ЗОСЬКА ВЕРАС

Я ПОМНЮ ЎСЁ


УСПАМІНЫ, ЛІСТЫ



ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

Я ПОМНЮ ЎСЁ

Успаміны, лісты



ЗОСЬКА ВЕРАС

Я ПОМНЮ ЎСЁ

Успаміны, лісты

Укладальнік Міхась Скобла



Гародня-Wrocław 2013



ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА прысвячаецца той Гародні, якой мы ганарымся.
Дзякуем усім, хто з намі.

Каардынатар кніжнай серыі «ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА»:
Павал Мажэйка

Ідэя серыі: Эдвард Дмухоўскі

Зоська Верас. Я помню ўсё: Успаміны, лісты – гэта 21-я кніга кніжнай сэрыі ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

Выданьне прымеркаванае да 120-х угодкаў Зоські Верас (Людвікі Сівіцкай; 1892–1991) – пісьменьніцы, мэмуарысткі, публіцысткі, лексыкографа, перакладчыцы, асьветніцы, грамадзкай дзеячкі. У аднатомавіку без купюраў друкуюцца яе ўспаміны і 386 лістоў (367 – упершыню), адрасаваных яе гарадзенскім карэспандэнтам.

Укладаньне, падрыхтоўка тэксту, прадмова, камэнтар, іменны паказьнік, кампутарны набор, рэдактура і карэктура: Міхась Скобла
Графічная апрацоўка і вёрстка: Іван Паўлёнак
Вокладка: Іван Паўлёнак

ISBN 978-83-7893-104-1
Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego
www.kew.org.pl
Друкарня: ZAKŁAD GRAFICZNY «COLONEL»S.A., Kraków

Copyright © Гарадзенская бібліятэка, 2013
© Міхась Скобла, укладанне, прадмова, каментар, 2013
© Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego, 2013

А ДУМКІ ЛЯЦЕЛІ Ў ГАРОДНЮ...

Сьмерць і радзіны не выбіраюць гадзіны. Зоська Верас не дажыла да свайго стагодзьдзя адзінаццаць месяцаў і восем дзён. 30 верасьня 1892 году прыйшла ў гэты сьвет — 8 кастрычніка 1991-га яго пакінула. А так хацелася, каб дажыла, каб заставалася жывым злучнікам паміж пакаленьнямі, эпохамі і стагодзьдзямі. Не збылося — сувязь часоў распалася.

Яе, маладую ўдаву наццэма Фабіяна Шантыра, расстралянага бальшавікамі ў 1920 годзе, прытуліў Панарскі лес пад Вільняй. А лес у беларусаў з лёсам сугучны, і лёсу скрыжалі недвухсэнсоўна вызначаюць, дзе і што нам рабіць: у сасновым лесе маліцца, у бярозавым — любіцца, у дубовым — волю каваць, у яловым — душу д'яблу прадаваць. А вось у якім лесе беларусу паміраць — скрыжалі тыя не паведамляюць. Таму Зоська Верас, калі прыйшла пара пакінуць гэты сьвет, пераехала ў Вільню, да дачкі. У гарадзкой кватэры ў звычайным блёчным доме і дажыла свае апошнія дні.

Я ня быў на яе магіле, і мне здаецца, што нікуды яна не пераяжджала. Проста выйшла аднойчы за парог і — сама стала лесам, сунічнікам, верасам. Або шарай пташкай — яшчэ адзін з яе псэўданімаў.

Амаль сем дзясяткаў гадоў — цэлае чалавечае жыцьцё — Зоська Верас пражыла ў сваёй Лясной хатцы. У ґлінабітнай, без усякіх выгодаў, у двары нават калодзежа не было. Улетку зьбіралі ў бочкі дажджавую ваду, узімку — тапілі сьнег.

Зоська Верас жыла ў лесе не пустэльніцай, хутчэй — партызанкай. І ваявала яна — актыўна і бескампрамісна — з усімі, хто пасягаў на гістарычную праўду. "Фальш шкодзіць гісторыі",— не стамлялася паўтараць старая дзяячка ў лістах да сваіх шматлікіх маладзейшых адрасатаў. Толькі за паваенны час лістоў гэтых яна напісала больш за шэсьць тысячаў, і ў кожным — штосьці ўдакладняла, кагосьці папраўляла, камусьці выносіла свой няўмольны прысуд.

Паказальны ў гэтым сэнсе выпадак з кнігай Алега Лойкі "Як агонь, як вада", якая выйшла ў 1984 годзе. Хітрамудры жанр "раману-эсэ" не дапамог аўтару пазьбегнуць бескампраміснай крытыкі ад Зоські Верас. За прыніжэньне Янкі Купалы і "Нашай нівы", за непраўдзівыя вобразы Івана і Антона Луцкевічаў (названых у рамане Лапкевічамі), за дыскрэдытацыю асобы Вацлава Ластоўскага (у рамане — Ласоўскі) кніга Лойкі ў Лясной хатцы атрымала найвышэйшую меру пакараньня — аўтадафэ — і была неадкладна спаленая на вогнішчы.

Аднойчы я даволі бестактоўна спытаўся ў свайго ўнівэрсытэцкага выкладчыка, ці ведаў ён пра тое лясное аўтадафэ? Алег Антонавіч са скрухай прызнаўся, што ведаў. Мала таго, тое вогнішча ў Панарскім лесе не давала яму спакою да канца дзён, яно і прымусіла ўрэшці перапісаць раман. Пасьля дапрацоўкі ён павялічыўся на сто старонак, трактоўка многіх падзеяў зьмянілася, а дзейным героям былі вернутыя іх сапраўдныя прозьвішчы.

Аўтарытэтаў на гэтай сваёй партызанскай вайне за праўду Зоська Верас не прызнавала. Дасталося ад яе і Зьмітраку Бядулю — за непраўдзівыя ўспаміны пра Максіма Багдановіча, і супрацоўніку Гістпарту пры ЦК КПБ Мікалаю Сташкевічу. Гаспадыня Лясной хаткі прачытала ягоную манаграфію

“Прысуд рэвалюцыі: крах антысавецкага руху ў Беларусі (1917–1925)” і на правах відавочцы апісаных там падзеяў вынесла свой прысуд: “Блытаніна!”.

З фальсыфікатарамі беларускай гісторыі Зоська Верас змагалася не галаслоўна, а з дапамогай дакумэнтаў. Прыкладам, яна захавала пратаколы беларускіх зьездаў, якія адбываліся ў Менску ў 1917 годзе, і настойліва прапаноўвала зацікаўленым людзям, якім давярала, прыехаць і азнаёміцца з імі. Перасылаць па пошце, улічваючы каштоўнасьць дакумэнтаў, не адважвалася. І гісторыкі, прагныя праўды, ехалі да першакрыніцаў.

Зьняпраўджвала Зоська Верас і распаўсюджаную ў савецкіх дасьледаваньнях інфармацыю пра падтрымку немцамі беларускага руху ў 1917–1918 гадах. Расказвала, як немцы брутальна выганялі беларускія арганізацыі з Губэрнатарскага дому ў Менску, як нейкі кайзэравец літаральна схапіў яе за руку, калі яна спрабавала забраць з шуфляды пячатку...

Дарэмна шукаць артыкулаў Зоські Верас пра ўсё гэта ў афіцыйным друку (а тады ўвесь друк быў афіцыйны). Па-першае, не надрукавалі б. Па-другое, ня надта яна таму друку давярала. І таму ў ход звыкла ішлі лісты-лістоўкі — праверaная партызанская практыка.

“Я помню ўсё”,— гэтай дэклярацыі Зоські Верас, выказанай у лісьце да аднаго з маладзейшых сяброў, няпроста паверыць. Гэта ж колькі падзеяў (гістарычных і шэраговых) яна перажыла, колькі людзей прайшліся поруч з ёй па жыццёвай дарозе! Але менавіта так — усё перажытае засталося ў яе фэнамэнальнай памяці, па якой можна было энцыкляпэдыі зьвяраць. І зьвяралі. Нездарма айчынныя энцыкляпэдысты Віталь Скалабан і Янка Саламевіч пакручастую дарогу да Лясной хаткі ведалі як свае пяць пальцаў. А з тае дарогі, бывала, зьбіваліся і спрактыкаваныя вандроўнікі. Скажам, Уладзімір Караткевіч, які, дарэчы, называў Зоську Верас “нашым батанічным богам”, аднойчы праблукаў паўдня ў Панарскім лесе і быў змушаны вярнуцца на віленскі брук, дзе, відавочна, пачуваўся больш упэўнена.

І ўсё ж дарогу да Зоські Верас знаходзілі — найчасцей з дапамогай яе зяця і найлепшага знаўцы гісторыі Вільні Лявона Луцкевіча, які, звычайна, сустракаў гасцей у дамоўленым месцы ў горадзе і, нібы спрактыкаваны сувязны, вёў іх далей прыгараднымі і ляснымі сьцежкамі. Усе менскія дапытлівыя нефармалы 80-х перабывалі ў Лясной хатцы. І такой бяды, што фотаздымкі з тых візытаў потым траплялі на старонкі адыёзнага “Политического собеседника”. Усім хацелася дакрануцца да жывой гісторыі.

Памятаю, як улетку 1987 году мы з Анатолем Сідарэвічам на свой страх і рызыку без праваднікa-сувязнога ішлі па чыгуначным палатне ў кірунку Панараў. Паміж рэек палахліва прыгіналі галовы прыземістыя рамонкі, чыгунка на даляглядзе пакалыхвалася ў сьпякотным марыве. Адна паваротка, другая... Першым згубіў арыентацыю я. А тут яшчэ абапал сьцежкі, проста пад нагамі — чырвоныя россыпы суніцаў, як хто крапідлам пакрапіў. Гэтак штохвіліны прыпыняючыся і ласуючыся, мы і дайшлі да партызанскага жытла — Лясной хаткі. Прыземістая, гліняныя сьцены ў размытых дажджамі трэшчынах, з якіх было відаць, што трымалася ўся спаруда на зьвязаных між сабой калочках. На падворку нас сустрэў Лявон Луцкевіч, які выказаў зьдзіўленьне — як жа мы не заблудзілі ў іхнім Панарскім лесе. Ягоная жонка Галіна Войцік частавала нас чарніцамі з малаком. Пачастунак, памятаю, зацягнуўся — Людвіка Антонаўна заседжвалася дапазна, таму з раніцы яе стараліся не будзіць. Мы бавілі час

на падворку, дзе Лявон Луцкевіч паказваў нам жыцьцёваважную ў сухаземным лесе сыстэму вадасьцёкаў.

Калі Зоська Верас прачнулася, пані Галіна паклікала нас у хату. І вось — зацішная бакоўка, нейкія старыя камоды з шуфлядамі і ў зручным фатэлі — яна. Маленькая, прыветлівая, з маладымі вачыма. На сьцяне кідаецца ў вочы падвойны партрэт, на якім маладая Зоська Верас з Максімам Багдановічам на менскай вуліцы.

Анатоль Сідарэвіч пісаў вялікімі літарамі свае пытаньні (на дзясятым дзясятку Зоська Верас амаль страціла слых), а мне было няёмка і турбаваць яе прыпамінаньнямі. Колькі падобных паломнікаў і цэлых дэлегацый прыняла яна за сваё жыцьцё і перад кожным дапытлівым суразмоўцам браму скарбаў сваіх адчыняла.

Гэта яна надрукавала свой першы твор яшчэ ў 1907 годзе — усяго на два гады пазьней за Янку Купалу, а аўтарам легендарнай “Нашай нівы” стала ў 1911-м.

Гэта яна ў 1916 годзе прывячала ў Менску Максіма Багдановіча, які абяцаўся пісаць ёй зь Ялты, з “белага дома над сіняй бухтай”.

Гэта яна на ўсё жыцьцё запомніла, як бальшавікі ў сьнежні 1917-га разганялі ў Менску І Усебеларускі кангрэс.

Гэта яна за свае сьціплыя заробкі ў 1928 годзе выдала паэтычны зборнік Міхася Машары “Малюнкі” і толькі за гэта заслугоўвае ня меншай пашаны, чым Магдалена Радзівіл — фундатарка неўміручага “Вянка”.

Гэта яна рабіла і выпускала ў сьвет часопісы для дзяцей “Заранка” і “Пралескі”, а для дарослых — месячнік “Беларуская борць”, якім карысталіся пчаляры па ўсёй Заходняй Беларусі.

Гэта яна склала і выдала ў 1924 годзе знакаміты “Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік”, у які і сёньня не зашкодзіць зазірнуць самым дасьведчаным лексыкографам, каб даведацца, як праўдзіва на роднай мове называецца тая ці іншая расьліна.

Гэта яна, ведаючы пра пільнае цэнзураваньне дванаццацітомавай “Беларускай савецкай энцыкляпэдыі”, склала свой уласны рукапісны энцыкляпэдычны даведнік, дзе зьмясьціла жыцьцяпісы Аркадзя Смоліча, Станіслава Грынкевіча, Янкі Багдановіча, Міхася Забэйды-Суміцкага — двух дзясяткаў выдатных беларускіх дзеячоў, імёны якіх на той час айчынным эцыкляпэдыстам згадваць забаранялася.

Гэта да яе паэт і бібліяфіл Гальяш Леўчык пісаў са Слоніма прачулыя лісты, якія пачыналіся ласкавымі звароткамі “залаценечка і дарагенечка дзядзінячка”, альбо “паважаная цётухна і залатая сястронка”...

Лісты ў Лясную хатку прыходзілі часта. І на кожны нястомная гаспадыня давала адказ — успаміная, тлумачыла, удакладняла. Уся карэспандэнцыя захоўвалася ў ідэальным парадку — меў магчымасьць пераканацца ў гэтым на свае вочы. Усе шуфляды ў бакоўцы былі літаральна пад завязку запоўненыя фотаальбомамі і акуратна перавязанымі стосікамі лістоў. Памятаю, Зоська Верас прасіла адчыніць пэўную шуфляду, дастаць патрэбны альбом ці пакунак, а пасьля асьцярожна трымала іх на каленях — лісты ад Ларысы Геніюш, Міхася Забэйды-Суміцкага, Генадзя Каханоўскага, Віталя Скалабана, Янкі Саламевіча, Арсеня Ліса, Аляксея Пяткевіча, Дануты Бічэль...

Ці ня самае працяглае і інтэнсіўнае ліставаньне Зоська Верас мела з Ларысай Геніюш, яно доўжылася каля чатырнаццаці гадоў — з 1967-га па 1983-ці

і налічвае больш за шэсцьсот лістоў (з абодвух бакоў). Абедзьве Антонаўны пісалі свае эпісталярныя летапісы проста самазабыўна. Ларыса Антонаўна ў сьнежні 1967-га наведала Лясную хатку, нават заначавала ў сваёй прыяцелькі, і яны да самай раніцы не маглі нагаварыцца. Гэтыя дзьве пасыянарныя беларускі ўмелі і пчолы гадаваць, і кветкі разводзіць, і вершы пісаць, і нацыянальным духам палымнець, ды так, каб і другія займаліся.

Як жа шкада, што Лясная хатка, у якой Зоська Верас пражыла — так прыкметна для Беларусі! — сем дзясяткаў гадоў, згарэла ў 1990 годзе, калі гаспадыні там ужо не было. Памятаю, пачуўшы пра пажар у Панарскім лесе, я з жалем падумаў, што згарэла і ўся бачаная ў Лясной хатцы перапіска. Але, дзякаваць Богу, вялікая частка эпісталярыю ацалела, своечасова перададзеная на захаваньне ў Беларускі дзяржаўны архіў-музэй літаратуры і мастацтва. Створаны там асабісты фонд Зоські Верас — надзейная схоўніца тых уратаваных з Панарскага лесу скарбаў.

Тады, у 1987-м, я адыходзіў з Лясной хаткі з дзіўным пачуцьцём — быццам зьдзейсьніў падарожжа ў мінулае на машыне часу. І доўга ня мог апрытомнець, нават ужо сеўшы ў менскі цягнік. Жалезныя колы разгоніста татахкалі на рэйкавых стыках, я чытаў зборнік "Каласкі", падараваны Анатолю Сідарэвічу з аўтографам аўтаркі, і думаў, што дарэмна Зоську Верас менскія парнасцы паблажліва называюць толькі дзіцячай пісьменьніцай. Ёсьць у яе верш "Ліст", які ня трапіў у "Каласкі" акурат з-за свае недзіцячасьці. Гэты лірычны шэдэўр нашаніўскай эпохі я калісьці ўлучыў у паэтычную анталёгію "Краса і сіла", прыйдзе час — і ім распачнецца больш поўны збор твораў паэткі і мэмуарысткі, лексыкографа і публіцысткі, перакладчыцы і асьветніцы Зоські Верас:

Хацела да цябе напісаці
На пялёстку ружы пахучай,
Але пялёстак мог згінуць
У пору буры грымучай.

Хацела да цябе напісаці
На скрыльлі у матылёчка,
Але матыль умірае,
Як прыйдзе цёмная ночка.

Хацела я ліст паслаці
Праз ластаўку з нашага дому,
Але ж яна магла даці
Яго каму-небудзь другому.

І так дзянёчкі праходзяць.
Не маю яго як паслаці,
А ліст такі ўжо сардэчны
Хацелася напісаці.

Адзін літаратуразнаўца, пачуўшы гэтыя радкі, усклікнуў: "Дык гэта ж насьледаваньне Максіму Танку — ягонаму вершу «Перапіска з зямлёй»!". Давялося патлумачыць калегу, што ў час, калі пісаўся "Ліст", падлетак Жэнік Скурко

(будучы народны паэт Максім Танк) бегаў з затуленага лесам пількаўскага хутара ў Сваткаўскую школку і лісты пісаў хіба пад дыктоўку сваёй бабкі Ульляны — жыцьцёва-празаічныя.

Народжаная на ўкраінскай Жытоміршчыне ў сям'і вайскоўца, большую частку свайго веку пражыўшы пад Вільняй, Зоська Верас усё жыцьцё заставалася патрыёткай Гародні і Гарадзеншчыны, адкуль паходзілі ўсе яе дзяды — па мячы і па кудзелі. "Мае думкі часта лятуць у Гродна — да ценяў дзядоў маіх, да ўспамінаў аб шчырай заўзятай працы ў Гродзенскім гуртку беларускай моладзі, дзе я стала на беларускую дарогу, па каторай іду ўжо 71 год," — пісала яна ў лісьце да паэткі Дануты Бічэль. А ў адным з апошніх сваіх лістоў да прафэсара Аляксея Пяткевіча ўжо амаль невідушчая Зоська Верас пыталася: "Як там жыве маё Ґродна?". Выведзеныя флямастарам буйныя непаслухмяныя літары распаўзаюцца па адмыслова разьлінееным аркушы, іх ледзь можна разабраць... Вернасьць гораду свайго маленства і юнацтва жыхарка Панарскага лесу захавала праз усё сваё доўгае жыцьцё, у лістах да гарадзенцаў называючы сябе "старой гродзенскай патрыёткай" або "гродзенскай душой на выгнаньні".

Хоць на эксьлібрысе Зоські Верас (мастак — Вячка Целеш) над усім дамінуе віленская вежа Гедыміна. І гэта нібыта таксама заканамерна — Зоська Верас была genius loci Вільні, genius loci беларускай Вільні. Без яе Вільня лягчэй ператвараецца ў Вільнюс. Шкада, што грамадзянка Людвіка Антонаўна Сівіцкая — назавем нарэшце яе сапраўднае імя — пахаваная не на Росах, дзе ёсьць нейкае падабенства нашага нацыянальнага нэкропалю. Сваім жыцьцёвым подзьвігам яна бясспрэчна заслужыла быць пахаванай у самым ганаровым месцы. Заслужыла сваім узвышэньнем праўды і Беларусі. А ўзгорыстыя могілкі Росы — адзінае месца ў сьвеце, дзе беларусы — вышэй за ўсіх.

Міхась Скобла

АЎТАБІЯГРАФІЯ

Радзілася [redacted] 30 верасьня 1892 году ў мястэчку Мяджыбаж паміж двума Бугамі-рэкамі, у Падольскай губэрні Лятычаўскага павету, г.зн. на Украіне, у сям'і вайскоўага. Бацька мой, Антон Сівіцкі[1], паходзіў з Гродна, маці, Эмілія з Садоўскіх[2],— з Сакольскага павету, дзе яе бацькі мелі невялікі фальварак Альхоўнікі.

Ад наймалодшых гадоў кожнае лета я з маткай праводзіла ў Сакольшчыне, наведываючы часта і дзядоў у Гродне. Хоць удома гаварылі па-польску, бацька мой палякам сябе не лічыў. Лічыў сабе літвіном, у тым значэньні, як Адам Міцкевіч[3] лічыў сваю бацькаўшчыну Літвой.

З улюбёнымі паэтамі бацькі — А. Міцкевічам і У. Сыракомлем[4] — я пазнаёмілася, маючы 10 гадоў. Тады, помню, седзячы на сходках ганку, чытала "Пана Тадэвуша". У гэтым самым часе бацьку на імяніны навучылася вынятак твору У. Сыракомлі "O budownictwie Wilna"[5] (дванаццаць старонак друку). Агульнага назову твора ня помню.

Паэзія, знаёмства з прыродай, туга па роднай Гродзеншчыне — усё гэта ўзгадавалі ў маёй душы бацькі. Маючы 9–10 гадоў, пачала пісаць апавяданьні і вершы — наіўныя, дзяцінныя. Першапачаткова бацькі вучылі мяне самі. Усяго, з музыкай уключна. Толькі ў 1904 годзе маці выехала са мной у Кіеў, дзе я паступіла ў прыватную гандлёвую школу — *Частное коммерческое училище Людмилы Николаевны Володкевич*.

Гэта была школа ў тыя часы, хіба, самая прагрэсіўная ў Расеі. Багатая бібліятэка з кніжкамі ў розных мовах, кабінэты фізыкі, хіміі, біялёгіі, фатаграфічныя лябараторыі. Абавязковыя мовы — нямецкая і француская (ясна, па-за расейскай), неабавязковыя — ангельская і польская. Пачынаючы з трэцяй клясы — клясовы часапіс. Шматлікія экскурсіі, на якіх праводзіліся лекцыі батанікі. Гурткі — літаратурны, біялягічны і г.д. Вось тады, ужо ў школе, зарадзілася ў мяне зацікаўленьне літаратурай і батанікай.

У 1906 годзе, летам, першы раз трапілі мне ў рукі "Наша ніва", "Дудка беларуская" і "Смык"[6]. Наколькі яны мяне ўразілі і спадабаліся, відаць з таго, што ў клясовай працы з польскай мовы "Charakterystyka Litvy" я старалася выясьніць розьніцу між літвінамі і беларусамі і прыводзіла, як доказ асобнай беларускай мовы, "Нашу ніву", "Дудку" і "Смык". Разумеецца, зроблена гэта было па-дзіцячаму. А ўсё ж...

На жаль, навука ў гэтай школе, якая пакінула ў маёй псыхіцы немалы сьлед, нечакана абарвалася. У 1907 годзе, у лістападзе, памёр раптоўна мой бацька. Аставацца надалей у Кіеве нам з маці не хацелася. Цягнула да сваіх. Я скончыла вясной 1908 году чацьвёртую клясу, і мы выехалі ў Гродзеншчыну. У 1909 годзе [redacted] паступіла ў 6-ю клясу прыватнай жаночай гімназіі К. Баркоўскай. Праграма гэтай гімназіі больш адпавядала праграме кіеўскай школы, чым у дзяржаўных гімназіях.

У тым жа 1909 годзе, увосені, я стала на тую сьцежку, па якой ішла праз ўсё дальнейшае жыцьцё. Менавіта ўвосені 1909 году арганізаваўся Горадзенскі гурток беларускай моладзі[7]. Адразу на арганізацыйным сходзе мяне выбралі бібліятэкарам гуртка. З гэтай прычыны завязалася карэспандэнцыя з віленскай

Беларускай кнігарняй, рэдакцыяй “Нашай нівы”, суполкай “Загляне сонца і ў наша ваконца”, а пазьней і асабістае знаёмства з віленскімі беларусамі. Паміж іншым, Іван Уладзіміравіч Саламевіч[8] знайшоў у архівах “Нашай нівы” мае лісты з таго часу.

У 1912 годзе я скончыла гімназію, а ў 1913-м выехала ў Варшаву на 10-месячныя курсы агародніцтва, садаўніцтва і пчалярства. Узяцца за даўжэйшую і саліднейшую навуку не пазваляла здароўе.

Яшчэ ў 1912–13 гадах я пачала складаць “Батанічны зельнік”, ставячы на першае месца назовы расьлін у беларускай мове. Падчас вайны (Першай сусьветнай) зельнік прапаў, але запісаныя назовы засталіся.

Скончыўшы курсы 1 ліпня 1914 году, я атрымала пасьведчаньне “аб'яздовага інструктара” і мела намер адбыць яшчэ хоць бы аднагадовую практыку. Але пачалася Першая сусьветная вайна. Выехаць нікуды не змагла і практыку адбывала ў свайго дзеда, замілаванага садаўніка і пчаляра. Ён, паміж іншым, вучыўся пчалярства ў Варшаве ў пчаляра Лявіцкага, якога іменем названы рамовы вулей яго ж канструкцыі. У вольны час далей запісывала назовы расьлін, да таго песьні, загадкі, прыпеўкі.

У жніўні 1915 году я разам з маткай выехала ў Менск. Там працавала ў Камітэце Таварыства помачы ахвярам вайны[9] і іншых арганізацыях (у Беларускім нацыянальным камітэце[10], у Цэнтральнай Радзе беларускіх арганізацый[11], у Вялікай Беларускай радзе[12], у Беларускай сацыялістычнай грамадзе[13]) — усюды сакратаркай. Найбольш працавала ў Таварыстве помачы ахвярам вайны (дарэчы, мая маці — таксама). У якой ролі — цяжкавата акрэсьліць, бо мая праца мянялася часта: была там, дзе была якраз патрэбная. Менш-больш так: загадчыцай сталовак, пасьля загадчыцай дзіцячага прытулку, загадчыцай ткацкай працоўні, скарбнікам, сакратаром і г.д. Мела таксама працу ў сваім фаху, бо Камітэт помачы ахвярам вайны правёў 6-тыднёвыя (45 дзён) курсы агародніцтва і пчалярства для бежанцаў. Лекцыі вяліся па-беларуску, а дазвол на курсы быў выданы Міністэрствам земляробства.

У 1918 годзе, пад восень, вярнулася ў Горадзеншчыну. Пяць гадоў пражыла ў дзедаўскім фальварку (дзеда ўжо не было) Альхоўніках. Тады далей апрацоўвала “Батанічны слоўнік” (быў выданы ў 1924 годзе рэдакцыяй газэты “Голас беларуса”) і — супольна з украінскім аграномам Міхайлам Бароўскім[14] — кніжку “Медадайныя расьліны”. Украінец пісаў па-ўкраінску, я — па-беларуску. Толькі доля нашай працы была не аднолькавая. Ён скончыў і выдаў у Львове сваю кніжку, багата ілюстраваную, а мая работа друкавалася пакрысе на старонках “Беларускай борці”[15]. І то ня ўся.

У канцы 1923 году я ўжо настала ў Вільні. Адразу засадзілі мяне адміністратаркай грамадаўскіх газэт на Віленскай,12. У вольны ад сваёй працы час я ў 1927 годзе пачала рэдагаваць і выдаваць дзіцячую часапіс “Заранка”, а таксама “Гаспадарчы дадатак” да газэтаў (раз у месяц).

У 1928 годзе арганізуецца Беларускае каапэратыўнае таварыства “Пчала” з абмежаванай адказнасьцю. Выбіраюць мяне старшынёй. У 1934 годзе таварыства “Пчала” пачынае выдаваць свой орган “Беларуская борць” пад маёй рэдакцыяй. У 1935 годзе “Пчала” арганізуе завочныя курсы па збору медадайна-лекарскіх і лекарскіх зёлак. Гэтыя курсы апрацоўваем удваіх са студэнтам-мэдыкам В. Тумашам[16].

Нядоўга трывае час дзейнасьці. У 1931 годзе гасьне "Заранка". У 1938-м перастае выходзіць "Беларуская борць". Зачыняецца таварыства "Пчала". Наступае некалькі гадоў нейкага духовага летаргічнага сну...

А пасьля мяне "разбудзілі", намовілі пісаць успаміны. "Разбудзіў" мяне Арсень Сяргеевіч Ліс[17]. У 1977 годзе ўспаміны скончаны. Знаёмства з сучаснымі беларускімі пісьменьнікамі, карэспандэнцыя з імі. Час ад часу ўдаецца перасылаць нейкую патрэбную вестку... Так канчаецца жыцьцё...

Трэба дадаць, што мае дробныя працы друкаваліся: У 1911–1913 гадах у "Нашай ніве" пад псэўданімам Мірко — "Песьня сіраты", "Ветру", "Дайце мне прыязьнь людзкую"; у "Вольнай Беларусі" (Менск) — "Нёману", "Толькі сон"; у 20–30-я гады ў "Студэнцкай думцы", у "Шляху моладзі", у кніжцы-зборніку "Наша праца" (Дзяржаўнае выдавецтва ў Львове; зборнік запраектаваны для дзьвюхмоўных школаў, год выданьня — 1937), у "Хрэстаматыі" І. Дварчаніна[18] і, зразумела, у "Заранцы" і "Беларускай борці", некалькі гадоў — у адрыўных календарах, дзе бывалі парады па агародніцтву, пчалярству, садаўніцтву і жаночай гаспадарцы. Ляжаць рукапісы перакладаў: "Палаючае сэрца Данка" М. Горкага[19] і "Цыганка Аза" Ю. Крашэўскага[20].

1978

УСПАМІНЫ

СТАРОЕ ГРОДНА

Думаю — Гродна! Бачу дзедаў парог
І чую тупат сваіх дзіцячых ног.
Думаю — Гродна... Адчуваю павеў маладосьці.
Ці не паехаць мне ў тое старое Гродна ў госьці?

А езьдзіць у госьці пачала вельмі рана... Першы раз павезла мяне маці ў Гродна, каб паказаць татавым бацькам, калі мне было шэсьць месяцаў. Тады мяне першы раз сфатаграфавалі. Пасьля ўжо з году ў год летам, прыяжджаючы з далёкай Украіны, дзе мы з бацькам жылі,— тата быў вайскоўцам,— я гасьцявала ў дзядоў Сівіцкіх — Міхала і Міхаліны.

Першыя чатыры гады сьлядоў у памяці не пакінулі. Але з пяці гадоў падарожжа з Альхоўнікаў, маленькага фальварка маміных бацькоў Садоўскіх, дзе мы праводзілі два, а то і тры летнія месяцы, помніцца жыва і ясна.

Езьдзілі коньмі. З Альхоўнікаў вузкая конная дарога вяла да шашы, якая злучала форт Асавец з Гродна. Гладкая шаша праходзіла паміж палямі, а вялікі яе адрэзак ляжаў паміж старым густым яловым лесам. У адным месцы сярод лесу была палянка, якая выходзіла аж на шашу. Расказвалі, быццам калісь на гэтай палянцы стаяла вялікая карчма, а ў гэтай карчме начамі зьбіраліся разбойнікі і нападалі на падарожнікаў. Памятаю, калі мне было гадоў шэсьць, на гэтым месцы я са страхам ціхенька, шэптам спыталася:

— А цяпер карчмы німа? А мо яе перанясьлі глыбей у лес? А разбойнікаў німа?

Канчаўся лес — міналі страхі. Далей ізноў палі, сенажаці. Нарэшці здалёк відаць дамкі Фарштата — як з нямецкай называлі прадмесьце Гродна. Шаша зьлівалася з вуліцай, якая рабілася штораз больш стромкай, бо спускалася да Нёмана. Але перад самым спускам на правым баку вуліцы быў заезд. Заезд, якіх поўна было на Беларусі. Праўда, не было тут карчмы, як усюды, а невялічкі чысты драўляны дамок, у якім першы ад увахода пакойчык — сьветлы, з фіранкамі на вокнах і нядрэннай мэбляй,— быў месцам адпачынку для падарожных. Нават можна было заказаць шклянку гарбаты і ваду, каб змыць дарожны пыл.

Але "заездам" называлі гэты дом таму, што да яго была прыбудавана вялікая будыніна: чатыры высокія сьцяны, страха, таксама высокая, з гонтаў; столі не было, а замест дзьвярэй — шырокія вароты, так што параконны воз ці брычка лёгка туды ўяжджалі ці на некалькігадзінны адпачынак, ці на ноч. Найчасьцей, адпачыўшы, пакарміўшы і папаіўшы коней, ехалі ў горад.

І тут было самае страшнае. Стромкая вуліца спускалася да Нёмана на мост. Але мост быў пантонны. За кожным крокам каня, за кожным паваротам калёсаў пантоны калыхаліся, вада хвалявалася. Коні стрыглі вушамі, коса паглядалі на ваду. Таму праз мост фурманкі маглі ехаць толькі па адной, ня больш. Часам па некалькі фурманак стаяла пры ўезьдзе — чакалі сваёй чаргі. Каб утрымаць належны парадак, пры ўезьдзе на мост жыў стражнік. Для яго быў збудава-

ны дамок — нешта падобнае да марской ліхтарні. На высокіх чатырох слупах невялікі дамок — адзін пакой.

Уваходзілася па сходах. У адной пярэдняй сьцяне — дзьверы, тры вялікія, амаль на ўсю сьцяну, акны. Гэта каб відаць было ня толькі мост, але і Нёман з абодвух бакоў мосту. Стражнік пільнаваў парадку і разводзіў мост, калі з аднаго або другога боку зьяўляліся плытнікі. У гэтым дамку я была ў дзесяцігадовым узросьце. Маці тагачаснага стражніка Вішнеўскага шмат гадоў была хатняй памочніцай маёй бабулі Міхаліны Сівіцкай. Якраз улетку, калі я гасьцявала ў Гродне, гэты стражнік памёр. Бабка мая пайшла наведаць нябожчыка і ўзяла мяне з сабой.

Едзем далей... Мост шчасьліва пераехалі, паварочваем налева, на вуліцу Падольную, якая праходзіла па беразе Нёмана. Яна вывела нас на вуліцу Мастовую. Можа, яна ў той час называлася інакш, а Мастовай назвалі, як пабудавалі сталы мост? Гэтага ня помню. Ехалася гэтай шырокай вуліцай пад гару, побач Бэрнардынскага касьцёлу і далей аж да Фары. Гэта для мяне быў самы цэнтр гораду, дзе цяперашняя вуліца Карла Маркса, а тады Купецкая. Яна ня раз мяняла свой назоў, бо да Купецкай называлася Брыгіцкай. Гэты апошні назоў зноў ужывалі з 1908 году. За Фарным касьцёлам жылі мае дзяды Сівіцкія. Вялікія вароты амаль заўсёды зачынены, каля іх вузкая брамка.

Уваходзілася на брукаваны панадворак, уздоўж якога расьлі дрэвы, а ў іх цяньку стаялі лаўкі. Каля самай брамы — мураваны двухпавярховы дом. З правага боку — даўгі, праз цэлы панадворак, дом: ніз мураваны, верх драўляны. Наверх вялі вонкавыя сходкі. У мураванай частцы дома жылі мае дзяды. Кватэра вялікая, сьветлая, мела адзін недахоп — была напалавіну сутарэннай. Дзяды перабраліся ў гэтую кватэру пасьля апошняга вялікага пажару Гродна.

Насупраць, за дрэвамі, стаялі гаспадарчыя будынкі — складзікі, скляпы, якія служылі ўсім жыхарам. Чацьвёрты бок панадворку займаў высокі мур, за якім віднеўся апошні паверх астрогу. Было непрыемна бачыць вокны з кратамі, за імі — часам змучаныя людзкія твары...

Дамы, пра якія толькі што расказала, усе разам мелі назву "Дом сабornага духавенства". Захавалася паштоўка, адрасаваная дзеду ў 1905 годзе, з такім адрасам.

Малой усё было цікава. Выйдзеш за браму — на супрацьлеглым баку вуліцы дом Аўтусевіча: унізе цукерня, на другім паверсе невялічкі гатэль. На рагу — будынак з чырвонай цэглы — дом Стэфана Баторыя[1]. Паміж сьцяной Фарнага касьцёлу і невысокім мурам — вузкі будынак кнігарні Левандоўскага. Вокнаў у кнігарні не было, гарэлі лямпы. Апрача кніжак прадаваліся пісьмовыя прылады. Часта я там бывала са сваёй бабуляй. Пакуль ня ўмела чытаць, куплялі мы там паперу і каляровыя алавікі, фарбы.

Але самае цікавае чакала перад уваходам у Фарны касьцёл. Там, дзе цяпер сквэр, быў пляц і, здаецца, некалькі дрэваў. Уздоўж пляца — вялікі драўляны будынак Ратушы. На другім паверсе магістрат ці гарадзкая ўправа, унізе — цэлы рад маленькіх крамак. Калі ў такую краму ўвойдуць адразу тры асобы, павярнуцца цяжка.

У першай краме была галянтарэя. Гаспадарыла там Гарбатая Бася. Чаго там ні было! Дзіцячыя вочы разьбягаліся, бо тут і касьнікі розных колераў, карункі, гузікі, іголкі, шпількі, шнуркі да боцікаў.

Наступная крама — жалезныя тавары: сярпы, косы, сякеры, малаткі,

а найцікавей — на даўгім услоне скрыні з цьвікамі. Ад велізарных да такіх малюсенькіх, што цяжка было пальцамі захапіць.

Далей — крамка з мукой і крупамі. У апошняй краме стаяла аграмадная бочка з кранам. Праз кран налівалі газу. Тут былі жалезныя дзьверы, а ўсярэдзіне і сьцены, і падлога, і столь абабітыя бляхай.

Каля Ратушы ў рынкавыя дні зьбіраліся сяляне. За пляцам з Ратушай узвышаўся Дамініканскі касьцёл. Пасьля паўстаньня 1863 году царскі ўрад касьцёл ператварыў у гарнізонны сабор. Пасьля Першай сусьветнай вайны ён зноў стаў касьцёлам. Направа ад яго ішла Дамініканская вуліца, назва якой зьмянялася разам з назвай касьцёлу — то Дамініканская, то Саборная. Гэта была галоўная вуліца ў горадзе. У суботу вечарам і ў нядзелю на ёй было месца спатканьняў і шпацыраў гродзенскай моладзі. Ходнік, асабліва з правага боку, быў так шчыльна запоўнены, немагчыма ні абмінуць, ні разьмінуцца. Так да позьняга вечару адны другім наступалі на пяткі...

На пачатку гэтай вуліцы, калі лічыць ад Дамініканскага касьцёлу, адзіны ў Гродне ўнівэрсальны магазін рускага купца Мухіна. Прадаваліся тульскія самавары, дарагія футры, ільняное палатно і дарагія сукны, і ядвабы, і сярэбраныя лыжкі, лыжачкі, відэльцы, нават элегантны абутак. Прадаваў сам гаспадар. Кліентаў было мала, але магазін існаваў доўга.

У 1898 годзе бацька мой, афіцэр пяхоты, атрымаў трохтыднёвы адпачынак, і мы ўсёй сям'ёй прыехалі ў Гродна. Тады я пабачыла ўвесь горад. Бацька любіў родны горад і яго ваколіцы. Перадусім павёў мяне на Каложу ды на Замак. Сьцежачкай каля Замку сышлі на бераг вольнага, не закаванага ў бэтон, Нёману...

Процілеглы бераг быў нізкі, пясчаны. Пад старымі, схіліўшыміся над вадой вербамі, рыбакі ў цяньку трымалі свае лодкі. Заўсёды нехта быў каля лодкаў. Даволі было паклікаць, як хто-небудзь сьпяшаўся павазіць жадаючых па Нёмане. Вось і вазіў мяне бацька да Крэйдавых гораў або ў процілеглы бок, аж за чыгуначны мост. У наступныя гады ня раз плавала я са сваім дзедам.

Так ішлі гады. Мы ўжо жылі ў Кіеве. Я вучылася ў гандлёвай школе. У 1907 годзе раптоўна памёр бацька. Не хацелася заставацца там, і мы з мамай пастанавілі ехаць да сваіх у Гродна. 1909 год застаў мяне ў Гродне вучаніцай шостае клясы прыватнай гімназіі Кацярыны Баркоўскай, якая мясьцілася ў камяніцы Стэфана Баторыя. Гэтай самай восеньню зарганізавалі Гарадзенскі гурток беларускай моладзі. Мяне выбралі бібліятэкарам. Праца ў гуртку разьвівалася плённа. Сходы, лекцыі, арганізацыя хору. Жылі з мамай амаль насупраць Брыгіцкага касьцёлу. У кватэры было піяніна, рэпэтыцыі хору адбываліся ў нас. Так пражылі толькі адну зіму.

Цяжка было праіснаваць на невялікую пэнсію па бацьку, таму мама атрымала дазвол у школьных уладаў арганізаваць у нас "вучнёўскую кватэру". Трэба было шукаць адпаведнае памяшканьне. Знайшлі ў знаёмай бабулі Будрыкавай на Гараднічанскай вуліцы, нумар чатырнаццаць. Пяць пакояў, кухня, перадпакой, балькон. Праўда, у мансардзе. На панадворку стаялі дрэвы, расла трава. Балькон выходзіў на панадворак. Вучняў набралася восем чалавек — усе беларусы, сябры гуртка. Бібліятэку перанесьлі сюды. Наш дом стаў кватэрай гуртка. Тут адбываліся рэпэтыцыі хору, спэктакляў, лекцыі і вечарынкі для малодшай сэкцыі. Заўсёды былі ў нас сябры з гуртка.

Як толькі прыходзіла вясна, не сядзелася ў горадзе. У першую цёплую нядзелю ішлі ў поле спатыкаць вясну. Ішлі аж пад прыстанак Ласосна або і далей.

Восеньню хадзілі на бераг ракі насупраць Францішканскага касьцёлу. Ціха стаялі цеснай групкай і чакалі, пакуль туман не падымецца настолькі, каб закрыць ніжнюю частку касьцёлу. Тады вежы, здавалася, плылі ў небе высока, нібы адарваныя ад зямлі. Як у казцы...

Але не заўсёды былі ў такім рамантычным настроі. Прыходзілі ў галаву і вясёлыя выдумкі. Быў у нас у гуртку Казюк Калышка з-пад Ваўкавыска. Сярэдняга росту, твар круглы. Апранулі мы яго ў беларускі жаночы касьцюм, завязалі на галаву шаляноўку, дзьве дзяўчыны ўзялі яго пад рукі і павялі ў самую гушчу шпацыруючых па Саборнай вуліцы. Гаварылі паміж сабой, як заўсёды, па-беларуску, але на гэты раз спэцыяльна гучна, каб зьвярнуць на сябе ўвагу. Зразумела, пачалі на нас аглядацца, ісьці за намі. Так дайшлі амаль да самай мужчынскай гімназіі. Але тут спахапіліся, што можам трапіць каму на вочы з настаўнікаў гімназіі, якія час ад часу сачылі за паводзінамі гімназістаў на вуліцы. Хуценька павярнулі ў першы папаўшыся завулак і пайшлі дамоў.

Апошняй падзеяй гуртка быў выдадзены на шапірографе ў 1913 годзе зборнічак "Колас беларускай нівы". Ішоў апошні год майго жыцьця ў Гродне. Восеньню выехала ў Варшаву на курсы. Пажагнала Гродна назаўсёды.

У памяці захавалася яшчэ адна падзея. У 1910 годзе цяжка захварэла Эліза Ажэшка[2]. Вуліца перад яе домам была заслана тоўстым пластом саломы, каб грукат колаў фурманак не трывожыў хворай. Горад перажываў моцна штораз горшыя весткі аб стане здароўя пісьменьніцы. Папраўы не было. Прыйшла сьмерць.

Адчынены дзьверы. Чорныя заслоны ў вокнах. З-за іх відаць запаленыя сьвечкі. Гродзенская інтэлігенцыя стварыла камітэт, які ўтрымліваў парадак і ладзіў хаўтуры. Нехта пісаў, што ўлады забаранілі моладзі з гімназій прымаць удзел у хаўтурах. Можа, мелася на ўвазе моладзь з дзяржаўных гімназій. Дзяўчаты з прыватных школ былі ўсе, пачынаючы ад пятае клясы. Мы ведалі творы пісьменьніцы, любілі іх. Узяўшыся моцна пад рукі, мы зрабілі ланцуг, які стрымліваў натоўп, што сабраўся на ходніках, каб не сыходзіў на вуліцу, сярэдзінай якой нясьлі на руках труну. Маса людзей розных нацыянальнасьцяў не зважала, што ў ланцугу пераважна дзяўчаты, націскалі моцна. Але мы неяк вытрымалі.

На трэці дзень пасьля хаўтур дом пісьменьніцы быў адчынены. Можна было ўвайсьці, агледзець кватэру, дзе столькі гадоў яна жыла, працавала. Мяне найбольш зьдзівілі прымацаваныя на сьценах кампазыцыі з засушанага лісьця і кветак, зробленыя рукамі Элізы Ажэшка.

Як жа я шкадавала, што мая нясьмеласьць не дазволіла зайсьці да яе. І магчымасьць была. Сваячка маёй бабулі была з Элізай Ажэшка ня толькі знаёмай, а і сталай спадарожніцай у шуканьні тыпаў, жыцьцёвых фактаў для творчасьці паміж горадзенскіх бедных рамесьнікаў.

ГОРАДЗЕНСКІ ГУРТОК БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

1909 год. Восень. У маленькім памяшканьні ў Бэрнардынскіх мурах у ксяндза Францішка Грынкевіча[1] сабралася невялікая грамадка моладзі. Гэта арганізацыйны сход беларускага гуртка. Былі там гімназісты апошніх клясаў: Адам Бычкоўскі[2] (першастрэчны брат рэдактара "Беларуса" Антона

Бычкоўскага[3]), Ф. Эйсмант, П. Аляксюк[4], сёстры Салянкоўны — Анна і Марыя, Гэлена Шэгідзевічанка (ужо скончыўшыя школы) і я, Людвіка Сівіцкая, вуч[аніца] 6-ай клясы.

Гаварылі аб патрэбе сваёй арганізацыі, выбралі назоў — Горадзенскі гурток беларускай моладзі, у скарачэнні — ГГБМ, абдумалі, якую зрабіць пячатку і выбралі ўрад: старшыня — А. Бычкоўскі, віцэ-старшыня — П. Аляксюк, сакратар — З. Абрамовіч[5], бібліятэкар — Л. Сівіцкая.

Сябры ўраду асталіся, каб запраектаваць працу на бліжэйшы час. Мэтай гуртка было аб'яднаньне горадзенскай беларускай моладзі, галоўным чынам школьнай, самаасьвета і, магчыма, найлепшая сувязь з вёскай. Кіраўніком гуртка быў кс[ёндз] Грынкевіч, што было вельмі важна, бо гурток нелегальны, мог бясьпечна зьбірацца ў свайго кіраўніка, які быў школьным капэлянам.

У бібліятэку на пачатак сябры ахвяравалі "Смык", "Дудку"[6], "Жалейку", ды гадавік "Нашай нівы", а кс[ёндз] Грынкевіч падараваў усе тамы М. Федароўскага[7] "Люд беларускі". Зараз жа было выпісана (за складковыя грошы) крыху кніжак з суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца", а я сьпісалася з віленскай "Беларускай кнігарняй" (Завальная, 7), якая згадзілася прысылаць нам "Нашу ніву", календары і кніжкі на камісію з вялікай зьніжкай. Грошы, атрыманыя з прадажы, ішлі на патрэбы бібліятэкі, а часткова і канцылярыі гуртка.

Сябры гуртка былі абавязаны браць усю літаратуру, едучы дамоў на сьвяты і канікулы, і прадаваць яе на вёсках. Рахункі захаваліся ў мяне дагэтуль. Разьлічаліся за ўзятае акуратна. Некаторыя сябры прадавалі кніжкі, але большасьць раздавала дарма, а плацілі ў бібліятэку з уласнай кішэні.

Зразумела, цікавілася кніжкамі найбольш моладзь. А як рэагавалі? Найлепшы прыклад: вершы з "Дудкі беларускай" Ф. Багушэвіча завучваліся на памяць. Я асабіста ведала двух такіх маладых хлапцоў. Адзін — Болек Бенеш — вывучыў некалькі вершаў, але ўлюбёным быў верш "Хрэсьбіны Мацюка". Як жа часта яго паўтараў! Косіць — а верш гучыць на ўсю сенажаць! Другому — Хвэльку Рэпуху — больш падабаўся верш "Не цурайся мяне, панічок". Трэба дадаць, што мы выпісывалі і "Нашу ніву", і кожны год — 100 календароў-кніжак, якія расходзіліся ўсе да аднаго.

У хуткім часе пачаліся пэрыядычныя лекцыі. Так, напрыклад, на першай лекцыі (20 лютага 1910 г.) пазнаёміліся з граніцамі Беларусі: азначылі на мапе губэрні і паветы, дзе беларусы жылі ў даны час і г.д. На другой лекцыі (10 сакавіка) чыталі народнае апавяданьне "Хітры мужык". Гаварылі аб Ф. Багушэвічу і чыталі яго творы. На трэцяй лекцыі (3 красавіка) заняліся суседзямі-славянамі, чацьвёртая лекцыя (1 мая) была прысьвечаная памяці С. Палуяна[8]: 1) нэкралёг "Памяці С. Палуяна" з "Нашай нівы" прачытаў П. Аляксюк; "Беларусы і іх нацыянальнае адраджэньне" — выступ М. Салянка; "Ня рвіся к багатым" Я. Купалы[9] — дэклямаваў А. Бычкоўскі; "Вясну" Каршуна[10] — П. Аляксюк; "Гэй ты, вецер" — М. Салянко.

Хутка разьехаліся на летнія канікулы, набраўшы з сабой газэтаў і кніжак. Увосені пачалася работа з новай энэргіяй. Прыбывала штораз больш сяброў, пачалі арганізоўваць хор, а хлопцы — струнны аркестр. І надумаліся зрабіць спэктакль. Выбралі п'еску "Па рэвізіі"[11]. Разабралі ролі, пачаліся рэпэтыцыі — у памяшканьні М. і А. Салянкаў на Паліцыйнай вуліцы (пад выглядам імянінаў — усё тая ж нелегальшчына!) зрабілі малую сцэну. Перад спэктаклем А. Бычкоўскі прачытаў рэфэрат аб адраджэньні Беларусі. Гасьцей сабралася

поўна. Сядзелі і стаялі пры сьценах, не было дзе павярнуцца. На гэты спэктакль прыйшлі прадстаўнікі Polskiego koła samokształczenia[12] Сыльвэстар Ваяводзкі (у свой час пасол польскага Сойму) і Мар'ян Янкоўскі (пазьней — віленскі ваявода, з каторым я тут спатыкалася; ён хацяі не паказываў яўна прыхільнасьці да беларусаў, але і ворагам ня быў).

Справа ў тым, што каб увайсьці ў кантакт з польскім гуртком, дзе згрупавалася лепшая паступовая польская моладзь, мы — А. Бычкоўскі і я — уступілі ў польскі гурток, бывалі там на лекцыях літаратуры, на вечарынах, карысталіся іх багатай бібліятэкай, а яны ўзаемна бывалі ў нас. Часам у памяшканьні маёй маткі рабілі сьпеўкі (у нас было піяніна) і вечарынкі.

Адыгралі камэдыю добра. Я была Пантурчыхай, але, хоць першы раз выступала на сцэне, трэмы ня мела, бо была загрыміраваная так, што мяне родная маці не пазнала. Грыміраваў наш сябра — рэжысёр З. Абрамовіч, які пазьней належаў да аб'язднога тэатру Ігната Буйніцкага[13].

На другі дзень, на жаданьне публікі, прыйшлося спэктакль цалкам паўтарыць. Каб быць кансэквэнтнымі і прытрымлівацца мэтаў гуртка, мы на адным з паседжаньняў пастанавілі выехаць з нашым спэктаклем на вёску. Зрабіць гэта было нялёгка. Наступіла зіма. Наладзіць спэктакль у якой-небудзь адрыне (стадоле) немагчыма, а хаты вясковыя цесныя, на гэтакую імпрэзу не надаюцца. Думалі-думалі і нарэшці пастанавілі зьвярнуцца да ўласьнікаў аднаго маёнтку (Крыштапарова пад Новым Дварам Сакольскага павету). І вось паехалі — кс[ёндз] Грынкевіч (каб было паважней), А. Бычкоўскі і я. Падарожа была не зусім прыемная: з Горадні цягнікам да ст[анцыі] Бяляны, а там фурманкай вёрстаў 5. Сьнег, мяцеліца і мароз немалы. Наш старшыня ў вучнёўскім шэрым пальтэчку жартаваў: "Каб ня ўмеў дрыжэць, то б замёрз". Але рэзультаты былі найлепшыя: нам ня толькі далі вялікі пакой, але і абяцалі зрабіць сцэну. І сапраўды, калі мы прыехалі ў назначаны дзень, сцэна была гатовая. Праграма спэктаклю тая самая, што ў Горадні.

На жаль, гледачоў было няшмат. Магчыма, таму, што вёскі Пагараны, Міланкоўцы і Вернікі былі мала знаёмыя, не было належнай агітацыі, ды і надвор'е мала спрыяла. Усё ж такі нейкі пачатак быў зроблены.

Апрача лекцыяў і спэктакляў, ішлі рэпэтыцыі хору і струннага аркестра. Надыйшла вясна. У горадзе не сядзелася, і мы кожную вольную хвіліну праводзілі над Нёманам у Ласосьне, дзе пад шум вады і шчэбет птушак разьвіваўся наш хор.

Карыстаўся хор 1-м спеўнікам А. Грыневіча[14], але найчасьцей пялі песьні, прывезеныя сябрамі з родных вёсак, і такім чынам вырабіўся зусім арыгінальны свой уласны рэпэртуар. Загадчыкам хору быў сябра Янка Ляўковіч з в[ёскі] Біты Камень Сакольскага павету; называлі мы яго мянушкай Капэльдудка.

Хутка, можна сказаць, работа ў гуртку спынілася: экзаміны, канец школьнага году не астаўлялі свабоднага часу. У канцы мая разьехаліся мы на лета.

І вось новы 1910–1911 школьны год. Пасьля адпаведнай агітацыі ў сябры гуртка запісалася шмат новых вучняў з малодшых клясаў — 4-й, 5-й, 6-й, а таксама прынялі ў гурток вучняў 1-й, 2-й і 3-й клясаў. Пры новым складзе гуртка неабходна было падзяліцца на сэкцыі. У старшай сэкцыі былі старыя сябры і крыху новых з апошніх клясаў, якія займаліся самаасьветай, кіраўніцтвам гуртка, а таксама вялі заняткі з сярэдняй сэкцыяй і малодшай. У малодшай дзеці вучыліся чытаць па-беларуску, пісалі дыктоўкі, вучыліся вершаў і г.д., раз у месяц рабіліся для іх вечарынкі з дэклямацыямі, сьпевамі і гульнямі.

Адразу з восені пачалі падгатаўляцца да вечарыны-спэктаклю. Выбралі "Модны шляхцюк" К. Каганца[15]. Пачалі вучыцца роляў — і заварушыўся наш гурток. Рэпэтыцыі, сьпеўкі, рэпэтыцыі аркестру, маляваньне дэкарацыяў запаўнялі ўсе свабодныя ад навукі хвіліны... На гэты раз пастараліся зрабіць куртыну — з блакітнага паркалю з чырвонай аблямоўкай, угары намаляваныя хмаркі, з-за якіх усходзіць залатое сонца. Купілі таксама крыху рэквізыту: бароды, вусы, фарбы. Галоўнай праблемай былі вопраткі.

Але тут знайшоўся выхад зусім просты: якіх вёрстаў 17–18 ад Горадні ў Сакольскім павеце была вёска Бяляны, дзе ў мяне было шмат знаёмых. І вось паехала я туды, пагаварыла, і нам абяцалі пазычыць аўтэнтычныя вясковыя вопраткі — як мужчынскія, так і жаночыя. Апошнія на выбар: даматканыя спадніцы, андаракі, папярэчкі, што мне падабаецца, нават са старых бабуліных скрыняў. Зналі мяне бялянскія сяляне ад малога, так што ахвотна згадзіліся памагчы ў нашым клопаце. Апрача вопратак удалося мне завербаваць музыку-скрыпача Яна Шыдлоўскага, які іграў заўсёды на вясковых вясельлях, вечарынках і г.д.

Калі вярнулася ў Гродна і расказала, як усё ўдалося наладзіць, радасьць сяброў была вялікая. Нарэшці ўсё было гатова. Памяшканьне дасталі добрае: вялікі пакой з сумежным малым на гардэроб. Нашы хлопцы зрабілі сцэну выгодную, нават з суфлёрскай будкай пад сцэнай.

На пару дзён перад спэктаклем я са сваім сцэнічным *бацькам* Язэпам Лявіцкім[16] (я была Ганкай) паехалі ў Бяляны па вопраткі. Набралі два вялікія мяхі ўсяго-ўсякага, аж да ботаў уключна. Прыйшлося пераначаваць, але было не да сну: у Бялянах была тады тайная школа, у якой вучыла дзяцей сяброўка нашага гуртка Марыся Бобрык. Праўда, вучыла па-польску, бо сяляне-католікі ўважалі польскую мову неразлучнай з "польскай верай", але Марыся ўмела паміж іншым прачытаць дзецям беларускую кніжку, верш, сьпяваць з дзецьмі беларускую песню. Вось мы з ёю цэлую ночку перагаварылі.

Раніцай сяляне адвязьлі нас на станцыю, а ў Гродне спаткалі нас на вакзале нашы таварышы і сярод сьмеху, жартаў давалаклі мяшкі да нашага тэатру. У назначаны на спэктакль дзень — каля паловы лютага 1911 г.,— прыехаў і музыка.

Насамперад быў прачытаны рэфэрат на тэму "Адгалосак душы беларускага народу ў яго песьнях, казках і легендах" А. Бычкоўскага. Далей пеў хор, было некалькі дэклямацый. Паміж іншымі дэклямавала мой верш "Што я люблю?" малая дзяўчынка Юзя Грынкевічанка. Тут выйшла сьмешная сцэнка. Я з-за сцэны шапчу ёй: "Юзя, не кажы чый верш", а наш старшыня грозна: "Юзя, скажы абавязкова!", а яна павярнулася да нас і кажа ўголас: "То каго ж з вас я маю слухаць?" — аж публіка засьмяялася. "Модны шляхцюк" выйшаў вельмі добра.

У гэтым вечары прыймалі ўдзел: Л. Сівіцкая (Ганка), Язэп Лявіцкі (бацька), Казюк Калышка (шляхцюк), Вінцук Семяновіч (Ігнась), Янка Ляўковіч[17] (сват), Адольф Зянюк[18] (суфлёр), Адам Бычкоўскі (рэжысёр). Дэклямавалі і належалі да хору: Анна і Марыя Салянкоўны, Юзя Грынкевічанка, Стася Кундоўна, Юзя Кадацкая, Марыся Бобрыкаўна, Фэлька Лабенец, Антон Сьпявак, Эдзюк Кунда і інш.

Публікі было шмат, быў нават адзін вучыцель літаратуры з рэальнай гімназіі — разумны, паступовы чалавек. Але найбольшую радасьць адчувалі мы, бачачы дарагога госьця з Вільні: Іван Луцкевіч[19] на нашы запросіны не адмовіўся прыехаць. Пасьля ў "Нашай ніве" (№ 8 за 1911 г.) зьмясціў карэ-

спандэнцыю: "Я дзіваваўся, гледзячы на артыстаў, як яны ўмелі падгледзець, падсьцерагчы характар вясковых сватаньняў, умелі наладзіць усё так, як яно папраўдзе бывае ў хаце беларусаў". У канцы карэспандэнцыі кажа: "Вынес я ў падзяку за прыемны вечар веру, што горадзенская беларуская моладзь родную справу пасуне ўперад".

На другі дзень прыйшлося спэктакль паўтарыць для вучнёўскай моладзі (малодшай), для якой у першы дзень не хапіла месца.

Аддаючы вопраткі бялянскім сялянам, мы абяцалі, што прыедзем са спэктаклем да іх. У хуткім часе мы мелі тры дні свабодных ад навукі г.зв. "царскія дні". Вось у гэты час мы пастанавілі паехаць. Недалёка ад вёскі Бяляны быў маёнтак горадзенскага архірэя — Дубніца, там мы дасталі ў арандатара меншбольш адпаведнае памяшканьне. Разумеецца, прыйшлося тром нашым сябрам паехаць раней, каб зрабіць сцэну. Я паехала з імі, бо ўся гэтая ваколіца была мне добра знаёмая. Сцэну зрабілі. Пакуль хлопцы працавалі, я абыйшла блізкія вёскі: Бяляны, Хварасьцяны і Стрэльчыкі ды паведаміла жыхарам, калі адбудзецца спэктакль.

У назначаны дзень мы прыехалі цягніком на станцыю Бяляны, а адтуль — пехатой у Дубніцу. На гэты раз была нас немалая грамада: артысты, хор, аркестр. Ізноў вопраткі прыгатавалі нам бялянскія жанчыны, і музыка той самы зьявіўся нават без просьбы. Праграма: рэфэрат асьведамляюча-агітацыйны А. Бычкоўскага, крыху дэклямацыяў (з "Дудкі беларускай", "Смыка"), хор, аркестр і "Модны шляхцюк".

Усё ўдалося добра. Публікі было маса. Цесната такая, што адны другіх на сцэну выпіхалі, выходзячы, сходы паламалі... Ну, але нічога. Арандатар не злаваў, чалавек быў добры і з пачуцьцём гумару.

Позна вечарам, шчыра пажагнаныя здаволенымі сялянамі, мы пайшлі на станцыю. Сьвяціў месяц, пагода была добрая; мы ішлі радасныя, з музыкай і песьнямі. Цягнік быў няхутка, і мы, чакаючы ў пустой у той позьні час пачакальні, пайшлі скакаць "Лявоніху".

Але такая прыемная і вясёлая (а крыху, можа, і карысная) імпрэза ледзь ня скончылася для некаторых з нас вельмі сумна... Справа вось у чым: у арандатара Дубніцы не было адпаведных на сцэну дошак, і ён парадзіў нам пайсьці ў фальварак Малая Дубніца да жыўшага там манаха і ўзяць дошкі адтуль. Дошкі манах даў, але ў хуткім часе, паехаўшы да архірэя, пахваліўся: "А ў нас быў спэктакль, прыяжджала моладзь". Архірэй да губэрнатара: "Каму даваў дазвол?". Губэрнатар, разумеецца, нічога ня ведаў, паслаў у мястэчка Новы Двор паліцыю, тыя таксама нічога ня ведалі; зьвярнуліся на станцыю Бяляны да жандара і начальніка станцыі, і так па нітцы да клубка дайшлі, што прыяжджала моладзь з Гродні. А хто? Уся амаль моладзь не тутэйшая, а ведалі толькі мяне і яшчэ аднаго з так зв[анай] Пушкінскай школы, які паходзіў з в[ёскі] Хварасьцяны. І ён, і я былі ў апошніх клясах, і нас, разумеецца, у найлепшым выпадку выгналі б са школ. Але, на нашае шчасьце, у губэрнатарскай канцылярыі працаваў бацька адной з нашых сябровак. Баючыся, каб і яго дачку не пацягнулі да адказнасьці, пастараўся, каб наша "дзела" прапала...

Ізноў пачалося нармальнае жыцьцё гуртка. Бібліятэка ўсё пашыралася. Перапіска з І. Луцкевічам, В. Ластоўскім[20] і А. Уласавым[21] была сувязяй з віленскімі беларускімі справамі. Наш маленькі гурток чуўся часткай вялікага цэлага...

У гэтым самым школьным годзе ў траўні адбылася ў нас вечарынка, на каторай ГГБМ разьвітаўся з вялікім жалем са сваім арганізатарам і першым старшынём Адамам Бычкоўскім, каторы, скончыўшы гімназію, выяжджаў з Горадні.

Нядоўга пачакаўшы, усе сябры разьехаліся на летні адпачынак. Зьехаўшыся ўвосені, ГГБМ першым чынам мусіў выбраць сабе старшыню; у канцы быў выбраны Казюк Калышка — гімназіст VIII клясы.

Пачаліся, як і раней, сьпеўкі і вербаваньне новых сяброў. У кастрычніку, на імяніны кіраўніка, малодшая сэкцыя гуртка прыгатавала маленькі спэктакль. Дзіцячых сцэнічных твораў у нас не было. На маю просьбу прыслаць што-небудзь В. Ластоўскі прыслаў мне рукапіс "Снатворнага маку" К. Лейкі[22]. Мы зараз перапісалі, а рукапіс адаслалі назад. На жаль, гэты твор нам не падыйшоў: шмат дзеючых асоб, касьцюмы вымагалі б і кошту, і вялікай работы. Тады я пералажыла з польскай мовы сцэнку "Пастушка", і яе паставілі.

Ігралі ў нашым памяшканьні на Гараднічанскай вуліцы. Прывезьлі поўны воз ёлак, кветак і зрабілі сцэну: лясную паляну. Апрача "Пастушкі" былі крыху дэклямацыяў і жывыя вобразы, асьветленыя каляровымі агнямі. Усё выйшла добра, эфэктыўна, дзеці, г.зн. самыя малодшыя нашы сябры, былі вельмі задаволеныя сваёй работай. Зараз пасля гэтага пачалі думаць аб спэктаклі, маючыся паставіць "У зімовы вечар" Э. Ажэшка. Пачалі нават рабіць рэпэтыцыі. Але ж, пераканаўшыся, што сілы заслабыя і добрага выкананьня цяжка спадзявацца, пакінулі думку аб спэктаклі і пастанавілі зрабіць Калядамі ёлку для дзяцей у якой-небудзь вёсцы.

Выбралі вёску Серуцёўцы Сакольскага павету, бо ў той бок мы яшчэ не дабіраліся. Грошай ў касе гуртка было мала, так што мы зрабілі складчыну. Купілі цукерак, пернікаў, арэхаў, яблыкаў. Зрабілі крыху цацак і, узяўшы з сабою вялікую колькасьць газэт, календароў і кніжак, каб раздаць сялянам, паехалі. Ізноў да станцыі Бяляны, а там пехатой. Трэба было ісьці вёрстаў 6 ці 7. Зіма, сьнег, добра, што мароз быў невялікі. Пакуль зайшлі, ужо сьцямнела. Зараз жа гаспадар хаты прынёс ёлку. Прыбралі, запалілі сьвечкі. Дзяцей і дарослых набралася поўная хата. Крыху пагулялі з дзяцьмі каля ёлкі, раздалі дзецям цукеркі і г.д., а дарослым — календары і кніжкі і пачалі зьбірацца на цягнік. Цяпер ужо было лепш, бо запраглі каня і адвязьлі нас на станцыю.

Езьдзіла нас, здаецца, чалавек 6. А ў наступную нядзелю ў парафіяльным касьцёле (у м[ястэчку] Новы Двор) з амбоны пробашч лаяў нас (завочна) за беларускую прапаганду. Толькі бацюшка маўчаў. Мусіць, ня ведаў, што там былі і яго "авечкі".

Хутка пасьля Новага году (1912) наш кіраўнік пад націскам вышэйшых духоўных уладаў адыйшоў ад гуртка і наогул ад беларускіх справаў. Старшыня К. Калышка быў старшынёй толькі з тытулу. Сакратаром у той час быў Ст. Більмін, які аказаўся здраднікам: зьнішчыў усе пратаколы паседжаньняў гуртка ад самага пачатку яго існаваньня.

Працаваць было штораз трудней. Капэлян мужчынскай гімназіі меў на ўвазе тых гімназістаў-католікаў, якія належалі да ГГБМ і гразіў ім, што будуць мець рэлігію па-расейску, а з захаваньня — паменшаныя ацэнкі. Некаторыя малодшыя на жаданьне бацькоў пакінулі гуртсок. Усё гэта адбілася цяжка на настроях нашай старшай моладзі. Хутка, аднак, скінулі з сябе гэтую прыбітасьць і няпэўнасьць і пад кіраўніцтвам сваіх лепшых сілаў з падвойнай энэргіяй узяліся за работу. Праектаў было шмат. Не прапускаючы лекцыяў

з сярэдняй і малодшай сэкцыямі, папаўнялі бібліятэку і тэатральны рэквізыт, чыталі і разьбіралі новыя творы беларускіх пісьменьнікаў, ад часу да часу некаторыя з сяброў прыносілі на лекцыі і свае ўласныя творы. На запускі адбыўся невялікі спэктакль, ставілі "Міхалку" і "Варажбу цыганкі" (пераробка з польскае — мая). Але цеснае памяшканьне і даволі нядбалая распрацоўка зрабілі дрэннае ўражаньне.

Праектаваная выстаўка хатніх вырабаў не наладзілася, хоць гэта было абгаворана з Вільняй. З Вільні Іван Луцкевіч пісаў нам: "Праект добры. Рабіце выстаўку ў сябе (у Горадні), мы тым часам падрыхтуемся тут, і вы са сваімі экспанатамі таксама да нас прыедзеце". Чаму гэта ня зьдзейснілася — ня памятаю.

Затое пачалася энэргічная праца дзеля падрыхтоўкі матэрыялаў для аднаднёўкі. Рэдакцыйная калегія, якая складалася з А. Зенюка, Язэпа Лявіцкага, Л. Сівіцкай, М. Бобрыкаўны і Ф. Лабенца, працавала шчыра і заўзята. Я. Лявіцкі (псэўд[анім] Юрка Снапко) даў пару вершаў, А. Зянюк і М. Бобрык — апавяданьні, таксама з апавяданьнем выступіў Ф. Лабенец, я напісала перадавіцу. Пазычылі шапірограф і позна ўвечары, пазавешываўшы вокны, узяліся за работу. А. Зянюк перапісываў (ён прыгожа пісаў), а Я. Лявіцкі адбіваў. Прасядзелі амаль да раніцы, адбілі 50 экз[эмпляраў]. Назва аднаднёўкі — "Колас беларускай нівы". На вокладцы — загаловак і рысунак каласоў...

Якая радасьць, можна сказаць, шчасьце запанавала ў сэрцах ініцыятараў і рэдактароў, калі ўгледзелі сваю працу. Зьдзейснены праект, вылітыя на паперу думкі ажыцьцявілі неяк і дадалі веры ў свае сілы. Крыху аднаднёўкі прадалі, параздавалі сябрам гуртка, паслалі тым, хто выехаў, і ў мяне астаўся адзін экзэмпляр, і то бракоўны. Вазіла яго з сабой у Варшаву і Менск, ды назад у Гарадзеншчыну, аж тут, у Вільні, на мой вялікі жаль, прапаў...

Увосені 1913 г. я выехала ў Варшаву на курсы. Гурток астаўся пад кіраўніцтвам Адольфа Зенюка. Як ён мне пісаў у Варшаву (лісты маю), прабавалі вясьці сякую-такую працу далей, але гэта нядоўга трывала. Гурток скончыў сваё існаваньне. Бібліятэка і тэатральны рэквізыт, астаўленыя ў Горадні падчас Першай сусьветнай вайны, прапалі.

Мушу ўспомніць незразумелы для мяне факт. Незразумелы, бо ня ведаю, каму і нашто было гісторыю ГГБМ выкрывіць і заблытаць. У часопісе "Крывіч" (№ 1/7, год 1924) на старонцы 64 пад загалоўкам "Горадзенскі беларускі гурток" (ужо сама назва няправільная) — успаміны, аўтар якіх, невядомы мне Ян з-пад Ласосны, піша рэчы, зусім нязгодныя з праўдай. Паміж іншым ён піша: "Адзіным вядомым дакумэнтам тагачаснай дзейнасьці Беларускага гуртка пад духоўным кіраўніцтвам кс[яндза] Грынкевіча, асталася аднаднёўка "Колас нашай нівы" (загаловак няправільны). Далей: "Прадмова, пісаная рукой кіраўніка"... (Для мяне вялікі гонар, што мая прадмова прыпісывалася кс[яндзу] Грынкевічу!)

Нічога падобнага. Кс[ёндз] Грынкевіч ад гуртка адышоў у пачатку 1912 г., значыцца, кіраўніком у час выхаду аднаднёўкі ня быў і аб ёй да часу яе паказаньня ў сьвет нічога ня ведаў. У гэтым самым артыкуле аўтар піша: "У 1913 г. у Горадні група вучняў сярэдніх школ залажыла Беларускі гурток...". У той час, калі ГГБМ быў зарганізаваны ўвосені 1909 г., а ў 1913-м, можна сказаць, дажываў свае апошнія дні. Далей: "Утварыўся гурток, у аснову якога паложана была веравызнаўчая азнака. Гэта адпавядала характару кіраўніка гуртка, які

вызначаўся рэлігійным фанатызмам". І тут аўтар, далікатна кажучы, вельмі памыляецца. Праз увесь час існаваньня ГГБМ ніякія рэлігійныя пытаньні не былі закрануты ні сябрамі, ні кіраўніком. Сябрамі былі як каталікі, так і праваслаўныя (Пушкарэвіч, Дзядзевіч, Сасноўская і інш.), праўда, апошніх менш, чым першых, але ж гэта толькі таму, што яны былі больш зрусыфікаваныя (царкоўныя школы), чым каталікі спалянізаваныя.

Праўда, быў такі факт (з ліста А. Зенюка ад 19.10.1913 г.): "Паклікаў нас да сябе кс[ёндз] Ф. Грынкевіч і радзіў нам зьмяніць крыху статут. Лепш сказаць, дапоўніць. Апрача напрамку самаасьветнага дадаць пункт аб самавыхаваньні. Мы згадзіліся. Адначасова пазнаем нашу мову, вывучаем гісторыю, геаграфію Беларусі, як і раней". Дзе ж тут веравызнаўчая азнака?

Вясной 1914 г. сябры ГГБК разьехаліся па хатах, каб болей у Горадню не вярнуцца. Пачалася вайна і параскідала іх па сьвеце.

НЕКАЛЬКІ БІЯГРАФІЙ СЯБРОЎ ГГБМ

АДВАКАТ АДАМ БЫЧКОЎСКІ

Адзін з арганізатараў і першы старшыня ГГБМ Адам Бычкоўскі паходзіў з фальварку Талочкі ў Сакольшчыне. Яшчэ будучы гімназістам, апрача працы ў гуртку, вёў работу асьведамляючую ў сваёй ваколіцы, што даводзіла да канфліктаў з мясцовымі ворагамі беларускай справы, а нават і з паліцыяй. Паступіўшы ў Пецярбурзе на юрыдычны факультэт, адразу ўзяўся разам з іншымі студэнтамі-беларусамі за арганізацыю гурткоў — і легальных, і нелегальных. Дзейны, энэргічны, шмат часу аддаваў працы грамадзкай. Пачалася вайна. А. Бычкоўскі канчае права. Але дрэнныя матэр'яльныя варункі і справы сямейныя на нейкі час адрываюць яго ад гэтай працы. Пры першай магчымасьці выяжджае на бацькаўшчыну і працуе судзьдзёй у Саколцы. Пасьля ўжо на сталае жыцьцё едзе ў Варшаву. Аб першых гадах яго жыцьця ў Варшаве дакладных вестак німа. Вядома толькі, што стала выпісываў беларускую прэсу і спатыкаўся з беларусамі з Вільні.

У 1935 г. знаёміцца з адвакатам А. Бычкоўскім Пётр Ластаўка[23], які меў намер паклікаць да жыцьця ў Варшаве беларускую арганізацыю. Дзеліцца сваімі праектамі з адв[акатам] А. Бычкоўскім, паказвае яму ўжо гатовы праект статуту. А. Бычкоўскі горача падтрымлівае ініцыятыву. Бярэ на сябе дапрацаваньне статуту. Прымае ўдзел у арганізацыйным сходзе і, паміма працы ў судзе і ў сваім бюро, уваходзіць у арганізацыйны камітэт і ў статутовую камісію. Ён жа складае дакумэнты ў камісарыят ураду Варшавы дзеля зацьвярджэньня статуту Беларускага культурнага т[аварыст]ва. Камісарыят зацьвердзіць статут адмовіўся. Тады адв[акат] А. Бычкоўскі зьвярнуўся да Міністэрства ўнутраных справаў. Працавіты, ахвярны, энэргічны, жыў дзеля грамадзкай працы сярод беларусаў: даваў безінтэрэсоўна парады, выступаў у судах...

Цешыла яго сувязь з беларусамі, якая нагадвала яму працу ў маладых школьных гадах у Горадзенскім гуртку беларускае моладзі. На жаль, не дадзена яму было далей працаваць і цешыцца плёнамі сваёй працы. Нават не дачакаўся зацьверджаньня Беларускага таварыства, аб што так ахвярна стараўся. Памёр раптоўна ў сваім бюро на сэрцавы атак 18 лістапада 1937 г., маючы ўсяго 48 гадоў.

Усе гэтыя апошнія весткі маю ад гр[амадзяніна] П. Ластаўкі.

ЯЗЭП ЛЯВІЦКІ

З-пад Сухаволі Сакольскага павету. Мой сцэнічны *бацька* (з "Моднага шляхцюка"), не адразу знайшоў сваю дарогу. Насамперш пасьля гімназіі пайшоў на біялёгію, правучыўся адзін год, пасьля думаў ісьці ў Лясны інстытут, але зьмяніў намеры яшчэ раз і паступіў на мэдыцыну ў Вайсковую акадэмію ў Петраградзе. Цяжка яму было ўжыцца з горадам.

Пісаў мне: "Людзей тут шмат, але чалавека, то далібог, не знайшоў бы, хоць бы, як Дыёгенас[24], з лучынаю шукаў. Кожны сабой заняты, кожны думае, каб сабе дагадзіць... А пажыўшы паміж такімі "дабрадзеямі", і сам з часам навучышся трымацца іх этыкі, а тады ўжо пішы прапала. Відзела ў вешчых, прарочых вобразах сэрца матулі, што чакае яе сына, і спарадзіла яна яго не магнатам-багачом, а мужыком, а гэтакае мяса нялёгка жуецца... Шмат яго салілі, сьлязамі мачылі, горам-перцам пасыпалі і тады складалі. Вось гэтак я зпажыўся, і места мяне не зламала, а толькі яшчэ болей стаў я яго ненавідзець, а людзей яшчэ больш любіць..."

"Бацька" рвецца на вёску. Не здавальняе яго праца ў студэнцкім гуртку. Ён лічыць, што робіцца ў гуртках — гэта для сябе, дзеля ўласнага здавольненьня... "Каму мы робім добра, што наладзім вечарыну? Каму ад гэтага лягчэй жыць будзе? Праўда, мы вучымся, працуем, каб пасьля сваю веду нясьці ў вёску, дзеля яе карысьці. Толькі маладому трудна чакаць, яму хочацца хутчэй быць там...". Нядоўга гэтак біўся з думкамі.

Трэба заўважыць, што гэта былі настроі не штодзённыя, бо фактычна быў вясёлы, поўны жыцьця. Акадэмію мабілізуюць, студэнтаў гоняць на фронт. Перад гэтым яшчэ піша: "Пытаешся, "дачка", ці пішу? Пішу, толькі па-старому — веры многа, толку мала! Пачнеш штосьці, ды так на паўслове і змоўкнеш. Пасылаю верш, не хвалі, а крытыкуй".

У 1916 г., калі я прыехала ў Петраград, спаткаў мяне на вакзале. Пагаварылі, паўспаміналі мінуўшчыну, Горадню, гурток. У хуткім часе пасьля гэтага быў ужо ў арміі пры лязарэце. Нядоўга там быў: прыйшла вестка — забіты...

АДОЛЬФ ЗЯНЮК

З мястэчка Сухаволя Сакольскага павету. Прыйшоў у ГГБМ будучы ў 3-й клясе гімназіі. Нацыянальную сьвядомасць вынес з роднай хаты. У гуртку прыймаў актыўны ўдзел ва ўсіх яго працах. Раней, як сябра сярэдняй групы, пасьля — старшай, у канцы, калі ўсе старшыя сябры разьехаліся, скончыўшы гімназію, А. [Зянюк] астаўся як кіраўнік і старшыня гуртка. Паміма яго стараньняў гурток не ўтрымаўся. Скончыўшы гімназію, едзе ў Петраград, паступае на юрыдычны факультэт. Дбаючы аб агульным разьвіцьці, ходзіць на лекцыі хіміі і філязофіі. Прыймае сталы ўдзел у працах беларускіх студэнцкіх арганізацый, а таксама ў агульна-грамадзкім беларускім руху.

Ён, як сталы сябра сабраньняў у праф[эсара] Б. Эпімах-Шыпілы[25], у курсе ўсіх петраградзкіх беларускіх падзей, і таму зьяўляецца як бы сувязьзю паміж Петраградам і Менскам. Яго лісты да мяне адбіваюць увесь беларускі рух у Петраградзе, і таму чыталі іх супольна з усімі менскімі беларусамі, якія зьбіраліся ў Беларускай хатцы (Захараўская, 18). І наадварот, мае лісты аб нашай працы ў Менску чыталі на сабраньнях у праф[эсара] Эпімах-Шыпілы.

16.12.1914 г. А. Зянюк чытае рэфэрат “Стасунак беларусаў да іх суседзяў”, які выклікаў дыскусіі, а Б. Тарашкевіч[26] рэфэрат пахваліў, што іншыя сябры ГГБМ спаткалі з вялікім здаваленьнем: наш — з ГГБМ!

У 1916 г. А. Зенюка бяруць у войска, дакладней — у Ваеннае вучылішча ў Кіеве. Скончыўшы, юнкерам пападае ў Перм... Унівэрсітэт канчае ўжо пасьля вайны — у Вільні. Належыць да Беларускага студэнцкага саюзу. У 1925 г. зьяўляецца рэдактарам “Студэнцкай думкі”. Скончыўшы, працуе судзьдзёй, здаецца, на Палесьсі. Памёр рана (у Вільні), у 1938 г., маючы ўсяго каля 44 гадоў.

ЯНКА ЛЯЎКОВІЧ

З вёскі Біты Камень (Сакольшчына). Заўсёды ціхі, скромны, як бы крыху сонны, не зварочваў бы на сябе ўвагі, каб не яго добры голас і вельмі разьвіты слух. Дзеля іх ён зрабіўся кіраўніком нашага гуртковага хору і атрымаў мянушку Капэльдудка. На гэтым становішчы пратрымаўся ад пачатку да канца існаваньня гуртка. Які ён ні быў ціхі, усё ж яго пастанова — скончыўшы гімназію, ісьці ў духоўную каталіцкую сэмінарыю,— вельмі нас зьдзівіла. Але кожны выбірае дарогу, якая для яго найлепшай здаецца.

Ужо ў сэмінарыі цікавіўся дзейнасьцю ГГБМ, і мы з ім не перарывалі кантактаў. Пісаў мне, стараючыся пераслаць ліст праз рукі, абмінаючы цэнзуру. У першым лісьце з Вільні піша: “24 лютага (1913 г.) у нас у сэмінарыі будзе спэктакль. Можа, мне ўдасца дэклямаваць “Град” (беларускі верш). Беларускай камэдыі паставіць не пазволілі. Але ж Бог з імі. Можа, калі-небудзь больш даб’ёмся, а цяпер і з гэтага рады. Ці ведаеце, што выходзіць газэта “Беларус” — рэдактар Антон Бычкоўскі? Можа, гэта наш старшыня? Я выпісаў гэтую газэту для бацькоў”. Рэдактарам “Беларуса” быў Антон Бычкоўскі — першастрэчны брат нашага старшыні Адама.

Калі гурток наладзіў ёлку ў в[ёсцы] Саруцёўцы, мы запрасілі клерыка Янку Ляўковіча і кс[яндза] Хлявінскага з Залесься, каб прыехалі. Але памылкова зададрасаваны ліст у пару не дайшоў, тады Я. Ляўковіч піша мне: “Хоць я з Вамі ня быў і хоць гэта ўжо даўно было, а мне ўсё здаецца, што я паміж сваімі, што чую свае песьні, што цешуся з сваім народам. Прыміце ад мяне і ад нас усіх (клерыкаў-беларусаў) шчырую падзяку за трудную працу для нашай сьвятой справы. Цяпер і мы тутака штось значым: маем свае кніжкі, падчас з намі лічацца, але толькі падчас, бо нядаўна за нашу якраз справу аднаго з нашых выкінулі. Ды гэта нічога. У сьвеце ён больш зробіць добрага, бо тутака цяпер штораз болей прыціскаюць, і мы нічога абсалютна для сваёй справы зрабіць ня можам. А цяпер, калі мы выстаўлены на крыжавы агонь паміж расейцаў і палякаў, праца патрэбная, праца жывым словам, а не на паперы. Ды, з другога боку гледзячы, цешыцца сэрца, калі сьвядомых з кожным днём лік павялічваецца. Я думаю, што калі так далей пойдзе, то нядоўга трэба будзе ждаць свайго часу, калі народ скажа: “Мы не палякі”. Ды аб гэтым мо калі пагаворым”.

З іншых сяброў: Ул. Чаржынскі[27] (увайшоў у самую малодшую сэкцыю) — літаратурны крытык; Янка Чарапук[28] — адвакат; Хіркоўскі — лекар; Я. Жук — лекар; Марыся Бобрык — сястра міласэрдзя, у час Першай сусьветнай вайны адзначалася мэдалямі.

ДЗЕСЯЦЬ МЕСЯЦАЎ У ВАРШАВЕ І ПАЧАТАК ВАЙНЫ

Увосені 1913 г. прыехала я ў Варшаву на курсы. Загадзя бядуючы, што ня маю ў Варшаве нікога знаёмага, а таксама, што буду адарваная ад беларускага руху, я падзялілася гэтымі сваімі думкамі з В. Ластоўскім. Ён зараз жа прыслаў мне адрас Гальяша Леўчыка[1] і студэнта-мэдыка Аркадзя Табэркі. Адначасна напісаў да Леўчыка, так што мне не прыйшлося апошняга шукаць, бо ён сам да мяне прыйшоў і ў хуткім часе пазнаёміў з рэштай беларусаў, якія жылі ў Варшаве.

Былі там: сям'я Сталыгваў (жылі яны ў Ажарове пад Варшавай у сваёй уласнай віле, якую праектаваў і будаваў архітэктар-беларус Лявон Дубейкаўскі[2]; далей — Язэп Гапановіч з Будслава; Пранук Віславух з Палесься; Ванда Карнацкая з Будслава; Людвік Славінскі з Слоніма. Арганізацыі ніякай не было, адно толькі, што спатыкаліся кожны дзень у сталоўцы прыватнай, якую называлі *беларускай* ды часта цэлай кампаніяй езьдзілі ў Ажарова да Сталыгваў. Разумеецца, атрымлівалі з Вільні "Нашу ніву" і кніжкі ды гаварылі па-беларуску.

Да гэтай жа кампаніі належаў Рамуальд Зямкевіч[3]. Гаварыў ён па-беларуску добра, лічыў сябе бібліёграфам, але хто ён быў, скуль — гэтага ніхто ня ведаў. Калі раз, едучы да Сталыгваў, мы ў вагоне пачалі гутарку аб тым, хто скуль, Зямкевіч на маё пытаньне: а вы, п[ане] Зямкевіч? — адказаў: "Мая бацькаўшчына там, дзе мне добра". Усе замоўклі. Што на гэта сказаць? Нясмак астаўся.

Хутка прыйшоў да мяне А. Табэрка — сымпатычны малады студэнт-мэдык з Віцебска. Энтузыяст, жывы, энэргічны, поўны праектаў. Але на мэдыцыне беларусаў амаль не было, і яго стараньні, каб наладзіць беларускую студэнцкую вечарыну, не ўдаліся.

Быў яшчэ адзін студэнт — К. Сініцкі, але з ім я так і не пазнаёмілася. Затое, ня помню ўжо як, спаткалася з вельмі сымпатычнай Марыляй Галубянкай[4]. Яна тады была вучыцелькай у школе. Часта да мяне прыходзіла, і наша прыязнасьць трывала аж да яе раньняй сьмерці ў Празе Чэшскай каля 1940 году, здаецца.

У тым самым часе я неспадзявана атрымала ліст з Пулаваў (Новай Александрыі), падпісаны А. Смолічам[5] і В. Рымкевічам, у якім яны мне дзякуюць за весткі з Варшавы. Я вельмі зьдзівілася, бо ня толькі не пісала, але нават аб іх існаваньні ня ведала. Відаць, нехта з Вільні, найхутчэй В. Ластоўскі, напісаў да іх ад майго імяні. Пасьля перапіскі А. Смоліч і Рымкевіч прыехалі ў Варшаву. Мы пазнаёміліся добра і надоўга.

Усе гэтыя знаёмствы прыемныя, але трэба ж было нешта рабіць больш канкрэтнае, чым гутаркі ды спацыры. Пастанавілі выдаць аднаднёўку і хоць тым змацаваць нашу сувязь. Зьбіраліся, радзілі, гаварылі, ды нічога ня выйшла. Галоўная прычына — безграшоўе. Замала нас было, каб здабыць патрэбную суму складкамі, ды большасьць былі студэнты, якім жылося нялёгка.

Я асабіста часу мела вельмі мала. Курсы, лекцыі, апрача таго — практыка ў агародах далёка за горадам, займалі цэлыя дні. У паветры ўжо адчуваліся подыхі вайны. Арганізаваліся санітарныя курсы. Вось на адныя такія курсы, вячэрнія, я таксама запісалася, што мне пасьля вельмі прыгадзілася.

Сумна было бачыць бязьдзейнасьць групкі варшаўскіх беларусаў, тым больш, што літвіны, галоўным чынам студэнты, патрафілі моцна зарганізавацца і ладзіць прапагандовыя імпрэзы. Паміж іншым, было шмат студэнтаў-літвіноў, з багата выкананай у народным стылі праграмай. На гэтым

балі сабралася ня толькі моладзь, але і шмат старэйшага грамадзянства — як літоўскага, так і польскага.

Горка было. Але я ні цяпер, ні тады не разумела, чаму гэта на мяне асабіста была надзея. Надзея, што я скрану з мейсца драмаючых спакойна беларусаў? Гэта ўсё прыдумываў Ластоўскі. Пісаў мне — такога-то выкарыстайце, прыцягніце, загітуйце... Нават Бабровіч[6], зьмяніўшы кватэру, праслаў мне свой новы адрас — можа, буду патрэбны... А я? Адной маёй заслугай было тое, што ў мяне пазнаёміліся тыя, хто раней ня быў знаёмы. Смоліч і Рымкевіч прыяжджалі ня раз, і я з балькону бачыла здалёк прыкметную пару: Смоліч — даволі высокі і добра збудаваны, з вялікай цёмнай чупрынай, і малы, шчуплы Рымкевіч — з агаленай да скуры галавой. Часьцей Смоліч прыяжджаў адзін. Ён, чытаючы "Балядыну" Ю. Славацкага[7], вырабіў на гэты твор нейкі свой погляд і хацеў праверыць яшчэ сваё ўражаньне ў тэатры. І вось прасіў паведаміць яго, калі будзе ісьці "Балядына". Я паведаміла. Смоліч прыехаў, і мы з ім былі ў тэатры.

Я рада была, што пазнаёмілася з аграномамі, думала, што ў іх знайду таксама сяброў па замілаваньні да прыроды, але крыху расчаравалася, хаця толькі часова і часткова. Смоліч на маё пытаньне, ці любіць сваю прафэсію, адказаў, што любіць настолькі, насколькі яна служыць людзям. Прыроду, праўда, любіў, адчуваў яе хараство і ўмеў вельмі прыгожа, паэтычна апісываць свае ўражаньні. А мне асабіста гэтага было мала. Я любіла прыроду пазнаваць, быць з ёю ў як найбліжэйшым кантакте: гадаваць расьліны, бачыць гэты цуд, як з малюсенькага зярнятка паўстае-вырастае, напрыклад, пышны куст кветак, ды знаёміцца "асабіста" з кожнай расьлінай, якая спатыкаецца ў полі, у лесе, на сенажаці. Тады я ўжо мела сабраныя зельнікі з назовамі ў розных мовах. На жаль, падчас 1-ай вайны яны прапалі.

І вось тут сталася памылка, якую пасьля трудна было паправіць. Неяк так выйшла, што пры спатканьнях з В. Рымкевічам мы ніколі не парушалі нашых адносінаў да прыроды, і толькі ў 1915 годзе, калі Рымкевіч быў у Харкаве, выясьнілася, што ён цікавіцца прыродай з тымі самымі мэтамі, што і я, і зьбірае матэр'ялы да беларускага батанічнага слоўніка. Розьніца была ў тым, што я пачала зьбіраць беларускія назовы расьлін па вёсках ад людзей, а Рымкевіч пачаў з гатовых матэр'ялаў — слоўніка Ластоўскага і г.д. На жаль, нічога не зрабіў, і што з ім самым сталася — невядома.

Але вярнуся да Смоліча. Ён любіў працу арганізацыйную. Стараўся быць у кантакце і з Вільняй, і з Петраградам, прымаць удзел у кожнай працы, якая б дзе ні разьвівалася, напрыклад, у выдаваньні аднаднёвак ("Раніца"), пісаў крытыку на "Сон на кургане"[8] і адначасна "Эканамічныя нарысы" для "Лучынкі"[9]. Энэргія і шырыня запраектаванай працы проста дзівілі. У адным з лістоў да мяне піша: "Трэба прысьпяшыць пашырэньне беларускага руху на Усход. Арганізм толькі тады здаровым будзе, калі ўсе яго часткі роўна будуць працаваць. Уся Магілёўшчына, усходняя Меншчына ды Віцебшчына, урэшці Смаленшчына, Чарнігаўшчына ляжаць незакранутымі абшарамі. Там патрэбная газэта — у Магілёве".

Вясной 1915 г. у Кракаве, куды быў перанесены інстытут з Пулаваў (Новай Александрыі), знайшоў крыху беларусаў, як пісаў, "людзей паважаных, шчырых, сымпатычных", і прачытаў ім рэферат з гісторыі беларускай літаратуры.

Але гэта ўсё было ўжо пасьля 1-ай вайны. А з варшаўскіх часоў мушу яшчэ ўспомніць Гальяша Леўчыка. Як паэт ён нічым асабліва не адзначыўся. Яго

вершы часта былі даволі наіўныя, а рымы нацягнутыя, але пісаў шмат і быў з сябе задаволены. Але як чалавек меў ён шмат плюсаў: вельмі таварыскі, спагадлівы, услужлівы. Гатовы кожнаму памагчы, увайсьці ў палажэньне. Ніколі не шкадаваў свайго часу, калі трэба было яго ахвяраваць ня толькі для нейкай важнай справы, але нават для прыемнасьці. У першыя месяцы быў маім чычэроне па Варшаве. Былі мы з ім на выстаўках, напрыклад, у Захэнце пазнаёміў мяне з М. Федароўскім і г.д. Сам поўны жыцьцёвай энэргіі, лічыў сваім абавязкам быць знаёмым з усімі беларусамі, што прыяжджалі ў Варшаву, і заўсёды быць з імі у кантакце. Разумеецца, заўсёды падтрымліваў адносіны з Вільняй. Працаваў ён тады ў магістраце рысаўнікам (*чертёжником*).

А вось Бабровіча, можна сказаць, я амаль ня знала. Калі ён да мяне прыйшоў, у мяне якраз быў Смоліч. Яны пазнаёміліся, і адразу пачалася вострая палеміка. Бабровіч — радыкал, узгадаваны пад уплывам расейскай культуры, а Смоліч — сацыяліст. І яны ніяк не маглі ня толькі паразумецца, але і зразумець адзін аднаго. Я ў іх гутарку ня ўмешывалася і нават яе ня слухала, бо ў мяне ў наступны дзень быў экзамін з хіміі, і я з галавой увайшла ў работу.

Пасьля мне Смоліч пісаў, што Бабровіч быў у яго ў Пулавах; спрачаліся дзень і ноч і да нічога не дагаварыліся. Паміма таго, завязалася паміж імі прыязьнь. Калі Бабровіча адразу ў пачатку вайны ўзялі у войска, ён прыслаў Смолічу сваю фатаграфію ў форме прапаршчыка і пісаў лісты. Вельмі хутка Бабровіч быў забіты.

Дзесяць месяцаў прайшло. Першага ліпня курсы скончыліся, экзаміны здадзеныя. Атрымала пасьведчаньне, тытул інструктаркі агародніцтва і пчалярства. Можна ехаць дахаты ў Сакольшчыну, у фальварак майго дзеда Альхоўнікі, дзе чакала мяне маці.

Толькі пасьпела прыехаць — пачалася вайна... Работа беларуская заціхла, асабліва ў нашым блізкім краі. Горадня, Вільня — яны так блізка граніцы. Пісалі мне: А. Табэрка, Г. Леўчык, А. Смоліч. Табэрка ў сябе ў м[ястэчку] Астроўна Магілёўскай губэрні працаваў ужо ў шпіталі доктарам — адзін на ўвесь шпіталь, бо другога забралі на вайну. Леўчык дакладна, як заўсёды, апісываў, што з кім сталася, хто ў войску, хто ранены, хто куды выехаў. Разважаньні аб вайне, аб будучыні Беларусі, як заціхне вайна, займалі цэлыя старонкі яго лістоў. Смоліч быў у лепшым ад нас становішчы, вайна ад яго была далёка. Быў тады ён у Харкаве, у Ігумене, а даўжэйшы час — у бацькоў у Саломерычах.

Я ў Альхоўніках займалася агародамі і была ў дзеда практыкантам-пчаляром. Часам спатыкалася з некаторымі сябрамі ГГБМ, напрыклад, з А. Зенюком, Я. Лявіцкім (*бацькам*) і Марысяй Бобрык. Аб якой грамадзкай працы не было чаго і думаць.

Пад канец 1914 г. дзед мой захварэў і ляжаў доўга ў Горадні ў шпіталі, а ў сакавіку 1915 г. мусіў ехаць у Варшаву на апэрацыю (рак). Каб адвязьці і даглядаць свайго бацьку, паехала мая маці. Былі там пару месяцаў. Ах, да чаго ж страшны для мяне быў той час! Ні дня, ні ночы спакойнай, усё адна думка: што будзе, як немцы прыйдуць і нас разлучаць, адрэжуць...

На шчасьце, вярнуліся. Дзед часова паправіўся. Яшчэ перад іх паваротам я, ня маючы чаго рабіць, вучылася прасьці лён, а пасьля і ткаць на кроснах. Нядоўга можна было займацца спакойна такімі работамі, бо водгукі вайны штораз прыбліжаліся. У нас палажэньне было асабліва небясьпеч-

нае: да фартоў было ўсяго чатыры вярсты. Хадзілі чуткі, што нашы Альхоўнікі зьнішчаць, каб не стаялі на дарозе.

Мама і дзед вельмі хвалілі Г. Леўчыка. Ён як даведаўся, што яны ў Варшаве, часта прыходзіў адведаць хворага, а нават замяняў на пару гадзін маму, каб яна магла пахадзіць, дыхнуць сьвежым паветрам і адпачыць.

Ня вельмі прыемным было і тое, што праз наш панадворак праходзіла ваенная стратэгічная дарога, якая злучала тракт паміж м[ястэчкамі] Кузьмінкай і Новым Дваром з аднаго боку, і шашой паміж Аўгустовам і Горадняй.

Тут перапішу некалькі старонак са сваіх запісаў таго часу: "*1 жніўня 1915 г.* Чаму я сягодня якраз пачынаю запісываць свае ўражаньні і здарэньні? Сама ня ведаю... Мо таму, што забытае часткова рэха вайны ізноў мацней адбіваецца ў нашым баку, а нават пануе ў ім, а я мо ўжо апошнія дзянькі жыву ў гэтым доме. Як прыйдзецца дзесьці па сьвеце снавацца, няхай гэтыя ўспаміны прыводзяць на памяць ўсё тое, што воляй-няволяй трэба было пакінуць.

Прыгналі 500 аўстрыякаў. Капаюць акопы каля Зайздры. Сякуць пагаранскі лес, кажуць, што будуць сячы і Крыштапароўскую бярэзіну.

2 жніўня, нядзеля. Нудна і без карысьці прайшоў дзень. Разам з фізычным недамаганьнем напала духовае гультайства. Цэлы дзень чытала якісьці мала варты пераклад з італьянскага "Polacy w Kalabryi"[10]. Газэты прывязьлі толькі ўвечары, так што і пачытаць людзям нашым не было калі. Былі госьці. Рэзультат гутаркі: яшчэ мацнейшае пераконаньне аб малой інтэлігенцыі нашай грашовай арыстакратыі.

Немцы ўжо ў Лапах. Ад нас — 5 станцыяў. Лістоў — ніскуль. Ня пішуць. Сумна.

3 жніўня. Каля вёскі Серуцёўцы засыпаюць зробленые акопы. Немцы ў Лапах.

4 жніўня. Вёска Бяляны перастала існаваць. За будынкі заплаціў урад і спаліў. Жыхары разьехаліся — хто куды змог. У нас, у Альхоўніках, жыве 4 сям'і. Сяляне блізкіх да нас вёсак зьбіраюцца ўцякаць: малоцяць збожжа, бабы мыюць хусьце. Аднак гаруць і сеюць. Для каго?..

5 жніўня. Дзень прайшоў спакойна, не было ніякіх вестак. Успакоеныя нэрвы пазволілі вярнуцца да штодзённай работы. Не магу глядзець на мой гарод: зусім зарос пустазельлем. Сягодня палолі цыбулю. Так усенька добра расьце, аж жаль бярэ, што дарма. Не ўсядзім, напэўна. Пад вечар прыехаў чыноўнік, цаніў каровы, цяляты, сьвіньні, гаспадарскія прылады. Мае прыехаць яшчэ другі — ацэньваць сад і будынкі. Дзядуля жартуе і сьмяецца, але гэта сьмех праз сьлёзы. На старасьць трэба кідаць усю працу цэлага жыцьця: кідаць сад, пасаджаны сваёй рукою, і думаць, што яго ня будзе. Не апісаць і не расказаць аб тым болю, што абыймае душу, гледзячы на дарагія куткі, з якімі трэба расстацца і мо больш не пабачыць.

6 жніўня. Заўтра вывозяць нашы рэчы ў Горадню: мо там ацалеюць. Едзе мама. Вестак — маса з усіх бакоў: пад Зайздраю акопы засыпаюць, капаюць на сыгнале. Немцы пад Беластокам, а мо ўжо і ў ім. Гэтак казаў Янка Чарапук, каторы апошняй машынай з Беластоку ўчора прыехаў. Ці ня думаюць немцы з усіх бакоў акружыць Горадню? Падходзяць ад Беластоку, Аўгустова і Коўна, якое ўчора ўзялі. Нашы адступаюць да фартоў. Ня вельмі добрае перакананьне маюць японцы аб інтэлігенцыі рускіх. Вось аб гэтакім здарэньні расказываў Я. Чарапук. У Саколцы да краўца прыйшоў афіцэр — японец, просячы, каб зрэпараваў ці перарабіў яму мундзір, але

хоць гаварыў чыста па-расейску, кравец ніяк ня мог зразумець, як узяцца за работу. Японец не разгневаўся, толькі пастукаў яго па галаве, кажучы: “Эх ты, русская голова”.

7 жніўня. Немцы ўжо ў Сэйнах. Увайшлі ўночы, цішком; рускага войска не было. Са станцыі Бяляны прыйшла Оля. Кажа, што прыйшла тэлеграма, каб сем’і чыгуначнікаў садзіліся ў вагоны. Вывязуць іх у Пскоў.

Мама з Ромкам езьдзілі ў Горадню. Жыды не бяруць папяровых грошаў. Казначэйства робіць апошнія выплаты — па колькі сотняў тысячаў у дзень. Аднаго дня выдалі гораду дробнай манеты на 30 тысячаў.

8 жніўня. Паміма ўсяго, гаспадарка ідзе па-старому. Сушым грушкі і яблыкі. Дзядуля і Ромак едуць у Кузьніцу. Так выглядае, што Альхоўнікі пакуль што астануцца цэлыя. Будынкаў і саду не ацэньвалі. Мусі, німа ўжо часу гэтым займацца. Немцы ідуць, нічога іх не затрымлівае. Што рабіць? Аставацца мне тут, і тады што? Сядзець у такі час у дзеда, калі гаспадарка нічога ня будзе даваць? Шукаць працы ў Горадні? Адарвацца зусім ад працы грамадзкай? Адна нікуды не паеду, а мама? Як ёй пакінуць бацьку і сястру ў такіх абставінах?.. Нічога ня ведаю... Як цяжка пастанавіць што-небудзь...

(*Нечытэльна — М.С.*) ... Пасажырскія машыны ня ходзяць. Выяжджаючыя з Кусьцінцаў Альбрэхты паехалі фурманкай у Горадню і адтуль у Екацярынаслаўль... Разумеецца, такія весткі зрабілі немалое ўражаньне і прыбілі ўсіх, але на гэты раз аказалася, што гэта былі проста плёткі. Увечары прыехаў дзядуля з Кузьніцы і кажа, што пошта працуе, машыны ходзяць і білеты даюць. А на доказ прывёз мне два лісты: ад А. Смоліча і Г. Леўчыка. Як жа [redacted] ўцешылася! Добрыя, мілыя прыяцелі! Абодва непакояцца, як тут у нас. Пішуць: “Там у Вас самае пекла, што думаеце рабіць? Выяжджайце куды небудзь!”. І праўда, што рабіць?

У Кузьніцы на ўсіх узгорках капаюць акопы, працуе тысяча аўстрыякаў, а каля нас — 700. Абстрэліваюць Беласток. Асавец пакуль што трымаецца. Цікава, што значаць весткі, што Гродна перастае быць крэпасьцю, будзе называцца *полевой защитой*, што нашыя ня маюць ужо амуніцыі і вывозяць з-пад Гродна гарматы? Дождж і дождж, калі ён перастане? Авёс на полі гніе, і мёду выбраць ня можам.

10 жніўня. Мама ляжыць. Мабыць, празябла. Ляжыць таксама дзед Станіслаў. Мае сільны рэўматызм у назе. То каля хворых, то пры гаспадарскай рабоце дзень праляцеў хутка, але нясуджана было спакойна правясьці і вечар. А гадзіне 9-ай прывязьлі ад Курыкоў цялё, бо яны ўжо сядзяць у вагонах, гатовыя кожную мінуту выехаць. Немцы пад Нова-Камянной.

Прыслалі нам праз знаёмых ліст ад мамінага швагра Філіповіча. Пісаны ён быў на Горадню. Філіповіч вельмі-вельмі просіць каб мы з мамай прыехалі да іх у Шыкутовічы (каля Менска, станцыя Койданава). Цёця Марыня выехала, і дзяўчынкі асталіся амаль без апекі, а яны ж малыя. Бедныя сіроткі: матка памёрла даўна, цётка выехала... Гэта, здаецца, добры выхад і для нас. Я рада б апыніцца ў Менску, а ехаць на пэўнае мейсца лягчэй, чым цягнуцца няведама куды і на якую долю.

Мама ня праціў. Так што будзем зьбірацца, бо ўжо апошняя пара. Трэба толькі яшчэ памагчы тут дзеду і цёці схаваць збожжа — сколькі магчыма, і хоць больш цэнную адзежу — зімовыя футры. Думаем зьвярнуцца да ксяндза Хлявінскага ў Залесьсі: схаваць там пад касьцёлам. Паеду я з мамай пага-

варыць, а тады адвязу. З нашых працаўнікоў ужо нікога німа, нават дзяўчаты вярнуліся да сваіх сем'яў, у такі час трэба усім быць разам. Дзядзіна з Ромкам, Юлькам і Маняй заўтра выяжджаюць. Я. Сабалеўскі з імі. Значыцца, як куды ехаць, то трэба мне... вось толькі бяда — запрагаць ня ўмею. Ну, неяк будзе.

11 жніўня. Усё, аказываецца, праўда. Войска адступае, аружжа вывозяць. Дзень і ноч шашою і гасьцінцам ды і праз наш падворак ідуць абозы і вайсковыя часьці. Асавец у руках немцаў, але нашаму войску ўдалося выйсьці, вывязьці аружжа і зьнішчыць за сабою ўсё, што было магчыма. З Кузьніцы пасажырскія машыны ня ходзяць, пошта ў вагонах.

Увечары мы ўсе сядзелі каля стала, пілі гарбату: гутарка ледзь-ледзь плялася, бо грозьба расстаньня вісела над усімі. Але раптам — стук у дзьверы на ганку. Усе спалохана прыслухоўваліся. Дзядуля выйшаў. Аказалася, зьявіўся ад'ютант падходзячай вайсковай часьці папярэдзіць, каб прыгатаваліся прыняць падпалкоўніка і іншых афіцэраў батальёну, і паглядзець, дзе можна паставіць палявыя кухні і войска.

Прыгатавалі вячэру, якую змаглі, і чакалі. Мы з мамай ляглі ў пакоі, суседнім з сталовым пакоем. А гадзіне 3-й уночы войска прыйшло. Падпалкоўнік са сваёй сьвітай усеўся каля стала, пытаецца ад'ютанта: “Ну как хозяин?”. А той: “Что ж, сделал кислую гримасу”. Мама ня выцярпела ды з другога пакою кажа: “Неправда, никто вам кислой мины не показывал, принимаем, чем в такое время возможно”.— “Вот отчаянная!” — нехта з іх кажа... “А чего мне бояться, я говорю правду, а впрочем, военные для меня — свои люди, я вдова капитана 45-го пехотного Азовского полка”. З другого пакою пачулася: “Простите”. Салдаты і палявыя кухні памясьціліся на нашым аграмадным панадворку. Для афіцэраў паставілі палаткі ў садзе.

12 жніўня. Сягодня мы адчулі на ўласнай скуры, што робіцца падчас вайны: з агародаў вынясьлі салдаты ўсё: і цыбулю, і капусту, і маладую моркву, усё дачыста. Агарод вытаптаны, як ток у стадоле. Але гэта яшчэ нічога, горш — зьнішчаны ўсе пчолы! Падпалівалі гнёзды саломай і выдзіралі мёд! Проста думаць страшна. Ну няхай бы вадой залівалі, усё ж пчолы бы аджылі... А то паліць жывое стварэньне... Вось дзе дзіч! За пчолы афіцэры заплацілі, а хто заплаціць за той боль, што адчуў пчаляр?

Забралі ўсіх кароў, асталася адна кульгавая Дама. Забралі маладога каня Сокала... Як мы яго ўсе гадавалі, як любілі... І німа. Выдалі квіты. Цікава, ці калі небудзь заплоцяць. Дзед паехаў у Кузьніцу, а мы з мамай езьдзілі ў Залесьсе. Туды заехалі добра, але назад па вузкай польнай дарозе цяжка было прабіцца праз абозы ўцекачоў. Цэлыя вёскі — ад Янава, Сухаволі, Дубровы — зьняліся з мейсца. Куды яны едуць? Што іх чакае?

Раптам з-паміж фурманак вырваўся самаход! Нашы коні спалохаліся і панясьлі. Удалося мне неяк зьвярнуць на поле, але затрымаць не было сілы, ды і сіла, хіба, не памагла б. Спалоханая мама стала ў брычцы і крычала, гэта, разумеецца, яшчэ больш дзеяла на коней. Я прасіла, угаварывала маму ўспакоіцца, а з другога боку, старалася ўспакоіць коней голасам — яны ж мяне добра ведалі. Не памагала нічога. Тады я накіравала коней на крутую горку, думала — або разаб'емся, або, зачапіўшыся коламі за каменьні, коні стануць. Гэтак і выйшла. Ня даўшы рады зрушыць брычку з мейсца, коні затрымаліся, і мы асталіся цэлыя, толькі вупраж парвалася, а мае рукі былі ў крыві — пакалечыла лейцамі.

Нашу бяду пабачылі здалёк салдаты і беглі на ратунак, але ўжо было па страху; толькі памаглі пазьвязываць вупраж, і мы паехалі. Ну, але з кс[яндзом] Хлявінскім дагаварыліся. Заўтра павязу збожжа.

13 жніўня. З рознымі прыгодамі, позным вечарам заехала я з Казюком Сабалеўскім, 13-летнім хлапчуком, у Залесьсе. Уносіць пацёмку збожжа і іншыя рэчы ў падкасьцельны склеп не было магчымасьці. Звалілі ўсё на касьцёльным панадворку і паехалі дамоў, амаль ня бачачы дарогі — так было цёмна.

14 жніўня. Цэлы дзень парадкавалі рэчы, разьбіраючы, што ўзяць з сабой, што аставіць. Браць прыходзілася самае неабходнае. А ці наагул удасца выехаць? Ці ідуць цягнікі? Усё няпэўнае. Ну пабачым... Заўтра едзем...

15 жніўня. Апошнія часіны... Усё трэба пажагнаць. На душы так цяжка, так балюча... Ці я наагул маю маральнае права вымагаць ад мамы, каб для мяне рабіла такую ахвяру? Пакідала старога бацьку, сястру... Які ж гэта эгаізм! Але старалася. Едзем. Седзячы на брычцы, апошні раз затуманенымі сьлязой вачыма акідаем мілы дом, сад, дарагіх сэрцу людзей... 18-вярстовую дарогу па добрай шашы праехалі даволі хутка. Пад'яжджаем пад вакзал. Ці ідуць цягнікі? Не. Зараз адыходзіць апошні вайсковы. Мама бяжыць да кіраўніка эшалёну, паказвае дакумэнты. Удава капітана — гэтага даволі, нас бяруць. Жагнай, Горадня...

Давязьлі нас да Ліды і — выбірайцеся. Далей цягнік не ідзе. Лідзкі вакзал ды і ўвесь горад (хоць ён маленькі, але горад) залітыя тысячамі ўцекачоў... Людзі ўсюды на вуліцах, на ходніках — ляжаць, сядзяць... Але ўсюды ціха. Усе прыгнечаныя, усе адурманеныя, час ад часу чуваць плач дзяцей...

Далей трэба дабірацца таварнымі цягнікамі... Даехалі да Маладзечна, там прыйшлося доўга-доўга чакаць, пакуль ізноў не ўдалося сесьці на таварны. Што тут доўга гаварыць — з Горадні ў Менск ехалі цэлы тыдзень.

ПРАЦА Ў ТАВАРЫСТВЕ ПОМАЧЫ АХВЯРАМ ВАЙНЫ І ДЗІЦЯЧЫХ ПРЫТУЛКАХ

Нарэшці даехалі... Змучаныя, як зьбітыя, але амаль на месцы. Цягнік з Койданава адыходзіў аж увечары. Я ўгаварыла маму пайсьці ў горад, зайсьці ў беларускую кнігарню, паглядзець, хто там ёсьць. А можа, хто знаёмы? Ідзем. Вуліца Захараўская, 24 — Беларуская кнігарня. Зойдзем? Зойдзем. Адчыняем дзьверы. Збоку каля стала нехта сядзіць — у шынялі... І раптам пазнаю... Галасы зьліваюцца: "Пане Уласаў!" — "Панна Людвіка!" — "Скуль вы тут?" — "А вы?". Першая бязладная гутарка. Пытаньні... Адказы.

Даведаўшыся аб усіх невыгодах нашай падарожы, Уласаў кажа: "Ну, цяпер мы маму ўгаворым легчы адпачыць, а мы з Вамі прыгатуем сёе-тое закусіць і пагаворым". А калі я сказала, што едзем у Шыкутовічы, разлажыў рукі: "І Вы думаеце там сядзець? Ці тут работы німа? У нас кожны беларус на вагу золата!". Гудзіць бас Уласава, а я сьмяюся: "Пане Уласаў, не агітуйце. У стасунку да мяне гэта зусім лішняе. Але як па-вашаму, мне адпачыць трэба?" — "Трэба, зразумела".— "Вось бачыце. Паеду, адпачну і прыеду. Сядзець, злажыўшы рукі ня буду напэўна. А што тут у Вас?.." — "Пісаў мне Смоліч, што адчыніў аддзел Таварыства помачы ахвярам вайны. Німа каму працаваць. Не хапае ініцыятывы..." — "Як жа ж так? А ўцекачы?" — "Ёсьць. Рэгіструе іх польскі камітэт..." — "А мы?" — "Нас — німа".— "Як жа вы гэта дапусьцілі?.." Трудна зразумець, а згадзіцца з гэтым яшчэ трудней.

Увечары едзем далей. Да Койданава блізка, а там фурманкай у Шыкутовічы. Вітаюць нас цёпла. Я ўжо раней знаёмая была з Філіповічам і яго дачушкамі, бо прыяжджала да іх у госьці. Добрае прыгожае памяшканьне, усяго поўна, як кажуць — птушынага малака не хапае, але — цяжкае духовае жыцьцё... Духовая цямніца. Ох, каб хутчэй адсюль выбрацца. Але як? Расстацца з мамай? Гэта немагчыма. Не падабалася мне Меншчына. Цяпер жнівень, у полі работы. У нас у Сакольшчыне, як выйдуць жанчыны ў поле, да жніва ці да сярпа, то аж поле зіхаціць ад рознакалёрных даматканых спадніцаў, а тут усе ў нейкай праціўнай, брудна-шэрай крамніне. Неспадзявана ўсё само сабой наладжваецца. Адгалоскі вайны даходзяць і сюды. Па вёсках неспакойна. Зьяўляюцца дэзерціры. Там абакралі, там падпалілі. Філіповіч кажа: "Не хачу, каб мае дзяўчынкі перыжылі які-небудзь страх. Яны маленькія — адной 6, другой 4 гады. Перажытае можа астацца на цэлае жыцьцё. Я думаю, у горадзе будзе спакайней. Знойдзем добрую кватэру, і забірайце маіх дзяцей у Менск. Буду прыяжджаць — прадукты прывозіць". Так і пастанавілі, з чаго я бязьмерна была рада. Кватэру знайшлі хутка, выгодную, умэбляваную і — мы ў Менску...

На другі дзень пасьля звароту з Шыкутовіч я замальдавалася ва Уласава. Якраз у кнігарні быў Ядвігін Ш[1]. і Ванда [Лявіцкая] [2]. Уласаў нас пазнаёміў. Пасядзелі, пагаварылі і пастанавілі на наступны дзень склікаць пасяджэньне Камітэту. Увечары пасьля працы сышліся амаль усе сябры Камітэту. Былі: Уласаў, Ядвігін Ш., Ванда [Лявіцкая], Галубок[3], Фальскі[4]. Не было Русецкага[5], Астрамовіча[6], Альбэрта Паўловіча[7]. Гэтых я пазнала пазьней. Ой, як я дрэнна чулася! Столькі новых незнаёмых людзей! Я заўсёды была нясьмелая, а тут яшчэ мой дрэнны слых... Ну, але яны ўсе былі такія сымпатычныя, прыхільныя, што я хутка "раскрахмалілася".

Усе сябры працавалі па розных становішчах, і працы ў Камітэце маглі аддаць толькі свой свабодны час. А я была вольная птушка і магла аддацца рабоце суцэльна. На гэтым пасяджэньні пастанавілі, што Камітэт вядзе рэгістрацыю ўцекачоў-беларусаў. Апрача таго, наняць пару памяшканьняў дзе-небудзь на прадмесьцях (каб таньней), на так званыя начлежкі, дзе б можна было памясьціць некалькі сем'яў беларусаў, якія б хацелі астацца ў Менску.

І адразу паднялі пытаньне аб арганізацыі сталовак: адной платнай — таннай і другой — бясплатнай. Тут Ядвігін Ш. выступіў з праектам: адчыніць яшчэ адну бясплатную сталоўку для беларускіх жыдоў, лічачы іх элемэнтам, прыхільным да беларусаў, што можа быць з часам карысным. Крыху пратэставалі, бо гэта быў немалы расход, але нарэшці згадзіліся. А грошы? Аказалася, што ёсьць 500 руб. у старшыні Камітэту адваката Чавусава[8]. Віцэ-старшынёй быў Фальскі, і ён узяўся рабіць стараньні, каб дастаць сталую дапамогу з гэтак званага Тацьцянінскага камітэту (урадавая арганізацыя, якая займалася праблемамі ўцекачоў у Расеі). На гэтым жа пасяджэньні мяне прынялі ў сябры Камітэту і выбралі сакратаром, што было толькі тытулам, бо рабіла я ўсё, што трэба было.

На другі дзень я пайшла да Чавусава. Яго ў Менску не было, меўся прыехаць за тыдзень. Трэба было чакаць. Але мы з Фальскім тым часам шукалі памяшканьняў і на начлежкі, і на сталоўкі. На начлежкі знайшлі дзьве кватэры: адну на Залатой Горцы і другую на вул. Шырокай. На сталоўку платную ўдалося наняць добрае памяшканьне на вул. Маскоўскай. Быў там адзін вялікі пакой, які меў уваход проста з вуліцы, два меншых пакоі і выгодная кухня. На бя-

сплатныя сталоўкі знайшлі дзьве кватэры на Георгіеўскім завулку. У адной з гэтых кватэр жыў пасьля З. Бядуля[9].

Нарэшці прыехаў Чавусаў. Даў грошы. Аплацілі ўсе нанятыя кватэры, і мы з Фальскім заняліся падлічэньнямі: што самае неабходнае з мэбляў, з пасудзіны і г.д. Некалькі дзён, як толькі Фальскі скончыў працу, мы куплялі: талеркі, лыжкі, відэльцы, гаршкі і г.д. Варочаліся з возчыкам з цэлай масай пакункаў. Здаецца, усё. Знайшлі кухарку, далі абвестку ў газэтах, абвестку на дзьвярах сталоўкі... (Пакуль адчынілі адну платную.)

Можна пачынаць. І цяпер выявілася трагічная сытуацыя: не было за што купіць прадуктаў на першы абед. Ні капейкі не асталося... Пайшла я шукаць ратунку ў сваёй маткі. Дала нам мама варыва (прывезьлі з Шыкутовіч) і пазычыла 3 рублі. Купілі мяса, грачаных крупаў і зварылі боршч ды катлеты з грачанай кашай. Усё добра зроблена, смачнае. Сядзім мы з кухаркай п. Судзінскай і бядуем: сталаўнікоў — аніводнага... З камітэцкіх ніхто не паказваецца, усе яшчэ на працы.

Ну што ж, трудна, пачатак заўсёды нялёгкі. А ўсё ж на сэрцы неспакойна. Толькі чую — стукнулі дзьверы! Аж дух заняло. Першы госьць... Падымаю галаву — і сапраўды госьць, ды які — Смоліч! Абое мы ўцешыліся з неспадзяванага спатканьня. "Можна паабедаць?" — "Калі ласка. Будзеце першым сталаўнікам. А рука ў Вас шчасьлівая?" — "Напэўна. Плачу за цэлы месяц наперад".— "Што Вы кажаце? Вось добра, на пару дзён абеды будзе за што рабіць".— "То ў вас аж так дрэнна?" — "Горш быць ня можа... Ну, але ж трэба мець надзею". І сапраўды, справа пайшла. Штодзень сталаўнікоў прыбывала.

У хуткім часе Фальскі выстараўся аб сталую дапамогу ў Тацьцянінскім камітэце[10]. Адчынілі і бясплатныя сталоўкі. Усё, значыцца, у парадку. А прадукты? Новая праблема. Трэба ж некаму хадзіць, шукаць ды купляць. І тут на сцэну выступіў Зьмітрок Бядуля. Ён будзе нашым дастаўнікам. Бядулю я пазнала яшчэ раней, пасьля прыезду ў Менск. Праўду сказаць, першае ўражаньне было нямілае. Я нават казала Вандзе: "Ведаеш, шкадую, што пазнаёмілася з Бядуляй, мне так падабаліся яго творы — і паэзія, і проза, а цяпер не магу сабе неяк уявіць, што гэтыя творы маюць сувязь з яго асобай, што ён іх аўтар".

Але пры бліжэйшым знаёмстве гэтае ўражаньне хутка разьвеялася. Чалавек ён быў просты, шчыры. Душа яго чуткая на ўсё прыгожае, як у прыродзе, так і ў людзях, у іх духовым жыцьці. Адно было дзіўна: працаваў пры сталоўцы, дома з сёстрамі гаварыў па-беларуску, пісаў па-беларуску, але, відаць, ня ўсім беларусам давяраў. Можа, баяўся, што знойдуцца паміж намі людзі, якія аднясуцца да яго непрыхільна? Адным словам, антысэміты... Бо ніколі не прымаў удзелу ў ніякіх паседжаньнях, сходах, зьездах, вечарынах і г.д. Сёстры, асабліва малодшая Чэрня, бывалі ўсюды на людзях, ён — ніколі. З паасобнымі людзьмі: Ядвігіным Ш., Вандай [Лявіцкай], Смолічам, Галубком, Фальскім,— адносіны былі як найлепшыя, але ў грамадзе, у таварыстве, агульна з усімі, яго ніхто ніколі ня бачыў. Праз некалькі месяцаў працы ў сталоўках мы з ім добра пазнаёміліся і зжыліся.

Вось які быў наш дзень працы. Я а 9-й раніцы ўжо была на месцы. Пару гадзін пазьней зьяўляўся Бядуля, прывозіў купленыя прадукты, і мы радзіліся, якіх запасаў нам яшчэ не хапае, што трэба купіць і колькі чаго. Здабываньне прадуктаў у гэты ваенны час было справай нялёгкай, але Бядуля спрытна даваў сабе рады. Заўсёды аставалася крыху часу, каб пагаварыць на іншыя тэмы, чым сталоўкі і прадукты. Часам хто з нас выскажа цікавую думку або прыдумае нейкі забаўны афарызм.

І прыйшло нам у галаву павесіць на сьцяне аркуш белай паперы і кожную такую думку ці афарызм запісваць. Нашы сябры, як даведаліся аб гэтым, то першай справай, прыйшоўшы ў сталоўку, лічылі паглядзець, што ў іх там новага.

Вельмі цяпер шкадую, што я гэтых аркушаў не хавала... Няшмат на гэтыя забавы мела часу. Трэба было ісьці праглядзець, што робіцца ў бясплатных сталоўках, і на гадзіну першую быць ізноў на месцы. Пачынаўся абед: прымала грошы, выдавала квіты, прыходзілі ўцекачы, якія карысталіся бясплатнымі абедамі, і ім давала квіткі ў бясплатныя сталоўкі. Пасьля абеду прыходзілі ўсе тры кухаркі. Я падлічвала квіты, запісвала колькасьць выданых абедаў (на кожную сталоўку — асобная кніжка), выдавала кожнай кухарцы прадукты на наступны дзень, падлічала касу і тады — дамоў. Гэта бывала а гадзіне 10-й увечары. А ўцекачоў прыбывала. Ехалі цэлымі вёскамі. Вуліцы Менска залітыя натоўпамі людзей, фурманак. Гараць вогнішчы, вараць ежу. Плачуць дзеці. Страшна было глядзець, сьціскалася сэрца, сьлёзы затуманьвалі вочы. Куды яны едуць, што іх чакае?

Раз, ідучы па Захараўскай, спаткала я чалавека з Бялянаў, з нашай суседняй вёскі. "Калі вы прыехалі?" — "А ўжо пару дзён мы тут; цэлай вёскай прыехалі: стаім чатыры вярсты за горадам". Гэтага ж самага дня пайшла іх шукаць. Знайшла. Сышліся знаёмыя сяляне, пагаварылі. Зьбіраліся яны ехаць у Курскую губэрню. Затрымалася я каля сям'і Яна Шыдлоўскага. Яны жылі перад выездам у нас у Альхоўніках. Воз высланы сенам, на ім ляжыць маленькі двухгадовы Францусь. Колькі разоў я яго на руках трымала, здаровага, ружовага, а цяпер? Худзенькі, бледны. "Што з ім?" — "А ён ужо тыдзень як хворы. Мы да Менска ехалі тры тыдні, вось у дарозе ён і захварэў".— "Паўлiначка,— кажу я да маткі,— пашкадуйце малога, ня едзьце далей! Аставайцеся ў Менску. Зарэгіструецеся ў Беларускім камітэце, дамо вам кватэру. Паможам знайсьці работу".

Падумалі Шыдлоўскія, парадзіліся паміж сабой і згадзіліся. Зараз жа пажагналіся з суседзямі, сваякамі і паехалі ў горад. Я адразу павяла іх на Залатую Горку, у нашу начлежку. Паклікалі доктара, але нічога ўжо не памагло, праз некалькі дзён Францусь памёр. Асталіся ўтраіх з дачкой — 12-гадовай Стэфаняй. Працаваў Ян з канём, зарабляў. Угаварыў яшчэ адну сям'ю з бялянскіх астацца ў Менску, і так прабылі аж да выезду назад дамоў. Не магу ня ўспомніць аднаго здарэньня, зьвязанага з імі. Неяк рана, чуць сьвет, прыбег хлапец, сусед Шыдлоўскіх. Мы яшчэ спалі. Пастукаў у акно і крыкнуў: "Ян цяжка захварэў". Я схапілася ісьці і па дарозе паклікаць доктара. Мама не хацела мяне адну пускаць. "Возьмем,— кажа,— возчыка, знойдзем доктара, ты паедзеш з ім, а я вярнуся". Так і зрабілі. Але доктара трудна было знайсьці, куды ні прыйдзеш, усе адмаўляюцца. Адзін — сам хворы, другі толькі што вярнуўся з дзяжурства... Нарэшці возчык кажа: "Я знаю аднаго фэльчара, ён не адмовіцца". Аж якраз гэты самы фэльчар ідзе па вуліцы. Пагаварылі з ім, ён згадзіўся ехаць. Паехалі: Ян ляжыць скорчаны, у чорных плямах. Фэльчар глянуў: "Халера, хутчэй у заразны шпіталь. А пакуль што расьцірайце яго шчоткамі".

Я пабегла заявіць у паліцыю. Далі паліцыянта, ён неяк усадзіў хворага на возчыка, на другога я села з Паўлінай, паехалі ў шпіталь. На шчасьце, усё скончылася добра, хворы выздаравеў. Але я лягла. Мама страшна спалохалася, паклікала доктара, аказалася — нічога страшнага: нэрвовы шок. Пралежала цэлы тыдзень. Ванда прыходзіла кожны дзень. Ядвігін Ш. прынёс бутэльку хіновага віна, Фальскі рабіў усю маю работу...

Тым часам нашых прыбывала. Ня помню ўжо, як зьявіўся ў нас новы беларус — Янка Крыўка, віленчук, а ў той час у войску — фэльдфэбель пяхоты. Што да яго беларускасьці, то не такі ён быў вельмі сьведамы. Гаварыў дрэнна, хоць стараўся як мог. Але неяк пацягнула яго да нас, і ўвесь вольны час праводзіў з намі. А чалавек быў цікавы — унівэрсальны. Да яго можна было зварочвацца з рознымі справамі — і дробнымі, і паважнымі, на ўсё знаходзіў раду, у кожным выпадку памагаў. Ці то дастаць мукі для сталоўкі, ці адрамантаваць машынку да пісаньня і г.д. А нам, дзяўчатам, радзіў, як пашыць сукенку, якія купіць пантофлі, і крытыкі яго мы баяліся, як агню. Шмат Крыўка памог сёстрам Бядулі асвоіцца з гарадзкім жыцьцём і яго вымогамі. І Чэрня, і Рэня слухалі яго і ва ўсім радзіліся. Бядуля быў рады — яму ня трэба апекавацца сёстрамі.

У хуткім часе, наколькі помню, па ініцыятыве Крыўкі мы пачалі ладзіць суботнікі, г.зн. у суботнія вечары зьбіраліся ў сталоўцы і сябры Таварыства, і знаёмая моладзь, каб разам правясьці час. Чыталі што-небудзь, найчасьцей гумарыстычныя апавяданьні Ядвігіна Ш. і Альбэрта Паўловіча. Часам хто-небудзь дэклямаваў, а то гулялі "ў пошту" (вымагалася, каб пісалі па-беларуску, у іншай мове калі хто напіша — плаціў штраф).

Пазьней на гэтых самых суботніках Фальскі арганізаваў хор. А з часам, як Галубок прывёў крыху моладзі з дэпо, мелі і сваіх музыкантаў, і можна было патанцаваць лявоніху. На адзін з такіх суботнікаў зьявіўся цікавы госьць: сам Ігнат Буйніцкі! І я мела гонар пратанцаваць з ім лявоніху ў першай пары... Але я гэта забегла далёка наперад.

Час ішоў. Хвалі ўцекачоў адплылі, асталіся толькі тыя, якія далей ехаць ня мелі намеру і стараліся наладзіць сваё жыцьцё тут, у Менску. Адны дабіваліся атрымаць паёк, іншыя, ня хочучы быць жабракамі, шукалі працы. Бясплатныя сталоўкі ўжо не былі так неабходны, тым больш што каса Таварыства была вельмі скромная. Асталася толькі танная сталоўка, і я старалася як магла, каб яна не давала дэфіцыту. Разумеецца, дзейнасьць Таварыства не магла абмежавацца ўтрыманьнем адной сталоўкі. Трэба было пачынаць шырэйшую работу.

На пасяджэньнях Камітэту абдумвалі розныя праекты, але неяк не прыступілі да іх рэалізацыі. Сядзела я ў сталоўцы, як пакутніца. Кожны дзень тое самае. Работа нецікавая і, праўду кажучы, што яна давала ўцекачам? Нічога абсалютна. А яны так патрабавалі апекі, цяпла, спагаданьня. Магчыма, я больш чым іншыя сябры Камітэту спачувала ўцекачам, бо сама была адным з іх. А што мы рабілі, каб сярод уцекачоў пашырыць нацыянальную сьвядомасьць? Нічога... Гэта ўсё псавала настрой і адбірала энэргію.

У адзін з такіх дзён, калі было шэра і на небе, і на душы, прыйшоў у сталоўку новы чалавек. Чалавек з душою паэта і адначасна барацьбіта. Ня помню, хто з нашых камітэцкіх знаёміў нас: "Знаёмцеся, наш беларускі дзеяч і пісьменьнік Фабіян Шантыр[11], па прафэсіі прыватны адвакат". Схарактарызаваць яго трудна. Найлепшую характарыстыку дадуць цытаты з яго лістоў: "Нявідныя сілы, тайны быту зьвязываюць маю душу з усім акружаючым, і на кожны бытавы праяў гэтага акружаючага будзяць у ёй водклік... Ня знае душа мая пакорнасьці, замест пакорнасьці пануе ў ёй бунт... Дух слабее і замірае тады, калі ўнутры яго чуецца спакой, сытнасьць, здаваленьне... Дзеля таго, каб дух панаваў над будзёншчынай быту і ўзнасіўся ўгару да зораў-ідэалаў і крапчаў, дзеля гэтага патрэбны цярпеньне, бо ў іх толькі дух гартуецца, бо яны толькі робяць яго чуткім і трывожным на ўсялякую

праяву жыцьця. А цярпеньне творыць толькі барацьба. Барацьба — гэта векавы пасувач росту чалавечага духу... Вышэйшая сіла над маім духам — гэта ідэя. Ёй я служу ня толькі маім духам, але нават усім сваім бытам".

І гэта не былі пустыя словы. Свае перакананьні пацьвярджаў усім сваім жыцьцём. Хто ён быў? Родам са Слуцка, сын рамесьніка (муляра?). Рана страціў матку. Мачыха — жанчына пустая, занятая сабой, любіла гасьцей, вясельле і не давала пасынку неабходнага дзіцяці цяпла. Рос адзінокі. З дзяцінства любіў кніжкі. Дзе і як вучыўся — ня ведаю. Як ні дзіўна, мы ніколі не гаварылі аб сабе, навуцы, прошлым. Як у лістах, так і ў час спатканьня амаль адзінымі тэмамі былі справы беларускага руху. У час нашага першага знаёмства Фабіян Шантыр быў у войску. Служыў на эвакуацыйным пункце на Палесьсі. Адкуль прыслаў мне надзвычай вобразнае паэтычнае апісаньне Палесься.

Час праходзіў хутка. Вось ужо недалёка Каляды. На пасяджэньні Камітэту нехта прапанаваў, каб зрабіць ёлку для дзяцей зарэгістраваных у нас уцекачоў. Гэтую справу даручылі Вандзе Лявіцкай (дачцэ Ядвігіна Ш.) і мне. Трэба было абдумаць усё так, каб кошт быў невялікі і ўражаньне нязгоршае. Купілі сьвечак, крыху бліскучых цацак і рознакаляровай паперы на цацкі, ланцугі і г.д. Галоўнае было — прыгатаваць салодкія падарункі. Спачатку думалі мы запакаваць цукеркі, яблыкі і г.д. у торбачкі з каляровай паперы. Так было найлягчэй. Але папера парвецца, і сьледу ня будзе. Вось і прыдумалі мы з Вандай работу на сваю галаву. Купілі сьветла-ружовага паркалю, пашылі торбачкі і вышылі на кожнай чырвонымі ніткамі: Менск — 1915 год. Больш 30-ці торбачак вышылі, па начах сядзелі (Ванда піша — 100). На ёлку сабраліся ня толькі дзеці, але і бацькі, а нават і старыя бабулькі прыйшлі паглядзець на такое дзіва.

Пасьля Калядаў — ізноў усё па-старому. Толькі пад вясну сябры Камітэту неяк ажывіліся. Выклікала перамену неабходнасьць пашырыць дзейнасьць Камітэту, чаго дамагліся ўцекачы і жыцьцё. Штораз часьцей прыходзілі жанчыны, якія, маючы дзяцей, не магліісьці працаваць, а патрабавалі заробку, і радзіліся, што ім рабіць. Перабіралі мы розныя праекты і нарэшці пастанавілі купіць лёну, калаўроты і раздаць жадаючым, каб у сябе на кватэрах пралі. Што рабіць з пражай — будзе відаць пазьней. Так і зрабілі. Ядвігін Ш. узяўся купіць лён і калаўроты, і я мела вясьці гэтую работу: раздаваць лён, прымаць пражу, разьлічацца за яе і г.д. У сталоўку ўзялі новую загадчыцу, і я нарэшці магла пакінуць надаеўшую мне работу.

На Захараўскай вуліцы, 18, непадалёку ад Беларускай кнігарні, знаходзіўся арыгінальны драўляны дамок. У памяшканьні — з чатырох пакояў, перадпакою, кухні ды яшчэ бальконы — вялі высокія сходы, крытыя, прыбудаваныя неяк збоку. Належаў дом да магістрату. Камітэт даручыў Ядвігіну Ш. наняць яго. Там цяпер мела я заняцца сваёй новай работай. Жанчыны вельмі ахвотна браліся прасьці лён, прыйшлося яшчэ дакупіць калаўротаў. Пралі хутка, бралі, здавалі пражу, і работы мне хапала. Аж раз прыходзяць тры старэнькія бабулькі: "Ці можна ў Вас узяць лён прасьці?" — пытаюцца.— "Калі ласка. І лён ёсьць, і калаўроты".— "Ой не, мы на колках прасьці ня ўмеем, нам бы верацёны".— "Добра, пастараемся дастаць вам верацёны, прыйдзіце праз тыдзень".

А сама думаю, дзе іх узяць, гэтыя верацёны, хіба замовіць у токара? І адразу да Ядвігіна Ш.: "Пане Лявіцкі, можа, ведаеце дзе якога старога токара, што ўмее верацёны рабіць?" –"А колькі вам іх трэба?" — "Пакуль што тры, але, мусіць, трэба рабіць больш, можа, яшчэ знойдуцца аматаркі". Праз тыдзень ве-

рацёны былі гатовыя, а бабулькі зьявіліся акуратна. Узялі лён, а калі прынясьлі пражу, я дзівам дзівілася: гэтакай пражы яшчэ ніхто не прыносіў: тоненькая, роўная, проста як фабрычныя ніткі. Вось і бабулькі з верацёнамі!..

А колькасьць гараджан расла. Частку яе перадалі Польскаму камітэту. А што рабіць з рэштай? Пастанавілі арганізаваць ткальню. Камітэт дэлегаваў Галубка, Зямкевіча і мяне да старых Русецкіх на Старажоўку — агледзець і наняць у іх памяшканьне. Пайшлі. Дагаварыліся. У Русецкіх было два драўляныя дамкі, добры сад, пчолы. У адным доме яны жылі самі, другі стаяў у той час пусты, і яны аддалі яго ў арэнду Камітэту. Доўга не чакаючы, Ядвігін Ш. недзе знайшоў двое кросен і інструктарку. Паведамілі зарэгістраваным у Камітэце жанчынам, што, калі хто хоча, можна пайсьці ткаць (плата за працу была назначана, якая — ня помню), прычым пад кіраўніцтвам інструктаркі можна навучыцца новых узораў, новай тэхнікі, ды і кросны былі лепшыя, чым вясковыя.

Работа пачалася. Ткалі абрусы, ручнікі, фартушкі з нацыянальнымі каляровымі ўзорамі і з такімі ж самымі ўзорамі мужчынскія кашулі. Жанчын, якія хацелі, было шмат, так што мы запрапанавалі ім праз нейкі час мяняцца. Мне, як крыху знаёмай з ткацтвам, прыйшлося ўзяцца за агульны дагляд, разрахункі і г.д. Амаль ня кожны дзень хадзіла я на Старажоўку. Ні інструктарцы, ні ткачыхам нічога няможна было закінуць у папрок,— работы былі прыгожыя.

Аднаго дня прыйшоўшы да Русецкіх, застала я ў іх незнаёмага. Мяне пазнаёмілі: Флярыян Ждановіч[12]. Ня маючы часу, я праз хвіліну зьбіралася ісьці. Ждановіч сабраўся разам. У дарозе ён паінфармаваў мяне аб сваіх плянах: хоча астацца ў Менску і арганізаваць беларускую трупу. Ці ж магла быць лепшая навіна! Ён пачаў падрабязна знаёміць мяне са сваімі думкамі, але я яго перапыніла: “У гэтай вельмі цікавай справе я Вам нічога дапамагчы не магу. Прыходзьце ў суботу ў Беларускую хатку на суботнік. У нас ёсьць невялікі хор, арганізаваў яго Фальскі. Я пэўная, што сябры хору змогуць быць падставай трупы”.

Ждановіч згадзіўся з маёй прапановай, прыйшоў на суботнік, пазнаёміўся з Фальскім, Галубком і іншымі. У хуткім часе праца ў іх закіпела. Калі не памыляюся, то пачалі распрацоўваць не традыцыйную “Паўлінку”, а “У зімовы вечар” Ажэшкавай.

Тым часам у сталоўцы справы ня клеіліся. Новая загадчыца мала клапацілася абедамі, вышывала, пякла сабе коржыкі. Сталаўнікоў было штораз менш. На паседжаньні Камітэту падняўся перапалох: што рабіць, прападзе сталоўка... Думалі, думалі... Мне варочацца на старое месца ніяк няможна было. Па-першае — ткацтва. Па-другое, было пастаноўлена адчыніць дзіцячы прытулак. Даручылі гэта мне. І тут Уласаў кажа: “А каб папрасіць Вашу маму... Ці згадзілася б?”. Што ж я магла за маму пастанаўляць? “Запытайцеся самі, але ж Вы ведаеце, што пад апекай мамы малыя дзяўчынкі...”.

Задумаліся нашыя камітэцкія. “Чакайце,— ускочыў раптам Ядвігін Ш.— Выхад ёсьць! Маем адчыніць дзіцячы прытулак, патрэбна на гэта памяшканьне. Зробім так: прытулак на Маскоўскай — на месца сталоўкі, сталоўку — сюды, у Беларускую хатку»; тут ёсьць лішні пакой — у гэтым пакоі будзе жыць п. Сівіцкая, панна Людвіка і дзяўчынкі. Добры праект?” Усе згадзіліся, што добры, але галоўнае, што скажа мая мама. Пайшла да мамы дэлегацыя — Ядвігін Ш. і Уласаў.

Як там было — ня ведаю, а мы з Фальскім ізноў пачалі купляць і звозіць для прытулку лыжкі, пасьцель, пасудзіну і г.д. Гаспадыняй аставалася даўнейшая

кухарка Судзінская (а на яе месца ў сталоўку ўзялі новую кухарку). Дапамогу сталую на ўтрыманьне прытулку выстараўся Фальскі у Тацьцянінскім камітэце. Наладзіўшы памяшканьне, пачалі прымаць дзяцей. Прыводзілі дзяцей-сірот або такіх, што згубілі сваіх бацькоў. Былі розных гадоў — і большыя, і меншыя, і зусім малыя — па 3–4 гады. Хлапцы і дзяўчынкі. Брудныя, абарваныя, панурыя. Малыя плакалі. Ой, як цяжка было на іх глядзець! Вымылі іх, апранулі па магчымасьці, добра кармілі. Няшмат іх было — каля 30. Цяжкая была мая доля з імі, асабліва са старэйшымі (былі па гадоў 12, 13) — ніякага паняцьця, што значыцца слухаць! Біліся паміж сабой, хлопцы дакучалі дзяўчынкам. Я не магла цэлы дзень быць з імі, бо і іншай работы хапала, а гаспадыня рады даць не магла, хоць у самой было двое хлопцаў. Але, як заўсёды, дзе бяда, зьяўляўся Янка Крыўка! Жыў недалёка і знаходзіў час, каб па некалькі разоў на дзень заглянуць да дзяцей. Завёў вайсковую дысцыпліну. Падзяліў на групы. Прынёс званок, і ўсё пайшло як па масьле. Як жа я яму была ўдзячная! Мяне, як апякунку прытулку, паставіў на такую вышыню, што і сам (вядома, пры дзецях), і загадчыкі груп, складалі мне рапарт аб усім, што ў маю адсутнасьць здарылася. Быццам гульня, але як гэта памагала і як выхоўвала дзяцей!

І так праца наладзілася. Наладзілася і ў сталоўцы. Абеды былі добрыя, танныя. Сталаўнікоў было штораз больш. Некаторыя, нават было іх нямала, плацілі наперад, каб мець пэўнасьць, што не астануцца без абеду. Пакой быў невялікі, стаяў адзін даўгі стол і тры малыя, на тры асобы кожны. У такіх варунках тварыліся калейкі і стаялі пад сьценамі. Калі Уласаву прыходзілася стаяць у калейцы, ён ішоў у кухню, дзе мая мама накладала порцыі на талеркі, прычым казаў сваім басам: "Я тут у Вас у куточку пачакаю, а там я сваёй асобай займаю шмат месца, іншым цесна".

Былі нават такія сталаўнікі, каторым трэба было варыць асобна: адзін урадавец з хворай вантробай і вэгетарыянец — Лявон Дубейкаўскі. Праз пару месяцаў на пасяджэньні Камітэту, беручы пад увагу, што сталоўка ня толькі аплачывае сябе, але і дае даход, пастанавілі, што ўсе працаўнікі Камітэту плацяць за абеды толькі 10 рублёў у месяц. Як толькі сталоўка перабралася на Захараўскую ў Беларускую хатку, вечарамі пачалі зьбірацца, як быццам у клюбе. Фальскі прыходзіў са сваім хорам на рэпэтыцыі. Невялікі спачатку хор штораз больш разрастаўся. Не вучона, не прафэсіянальна, скромна, па-аматарску, але з цэлага сэрца стараючыся, пяялі: "Рабінка-рабіначка...", "А ў лесе ў гушчары калыхаліс камары...", "Камар лазьню тапіў..." і г.д.

Калі не было рэпэтыцыі, то ўсё роўна Беларуская хатка не пуставала. Прыходзілі Галубок, Фальскі, часам Ядвігін Ш., Крыўка і інш. Гаварылі, гаварылі, гаварылі... Аб чым? Што каму да думкі прыйшло. Не вышуківалі паважных тэмаў. Вось як у сям'і, дзяліліся ўспамінамі, перажытымі падзеямі, праектамі на будучыню... А Галубок ніколі не забываўся узяць з сабой фарбу і маленькі пэндзалёк. Яны ў яго заўсёды былі ў кішэні камізэлькі. Наліваў крышку гарбаты на сподак і падчас гутаркі маляваў цудоўныя, далікатныя пэйзажыкі на канвэртах, на кавалках брыстолю, а то проста на першым лепшым шматку паперы.

Я часта атрымлівала лісты ад Смоліча — то з Харкава, то з Ігуменшчыны, дзе нейкі час працаваў статыстыкам, ад А. Зенюка і М. Галубянкі з Петраграда. У іх лістах было заўсёды шмат цікавага аб грамадзкай працы сярод студэнтаў-беларусаў і г.д. Лісты заўсёды чыталі мы вечарамі сумесна. Таксама часта мела лісты ад Фабіяна Шантыра. Вось у адным з іх ён мне піша: "У маім жыцьці пе-

рамена. Назначаны загадчыкам вайсковага шпіталя ў Бабруйску. Еду на новае месца. Ці ёсьць там якая беларуская арганізацыя, а калі не, то, можа, ведаеце адрасы каго-небудзь з беларусаў? Прышліце".

Ніякіх адрасоў мы ня ведалі, арганізацыі там не было... Але гэта аказалася і непатрэбным. Ужо ў тыдзень пасьля прыезду Ф. Шантыр чытаў лекцыю па-беларуску ў Бабруйскай мужчынскай гімназіі. Пісаў: "Лекцыя прайшла добра, атрымаў поўнае маральнае здаволеньне..."

Ад гэтай пары я пачала жыць падвойным жыцьцём: падзеямі менскімі і бабруйскімі.

У Менску праца ішла хуткімі тэмпамі, хоць і цяжка было яе весьці: зьвязывала рукі безграшоўе. Пачалі раздаваць сябрам Камітэту падпісныя лісты, каб сабранымі ахвярамі хоць крыху папоўніць касу. Рабілі таксама скарбо-начныя зборы. Хадзіць да губэрнатара па дазволы прыходзілася мне. Няшмат гэта давала, але ўсё ж неяк канцы з канцамі вязалі. Пастанавілі дзяцей з нашага прытулку вывезьці ўлетку на вёску. Выбралі месца — Карпілаўку, сядзібу Ядвігіна Ш. Дом там быў вялікі, месца хапала. Блізка каля дому — лес. Значыцца — грыбы, ягады. Гэта і занятак дзецям, і дапамога ў харчаваньні. З дзяцьмі, у ролі апякунак і вучыцелек паехалі Ванда Лявіцкая і Ядзя Раткевіч[13].

Фальскаму ўдалося ў Саюзе гарадоў дастаць для дзяцей прадукты, якія мелі выдаваць кожны тыдзень. Давалі хлеб, саланіну, цукар, кансэрвы, макароны ды крупы. Кожны тыдзень давалі таксама фурманку, каб тыя прадукты адвозіць, а таксама адвозіць новых дзяцей, якіх прыводзілі ў прытулак, каторы так і існаваў на Маскоўскай. Я загадывала прытулкам, але лічылася таксама загадчыцай гэтай калёніі ў Карпілаўцы і езьдзіла туды кожны тыдзень з прадуктамі, дзецьмі і г.д.

У той час прыехаў у Менск вайсковы доктар Кастравіцкі — брат Каганца. Ён арганізаваў для калёніі аптэчку і даў мне шмат цэнных парадаў, як сабе радзіць у выпадку хваробаў у дзяцей. Пры аскладнёных выпадках я зьбірала хворых у Менск і хадзіла з імі да доктара. Гэтыя падарожы забіралі шмат часу і сілы. Каля 30-ці вёрстаў — туды, часта з дзяцьмі на руках, на другі дзень пасьля таго, як спраўджу рахункі, памагу ўладзіць розныя праблемы — язда назад. Варочалася ў Менск а 12-й ночы. Мама заўсёды чакала і непакоілася, але з ёю разам чакаў або Фальскі, або Галубок, а то і абодва разам. Так цягнулася два месяцы.

Наогул усё праходзіла добра, быў толькі адзін прыкры выпадак: 12-гадовы хлопчык уцёк на фронт. Шукалі самі і паліцыя, але не знайшлі. Сказаў ён, адыходзячы, толькі аднаму хлапцу, а той невядома чаму не прызнаваўся, аж праз тыдзень сказаў. Перанэрваваліся мы нямала...

ПЯЦЬ МЕСЯЦАЎ У МЕНСКУ

— У хуткім часе ў Менск прыедзе Максім Багдановіч[1]! — пачулі мы голас Аркадзя Смоліча, які ўвайшоў у сталоўку Беларускай хаткі, трымаючы ў руках ліст. Усе прысутныя заварушыліся, пасыпаліся пытаньні: — Калі? Надоўга? Што ён піша? — Максім Багдановіч піша, што хоча пажыць у Менску, у сваім родным горадзе, дыхнуць паветрам Бацькаўшчыны, пачуць жывую беларускую мову. Просіць паклапаціцца аб працы для яго, а калі канкрэтна прыедзе, яшчэ напіша або папярэдзіць тэлеграмай.

Нас ахапіла і радасьць, і трывога. Радасьць, што пазнаем нашага дарагога паэта, і трывога за яго здароўе, яго жыцьцё... Як доўга ён з намі пабудзе? Было гэта недзе ў палове верасьня 1916 г.

У Беларускай хатцы на Захараўскай вуліцы, 18 — сталоўцы Таварыства помачы ахвярам вайны — кожны вечар зьбіраліся як сябры, так і працаўнікі Камітэту таварыства, каб разам скаратаць вольны вечар, падзяліцца думкамі ды ўражаньнямі пражытага дня.

Цяпер вестка аб прыезьдзе М. Багдановіча дала новую тэму для гутарак і адначасова новыя абавязкі. Трэба было падумаць загадзя, дзе ён будзе жыць. Перабіраючы розныя магчымасьці, затрымаліся на тым, што найлепш будзе наняць пакой у Бядулі.

Зьм[ітрок] Бядуля з сёстрамі Рэняй і Чэрняй жыў на маленькай ціхай вуліцы Малой Георгіеўскай у доме Рэдзькі. Дамок стаяў у глыбіні панадворка, за домам быў садок, студня. Ціха, спакой, добрае паветра. Кватэра (там больш ніхто ня жыў) мела тры пакоі: два займаў Зьм. Бядуля з сёстрамі, а трэці — вялікі, сьветлы, з асобным уваходам — цалкам стаяў пусты. (У гэтым пакоі я пасьля жыла некалькі месяцаў са сваёй маці.)

З Бядуляй хутка дагаварыліся. Ён быў рады мець пад сваёй страхой такога госьця.

Нарэшці ў канцы верасьня ці мо ў пачатку кастрычніка М. Багдановіч прыехаў. Спаткаў яго А. Смоліч і прывёў у Беларускую хатку, дзе мы цэлай грамадой чакалі яго з нецярплівасьцю.

Сардэчны, скромны і просты М. Багдановіч адразу заваяваў агульную сымпатыю. Ужо ў канцы вечара здавалася, што ён даўно з намі, што ўсім блізкі і дарагі. Тым больш трывожылі яго бледнасьць і бліскучыя ад гарачкі вочы. Кашляў зусім мала.

Пасьля гарбаты сядзелі нядоўга. Трэба было змучанаму дарогай адпачыць. На кватэру адвялі Багдановіча Смоліч, Галубок і Фальскі.

Дагаварыліся, што Багдановіч будзе сталавацца, як і мы ўсе, у сталоўцы, але будзе тут мець і сьнеданьні, і вячэры.

Мая маці ў той час была загадчыцай сталоўкі, і мы жылі тут на месцы. Так што мы з Багдановічам бачыліся па тры разы на дзень, а вечары, як заўсёды, праводзілі разам з цэлай нашай грамадкай: М. Багдановіч, Фальскі, Смоліч, часта Ядвігін Ш., Галубок, я...

Праз пару дзён выявілася, што Максім вельмі мала дбае аб сваім здароўі. Найчасьцей забываўся прыняць лякарствы, не прыносіў іх з сабой. Як кожны такі хворы, не любіў, каб яму прыпаміналі аб лякарствах, а тым самым аб хваробе. Тады ўмяшалася мая маці. Угаварыла яго аддаць ёй усе лякарствы і сама яму іх давала ў адпаведны час. Новыя дозы хто-небудзь з нас прыносіў з аптэкі, так што ён не патрабаваў аб сваім лячэньні думаць і клапаціцца. Ня толькі да лячэньня, але наогул да ўсіх спраў, што датычылі яго самога, адносіўся дзіўна абыякава.

Адразу ў першы вечар зьдзівіла нас просьба Багдановіча ня класьці яму ў гарбату цукру... На пытаньне, можа, ня любіць салодкага, адказаў: “Ня ў тым справа, але з цукрам ня п’ю”. Дарма стараліся пераканаць, што гэта нездарова, што цукар яму неабходны... Не і не. Раз нехта, ня помню хто, цішком перамяніў шклянку, і гарбата аказалася салодкай. Як жа ён разгневаўся, разнэрваваўся! Ледзь удалося супакоіць і перапрасіць.

Праз пару дзён пасьля гэтага, калі мы сьнедалі толькі ўдваіх, я запыталася: "Скажыце шчыра, чаму так упіраецеся пры сваёй пастанове, нашто вы сабе шкодзіце?" — "Бачыце,— кажа,— вельмі перажываю тое, што я бясьсільны памагчы тым, хто цяпер, падчас вайны, церпіць голад, асабліва шкадую дзяцей. Калі я сабе адмаўляю ў тым, што люблю (бо, прызнацца, люблю салодкую гарбату), мне здаецца, што я раблю нейкую ахвяру, і гэта мяне хоць крыху пацяшае..."

— Выбачайце,— кажу,— але фактычна ваша ахвяра нічога дзецям не дае.— А гэта пабачым,— неяк загадкава адказаў. І сапраўды, праз нейкіх тры месяцы пабачылі. М. Багдановіч працаваў у магістраце ў аддзеле харчаваньня. Там працаўнікам, апрача платы, выдавалі паёк — пераважна цукар. І вось у адзін дзень раніцай, пасьля сьнеданьня, выходзячы на працу, Максім просіць маю маму, каб дала яму чыстую пошыўку. Увечары сабраліся і дзівіліся, што так доўга німа Максіма. Ёп прыйшоў позна і прынёс на плячах паўпуду цукру! Аддаў яго мне (я была паміж іншымі абавязкамі сакратаркай Камітэту) і кажа: "Гэта для дзяцей уцекачоў". Усе былі ўзрушаныя, але зрабілі вымоўку за тое, што сам нёс, а не паклікаў каго-небудзь, каб памаглі...

М. Багдановіч не прапускаў таксама вечарынак-суботнікаў, слухаў дэклямацыі, сьпевы. Улюбёнай яго песьняй была "Рабіна, рабіначка...".

Неяк у канцы кастрычніка прыехала да мяне з фронту мэдсястра, мая сяброўка з Горадзенскага гуртка беларускай моладзі Марыся Бобрык. Прыехала на адзін дзень і ўвечары позна выяжджала. Я сабралася яе правесьці на вакзал. Мы ўжо выходзілі, як падышоў да мяне Максім і пытаецца: "Можна мне з вамі?" — "Разумеецца, калі ласка". Вуліцы былі пустыя, нідзе нікога. Ня ведаю, чаму мы ішлі не па тратуары, а пасярод вуліцы. Мы з сяброўкай успаміналі Горадню, наша там жыцьцё, працу ў гуртку. Багдановіч з зацікаўленьнем слухаў, заўважыўшы, што жыў у Горадні, як быў маленькі, і што там пахавана яго маці.

Варочаліся зноў пасярэдзіне вуліцы памаленьку, не сьпяшаючыся. І тады Максім пачаў гаварыць аб сабе... "Я ўжо пагадзіўся са сваёй хваробай і з тым, што жыць асталося няшмат, але вельмі мне цяжка, што не магу мець сям'і. Я так люблю дзяцей. Ведаеце, калі я пачаў пісаць і друкаваць вершы, на жаль, не ў сваёй мове, а па-руску, бо я гадаваўся ў рускім асяродзьдзі, як ні горка да гэтага прызнацца, а напісаў калыханку і аддаў яе ў друк, падпісаўшы псэўданімам. Усе, хто яе чытаў, думалі, што гэтую калыханку напісала жанчына, і то жанчына-маці. У гэты твор я ўлажыў усё сваё пачуцьцё".

Пасьля наша гутарка перайшла на Менск і ўражаньні ад усяго тут пазнанага і пабачанага. М. Багдановіч, паводле яго слоў, чуўся паміж намі добра, як у сям'і. "Маю толькі адно прыкрае перажываньне, якое адбірае мне спакой. Можа, вы чулі, што я ўжо даўжэйшы час перапісываўся з адной асобай з Менску (назавём яе N.). Завязалася лістоўная прыязьнь, шчырасьць. Вось, прыехаўшы і пазнаёміўшыся асабіста, уся мая прыязьнь да яе разьвеялася. Не магу ёй адказаць тым самым, не магу... і гэта так мучыць! Раблю чалавеку прыкрасьць... Ці ж гэта можа не балець?". Як я пераканалася ў далейшым, чуласьць Максіма на чужую крыўду была выключнай.

Час праходзіў. Камітэт Таварыства помачы ахвярам вайны вёў барацьбу з безграшоўем. Асабліва балюча было тое, што т.зв. Тацьцянінскі камітэт адмовіў нам субсыдыі на ўтрыманьне дзіцячага прытулку і запрапанаваў забраць наш прытулак пад сваю непасрэдную апеку. Мы прымушаны былі

згадзіцца. Але паставілі варунак, што нашы дзеці будуць вучыцца асобна — па-беларуску, і вучыць іх будуць нашы вучыцелькі: Ванда Лявіцкая — дачка Ядвігіна Ш., і яе памочніца Ядзя Раткевіч. Наш прытулак на лета быў вывезены ў Карпілаўку (уласнасьць Ядвігіна Ш.), і трэба было адтуль перавозіць яго ў Ратамку. Прыйшлося мне ехаць памагчы перавозіць дзяцей. Мушу зазначыць, што ўсё лета апекаваліся дзяцьмі тыя ж Ванда Лявіцкая і Ядзя Раткевіч.

Дні ўжо былі кароткія, холад, а ехаць трэба было фурманкай вёрст 30. Падарожа ня вельмі мілая. Сядзелі мы гэтак у сталоўцы ў поўным складзе і гаварылі аб гэтай паездцы. Была пятніца, ехаць я мела ў суботу. Раптам М. Багдановіч кажа: "І я паеду". Мы ўсе ахнулі: "Што вы кажаце! У такі холад.30 вёрстаў. І ня думайце!". Зазлаваў на нас Максім: "Што я — маленькі? Волі сваёй мець не магу? Сказаў — паеду, і паеду! Не забараніце".

Зноў пасыпаліся пратэсты. Адзін Галубок маўчаў, думаў нешта сваё. Калі ж пачалася сапраўдная сварка, Галубок абазваўся: "Ціха, ша! Успакойцеся! Я пайду і хутка вярнуся, тады пабачым".

Не было Галубка з гадзіну. Нарэшці — крокі на сходках, адчыняюцца дзьверы, уваходзіць Галубок з аграмадным кажухом! Кажухом, якія насілі вартаўнікі ў дэпо. "Маеце, дзядзька Максім, паедзеце". Усе абступілі Галубка, дзякуючы за такое ўладжаньне справы.

На другі дзень паехалі. Было ўжо цёмна. Выехалі за горад на тракт. Грукат сьціх. Пачалі мы гутарку. Парушылі розныя тэмы і дайшлі да паэзіі, да яе формаў. Максім у той час цікавіўся японскай паэзіяй, а менавіта вельмі папулярнымі кароценькімі чатырох-шасьцірадковымі вершамі. І тут ён мне кажа: "А вы паспрабуйце, у вас гэта выйдзе". Я толькі засьмяялася. Дзе мне пры маё такой празаічнай і клапатлівай працы з бежанцамі думаць аб паэзіі. Мы замоўклі...

Раптам нашу ўвагу зьвярнула нейкая незвычайная чырвань на небе. Пад'ехалі далей на ўзгорак, глядзім — пажар. Гарыць вёска. Далёка ад тракту, але і так былі відаць слупы агню, якія падымаліся аж да хмар. "Які жудасны абраз! А колькі там гора людзкога, колькі сьлёз",— кажа Максім. Далей ехалі моўчкі. Прыехалі на месца позна. Пераначаваўшы, Максім вярнуўся ў Менск. Я асталася.

Прытулкі Тацьцянінскага камітэту ў Ратамцы мелася наведаць сястра Льва Талстога. Ладзілі спэктакль-вечарынку. Наша школа мела выступіць са сваёй асобнай праграмай у беларускіх нацыянальных вопратках. Паставілі сцэнічны абразок "Пастушка", у дадатак былі дэклямацыі, хор. З Менска сабраліся і мы: М. Багдановіч, А. Смоліч, сёстры Бядулі (яны прыгожа сьпявалі) і я. Дагэтуль стаіць у маіх вачах Максім: у белай вышыванай кашулі, падпяразаны прыгожым паяском, вясёлы. Умяшаўся ў хор... Здавалася, і ён будзе сьпяваць...

Скончылася ўсё позна, цягніка ўжо не было, і прыйшлося прасядзець ноч, бо спаць не было дзе. Школа беларускіх дзяцей зьмяшчалася ў летнім драўляным дамку — дачы. Вучыцелькі мелі там маленькі пакойчык з жалезнай печкай, а клясы не апальваліся. Мы сабраліся ў маленькім пакоі — Ванда Лявіцкая, Ядзя Раткевіч, Бядулянкі (гэтак мы называлі сёстраў Зьм[ітрака] Бядулі) і я. А М. Багдановіч астаўся сядзець у халоднай клясе. Як мы ні прасілі, нічога не памагала. "Там і так цесна",— кажа. На працягу ночы я разы тры хадзіла намаўляць яго, каб не рызыкаваў, надумаўся... "Мы не зьбіраемся спаць, сядзім, гаворым — ідзём!" — "Не,— кажа Максім,— я рызыкую сваім здароўем,

але ня буду рызыкаваць вашым, мая хвароба заразьлівая. Вы ж гэта ведаеце".

Прыйшла зіма. Сьнег, марозы. Калі пасьля марозу прыходзіла адліга, чырвоныя цэглы новага касьцёла пакрываліся срабрыстай шэраньню, і гэта было цудоўна, як у казцы. На работу пасьля сьнеданьня мы з Багдановічам выходзілі разам і адразу пераходзілі на другі бок вуліцы, каб ісьці каля касьцёла (ён знаходзіўся амаль супраць Беларускай хаткі, крыху наўскос) і нацешыцца яго выглядам. Багдановіча няможна было адарваць, да таго быў захоплены. А стаяць на холадзе і вільгаці для яго было забойствам. Сказаць, што гэта для яго шкодна, нельга, вось і прыходзілася нешта прыдумваць або сьпяшацца на работу, або — што мне зімна...

Надыходзіў Новы год — 1917... Пастанавілі спатыкаць яго ў Беларускай хатцы ўсёй грамадой. Наладзіць усё і выслаць запросіны даручылі Багдановічу, Смолічу і мне. Пішучы запросіны, мы задумаліся: запрашаць Р. Зямкевіча ці не? Справа ў тым, што на другі дзень пасьля вечарыны у Ратамцы я і Смоліч атрымалі лісты ад Зямкевіча. Ён у самым грубым тоне лаяў мяне. Я зараз жа паказала лісты Багдановічу і Смолічу; яны сядзелі у другім пакоі і другі ліст чыталі разам. Аддаючы ім свой ліст, я кажу: "Пакажыце свой". Смоліч адказаў адным словам: "Не!" і схаваў ліст у кішэнь. Што там было, ніколі я не даведалася, але, відаць, нешта аба мне, бо чаму ж яны мне не паказалі? Думалі мы думалі і нарэшці дайшлі да пераканання, што калі мы гаспадары імпрэзы, а Зямкевіч нас абразіў, то маем маральнае права яго не запрашаць... Так і зрабілі.

Прайшоў вечар перад Новым годам, і вось тады я яшчэ раз пераканалася ў надзвычайнай чуткасьці і імпульсыўнасьці Максіма. Госьці ўжо пачалі зьбірацца, я яшчэ была ў сваім пакоі. Раптам, нават не пастукаўшы, убягае Максім, за ім Смоліч. Максім бледны, узбураны: "Панна Людвіка, прыйшоў Зямкевіч". Відаць, зразумеўшы, якое гэтая вестка зрабіла на мяне ўражаньне, Максім кінуўся да дзьвярэй... Мы са Смолічам не пасьпелі зарыентавацца, што ён хоча зрабіць. А Максім адразу: "Пане Зямкевіч, хто вас сюды прасіў?" Разумецца, госьці, якія ні аб чым ня ведалі, абурыліся. Смоліч усё ім растлумачыў, і госьці супакоіліся. Мушу дадаць, што Зямкевіч застаўся, але праз увесь вечар ніхто з ім не загаварыў.

Сабраліся ўсе, хто толькі ў той час быў у Менску. Прыйшлі: Ядвігін Ш., Альбэрт Паўловіч з дачкой Уладзяй і зяцем Ю. Фарботкам[2], ксёндз Гадлеўскі[3], Ф. Шантыр (прыехаў з Бабруйска), Ус. Фальскі, У. Галубок, адвакат Чавусаў, Л. Заяц[4], В. Лявіцкая, А. Уласаў, архітэктар Л. Дубейкаўскі, Я. Крыўка, мая маці Э. Сівіцкая... Пачатковая непрыемнасьць разьвеялася, настрой быў мілы, і ўсе былі рады з гэтай імпрэзы.

Далей усё ішло па-ранейшаму, толькі, на жаль, Багдановіч чуўся слабейшым. Калі ў сталоўцы ўсё заціхала, усе разыходзіліся, ён аставаўся і дапозна сядзеў у бюро Камітэту. Гэта быў невялікі пакой з бальконам. Знаходзіўся ён паміж сталовым пакоем, дзе мы з мамай жылі. Там стаяў стол і глыбокі, мяккі фатэль. У гэтым фатэлі сядзеў Максім доўгія гадзіны — пацёмку. Я ня раз прапанавала запаліць лямпу, але не хацеў. "Мне так тут добра",— казаў. Мо якраз тады ён складаў свае апошнія вершы?

Мяркуючы па тым, што пісаў аб Багдановічу Барыс Мікуліч[5] ("Выбранае" 1959 г.), выглядае, што Максім апрача Бядулі і яго сястры Рэні, ні з кім не спатыкаўся і ні з кім не сябраваў. Відаць, абапіраючца на гэтую кніжку і аўтары беластоцкай "Нівы", калі пішуць: "Максіма Багдановіча лучыла сар-

дэчная прыязьнь з З. Бядуляй". Гэта зусім праўдзе не адпавядае. Сёстры Бядулі панічна баяліся, каб не заразіцца, так што кантактаў паміж пamяшканьнямі амаль не было. І ў чым магла выявіцца гэтая прыязьнь і калі? Багдановіч прыходзіў у свой пакой позна і рана выходзіў? Нешта ня вяжацца...

Прадчуваліся ўжо блізкі канец вайны і зьмены, якія могуць наступіць у жыцьці народаў. Мы часта гаварылі аб тым, што, можа, хутка дачакаемся сваіх беларускіх школ, а падручнікаў да навукі німа. Лемантары сякія-такія былі, а вось чытанкі пасьля лемантара німа. Смоліч запрапанаваў узяцца за апрацоўку такой чытанкі-хрэстаматыі. Складаць яе мы мелі ўтраіх: М. Багдановіч, А. Смоліч і я. Насамперш распрацавалі плян. Мела кніжка дзяліцца на 4 часткі: 1 — вясна, 2 — лета, 3 — восень, 4 — зіма. Трэба было падбіраць матэрыялы. М. Багдановіч меў заняцца паэзіяй — падбіраць адпаведныя вершы з беларускай літаратуры, рабіць пераклады і пісаць іх самому.

Шмат вечароў прасядзелі мы ў сталоўцы ў позьнія гадзіны, калі нашы штодзённыя вячэрнія госьці расходзіліся. Кожны з нас ужо пакрысе напісаў, але далей ужо супольна працаваць не прыйшлося. Надыходзіла вясна, дажджы, вільгаць. Максім чуўся горш. Тэмпэратура падымалася... Трэба было яму зьмяніць клімат. Пастанавілі на супольных нарадах, што паедзе ў Ялту. Здабылі грошы, прыгатавалі што трэба на дарогу, і ў канцы лютага наступілі ад'езьдзіны. Мы ўсе хацелі правесьці яго на цягнік, але Максім запратэставаў: "Разьвітаемся тут, у Беларускай хатцы. Мне будзе цяжэй разьвітвацца з вамі ўсімі пры натоўпе чужых людзей". Жагналі мы яго са сьлязамі на вачах, як бы прадчувалі, што жагнаем яго назаўсёды. Маці мая абняла яго і пацалавала галаву. Мне ён сказаў: "Я вам напішу". Не напісаў. Можа, не хапіла сілы... а можа, і напісаў, а чужыя людзі не парупіліся выслаць? Хто ведае?

Але калі прыйшла вестка аб яго сьмерці, такой цяжкай, у адзіноце, мы не маглі сабе дараваць зробленай памылкі. Нашто было выпраўляць яго, не парадзіўшыся з доктарам, ня маючы пэўнасьці, што гэта яму дапаможа. Як недарэчна... Трэба было запэўніць тут на месцы больш выгоды, больш сардэчнай апекі. Сьмерць, на жаль, яго не мінула б, але няхай бы паміраў паміж нас, паміж сваіх, адданых яму шчыра прыяцеляў, у роднай старонцы. Ён жа гэтага сам хацеў... сам пісаў: "Ня будзеш цяжкаю ты сыну / свайму, зямля. / Там хоць у гліне, хоць у брудзе, / там пад зямлёй, / найдуць мае слабыя грудзі / сабе спакой...". А можа, згадзіўся ехаць, маючы крыху надзеі, што яшчэ падлечыцца і вернецца? Хто ведае?..

Прайшло паўвека, а ўспаміны аб гэтых пяці месяцах усё жывыя. З тых дзён мне асталася адна памятка — маленькая карталюшка з гульні "ў пошту" на адным з суботнікаў. Максім напісаў: "Сягодня пачуў, як Ваша мама сказала: "бедная мая дзяўчынка". Увесь вечар думаю аб гэтым і да нічога не магу дадумацца. Жывём як чужыя". З гэтых слоў відаць, як ён уяўляў сабе сужыцьцё беларусаў, прынамсі, нашай менскай групы: усе павінны быць роднымі, усе — адна сям'я.

ПАДАРОЖА Ў ПЕЦЯРБУРГ І МЕНСКАЯ БАТЛЕЙКА

Ня хочучы перабіваць успаміны аб М. Багдановічу, [redacted] прапусьціла дзьве падзеі з часу перад Новым годам. Першая — мая падарожа у Пецярбург, а другое — батлейка.

Мы слалі і слалі лісты у Пецярбург, і да Л. Родзевіча[1], і да Іваноўскага[2], каб яны там на месцы рабілі стараньні аб дзяржаўнай дапамозе нашаму Таварыству помачы ахвярам вайны. Пецярбургскія беларускія дзеячы для свайго толькі што адчыненага аддзелу такую дапамогу атрымалі. Апрача таго, атрымалі 5000 руб. ад літоўцаў, [redacted] мы ў Менску біліся, як рыбы аб лёд... На нашыя лісты не адклікаліся.

Тады Камітэт пастанавіў дэлегаваць у Пецярбург мяне, каб там на мейсцы паглядзець, у чым справа і па магчымасьці дабіцца нейкага канкрэтнага адказу. Паехала [redacted] туды ў кастрычніку. Была ў Л. Родзевіча, бачылася з Іваноўскім, але без рэзультату. Прасядзела я там пару тыдняў. Спачатку жыла ў Сталыгваў, але, ня хочучы злоўжываць іх гасьціннасьцю, перабралася ў нядаўна адчынены інтэрнат Таварыства помачы ахвярам вайны. Не падабаўся мне ён. Не было добрай адміністрацыі — балаган. У інтэрнаце — і моладзь, і школьныя дзеці. Апекі — ніякай, так 12-гадовы хлопец (паміж іншым, брат нашага гродзенскага сябра з гуртка А. Зенюка) аднойчы са школы ў інтэрнат не вярнуўся, начаваў у горадзе. І ніхто гэтым не пацікавіўся, німа — і німа. На другі дзень прыйшоў. Я пытаюся: дзе ты быў. "Я начаваў у п. Марысі Галубянкі" (гэта была мая знаёмая з Варшавы). "А ў школе сягодня быў?" — "Не".— "Зьбірайся,— кажу,— паедзем да п. Марысі, пабачым".

У Пецярбургу я пазнаёмілася з прафэсарам Эпімахам-Шыпілам, але ў Менск вярнулася ні з нічым. Мушу яшчэ дадаць, што да пецярбургскага аддзелу таварыства была гутарка аб праекце новага таварыства "Заранка", якое мела б выдаваць школьныя падручнікі і папулярныя брашуры. Адразу з Пецярбургу я напісала аб гэтым Ф. Шантыру. Прыехаўшы ў Менск, атрымала адказ. Вельмі крытычна аднёсься Ф.Ш. да пецярбургскага праекту. Пісаў: "Ідэя варта сьмеху! Гурток людзей маніцца выдаваць падручнікі тады, калі німа каму і каго вучыць. Народ беларускі зруйнаваны і расьцярушаны па ўсім абшары сьвету. Выдаваць падручнікі і брашуры, калі німа ніякага культурнага нацыянальнага жыцьця, калі праца для прабуджэньня беларускага народу да уласнага жыцьця для многіх яшчэ ўсё — модная забаўка... Для нас цяпер, як і ў пачатку нацыянальнага руху, найпершай і найважнейшай патрэбай ёсьць збудаваньне сталага фундамэнту нашага нацыянальнага жыцьця — г.зн. прабуджэньне і пакліканьне да нацыянальнай працы вялікай колькасьці інтэлігентных працаўнікоў, якія б разнясьлі ідэю беларускага нацыянальнага адраджэньня ва ўсе канцы нашай Бацькашчыны і ўвялі б яе практычна у прыватнае жыцьцё..."

Чытала я гэты ліст і разважала: не згадзіцца з ягоывадамі немагчыма. Але з другога боку? Добра, гэтыя працаўнікі пойдуць у народ, але народ наш у сваёй масе цёмны. Трэба адчыняць яму вочы на ўсебаковыя зьявы жыцьця, а калі так, то ў якой мове даць яму кніжку, брашуру, у якой мове адказаць на тыя пытаньні, якія ставіць перад чалавекам само жыцьцё? Адказ адзін: беларускія падручнікі і папулярныя брашуры патрэбныя. Прыгатаваць іх загадзя ня шкодзіць, тым больш, што кніжка — ня булка, у адзін дзень не сьпячэш... Да гэтай тэмы мы з Ф. Ш[антырам] яшчэ ня раз варочаліся і ня раз сварыліся.

Па вяртаньні з Пецярбургу, у адну з суботаў у Беларускай хатцы гутарка неяк зайшла аб фальклёры розных народаў. Што найбольш ведама аб беларускім фальклёры? Песьні, казкі, легенды, прыказкі, загадкі, вопратка, тканіны... А му-

зыкальныя інструмэнты? Цымбалы! А хто іх бачыў, хто чуў? Нехта прыпомніў: а што мы ведаем аб старадаўніх беларускіх батлейках?

Я цікавілася батлейкай яшчэ ў сябе ў Сакольшчыне. Доўга шукала яе сьлядоў, нарэшці знайшла у адной вёсцы, на мяжы з Сувальшчынай. Паехала. Але ўжо ні батлейшчыка, ні батлейкі не застала, а дачка батлейшчыка, старая ўжо жанчына, тэкст крыху прыпомніла, але дыктавала мне яго напалову па-польску... У Беларускай хатцы мы падумалі: а што каб пашукаць батлейку і цымбалы ды ў Менску дэманстраваць іх?

Хто заняўся пошукамі, хто знайшоў — ніяк не магу прыпомніць... Адно толькі помню, што у Беларускай кнігарні пазавешвалі полкі з кніжкамі даматканымі просьцінамі, у вакне зрабілі адпаведную дэкарацыю і дзён дзесяць штодзень за малую плату дэманстравалі публіцы нашую старасьветчыну. Не скажу, каб публікі зьбіралася шмат, ды і адносіны былі розныя... Як заўжды, у лістах да А. Смоліча я знаёміла яго з усім тым, што мы рабілі у Менску, а значыцца, пісала і аб батлейцы. У адказ Смоліч пісаў: "Добра, усё добра..." Затое ліст з Бабруйска! Ах, што за ліст — крытыка вострая, неміласэрная... Ф. Шантыр пісаў: "Я хачу адарваць вас ад ролі, каторая даводзіць ледзь не да шыцьця сукенак для балванчыкаў батлейкі". Мяне ахаплялі абурэньне і злосьць! Помню добра мой адказ: "Глупа, глупа і яшчэ раз глупа! Крытыка — рэч добрая і патрэбная; кожны мае права мець свае погляды і выказваць іх. Але крытыкаваць трэба рэальныя факты, разумеючы і дакладна ведаючы іх, а не як у той прыказцы: чуць звон, ды ня ведаць, дзе ён... Трэба было раней запытацца, выясьніць, мець весткі з першых рук, а не ад інфарматараў ды яшчэ інтрыгантаў (Р. Зямкевіч). Адкажу коратка па парадку закідаў.

За духовыя і артыстычныя вартасьці батлейкі адказываем ня мы, а нашы пра-пра-прадзеды, бо гэта іх твор, іх спробы, як бы пачаткі тэатру лялек. Гэтакія ж батлейкі маюць і палякі і гэтай часткі свайго старадаўняга фальклёру зусім не саромеюцца. І наш, прывезены ў Менск стары дзядок са сваёй яшчэ старэйшай батлейкай нічым нашай Бацькаўшчыны не прынізіў... А цымбаліст, можа, апошні у нашай старонцы, ня выклікаў вашага абурэньня? Ці аб ім вам не далажылі?". Гэтакі прыблізна быў мой адказ. І мушу зазначыць, што пасьля далейшых выясьненьняў пры спатканьні Ф. Шантыр ад многіх сваіх закідаў адрокся.

МЕНСКІЯ ЗЬЕЗДЫ

Надышоў час, калі неабходна было пачынаць работу шырэйшую, праводзіць палітычную падгатоўку, а гэта рабіць пад фірмай Т[аварыст]ва помачы ахвярам вайны было немагчыма. І вось сябры Таварыства супольна з новымі зьехаўшыміся беларусамі — Лявонам Зайцам, П. Алексюком, Я. Варонкам[1] і др.— стварылі часовы Беларускі нацыянальны камітэт. Што ён рабіў? Канкрэтнага нічога. Паседжаньні, гутаркі, нарады, спрэчкі... Успамінаць, апісваць німа чаго. Гэта ўсім вядома і ўсяляк асьветлена. Цяпер чытаю закіды: бывалі там Р. Скірмунт[2] і княгіня Радзівіліха[3]. Так, бывалі. Але каб Беларускі нацыянальны камітэт браў ад іх грошы, дапамогі, ахвяры і тым самым ставіў сябе у залежнасьць ад іх — такога не было. Гэта было б проста здрадай сваёй справы. Так, цікавіліся, прыходзілі — няхай сабе.

Хоць гэта здарылася шмат пазьней, пасьля Вайсковага зьезду[4], але мушу тут успомніць адзін факт. У Беларускай вайсковай радзе быў адзін паручнік,

здаецца, Альховік. Вось ён захацеў скарыстаць зацікаўленьне беларушчынай Радзівіліхі. Пайшоў да яе і атрымаў у падарунак — лякераваныя боцікі! За гэта яго судзілі таварыскім судом і з Вайсковай рады выкінулі...

Грошы Нацыянальны камітэт меў толькі са складак, падпісных лістоў (маю запісы, колькі які падпісны ліст даў) і скарбоначных збораў. Па дазвол на апошнія часьценька прыходзілася мне хадзіць да губэрнатара. У сувязі з скарбоначным зборам не магу ня ўспомніць маёй спрэчкі з арганізатарамі: быў назначаны сход арганізацыйнай групы. Я крыху спазьнілася. Падыходжу, сябры сходу хваляцца: а мы ўжо адозву і плякат апрацавалі. Прашу — пакажыце. Пачынаю чытаць, і маё зьдзіўленьне і абурэньне ня мае граніц. І адозва, і плякат (чарнавікі) — па-расейску! Я не сказала ні слова, устала і зьбіраюся выйсьці... “Што вы, куды?” — “Выбачайце,— кажу,— я, відавочна, не туды прыйшла. У нас мела сабрацца група беларусаў, а не расейцаў!” Пачалі тлумачыць, што мала хто па-беларуску разумее і г.д.— “Калі так,— кажу,— то рабіце ў дзьвюх мовах, а то і ў трох, бо шмат ёсьць палякаў! Саромна мне з вамі працаваць...”. Зрабілі і адозвы, і плякаты ў трох мовах.

Часовы Нац[ыянальны] камітэт склікаў Зьезд 25 сакавіка 1917 г. Зьезд адбыўся ў тэатры, і цяпер стаіць перад вачыма заля, перапоўненая ня толькі дэлегатамі, але і зацікаўленай публікай. Стаіць перад вачамі склад-выгляд натоўпу: сьвіткі, сярмягі, салдацкія шынялі...

Дзе нашы ворагі бачылі “буржуазію”? Скірмунт ім мазоліў вочы? А мы яго і не заўважылі нават, мы бачылі салдат, сялян. Максім Гарэцкі, які стаяў побач мяне у лёжы, казаў: “Бачыце, наша вёска, наш народ тут — яны падаюць голас, прачнуліся”. Няхай сабе Круталевіч[5], апіраючыся на афіцыяльныя матэрыялы, дыскрэдытуе зьезд, гэта ня зьменіць таго, што сапраўды было. Прыкладаю тут пратакол Зьезду беларускіх нацыянальных арганізацыяў 25–27 сакавіка 1917 году.

ПРАТАКОЛ ЗЬЕЗДУ БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ 25–27 САКАВІКА 1917 Г.

На зьезд сабралася ўсяго да 150 удзельнікаў. На старшыню сходу быў выбраны доктар Кастравіцкі, яго таварышамі — Метлін[6] і юрыст Аляксюк. За сакратароў выбралі Л. Зайца і Б. Тарашкевіча. Зьезд адкрыўся у 7 гадзін вечара.

Таварыш старшыні П. Аляксюк прачытаў прыветныя тэлеграмы ад розных арганізацый і прыяцеляў беларусаў: Радзевіча, Сталыгвы і Сьвілана з Петраграду, ад жаночага бел[арускага] гуртка ў Петраградзе, ад бел[арускага] ксяндза Будзькі[7], ад Мануіла Булгака з Магілёва, ад беларускага артыста Абрамовіча, ад палякаў Пінскага павету, ад харкаўскіх беларусаў, ад беларусаў 38-га ваенна-дарожнага атраду.

Старшыня Камітэту “Прапаганды асноваў новага грамадзянскага строю доктар Марзон шчыра прывітаў першы нацыянальны зьезд беларусаў і прызваў яго да супольнай і згоднай работы. Па парадку віталі зьезд і дэлегаты розных арганізацый і гурткоў: ад гуртка магілёўскіх беларусаў і пэдагогаў — Кахановіч[8], ад петраградзкіх студэнтаў — студэнт Каравайчык[9], ад петраградзкіх беларусаў-чыноўнікаў почты і тэлеграфу — А. Адамовіч[10], ад палякаў Аршанскага павету — Гардзялкоўскі, ад рады рабочых і салдацкіх дэпутатаў Петраграда — Жылуновіч[11].

Таварыш старшыні Менскага Камітэту помачы ахвярам вайны У. Фальскі далажыў кароткі агляд працы беларускага Камітэту, каторы дужа ў дрэнных варунках пры старым урадзе, ня маючы грошай, павінен быў закрываць адну за другой адчыненыя установы. Можна было думаць, што рабоце Камітэту прыходзіць канец. Але ўзышло сонца свабоды, і беларусы падняліся, устанавілі часовы Нацыянальны камітэт, каторы арганізоўваў сярод мяшчан і сялян мітынгі, знаёміў вёску з тым, што дзеецца ў Расіі, прылучаў да сябе прадстаўнікоў ад сялян і мяшчан, зробіў збор на вольны беларускі друк у Менску і Бабруйску, склікаў гэты зьезд і разаслаў павесткі на сялянскі зьезд на 4 сакавіка гэтага году.

Даклад аб рабоце петраградзкіх беларусаў зрабіў Э. Будзька. Беларускі Камітэт помачы ахвярам вайны ў Петраградзе закладаў бурсы для моладзі беларускай, залажыў швальню і падаваў помач бежанцам грашыма, вопраткай і работай. Петраградзкія беларусы ўзяліся арганізаваць салдат, работнікаў і студэнцкую моладзь.

У сваёй прамове П. Аляксюк абрысаваў колішнюю сьветнасьць Беларусі, як яе мову шанавалі пры князёўскіх дварах, як гэта мова была ўрадавая, як пасьля злы лёс загнаў яе ў курныя хаты, скуль яна, здавалася, ня выйдзе на сьвет Божы. Але вось сьвятлейшыя сыны Бацькаўшчыны пачалі будзіць дух народны, але да 1905 году мала знаходзілі водгуку. Прыйшоў і гэты крывавы год. Няма-ла крыві пралілося за народную волю і лепшую долю Бацькаўшчыны, і толькі цяпер сонца свабоды узышло над Бацькаўшчынай, цяпер толькі сьветлыя яго праменьні далятуць ва ўсе цёмныя куткі. Шчасьце ў нашых руках, і калі цяпер мы яго не здалеем узяць, то каб не было пасьля запозна.

Ад імені Беларускай сацыялістычнай грамады выступіў з дэкларацыяй А. Смоліч. Беларуская грамада бароніць клясавыя інтарэсы беларускага сялянства і наогул працоўнай беднаты, бароніць яго нацыянальную душу, бо жыцьцё кожнага народу і яго шлях да найвышэйшых мэтаў павінен ісьці цераз нацыянальнае самапазнаньне.

З дэкларацыяй ад Каталіцкай дэмакратычнай партыі выступіў ксёндз Гадлеўскі. Мэтай партыі ёсьць перш-наперш дабро народу, каторага яна кліча да праўдзівай хрысьціянскай міласьці. Партыя будзе клікаць да згоднага жыцьця з праваслаўнымі братамі-беларусамі. Партыя будзе памагаць народу ў яго штодзённай справе, у зямельнай і кожнай рабоце. Партыя хоча падняць прасьветай культурнае жыцьцё працоўных. Але каб народ быў моцны, ён павінен мець усё сваё: школу, мову, культуру, аўтаномію.

Ад народнай Дэмакратычнай партыі выступіў Р. Зямкевіч з дэкларацыяй, што партыя найгалоўнейшай сваёй мэтай ставіць прасьвету цёмнага народу. Пасьля ўсіх дэкларацый выступіў член ад рады рабочых дэпутатаў Кузьміцкі, прызываючы пацешыць тых, хто гніе ў акопах, прыветнай тэлеграмай і паказаць гэтым, што пойдзем разам з імі.

Усе дужа ахвотна прынялі прапанову і пастанавілі, апрача таго, пасьлаць прыветныя тэлеграмы Часоваму Ураду, Радзе рабочых і салдацкіх дэпутатаў, нацыянальным арганізацыям: украінцам, літвінам і другім. Метлін выступіў з прамовай, што цяпер ня час падымаць нацыянальнае пытаньне, а трэба ўмацаваць атрыманую свабоду, злучыўшыся разам з усімі для скліканьня *Учредительного Собрания*. Па яго разуменьню, наш рух нацыянальны не натуральны, бо пад ім німа цьвёрдага фундамэнту народных нізоў.

Ад сэрца адказаў яму Л. Заяц, што мы хочам умацаваць атрыманую свабоду ня менш за другіх, што мы будзем згодна працаваць з Часовым Урадам, але сказаў, што такая вялікая дзяржава, як Расея, ня можа стойка ўтрымацца, калі ня дасьць аўтаноміі народам, каторыя ў ёй жывуць. Праціўніку беларускага руху Метліну німа чаго баяцца, што ў ім німа моцнага фундамэнту, бо большасьць тут сабраўшыхся, хоць і не падобны да простых мужыкоў па вопратцы, але выйшлі з нізоў народных, з курных хат, і каму, калі ня ім, бараніць беларускую справу.

З. Жылуновіч, адказываючы Метліну, даводзіў, што свабода тады дарагая, калі народ сваімі сіламі яе здабыў.

Дэлегат ад кіеўскіх беларусаў І. Краскоўскі[12] з вялікім жарам заклікаў зьезд ня слухаць людзей, што прывыклі баяцца "страшных" слоў: свабодная нацыя, фэдэралізм і т.д. Настала часіна, калі нам гэтага баяцца ня трэба, бо народы вольныя ў сваім разьвіцьці і ідуць да вялікай будучыні, да агульналюдзкіх ідэалаў і злучэньня. У нацыі і толькі свабоднай нацыі — сіла.

А. Смоліч заклікаў да рэальнай працы. Перш-наперш нам трэба нацыянальную школу, каб не былі ні палякамі, ні расейцамі. Каб лепей распрацаваць школьнае пытаньне, трэба выбраць школьную камісію з прадстаўнікоў зьезду. Каб вырашыць справу выданьня ў найбліжэйшым часе беларускай газэты, трэба выбраць камісію па друку.

Адвакат Чавусаў даводзіў, што беларусы ўжо вырасьлі і дастойны свайго нацыянальнага самапазнаньня.

Стары сацыяліст А. Бурбіс[13] занадта горача накінуўся на тых, каторыя кажуць, што цяпер ня час займацца нацыянальнымі справамі; яго яшчэ гарачэй падтрымаў П. Аляксюк, сказаўшы: таварыш старшыні Метлін — велікарус, ён не павінен быў згадзіцца заняць адказнае крэсла таварыша старшыні нашага першага свабоднага зьезду, на каторым выказаў думку, што цяжкім каменем тамавала нашы душы. Зразумейце ж вы, чужынцы, нашы перажываньні ў гэты момант. Пасьля гэтага Метлін, убачыўшы, што ён уносіць у зьезд пэўны дысананс, злажыў з сябе паўнамоцтвы і пакінуў зьезд разам са сваімі староньнікамі.

Быў аб'яўлены перарыў, пасьля каторага былі выбраны камісіі, каб прыгатаваць матэрыялы на другі дзень.

Камісія агітацыйна-палітычная: сакратар — Бурбіс, сябры — Кахановіч, Жылуновіч, Аляксюк, Адамовіч, Парэчын, Станкевіч[14], Вайткевіч, Скірмунт, Шарэйка і Заяц.

Арганізацыйная: да яе апроч увайшоўшых у першую прылучыліся з сакратаром Алексюком Смоліч, Лянкоўскі, Багдановіч, Будзька.

Этнаграфічная: сакратар — Тарашкевіч, сябры — Краскоўскі, Будзька, Зямкевіч, Сівіцкая, Жывіца, Лявіцкая, Мядзёлка[15], Лянкоўскі, Смоліч, Кодзіс, Парэчын, Станкевіч, Кастравіцкі.

Фінансавая: сакратар — Будзька, сябры — Фальскі, Скірмунт, Буйніцкі.

Друку: сакратар — Жылуновіч, сябры — Зямкевіч, Парэчын, Станкевіч, Мядзёлка, Купала, Галубок, Лявіцкая, Лявіцкі.

Земская: сакратар — Стаўпольскі, сябры — Заяц, Кастравіцкі, Лявіцкі, Шарэйка і Будзька.

ПРАТАКОЛ ДРУГОГА ДНЯ ЗЬЕЗДУ

У прэзыдыюм былі выбраныя Р. Скірмунт, П. Аляксюк і А. Смоліч. Ад петраградзкіх народнікаў прывітаў зьезд Дубейкаўскі, жадаючы яму карысьці ў гэтай вялікай працы. К. Душэўскі ад імя моладзі петраградзкіх вышэйшых школ таксама шчыра вітаў зьезд.

Далей зьезд перайшоў да дакладаў камісій.

Даклад агітацыйнай камісіі зрабіў А. Смоліч, каторы выказаў галоўныя мэты агітацыі на вёсцы: прасьвета сялянства аб значэньні сучаснага палітычнага моманту і арганізацыя сялянства, бо толькі сіла арганізаваная і разумная можа сама здабыць лепшы парадак. Элемэнт, каторы можа зрабіць вялікую працу,— гэта сельскія вучыцелі, яны самая блізкая народу інтэлігентная сіла, народ ёй верыць. У гэтым кірунку і былі прынятыя рэзалюцыі:

— Белнацкам павінен адразу прыступіць да арганізацыі сялянства і шырэньня палітычнай прасьветы паміж ім, ідучы побач з другімі арганізацыямі, як Менскі камітэт прапаганды новага парадку ў вёсцы, і другімі.

Дзеля гэтага БНК сазывае зьезды — сялянскі і вучыцельскі — і адкрывае хаўрусы сялянскія і вучыцельскія; арганізуе аддзел разьездных лектараў, арганізуе пераклад палітычнай літаратуры і пашырае яе сярод шырокіх мас, арганізуе каапэратывы, стварае фонд прапаганды дэмакратычнага парадку.

Ад сэкцыі друку і выдавецтва даклад зрабіў Жылуновіч (Цішка Гартны). Камісія ўважае, што ўсімі сіламі трэба ўзяцца за выдавецтва беларускай літаратуры, каторая пасьля заняцьця Вільні, дзе друкавалася большая частка кніжак і выходзілі газэты, зусім блізка разышлася. Па дакладзе гэтай камісіі прынялі такія рэзалюцыі: выдаваць найхутчэй газэту беларускага нацыянальнага камітэту; рэдагаваць гэту газэту мае камісія з 5 чалавек, прадстаўнікоў партый, выбранных Камітэтам (супрацоўнікаў рэдакцыі і іх ганарар назначае сам Камітэт, які аблічыў прыкладную сьмету на 2,135 руб. у месяц на тыднёвую газэту); поруч з газэтай павінны выдавацца папулярныя агітацыйныя брашуры; палавіну скарбоначнага збору, каторы быў зроблены ў Менску і Бабруйску, аддаць на літаратуру Беларускай сацыялістычнай грамады; выдаваць бібліяграфічны справачнік усіх беларускіх кніжак і прац аб Беларусі ў другіх мовах.

Даклад школьнай камісіі зрабіў Б. Тарашкевіч. Дакладчык казаў, што справа школы беларускай — адна з самых важных і балючых спраў беларускіх. Камісія добра зразумела ўсю труднасьць пытаньня і дзеля гэтага шчыра бралася да работы. Камісія ўся стаяла на тым становішчы, што прынцыпова праціў беларускай мовы ў школе ніякай супярэчкі быць ня можа. Але дзеля таго, што пакуль яшчэ альбо зусім німа добрых падручнікаў, альбо тыя, што ёсьць, не зусім добрыя для навучаньня, камісія выпрацавала паступенны пераход на беларускую мову. Апроч падручнікаў ня менш важнай перашкодай для ўвядзеньня беларускай мовы ў школе тое, што ў ёй мала вучыцеляў-беларусаў. Як паказаў гр[амадзянін] Кахановіч, былы інспэктар народных вучылішчаў, у Магілёўскай губэрні блізка што скрозь вучыцелі і вучылькі — велікарусы, каторыя ня ведаюць мовы беларускай. Дзеля ўсяго гэтага камісія стаяла на тым, каб перш ва ўсе школы, а найбольш у народныя, увесьці дух беларускі, значыцца, сколькі магчымасьці старацца, каб у нас вучылі тутэйшыя беларусы, а не велікарусы з глыбокай Расеі, каторыя хоць і родныя нам і блізкія, але мовы і культуры на-

шай ня знаюць. Камісія стаяла на тым, каб заняцца справай падручнікаў і неадкладна наладзіць беларускія курсы для вучыцеляў.

Школьная справа вызвала вельмі жывую супярэчку. Хоць і ўсе згаджаліся на тое, што беларуская мова, літаратура і гісторыя мусяць быць уведзеныя ў школах, але моцная спрэчка была ў тым, якім парадкам і калі павінна быць гэта зроблена. Пасьля доўгіх і гарачых прамоваў былі даволі згодна прыняты такія пажаданні і пастановы: 1) арганізаваць таварыства "Прасьвета" і для гэтага выбраць тымчасовы ўрад (Парэчына, Станкевіча, Лявіцкую, Смоліча і Тарашкевіча); 2) запрасіць да помачы ў справе арганізацыі таварыства вядомых дзеячоў: Краскоўскага, Ігнатоўскага, Мігая, Бр. Эпімах-Шыпілу, Іваноўскага, Фальковіча, Максіма Багдановіча; 3) даручыць дэлегацыі да Часовага ўраду, каб яна прадставіла ўраду, што справа кіраваньня прасьветай у Беларусі павінна быць аддадзена ў беларускія рукі; 4) дамагацца, каб у ніжэйшых школах уводзілася беларуская мова, літаратура і гісторыя па меры магчымасьці і вучыцельскіх сілаў. Якім парадкам гэта мае быць праведзена ў жыцьцё, павінны судзіць зьезды беларускіх народных вучыцеляў; 4) хутчэй выдаць патрэбныя падручнікі; 5) арганізаваць на лета беларускія курсы для вучыцеляў; 6) каб у вучыцельскіх сэмінарыях, а таксама у духоўных — праваслаўных і каталіцкіх — былі ўведзеныя беларуская мова, літаратура, шырэйшае пазнаньне краю і яго гісторыі; 7) дапусьціць у сярэднія школы, там дзе знойдуцца патрэбныя вучыцелі, беларускую мову і літаратуру як асобны прадмет (факультатыўна); 8) шырока разьвіць пазашкольную прасьвету і пашырэньне ўсялякай навукі пры помачы арганізацыі на мейсцах курсаў, чытаньняў, народных дамоў і іншых прасьветных ўстаноў.

Этнаграфічная камісія, разгледзеўшы пытаньні аб этнаграфічных граніцах Беларусі, прыйшла да выводу, што такімі граніцамі ёсьць межы расьсяленьня беларускага народу. Значыцца, у склад яе ўваходзяць губэрні: Менская, Гарадзенская, Магілёўская, часьць Смаленскай і Чарнігаўскай. Дзеля точнага абмежаваньня граніцаў пастанавілі стварыць асобую камісію прафэсараў: Любаўскі[16] (рэктар Маскоўскага ўнівэрсытэту), Доўнар– Запольскі[17] (Кіеўскі ўнівэрсытэт), акадэмік Карскі[18] (Петраград) і акадэмік Шахматаў[19] (Петраград).

Дзеля таго, што дэпутацыя ад Літоўскага камітэту зьвярнулася да Часовага ўраду з заявай, што Віленская губэрня — літоўская (як Ковенская і Сувальская), таму ў незанятай часьці Віленскай губэрні павінна быць уведзена літоўская адміністрацыя, этнаграфічная камісія прапанавала зьезду выразіць перад Часовым урадам пратэст супраць уключэньня літвінамі ў склад Літвы усёй Віленскай губэрні, заселенай блізка на ¾ беларусамі, а ў той часьці, катарая не занята немцамі, заселенай беларусамі скрозь. Такім парадкам аб назначэньні ў ёй літоўскай адміністрацыі ня можа быць ніякай гутаркі. Зьезд згадзіўся з дакладам этнаграфічнай камісіі (дакладчыкам быў рэдактар "Магілёўскага весьніка" М. Кахановіч).

Даклад фінансавай камісіі рабіў Э. Будзька. Каб можна было сапраўды рабіць нейкую работу, трэба залажыць нацыянальны фонд. Для добрага пачатку дакладчык даў на гэты фонд 2000 руб. — ад імені петраградзкіх беларусаў. Дакладчык раіў шмат спосабаў, як можна мець грошы для нацыянальнага фонду, а паміж іншымі: 1) стварыць аддзел для арганізацыі беларускага нацыянальнага банку; 2) разаслаць падпісныя лісты ўсім беларускім арганізацыям; 3) старацца дастаць уклады на некаторыя рэчы, як напрыклад, на арганізацыю сялянства і прапаганду паміж імі новага парадку; 4) каб ня толькі зьберагчы

грошы, але яшчэ і зарабіць, камітэт павінен залажыць друкарню, а таксама тэатр. Зьезд з довадамі дакладчыка згадзіўся.

Даклад земскай камісіі зрабіў Стаўпольскі. Камісія прапанавала адразу прыступіць да рэарганізыцыі земскага самаўпраўленьня на такіх падставах: 1) арганізаваць валасныя камітэты на аснове агульнага выбарчага права — бяз розьніцы мужчын і жанок; 2) устанавіць меншы лік членаў валаснога камітэту, чым было выбарных валаснога сходу; 3) на чале валаснога камітэту павінен стаяць урад у складзе: старшыні, 2 членаў і пісара; валасны камітэт выбірае валаснога камісара; 4) арганізаваць павятовыя земскія камітэты на аснове прапарцыянальных выбараў ад усіх валасных камітэтаў павету, лічачы па 1 прадстаўніку ад кожных 40 членаў валасных камітэтаў з тым, каб лік членаў павятовага камітэту быў ня меншы, як адзін на волась з павелічэньнем ліку членаў павятовага камітэту на 10% ад ліку валасьцей павету; 5) на чале павятовага земскага камітэту павінна стаяць павятовая земская управа ў складзе аднаго старшыні і 5 членаў; павятовы земскі камітэт выбірае павятовага камісара; 6) арганізаваць губэрнскі земскі камітэт на асновах прапарцыянальных выбараў ад усіх членаў павятовых земскіх камітэтаў;

Даклад арганізацыйнай камісіі зрабіў П. Аляксюк. Пасьля гэтага дакладу зьезд прыняў такія рэзалюцыі: 1) Беларускі нацыянальны зьезд лічыць патрэбным стварэньне ў як найбліжэйшым часе Беларускай Краёвай Рады ў Менску; 2) да выбараў у Беларускую Краёвую раду зьезд пры патрэбе бярэ на сябе ролю вышэйшай краёвай інстытуцыі; 3) Беларускі нацыянальны зьезд выбірае з сябе камітэт з 18 асоб, каторы мае называцца Беларускі Нацыянальны Камітэт.

Беларускі Нацыянальны Камітэт мае: 1) арганізаваць Беларусь у кантакце з Часовым расейскім урадам; 2) падгатовіць выбары ў беларускую Краёвую Раду; 3) весьці прапаганду выбараў у Расейскае *Учредительное собрание* на прынцыпах Расейскай фэдэратыўна-дэмакратычнай рэспублікі; 4) цяпер жа прыступіць да апрацаваньня канстытуцыі і Беларускага краёвага ўраду ў кантакце з усімі нацыямі Беларусі і з прапарцыянальным ад іх прадстаўніцтвам; 5) дзеля выканаўчых функцый з складу Нацыянальнага камітэту выбіраецца прэзыдыюм з пяці асоб.

У канцы засяданьня П. Аляксюк прапанаваў прыняць дэклярацыю зьезду, каторую павінны злажыць перад Часовым урадам выбраныя зьездам дэлегаты. Зьезд прыняў такую дэклярацыю:

Зьезд прадстаўнікоў беларускіх палітычных партый і клясаў, сабраўшыхся у Менску 25–27 сакавіка 1917 году, вітаючы вялікую расейскую рэвалюцыю, прынёсшую нам свабоду і блізкасьць аўтаноміі для Беларусі, выражаючы сваю гатоўнасьць падтрымаць Часовы Урад у яго барацьбе са зьнешнімі ворагамі за свабоду Расеі і яе народаў і з прыслужнікамі старога ўраду, перадае спаўніцельную ўладу Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту, каторы павінен у кантакце з Часовым расейскім Урадам арганізаваць Беларусь.

Беларускі Нацыянальны зьезд умацаваны ў шчырым жаданьні нясьці часьць вялікай працы на карысьць вольных народаў Расеі, моцна пераконаны, што яго Нацыянальны Камітэт, кіруючыся да паляпшэньня жыцьця у родным краю, абапіраючыся на ўсіх жыхароў Беларусі, прынясе карысьць агульнадзяржаўнаму будаваньню на фундамэнце фэдэратыўнага строю дэмакратычна-рэспубліканскай Расеі, аб чым зьезд даручае сваёй дэлегацыі данесьці да ведама Часовага Ураду.

У дэлегацыю да Часовага Ураду выбраны: 1) І. Краскоўскі (упаўнамочаны Саюзу гарадоў *Юго-западного фронта*), 2) Р. Скірмунт (дэпутат *I Государ[ственной] Думы*), 3) Э. Будзька (член Беларускага каміт[эту] помачы ахвярам вайны ў Петраградзе, селянін Вілейскага павету), 4) Я. Канчар[20] (упаўнамочаны ад Часовага Ураду па арганізацыі каапэратываў у Менскай губ[эрні]), 5) П. Аляксюк (юрыст), 6) М. Кахановіч (рэдактар "Магілёўскага весніка"), 7) І. Касяк[21] (народны вучыцель).

Зьезд высказаўся за прылучэньне прадстаўнікоў ад праваслаўнага і каталіцкага духавенства.

У Нацыянальны камітэт выбраны: 1) Р. Скірмунт, 2) А. Смоліч (аграном), 3) П. Аляксюк, 4) Л. Заяц (юрыст), 5) Э. Будзька (публіцыст), 6) У. Фальскі (чыноўнік Ліб[ава] – Ром[енскай] чыгункі), 7) Б. Тарашкевіч (кандыдат філялёгіі), 8) кс[ёндз] Гадлеўскі, 9) Я. Канчар, 10) І. Краскоўскі, 11) А. Бурбіс (банкаўскі служачы), 12) К. Кастравіцкі (гаспадар), 13) Бобрыкін (вучыцель гімназіі), 14) Ф. Шантыр (прыватны адвакат), 15) М. Кахановіч, 16) В. Іваноўскі (інжынер), 17) Дубейкаўскі (архітэктар), 18) З. Жылуновіч (работнік і паэт).

Беларускі Нацыянальны Камітэт мае права кааптацыі, а таксама пашыраецца прадстаўнікамі сялянскіх і беларускіх нацыянальных арганізацый (у тым парадку, як пры Саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў).

Удзельнікі Белнацкаму з 18 асоб выбралі прэзыдыюм з менскіх працаўнікоў — 5 чалавек: 1) Скірмунт (старшыня), 2) П. Аляксюк, 3) У. Фальскі, 4) Л. Заяц (скарбнік), 5) Б. Тарашкевіч (пісар).

Старшыні зьезду: Кастравіцкі, Скірмунт; віцэ-старшыні: Аляксюк, Смоліч; сакратары зьезду: Тарашкевіч, Заяц.

Дадам толькі некалькі сваіх заўвагаў: 1) у прэзыдыюме апрача пералічаных у пратаколе таксама былі Т. Грыб[22] і С. Рак-Міхалоўскі[23]; 2) чаму гэта Б. Тарашкевіч гэтак "далікатна" піша аб выступленьні Метліна? Чаму не прыводзіць яго грубіянскія выкрыкі: "Далой эту тряпку!" — гэта пра наш беларускі сьцяг!!! 3) чаму падае адказ Метліну сяброў прэзыдыюму, а не зварочвае ўвагі на выступленьне дэлегатаў з залі: Ф. Шантыра (адказ востры, з глыбіні абуранай душы) і старэнькага сівога селяніна, які, сказаўшы некалькі простых, але моцных слоў, укленчыў і пацалаваў сьцяг!

Гэта было мацней, чым прамовы пры стале прэзыдыюму, і шмат большае зрабіла ўражаньне. Адначасова дало адказ на закіды, што наш рух не натуральны і нізы ім не закранутыя.

Адразу пасьля лютаўскага перавароту беларусы захапілі Губэрнатарскі дом, дзе і была зроблена фатаграфія сяброў Зьезду. Доўга я думала і прыпамінала і ў канцы мушу згадзіцца з тым, што Зьезд утварыў Беларускі Нацыянальны Камітэт. Ён нядоўга праіснаваў, ператварыўся ў Цэнтральную Раду беларускіх арганізацыяў, куды ўвайшлі і Грамада, і Камітэт Таварыства помачы ахвярам вайны. Гэта дало повад для іранічнай заўвагі, што "прыцягнулі нават бежанцаў", як бы бежанцы беларусы не былі людзьмі раўнапраўнымі для сваёй Бацькаўшчыны!

На першым паседжаньні створанага зьездам Нацыянальнага Камітэту мяне выбралі сакратаркай. Б. Тарашкевіч выяжджаў назад у Петраград. Ня помню, чаму я недзе паехала з ім на рамізьніку. У горадзе прашу Тарашкевіча, каб даў мне пратаколы зьезду. Не пачынаць жа мне на пустым месцы! А ён мне са злосьцю: "Ня маю ніякіх пратаколаў, згубіў". Я засьмяялася і кажу: "Не гава-

рыце глупства, можа, адкажаце з большым сэнсам?" (Мы былі крыху знаёмы і раней.) Ад гэтага часу нейкая варожасьць асталася паміж намі.

На франтах арганізаваліся ў асобныя батальёны палякі, украінцы. А сколькі там было беларусаў! Параскіданыя па ўсіх франтах, у большасьці нацыянальна несьвядомыя, пазбаўленыя ўсялякай сувязі з беларускімі арганізацыямі... Вось тады нарадзілася думка склікаць вайсковы зьезд. Галоўным пачынальнікам быў Сымон Рак-Міхайлоўскі. Але ён быў са сваёй часьцю пад Маладзечнам і асабіста заняцца друкам адозваў, іх высылкай і г.д. ня мог.

У Менску быў М. Шыла[24], быў А. Уласаў, але яны як ваенныя кожную хвіліну маглі выехаць, і дзеля таго ўсю тэхнічную справу вайсковага зьезду Рак-Міхайлоўскі даручыў — мне! Гэта было крыху дзіўна і крыху сьмешна. Але ён тлумачыў так: "Я ведаю, што вы ўсё зробіце аккуратна і сумленна, а потым вы ж — ваенная костачка". (Мой бацька быў вайскоўцам.) Ну што ж... С. Рак-Міхайлоўскі аставіў мне чарнавікі адозваў, адрасы розных вайсковых аддзелаў і т.п. Думаючы, што ў мяне могуць быць нейкія няпэўнасьці, пазнаёміў мяне з сакратаром у штабе фронту і прасіў, каб мне, як будзе трэба, пазволілі карыстацца талефонам — парадзіцца з ім. Але і без яго дала я сабе рады.

Адозвы, павесткі разасланыя. Шыла наладзіў кватэры (у Губэрнатарскім доме) і справу харчаваньня так, як раней было ўзгоднена з Ракам-Міхайлоўскім і іншымі. Я пры помачы Рэні Бядулькі прыгатавала цэлую масу чырвона-белых сьцяжкоў для дэлегатаў. Здаецца, усё... Заўтра з раніцы пачнуць зьяжджацца, увечары зьезд адкрываецца.

Вечар. У Беларускую хатку прыходзіць Шыла і здаволена кажа: "Дзяжурных на вакзал назначылі — выйдуць на самы раньні цягнік". У гэту мінуту ў мяне бліснула думка: "Чакайце-чакайце, а як жа дэлегаты і дзяжурныя пазнаюць адныя другіх? Трэба ж неяк дзяжурных адзначыць!" — "Праўда,— кажа Шыла,— як жа мы аб гэтым забыліся? Трэба апаяскі на рукавы зрабіць з надпісамі".— "Ну так давайце рабіць".— "Але з чаго, чым падпісваць?" — "З чаго — гэта не праблема, зараз у мамы нейкага палатна дастану, сшыю, а на надпісы бярыце мае фарбы, я учора купіла сьвежыя акварэлі ў цюбіках".—"То я,— кажа Шыла,— пайду ў кнігарню з гэтай работай, бо позна, а хутка гэтага ня зробіш".— "На вуліцы цёмна, у кнігарні сьвятла німа, трэба браць лямпу са сталоўкі, то хіба я вас правяду, бо ўсяго разам не забераце".

Кнігарня была побач, ключ Ядвігін Ш. часова аставіў у сталоўцы, так што ўсё ясна. Толькі мама мая сьмяялася, што нас міліцыя затрымае за шпацыр з запаленай лямпай.

На раніцу апаяскі былі гатовыя з надпісам: Беларускі вайсковы зьезд. Увечары ў зале Губернатарскага дому зьезд адкрыўся. Колькі было дэлегатаў — ня помню. Але шмат і салдатаў, і афіцэраў — з генэралам Кандратовічам[25] у тым ліку. Ад Балтыйскага флоту матросы: Муха і Вярбіцкі. Усе сапраўды ўзрушаныя, усе здаволеныя, што сабраліся ў адной грамадзе... Знаёміліся паміж сабой, а беларуская мова цешыла і давала нейкую надзею на лепшую будучыню. Я была там адзінай жанчынай і ня чулася паміж імі не на месцы.

Разумеецца, і дзясятай часьці прозьвішчаў ня помню, але асталіся ў памяці пераважна тыя, хто астаўся працаваць у Вайсковай Радзе: Гацкі, Міхайчук, Русак[26], Сакалоўскі, Козіч, браты Красоўскія, а перадусім Чарвякоў[27] і Езавітаў[28].

Аднаго дэлегата помню добра, хоць прозьвішча яго і ня ведала. Глыбока сьвядомы, разьвіты, але які ж нешчасьлівы. Нядаўна выйшаў са шпіталю, паранены твар. Страшная маска... шрамы... Як жа ён цярпеў духова... Усё дапытваўся: скажыце праўду, страшна на мяне глядзець, усе ад мяне адвернуцца, праўда? Які ж боль у голасе... Я шмат з ім гаварыла, тлумачыла, што ня ў твары, ня ў выглядзе справа, а ў душы, у паводзінах чалавека і г.д. Але ці ён мне паверыў?

У канцы працы Зьезду запранавалі запісывацца у бел[арускія] батальёны. Запісываліся, хіба, усе без вынятку. Запісалася і я. Прасілі высылаць літаратуру, калі будуць — газэты.

У апошні дзень зьезду Ф. Шантыр прачытаў лекцыю "Аб патрэбе нацыянальнага самавызначэньня для беларусаў". Лекцыю слухалі з вялікім зацікаўленьнем.

Цэнтральны Камітэт беларускіх арганізацыяў працаваў... Сходы, пасяджэньні... Таксама паседжаньні сяброў менскага аддзелу Грамады. Ня маю аб чым успамінаць. Не люблю і не любіла гэтакай работы. Шмат мне мілейшай была работа з бежанцамі, там рабілася нешта канткрэтнае. Да вялікіх справаў трэба мець вялікія здольнасьці. У мяне іх не было...

Неяк абодва зьезды успомніліся адзін за адным, а паміж імі прайшоў не адзін месяц, бо Вайсковы зьезд адбыўся 18–21 кастрычніка 1917 г. У міжчасе работа ў Камітэце помачы ахвярам вайны не стаяла на месцы: пастанавілі сталоўку пашырыць. Нанялі вялікую кватэру на Маскоўскім завулку (здаецца) — з мансардай, дзе мы з мамай закватараваліся. А на Захараўскай, 18, у Беларускай хатцы адгэтуль зьмяшчаліся сакратарыяты: Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый, Грамады і Камітэту помачы ахвярам вайны. І ва ўсіх трох я была сакратаром, г.зн. прымала інтэрэсантаў, давала інфармацыі і г.д.

На Маскоўскім завулку мы з мамай нядоўга жылі. Мама хварэла, і займацца сталоўкай, тым больш хадзіць па сходах было цяжка. Ядвігін Ш. знайшоў новую загадчыцу для сталоўкі, а мы нанялі сабе пакойчык на Залатой Горцы, недалёка могілак. Так ужо надаела ў горадзе паміж камянёў, муроў, што лягчэй дыхнулі, выбраўшыся на ціхую вулічку паміж дрэвамі. Хадзіць або езьдзіць на концы было далёка, але затое вочы бачылі зелень, чыстае неба.

У мансардзе над сталоўкай зрабілі інтэрнат, дзе жылі, паміж іншымі, У. Чыркі, Г. Матук, Лытчык і др. Інтэрнатам загадваў прыехаўшы у той час Я. Лёсік[29]. А. Прушынскі[30] (А. Гарун) жыў на Захараўскай, 18, узяўшы да сябе матку і маладога брата. У гэты час тэатральная трупа Ф. Ждановіча ўжо даволі моцна чулася. Распрацавалі і паставілі "У зімовы вечар". Ролю Рыся іграў брат Флярыяна Антук (псэўданім *Крыніца*). Якое ж моцнае ўражаньне было, з якой сілай іграў! Я адразу сваімі перажываньнямі падзялілася з Ф. Шантырам. Праз пару дзён ліст: "Пагаварыце з Ф. Ждановічам. Скажыце яму, што запрашаем яго трупу ў Бабруйск. Паведамце загадзя, каб узгадніць тэрмін".

Ждановіч ахвотна згадзіўся, назначылі дзень. Паехалі трупа і хор, які таксама значна павялічыўся. Асабліва добры быў бас — працаўнік дэпо. Паехала і я з імі. Гэта было ў канцы красавіка 1917 г. У Бабруйску ўсё было арганізавана: заля нанятая (у тэатры ці у нейкім клюбе), афішы расклееныя, прададзена шмат білетаў. Начлег для трупы і хору наладжаны ў будынку шпіталя, г.зн. у старой Бабруйскай крэпасьці.

Апрача п'есы "У зімовы вечар" і хору былі яшчэ дэклямацыі. Асабліва падабаўся публіцы маналог "Ай зубы, праклятыя зубы" ў выкананьні Янкі

Ждановіча (ён ня быў сваяком Ф. і А. Ждановічам). Антук Ждановіч з такой сілай выканаў сваю ролю, што атрымаў сэрцавую атаку (ён быў хворы на сэрца), і яго вынесьлі са сцэны.

Далей Ф. Ждановіч працаваў вытрывала і з посьпехам. Ставілі: "Пашыліся ў дурні", "Паўлінку", "Апошняе спатканьне" У. Галубка. Усё гэта ставілася, як мне здаецца, у летнім тэатры, бо помню, што каса была пры ўваходзе ў сад. Я пару разоў у касе прадавала білеты ў бел[арускай]нац[ыянальнай] вопратцы.

РОЗНЫЯ БЕЖАНЦЫ І ФАБІЯН ШАНТЫР

Ужо летам 1917 г. уцекачы, якія спыніліся ў глыбіні Расеі пачалі зьяжджацца ў Менск, каб пры першай магчымасьці вярнуцца да родных кутоў. Пакуль можна будзе ехаць далей, уцекачы шукалі працы. Дзеля гэтага пры менскім Камітэце Таварыства помачы ахвярам вайны было арганізавана бюро працы. І вось, прыйшоўшы аднойчы на сваё месца працы, я бурна пазнаёмілася з Янкам Станкевічам (пазьней у Вільні мы яго называлі *спадаром*). Ён быў у войску, але на зьездзе вайсковым ня быў — прычыны ня помню. А цяпер прыехаў пазнаёміцца з працай беларускіх арганізацыяў. Уляцеў, як бомба, не прывітаўся і адразу напаў на мяне: "Чаму ўчора ў вас было зачынена? Што гэта за парадкі?!" Я спакойненька кажу: "Перадусім не крычыце, вы не ў казарме. А чаму зачынена? Калі чалавек, у даным выпадку я, праз цэлы тыдзень тут па гадзін дзесяць, то ў нядзелю мае права адпачыць. Замяніць мяне німа каму".— "А што рабіць, калі хто ў нядзелю прыедзе?" — "Пачакаць да панядзелка, а тым часам пайсьці ў Вайсковую Раду, там працаўнікі-сябры жывуць на месцы".

Ня цешыла праца нашых арганізацыяў: Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый і Грамады. Сядзелі, прамаўлялі, дыскутавалі і — таўкліся на месцы. З тым большым захапленьнем, нават з зайздрасьцю бачыла я, як працаваў Бабруйск. Які размах, якая энэргія! А працаваў там адзін чалавек — Ф. Шантыр. У адным з лістоў 1917 г. ён пісаў мне: "Сягодня чуюся надта шчасьліва: была ў нас маніфэстацыя салдат і сялян. Народу было некалькі тысяч. Пасьля маніфэстацыі былі мітынгі, спачатку салдацкі, а пасьля вясковы. На абодвух мітынгах я выступаў. І знаеце, перажытае падчас мітынгаў я ніколі не перажываў і, мабыць, ня буду перажываць! Народ страпянуўся, і старонка, хоць памалу, але ж будзіцца і ідзе па праўдзівай дарозе. Пытаецеся, як расходзяцца адозвы? Было выпушчана 5000 адозваў. Адна мая свячка равозіла іх па вёсках. Адозвы ўсе раздала, так народ быў рады, што мог прачытаць... Беглі за возам, хапалі як бы грошы ім хто даваў! Вось наколькі народ галодны на шчырае друкаванае слова".

Іншы ліст: "Як ведаеш, тут арганізаваўся аддзел Беларускай сацыялістычнай грамады. Цяпер грамада налічвае ўжо больш 100 сяброў. Выдалі 5000 адозваў. Грамада выступіла на маніфэстацыі са сваім сьцягам. Купальле будзем ладзіць таксама арганізавана. Мо будзе ў Менску прыгатоўлена на Купальле якая літаратура, то высылайце загадзя... Ладзім скарбоначныя зборы. У маленькім Бабруйску сабралі каля 500 рублёў. Бяда адно, што німа каму арганізаваць хор! Вышлі як хутчэй усе песьні з нотамі і п'есы беларускія. Маю надзею, што калі справы і далей будуць ісьці, як цяпер ідуць, то незадоўга пачнем выдаваць у Бабруйску газэту".

Энтузыяст, палымяны трыбун, Ф. Шантыр вёў за сабой масы. Зайздросьціла, захоплівалася, а ўсё ж кінуць сваю шэрую работу і ехаць у Бабруйск не магла: у Менску я была патрэбная, і гэта мяне трымала.

А ў Менску нават Купальля не сьвяткавалі? Бо Купальле не праца... Так, але прапаганда беларускіх звычаяў, песьняў... Неяк пайшлі ў лес — Галубок, Ядвігін Ш., Фальскі, Бядуля, я. Пасядзелі гадзінку, памаўчалі і — вярнуліся. Апрача газэты "Грамада", якая час ад часу выходзіла, не друкавалася нічога. Каб хоць крыху запоўніць гэтую пустку, надумаліся выдаць аднаднёўку. Крыху палітычнага агляду, пару паважнейшых артыкулаў і шмат бэлетрыстыкі. Помню, сабраліся ў нейкім маленькім пакойчыку: Ядвігін Ш., Галубок, прыехаў Ф. Шантыр, Андрэй Зязюля (кс [ёндз] Астрамовіч) і я. Гутарылі, праектавалі, абдумывалі... Здаецца, абдумалі ўсё дакладна. Пастанавілі пісаць, падбіраць матэр'ялы. Тады Ф. Шантыр кажа: "Я хутка прыехаць не змагу, а для аддзелу бэлетрыстыкі магу цяпер даць сваё апошняе апавяданьне. Можа, прачытаць? Буду адразу ведаць, ці падыйдзе". Разумеецца, папрасілі чытаць. Гэта было апавяданьне "Сьвяты Божа" — рэч моцная, трагічная... Уражаньне? Як яго апішаш? І тут — неспадзянка! А. Зязюля: "Я гэтага не дапушчу! Гэта багахульства. Як можна нават думаць, каб гэта пусьціць у друк?" Ф. Шантыр на дзіва не абурыўся, не запратэставаў. Схаваў рукапіс, разьвітаўся і выйшаў. Усе маўчалі. Урэшці Ядвігін Ш. кажа: "Што ж, ня думаю, каб хто згадзіўся аддаваць свае працы ў такую жорсткую цэнзуру. Значыцца, з праекту аднаднёўкі нічога ня будзе". І так добрыя намеры ня зьдзейсьніліся.

Па нейкім часе я атрымала ад Ф. Шантыра ліст, у якім ён прасіў аддаць уложаны ў капэрту ліст да А. Зязюлі. Я аддала. Што там было — ня ведаю. "Сьвяты Божа" было надрукавана пазьней у "Вольнай Беларусі", пасьля быў друкаваны ў Маскве пераклад, і на польскай мове ў "Przeglądzie Wileńskim". А ў "Хрэстаматыі" І. Дварчаніна ў апавяданьні канец адрэзаны, ды так няўдала, што загаловак страціў сувязь са зьместам...

Як я ўжо ўспамінала, бежанцы з глыбіні Расеі накіроўваліся бліжэй да сваёй старонкі. Некаторыя заходзілі ў наш Камітэт, рэгістраваліся, ішлі на работу. Большасьць радзіла сабе сама. Сябры Камітэту не паказваліся. Адзін Фальскі, сталы віцэ-старшыня, заглядываў часам на хвілінку. Я адна мусіла даваць раду. І вось раз прыходзіць цэлая грамада бежанцаў. Адна старая жанчына, дзьве маладыя і тры падросткі па гадоў 16–17. Усе здаровыя, сільныя і бязьмерна нахальныя. З гэтакімі яшчэ не прыходзілася спатыкацца. Адразу з вымаганьнем — дайце нам кватэру! Я кажу, што кватэраў ня маем, начлежкі даўно ліквідаваныя, бо жыўшыя ў іх уцекачы, наладзіўшы сваё жыцьце, нанялі сабе кватэры. "Ну так мы пажывем у вас у калідоры".— Гэтага ня зробіце. Тут памяшканьне Камітэту, дом належыць да магістрату, і ніхто тут жыць ня мае права".— "Усё роўна мы сягодня ня пойдзем нікуды, ужо вечар".— "Што ж, пераначуйце, але заўтра шукайце сабе кватэры".

Пераначавалі ноч, другую, ніякай сілай не магла іх пазбыцца. Дайшло да таго, што прыгразіла ім паліцыяй. Тады яны перайшлі ў складзік на дровы (ён быў пусты). Цэлыя дні сядзяць, ляжаць на сваёй пасьцелі — было цёпла, суха. А мяне ліха бярэ. Здаровыя бабы нічога не робяць, хлапцы ляжаць, кураць. Вырабілі сабе паёк, які быў агранічаны, не на ўсіх хапала.

Аднаго разу звоняць з чыгункі, каб прыслаць работнікаў — пільная праца. Неяк з бядой угаварыла я сваіх гультаёў, каб ішлі на работу, асталася толькі

старая матка. На другі дзень, з трэскам адчыніўшы дзьверы, убягае разьюшаная баба і да мяне: "Што вы нарабілі! Паслалі нас на работу, і нам цяпер пайка не даюць!" — "Але плацяць, а паёк прыгадзіцца тым, хто працаваць ня можа". Яшчэ там нешта крычала, стукнула дзьвярамі, а потым адчыніла ізноў ды крыкнула: "Каб вам сэрца згарэла!".

Я вярнулася да сваёй работы, сяджу, пішу, але мне неяк нядобра... Усё ж не паддаюся. Знэрвавалася, ясна, але гэта міне, думаю. У той час прыйшоў нейкі старэнькі гаспадар з-пад Менска, просіць дастаць яму палонных аўстрыякаў да жніва. Ён ды жонка старыя, а сыны на фронце. Я дагаварылася па тэлефоне з начальнікам лягеру. Дала свайму інтэрэсанту адрас, але ногі мяне не трымаюць. Той пытаецца: што з вамі? Вы — белая, як палатно...

Нічога страшнага, кажу, але ўсё ж трэба ехаць дахаты. Зачыніла Камітэт, узяла возчыка, паехала. Мама паклікала доктара... Мне нічога не балела, толькі гарачка была да 40 градусаў і білася, як шалёнае, сэрца... Доктарскі дыягназ: нэрвовая гарачка... "Каб вам сэрца згарэла"... Ляжала тры тыдні. Значыцца, бываюць ведзьмы? І праклёны маюць сілу? Хварэла-паздаравела...

Ня гэта было балючым... Але сколькі набрала я праз гэта жыцьцёвай практыкі! Сколькі страціла веры ў людзей, у іх праўду. Тыя, хто так прыгожа думаў, гаварыў, пісаў аб тым, якімі павінны быць адносіны паміж намі, беларусамі ("усё для чалавека", "усе як адна сям'я") паказалі яўна, што іх словы ня маюць нічога супольнага з паступкамі. Праз час маёй хваробы ніхто, даслоўна ніхто, не пацікавіўся, што са мной. Можа, трэба дапамагчы? Толькі ў канцы, як ужо пачала ўставаць, зьявіўся Галубок. Ф. Шантыр прыехаць ня змог, але лісты былі кожны дзень, непакоіўся, але гэта быў блізкі і родны чалавек.

Затое нашы бежанцы з Бялянаў (Сакольшчына) спагадалі цэлым сэрцам. Паўліна Шыдлоўская прыходзіла кожны дзень; аставалася пры мне, калі мама ішла у горад, у аптэку. Старалася памагчы маме ў хатніх справах. Ні асьвета, ні шырокія глыбокія погляды не заменяць сэрца...

ВІР ГРАМАДЗКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Сходы, дэбаты Цэнтральнай Рады бел[арускіх] арганізацый ішлі па-старому. Пакрысе прыбывалі новыя людзі. Ну, не зусім новыя, але тыя, што толькі прыехалі, або толькі цяпер змаглі працаваць. Да такіх належалі Тодар Вернікоўскі[1] і вайсковы др. Кастравіцкі — брат Каганца. Высокі, з сівеючай барадой, часта прыводзіў з сабой сыноў-гімназістаў.

Урэшці, каб выканаць пастанову Зьезду "Аб утварэньні Краёвай Рады", стварылі Вялікую Беларускую Раду. Пачала яна працаваць увосені 1917 г. у Губэрнатарскім доме. Мяне кааптавалі у Раду і назначылі сакратаром! У маім жыцці шмат што зьмянілася. Адносіны з Ф. Шантырам псаваліся. Ненармальны ваенны час, нязгода ў поглядах і г.д. часова нас разлучылі. Маці мая выехала пад Глыбокае, дзе працавала вучыцелькай у маёнтку адной абшарніцы, якая, баючыся надыходзячых падзеяў, старалася залагодзіць сваіх работнікаў. Якія благія прычыны ні кіравалі гэтай абшарніцай, усё ж выкарыстаць магчымасьць даць дзецям навуку было неабходна.

Мне прыйшлося шукаць сабе кватэру. Бядуля запрапанаваў, каб [redacted] жыла ў яго, з яго сёстрамі: яны займалі вялікі пакой, дзе хапала месца і на трэцяга чалавека. Пакой, дзе жыў М. Багдановіч, цяпер займаў Я. Лёсік. У Вялікай

Радзе работы было шмат, тым больш, што я ўсюды цягнула за сабой і работу Камітэту помачы ахвярам вайны. Пры ўсёй гэтай працы неабходна была машыністка. Паслалі на курсы машыністкі малодшую сястру Бядулі — Чэрню. Скончыўшы курсы, яна пачала працаваць у Вялікай Радзе. Вось і хадзілі мы на работу разам. Ад 10-й рана розная папяровая работа, ды мая з бежанцамі, а вечарам — паседжаньні. Справы асьветы, друку, зямельная рэформа, пераход зямлі да сялян з выкупам ці бяз выкупу і г.д. Дэбаты, дэбаты, спрэчкі… Сходы штораз больш людныя, бо і сябры Вайсковай Рады ўваходзілі у Вялікую Раду. Чым больш было людзей, тым мне з маім слабым слухам цяжэй было весьці пратаколы сходу, і тады па ініцыятыве С. Рака-Міхайлоўскага выбралі другога сакратара, ці, лепш сказаць, памочніка мне — Анну Сакалоўскую.

А гадзіне 10–11-й вечара канчалася праца, і мы з Чэрняй ішлі дамоў. Позна, цёмна. Ісьці далёка. Заўсёды хто-небудзь праводзіў: Чарвякоў, Косіч (з Гродзеншчыны) або Езавітаў. Прыйшоўшы дамоў, змучаныя, галодныя, пачыналі рабіць сабе вячэру… Сьмешна, але каб было хутчэй, варылі аднаго дня літыя клёцкі, на другі дзень — бульбяныя бліны. Ізноў Чэрня ганяла брата: “Бядуля, прынясі вады. Ён усё паслушна спаўняў, але, зрабіўшы што трэба, з кухні не выходзіў, а кухня цесная, маленькая… Тады я ўжо прасіла: “Пане Бядуля, не перашкаджайце”. А ён на гэта: “Дайце хвілінку мне каля вас натупацца!”.

Ня ведаю, ці доўга мы з Чэрняй вытрымалі б такое жыццё з сухімі абедамі, але Рак-Міхайлоўскі неяк заўважыў: “Гэта несправядліва. Мы, працаўнікі Вайсковай Рады, сталуемся ў сталоўцы Саюзу гарадоў[2], а яны аднымі бутэрбродамі жывуць. Трэба іх прыпісаць да Вайсковай Рады і сталоўкі”. Гэтак і зрабілі. І мы з Чэрняй ад гэтай пары хадзілі на абеды ў сталоўку, а на сьняданкі і вячэры атрымлівалі паёк — булкі, масла, сыр.

У нядзелю, маючы час, мы шмат гаварылі з Бядуляй. Ён тады працаваў над драмай “Плач у гарах”. Працаваў сумленна — перарабляў, шліфаваў. Шмат вымагаў ад сябе, рэдка быў здаволены з напісанага. Найбольш яго тады цікавілі тэмы біблейскія.

Нядоўга я жыла бяз мамы. Ёй не спадабаліся адносіны пані да сялян, і яна праз пару месяцаў вярнулася ў Менск. Пакой, дзе жыў раней М. Багдановіч, стаяў пусты. Дагаварыўшыся пра цану, нанялі мы яго і загаспадарыліся. У суседнім пакоі, праходным, жылі У. Чаржынскі і Г. Матук, бо інтэрнат над сталоўкай ужо быў зьліквідаваны. Цяжка жылося… Крамы пустыя, хлеб добра калі ўдавалася купіць у салдатаў, на рынку — пуста… Прабавалі спажываць муку з сухіх абаранкаў. Толькі бульбы яшчэ купіць можна было. Былі дні, калі на сьнеданьне замест хлеба ды гарбаты мама смажыла бульбяныя блінкі. Не толькі для нас, але і для Матука і Чаржынскага.

З якой удзячнасьцю ўспамінаецца спагадлівасьць А. Уласава! Неяк раніцай пачулі мы стук у дзьверы ад ганку. Я пайшла адчыніць. Увайшоў Уласаў, якога некалькі дзён не было у Менску, езьдзіў да сябе ў Мігаўку (каля Радашкавічаў). Прывітаўся і паклаў на стол агромны бохан хлеба… “Можа, ня лішні?” — кажа. Ох, як усе цешыліся! Цешыў ня толькі смачны хлеб, але яшчэ ў большай меры памяць і спагадлівасьць. Гэты ўвесь пэрыяд неяк не ўспамінаецца як ланцуг падзеяў, а паасобныя мамэнты-абразкі, што адбіліся ў памяці.

Часова ў горадзе — немцы. Я ў той час мела шмат работы з уцекачамі. Немцы пачалі даваць пропускі на паварот у родныя куткі. Дзеля гэтага вымагалі пасьведчаньняў, дзе ўцекачы былі зарэгістраваныя. Каб інтэрэсантам лягчэй

было знайсці Камітэт помачы ахвярам вайны, мяне перавялі ў былы кабінэт губэрнатара, бо ён быў пры самым уваходзе. Я там прыгатаўляла сьпіскі ўцекачоў і інш. Аднойчы ўвайшоў немец-салдат і папрасіў пакінуць пакой. Я адразу падумала: бланкі маю ў хаце, каб толькі пячатку схапіць… І — руку ў шуфляду, а немец — мяне за руку! Што ж, не было рады, прыйшлося пакінуць.

У гэты самы дзень увечары да нас позна-позна пастукалі ў акно. Капітан Ярашэвіч, рэдактар вайсковай газэты, прывёз пад маю апеку ўсю сваю рэдакцыю. "Схавайце ў сябе,— кажа,— у вас шукаць ня будуць".

Яшчэ перад тым былі зьезды — Беларускай сацыялістычнай грамады і Усебеларускі[3]—5 сьнежня 1917 г. Была я і на адным, і на другім, але нічога ня помню. З Усебеларускага маю білет. Відаць, не помню таму, што была дэлегатам, актыўнага ўдзелу не прымала, вось і выветрылася з памяці.

Кангрэс… Занадта шумны назоў? Хто аб гэтым думаў? Здавалася, восьвось наступіць пара, да якой імкнуліся найлепшыя нашы людзі, працуючы горача, ахвярна… Дачакаемся вольнай, самастойнай Беларусі… Не было паміж намі выпрактыкаваных палітыкаў, былі толькі гарачыя сэрцы і галовы. Усе чыталі пастанову Леніна[4]: "Усе народы маюць права да самавызначэньня… аж да ўтварэньня незалежнай дзяржавы". Чыталі і былі настолькі наіўнымі, што верылі.

Дазвол на кангрэс атрымалі. Зьбіраліся адкрыта, уваход — свабодны для ўсіх. Першы, другі дзень дэбатаў… Знаёмыя твары, свае людзі. Тады я першы і адзіны раз бачыла Янку Купалу! Прыйшоў, пасядзеў каля дзьвярэй на парапэце і пайшоў. На трэці дзень пачалі зьяўляцца чужыя людзі. Пераважна жанчыны ў скураных куртках: садзіліся паміж нашымі то тут, то там. Гэта насьцярожвала. Але дэбатаў не спынялі. Увечары меліся скончыць дэбаты і падпісаць акт-рэзалюцыю. Абвешчаньне незалежнасьці Беларусі. Як жа біліся сэрцы… Як перад вачамі ўжо зьяўляліся школы, выдавецтвы, кніжкі, прэса…

Прэзыдыюм на сцэне (кангрэс праводзіў сваю работу ў Дваранскім сабраньні, у рагавой камяніцы). Чакаем. Рэзалюцыя напісана, астаецца падпісаць. У гэты момант з грукатам урываецца ў залю аддзел узброеных салдатаў з латышом Рэзаўскім[5] наперадзе… Рэзаўскі з рэвальвэрам у руцэ, цэліцца ў безабаронных сяброў прэзыдыюму. Загадвае прэзыдыюму сысьці са сцэны. Салдаты яго акружаюць, выводзяць праз чорны ход. Пазасталыя ня трацяць прытомнасьці. Мамэнтальна выбраны новы прэзыдыюм сьпяшыць выканаць задуманае. Усё паўтараецца ад пачатку: салдаты, Рэзаўскі, і — новы прэзыдыюм за дзьвярамі. Нехта з выведзеных здолеў вырвацца, адчыніў дзьверы і крыкнуў: "Усе на сцэну! Ня стойце перад вокнамі. У вокны накіраваныя кулямёты!"

Параду выпаўнілі: жменька нас пазасталых запоўніла невялікую сцэну. Прэзыдыюму новага ўжо не выбіралі, рэзалюцыю падпісалі, выйшлі, не чакаючы на прымусовы вывад. На вуліцы — кулямёты, коньнікі… Разыходзіліся групамі, куды каму выпадала дарога. Коньнікі праводзілі кожную групу, пакуль апошні чалавек не ўвайшоў у свой дом. Пачалася работа падпольная. Зьбіраліся ў розных мышыных норках… зьмянялі ў апошнюю мінуту мейсца нарадаў…

Урэшці быў выбраны 1-шы Урад Беларускай Народнай Рэспублікі. У яго ўвайшлі: Смоліч, Серада[6], Варонка, Крэчаўскі[7], Аўсянік[8], Захарка[9], Заяц. Мо яшчэ хто — ня помню. Але гэта ня цешыла. Відаць было, што гэта ўжо нічога ня дасьць. Што ж, Беларускай Рэспублікі[10] дачакаліся… Толькі ня мы яе

будавалі. Тварыла яе Масква — рукамі маскалёў і жыдоў. Увялі ва Урад і нашых: Жылуновіча, Чарвякова, Фальскага, Шантыра, Дылу[11]. Але гэта часова — "*на время, пока не пришлём своих*".

Горка, сумна, балюча... І сягодня, як некалісь, г.зв. Беларуская Рэспубліка падпарадкуецца дырэктывам Масквы... Знаходзяцца беларусы, для якіх "Масква родная да болю". І не саромяцца гэтага абʼяўляць публічна! А ўсё ж добрых, чыстых беларусаў штораз больш. Няхай жа ім шанцуе ў працы, у задумах, у жыцьці. Факт абвешчаньня незалежнасьці Беларусі не астаўся без значэньня. У 20-х гадах у Вільні ў гэты дзень беларусы розных партыяў, якія грызьліся безупынна паміж сабой, забываліся аб тым, што іх дзеліць, а помнілі аб Бацькаўшчыне, якая іх узгадавала, і зьбіраліся на супольную ўрачыстую акадэмію.

АПОШНІ ГОД У МЕНСКУ

Ужо 1918 год. Цяжкае матэрыяльнае становішча (Камітэту амаль не было, мама эмэрытуру не атрымлівала) прымусіла шукаць працы. Хто ж мог памагчы? Толькі Фальскі... Не пасьпела я папрасіць, як ён сам запрапанаваў знойдзеную для нас абедзьвюх работу ў Земскім саюзе — у так званым *распределительном приюте*. Дзяцей там было мала, і то ня сталых, бо іх або забіралі ў іншыя прытулкі, або знаходзіліся бацькі і забіралі дзяцей да сябе. Але затое былі аграмадныя склады адзежы, абутку ды прадуктаў: масла, саланіны, кансэрваў, макаронаў, сушанай бульбы ды іншай агародніны. Апрача таго, былі дзьве пары коней з фурманамі і г.д. З гэтай базы выдаваліся прадукты і ўсё іншае для сталых дзіцячых прытулкаў і дзіцячай бальнічкі, якая знаходзілася недалёка ад базы. Вось там мы з мамай пачалі працаваць. Мама загадывала цэлай гаспадаркай, я займалася дзяцьмі. Ніхто не сумняваўся, як я дзяцей вучыла па-беларуску, хоць такіх, што гаварылі чыста па-беларуску, было вельмі мала. Абруселі, бадзяючыся па прытулках, але вучыліся па-беларуску ахвотна, а найбольш любілі беларускія песьні. Нярэдка, бывала, задумаецца дзяўчынка, а пасьля ціхенька кажа: "А гэтую песьню мая мама пела...".

Надышла вясна. Я са старшымі дзецьмі пайшла парадкаваць агарод каля бальніцы. І ў гэты час мяне абакралі. І хто? Антук Ждановіч! Прыйшоў на агарод, у руках нейкі пакунак ды белая хустка на галаву. Кажа мне: "Завяжыце на галаву гэтую хустку, а тую, што ў вас, дайце мне". (Я мела пазасталую ад беларускай нацыянальнай вопраткі рэшту: пацяркі, хвартушок, загруднік, спадніцу). "Ваша мама мне дала: сягодня спэктакль, нам не хапіла касьцюмаў". Ну што ж, дала я і шаляноўку... І больш свайго касьцюма ня бачыла...

Тады ўжо група Ф. Ждановіча загаспадарвалася ў бараку на Камароўцы. Была я там толькі раз — на Купалаўскім "Раскіданым гнязьдзе". У гэтым самым бараку была беларуская бібліятэка — пад загадам П. Мядзёлкі і яе брата Казіміра.

У хуткім часе захварэла мая мама, трэба было палажыць ў шпіталь, а тут ні на хвіліну адысьці няможна. Адказнасць за склады, іх цэласнасьць яшчэ большая, чым за дзяцей. Ня ведаю, што я рабіла б, каб ня Фальскі і яго жонка Ксеня Сьцяпанаўна (украінка). І маму маю адведывалі, і мяне зьмянялі, каб я магла да мамы пайсьці... Мала таго, як я першы раз да мамы пайшла, каб адведаць і што-небудзь ёй занясьці, у яе ўжо былі віно і памаранчы ад Фаль-

скага. І цяпер, праз 50 гадоў, удзячнасьць мая да гэтых сардэчных, праўдзівых людзей ня гасьне.

Грамадзкая праца ў той час разьвівалася. Выходзіла “Вольная Беларусь” (рэдакцыя — на Захараўскай, 18 у ранейшай Беларускай хатцы, і рэдактар Я. Лёсік жыў там таксама), ладзіліся вучыцельскія курсы. А. Смоліч пісаў сваю геаграфію, адбываліся сходы, нарады... Стараліся наладзіць нейкі зьезд у Бабруйску, але нічога ня выйшла (з майго запісу таго часу: немцы пропускі ў Бабруйск даюць, але палякі не пускаюць). Вайсковых расейскіх шпіталяў ужо даўно ў Бабруйску не было, але яшчэ ня ўсё было зьліквідавана, і Ф. Шантыр яшчэ быў там, меў скончыць ліквідацыю.

Аднойчы спатыкаю на вуліцы Смоліча. Ён пытаецца: “Чулі? Палякі Ф. Шантыра арыштавалі. Паедзеце? Мо там нікога німа, хто б заняўся гэтай справай”.— “Паеду,— кажу,— сягодня”. Пропуск дастаць ня так лёгка было. Я махнула рукой — паехала бяз пропуску. Цягнік выйшаў з Менска позна ўвечары. Еду і думаю: прыйдзе кантроль і або мяне арыштуе, або на першым прыпынку выкіне... Што рабіць? Побач мяне сядзеў польскі палкоўнік. Відаць, маё хваляваньне было відочнае... Увайшоў кантроль, ну, думаю, прапала. Палкоўнік падае кантралёру свой пропуск і, паказваючы на мяне, кажа: “Мая жонка”. Я была выратаваная. Шчыра майму ратаўніку падзякавала...

У Бабруйску ўсё было ў парадку. Вызваліць Ф. Шантыра з арышту памог швагра П. Алексюка — польскі афіцэр. На другі дзень я пайшла да яго па пропуск. Другі раз не рызыкавала без яго ехаць.

У грамадзкім руху я ўдзелу не прымала, ды і не было ўжо такой патрэбы. Праца разьвівалася, грошы былі (скуль — ня ведаю), працаўнікам плацілі, то і людзі знаходзіліся. Не было патрэбы з аднаго чалавека дзесяць скураў дзёрці...

Трудна забыцца такое здарэньне: я яшчэ працавала у Камітэце помачы ахвярам вайны. Спатыкаемся на вуліцы са Смолічам і Ядвігіным Ш. Смоліч кажа: “Вось добра, што мы вас спаткалі. Вазьміцеся зрабіць... (што — ніяк не прыпомню, нейкую немалаважную работу, а я і так мела абавязкаў вышэй галавы). “Не,— кажу,— больш таго, што раблю, нічога на сябе браць ня буду”. Смоліч рукі разлажыў: “Быў конь, ды зьезьдзіўся”.

Усё ж час ад часу заглядала на якое паседжаньне, праз цікавасьць, што робіцца... Мне казалі: “Заходзьце да нас часьцей”.— “Як госьць? А я гасьцём у беларускім руху быць не прывыкла”. Брацца за нейкую работу не хацела. Адна была думка: ехаць дахаты, да сваіх...

Тады ж Земскі саюз запрапанаваў мне правясьці курс садаўніцтва — практычна на Цне, дзе быў прытулак (і гаспадарка) для старшых хлапцоў. Былі там сад, агароды і поле. Быў аграном, але чамусьці практычных работ у садзе вясьці не хацеў. Я згадзілася. Жыла там, толькі на нядзелю прыходзіла да мамы.

Там работы працягнуліся да канца чэрвеня, а ўжо ў пачатку ліпеня мы пачалі старацца аб пропуску ў Гродна. Трэба прайсьці розныя ўколы супраць тыфусу, халеры, воспы... Падаць дакумэнты і — чакаць сваёй калейкі. Паміма ўсялякіх справаў, зьвязаных з выездам, мела я крыху часу, каб сяды-тады пацікавіцца грамадзкім жыцьцём. Тэатр Ф. Ждановіча працаваў, але і Галубок пачаў кратацца. Яшчэ ў канцы 1917 г. прывёз з Сергіева Пасада сваю сям’ю — жонку і шасьцёра дзяцей. Хлопцы былі малыя, але дзяўчынкі — Багуся і Люся — добра пелі і мелі вельмі прыгожыя галасы. Пастанавіў Галубок выступіць сам і вывесьці ў сьвет сваіх дзяўчат.

Спэктакль наладзіў у нейкім прыватным памяшканьні. Пакой вялікі, у ім зробленая маленькая сцэна, чатыры рады крэслаў для публікі. Насампе- рад выйшлі дзяўчаткі Багуся і Люся, у беларускіх вопратках, прыгожа пяялі некалькі песьняў, а пасьля сам Галубок выступіў у аднаасобавай камэдыі, нядаўна ім жа напісанай,— “Забыўся падперазацца”. Сорамна было за яго і балюча... Публіка, амаль уся паміж сабой знаёмая, не глядзела сабе ўзаемна ў вочы... Ніхто, даслоўна ніхто, не засьмяяўся. Гэта была не камэдыя, не “гу- марыстычны вадэвіль” (як цяпер пішуць), а нешта да таго пошлае і грубае, што і акрэсьліць трудна... Мо дзе на кірмашы ў балагане мела б посьпех... Але ці аўтар меў права прынізіць і сябе, і родную мову, каб спадабацца публіцы на найніжэйшым узроўні культуры? Заместа падымаць культуру — зьніжацца? Не, гэта былі хвіліны нямілыя, цяжкія... Разьвітваючыся, я змагла толькі ска- заць: “Як вы, пане Уладыславе, маглі пасьля “Апошняга спатканьня”, пасьля ўсіх апавяданьняў, якія я вам перапісывала, як вы маглі так сябе прынізіць?” Ён глядзеў, быццам не разумеў мяне, але маўчаў. Можа, крыху і задумаўся?

Часам заходзіла я да З. Бядулі — даведаецца, што робяць яго сёстры, як ім жывецца, ды ў рэдакцыю “Вольнай Беларусі”. Зайшла неяк у рэдак- цыю. Там сядзеў Бядуля. Быў і Я. Лёсік. Пагаварыўшы аб тым-сім, я спы- талася ў Бядулі, чым ён цяпер займаецца, што піша? “Усё шліфую “Плач у гарах”. Я зьдзівілася: “Яшчэ ўсё шліфуеце? Не раўняю я сябе ні з вамі, ні наогул з пісьменьнікамі, але я так не патрапіла б... У мяне як напішацца адразу — добра, а не — у кошык”.— “Ну,— кажа Бядуля,— як гэта магчы- ма пісаць без направак?” Лёсік слухаў, слухаў ды кажа: “А вы заместа гава- рыць бярыце паперу і садзіцеся пісаць, няхай кожны сваю рацыю дакажа”. Даў нам па картцы паперы, алавікі... Я думала нядоўга. Можа, туга па сваёй Горадзеншчыне, па школьных гадах над Нёманам навеяла мне тэму, але я хуценька, не адрываючы алавіка ад паперы, напісала абразок “Нёману” (“Праз акопы і рады штыкоў...”). Лёсік стаяў за мной і чытаў. Калі я скон- чыла, кажа: “Надпішыце”.— “Нашто?” — “Пойдзе ў “Вольную Беларусь”. Я падпісала: *Зоська Верас*. Першы раз ужыла псэўданім (Зоська, Зофія — маё другое імя, верас вельмі люблю, ды якраз нядоўга перад тым Лёня Лявіцкі, сын Ядвігіна Ш., прывёз мне з Карпілаўкі рана зацьвіўшы верас). Гэтая пад- зея была хіба адзінай мілай хвілінай, перажытай перад выездам з Менска. Мама цяжка рэагавала на розныя прафіляктычныя ўколы — хварэла. Час выезду быў штораз бліжэй. Сувязі з людзьмі, далёкімі і блізкімі, паступо- ва абрываліся. З Менскам ужо нічога не зьвязывала. Толькі Фальскія абое да канца былі сардэчныя і адданыя. Нарэшці наш чарод прыйшоў. Усе да- кумэнты ў руках, дзень назначаны. Едзем. Бывай, Менск!

ПЯЦЬ ГАДОЎ У АЛЬХОЎНІКАХ

На абставіны ў дарозе наракаць нельга. Немцы выгонаў не перапаўнялі, кожны даволі выгодна сядзеў, адносіліся нязгорш, у дарозе давалі каву, хлеб ды мармэляду. Прыехаўшы ў Горадню, даведаліся, што мусім, як і ўсе бежан- цы, адбыць карантыну ды прыняць прафіляктычныя ўколы — ізноў! Усіх загналі ў старыя вайсковыя казармы, якія знаходзіліся проціў вакзала — на другім баку чыгункі. Мама гаварыла добра па-нямецку, так што дамаглася асобнага па- кою, хоць таксама з салдацкімі нарамі. На другі дзень раніцай нямецкі сал-

дат прынёс каву і кажа: "Можна абысьціся і без уколаў, лазьні ды карантыны. Пайдзіце ў канцылярыю ды пагаварыце з пісарам — за нейкія 30 марак ён вам дасьць пропуск". Усё гэтак і сталася. Праз паўгадзіны пропуск быў у нас у руках. Памаглі перанясьці рэчы на другі бок чыгункі, на вакзал. Мы вольныя. Мы ў Горадні. Вярнуліся. Але як шмат перажыта...

На вакзале дзяжураць жанчыны з дабрадзейнага таварыства. Спатыкаюць бежанцаў, даюць патрабуючым помач, парады. Падыходзяць да нас, вітаюць. Пытаюцца, куды далей едзем. Мамам кажа, што ў горадзе мае першастрыечную сястру, перадусім яе трэба нам адшукаць. Пытаюцца прозьвішча. Мы кажам — Разалія Сівіцкая. І ўмомант усё наладжваецца. Гэтая мая цётка была сябрам гэтага ж дабрадзейнага т[аварыст]ва. Усе яе зналі і адрас ведалі. Запрапанавалі нам пачакаць і паслалі паведаміць цётку аб нашым прыезьдзе. Дзіўна нам шанцавала. Гэтага ж дня быў конь з Альхоўнікаў у горадзе...

Адразу цётка прыехала па нас на вакзал, паехалі да яе, крыху адпачылі і зараз жа далей — у Альхоўнікі... Дзедаў фальварак быў маленькі — усяго 35 дзесяцін. Называлі яго ў афіцыяльных сьпісках "имение", гэта таму, што ў нашых краях вялікіх маёнткаў не было, да таго ж, лічыўся спосаб гаспадараньня. У дзеда было 2 пары коняў, 10 кароў, цэнтрыфуга для малака, жнівярка, конная малатарня і вялікі (300 дрэваў) сад, пчолы, добры 5-пакаёвы дом. Гападарка вялася прагрэсіўна... А тут вайна ўсё адняла. Дзед памёр, гаспадарыла мая цётка, маміна сястра. Усё ж сад быў, агароды, усё, па чым я так тужыла ў Менску. Але прыняла мяне Сакольшчына варожа... У найбліжэйшую нядзелю ў Новым Двары пробашч кс. Ліпінскі, які ня ведаў мяне, пасьля казаньня з амбоны перасьцерагаў сваіх парафіян, каб ня мелі са мной ніякіх кантактаў, бо я "тры гады была у Менску, працавала ў бальшавікоў і напэўна буду займацца варожай для Польшчы агітацыяй".

Ніякай агітацыяй я наогул займацца ня думала. Праектавала вярнуцца да працы над батанічным слоўнікам, а пакуль што адпачывала целам і душой. Але і адпачынак ня вельмі ладзіўся. Мама хварэла штораз цяжэй. Дайшло да таго, што вельмі слабую завезьлі ў Горадню ў шпіталь. Трэба было рабіць апэрацыю...

Добра, што кіраўнік шпіталю хірург др. Тальгэйм быў добра знаёмы. Апэрацыя прайшла добра, але тры месяцы мама ляжала ў шпіталі. У той час нарадзіўся мой сынок. Цяжка было мне на душы і адзінока, пакуль мама паздаравела і вярнулася ў Альхоўнікі. Матэр'яльна нам нічога не бракавала, але ізноў пачаліся непрыемнасьці з боку кс[яндза] Ліпінскага... Ізноў публічна з амбоны закід: чаму 4 месяцы дзіця не ахрышчанае? Я папрасіла былога кіраўніка Горадзенскага гуртка беларускай моладзі кс. Грынкевіча, і той прыехаў і ахрысьціў дзіця ў нас дома. Хрышчоным бацькам быў брат ксяндза, студэнт Віленскага ўнівэрсытэту, а хрышчонай маткай — мая цётка.

Далей жылося нядрэнна. Усе былі здаровыя (праўда, малы хварэў на запаленьне лёгкіх, але няцяжка). Я працавала на гародзе, у садзе, пры пчолах. Напісала невялікую брашуру "Лекавыя зёлкі", якую, на жаль, студэнт Ст. Грынкевіч[1] і В. Тумаш узялі, каб пастарацца выдаць, ды рукапіс згубілі.

Даволі аднастайна праходзіла жыцьцё, аж пакуль не пачалася польска-бальшавіцкая вайна. Польскага войска мы ня бачылі, і Чырвоная армія, ідучы на Варшаву, неяк нас абмінула. Але затое як ішлі з-пад Варшавы назад — пачалося... Часьць пчолаў зьнішчылі... Было пару падсьвінкаў — закалолі... Авёс ды

ячмень снапамі клалі сваім коням пад ногі... Што ж, мы былі "буржуі", добры дом, піяніна ды 35 дзесяцін зямлі... Толькі грабіць...

Тры тыдні быў у нашым доме штаб фронту. Пасьля трох тыдняў пачалі падыходзіць палякі. Чырвонаармейцы акапаліся на нашым падворку, у садзе, пачаліся бітвы ад сьвітаньня да зьмярканьня. Мы гэты час праводзілі ў склепе пад сьвірнам. Не скажу, каб там было бясьпечна. Сьвіран быў мураваны, каб папалі ў яго з гарматаў, засыпала б нас напэўна. А сядзелі там адныя жанчыны і дзеці: мая маці, цёця, я з малым і дзьве сям'і сялян, што вярнуліся з бежанства.

На шчасьце, на другі дзень увечары чырвонаармейцы адступілі (часова), і прыйшла разьведка польская — афіцэр і пару салдатаў. Пабачылі, якая ў нас сытуацыя, і кажуць: "Добра, што мы прыйшлі і бачым, якія вы безабаронныя, будзем страляць, абмінаючы будынкі"... Раніцай, ледзь разьвіднелася, палякі адышлі, а чырвонаармейцы вярнуліся. Ізноў пачалося...

За будынкамі і за садам чырвонаармейцы трымаліся моцна. На чацьвёрты дзень польскае войска атрымала загад: "Калі ня здолееце ўзяць Альхоўнікі — паліце будынкі". Але да гэтага не дайшло. Чырвонаармейцам прыйшлося адступіць. Праз усе гэтыя чатыры дні было шмат параненых. Мы іх заносілі ў стадолу на разасланае сена. Я скончыла ў Варшаве санітарныя курсы, таму мыла, перавязывала раны, паіла кавай, карміла... Былі і забітыя, асталіся магілы на полі і на сенажаці. І так мы ацалелі. Толькі трэба было ўстаўляць пабітыя вокны ды тынкаваць падзіраўленыя сенцы. Але сад, сад! Глядзець было страшна: дрэвы пакалечаныя, галіны паламаныя, усюды сьляды ад гарматных куляў, асколкі...

Трэба было сад ратаваць. Што і як трэба рабіць, я ведала, але выканаць усё ня мела сілы. Наша суседка, удава, узяла сабе да помачы ўкраінца, аднаго з інтэрнаваных у Чэнстахове, і радзіла зрабіць тое самае. Гэтакім чынам апынуўся ў нас украінец Міхайла Бароўскі — студэнт-аграном. Добры быў чалавек, спагадлівы, прыхільны ды замілаваны ў сваім фаху. А ўжо пчолак любіў — да фанатызму! Кожную вольную хвіліну праводзіў між вульлямі, не спускаючы вачэй з пчолак, якія нясьлі ў гняздо пажытак: мёд ды пылок.

Бароўскі працаваў шчыра, як для сябе, але не пераставаў думаць, як бы вучыцца далей. Праектаваў унівэрсытэт, а дзеля гэтага трэба было вучыцца польскай мове ці, лепш сказаць, пісаць па-польску, бо гаварыць крыху ўмеў і чытаў нязгорш. Вечарамі я яго вучыла. У хуткім часе мы з ім пачалі супольна апрацоўваць кніжку "Медадайныя расьліны". Ён — па-украінску, я — па-беларуску. Ён тэму ведаў шмат лепш за мяне, так што я нямала скарыстала. Доля нашай працы была неаднолькавая, і ён выдаў прыгожую, багата ілюстраваную кніжку, а мае матэрыялы пайшлі ў "Беларускую борць", і то ня ўсе.

Знаёмства з М. Бароўскім, як будзе відаць з маіх далейшых успамінаў, было вельмі прыдатнае для Таварыства "Пчала". Пісаньне вечарамі польскіх дыктовак і праца над "Медадайнымі расьлінамі" мелі нечаканыя вынікі. У нас па старой традыцыі заўсёды жылі нейкія старушкі, удовы і г.д. На гэты раз мая цётка прыняла цэлую сям'ю — удаву і яе 6 дзяцей. Яна прыехала з Вільні да брата, які меў недалёка ад нас фальварак, але так яму з цэлай сям'ёй надакучыла, што ён яе проста выкінуў. Цёця — прыняла. І вось удава адудзячылася... Пайшла ў паліцыю і данясла, што ў нас вечарамі нешта пішуць, а пасьля некуды адвозяць... А гэта Бароўскі езьдзіў да пчаляроў, купляў для нас раі. Паліцыя на першы раз не зьвярнула ўвагі.

У хуткім часе Бароўскі сабраўся паехаць у Варшаву — даведацца аб магчымасьцях далейшай навукі. Удава — у паліцыю. На гэты раз паліцыя яе паслухала. Бароўскага перахапілі на вакзале станцыі Бяляны і павялі ў Новы Двор у пастарунак. Ноч пратрымалі, раніцай спраўдзілі дакумэнты і — выпусьцілі. Ён вярнуўся да нас, расказаў аб гэтай падзеі і паехаў. Тады паліцыя пацікавілася маёй асобай. Зрабілі рэвізію. Забралі некалькі кніжак менскага выданьня і візытны білецік майго бацькі, бо ён быў у расейскай мове: *Антон Михайлович Сивитский. Капитан 45-го пехотного Азовского полка*.

Забранае павезьлі ў Беласток, у ваяводзтва. Пару месяцаў пасьля ўсё ўзятае вярнулі. Трэба было пахвітаваць. Паліцыянт, вельмі глупаваты, даў мне ў рукі цэлую сашпіленую пачку дакумэнтаў. Я глянула, а там напісана: "Сакрэтна". Усьміхнуўшыся міла да паліцыянта, я сказала: зараз падпішу, а сама з усім гэтым — у другі пакой. Там разглядзела: гэта быў загад ваяводзтва — узяць мяне, пробашча суседняй парафіі ксяндза Хлявінскага і яшчэ трэцюю асобу (прозьвішча не запомнілася) пад нагляд. Я паперу аб прыняцьці кніжак падпісала, усё паліцыянту вярнула і таго самага дня паведаміла і кс[яндза] Хлявінскага, і таго другога чалавека, каб сьцерагліся.

Паўтара года я апеку адчувала. Паліцыя складала візыты і г.д. Гаспадарыць было вельмі цяжка. Што можна было зрабіць, маючы аднаго каня? Падвярнулася неяк адна сям'я — бацька, матка і трое іхніх маладых сыноў. Шукалі яны сабе нейкай арэнды. Бацька з адным сынам узялі недзе ў арэнду фальварак, а матка з астатнімі сынамі — у нас зямлю напалову. Загаралі, засеялі, прыйшла восень — сабралі ўраджай. Ужо памалацілі, і трэба было прымаць належнае нам збожжа. Я не напісала, што як толькі мы з мамай прыехалі у Альхоўнікі, цёця мая пасьпяшыла зьдзейсьніць летуценьне свайго цэлага жыцьця і пайшла працаваць вучыцелькай у Нова-Дворскую школу. Раней гэтага зрабіць не магла, бо не хацела астаўляць бацькоў адных. І вось трэба прымаць, важыць зярно, а дома хвароба: грып — гішпанка. Насамперад захварэла мама, пасьля служанка, а яшчэ і дзяўчынка, што даглядала малога. Я адна на нагах. Прывезьлі доктара. Усіх аглядзеў, запісаў лякарствы, а разьвітваючыся, кажа мне: "Вам таксама раджу легчы, у вас, відаць, гарачка". Я засьмяялася: "Што ж тады будзе? Паміраць нам усім?".

Даглядала хворых, прымала збожжа, не было часу думаць аб сваёй хваробе. Прайшлі гэтак восень і зіма. Дачакаліся вясны, а далей і лета. Пагода цудоўная. Горача. Усім горача, а мне зімна ды зімна: зябіць, дрыжыкі па плячах ходзяць. Мама кажа: "А памерай ты тэмпэратуру". Памерала і аж ахнула: у белы дзень 38,9. Я да доктара. Дыягназ: занятыя вярхі лёгкіх. Гэта помста гішпанкі. Прымала розныя лекі, але паправы не было: тэмпература трымалася, пачаўся кашаль. Адзіная рада — трэба зьбірацца ў Закапанае.

Пакуль здабылі грошы, пакуль сабраліся, ужо і Каляды прайшлі. Выехала ў самы Новы год. Мела адрас добрага і недарагога пансыянату і адрас доктара. Пансыянат быў далёка ад гораду, у гарах. Ціха. Сымпатычна. Кармілі вельмі добра. На другі дзень пайшла да доктара. Як заўсёды ў Закапаным, лекаў не было ніякіх, толькі паветра. Хадзіць мне можна было толькі адну гадзіну ў дзень! Рэшта часу — на адкрытай вэрандзе ляжаць на лежаку. Ляжаць то я паслушна ляжала, але хадзіла больш, праз дзень — у горад, у бібліятэку па кніжкі. Спала пры адчыненым вакне. Апэтыт шалёны. Вось гэты апэтыт ня даў мне пабыць у Закапаным даўжэй, як 6 тыдняў. Пачаліся клопаты са страўнікам. Але праз

гэтыя 6 тыдняў перастала кашляць, і тэмпэратура зрабілася нармальнай. Доктар парадзіў ехаць дамоў. Прыехала ў Альхоўнікі ў палове лютага здаровая.

Час праходзіў у хатняй працы, на гародзе, пры пчолах... Запісывала песьні, далей зьбірала назвы расьлін для слоўніка. Далей гэтак жыць было немагчыма. Цягнула да нейкай грамадзкай працы. Пастанавілі мы ехаць у Вільню. У 1923 годзе, у сакавіку, якраз на Казюка, паехала я ў Вільню разглядзецца, як там з кватэрамі. Думала забіраць з Альхоўнікаў свае пчолы, таму і кватэру трэба было шукаць адпаведную — з агародам.

У Вільні я спаткалася з Г. Леўчыкам. Ён тады ня меў працы, прыехаў з Варшавы з надзеяй, што знойдзе якую-небудзь працу ў Вільні. Але і тут яму не шанцавала. Г. Леўчык меў у Вільні нямала знаёмых беларусаў і памог мне знайсьці кватэру. На Антокалі — маленькай вуліцы — жыў сьвядомы беларус Мітрафан Кэпэль — працаўнік пошты. Брат жонкі Кэпэля Гур'янаў побач іх меў свой дом. Вось у яго была вольная кватэра. Два пакоі, кухня, вэранда, і пчолы ў садочку можна было паставіць. Усё як трэба. З гэтай добрай весткай паехала я ў Альхоўнікі. Адразу выслала Г. Леўчыку грошы, каб аплаціў гэтую кватэру, каб мець пэўнасьць, што гаспадар не аддасьць яе нікому другому. Але ехаць пастанавілі толькі ўвосені. Мама хацела ўзяць сваю часьць ураджаю з гаспадаркі, а я хацела праз лета зрабіць запас ягад, грыбоў, гарэхаў і г.д.

Трэба было мець як найбольш розных прадуктаў, бо працу магла я знайсьці няхутка, а з адной мамінай пэнсіі (па мужу) пражыць нялёгка было б. А год 1923 выпаў на дзіва ўраджайны. Я цэлыя дні праводзіла ў лесе. Ягадаў-пазёмак, малінаў, чарніцаў, а пасьля брусьніцаў — аграмадныя колькасьці. А пасьля грыбы... Толькі пасьпявалі варыць павідлы, канфітуры, грыбы сушыць, саліць... Гарэхаў назьбірала з ½ пуда, а ў садзе валоскія гарэхі таксама ўрадзілі, і на нашу долю дасталося нямала. Да таго ж, выгадавалі сабе парсючка, закалолі і прыгатавалі вяндліны. Але ўсё ж гэтыя клопаты мелі немалы смак горычы. Ад'езьдзіны з мілых Альхоўнікаў, разьвітаньне назаўсёды з тым кутком, да якога з самага раньняга дзяцінства так цягнула, моцна прыгнятала.

Так сышоў час аж да лістападу. Спакавалі ўсе свае мэблі (прывезеныя яшчэ з Кіева пасьля сьмерці майго бацькі), прадукты і г.д. Нанялі таварны вагон ад станцыі Бяляны (адна станцыя ад Гродна) — і ў дарогу! Я паехала з рэчамі таварным. Са мной — мамы хрышчоны сын, які меў нейкі час жыць з намі, і знаёмы ўкраінец Лявон Чарэп — для помачы. Мама з малым на другі дзень мелася выехаць пасажырскім. Па пчолы я зьбіралася прыехаць вясной.

ВІЛЬНЯ

Вось мы і ў Вільні... Пакуль упарадкавалі кватэру, наладзілі новае жыцьцё, прайшло пару тыдняў. Пара было думаць і аб працы. Дзе шукаць — ня надта я сабе ўяўляла... Але перш-наперш трэба было скантактавацца з беларусамі. Ці знайду каго знаёмага? Вайна ж параскідала людзей па ўсім сьвеце. Напэўны пункт — гэта кнігарня. А я нават няпэўная была, ці яна ёсьць на старым мейсцы — Завальная, 7.

У памяці аджывае 1912 год, спатканьне ў рэдакцыі "Нашай нівы" і кнігарні з А. Уласавым, В. Ластоўскім, Іванам Луцкевічам. Аб сьмерці апошняга я, зразумела, ведала.

Іду ў кнігарню. На шчасьце — знаёмы твар: Станіслаў Станкевіч[1]. Мы з ім пазнаёміліся ў Менску ўвосені 1917 г., ці ў пачатку 1918-га. Ён ехаў з Петраграду і затрымаўся быў некалькі дзён ў Менску. Цяпер спатыкаемся ў Вільні. Паведамляе, што кнігарня належыць да Беларускага Выдавецкага таварыства[2], а ён працуе як загадчык. Расказывае мне пра розныя падзеі ў Вільні, хто з беларускіх дзеячоў тут ёсьць. Думала запісаць сабе некаторыя адрасы, і да аднаго, да другога пайсьці. Але не пасьпела яшчэ нічога запісаць, як зьявіўся Сымон Рак-Міхайлоўскі! Абое мы ўсьцешыліся са спатканьня. С. Рак-Міхайлоўскі перад усім пацікавіўся, калі я прыехала ў Вільню і ці назусім? Даведаўшыся, што ўжо 2 тыдні таму, абурыўся: "І дагэтуль нідзе не паказаліся?" — "Зразумейце,— кажу,— я прыехала настала і не адна, а з маткай і сынам. Трэба было ўладкавацца, стварыць больш-менш выгоднае жыцьцё. А вось цяпер я ўжо чалавек вольны і гатовы да кожнай працы. Аб гэтым вам ідзе?" Засьмяяўся Рак-Міхайлоўскі: "Вядома аб гэтым, гультаяваць мы вам не дамо. Ідзем да Антона Луцкевіча"[3].

Ідзем. Рада буду аднавіць знаёмства з ім. А пазнаёміліся мы з ім у 1912 г., калі мяне запрасілі прыехаць на спэктакль — ставілі "Паўлінку" ў Клюбе палескага чыгуначніка. Прыехаўшы на пару дзён раней, я затрымалася ў сваёй школьнай каляжанкі, якая прыехала з Горадні ў Вільню і жыла ў свайго брата. У дзень спэктаклю я даволі рана пайшла у рэдакцыю "Нашай нівы", каб разам з працаўнікамі ісьці на спэктакль. Усе былі на мейсцы: Іван Луцкевіч, В. Ластоўскі, А. Уласаў ды яшчэ адзін, якога я дагэтуль ня знала,— Манькоўскі[4].

Крыху пасядзелі, пагаварылі, а тады Іван Луцкевіч кажа: "Ідзем! На спэктакль яшчэ рана, але зайдзем да Антона. Возьмем у яго гарбаты, а тады ўсе разам пойдзем на "Паўлінку". Антон Луцкевіч працаваў тады у "Вячэрняй газэце"[5], калі не мылюся, а рэдакцыя была пры Гарадзкой бібліятэцы. Там на месцы Антон Луцкевіч і жыў. Помніцца невялікая заля, вакол усіх сьценаў аграмадныя высокія, да столі, шафы з кнігамі. Пасярэдзіне маленькі столік. Прыйшоў са свайго пакою Антон Луцкевіч. Пазнаёміліся... Прынесьлі крэслы, талеркі з хлебам, вяндлінай, шклянкі і самавар. Будзьце гаспадыняй — мне кажуць. Што ж, гаспадыняй так гаспадыняй. Скінуўшы пальто, пачала наліваць усім гарбату. А ў памяшканьні — холад! А я ў лёгкай сьветлай сукенцы... Хоць невыгодна было есьці ў пальце, але прымусілі мяне яго надзець. Хутка пайшлі на спэктакль. Людзей — поўная заля... Вось цяпер, пасьля 2 гадоў, якія прайшлі з таго часу, усё паўстала перад вачамі.

С. Рак-Міхайлоўскі, пагаварыўшы з А. Луцкевічам, кажа мне: "Вось што, панічка, мы вам прапануем заняць мейсца адміністратара ў рэдакцыі грамадаўскіх газэт. Згодзіцеся?" —"Згадзіцца то я магу, але ці дам рады? Я ж з такімі справамі ніколі дачыненьня ня мела". Рак-Міхайлоўскі аж падскочыў: "А ў Менску вы да кожнай работы загадзя былі падгатаваны, ці што? А калі што трэба будзе на пачатку — паможам".— "Ну, калі так, добра".

Дамовіліся мы з Ракам-Міхайлоўскім спаткацца на наступны дзень у "Беларускай кнігарні". Тады пайсьці ў друкарню Левіна, пазнаёміцца з гаспадаром і з наборшчыкам, а адтуль — на Віленскую, 12, у рэдакцыю. Гэтак і было. Друкарня "Левін і сын" на вул. Нямецкай, 22 была невялічкай. Уваходзілася з бракамы. У першым пакоі — наборныя касы ды маленькі столік для карэктара. Карэктаркай працавала тады Яўгіньня Шэлека. У другім — машына друкарская, якую абслугоўваў машыніст — стары Пэрловіч. Ён жа — памочнік Левіна-сына.

Наборшчыкаў спачатку было трох: Уладзімір Рэшатаў, Дудка (імені ня помню) і старэйшы ўжо чалавек — латыш Магнус.

С. Рак-Міхайлоўскі пазнаёміў мяне з усімі, цёпла зарэкамэндаваў і, ня трацячы часу, пайшлі мы з ім у рэдакцыю. Па дарозе расказаў, што ў гэтай самай кватэры за сьцяной ці, лепш сказаць, за дзьвярамі зьмяшчаецца Таварыства беларускай школы, а далей — калідор, з якога дзьверы вядуць у пакойчык Антона Грыневіча, пакой Беларускага студэнцкага саюзу[6] і вялікі цёмны пакой, у якім жылі некаторыя зіц-рэдактары. Пакуль дайшлі, пасьпелі яшчэ вярнуцца думкамі да супольнай працы у Менску.

Вось мы ўжо на мейсцы. Глыбокая брама вядзе на вялікі брукаваны панадворак, налева — даўгі 2-павярховы будынак. На партэры — рад вокан. Амаль на рагу — уваход у сені, з якіх направа — дзьверы ў рэдакцыю. Насамперад — маленькі цёмны перадпакойчык. З яго направа — кухня-экспэдыцыя, дзе фальцуецца газэта. Проста — у самую рэдакцыю... Уражаньне страшнае... Не пакой, а нейкая пячора. Зімна, цёмна, брудна. Адзінае вакно зарасло павуціньнем і пылам... Падлога шэрая ад бруду, адзіны просты стол, 2 крэслы, вузенькая канцылярская шафа. Вось і ўсё.

Газэту падпісываў у той час, калі не мылюся, М. Шыла (я яго ведала з Менска). Адміністратарам быў аграном Янка Пачопка[7] — аўтар кніжак "Пчолы", "Садаўніцтва" і інш. Якраз і ён прыйшоў. Ня ведаю, ці быў папярэджаны, што я займу яго месца, але да ветлівай сустрэчы было далёка. С. Рак-Міхайлоўскі хутка разьвітаўся і пайшоў. Я папрасіла Я. Пачопку, каб пазнаёміў мяне з працай, якую маю выконваць. На гэта атрымала дзіўны адказ: "Што тут паказываць? Як будзеце рабіць, так і будзе добра".— "Хоць здайце мне кніжкі канцылярскія, дакумэнты і г.д." — "І здаваць німа чаго. Вось вам адзіная адрасная кніжка, сюды і падпіска ўносіцца".— "А рахункавая — расходная?" Пацiснуў плячыма: "Німа". Даў мне ключ ад дзьвярэй, і больш я яго ня бачыла.

Становішча незайздроснае. Што ж, трэба ўсё наладжваць ад пачатку. Але першая работа, за якую я ўзялася на наступны дзень, ня мела нічога супольнага з рэдакцыйнай працай. Прынясла я з сабой фартух, хустку на галаву, мятлу і ўзялася рабіць парадкі, зачыніўшыся на ключ. Перад тым яшчэ агледзела ўсе куты: за шафай, у шафе, у шуфлядзе стала ды ўсе куточкі ў кухні за плітой і хлебавай печкай уключна. І ня думала, сколькі мяне чакае неспадзянак. Перадусім у шуфлядзе стала і на полках у шафе — нямала адрэзкаў аб грашовых пераводах. Чаму яны так валяюцца? Але на гэта адказу буду шукаць пазьней. Пакуль што ня менш непрыемнае зьдзіўленьне выклікала безьліч пустых бутэлек. Ад віна, ад гарэлкі... Зрабілася цяжка, сумна... Гэтае "багацьце" я пакуль што не чапала. Вымыла вакно, абмяла павуціньне, прыбрала стол. Каб адпачыць, пайшла ў кнігарню да С. Станкевіча, купіла зялёнай паперы на стол і касавую кніжку. Заслала стол і, яшчэ тое-сёе паскладаўшы, пайшла дахаты.

Заўтра трэба прыйсьці раней. Зрабіць парадак з абрэзкамі, з адрасамі, бо праз дзень і газэта выйдзе. А я ня ведаю, як яе высылаць! Бо і экспэдытара пакуль ніякага не было. На шчасьце, С. Рак-Міхайлоўскі аб маіх клопатах не забыўся.

На другі дзень, як толькі я прыйшла ў рэдакцыю, зьявілася два ці тры вучні Віленскай Беларускай гімназіі[8], якія ўжо ня раз прыходзілі фальцаваць газэту, і з высылкай яе былі знаёмыя. Прыслаў іх Рак-Міхайлоўскі. Зрабілася крыху весялей на душы.

Такім чынам, усе адрасы дзеля высылкі газэты трэба было кожны раз пісаць пяром на вузенькіх кусочках паперы, якія наклейваліся на газэту. Тады раскладаліся газэты па поштах, зьвязываліся ў пачкі і адвозіліся возчыкам у галоўную экспэдыцыю. Мне такая работа здалася вельмі нерацыянальнаю. Трэба было нешта зьмяніць. Але насамперад трэба было зрабіць парадак з параскіданамі ўсюды грашовымі квіткамі. Тут выявіўся поўны хаос. На большай колькасьці адрэзкаў прозьвішчы новыя, ня ўпісаныя у адрасную кніжку. І грошы ў кніжку ня ўнесеныя. А раз у кніжцы гэтых новых адрасоў німа, значыцца, газэта не высылалася. Што там людзі думаюць? Нямала часу заняло мне ўпісываньне новых адрасоў і натаваньне падпіскі ў касавую кніжку. Але гэта гарантавала парадак на будучыню. Пачатак быў зроблены. Выйшла пару нумароў газэты, на шчасьце, не сканфіскавалі. Адрасы я пісала ад рукі, але ў першы вальнейшы дзень напісала адрасы і аднясла ў друкарню. Там іх набралі, адбілі большую колькасьць такіх аркушаў. Цяпер аставалася іх рэзаць і адразу раскладаць па поштах. Адразу работы паменшала і мне, і хлопцам. Толькі кожны раз трэба было дапісываць прозьвішчы новых падпісчыкаў. Адначасна я папрасіла, каб у кожным нумары газэты давалі мне крыху месца на квітаваньне атрыманай падпіскі. Падавала: "Ад адміністрацыі: ад грамадзяніна такога-то атрымана..."

Здаецца — драбнічка, а людзі, прачытаўшы, былі пэўныя, што рэдакцыя грошы атрымала і газэту вышле. Падпіска была штораз большая і большая. Аплачываць перасылку трэба было мне самой загадзя. Так я пазнаёмілася ў паштовай экспэдыцыі з яе кіраўнікам Каліцкім. Ён цікавіўся ўсімі беларускімі газэтамі і іншымі друкамі і заўсёды прасіў, каб яму па аднаму экзэмпляру прыносіла. У яго трэба было браць адумысловыя блянкі, у іх уносіць кошты і лік экзэмпляраў на кожную пошту, а падлічыўшы, аплаціць.

Цікава, што 5 гадоў працы ў рэдакцыі і знаёмства з Каліцкім перетрывала доўгія гады. Спаткаўшыся неяк на вуліцы у 50-я гады, мы з ім успаміналі высылку беларускіх газэт. Маім абавязкам было купляць паперу. Купляла або на Завальнай, дзе раней быў магазын з гаспадарчымі прыладамі З. Нагродзкага[9], або на адным з жыдоўскіх складоў паперы ў ваколіцы Рудніцкай. Ня раз трэба было нямала пахадзіць, пакуль знаходзілася папера адпаведнага фармату і гатунку. Час ад часу трэба было заглядаць і ў друкарню, каб ведаць, як справа з паперай, калі выйдзе газэта і г.д. Наборшчыкі і карэктарка прыходзілі па плату да мяне ў рэдакцыю, Левіну адносіла я ў друкарню. Грошы прыносіў хто-небудзь з паслоў як складку ад Пасольскага клюбу. Кожны месяц, зрабіўшы разрахунак, я здавала яго разам з грашовымі дакумэнтамі найчасьцей С. Раку-Міхайлоўскаму.

Сваіх рэдактараў я мала бачыла — мяняліся яны вельмі часта. Як зьяўляліся, так і зьнікалі. Прыйдзе такі зіц-рэдактар на гадзінку, разьбярэ пошту... Што тычыцца адміністрацыі — аддасьць мне, карэспандэнцыі — супрацоўнікам газэты. Па пэўным часе далі мне і экспэдытара. Пацеха з яго была невялікая — падмяце падлогу, напаліць у печы, адвязе газэту на пошту — вось і ўсё. Часам экспэдытар рабіўся рэдактарам.

Найбольш жыцьця ўносілі гімназісты. Працавалі ахвотна, сумленна. Заўсёды вясёлыя, у добрых гумарах і ветлівыя. Амаль усе яны жылі ў інтэрнаце. Ня надта там было цёпла і сытна, але не наракалі, не бедавалі. У першы дзень, як мы пазнаёміліся, работу мелі незвычайную. Я ім загадала прынясьці мяшкі

і грунтоўна ачысьціць рэдакцыю ад бутэлек. Прадайце іх, кажу ім, падзяліцеся грашамі. Яны так і зрабілі.

Калі работа наладзілася, у мяне аставалася нямала вольнага часу. Перадусім дастала адпаведную скрыначку і зрабіла картатэку падпісчыкаў, падзяліўшы адразу на пошты. У выпадку перамены адразу было лягчэй адшукаць патрэбнае прозьвішча.

Штораз больш людзей наведывала рэдакцыю. Часам прыходзіў хто з прыехаўшых у Вільню падпісчыкаў, заходзілі паслы, заглядалі студэнты. У той час вучыўся на юрыдычным факультэце мой калега з Горадзенскага гуртка беларускай моладзі Адольф Зянюк. Ён нейкі час падпісываў як рэдактар "Студэнцкую думку"[10]. Вось ён ад імя рэдакцыі запрапанаваў мне даваць ім у друк свае дробныя творы. Я ахвотна згадзілася, а са свайго боку дапамагла яму выпускаць часопіс, калі гэта выпадала падчас экзамінацыйнай сэсіі, і ён ня меў часу. Давалі мне матэрыялы, грошы, а я аддавала гатовы нумар, бо і карэктуру сама рабіла.

Ведаючы ад А. Зенюка аб маёй працы ў Менску, часта прыходзілі студэнты — падзяліцца сваімі праектамі ў працы Студэнцкага саюзу, парадзіцца. Напрыклад, яны хацелі адчыніць студэнцкую сталоўку. Мы нават хадзілі з імі аглядаць адпаведныя кватэры, укладалі бюджэт. Але нічога ня выйшла. Проста не было патрэбнага капіталу.

Пад восень 1924 г. зьявіўся новы рэдактар — Антон Войцік[11], запрошаны на гэтую пасаду паслом Гаўрылікам[12]. Падпісываў газэту "Сялянская праўда"[13]. Адразу зазначыліся зусім іншыя паводзіны, чым ранейшых рэдактараў. Сядзеў у рэдакцыі, апрацоўваў карэспандэнцыі, цікавіўся усёй адміністрацыйнай і рэдакцыйнай работай. Немала памагаў у маёй рабоце. І людзей пачало больш прыходзіць, каб пагаварыць з рэдактарам.

Часта ў карэспандэнцыях і ў лістах траплялісі пытаньні зьместу сельска-гаспадарчага. То пыталіся аб нейкай патрэбнай у гаспадарцы фаховай кніжцы, то дзе ёсьць і па якой цане штучныя гнаі і г.п. Я сумленна даведывалася ў адпаведных крамах, кнігарнях і г.д. і адказывала лістоўна. Але падумалася, ці ня трэба зрабіць які-небудзь гаспадарскі дадатак пры газэце?

Канфіскаты тады здараліся вельмі часта, а тады наступны нумар выходзіў з белымі плямамі, або трэба было на замену набраць адзін артыкул. У такіх выпадках наборшчыкі цэлы дзень нічога не рабілі. А плацілася ім месячна, значыцца, і гэтыя пустыя дні былі аплачаныя. Магчыма, яны згодзяцца ў такі час набіраць гаспадарчы дадатак? Аплаціць трэба было друк і крыху паперы. Разумеецца, дадатак не да кожнага нумару, а адзін раз у месяц. З гэтым праектам я зьвярнулася да С. Рака-Міхайлоўскага. Ён мяне ведаў і яшчэ ў Менску да маіх праектаў прывык. "Значыцца, раскручываецеся? Добра! Пойдзем да Антона Луцкевіча, пагаворым". Пайшлі. Я паўтарыла свае думкі. "А хто вам фахова паможа?" Я ўжо аб гэтым думала. Тут быў знаёмы яшчэ з Менска Янка Крыўка. Ён па спэцыяльнасьці садаўнік, але майстар на ўсе рукі. Напэўна, паможа. "Калі ўжо ўсё абдумалі — рабіце".

І так пачалася новая работа. Я. Крыўка ахвотна згадзіўся памагаць. "Гаспадарчы дадатак" выйшаў у наступных газэтах: "Жыцьцё беларуса", "Беларуская ніва", "Беларуская справа", "Народная справа". Былі яшчэ два "Гаспадарчыя дадаткі", але не захаваліся, і пры якіх газэтах выйшлі — ня помню. Памалу і супрацоўнікі знайшліся. Зьмест "Гаспадарчага дадатку" быў даволі

багаты і разнастайны. Нават платныя абвесткі ўдавалася дастаўваць. І Зыгмунт Нагродзкі даваў абвестку. Дадатак друкаваўся асобна, і трэба было яго ўлажыць у кожны экзэмпляр газэты. Гэта займала нямала часу. Але хлопцы-гімназісты не наракалі, а нават самі цікавіліся зьместам дадаткаў.

ШЛЮБ З АНТОНАМ ВОЙЦІКАМ І ПЕРАЕЗД У ЧЫГУНАЧНУЮ КАЛЁНІЮ

Тут прыйдзецца вярнуцца назад... Неяк летам 1924 г. захварэла мая мама, і прыйшлося ёй легчы у шпіталь. Становішча сталася складаным: што рабіць з сынком? Яму было 5,5 гадоў. Астаўляць аднаго — немагчыма. Ні гаспадары дому, ні суседзі на апекуноў не надаваліся. Прыходзілася браць малога з сабой у рэдакцыю і трымаць некалькі гадзін у халодным памяшканьні. Брала з сабой некалькі бутэрбродаў, а ў поўдзень ішла ў суседнюю кавярню выпіць гарачага малака. Сынок мой быў спакойны, разумеў, што інакш нічога не парадзім, і ўвесь час рысаваў. Давала яму паперу, чырвоны і сіні алавікі, і ён на паасобных картках рысаваў караблі, лодкі з ветразямі, мора... Мора спакойнае, мора бурлівае. Хвалі... хвалі... хвалі... Адыходзячы дамоў, я тыя "мастацкія творы" выкідала ў кошык. Але мае памочнікі-гімназісты запратэставалі! Як можна так нішчыць дзіцячую працу? Павыбіралі лепшыя малюнкі, распрасталі і павывешвалі на сьценах. Пасьмяялася я з тае выстаўкі і загадала паздымаць. На шчасьце, мае гэтыя клопаты нядоўга трывалі.

На нашай вуліцы праз некалькі дамоў ад нас жылі дзьве старушкі. Адна — зусім сляпая, і яе сястра, што сьляпую даглядала. Вось гэтая малодшая старушка падсьцерагла нас, калі мы праходзілі міма яе дому, і запрапанавала, каб малога астаўляць у яе. Хоць мы дагэтуль не былі знаёмыя, я ахвотна згадзілася, і сынок не пратэставаў. Надаела яму бяз руху сядзець у рэдакцыі. Праз нейкі тыдзень мая мама змагла вярнуцца дахаты, і жыцьцё пайшло нармальна.

Выходзіла "Сялянская праўда". Канфіскаты час ад часу здараліся, але ўсё ж выйшла аж 25 нумароў! Двадцаць пяты адбілі золатам — першую старонку. Апрача працы ў газэце А. Войцік увесь час апекаваўся палітычнымі вязьнямі. Прыгатаўляў пачкі з прадуктамі, падбіраў кніжкі, газэты. У той час быў у нас экспэдытарам Закрэўскі. Мала я яго помню. Нерухавы быў, павольны. А. Войцік пытаўся яго: "Ці вам мама казала цяжка не падымаць? Што вы носіце па тры пачкі газэтаў да возчыка?". А чалавеку было гадоў 30, высокі, добра збудаваны. Малапісьменны, так што карысьць ад яго была невялікая. Газэты і кніжкі для вязьняў трэба было адносіць у пракуратуру. Адтуль з пячаткамі і подпісам пракурора яны адсылаліся на Лукішкі. Хадзіла ў пракуратуру заўсёды я.

Але вось меўся выйсьці 26-ы нумар "Сялянскай праўды". Я прыгатавала адрасы, сядзім, чакаем. А газэты — німа. "Пайду,— кажа А. Войцік,— пагляджу, што там сталася?" Як пайшоў — так і сам прапаў. Чакала я, чакала ды страціла цярплівасьць. Зачыніла рэдакцыю на ключ і пайшла ў друкарню. Адчувала я, што нічога добрага не застану, але такой навіны не спадзявалася. У друкарні быў Левін і ўсе наборшчыкі. Сядзець, як на хаўтурах... Што сталася? Канфіската? "Мала таго, што газэта сканфіскаваная, рэдактар арыштаваны... Павязьлі адразу на Лукішкі!".

Вось так справы. А. Войцік нікога блізка знаёмага ня меў. Забралі, як стаяў... Якраз прыйшоў да яго ліст ад маткі і братоў. Да ўсяго, нядаўна ўзяў ён на выпла-

ту зімовае пальто (прыехаў у салдацкай шынэлі), трэба плаціць кожны месяц. Усё гэта трэба абгаварыць. Німа рады, трэба ісьці ў пракуратуру, дастаць пропуск на пабачаньне. Мне і ў галаву не прыйшло, што перад канцом пабачаньняў не даюць... Але я дастала! Сказала, што ня ведаю, што рабіць з наборшчыкамі, экспэдытарам і г.д. Ці іх зволіць, ці трымаць? Відаць, усё было праўдападобна, бо пабачаньне далі ў той самы дзень... Пасьля паслы надзівіцца не маглі, як гэта мне ўдалося. Далі новага рэдактара, пачала выходзіць новая газэта.

Усіх рэдактараў я ня помню. Былі У. Варава, Германовіч (спачатку быў экспэдытарам), Серафім Татарын[1], Міхась Машара[2]. Быў яшчэ адзін, недзе з Беласточыны, інтэлігентны чалавек, прозьвішча ня помню.

Далей работа ішла, як заўсёды. Толькі што прыбыло падапечных вязьняў, бо менш-больш у той час трапіў на Лукішкі сэнатар Сабалеўскі[3], і Рак-Міхайлоўскі прасіў мяне і яго ўзяць пад апеку. Трэба ўспомніць яшчэ адну падапечную. Сядзеў у астрозе Макар Косьцевіч[4] (Краўцоў). За што — ня ведаю, і ніхто ня помніць. Асталася яго жонка — без ніякіх сродкаў для жыцьця. Паслы пастанавілі ёй даваць кожны месяц грашовую дапамогу. Даручылі гэта мне. Рак-Міхайлоўскі ведаў, дзе Косьцевічыха жыве, але ня ведаў нумару дому. Таму першы раз пайшлі мы з ім разам. Паказаў мне здалёк дом. Ідучы, казаў: “Памагчы трэба, але гэта проста амаральна, каб маладая здаровая жанчына не шукала сабе працы, а чакала ласкавай дапамогі”. На другі месяц ізноў паўтарыў тыя ж словы. Тады я яму кажу: “Нашто вы мне гэта кажаце? Я ж ёй не паўтару”.

Але сапраўды Косьцевічы былі людзі нейкія нежыцьцёвыя. Ён рэдка калі меў сталую працу. Найчасьцей быў зарэгістраваны як безработны і даставаў невялікую дапамогу. Як ён сядзеў, то жонка жыла ў некага на куце — мела ложак, пастаўлены ў кухні. Як Макар Косьцевіч выйшаў з астрогу, то ня мелі дзе дзецца, не было за што наняць кватэру. Але тут ім пашанцавала. На даўнейшай Папоўскай вуліцы нейкі стары расеец меў драўляны дом на 7 кватэраў, а пры ім садок, у панадворку — гаспадарскія будынкі. Быў ён адзін як палец. Сам сабе варыў, спратываў, мыў бялізну, даглядаў гарод і садок. Пры гаспадарчым будынку ён агарадзіў пакойчык, паставіў печку і пліту і аддаў кватэру Косьцевічам зусім бясплатна. Паміж іншым, у гэтым доме ў мэзаніне жыў і дырэктар Беларускай гімназіі С.К. Паўловіч[5] з жонкай (удава, і цяпер там жыве).

Калі Косьцевіча вывезьлі, а пасьля яго жонка апынулася у нямецкім канцлягеры, гаспадар дому аб іх не забыўся. Калі Косьцевічыха вярнулася і прыйшла да яго, ён запрапанаваў: “Апякуйцеся мной да маёй сьмерці, пахавайце, а я вам запішу свой дом”. Так і было. Я ў яе даволі часта бывала. З платаў за кватэры жыла яна нядрэнна. Пляменьніца прасіла яе прыехаць у Варшаву, але Косьцевічыха не хацела. Яна — сама варшавянка — навучылася добра гаварыць па-беларуску і да самай сьмерці гэтай мовай гаварыла. Пасьля вайны ў яе дом адабралі. Далі пакойчык з кухняй і невялікую пэнсію. Памерла адзінокай, нават праз пару дзён ніхто ня ведаў, што яна не жыве. Вось гісторыя адной нашай сам'і.

Але вярнуся да А. Войціка. Газэту канфіскавалі за карэспандэнцыю аб зьдзеках паліцыі над сялянамі. У карэспандэнцыі аўтары абяцалі паставіць, калі трэба будзе, сьведкаў. Падалі нават іх прозьвішчы і адрасы. Паслы прасілі мяне пайсьці да адваката Урублеўскага дагаварыцца аб абароне і высьніць, якія дакумэнты яму патрэбныя. Аказалася, што адвакат Урублеўскі хворы, за абарону не бярэцца, і параіў пагаварыць з яго сынам, адвакатам Садкоўскім, які жыў на Вялікай Пагулянцы (сёньня вул. Басановіча).

Я пайшла. Але абарона нічога не дала, бо з выкліканых сьведкаў ніхто не прыехаў. Адсядзеў рэдактар 9 месяцаў. Тады звольнілі ўмоўна да апэляцыйнага суду. Апэляцыйны суд адбыўся ў кастрычніку 1927 г., далі яшчэ 2 месяцы... А падчас умоўнай свабоды ў кастрычніку 1926 г. мы з А. Войцікам пажаніліся. Сьведкамі на шлюбе былі гр[амадзянін] П. Каруза[6] і Альбін Стэповіч[7]. Калі ішоў адсядзець 2 месяцы, у нас ужо была двухмесячная дачка...

У жніўні 1927 г. мая мама атрымала грошы са спадчыны па сваім бацьку, і мы пастанавілі купіць домік з агародам. Доўга шукалі, аглядалі у розных мейсцах, нарэшці знайшлі адпаведны аб'ект у Калёніі Каляёвай (Чыгуначнай калёніі, цяпер — Павільнюс). Мы ўсё аформілі, але перабірацца туды з Вільні прыйшлося ўжо бяз мужа. Добра, што прыехаў яго малодшы брат Вацюк і ва ўсім дапамог. Калёнія Каляёвая — гэта было каапэратыўнае таварыства, да якога належалі пераважна чыгуначнікі, але былі і прыватныя асобы. Трэба было заплаціць пай. Дзеля гэтага трэба было мне пайсьці на чарговы агульны сход таварыства. Дом быў куплены на маё імя. Я пайшла, падала адпаведную заяву. Управа таварыства, а з ёй і цэлы агульны сход, моцна задумаліся. Як можна прыняць у сябры работніка беларускай радыкальнай газэты? Пастанавілі адмовіць. Але на пасяджэньні быў пасол Ф. Ярэміч[8]. Ён бачыў, да чаго сход імкнецца, хуценька напісаў нейкую паперку, устаў і кажа: "Бачу, што ня хочаце прыняць у сябры беларуску. Тады прыміце маю заўвагу аб выхадзе з сяброў таварыства Калёніі. Я ж таксама беларус, а значыцца, і мне тут німа мейсца". Управе не было выхаду. Выкінуць пасла — вялікі скандал. Хацелі ці не, але мусілі прыняць і мяне.

Пражылі мы там 10 гадоў. Нядрэнны мелі драўляны дом: 4 пакоі, кухня, сені, перадпакойчык, вэранда, лазьня, гаспадарчая прыбудова і ¼ гэктару агароду, на якім былі і яблыкі, і маліны, і вішні. Прывязьлі свае пчолы, і вясной узялася я за агарод. Нялёгка было, бо ў рэдакцыі працавала [redacted] адна. Рэдактары, як заўсёды, толькі паказваліся. Рак-Міхайлоўскі і А. Луцкевіч прапанавалі мне ўзяць сабе каго ў памочнікі, але [redacted] не хацела. Узяць чалавека незнаёмага — трэба яго пільнаваць, наказываць. То ўжо лепш зрабіць самой. Работы было шмат, бо ўжо з сакавіка 1927 г. выходзіла "Заранка"[9]. Аб "Заранцы" ўжо напісана, паўтараць ня буду. Толькі мушу дадаць, што цяпер, у 50-я ўгодкі "Заранкі", спаткала мяне вельмі непрыемная неспадзянка. Аказалася, што ў архівах партыйных знайшліся запісы, быццам Таварыства беларускай школы[19] са свайго беднага бюджэту аплачывала кожны месяц 250 злотых — на дапамогу "Сасе"[11] ("Саха" ў той час не выходзіла) і "Заранцы", якая была далёкай ад радыкальных напрамкаў. А папраўдзе, "Заранка" нічога супольнага з ТБШ ня мела і ніколі ні аднаго злотага адтуль не атрымала. Мо ў ТБШ былі якія недахопы ў разрахунках і спосабам нейкай хлусьні іх выраўнівалі?

Аб выхадзе ў 1925–26 гадах "Беларускага адрыўнога календара" я пісала асобна. Далей сядзела ў рэдакцыі, ня раз дапазна. Мерзла... С. Рак-Міхайлоўскі часам прыходзіў з жонкай і выцягіваў мяне на сьвет божы: "Хопіць мерзнуць, ідзем, усё роўна ўсяго не пераробіце". То прайсьціся забіралі, то на абед у "Эўрапейскі гатэль". Бывалі ў нас дома, і я часта з малым ці з мамай у іх гасьцявала. Дачка Міхайлоўскіх Рагнеда была равесьніцай майго сына.

У Вільні выходзіла польская гаспадарчая часопісь "Tygodnik Rolniczy". Дагэтуль ня ведаю, чаму і па чыёй ініцыятыве рэдактар гэтай часапісі запрапанаваў мне пасаду адміністратаркі ў сябе. Я падзякавала і адмовілася, матывуючы, што я ж працую і ня маю ніякіх падставаў гэтую працу кідаць. Па нейкім

часе рэдактар асабіста прыйшоў і паўтарыў прапанову... Зразумела, я ізноў адмовілася. Думаю, ці ня Крыўка гэта прыдумаў? Ня раз абураўся, што я ў такіх дрэнных умовах працую. Холад, ужо аж ногі пачалі балець, і вады не было, няможна было мець на мейсцы гарачай гарбаты. Наогул, аб палепшаньне абставінаў ніхто ня дбаў. Гэта ня Менск, дзе ўсе былі "роўныя". Тут былі "касты". Людзі высока пастаўленыя — паслы, сэнатары, дырэктары і людзі шэрыя... Усе выступленьні, прамовы аб роўнасьці, брацтве і г.д. былі "на вынас", а на мейсцы — зусім інакш. Прыкра ўсё гэта было. Мы з мужам стараліся жыць сваім жыцьцём і не зьвяртаць увагі на "вышэйшы круг". Я да гэтакіх адносін не прывыкла, таму і займалася самастойна "Заранкай" ды іншымі справамі, а гэта ізноў не падабалася. Занадта была незалежнай.

Усё ж стварыўся круг знаёмых: Шнаркевічы[12], С. Паўловіч і яго жонка Марыя Мікалаеўна ды інш. Добра чулася ў Рак-Міхайлоўскіх ды Луцкевічаў. У рэдакцыю па-ранейшаму заглядалі студэнты М. Марцінчык[13], Ермаковіч, М. Тулейка[14], Якімец і др.

Аб рэвізіях, арыштах грамадаўцаў не ўспамінаю, бо аб гэтым шмат напісана. Толькі дадам, што ў нас, яшчэ калі жылі ў Вільні, у канцы 1926 ці напачатку 1927 г. была рэвізія ўночы, але толькі ў тым пакоі, дзе я жыла з мужам. У пакоі маёй мамы нічога не чапалі. Я загадзя вынесла з дому ўсё, што тычылася маёй працы ў рэдакцыі — розную драбязу, што насіла з сабой у торбачцы: нататкі, квіты і г.д. Так што неяк абышлося.

ТАВАРЫСТВА "ПЧАЛА" І ЧАСОПІС "БЕЛАРУСКАЯ БОРЦЬ"

Як жа далёка трэба вярнуцца думкамі! Ажно ў 1914 год! У гэты год, першага ліпеня, я скончыла ў Варшаве курсы садоўніцтва, агародніцтва і пчалярства і атрымала пасьведчаньне на працу аб'язнога інструктара. Курсы былі ўсяго дзесяцімесячныя, але праграма багатая, дала шмат ведаў — і тэарэтычных, і практычных. Да абеду вывучалася тэорыя: садаўніцтва, агародніцтва, пчалярства, батаніка, хімія, энтымалёгія і г.д. Другую палову дня займала практыка. Ня толькі на пчольніку, у садзе ды агародзе, але і ў шклярнях. Працавалі вельмі інтэнсіўна. Але вось і канец. Я паехала ў Сакольшчыну, дзе ў дзедавым фальварку чакала мяне маці

Яшчэ едучы на курсы, я ўсё меркавала, як бы здабытыя веды выкарыстаць на грамадзкім грунце. Карэспандуючы ўвесь час з супрацоўнікамі "Нашай нівы" і віленскай "Беларускай кнігарні", я ня раз успамінала аб сваіх праектах

Але праз пару тыдняў пасьля майго звароту ў Сакольшчыну пачалася вайна! Усе праекты адкладываліся на няведама які час.

Пакуль цягнікі хадзілі і пошта працавала, я не пакідала кантактаў з Вільняй. У лютым 1915 г. я атрымала надзвычай цікавы ліст ад В. Ластоўскага. Ліст, зьмест якога быў цесна зьвязаны з маімі думкамі і праектамі. Вось ён:

"Шаноўная панна Людвіка! Шырэй працаваць Вы здолееце толькі на шырэйшым полі, дзеля гэтага, мне здаецца, трэба было б найперш адкрыць пчалярскае таварыства, мо найлепей у Вільні ці Гродні, праца каторага абхапіла б, прынамсі, губэрні: Гродзенскую, Віленскую, Менскую, Магілёўскую. З канторай і складам пчалярскіх прылад у каторым з гэтых гарадоў. Тады ў Вас знойдзецца практыка па Вашай спэцыяльнасьці, а склад можа даваць апрача практыкі сам па сабе нязгоршы даход.

Такое пчалярскае таварыства можна зрабіць як аддзел Расейскага Імпэратарскага *Общества пчеловодства*. Яны даюць фірму, даюць падмогу грашамі і крэдыт на тавары, а што найважнейшае, не ўтыкаюць у гэтую справу палітыкі, а дзеля гэтага можна арганізаваць курсы і ў сваёй мясцовай мове, выдаваць брашуры, адозвы, мець лекцыі, рабіць выстаўкі і ўсё іншае.

Калісь, гады два таму, я насіўся з гэткім праектам, г.зн. каб адкрыць такое таварыства, але тады не было сваіх людзей. Таварыства можна было адкрыць, але яно не было б беларускае, і вось дзеля таго закінуў гэтую думку да лепшых часоў, да тых часоў, калі ў нас будуць свае людзі.

Мо ўжо цяпер і можна было б узяцца за гэтую працу? У садзе Вашага дзеда можна было б арганізаваць паказную пасеку для Гродзешчыны, у Віленшчыне знойдзецца таксама чалавек, каторы будзе ўтрымліваць такую пасеку, у Меншчыне таксама, цяжка толькі з Магілёўшчынай. Але не безнадзейна і там.

Панна Людвіка, абдумайце мой праект і напішыце свае думкі. Я веру, што праект добры, бо дае поле і да працы ідэйнай, і да падняцьця эканамічнага нашай старонкі".

Якія ж шырокія гарызонты, якія пэрспэктывы... Здаецца, на крыльлях паляцела б пачынаць працу! Але — на перашкодзе стаяла вайна. Трэба чакаць. Пакуль што практыкавала ў дзеда: памагала даглядаць пчолаў, выбіраць мёд.

Немцы надыходзілі. Мы з мамай пастанавілі ехаць у Менск, ці лепш пад Менск, куды нас запрашаў мамін швагра. Выехалі 15 жніўня 1915 году. Аб трох гадах, праведзеных у Менску, працы там, пішу ў іншым месцы. Тут толькі прыпамінаю сабе працу ў сваім фаху.

У 1916 годзе Таварыства помачы ахвярам вайны пастанавіла наладзіць кароткія курсы садаўніцтва і агародніцтва з дадаткам пчалярства для бежанцаў, зарэгістраваных у нашым Камітэце. Мы лічылі, што нядрэнна будзе гаспадарам, якія вернуцца на свае зьнішчаныя гаспадаркі, умела ўзяцца за іх аднаўленьне. Пайшла я да губэрнатара па дазвол на арганізацыю такіх курсаў. Але ён адказаў, што гэта не ў яго кампэтэнцыі, і параіў дадаць заяву, прашэньне ў Міністэрства земляробства. Мы падалі і надзіва хутка атрымалі дазвол. Гэта былі першыя афіцыяльныя курсы, якія вяліся на беларускай мове. Вялі мы іх удваіх: Янка Крыўка і я.

Захаваліся праграмы курсаў. Навука трывала 45 дзён. Заняткі кожны дзень: ад 9 раніцы да 11, і ад 2 да 6. Практычныя заняткі — у садах, агародах, інспэктах. Практыку вялі ў Русецкіх на Старажоўцы. Пры 315 гадзінах на садаўніцтва адводзілася 100 гадзін, на агародніцтва — 150 гадзін, на пчалярства і прыкладныя навукі — 65 гадзін. Чыталіся розныя рэфэраты, напрыклад, "Карысныя і шкодныя птушкі ў нашых садах" і г.д. Гэтакія тэмы апрацоўвала найчасьцей я. Было цяжка. Ані адпаведных кніжак на беларускай мове, ані знаёмства з назвамі птушак, расьлін, казюлек і г.д. у нас не было. Толькі "Саха", якая дагэтуль выйшла, крыху памагала. У большасьці трэба было ўсё вышуківаць, перакладаць, а то і проста ствараць.

Усё ж неяк ішло. Слухачоў было няшмат і ўсе рознага ўзросту: старыя, сівюсенькія дзядулькі і маладыя. Аднаго добра помню: Эдзік Падгайскі з Ашмяншчыны. Найбольш быў рупны, цікаўны, працавіты. Усё гаварыў аб тым, як гэта ён вернецца на сваю гаспадарку, як будзе праводзіць у жыцьцё здабытыя веды.

Апошнія экзаміны адбыліся ў прысутнасьці Ядвігіна Ш. і гарадзкога агранома. Выдалі пятнаццаць пасьведчаньняў аб скончаных курсах. Ізноў розная штодзённая работа, а пчолы, сады, агароды — толькі ў снах...

У ліпені 1918 г. мы з мамай, якая была паважна хворая, выехалі дамоў, у Сакольшчыну. Дзед мой памёр, гаспадарыла мая цётка. Пчолаў не было каму глядзець. Некалькі сем'яў загінула, а тыя, што засталіся, былі ў страшэнным стане. Узялася я даводзіць іх да парадку. Пару старых вульляў выменяла ў старога пчаляра-селяніна на раі. Паехаўшы да яго ў вёску Куляўцы, я апынулася ў сівой мінуўшчыне. Невялікі садок, а ў ім пчолы ў калодах! Ды ня толькі ў калодах-стаяках, але і ў лежаках, якія я ўпершыню ў жыцьці пабачыла. Калоды мэтры па два ляжалі на траве на нізенькіх казлах, крапіва, лебяда... Вылет амаль каля самай зямлі... Пчолы скрозь траву прабіваюцца. Зьверху, каб дожджык не заліваў, калода пакрыта пластамі яловай кары, прыціснутай каменьнямі. Але, відаць, і пчаляру надаела так гаспадарыць, бо ахвотна згадзіўся выменяць 3–4 раі на рамовыя вульлі.

У той час у нас гасьцяваў украінец, студэнт-аграном Міхайла Бароўскі — замілаваны пчаляр. Я вельмі шмат скарыстала з гутарак з ім аб пчолах. Апрача таго, мы з ім разам узяліся пісаць кніжку "Медадайныя расьліны". Ён пісаў па-украінску, я — па-беларуску. Так мінуў час аж да 1923 году, у якім я з сям'ёй выехала ў Вільню на сталае жыцьцё. Да сьнежня 1923 г. я ўжо працавала адміністратаркай грамадаўскіх газэт. Паміма таго, што работа займала шмат часу, была магчымасьць знаёміцца з віленскімі і прыяжджаючымі ў Вільню беларусамі, паміж якімі спатыкаліся і замілаваныя пчаляры. З імі заўсёды было аб чым пагаварыць. Віленскія пчаляры, як Язэп Шнаркевіч, Ігнат Біндзюк, А. Коўш[1] і я, мелі па некалькі сем'яў пчол у сваіх садочках; пчаляры-сяляне мелі і немалыя пасекі. Спатыкаючыся, мы гаварылі аб сваіх посьпехах і клопатах, дзяліліся сваёй практыкай.

Сабраўшыся неяк большай групай, да якой далучылася пару студэнтаў, пчаляроў-энтузіястаў, мы пачалі разважаць магчымасьці стварэньня сваёй арганізацыі. Тады я прачытала прысутным ліст В. Ластоўскага. Гэта быў апошні штуршок, які прымусіў узяцца за канкрэтную работу. У такіх маштабах яна не разьвернецца, але хоць мінімальна няхай зьдзейсьніцца тое, аб чым марылі ў Вільні 10 гадоў таму. Але з чаго пачынаць, з якімі капіталамі? Адзіны выхад: браць прыклад з украінскіх пчаляроў. У Львове ўжо існавала каапэратыўнае пчалярскае таварыства "Рій". Яно мела ні мала-ні многа 4000 сяброў. Сіла! Мела часопіс "Украіньске пасічніцтво", краму з прыладамі, майстэрню, дзе гэтыя прылады выраблялі. Чаму ж нам не пайсці гэткай жа дарогай?

Найперш трэба было апрацаваць праект статуту, а тады склікаць арганізацыйны сход. Са статутам клопату не было. У Беларускім каапэратыўным банку, які паўстаў у Вільні ў 1925 годзе, працаваў старшым бугальтарам Мікалай Манцэвіч. Ён быў спрактываным каапэратарам, да таго ж чалавекам вялікай энэргіі і працавітасьці. Ён моцна зацікавіўся нашым праектам і абяцаў апрацаваць статут. Не адкладываючы, узяўся за работу. Яму памагаў другі бугальтар з Беларускага каапэратыўнага банку — пчаляр Ігнат Біндзюк. Я напісала як уступ да статуту "Дзесяць запаведзяў пчаляра-каапэратара".

І вось статут гатовы, і можна склікаць арганізацыйны сход. Наша ініцыятыўная група пачала паведамляць усіх знаёмых — і асабіста, і пісулькамі. Трэба было, каб мінімум дзесяць чалавек падпісала статут, а тады ўжо можна было б старацца аб яго рэгістрацыі.

Запрашалі мы ўсіх, каго ведалі, нягледзячы на тое, пчаляр ён ці не, будзе карысны ці не. Абы была на пачатак патрэбная колькасьць. Наогул

людзі і цікавіліся праектам новай пчалярскай арганізацыі, і ахвотна абяцалі прыйсьці на сход.

Тым больш прыкрае ўражаньне зрабілі адносіны да нашай прапановы аднаго з "вялікіх дзеячоў": "Пчалярскае таварыства? А каго ж можа цікавіць нейкае там пчалярства?" На гэта ў мяне не знайшлося адказу. Не агітаваць жа... Тлумачыць аб значэньні такога таварыства праз сувязі з вёскай, эканамічныя магчымасьці? Завялікая была розьніца паміж "дзеячамі" і маленькімі, шэрымі людзьмі, якія складалі ініцыятыўную групу.

Арганізацыйны сход сабраўся ў назначаны дзень у памяшканьні Беларускага каапэратыўнага банку, які тады часова знаходзіўся на Віленскай вуліцы, 8. Пазнаёмілі мы прысутных з мэтамі Таварыства, дакладна абгаварылі статут, унесьлі пару паправак. Статут падпісалі: Людвіка Войцікава, Мікалай Манцэвіч, Піліп Назарук, Зіновій Майсяюк, Барбара Журанкова, Ігнат Біндзюк, Міхал Тулейка, Ігнат Мятла, Мікалай Сіняўскі.

Цяпер трэба было рабіць захады аб легалізацыі Таварыства. Цягнулася гэта даволі доўга, але ўсё ж давялі да канца: Беларускае каапэратыўнае таварыства "Пчала" было ўжо не праектам, а рэальнасьцю. Ужо было можна пачынаць работу, г.зн. зьбіраць сяброў, чые паі і ствараць галоўны капітал. Перадусім запісаліся людзі з ініцыятыўнай групы, а і тыя, што падпісалі статут, не адмовіліся заплаціць паі. Але гэтага было мала, вельмі мала...

Тады мы адбілі на шапірографе адозву да сялян-пчаляроў і разаслалі часткова лістамі, часткова разам з газэтай. Некалькі чалавек, больш сьвядомых, адгукнуліся і прыслалі грошы — паі і ўпісныя. Адразу выявілася, што арганізацыя патрэбная, бо ўжо пасьля першай адозвы пасыпаліся лісты з запытаньнямі: "Чым "Пчала" можа дапамагчы?"

Той год для пчаляроў быў цяжкі. Мёду было мала, і трэба было пчолы падкормліваць цукрам. Купляць чысты цукар — дарага, не аплачывалася, а здабываць танны, спэцыяльна прыгатаваны для падкормліваньня (засьмечаны невялікай колькасьцю апілак або падфарбаваны) можна было толькі праз арганізацыі. Значыць, перш за ўсе нам трэба было здабыць цукар! І забясьпечыць ім хаця б тых пчаляроў, якія гатага найбольш патрабавалі.

Сабраўшымся сябрам Праўленьня я прапанавала зьвярнуцца да Украінскага каапэратыву "Рій". У мяне быў знаёмы — той самы Міхайла Бароўскі, з якім мы некалі пісалі разам кніжку "Медадайныя расьліны". Цяпер ён ужо быў інжынерам — закончыў аграномію ў Чэхаславакіі, працаваў у Львове, рэдагаваў пчалярскі часопіс "Украінскі пасічнік". Сябры з праўленьня згадзіліся з маёй думкай і даручылі мне напісаць у Львоў. Адначасова мы выслалі грошы на дзесяць кіляграмаў цукру для падкормліваньня пчол.

Адказ атрымалі даволі хутка. З Львова нам пісалі: "Отже годимося Вам поборгувати на 10 кг вощин і дещо приладів з умовою, що дістанемо вексель гваранційний і замовлення. По продажі вузи гроші просимо выслати на другу партію і так далі. Цукор выслали. Чи вже одержали? Ради Вам поможемо, але невеликою сумою".

Такі адказ нас зусім задаволіў. У вялікія даўгі мы і самі залазіць не хацелі. А пачынаць работу можна было нават з невялікай колькасьцю тавару. Выпісалі 10 кіляграмаў вузы, крыху куродымаў, сетак, нажоў, долатаў і іншай пчалярскай драбязы. Паслалі гарантыйны вэксаль на 400 злотых. У адказ атрымалі падрабязны рахунак на 25 пазыцый — уключна з насеньнем меданосаў. Далі

нам 10 працэнтаў зьніжкі. Цяпер ужо работа пайшла як трэба. Мы паведамілі пчалярам, што прылады ўжо ёсьць, і хутка пачалі атрымліваць заказы ды высылаць заказаныя рэчы. Адначасна прыбывала ў сьпісках прозьвішчаў актыўных пчаляроў. Атрымлівалі просьбы залічыць у сябры "Пчалы". Праўда, такіх сьвядомых было мала, але мы ня трацілі надзеі на лепшае.

Пасьля атрыманьня паёў і ўступнай платы мы высылалі сяброўскія кніжкі. Ужо ў 1929 годзе нам пачалі прысылаць воск на пераробку на вузу (у некаторых мясцовасьцях называлі яе *наўза*) і на абмен або на прадажу. Пчаляры запрапанавалі таксама прысылаць нам большую колькасьць мёду для камісійнай прадажы. Атрымалі мы 2 бочкі мёду агульнай вагой 218 кіляграмаў, пасьля — яшчэ бочку вагой 69 кіляграмаў. Частку прадалі гуртам у краму, частку — дэталічна. Заплаціўшы належную суму пчалярам, адлічыўшы расходы (перасылка бочак уласьнікам і г.д.), мы атрымалі 253 злотыя чыстага даходу.

У 1930 г. зноў атрымалі на камісію бочку мёду вагой 131 кіляграм. Гэты прадалі дэталічна. Зарабілі нешта з 65 злотых. Заробак быў невялікі, а клопату шмат. Але пчаляры былі здаволены, бо атрымалі шмат больш, чым калі б яны прадалі мёд мясцовым гандлярам. З гэтай апошняй бочкі каля 30 кіляграмаў пайшло на пітны мёд, за які мы атрымалі 50 злотых.

А было гэта так. Беларускі студэнцкі саюз ладзіў баль сумесна са студэнтамі-украінцамі. За пару тыдняў перад заплянаваным балем пару студэнтаў-беларусаў прыйшлі даведацца, ці мае "Пчала" яшчэ мёд. "Ёсьць,— адказала я,— яшчэ з паўбочкі мёду маем. А нашто вам?" — "Ці будзе ён нам патрэбны, залежыць ад вас асабіста. Мы хацелі б зрабіць пітны мёд, каб мець яго ў буфэце. Гэта пітво не зусім звычайнае, і, думаем, пайшло б яно добра. Але ж ніхто з нашых сяброў ня мае такіх умоў, каб зварыць мёд у сябе. Таму мы і задумалі вас прасіць пра гэта".— "Але я ня ўмею варыць пітны мёд!" — "Гэта не бяда,— адказаў студэнт-пчаляр М. Тулейка,— мы дамо выпрабаваны рэцэпт. У нас дома вараць мёд на ўсю ваколіцу. Каму на вясельле, каму на хрысьціны, а то і на хаўтуры".— "Калі так, то іншая справа. Добра, звару".

Пайшлі ў Беларускі банк. Бо трэба заўважыць, што "Пчала" ня мела ўласнага памяшканьня і ўвесь час тулілася пры Беларускім каапэратыўным банку і разам з ім мяняла кватэры. У той час кватаравалі на Гданьскай вуліцы, 1.

Адважылі каля 30 кіляграмаў мёду, адвезьлі яго да мяне, у Калёнію Каляёвую (цяпер Павільнюс). Далі мне студэнты рэцэпт, прывезьлі пару мяшкоў бутэлек, і я ўзялася за работу. Зварылі пітны мёд, разьлілі ў бутэлькі, моцна закаркавалі і палажылі ў халодным месцы. Памагалі мне муж і сын. Выйшла 124 бутэлькі. Яшчэ крыху засталося, і я ўліла рэшткі ў вялікую пяцілітровую бутэльку. Праўда, ці то мёд быў звараны зарана, ці было зацёпла, але пачало рваць коркі, а нават лопаліся бутэлькі. Гэтыя выбухі нямала каштавалі нам нэрваў.

Адным словам, студэнты ўзялі 42 бутэлькі, заплацілі за іх 50 злотых. Ды яшчэ на дадатак дасталі тую пяцілітровую бутэльку, на якую падрыхтавалі білеты і пусьцілі яе на лятарэю. Пасьля казалі, што яшчэ ніколі буфэт ня даў такога даходу, як на гэты раз — і ўсё дзякуючы мёду. Праз удзячнасьць запрасілі мяне на гаспадыню балю, але якраз хварэла мая маці, і я мусіла ад гэтага гонару адмовіцца...

Рэшту пітнога мёду "Пчала" прадала за 1 злоты 30 грошай за бутэльку. І студэнты зарабілі, і "Пчала" грошы за мёд атрымала па гуртовай цане. Каб

ня лопнутыя бутэлькі, то яшчэ і невялікі даход быў бы. Ну, і нашая праца пры варцы — гэта ўжо на карысьць студэнтаў і "Пчалы".

А лісты ад пчаляроў тым часам не спыняліся... Чаго ў іх толькі ні было! Розныя фаховыя пытаньні, просьбы выслаць пчалярскія кніжкі — а была толькі адна: "Пчолы" Я. Пачопкі. Карысталася яна вялікім посьпехам, і мы яе часта высылалі. Рабілі пчаляры і свае прапановы наконт пашырэньня дзейнасьці "Пчалы". Напрыклад, прасілі, каб прыяжджаць і на месцах ладзіць папулярныя лекцыі... На вялікі жаль, не маглі мы гэтага зьдзейсьніць. Людзей то можна было б знайсьці, хоць было нас на месцы вельмі мала. Але на паездкі патрэбны былі грошы, а іх у нас не было. Ні граша лішняга. Толькі ў Гарадку каля Маладзечна ўзяўся ладзіць лекцыі і гутаркі наш актыўны сябра Пётра Прадуха, атрымаўшы ад "Пчалы" адпаведнае пасьведчаньне.

Другое пасьведчаньне на права ладзіць лекцыі і гутаркі атрымаў Сьцяпан Дараховіч з вёскі Мілявічы Слонімскага павету. Трэцім зацікаўленым гэтай справай быў Раман Салавей з вёскі Падбагонікі Горадзенскага павету. Гэты апошні пчаляр быў вельмі дзейным сябрам таварыства. Прысылаў ён артыкулы ў "Беларускую борць", калі яна пачала выходзіць, стараўся прыдбаць сяброў, прысылаў свае меркаваньні, як і калі найлепш правесьці цыклі лекцый па пчалярству. Паведамляў, колькі і дзе налічваецца на Горадзеншчыне добрых пчалярскіх гаспадарак.

У адным лісьце ён пісаў: "У Горадні, у "Сындыкаце рольнічым" працуе аграном Афанасьеў (цяпер ён сябе называе Атаназэвіч, а часам, калі яму выгадна, лічыць сябе нават беларусам). Але гэта нічога. Калі б яго прыцягнуць да працы у Таварыстве "Пчала", ён як пчаляр быў бы карысны. Мог бы ў Горадні адчыніць аддзел "Пчалы". Мы мелі б свой цэнтар. А то нам пасылаць аж у Вільню мёд і воск вельмі нязручна".

Гэта была ўжо другая прапанова аб стварэньні аддзелу "Пчалы". Першым выступіў з такой прапановай Аляксандр Матрэнчык з Беласточчыны. Разам з ішымі пчалярамі ён прасіў адчыніць аддзел у Беластоку. Аддзелу нават давалі зямлю пад Беластокам, у вёсцы Патока, каб арганізаваць там узорную пасеку і плянтацыю меданосаў.

Пераглядаю лісты пчаляроў, а іх нямала захавалася. Прыпамінаю, колькі радасьці прыносілі гэтыя лісты! Як падтрымлівалі наш дух. З другога боку, як балюча адчувалася наша бязраднасьць, немагчымасьць выканаць патрабаваньні пчаляроў... Зьвязывала рукі безграшоўе. Мы ўжо хацелі старацца аб пазыцы ў "Банку рольным". Але для гэтага трэба было здабыць розныя паперкі-апініі ад Ваяводзкай арганізацыі земляробства і іншых установ, так што малая была надзея на зрэалізаваньне гатай задумы.

Вядома, калі б павялічыўся лік сяброў Таварыства, то сабраныя паі і ўпісныя ўжо далі б пэўны капітал. І справа была ня толькі ў тых 10 злотых паявых і 2 злотых упісных, колькі ў тым, што, як выясьніў у сваім лісьце ўжо ўспомнены Раман Салавей, людзі проста баяліся.

У красавіку 1928 г. Салавей пісаў мне: "Прашу выслаць мне 10 штук дэклярацый. Быць можа, я ўцягну ў сябры асоб колькі. Павінен сказаць, што наш вясковы пчаляр баіцца цяпер быць сябрам любой арганізацыі, бо думае — а што, як каму там не ўпадабаецца гэта арганізацыя, а тады паліцэйскі будзе чапляцца і за сьвіньню, і за сабаку, і за комін... Вось якія былі вынікі 1925 году! Але што рабіць? Прыйдзецца працаваць. Можа, хоць

гэты наш каапэратыў будзе даўгавечнейшы за іншыя. Для яго існаваньня патрэбны грунт ёсьць, і ён будзе жыць, трэба толькі быць цярплівым і перамагчы нашу беларускую інэртнасьць. Знаю, як цяжка працаваць Вам над гэтай справай у Вільні, і я прашу Вас не паддавацца, верыць, бо пчалярства ідзе наперад, і яно будзе пашырацца, бо і саматугам расшыраецца, а гэта паказьнік таго, што яно не заглохне. Будзьце ласкавы, калі можаце бачыць з майго ліста, што я магу быць карысным для справы, то пакіруйце мною, а я, у чым толькі магу, пастараюся палегчыць працу Управы Таварыства".

Такія лісты сапраўды падбадзёрывалі. Мы бачылі, што працуем недарэмна і наша праца дае вынікі. Але ў большасьці лістоў былі пытаньні, просьбы аб парадах. Часам два-тры лісты былі амаль аднолькавага зьместу: пыталіся пра тое ж самае. І кожнаму асобна трэба было адказываць! Толькі трата часу, паперы і — паштовых марак.

Выхад быў адзін: выдаваць свой пчалярскі часопіс! Так і пастанавілі. І было гэта ў 1934 годзе. Але яшчэ перад выхадам першага нумару часопіса "Пчала" правяла вялікую работу: арганізавалі завочныя курсы па збору і прадажы лекарскіх зёлак. Беручы пад увагу, што шмат якія лекарскія зёлкі адначасова зьяўляюцца меданоснымі расьлінамі, нават невялікія плянтацыі гэтых расьлін маглі даць пчалярам падвойную карысьць. А збор дзікарастучых лекарскіх зёлак мог даць немалы заробак.

Атрымаўшы з Варшавы, ад зялярскай арганізацыі сьпіскі зёлак, на якія было найбольшае запатрабаваньне ў краі і за граніцай, ды цэны на іх, мы ўзяліся за работу. Працавалі шчыра і сумленна. Тэксты пісала я супольна са студэнтам-мэдыкам В. Тумашам, малюнкі абяцаў зрабіць Янка Хвораст[2], а М. Манцэвіч узяў на сябе ўсю тэхнічную работу — перадрук на машынцы і адбіваньне на шапірографе.

Беручы пад увагу, што назвы аднаго ж і таго зельля ня ўсюды аднолькавыя, трэба было кожнае вельмі падрабязна апісываць. Каб добра апісаць, мала было ведаць расьліну па малюнку ў батаніцы, трэба было яшчэ пазнаёміцца з ёю "асабіста". Вось мы і хадзілі па лясах, палях, сенажацях над рэчкай Віленкай і вышуківалі патрэбныя нам расьліны... Аднае расліны, дробнай, маленькай, аніяк не ўдавалася знайсьці. І назва яе беларуская, арыгінальная — буслава пасьцель, і запатрабаваньне на яе было вялікае, і цана высокая, а як яе ўнесьці ў лекцыю, калі мы яе і ў вочы ня бачылі? Так і прыйшлося буславу пасьцель са сьпіскаў выкінуць.

Яшчэ адно трэба было спраўдзіць: як расьліна найлепей сохне? У якіх варунках? На сонцы ці ў цяньку, ці ў штучным цяпле, напрыклад, у печцы ці духоўцы? Дзеля гэтага мы кожны ў сябе рабілі пробы, а пасьля дзяліліся вынікамі.

З адной расьлінкай — заячымі агурочкамі — быў і сьмех, і плач. Аніякім спосабам яна не давалася высушыць. Дзе ні прабавалі яе класьці ці вешаць — нічога не выходзіла: ня толькі ня сохла, але проста — расла... Да таго нас даняла, што мы перасталі пры спатканьні з сабой нармальна вітацца: замест звычайнага добрага дня адразу пыталіся: "А што — сохне?" — "Дзе там сохне — расьце! А ў вас?" — "Таксама расьце". Ня даўшы рады яе высушыць, таксама выкінулі са сьпіскаў.

Нягледзячы на такія дробныя перашкоды, работа хутка пасоўвалася наперад. Тым часам і курсантаў набралася чалавек з дваццаць, і першыя лекцыі пачалі мы высылаць. Як і было запраектавана, за тры тыдні мы выслалі ўсе дзе-

вяць лекцый. Заставалася шмат запасных экзэмпляраў, але і на іх знайшліся аматары. Усяго курсы мелі 54 падпісчыкаў. Нашымі курсамі вельмі зацікавіліся ўкраінцы. У іх былі добрыя фахоўцы: інжынер Гаўрыленка і аўтар кніжкі "Лікарскі ростіні" Т. Паныч. Пастанавілі яны наладзіць такія ж курсы ў сябе і пыталіся аб тэхнічным баку работы.

Вядома, вялікіх вынікаў курсы не далі. Мо таму, што якраз скончыўся сэзон. Але ўсё ж людзі з гэтай працай пазнаёміліся і ў будучым маглі за яе ўзяцца.

З 1934 году тут мушу вярнуцца ў год 1930-ы, бо неяк я прапусьціла пару падзеяў. Ня трэба гаварыць, што праз увесь гэты час нармальная работа ў Таварыстве "Пчала" амаль не перапынялася: мы атрымлівалі многа лістоў, адказывалі на іх, куплялі воск і мёд, высылалі воск і розныя выпісаныя прылады... У верасьні 1930 г. выйшаў першы нумар "Сахі" — беларускага месячніка сельскай гаспадаркі і вэтэрынарыі. Кіраваў выданьнем інжынер-аграном С. Бусел [3]. Пагаварыўшыся з ім, "Пчала" пачала для "Сахі" рабіць пчалярскі аддзел пад маёй рэдакцыяй. Часткова гэта замяняла неабходны для ўсіх пчаляроў уласны часопіс. На старонках "Сахі" "Пчала" таксама зьмяшчала ўсе свае абвесткі.

Пераглядаючы цяпер першы нумар "Сахі", знайшла я ў хроніцы зацемку, якая мяне незвычайна зьдзівіла, бо я чамусці гэтага факту абсалютна ня помню. Вось яе тэкст: "Беларуская медасытня ў Вільні. Беларускае каапэратыўнае Т[аварыст]ва "Пчала" пачало энэргічную працу над утварэньнем у Вільні беларускай медасытні. У медасытні будуць прадавацца ўсякія вырабы з мёду, таксама і мёд. Апрача таго, пры медасытні будзе існаваць і сталоўка. Шмат працы ў гэтым кірунку паклала гр[амадзянка] Л. Войцікава". Вось так гісторыя: як жа я гэтага ня помню?

Далей у зацемцы гаварылася, што справа беларускай медасытні, бясспрэчна, залежыць у першую чаргу ад нашага грамадзтва. Дзеля гэтага, каб праект медасытні сапраўды быў зрэалізаваны, патрэбна помач і супрацоўніцтва ня тольні сяброў "Пчалы", але і іншых беларускіх арганізацый. Праект такіх сталовак і медасытняў, якімі кіравалі б каапэратыўныя арганізацыі, трэба было б пашыраць і на іншыя гарады. Гэта аблягчыла б і працу самога Таварыства "Пчала", даючы магчымасьць пчалярам прадаваць мёд у бліжэйшых гарадах і мястэчках... Што ж, думка добрая, але, мусіць, усё разьбілася аб нашу сталую перашкоду — безграшоўе.

Другі факт з жыцьця "Пчалы" ў той час то я добра помню. 14 верасьня 1930 г. распачаўся ў Вільні другі Паўночны кірмаш, які працягнуўся аж да 28 верасьня. У кірмашы прымалі ўдзел ня толькі прамысловыя і гандлёвыя фірмы нашага краю і Польшчы, але таксама прыватныя фірмы Швайцарыі, Аўстрыі, Фінляндыі і інш. На кірмашы было шмат аддзелаў, між якіх быў і сельскагаспадарчы аддзел. Кірмаш адбываўся ў Бэрнардынскім садзе.

Наша Таварыства "Пчала" атрымала там невялікі пляц і на ім, пад прыгожа зробленым плякатам, наладзіла выстаўку самаробных пчалярскік прылад. Сябра "Пчалы" М. Тулейка са Стаўбцоўшчыны прывёз саламяны вулей (з прасаванай саломы) сваёй работы, сеткі, куродым і інш. Прыслалі нашы пчаляры таксама т.зв. ліпаўкі — выдаўбленыя з ліповых калодак бочачкі на мёд. Я дала калекцыю насеньня меданосных расьлін. Шмат што з выстаўленага было прададзена.

А цяпер з 1930 году зноў вярнуся да перапыненых успамінаў аб курсах. Скончыўшы з імі, мы адразу пачалі рыхтаваць часапіс. На друк не было сродкаў,

таму пяць першых нумароў адбілі на шапіраграфе. Назвалі часопіс "Беларуская борць: месячнік пчалярства і мядова-лекарскіх расьлін". Падпісная цана ўстанаўлівалася: на год — 5 злотых, на тры месяцы — паўтара злотых, за граніцу — удвая даражэй.

Першы нумар "Беларускай борці" выйшаў у жніўні 1934 г., другі-трэці (падвойны) — у верасьні-кастрычніку, чацьвёрты і пяты — адпаведна ў лістападзе і сьнежні. Пачынаючы ад першага нумару, мы высылалі свой часопіс на абмен розным краёвым і загранічным пчалярскім часопісам. У хуткім часе ў абмен атрымалі польскія, украінскія, чэшскія, нямецкія, рускія.

Разаслалі мы пробныя нумары на ўсе адрасы пчаляроў, якія дагэтуль "Пчала" здабыла. І амаль адваротнай поштай пасыпаліся скаргі: "Невыразна, цяжка чытаць, чаму не друкуеце?" Адразу ж, у наступным нумары, быў агульны адказ — артыкул ад рэдакцыі. Стараліся мы вытлумачыць пчалярам, што работу мы пачалі без ніякіх капіталаў і цяпер чакаем падтрымкі з боку пчаляроўпадпісчыкаў. Таму просім прыслаць падпіску і старацца прыдбаць новых падпісчыкаў у сваёй ваколіцы.

Відаць, першыя нумары "Беларускай борці" пчалярам спадабаліся, бо яны паслухалі нас і пачалі прысылаць падпіску. І ўжо ў студзені-лютым 1935 г. мы выпусьцілі 1–2 (6–7) нумары "Беларускай борці" друкарскім спосабам. Цяпер ужо ўсе адказы пчалярам даваліся ў паштовай скрынцы, а "Пчала" мела дзе зьмяшчаць свае камунікаты.

На старонках "Беларускай борці" зьмяшчаліся таксама цэньнікі на лекарскія зёлкі, на насеньне, а таксама на медадайныя расьліны і адрасы, дзе гэтае насеньне або флянсы купіць. Шмат што можна было дастаць у Вільні, ва ўнівэрсытэцкім батанічным садзе. Агароднік батанічнага саду сам прадаваць флянсаў ня меў права, трэба было мець на гэта дазвол ад загадчыка саду прафэсара Мушынскага. Але ён заўсёды ахвотна падпісываў загад прадаць патрэбную нам колькасьць, а калі чаго не было, даваў адрасы, дзе можна купіць. "Беларуская борць" разыходзілася ўсе шырэй і шырэй, мела падпісчыкаў на Украіне, у Румыніі і г.д.

Шмат задавальненьня далі нам вельмі прыхільныя рэцэнзіі ў польскім часопісе "Бортнік Велькопольскі" і часопісе "Украінскі пасічнік". У дзесятым нумары за 1934 год "Украінскі пасічнік" падаў вестку аб выхадзе ў сьвет першага нумару "Беларускай борці". Пасьля пералічэньня зьмешчаных у ім артыкулаў гаварылася: "Зьмест часопіса паважны. Артыкулы цікавыя, што абяцае беларускім пчалярам пэўнасьць разьвіцьця іх часопіса дзеля дабра народнага пчалярства. Абдуманае злучэньне пчалярства з лекарскімі зёлкамі — ідэальнае. Беларусь — гэта край, дзе земляробчая культура яшчэ не папсавала, як у нас, прыроднай цэльнасьці, дзе яшчэ рай для жывёлагадоўлі, пчалярства, дзе можна вагонамі зьбіраць лекарскія зёлкі, ягады, грыбы, толькі трэба, каб народ зразумеў, якія скарбы кругом сябе мае. Дзеля выкарыстоўваньня гэтага прыроднага багацьця ў першую чаргу патрэбна фаховая асьвета. Думаем, што ініцыятыва "Пчалы" шчасьлівая і шчыра народная, таму маем надзею, што затрыманьня ў пашырэньні фаховай асьветы сярод пчаляроў ня будзе. Слава беларускім пчалярам! Нашым пчалярам з Палесься, Холмшчыны і Падляшша радзім часопісам "Беларуская борць" зацікавіцца дзеля сваёй карысьці".

Украінцы наогул вельмі прыхільна адносіліся да "Беларускай борці". Інжынер М. Гаўрыленка прыслаў нам у "Беларускую борць" свой артыкул "Ці

аплачываецца гадаваць лекарска-прамысловыя расьліны?", і мы зьмясцілі яго ў чацьвёртым нумары за 1934 год. Пасьля ён жа ня раз адказываў на пытаньні нашых чытачоў. Апрача таго, для 1–2 нумару за 1935 г. ён прыслаў яшчэ адзін артыкул — "Збор дзікіх і культываваных лекарскіх расьлін". У сваю чаргу мы давалі ў "Беларускай борці" аб'явы аб ладжаных украінцамі пчалярскіх курсах і інш.

У канцы зімы 1935 г. рэдакцыя "Беларускай борці" абяцала сваім акуратным падпісчыкам прэміі — насеньне меданосных расьлін. Той, хто прышле падпіску на цэлы год, дастане дзьве порцыі насеньня, хто на паўгода — адну порцыю. Пчаляроў гэта зацікавіла. Падпіска пабольшала, і мы акуратна высылалі абяцаныя прэміі, а пчаляры дакладна паведамлялі аб іх атрыманьні.

Тым часам зьмест "Беларускай борці" штораз усё больш пашыраўся. Па жаданьню чытачоў мы ўвялі аддзелы: садаўніцтва і агародніцтва, шаўкоўніцтва, дробнай жывёлагадоўлі (трусы, куры і г.д.), мэдыцынскі, вэтэрынарны. Па выразнаму жаданьню жанчын — жаночую старонку. Зьявіліся аддзелы рыбалоўства, грыбазнаўства, куток наймалодшых. Прыбывала тэмаў, матэрыялаў, а разам з тым — і пытаньняў, лістоў ад чытачоў. Пчаляры прысылалі справаздачы са сваіх пасек, з пробных палеткаў меданосаў, з пачатай гадоўлі лекарскіх расьлін.

Сувязь з чытачамі была штораз мацнейшая. Але, хаця некаторыя пчаляры, прысылаючы падпіску, давалі па пару залатовак у фонд часопіса, матэрыяльнае становішча "Беларускай борці" зусім не палепшылася. У маі 1939 году мы выдалі апошні нумар. З вялікім сумам расставаліся з нашым выпеставаным часопісам, бо на далейшае ўжо не хапала сілы.

Сёньня, пераглядаючы лісты пчаляроў ды захаваныя нумары "Беларускай борці", думаю, чаму так выйшла. Чаму нашай маленькай жменьцы ніхто з віленскага беларускага грамадзянства не дапамог? А яшчэ ж раней трэба было спыніць дзейнасьць Таварыства "Пчала". Як каапэратыў Таварыства падлягала агульнаму Саюзу каапэратываў і павінна было час ад часу падлягаць рэвізіі. Прыяжджаў рэвізор з Брэста. Рэвізор аднёсься да нашай працы вельмі прыхільна, раіў толькі, каб шырэй павесьці работу, бо лічыў, што як на каапэратыў наша Таварыства мала дзейснае. Мы гэта і самі бачылі, але ўсе намаганьні нічога не далі.

На наступны раз, праз пару гадоў, рэвізор параіў: калі ня можаце шырэй разгарнуцца, лепш дабравольна ліквідуйце Таварыства. Ня варта чакаць, каб ліквідацыя за бязьдзейнасьць была прымусовай. Мы так і зрабілі. Але ўсё ж дзейнасьць "Пчалы", разам з выданьнем "Беларускай борці", працягнулася дзесяць гадоў!

Трэба дадаць, што ўсе працаўнікі як "Пчалы", так і "Беларускай борці", усе дзесяць гадоў працавалі ганарова. Апошняй падзеяй у "Пчалы" было арганізаваньне ў Вільні лекцыі-вечарыны дзеля прапаганды пчалярства і спажыцьця мёду. Вось праграма гэтай вечарыны, што адбылася 3 сакавіка 1935 году:

1. Кароткі нарыс гісторыі пчалярства: рэфэрат Л. Войцікавай;

2. Спажыўныя і лекарскія вартасьці мёду: рэфэрат М. Якімца (студэнта-мэдыка);

3. Пчала ў літаратуры, казках і песьнях народаў славянскіх: уступнае слова Р. Шырмы[4].

Былі прачытаны: урывак з твора М. Родзевіч[5] "Лета лясных людзей"

(на польскай мове), “Багатая пчэльня” — апавяданьне М. Гарэцкага, урывак з паэмы “Новая зямля” Я. Коласа, верш “Пчолы” Я. Журбы[6], “Як я вучыўся пчалёраваць” А. Вішні[7] (на ўкраінскай мове), украінская казка “Харобрая пчала”, урыўкі з “Ганны Карэнінай” і з “Раніцы памешчыка” Л. Талстога[8] (на рускай мове).

Хор пад кіраўніцтвам Р. Шырмы выканаў згарманізаваную Грэчанінавым[9] беларускую народную песьню “Ішоў раёк”, згарманізаваную Равенскім[10] беларускую народную песьню “Ня стой, каліна”, “Сьняжыначкі” Уладамірскага, згарманізаваную Галкоўскім[11] беларускую народную песьню “Зялёны гай”.

Дзейнічаў буфэт, у якім усё было з мёду: мядовы торт, макаўнікі, пернікі, мёд у рамках, мёд скрышталізаваны, мёд сьвежы, гарбата. Прыгожыя праграмы — усе з пчалярскімі матывамі — нарысаваў для гэтай вечарыны Янка Хвораст. Запрашэньняў разаслалі шмат. Але і тут нас спаткала расчараваньне: публікі было мала, а з нашых “вялікіх дзеячаў” — нікога! Відаць, занізкія былі для іх парогі...

[1975–1983]

ЛІСТЫ

1. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

28 мая 1967 г. Вільня

Паважаная грамадзянка[1].

Зьдзівіць Вас, магчыма, ліст ад незнаёмай, але я думаю, што нас з Вамі злучае супольны клопат аб здароўі і жыцьці грамадзяніна П. Ластаўкі[2]. А. Клімовіч[3] пераслаў мне выпіску з Вашага ліста, у каторым пішаце, што ня верыце ў палепшаньне здароўя П. Л-кі і яго шчасьце. Аб шчасьці гаварыць ня будзем — тэма даўгая, а што да здароўя, то пару дзён таму я мела ад яго вестку. Ізноў піша, што "чуецца добра" і больш працуе, чым раней. Вы пішаце, што ён *хоча* быць здаровым і вельмі *хоча* жыць! Гэта галоўнае. Псыхічны настрой мае вялікае значэньне для паправы здароўя. Толькі трэба яму дапамагчы гэты настрой утрымаць! Шчыра спагадлівыя адносіны знаёмых, прыяцеляў, безумоўна, падтрымаюць сілу яго духа. Каб толькі мясцовыя знаёмыя, якія маюць з ім кантакт асабісты, патрафілі быць яму карыснымі ў гэтым сэнсе.

Я асабіста з гр. Ластаўкай незнаёмая, а толькі лістоўна. Шукала я кантактаў з кім-небудзь, хто ў міжваенны час жыў у Варшаве і знаў аднаго з арганізатараў і першага старшыню нашага Горадзенскага гуртка беларускай моладзі. Мой ліст пераслалі П. Ластаўцы. Ён мне прыслаў дэтальныя дадзеныя, якія мне былі патрэбныя. І так завязалася карэспандэнцыя.

Безумоўна, сэрцавая хвароба, на жаль, любіць варочацца да сваіх ахвяраў, і таму трэба безупынна сьлядзіць, як у П. Ластаўкі справы маюцца, каб у разе чаго не дапусьціць да прапажы яго цэннай бібіліятэкі і рукапісаў працы, якой цяпер займаецца. Хто гэтым мог бы заняцца — ня ведаю. Тут патрэбны чалавек высокакультурны і практычыны.

Пры гэтай аказіі пазвольце мне, паважаная грамадзянка, падзякаваць Вам за мілыя хвіліны, якія перажыла я, чытаючы Ваш "Куфар"[4]. Якім жа блізкім, родным павеяла на мяне духам! Толькі хіба наша Горадзеншчына (для мяне — Сакольшчына) магла даць Вам натхненьне да такога твору? Бо дзе больш так разьвітае было, можна сказаць, артыстычнае замілаваньне ткацтвам, як ня ў нас?

Калі б захацелі кінуць мне пару слоў, буду рада і ўдзячная. З прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

Адрас: *г. Вильнюс-15, просп. Красной Армии, 180–2, Войцик Людвика Антоновна.*

2. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

12 чэрвеня 1967 г. Вільня

Паважаная грамадзянка.

Шчыра дзякую за ліст. Не адразу адказала, бо з дня на дзень чакала весткі ад гр. Ластаўкі. На жаль, ужо амаль месяц прайшоў ад часу, калі мела ад яго ліст. Ня ведаю, як гэта вытлумачыць? У чым справа? Вы ў лепшым становішчы, бо можаце даведацца аб ім ад знаёмых, сяброў з Варшавы. Дзеля гэтага вельмі Вас прашу, калі будзеце што-небудзь ведаць аб П. Л[астаўцы], кіньце мне пару слоў.

Аб сямейным сумным жыцьці П. Л[астаў] кі я дагадывалася. У сваіх лістах ён неаднаразова варочаўся да справы неадпаведнага жанімства. Бо фактычна ад гэтага і пачалася наша з ім карэспандэнцыя. На маю просьбу ён мне прыслаў свае ўспаміны аб адвакаце Адаме Бычкоўскім. Гэта быў адзін з арганізатараў і першы старшыня Горадзенскага гуртка беларускай моладзі, заснаванага ў 1909 г.

А. Бычкоўскі[1] жаніўся (гэта была трагічная памылка) з грузінкай, але па духу рускай шавіністкай, якая не дапускала ў хату нікога з беларусаў, прычым і дачку гэтак навучыла. Бычкоўскі ў міжваенны час жыў і працаваў у Варшаве, увесь свой вольны час аддаваў беларускай справе, але спатыкаўся з беларусамі толькі ў горадзе або ў сваім бюро. Нават свае рукапісы аддаў на перахаваньне П. Ластаўцы. Памёр на сэрцовы атак у бюро! З беларусаў ніхто ня ведаў і ніхто ня быў на хаўтурах. Як бачыце — сытуацыя яшчэ горшая, як у П. Ластаўкі.

Гора яшчэ ў тым, што ў такіх мешаных сем'ях церпяць толькі выняткова цэнныя адзінкі: патрыёты, людзі, усёй душой адданыя Бацькаўшчыне. І гэта са старэйшага пакаленьня. А цяперашнія, маладыя лёгка ды бяз бою паддаюцца ўплывам. Прадаюць сваю мову, душу за сямейнае шчасьце. Я тут на мейсцы маю шмат гэтакіх сумных прыкладаў.

Справа бібліятэкі П. Л[астаўкі] вельмі важная ды паважная. Трэба, каб нехта сумленны, грамадзка настроены гэтым заняўся. Каб самыя зычлівыя сябры не расьцягнулі яе, як у прыкладзе Бурша[2]. Мяне яшчэ непакоіць лёс яго рукапісаў, бо ведаю, над чым працуе.

Галоўная думка Вашага твору ("Куфар") для мяне ясная. Хоць нашая вёска нацыянальна маласьведамай была, але інстынктыўна захоўвала і звычаі, і народныя традыцыі, і яе творчы дух узбагачаў нашую культуру. Гэта было. А сягодня? Сягодня нашыя дзеячы цешацца, што хутка паміж горадам і вёскай ня будзе ніякай розьніцы. Вёска робіцца культурнай! Як гэта разумець? Мэблі, нэйлёны і г.д.? І вясковую моладзь ужо не задавольвае народная песьня, народны танец, народны дыван, як піша Вера Леўчык[3] у "Ніве". А што гэтая песьня, танец, дыван — наша спадчына, наша нацыянальная сіла, наша самабытнасьць — гэта няважна...

Сумна. Куфраў са скарбамі, хіба, ужо німа. Музэяў вартасных — таксама. Нацыянальнай вопраткі, такой праўдзівай, старадаўнай — не пабачыш, поўны заняпад. А другія народы яе маюць, шануюць. І гэтага неяк ніхто ня бачыць і не перажывае. А можа, я мылюся? Хацела б, каб так было.

Прыміце словы пашаны. *Л. Войцікава.*

3. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

25 жніўня 1967 г. Вільня

Дарагая сяброўка.

Сягодня ў гутарцы з сынам даведалася, што маем тут супольных з Вамі знаёмых, гэта Канстанты Шышэя і яго жонка Лёдзя[1]. Я, праўда, спатыкаюся з імі рэдка (абое мне вельмі падабаюцца), але сын мой з імі ў прыязьні. Гэта ж яго таварышы па няшчасьці, бо ён таксама правёў дзесяць гадоў на Варкуце і ў Сібіры. Вось і захацелася мне напісаць крыху да Вас і падзяліцца як добрымі, так і благімі весткамі, хоць ад Вас адказу ня маю.

Адно благое, што даўна ня маю весткі ад П. Ластаўкі, ня ведаю, што там у яго чуваць. Да В. Шведа[2], паводле Вашай рады, пісаць не хачу, каб не пады-

мацьалярму, бо, можа, маўчаньне П. Л[астаўкі] — проста нехват часу.

Націск вярхоў Бел[арускай] Рэспублікі на сьведамых беларусаў, якія хочуць захаваць сваю мову, не спыняецца. Сягодня быў у нас прыяцель майго сына, доктар Глеб Багдановіч[3] (сын быўшага беларускага сэнатара Польскага Сойму В. Багдановіча[4]) — шчыры і нязломны беларус, працуе ў м. Рудзенску, 50 кілямэтраў ад Менска. Ён расказываў, як там у іх у дзіцячым садочку ўся праца з дзяцьмі вядзецца ў расейскай мове, а калі адна з вучыцелек прабавала гаварыць з дзяцьмі па-беларуску, яе чуць ня выкінулі з пасады. І німа сілы, німа магчымасьці скінуць гэтую няволю. Відаць, больш ёсьць баязьлівых і пакорных, чым мужных і цьвёрдых. Але ці мужнасьць памагла б? Ці не завяла б толькі ў далёкія краі?..

Але якія ёсьць кантрасты! Чытаеш у творы *беларускага* пісьменьніка сказ: "Масква! *Родная* да болю...". Але я трымаю перад вачыма кніжку, якую мне прыслалі з Менска,— "З думай пра Беларусь". Тэмы дзьве: Кастусь Каліноўскі[5] і Францішак Багушэвіч. Праца гісторыка Г. Кісялёва[6] — *расейца*! Па-беларуску, мова добрая. Напісана надзвычайна! З якім замілаваньнем сабраныя гістарычныя матэр'ялы! З якой цеплынёй адносіцца аўтар да герояў сваёй працы!

Ці Вы чытаеце "Полымя"? У 7-м нумары два цікавыя артыкулы: Р. Семашкевіча[7] — "Я. Купала і прафэсар Эпімах-Шыпіла" і Янкі Саламевіча — "Зьбіральнік залатых скарбаў" (аб Міхале Федароўскім).

Янка Саламевіч і Алег Лойка[8] (паэт і пісьменьнік) прыяжджалі да мяне. Абодва вельмі сымпатычныя, шчырыя беларусы, нашы заходнікі з-пад Слоніма. Каб такіх больш. Што ж, яны пішуць, добра пішуць, друкуюць, але ўплыву на агульны стан абставінаў ня маюць.

Яшчэ я мела мілую хвілінку. Атрымала ад аўтара С. Шушкевіча[9] яго кніжачку дзіцячую — "Будзільнік". Прыгожыя, мастацкія рысункі і вельмі добрыя вершы для наймалодшых. Але тыраж, пэўна, невялікі, бо дзясяткамі тысяч выдаюцца толькі кніжкі ў мове расейскай і пераклады беларускіх аўтараў на расейскую — імі запаўняюцца беларускія бібліятэкі. Зрэшты, аб усім гэтым Вы ведаеце ня горш, чым я.

Спадзяюся, што напішаце мне. Буду радая і ўдзячная. У мае такія вялікія гады (хутка 75!) кожная сьвежая думка, спрыячае слова маюць ажыўляючае значэньне.

Усяго найлепшага! Шчыра цалую. *Л. Войцік.*

4. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

17 верасьня 1967 г. Вільня

Дарагая мая.

Дзякую за цікавы і шчыры ліст. Ведаеце, маю такое ўражаньне, што я з Вамі даўна-даўна знаёмая. Што нас нічога ня дзеліць, а шмат што зьвязывае. Я радая, што ў канцы жыцьця маю некага, з кім магу шчыра падзяліцца думкамі. Бо нават са старымі знаёмымі ня ўсім магу падзяліцца.

Маю ў Менску знаёмую, можа, Вы чулі — Юлія Бібіла[1]. Мы з ёю спатыкаліся ў 1917 г. 50 гадоў ня бачыліся і ня чулі адна аб другой. Цяпер яна была ў мяне пару дзён, часта піша. Прысылае мне кніжкі, наагул, адносіцца добра, а ўсё ж я з ёю шчырай быць не магу! Яна так захопленая "вялікімі маштабамі работы"! А на ўсе мінусы вочы мае зачыненыя, проста мінусаў ня бачыць і ня

хоча бачыць. Я раз-другі адазвалася крытычна, то яна тлумачыць тым, што я "не разумею духу часу" і г.д.

З іншымі старымі і добрымі знаёмымі — тое самае. Дачка Ядвігіна Ш.[2], з якой мы 3 гады (1915–18) былі амаль неразлучныя, напісала мне нядаўна: "Чаго ты хочаш? Маем рэспубліку, маем усё, што дзяржава мець павінна, чаго больш табе трэба? Няхай працуюць так, як вымагаюць час і абставіны". На мае тлумачэньні недахопаў зусім перастала пісаць.

А *яны* там у Менску так залгаліся, што проста не разумеюць, мусі, што робяць, не разьдзяляюць праўды ад маны. Мела я цяпер хвіліны абурэньня і прыкрасьці. У прошлым тыдні атрымала я ад Ю. Бібіла новую кніжку "Пяцьдзесят чатыры дарогі" — збор біяграфіяў і аўтабіяграфіяў беларускіх пісьменьнікаў. Паміж імі аўтабіяграфія Міхася Машары. Можа, Вы яго ведаеце? Чытаю і вачам сваім ня веру! У той час, як я працавала адміністраторкай беларускай радыкальнай прэсы, ён быў адказным рэдактарам.

Ну, адна, другая, трэцяя канфіската — арышт — Лукішкі. Сядзеў 2 гады і 4 месяцы (у аўтабіяграфіі піша, што 4 гады!). Я, як і ўсімі арыштаванымі рэдактарамі, апекавалася ім, пасылала пачкі з ядой, насіла кніжкі праз пракуратуру. У той час ён пачаў пісаць вершы па-беларуску. Кожны верш перасылаў у лістах мне, у рэдакцыю "Заранкі", дзе некаторыя я зьмяшчала. Наагул, дзе трэба было, вершы папраўляла, увагі перасылала яму. Лістоў яго з вершамі набралася ў мяне шмат. Ды на бяду яны, як і ўся папка з лістамі дзяцей да "Заранкі", загінулі.

Машара нядаўна прыслаў мне першую кніжку сваёй трылёгіі "Крэсы змагаюцца" з цёплай дэдыкацыяй. Пры аказіях перасылае мне прывітаньні і г.д. А ў аўтабіяграфіі піша: "*У пачатку 1928 г. турэмны камітэт* (арганізацыя палітвязьняў) *пераслаў на волю нізку маіх вершаў. На сродкі МОПРа*[3] *неўзабаве выйшаў маленькі зборнічак маіх вершаў "Малюнкі"* і г.д. Якая мана! "Малюнкі" выдала я асабіста, памаглі наборшчыкі бясплатнай працай. Ніякі МОПР нічога супольнага з гэтым ня меў. Як Машара выйшаў з астрогу, я яму дала аўтарскія экзэмпляры і невялічкі ганарар, сабраны з прададзеных кнігарняй кніжачак.

Ніяк не разумею, нашто, дзеля чаго такая мана? Скрыць сувязь з "Заранкай", пахваліцца, што МОПР яму памог? Мне ня трэба ды я і не хачу, каб ён называў мяне як выдаўца — не для пахвалы я гэта рабіла, але чаму лгаць і то ў жывыя вочы? Як гэта назваць? Ды ня варта псаваць сабе нэрваў, толькі што я гэтага так не пакіну — гэта ясна.

Пішаце, што маем супольных знаёмых? Адчасьці, гэта так. А. Ліса ведаю, хоць бачу яго рэдка, а аб ім чую ад знаёмай п. Шнаркевіч, да якой ён піша. Караткевіча[4], на жаль, дагэтуль асабіста ня знаю. Хоць вельмі мне ён падабаецца — як у сваіх творах, так і ў тых пару лістах, якія ад яго маю. Асабіста з менскіх знаю І. Саламевіча і А. Лойку, якія ў жніўні да мяне прыяжджалі.

Шышэі, як кажа мой сын, Вас часта і добра ўспамінаюць. У іх вельмі мілая і прыгожая дачушка Ліля. Лёдзя здавала экзаміны за 10 кл. і вучыцца ў вячэрнім тэхнікуме, Косьця працуе на фабрыцы токарам. А чаму Клімовічы аба мне Вам не казалі? Гэта ж вельмі проста! У Вас уражаньне было праўдзівае: беларускія дзеячы — гэта быў Клімовіч і кампанія, ці інакш — хадэкі! У іх быў прынцып — хто ня з намі, той процуў нас! Калі я рэдагавала "Беларускую борць", то яны гаварылі: "Борць" выдаецца на тое, каб зрабіць

падрыў "Самапомачы"[5], якую выдаваў А. Клімовіч. І шмат-шмат падобнага.

Цяпер, калі Клімовічу патрэбныя былі пэўныя зацемкі, ён прасіў аб іх мяне — праз супольную знаёмую п. Шнаркевічыху, а да яе пасылаў Шутавічанку[6]. Тады Шнаркевічава кажа: "Чаму Клімовіч ня зробіць гэтага асабіста, паехаў бы і атрымаў адказы на ўсё, што яму трэба?". На гэта Шутавічанка: "Ён баіцца." Усё ж адважыўся. Я старога, ясна, не ўспамінала, і так пакрысе супрацоўнічаем. Хоць ён у шмат чым хадэкам астаўся.

Што тычыцца М. Марцінчыка, то ў Вас, напэўна, падставы важныя, каб яго не любіць. Я з ім ні ў працы, ні ў якой паважнай бядзе справы ня мела. Прыходзіў у рэдакцыю, пералівалі з пустога ў парожняе. Цяпер ад часу да часу заскочыць даведацца, як маюся, і ўсё. Так што судзіць аб ім не магу.

Ці Вашаму мужу не прыйшлося пазнаёміцца ў Празе з др. Марыяй Голуб-Бучынскай? Вось гэта сапраўды было б супольнае знаёмства! Гэта мая добрая, сардэчная знаёмая.

Цікава, што за Муха, аб якім Вы пішаце? Клімовіча я аб ім не пыталася, а сама ведала Муху[7] (без дадаткаў) — матроса, дэлегата ад Балтыйскага флёту на Вайсковы зьезд у Менску ў 1917 г.

Але паважных спраў — хопіць. Цяпер аб мілым і ясным: аб кветках і грыбах. У нас таксама цьвітуць геаргіні. Глядыёлюсы (дзеткі), флёксы ды з летніх — залаты мак (этольцыя), нэмэзія, алісум, лябэлія. Астры растуць добра, а прыгожых ня маем. Куплялі і флянсы, і насеньне, ды ўсё нічога ня вартае. Ужо маем пасаджаныя двухгадовыя кампанулі і 250 штук браткаў. У нас ёсьць сякія-такія інспэкты, так што ўсе флянсы кветак і памідораў я сама гадую.

Шкада, што ў Вас німа як выгадаваць флянсаў. У мяне вельмі цікавыя памідоры. Ёсьць жоўтыя вялікія, жоўтыя дробненькія — як чарэшні. Падоўжаныя, як сьліўкі, чырвоныя, вельмі плодныя — кусты ломяцца! І бразылійскія высокія. Унук мой выгадаваў куст больш 2 мэтраў вышыні! Праўда, сёлета ўсе вельмі гніюць. Але і так шмат маем. Цікава, як Вы кансэрвуеце памідоры? Напішыце мне, добра? У мяне цяпер самы збор.

А я Вам пасылаю рэцэпт на марынаваныя грыбы. Вельмі добры спосаб, не псуюцца, могуць стаяць гады тры і смачныя. У нас таксама было баравікоў шмат, але гэта пад горадам. Людзей больш, чым грыбоў! Усё ж я замарынавала 10 паўлітровых слоікаў (а 6 маю прашлагодніх) і насушыла. Дачка мая добра зьбірае, а я каля дому знаходжу, маю свае мейсцы.

Унук прыпамінае, каб запытацца, які ў Вас вінаград і скуль маеце, можа, можна адтуль выпісаць? У нас таксама ёсьць, але мой Слаўка[8] любіць садзіць новыя гатункі. Бедны ён у нас! Мае ляганэўроз — трудна яму гаварыць. Цяпер ходзіць да лягапэда на розныя працэдуры. Доктар дае надзею, што вылечыцца, а тым часам мучыцца, і нам цяжка на яго глядзець. А такі здольны да кожнай работы, так добра вучыцца! Фізычна здаровы, мае 13 ½ гадоў і 170 росту! Сільны, а тут такая бяда.

Вось расьпісалася! Чытаць Вам надаесьць. Моцна цалую, прыезду чакаю. Толькі ня думайце самі шукаць! Немагчыма. Спаткаем. Сардэчныя прывітаньні Вашаму мужу.

Л. Войцікава.

5. АРСЕНЮ ЛІСУ

2 сакавіка 1968 г. Вільня

Паважаны грамадзянін[1].

Сягодня атрымала Ваш ліст. У адказ паведамляю, што я ад восені 1915 г. да пачатку 1918 г. працавала ў Менску ў камітэце Таварыства помачы ахвярам вайны і маю напісаныя ўспаміны за гэты час. Апрача таго, магу напісаць гісторыю аднае вёскі ў Сакольскім павеце Гродзеншчыны — яе зьнішчэньне, выезд у бежанцы, паварот...

Калі такі матэр'ял Вас зацікавіць, калі ласка, паведамце, перапішу і перашлю Вам. Калі, пазнаёміўшыся з маімі матэр'яламі, будзеце лічыць, што варта іх даць у друк, будзем старацца гэта зрабіць.

Цяпер у рэд[акцыі] "Полымя" ляжаць два разьдзелы з "Маіх успамінаў". Падобна, будуць іх друкаваць. Калі гэта зьдзейсьніцца, можна было б папрабаваць папхнуць і матэр'ялы бежанцкія. Я сама ў Менску не бываю, але ёсьць там малады кандыдат філялёгіі[2], які ласкава маімі справамі займаецца. Мушу дадаць, што і я сама была ў Менску ў бежанцах, бо прыехала туды з Сакольшчыны.

Прыйшла мне ў галаву адна ідэя, а нават дзьве!

1. У Гродзенскай вобласьці, у Мастоўскім раёне ёсьць вёска Гудзевічы, у ёй сярэдняя школа. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры ў гэтай школе[3] — чалавек вельмі рупны і вучняў сваіх заахвочывае да грамадзкай працы. Я напішу да яго, папрашу, каб пагаварыў з моладзьдзю старэйшых клясаў, мо ў каго ёсьць бабкі і дзяды, якія былі бежанцамі і змаглі б падзяліцца з унукамі сваімі ўспамінамі з тых часоў. Гэта былі б матэр'ялы аўтэнтычныя, з першых рук.

2. Ці не цікава было б сабраць творы нашых пісьменьнікаў, у якіх адлюстраваліся падзеі, перажываньні скранутых з родных хат нашых людзей? Напрыклад, у М. Гарэцкага[4] ёсьць дзьве рэчы — "Уцекачы" і "Пакіненыя хаты". Я маю маленькі абразок "Толькі сон". Яшчэ шмат чаго можна знайсьці. Я думаю, не адмовілася б гэтым заняцца Юлія Язэпаўна Бібіла.

Хіба, пакуль што ўсё. Чакаю адказу і пастановы, што да маіх прапановаў.

З паважаньнем — *Л. Война́ва*.

6. ЯЎГЕНУ ПЕТРАШЭВІЧУ

2 верасьня 1968 г. Вільня

Паважаны Яўген Канстанцінавіч[1].

Дзякую за ліст. Вельмі шкадуем, што Вы не змаглі да нас заглянуць. Гэта была б надта мілая неспадзянка. Пакуль што пасылаю Вам другую абяцанку — пару ўспамінаў аб Я. Хворасьце.

Што тычыцца песьняў — далучаю сьпісак тых, якія мы з дачкой ведаем. Ведаем і мэлёдыі, але запісаць іх німа каму.

Калі паміж гэтымі песьнямі ёсьць такія, якія Вы ня ведаеце, то напішыце. Тады я вышлю Вам тэксты. У выпадку, калі яны Вас зацікавяць, то ёсьць адзін выхад: прыехаць Вам самому і запісаць. Гэта ж недалёка! А за адным заходам паглядзелі б мой архіў: старыя фатаграфіі, лісты, часапісі, якіх і ў музэях німа. А мы ўсе былі б рады.

Сягодня дадаю пару прыпевак з нашай Сакольшчыны. Кладу ў ліст галіначку

сардэчніку. У хуткім часе прышлю некалькі пучкоў са свайго запасу, калі ў Вас німа. Бо, хіба, ужо перацьвіў.

Слава шчыра дзякуе Вам за памяць і за пажаданьні. Сягодня пачаў свой працавіты год. Вашы выезды па артыстаў вельмі цікавыя. Буду ўдзячная, калі сваімі ўражаньнямі хоць коратка са мной падзеліцеся.

Сардэчнае прывітаньне ўсёй Вашай сям'і. *Л. Войцікава.*

Песьні: 1) Умру, умру, бабка, / умру, умру, любка...1) Ой мамачка, не магу — / сеў мне качар на нагу... 3) Ой там у лесе пры даліне, / а там сталася бяда... 4) Учора казаў да шлюбаньку стаці, / а сёньня ідзеш другое шукаці... 5) Ты пойдзеш гарою, / а я даліною...

Мая дачка ведае і другія песьні, але ўсім вядомыя: "А ў полі вярба...", "Ці сьвет, ці сьвітае..." і г.д.

Прыпеўкі

Танцуй, танцуй, абы змог,
не шкадуй маіх ты ног —
мае ножкі сталёвыя,
да таночку гатовыя.

*

Я на ганачку стаю,
сьлёзкі коцяцца.
Мяне замуж аддаюць,
а мне хочацца...

*

Ой пайду я на гару,
на жоўты пясочак —
кавалера прыману
на сыры кусочак!

*

Ой пайду я на гару
ды пасею раману.
Хоць сама я не хароша –
харошага прыману!

Вёска Новы Двор Сакольскага павету.

7. ЯЎГЕНУ ПЕТРАШЭВІЧУ

23 кастрычніка 1968 г. Вільня

Паважаны Яўген Канстанцінавіч.

Дзякую за ліст. Сапраўды, паўза была доўгая. Ці не аматар Вы музыкі, якая складаецца з адных паўзаў?

Я рада, што пасылка зрабіла прыемнасьць усёй Вашай сям'і. З прыемнасьцю чытала аб Вашай працы — падрыхтоўцы да дэкады. Жадаю вялікага пось-

пеху! І Вам, і гр. Я. Хворасту. Апошняму адрас мой, зразумела, дайце, а і мне — яго адрас. Маю да яго паважаную справу. Але не за пару месяцаў, а ўжо зараз...

А да Вас такая справа. У Менску ў Акадэміі навук, у аддзеле фальклёру рыхтуецца да выданьня кніжка "Беларускі дзіцячы фальклёр". Я напісала ліст, паслала ім крыху запісаў (той *каток* і г.д., што пасылала Вам). Сягодня атрымала ліст. Вельмі добра напісаны, прыгожай, чыстай беларускай мовай. Просяць прысылаць як найбольш запісаў — войдуць у кніжку. Паводле мяне, гэта наш грамадзкі абавязак — паслаць як найбольш *праўдзівых* запісаў, каб не дапусьціць *нечага штучнага*.

Можа, і Вы пашлеце што са сваіх збораў? Гэта была б сапраўды вялікая карысьць. У Вас запісы захаваюцца для сябе і адначасна войдуць у кніжку. Падумайце. Добра? Я бы шчыра радзіла...

Нашы запісы з Гродзеншчыны маюць найбольшую вартасьць, бо захоўваюць чыстую народную мову. Вам дасылаю пару дзіцячых песьняў, можа, у Вас іх німа? Я нядаўна дастала і ў Менск дала.

Я Вам пісала, якія маю песьні. Не пасылаю, бо ня ведаю, якія з іх Вам знаёмыя. Як будзеце ўжо мець час і напішаце мне аб гэтым, тады прышлю.

Што тычыцца Вашага прыезду, то калі б ні прыехалі — заўсёды будзем рады. Аб значэньні назоваў напішу другі раз.

Усяго добрага Вам і ўсёй Вашай сям'і. Слава прывітаньні далучае. *Л. Войцікава*.

Песьня пра камарыка

Ладкі, ладкі, ладкі,
ўпаў камарык з кладкі.
Давялося стракaзе
у балоце, у лазе
камарыка ратаваць,
з быстрай рэчкі даставаць.
Каб ня быстрая вада,
то з камарыкам — бяда.
Сеў камарык на траве –
як заплача, зараве:
"Ой, замокла кашулька,
будзе лаяць бабулька,
а штаны у сажы –
што матулька скажа?"
Ой ладкі ды ладкі,
больш ня падай з кладкі.

Вёска Студзёнкі, Нясьвіжскі р-н. Пяяў Юра Гурын (6 гадоў).

Калыханка (народная песьня з Браслаўшчыны)

Люлі-люлі-люлі,
пайшоў кот па дулі,
памарозіў лапкі –

скочыў на палаткі,
а з палатак ды на печ,
ўдарыў бабку паміж плеч.
Тады коцік спужаўся
ды на печцы схаваўся.
Бабка коціка знайшла
ды за вушкі патрасла.
Пайшоў коцік, плачучы,
за ім бабка, плачучы:
"Ціха, коцік, не ўцякай,
ціха, коцік, пачакай.
Ціха, коцік, не тужы,
яшчэ з гадок паслужы.
Куплю табе боты
слуцкае работы.
Боты дарагія –
за тры залатыя.
Ой ты, коце, коце,
не сядзі на плоце,
хадзі лепей к нам, к нам,
нешта табе дам, дам.
Люлі-люлі-люляшу,
а я катка палажу,
каб па ночы не хадзіў,
маёй Насты не будзіў.
Люлі-люлі-люлі,
ўсе дзеткі паснулі,
адзін Яначка ня сьпіць,
ня сьпіць, не драмае –
вочкамі міргае.

Адрас, куды пасылаць фальклёрныя запісы: *Мінск, Інстытут мастацтвазнаўства Акадэміі навук БССР, сэктар фальклёру. Гр. Галіне Барташэвіч*[1].

8. ЯЎГЕНУ ПЕТРАШЭВІЧУ

29 лістапада 1968 г.

Паважаны Яўген Канстанцінавіч.

Яўна адчуваю, што Вы на мяне — абразіліся! За жарт аб музыцы — раз, за налягань не аб хуткі адказ — два. Праўда?

А я пакрыўдзіць Вас нічым не хацела... Аб музыцы чытала якраз такую гумарэску, а прасіла хуценька адрасу гр. Я. Хвораста, бо хацела яго прасіць, каб што-небудзь напісаў аб часах навукі ў Віленскай Беларускай гімназіі. Манімся напісаць гісторыю гэтай гімназіі, а каб было больш матэр'ялу, пастанавілі прасіць былых вучняў аб іх успаміны з часоў навукі. І я вось шукаю былых вучняў па ўсім сьвеце. Так што — будзе згода?

Я Вам абяцала напісаць аб назовах litaradoў. Крыху сабрала. Што тычыцца Вільні, то яшчэ няясна. Адныя кажуць, што ад слова *воўк* — літ[оўскае] *vilkas*,

другія — ад *вічкі*, мейсца паміж дзьвюмя рэчкамі, дзе яны злучаюцца — Вільня і Віленка. Яшчэ буду шукаць.

Далей падаю, што знайшла ў газэтах (польскі "Przegląd Wileński"): 1) Ліда — адно з найдаўнейшых паселішчаў літоўскіх, назоў паходзіць ад літ[оўскага] слова *lida* — выцерабленае мейсца; 2) Ашмяна — літ[оўскае] слова *aszmuo* — вострыя (напрыклад, вастрыё кап'я); 3) Гродна — крыжакі называлі *Gartena, Garten*, усе гэтыя назовы былі сапсаванымі формамі літоўскага слова *gardinas* або *gardas*, што значыць абгароджанае мейсца.

А ці ня чулі Вы якой беларускай легенды аб назове Горадні ці, як яшчэ інакш казалі — Горадзень?

Аб назовах нашых гарадоў, мястэчкаў, рэчак ды вадаёмаў, г.зн. аб тапаніміцы ёсьць асобныя працы. У Менску сёлета выйшла кніжка В. Жучкевіча[1] (парасейску) — "Топонимика Белоруссии", а пасьля ў "Полымі" за чэрвень зьявіўся вельмі добры артыкул нашага доктара гістарычных навук М. Улашчыка[2]. Артыкул крытычны — "Пытаньні тапанімікі Беларусі".

Што ў Вас чуваць? Як ідзе праца? Што робіць гр. Хвораст? Ці пачыналі пісаць музыку да верша "Рэквіем"[3]? Але, цяпер, хіба, німа на гэта часу...

Жадаю выдатных посьпехаў у працы і шлю прывітаньне Вам і Вашай сям'і.

Л. Войцікава.

Легенда аб рэках Нёмане і Лошы

Нёман і Лоша, якія выплываюць з адной крыніцы, паспрачаліся паміж сабою, хто каму павінен першы пакланіцца. Пасьля полудня (абеду) Нёман і Лоша ляглі на ўзгорку адпачыць. Лоша прачнулася першая і ціхусенька пабегла па зялёнай сенажаці, хаваючыся пасярод кустоў і ройстаў.

Збудзіўся Нёман, бачыць — Лошы німа. Устаў ён тады, выпрастаўся і пабег праз лясы і лугі, выперадзіўшы Лошу. Выбегла Лоша з зарасьляў і балотаў, папоўніўшыся шматлікімі крыніцамі, глядзіць — а Нёман далёка-далёка наперадзе... І мусіла Лоша пакланіцца яму, уліваючы свае воды ў бурлівы Нёман.

9. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

2 лютага 1969 г.

Даражэнькая.

Дзякую за ліст. Даўна я яго атрымала, але ўсё не магла сабрацца адказаць. З прыкрасьцю і болем чытала я аб Вашых жыцьцёвых труднасьцях. І цяжка, і дзіўна: столькі маеце шчыра прыхільных людзей, а памагчы Вам ніхто ня можа, хоць, не сумняваюся, не адзін хацеў бы, але, відавочна, усе не паны над сваёй воляй.

Лявона Л[уцкевіча] [1] я даволі даўна ня бачыла. Ня хочацца мне Вас расчараваць, але ніяк не магу дадумацца, якім чынам у Вас злажылася такая думка аб Лявоне? Эх, каб ён быў такі, як Вы думаеце! Ня буду пісаць яго характарыстыкі, адно скажу, што ён вельмі далёкі ад нашых беларускіх інтарэсаў, і гэта галоўны яго мінус. Не выпісывае ніякіх беларускіх часапісаў, не цікавіцца нашымі балючымі справамі. Я заўсёды стараюся ўсунуць кніжкі, якія атрымліваю.

Як былі яны з маім сынам у Менску, Тонік[2] пазнаёміў яго з Саламевічам, С. Новікам[3], а тут у Вільні — з Кісялёвым. Я ўжо месяцы тры прашу яго, каб напісаў

свае ўспаміны з Беларускай гімназіі і зрабіў адбіткі фатаграфіяў, але рэзультату німа. Я не віню яго. Абставіны такія, што ён у маладыя гады не набраўся патрыятызму, а цяпер? У нас фактычна і беларусаў амаль німа. Адзінокаму чалавеку дзе дзецца? Найбольш кампанія чужая — расейцы. Наагул, ён добры чалавек, але актыўнасьці ад яго вымагаць трудна. Але хопіць аб ім.

Зайздрошчу Вам, што чытаеце "Каласы"[4]. Калі А. Мальдзіс[5] зьбіраўся ў Вільню, хацеў прывязьці нам "Каласы". Але аўтар не пазволіў. Сказаў, што як выйдзе другі том, то сам прышле абодва разам. Пакуль што німа. Можа, проста забыўся. Трэба будзе пазычыць у Шнаркевічаў, бо ім нехта ўжо прыслаў. Я ў іх даўна не была. То мароз быў вялікі, то сьлізка. Сягодня папрасіла сына, каб пад'ехаў да іх, даведаўся, як яны маюцца. Сама пакуль што не зьбіраюся, бо ў нас грыпа: ляжыць Слаўка.

Вельмі зацікавіла мяне, што Вы пішаце аб працы Івана Л[уцкевіча] "Кітаб". Я аб гэтым ніколі ня чула. Ведаю, што "Ай-Кітаб" распрацоўваў Янка Станкевіч[6]. Але Іван Л[уцкевіч]?

Вельмі добра, што С. Панізнік[7] так цікавіцца тканінамі і наагул фальклёрам нашым. От каб ён пабачыў дываны ў Белакозаў! Цудоўныя, мне аж вочы "вылазілі". Разумеецца, што Юлія Б[ібіла]ня дасьць рады ўсіх аматараў задаволіць, каб і ніткі мела. Пісала, што хутка мучыцца сама і — вочы. Я ёй шчыра радзіла, каб яна пастаралася знайсьці пару дзяўчатак і навучыла іх ткаць. Мусілі б гэта быць хоць менш-больш з артыстычным смакам і зразуменьнем. Трэба аддаць сваю ўмеласьць маладым, бо прападзе бескарысна.

Ці грамадзянін С. Панізнік ня мае якіх "ходаў" у "Літаратуры і мастацтве"? Можа, пацікавіўся б, што рэдакцыя зрабіла з артыкулам Надзеі Маркаўны Шнаркевіч "Аб народным мастацтве"? Ён добра напісаны. Як жа ёй было б прыемна пабачыць яго ў друку! Н. Шнаркевіч апошні час вельмі дрэнна чуецца. Проста баюся, якую вестку сын мой ад іх прынясе. Я аб гэтым яе артыкуле ўжо шмат каму і гаварыла, і пісала, але ўсе астаўляюць без увагі. Я ўжо ў пэўным выпадку чула такі сказ: "Проста сьмешна: ідзе работа ў такіх маштабах, а ў Вас клопат аб адным чалавеку". Ці з гэтым можна згадзіцца?

З галавы мне не выходзіць справа тых студэнтаў[8]. Але што ім парадзіць? Пакінуць унівэрсытэт? Ісьці ў другі? А якія пасьведчаньні яны атрымаюць? Можа, воўчы білет? Усё магчыма.

Як чуецца Ваш муж? Шчырае яму прывітаньне ад нас усіх і Вам таксама. Цалую моцна. Ваша *Л.В.*

P.S. Не падумайце, што я маю што проціў Лявона Л[уцкевіча]. Ён жа ў нас як свой, і таму мне прыкра, што ён абыякавы да нашых спраў. А, можа, такі ўжо характар? Гэтакі і ў маёй дачкі. А мы з сынам калі што — кіпім... Пішаце, што Прашковіч[9] міла гаварыў аб З. Верас? Ён жа мяне ня ведае. А можа, якраз пры асабістым знаёмстве ўражаньне было б нэгатыўнае.

10. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

26 сакавіка 1969 г. Вільня

Даражэнькая.

Дзякую за даўгі і цікавы ліст. Добра, што Вам удалося сьвяткаваньне, і прыгатавалі столькі смачных страваў. Мы 8-га сьвяткавалі ўчатырох, бо Славу ніяк ня можам угаварыць, каб на свае ўрадзіны запрасіў калегаў. Ня хоча,

а запрашаць дарослых німа сэнсу, хоць тут шмат хто так робіць. На ўрадзіны малых дзяцей запрашаюць дарослую кампанію. Ядуць, п'юць, гуляюць да познай ночы, а дзіця нудзіцца.

Слаўка на свае ўрадзіны сам сабе заказывае абед, гэта ўжо так заўсёды. Сёлета прасіў зрабіць плоў — матка робіць праўдзівы азэрбайджанскі, сьліўковую зупу, ну а далей — усё салодкае.

На ўрадзіны Тоніка 8 лютага былі госьці. Але прыймалі скромна. Бо перадусім мы з Галяй ужо мелі пачаткі грыпы, а па-другое, Галя трымаецца загранічнай моды. Халодныя закускі: тры гатункі салятаў, грыбы салёныя са сьмятанай, зарыльмопсы, і адно гарачае — сасіскі з жоўтым сырам і вэнджаным бачком (закручаны сьлімаком) і засмажаныя да іх агуркі (свае запарываныя), памідоры, грыбы марынаваныя. Хруст і пунш. Я нічога не памагала, рабілі Галя[1] і Слаўка.

Цяпер надходзіць Вялікдзень. Мне вельмі хочацца што-небудзь прыгатаваць, але ці ўдасца — ня ведаю. Перадусім цяжка з прадуктамі, ніколі нявевдама, што ўдасца дастаць. Аб цяляціне і марыць німа што. Ніякіх вандлінаў, каўбасы і г.д. А яшчэ бяда, што духоўка не пячэ ў кухні, а толькі маленькая, што ў пакаёвай печцы. А ў яе ўлазіць толькі маленькая брытванка. Усё ж нейкую пячэнь сьпячэм — або я, або Слаўка, ён гэта добра ўмее. Ну і хочацца зрабіць крохкі мазурак, абліваны чакалядай. А так што гатовае купім.

Як прыпомню (расказываю Славе), якія сталы ставілі на Вялікдзень у часы майго дзяцінства! Бабы, мазуркі самыя розныя, баўмкухэны — торты тады ня ў модзе былі. Як пачнуць пячы ў чацьвер або ў сераду, то толькі ў суботу пасьпеюць скончыць. Нават сьмешна. Але што ж — традыцыя. А мая Галя абураецца — ці ў ядзе сьвята? З аднаго боку — так, а з другога? Гаспадыня мае пару дзён, а то і больш, спакой — кожны есьць, што хоча і колькі хоча, ня трэба абедаў варыць. Але хіба аб справах кулінарных хопіць — нэрвы адпачылі.

Цяпер тое, што строга паміж намі: ад П. М[ядзёлкі] я мела два лісты. На першы адказала, на другі — таксама. У другім лісьце яна мне прыслала копію рэцэнзіі, якую на яе ўспаміны прыслаў С. Александровіч[2]. Ён хваліць, лічыць кніжку патрэбнай і карыснай. А я гэтай кніжкі баюся. Баюся, што там будзе выліта шмат "памыяў" на людзей, якія гэтага не заслужылі.

Тое, што Вы пішаце (аб Аляхновічу[3]) — няпраўда! — аб яе адносінах да Уладкі Луцэвіч[4] ужо нешта нядобрае гаворыць. У адным з лістоў с.п. Ванда Лёсікава (Лявіцкая) пісала мне: "П. М[ядзёлка] піша ўспаміны, баюся, ізноў трэба будзе пераживаць, душа перавернецца ад яе характарыстык". Яна піша, што Тамаша Г[рыба] (свайго пазьнейшага мужа) яна пазнала ў 1918 г., а сапраўды абое былі на зьездзе 25–27 сакавіка 1917 г. Ужо няпраўда. Хоча абмежавацца ад некаторых падзеяў — "і я не я"? Мой сын кажа: "Раз друкуюць, то ўжо там ня ўсё чыста". Можа, і так.

Арсень Л[іс] быў у нас. Як заўсёды — сардэчны. На другі дзень сабраліся ў Лёні Л[уцкевіча] (ён мае ўжо сваё добрае памешканьне) учатырох: Лёня, Арсень, Гена Кісялёў і Тонік і назвалі сябе Клюбам старых кавалераў.

Была я нарэшці ў Шнаркевічаў. Пісала да іх ці, лепш, да яе Юлія Б[ібіла] (пісала і да мяне, але коратка), што зьбіраецца стварыць мастацкую арганізацыю, якая б занялася паяскамі, краваткамі і г.д. Думае шукаць падтрымкі ў П. Глебкі[5]. Можа, што з гэтага і выйдзе. Яна дзівіцца, што С. Панізьнік да яе "не дастукаўся". Яна цэлы люты дрэнна чулася і нікуды не выходзіла, а "падзяліцца сваімі дасягненьнямі заўсёды рада". Піша, што, можа, ня там шукаў, бо на другім баку

ёсьць той самы нумар дома, толькі з літарай А. Можа, напішаце яму?

Ніяк ня можам дачакацца вясны. А мне яна так патрэбная! Чуюся дрэнна. Пачала ізноў балець галава, коле ў сэрцы. Стараюся сябе перамагчы, але трудна, вельмі трудна. Проста арганізм перастае функцыянаваць. Арсень [Ліс] кажа: “Каб Вам цяпер пратрымацца, а як зямля разьмерзьнецца, зрабіць наліўку на карэньнях ялаўцу — яна вельмі памагае”. А калі зямля разьмерзьнецца? Чакай гэтага. Днём цёпла — да +6⁰, а ўночы марозы. Толькі пралескі ня маюць цярплівасьці і паказаліся — пупышкі на тых узгорках, дзе сьнег сыйшоў.

Чытаю строфку песьні, якую Вы выпісаліз кніжкі Cat-Mackiewicza[6], і думаю, ці гэта з песьні:

Пайду я гарою,
А ты даліною,
А Бог сам знае, а Бог ведае,
Ці мне быць за табою.
Ці гэта два вар’янты?

На жаль, працягу песьні не магу прыпомніць, ведаю толькі, што канчаецца:

Ды ня даў мне Бог,
Не судзіў мне Бог,
Каго верна любіла.

Нядаўна знайшла стары-стары сшытак, а ў ім некалькі песьняў з Сакольскага павету Навадворскай парафіі. Калі крыху папраўлюся, то зьбяруся да П. Сергіевіча[7]. Ужо столькі разоў запрашалі, а я ўсё не магу сабрацца. А я яго знаю з часоў, як яшчэ студэнтам быў.

Заўтра думаю сеяць памідоры ў скрыначках, а пасьля перанясуцца ў інспэкты, калі мае мужчыны зробяць новыя вокны, бо старыя паламаліся. Дастала я насеньне памідораў, якіх 3 штукі ідзе на кіляграм. Можа, яшчэ і выгадую.

Трэба канчаць, бо вельмі позна, і мой апякун Тонік злуецца, што не лажуся. Мусі, трэба слухацца. Пішыце. Цалую Вас моцна. Мужу Вашаму прывітаньне. Мае вітаюць Вас абаіх сардэчна. Ваша *Л.В.*

P.S. П. М[ядзёлка]на другі мой ліст не адказала яшчэ. Што тычыцца Вашага грамадзянства, то мы тут з Арсенем [Лісам] дайшлі да вываду: усе, хто Вас намаўляе, робяць гэта, маючы на ўвазе Вашае дабро (можна так сказаць?), бо тады Вас прынялі б у Саюз пісьменьнікаў, і Вы мелі б запэўненую пэнсію — 100 руб. у месяц. Я разумею, што ў цяперашніх абставінах Вам ня хочацца рабіць сябе залежнай, але хто ведае, можа, гэта і добра. Толькі што ніхто ня мае права рабіць на Вас націску. *Л.В.*

11. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

[1969 г.]

Даражэнькія.

Учора напіса гэтае адно слова, а далей — ні-ні. Позна было, і сын ня даў сядзець. Ён бы мяне, мусі, з прыемнасьцю закутаў у вату і на цьвічок павесіў. Рана ляжу, як якая пані, да гадзіны 12-й, а ён накорміць нашую жывёлу: сабак,

катоў, кролікаў, гарбату прыгатуе, печку напаліць. Слаўка ўстае а 7-й, робіць сабе сьняданьне і ідзе ў школу. Дачка кожны дзень іншай парой выходзіць, часам рана, а часам позна. Мне астаецца паспратываць, абед зварыць. Абед у нас позна — а 7-й, а як Слаўка са школы прыйдзе — то другое сьняданьне, а 2-й. Яго накарміць нялёгка, бо апэтыт роўны яго ўзросту і сіле.

Дзякую за памяць аб маім здароўі. Крыху кашляю, але гэта драбніца. Прошлай вясной др. Глеб [Багдановіч] аж дзівіўся, што ў мяне лёгкія — як у маладой. Горш з жыватом — такія "абструкцыі", што рады даць не магу. І крушыну п'ю, і сьліўкі мочаныя нанач ем — і ўсё без рэзультату. Проста замучылася.

З прыемнасьцю падаю Вам рэцэпты на крапіву. Што да смаку, то ў кожнага свой густ. У нас усе зялёныя зупы любяць. А я вару ня толькі крапіву, але і сьнітку, і пазьней — лебяду. Падаю Вам таксама рэцэпт крохкіх цястак з "Гэркулесу" (аўсянкі) — недарагія і смачныя.

Ведаеце, каб утрымаць нейкую духовую раўнавагу, трэба хоць часам заняцца гаспадарчымі-кулінарнымі праблемамі, дзеля адпачынку, бо сапраўды можна заламацца псыхічна, ня вытрымаць усяго, што робіцца.

Атрымала пасьля доўгага маўчаньня некалькі слоў ад Аляксандра Мікалаевіча Б[елакоза]. Проста роспач, што там робіцца. І да чаго гэта ўсё давядзе? Куды мы ідзем?

А за свайго сына я спакойная. Перадусім яму ўжо 50 стукнула, ніхто галавы яму не закруціць. Па-другое, ён столькі пераджыў, столькі выцерпеў, што яго пагляды для яго даражэй жыцьця. Па бацьку пайшоў. Учора ён быў у П. Сергіевіча, там спаткаўся з Антановічам[1], бачыў яго працу аб Ай-Кітабе. Антановіч казаў, што Ай-Кітабу ёсьць ня толькі адзін экзэмпляр, што ў Літ[оўскай] акадэміі (з нашага музэю). Але ёсьць яшчэ ў Казані і Нямеччыне. Антановіч усё гэта дасьледаваў падрабязна. Ён адзіны спэцыяліст па Ай-Кітабу. І гэта тэма яго доктарскай дысэртацыі, якую будзе бараніць у Менску. Мая Галя Антановіча ведае, бо яны адначасна Віленскі ўнівэрсытэт канчалі.

"Мой Дагестан"[2] я чытала. Ён друкаваўся ў часапісі "Новый мир", якую Тонік кожны месяц купляе. "Полымя" маем — Галя выпісала. І "Дуб Крывашапкі" Караткевіча ў "Маладосьці" чытала і аж засьмяялася з радасьці, што нідзе не напісаў ні разу *касьцёр*, а — *вогнішча*. Гэты *касьцёр* мне шмат крыві напсаваў. Затое не магу яму дараваць, што расьліну, якую сам так прыгожа называў *малінавы скрыпень* (у нас яе называюць *залётнік*), назваў па-расейску *кіпрэй*. Трэба ж так зрабіць! А "Каласоў" я так і ня маю.

Учора мела ліст ад П. Мядзёлкі. Прыемна мне. Гэта — як голас з маладых гадоў. Абяцае летам прыехаць. А я нідзе не змагу парухацца, бо Галя на цэлы ліпень едзе ў Эрфурт, а ў жніўні сваяк наш запрашае яе і Слаўку ў Варшаву. Хацеў запрасіць мяне з сынам, але мы з розных прычын прыняць запросінаў не маглі. Хутка 8-га. Помню, што Вы сьвяткуеце ўрадзіны Вашага мужа. Прыйміце і перадайце мужу мае сардэчныя павіншаваньні і пажаданьні як найлепшага здароўя і як найлепшых жыцьцёвых клопатаў. А Вам асабіста ў наш жаночы дзень — хоць крыху спакою духу.

Цалую Вас шчыра. Ваша *Л. Войцікава.*

P.S. Што за бяда з Юл. Бібіла? Чаму яна так упарта не прыймае С. Панізьніка? Мне яна ня піша. Наагул, адносіны да мяне зьмяніліся. Чаму — ня ведаю. У кожным выпадку, сумленьне ў мяне чыстае.

12. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

26 студзеня 1970 г. Вільня

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч[1].

Доўга я Вам не пісала, усё чакала, каб пераслаць Вам канкрэтныя весткі. Толькі ўчора сын мой дабраўся да Я. Багдановіча[2]. Усё ня мог сабрацца, а віна мая, ці лепш, майго дрэннага здароўя. Ён можа выйсьці з хаты толькі тады, як дачка вернецца з працы, а Слаўка са школы. А гэта ўжо амаль вечар, і шукаць Я. Б[агданові]ча ўжо цяжка. Ён жыве ў зусім новым раёне за ракой, дамы параскіданыя. Адзін раз сын паехаў, але ўжо быў вечар, і не знайшоў. Учора ўдалося.

Ліст Ваш (Вашай вучаніцы) аддадзены. Я. Б[агданові]ч абяцаў усё, што прасілі, зрабіць: вершы выпісаць і Вам выслаць. Апрача таго, ён казаў, што аднёс да Надзеі Маркаўны [Шнаркевіч] глёбус з беларускімі надпісамі-назовамі — для Вашага музэю. Глёбус паходзіць з Віленскай Бел[арускай] гімназіі.

Надзея Маркаўна бядуе, што так доўга ня можа выслаць Вам лялькі, але часта перарывала работу, бо дрэнна чулася. Я ў яе даўна не была — не магу, але дачка мая была ў іх, адвозіла там нейкую драбязу, патрэбную для лялькі. Гэтая лялька будзе сапраўды цэнным экспанатам, бо да апошняй драбніцы касьцюм выкананы паводле старасьвецкіх вымогаў.

Вы пішаце, што шкадуеце, задаўшы хворай такую працу? Але гэта дарма. І ня думайце так. Такая, у пэўным сэнсе творчая, работа дае ёй шмат задаволеньня, адрывае ад цяжкіх думак, якія мусяць міжвольна прыгнятаць хворага чалавека. Калі я бачыла Н.М. яшчэ перад Новым годам, то зьдзівілася, з якім энтузыязмам яна бралася за работу. Я яе зусім разумею.

Я маю некалькі паштовак з сэрыі “Беларускія тыпы”. Вельмі хачу іх фотакопіі пераслаць Вам у музэй. На жаль, зрабіць фотакопіі, хіба, няхутка ўдасца. Хоць сын і абяцае, але ён так зьвязаны маёй хваробай (часта ляжу), што ня ведаю, калі гэта будзе. Аддала б арыгіналы, але такіх і бібліятэка Акадэміі навук у Менску ня мае і прасіла фотакопіяў. Прыйдзецца Вам пачакаць.

Ларыса Антонаўна [Геніюш] пісала мне, што Вам вярнулі ліст да М. Забэйды-Суміцкага[3]. Што ж гэта такое? Па гэтакаму адрасу яму з Вільні пішуць. Ага, ці Вы пісалі яму на той адрас, што я Вам некаліс паслала?

Аляксандра Ігнатаўна Смоліч[4] прыслала мне крыху ўспамінаў аб Гарадзенскай Бел[арускай] гімназіі 20-х гадоў. Яна піша, што там галоўнай дзяячкай была *Серафіма Кішко*[5]. Ці Вам гэтае прозьвішча штосьць гаворыць? А ці наагул аб гэтай гімназіі Вы чулі? А можа, грамадзянка Петрашэвіч[6] штонебудзь ведае? Калі будзеце ў Горадні, калі ласка, запытайцеся.

Матэрыялы да гісторыі Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі памаленьку набіраюцца, шмат фатаграфіяў. У жніўні будзе ў Вільні выстаўка працаў мастака П. Сергіевіча. Трэба Вам абавязкова прыехаць паглядзець. Адначасна пазнаёміцца з гісторыямі беларускіх гімназіяў Заходняй Беларусі. Можа, і я дацягну да гэтага часу, то яшчэ раз пабачымся.

Усяго Вам добрага! Усей Вашай сям'і шлем сардэчныя прывітаньні. *Л. Войцікава.*

13. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

2 лютага 1970 г. Вільня

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч.

Сягодня атрымала Ваш ліст. Дзякую. Адразу бяруся адказаць. Перадусім віншую з такой здабычай, як шкло! Нарэшці давядзеце да парадку этнаграфічны музэй.

Тапаніміка — вельмі цікавая галіна навукі. Шчыра жадаю Вам як найбольшых посьпехаў. Каб павясьці працу ў такіх маштабах, як думаеце, трэба знайсьці супрацоўнікаў. А ці шмат знойдзеце людзей, якія б гэтак горача браліся за справу, як Вы?

Ці ёсьць у Літоўскай АН аддзел тапанімікі — пастараемся даведацца праз Г. Кісялёва і зараз Вам паведамім. Паштоўкі для музэю ўжо перафатаграфаваныя, але нашы фатографы — мой сын і Лявон Луцкевіч — запрапанавалі, каб іх зрабіць у большым фармаце, бо цяпер яны велічыні паштоўкі і для музэю замала выразныя, бо на іх цэлыя групы людзей. І я ўважаю, што іх праект разумны, а значыцца — трэба яшчэ крыху пачакаць.

Сягодня пасылаю Вам фатаграфію магілы с.п. Івана Луцкевіча ў Закапаным. Яна даволі цёмная, але такая ў кніжцы, з якой перафатаграфаваная. Фатаграфію гэтай магілы пасылаю таксама М. Пецюкевічу[1] (ён цяпер у санаторыі), бо ён маніцца адшукаць у Закапаным магілу і паставіць на ёй хоць невялікі помнік. Ці ўдасца яму знайсьці? Ён ужо шукаў, але не знайшоў і таму прасіў прысладь яму гэты здымак. Ці паможа — ня ведаю. Усё ж прайшло 40 гадоў! Крыж мог паваліцца. У найгоршым выпадку М. Пец[юкеві]ч хоча хоць прыблізна знайсьці кусочак мейсца, закупіць яго і помнік паставіць.

Пасылаю таксама фота Ганкі[2] з камэдыі Каганца "Модны шляхцюк", якая выступала на спэктаклі Горадзенскага гуртка беларускай моладзі ў 1911 годзе.

Я таксама непакоілася аб здароўі Надзеі Маркаўны [Шнаркевіч]. Яна мне на ліст не адказала, кажаце, што і Вам ня піша, і С. Новік-Пяюн адказу ад яе не атрымаў. Сягодня дачка адшукала ў інстытуце студэнтку — сваячку Надзеі Маркаўны — і спыталася, у чым справа. Тая кажа, што ўсё нармальна, ня горш, як заўсёды. І тут я ўжо нічога не разумею. Я ў Н.М. вельмі даўна не была — месяцы тры. Вельмі дрэнная дарога ад нас да аўтобусу: то глыбокі сьнег, то сьлізка, і дзеці мяне не пускаюць. Можа, нарэшці, гэтая мука-зіма скончыцца, тады будзе лягчэй.

Як толькі даведаемся што аб аддзеле тапанімікі — напішу. Пакуль што ўсяго добрага! Няхай усе Вашы намеры спаўняюцца як найлепш. Вітаю Вас і ўсю Вашу сям'ю.

Л. Войцікава.

14. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

21 сакавіка 1970 г. Вільня

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч.

Ліст Ваш атрымала. Яшчэ раней я пісала да Вас, паслала адрас таго знаёмага этнографа. Можа, ён ужо да Вас напісаў? Крыху раней ці крыху пазьней напіша напэўна. У канцы месяца едзе на адпачынак, то будзе мець больш часу.

Пару дзён таму пісаў мне Янка Багдановіч, што як выслаў Вам вершы М. Явара[1], то атрымаў ад Вас вестку, а на другую пасылку (нэкралёг М. Явара і 2 фатаграфіі М. Забэйды) адказу ад Вас ня мае. Баіцца, што маглі яны недзе прапасьці. Ці атрымалі Вы другую пасылку? Напішыце, калі ласка, аб гэтым.

Абурыла мяне вестка, што П. Сергіевіч не адказаў на ліст дзяўчынкі. Як жа гэта некультурна! Вы пытаецеся, скуль я ведаю, што ён меў даць у музэй свой абраз (цярпець не магу слова *карціна* — гэта ж чыста расейскае слова з адной зьмененай літарай!). Тут Вы мяне не зразумелі. Я пісала, што ён казаў аб высылцы ў Гудзевічы фотакопіяў, а гэта я і мой сын (які працы П. С[ергіевіч]ча добра ведае) думаем, што мог бы паслаць хоць які пэйзаж, бо ў яго іх шмат. У пэйзажах работы няшмат. Ён малюе хутка. Адзін пэйзаж маляваў у нас у садзе. Вельмі добры. Зрабіў 3 ці 4 копіі з яго і прадаў, а арыгінал падараваў мне на маё 75-годзьдзе. Я П. С[ергіевіч]ча ведаю вельмі даўна, яшчэ як ён быў студэнтам.

Унучка Ядвігіна Ш.[2] прыслала мне фатаграфіі сваёй маткі — дачкі Ядвігіна Ванды Лёсікавай, і фатаграфіі свайго ўнука, г.зн. прапраўнука Ядвігіна Ш.! Гэтыя апошнія — толькі паказаць, мушу адаслаць назад. Але, можа, удасца выпрасіць у яе фатаграфіі Ванды Лёсік і хлопчыка, а можа, і Ядвігіна Ш.— для Вас.

Ці прыслаў Вам А.С. Ліс сваю кніжку пра П. Сергіевіча? Я яго аб гэтым прасіла, але адказу ня маю. Сьпяшаюся, бо сын выходзіць. Хачу, каб ліст гэты выслаў.

З прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

Яшчэ раз пасылаю адрас: *Польшча — Polska, Torun-4, ul. Drzumaty, 14/24, m. 2, magister Marjan Pieciukiewicz.*

15. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

6 мая 1970 г. Вільня

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч.

Ваш ліст атрымала 2 мая — дзякую. Вы ўжо, хіба, атрымалі заказную пасылку з фатаграфіямі? Здаецца, я ўсё напісала, як трэба. Толькі дакладнай даты, калі я фатаграфавалася, ня ведаю. У кожным выпадку ў 1911 г.— пасьля спэктаклю "Модны шляхцюк"[1].

Вельмі цікавая і важная ў Вас падзея — знаходка манетаў! Ці Вы напісалі аб гэтым хоць бы ў "Літаратуру і мастацтва"? Няхай бы ўсе ведалі.

У справе літоўскай мовы ў школах ■ раджу Вам зьвярнуцца да Янкі Багдановіча. Ён жа вучыцель. Хоць вучыць у польскай школе, але і з іншымі школамі, хіба, мае кантакты. Ён чалавек услужлівы, напэўна, Вам адкажа. Я якраз 2 мая яго бачыла, але гэта было на сьвяткаваньні 70-годзьдзя Адольфа Клімовіча, шмат было гасьцей, і гаварыць з Ян. Б[агдановіч]ам я ня мела магчымасьці.

Дачка мая цяпер вельмі занятая і пакуль што не магла паразумецца з літоўцам-тапанімікам. Але зробіць гэта напэўна. А ці Вы ведаеце, што ёсьць беларуская кніжка (загалоўка ня помню) на тэму тапанімікі. Аўтар — Алесь Бачыла[2]. Я днямі буду яму пісаць. Запытаюся, ці гэтую кніжку можна цяпер дастаць.

Я доўга ня мела весткі ад Ларысы Антонаўны [Геніюш], але сягодня атрымала ліст. Скаржыцца, што вельмі баліць галава. Такая ў нас звар'яваная пагода, што цяжка вытрымаць. Учора раптам тэмпэратура паднялася да +27°! Сягодня было +26°. Слаўка зрабіў цяпліцу з плёнкі на агуркі. Я сягодня як адчыніла

дзьверкі, то аж у вачах пацямнела — такое гарачае паветра адтуль бухнула. Ну, але можа, хоць расьці што пачне, калі халады мінулі. Толькі ізноў страх, каб не сушыла.

Хутка ўжо і навука ў школах канчаецца. А калі Вы ідзеце на адпачынак? Праектаў на лета ў Вас, хіба, шмат.

Усяго добрага Вам і ўсёй Вашай сям'і. З прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

16. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

16 мая 1970 г. Вільня

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч.

Дзякую за ліст. Пакуль што на яго не адказываю — ня маю часу. Пішу толькі некалькі сьпешных слоў.

14 чэрвеня надходзіць 70-годзьдзе М. Забэйды-Суміцкага. Можа, захочаце (калі гэта магчыма) павіншаваць яго. Апрача таго, быў нядаўна ад яго ліст. Ён просіць, каб хто-небудзь наведаўся на магілу яго маткі. Гэта недзе каля Ружаны[1]. На жаль, назову вёскі ня ведаю. Нашы тутэйшыя раздумываюць: далёка, німа каму і г.д. Яшчэ, напэўна, доўга будуць думаць. Каб я была крыху маладзейшая, напэўна, ня думала б!

Якія ў Вас могуць быць магчымасьці? Можа, у ваколіцах Ружаны маеце знаёмых выкладчыкаў. Як бы наладзіць апеку над магілай? Гэта быў бы найлепшы падарак на яго юбілей.

Тут у Вільні ёсьць яго піяніна. Ён просіць, каб яго прадаць і паставіць на магіле маткі помнік. Але гэта ўжо справы далейшыя. Паміж іншым, падобна, здароўе М. Забэйды-Суміцкага вельмі благое.

Вось і ўсё. Вітаю! *Л. Войцікава.*

17. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

20 чэрвеня 1970 г. Вільня

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч.

Я ў "Полымя" напішу. Але не да Бачылы, а да таго чалавека (ня помню прозьвішча), які мае дачыненьне да старонак энцыкляпэдыі і які ў свой час прыслаў мне на перагляд карэктуру зацемкі аб "Заранцы". Можа, гэта больш паможа. Я неяк на Бачылу не спадзяюся. Была ў мяне да яго справа (не мая асабістая), і ён мне не адказаў. Людзі мяняюцца, ці што?

З абурэньнем чытала ў Вашым лісьце аб паводзінах і парадах той жанчыны з Горадні. І гэтакая асоба загадвае літаратурным аддзелам музэю? Ды яшчэ вучыць моладзь? Чаго ж яна можа навучыць?

Была я ў Надзеі Маркаўны [Шнаркевіч]. Яна як быццам крыху ажывілася, прынамсі, рукі перасталі балець. Але наагул — мучаніца яна.

20 ліпня — 90 гадоў з дня нараджэньня Гальяша Леўчыка. Шкада, што якраз падчас канікулаў. Думаю, што да 20-га С. Новік-Пяюн пасьпее прысылаць Вам мае ўспаміны аб Г. Леўчыку. Пасылаю яму фатаграфіі Г. Л[еўчыка] — да ўспамінаў. Ён хоча наклеіць на першай старонцы.

Ці атрымалі Вы мой ліст, у якім я Вам паслала прозьвішча першастрэчнай (дваюраднай) сястры М. Забэйды? Абавязкова пастарайцеся паехаць.

Яна, хіба, магілу маткі М.З. Вам пакажа. Паглядзіце, у якім стане магіла, і напішыце мне. Толькі не кажыце там у вёсцы, што робіце гэта на просьбу і з ведама М. З[абэй]ды. Кажыце, што гэта Вас асабіста цікавіць. У хуткім часе прышлем (ці я, ці Надзея Маркаўна) фатаграфію М. Забэйды з маткай. Вельмі добры здымак. Сын мой перафатаграфуе і павялічыць.

Што тычыцца прозьвішча К. Буйлянкі[1], то я Вам паведаміла тое, што мне напісала Паўлінка М[ядзёлка], а яна піша, што паўтарае словы самой Буйлянкі. Я не філёляг, але мне ніякія зьмены прозьвішчаў не падабаюцца, і не лічу іх магчымымі. Проста для мяне дзіка гучыць *Бруна* або *Сукарна*. Так некаторыя маё прозьвішча пішуць па-расейску *Войтик*. Я з гэтым не згаджаюся. У якой бы мове ні было — гучаньне прозьвішча зьмяніцца ня можа. Ну, але гэта ўсё няважна.

У справе 90-х угодкаў нараджэньня Г. Леўчыка я атрымала ліст са Слоніма — ад рэдактара *радиовещания*, з просьбай аб успамінах аб Г. Леўчыку. Ліст — па-расейску! Я адказала па-беларуску і паміж іншым парадзіла, калі майго ліста не зразумее, каб узяў сабе перакладчыка! Калі выступяць з успамінамі аб Лейчыку ў расейскай мове, то ён у магіле перавернецца ад такой зьнявагі. Вылаюць мяне за гэта ці не?

Пасылаю Вам фатаграфію Ядвігіна Ш. Дрэнная, бо — выхапленая з групы. Лепш зрабіць не ўдалося. А фатаграфіі Ядвігіна Ш. ніхто ня мае, нават унукі яго.

Усяго найлепшага. Усім прывітаньне. Музэю жадаю — расьці! *Л. Войцікава.*

18. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

29 чэрвеня 1970 г.

Паважаны пане Мальдзіс[1].

Як бачыце, даганяю Вас лістом. Прыйшло мне ў галаву, што магчыма добрых, праўдзівых інфармацыяў пра У. Самойлу[2] той, хто цікавіцца У. Самойлам, мог бы дастаць у доктара Мікалая Міхайлавіча Марцінчыка ў Гродне. Др. Марцінчык, у той час студэнт мэдыцыны, стаяў блізка да грамадаўскай прэсы і, здаецца мне, быў з Самойлам добра знаёмы. Ня ведаю толькі, як др. Марцінчыка здароўе, бо сёлета я яго ня бачыла. Калі б трэба было, я магла б да яго напісаць. Калі ласка, паведамце.

Што тычыцца вестак, здабытых ад Я. Шутовіча[3], я б не радзіла на іх апірацца. Я. Ш[утовіч]віч быў інфарматарам М. Машары, калі той пісаў свой т.зв. раман “Сонца за кратамі”, дзе ўсё фальшывае, усё выдуманае. Галоўная тэндэцыя — абліць балотам А. Луцкевіча, хіба, каб падпарадкавацца цяперашнім вымогам?

Усё, што Машара на гэтую тэму напісаў,— няпраўда, хлусьня. Зачапіў ён там і майго мужа. Ведаю напэўна, што Машара радзіўся ва ўсім з Шутовічам. Баюся, што яго інфармацыі аб У. Самойле таго ж характару.

З пашанай — *Л. Войцікава.*

P.S. Прыміце шчырыя павіншаваньні ў сувязі з другім сынам. Новаму чалавеку — самыя лепшыя пажаданьні. *Л.В.*

19. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

9 ліпеня 1970 г. Вільня

Паважаны пане Мальдзіс.

Сардэчна дзякую за кніжку. Люблю Вашыя працы за іх добрую мову і цікавую, сумленную апрацоўку.

А ведаеце — я не давяраю С. Майхровічу[1] пасьля яго "Мялеція Сматрыцкага" са ўсімі недарэчнасьцямі і тэндэнцыяй. Да М. Марцінчыка я напісала адразу пасьля Вашага выезду. Адказу ня маю. Нічога ня ведаю, што з М. Марцінчыкам, бо даўна ад яго ніякой весткі не атрымала. Кожны год адведываў мяне, хоць наборатка прыяжджаў, браў таксі. Хадзіць ня можа далёка: хворае сэрца і баліць нага. Можа, і дарэмна я спадзявалася дастаць ад яго зьвесткі. Магчыма, і сёлета быў у Вільні, але да нас ня мог дабрацца — раскапаная дарога, і німа даезду. Каб асабіста, то, магчыма, па старой знаёмасьці вяцягнула б з яго тое-сёе.

Калі ласка, не забудзьце пра Гудзевіцкі музэй і яго кіраўніка Аляксандра Мікалаевіча Белакоза. Ён варты гэтага. І прашу вельмі — пашліце ў музэй сваю кніжку. Яны будуць вельмі рады. А А.М. Белакоз і на лекцыях па літаратуры яе выкарыстае.

Усяго найлепшага. З пашанай — *Л. Войцікава.*

Шчырае прывітаньне ад сына. Адрас А.М. Белакоза: *п/а Гудзевічы, Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл.*

20. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

14 ліпеня 1970 г. Вільня

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч.

Ліст Ваш атрымала — дзякую. Вельмі прыемныя весткі пра магілу А.Ф. Забэйда. Хацела сягодня паехаць да Надзеі Маркаўны [Шнаркевіч], каб яна паведаміла М. Шутавічанку, якая з М. Забэйдай карэспандуе, каб праз яе гэтыя весткі пайшлі далей — у Прагу. Але нічога ня выйшла — пачалася бура, паліў дождж. Гэта выклікала ў мяне падвойныя пачуцьці: жаль, што немагчыма ехаць, і радасьць з доўгачаканага дажджу! Ня ўсё выратуецца, бо шмат што аканчальна высахла, але мо што і паправіцца. Паеду да Н.М., хіба, пасьлязаўтра.

Здаецца, я Вам пісала, што ў Слоніме рыхтуюцца да 90-х угодкаў нарадзінаў Гальяша Леўчыка. Пісалі мне, што "знойдзецца каму выступіць у прэсе і па радыё ў роднай мове". Але ці будзе так? Ці хопіць адвагі?

С. Новік-Пяюн маўчыць. Ня ведаю, ці разашле па музэях мае ўспаміны аб Г. Леўчыку. Прыяжджаў А. Мальдзіс. Прывёз мне сваю апошнюю кніжку "Падарожжа ў XIX стагодзьдзе". Вельмі цікавая і карысная. Я прасіла, каб выслаў такую Вам.

Абавязкова рабіце ўсё магчымае, каб наладзіць экскурсію ў Вільню. Экскурсавод будзе адпаведны — мой сын. Ён Вільню добра ведае, ведае гісторыю, архітэктуру, ну і аб'екты, зьвязаныя з беларускімі падзеямі. Апрача таго, будзе добра падгатаваны, бо якраз цяпер памагае сваёй знаёмай прыгатавацца да экзаміну на экскурсавода. Дзеля гэтага знаёміцца з адпаведнай літаратурай.

Каб хоць Вам удалося зваяваць сваіх ня вельмі разумных праціўнікаў! І чаго яны баяцца? Паведамце, як будзе з Вашым праектам, ці ўдасца наладзіць. Вось было б добра. У апошнім выпадку прыяжджайце хоць на выстаўку П. Сергіевіча.

У гэтую мінуту сын мне сказаў, што выстаўка будзе 10-га! Калі б дата была іншая — паведамлю.

Усяго добрага. Сямейцы — прывітаньні. Мае Вам кланяюцца. *Л. Войцікава.*

21. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

23 ліпеня 1970 г. Вільня

Паважаны пане Мальдзіс.

Атрымала адказ ад др. М.М. Марцінчыка. Цытую яго словы аб У.І. Самойле — даволі аднабокія: "Пра Самойлу У.І. магу сказаць, што калі ставіць пытаньне аб яго беларускасьці, то ў кожным разе ў яго больш беларускасьці, чым рускасьці. Ён з нашаніўскай пары супрацоўнічаў у прагрэсіўным беларускім друку. Калі б было іначай, то не лічыліся б з ім і не паважалі яго такія беларускія дзеячы, як Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч ці Антон Навіна[1], ці Антон Трэпка[2]. Ён быў вельмі адукаваны і здольны чалавек — мог і вершы пісаць..."

Як бачыце, нічога новага не сказаў. Падкрэсьліваю псэўдонім *Антон Навіна* таму, што калі я расказала, як мне даручылі плаціць У. С [амой]ле ганарары, Вы высказалі думку, што гэта па ініцыятыве А. Навіны. Я на гэта не зарэагавала, бо вельмі шмат трэба было б гаварыць, каб "зьбіць" тую няслушна крыўдную апінію, якую вырабілі А. Навіне розныя М. Машары.

Хоць гэтыя некалькі слоў др. М. Марцінчыка нічога новага ня ўносяць, лічу патрэбным паведаміць аб іх.

З прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

22. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

19 лістапада 1970 г. Вільня

Паважаны пане Мальдзіс.

Лічу патрэбным паведаміць, што ў мяне знайшлася брашурка У. Самойлы (Сулімы) "Які самаўрад гатуе беларускаму народу польская рэспубліка" (Вільня, выданьне газэты "Голас беларуса", 1924 г.). Калі б яна дасьледчыкам У. Самойлы была патрэбная, магу выслаць. Калі ласка, паведамце, каму пераслаць, на які адрас.

Апрача таго, хутка будзе зробленая фотакопія групы беларусаў у перадвыбарчы час 1922 г. Там фігуруе і У. Самойла. Мой сын пастараецца зрабіць адтуль асобны здымак У.С. Можа, будзе патрэбны.

Вельмі шкада, што ў той час, як Вы былі ў Гудзевічах, Аляксандра Мікалаевіча Белакоза не было на мейсцы. Ён асабіста лепш бы Вас пазнаёміў з вартасьцямі лялькі Ганулькі-Паляшучкі. Справа ў тым, што вопратка — аўтэнтычна палеская і зробленая з аўтэнтычнай старасьвецкай вопраткі, а не з выпадковых кавалачкаў. А што яшчэ важней: да экспанатаў дададзеная падрабязная выкрайка ўсіх частак вопраткі з адумысловымі назовамі кожнай фалдачкі, кожнага кліночка... Так што экспанат мае вартасьць ня толькі для этнографа, але і для лінгвіста.

Прыкра ўразілі мяне Вашыя словы: "Музэем называць загучна... Адзін пакойчык, благая экспазыцыя экспанатаў" і г.д. (Выбачайце — не дасlоўна, а па сэнсу.) А ці А. Белакоз ці тая моладзь, у якой ён збудзіў пашану да старой нашай

культуры, нясуць віну за гэты стан? На просьбу пашырыць мейсца для збораў раённае начальства сказала: "Ня трэба, музэй і так завялікі".

Не віна тут Белакоза, так як і не заслуга Петрыкевіча[1], што яму памагаюць партызанскія ўлады. Там жа дзяржаўны музэй. А ў Гудзевічах — пляцоўка, наладжаная саматугам, паміма перашкод, якія рабіліся на кожным кроку, як з боку раённых уладаў, так і мясцовых, школьных.

А што гэтую пляцоўку чакае? Назначаны новы дырэктар, які з А. Белакозам не гаворыць... Гэта нешта значыць. Жах бярэ. І хто ім паможа? Хто ня дасьць загубіць высілкі моладзі?

Марыцца мне, каб пазнаёміць Вас з Надзеяй Маркаўнай Шнаркевіч. Гэта чалавек вялікай сілы духу. Былая кіраўніца ТБШ, паміма 73 гадоў жыцьця, з чаго больш 30 прыкаваная да ложка (але не спаралізаваная), дасюль поўная энэргіі, ініцыятывы, волі да грамадзкай працы.

Ну і расьпісалася я — аж зашмат. Калі ласка, не пакрыўдзіцеся на мяне за маю шчырасьць і мо лішнюю гарачнасьць. Не навучылася абыякава праходзіць побач такіх справаў.

З пашанай — *Л. Войцікава.*

23. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

26 лістапада 1970 г. Вільня

Паважаная і дарагая Ларыса Антонаўна.

З болем мушу паведаміць Вас, што 24 лістапада памёр Адольф Клімовіч. Даўна хворы на сэрца, падлечываўся і неяк трымаўся. 30 верасьня быў у мяне, адсюль паехаў да Шнаркевічаў. Пасьля напісаў мне, што "22–23 лістапада іду ў шпіталь: абяцалі мяне прыняць і падлячыць". Каторага лёг у шпіталь дакладна — ня ведаю, але ўжо ад пачатку дактары казалі, што стан яго цяжкі. Ляжаў, хіба, больш 2-х тыдняў. Надзеі не было.

Учора, 25 лістапада, прыехаў да нас П. Сергіевіч паведаміць, што с.п. А. Клімовіч памёр. Сягодня раніцай а 8-й было жалобнае набажэнства. Хаваць, паводле волі нябожчыка, павезьлі ў родную вёску ў Сьвянцяншчыну. Вельмі, вельмі яго шкада. Аж пакуль ня лёг у шпіталь, быў актыўны, рабіў усё, што мог і як мог для Бацькаўшчыны.

Як здароўе Вашае і Вашага мужа? Вельмі даўна ня мела ▪ весткі ад Вас.
З шчырым прывітаньнем — *Л. Войцік.*

24. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

3 сьнежня 1970 г. Вільня

Паважаны пане Мальдзіс.

Сардэчна дзякую за адвагу. Я Вашыя шчырыя намеры разумею, але баюся, што мясцовая ўлада — чужаземцы і свае рэнэгаты — думаюць інакш. Як чую: "У Дзятлаве музэй дзяржаўны, вось яму і памагаюць. А ў Гудзевічах — прыватная ініцыятыва, ды яшчэ чалавека вельмі-вельмі "неблагонадёжного", як гэта гаварылі чарнасоценцы царскіх часоў.

Я ў кантакце з А. Белакозам амаль 4 гады. У 1968 г. была ў яго 3 дні. Абставіны ў яго школе ведаю. Ён жа і ў сябе на мейсцы ня мае ніводнага спрыяючага ча-

лавека, апрача сваёй жонкі. Усё ж пабачым, што далей будзе. Як жа бы хацелася, каб у яго хоць крыху былі зьмены на лепшае. Цяжка чытаць яго лісты...

Паміж іншым, аб Петрыкевічу. Мяне ўжо даўна паведамілі, што ён былы вучань Наваградзкай Бел[арускай] гімназіі. Стараючыся сабраць матэр'ялы да гісторыі Навагр[адзкай] гімн[азіі], я напісала да яго, просячы дапамагчы здымкамі ці іншымі матэр'яламі. Адказу не атрымала.

Магчыма, Арсень Сяргеевіч казаў Вам аб сьмерці старога беларускага дзеяча ў Вільні — Адольфа Клімовіча? Пахавалі яго тыдзень таму. Для нас гэта вялікая страта. Страцілі чалавека, страцім і тое, што ён прыдбаў: цэнныя дакуманты, падшыўкі часапісаў, вялікую колькасьць біяграфіяў людзей, якія мелі сувязь з беларускім рухам. Не аставіў нікога, хто б яго скарбамі ўмела заняўся. Баімся, што ўсё пападзецца ў рукі чалавека, ад якога ніхто нічога не дастане, хіба — за грошы.

С.п. Адольф Клімовіч у сувязі з Вашым артыкулам аб ахове помнікаў нашай мінуўшчыны напісаў ліст у Бел[арускае] т[аварыст]ва аховы помнікаў. Зьбіраючыся легчы ў шпіталь, на тыдні два перад сьмерцю, пісаў мне ды прыслаў копію таго ліста, просячы захаваць яе ў сябе. Прасіў таксама пастарацца для яго аб статут Т[аварыст]ва аховы... Я зьбіралася напісаць да Вас. Але яму так хутка пагоршала, і стан быў безнадзейны, што я і не пісала.

Калі будзеце ў Вільні, заўсёды будзем рады бачыць Вас у сябе. Ведаю, як цяжка са мной гаварыць, але, можа, паразумеемся.

Шчыра вітаю Вас і ад сябе, і ад маёй сямёйкі. *Л. Войцікава.*

25. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

10 сьнежня 1970 г. Вільня

Паважаная Ларыса Антонаўна.

Не хацела быць назойлівай і займаць Вам час сваім лістом, але дайшла да пераканаьня, што мушу зарэагаваць на Вашыя несправядлівыя закіды. Відаць, палякі і літвіны былі загадзя паведамленыя аб сьмерці с.п. А. Клімовіча, часе набажэнства і паховінаў. Мы — я і мая сям'я — даведаліся ў сераду а 3-й — прыехаў нам сказаць гр. П. Сергіевіч. Меўся ехаць яшчэ да Шнаркевічаў. Але гэту місію мы ўзялі на сябе. Каго П. Сергіевіч паведамляў, яшчэ ня ведаю. Шнаркевічы даведаліся толькі а 5-й. Іх пляменьнік з жонкай зараз жа нарэзалі хрызантэмаў і паехалі да Клімовічаў наведаць нябожчыка.

Зразумела, што ўначы і раніцай а 8-й ніхто з працы звольніцца ня мог, нават калі б звольніцца было магчыма. А гэтага ня мог зрабіць ніхто ані з маёй сям'і, ані з сям'і Шнаркевічаў. Мой сын у касьцёле быў. Яго ня бачылі? Ён быў, каб пажагнаць нябожчыка, а не на тое, каб паказацца. Пасьля набажэнства сказаў П. Сергіевічу, што сьпяшаецца дахаты, бо матка ляжыць адна ў хаце. А больш якіх беларусаў Вы спадзяваліся бачыць? Я больш нікога ня ведаю, апрача тых, хто быў на хаўтурах.

Мы — Надзея Маркаўна Шнаркевіч і я — успамінаем нябожчыка і доўга ўспамінаць будзем, бо нас зьвязывала ня простае знаёмства, а супольная праца амаль да апошніх яго дзён. Успамінаем добрым словам, але будзьце пэўныя, што не за "дзякуй".

З паважаньнем — *Л. Войцікава.*

26. ЯЎГЕНУ ПЕТРАШЭВІЧУ

[1970 г.]

Паважаны Яўген Канстанцінавіч.

Дзякую за памяць і за добрыя пажаданьні. Вам — узаемна — усяго найлепшага! Хоць позна, але ня менш шчыра.

Крыху хварэла. Ведаеце, у ліпні (23.VII.70 г.) мы са Славай былі два дні ў Горадні. Мелі шчыры намер быць і ў Вас. Часу было мала, усё ж бы зайшлі, але, ідучы па вуліцы Ажэшковай, Слаўка пабачыў Вас на другім баку вуліцы. Пакуль зарыентаваліся, Вы зьніклі. Ісьці да Вас дахаты ўжо не было сэнсу. Ды ці і знайшлі б? У Вас іншы адрас. Чаму?

Шчырае і сардэчнае прывітаньне. І ўсім Вашым. *Л. Войцікава* і *Слава*.

27. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[1970 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч[1].

Апрача абяцаных біяграфіяў с.п. Ю.Я. Бібіла і с.п. У. Паўлюкоўскага[2] пасылаю Вам весткі аб 1-ай Горадзенскай Беларускай гімназіі. Няшмат гэтага, але ўсё ж хоць ведама, што такая гімназія існавала.

У біяграфіі У. Паўлюкоўскага я ўспамінаю аб яго даволі саліднай працы, друкаванай у "Шляху моладзі"[3]. Я яе ўважаю за вельмі цікавую і цэнную. Там ён кожны месяц даваў адпаведна да месяца: народныя прагнозы пагоды, прыказкі, загадкі і г.д. Матэр'ял, якога цяпер ужо сабраць немагчыма.

Я вельмі хацела перапісаць усё гэта на машынцы, стварыць такі цэлы машынапісны экзэмпляр. Нават пазычыла ў Янкі Багдановіча (былога рэдактара "Шляху моладзі") гэты гадавік і паслала ў Менск С.М. Новіку (у Вільні перапісаць не было каму). Але Я. Багдановіч так паганяў, каб яму вярнуць гадавік, што Новік не пасьпеў перапісаць — быў тады заняты іншай сьпешнай працай.

Увосені 1975 г.с.п. мой сын, хоць ужо дрэнна чуўся, хацеў узяць гэты гадавік і перафатаграфаваць. А калі Я. Багдановіч пазычыць адмовіўся ("зноў будзеце доўга трымаць"), сын пастанавіў пайсьці да яго з апаратам і на мейсцы перафатаграфаваць. Але ўжо не хапіла сілы...

Цяпер ня ведаю, што рабіць. А шкада. Цікавы матэр'ял закансэрваваны навечна ў шафе Я. Багдановіча. С.М. Новік-Пяюн скончыў альбом "Віленская Беларуская гімназія". Салідная праца. І тэкст цікавы, і шмат здымкаў. Пакуль што альбом у мяне. Вам трэба было б абавязкова гэты альбом пабачыць, прачытаць.

Стараюся скончыць усё пачатае-задуманае, хоць гэта вельмі цяжка даецца. Чуюся, быццам палова маёй істоты ўжо адыйшла ў вечнасьць, а толькі другая палова неяк яшчэ затрымалася на зямлі. Я так прывыкла ўсім дзяліцца з с.п. сынам, часта радзіцца з ім. А цяпер німа з кім і пагаварыць. Мае астаўшыеся блізкія маюць сваё жыцьцё, свае праблемы. А [redacted] адна. І са сваім горам — адна. Бо гора мацеры ніхто не патрапіць разьдзяліць.

Што да Янкі Шутовіча — ня ведаю, чаму Вы лічыце, што ён з Гродзеншчыны? Ён радзіўся ў в. Шутавічы Маладзечанскай вобласьці Смаргонскага раёну. А мо гэта раней была Гродзеншчына? Усе дэталі да яго біяграфіі ўжо маю, але яшчэ не пісала. Маю таксама ўсё, што трэба да біяграфіі Адольфа Клімовіча.

Вялікую ласку зрабілі б, напісаўшы мне. Пішучы біяграфіі, жыву паміж памёршых — з жывымі зьвязываюць толькі лісты.

Усяго найлепшага Вам і п. Марыі. *Л. Войцікава.*

Аб Горадзенскай Беларускай гімназіі пачатку 20-х гадоў (з ліста Алесі Смоліч, пісанага 16 студзеня 1970 г.)

Гімназія была пры беларускім дзіцячым прытулку, і вучні пераважна прытулковыя. Нават у вялікі перапынак вучні харчаваліся прытулковым абедам, а разам з імі і мы, вучыцелі, садзіліся за стол. Душою гімназіі была Серафіма Кішко — загадчыца ў той час Беларускага прытулку. Сьвядомая, шчырая беларуска. Вельмі цікавілася нашымі пісьменьнікамі — Купалай, Коласам, Багдановічам, Ядвігіным Ш. і інш. З захапленьнем казала, што шчасьлівыя тыя, хто бачыўся і знаёмы з гэтымі вялікімі людзьмі. Часта прасіла мяне расказаць, апісаць ёй Я. Купалу, Я. Коласа. Передавалася гэта і вучням.

Выкладала я ў 5-й і 6-й клясе беларускую мову. Здаецца, была і 7-я кляса — добра ня помню.

У гімназіі з дапамогай загадчыцы прытулку мы паставілі цікавы дзіцячы спэктакль "Хлопчык у лесе" Алеся Гаруна. У мяне быў машынапісны экзэмпляр, падараваны аўтарам. Я ніколі не забуду, з якім замілаваньнем і клапатлівасьцю ішла падрыхтоўка да спэктаклю. Куплялі гафраваную паперу, шылі з яе сукеначкі, шапачкі, рабілі кветкі, вянкі. Нямала вучні ўлажылі сваёй ініцыятывы і для палаца Чараўніка.

Калі я не памыляюся, ставілі мы спэктакль два разы. Першы — для вучняў і прытулковых меншых дзяцей, а потым ставілі па білетах, каб пакрыць нашыя выдаткі.

З настаўнікаў гімназіі помню маладую дзяўчыну, выкладчыцу матэматыкі Мальчэўскую, здаецца, Жэню. Потым у 1923 ці 24 г. яна прыяжджала ў Менск і заходзіла да мяне. Гісторыю выкладаў Сымон Аляксандравіч Рак-Міхайлоўскі.

Копію пасьведчаньня пасылаю:

m. Grodno

I Bialoruska Gimnazjum Grodzienska

11.V.1921 г. № 69

Пасьведчаньне

Гэтым сьведчыцца, што Алеся Смоліч была вучыцелькай 1-ай Горадзенскай Беларускай гімназіі ад 15 лістапада 1920 г. да 1 траўня 1921 г.

Дырэктар — П. Тамашчык (подпіс).

Круглая пячатка: *1-я Беларуская Горадзенская гімназія.*

28. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

18 лістапада 1971 г. Вільня

Паважаны Аляксей Міхайлавіч.

Сягодня мінула 34 гады ад дня сьмерці першага старшыні Горадзенскага гуртка бел[арускай] моладзі Адама Бычкоўскага. Ён быў і адным з арганізатараў гуртка.

Маю яго лісты і маю артыкул Пятра Ластаўкі "Адвакат Адам Бычкоўскі" — да 30-годзьдзя яго сьмерці, напісаны ў 1967 г. П. Ластаўка меў надзею, што гэты артыкул будзе надрукаваны ў беластоцкай "Ніве". Але гэта была толькі

абяцанка — не надрукавалі. У гэтым артыкуле гаворыцца аб працы адваката А. Бычкоўскага ў Варшаве ў апошнія гады перад сьмерцяй.

Нябожчыкі ў Варшаве працягіваў пачатую ў гуртку працу для Бацькаўшчыны. Маю сцэнічны твор А. Бычкоўкага "У сваты", напісаны ў Гродне ў 1910 г. Праўда, твор пакуль што не ў мяне, а ў Менску — у З. Пазьняка[1], які піша дысэртацыю на тэму тэатру. Я бы вельмі хацела, каб Вы, пішучы аб гуртку, асаблівую ўвагу зьвярнулі на асобу А. Бычкоўскага. Каб яго імя не было забыта.

Ня ведаю, ці Вы атрымалі мой ліст, які я пісала, атрымаўшы вернутыя матэр'ялы. Чакала Вашых запытаньняў, прыезду. Распрацоўка гісторыі гуртка для мяне важней за ўсё. Гэта радасьць — вярнуцца да маладосьці. Наскалькі змагу знайсьці час, хачу напісаць асабістыя, не зьвязаныя з працай у беларускім руху, чыста прыватныя ўспаміны. Гэта будзе якраз тое, што Вас цікавіць.

Я вельмі моцна была зьвязаная з дзедавым фальваркам — Альхоўнікамі. Маю нават вершы (на жаль, па-польску), у якіх вылілася гарачае каханьне да роднай зямлі. Любіла коней, гаспадарку, жала, палола, прала, ткала не таму, што ад мяне гэтага вымагалі, а проста праз цікавасьць. Такі ўжо быў неспакойны дух дзіцяці.

У мяне вельмі разьвітая памяць узроку, і гэта памагае "бачыць" усю мінуўшчыну. Але хопіць хваліцца. Праўда, крыху не выпадае?

Чакаю весткі і сардэчна вітаю. Усяга добрага. *Л. Войцікава.*

29. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

14 сьнежня 1971 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Паміма добрай волі зацягнула з адказам. Хварэў мой сын, ды і сама чуюся блага. Усё ж неяк пастараюся адказаць на ўсё, што Вас цікавіць.

Перадусім падзялюся падзеямі сучаснымі. Я, здаецца, казала Вам, што аўтар успамінаў (у "Полымі") аб І. Буйніцкім — Зыгмунт Абрамовіч — гэта сябра Горадзенскага гуртка бел[арускай] моладзі. Першы гуртковы сакратар, рэжысёр і адзіны, які дагэтуль жыве, апрача мяне. І вось Менскае беларускае тэатральнае таварыства запрасіла яго на свой зьезд. Прыехаў ён 26/11 і цяпер у Менску. (Магчыма, прыедзе да мяне.)

З прыемнасьцю чытаю ў лістах Арсеня Сярг[еевіча] Л[іса] і Зянона Пазьняка, як хваляць выступленьні З. Абрамовіча. Ужо каля 30 гадоў жыве ён у Польшчы, а на зьезьдзе, у акадэміі і г.д.— выступае ўсюды па-беларуску! Нашым бы ў яго павучыцца — я такая рада і гордая з яго. Пачатак яго беларускай сьцежкі быў у гуртку. Значыцца, гурток патрапіў улажыць у душы сяброў нейкі агеньчык. На жаль, ня ўсім.

Вы пытаецеся пра Ст. Більміна, чым ён кіраваўся. Сапраўды, цяжка мне адказаць. Магчыма, уплыў мала разьвітых бацькоў. Яны мелі вялікі фальварак. Вось ім, панам, не падабалася сувязь сына з "мужыцкай" мовай і г.д. Так думаю. Усё ж мог адысьці (ніхто сілай не трымаў), але не рабіць гуртку такую шкоду. Проста не зусім чыстая натура.

Што да П. Алексюка, то хоць не люблю такіх вострых слоў, як Паўлінка М[ядзёлка], але добрага нічога аб ім сказаць не магу. У гуртку ён быў вельмі каратка. З самага пачатку прыходзіў на г.зв. лекцыі, чытаў вершы (маю запісы), раз, здаецца, рэфэрат — і гэта ўсё. Ні ў спэктаклях, ні ў далейшай рабоце ўдзелу

не прыймаў, хоць быў у Горадні. Нават пры спатканьні з сябрамі гуртка паводзіў сябе, як чужы.

З А. Бычкоўскім — вадзіліся, часта не згаджаліся ў паглядах. Аб вартасьці яго характару гаворыць такі факт: калі малодшыя сябры А. Зянюк, Я. Лявіцкі прыехалі ў Пецярбург, П. Аляксюк, спаткаўшы іх, сказаў (словы з ліста А. Зенюка): “Да Бычкоўскага можаце не ісьці. У яго ўжо ўсе ідэі-ідэйкі выветрыліся...”. А гэта была няпраўда, бо А.Б. толькі на кароткі час свайго студэнцкага жыцьця адыйшоў ад працы ў бел[арускіх] арганізацыях, і то дзеля сямейных абставінаў.

Пасьля П. Аляксюк у 1916–17 г. быў у Менску. Прыймаў удзел у зьездах, але яго тоны, заразумеласьць не здабывалі сымпатыяў. Аб далейшай “здрадніцкай” рабоце папрашу сябру З. Абрамовічу напісаць падрабязна (як вернецца з Менска дахаты), бо гэты час яму добра вядомы. П. Аляксюк паходзіў з Воўпы.

Пішаце, што мае ўспаміны аб сябрах — лаканічныя? Я пісала, маючы надзею “Успаміны аб ГГБМ” надрукаваць — гэта раз, а па-другое, у мяне столькі рознай пісаніны, што цяжка вельмі займацца падрабязнасьцямі, ды я проста ня ўмею гэтага рабіць. Ужо мне Арсень Сярг[еевіч Ліс]ня раз казаў: пішыце больш аб людзях. Не выходзіць. Трэба было б прастудыяваць лісты сяброў і тады з іх вывесьці характары і г.д. Гэта работа для пісьменьніка.

Пасылаю сваю аўтабіяграфію. Сягодня больш не пішу, бо ўсё ж нядобра чуюся — мушу легчы. Рада буду, калі знойдзеце час пад’ехаць да нас. Усе лісты зможаце прачытаць. Толькі як дабярэцеся? Цяпер таксі не паедзе. Трэба ехаць аўтобусам (з вакзалу тралейбусам № 15 да тэлевузлоў), а тады — пехатой да нас, але ці патрапіце? І сьнегу шмат. Мо лепш было б спаткаць?

З сардэчным апывітаньнем — *Л. Войцікава.*

[P.S.] Ці чыталі ўжо кніжку Р. Семашкевіча[1] “Літаратурны... рух у Пецярбурзе”[2]? Там у яго шмат наблытана — у частцы, дзе гаворыцца аб студэнцкіх арганізацыях.

Стар. 47. Хрэстаматыя адкрываецца старым уніяцкім гімнам “О мой Божа, веру Табе”. Аўтар у спасылцы кажа: “Мяркую, што гімн зьяўляецца перакладам польскага каталіцкага гімна “Wierzę w Boga Ojca”. І вось: “Wierzę w Boga Ojca” — на лаціне “Credo” — гэта ня гімн, а малітва. Гімн “О мой Божа, веру Табе” напісаны нейкім віцебскім ці магілёўскім Уладыкаю — вестка ад А. Клімовіча. Казаў мне год і імя Уладыкі — не запісала і ня помню. Магчыма, знайду ў лістах А. Клімовіча.

Ст. 57. Пасылаю арыгінал верша Сыракомлі “Po nocnej rosie”. Відаць, што пераклад вельмі благі. Некаторыя словы па значэньні зусім не адпавядаюць польскім. Адна строфка прапушчана. Ці трэба гэта падаваць? Нават праф[эсар] Б. Э[пімах] - Шыпіла мог зрабіць памылку, запісываючы такі бязвартасны пераклад. Добра, што аўтар хоць на гэты раз падаў, што верш У. Сыракомлі.

Ст. 61. Паміж пералічанымі прозьвішчамі арганізатараў студэнцкага гуртка (з іх Пушкарэвіч, А. Бычкоўскі, П. Аляксюк — сябры Горадзенскага гуртка беларускай моладзі) ёсьць Дзядовіч. Ці не памылка? У Горадзенскім гуртку быў Дзядзевіч, які разам з Пушкарэвічам і А. Бычкоўскім паехаў у Пецярбург.

Ст. 65. А. Бычкоўскі піша мне (даты на лісьце німа): “Ва ўнівэрсытэце Беларускі гурток ужо зарганізаваны, цяпер будзе другі, нелегальны, мэта каторага будзе памагаць бяднейшым кампанам і злучаць усіх беларусаў” і г.д. Значыцца, гурткоў было два.

Ст. 66. 11 радок ад нізу: “У гэты вечар рэфэрат “Стасунак беларусаў да іх

суседзяў" крэсьля (?) дзяленьня чытаў...". Павінна быць: "У гэты вечар рэфэрат чытаў А. Зянюк –"Стасунак беларусаў да іх суседзяў (квэстыя дзяленьня)" і г.д.

Ст. 131. Спасылка 2: "Акрамя прамых (ох!) і ўскосных сьведчаньняў... аб сувязях Гродзенскага гуртка студэнтаў-беларусаў з пецярбургскімі...". Які мог быць у Горадні гурток студэнтаў? Быў Горадзенскі гурток беларускай моладзі (ГГБМ).

Далей: "Некаторыя зьвесткі такога характару ёсьць у яе рукапісным артыкуле "Пяць месяцаў у Варшаве"... Не разумею. У 1967 г. друкавалася ў "ЛіМе" "Пяць месяцаў у Менску"[3], а ў агульных успамінах — рукапісе — ёсьць разьдзел "Дзесяць месяцаў у Варшаве". Але хто яго бачыў? І там нічога аб справах пецярбургскіх німа.

Ня ведаю, дзе віна аўтара, а дзе неахайная карэкта? Усё ж, як палякі кажуць: "Mała rzecz, a wstyd"[4].

Пытаецеся, хто аўтары "Варажбы цыганкі" і "Пастушкі"? Пераклады мае, а я была яшчэ такая зялёная, што сама не падумала, і ніхто мне не падказаў, што трэба запісаць аўтараў арыгіналаў. "Варажба цыганкі" — з польскага календара-кніжкі. "Пастушка" — ня помню. Рукапіс перакладу "Варажбы цыганкі" маю. Сцэнічнага абразка (вершам) "Пастушкі", на жаль, німа. Гэта ставілі ў Менску ў 1916 г. у дзіцячым прытулку і рукапісы мне не вярнулі.

Л. Войцікава.

30. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

16 студзеня 1972 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

У такія маразы ня можа быць і гутаркі аб падарожы, нават каб Вы мелі вольны час. Тым больш, што Вам пасьля хваробы трэба вельмі сьцерагчыся.

Я з прыемнасьцю буду адказываць Вам на ўсе чародныя пытаньні. Дакладна — насколькі змагу. Для мяне такі агляд дзён дзяцінства і маладосьці — гэта духовы адпачынак.

Мой бацька Антон Міхайлавіч Сівіцкі нарадзіўся ў Гродне ў 1864 г. Тут правёў дзяцінства, скончыў гімназію. Далей вучыўся ў Маскве ў Юнкерскім вучылішчы. Падпаручнікам выехаў у полк на Украіну — у Мяджыбаж. Яго бацькі (мае дзяды) далей жылі ў Гродне (да сьмерці). Бацька ніколі не пакідаў кантакту з Гроднам. Любіў горад, ваколіцы, Нёман. Калі мне было 5–6 гадоў, вадзіў мяне на Каложу, плавалі мы лодкай па Нёмане.

Пасьля сьмерці бацькі я і маці вярнуліся на Бацькаўшчыну. Адзін год — 1908 — пражылі ў Сакольшчыне, у фальварку матчынага бацькі, а ў 1909 г. я паступіла адразу ў 6-ю клясу гімназіі ў Гродне. Пэнсія па бацьку была невялікая (памёр капітанам), таму маці пастаралася аб згоду дырэкцыі дзяржаўнай мужчынскай гімназіі трымаць на кватэры гімназістаў. Дазвол далі. І вось у 1910 г. нанялі кватэру — 5 пакояў — на Гараднічанскай вул[іцы], дом Будрыка (пакуль што нумару ня помню, здаецца, 4). Гэта і была наша кватэра.

Вучні былі розных клясаў — і старэйшых, і малодшых. Са старэйшых жылі па 2–3 гады беларусы: Калышка (нейкі час і яго сястра) ды Кунды: Эдмунд і яго сястра Стася. Гэта першастрэчныя Адама Бычкоўскага. З малодшых — мой далёкі сваяк і сястра ксяндза Ф. Грынкевіча. (З ёю і цяпер карэспандую, хоць, на жаль, рана выйшла замуж за паляка і ўсё жыцьцё жыве ў Варшаве, дзеці

яе — палякі. Але помніць гурток і рада ўспамінаць тыя часы.) Былі і яшчэ дзеці з 1–2 клясаў — не беларусы.

Калі кс. Грынкевіч адыйшоў ад гуртка, мы зьбіраліся выключна ў нас. Тут праводзіліся рэпэтыцыі, сходы і г.д. Да сябе забрала я і бібліятэку гуртка... Не было дня, каб апрача сваіх жыхароў (што жылі ў нас) не прыйшло яшчэ 2–3 сяброў. Маці мая ўсіх паіла гарбатай і прыймала як сваіх.

У нас адбівалася і аднаднёўка "Колас беларускай нівы". І дзіўнае нам спрыяла шчасьце! Нармальна такія зарэгістраваныя вучнёўскія кватэры час ад часу наведывалі г.зв. пэдалі, а ў нас ні разу ніхто ня быў! Так, відаць, верылі ў ляяльнасьць удавы капітана... Праўда, мы ўсё ж асьцерагаліся, і калі было асабліва мнагалюднае сабраньне, ставілі варту. Тады ўсялякія сходы, арганізацыі вучнёўскія былі строга забароненыя.

Я скончыла гімназію ў 1912 г., але яшчэ адну зіму да вясны 1913 г., пражылі ў Гродне. Я мела карэпэтыцыі, крыху зарабляла. Тады і гурток яшчэ трымаўся.

Гімназія Баркоўскай, дзе я вучылася, была на рагу (пачатку) вул. Брыгіцкай — процію кас[ьцёла] Фары — такі мураваны будынак з чырвонай цэглы. Падобна, гэта была камяніца, у каторай жыў кароль Стэф[ан] Баторы. Над вуліцай быў зроблены крыты пераход да касьцёла.

У 1953 г. там была нейкая школа чыгуначнікаў ці нешта падобнае. У 1968 г. гэты будынак стаяў на мейсцы. Вось назоваў вуліцаў па-цяперашняму я Вам ніяк падаць не магу — ня ведаю. Трэба Вам распытацца ў старых жыхароў.

У мяне такая думка: калі я дачакаю-дажыву да лета — прыехаць на дзень-два ў Гродна. Хачу паказаць горад свайму ўнуку, а тады паказала б Вам усе мейсцы, зьвязаныя з гуртком. Як думаеце?

Я памаленьку зьбіраю весткі аб некаторых сябрах гуртка. Пытаюся ў пляменьніка кс[яндза] Грынкевіча. Гэты пляменьнік — Казімір Грынкевіч — добры беларус, жыве ў Новым Двары. Я з ім перапісываюся і аб некаторых гуртkоўцах у яго магу даведацца. Аб Марысі Бобрык не пішу, бо маю шмат яе лістоў. Пазнаёміцеся з ёю "асабіста". Аб Калышцы, хоць жыў у нас пару гадоў, нічога ня помню, нават скуль ён. Мала цікавы чалавек, мала дзейны, беспрынцыповы. Лабенец Хвэлька — з Новага Двара, аб ім распытаюся К. Грынкевіча. Ведаю адно, што ў 1918 г. выехаў у Савецкі Саюз. Спаткала я яго ў Менску на вакзале...

Абрамовіч ніякіх вестак аб гуртку Вам ня дасьць. Быў у гуртку коратка — адну зіму. Пасьля з Гродна выехаў. Бацька яго — вайсковы лекар са Слуцка. Нават аб пачатку гуртка Абрамовіч мала помніць. Пішучы заканчэньне сваіх успамінаў аб І. Буйніцкім (яшчэ гэта заканчэньне не друкавалася), такога аб гуртку наплёў! Шчасьце, што гэты разьдзел прыслаў мне (копію) — я проста спалохалася, каб не надрукавалі і, не пытаючыся згоды аўтара, каб ня траціць часу, адразу напісала спраставаньне ў Менск на імя Арсеня Сяргеевіча Ліса, а ён аддаў А. Сабалеўскаму[1].

Як бачыце, карысьці ў гэтым выпадку з Абрамовіча ня будзе. З. Абрамовіч у мяне ня быў і, на дзіва, ні адзін яго ліст, пісаны з Менска, да мяне не дайшоў. Што з Менска пісаў — паведамілі мяне людзі.

Пранук Эйсмант (паміж іншым, хрышчоны сын маёй бабкі — па матцы) — сын лесьніка (ці аб'езджыка?). Жылі ў вёсцы Кусьцінцы Сакольскага павету (паміж Кузьніцай і Новым Дваром). Скончыў гімназію ў Гродне. Пасьля я яго страціла з вачэй.

Салянкі мелі дом... вуліцы ня помню. Бацька — нейкі ўрадовец. І дома гаварылі па-польску, хоць належалі да гуртка і былі дзейнымі сябрамі, але пісалі да мяне па-польску. Яны абедзьве былі шмат за ўсіх старэйшыя, ужо дарослыя асобы. Старэйшая з іх, Анна, выехала ў Манахіум на нейкія курсы, там пазнаёмілася са студэнтам-расейцам, выйшла за яго замуж, вельмі нешчасьліва. Скончыла самагубствам у Вільні, тут пахаваная. Магілу даглядаем мы з сынам або ўнукам. Другая, Марыя, падобна, памёрла ў Самаркандзе.

Аб Эйсмантах пагаворым, раскажу больш. Пісаць доўга. Ды і да ГГБМ не адносіцца. Вось, здаецца, адказала на ўсе Вашыя пытаньні. Чакаю далейшых — пытайцеся...

Моцна сябе віню, што не старалася даць хоць маленькую вестку аб ГГБМ у энцыкляпэдыю. Ці прайшла б — гэта другая справа. Артыкул аб З. Верас моцна скарочаны. Але ці было там аб ГГБМ — сапраўды ня помню. І.У. Саламевіч прысылаў мне артыкул разы тры — дзеля перагляду. Бачыце, каб мае ўспаміны аб ГГБМ былі надрукаваныя ў "ЛіМе" або хоць у беластоцкай "Ніве"... Пасылала і сюды, і туды...

Яшчэ адно глупства зрабіла — не падала ў БелСЭ аб "Беларускай борці". Мая віна. Цяпер — каб не прапусьціць літару *П* і даць аб пчалярскім таварыстве "Пчала". Мо прапусьцяць?

Падумаўшы, як абышліся ў "ЛіМе" з Вашым артыкулам і інфармацыямі аб вечарах у інстытуце, сапраўды траціцца ўсялякая надзея, каб матэр'ялы, якія зьбіраеце аб ГГБМ, прайшлі ў Вашай кніжцы. Ці не дарэмная Ваша праца?

Не зьмясьцілі інфармацыяў аб тым, што робіцца цяпер, і то ў чэсьць Я. Купалы... А як жа можна прызнаць, што нешта рабілася ў той далёкі час перад кастрычнікам?.. Там мог быць толькі хаос і цемра...

Нічога не ўспамінаеце, ці ў Вас сьвяткавалі 80-я ўгодкі Максіма Багдановіча. Як сёлета сабралася шмат 80-х гадавін нараджэньня! І Максім Б[агдановіч], і Я. Купала, і Б. Тарашкевіч, і Р. Шырма... Хоць, праўда, угодкі М. Багдановіча былі ў леташнім годзе.

Напісала шмат. Чытаць Вам абрыдне. Я чуюся ня надта добра. Вельмі баліць галава. Гэта ў мяне ад сэрца. Сын рабіў мне ўколы. Маю заўсёды поўны асартымэнт патрэбных лякарстваў, але гады бяруць сваё. Ды яшчэ гэтыя маразы. Хоць мае апекуны — сын і дачка — робяць усё магчымае, каб мне было цёпла. Сьцеражыцеся маразоў і не хварэйце.

Усяго Вам добрага. *Л. Войцікава.*

А катэдра ў Вас немалая. Калі ў 1950–53 г. мая дачка там працавала, час ад часу прыяжджаў з Менска Пятровіч[2].

31. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

14 лютага 1972 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Хоць са спазьненьнем, але з прыемнасьцю падзялюся з Вамі ўсім, што ведаю і што помню. Насамперад мусім дамовіцца, што пад словам *Гродзеншчына* будзем лічыць не цяперашнюю Гродзенскую вобласьць, а *губэрню*, у якую якраз і ўваходзілі паветы (паміж іншымі) Сакольскі і Дуброўскі — якраз тое, што сяньня знаходзіцца за мяжой, а тады было найбліжэй Гродна, лічачы па той бок Нёмана, пад Кузьніцу, Саколку. На жаль, тое, што за Нёманам, Вам мала

вядомае, і таму Вам цяжкавата зразумець мае сувязі.

Ну, але пастараюся ўсё выясьніць. Фальварак майго дзеда — матчынага бацькі — ляжаў 18 вёрстаў ад Гродна — па шашы Гродна — Аўгустова — Сувалкі. Там я з маці праводзіла кожнае лета 2–3 месяцы. Першы раз прывязьлі мяне з Мяджыбажа, як мне было 6 месяцаў! Зразумела, што ў працягу лета па некалькі разоў адведывалі мы з маці і маіх гродзенскіх дзядоў (бацькоў майго бацькі). Як бачыце, сувязь з Гродзеншчынай ды Гроднам была самая цесная і трывалая.

Мушу выясьніць, чаму так склаліся абставіны і нашы рэгулярныя падарожы. Мястэчка Мяджыбаж, дзе бацька быў у войску і дзе я радзілася, мела ў сваім раёне вялікія роўныя палі, куды летам на муштру зьбіралася шмат войска: пяхоты і кавалерыі. Мястэчка малое, напаўнялася пылам, гармідарам. Атмасфэра не зусім прыемная ды здаровая. Таму мы ехалі да сваіх па сьвежае паветра, малако, фрукты і г.д. Бацька час ад часу атрымліваў водпуск і ехаў хоць накоратка з намі. І так ужо выйшла, што для мяне Гродзеншчына была *бацькаўшчынай*, а Украіна — чужой старонкай. Калі-небудзь пазнаёмлю Вас са сваімі вершамі на гэтую тэму.

Пытаецеся, як гэта здарылася, што найбольш сяброў ГГБМ было, як у нас казалі, з нашага боку? Помню я іх таму, што гэта была моладзь самая актыўная. Бачыце, там у нас пад Сухаволяй, Новым Дваром, Кузьніцай вёскі былі пераважна каталіцкія, і яны, хоць веру сваю называлі польскай, сябе не называлі палякамі, а тутэйшымі, і мову сваю — тутэйшай. І як бы розныя цяперашнія гісторыкі ні круцілі, абсалютна не былі спалянізаваныя. Моцна трымаліся сваёй мовы і сваіх звычаяў. А гэтага няможна сказаць аб беларусах праваслаўных. Бо апошніх царкоўныя школы ў таварыстве з жандармамі здолелі пераканаць, што царква і руская мова неразлучныя.

Найлепшым прыкладам — наш ГГБМ. Усе сябры — і старэйшыя, і самыя малодшыя — адразу прыходзілі (пераважна) сьвядомымі і з добрай мовай, ды ішлі ахвотна. А ўсяго 2-х удалося ўцягнуць праваслаўных — яны па-беларуску ні слова не гаварылі і трымаліся здалёк ад усіх. А чаму? Цяжка зразумець, бо ў нас тэма рэлігійная ніколі не закраналася, хоць кіраўнік быў духоўнай асобай.

Вось тут можна перайсьці да асобы кс. Франца Грынкевіча. Ён паходзіў з мястэчка Новы Двор (вёрстаў 20 ад Гродна, 3 — ад нашага фальварку Альхоўнікі). Бацькі яго — старыя Грынкевічы — гаварылі па-беларуску, асабліва матка, і да канца жыцьця інакш не гаварылі. Так што і сын вынес з хаты пашану да роднай мовы. Скончыў гімназію (дзе — даведаюся ў яго сястры, бо ня помню, і даты таксама), пасьля духоўную сэмінарыю ў Вільні, далей — духоўную акадэмію ў Пецярбургу, і пасьля яшчэ вучыўся ў Інсбруку.

Арганізуючы гурток (лепш — ён кінуў такую думку і памог у арганізацыі, бо арганізаваліся мы самі пры яго помачы), напэўна, ніякіх пабочных мэтаў ён ня меў, тым больш, што ня ўсе мы былі яго вучнямі. У шмат якіх школах былі іншыя капэляны, якія вельмі варожа адносіліся да ГГБМ і да Фр. Грынкевіча.

Спачатку, калі кс[ёндз] Ф. Грынкевіч жыў пры Бэрнардынах, мы там зьбіраліся і на лекцыі (вёў сам кіраўнік: геаграфію Беларусі, гісторыю, літаратуру), і на паседжаньні. Але пасьля ён быў назначаны капэлянам жаночага кляштару Брыгіткі. Першапачаткова мы і там зьбіраліся, але нядоўга, бо кіраўнічка (па-польску *prioress*) кляштару паказала свае шавіністычныя рожкі. Пачаліся вымоўкі Ф. Грынкевічу — нават з Віленскай курыі. Штораз больш націск, просьбы. Вось мы і перасталі туды хадзіць, але ў хуткім часе кс. Фр[анцішак] і наагул

(афіцыяльна) ад нас адыйшоў. Пакуль я ня выехала, так і было.

Пасьля мне ў Варшаву А. Зянюк пісаў, што кс[ёндз] Фр[анцішак] паклікаў сяброў гуртка і запрапанаваў дадаць да нашай праграмы яшчэ пункт аб самавыхаваньні (маральным). Але вайна і гэтаму палажыла канец. Аб далейшым запытаюся ў яго сястры. Памёр у Гродне, пахаваны направа ад капліцы.

Мушу дадаць, што малодшы брат кс[яндза] Грынкевіча — доктар Станіслаў[1] — шчыры беларус-патрыёт. Як доктар і чалавек, заслужыў на самую лепшую памяць. У свой, цяжкі для ўсіх нас час, быў з Вільні вывезены. Далёка вывезьці не пасьпелі — памёр у Менску ў турме. Наша сям'я, ад дзеда пачынаючы, з сям'ёй Грынкевічаў цесна зьвязаная. У Гродне быў яшчэ адзін кс[ёндз] беларус — Родзька[2]. Ды і ня так мала іх было.

Цяпер кніжкі: у бібліятэцы гуртка былі ўсе беларускія, якія толькі выйшлі. 3 тамы М. Федароўскага[3] "Lud Białoruski", быў слоўнік Насовіча[4], быў Карскі[5]. У маім нататнічку значыцца: хто і што ўзяў на прадажу. Ёсьць запіс: выпісана 366 экзэмпляраў.

Цяпер знайшла цэнную паперку, падпісаную адміністратарам "Нашай нівы" Баляславам Пачопкам[6], у якой перасылае дублікат паквітаваньня на высланыя 100 экз. календара. На жаль, німа даты. Але гэта магло быць у 1910–11 гадах. Наагул, у маім блякноце шмат цікавага. Там толькі першыя старонкі замазаныя, а далей усё ясна. А вось перапісываць ня маю часу.

Цяпер прынясьлі мне вялікі нарыс аб Беларускім музэі імя І. Луцкевіча. Мушу сьпешна прачытаць, а чытаць цяжка, бо гэта рукапіс, ды яшчэ чарнавік.

Сэрдэчна дзякую за запросіны. Трэба мець надзею, што дачакаю лета — а вельмі-вельмі хочацца яшчэ раз глянуць на Нёман. Толькі хадзіць трэба, гледзячы пад ногі, а не на чужаземныя шыльды ды плякаты. Адно што з начлегам трэба неяк інакш прыдумаць. Вы ж ведаеце, што я дрэнна чую, і самой мне ехаць цяжка. Мушу мець апекуна ў асобе майго ўнука.

Зразумела, дзьве асобы — гэта для Вас завялікі клопат. Час яшчэ ёсьць, нешта прыдумаем. Ня ведаю нават, калі б удалося прыехаць. Ва ўнука сэсія ў чэрвені, да якой даты — няведама, а пасьля едуць на месяц на работу. Калі і куды — таксама яшчэ няведама. Ды і ў Вас таксама сэсія. Адным словам, пабачым. Абы дачакаць.

Яшчэ адно Вашае пытаньне — аб беларускіх кніжках у гродзенскіх крамах. Не, не прадаваліся нідзе. У 1913–14 гадах, калі я была ў Варшаве на курсах, В. Ластоўскі пісаў мне, пытаўся, як я думаю, ці ўдасца ў Гродне адчыніць бел[арускую] кнігарню? (Ліст гэты маю.) Гэта быў праект. Зьдзейсьніць ці нават паспрабаваць не пазволіла вайна.

Пакуль што, здаецца, усё. Ага, К. Грынкевіч прыслаў мне некалькі вестак аб трох сябрах ГГБМ, аб іх долі, іх сьмерці.

Усяго добрага. Чакаю далейшай сэрыі пытаньняў. Вашай сям'і — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

32. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

3 красавіка 1972 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Хацела зараз адказаць, але ўсё нядобра чуюся. Цэлы дзень кратаюся каля хатняй работы, а ўвечары цяжка сядзець. Моцна дакучае катар

страўніка. Дастаў сын лякарства (булгарскае), якое летась памагала. Пачала піць. Пакуль што яшчэ паправы не відаць.

Вельмі благая пагода дрэнна адбіваецца на цэлым арганізме. Што да візыты ў Гродна — неяк пару дзянькоў вырвем у канцы чэрвеня або ў ліпні. Найхутчэй — з унукам. Сардэчна дзякуем за запросіны.

Значыцца, Ваша дачка перажывае тое, што мой унук летась... Усялякія экзаміны, асабліва ўступныя — гэта вялікая лятарэя. Незнаёмыя выкладчыкі, незнаёмыя вымаганьні... Ня дзіва, што моладзь нэрвуецца.

Гэта добра, што маеце шмат разнаякай працы. Я некалісь такі навал работы любіла. Тады чалавек адчувае, што жыве і нашто жыве. Толькі вось крыўдна было б, каб Вашага артыкулу не надрукавалі. Такія крытычныя артыкулы ой як патрэбныя! Бо з мовай сапраўды штораз горш. Часта німа цярплівасьці чытаць.

У "ЛіМе" быў маленькі артыкул М. Ермаловіча[1]. І гэта карысна. Але ці хто зьверне ўвагу? Ці ня будзе гэта гарох аб сьценку?

Маю некалькі новых вестак (сумных) аб сябрах ГГБМ. Зьбіраецца штораз больш. Усё натую ў нататніку, каб пасьля не шукаць у лістах. Але цяпер адказываю на тое, што Вас цікавіць.

М. Краўцова[2] (Косьцевіча) я ведала вельмі мала, і амаль нічога аб ім не магу сказаць. Пачала ўжо зьбіраць весткі ў людзей. Мо што набярэцца. На яго плюс магу залічыць адно: ён, як і некаторыя іншыя беларусы (пасол Ф. Ярэміч[3] і бугальтар Беларускага каапэратыўнага банку Ігнат Біндзюк) быў жанаты з варшавянкай. І ў той час, калі ў сям'і пасла Я[рэміча] і бугальтара Б[індзюка] запанавала польская мова, у Косьцевіча — наадварот!

Жонка навучылася добра гаварыць па-беларуску і гаварыла мовай мужа доўга пасьля, як ён загінуў. Якраз як яна асталася адна (вярнулася з нямецкага канцлягеру), я з ёю добра пазнаёмілася, і мы даволі часта бачыліся. Памёрла яна пару гадоў таму, зусім самотная. Дзяцей у іх не было. А ў апошнія гады яна неяк адчуралася ад людзей — нікога не хацела бачыць, і я ў яе перастала бываць.

Проста не прыпамінаю, дзе і калі М. К[осьцевіч] працаваў. Ведаю адно, што матэр'яльна ў іх было вельмі блага. Падрабязна — іншым разам, бо гэта доўгая гісторыя... А ці не прабавалі Вы здабыць якія весткі аб М. К[осьцеві]чу ад др. Марцінчыка? Помню два факты. Я з ім спаткалася 1–2 разы ў 1924 г., калі ён рабіў карэкту майго "Батанічнага слоўніка". Я зрабіла яму ўвагу, што аставіў памылкі ў лацінскіх назовах. Ён адказаў, што лаціны ня ведае. Адказ ня вельмі дарэчы, бо трэба было толькі ўважна чытаць рукапіс.

Ведаю, што ў 1925 ці 26 г. ён сядзеў на Лукішках. За што — ня помню. А я ў той час насіла кожны месяц дапамогу яго жонцы, якая нідзе не працавала, чым выклікала абурэньне С. Рака-Міхайлоўскага. Ён кожны раз, даючы мне грошы (для жонкі К[осьцеві]ча), казаў: "Прыймаць дапамогу, будучы маладой і здаровай жанчынай — проста амаральна". У канцы я зазлавала і сказала: "Нашто Вы мне кожны раз гэта гаворыце? Няўжо думаеце, што я ёй Вашыя словы паўтару?"

Што да хаўтураў Эл. Ажэшка — помню добра, бо я сама была і разам з моладзьдзю трымала ланцуг бясьпекі, які стараўся ўстрымаць наплыў публікі з ходнікаў на вуліцу, дзе праходзіў хаўтурны караван, вянкі, дэлегацыі. Справа была цяжкая, бо натоўп аграмадны, стрымліваць было вельмі трудна.

Недзе пісалі, што моладзі вучнёўскай было забаронена прыймаць удзел у хаўтурах. Можа, гэта тычылася ўрадовых школаў? Нічога не магу

прыпомніць... Я і мае каляжанкі вучыліся ў прыватнай гімназіі і ўсе на хаўтурах былі. Я ўжо пыталася аб гэтым факце свайго сваяка, але ён тады меў гадоў 13–14 і ня помніць.

Пасьля хаўтураў дом Э. Ажэшка быў нейкі час адчынены, і можна было аглядаць яе памяшканьне. Разумеецца, я там была. Умэбляваньне вельмі скромнае. Увагу зварочвалі вянкі і букеты на сьценах — з засушанага васеньняга лісьця. Сама пісьменьніца лісьцё зьбірала, сушыла, рабіла цікавыя кампазыцыі. А я, праўду сказаць, магла хоць крыху пазнаёміцца з пісьменьніцай. Бо далёкая сваячка (пані Каляртова) маёй бабкі па бацьку была знаёмая з ёю і, як я чула, часта з пісьменьніцай хадзіла па мяшчанскіх і жыдоўскіх хатах у пошуках тыпаў. Праўда, я ў той час была малая...

А вось як гэта гурткоўцам не прыйшло ў галаву пайсьці да яе, выказаць словы пашаны? Цяжка сабе выбачыць такую няўвагу... Відаць, замала ведалі аб яе сувязі, напрыклад, з Багушэвічам, не ўяўлялі значэньня. Эх, маладосьць — дурнасьць. Сколькі памылак...

Можа, што даведаюся аб М. К[осьцеві]чу — напішу. Пакуль што бывайце! Усяго найлепшага. Прывітаньне Вашай сям'і. *Л. Войцікава.*

P.S. Перад тым, як я зьбяруся ў Гродна, думаю, што Вам удасца прыехаць да нас.

33. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

30 лістапада 1972 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Вось ужо два тыдні прайшло, як я атрымала Ваш ліст. Рада была, чытаючы, што Вы па-належнаму ацанілі скарочаньне ўспамінаў аб ГГБМ. Толькі не магу згадзіцца, што "ў публікацыі больш радаснага, чым сумнага". Што добрага ў тым, што моладзь прачытае такую публікацыю? Там жа амаль нічога не асталося ад дзейнасьці гуртка! Тры спэктаклі (першы, у Горадні, выкінулі), дзіцячы спэктакль і ёлка на вёсцы — гэта ўсё. А дзе бібліятэка, дзе летнія работы сяброў, дзе сувязь з выдавецтвамі? Нічога німа. Ці дзеля трох спэктакляў варта было арганізоўваць гурток? Як кажуць — курам на сьмех... Ня вельмі добра падумае моладзь цяперашняя аб такой "рабоце"...

Стараньне аб публікацыі ўспамінаў рабіў З. Пазьняк. Вось што ён мне піша: "Калі выйшлі Вашыя ўспаміны ў скарочаным і, як я лічу, папсаваным выглядзе, я быў ня тое, што ўражаны, а проста зусім разгублены. Мне сто разоў абяцалі, што надрукуюць поўнасьцю, не паправяць і не выкінуць нічога. Я паверыў. Але вычытаць карэкту мяне не пазвалі (а то б не пусьціў) — і вось вынік! Не апраўдваюся, бо вінаваты. Трэба было ня злазіць з іхняга карку. Але абяцалі такія харошыя і паважаныя мною людзі. Вось якая справа. Проста ашукалі".

Усё ж я хацела гэты нумар "Маладосьці" таму-сяму паслаць. (Дачка з мужам езьдзілі ў той час у Радашкавічы, Маладзечна і Менск і купілі некалькі экзэмпляраў.) Але С. Новік-Пяюн мяне апярэдзіў і сам якраз тым асобам разаслаў. Але каб было ясна, што рэдакцыя зрабіла, дадаў да кожнага экзэмпляра перапісаную на машынцы копію арыгінала. Камэнтарыяў, лічу, ня трэба.

Што да нелегальнасьці гуртка, справа такая: у той час вучні гімназіяў і іншых сярэдніх школаў ня мелі права арганізоўваць і належаць да гурткоў, таварыстваў і г.д. А на розныя імпрэзы, вечарыны, спэктаклі і інш. трэба было

мецьдазвол ад мясцовай паліцыі. Мы браць дазволаў не маглі, бо афіцыяльна як гурток не існавалі. У горадзе рабілі спэктаклі пад фірмай імянінаў гаспадароў кватэры, ну а на вёсцы — ужо зусім нелегальна. Трупа І. Буйніцкага заўсёды прасіла дазволу. Думаю, што і іншыя — таксама. Але гэта не былі вучні. Іх становішча было зусім іншае.

Прайшлі ўжо і Коласаўскія сьвяты. У Вас, хіба, часу больш? Я памаленьку рыхтую матэр'ялы да ўспамінаў віленскага пэрыяду. Бяда толькі, што мокрае надвор'е выклікае ў мяне радзікуліт. Сільныя болі ў крыжы не даюць сядзець. Як ляжу — баліць менш або зусім перастае. А як тут пісаць, лежачы... Раблю нататкі і чакаю лепшай пагоды.

Усяго Вам найлепшага! Шчырае прывітаньне Вашай жонцы. *Л. Войцікава.*

34. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

2 лютага 1973 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Вось маем ужо 2 лютага — Грамніцы. Як кажа прыказка: *Грамніцы — зімы палавіца*, а яна сапраўды толькі цяпер пачынаецца. Маеце рацыю — такое ненармальнае надвор'е вельмі блага ўплывае на здароўе і самапачуцьцё чалавека. Я зімой заўсёды горш чуюся, а сёлета дакучаюць розныя болі: нэўральгічныя, атрэтычныя і г.д. Гаспадару, як заўсёды, але вечарамі не магу доўга сядзець. Мае хваробы не даюць ні памерці, ні жыць нармальна. Так — нешта-нейкае...

Добра, што маю амаль фаховую апеку ўдома, бо сын нядрэнна знаецца на патрэбных мне леках, уколах. Тое-сёе раблю. Дастала (пазычыла) 9 гадавікоў "Шляху моладзі". Раблю нататкі, пераважна з хронікі. Гэта памагае мне прыпомніць даты і факты, аб якіх я забылася, а то і ня ведала. Думаю, што для поўнасьці ўспамінаў не зашкодзіць.

Больш чым фізычныя недамаганьні, псуюць настрой розныя непрыемныя, а то і сумныя весткі. Аляксандра Ігнатаўна Смоліч (удава па Арк. Смолічы — аўтары геаграфіі і іншых геаграфічных кніжак), мая старая прыяцелька, ужо месяц ляжыць у шпіталі пасьля другога інсульту (летась), дыябэту і інш. хваробаў — і не папраўляецца... Апрача таго, штораз горш бачыць. Піша мне часта. Лісты сумныя.

Я Вам расказывала аб сям'і Я. і Н. Шнаркевічаў. Яна ляжыць ужо каля 30 гадоў, але такой сілы духу і яснасьці розуму можна пажадаць кожнаму. Бывала ёй і лепш, і горш. Але вось гэтай зімой яе муж (арганізатар Нясьвіжскай Беларускай гімназіі[1]), якому ўжо 86 гадоў, усё хварэе. Меў запаленьне лёгкіх ужо 2 разы, а цяпер сухі плеўрыт. Зразумела, адбіваецца гэта і на яе стане.

Была я ў іх 25 студзеня г.г. Яна праз гэты час вельмі паблажэла. Я рэдка магу яе адведаць, і мы проста перапісываліся. Цяпер яна амаль ня можа пісаць — дрыжаць рукі. Сын мой, як толькі можа, езьдзіць да іх. Для мяне гэта цяжкое перажываньне, бо яна, Надзея Маркаўна [Шнаркевіч], адзіная мая старая знаёмая.

Здаецца, я Вам успаміала аб альбомах-гісторыях беларускіх гімназіяў. Гатовыя — Нясьвіжска-Клецкая і Радашкаўская[2], а вось з Віленскай усё ня ладзіцца. Трэба заўважыць, што зьбіраньне матэр'ялу, здымкаў і г.д.— усё гэта заслуга Надзеі Маркаўны. Да гісторыі Віленскай Беларускай гімназіі сабрана шмат здымкаў (копіі рабілі мой зяць і сын), успамінаў былых вучняў і г.д.

Але ўсе гэтыя ўспаміны і іншы тэкст трэба неяк зладжыць-апрацаваць. На гэта ў нас не хапіла магчымасьці, і Н.М. пры спатканьні прасіла А.С. Ліса, каб ён гэта зрабіў. Усе матэр'ялы ўзяў, але дагэтуль нічога не зрабіў... Праўда, ён вельмі заняты, адна тэрміновая работа другую гоніць, але Н.М. нэрвуецца, траціць надзею, што дажыве, пакуль альбом зробіцца. Усё гэта і на мне адбіваецца.

З цікавасьцю чытала аб Вашым сямейным зьезьдзе. Як гэта прыемна — мець вялікую сям'ю, магчы з усімі пабачыцца. Шчыра кажучы, крышку Вам пазайздросьціла, бо наша сям'я на рэдкасьць маленькая — усяго 5 чалавек, лічачы і зяця. Ёсьць крыху далёкіх сваякоў, але ўсе ў Польшчы.

Я нават ня ведаю, дзе Ваша родная мясцовасьць? Дзе жывуць Вашы бацькі? Рада была б ведаць.

А цяпер адкажу на Вашыя пытаньні. Хто такія Шышэі? Гэта цікавая беларуская сям'я. Ён з Наваградчыны, жонка з-пад Слоніма (вучылася ў школе ў Слоніме разам з Алегам Лойкам, але не ў адной клясе). І ён, і яна (дзяўчынкай, толькі што акончыўшай 10 кл.) былі забраныя і адсядзелі сваё на Варкуце — разам з Л.А. Геніюш. Звольніўшыся, прыехалі ў Вільню. Ён працуе сьлёсарам, а яна здала экзаміны за 10 клясаў (бо ў Слоніме дакумэнтаў не дастала), пайшла ў эканамічны тэхнікум, скончыла і працуе ў банку. Маюць адну дачку — вучыцца ў школе, але адначасна і ў музычнай. Маюць добрую каапэратыўную кватэру. Гавораць па-беларуску, цікавяцца беларускай літаратурай. Мілая сям'я. Асабліва ён сам.

Што да кс. Грынкевіча, то прэфэкт — гэта проста выкладчык рэлігіі. Скончыўшы акадэмію ў Інсбруку, назначаны быў у Гродна пры Бэрнардынах (хіба, вікарыем, г.зн. памочнікам пробашча), прэфэктам быў у ніжэйшых клясах і ў 2 прыватных гімназіях — мужчынскай (недалёка дому Э. Ажэшковай) і нашай жаночай. З Бэрнардынаў перавялі яго як капэляна да сёстраў-брыгітак — кляштар і касьцёл Брыгіцкі. Пасьля гэты кляштар зьмянілі на сёстраў-назарэтанак.

Мне было вельмі непрыемна і крыўдна, калі кс. Ф. Грынкевіч адыйшоў ад нашага гуртка. Я ў сваіх успамінах (для друку) напісала, што ён гэта зрабіў пад націскам старшага духавенства. Было не зусім так, а мо проста не хацеў мне гэтага сказаць, а прызнаўся, што "ня бачыць пэрспэктываў" нашай працы...

Сёлета ад яго сястры даведалася, што пасьля 1-ай сусьветнай вайны, як толькі немцы выйшлі з Гродна, ён далучыўся да гродзенскай інтэлігенцыі (др. Тальгэйм, аптэкар Маліноўскі, адвакат Рэйнгард і інш.) і разам адчынілі 2 польскіх гімназіі — жаночую і мужчынскую. І пры мужчынскай (дзе раней была рэальная школа) дастаў памяшканьне. Там жыў, пакуль не пачаў хварэць на сэрца. Тады законьніцы сёстры-назарэтанкі ізноў запрасілі яго да сябе і, каб даць поўную выгоду, пабудавалі яму невялічкі дамок на другім баку вуліцы — vis-a-vis муроў кляштару. Там пражыў да сьмерці. Дамок і цяпер стаіць.

А вось яго малодшы брат — доктар Станіслаў Грынкевіч усяго сябе аддаў беларускай рабоце. Марыў аб бел[арускіх] народных унівэрсытэтах (яго брашуру "Асьвета" сканфіскавалі, яго судзілі). Праўда, працаваў у Бел[арускім] інстытуце гаспадаркі і культуры[3], значыцца, з хадэкамі, але праца яго была шчырая і плённая для нашага руху. І канец яго быў перадчасны (меў 42 гады) і трагічны... Як доктар і як чалавек меў вялікую вартасьць.

Столькі напісала, што і скончыць пара. Пішыце. Усяго найлепшага Вам і Вашай жонцы.

Л. Войцікава і мае хлопцы.

Што Вы скажаце на артыкул у № 1 "Полымя"? Нарыс Васіля Якавенкі[4] "Акно на плошчу" — стар. 132, радок 25 ад гары?

35. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

25 лістапада 1973 г. Вільня

Паважаны Аляксей Міхайлавіч.

Ведаю, як Вы ня маеце часу, але ўсё ж мушу зьвярнуцца з пытаньнем. Гэтая няясная справа вельмі мяне непакоіць. Мо Вы ведаеце выпадкам, хто такі Уладзімір Фадзеевіч Станкевіч[1]? Ён, падобна, паходзіў з В[ялікай] Бераставіцы.

А справа такая. Хіба, ведаеце ўсё пра Пятра Ластаўку — бел[арускага] пісьменьніка і публіцыста, які ад 1925 г. жыў у Польшчы — у Мілянувку каля Варшавы, а перад тым суджаны тут у Вільні за працу ў бел[арускім] руху.

Вось мяне з ім скантактавалі, калі я зьбірала матэр'ялы да ўспамінаў аб Гор[адзенскім] гуртку бел[арускай] моладзі. Менавіта я шукала вестак аб жыцьці і працы нашага першага старшыні А. Бычкоўскага. П. Ластаўка А. Бычкоўскага ведаў і спатыкаўся ды працаваў з ім аж да сьмерці А. Б[ычкоўска]га ў 1937 г.

П. Ластаўка прыслаў мне свае ўспаміны аб А. Б[ычкоўскім] і яго здымак, зроблены незадоўга перад сьмерцю, а таксама абяцаў мне на маю просьбу напісаць аб апошнім часе жыцьця Г. Леўчыка. П. Ластаўка хварэў цяжка на сэрца і пісаў з вялікімі перарывамі. У адным з апошніх лістоў пісаў: "Матэр'ялы аб А. Бычкоўскім, яго здымкі, рукапіс яго сцэнічнага твору "У сваты" ды клепсыдру адсылаю ў Горадзенскі музэй, няхай будзе там, дзе ён пачынаў сваю грамадзкую працу. А машынапіс сцэнічнага твору "У сваты" ды мае ўспаміны аб А.Б. пасылаю ў Беласток, у "Ніву", каб надрукавалі ў 1967 г., у 30-я ўгодкі сьмерці А.Б. Аб Леўчыку для Вас напішу". Лісты П. Л[астаў]кі маю.

Пасьля яго сьмерці я даведывалася ў Гродзенскім музэі. Адказ: нічога німа, не атрымалі... "Ніва" нічога не атрымала. Я — таксама. Дзе ж усё дзелася?

Летась піша мне журналіст і працаўнік Слонімскага радыё М.І. Рылко[2], што "У.Ф. Станкевіч прыслаў *мне* матэр'ялы аб А. Бычкоўскім і рукапіс ды машынапіс "У сваты".

Што за Станкевіч? Скуль ён узяўся і чаму прыслаў усё ў прыватныя рукі чалавека, нічым не зьвязанага з працай гродзенскай моладзі?

Я адказала М. Рылко, што калі гэтыя матэр'ялы маюць быць у прыватных руках, то хутчэй належацца мне, а не яму. У адказ атрымала ласкава ахвяраваны машынапіс "У сваты". А рукапіс? "Рукапісу ня дам. Ён будзе ў маім архіве".

Сёлета М. Рылко піша: "У.Ф. Станкевіч прыслаў *мне* працу П. Ластаўкі "Апошнія гады жыцьця Г. Леўчыка", і цяпер я маю найбольш вестак аб Г. Леўчыку...". Гэта ўжо да нічога не падобнае. Весткі аб Г. Л[еўчы]ку напісаныя спэцыяльна для мяне — на маю просьбу.

Трэба дадаць, што Рылко ў такі спосаб сабраў вялікі асабісты архіў, каб мець матэр'ялы да сваіх артыкулаў і выступленьняў па радыё. А што яшчэ горш — забірае патрэбныя яму матэр'ялы са Слонімскага музэю і так узбагачывае свой архіў.

І вось пытаньне — што за Станкевіч? Чаму ён бясправаўна гаспадарыць чужымі матэр'яламі і аддае іх у прыватныя рукі? П. Ластаўка ніколі аб некім такім не ўспамінаў.

Нядобра ў нас дзеецца. Гэтак і музэі раскрадуць. Калі Вам што вядома,

калі ласка, напішыце, але гэты мой ліст няхай астаецца паміж намі, бо некаторыя факты ведаю ад чалавека, які ня хоча і ня можа быць уцягнуты ў канфлікт з М.І. Рылко.

Усяго Вам найлепшага! Выбачайце, што раблю клопат. Як чуецеся Вы і Ваша жонка? З сардэчным прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

36. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

10 студзеня 1975 г. Вільня

Паважаны пане Мальдзіс.

Сардэчна дзякую за памяць і за кніжку. Прачытала яе адным дыхам. Але, хіба, яшчэ ня раз да яе вярнуся.

У Новым годзе зычу Вам шчыра энтузыязму і вытрываласьці, ня меншых і як найлепшых вынікаў. Вашая праца прыносіць пачуцьцё радасьці пры шчасьлівых знаходках, але, хіба, і немалую згрызоту пры выяўленьні загубленых скарбаў. Маю на думцы Віленскі Бел[арускі] музэй імя І. Луцкевіча[2]. Так зьнішчыць народнае багацьце, шматгадовую ахвярную працу! Усё раскідана па сьвеце...

А дзе ж слуцкія паясы? Іх была цэлая вітрына... У 1930, а мо 1931 годзе ў Вільні ладзіліся штогод г.зв. targi ў Бэрнардынскім садзе. Тады Навук[овае] Бел[арускае] таварыства пастанавіла паказаць экспанаты Бел[арускаму] музэю. Зразумела, ня рукапісы і падобныя цэнныя рэчы, а толькі тканіны (дываны, посьцілкі, абрусы, андаракі і г.д.), а таксама абразы нашых мастакоў і цікавыя рысункі Драздовіча[2]. Дасталі адпаведную салю ў адным з будынкаў і там наладзілі выстаўку. І сяньня ў вачах стаяць рознакаляровыя тканіны...

А музэй карыстаўся папулярнасьцю. За 1935 г. яго наведала 903 асобы і 42 экскурсіі, у 1936–1494 асобы і 64 экскурсіі, у 1937 — за першыя тры месяцы 777 асобаў, паміма таго, што музэй займаў памяшканьне ў куточку ў Базыл[ьянскіх] мурах.

Як там было з дырэктарствам Я. Шутовіча — цяжка сказаць. Ён свае заслугі, хіба, перабольшываў, але нарыс аб музэі напісаў нядрэнна, падрабязна, толькі дзе ён дзеўся? Пасьля сьмерці Я. Шутовіча яго архівы забрала пляменьніца ў Павільнюс. Там іх перабіраў А. Разанаў[3]. Пасьля, падобна, прыяжджаў нехта з Менска і забраў ці ня ўсё? І дзе ж той нарыс аб музэі?

З прыемнасьцю чытала ў Вашай працы добрыя словы аб працы Белакоза. Толькі бяда, што Белакоз вісіць на нітачцы... А калі што з ім, то і ўся яго праца прападзе. Там такія адносіны, што ворагі рады будуць зьліквідаваць усё. Шкада, што ніхто не цікавіцца адносінамі ў г.зв. беларускіх школах. Доля сумленных выкладчыкаў беларускай мовы надта цяжкая, і беларускасьць школы стаіць пад знакам пытаньня. Дзецям на ніякую актыўную работу не пазваляюць.

У Гудзевічах гурток ткацтва ткаў на 20 кроснах пояскі, закладкі, гальштукі. Мелі намер выступіць са сваім ткацтвам па тэлебачаньні — не пазволілі (мусі, раённыя ці школьныя ўлады). Хацелі наладзіць спатканьне з паэтам А. Вярцінскім[4] — не пазволілі... Маю справаздачу з абураючай школьнай нарады. Проста жах...

А Слонімскі музэй варта мець на ўвазе: там шмат цэнных экспанатаў пераходзіць (з ведама дырэктара) ў прыватныя рукі. Не прадажа, ня кража, а проста той чалавек бярэ, што хоча, у свой прыватны архіў. Гэта нехта па-

добны да Р. Зямкевіча[5]... Ой, як добра, што Вы яго "раскрылі". А то ўсе спасылаюцца на працы Р. Зямкевіча. Тое меў, тое напісаў, а гэта быў чалавек дрэнь, якіх рэдка... "Цёмная лічнасьць" — як яго называла дачка Ядвігіна Ш.

У Вас на 131 старонцы 2 песьні. Маю варыянт першай з іх, запісаны ў 1912 годзе ў ваколіцах Новага Двара Сакольскага павету (сяньня — Дуброўскага). Знойдзенае Вамі ня робіць уражаньня цэласьці, а як бы "зьлепак" прыпевак. Ці Вам так не здаецца? Як бы ні было — добра, што ёсьць, што было ў той далёкі час.

Думаю, што ведаеце, якія страты прынёс нам 1974 год.21 мая памёрла Надзея Маркаўна Шнаркевіч, 14 жніўня — Аляксандра Смоліч (пад Кіевам), 1 сьнежня — Язэп Шпаркевіч, муж Надзеі Маркаўны. Са старых беларусаў Вільні я засталася адна...

Тым больш ляжыць мне каменем на сэрцы нясканчаная дагэтуль апрацоўка гісторыі Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі. Хіба, ведаеце, што ёсьць зробленая ў форме альбома гісторыя Нясьвіжска-Клецкай бел[арускай] гімназіі і Радашкоўскай бел[арускай] гімназіі. Пасьля з вялікімі клопатамі сабралі матэр'ялы да гісторыі Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі. Стараньнямі Надзеі Маркаўны здабылі (пазычылі) шмат здымкаў, з якіх мой зяць зрабіў копіі. Атрымаўся багаты матэр'ял.

Як папярэднія альбомы, так і гэты ўзяўся рабіць С.М. Новік-Пяюн. Яго работа надзвычайна дакладная, проста артыстычная. Ды адна бяда, што ён усё хварэе. У яго стэнакардыя, апрача таго, летам праходзіў некалькі апэрацыяў на разьбітай у Калдычаве[6] скіўіцы. Нядаўна гаварыў майму зяцю па тэлефоне, што работа над альбомам ідзе марудна, бо без акуляраў ня бачыць, а акуляры націскаюць, і баліць галава...

Як С. Новік доўга ня піша, я мейсца сабе не знаходжу. У Менску німа абсалютна нікога, хто б гэтай работай зацікавіўся, заглянуў да яго, мо ў чым памог. Ён чалавек адзінокі. І калі б што з ім — што будзе з гэтым матэр'ялам?

Цяпер знаходзяцца працы нашых продкаў. А што будуць ведаць нашчадкі аб працы беларусаў у Вільні? Толькі тое, што зрадзілася ў хворай галаве Машары, ды што пішацца ў агідных артыкулах у "Полымі". А ці гэта так сапраўды было?

Так здарылася, што ў мяне завязаўся кантакт з сярэдняй школай імя Багушэвіча ў Жупранах, а менавіта з музэем Ф. Багушэвіча. Я ім паслала хрэстаматыю М. Гарэцкага і некалькі копій паштовак, выдадзеных суполкай "Загляне сонца". Уявіце сабе маё зьдзіўленьне, калі вучні той школы прыслалі ліст, у якім пішуць: "Як гэта магло быць, што ў той час, як наша Радзіма была падняволена панскай Польшчай, у Вільні выйшла беларуская кніжка?". І тое самае — аб паштоўках. Значыцца — быў Багушэвіч? Быў... А пасьля пуста і глуха аж да 1917 году... Так іх вучаць.

Ну і надурыла ■ Вам галаву. Выбачайце. Калі жыла Надзея Маркаўна [Шнаркевіч], я ў яе бывала, хоць і ня часта, апрача таго, мы перапісываліся. Было з кім пагаварыць. 50 гадоў знаёмства — гэта нешта значыць. А цяпер і яе німа... А паміж іншым, яна не была спаралiжаваная. Іншая хвароба мучыла яе сільнымі болямі і каля 30 гадоў трымала ў ложку. Выключна сьветлая была ў яе галава і вялікая мужнасьць.

Пару гадоў таму запісала цэлае беларускае вясельле (песьні) — ад запоінаў да канца. Ноты запісаў П. Каруза. Цяжка ёй было над гэтым працаваць, але

цешыла сябе, што мо з гэтага будзе карысьць. Літоўцы зрабілі такое "Вясельле" для тэлебачаньня... Але ня ў нас. Узяла Г. Барташэвіч, нічога не зрабіла. Узяў Р. Шырма, мае друкаваць са сваімі песьнямі... Але як? У якой форме?

Але пара скончыць. Яшчэ раз дзякую. Прывітаньне ад сына. Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

37. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

17 студзеня 1975 г. Вільня

Паважаны пане Мальдзіс.

Сяньня атрымала Вашую паштоўку. Дзякую за весткі аб спадчыне Я. Л[уцкеві]ча. Добра, што хоць копія гісторыі Музэю ёсьць. Тымчасам я даведалася (не разумею, чаму мне раней аб гэтым не сказалі), што тут, у Літоўскім этнаграфічным музэі ёсьць нашы слуцкія паясы і шмат іншага. Зяць мой Лявон Луцкевіч помніць, што ў Музэі было. Зразумела, ня ўсё выстаўлена. Магчыма, у сховішчах і важных дакумэнтаў нямала.

За Вашае спачваньне ў маіх клопатах дзякую. Але — ня вельмі... Калі я пісала, што німа каму пацікавіцца, а мо і ў чым памагчы, то мела на ўвазе толькі якую-небудзь прыватную асобу. У нас зусім іншыя крытэрыі ацэнкі пытаньня. Альбому ніякім чынам ня могуць рабіць чужыя рукі. Трэба матэр'ял ведаць, разумець яго. Гэта не мэханічная работа.

Л.І. З[бралевіч][1], праўда, шмат зрабіла для нас, заказаўшы ў сваёй майстэрні альбомы, але далей — справа іншая.

Нашы матэр'ялы не надаюцца да публікаваньня. Яны для нас — сьвятая сьвятых. А каб папаліся на вочы розным Шаўцовым[2] або аўтарам артыкулу "Бел[арускія] пісьменьнікі аб буржуазных нацыяналістах"[3]? Ох, колькі яны крыві напсавалі...

Ведаю, што ў Менску (паводле мяне — зусім беспадстаўна) ганьбяць С. Новіка. Я на яго гляджу інакш. Моцна яму веру і бясконца ўдзячная за яго ахвярную, безінтэрэсоўную працу. Нават для мяне асабіста. Калі "Маладосьць" зрабіла з маіх успамінаў аб Гарадзенскім гуртку беларускай моладзі нейкі бессэнсоўны агрызак, С. Новік перапісаў на машынцы мой рукапіс у вялікім ліку экзэмпляраў і разаслаў усім, каго гісторыя гуртка магла цікавіць. І гэта без маёй просьбы, без майго ведама.

Не разумею, за што яму жыць не даюць? Прыслалі яму ліст (хто — ня ведаю), у якім, як ён мне піша, "зрабілі з мяне нейкага чорта". А яшчэ горш, што копію гэтага ліста паслалі яго хворай на сэрца сястры. Гэта ж подласьць! Ён дрэнны, а Шаўцоў — добры? — апрацоўвае, карэктуе працы пісьменьнікаў? Бедная наша Беларусь — да чаго дажылі...

Ліст ад С.М. [Новіка-] Пеюна — мела. Прайшоў новую апэрацыю носа. Вонкавая рана не дае надзяваць акуляраў, таму з цяжкасьцю і марудна працуе. Усё ж піша: альбомы зраблю! Трэба набрацца цярплівасьці і чакаць.

Вось ізноў расьпісалася. Гэта, мусі, мая старасьць сьпяшаецца выліць усё, што на душы. Мо, часам, і завостра што напішу, але такая нястрыманая натура. Ня ўмею быць абыякавай. Так што, калі што якое ня так,— выбачайце. Ад маіх — прывітаньне.

Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

38. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

8 красавіка 1975 г. Вільня

Дарагая Ларыса Антонаўна.

Толькі выслала да Вас ліст і гэтага самага дня ўвечары атрымала ад Вас ліст і ўспаміны. Шчыра дзякую за адно і другое. Якраз, ня ведаю чаму, у 1930 г. перарвалася мая карэспандэнцыя з Гальяшом Леўчыкам. А мо былі ад яго лісты, а я ня помню? Бо я, здаецца, Вам некаліс пісала, што ў мяне прапаў цэлы архіў "Заранкі", а там маглі быць і лісты Леўчыка.

Калі гутарка аб Леўчыку, то мушу зазначыць, што ў Вільні былі выданыя па-беларуску "Песьні духоўныя" для мэтадыстаў у перакладзе Леўчыка. Ён прыехаў на пару дзён, прывёз рукапісы і грошы. Усё гэта аставіў мне, просячы, каб я аддала ў друк, што я і зрабіла. У сваіх успамінах аб Г. Леўчыку ■ аб гэтым не пішу, таму што тыя ўспаміны меліся друкавацца ў "Полымі", і мяне папярэдзілі, каб я аб гэтых "грахах" Леўчыка не ўспамінала. Пэўне ж — "Песьні духоўныя" — страшна падумаць! Эх, людзі! Лепш бы баяліся сваіх грахоў проці роднай мовы. Здаецца, я маю "Песьні" ў 2 экзэмплярах. Калі так, то адзін прышлю Вам.

Справа дакумэнтаў, якія П. Ластаўка меўся пасланць у Гродзенскі музэй, вельмі незразумелая. Ён мне дакладна пісаў, што і куды меў паслаць. Паміж іншым, я яму пасылаць у Гродзенскі музэй ня радзіла. У яго былі прыгатаваныя такія матэр'ялы: "Успаміны аб адвакаце Адаме Бычкоўскім" на 30-я ўгодкі яго сьмерці, сцэнічны твор А. Бычкоўскага "У сваты", напісаны ў Гродне ў 1910 г., калі аўтар быў у 8-й клясе Гродзенскай мужчынскай гімназіі і ў той жа час старшынёй нашага Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Гэта мела быць адаслана ў Беласток у рэд[акцыю] "Нівы", каб надрукавалі. Ужо было дагаворана і выясьнілася, што надрукуюць ня ў "Ніве", а ў альманаху "Белавежа", з чаго П. Ластаўка быў рады.

У Беласток меўся паслаць машынапіс "У сваты" і свае ўспаміны аб А. Бычкоўскім. А рукапіс, здымкі А. Бычкоўскага (адзін незадоўга перад сьмерцю, а другі — што я паслала П. Л[астаў]ку з вучнёўскіх часоў) і клепсыдру меўся паслаць у Гродна, як пісаў, "каб былі гэтыя памяткі там, дзе А. Б[ычкоўскі] пачынаў працаваць у беларускім руху." А ўспаміны аб Г. Леўчыку меўся прыслаць проста мне. Пасьля сьмерці П. Ластаўкі ніякіх вестак аб усім гэтым не было. Я таксама даведывалася ў Гродне і Дзятлаве. Ні ў "Ніве", ні ў альманаху нічога не надрукавалі.

У міжчасе да мяне напісаў журналіст са Слоніма М.І. Рылко, даведаўшыся, што я была знаёмая з Леўчыкам. Першы раз напісаў па-расейску. Я яму адказала, што я аб справах беларускіх у чужой мове пісаць ня буду, няхай сабе знойдзе перакладчыка, а тады да мяне зварочваецца. Адказаў, што ён і сам сваю мову ведае. Паміж іншым, ён вядзе перадачы ў Слонімскім радыё. А ў якой мове — ня ведаю. Пачаў пісаць часта, прысылаць раённую газэту. Аж раз піша, што я, напэўна, уцешуся, даведаўшыся, што яму прывязьлі матэр'ялы, прыгатаваныя П. Ластаўкай! Прывёз нейкі Уладзімір Станкевіч (з Вялікай Бераставіцы, як я пасьля даведалася).

Якім цудам у рукі гэтага У. Ст[анкеві]ча ўсё трапіла? А ў яго аказалася ўсё чыста: і тое, што мелася друкавацца ў "Ніве", і тое, што назначалася ў Гродзенскі музэй, і тое, што для мяне. Мушу зазначыць, што М. Рылко і У. Станкевіч людзі свае, партыйныя, і мне радзілі іх не чапаць. Але я напісала Рылко, што памят-

кам па А. Бычкоўскім, хутчэй, мейсца ў мяне, бо мы разам працавалі.

Пасьля даўгой перапіскі Рылко прыслаў мне машынапіс "У сваты", а рукапіс прывёз паказаць. Успаміны аб Леўчыку аселі ў яго. Калі прыслаў мне навагоднія пажаданьні, я яму напісала: "За пажаданьні і памяць дзякую, але прашу падумаць, як можна назваць затрыманьне чужой уласнасьці, як гэта зрабілі Вы з успамінамі П. Ластаўкі аб Г. Леўчыку, пісанымі спэцыяльна для мяне на маю просьбу. Што гэта так, маю доказ — ліст П. Ластаўкі".

На гэтым і скончылася. Вось дакладна ўсё, як было. І што можна зрабіць? І такая злосьць! Гэта ж Ластаўка апісаў апошнія гады жыцьця Г. Леўчыка! Якраз тое, чаго ня ведаем. А той М. Рылко яшчэ хваліцца, што цяпер ён больш за ўсіх аб Г. Леўчыку ведае...

Вы чыталі апошнюю кніжку А. Мальдзіса і тое, як ён нарэшці раскрыў "слаўнага бібліёграфа Р. Зямкевіча"? Я аж Мальдзісу падзякавала, што хоць ён напісаў праўду! Вось М. Рылко — гэта такі самы тып. А чапаць яго сапраўды боязна, бо ён мае плечы.

Дажджы, вільгаць, і мы ўсе — як паламаныя. Пачалі работу ў гародзе. Я ўжо пасадзіла гарох — шпараговы і цукровы, буракі, дробныя цыбулькі глядыёлюсаў. Вялікія ў кветніку пасадзіць дачка, хоць ёй таксама рука баліць. Пакрысе падсыпаю штучнымі навозамі трускаўкі. Так у рабоце дні хутка праходзяць. Аж захутка.

Маю надзею, што ўдасца заўтра выслаць Вам маленькую пачку: форсыцію і пару трывалых ружовых румянкаў. Яны прыгожыя, доўга цьвітуць і зрэзаныя доўга ў вадзе стаяць. А Вашая цыбуля, што памаранчавым цьвіце, ні разу не цьвіла, толькі разрастаецца. Мы яе і выймалі на зіму, і ў грунце астаўлялі — нічога не памагае. Што з ёю рабіць? У нас ізноў выгінулі амаль усе геаргіні. Як я іх ні гляджу, усё не ўдаецца, а такія ўжо былі прыгожыя.

Ня ведаю, як Вы маю мазаніну будзеце чытаць. Баляць рукі, асабліва правая ў локці. Не магу сагнуць, не магу пачасацца. Мужу — сардэчнае прывітаньне і падзяка за ўспаміны.

Шчыра дзякую за арыгінальны здымак. Цалую Вас сардэчна і шчыра. *Л. Войцікава.*

39. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

19 кастрычніка 1975 г. Вільня

Дарагі Іван Уладзіміравіч[1].

Учора атрымала Ваш ліст і кнігу Альбэрта Паўловіча[2]. Гэта 2-гі экзэмпляр, адзін ужо мела. Але гэта нічога, прыдасца для каго-небудзь, каго ў беларускую атмасфэру трэба цягнуць за вушы. За адно і другое шчыра дзякую.

Аб А. Паўловічу — далей. А насамперад справа "Снатворнага маку"[3]. З Гудзевіч, з музэю, копію "С[натворнага] маку", якую я ім ахвяравала, адразу мне прыслалі з просьбай вярнуць. Я ўжо зьбіралася выслаць яе Вам, аж тут нечакана атрымала з фундамэнтальнай Бібл[іятэкі] АН БССР прыгожа апраўленую адбітку гэтай п'ескі. Хто выслаў, з якой мэтай — ня ведаю. Ці гэта мне, ці толькі для перагляду? Ніякага выясьненьня. І цяпер пытаньне — ці Вам высылаць маю рукапісную копію, ці ня трэба? Чакаю хуткага адказу.

Цяпер справа зборніка Г. Леўчыка. Што вершы трэба ператрасьці — гэта напэўна. У тых, што меліся выйсьці ў "Бел[арускім] жаўранку"[4], нямала

слабенькіх, апрача таго, ёсьць і чужыя, менавіта Л. Славінскага (з Ружаны). Колькі такіх — ня помню, а пераглядаць "Бел[арускага] ж[аўран] ка" (машынапіс, што прыслаў С. Н[овік] – П[яюн]), ня хочацца, неяк нядобра чуюся.

У сваіх успамінах аб Г. Л[еўчы]ку я ўспамінаю, што спаткалася з ім у Вільні вясной 1923 г., а пасьля, як ён прыяжджаў у 1926 г., я яго ня бачыла. Калі Вы маіх успамінаў аб Г.Л. ня маеце, то яны ёсьць у С. Новіка і ў бібл[іятэцы] рэдкіх друкаў і рукапісаў — у Лідзіі Іванаўны [Збралевіч]. Ці маеце добрую фатаграфію самога Леўчыка? Тая, што на маіх успамінах, надта добрая — з 1913 году. Маем яе на плёнцы. Хатку Леўчыка высылаю. Гэта копія, мо ня вельмі добрая. У Новіка ёсьць, здаецца, арыгінал. Маю яшчэ фатаграфію-групу 1912 г.— Варшаўскі бел[арускі] гурток, дзе ёсьць і Леўчык. Мо зрабіць копію?

Ці Вы не прабавалі здабыць у М.І. Рылко (Слонім) апошніх вестак аб Леўчыку? Ці, лепш сказаць, аб апошнім часе яго жыцьця? Добра было б не зрабіць той памылкі, якая паўтараецца ўжо шмат разоў, што Л[еўчы] к быў расстраляны. П. Ластаўка пісаў мне (на жаданьне, магу прыслаць гэты ліст): "Г. Л-к памёр сваёй сьмерцю ў 1944 г., а ня быў расстраляны, як гэта было дзесьці надрукавана".

Вярнуся да А. Паўловіча. У часе, як я была ў Менску, ён трымаўся вельмі здалёк ад нашай групы, якая гуртавалася пры К [амітэ] це Т[аварыст]ва помачы ахвярам вайны. Не бываў ніколі ні ў Бел[арускай] хатцы, ні на г.зв. суботніках. На суботніках яго сатырычныя вершы чыталі (ня толькі ў Менску, але і раней — у Гродз[енскім] гуртку).

Ядвігін Ш. усюды бываў і сам ня раз чытаў свае творы. А. Паўловіч — не. Толькі на спатканьне новага 1917 г. прыйшоў, запрошаны, са сваёй дачкой Уладзяй і яе мужам Я. Фарботкам (таксама крыху паэтам). Тады хіба і пазнаёміўся з Максімам Б[агдановічам]. Ці той апошні бываў у доме Паўловічаў? Нічога пэўнага сказаць не магу. Але няўжо ж ніхто з нас аб гэтым ня ведаў? Максім ня быў скрытным чалавекам, а да нас усіх адносіўся, як да блізкіх людзей. Ня ведаю...

Я выехала з Менска ў ліпні 1918 г. Перад тым, як выйшлі на арэну Купала, Колас... Сабралася публіка таленавітая, вартасная, тады і варта было ўвайсьці ў іх круг. Такое ўражаньне зрабілі на мяне ўспаміны дачкі А. Паўловіча. Пісаў ён добра і рысаваў добра. Крыху мова падводзіла. Маю на ўвазе пераклад М. Канапніцкай[5].

Выбачайце за хаатычны ліст і мазаніну. Цягне легчы. Усяго Вам добрага і ўсім Вашым. Вераніка[6] — малайчына! Няхай і далей так цешыць бацькоў. Ад Тоніка — прывітаньне.

Л.В.

Пішыце. Такія лісты — гэта жыватворная вада. Ня вельмі арыентуюся ў 2-м Бел[арускім] савец[кім] энц[ыкляпэдычным] слоўніку[7], у яго зьмесьце. Ці ня можна там "усадзіць" словы "Бел[аруская] борць" і "Бел[арускае] каапэр[атыўнае] пчалярскае т[аварыст]ва "Пчала"? Не магу сабе дараваць, што не прабавала прасунуць вестак аб іх у энцыкляпэдыі.

Яшчэ аб П[аўлові]чу. Надта няясна выглядаюць успаміны яго дачкі таму, што німа хоць бы больш-менш дакладных датаў. Калі, у які час часта прыяжджаў у Менск прафэсар Б. Э[пімах] – Шыпіла? Якія пісьменьнікі жылі ад 1900 па 1915 г. па-за Менскам і прыяжджалі ў Менск? Усё гэта цікава. А мо толькі я не арыентуюся? Што прыяжджала Цётка — ведаю з расказаў і лістоў дачкі Ядвігіна Ш. А вось А. Паўловіча, яго сям'ю, яна ніколі не ўспамінала.

Калі будзеце пісаць, то лепш на адрас маёй дачкі. Бо ўсё баюся, што лісты гінуць. Нашу скрынку паштовую часта бачаць з адагнутымі дзьверкамі.

Адрас дачкі: *Вильнюс — 49, Архитекту, 132, кв. 69. Індэкс 232049 (тэл.: 49001), Галіна Антонаўна Войцік-Луцкевіч.* Наш нумар пошты зьменены: *232053, Вильнюс — 53.*

40. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

1 лістапада 1975 г. Вільня

Дарагі Валодзя[1].

Думаю, што не загневаецеся за такую фамільярнасьць. Але бо сапраўды Вы маглі б быць маім унукам, і я адношуся да Вас, як да некага блізкага, так мяне цешыць Ваша прага грамадзкай дзейнасьці. У чым толькі змагу, ахвотна памагу.

Я ўжо зьвязаная з 2-ма музэямі: Гудзевіцкім і музэем Фр. Багушэвіча ў Жупранах пры сярэдняй школе імя Ф. Б[агушэві]ча. Цяпер з радасьцю прыйму ўдзел у "народзінах" новага музэю. Што да Вашых просьбаў, лічу так: у мае ўспаміны аб Г. Леўчыку ўвайшлі ўсе яго лісты[2]. Так што перапісываць лісты, лічы, німа патрэбы. Хіба нейкі адзін, які Вам найбольш спадабаецца, можна будзе перапісаць, а мо лепш сфатаграфаваць, каб захаваць яго аўтэнтычнасьць. Верш са свайго альбомчыка — перапішу, а пару старонак з яго папрашу зяця перафатаграфаваць.

Свае здымкі пастараюся адшукаць і дам Вам. Самыя ўспаміны ці ня лепш было б папрасіць Сяргея Міхайлавіча [Новіка-Пеюна], каб аформіў так, як я маю? Здымак Г. Леўчыка я прыслала б. Такі лепш выглядае, і чытаць кожнаму лягчэй, чым пісанае рукой. Калі б Вы не хацелі самі прасіць С.М., то магу гэта зрабіць я ад сябе. Шчыра кажучы, я вельмі ня маю часу. Хацела б да Новага году скончыць пісаць свае ўспаміны — віленскія гады, г.зн. ад 1923 году і да вайны.

А яшчэ маю заплянаваную такую работу: у апошнія гады памёрла шмат беларускіх дзеячоў, аб якіх ніхто ні словам нідзе ня ўспомніў. Я сабрала аб іх біяграфічныя дадзеныя (пераважна з іх жа лістоў да мяне) і фатаграфіі. Хачу гэта ўсё ўпісаць у адмысловы сшытак. Няхай жа хоць так памяць аб гэтых людзях захаваецца. А мо ў будучыні каму-небудзь такі матэр'ял спатрэбіцца. Тым больш цяпер, калі я зразумела, што нават аб такім заслужаным бібліёграфе, як Юлія Язэпаўна Бібіла, моладзь нічога ня ведае,— лічу сваю задуму вартай выпаўненьня.

Хатняя гаспадарка займае шмат часу, астаюцца вечары... Але калі б трэба было памагчы Вам — не адмоўлюся.

Нашу сустрэчу ўспамінаю з прыемнасьцю і рада буду зноў з моладзьдзю спаткацца. Але я вельмі хацела б, каб Вы раней прыехалі адзін. Хачу пазнаёміць Вас з такімі матэр'яламі, якія Вам асабліва варта ведаць. Варта арыентавацца ў цэласнасьці беларускага руху ў Зах[одняй] Беларусі па сапраўдных фактах. Я маю перапісаную хроніку ў час[апісе] "Шлях моладзі" амаль за 10 гадоў. Вы маглі б сабе спакойна перапісаць тое, што найбольш бы зацікавіла. Гэта дало б Вам магчымасьць ясна бачыць розьніцу паміж тым, што было, і тым, што бачаць (і пішуць) у фальшывым сьвятле. Там ёсьць таксама крыху і аб Г. Леўчыку. Як думаеце? Ці згаджаецеся са мной? Пішыце. І ў ніякім выпадку ня бойцеся дакучаць лістамі.

Усяго добрага. Усім Вашым таварышам шлю прывітаньне. *Л. Войцікава.*

3 лістапада. Напісала ліст 1-га ўвечары, але ўчора выслаць не ўдалося. Учора ў нас быў дзень памёршых — Задушкі. Я езьдзіла з унукам на магілы сваіх родных, а таксама на могільнік Росы на беларускія магілы. Завязьлі кветкі, сьвечкі. Асабліва на магілу Ядвігіна Ш.

Прычытала раней напісаны ліст і задумалася, ці высылаць яго з такім загалоўкам? Мо зарана на такую фамільярнасьць. Але ўжо няхай так будзе — па-багдановічаўску. Ён жа лічыў, што мы, беларусы, зьвязаныя ідэяй, не павінны быць чужымі.

Маю да Вас просьбу. Калі знойдзеце час, запытайцеся Сяргея Міхайлавіча [Новіка-Пеюна], ці атрымаў ад мяне бандэроль — матэр'ялы да альбому, і ці пісаў мне аб гэтым. Непакоюся... Мо ліст яго загінуў? У той пачцы, што прыслаў праз Вас, ліста не было, толькі яго вершы. У нас часта лісты прападаюць. Ну, усяго добрага. Чакаю адказу.

Алегу Антоновічу [Лойку] шлю сардэчнае прывітаньне. *Л.В.*

41. АЛЯКСЕЮ АНІШЧЫКУ

12 лютага 1976 г.

Паважаны грамадзянін[1].

Дзякую за словы спачуваньня. Але маеце рацыю — гору маткі ніхто і нічым не паможа. Цяжка, страшна цяжка... І фізычна чуюся вельмі блага.

Аб слухавым апараце ня думаю і не хачу яго. Быў час, калі мой с.п. сын быў разам, і я вельмі хацела дапамагчы майму слуху. Але не давялося гэтага зрабіць. А цяпер ужо ня варта.

С.п. сын хварэў на сэрца даўна. Ад вясны леташняй чуўся вельмі нядобра. Але ўсім займаўся ўдома: дровы, вада, гарод... Вазіў прадукты з гораду. Усё гэта адняло апошнія сілы — сэрца ня вытрымала...

Паведамляю, што альбом "Віленская Беларуская гімназія" ўжо гатовы. Пакуль што ён у мяне.

Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

42. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

14 лютага 1976 г.

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую Вам за спачуваньне і за добрыя, зычлівыя словы аб маім с.п. сыне. Мушу дадаць, што ён быў да таго ж найлепшым, адданым сынам. Яго стараньнямі і апекай утрымалася я да гэтай пары. Далей жыць мне німа чаго...

Пішаце, што мае ўспаміны патрэбныя ўсім. Я так ня думаю. Пераканалася, што іх наагул ня трэба было пісаць,— доказы ёсьць. Калісьці ў "ЛіМе" Я. Рамановіч[1] напісаў аб пачатках беларускага тэатру ў Менску, аб трупе Ф. Ждановіча. Я пабачыла, што ён моцна памыляецца, бо трупа працавала шмат раней, чым яму здаецца. Я дастала яго адрас і напісала яму, як гэта сапраўды было. Ён мне адказаў, але так блытана, што я нічога не зразумела. Праз нейкі час выйшла яго кніжка — паўтарыў усё, як раней. А я ж якраз у сваіх успамінах пішу аб першым спатканьні з Ф. Ждановічам, аб яго працы апрача трупы...

Пасьля — яшчэ лепш. Друкаваліся мае ўспаміны аб М. Багдановічу. Усё так ясна бачу, так добра помню. Праз пэўны час мяне пазнаёмілі з "Страцімлебедзем" З. Бядулі. Што я перажыла... Ён так подла абгаварыў маю с.п. матку! А адначасна і мяне, бо і я разам жыла — паводле яго. А ўсё, што ён піша — адна мана. Ані мы ў яго ў той час не жылі, ані М. Багдановіч ня жыў і ня мог бы жыць у такіх абставінах...

Я старалася падрабязна выясьніць — рысавала плян Бядулінай кватэры... Да нікога не дайшло. Мне ня вераць... Я не дабівалася, каб Н. Ватацы[2] выкінула БядулінУю вэрсію, а друкавала маю, а проста, лягічна рэзюмуючы, прасіла: або — або... Калі Бядулін "твор" — маіх успамінаў ня трэба. Ніякай увагі...

А дзе сэнс? Трэба верыць або аднаму, або другому. Бо што ж выходзіць? Там жа ўсё пярэчыць адно другому. Вось у такі цяжкі, трагічны для мяне час прыйшлося зрабіць яшчэ адзін горкі, горкі глыток... Дык нашто пісаць? Для каго?

Калі змагу, перапішу прыгатаваныя біяграфіі тых бел[арускіх] дзеячоў, якіх ніхто нідзе не ўспамінае. І ўсё. Чуюся вельмі дрэнна — і духова, і фізычна.

Мо і добра, што лёс заашчадзіў сыну прыкрасьці і болю, бо калі б прачытаў Бядуліну брахню... Сын мой так любіў і шанаваў сваю бабку, якая і ў Горадні, і ў Менску шмат зрабіла для бел[арускай] справы. Ціха, ня гучна, але з усёй душы.

Яшчэ раз дзякую за спагадлівасьць і спачуваньне. *Л. Войцікава.*

43. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

16 лістапада 1976 г.

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Перадусім адказываю на пытаньні. Кнігу Ядвігіна Ш. прыслала мне выдавецтва, а пасьля яшчэ і Г.А. Кахано́ўскі. "Даляглядь"[1] маю таксама — 2 экз. Цёткі[2] мела аж 3 — адзін паслала ў Прагу — М. Забэйду. Я з ім часта перапісываюся. Шкада яго. Слабы, а апекі ня мае. Дзіўна. Ці ж там нельга за грошы знайсьці жанчыну, якая б занялася хатняй работай хоць пару гадзін у дзень? А то ён піша, што "цяжка дайсьці да сталоўкі, цяжка паспратываць свой пакойчык".

Здароўе С.М. Новіка — лепш. Прынамсі, нічога небясьпечнага не аказалася. Але старая хвароба — стэнакардыя — дакучае. Цяпер ён выехаў у Слонім. Паклікалі да хворай сястры.

Аб "Сьмешным доктары" я проста забылася. Гэта жарт народны. К. Калышка (той самы — з гуртка) даў яго ў нашу аднаднёўку "Колас беларускай нівы". Прачытаўшы ў рэцэнзіі Я. Саламевіча, што гэту рэч М. Б[агдановіч] пералажыў на расейскую мову, я зьдзівілася: скуль ён узяў? Я. Саламевіч прыпомніў мне, што "Сьмешны доктар" друкаваўся ў "Нашай ніве". К. К [алыш] ка, хіба, больш нічога і не напісаў.

Ці я Вам дала біяграфію Францішка Грышкевіча[3] — апошняга дырэктара Віленскай Беларускай гімназіі? Ён паходзіў з Сухаволі. Калі не — прышлю, здымак таксама.

Цікава мне, скуль Вы даведаліся аб Антону Бычкоўскім? Гэта стрыечны брат с.п. Адама Бычкоўскага. У "Przeglądze Wileńskim" (1925, № 16) ёсьць артыкул Баляслава Пачопкі — "Biełarus": ze wspomnień redaktorza". Там аўтар гаворыць аб Ант. Бычкоўскім. Маю гэты артыкул перапісаны.

Аб друку "Каласкоў"[4] німа чаго і марыць. Там усё, як сказалі б цяперашнія аўтары, "пахне нафталінам". Ні піянераў, ні даярак...

Я. Саламевіч быў пару тыдняў таму ў мяне. "Каласкі" бачыў, але яны яго не зацікавілі. Прыяжджаў з таварышам, які меў нейкія скамплікаваныя фатаграфічныя апараты. Зрабілі каля 300 здымкаў: фатаграфіяў, лістоў, розных старых дакумэнтаў, бо Я.С. не хацеў браць арыгіналаў, каб што пры перасылках ня згінула. Прывёз мне матэр'ялы, сабраныя для зборніка Г. Леўчыка,— паказаць, як будзе выглядаць зборнік. Вельмі я яму за гэта ўдзячная. Зборнік мае выйсьці аж у 1980 г., у 100-я ўгодкі нараджэньня Г. Леўчыка, а гэта для мяне задалёкая мэта.

Я выпадкова знайшла ў сябе лісток Беларускага адрыўнога календара і напісала яго гісторыю. Пасылаю Вам яе і фотакопію лістка. У гэтым годзе якраз 50 гадоў ад выхаду яго ў сьвет. Юбілей...

Думала напісаць аб ім у пачатку году. Гаварыла аб гэтым са сваім с.п. сынам. Але ня маючы, чым даказаць яго існаваньне, усё адкладала. Але цяпер адзіны лісток знайшоўся. Калі б у Вас быў лішні здымак Макара Краўцова, калі ласка, прышліце. Ён рабіў карэкту майго "Батанічнага слоўніка".

Усяго найлепшага Вам і п. Марыі[5]! Л. Войцікава.

44. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

22 сьнежня 1976 г. Вільня

Дарагі Іван Уладзіміравіч.

Дзякую за ліст. Вы мой апошні, напэўна, таксама атрымалі? Нядобра, што Вы так перамучываецеся. Ці ў такім тэмпе працы надоўга сілаў хопіць? Праз сілу ўсяго не пераробіце.

Я ўжо канчаю біяграфіі. І вось бяда — ніяк не магу дастаць здымка У. Паўлюкоўскага. Мо Вы дзе яго здымак бачылі? Мне некалісь Арсень Сяргеевіч [Ліс] казаў, што бачыў здымак: У. П[аўлюкоўс]кі з вядром, пэндзлем бяжыць на сваю малярскую працу (на жаль, ня помніць дзе, у чым).

Аб выданьні "Малюнкаў" пастараюся напісаць[1]. Але гэта, хіба, толькі для Вас, а не для друку. Бо калі напішу так, як было, што атрымлівала вершы ў лістах нармальных, то той, хто падаваў да друку гутарку з М. Машарай, запратэстуе, скажа, што няпраўда. М. Машара пасылаў грыпсы. Гэта ўсё было так проста. Выбрала, занясла ў друкарню і — усё.

Добра было б, каб Вы яшчэ хоць раз вырваліся з Менска і прыехалі. Трэба ж скончыць чытаць успаміны, пакуль я магу што дадаць, выясьніць. І я вельмі хацела б, каб Вы прачыталі лісты А. Смоліча. Цікавы быў чалавек. Каб інакш жаніўся, мог бы аставіць па сабе вартасных нашчадкаў. А так Алеся змарнавала (пад узглядам бел[арускай] сьвядомасьці) усіх сваіх дзяцей, хоць сама сябе лічыла беларускай патрыёткай.

Добра разумею, што значыць ня спаць. І я спаць не магу. Кожную ноч мучуся да гадзіны 5-й раніцы бяз сну. А бывае, што і ўстаю, не заснуўшы. Мая дачка выслала на адрас Арс. Сярг[еевіча Ліса] зёлкі для З. Пазьняка і для Вас. Калі атрымалі — піце. Яны могуць і на сон падзеяць.

Мела я цяпер доўгі і цікавы ліст ад М. Забэйды. Усяго найлепшага! *Л.В.*

45. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

1 студзеня 1977 г.

Дарагі Іван Уладзіміравіч.

Шчыра дзякую за здымкі Вам і Вашаму таварышу. Яны шмат лепшыя за тыя, што я Вам паслала. Учора скончыла біяграфіі. Асталося дадаць нейкія дэталі, якія мушу здабыць. Хіба, у панядзелак, 3-га, вазьмуся пісаць, як паўсталі "Малюнкі". Што атрымаецца — ня ведаю. Неяк ня пішацца, ня думаецца.

Гэта ж надыходзяць угодкі с.п. сына. Усё ж прымушаю сябе рабіць, што трэба, бо час не стаіць. А пачатае трэба скончыць. Аб гэтым прыпамінаюць мне абсалютна ўсе — у кожным лісьце.

Насыпала шмат сьнегу. Слаўка атрасае яго з яблыняў — баіцца, каб не паламаліся галіны. Мароз –4°, цікава, якая далей будзе зіма? Падобна, у Менску грып? А ў Вас ніхто не хварэе?

Дзякую за добрыя пажаданьні. І Вам, і Вашым родным яшчэ раз сардэчна жадаю ўсяго самага лепшага. Не забывайце. Ад маіх — прывітаньне і падзяка за памяць. *Л.В.*

46. ЯЎГЕНУ ПЕТРАШЭВІЧУ

27 студзеня 1977 г. Вільня

Паважаны Яўген Канстанцінавіч.

Мушу Вас патурбаваць маленькай просьбай. Мо будзеце ласкавы адказаць мне на пытаньне, на якое ніадкуль не магу дастаць адказу.

Што дзеецца ў Аляксандра Мікалаевіча [Белакоза]? На пасланую ў музэй бандэроль і на два лісты ня маю ніякага адказу. Гэтага ніколі не было. Мо проста лісты гінуць? А мо там нешта нядобрае? Хацела яшчэ адзін экспанат у музэй пераслаць, але пры такіх абставінах ня ведаю, што рабіць.

Хоць так няхутка, але выражаю Вам шчырае спачуваньне ў сувязі са сьмерцю Вашай с.п. маткі. У свой час не напісала, бо і ў мяне гора — памёр мой с.п. сын.

Усяго Вам найлепшага. Маю надзею на адказ. *Л. Войцікава.*

47. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

30 студзеня 1977 г.

Даражэнькая Ларыса Антонаўна.

Нядаўна я Вам пісала (27/1), але ўчора атрымала "Ніву" і пішу ізноў. Сардэчна дзякую за "Ніву". Рада мець нумар са сваім артыкулам[1]. Добра адбілася картка з календара. Шкада толькі, што не адбілі і адваротнага боку, які я ім таксама паслала. Менск наагул гэтым не зацікавіўся.

Як добра, што Вы думаеце складаць сваю новую кнігу! Рабіце гэта як найхутчэй. Чакаем.

Учора, у першыя ўгодкі паховін с.п. Тоніка, прыязная яму сям'я езьдзіла на магілкі — інжынер Алег, яго жонка Рыта і іх сын, а пасьля прыехалі да нас. Прыехалі таксама Кастусь і Лёдзя [Шышэі]. Доўга сядзелі, успаміналі, шкадавалі. Зрабілі памінкі. Не люблю я гэтага, але што ж, трэба жыць, як людзі маюць у звычаі.

У мяне да Вас маленькая просьба. Вы, магчыма, заўважалі калі ў "Ніве" прозьвішча Мар'ян Пецюкевіч? Я Вам калісь аб ім успаміналa. Ён даўна на пэнсіі. Жыве ў Польшчы, у Торуні. Здаўна зьбірае розныя матэр'ялы з нашай этнаграфіі. Друкаваўся ў "Ніве", выдаваў паасобныя брашуркі і артыкулы ў польскай навуковай прэсе. Цяпер зьбірае матэр'ялы аб беларускай народнай лазьні. Мае ўжо з розных бакоў Беларусі, толькі з Гродзеншчыны нічога ня мае. Пытаўся мяне. Але я ніколі з гэтым не спатыкалася і ня чула.

Мо Вы, часам, ведаеце, ці былі па вёсках паравыя лазьні? Ці супольныя, ці ў кожнага свая? Наагул, калі што ведаеце ў гэтай справе, напішыце мне, а я яго паведамлю. У Дзісьненшчыне, адкуль мой с.п. муж, лазьні былі, у мужавай маткі — таксама. А вось у Сакольшчыне — ніколі ня чула. Хацела запытацца А.М. Белакоза, але ён даўна маўчыць. Не разумею, што там сталася.

Ізноў пацяплела, хмарна. І на люты прагнозы такія самыя. Калі ў сакавіку вялікіх маразоў ня будзе, зіма так і адыйдзе лёгкай. Слаўка ўвесь вольны час праводзіць, чытаючы падручнікі садаўніцтва і пераглядаючы старыя часапісі агародніцка-садаўнічыя — польскія і ўкраінскія, якіх ▪ шмат маю. Як выдавалася "Беларуская борць", мы ў абмен на яе атрымлівалі 12 часапісаў — польскія, чэшскія, украінскія, нямецкія і расейскія. І амаль усе ў мяне захаваліся.

Цяпер буду пісаць успаміны пра "Беларускае каапэратыўнае т[аварыст]ва "Пчала" і яго орган "Беларуская борць". Матэр'ял маю вялікі, бо абыймае 10 гадоў працы. Трэба сьпяшацца, пакуль яшчэ магу пісаць, і даўгія вечары спрыяюць.

Сардэчна вітаю і цалую. *Л. Войцікава.*

48. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

17 лютага 1977 г.

Дарагі Валодзя.

Я рада, што Вы мяне не забываеце. Рада таксама вестцы, што на Беларусь даходзіць беластоцкая "Ніва". А я і не думала, што яе выпісываюць. А календара беластоцкага ня маеце? Яны там выдаюць нядрэнныя календары. Праўда, крыху зашмат аб дзейнасцьці свайго т[аварыст]ва і яго гурткоў, але для іх на мейсцы то гэта цікава — для нас менш. Кожны год нешта цікавае дае ў каляндар Аляксандра Бэргман[1]. Даўней у Вільні, у 20–30-я гады, кожны год выдаваліся вельмі добрыя, цікавага зьместу бел[арускія] календары-кніжкі. І то не па аднаму, а па два-тры — розных выдавецтваў. У нашы дні тыя календары на вагу золата. Асабліва шукаюць іх нашыя лепшыя дасьледчыкі.

А вось календароў адрыўных і сьлед прапаў. Дзе-нідзе траплялася па аднаму лістку. Нават я проста неспадзявана адзін лісток знайшла ў сябе. Мне пісалі, што некалькі гадоў нехта знайшоў адзін лісток адрыўнога календара і павёз яго ў Менск у выдавецтва на паказ і з прапановай выпускаць такое. Але чамусьці выдавецтва не зьвярнула ўвагі.

Як добра, што Вы напісалі да М.І. Забэйды! Ён мне пісаў аб Вашым лісьце. Пісаў, што вельмі яму было прыемна. Зьбіраўся Вам адказаць, а калі не адразу, то няможна дзівіцца. Ён надта дрэнна чуецца і, на жаль, штораз горш. Нават ліст напісаць для яго — гэта высілак.

Што да матэр'ялаў аб І. і А. Луцкевічах, то крыху ёсьць успаміны аб Ів. Л[уцкеві]чу, пісаныя яго нарачонай ці яе сястрой[2] — ня помню. Гэтую кніжку мае мой зяць.

Ёсьць А. Л[уцкеві]ча "За 25 гадоў"[3] — гісторыя Бел[арускай] сац[ыялістычнай] грамады, а тым самым і Л[уцкеві]чаў. Ёсьць Антонавава брашура аб цэлі Конрада[4] — гэта аб той цэлі ў Базыльянскіх мурах, дзе, падобна, сядзеў Адам Міцкевіч. Ёсьць і іншыя матэр'ялы. А. Л[уцкеві]ч чытаў шмат публічных лекцыяў. Сьпісак іх я вам прыгатую.

Думка Ваша добрая. Каб толькі ўдалося зьдзейсьніць. Ці ўдасца такі матэр'ял надрукаваць? Гэта іншая справа. Але трэба мець надзею, мо абставіны палепшаюць.

Вясна, хіба, ужо недалёка. Тады, калі ласка, прыяжджайце. Пытаецеся, ці я жыву ў дачкі? Як жа ж гэта было б магчыма? А хто ж пільнаваў бы дом, сад? Ды я ніколі б не згадзілася жыць у горадзе! Цярпець не магу гораду, гарадзкой няволі.

Слаўка працуе ў Вільні, у экспэрымэнтальным бюро. Жывем разам. І ён ня любіць гораду. Ужо цяпер прыгатаўляецца да веснавой работы ў садзе. Думае шмат што шчапіць, перасаджваць. Гэта яго замілаваньне.

Бывайце! Усяго добрага. *Л. Войцікава.*

49. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

23 лютага 1977 г. Вільня

Даражэнькая Ларыса Антонаўна.

Як жа дзіўна пераплятаюцца людзкія сьцежкі! Пішаце, што маці Вашага мужа з дому Палубінскіх? Сям'я маёй мамы і мама сама з Палубінскімі былі добра знаёмыя. А мая цёця нейкі час жыла ў Палубінскіх, вучылася музыкі. А пасьля ў Менску ў 1916 г. мы з мамай выпадкова спаткаліся з Палубінскім на вуліцы. Ён з жонкай і дачкой былі бежанцамі. Дачку іх спаралiжавала — ляжала з безуладнымі нагамі. Мы з мамай пару разоў іх адведывалі.

Я сама ў іх у Малой Бобры (там быў яшчэ маёнтак Вялікая Бобра, аб уласьніках якога нехта злосна і несправядліва нахлусіў у "Ніве") не была, але ўсе казалі, што ў іх гаспадарка вялася вельмі блага, няўмела. Так што, хіба, мэзальянсу ў яе замужжы вялікага не было.

Прозьвішча Контрым таксама мне знаёмае. У Гродне ў гімназіі вучыўся Контрым з Вільні. Ён жаніўся з маёй школьнай каляжанкай.

Што да Шантыраў, то тут у Вільні нейкі Шантыр меў аптэку. А мой муж паходзіў са Слуцка. Ён ужо ў 1909 г. шмат друкаваўся ў "Нашай ніве". А пасьля ў "Вольнай Беларусі", у "Дзяньніцы"[1] і "Świetaču"[2]. Год таму зацікавіліся яго творамі. Сабралі ўсё, што друкавалася, а яшчэ ў архівах знайшлі рукапісы. Думалі выдаць, напісаўшы ўступны артыкул з яго біяграфіяй. Бо трэба дадаць, што ён быў выдатным дзеячом і сябрам Першага беларускага ўраду — як камісар па справах нацыянальных. Але з друку, напэўна, нічога ня выйдзе, бо замала матэр'ялу.

Вельмі непакоюся станам Алеся Мікалаевіча [Белакоза]. Я напісала ў Гродна да яго стрыечнага (цётчынага) брата Яўгена Канстанцінавіча [Петрашэвіча], але не адказаў ні слова. Аляксей Міхайлавіч П[яткевіч] выехаў на 4 месяцы ў Менск, ён таксама нічога ня піша.

Ужо некалькі дзён німа марозу. Цёпла. Да +4^{0}. Сьнег памалу сходзіць. Але яго так шмат, што сыйдзе яшчэ няхутка. А могуць яшчэ і маразы быць. Такая, як цяпер, пагода здароўю ня вельмі спрыяе. Галі страшна баліць галава, а мяне мучыць моцны радзікуліт.

Слаўка нарэзаў розных шчэпаў да веснавога шчапленьня і ў канцы гэтага тыдня будзе сеяць у скрыначкі насеньне нейкіх пазёмак, што прыслалі яму з Варшавы.

Пішаце, што ня трэба так шмат думаць аб с.п. сыне. А як жа можа быць інакш? Я па 10 гадзін удома адна. А тут усё на кожным кроку гаворыць аб ім. Кожны цьвік, кожная кніжка на полцы. Адна разрыўка мая — гэта кармленьне птушак: сінячкоў, дзятлаў, дзятлікаў і інш., якія зьлятаюцца нават на голас. Клічам іх, як куранят. Але і гэта раблю з памяцьцю аб сыне. Ён кожны вечар перад сном сыпаў ежу птушкам, каб, як толькі засьвітае, маглі спакойна пад'есьці. Што яму лепш, я ведаю вельмі добра. Але мне баліць.

Вельмі спачуваю, што ў Вас усё загінула. Мяне гэта бяда абмінула. Захавалася ўсё, нават лісты, нататкі, вершы з 1905–6 гадоў і далей. А вось кніжкі — бацькава бібіліятэка — прапалі. Бацька вельмі любіў і цаніў кніжкі. У сябе ў палку быў выбраны бібліятэкарам, якім працаваў 12 гадоў. Сабе зьбіраў творы расейскіх і польскіх пісьменьнікаў, усе выданьні. Кожны пісьменьнік меў іншага колеру палатняную вокладку. І ўсё прапала. Астаўся адзін том Сыракомлі[3].

Як мы выехалі з мамай у Менск, усё асталося ў дзедавым фальварку. А мамы сястра пазычала да чытаньня направа і налева, усім, хто хацеў. Дамагацца, каб вярнулі, і ня думала. Я і цяпер гэтага бацькавага багацьця шкадую. З такім замілаваньнем ён усё гэта зьбіраў!

Як жа я Вам зайздрошчу, што бачыце кросны і працу на іх. Ткацтва — гэта мой конік. Нават дзіўна — у нас у сям'і ўсе любілі даматканыя рэчы. Мая бабуля па маме, напрыклад, уважала, што добра сьпіцца толькі ў начной кашулі з тонелькага кужалю. Але самой работай ніхто не цікавіўся. А я — вельмі.

Адзін год (напачатку І-ай вайны), пасьля курсаў, я жыла ў дзеда. Папрасіла, каб пазволіў мне самастойна заняцца лёнам. Сеялі мала, абы крыху было. Дзед пазволіў. Я сама ўсё зрабіла: рвала, сушыла, абівала насеньне, пасьля лён мачыла, сушыла, мяла і часала. Навучылася прасьці. Але ўдаваліся добра толькі пакульле і пачасьсе, а кужалю аніяк не навучылася. Пасьля з пачасься, якое сама фарбавала, аснавала і выткала хаднікі.

Бачыце, які з мяне майстар? А колькі я мела сукенак, касьцюмаў з даматканых тканінаў! Нават едучы ў Варшаву на курсы, пашыла сабе такі касьцюм і 2 сукенкі. Пасьля мне маё знаёмства з пражай і ткацтвам прыгадзілася. Бо ў Менску ў Т[аварыст] ве помачы ахвярам вайны загадывала ткацкай майстэрняй. А перад тым выдавала бежанкам калаўроты, верацёны і лён. Сяньня пераглядаю свае нататнікі з таго часу. Там запісаныя прозьвішчы бежанак, іх адрасы, колькасьці выданага лёну і г.д.

Трэба канчаць. Хачу, каб Галя заўтра ліст укінула. А цяпер ужо позна. Пара піць гарбату. Галя і Слаўка выходзяць рана. Сяньня такі дзень, што Галя прыйшла і начуе.

Усяго Вам найлепшага! Пішыце. Шчырыя пацалункі і прывітаньні ад *Л.В.*

50. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

24 красавіка 1977 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Забяру Вам крыху часу, бо хачу парадзіцца ў адной справе. А менавіта: ці ў сваёй "Пчале" падаваць прозьвішчы выдатных пчаляроў? Ці бясьпечней гэта-

га не рабіць? А мо азначаць іх ініцыяламі? Магчыма, гэтых людзей даўно німа, але мо хто з іх у "нечым" замешаны? Ня ведаю, як лепш. Парадзьце, калі ласка. Я, праўду сказаць, у архівы "Пчалы" даўненька не заглядала і цяпер чуюся, як ар-хэалёг пры раскопках. Штораз натыкаюся на нейкія новыя, г.зн. забытыя факты.

Як бы гэта было добра, каб знайшоўся чалавек-энтузыяст старых часоў і захацеў дэтальна пазнаёміцца з рэакцыяй пчаляроў на стварэньне Т[аварыст]ва! Гэта адлюстроўваецца ў шматлікіх лістах, якія — ясна — у арты-кул увайсьці цалкам ня могуць, бо іх шмат. Так бы хацелася, каб гэтай тэмай нехта зацікавіўся і напісаў аб "Пчале" і "Борці" незалежна ад маіх успамінаў.

Шкада, што Вы, відаць, не змаглі заглянуць да мяне. Пабачылі б самі, што "Пчала" выклікала немалы рух сярод пчаляроў Гродзеншчыны, Беласточчыны, Наваградчыны і г.д. і як бы злучыла беларускую пчаляровую сям'ю. А што бе-ларускую — гэта відаць з лістоў. Ды і час заняцца "Пчалой" адпаведны: у на-ступным 1978 годзе — 50-годзьдзе яе нараджэньня! А "Пчала" і, як яе ня стала, "Бел[аруская] борць" існавалі 10 гадоў. Як на тыя часы — нямала...

І яшчэ: як зрабіць з перапіскай? Дагэтуль, калі я нешта пісала (рэчы кароткія), то пасылала пераважна І.У. Саламевічу проста рукапісы. Мушу да-даць, што чарнавікоў у мяне не бывае. Іван Уладзіміравіч перапісываў на ма-шынцы, рукапіс астаўляў у сябе, а мне прысылаў машынапіс, каб у разе, калі матэр'ял у друк не ідзе, я мела ў сябе сваю работу.

Для Вас гэта, хіба, завялікі клопат. То як зрабіць? Прыйдзецца, мусі, перапісаць самой... Вельмі хацелася б скончыць "Пчалу". Яшчэ шмат пісаць, а бываюць, на бяду, дні, калі чуюся вельмі дрэнна і пісаць не магу. Мо неяк выйдзе.

Чакаю ласкавага адказу. Усяго найлепшага! *Л.В.*

51. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

3 чэрвеня 1977 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Сорамна мне высылаць рукапіс у гэтакім непрыгожым выглядзе, але перапісываньне заняло б шмат часу. Апрача таго, вельмі блага чуюся і брацца за такую работу ня маю адвагі. Пасылаю так, як ёсьць.

Пісала на картках таму, каб можна было іх уклеіць у мае агульныя ўспаміны — падходзяць разьмерам. Калі, прачытаўшы, зробіце вывад, што гэта нечага вартае, і пастановіцца перадрукаваць на машынцы, то, калі ла-ска, рукапіс мне вярніце. Ведаю, што такога звычаю німа, але я ўжо другі раз не напішу, а гэта якраз канец маіх успамінаў.

Шкадую, што не пісала на адным баку, так як трэба. Але не падумала, а пасьля ўжо перапісываць не хацелася. Старасьць зрабіла мяне гультаём...

Пасылаю здымкі сяброўскай кніжкі і пару вокладак "Б[еларускай] борці". Мо спатрэбяцца, а не — захавайце. Думаецца мне, што, хіба, мала хто аб Т[аварыст]ве "Пчала" і аб "Б[еларускай] борці" ведае. Няхай гэтыя здымкі бу-дуць доказам, што яны сапраўды існавалі, а ня ў снах я іх бачыла.

У такія ўспаміны ўсяго ня ўпішаш. Толькі пераглядзеўшы лісты пчаляроў у "Б[еларускай] борці", асабліва паштовую скрынку, можна сабе ўявіць настроі пчаляроў і працу арганізацыі ды рэдакцыі. Скончыла я пісаць акуратна да чэр-веня — 31 траўня. Толькі з высылкай затрымалася.

Усяго найлепшага! Чакаю весткі або і Вас асабіста. З прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

52. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

15 ліпеня 1977 г. Вільня.

Дарагі Валодзя.

Вось як у мяне, паміма найлепшай волі, спазьняюцца адказы. Шмат работы на гародзе, а вынікі з прычыны зьменаў пагоды марныя. Вось адсюль і перамучаньне, і дрэнны настрой. Без канца зьмены: то суха ды пячэ, то холад, то льюць дажджы празьмерна. А сяньня ізноў пахаладнела, хмарна... Гэта і на здароўі адбіваецца. Вам там у бары дождж таксама, напэўна, даўся ў знакі? Але Вы ўсе маладыя, гэта нічога. Я калісьці, у маладосьці, нават любіла ў дождж, а то і ў буру пайсьці ў поле, на сенажаць, зьнікнуць, надыхацца парным паветрам.

Добра, што берацеся пісаць. Трэба набірацца практыкі, раскручваць здольнасьці. Я ўсё перачытываю (і Слаўка таксама) Янкі Брыля[1] "Жменю сонечных промняў" і "Акраец хлеба". Люблю яго лірычныя замалёўкі. Коратка, а сколькі глыбокіх думак, сколькі выяўляецца ўніклівага нагляданьня ў наваколье. У "Акрайцы хлеба" вельмі добры рэпартаж з Балгарыі. Апавяданьні менш мне падабаюцца... У нашай літаратуры вельмі не хапае добрых рэпартажаў. Хоць бы з уласнага краю.

Я Вам пісала аб мэмарыяльным помніку Максіму Багдановічу ў Ракуцёўшчыне. Ня помню, ці пісала, што ўвосені думаюць ладзіць сьвята паэзіі Багдановіча і навокал помніка зьбіраюцца закласьці невялікі парк: кожны з пісьменьнікаў пасадзіць дрэўца... Гэта добрая думка, і я думаю, што варта было б і студэнтам-філёлягам да гэтага далучыцца.

Ёсьць праект ставіць мэмарыяльныя дошкі ў былых дамах, вёсках, скуль паходзілі і дзе жылі старыя пісьменьнікі, напрыклад, Ядвігін Ш.[2], К. Каганец[3] і г.д. Добра, што ёсьць людзі, асабліва адзін чалавек, які поўны добрых думак і праектаў, і нястомна ўводзіць іх у жыцьцё.

Ёсьць і сьвежыя страты ў нашым грамадзянстве. 29 мая памёр стары беларус-аграном Янка Пачопка. Шмат карыснага зрабіў у сваім жыцьці. Яму было 87 гадоў. Маю яго аўтабіяграфію, некалькі лістоў і пару кніжак — "Пчолы" і "Агародніцтва".

Слаўка мае час ад часу па некалькі дзён вельмі напружанай працы па 2 зьмены без перарыву. За гэта дастае пару вольных дзён. Выкарыстоўвае іх на працу на агародзе.

На сяньня хопіць. Дачка ідзе ў горад, хачу, каб ліст выслала. У мяне сабралася цэлых 10 лістоў, якія ляжаць без адказу.

Усяго найлепшага. Зычу плённай працы. *Л. Войцікава.* Ад Слаўкі — прывітаньне.

53. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

22 ліпеня 1977 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Бандэроль атрымала — шчыра дзякую. Яшчэ ўважліва не прачытала. Што прыйдзецца Вам папраўляць правапіс, я, безумоўна, ведала, хоць, праўду кажучы, ня ўсё мне ў сучасным правапісе падабаецца.

Што да "Б[еларускай] борці", я ведаю і згаджаюся, што трэба было б аб ёй сказаць больш. Але гэта рэч, так сказаць, далікатная. Бачыце, справа ў тым, што я яе рабіла адна. А хто цяпер пры цяперашніх рэдкалегіях у гэта паверыць? Скажуць — маніць і хваліцца.

М. Манцэвіч[1] пісаў артыкулы-заклікі і час ад часу стараўся аб грошы. Дзе і як — я не цікавілася, бо тады чым менш ведаць, тым было бясьпечней. Але фаховы бок — адміністрацыя, карэспандэнцыя, карэкта — усё гэта я рабіла сама. Зрэшты, паглядзіце самі архівы "Пчалы" і "Б[еларускай] борці". Пасьля была створаная рэдкалегія, але яна існавала толькі на паперы. А дзеля таго, што туды ўвайшлі людзі, аб якіх "не ўспамінаецца", я аб гэтым змаўчала. Хоць у сваіх успамінах для сябе — дадам. Прыедзеце — пагаворым, парадзімся.

А шукайце мяне ў маёй старой хаце. Я заўсёды, усё сваё жыцьцё цярпець не магла гораду. Асабліва цяпер, калі я па 8–10 гадзін у дзень астаюся адна — пакуль унук ня вернецца з працы, або ня прыйдзе дачка, то толькі тут магу вытрымаць.

Маю работу на гародзе, катоў, сабаку, ды і птушкі лётаюць. А што я магла б рабіць у гарадзкой клетцы?

Усяго Вам найлепшага — *Л. Войцікава.*

54. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

[12 жніўня 1977 г.]

Дарагі Валодзя.

Спаўняю Вашую просьбу — пасылаю адказ на анкету. Ня вельмі добра напісала, але самапачуцьцё благое, цяжка думаць.

Што да ўспамінаў, то яны ў рукапісах. Усё перадрукаваць немагчыма, бо была б цэлая кніжка... Толькі апошняя частка[ўспамінаў] "Беларускае каапэратыўнае пчалярскае таварыства "Пчала" і яго орган "Беларуская борць" перадрукавана на машынцы, бо, можа, гэта яшчэ вялікае пытаньне, будзе надрукавана. Калі не надрукуюць, то, магчыма, Сяргей Міхайлавіч [Новік-Пяюн] аформіць так, як гэта рабіў з іншымі маімі працамі. Тады прачытаеце.

Дзякую за ліст і за весткі аб сваім "вайсковым жыцьці". Слаўка сьмяецца, што ў Вас шмат лягчэй, чым было ў іх. Бо і адпачынак быў, і ў лес свабодна ходзіце... А яны сядзелі за дратамі, а калі ішлі ў лес, то нелегальна.

Усяго добрага! *Л. Войцікава.*

1. Улюбёны пісьменьнік — Янка Брыль. Люблю асабліва яго лірычныя запісы. Гэты жанр пазбаўлены штучнай апрацоўкі — шліфаваньня. Думкі плывуць проста з сэрца.

2. Самы памятны дзень? Цяжка сказаць... Мо дзень выхаду "Батанічнага слоўніка"? Мо 1-га нумару "Заранкі" або "Беларускай борці"?

3. Што можна дадаць да слоў Фр. Багушэвіча: "Не пакідайце мовы роднай,

каб ня ўмерлі...”? Ці не да гэткага канца даходзім? Скажуць: столькі друкуецца часапісаў, столькі выходзіць кніжак... Аўтары атрымліваюць плату “ад радка”, а ўдома, у сям’і сваёй мовы не ўжываюць. Зразумела, ня ўсе... Але шмат, шмат...

Было так. У Вільні праходзілі Беларускія дні. Прыехала дэлегацыя з Менска (прозьвішчы не падаю...). Яе спаткаў літоўскі пісьменьнік прамовай па-літоўску і па-беларуску. Прадстаўнікі беларускай дэлегацыі адказалі па-расейску! Ці ж не зганьбілі сябе? Горка і сорамна пры адной думцы аб такой падзеі...

Яшчэ. Стары беларускі культурны дзеяч прыехаў у Вільню. Па-беларуску гаварыў, а як жа, але толькі ў памяшканьні пры зачыненых дзьвярах! На вуліцы, у аўтобусе, у таксі гаварыў па-расейску. Саромеўся сваёй мовы? Ці гэта не вядзе да сьмерці мовы і народу?

Надзея на моладзь! Можа, моладзь пакажа сябе больш адважнай, больш прынцыповай, ахвяруе ўсе свае сілы на захаваньне Роднай Мовы, культуры, а тым самым — Жыцьця Народу.

Л. Войцікава (Зоська Верас).

55. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

26 лістапада 1977 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

У маіх успамінах аб “Пчале” і “Бел[арускай] борці” німа рэцэнзіі на “Борць”, зьмешчанай у польскай пчалярскай часопісі “Bortnik postępowy”. А німа таму, што той нумар у мяне прапаў. Сяньня я атрымала тую рэцэнзію ад Алякс. Бэргман, якая яе для мяне перапісала ў бібліятэцы Narodowej. Упісываю рэцэнзію ў сябе, пасылаю і Вам. Няхай будзе.

Гэта ня толькі добрыя думкі аб “Бел[арускай] борці”, але і доказ, што былі дарогі, па каторых можна было ісьці разам з палякамі — у згодзе і ва ўзаемным зразуменьні.

Што ў Вас чуваць? Усяго найлепшага — *Л. Войцікава.*

56. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

9 сьнежня 1977 г. Вільня.

Дарагі Валодзя.

Ужо два тыдні, як я Ваш ліст атрымала, а адказаць усё не было як. Найбольш перашкаджаюць розныя хваробы і болі. І нідзе ад іх ня дзенешся. Да таго яшчэ трэізноў пасыпаліся лісты з усіх бакоў з markdownрознымі сьпешнымі справамі. На іх то трэба адказываць у першую чаргу. Гэта абавязак старога чалавека, які мае абавязак дзяліцца з людзьмі ўсім, што ведае і што помніць. Трэба прызнацца, што і мне людзі памагаюць.

Я Вам, здаецца, пісала, што скончыла ўспаміны аб Беларускім пчалярскім Таварыстве і г.д. Не хапала мне да іх адной цікавай рэчы. Як пачала выходзіць часопісь “Беларуская борць”, мы яе пасылалі на абмен у розныя пчалярскія часапісі: украінскія, чэшскія, польскія...

З вялікім здаволеньнем пабачылі ва ўкраінскай і адной польскай вельмі прыхільныя рэцэнзіі. Украінскі часапіс маю і магла гэтую рэцэнзію

ў свае ўспаміны ўставіць, а вось польскі, якраз гэты нумар, недзе згубіўся. Я напісала ў Варшаву да гр. Аляксандры Бэргман, з якой знаёмая асабіста. Вы яе, напэўна, па артыкулах у "Ніве" ведаеце. І вось яна не пашкадавала часу, пашукала ў варшаўскіх бібліятэках, знайшла той нумар, рэцэнзію на "Беларускую борць" перапісала і мне прыслала. Я ёй вельмі ўдзячная. Магла свае ўспаміны папоўніць цікавым фрагмэнтам. Вось так і пляцецца маё жыцьцё.

А Вам ужо нядоўга астаецца працаваць у школе. А што тады? Праца над дыплёмнай? Ці ня ведаеце, што там чуваць у Сяргея Міхайлавіча [Новіка-Пеюна]? Вельмі даўно ня маю ад яго весткі. Дзе ён? Маўчыць таксама і М. Забэйда. На мой апошні ліст не адказаў... Аж неспакой за яго.

Пішыце. Усяго Вам найлепшага. *Л. Войцікава.*

57. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

12 сьнежня 1977 г.

Паважаны Адам Язэпавіч.

Ліст Ваш атрымала. Дзякую за прапанову. З усіх маіх успамінаў найбольш бясьпечны матэр'ял — гэта "Беларускае пчалярскае каапэратыўнае т[аварыст]ва "Пчала" і яго орган "Беларуская борць". Усё абапёртае на фактах, на існуючых архівах, лістах пчаляроў і г.д.

Усё разам абымае час ад сакавіка 1928 г., калі быў зацьверджаны статут, да мая 1938 г., калі выйшаў апошні нумар "Бел[арускай] борці".

Гэтая частка ўспамінаў абдуманая, але яшчэ не напісаная. Калі Вам такі зьмест адпавядае, калі ласка, напішыце. Тады вазьмуся пісаць.

Цяпер канчаю біяграфіі (11) тых людзей, якіх ніхто не ўспамінае і ня ўспомніць, а якія нямала рабілі для нашай справы. Няхай біяграфіі ляжаць. Мо каму з дасьледчыкаў спатрэбяцца.

Мо бываеце ў Вільні? Калі ласка, загляніце да мяне. Прыемна было б спаткацца з тым, хто ведаў і добра ўспамінаў майго с.п. сына.

Усяго найлепшага. Чакаю весткі — *Л.В.*

58. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

14 студзеня 1978 г.

Дарагі Іван Уладзіміравіч.

Шчыра дзякую за кніжку. Віншую з такой удалай і так добра выданай працай. Вельмі эстэтычна аформленая. З прыемнасьцю прыпамінаю прачытаныя раней балады і знаёмлюся з новымі для мяне.

Ці паслалі Вы кніжку ў Гудзевіцкі музэй? Яны былі б вельмі ўдзячныя. Гудзевіцкая школа — адна з нявельмі шматлікіх, дзе пануе родная мова.

У нас так бела, як даўна не было, і ўсё падае сьнег, густы і дробны. Цёпла. Як Вы і сям'я перажылі маразы? Ці цёпла было ўдома? Мы іх ня вельмі адчулі — Слаўка добра паліў печы.

Усяго найлепшага Вам і сям'і. *Л.В.*

59. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

25 лютага 1978 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую за ліст і за кніжку. Прачытала яе адным духам. Знайшла знаёмае прозьвішча — Козіч. Быў такі ў Менску на Вайсковым зьездзе, а пасьля ў Вайсковай Радзе. Ён з Гродзеншчыны, таму мы зь ім як землякі сябравалі.

Зацікавілі мяне анкеты ў школах. Пішаце, што дзеці ведалі "Дудку", "Смык", а нават "Скрыпку". А цікава, ці мелі ўяўленьне аб выдавецтвах 20–30 гадоў у Вільні? Бо я спаткалася з такім зьявішчам, што моладзь з Жупранскай школы імя Багушэвіча вельмі была зьдзіўленая, што ў Вільні падчас польскай "акупацыі" ў 1923 г. выйшла "Хрэстаматыя беларускай літаратуры" М. Гарэцкага! "Як гэта магло быць?" — пісалі мне. Дадавалі: мы ад сваіх бацькоў і дзядоў крыху чулі, што ў Вільні выходзілі беларускія газэты, але ў школе аб гэтым не гавораць... Цікава, ці гэта загад, ці "добрая воля" школьных мясцовых уладаў?

Рада буду, калі Вам удасца асабіста вярнуць мне рукапіс. Хацела б зацікавіць Вас працай менскага аддзелу Т[арыст]ва помачы ахвярам вайны.

Ці можна ведаць, хто ўвайшоў у рэдкалегію задуманай кніжкі?

Усяго добрага! *Л. Войцікава.*

60. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

29 лютага 1978 г. Вільня

Дарагі Іван Уладзіміравіч.

Дзякую за прывітаньне з Друскенікаў. Роўна 65 гадоў таму і я была там. Тыдняў шэсьць жыла са сваёй мамай у кутку Друскенікаў, які называўся Паганка. Ванны мне не памагалі, а аслабілі, і мой гродзенскі доктар, які таксама прыехаў у Друскенікі, адправіў мяне дахаты, у дзедавыя Альхоўнікі, і загадаў прыняць 10 ваннаў kwaso-węgielowych[1]. Вось гэта было лячэньне! Ніколі нічога мне так добра не памагло, як тыя ванны...

Але ўспаміны нецікавыя ні для Вас, ні для мяне. А цяпер асабліва німа чаго імі займацца — пры неспадзявана пагоршыўшымся здароўі. Тыдзень таму прыйшлося выклікаць хуткую дапамогу — быў вельмі высокі ціск — 230 на 110. Зьбілі яго ўколамі ненадоўга. Сяньня быў доктар — 210 на 90. Лекі, лекі... Мо што паможа.

Добра тое, што і Галя, і Слаўка ў адпачынку, і ■ не адна. Нельга нахіляцца і г.д, а я ж так не люблю быць без работы. Мука... А як гэта Вы думаеце падлячыцца — узяўшы з сабой работу? Ці ня лепш было б адпачыць на 100%?

Што да Рыгі, то я там нікога знаёмага ня маю. Пыталася Лявона [Луцкевіча] — таксама нікога ня ведае. Хіба, прыйдзецца каму-небудзь паехаць. Фартушок атрымала даўна. Дзякую за помач, за клопаты. Яшчэ не адаслала ў Гудзевічы, бо ня ведаю, хто там цяпер ёсьць. Гэтак званая Рада музэю (савет) разьехалася. А. Белакоз хворы, здаецца, ізноў у шпіталі, а яго дачка, хіба, яшчэ ў Гродне. Яна вучыцца ў Пэдінстытуце. Сьпішуся з ёю. Як будзе ўжо напэўна экспанат удома — адашлю.

Ці доўга будзеце ў санаторыі? Мо, варочаючыся, заедзеце? Усяго найлепшага. Добрай і трывалай паправы здароўя зычу Вам шчыра. Ад маіх — прывітаньне. Шлю паклон майму дарагому Нёману...

Л.В.

61. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

26 сакавіка 1978 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за цікавыя весткі. Вось жа мой *бацька* (Вы, напэўна, помніце, што Я. Лявіцкі — Юрка Снапко — быў маім сцэнічным *бацькам*) нічога не казаў, што друкуецца ў часапісе "Пед[агогическое] дело"[1]. Гэта вельмі цікава. Ці можна б Вас прасіць пару беларускіх вершаў ці хоць загалоўкаў, каб дадаць да яго бяіграфіі ў маіх успамінах аб ГГБМ? Магчыма, што гэтыя ўспаміны будуць надрукаваныя, хоць пэўнасьці німа. Хацела б тое-сёе дапоўніць, закончыць.

Чуюся вельмі дрэнна. Моцна завастрылася хвароба страўніка — нічога не памагае. Таму сьпяшаюся, каб аставіць усё ў магчымым парадку. Весткі аб сьмерці маіх амаль аднагодкаў (Р.Р. Шырма) не паляпшаюць настрою.

Найгорш, калі я адна ўдома. Дачка стараецца прыходзіць як найчасьцей, але ж не заўсёды можа. Толькі як ужо дачакаюся ўнука з працы, адчуваю, што маю апеку і помач. Але на гэта трэба чакаць 8–10–11 гадзін.

Што да "Коласа бел[арускай] нівы" — у ім (калі не памыляюся) 15 старонак канцылярскай паперы. Мы яго назвалі аднаднёўкай, таму што выйшаў адзін раз. Што такі назоў па тэорыі не падыходзіць — хто ж з нас тады разьбіраўся? У кожным выпадку ні газэтай, ні часопісам, хіба, назваць нельга?

Я "Коласа..." яшчэ ня маю. Я. Саламевіч паказаў мне і забраў, каб перадрукаваць на машынцы (узяў таксама і ўсе мае ўспаміны — цэлы сшытак). Гэта было ў канцы сьнежня. Дагэтуль ня даў знаку жыцьця. Я ведаю, што ён страшэнна запрацаваны, але я чакаць далей ня маю часу. Хацела б "Колас..." мець у руках.

Паміж іншым, у "Коласе..." Я. Лявіцкі свае працы падпісаў *Дзядзько* (*Dziadzko* — "Колас..." пісаны лацінкай). І Вам бы хацела копію пасланць. Я прасіла Я. Саламевіча, каб дагаварыўся з С. Новікам і папрасіў яго аформіць "Колас..." так, як С. Новік рабіў з іншымі маімі работамі.

Тым часам нешта С. Новік маўчыць ужо ад Новага году. Нечага пакрыўдзіўся на мяне, відаць, бо нават з Вялікаднем не павіншаваў, а раней кожны год прысылаў сваёй работы паштоўку з Велікодным яечкам. Іх у мяне цэлая калекцыя. Непрыемна, калі, канчаючы жыцьцё, астаўляеш неспадзяванага ворага. А чаму? Не разумею...

Праца А. Бэргман вартая як найбольшай увагі. Шкада толькі, што ўкралася некалькі дробных памылак. Але гэта няважна. Бо з цяперашніх чытачоў, хіба, ніхто не зарыентуецца.

Твору У. Калесьніка[2] ня бачыла, хоць чула нямала. А не назваў ён там нікога "дэфэнзыўшчыкам"? Не магу дараваць яму такога абвінавачваньня Макара Косьцевіча.

Я, нарэшці, дастала фота Ластоўскага і маю цяпер рэдакцыю "Нашай нівы" ў поўным складзе.

Хоць вельмі халодная, але надыходзіць вясна. Вылезьлі белыя падсьнежнікі і пралескі. Днём +6, уночы мароз –4. Зьбіраюся сеяць памідоры, але ня ведаю, ці дам рады.

Бывайце. Усяго найлепшага Вам у жыцьці і працы! Вашым — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

62. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

28 сакавіка 1978 г. Вільня

Дарагі Адам Язэпавіч.

Дзякую шчыра за сьвяточныя пажаданьні. А я дагэтуль так і ня ведаю, ці Вы традыцыйна сьвяткуеце Вялікдзень ці не? Я люблю ўсе старыя традыцыі і стараюся іх захоўваць.

Дзякую таксама за добрую вестку. Прыемна, што Вы з сябрамі знайшлі такі выхад. Цікава было б мне ведаць, ці тая "ўпартая" рэшта — расейцы, ці, як мы калісь такіх называлі, "тоже белоруссы"?

Цікавыя весткі маю з Гудзевіч — аб працы іх музэю. Ёсьць перамены на лепшае. Прынамсі, німа адкрытых перашкодаў. А.М. Белакоз паміма цяжкой хваробы не пакідае працы.

А цяпер да Вас пытаньне. Даю яго ўсім-усім, а мо ад каго-небудзь атрымаю канкрэтны адказ. Ці Вы, працуючы ў віленскіх архівах, не спатыкалі адрэсы друкарні Марціна Кухты[1]? Ведаю ад Г. Кісялёва, што ў 1914–17 гадах яна была на вул. Татарскай, 20. А пасьля? Г. Кісялёў радзіць шукаць у архівах даведнікаў з 20-х гадоў. Але тут у нас німа каму рабіць такіх пошукаў. А мне вельмі хацелася б выясьніць гэтую супярэчлівую справу. Вы, напэўна, здагадываецеся, чым выклікана маё пытаньне...

У кніжцы "Rzecz o B. Taraszkiewiczu"[2] аўтарка падае, што друкарня М. Кухты была разам з рэдакцыяй ТБШ і г.д. на Віленскай, 12, кв. 6. Я там працавала 5 гадоў — ад канца 1923 г.— і ніколі нічога падобнага ня чула.

Пыталася тых, хто ў рэдакцыі часта бываў,— таксама аб друкарні пад гэтым адрасам ня чулі. Дадаю, што А. Бэргман такую вестку атрымала ад Веры Андрэеўны[3] — першай жонкі Тарашкевіча. На маё пытаньне В.А. тлумачыцца "слабой памяцьцю". Мне здаецца, што гэтую справу трэба неяк выясьніць дакладна. Друкарня М. Кухты для нас — гістарычная.

Маё здароўе моцна пагоршылася. Вось і сьпяшу...

Усяго найлепшага — *Л. Войцікава.*

63. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

29 сакавіка 1978 г. Вільня.

Дарагі Валодзя.

Даўно я Вам не пісала. Усё не хапае часу, а калі ёсьць час, то заняты барацьбой з рознымі недамаганьнямі. Гэта зусім натуральна, я думаю, у мае гады.

Як палічыла сяньня, то за 3 месяцы сёлетнія атрымла больш як 100 лістоў, і то пераважна з рознымі пытаньнямі на самыя неспадзяваныя тэмы. Пытаюцца аб справах 1916, 17 гадоў, аб 1919–20, 21 і г.д. Чаго ня помню, шукаю ў лістах тых часоў, а часам пішу да іншых людзей, прашу інфармацыі. Усё гэта забірае шмат часу, увагі, клопатаў. А адмовіць нельга нікому, тым больш, што ў некаторых выпадках ня маюць людзі каго пытацца. Вось як дрэнна так доўга жыць... ды яшчэ шмат ведаць.

Ці Вы чыталі "Маладосьць"[1]? У апошнім нумары ў пераглядзе маладых пісьменьнікаў ўспамінаецца і Ваша прозьвішча. Аўтар піша, што ў Вадым апавяданьні "Стрэл дуплетам" "прарэзываецца нейкі свой, непадобны на іншыя голас". Вось гэты "свой, непадобны на іншыя голас" уразіў і мяне.

І ўсё думаю — чаму Вы ня пішаце, чаму не падаеце таго свайго "іншага" голасу? Унясьлі б нешта новае, сьвежае да нашай вельмі ж ужо аднастайнай літаратуры. Або вайна, партызаны, або калгасы з іх старшынямі і даяркамі... Ды яшчэ ўсё расьцягнутае, да немагчымасьці шматслоўнае. Чытаеш, чытаеш і так хочацца сказаць аўтару: пішы карацей, больш сьцісла, кампактна!

Ведаю, што Вашы жыцьцёвыя ўмовы не вельмі спрыяюць творчай працы. Але час ідзе, гады ўцякаюць. Нельга іх траціць. Пішыце хоць нешта дробнае. Замалёўкі з паездак: нейкія цікавыя тыпы, нейкія пэйзаж — усё можа быць тэмай. Гэта добры трэнінг. Выбачайце за такі павучальны тон, але мне сапраўды шкада Вашых здольнасьцяў, Вашага "непадобнага да іншых" голасу.

Вось якая радасьць чакае Вас! Хлопчык! А мо якраз ня хлопчык, а дзяўчынка? Адно ці другое — радасьць для бацькоў. Шчыра, шчыра зычу Вам, каб усё было добра, шчасьліва.

Даруйце, што так доўга маўчала, і пішыце. У нас усё па-старому. Кожны заняты сваёй працай, сваімі абавязкамі. Надыходзіць вясна, значыцца, і працы, і абавязкаў будзе больш. Мо я і сёлета яшчэ памагу сваім на гародзе, хоць бывае, што чуюся дрэнна і адпадае ахвота чым-небудзь займацца.

Усяго Вам абаім найлепшага! З прыязьню — *Л. Война*

64. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

11 мая 1978 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Думаю, што нехта будзе пісаць рэцэнзію на кніжку Л. Арабей[1] "Стану песьняй". Магчыма, напішаце Вы, а мо нават ужо напісалі. Усё роўна на Вашыя рукі пасылаю некалькі заўваг, якія тычацца першых старонак кніжкі. Вядома, ні паэзіі Цёткі, ні яе рэвалюцыйнай дзейнасьці не бяру пад увагу, на гэта ёсьць спэцыялісты.

Але, пачаўшы чытаць, адразу зь першых старонак пачала выпісываць ляпсусы, бо абмінуць іх немагчыма. Некаторыя сказы цяперашняму пакаленьню могуць паказацца адлюстраваньнем "дзікіх" паглядаў тых часоў. А па праўдзе, гэта непаразуменьне, дапушчанае аўтаркай.

Падаю заўвагі па чарзе — па старонках.

Стар. 9.— Ня *Война*, а *Вайцех* (па-беларуску).

Стар. 13.— *Залацілася лістамі сьліва...*— Чаму гэта залацілася?

Стар. 14.— *Ксёндз трымае крыж над галавой...*— Гэта, мусіць, апісана, як дзеці да споведзі прыступалі? Калі які пробашч сам прыгатаўляў дзяцей да споведзі (першай), то зьбіраў іх на касьцельным панадворку або ў плябаніі. Вучыў катэхізму, тлумачыў, што ёсьць грэх і г.д. Ніякага крыжа над галавой не трымаў і аб котках не гаварыў у дзень споведзі.

Стар. 15.— *Пасьля першага прычасьця дзеці лічыліся дарослымі...*— Чаму прычасьця? Гутарка аб дзецях каталіцкіх, значыцца — пасьля першай споведзі або першай камуніі. Аўтарка зблытала першую споведзь з канфірмацыяй. Да споведзі ішлі дзеці ў 7–8–9 гадоў, а да канфірмацыі дапускалася моладзь у 16–17 г. Прытым, канфірмацыя ў каталікоў не існуе, а толькі ў пратэстантаў.

Стар. 15. *Нягледзячы на тое, што ўсе былі пісьменныя і лажыліся і ўставалі з малітваю...*— Значыцца, мільёны веруючых людзей — непісьменныя? Што мае адно да другога? Далей.— *Алаіза гадавалася ў строгай рэлігійнасьці... цалавала ў знак пашаны руку бацьку і маці...*— Пры чым тут рэлігія?

Стар. 23.— *Была вуліца Сабачая...*— Ніколі ў Вільні такой вуліцы не было. Была і ёсьць вуліца Субач. Пры якой, паводле А. Кіркора[2], на рагу Бакшты пры вежы жыў кат. Але гэта было ў XV–XVII стагоддзях! А калі гутарка аб лоўлі сабак (іх лавілі гіцлі), то пры чым тут здраднікі і шпікі? Адно другога не трымаецца.

Стар. 24.— Не разумею, чаму трэба казаць не *Катэдра*, а *Кафедральны сабор*. Гэта ж не царква.

Стар. 28.— Паводле мяне, на Беларусі ніколі *скамарохаў* не было. Батлейку насілі *батлейшчыкі*. Я ў Сакольшчыне запісывала словы батлейкі, як яшчэ была ў гімназіі. А ў Менску ў 1917 г. мы адшукалі на правінцыі старога батлейшчыка, прывязьлі ў Менск (зразумела — з батлейкай) і на Захараўскай, 24 у "Беларускай кнігарні" цэлы тыдзень ладзілі яго выступленьні.

Стар. 73.— Дзівяць моцна словы: *Навошта вы на майго бацьку дарма працуеце.*— Чаму дарма? Тады ж ужо паншчыны не было. Таксама: *А. цярпела ў Пецярбургу холад і голад.*— Гэта пры сотнях дзесяцін, што меў бацька? Для мяне гэта дзіка. Мой дзед (па матцы) меў усяго 35 дзесяцін. Доўга браў у арэнду маёнтак гродзенскага архірэя. А між тым сын (мой дзядзька) скончыў у Пецярбургу Лясны інстытут, мая маці — пэнсію ў Кракаве, а сястра мамы — курсы бугальтэрыі ў Варшаве і вучылася музыцы ў Гродне. І ніхто галодны ня быў. Як гэта зразумець?

Стар. 74.— Успамінаецца біскуп *Эдуард Рап*. Памылкова — быў біскуп Э. Роп[3]. Драбязы яшчэ на пару старонак хапіла б. Але і гэтага хопіць. Прыкра падумаць, што кніжка, напэўна, ужо ў Польшчу пасланая. Як гэта ўсё прымуць? Пасьмяюцца? Ґонару гэта беларускаму выдавецтву ня зробіць.

Вельмі хочацца мне ведаць Ваш пагляд. Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

65. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

3 чэрвеня 1978 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Ліст Ваш атрымала — дзякую. А я і ня думала, што Вы ў рэцэнзіі зможаце закрануць гэтыя пытаньні. Калі б і закранулі, то іх не прапусьцілі б. Ведама, чым гаворыцца горш — тым лепш.

Не падумайце, што я нейкая дэвотка ці вельмі набожная. Ніколі такой не была ў жыцьці. Але талеранцыю, а перадусім праўду, маю ў крыві. Ня ведаю, ці варта аўтарцы гаварыць аб маіх заўвагах. У нас з ёю ўжо было падобнае "спатканьне".

Калі выйшла ў сьвет першая кніжка М. Машары, я напісала і паслала ў "ЛіМ" (мне так парадзілі) некаторыя спраставаньні — "Праўда аб рэдакцыі грамадаўскай прэсы, яе супрацоўніках і арганізацыі працы". "ЛіМ" пераслаў у "Полымя" — вы надрукавалі, вы і адказывайце. (Праўда, гэта была яшчэ ня кніжка, а часьць яе, надрукаваная ў "Полымі".) Вось я і атрымала ліст ад Л. Арабей, у якім яна пісала, што гэта раман, і аўтар меў права карыстацца сваёй фантазіяй. Галоўнае — каб "праўдзіва была адлюстраваная эпоха".

Я адказала: "Не разумею Вашай лёгікі. Як можа быць праўдзіва адлюстраваная эпоха, калі ўсё апіраецца на непраўдзівыя факты?". Так што цяпер яна, напэўна, маіх заўвагаў не прыме. Зрэшты — ня важна. Вы са мной згадзіліся — і хопіць. Ведаю, што маю рацыю.

А як з *Сабачай вуліцай*? І сьмех, і грэх. Мае хатнія сьмяяліся, а мне ня так ужо

і сьмешна. Прыкра бачыць такую абыякавасьць пры падаваньні вестак. Проста непашана да чытача, які быццам мала разумее і ўсё прыме.

Аб назове альманаха і іншых зьвязаных з ім справах ведаю ад Янкі Саламевіча. Але чаму "Белая вежа"? Гэта ж беластоцкі альманах называецца "Белавежа".

Не магу зразумець у Вашым лісьце аднаго. Калі сабраліся ў Л[ідзіі] Іванаўны [Збралевіч] усе часткі перакладу "Пана Тадэвуша"[1], — гэта вельмі добра. Але Вы пішаце: "У тым і Ваша (заслуга)". Я ніколі ня мела нічога супольнага ані з гэтым перакладам, ані з Тарашкевічам. Так прычым тут я?

Крыху я заблыталася, кажучы, што з Т[арашкеві]чам ня мела нічога супольнага. Я яго ведала яшчэ з 1917 г. Але гэтае знаёмства з розных прычынаў было вельмі далёкае і ў некаторых выпадках з канфліктамі.

Горача, суха і вялікія вятры — усё дрэнна адбіваецца на маім старым сэрцы.

Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

66. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

17 ліпеня 1978 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч[1].

Сяньня толькі прынясьлі мне Ваш ліст. Сьпяшаюся адказаць, каб пацьвердзіць словы Мікалая Міхайлавіча [Марцінчыка] [2]. На жаль, мала скарыстаеце з майго адказу. Я Цёткі зусім ня ведала. З Ядвігіным Ш., праўда, была добра знаёмая у працягу 3 гадоў у Менску — ад восені 1915 да паловы 1918 г. Бачыліся, працуючы ў Камітэце Т[аварыст]ва помачы ахвярам вайны амаль кожны дзень, але не перапісываліся, і ніякіх дакумэнтаў-памятак з таго часу ня маю. Але з дачкой яго Вандай Лявіцкай-Лёсікавай перапісывалася аж да яе сьмерці.

Аб тым, што Ядвігін Ш. працаваў у Радашкавічах памочнікам правізара, Вы ведаеце. Мэдыцынскай практыкай ніколі не займаўся, калі не лічыць, што сам лячыў сваю сям'ю — дзяцей і, магчыма, я так думаю, ня раз служыў радай суседзям-сялянам. Перагледжу лісты яго дачкі Ванды, мо на гэтую тэму штонебудзь знайду.

А вось у Менску ў працы з бежанцамі ён неяк ніколі сваёй мэдычнай веды скарыстаць не хацеў. Прыходзілася мне самой маленькую помач даваць: ставіць банькі, лячыць раны пакалечаных у дарозе ног. Магла гэта рабіць, бо скончыла кароткія 6-тыднёвыя санітарныя курсы ў Варшаве ў 1913 г.

Наша беларускае Т[аварыст]ва помачы ахвярам вайны было такое беднае, што на лекара нам не хапала. Мушу сказаць, бо гэтага ніхто нідзе не ўспамінае, што родны брат Каганца — Кастравіцкі — быў ваенным доктарам, і калі нейкі час быў у Менску, шмат памагаў фаховымі парадамі і зарганізаваў адумысловую аптэчку для Беларускага дзіцячага прытулку.

Але ёсьць у мяне іншая справа. Калі Вы чытаеце лекцыі па гісторыі мэдыцыны, то, напэўна, закранаеце і лячэньне лекарскімі зёлкамі, і значэньне зёлак у народнай мэдыцыне? Калі так, то, можа, Вас зацікавіць, што ў 30-я гады існуючае ў Вільні Бел[арускае] каапэратыўнае пчалярскае т[аварыст]ва "Пчала" ладзіла карэспандэнцыйныя курсы па збору лекарскіх зёлак.

Апошняя частка маіх успамінаў якраз аб т[аварыст] ве "Пчала" і яго органе "Беларуская борць", дзе гаворыцца і аб гэтых курсах, будзе друкавацца ў аль-

манаху ў Менску. Але гэта няхутка будзе. Вельмі марудзяць.

Калі толькі Вас гэтая справа цікавіць, прышлю Вам рукапіс, здаецца, маю і машынапіс. Чаму пішу — здаецца, маю? Справа празаічная — робіцца рамонт часьці дома, і не магу дабрацца да сваіх "скарбаў".

Ці маеце фота Ядвігіна Ш.? Калі не — пастараюся дастаць. Мушу дадаць, што ўсё магчымае зраблю з вялікай прыемнасьцю, бо гэта для Гродна... Гродна — горад майго бацькі. А і я там вучылася і там у 1909 г. пачала працаваць у беларускім руху.

Бывайце. Чакаю адказу. Прывітаньне для Мікалая Міхайлавіча [Марцінчыка]. *Л. Войцікава.*

67. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

30 ліпеня 1978 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Учора атрымала Ваш ліст. З прыемнасьцю адказываю, бо лічу, што калі чалавеку дадзена доўга жыць, то дзяліцца тым, што ён ведае і помніць,— проста яго абавязак. Нічога канкрэтнага сяньня не высылаю. Трэба яшчэ сабраць, прыгатаваць і г.д.

А фота Ядвігіна[Ш.] трэба старацца ў Менску, а цяпер амаль усе ў адпачынку, і німа да каго зьвярнуцца. На жаль, іншага, як тое, што ў кніжцы, нідзе не дастанеце. Нават унукі Ядвігіна Ш. здымкаў дзеда ня маюць. Хоць на ўсялякі выпадак запытаюся. Я з унучкай Ядвігіна стала карэспандую. Сама маю Ядвігіна ў групе, прабавалі адтуль перафатаграфаваць — ня выйшла. А мо яшчэ папрабуем? Пагляджу.

Вельмі шкадую, што не магу споўніць Вашай просьбы што да майго слоўніка. Маю толькі адзін экзэмпляр. Але маю вялікую рукапісь "Мядовыя расьліны" — з назовамі расьлін у 5 мовах: беларускай, украінскай, польскай, расейскай і лацінскай. З альфабэтычнымі сьпіскамі ва ўсіх гэтых мовах, падзелам расьлін на лекарскія, дэкаратыўныя, кармовыя і г.д. І, зразумела, апісаньне ўсіх расьлінаў. Адна бяда, што ўсё пісанае лацінкай, бо тады я так прывыкла. Гэта даўна было. Для музэю гэта вартасьці ня мае, але Вам асабіста мо спатрэбілася б. Я ахвотна дала б, бо нашто гэта мае ляжаць?

Яшчэ аб сім-тым можна было б пагаварыць. Мне прыйшло ў галаву, ці не захацелі б Вы на дзянёк, а то і два пад'ехаць да мяне? Гэта ж блізка. Перагледзелі б нумары "Беларускай борці", дзе ёсьць пару артыкулаў па мэдыцыне, гігіене, вэтэрынарыі. Скромнае ўсё гэта, магчыма, устарэлае, але ўсё ж рабілася, што было магчыма. Тады пагаварылі б яшчэ і аб іншых справах. Паглядзелі б здымкі Гр[одзенскага] гуртка бел[арускай] моладзі і г.д. Узялі б рукапіс, калі б ён Вам быў патрэбны, і машынапіс "Т[аварыст]ва "Пчала". Буду чакаць адказу, памыснай весткі. Лічу, што лістоўна ніколі ня зможам усяго выясьніць.

Аб маім дачыненьні да мэдыцыны і ўспамінаць ня варта. Гэта ў 1924 г., калі ў паветры адчувалася вайна, быў праведзены санітарны курс: перавязкі, дэзынфэкцыі ранаў і г.д. Здаецца, і паперак ніякіх не давалі. Выкладаў ваенны лекар. Буду мецць маленькі ўспамін аб мэдсястры — сяброўцы Гродз[енскага] бел[арускага] гуртка. Маю і здымак яе. Яна крыху пісала.

А вось у справах рэвалюцыйнай работы, то я тут "цёмная". Мая сьцежка

была іншая — асьвета, усё зьвязанае з прыродай, 3 гады працы ў бежанскім камітэце. Усё ціхае, дробнае, адыйшоўшае ўжо з людзкой памяці. Аб рэвалюцыйнай працы ў Гродне нічога ніколі ня чула. Як той гурток быў зьнішчаны, мне было 2 гады. У Гродна на нейкі час (на 4 гады) я прыехала, маючы 17 г. А тут навука (канчала гімназію, пачатую ў Кіеве), ну і Бел[арускі] гурток.

Калі б Вы змаглі і лічылі патрэбным прыехаць, як дабрацца (нялёгка) — пытайцеся др. Марцінчыка. Ён першы раз прыехаў з плянам у руках.

Як бачыце, напісала шмат, а прыдатнага — нічога. Пішыце ўсё, што Вам трэба. А мне? Ад мяне пакланіцеся Нёману! Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

68. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[8 жніўня 1978 г. Вільня]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сардэчна дзякую за кніжку. Чытаю. Каб мне вельмі падабаліся яго творы — не скажу. Чаму? Мо іншым разам — шмат пісаць... А ведаеце? Мая дачка, як працавала ў Гродне ў пэдынстытуце, ведала аўтара. Ён тады быў на апошнім курсе.

Пасылаю пару вершаў з “Коласа бел[арускай] нівы” і лісты. Апошнім з 1915 г. ёсьць апошні верш Юркі Снапко — майго “бацькі”. Яго дата нараджэньня — 1893 г., а вось што да яго сьмерці, ёсьць два варыянты. Мяне асабіста паведамлялі з Петраграду, што ён забіты на фронце, хутка, як туды выехаў (у 1916 г.). А яго былая нарэчаная, якая цяпер жыве ў Варшаве, кажа, што ён быў пасланы на працу ў Маскву ў эпідэмічны шпіталь, там заразіўся тыфусам і памёр. Не разумею толькі, чаму ж яго таварыш (наш супольны сябра з ГГБМ) Адольф Зянюк, з якім мы тут у Вільні амаль кожны дзень бачыліся, нічога мне аб гэтым не казаў? Яны абодва з Сакольшчыны, і сем’і іх знаёмыя. Вельмі дзіўна.

Бандэроль вышлем 8 жніўня. Прыедзеце — будзе на мейсцы. Лістоў Лявіцкага буду чакаць пасьля выкарыстаньня. Люблю часам перагледзець старыя лісты — вярнуцца ў мінуўшчыну.

Усяго найлепшага ўсёй Вашай сям’і. Думаю, што ў верасьні змагу Вам пасьлаць “Колас бел[арускай] нівы”. Перапішуць мне яго ў некалькіх экзэмплярах. *Л. Войцікава.*

69. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

15 верасьня 1978 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ужо даўна атрымала Ваш ліст і лісты “бацькі”. Усё не было магчымасьці адказаць. І сяньня не адкажу на Вашыя пытаньні адносна “бацькі”. Пачакаю, пакуль усё выясьніцца, бо толькі цяпер паведамілі мяне (з Новага Двара), што нарэшці дасталі адрас сваякоў “бацькі” і паслалі ліст, пытаючыся, калі і як загінуў, бо ёсьць 2 вэрсіі. Адначасна прышлюць мне *пэўны* назоў вёскі, а то мне пісалі двапка. Як усё будзе ясна — апрацую поўны жыцяпіс.

А цяпер пасылаю Вам пасьмертны ўспамін яшчэ аднаго з сяброў Гродзенскага гуртка. Як бачыце, таксама вельмі вартаснага чалавека. Трэба дадаць, што гэта з малодшай сэкцыі гуртка. А той, хто пісаў успамін, таксама гуртковец. Аб

яго цяпер пытаўся ў мяне А.С. Ліс — ці я яго ведала, бо гэтае прозьвішча спаткаў у прэсе. Быццам Я. Натусэвіч[1] у 20-я гады працаваў у Гродне ў Бел[арускім] камітэце, змагаўся за беларускія школы і г.д.

Я прасіла А. Ліса, каб напісаў мне больш падрабязна, бо я аб гэтым ня ведала. Неяк кантакту з Янкам Натусэвічам пасьля выезду з Гродна ня мела. Як відаць, у нашым гуртку хапала моладзі ідэйнай, глыбака сьвядомай. Гурток наш працаваў шчыра, горача і ахвярна. Вынікі былі.

Маю лісты (шмат іх) яшчэ аднаго сябра — Адольфа Зенюка. У свой час (20–30 гады) дзейнага сябра Бел[арускага] студ[энцкага] саюзу ў Вільні. Лісты пераважна з Петраграду. Гавораць аб працы петраградзкіх студэнцкіх арганізацыяў і г.д. Аўтар іх — з самой Сухаволі. Мая мара — каб Вы іх прачыталі. Тады яшчэ лепш пазнаеце дух Гродз[енскага] гуртка.

Мае ўспаміны аб ГГБМ, якія Вы чыталі, усяго абняць не маглі. Але на тое, каб з лістамі А. Зенюка пазнаёміцца, Вам трэба ахвяраваць нейкую нядзелю і прыехаць. Я ведаю з практыкі, што кожны такі ліст патрабуе растлумачэньня, камэнтарыяў — іначай ня выйдзе.

Што гэта так, бачу на прыкладзе. Уладзімір Содаль[2] (Вы яго па прэсе, напэўна, ведаеце), зацікавіўшыся Ядвігіным Ш., ня менш зацікавіўся яго дачкой — с.п. Вандай Лёсікавай. Каб лепш пазнаць яе, папрасіў у мяне яе лісты. Я яму дала. Ён іх сабе перадрукоўвае і што ж? Амаль кожную копію прысылае мне з цэлай масай пытаньняў. І яму клопат — і мне работа. А каб чытаў на мейсцы, адразу ўсё магла б выясьніць.

Назьбіралася цяпер у мяне шмат лістоў — кожны на іншую тэму. Для мяне такая работа не бяда, а радасьць. Чую, што яшчэ магу быць патрэбнай. Але чуюся ня вельмі добра, і таму ўсе адказы позьняцца.

Як толькі дастану весткі з Новага Двара (там жыве мой памочнік — Казімір Грынкевіч, які памагае мне зьбіраць весткі аб гуртказўцах), адразу вазьмуся за жыцьцяпіс "бацькі". Я яго, зрэшты, як і іншых, вельмі добра помню. Розныя дробныя факты, супольныя прыгоды, падзеі.

Вельмі была б рада, каб Вас справа гурткоўцаў захапіла. Бо як мяне ня будзе, усё зьнікне. Тады ўжо камэнтарыяў ніхто ня дасьць.

Усяго Вам найлепшага! Прывітаньне Вашым родным. *Л. Войцікава.*

70. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

20 верасьня 1978 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Дзякую за ліст. Цікавая вестка аб 750-х угодках Гродна. Я гэтага ня ведала. Напэўна, будзе ў друку гісторыя Гродна? Цікава, ці будзе ўспомнены вялікі пажар гораду? Ня ведаю, у якім гэта годзе было. А цікава было б ведаць, бо мае дзяды (бацькі майго бацькі) пасьля пажару перабраліся на новую кватэру каля Фары, дзе і жылі да сьмерці. А сам пажар бацькі маёй маткі бачылі са свайго фальварку — 18 вёрст ад Гродна (за Нёманам), увайшоўшы на самую высокую частку млына-ветрака. Мне малой аб гэтым расказвалі.

На закранутыя Вамі справы адказваю па чарзе. Пераглядзела я лацінскія альфабэтычныя сьпіскі свайго слоўніка і кніжкі аб лекарскіх зёлках. Аказалася, што ў слоўніку налічываецца лекарскіх расьлін — 92. У пачатку 20-х гадоў (1924–25) я друкавала матэр'ялы аб лекарскіх зёлках у гаспадарчых дадат-

ках да грамадаўскіх газэтаў. Гэта значыць, на гадоў 9–10 перад выхадам "Бел[арускай] борці".

Відаць, М. Бобрык скончыла гэтую самую фэльчарска-акушэрскую школу? Бо вучылася яна ў Гродне. Нікуды не выяжджала. Скончыўшы навуку, яе першая праца была ў прыватным доме (у жыдоўскай сям'і) пры ўмыслова хворым. Чалавек быў спакойны, аддаваць у спэцклініку не хацелі, і Марыся Б[обрык] з цэлым адданьнем апекавалася ім. Таму, хоць і належала, да Гродз[енскага] гуртка бел[арускай] мол[адзі], рэдка мела час быць з намі. Усё ж часам прыймала ўдзел — найбольш дэклямавала. Выступаць на сцэне ёй было немагчыма з прычыны ненармальна высокага росту. Яна мела нешта 190 см, калі ня з гакам. Усе іншыя пры ёй выглядалі карлікамі. Гэта было яе няшчасьцем, бо хапала такіх людзей, якія не давалі спакойна прайсьці па вуліцы.

Пераклад верша "Школьны званок" яна мне дала яшчэ ў Гродне. Я яго захавала і пасьля дала ў "Заранку". У "Коласе бел[арускай] нівы" ёсьць яе гумарыстычнае апавяданьне "Штосьці", падпісанае — *Наста*. Думаю, што сюжэт народны. У апрацоўцы "Коласа..." прыймала самы беспасярэдні ўдзел.

Перагледжу яе лісты. Магчыма, калі што цікавае там ёсьць, прышлю Вам пазнаёміцца. Гэта мне не навіна — перасылаць лісты, факты і г.д. Вось нядаўна з Гродна вярнулі мне лісты Я. Лявіцкага — маладога лекара, аб якім я Вам гаварыла. Пасылала я іх Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу — выкладчыку бел[арускай] мовы і літаратуры ў Гродз[енскім] пэдінстытуце (цяпер унівэрсытэт). Ён зьбірае матэр'ялы да кніжкі "Літаратурнае і культурнае жыцьцё Гродзеншчыны".

Я думаю, варта было б Вам з ім пазнаёміцца. Вельмі сымпатычная сям'я — ён і яго жонка. Ды Вы, напэўна, ня раз чулі ў Гродз[енскім] тэлебачаньні штомесячны яго агляд новых бел[арускіх] кніжак пад загалоўкам "Наша кнігарня".

Што да артыкулу пра М. Багдановіча, то я пераглядзела ўсю, якая ў мяне ёсьць, "Маладосьць" і не знайшла яго. Мо ■ памылілася, і ён быў у "Полымі"? Пагляджу. А калі не знайду, запытаюся Аляксандра Мікалаевіча Бачылу — мы з ім добра знаёмыя. Мо ён паможа мне прыпомніць, дзе гэта было. А мо яшчэ што ведае, бо дагэтуль не перастае шукаць матэр'ялаў аб жыцьці Максіма Б[агдановіча]. Заўсёды дзяліўся са мной новымі знаходкамі. Цяпер даўно не пісаў.

Яшчэ справа "Коласа б[еларускай]н[івы] ". Маю я з ім шмат непрыемнасьці. Мой знаёмы ўзяў яго ў Менск, каб там даць перадрукаваць на машынцы ў 4–5 экз[эмплярах], бо знаёмыя і сваякі тых гурткоўцаў, што рабілі "Колас...", хацелі яго мець. Як абяцаў — так і зрабіў, даў нейкім перапісчыкам, сказаўшы, што мае быць усё так, як ёсьць.

Але дзе там — пачалі ўводзіць новы — цяперашні — правапіс, перарабляць словы. Адным словам, змарнавалі работу. Што будзе — ня ведаю, бо нанава перапісываць ня хочуць. Вось прыслужыліся...

Зьдзівіцць Вас, напэўна, што пасылаю Вам некалькі слоў аб гуртку і "Коласе..." па-беларуску. Бачыце, каб я пачала пісаць па-руску, то мне гэта заняло б шмат часу. Адвыкла я зусім паслугоўвацца рускай мовай, хоць чытаю шмат. Калі Вы палічыце, што гэта нечага вартае, то мо ахвяруеце крыху часу, каб пералажыць? А калі не — няхай будзе для Вас.

Маю шмат работы пры гаспадарцы. Восень. Унук зьбірае паступова яблыкі — трэба горшыя сушыць, варыць і г.д. Ратуем памідоры, якія гніюць ад дажджоў... Збор лекарскіх зёлак скончыўся — асталіся ягады: барбарыс, абляпіха, рабіна. Трэба выкарыстаць.

Мой унук, хоць па прафэсіі фізык-інжынер, удома пераменяецца на садаўніка і добрага знаўцу лекарскіх ягадных кустоў. Сёлета знайшоў у лесе абляпіху — папрабавалі рабіць сыроп. Гэта ж добры лек. Так вось час на ўсё патрэбны. Яшчэ добра, што я ў свае гады магу ва ўсім памагчы. А мо якраз таму і жыву, што ва ўсім прыймаю ўдзел?

Усяго Вам найлепшага. Прывітаньне для жонкі. *Л. Войцікава.*

71. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

21 кастрычніка 1978 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

Цяпер я мушу прасіць прабачэньня — так доўга не адказывала Вам і не падзякавала за памяць аб маім дні нараджэньня. Тым больш было мне прыемна, што вельмі мала хто помніў аб гэтым. А ўсё ж 86 гадоў жыцьця і 69 гадоў у беларускім руху. Няшмат я зрабіла, але сумленьне маю спакойнае, бо старалася, як магла.

У гэтым годзе мела я і добрыя хвіліны. Раскажу падрабязна. Помніце, я Вам, хіба, гаварыла аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі, які працаваў у Гродне ад 1909 па 1913 г. уключна. І вось у гэты апошні 1913 год мы выдалі аднаднёўку "Колас беларускай нівы". Вельмі скромны каласок, адбіты на шапірографе ў ліку 50 экзэмпляраў. У мяне астаўся, як памятка, адзін экзэмпляр. Вазіла я яго ўсюды з сабой. Аж тут, у Вільні, прапаў. Як я яго шкадавала... Помніла загалоўкі вершаў і артыкулаў, помніла прозьвішчы аўтараў. Але што з таго — тэкстаў не было.

Сёлета зімой прыехаў з Менска Іван Уладзіміравіч Саламевіч, каб папрацаваць у віленскіх архівах. Аднаго дня пасьля работы прыйшоў да мяне і кажа: "Ведаеце, што я ў архівах знайшоў? "Колас беларускай нівы"!

Мне проста верыць не хацелася. Аказалася, што "Колас..." вельмі зьнішчаны, і перафатаграфаваць нельга. Але І.У. Саламевіч не пашкадаваў часу і працы — перапісаў усё ад рукі... Пасьля ўжо ў Менску перадрукаваў на машынцы. Прыслаў мне машынапіс і пазычыў такі ж С.М. Новіку. А той, як заўсёды, цудоўна аформіў з рысункам каласоў на вокладцы — як у арыгінале. Так што цяпер разам з маімі ўспамінамі аб Гродзенскім гуртку — гісторыя гуртка поўная. Адно жаль, што апрача мяне нікога з рэдакцыйнай групы німа. Ды і наагул з гуртка, насколькі ведаю, німа нікога.

Вельмі Вам спачуваю, што дагэтуль не ўдалося наладзіць сабе добрай працы і памяшканьня. Ці думаеце і надалей жыць і працаваць у Брэсьце? Я неяк пыталася пра Вас С.М. Новіка, і ён мне крыху пісаў аб Вашых жыцьцёвых клопатах і пераездах. Нядобра, што Вы кінулі пісаць. Як бы жыцьцё ні складалася, ня варта губляць сваіх здольнасьцяў. Калі не пішацца, то хоць запісывайце стала, кожны дзень — свае думкі, уражаньні з пражытага дня і г.п. Гэта ж таксама трэнінг.

Пытаецеся, што я пішу? Лісты! Кучы лістоў на самыя розныя тэмы... Мяне пытаюцца аб розныя мінуўшыя справы. Кожны нешта іншае, вось і стараюся па магчымасьці кожнаму з сэнсам адказаць.

Вельмі дрэнная, ненармальная ў гэтым годзе пагода, а гэта моцна адбіваецца на здароўі. Летам было нават даволі дрэнна. Цяпер крыху лепш. Не здаюся... Усім займаюся ўдома і на гародзе пакрысе. Найгорш тое, што

я цэлыя дні — па 10–11 гадзін — адна. Слаўка мае работу вельмі далёка, і гэта яму займае шмат часу. Дачка прыходзіць праз дзень таксама пасьля работы. Толькі ў суботу і нядзелю ўсе ўдома. На жаль, мінуў той добры час, калі с.п. сын быў са мной.

Калі зможаце калі мяне адведаць, буду рада. Абаім Вам з жонкай сардэчнае прывітаньне. Ад маіх таксама прывітаньне далучаю. *Л. Войцікава.*

72. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

23 кастрычніка 1978 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Не адразу адказала на Ваш ліст, бо Вы меліся выяжджаць з Гродна. Мне вельмі прыемна, што Вас цікавіць і хвалюе ГГБМ. Добра было б, каб Вы прыехалі. Апрача лістоў А. Зенюка маю яшчэ лісты Янкі Ляўковіча, які паходзіў з вёскі Біты Камень у Сакольшчыне. І лісты не абы якія: проста з духоўнай сэмінарыі ў Вільні, куды ён паступіў, вельмі зьдзіўшы тым усіх нашых сяброў.

Я даўгія гады — у вайну і пасьля вайны (1-ай) — нічога аб ім ня ведала, а пасьля, у 60-я неяк дастала яго адрас і паслала яму ўспаміны аб гуртку. Атрымала адказ па-беларуску і яшчэ адзін ліст. Усяго. Ён быў ужо паважна хворы і хутка памёр.

Што да Я. Натусэвіча, то А. Ліс абяцаў, што як будзе ў Вільні (не раней вясны), перагледзіць больш дакладна “Бел[арускае] слова”[1] і падзеліцца здабытымі весткамі. Папрашу яго, калі б я не дачакала, каб аддаў матэр’ялы Вам.

А ведаеце, хто яшчэ цікавіцца гуртком і яго аднаднёўкай “Колас беларускай нівы”? Юры Туронак[2] — супрацоўнік беластоцкай “Нівы”. Мы неяк пачалі сёлета з ім перапісывацца. А яшчэ адзін беларус, і то ў Вас у Гродне, доктар Ф.І. Ігнатовіч — выкладчык гісторыі мэдыцыны ў Гродзенскім мэдінстытуце. З ім то я пазнаёмілася асабіста. Быў у Вільні і быў у мяне. Ён зьбірае матэр’ялы аб беларускіх дактарах-пісьменьніках.

А я ўсё яшчэ зьбіраю дэталі аб сваім “бацьку” — Я. Лявіцкім. Ніяк не магу дайсьці да ладу з назовам вёскі, скуль ён паходзіў. Яго былая нарэчаная (сама з-пад Сухаволі з маёнтка Жухава) падае назоў Chlewiska Dolne, а К. Грынкевіч з Новага Двара знайшоў сваякоў Я. Лявіцкага і падае адрас, атрыманы ад іх — Chlewsk Dolny. І адно, і другое неяк дзіўна гучыць — зусім не па-беларуску, і я ня ведаю, што з гэтым рабіць і каму верыць.

Маеце рацыю, гэта вельмі сумна, што такія вялікія ўгодкі — 850-я — нічым не адзначаныя, не адсьвяткаваныя, як належыцца. Гэта, мусі, каб абмінуць слова Беларусь, беларускі... нават у сувязі з Беларуска-Літоўскім Княжаствам. А 60-я ўгодкі БССР то ўжо ўрачыста адсьвяткуюць, хоць гэтая Беларусь — адзін толькі міраж.

Дзякую за юбілейныя капэрты. Калі ня трудна, то, калі ласка, прышліце яшчэ. Тыя я ўжо разаслала былым гродзенчукам, але яшчэ ёсьць людзі, катовым хочацца паслаць. А я ад др. Ігнатовіча атрымала 2 лісты, высланыя аднаго дня — 29.09, з юбілейнымі штампамі.

Нядоўга трывала прыгожая цёплая пагода. У нас пазаўчора і ўчора падаў сьнег, а ўночы —прымаразкі. Учора і сяньня днём +4, +5. Няўжо пачнецца зіма? А наш лес яшчэ ў гэтую пару багаты ягадамі. Унук мой знайшоў (далёка ад нас) цэлыя зарасьлі барбарысу. Летась рабілі з яго сок і сёлета таксама. Вельмі до-

бры на кісялі і да гарбаты — заместа цытрыны. Тыдзень таму назьбіралі цэлае вядро ягад, і гэта толькі невялікая частка таго, што асталося на кустах. Дзіўна, але ніхто яго ня ведае і не зьбірае.

Маем у лесе і яшчэ адну ягадную расьліну — абляпіху. Яе ягады — лякарства. Пад Вільняй ёсьць плянтацыі абляпіхі на 4-х гэктарах. З ягад робяць алей, які ўжываецца ад хваробаў страўніка і вантробы. Але дастаць гэты лек у аптэках вельмі цяжка. А ў нас ягады — пад бокам у лесе. Але цяжка выкарыстаць, бо не хапае часу. Шмат яго ідзе на работу з яблыкамі, каторых сёлета ў нас шмат.

Але я і расьпісалася. І то аб драбніцах. Усяго найлепшага Вам і п. Марыі. Чакаю. *Л. Войцікава.*

73. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

25 кастрычніка 1978 г. Вільня

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Гэта добра, што Вашае дрэннае самаадчуваньне было выклікана толькі змучаньнем. А ўсё ж шкада, што ня хочаце папрабаваць піць мэлісу. У ніякім выпадку не пашкодзіла б, нават калі б не памагла.

А я перахвалілася сваім добрым станам. Праўда, у сэрцы не баліць і перабояў німа, але як толькі пачаліся дажджы з вялікімі ветрамі (а сяньня і з грымотамі), ізноў моцна дакучае галава. Але нічога. Стараюся трымацца, бо яшчэ ёсьць работа.

Што да “Б. Тарашкевіча”[1]... Ня ведаю, чаму Вы палічылі за іранічныя словы *nasz bohater*[2]? Я не адчуваю надзвычайнай сымпатыі да Аляксандры Бэргман, але бачыла, як яна старанна і з захопленьнем зьбірала матэр’ялы да гэтай кніжкі, і я пэўная, што рабіла гэта шчыра. Тады яна была ў Вільні ці ня 2 месяцы і часта прыходзіла да мяне. Чытала-перачытывала лісты (да мяне) Марыі Ґалубянкі (пазьней па мужу-украінцу — Бучынскай). М. Галубянка, жывучы ў Петраградзе, часта спатыкалася з Тарашкевічам і шмат аб ім мне пісала. Я асабіста Б. Тарашкевічам ня так ужо захопленая. Маю на гэта прычыны...

Скончыўшы з кніжкай “Б. Т[арашкеві]ч”, Бэргман занялася І. Дварчанінам. Напісала аб ім артыкул у беластоцкім календары. Мне ўдалося памагчы ёй дастаць копіі вершаў Дварчаніна і яго пераклад Блока “Дванаццаць”[3]. А пасьля пісала яна аб Л. Родзевічу. Адшукала ў Польшчы сястру Родзевіча п. Яніну, якой ужо 93 гады. Езьдзіць да яе і ў беластоцкай “Ніве” зьмясьціла ўражаньні з гэтых падарожаў.

Я ведаю, што Вы паслалі А. Белакозу свае ўспаміны аб І. Дварчаніну. А ці маеце яго вершы? У мяне асталіся копіі. Калі хочаце, магу іх Вам выслаць. Мне не патрэбныя. Я Ігната Дв[арчаніна] ведала яшчэ з Менска. Але там мы з ім часта сварыліся. Старыя падзеі... А ўсё ж помніцца...

Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

74. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

30 кастрычніка 1978 г. Вільня

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Добра з Вамі карэспандаваць — хутка адказываеце. Каб гэта так і іншыя

рабілі... А то пару тыдняў таму выслала аж пяць бандэроляў. Дзьве ў Польшчу, а тры тутэйшыя — дзьве ў Менск, адну ў Гродна (др. Ігнатовічу). З Польшчы ўжо атрымала адказы і спакойная, а тутэйшыя адрасаты маўчаць, як заклятыя... А я непакоюся, бо хто ведае, ці бандэролі дайшлі? На пошце ўсялякае бывае...

Пытаецеся аб партрэт М. Забэйды. Ён быў увесь час у пляменьніцы Янкі Шутовіча. Як была выстаўка працаў П. Сергіевіча ў Менску, мастакі, якія выстаўку ладзілі, і гэты партрэт узялі. Што з ім зрабілі пасьля — ня ведаю. Пастараюся даведацца.

Яшчэ астаўся ў Вільні і фартап'ян М. Забэйды. Ён таксама ў пляменьніцы Я. Шутовіча Ядзі Гарлуковіч. Сын яе на тым фартап'яне іграе...

Што да альбому Забэйды, то ён быў бы вельмі цікавы. Здымкаў, хіба, каля сотні, а тэкст апрацаваў Янка Шутовіч на падставе лістоў сьпевака, артыкулаў у прэсе, праграмаў канцэртаў і г.д. Ён (Я. Шутовіч) прыносіў мне прачытаць. Добра, цікава напісана, толькі я яму радзіла крыху скараціць, бо вельмі ж паўтараюцца ацэнкі, эпітэты і г.д. Але ён, здаецца, не паслухаў. Гэта дробязь.

А вось бяда, што Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн вельмі марудна гэты альбом робіць. Аж страшна, ці здолее скончыць. У яго стэнакардыя, а цяпер і іншыя хваробы прычапіліся. Я яму прапанавала, каб, друкуючы на машынцы тэкст, рабіў яго ў 2 экз. Адзін для альбому, а другі каб паслаць сьпеваку. Я думаю, што гэта зрабіла б яму прыемнасьць. С.М. Новік са мной згадзіўся. Але ці робіць так — ня ведаю. Паміж іншым, С. Новік з М. Забэйдай знаёмы асабіста, і яны карэспандуюць.

А цяпер да Вас просьба. Ці ня чулі Вы, а можа, і ведалі ў Гродне доктара Нічыпарука? Магчыма, прозьвішча крыху пераіначанае, але падобнае. Аб яго пытаецца і просіць мяне даведацца родная сястра др. Станіслава Грынкевіча. Яна жыве ў Варшаве. Мы з ёю знаёмыя ад дзіцячых гадоў і стала перапісываемся. Вось яна піша, што добра ведала жонку гэтага доктара, яе сястру і матку і вельмі хацела б здабыць іх адрас.

Сястра др. С. Грынкевіча скончыла ў Гродне гімназію, а і пасьля, ужо будучы замужам (на жаль, выйшла за паляка-шавініста, але ён памёр ня так даўна), нейкі час з мужам і дзяцьмі жыла ў Гродне. І цяпер успамінае Гродна з вялікім узрушэньнем — ня меншым, чым я. Гэта якраз яна пастаралася купіць і прыслала мне "Б. Тарашкевіча" для Вас.

Якраз сяньня дастала я ліст з Менска ад знаёмага выкладчыка ўнівэрсытэту, з факультэту журналістыкі.Піша, што дастаў прачытаць Б. Тарашкевіча. Ізноў буду змушаная падымаць справу друкарні М. Кухты. А то ён яшчэ ў якой сваёй працы гэтую друкарню памесьціць на Віленскай, 12... Ён, Сьцяпан Васілевіч Говін[1], напісаў і выдаў кніжку "Друк Заходняй Беларусі". Не абыйшлося ў яго без памылак. Але абяцаў у далейшым паправіць. Вось хачу папярэдзіць, каб не зрабіў новай памылкі. Такая, мусі, ужо мая доля.

Адносна тых успамінаў, якія ляжаць у мяне... Аўтар там піша[2], што Навагрудзкая гімназія існавала вельмі коратка. А я дастала дэтальныя весткі ад былога вучня Нав[агрудзкай] гімназіі, што яна існавала 15 гадоў. Падае, калі паўстала, як працавала і г.д.

Але — хопіць. Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

75. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

4 лютага 1979 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую Вам за ліст, дзякую, што мне паверылі. Разумею добра, якое ўражаньне магла зрабіць на Вас выдумка Ліса. Ён і цяпер ня хоча мне верыць, хоць тлумачыла яму тымі самымі словамі, што і Вам.

А я — можа, Вас гэта і зьдзівіць — нават ня ведала, што там нешта друкуецца. Таксама ня ведала гэтага і мая дачка.

Сваякі зяця часта адтуль пішуць, прысылаюць здымкі з фэстываляў, выставак, але аб якім-небудзь друку ніколі не ўспаміналі ні словам. А яны ж — людзі інтэлігентныя, прымаюць удзел у беларускім грамадзкім жыцьці, надзвычайна пільна і старанна культывуюць мову, хоць выхаваліся, а нават радзіліся (апошняе пакаленьне — праўнукі роднай сястры Ант. Луцкевіча) так далёка. Відаць, той друк — справа малаважная.

Я раблю ўсё магчымае, каб там самавольна чаго ў друк не пусьцілі. Нават ня ведаю, ці мая тая бандэроль дайшла, бо дагэтуль німа аб ёй весткі. Калі б, барані Божа, што непамыснае здарылася, адразу Вас паведамлю. Шмат здароўя мне гэтая гісторыя адняла.

Усяго найлепшага! Яшчэ раз дзякую. Давер — гэта вялікая справа. *Л. Войцікава.*

76. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

21 лютага 1979 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Сяньня атрымала Ваш ліст — адказываю. Адаслаўшы папярэдні ліст і Ваш артыкул, я зараз жа напісала ў Менск да Адама Мальдзіса, у якога на руках мае ўспаміны і ўся выдавецкая справа таго альманаха, у якім мае ўспаміны маюць быць. Я запыталася яго, як ён глядзіць на друк Вашага артыкула ў "Нёмане"? Адказаў зараз жа. Перапісываю яго словы: "Шаноўная Л[юдвіка] А [нтонаў]на! Сьпяшаюся запэўніць Вас, што публікацыя ў "Нёмане" пра "Борць і Пчалу" ніяк ня можа перашкодзіць нам. Хутчэй, наадварот — узьніме цікавасьць".

Так што я зусім без патрэбы Вас непакоіла, просячы тое-сёе скараціць. Выбачайце. Давайце ўсё, як было. Разумеецца, апрача дробных паправак. Чакаць з публікацыяй ня варта. Той альманах выйдзе няведама калі. Можа цягнуцца гэтая справа і паўгода, а мо год, а то і два. Ведаю, што ў выдавецтве цягнуць гадамі, а часам і зусім зьнімаюць з плянаў.

Мне і самой было б прыемна, каб вестка аб "Борці" і "Пчале" выйшла ў сьвет. Аб іх жа ніхто ня ведае. Ня я адна там працавала. А мо часам хто са старых падпісчыкаў "Борці" яшчэ жыве і Ваш артыкул прачытае. Так што не адкладайце — пасылайце, і посьпехаў Вам у друку.

Прачытала яшчэ раз Ваш машынапіс. Вы мне прыпомнілі мае санітарныя курсы. Так сабе, дзеля Вашай цікавасьці скажу, што я з іх шмат карыстала падчас 1-ай сусьветнай вайны (напачатку), а пасьля ў 1921 г., калі якраз там, дзе я жыла ў фальварку майго дзеда (18 км ад Гродна), ішлі баі. Баі — 3 дні на нашым панадворку і на полі. Я ўвесь час рабіла перавязкі параненым... Не паду-

майце, што хвалюся! Проста прыпомніўся той час... Калі Вам цікава, раскажу больш падрабязна калі-небудзь.

Разумеецца, калі б менш было аб маёй асобе — было б лепш. Але што зрабіць, калі інакш не выходзіць...

А цяпер бывайце. Ня гневайцеся, што столькі клопату Вам нарабіла. Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

77. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

28 лютага 1979 г. Вільня

Дарагі Іван Уладзіміравіч.

Адна просьба — не мая асабістая. Ю. Туронак паміж цэлай літаніяй пытаньняў да мяне пытаецца аб псэўдонімы, якія спатыкаліся ў беларускіх календарах 1910–1914 гадоў пад гаспадарчымі артыкуламі. Гэта: *Юрка Бусел з-пад Слуцка*[1], *Лемеш, Крэмень, Борысовіч, Село, П.Г.* Ці ёсьць яны ў Вашым зборніку? Калі што маеце, калі ласка, напішыце мне, а я яму перашлю разам з іншымі весткамі.

Калі б ведала, што мая дачка будзе ў Вас, папрасіла б на пэўны час вярнуць мне мае ўспаміны. Вельмі мне бяз іх трудна. Часта-густа нехта пытаецца аб той ці іншы факт, ня ўсё помню, што пісала. Усё ж прайшлі гады — больш 10-ці. Перасылаць поштай боязна. Могуць загінуць.

Дрэнна чуюся, а работы яшчэ маю шмат — над тымі ўспамінамі, што Вам паказывала. Праўда, асталося толькі перапісаць у 2-х экзэмплярах, але гэта шмат, а сядзець доўга не магу. Дзякуючы Янку Хворасту, які вельмі шмат памог у расшыфраваньні розных недарэчнасьцяў, наагул работа скончаная. Перапісаць і выслаць.

Марозу амаль німа, але сьнег сыпле бясконца. На гародзе шмат што прымёрзла. Сумныя весткі з Зэльвы. Др. І.П. Геніюш[2] дажывае апошнія дні — лекары ўжо ня робяць ніякай надзеі. Вельмі мучыцца.

Усяго добрага! Чакаю хуткага адказу. У Польшчу лісты ідуць вельмі доўга. *Л.В.*

А галоўнае — забылася! Сардэчна дзякую за кніжку! Мая бібліятэка вярнулася на старое мейсца — на полкі ў пакоі Слаўкі, і мне цяпер выгодна карыстацца кніжкамі.

78. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[Люты 1979 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ведаючы, што Вас ня будзе нейкі час у Гродне, не сьпяшалася з адказам. "Коласа бел[арускай] нівы" не пасылаю, бо гэта немалая рэч, і з высылкай шмат клопату — нязручны фармат. Прыедзеце — возьмеце. Праўда, прыкрая справа з Вашай кніжкай... І чаму так робяць? Тое самае — са "Слоўнікам псэўданімаў" Я. Саламевіча. Ён над ім працаваў 15 гадоў, калі ня больш. У друк прынялі, назначылі тэрмін, а пасьля адлажылі... І ён нават ня ведае, ці перасунулі на іншы год, ці зьнялі з пляну зусім.

Вы ўжо, хіба, ведаеце, што 8 лютага памёр Іван Пятровіч Геніюш. Хай яму зямелька лёгкай будзе. Але Ларыса Антонаўна то сапраўды нешчасьлівая.

Уяўляю, як перажывае... І як яна цяпер будзе жыць? Адна-аднюсенькая... Ня думаю, каб хацела ехаць да сына. А на мейсцы што яе чакае? І з чаго будзе жыць? Пэнсіі ёй, пэўна, не дадуць? Моцна за яе перажываю. І здароўе яе благое, і блізкай душы побач німа...

Ня думаю, каб Я. Саламевіч зьбіраўся выкарыстаць матэр'ялы "Коласа бел[арускай] нівы". Але найлепш з ім паразумецца лістоўна, тады будзе ясна, што рабіць.

Цяпер пасылаю тое, што абяцала. Крыху фактаў з жыцьця Я. Л[явіцка]га і здымкі — яго і Марысі Бобрык. Мо гэта і дзіўна, але хоць я з ёю была знаёмая і часта спатыкалася, і ў хаце ў яе бывала, а некаторых фактаў з яе жыцьця ня ведаю. Ня ведаю, калі радзілася, ня ведаю, калі і дзе памёрла. Маю некалькі лістоў ад яе. Прыедзеце — прачытаеце, мо гэта Вам нешта дасьць.

Казалі мне пра Я. Л[явіцка]га — забіты на фронце. Яго былая нарэчаная, якая і цяпер жыве ў Варшаве, расказвае, быццам спаткала Адольфа Зенюка з Сухаволі, які вёз для сваякоў Я. Лявіцкага здымак яго ў труне... Быццам Я. Л[явіц]кі працаваў у Маскве ў шпіталі, заразіўся там тыфусам і памёр.

Сваякі Я. Л[явіцка]га, якія жывуць у вёсцы Хлевіска, кажуць, што ў Пецярбургу (хіба, ў 1917 г., у час Рэвалюцыі) Я. Лявіцкі і нейкі ксёндз (магчыма, таксама з Сухаволі або ваколіцы) былі арыштаваныя. Ксяндза таго выпусьцілі, а Я. Л[явіцка]га расстралялі (афіцэр, хоць і лекар...). Думаю, што той ксёндз — навочны сьведка — і расказаў.

Нарэчаная Я. Л[явіцка]га трымаецца сваёй вэрсіі. Абяцае прыслаць той здымак. Калі прышле, тады будзе ясна, што яе вэрсія праўдзівая.

Усяго найлепшага Вам і ўсёй Вашай сям'і. *Л. Войцікава.*

Зьвярніце ўвагу на капэрту — юбілейная: *400 лет. Вильнюсский университет имени В. Капсукаса. 400 metu. Vilniaus V. Kapsuko universitetas.*

79. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

15 сакавіка 1979 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Даўна ня маю ад Вас весткі. Ня ведаю нават, ці Вы атрымалі мой заказны ліст — весткі пра Язэпа Лявіцкага, здымкі яго і М. Бобрык.

Пазаўчора атрымала ліст з Новага Двара — ад К. Грынкевіча. Ён піша, што быў у яго пляменьнік Я. Лявіцкага. Выясьніў аканчальна справу сьмерці свайго дзядзькі. Тая вестка, што той быў расстраляны,— няпраўдзівая. Фактычна памёр ад тыфусу. Але здымка ня маюць. У іх згарэў дом і ўсё, што ў доме было.

А назоў вёскі (нават гэта ня вёска, а хутар) — Хлеўск Горны (górny). Бацька Язэпа купіў кусок зямлі з маёнтку, які называўся Хлеўск. Так што цяпер з гэтым ясна.

Грынкевіч піша, што той пляменьнік Я. Лявіцкага і яго сям'я вельмі добра, чыста гавораць па-беларуску. Вось дзе захаваўся моцны беларускі дух — можна пазайздросьціць. А мне можна з чыстым сумленьнем ганарыцца маімі сакольскімі сябрамі.

Нават крыху непакоюся, што Вы нічога ня пішаце. Мо ў Вас што нядобрае здарылася? Мне думалася, што мо прыедзе ў гэтыя тры дні сакавіцкіх сьвятаў.

Усяго добрага ўсёй Вашай сям'і. *Л. Войцікава.*

80. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

8 красавіка 1979 г. Вільня

Дарагі Іван Уладзіміравіч.

Доўга не адказывала і не падзякавала за прысланыя даведкі, якія адразу пераслала далей — Ю. Туронку, дадаўшы тое, што атрымала ад С.В. Говіна (аб бел[арускіх] выдавецтвах у 1919–20 гады). Вашы весткі перапісала, а Говіна адаслала з цэлым лістом. Шмат было б перапісываць, а я ня вельмі магу доўга сядзець. Ці веснавая пагода, ці старыя хваробы давялі да таго, што ўсё баліць. Усе косьці, усе мускулы, уся — адзін боль. Пасьля ночы лепш, а ад паўдня і ўвечары цяжка цярпець. Змагаюся як магу, бо работы, як заўсёды, хапае. Лісты залежываюцца, а людзі добрыя чакаюць.

Ужо і веснавыя работы падышлі. Я ўжо пасадзіла ў скрыначках памідоры і іншыя расьліны. Нават паўсходзілі. Слаўка, як прыйдзе з работы, усё ў садзе — абрэзывае, замазывае. А яшчэ пастанавіў зрабіць цяплярню — шкляную і аграваную. Абодва з Лявонам працуюць над гэтай задумай. Слаўка муруе печку паводле ўласных плянаў. Цікава — што выйдзе.

Я ўжо скончыла папраўкі да тых успамінаў, якія Вам паказывала. Шмат прыйшлося патрасьці людзкую памяць, але сабраліся цікавыя матэр'ялы, напрыклад, аб беларускіх гімназіях, асабліва аб Наваградзкай. Цікавая, а зусім не апісаная дзейнасьць драматычнага гуртка Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі. Мне вельмі хочацца, каб былыя сябры драмгуртка апісалі і зрабілі дадатковую старонку да альбому Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі. Нават дагаварылася з Новікам[-Пеюном][1], што ён гэтую старонку надрукуе і прыгатуе, каб уклеіць у альбом. Зразумела, найлепш гэта зрабіў бы Янка Хворaст (напісаў успаміны), але ён ізноў ляжыць у шпіталі. Даручыў работу сваёй каляжанцы па гуртку, але ад яе — ні слуху, ні духу.

Выявілася, што драмгурток выяжджаў — ставіў спэктаклі ў Эйшышках, Гродне, Беластоку, Слоніме і Баранавічах, і пасьля былі пахвальныя рэцэнзіі ў газэце “Kurjer Wileński”[2] — гэта словы Я. Хвораста. Трэба было б тыя нумары газэты адшукаць у архівах і рэцэнзіі перапісаць. Была б цікавая старонка з жыцьця Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі. Але ці ўдасца гэта зрабіць? Ня ведаю...

Як добра, што дачка Гарэцкага дбае аб памяці бацькі. Гэта вялікая помач для ўкладальнікаў кніжкі. Гэта ня тое, што трэба кожнае слова выцягіваць ад абыякавых да справы людзей.

Іван Уладзіміравіч, дарагі, кіньце Вы гэтыя мае ўспаміны. Што тут сьпешнага — перадрукоўваць іх? Няхай яны ў мяне будуць так, як ёсьць, а перадрукоўваюцца пасьля без мяне. Я ж для гэтага непатрэбная. Самі кажаце, што там усё ясна. Цяпер пры Вашай працы браць на сябе такую работу, калі німа вялікай патрэбы, зусім лішняе. Паслухайце мяне старую і згадзіцеся, што [redacted] маю рацыю.

Я толькі папрашу, каб мне іх пры першай магчымасьці пераслаць, бо сапраўды часта трэба туды заглянуць. Зьбіраецца прыехаць у Вільню Ю. Туронак. Яму шмат што (ва ўспамінах) трэба будзе паказаць.

За кніжку “Сьвет расьлінны...” будзем удзячныя. Гэтая бібліятэчка цікавіць таксама і Слаўку. Баюся толькі, што там будзе безьліч памылак у назовах расьлін.

Арсень Сяргеевіч [Ліс] прывёз 2-гі нумар “Роднай прыроды”. Так шка-

дую, што я там у рэдакцыі нікога ня ведаю. Не даравала б такіх русіцызмаў: *сьнегіры* — замест *гілі*, *медуница* — замест *мядоўка*, *сон-трава* — замест *сончыкі*... Ды яшчэ *луньнік* (ад луна — месяц) — лацінскі назоў *lunaria*. А чаму ж тыя, што знайшлі мейсцы, дзе гэтая расьліна выступае, не запісалі народных назоваў?

У кніжцы "Жывёльны сьвет Беларусі" ў разьдзеле "Птушкі" падана: *поползень* — народны назоў *дзятлік*. То чаму ж не ўжываць народнага, а расейскі? Гэта мае быць тэрмін навуковы? І сьмешна, і горка... Скажаце — села на свайго коніка... Праўда?

Усяго Вам найлепшага. Ад маіх — прывітаньне. *Л.В.*

Так мне прыкра, што ıı нічым не магу даказаць Ніне Аляксандраўне [Ляшковіч][3] майго спачуваньня, хоць часта аб ёй думаю. Сама з дому нікуды не рухаюся — не магу, а Галя і рада мяне паслухаць — пайсьці адведаць, але ёй вельмі баляць ногі, ледзь ходзіць.

81. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

12 мая 1979 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую за прыемную вестку. А таксама за ўсю помач у гэтай справе. Шмат Вы пасьвяцілі часу і стараньняў. Шчыра і сардэчна дзякую.

Вельмі шкадую, што Вы не ўваходзіце ў рэдкалегію — была б я спакойнейшая за свой артыкул. Баюся скарочываньня, бо маю прыкрую практыку за сабой.

Магчыма, помніце ў 1972 г. у "Маладосьці" мае ўспаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі? Там іх рэдакцыя скарачывала. Відавочна мэханічна вырэзывалі кускі з рукапісу, ня вельмі дбаючы, які сэнс астаецца ў рэшці матэр'ялу.

А тут — што А. Разанаў[1] можа ведаць аб тым, якая частка "другарадная", а якая першаплянавая? Тэма для ўсіх, я думаю, terra incognita[2]. Але што будзе — тое будзе. Я тут голасу ня маю.

Часы і звычаі мяняюцца, і я не магу хацець, каб захаваліся звычаі такія, якія практыкаваліся падчас маёй працы ў ролі рэдактара. То была "гульня", а цяпер справа паважная. Пры гэтай аказіі пазвольце мне зьвярнуцца з такой просьбай. Калі не мыляюся, пасьля сьмерці Янкі Шутовіча гр. А. Разанаў прыязджаў у Вільню і сартаваў астаўшыеся архівы Я. Шутовіча. Магчыма, гр. Разанаў помніць, што там было, што ўдалося знайсьці і захаваць, і ласкава мяне аб гэтым паведаміць. Я ведаю, што астаўся нарыс аб віленскім Беларускім музэі імя І. Луцкевіча (ён у майго зяця) і нарыс аб сьпеваку М. Забэйдзе — ён таксама ёсьць захаваны. А што больш?

Як ведаеце, маю рукапісны зборнічак жыцьцяпісаў — у тым ліку і Я. Шутовіча. Хацела б да яго дадаць інфармацыі, што з працаў і наагул архіваў Я. Ш[утові]ча захавалася і дзе. Была б вельмі ўдзячная.

Выбачайце, што сваёй просьбай раблю клопат. Ці зьбіраецеся ў Вільню сёлета?

Усяго найлепшага! Ад маіх — таксама. *Л. Войцікава.*

82. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

14 мая 1979 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Ці Вы ўжо атрымалі якую-небудзь вестку з "Нёмана"? Я Вам пісала, што прасіла этнографа Арсеня Сяргеевіча Ліса, каб зайшоў у рэдакцыю "Нёмана" і запытаўся, чаму яны маўчаць. Атрымала адказ, што быў, пытаўся. Абяцалі праз тыдзень (гэта было недзе 3-га ці 4-га) напісаць Вам. Канкрэтнага нічога не сказалі. А. Ліс меў уражаньне, што нават яшчэ не разглядалі пасланага матэр'ялу.

Бачыце, каб Вы знайшлі ў дзейнасьці "Пчалы" нешта *адмоўнае*, то напэўна адразу пайшло б у друк. А дзейнасьць пазытыўная ў Заходняй Беларусі — рэч падазроная...

Не дзівіцеся майму пэсымізму. У апошні час у Менску пачалі барацьбу з нябожчыкамі. Я Вам аб гэтым не пісала б, але ведаю, што цікавіцеся рознымі дакумэнтамі, так што і да Вашага ведама можа дайсьці тое, што тычыцца гэтага доктара-беларуса, і адразу даць фальшывы вобраз чалавека. Хачу адразу папярэдзіць.

Гэты Станіслаў Грынкевіч паходзіў з мястэчка Новы Двор Сакольскага павету — ад Гродна адна станцыя Бяляны (цяпер у Польшчы — Беластоцкае ваяводзтва). Я яго ведала як малога хлопчыка, калі паступаў у 1-ю клясу Гродзенскай дзяржаўнай гімназіі ў 1913 г. Але гэта ня мае значэньня...

Скончыў мэдыцыну. Пачаў навуку ў Вільні — канчаў (дзеля сямейных абставінаў) у Пазнані. Скончыўшы, нейкі час працаваў у Харошчы на Бельшчыне ў шпіталі, а пасьля прыехаў настала ў Вільню. Працаваў у 1-ай палікліліцы. Беларус-патрыёт, асьветнік, крыху пісьменьнік. Напісаў некалькі брашураў па мэдыцыне і гігіене. Езьдзіў шмат па З[аходняй] Беларусі, чытаў іх па вёсках як лекцыі. Яго марай былі народныя ўнівэрсытэты. Напісаў брашуру "Асьвета", якая была сканфіскаваная, а аўтар *адсядзеў* кару і заплаціў штраф.

Ці трэба гаварыць, што тут сярод нас заслужыў на пашану і глыбокую ўдзячнасьць і як лекар, і як чалавек. У 1943 г. (прыблізна), як шмат хто з віленскіх беларусаў, быў арыштаваны і вывезены. Недалёка — у Менску памёр у турме. Якая была яго віна — ніхто з нас не зразумеў...

Астаўшыеся пасьля яго працы — кніжкі — дагэтуль перахоўваліся ў фундамэнтальнай Бібліятэцы АН у Менску. Раптам цяпер — навіна! Кніжкі забралі і схавалі ад людзкога вока, бо: *няпраўда, што памёр у Менску, а выехаў за граніцу і там вёў шкодную для БССР работу...*

І гэта так катэгарычна гаворыцца... А праўда зусім іншая. Гэты наш др. Ст. Грынкевіч безумоўна памёр у Менску — год 1944 (мо пачатак 1945-га).

А ў Амэрыцы быў зусім іншы чалавек — таксама доктар, таксама Станіслаў Грынкевіч[1], але "малодшы" (няродны пляменьнік таго "старшага"), які радзіўся ў 1913 г., выехаў у 1947-м, памёр у 1966-м. Якая была там яго дзейнасьць — ня ведаю, і гэта няважна. Важна тое, што, ня ведаючы і не стараючыся ведаць дакладна, як і што, абвінавацілі нябожчыка, паднялі цэлую паніку, каб хто такога "вырадка" кніжкі ў рукі не дастаў...

Ня толькі я, але і іншыя, хто нашага д-ра ведалі, абураныя. Паміж іншым, добра яго ведаў і Мікалай Міхайлавіч [Марцінчык]. Я Вам аб др. Ст. Грынкевічу не ўспаміала, бо падумала, што да Вашай працы яго біяграфія не падыйдзе.

Але калі б Вас ён зацікавіў, змагу падаць загалоўкі яго працаў. Пакуль што маю толькі загалоўкі бэлетрыстыкі, але дастану ад яго сына і загалоўкі брашур па мэдыцыне. Толькі паведамце, калі ласка, ці гэта Вам спатрэбіцца.

Чакаю адказу і адрасу Вашага Інстытуту ці яго музэю. Усяго Вам найлепшага! *Л. Войцікава.*

P.S. Учора напісала ліст, а сяньня разарвала капэрту і дапісываю, бо забылася аб адной немалаважнай справе. Аб др. С. Грынкевічу зможаце шмат даведацца ад Мікалая Міхайлавіча, які яго добра ведаў асабіста і, як мне казаў, "вельмі шанаваў". Думаю, што гэта для Вас будзе паважным матэр'ялам.

Ці зьбіраецца на буру, ці якая іншая прычына, але чуюся выняткова нядобра. Хіба, ціск падняўся?

Ці не зьбірацеся часам у нашы архівы? Пытаюся аб гэтым усіх знаёмых, бо і я маю ў архівах справу, а тут у нас ніхто ня мае да іх доступу.

Бібліяграфія твораў др. Станіслава Грынкевіча: *"Асьвета"* прыблізна ў 1935 г. друкавалася ў "Беларускай крыніцы"[2]. Пасьля была выданая асобнай брашурай, але тады яе адразу сканфіскавалі. Адбыўся суд, які засудзіў аўтара на 2 тыдні арышту і штраф. *"Арлянё", "Царква", "Помста", "Вязьніца"* зьвязаныя адной тэмай, на падставе мясцовых падзеяў. *"Капля вады"* — прыродазнаўчае апавяданьне ў часапісі для дзяцей "Заранка". *"Узгадаваньне характару"* — "Студэнцкая думка", год 1928, № 2 (9). *"Аб прывычцы ў самаўзгадаваньні"* — "Студэнцкая думка", год 1928, № 3 (10). *"У братоў украінцаў"* — брашура-рэпартаж, год 1937.

8 і 15 сакавіка 1931 г. у памяшканьні Бел[арускага] інст[ытуту] гаспад[аркі] і культуры др. Ст. Грынкевіч прачытаў лекцыі на тэму *"Народныя ўнівэрсытэты"*.

Сьпісак брашур па мэдыцыне прышлю пазьней — як атрымаю ад сына др. Гр[ынкевіча].

Усяго добрага. *Л. Войцікава.*

83. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

26 мая 1979 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Сапраўды дзіўна, што др. Ст. Грынкевічам заняліся і Вы і я — адначасова. Але гэта і добра, бо Вы ўжо былі крыху падгатаваныя да гутаркі аб ім. Гэта чалавек, дзейнасьцю якога варта і трэба зацікавіцца.

Тое, што др. Ст. Гр[ынкевіч] друкаваўся ў г.зв. хадэкаў і чытаў у іх лекцыі, тое, што быў арыштаваны і памёр падчас сьледзтва ў Менску ў турме (год 1944–45), відаць, не папсавала яго апініі, бо яго творы да нядаўняга часу перахоўваліся ў фундамэнтальнай Бібліятэцы АН БССР і лічыліся вартаснымі.

Раптам знайшоўся чалавек, які — ці па сваёй умысловай агранічанасьці, ці па злой волі — зблытаў нашага др. Ст. Гр[ынкевіча] з другім доктарам — таксама Станіславам Грынкевічам, на гадоў дзесяць малодшым ад першага і яго далёкім пляменьнікам (ня родным), які выехаў за граніцу ў 1917 г. — ужо пасьля сьмерці нашага доктара і памёр там 10 красавіка 1966 г. Не стараючыся высьніць, ці мае справу з адным і тым самым чалавекам, ці не — прыпісаў творы старшага — малодшаму. Вось і паднялі беспадстаўную трывогу...

Што за злачынствы прыпісываюць малодшаму — ня ведаю. Бо якраз нядаўна выпадкова спаткалася я з беларусамі, якія таго малодшага ведалі

асабіста (я яго ня ведала) і адзываюцца аб ім як аб сумленным чалавеку. Але гэта няважна. Важна тое, што я паслала ў Менск падрабязную гэнэалёгію сям'і Грынкевічаў і атрымала адказ, што яна будзе перададзена загадчыку аддзелу рэдкіх кніг фунд[амэнтальнай] Бібл[іятэкі] — з тым, каб там справу выясьнілі і творы др. Ст. Гр[ынкевіча] вярнулі на належнае ім мейсца. Хачу спадзявацца, што гэтак будзе.

Ня думаю, каб брашуру "Асьвета" можна было дзе знайсьці, бо яна была сканфіскаваная. Але калі гэты матэр'ял першапачаткова быў надрукаваны ў "Бел[арускай] крыніцы", то, магчыма, яго можна знайсьці ў віленскіх архівах. Тое, што друкавалася ў "Заранцы" і "Студэнцкай думцы", можаце прачытаць у мяне. Я больш нічога ня маю, але, можа, даведаюся тут у каго, а мо трапіцца? Тады паведамлю.

Адрас Вашага Інстытуту я ўжо паслала знаёмаму, які будзе рабіць стараньні аб копію слоўніка. А вось ці варта пасылаць у музэй успаміны аб гуртку — я моцна задумалася. Ініцыятарам нашага гуртка быў ксёндз Францішак Грынкевіч — старшы брат др. Станіслава... Ужо адно гэта (*ксёндз*) палічаць "падазроным", і ўспамінаў людзкое вока не пабачыць. Фактычна дзейнасьць гуртка ніякага непажаданага напрамку ніколі ня мела, але што зрабіць, калі зразумець гэтага ніхто ня можа або проста ня хоча.

Атрымліваецца сьмешна (было б сьмешна — каб не балюча). У "Полымі" быў надрукаваны артыкул Сьц. Майхровіча "Мілеці Сматрыцкі", у якім аўтар даказывае, што "нацыянальная сьвядомасьць да беларусаў прыйшла праз царкву", ды яшчэ — царскую. А калі хоча абудзіць сьвядомасьць у моладзі ксёндз — то гэта скандал... Ну але хопіць — мне ж няможна нэрвавацца.

Чуюся дрэнна, нешта робіцца з галавой. Было шмат лепш, а цяпер зусім нядобра. Дачка і ўнук не пазваляюць нахіляцца, не даюць нічога рабіць на агародзе. Асталася безработнай.

Калі Вам што трэба, якія весткі — калі ласка, пытайцеся. Заўсёды з прыемнасьцю адкажу, што змагу. А ў мяне да Вас такая просьба. Нешта Мікалай Міхайлавіч [Марцінчык] пісаць перастаў, мусі, таму, што ня ўсе лісты даходзяць... Як ён быў у мяне апошні раз, я даведалася, што ён ведаў сястру і швагра нашай беларускай паэткі Канстанцыі Буйло, якая ад 1923 г. жыве ў Маскве.

І вось яна вельмі просіць адрас Мікалая Міхайлавіча, бо хоча ў яго распытаць аб жыцьці сваёй сястры. Ясна, я адрасу без дазволу Мікалая Міхайлавіча даць не магу, а няпэўная, што ад яго адказ атрымаю. Таму вельмі Вас прашу: запытайцеся М.М., ці магу паслаць яго адрас нашай паэтцы, і ці захоча ён ёй адказаць. Яна — хіба, адзіная пасьля мяне з часоў "Нашай нівы", і павінна карыстацца асаблівай увагай.

Выбачайце за клопат, які раблю маёй просьбай. Усяго найлепшага!
Л. Войцікава.

84. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

10 чэрвеня 1979 г.

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую за інфармацыі аб архівах Шутовіча. Перасылаць іх Ю. Туронку ня буду, бо ён сам у канцы чэрвеня прыедзе — тады і скажу.

Пісала мне неяк Ларыса Геніюш, што нехта з Менску прыяжджаў да яе, гаварылі аб выданьні яе зборніка. Яна была вельмі задаволеная, пісала, што адчула сябе бесьпячнейшай і менш самотнай. Шкада, што гэта быў толькі аднаразовы кантакт, і ня ведаю, з якімі вынікамі. Цяпер Л.Г. чуецца вельмі адзінокай, проста забытай. А становішча яе проста жахлівае, бо ці ж можа чалавек утрымацца з назначанымі ёй 33 руб. з капейкамі? Ёй памагаюць, як могуць, мясцовыя простыя людзі. Некаторыя проста хочуць забраць яе да сябе...

Але як жа гэта цяжка — апынуцца на чужой ласцы... Мае свой дамок і гарод. Толькі ня ведаю, ці хопіць ёй сілы ў гэтым гародзе працаваць, каб мець з яго карысьць.

Учора атрымала ад яе ліст, бо яна непакоіцца, што я доўга не пісала. А я хварэю.

Думаючы аб ёй і яе долі, напісала Вам. Бо сапраўды яе доля непакоіць мяне моцна. Падобна, што ня піша ёй ніхто, нават ад сына лістоў ня мае. Магчыма, лісты не даходзяць з той ці іншых прычынаў...

Усяго Вам найлепшага! *Л. Войцікава.*

85. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

16 чэрвеня 1979 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Ліст Ваш з 10 чэрвеня атрымала — дзякую. Дзякую за весткі аб М. М. [Марцінчыку]. Я ўжо (яшчэ перад Вашым лістом) з ім сьпісалася, яго адрас К. Буйло паслала.

Разумею яго — прападаньне лістоў можа непакоіць. Я М.М. прасіла, каб напісаў сваю хоць кароткую аўтабіяграфію ў мой рукапісны зборнічак біяграфіяў знаёмых мне людзей. Ён маю просьбу выпаўніў — напісаў, выслаў, а гэтага ліста і сьлед прапаў. Ня дзіва, што чалавек траціць усялякую ахвоту што-небудзь пісаць...

Тым больш, што амаль у кожным нумары "Маладосьці" друкуюць г.зв. "творы" (і то падпісаныя "дактарамі навук" або знанымі пісьменьнікамі!), у якіх — адна хлусьня паганяе другую. І што з гэтым можна зрабіць? Пратэставаць? Ясна — трэба. Але хто той пратэст пабачыць? Ён адразу пойдзе ў рэдакцыйны кошык...

Калі прачытаеце ў № 5 "Маладосьці" г.зв. "дакумэнтальную" аповесьць "Пасланец Праметэя"[1], зразумееце, чаму "Нёман" нават не адказывае Вам на Ваш артыкул аб "Пчале"[2]. Там жа ясна сказана, што "Праметэі" *ледзь цярпелі* розныя ўстановы — як Бел[арускі] банк, *каапэратывы*, розныя рэдакцыі... А чым мы шкодзілі бел[арускай], сапраўды беларускай справе? Працавалі ціха, аддана, бяз крыку, галоўнае — без усялякай фінансавай карысьці. А сяньня нам кажуць, што нас *цярпелі*...

Аб гэтым можна было б пагаварыць асабіста. Мне пісалі з Менска, што справу др. Ст. Гр[ынкевіча] "адробяць". Але я ведаю, што зрабіць брудную работу лёгка, а адрабіць — шмат цяжэй. Я маю надзею сабраць больш матэр'ялаў аб Ст. Гр[ынкевічу]. Біяграфію і сьпісак твораў мэдычных — то пэўна. А можа, што і з віленскіх архіваў.

У канцы гэтага месяца прыедзе з Варшавы адзін беларус у Вільню — шукаць у архівах сьлядоў свайго бацькі — былога студэнта-мэдыка Віленскага

ўнівэрсытэта. Пагавару з ім, каб зьвярнуў увагу і на сьляды Ст. Гр[ынкевіча]. Тым больш, што абодва мэдыкі, насколькі ведаю, былі знаёмыя. Усё, што даведа-юся, Вам перашлю. А калі захочаце прачытаць тое, што ёсьць у мяне, то, калі ласка, прыяжджайце ў першы-лепшы сьвяточны дзень. Гэта ж недалёка.

Пішаце, што выйдзе кніжка аб ТБШ? Напэўна, надрукуюць, што ТБШ "*кож-ны месяц з сваіх мізэрных сродкаў давала дапамогу на выданьне "Заранкі", хоць яна і не была прагрэсіўнай*"... А гэта ж грубая хлусьня! Я ніколі ніякай дапамогі ад ТБШ ня бачыла ў вочы. Ой як я ня веру ўсім "гістарычным дакумэнтам"...

Дзякую за памяць аб маім здароўі ці, ясьней, нездароўі. Нецікава. Ціск крыві 190/100 — з усімі кансэквэнцыямі. Не магу нахіляцца, не магу быць на сонцы. Проста — інвалід. А я жыць бяз руху, без работы ня ўмею.

Дзякую за прапанову помачы. Мне Мікалай Міхайлавіч [Марцінчык] пры-сылае парады і лекі. А цяпер, магчыма, той беларус з Варшавы прывязе мне лекі польскія, якія парадзіў (і прысылаў на пробу) Мік. Міхайлавіч.

Дзякую за клопаты аб успамінах аб Гродз[енскім] гуртку. Пры першай магчымасьці пасьля 18-га, калі мая дачка будзе ўжо ў адпачынку, вышлем на Вашае імя. Што яны ў экспазыцыю ня пойдуць, я больш чым пэўная, бо ініцыятарам і першым кіраўніком быў ксёндз! Хоць я магу запэўніць, што ў нас ніколі не былі закранутыя ніякія рэлігійныя тэмы. Гэта быў Францішак Грынкевіч — старшы брат др. Станіслава. Ня кажучы аб тым, што зарганізаваў белар[ускую] моладзь, гэта быў чалавек — апякун усёй гродз[енскай] беднай моладзі. Аплачываў школы, апранаў, карміў самых бедных. Пахаваны ў Гродне. Памяць захоўваюць аб ім, кладучы амаль цэлы год сьвежыя кветкі на магілу.

Усяго добрага. *Л. Войцікава.*

86. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

5 ліпеня 1979 г. Вільня

Паважаны Адам Яззэпавіч.

Справа такая. Я даведалася, што мае выйсьці кніжка пра Р. Шырму. Зразу-мела, будуць узяты пад увагу і яго ўспаміны ды артыкулы. Хто кніжку піша — ня ведаю. Звяртаюся да Вас, як да чалавека блізкага да спраў выдавецкіх. Вельмі пажадана было б не дапусьціць да паўтарэньня тых памылак, якія рабіў Р. Шыр-ма ў сваіх артыкулах і высказываньнях. Бо нашто ж заблытваць гісторыю?

Ня ведаю, ці Вы помніце артыкул у беластоцкай "Ніве", зьмешча-ны на юбілей (85 гадоў?) Р. Шырмы. Там былі такія радкі: "Р. Шырме запрапанавалі працу ў Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі... Пачаў працаваць у 1926 г. Але працаваў нядоўга, бо праз два гады гімназію закрылі" (гэта, мусі, значыць — зачынілі). Вынік — Віл[енская] Бел[аруская] гімназія ў 1928 г. перастала існаваць. Я адразу напісала ў рэдакцыю "Нівы": "Ці гэта злая воля, ці абыякавасьць аўтара артыкулу да гістарычнай праўды?". Рэдактар мне нічога не адказаў, але паказаў ліст мой аўтару — М. Гайдуку[1]...

Толькі цяпер, 31 красавіка, як М. Гайдук заехаў да мяне, справа высьнілася: вестка аб зачыненьні Віленскай Беларускай гімназіі ў 1928 г. узята з успамінаў Р. Шырмы... М. Гайдук на мяне не пакрыўдзіўся. Наадва-рот, сьцьвярджаючы, што я яго "вылаяла", сказаў, што гэта добра! Каб ізноў не скараціць існаваньне ВБГ аж на 16 гадоў... У артыкуле — яшчэ паўбяды, але ў кніжцы было б недаравальна.

Другое. У "Літаратуры і мастацтве", у аддзеле "Пошукі і знаходкі", былі надрукаваныя два вершы Сяргея Крыўца[2] з камэнтарамі — "вершы друкуюцца ўпершыню, арыгіналы перахоўваліся ў архівах Р. Шырмы". А ў сапраўднасьці абодва вершы друкаваліся ў "Заранцы" ў 1927 і 1928 гг. Прыслаў мне іх сам аўтар, які тады падпісываўся *Сярожа Пастушок*. Наагул, ён 89 г. нар[аджэньня], пачынаў друкаваць і вершы, і прозу ў "Заранцы". Ня ведаю, які Ваш пагляд на гэтыя справы і як зарэагуеце на мой ліст. Усё ж пішу. І прашу выбачыць, што турбую.

Мо будзеце ў Вільні? Калі ласка — заглянiце. Я бы Вам паказала "ўспаміны" аднаго чалавека, якія складаюцца пераважна з хлусьні.

Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

87. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

23 ліпеня 1979 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Толькі што атрымала Ваш ліст. Я яго чакала, бо такі спадзявалася, што Ліс не абміне падзяліцца з Вамі сваёй беспадстаўнай выдумкай. Учора выразіла яму сваё абурэньне. Як жа я магла пасылаць туды да друку тое, што тут даўно абгаворана з Вамі? Калі мяне папрасілі з Беластоку прыслаць ім у каляндар свае ўспаміны аб Г. Леўчыку, я насамперад запыталася ў Я. Саламевіча, што ён на гэта скажа, бо ведала, што гэтыя ўспаміны ён даў у зборнік Леўчыка. І толькі тады, калі напісаў мне "пасылайце абавязкова", я дала згоду і матэр'ял паслала. А тут такое...

Што паслала — гэта праўда, але папярэдзіла, што толькі яму асабіста, як памятку аб супольнай працы і каб спраўдзіць сябе — ці я ўсё добра помню, нічога не пераблытала, не дадала або не прапусьціла...

Ужо пару гадоў я праз супольных знаёмых атрымлівала ад той сям'і словы памяці і прыхільнасьці. А ў канцы 1978 г. паведамілі, што там зробленая рэпрадукцыя майго "Батанічнага слоўніка". Прыслалі фотастат бібліяграфічнай карткі, здымкі бібліятэкі, здымкі плякатаў з выстаўкі бел[арускай] кнігі падчас Скарынінскага юбілею. Іван Уладзіміравіч Саламевіч гэтыя здымкі бачыў, лісты чытаў.

Я абсалютна не разумею, чым каму-небудзь можа грэзіць мая прыватная карэспандэнцыя? Тым больш, што я ведала адно: "яго імені няможна ўспамінаць...". Ды мала каго няможна ўспамінаць — нават з тых, хто жыве тут у нашым Краі?

Што мне за інтэрас? Я магу мець свой пагляд. Каму гэта не падабаецца, што ж — трудна... Я прыстасаванцам ніколі не была і ня буду.

Здаецца, беларускай справе я дагэтуль ніякай шкоды не зрабіла, хоць вось ужо блізка 70 гадоў з ёю зьвязаная. Магчыма, і Вам маё становішча ў гэтай справе не падабаецца? Тады мой матэр'ял забярыце і вярніце мне. Неяк пражыву і гэтую прыкрасьць. Выбачайце за тон. Але сапраўды цяжка быць спакойнай у такіх абставінах.

Мушу дадаць, што я абрыўкі сваіх успамінаў пасылала шмат каму: тым, аб кім гаворыцца, каго ўспамінаю — яго асобу або працу. Скажаце — гэта ня тое самае? Магчыма. Мне так шмат прыйшлося спаткацца з няпраўдай, са злоснай хлусьнёй, што я вельмі мала веру, калі каго абвінавачваюць.

Але хопіць. Нэрвую Вас і сябе. З пашанай — *Л. Войцікава*.

88. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

10 жніўня 1979 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Сяньня атрымала Ваш ліст, за які ўдзячная, і зараз адказываю. Дабра, што "Нёман" адазваўся. Бяда толькі, што ў мяне вельмі непрыемныя ўспаміны (на практыцы) вынікаў іх "скарачэньняў". Там могуць такое зрабіць, што і самі сваёй работы не пазнаеце. Але мо на гэты раз матэр'ял папаў у рукі сумленнага чалавека, і ўсё будзе добра. Вам абавязкова прышлюць або адбітку, або і сам "Нёман".

Дзякую, што напісалі аб долі ўспамінаў "Гродз[енскі] гурток". Бо з музэю ніхто да мяне не пісаў. Што да біяграфіі др. Ст. Гр[ынкевіча] — маю падрабязную, ад яго сястры, і фота маю. Трэба толькі зрабіць адбітку для Вас. Тады ўсё разам прышлю.

Яго сына аб гэта прасіць немагчыма, бо ён быў зусім невялікім хлопчыкам (гадоў 11, 12), як бацькі ня стала. Ён быў самы старшы з дзяцей. Адна сястра — лекар — памерла год таму ад раку. Другая — біёляг. А аб самым малодшым нічога ня ведаю.

Дэталі аб старшым сыне даведаюся ад цёткі — сястры др. Ст. Гр[ынкевіча]. Знача — аб тым, дзе працуе. Жыве, здаецца, у Магдэбургу. Я прасіла, каб ён прыслаў сьпісак брашур бацькі аб мэдыцыне. Прасіла праз яго цётку, але нешта ні яна, ні іншыя сваякі ня могуць з ім скамунікавацца. Баяцца — ці ня хворы. У яго былі ўжо 2 інфаркты.

І фота, і біяграфію прыгатую, толькі паведамце, калі ласка, ці можна да Вас выслаць заказным. Пішу, што прыгатую, бо чуюся дрэнна. Толькі што быў у мяне доктар. Нібы ўсё добра — і ціск крыві, і пульс. Але знайшлася вада ў жываце, гэта, падобна, нягрознае, але вельмі мучыць і аслабляе. Запісалі ўколы — пабачым. Мучаць таксама болі галавы, склерозныя зьявы. Глытаю розную дрэнь, аж надаела...

Стараюся не дапускаць да сябе лені і адказываць своечасова на лісты, якіх, як заўсёды, шмат. Гэта добра — сувязь з жыцьцём, з людзьмі мне вельмі патрэбная.

Паправілася пагода — цёпла, сонца. Безьліч у нас кветак, самых розных. Ёсьць і грыбы, па якія часам хаджу. Бачыце, які з мяне герой? Як заўсёды, зьбіраю і сушу лекарскія зёлкі, не перастаю імі цікавіцца, а нават набіраю новай практыкі.

З Гродна атрымліваю лісты толькі ад Мікалая Міхайлавіча [Марцінчыка]. Другі гродзенскі знаёмы — Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] — піша вельмі рэдка. Мае шмат клопатаў — і на працы ва ўнівэрсытэце, і ў сям'і.

Усяго Вам найлепшага ў новых абставінах. Не забывайце. Шчыра вітаю — *Л. Война-Войцікава.*

89. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

19 верасьня 1979 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую за ліст, за весткі, і то добрыя, бо калі ня будзе ўспамінаў само-

га Р.Р. Шырмы — ня будзе прычыны непакоіцца аб сапраўднасьці апісаных фактаў. Здаецца мне, што там яшчэ знайшлася б не адна памылка, ня толькі аб гімназіі. Падставы маю, бо ведаю, што ў партыйных архівах (кніжка Говіна "Заходнебеларускі друк"[1]) захоўваецца такі запіс: "ТБШ са сваіх невялікіх сум кожны месяц выплачывала дапамогу "Заранцы" і г.д. І гэта тады, калі "Заранка" ні аднаго разу ніякай дапамогі ад ТБШ не атрымала. Але што было — тое было.

Даўна мяне інтрыгавала прозьвішча кампазытара Войціка[2]. Скуль ён? Мо які сваяк майго мужа?

З прыемнасьцю перашлю ўсё, што ведаю і помню аб Ф. Ш[антыру]. Перадусім трэба абгаварыць няяснасьці ў інфармацыі ў энцыкляпэдыі. Напрыклад, "чытаў лекцыі ў мужчынскай гімназіі ў Бабруйску" можна зразумець, што гэтыя лекцыі чытаў праз даўжэйшы час, а гэта была аднаразовая лекцыя.

Аб слуцкім часе ня ведаю амаль нічога. Хіба толькі, што рана страціў матку, меў мачыху і г.д., і што працаваў як хатні вучыцель у прыватных дамах — недзе пад Слуцкам. Затое час бабруйскі магу апісаць падрабязна, і то не з памяці, але паводле лістоў Ф. Ш[антыра]. Але тут адно "але". У Бабруйску Ф.Ш. адразу зарганізаваў аддзел Беларускай сацыялістычнай грамады і павёў вялікую работу: мітынгі — сялянскія і салдацкія і г.д., выданьне адозваў і распаўсюджваньне іх па вёсках. Гэта ад вясны (сакавік-красавік) 1917 г.— г.зн. пасьля лютаўскай рэвалюцыі.

Усё гэта — Б[еларуская] С [ацыялістычная] Грамада. Як гэта сяньня прымуць? Ня ведаю і таму чакаю на Вашую раду (хіба ў паразуменьні з працаўнікамі зборніка?). Калі такія весткі спатрэбяцца — напішу ўсё дакладна. Маю таксама, хіба, поўны сьпісак усіх твораў Ф. Ш[антыра]. Поўную бібліяграфію з датамі і г.д., якую мне ў свой час прыгатавала с.п. Юлія Бібіла. Так што чакаю на весткі і загад — што рабіць?

Аб часах слуцкіх мо што падасьць Сьцяпан Майхровіч. Ён сваяк (хіба далёкі) Ф. Ш[анты]ра. Ён (С.М.) мне некаліcь пару разоў пісаў, гаварыў аб супольных сваяках сваіх і Ф. Ш[анты]ра — але так блытана, што я нічога не зразумела.

А ў мяне да Вас такая справа: помніце, я Вам пісала, што мой знаёмы з Гродна др. Ігнатовіч, зацікавіўшыся "Беларускай борцю" і "Пчалой", напісаў артыкул "Таварыства "Пчала" і народная мэдыцына" і паслаў у "Нёман". Вельмі доўга ня меў адтуль ніякай весткі. Нарэшці атрымаў — матэр'ял разгледжаны, і просяць дазволу на скарачэньне і некаторыя папраўкі. Аўтар дазвол такі даў... Каб сам быў тут на мейсцы (у Гродне), то няхай бы сам цікавіўся, што з тых паправак выйдзе, але яго (др. Ігнатовіча) паслалі на 3 гады на працу ў ГДР.

І вось сядзіць там і непакоіцца, што з яго артыкулам зробяць? А я непакоюся, каб гэтыя "папраўкі" не зрабілі фактаў нязгоднымі з тымі маімі ўспамінамі, што цяпер у А. Разанава... Матэр'ял др. Ігнатовіча ў руках Ул. Глушакова[3]. Мо яго ведаеце? Проста ня ведаю, што рабіць... Праўда, час ёсьць, бо абяцаюць друкаваць за 6–10 месяцаў. Што Вы мне парадзіце? Выбачайце, што ўсё нейкія справы Вам падкідаю.

Усяго добрага. Ад маіх — прывітаньне. *З.В.*

P.S. А шкада, што Вы не змаглі прыехаць, у нас сёлета цудоўныя памідоры. І яшчэ доўга будуць.

90. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

1 кастрычніка 1979 г. Вільня

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, за павіншаваньне. Але чаму Вы мне дадалі адзін год? Каб бліжэй было да абяцанай сотні? Мне пайшоў "усяго" 88-ы...

Дзякую за весткі аб старых гімназіях. Якія былі тыпы — я ведаю, помню. Трэба яшчэ дадаць, што былі і дзяржаўныя, і прыватныя, і мужчынскія, і жаночыя. А вось што трэба было ведаць да экзаміну — я Вас ня вельмі разумею. Ці гэта значыць, што навука стаяла настолькі вышэй, і ў 1-ю клясу паступаючы, трэба было ведаць тое, што сяньня праходзяць у 2-й? Але сяньня вучацца шмат даўжэй — ня 8 (як у мужчынскіх было), а 10–11 гадоў. Мо гэта на адно выходзіць? Наскольki помню, прыймалі ў 1-ю клясу без дакладнага вызначэньня гадоў. Паступалі, маючы 9, 10, а то і больш гадоў.

Што да кніжкі аб Р.Р. Ш[ыр] ме... Яе меў выдаваць Саюз кампазытараў, і іх сакратар папрасіў у А. Мальдзіса мой адрас, маючы прасіць, каб я прыняла ўдзел у гэтым выданьні, а мо яшчэ парадзіла, да каго зьвярнуцца. Я падумала аб Вас, лічачы, што Вы ведалі Р. Ш[ырму] па працы ў ТБШ. Я, зразумела, адмовілася — замала нябожчыка ведала, а што ведала — не надавалася да пісаньня.

Але справа зьмянілася. Падобна, прыймуць удзел у гэтай кніжцы і літаратары, і яны будуць выдаваць. Значыцца, людзей хопіць. Ясна, што аб віленскім часе жыцьця Р. Ш[ырмы] ведаюць *там* тое, што ён сам аб сабе казаў. Аб "вельмі дрэнных, цяжкіх умовах" і г.д. Ну, няхай пішуць. Крыху менш фальшу ці крыху больш — розьніца невялікая.

На "віну" літоўцаў [redacted] гляджу крыху інакш. Ёсьць і цяпер літоўцы, прафэсары, пісьменьнікі, якія цікавяцца бел[арускай] літаратурай і самі добра пабеларуску гавораць. У нашай мове вітаюць менскія дэлегацыі. А што яны вінаваты, што якраз *беларускія* дэлегаты адказываюць па-расейску? А гімназія? Яе зачынілі ў 1944 г. увосені. Хто зачыніў — Вы ведаеце. А польскую гімназію аставілі ў спакоі, і яна па сёньняшні дзень існуе. А нават пры Пэдінстытуце ёсьць польскі факультэт. Як жа літоўцы маглі ісьці проціў тых уладаў, якія нашую гісторыю зачынілі? Тут жа адзіная палітыка...

Учора адзін з гасьцей (паміж іншым — расеец) прынёс мне кніжку "История Вильнюского университета имени Капсукаса"[1], выданую да 400-годзьдзя. Я яе яшчэ дакладна не прачытала, але, хіба, самахвальства хопіць. Вельмі хачу здабыць гэтую кніжку і для Вас. Але ня ведаю, ці ўдасца, бо тыраж малы і, падобна, мамэнтальна хапаюць.

Пяройдзем да цікавейшых, прынамсі, важнейшых справаў. Якія зёлкі Вы хацелі б мець да ваннаў? Калі я ня маю, то мо тут у спэцыяльнай аптэцы зялярскай нешта знойдзецца. Зьбіраць, вядома, ужо не пара — нічога німа апрача мэлісы, якую [redacted] яшчэ пазаўчора зрэзывала. Я глядзела ва ўсіх сваіх зёлкавых кніжках — наагул да ваннаў нічога німа ў такой хваробе, як Вашая.

А для мяне пачаўся найгоршы час. Цэлы дзень адна, ад хаты не адыйду, а дзень штораз карацейшы. Як унук прыйдзе, то ўжо цямнее — німа калі парухацца на сьвежым паветры. Бо хатняя мітусьня ня мае таго значэньня. А бяз руху страўнік зусім бастуе. Думаю, што і сокаў у ім не хапае, таму ўсё камянее. А розныя сродкі па пэўным часе перастаюць дзеяць. Але неяк будзе.

Ледзь не забылася напісаць аб адной падзеі, хоць, магчыма, М. Маслоўская[2] і сама напіша Вам. У прошлым тыдні адкрылі мэмарыяльную

дошку на Віленскай, 12 — у гонар Б. Тарашкевіча. Толькі, па-мояму, яна там прыбіта не як Б. Т[арашкеві]чу-беларусу. Праўду сказаць, у якой мове — ня ведаю. Але, як казала п. Марыся [Маслоўская], не было ў прамовах ні слова пабеларуску. Ды прыехала з Масквы "жонка" Б. Тар[ашкеві]ча, якая сябе лічыць яго "сподвижницей" і ўсюды выступае. Яна і ў Польшчу езьдзіла. Добра, што Вера Андрэеўна не прыяжджала...

Усяго найлепшага. Чакаю адказу аб зёлках. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава*.

91. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

28 кастрычніка 1979 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Як жа я рада была, атрымаўшы Ваш ліст. А яшчэ больш буду рада, калі сапраўды зможаце прыехаць — хоць на некалькі гадзін. Не забывайце, што мне пайшоў ужо 88-ы год — а гэта нешта значыць.

У чэрвені і ліпні я вельмі дрэнна чулася, але пасьля прыняла шмат розных уколаў і палепшала. Не скажу, каб была зусім здаровая, але маю больш сілы. Па-даўнейшаму ўсё ўдома магу сама зрабіць, а і на гародзе крыху памагала пад восень, чаго вясной і летам рабіць не магла.

Ня помню, ці я Вам пісала, што др. Ігнатовіча паслалі на 3 гады працаваць у ГДР. Выехаў 23 красавіка, а я якраз у гэты самы дзень выслала на яго адрас бандэроль з успамінамі аб Гродзенскім гуртку — для Гродзенскага музэю. У гэтую бандэроль улажыла і ліст для адрасата. Даведаўшыся, што ён выехаў (перад выездам напісаў мне ліст), я зараз жа напісала да яго жонкі і яшчэ папрасіла др. Марцінчыка, каб пазваніў ёй, і прасіла выняць з бандэролі мой ліст і пераслаць яму. Так і зрабілі. Пасьля др. Ігнатовіч напісаў мне, што яго жонка пыталася, што рабіць з успамінамі. Ён ёй адказаў, каб аднясла ў музэй і аддала ў рукі той асобе, з якой ён раней аб гэтым матэр'яле гаварыў.

Вельмі было б добра, каб Вы змаглі заглянуць у музэй і паглядзець, ці мае ўспаміны аддадзеныя туды, і што з імі зрабілі. Не думаю, каб яны трапілі ў экспазыцыю, але няхай бы хоць у фондах былі, а не дзе-небудзь пад лаўкай, дзе іх ніхто не пабачыць.

Пацікавіцца Горадзенскім гуртком бел[арускай] моладзі самая пара, бо якраз у гэтым месяцы мінула 70 гадоў ад дня яго заснаваньня. Немалы юбілей. І для мяне асабіста, бо выходзіць, што я 70 гадоў таму пачала крыху кратацца пры беларускім руху. І таму цяпер я часта думкамі ў Гродне... Не сягоньняшнім, а тым нашым, старым і вельмі для душы мілым, як родны горад майго бацькі і маёй маладосьці

Што да артыкула др. Ігнатовіча, то і аб гэтым ён мне пісаў, ужо *адтуль*. Нарэшці, з "Нёмана" яму напісалі, што калі згодзіцца на скарачэньне і на некаторыя папраўкі (якіх, праўду сказаць, баюся), то артыкул пойдзе праз 6–10 месяцаў. Ён такую згоду даў, бо, як піша: "Няхай хоць скарочана, абы пайшло". Пабачым, што будзе.

Аб сьмерці Вашай выкладчыцы[1] Вы мне пісалі. Страшная хвароба, і так шмат ахвяр забірае... Тое самае тут у нас. Хварэе на рак загадчыца катэдры германістыкі ў тутэйшым пэдынстытуце. Цэлае лета ляжала ў клініцы. Зрабілі апэрацыю. Цяпер паехала ў санаторыю. Усё гэта адбіваецца на маёй дачцы:

вядзе, як заўсёды, свае лекцыі (гісторыю нямецкай мовы) і адначасна замяняе загадчыцу катэдры. Працуе часта па 12 гадзін на дзень. Уяўляеце, як гэта дзеіць на здароўе? Пры гэтым стараецца як мага часьцей бываць тут у нас, каб мы з унукам не чуліся такімі пакінутымі.

Лета прамінула нядрэнна, бо ўсе мае мелі адпачынак і ўсе былі тут разам. Паміма ня вельмі спрыяючага надвор'я — то гарачыня і суша, то халады — на ўсю агародніну быў добры ўраджай. Асабліва ўрадзілі агуркі і памідоры. Памідораў сабралі 173 кіляграмы! Позьнія гатункі былі пасаджаныя ў цяплярні, як пачаліся халады — абаграванай, так што ня так даўна скончылі іх зьбіраць. І цяпер маем нямала і сьпелых, і зялёных. Цяпер у абаграванай цяплярні растуць салята і радыска. Усё гэта — заслуга майго ўнука, які ўвесь вольны час аддае працы ў садзе і на агародзе.

Справы агульныя ў Вільні нецікавыя, а нават сумныя. 27 верасьня адкрылі мэмарыяльную дошку памяці Б. Тарашкевіча на Віленскай, 12, дзе ён жыў. Быццам добра? Але пры адкрыцьці ніхто ні слова не сказаў па-беларуску, а дошка ў 2 мовах — *літоўскай* і *расейскай.* Як Вам гэта падабаецца?

Чакаю весткі ад Вас і прыезду. Што былі ў Зэльве, я ўжо ведала ад Ларысы Антонаўны [Геніюш]. Гэта вельмі добра, што яе адведалі.

Усяго найлепшага Вам і сям'і. Бывайце. *Л. Войцікава.*

P.S. Ужо заклеіла ліст, як прыпомніла сабе, што не напісала нічога аб працы З. Абрамовіча ў ГГБМ. Вы вельмі добра адчулі, што ў тым напісаным артыкуле ня ўсё ў парадку. Наагул, З. А [брамові]ч вельмі любіць і любіў даваць волю сваёй фантазіі. Шмат што перабольшывае ў сваёй біяграфіі, ня зьвязанае з працай грамадзкай, як напрыклад, сказы аб "генэральстве" бацькі, "люксусовай віле", "службе на фронце". Няхай сабе, гэта нікому ніякай шкоды не прыносіць.

Але што да працы ў гуртку, то ён невялікі ўдзел прыймаў, бо ўжо ўвосень 1910 г. выехаў з Гродна. Прыймаў удзел толькі ў першым спэктаклі ў 1910 г., калі ігралі "Па рэвізіі". Тады сапраўды быў крыху рэжысёрам, але больш грымíраваў артыстаў, сам не іграў. Пяяў толькі з сяброўкай Юзяй Касацкай "А хто там ідзе". Калі мы ўвосені з гэтым спэктаклем паехалі на вёску, ён ужо з намі ня езьдзіў. Аб далейшай працы, спэктаклях, выездах на вёскі ведаў ад мяне. З маіх лістоў, расказаў пры спатканьні ў Менску і з маіх успамінаў, якія я яму паслала.

Магчыма ён і не арыентаваўся добра, што помніць з пражытага асабіста, а што з маіх слоў, бо ён ужо 15 чэрвеня скончыў 87 гадоў, часта хварэе, ад 1940 г. жыве ў Польшчы. Сям'я — жонка, дачка і сын — беларускімі справамі не цікавяцца, і ён ня раз жаліўся, што чуецца вельмі самотным. І так трэба дзівіцца, што ў такіх абставінах патрафіў захаваць чыстую, прыгожую мову.

Л. Войцікава.

92. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

8 лістапада 1979 г. Вільня

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Учора атрымала Ваш ліст. Дзякую за ўсе адказы, асабліва ў справе школаў. Не хапае мне яшчэ адной весткі: ці праграма тых 4-клясных школаў раўнялася з праграмай 4-кляснай гімназіі? Ці была ніжэйшай? Калі гэта буду ведаць, то ўжо Вам гэтай справай дакучаць ня буду.

Аб літоўска-беларускіх адносінах пісаць ня буду. Мы тут маем іншыя пагляды, абапёртыя на асабістых перажываньнях. Я не скажу, каб мела да літоўцаў асаблівы сантымэнт, але і мясцовых, астаўшыхся беларусаў выбеліваць не бяруся. Увесь час każdy sobie rzepką skrobie[1]. Ніякага пачуцьця салідарнасьці або абавязку ў нікога німа. І то чым далей, тым горш.

Цяпер гэтая гісторыя з адкрыцьцём мэмарыяльнай дошкі ў гонар Бр. Тарашкевіча — гэта ж скандал... Бярэцца за справу чалавек, вельмі недалёкі па разьвіцьцю, а таму заразумелы. З нікім не параіўшыся, нікога не пытаючыся, напісаў ліст да Сьнечкуса[2] (хто ён там такі — сакратар партыі ці што), што трэба абавязкова ўшанаваць Б. Тарашкевіча. Той і ўзяўся зьбіраць матэр'ялы ды наладжваць сьвята. Беларусаў паведамілі ў апошнюю мінуту.

Назначылі адкрыцьцё 27 верасьня — у рабочы дзень, у рабочыя гадзіны, пра браме Віленская, 12. Прыйшла малая жменька людзей. Ніхто па-беларуску не сказаў ні слова, а дошка ў 2 мовах — літоўскай і расейскай... Галоўную ролю іграла выпісаная з Масквы *жена* і *сподвижница* Ніна Аляксандраўна Тарашкевіч*. А ў беластоцкай "Ніве" А. Бэргман з захапленьнем піша, як Вільня "ўшанавала" *беларускага* дзеяча і г.д.

Прайшло больш месяца, а я не магу аб гэтым спакойна думаць. Які сорам для беларусаў, і то праз гэтага ідыёта (выбачайце) сваяка Т[арашкеві]ча Антона Янкоўскага[3], які ўсё бярэ на сябе — такая важная асоба — і ўсю справу аддае ў чужыя рукі. Ці ж літоўцы мелі сьцерагчы гонару беларусаў? А ня самі беларусы ў асобе А. Янкоўскага, які выдае сябе за дзеяча...

Магчыма, ад усяго гэтага вельмі дрэнна чуюся. Са страўнікам штораз горш. Хіба, проста нэрвіца!

Вашы запісы, што прыймаць ад болю жывата, дачка трымае пад рукой і корміць мяне цэлы дзень то тым, то другім. Бо якраз 4 дні сьвята Кастрычніка, і яна ўдома.

Мела я ліст ад Янкі Хвораста. Піша, што чуецца крыху лепш і мае надзею яшчэ больш папраравіцца. Дай яму Божа.

У канцы кастрычніка схапілі маразы. Мы кінуліся накрываць усе расьліны, што маглі зьмерзнуць: вінаград, ружы, а таксама маладыя трускаўкі, якіх унук пасадзіў увосені 300 штук. Усё засыпалі сухім лісьцём, якога я шмат награбла. Але пару дзён былі вялікія вятры, і ўсё лісьцё паляцела. Цяпер прыгатаўляем яловыя лапкі, каб ізноў усё накрываць. Добра, што пакуль гэтага рабіць ня трэба — пацяплела да +5.

2 лістапада ў нас былі Задушкі. Я з дачкой і зяцем езьдзіла на могілкі. Вазіў нас (як і штогод) знаёмы інжынер сваёй машынай. Насамперад паехалі на могілкі, дзе пахаваныя нашыя родныя — с.п. мая маці, яе сястра, мой муж і сын. А пасьля паехалі на Росы — на магілу Ядвігіна Ш., архітэктара Лявона Дубейкаўскага і маёй сяброўкі з Горадзенскага гуртка бел[арускай] мол[адзі]. Усюды палажылі кветкі і запалілі сьвечкі. На Росах ёсьць і больш беларускіх магіл, але цяжка да іх дайсьці, як цёмна. А прыходзіцца ехаць увечары, як усе вернуцца з работы.

Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

*Сам А. Янкоўскі — ініцыятар,— зразумела, быў, але, мусі, маўчаў — гэтага ня ведаю.

93. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

15 лістапада 1979 г. Вільня

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Перада мной тры Вашых лісты — з 6, 10 і 11 лістапада. За ўсе шчыра дзякую, быццам гутарку са мной вядзеце. Гэта моцна падтрымлівае на духу. Бо я найчасьцей атрымліваю лісты ад тых, што нечага ад мяне патрабуюць — нейкай весткі, нейкага факту і г.д. Гэта ўжо не безінтэрэсоўная гутарка...

А то бывае і так, што пашлю матэр'ял, аб які просяць, а яны нават не паведамяць, ці атрымалі... Аж злосьць бярэ. Праўда, ня ўсе такія. Ёсьць і вельмі ветлівыя, тактычныя людзі.

Цяпер ужо ня так шмат лістоў атрымліваю, як бывала. Гадоў 5 таму ў працягу трох месяцаў атрымала 172 лісты і — пахвалюся — на ўсе адказала.

Дзякую за весткі аб Хворасту і Новіку. Хворааст ня так даўна пісаў, але гэта было, відаць, раней, чым прастудзіўся. А ад Новіка ня маю адказу на свой апошні ліст. Цяпер прычына ясная. Але ў яго і стэнакардыя, і то вельмі даўняя. Гэта, хіба, горшае, чым вантроба.

Шкада, што ня хочаце папрабаваць пазнаёміцца з Новікам, пакуль што лістоўна. Знайсьці прычыну да першага ліста ня так цяжка, а да вясны далёка. Ён у аграмадным Менску вельмі адзінокі, і атрымаць ад Вас ліст было б яму вельмі прыемна.

Верш М.Т. чытала ў "Ніве"[1] (я яе атрымліваю — выпісаў для мяне Ю. Туронак). Верш сам па сабе прыгожы, глыбокага зьместу. Магчыма, ёсьць шмат людзей, якія такую веру маюць і хаваюць яе ў глыбіні душы. Але ці ня страцяць яе, прачытаўшы той верш і ведаючы, што ў аўтара ў вершы — адно, а ў жыцьці — зусім другое? Асабліва што тычыцца мовы. Ён у яе верыць! То чаму ж яна яму служыць толькі для "красного словца"? А што *там* мова штораз больш зьнікае са штодзённага ўжытку — на гэта прыкладаў усё больш і больш.

Ці Вы ведалі ў свой час такога зіц-рэдактара Серафіма Татарына[2]? Ён з Зэльвенскага раёну, з вёскі Вострава. Ужо шмат гадоў я з ім час ад часу перапісывалася. Ён раз, будучы праездам у Вільні, нават адведаў мяне. Заўсёды пісаў па-беларуску, нават даволі чыста. Зразумееце маё зьдзіўленьне і абурэньне, калі цяпер на сьвята Кастрычніка прыслаў паштоўку не па-беларуску... Сама ня ведаю, як зарэагаваць на гэта.

У апошнім лісьце я Вам апісала "ўрачыстасьць", якая тут у Вільні адбылася. Кожная думка аб гэтым нанава выклікае абурэньне. Калі чытаеце "Ніву", то ўжо напэўна чыталі артыкул А. Бэргман аб гэтай "урачыстасьці". Цешыцца... Учора атрымала ад яе ліст — паўтарае сваю радасьць і шкадуе, што Вера Андрэеўна не была. А паводле нас — гэта яе шчасьце. Хоць крыху нэрвы заашчадзіла. Арганізатары спэцыяльна выпісалі з Масквы *жену и сподвижницу*, каб паставіць яе на першае мейсца.

Пасылаю Вам здымак з гэтай "урачыстасьці". Пазнаеце там знаёмых. А з правага боку, каля стала ў белым плашчы — госьця з Масквы.

Вельмі доўга я не адказывала Канстанцыі Антонаўне Б[уйло], а яна чамусьці шле мне надзвычайна сардэчныя лісты. Мо таму, што мы дзьве помнім нашаніўскія часы, і гэта нас зьвязывае? Нарэшці ўчора напісала ёй даўгі ліст.

Але засядзелася... Трэба канчаць, а то ня вельмі добра чуюся. Баліць пад лыжачкай і пад рэбрамі і часта падымаецца як бы нейкая хваля аж пад горла, і ў вушах робіцца горача. Было гэтак і вясной. Лекарка казала, што пасьля

ўколаў пройдзе. І праўда — нейкі час не было, а цяпер ізноў.

Аб новай сэрыі ўколаў німа чаго і думаць — мая мэдсястра зімой хадзіць да мяне ня зможа. Трэба ратавацца нечым іншым. Пастанавіла аб хваробах не пісаць і ня вытрымала — пажалілася...

Я так рада, што Вы трымаецеся нядрэнна! Каб і далей так. Усяго добрага! *Л. Войцікава.*

94. ФЁДАРУ ІГНАТОВІЧУ

11 сьнежня 1979 г. Вільня

Паважаны Фёдар Іванавіч.

Вельмі была рада, атрымаўшы ад Вас вестку. Вашае становішча разумею і спачуваю. Што да рэдакцыі "Нёмана", то гэта, здаецца, агульная хвароба менскіх выданьняў. Яны *ведаюць лепш*, чым аўтар, і таму з аўтарам ня лічацца. Я ўжо гэтакае паспрабавала на ўласнай скуры. Робяць што хочуць: скарачаюць, папраўляюць, пераіначваюць. І німа на гэта рады.

Вельмі мяне зьдзівіла вестка, што др. Марцінчык "канчае 80 гадоў". А мне ён казаў, што толькі на паўгода маладзейшы ад мяне, а мне пайшоў ужо 88-ы год... Што аб ім пішаце — вельмі добра. Ён гэтага варты. Тут, хіба, ня знойдзецца ніхто, каб гэтым заняцца.

А Мікалай Міхайлавіч нічога ня піша — ніякіх успамінаў. Кажа, што "неяк ня клеіцца". Летам прыяжджаў у Вільню разы тры, але кожны раз, як казаў, гэтыя падарожы перахварэў.

Я яшчэ сяк-так трымаюся. Пішу шмат лістоў і памагаю тым, хто піша пра даўнейшыя часы, а фактаў не хапае. Цяпер мяне просяць напісаць успаміны пра Уладыслава Галубка — драматурга і арганізатара аб'язднога тэатру. Я Галубка вельмі добра ведала ў 1915, 16, 17 гадах. Трэба просьбу споўніць. Хоць часам цяжкавата сядзець доўга. Але пакуль чалавек жыве, мусіць нешта рабіць.

Калі толькі зможаце — пішыце. Я часта аб Вас думала. Матэр'ялы аб др. Ст. Гр[ынкевічу] высылаю. Усё, што змагла сабраць. Крыніцы пэўныя: яго родная сястра і яго пляменьнік. Тая яго цёмная справа, здаецца, выясьняецца — так мне пішуць. Калі што даведаюся — напішу.

Усяго найлепшага! Сардэчна вітаю — *Л. Войцікава.*

Д-р Станіслаў Грынкевіч

Радзіўся 2 лютага 1902 г. у мястэчку Новы Двор былога Сакольскага павету Гродзенскай губэрні (цяпер Дуброўскі павет Беластоцкага ваяводзтва). Бацька — Сымон Грынкевіч, матка — Магдалена з Шыманскіх.

Першапачаткова вучыўся ў вясковага вучыцеля, які яго прыгатаваў да экзаміну ў гімназію. У 1912 г. здаў экзамін і быў прыняты ў Гродзенскую дзяржаўную мужчынскую гімн[азію]. У 1914 г., у пачатку 1-ай сусьветнай вайны, выехаў са сваім пэршастрэчным (дваюрадным) дзядзькам у Дарагабуж Смаленскай губ[эрні]. Там далей вучыўся ў гімназіі. Скончыўшы 7 клясу, вярнуўся ў Новы Двор.

Доўга не чакаючы, паехаў у Варшаву прыгатаўляцца да матуры. Жыў у інтэрнаце. Здаўшы матуральныя экзаміны, паступіў у Віленскі ўнівэрсытэт на мэдыцыну. Але змушаны сямейнымі абставінамі, канчаў мэдыцыну ўжо ў Пазнані. Скончыўшы, пачаў працаваць у мэдычнай клініцы — да 1935 г.

У 1935 г. прыняў запрапанаваную яму працу ў Псыхіятрычнай клініцы ў Харошчы (на Бельшчыне) — як спэцыяліст псыхіятр-нэўроляг. Працаваў як ардынатар аддзелу нэрвовахворых, адначасна вёў у лябараторыях досьледы і пісаў аб іх працы ды перакладаў працы мэдычныя з іншых моваў.

У той жа час пісаў па-беларуску папулярныя мэдычныя брашуры для сялян. Перад самай 2-й сусьветнай вайной (ці не ў 1937-м) прыехаў з сям'ёй у Вільню, дзе адразу пачаў працаваць у 1-ай паліклініцы (тады — вуліца Міцкевіча, сяньня — Ленінскі праспэкт).

Жыў пад Вільняй у Ерузалімцы, дзе меў невялікі дамок і сад (сам садзіў) ды агарод, каторымі ў вольны час з захапленьнем займаўся. І сваіх 4-х дзяцей (2 сыны і 2 дачкі) да працы прывучаў.

У Вільні пісаў артыкулы ў розныя беларускія часапісы ("Студэнцкую думку", "Крыніцу", "Заранку"). Езьдзіў па вёсках, чытаючы лекцыі па-беларуску на тэмы мэдычныя.

Выдаў у 1937 г. брашуру "Асьвета", якую сканфіскавалі. Адбыўся суд — прысудзілі 2 тыдні турмы і штраф.

Пасьля падарожы ў Львоў выдаў брашуру "У братоў украінцаў" (1937). Арыштаваны ў 1944 (ці 1945) г. Вывезены ў Менск, дзе падчас сьледзтва памёр.

Сын др. Ст. Гр[ынкевіча] Вітаўт Грынкевіч працуе кураторам асьветы ў Эльблёнгскім ваяводзтве. Старшая дачка Вольга — лекар, памёрла ў 1935 (1936?) г. на рака. Муж яе — беларус з Ашмяны, памёр у 1979 г. Аб дваіх малодшых вестак ня маю.

Жонка др. Ст. Гр[ынкевіча] пасьля сьмерці мужа выехала з дзяцьмі ў Польшчу.

Літаратурныя працы др. Ст. Гр[ынкевіча]: "Арлянё", "Царква", "Помста", "Вязьніца", "Пра тэатр", "Жаніцьба праз радыё" (сцэнічны твор), "Рады хворым і здаровым", "Як лячыць хваробы хатнім спосабам", "Асьвета", "У братоў украінцаў".

Мэдычных брашур было, хіба, больш, але аніяк не ўдаецца дастаць поўнага сьпіску. Калі што даведаюся — дашлю.

95. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

27 сьнежня 1979 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую за добрыя пажаданьні. Дзякую таксама за пасланую копію Вашага артыкула. Што да датаў нараджэньня і сьмерці Ф. Ш[антыра], няхай так застаецца. Я і сама іх ня вельмі пэўная. Дата нараджэньня, хіба, правідловая, бо ведаю добра, што ён быў старэйшы за мяне на 5 гадоў. А што да сьмерці? Я ў Гродне прачытала ў "Бел[арускай] газэце"[1] — быў паданы 1921 год. Пасьля С. Майхровіч падаў мне 1919 год. З гэтай апошняй датай цяжка пагадзіцца. То няхай будзе сярэдняя — 1920.

Як думаеце, ці не перастравіць весткі аб надрукаваньні ў Слуцку брашуры "Патрэбнасьць нацыянальнага жыцьця..." на 1917 г.— перад "Сьвяты Божа"? Бо так, фактычна, было.

Рэшта ўсё — вельмі добра, коратка і ясна. Мушу дадаць, што выбар яго на камісара нацыянальных справаў спаміж кандыдатаў-беларусаў выняткова правідловы, бо У. Фальскі — на камісара замежных справаў, а Я. Дыла — справаў

гаспадарчых — зусім не на мейсцы. Трэба было наадварот. У. Фальскі — вельмі добры арганізатар, на тое, каб займацца замежнымі справамі, быў замала адукаваны і разьвіты, а Я. Дыла — у справах гаспадарчых. Сумліўна. Ну што ж, гэта было "часовае", а значыць, мала важнае...

А цяпер такая справа. Думаю, што Гродна ў "Зборы"[2] займе сваё мейсца, як і павінна быць. Ці ня можна было б паказаць супрацоўнікам "Збору", каб хоць некалькімі словамі ўспомнілі аб існаваньні ў Гродне ад 1909 па 1913 г. Гродзенскага гуртка беларускай моладзі? Наш гурток праз гэты кароткі час зрабіў нямала дзеля ўсьведамленьня беларусаў Гродзеншчыны. Спэктаклі ў горадзе і па вёсках, распаўсюджваньне календароў (выпісывалі кожны год па 100 штук) "Нашай нівы", літаратуры зрабілі сваю справу. Вясковая моладзь, асабліва Сакольшчыны, добра знаёмая была з творамі Ф. Багушэвіча і шмат яго вершаў ведала на памяць. Я і сягодня перапісываюся з тымі, хто або быў у гуртку, або знаёмы быў з яго дзейнасьцю. Сьлед астаўся... А як Вам здаецца? Ці варта?

Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

96. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

19 студзеня 1980 г.

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Сяньня атрымала Ваш ліст — дзякую. Акрамя "Роднага слова"[1] тысяча прычын, каб ужо зусім страціць нэрвы. Я "Р[однага] сл[ова] " ня бачу і ня чую, але з прысыланых сцэнарыяў і вестак у лістах ведаю, што і як там робіцца. І — не маўчу.

У апошнім тыдні атрымала 2 лісты, адзін за другім, ад Ф.М. Янкоўскага[2]. Я з ім асабіста незнаёмая, толькі лістоўна. Ён мяне называе па псэўдоніму — Зоська Верас. Яму пакуль што аб "Р[одным] с [лове] " нічога не пісала, бо былі іншыя справы. Але Содалю проста напісала, што калі ён хоча, каб "Р[однае] с [лова] " рабіла нейкую добрую справу, то перадусім вядучыя павінны навучыцца гаварыць па-беларуску. Навуковых тытулаў замала, каб мець права вучыць іншых. Што ўсе "вучоныя" зьвяртаюць увагу на граматыку, сынтаксыс і г.д., чаго ня кожны са слухачоў зразумее. А вось чаму не бяруць пад увагу слоў, назоваў, якія ўжываюцца штодзённа ў кожнай сям'і, слоў, чужых для беларускай мовы, як: *каструля, крышка, суп, соус, іменна, пастаянна, прама* і г.д. Чаму? Таму, што самі ў сябе ў хаце так гавораць? І прынялі такую "беларускую" гутарку за нармальную?

Я шмат з кім ужо гадамі знаёмая і перапісываюся, але заўважыла, што і ў тых найлепшых пісьменьнікаў мова штораз горшая і горшая. У Беластоку ня лепш. А дзе добра, чыста гавораць па-нашаму? У ЗША. Каб Вы ведалі, якая прыгожая мова ў Вітаўта Т[ума] ша[3], у Баляслава Грабінскага[4].

Вось успомніла др. Грабінскага... Атрымала ад яго вялікі ліст на 4 старонках канцылярскай паперы. Як жа я была рада... Аж сорамна, што да гэтай пары не адказала яму. Толькі нядаўна я даведалася, што ён быў сябрам Гродзенскага гуртка бел[арускай] моладзі. Праўда, з самай малодшай сэкцыі — меў гадоў 12–13. Я яго помніць не магла, бо такіх хлапчукоў было ў нас каля 20. Ну а ён пад зьмененым (па мужу) прозьвішчам мяне таксама ня ведаў. Так і пражылі ў Вільні гадоў 20, ня ведаючы, колькі ў нас супольных знаёмых з гуртка. А цяпер я рада, што маю з кім успамінаць тых, з кім бачылася, хіба,

кожны дзень гадоў 70 таму. Ён нават маю кватэру на Гараднічанскай вул[іцы] помніць. Ну, але такіх прыемных хвілін мала.

Вось атрымала беластоцкі "Беларускі каляндар". Там вялікі артыкул А. Бэргман — аб Раку-Міхайлоўскім. Усё абаснавана на партыйных архіўных матэр'ялах. А хлусьні, хлусьні... Нават тое, аб што мяне пыталася, перакруціла. Пыталася, ці я помню, дзе Р[ак] – М[іхайлоўс]кія ў Гродне жылі. Я хоць часта ў іх бывала (гады 1919, 20), назову вуліцы ня помню, але напісала, што жылі разам са Смолічамі (лепш — з жонкай Смоліча і іх дзіцём). А яна напісала, што жылі разам з Лёсікамі... Калі ў сапраўднасьці Лёсікі ў жыцьці ў Горадні не былі. Вось як пішуцца "гістарычныя артыкулы". Я ня ведаю, што рабіць? Пісаць ёй аб гэтым ці не пісаць?

За кніжку Ф. Янк[оўскага] буду ўдзячная. Але калі яшчэ ня выслалі, то пачакайце, мо ён сам прышле, бо ўжо не адну прыслаў. Сяньня атрымала новую кніжку Сьцяпана Хусэйнавіча Александровіча "На шырокі *прастор*". Яшчэ не пераглядала. Бо адначасна з кніжкай быў ліст, у якім прасіў перагледзець лісты маіх знаёмых пецярбургскіх студэнтаў з 1914, 15, 16 гадоў — ці не пісалі мне чаго пра Янку Купалу. Гэта пераглядданьне заняло мне паўдня. А карэспандэнцыя запушчаная — аж страх. Лістоў 20 да адказу, а яшчэ сьпешна трэба напісаць усё, што помню аб У. Галубку з 1915–18 гадоў. Патрэбна для кніжкі.

Мой новы карэспандэнт з Менска, што піша кніжку аб Галубку (на 100-годзьдзе нараджэньня), Сяргей Астапавіч Пятровіч цудоўна па-беларуску піша. Ці доўга "вытрымае" ў менскай атмасфэры чыстую мову? Абяцае вясной прыехаць паглядзець малюнкі Галубка і інш. памяткі, якія па ім маю.

За лекарскія парады дзякую. Буду прабаваць так рабіць, бо ўжо сапраўды замучылася, аж ногі ня носяць... Ці Вы заўважылі ў перадапошнім "ЛіМе" маю кароткую нататку "Як выдаваўся зборнік"? Яшчэ адна прычына, каб знэрвавацца: скарацілі напалову. І то калі Янка Саламевіч, пераглядаючы ў мяне тэкст, пахваліў і ніякіх увагаў не рабіў. Але рэдакцыя ўсё лепш ведае, чым сам аўтар. За нашых часоў гэтак не рабілася.

З Менска весткі дрэнныя. Янка Маркавіч [Хвораст] у шпіталі. Забірала хуткая дапамога. Тры дні быў у рэанімацыі. С. Александровіч ляжаў месяц з запаленьнем лёгкіх, а ў яго ж сухоты...

Дачку маю лечаць, кожны раз — іншыя лекі. Цяпер яна ходзіць на масажы патыліцы. Ну а я пачала зноў уколы АТФ. Робіць дачка — навучылася вельмі добра. Мо дастану яшчэ адзін каляндар, то прышлю Вам.

Усяго найлепшага! Пішыце. *Л. Войцікава.*

97. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

20 студзеня 1980 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за клопаты аб мае ўспаміны. Прыкра мне, што забіраю Вам час, але што зрабіць? Карэспандэнцыя з такой установай нічога б не дала. А мне тых успамінаў шкада, бо былі прыгожа аформленыя і са здымкамі.

Нумару тэлефону Ф. Ігнатовіча ня маю, але адрас маю і пасылаю Вам. Толькі што ні імяні, ні па бацьку жонкі др. Ігнатовіча ня ведаю. Тэлефон мае др. Марцінчык, бо я некаліс прасіла яго нешта даведацца, і ён туды званіў. Вельмі ўсё гэта дзіўна. Бо др. Ігнатовіч у першым лісьце *адтуль*[1] пісаў мне, што жон-

ка яго пыталася, што рабіць з атрыманамі ўспамінамі. Ён даручыў ёй занясьці ў музэй — асобе, з якой ён дагаварыўся. Аб якой "асобе" ішло — ня ведаю.

Ня мае наш гурток шчасьця. Вы, зразумела, ведаеце, што ў Менску выдаюць шматтамовы "Збор", дзе апісаныя гарады, вобласьці — архітэктурныя помнікі, падзеі, людзі, якія там жылі-працавалі. Калі пісалі аб Менску, успомнілі і Т[аварыст]ва помачы ахвярам вайны і прасілі аб дэталі яго працы, нават артыкул для перагляду прыслалі. А калі я запыталася аб Гродна — Гродзенскім гуртку, мне адказалі, што Гродзенская вобласьць ужо зробленая, а аб гуртку ніхто нічога ня ведае. Цэлая надзея на Вас.

А я неспадзявана знайшла сябра нашага гуртка, праўда, аднаго з самых малодшых (яму было 12–13 гадоў), і я яго з тых часоў ня помню, бо такіх хлапчукоў у нас было шмат. Але ён помніць амаль усіх старэйшых сяброў (адзін з іх — яго сваяк), помніць вечарынкі, помніць, як сам дэклямаваў, а нават маю кватэру на Гараднічанскай. Цяпер маю з кім успамінаць супольных знаёмых і г.д. Праўда, жыве ён аж на Флёрыдзе[2], і лісты ідуць доўга. А ■ і ня вельмі хутка адказываю — чуюся кепска, і цяжка доўга пісаць.

Маю яшчэ крыху няскончанай работы, хацела б усё аставіць у парадку. Таму вельмі чакаю, калі ў Вас знойдзецца час, каб аканчальна пазнаёміцца з падзеямі ГГБМ. Успаміны ўспамінамі, а ў гутарцы ўспамінаецца часта больш падрабязна.

Прыслаў мне Ю. Туронак беластоцкі каляндар. Добра яшчэ ўсяго не прачытала. Але мова магла б быць лепшая. На 100-годзьдзе Г. Леўчыка — мала, вельмі мала, бо што было сабрана, запраектавана — адкінулі.

Ну а ўжо А. Бэргманова... Чытаецца гладка, але для таго, хто сам у той час быў і бачыў, прычынаў да знэрваваньня хапае. Нават з кім жыла сям'я Рака-Міхайлоўскага ў Гродне — і тое перакруціла. Я ёй выразна напісала, што жылі разам *са Смолічамі* (лепш — з жонкай Смоліча, бо ён даяжджаў толькі) і іх дзіцём. А напісана — *з Лёсікамі.* А Лёсікі тады жылі ў Менску, нават адрас ведаю. І як так можна адносіцца? Гэта ж ня казка пра белага бычка!

Цікава мне было б ведаць, якое ўражаньне робіць на Вас менскае тэлевізійнае "Роднае слова"? Мы яго ня бачым — у Вільню не даходзіць. Але маю сцэнарыі, выразкі, уражаньні паасобных слухачоў. І з гэтага ўсяго нічога радаснага выцягнуць нельга.

Усяго добрага Вам і Вашай сямейцы! Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

98. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

30 студзеня 1980 г. Вільня

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Сяньня атрымала Ваш ліст з дня 25/І, а я Вам напісала 27/І, значыць — лісты разьмінуліся. Таксама сяньня прыйшоў ліст ад У. Содаля — з Ялты! Ад якога часу ён там — ня ведаю. Чаму ў Ялце? У яго гіпэртанія і нешта сэрцавае. Ня раз ужо ляжаў з такімі болямі сэрца, што ні падняцца, ні павярнуцца на бок ня меў магчымасьці. А яму ж ледзь сорак мінула... Але чаму з такімі хваробамі — у Ялце?

Піша, што робіць усё, што дактары загадываюць, але рэзультатаў ня бачыць. Ужо 5 лютага варочаецца. Новая трывога, новая бяда... Ён рабіў усё, што мог і ў "Родным слове", і раней у тэлебачаньні. Ваяваў за зьмест перадачаў, за мову. Даходзіла да таго, што яго да міністра асьветы Мінкевіча[1] (гэта школьны сябра майго с.п. сына) выклікалі на размову. Відаць, за ўсё гэта цяпер расплачываец-

ца хваробай. Відаць, чуецца дрэнна, калі піша: "Мо Бог дасьць яшчэ пабачымся ў Вільні". Дадае: "Пішу Вам, бо лічу патрэбным паведаміць, дзе я дзеўся".

Вы пішаце, што трэба на помач выклікаць Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага? Я яго асабіста ня ведаю. Маю пару яго кніжак і артыкулаў з аўтографамі, пару разоў перакінуліся некалькімі словамі. Але вось у мінулую суботу зьявіўся ў нас прафэсар Віленскага ўнівэрсытэту беларус Антановіч. Я Вам ужо аб ім успамінала. Ён быў у Менску, бачыўся з Ф. Янкоўскім, які прасіў наведаць нас і разам прыслаў свайго маладога вучня Несьцяровіча[2] — з Інстытуту гмовазнаўства. Вучань Ф. Янкоўскага варт свайго прафэсара. Вельмі чыста гаворыць (да мяне, зразумела, піша) па-беларуску, ясна і шчыра гаворыць аб становішчы беларусаў *у сябе*...

І вось Несьцяровіч кажа, што Янкоўскі вельмі слабы, часта хварэе, ляжыць. У яго арытмія. Кажа (гэта і мне раз пісаў): "Сэрца баліць (у пераносным разуменьні), хочацца ў Вільню, а сілы німа". Такое гора...

А каб скуль што добрае. Аб Янку Хворасьце нічога ня ведаю. Як напісаў Новік, што ён у шпіталі, так больш нічога, ні слова. Аб усіх памылках у артыкуле аб Раку-Міх[айлоўскім] я да аўтаркі не пісала. Але ўжо напісала Ю. Туронку. Ён належыць да рэдакцыйнай калегіі календароў. Наскольқі яго пазнала і з лістоў, і з асабістага спатканьня, з ім гаварыць можна. Разумны і шчыры беларус.

Пасылаю Вам вестку, калі, у якім нумары "ЛіМа" быў надрукаваны мой маленькі артыкул, а разам пасылаю і машынапіс з даслоўным зьместам таго, што я напісала. Я заўсёды, калі даю што Янку Саламевічу да друку, ён робіць з рукапісу 2–3 машынапісы і прысылае мне. Вось адзін экзэмпляр пасылаю, другі астаецца ў мяне. Цяпер то хоць у мяне астаецца тое, што я напішу, а то я ніколі не пішу начорна, а проста начыста. І як куды пашлю, у мяне і сьледу не астаецца (калі не надрукуюць). Ужо шмат чаго прапала.

Я Марыі Васілеўны даўна ня бачыла. Яна пісала, што зьбіралася прыйсьці, але балелі горла і зубы. Я адказала, але больш вестак ня маю. Цяпер сьнегу па калена, і няхутка можна будзе да нас дабрацца.

Мела я вельмі сымпатычны ліст ад Жэні Лобан (Казлоўскай[3]), і аж сорамна, ніяк не магу сабрацца адказаць. І на лісты іншых не пасьпяваю адказываць, бо як ня той, дык той з Менска аб нешта пытаецца, і ўсім сьпешна. Сьцяпан Хусэйнавіч Александровіч, як быў летась у нас і пераглядаў лісты сяброў Гродз[енскага] бел[арускага] гуртка, шмат чым зацікавіўся, запісаў сабе. Але запісаў недакладна і вось цяпер просіць, каб тое-сёе ўдакладніць-дапісаць.

Ідзе яму аб адносіны пецярбургскай моладзі (беларусаў) да творчасьці Янкі Купалы і яго самога як чалавека. Цэлы вечар пазаўчора сядзела, капалася ў лістах (1914, 15, 16, 17 гады) і рабіла выпіскі. А тым часам як доўга пасяджу, не магу распраставаць касьцей.

С.Х. Александровіч пасьля хваробы (цяжкае запаленьне лёгкіх) слабы і сам мала працуе — наглядае толькі, як працуе яго дачка і памагае ёй. Як добра, што мае таленавітую замену.

Мяне чакаюць сумныя і непрыемныя дні. У дачкі канчаюцца зімовыя канікулы, а ўнук едзе на канфэрэнцыю па мікраэлектроніцы на 3–5 дзён. Трэба і гэта неяк перажыць. З вялікай прыкрасьцю і непакоем чытала Ваш ліст аб Вашых недамаганьнях. Усюды хваробы, усюды гора. А і маральных перажываньняў — ня менш...

Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

99. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

1 лютага 1980 г. Вільня

Даражэнькая Данута Іванаўна.

Дзякую за ліст. Разумею, як Вы мусіце пільнаваць дыеты мужа, і буду цярпліва чакаць, калі знойдзеце магчымасьць пад'ехаць машынай хоць на некалькі гадзін, калі Вас гэта лішне не замучыць. Хацела б паказаць Вам старыя памяткі, альбомы. Тым больш што ў нядзелю, 22-га, прыедзе да мяне Новік-Пяюн і прывязе гатовы альбом "Наш сьпявак — Міхась Забэйда". Цікавы тэкст: рэцэнзіі з канцэртаў, праграмы, успаміны знаёмых і вельмі шмат здымкаў. Рабіў гэты альбом (афармляў) Новік-Пяюн, а матэрыялы зьбіралі мы тут супольна ў Вільні — яго (Забэйды) асабістыя знаёмыя і незнаёмыя. Альбом пакуль што будзе ў мяне. Я ведаю, шмат хто мае матэрыялы, пераважна лісты Міхася Іванавіча. Але хто адважыцца іх выкарыстаць? С. Панізьнік, напэўна, не зарызыкуе. За само знаёмства з М. З[абэйда]м нямала паплаціўся, вярнуўшыся.

Мела я ліст і ад Янкі Хвораста — ізноў са шпіталя, дзе ляжыць ад 14/5. Адказала зараз жа, але аб сьмерці др. Марцінчыка не пісала, хоць Хвораст пытаўся, "як доктар чуецца". Сама гэтую сьмерць моцна перажываю, што адбіваецца на здароўі. Вельмі шмат нас зьвязывала.

Я маю рукапісны зборнічак біяграфіяў і аўтабіяграфіяў беларускіх дзеячоў, якіх ніхто нідзе ня ўспомніць. Хачу ўнясьці туды і біяграфію с.п. др. Марцінчыка. Зрабіць гэта няцяжка, бо маю шмат яго лістоў (больш 80), успаміны з бежанства, здымкі, але не хапае галоўных датаў: нараджэньня, выезду ў ссылку і павароту адтуль. Прасіла яго жонку аб гэтыя даты, але, мусіць, лішне сьвежы яе боль, каб гэтым займацца. Адказу ня маю.

Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] пісаў. Сапраўды, з кватэрай — цэлая эпапея. Павінен да мяне прыехаць па патрэбныя яму да кніжкі матэр'ялы і ніяк ня можа знайсьці часу. Але, пішучы апошні ліст, паведаміў, што мае ўспаміны "Гродзенскі гурток беларускай моладзі" ў фонд Гродзенскага гістарычнага музэю прыняты. Добра і гэта, бо я не была пэўная, які лёс гэтых успамінаў.

Пішаце аб знойдзенай яшчэ адной старой царкве. Але я аніяк не магу прыпомніць, дзе ў Гродне Базыльянскі кляштар? А ці Вы ведаеце, што проціў Фары, там дзе цяпер сквэр, быў калісьці стары-стары драўляны ратуш? На паверху была гарадзкая ўправа, а ўнізе з усіх бакоў — маленькія крамкі, пераважна жыдоўскія, у адной розная драбяза: іголкі, ніткі, гузікі і г.п. Паміж іншым, я дзіцём ня раз там бывала з мамай або са сваёй бабкай — у старэнькай гарбатай жыдоўкі Басі ўсё гэта куплялі. У іншых крамах — бочкі з селядцамі, бочкі з нафтай, а там ізноў — абаранкі, маца, ватрушкі з цыбуляй. Як усё гэта помніцца...

Усяго найлепшага — Вам і Вашым блізкім. Сардэчна вітаю. *Л. Войцікава.*

100. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

2 лютага 1980 г. Вільня

Даражэнькая Данута Іванаўна.

Дзякую сардэчна за верш. Пасылаю Вам верш літоўца — прыяцеля беларусаў. Ёсьць і такія... Ёсьць браты-літоўцы і паміж старэйшымі пісьменьнікамі, мастакамі. Даказываюць свае добрыя адносіны, наладжваючы выстаўку абразоў нашага П. Сергіевіча або Дні беларускай культуры. Страш-

на толькі, каб гэтыя прыхільнікі ня страцілі пашаны да беларусаў, калі на іх выступленьні-прывітаньні *ў беларускай мове* чуюць у адказ — у расейскай...

Гэта здарылася ў Дні беларускай культуры — з адказам у чужой мове выступіў сам вялікі Народны паэт М. Танк. Трэба з радасьцю прызнаць, што на адкрыцьці выстаўкі П. Сергіевіча гэтага не было. Мастакі нашы стаяць на вышыні, маюць свой гонар і выступалі па-беларуску. Слава ім за гэта.

За адным захадам пасылаю Вам верш літоўскага паэта пра беларускую мову.

Усяго Вам найлепшага! Дзякую, што не забываеце. Шчыра вітаю. *Л. Войцікава.*

Беларуская мова (верш літоўца Ёзаса Рыбікаўскаса)

Як хвалі нёманскай вады, пяшчотная,
Як гоман шматвяковых пушч і шум бароў,—
Гучыш ты на зямлі бацькоўскай горда,
Прайшоўшы праз віхуры цёмныя вякоў.

Як маці родную, цябе любілі
Сыны народа — гордыя арлы.
А ворагі шалёныя усё рабілі,
Каб твайму сьледу не застацца на зямлі.

Гучала ты і за калючым дротам,
Была заўсёды Каліноўскаму сябром,
Ляжала пад цяжкім жандармскім ботам
"Мужыцкай праўды" вогненным радком.

Крывёй гарачаю бацькоў аблітая,
Ты праўду мужыкам нясла заўжды.
Славамі моцнымі, нібы з граніту,
Гісторыю пісала праз гады.

Твой лёс мне сёньня вельмі блізкі,
Маёй ты мовы родная сястра.
Шляхом тваім — дарогай камяністай —
І мова летувіская прайшла.

Ты — як цымбал чароўныя акорды,
Як жаўранка сьпеў з нёманскіх палёў.
Ты — беларусаў сіла, вера, гордасьць
І неўміручасьць вогненных баёў.

Табе [redacted] верным застаюся назаўжды,
Глыбока ў маё сэрца ты запала.
Любіце мову родную, браты,
Як Каліноўскі, Багдановіч і Купала.

101. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

9 лютага 1980 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ня пішаце — значыцца, мае ўспаміны аб ГГБМ прапалі... Перапіска мая з др. Ігнатовічам спынілася. Відаць, яму *адтуль* пісаць цяжка.

Артыкул "Беларуская борць і народная мэдыцына" др. Ігнатовіча таксама недзе ў рэдакцыі "Нёману" ляжыць не чапаны. Адным словам — не шанцуе.

Але ў мяне важнейшая справа. Вы, напэўна, "Беларускі каляндар" на 1980 год з Беластока атрымалі і артыкул А. Бэргмановай аб С. Раку-Міхайлоўскім чыталі. Магчыма, захочаце пры нагодзе гаварыць аб ім з Вашымі студэнтамі, таму сьпяшаюся пазнаёміць Вас з тымі памылкамі, якія яна пазволіла сабе ўставіць у артыкул.

Яна мяне пыталася аб часе, калі Рак-Міхайлоўскі з сям'ёй жыў у Гродне — 1919-ты, 20-ты, 21-шы гады. Я ёй адказала, што назову вуліцы ня помню, але абʼясьніла раён, дзе яна знаходзілася. І дадала, што сям'я Рака-Міхайлоўскага жыла разам са Смолічамі (жонка А. Смоліча Аляксандра выкладала ў Гродзенскай Беларускай гімназіі беларускую мову і літаратуру). Тым часам у А. Бэргмановай нейкім цудам *Смолічы* зрабіліся *Лёсікамі*! Апошнія ніколі ў Гродне не былі.

Далей, ужо з часу працы Рака-Міхайлоўскага ў Вільні, піша, што ён *адзін* адказываў за выдавецтвы грамадаўскай прэсы — выпраўляў матэр'ялы, хадзіў у друкарню... І ніякага дачыненьня ня меў да гэтай справы А. Луцкевіч...

То чаму ж, калі я пераехала ў Вільню ў лістападзе 1923 г. і спаткалася з Ракам-Міхайлоўскім (добрым маім знаёмым з Менска) ў "Беларускай кнігарні", то ён не запрапанаваў мне ад сябе асабіста працы ў рэдакцыі, а сказаў: "Ідзем да А. Луцкевіча, пагаворым".

А другі раз, у 1925 г., калі я запрапанавала выдаваць раз у месяц да грамадаўскіх газэтаў "Гаспадарчы дадатак" і запыталася Рака-Міхайлоўскага, ці гэта магчыма, ён зноў сказаў: "Пойдзем да Антона Л[уцкевіча] ". Значыцца, А.Л. не стаяў збоку і ў выдавецтве голас меў. А Рак-Міхайлоўскі ня быў поўным гаспадаром. Ды і ўсе сходкі-нарады па выдавецтву грамадаўскай прэсы адбываліся на Віленскай, 8 — у кватэры А. Луцкевіча.

Чаму ж А. Бэргман маніць? Скуль узяла такія весткі? Ці не апіраецца яна на "ўспаміны" сына Максіма Бурсэвіча[1] — Ігара[2]? Помніце, я Вам аб яго "ўспамінах" гаварыла, а мо і паказывала. Калі А. Бэргман у кароткім артыкуле ў "Ніве" аб М. Бурсэвічу напісала і пахвалілася, што знайшла яго дачку і сына, я адразу падумала, што з гэтага нічога добрага ня будзе.

Мне калісьці пісаў Мікалай Іванавіч Ермаловіч: "Да чаго ж сфальшавалі нашу гісторыю! І жыцьця ня хопіць, каб унясьці крыху яснасьці". Тое самае робіцца і цяпер.

Я вельмі шкадую, што пачала адказываць на яе пытаньні і тым самым быццам прыймала ўдзел у яе памылках. Ужо ў "Rzeczy o B. Taraszkiewiczu" яна наблытала, што далей не ідзе, а цяпер працягіваецца тое самае... Хоць бы нарэшці перастала пісаць! Быў бы спакой. А ён мне вельмі патрэбны. Чуюся вельмі нядобра і ўжо проста ня ведаю, што рабіць. На бяду, столькі сьнегу, што нават доктара німа як выклікаць. Але нічога, неяк будзе.

Знойдзеце хвіліну — адгукніцеся. Буду рада. Мушу дадаць, што знайшоўся адзін з самых малодшых сяброў Гродзенскага гуртка. Піша мне сардэч-

ныя лісты. Але рэдка, бо ён аж на Флёрыдзе. Але ёсьць з кім паўспамінаць сяброў гуртка.

Усяго добрага Вам і цэлай Вашай сям'і. Са шчырым прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

102. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

4 сакавіка 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна[1].

Учора атрымала ліст ад Ларысы Антонаўны [Геніюш] [2]. З яго даведалася, што ў Вас сытуацыя са станам здароўя мужа пагоршала. Сьціснулася за Вас сэрца. З цэлай душы Вам спачуваю. Каб жа магла ў чым памагчы...

Мо што патрэбнае такое, чаго німа ў Гродне, а ў нас можна дастаць? Не кажу аб леках, бо ў нас з гэтым шмат горш, чым на Беларусі. Калі што трэба — пішыце без усякай цырымоніі.

А ці Ваш муж ніколі не прабаваў лячыцца зёлкамі? Не закранаю сяньня іншых пытаньняў, бо Вам не да іх. Знойдзеце магчымасьць — напішыце пару слоў, што і як у Вас.

Шчыра і сардэчна зычу ўтрымаць сілу духу, бадзёрасьць, хоць вонкавую, бо гэта неабходна хвораму.

Усяго самага лепшага. Ваша *Л. Войцікава.*

103. МІКАЛАЮ МАРЦІНЧЫКУ

10 сакавіка 1980 г. Вільня

Паважаны Мікалай Міхайлавіч.

Абедзьве з дачкой дзякуем Вам за сьвяточныя пажаданьні, а я — і за ліст. Відаць, ня ўсе лісты даходзяць, бо таго, што Вы пісалі пасьля атрыманьня "Нівы", я не атрымала. "Ніву" буду і далей адсылаць Вам па некалькі нумароў адразу. Я рада, што Вы здаволены гэтым.

Калі ласка, напішыце, ці маеце насьценны каляндар "Прырода Беларусі"? Мова не надзвычайная, але малюнкі вельмі добрыя — прыемна глядзець. Калі ня маеце, то вышлю разам з "Нівай", бо я маю два. Адзін экзэмпляр прыслаў мне З. Пазьняк яшчэ перад Новым годам, а пасьля яшчэ нехта прыслаў, а хто — ня помню.

У апошнім лісьце я пісала Вам, што Содаль не прыяжджаў, і пакуль што ня ведаю, ці прыедзе. Вашыя лісты, у якіх ёсьць аб "Р[одным] слове", адкладаю асобна, каб Содалю, калі прыедзе, паказаць. А.М. Пяткевіч аб "Р[одным] слове" таксама піша вельмі крытычна. І яго ліст Содалю пакажу.

Ф.М. Янкоўскага ня варта гэтай справай нэрваваць. Ён зусім слабы — ня можа прыйсьці да сябе пасьля чароднага побыту ў шпіталі. Пісаў мне некалькі слоў... Я яго асабіста ня ведаю і, хіба, ніколі не пабачу, бо прыехаць ён ня зможа.

Ні ад Янкі Маркавіча [Хвораста], ні ад С. Новіка даўна нічога ня маю. Мела кароценькі ліст ад Вітаўта Тумаша — шле прывітаньне ўсім, хто яго помніць. Наагул, лістоў — безьліч. Не пасьпяваю адказываць. З Менска шмат навін з выдавецкага руху. Ужо ў друку зборнік твораў Гальяша Леўчыка: больш 100 вершаў, артыкулы, лісты, у іх ліку восем да мяне.

Мае выходзіць зборнік "Спадчына"[1], 5-томная энцыкляпэдыя "Прырода Беларусі", "Гісторыя беларускага тэатру". У першы том "Гісторыі беларускага тэатру" войдзе артыкул аб Гродзенскім гуртку бел[арускай] моладзі. Прысылалі мне машынапіс, каб перагледзець і папрравіць. Я ўжо гэта зрабіла і паслала.

Што да элемэнтара (не цярплю слова *буквар*!), то гэта памылка. Аркадзь Смоліч ніколі яго не пісаў, гэта яго жонка напісала элемэнтар "Зорка" і першую пасьля элемэнтара чытанку — таксама "Зорка". А Аркадзь Смоліч напісаў і надрукаваў шмат працаў па геаграфіі, эканоміі і г.д. Яго дзьве працы — "Разьмяшчэньне насельніцтва на тэрыторыі Беларусі" і "Сельскагаспадарчыя раёны БССР" — у 1930 годзе ўзнагароджаны малым залатым мэдалём дзяржаўнага Рускага геаграфічнага т[аварыст]ва.

Высланы, працаваў у Ішыме выкладчыкам геаграфіі і яшчэ жыў разам з сям'ёй. Пасьля выслалі няведама куды аднаго, дзе і памёр. Жонка рабіла захады аб рэабілітацыі. Атрымала адмоўны адказ: "*оснований нет*...".

Маю больш 20 лістоў Смоліча. Цікавая душа. Чалавек з вялікай літары. І сяньня яго прозьвішча ўспамінаць у друку нельга. Ён жа належаў да першага Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі — разам з Варонкай, Аўсянікам, Захаркай, Серадой і іншымі. Мела я здымак гэтага Ураду, ды недзе прапаў. А шкада — усіх я ведала асабіста.

Яшчэ вярнуся да элемэнтара Алесі Смолічыхі. Яна яго апрацоўвала тут у Вільні ў 1922 ці 23 годзе. А муж яе Аркадзь пісаў тады "Геаграфію Беларусі". Можа, Вас зьдзівіць, скуль я ўсё гэта ведаю? Я ж іх абоіх вельмі добра ведала. Яго яшчэ з 1913 г., калі была ў Варшаве, а ён у Пулавах (Нова-Александрыі) — у Сельска-гаспадарчым інстытуце. Пасьля амаль праз тры гады разам былі ў Менску. Там Смолічы пажаніліся.

У 60-я гады яна прыяжджала сюды да мяне, і мы карэспандавалі аж да яе сьмерці (памёрла пад Кіевам у 1974 г.). Яшчэ цікавая дэталь — яна ў 1921 г. у Гродне ў Беларускай гімназіі выкладала беларускую мову. Лістоў яе маю, хіба, каля сотні.

Ужо другі тыдзень прыймаю парашкі па Вашаму рэцэпту — і пэпсін таксама. Лепш настолькі, што німа такога stwardnienie[2], як бывала, але болі пад лыжачкай ёсьць, і бываюць вельмі моцныя. Папавэрын бяру па тры таблеткі зараз. Ці баралгін можа выклікаць алергію? Калі дачка рабіла мне ўколы АТФ, усё было добра, а ад баралгіну робяцца гузы, хоць і масаж робіць, і грэлку кладзе, і робіць так, як Вы пісалі: палову дозы, а праз гадзіну — другую палову. Боль здымае — гэта так. Але таму, што адзін такі гуз нават нарываў, вялікі, як сьліўка, цяпер дачка баіцца рабіць.

У нас у хаце — вясна! Унук зрабіў пакаёвую цяплярню. Расьце расада памідораў, расада суніцаў, цыбуля. Аграваецца і асьвятляецца электрычнасьцю.

Канчаю, бо мой апякун (унук) гоніць, каб хутчэй лажылася. Ад маіх — прывітаньне. Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

104. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

17 сакавіка 1980 г. Вільня

Дарагая Ларыса Антонаўна.

Шчыра дзякую за даўгі ліст, за тое, што дзеліцеся са мной сваімі думкамі. Не адразу адказала, бо было вельмі шмат лістоў, а на некаторыя трэба было

тэрмінова даць адказ. Я рада, што яшчэ да мяне зварочваюцца з рознымі пытаньнямі, просяць вестак са старых часоў пра людзей, пра падзеі. Памяць мая яшчэ, дзякаваць Богу, добрая, і я не баюся, што магу што-небудзь наблытаць.

У Літву менскае тэлебачаньне не даходзіць, так што магу мець уяўленьне аб "Родным слове" толькі з таго, што мне пішуць. І сам рэдактар "Роднага слова", і гледачы: Вы, Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч], др. Марцінчык, а з Менска — Сяргей Новік. Рэдактар часам прысылае мне сцэнарыі і піша, як цяжка і не заўсёды па яго волі ідзе работа. А тыя гледачы, што мне пішуць, крытыкуюць, і то востра крытыкуюць, прычым маюць надзею, што я, пабачыўшы рэдактара, з гэтай крытыкай яго пазнаёмлю. Я зраблю гэта, напэўна, хоць ведаю, што гэта зробіць яму прыкрасьць. Але для дабра справы... Я рэдактара ведаю асабіста. Некалькі разоў прыяжджаў і цяпер зьбіраецца, але, мусі, ёсьць нейкія перашкоды, бо ня едзе.

Захапіла мяне Вашая думка, каб дзяўчаты наладзілі сардэчную апеку над тымі, хто гэтага патрабуе. Гэта будзе карысна для тых і другіх. Падапечныя ня будуць адчуваць сябе такімі самотнымі і бездапаможнымі, а апякункі ўзбагацяць свае душы і сэрцы, што пры арульным эгаізме вельмі важна. Толькі трэба падысьці да справы сардэчна і далікатна, каб часам не павеяла ласкай.

Наведываньне Новіка і з другога боку будзе карыснае. У яго добрая бібліятэка старых кніжак, здымкаў, малюнкаў (ён і сам добра малюе), старых дакумэнтаў. Пагаварыць, паказаць ён любіць. Калісь мой с.п. сын быў у яго. Расказываў мне, што яго пакой хутчэй падобны на музэй, чым на прыватную кватэру.

А Янка Маркавіч Хвораст — харэограф. У Віленскай Бел[арускай] гімназіі вёў танцавальны гурток, пасьля таксама студэнцкі. Ведае масу беларускіх танцаў. Цяпер апрацоўвае і дае апісаньне, каб выдаць кніжкамі. На жаль, хворы на сэрца, цяжка. Цэлы месяц люты ізноў пралежаў у шпіталі. Цяпер удома. Піша, што добра падлячыўся. Але ці надоўга?

Яны абодва з сабой у прыязьні — адведываць адзін аднаго не заўсёды могуць, але кожны дзень гавораць па тэлефоне. Найперш я думаю, каб дзяўчаткі першы раз спасылаліся на Вас, на мяне. Гэта адразу пераламае першы лёд.

Пані Данусі [Бічэль] [1] дзякую за прывітаньні і сама яе шчыра вітаю. Яна мне блізкая тым, што жыве ў Гродне, любіць яго. Гэта ж горад майго бацькі, а і мой, бо ■ там канчала гімназію, і там праз Горадзенскі гурток беларускай моладзі стала на беларускі шлях.

Вера Андрэеўна [Ніжанкоўская] маецца лепш. У апошнім лісьце пісала, што яшчэ мае прайсьці рэнтген. Вось Вы абходзілі ўгодкі сьмерці Вашага с.п. мужа — першыя ўгодкі. А я 28 сакавіка буду ўспамінаць сьмерць свайго с.п. мужа ўжо 32-гі раз. Яшчэ 50 гадоў ня меў, як памёр.

Пішыце, калі ласка, ці ўдасца што наладзіць, як на гэта паглядзіць п. Дануся? Адрасы далучаю. Буду вельмі чакаць, што з гэтага выйдзе.

Ад З. Абрамовіча я ліст мела — пісаў, што атрымаў ад Вас цёплы, сардэчны ліст. А я ўжо трачу цярплівасьць. Напішу да яго даўгі ліст — а заместа адказу на яго атрымліваю вымоўкі, што не пішу. Летась павіншавала з днём імянінаў (2 мая), урадзінаў — 25 лютага — і на гэта ні слова.

Цалую Вас сардэчна. Ад маіх — шчырыя прывітаньні. *Л. Войцікава.*

Адрасы: *220036, Мінск-36, вул. Купрыянава, 9–108. Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн; 110068, Мінск-68, бульвар Шаўчэнкі, 9–41. Янка Маркавіч Хвораст.*

105. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

24 сакавіка 1980 г. Вільня

Дарагая Ларыса Антонаўна.

Нядаўна я Вам пісала, але мушу яшчэ раз пагаварыць аб дапамозе хворым. Вельмі мяне Ваша прапанова захапіла, і патрэбная яна як найхутчэй. Аб чым яшчэ раз я пераканалася.

Я Вам пісала і паслала адрас Янкі Маркавіча Хвораста — харэографа. Я яго ведаю яшчэ з тых часоў, калі ён быў вучнем Віленскай Беларускай гімназіі. Як ужо ведаеце з майго папярэдняга ліста, ён цяжка хворы на сэрца — часта яго хуткая дапамога забірае ў шпіталь. Апошні раз ляжаў цэлы люты. Выйшаўшы адтуль, пісаў мне, што добра падлячыўся. Тым часам пазаўчора [redacted] даведалася, што зноў меў цяжкі прыступ (ад 12 гадз. ночы да 6 раніцы), але хуткай дапамогі ня выклікаў, баіцца шпітальнага лячэньня. Страх падумаць, што пасьля такога прыступу аслабелы чалавек у хаце адзін. Што ён есьць? Што п'е? Хто яму што купіць? Ведаю, што ў нармальным стане сам сабе варыць.

Учора ў польскай газэце прачытала арыкул, што нават па вёсках арганізуюць грамадзкую апеку над старымі і хворымі, не гаворачы аб гарадах, дзе ёсьць цэлыя арміі грамадзкіх апекуноў. А ў нас? У тэорыі "ўсё для чалавека", а на практыцы? Хоць згінь — ніхто рукі не падасьць, асабліва ў вялікім горадзе. Яшчэ ў Вас у Зэльве добра. Шмат простых людзей, а яны яшчэ сумленныя і сэрца ня страцілі.

Ці Вы ўжо мелі магчымасьць пагаварыць з паняй Данусяй [Бічэль]? Як яна глядзіць на гэтую справу? Вельмі буду чакаць Вашага адказу.

Ці ў Вас таксама яшчэ маразы? У нас уночы было –17–18, але сяньня толькі –13, а ўдзень дайшло да нуля. Хмарыцца. Мусі, і Вялікдзень будзе яшчэ са сьнегам і марозам. Толькі ў Слаўкі ў пакоі ўжо вясна. У пакаёвай цяплярні растуць памідоры (расада), расада пазёмак і зялёная цыбуля. Цыбуля вымахала на паўмэтра — далікатная, смачная. Слаўка як толькі прыходзіць з работы, ідзе глядзець цяплярню: тэмпэратуру, вільгаць і г.д. Палівае, апрысківае. Вось дзе сапраўды замілаваньне. Не ідзе абедаць, пакуль не прыгатуе для мяне на наступны дзень запас вады і дроў.

Маю ўсе палёгкі, бо і дачка прыходзіць і часта сама варыць, а я неяк не магу пахваліцца сваім здароўем. Як заўсёды, зімой — клопаты са страўнікам, і галава баліць. А думаць трэба, адказываць на лісты трэба, а ня раз і нэрваў напсаваць. Аж трудна. Пакуль чалавек жыве, ня мае права адмаўляцца ад таго, чаго ад яго вымагаюць. Канчаю, бо Слаўка дае вячэру...

Усяго Вам найлепшага! Сардэчна цалую Вас і чакаю адказу. Ваша *Л. Войцікава.*

106. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

6 мая[1980 г.]

Дарагая Данута Іванаўна.

Учора напісала Вам ліст, а пасьля агледзелася, што ня ўсе пытаньні парушыла. Так што даганяю другім.

Мае думкі часта лятуць у Гродна. Да ценяў дзядоў маіх, да ўспамінаў аб шчырай, заўзятай працы ў Гродзенскім гуртку беларускай моладзі, дзе я стала на беларускую дарогу, па каторай іду ўжо 71 год. У канцы існаваньня гуртка

ў 1913 г. мы выдалі на (шапірографе адбівалі) аднаднёўку "Колас беларускай нівы". Аднаднёўка, якую я вазіла з сабой (адзін з 50 экзэмпляраў) і ў Варшаву, і ў Менск, і назад у Гродна, а пасьля ў Вільню, тут у мяне зьнікла! Але, на вялікую маю радасьць, Іван Уладзіміравіч Саламевіч, працуючы ў віленскіх архівах, натрапіў на яе. Зьнішчанай сфатаграфаваць немагчыма было, але Саламевіч, добрая душа, перапісаў цэлую ад рукі, а пасьля Новік перапісаў на машынцы і прыгожа аформіў. І вось маю сьлед нашай гродзенскай працы.

Атрымала вестку з Менска, што Я. Хвораст ізноў у шпіталі. Новы атак сэрцовы. Вядома, цяпер ён мае і будзе мець апеку, але трывога за яго застаецца.

Што да Новіка — ня ведаю, што і думаць. Або хворы, або выехаў у Слонім. Там у яго дзьве сястры, абедзьве хворыя, а трэцяя, таксама хворая,— у роднай вёсцы Лявонавічы пад Слонімам[1]. Ён часам месяцамі там сядзіць. Гэта для яго асабіста лепш, бо паміж сваімі людзьмі. Але я ўсё непакоюся, як той альбом М. Забэйды, які ён ніяк ня здолее скончыць. Баюся, што Ваш знаёмы мастак Новіка не застане. А ці зможа зарганізаваць хоць нейкі сьціплы напамінак аб 80-годзьдзі сьпевака? Ці ёсьць даволі матэр'ялу?

Я маю ад Міхася Забэйды 25 лістоў і 10 копіяў лістоў яго да Новіка. (Новік мне прысылае копіі, каб усё было ў мяне. Баіцца, што ў яго, адзінокага, лісты могуць прапасьці.) Я з М. Забэйдам асабіста незнаёмая, але калі сям'я Шутовічаў, з якой ён быў у сардэчных адносінах і перапісываўся, вымерла (усе памёрлі хутка адзін за другім), я падумала, што ў М. Забэйды цяпер ня будзе ніякіх з Вільняй кантактаў. Напісала яму, і так карэспандэнцыя трывае і цяпер.

У лістах ёсьць шмат фактаў з дзяцінства, розныя цікавыя думкі. Што той малады мастак цікавіцца М. Забэйдам — гэта добра, але падаць весткі шырэй грамадзтву — думаю, безнадзейна. Цяпер, хіба, усё.

Сардэчна Вас вітаю. *Л. Войцікава.*

107. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

11 мая 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Толькі што атрымала Ваш ліст і зараз адказываю. Клопат з Я. Хворастам[1] адпадае (я ўжо аб гэтым пісала да Ларысы Антонаўны [Геніюш]). Атрымала я ад яго аж 2 лісты — адзін за другім. Выявілася, што ён цяпер будзе мець апеку — лепшай ня трэба. Гэтая школьная сяброўка, якая там гаспадарыла, калі Вашая дачка яго наведала,— старая сымпатыя са школьнага часу, і яны абое адзнокія. Пастанавілі дажываць жыцьцё разам. Можна ім толькі пажадаць шчасьця, праўда?

Што да Новіка-Пеюна Сяргея Міхайлавіча[2] — справа іншая. Яму помач патрэбная. Але ні варыць яму, ні спратываць ня трэба. Ён гэта робіць сам. А вось час ад часу даведацца, мо што купіць, прынясьці, калі ён дрэнна чуецца і сам ня можа пайсьці ў горад... У яго стэнакардыя. У яго цікава. Ён любіць моладзь, любіць расказаць, пагаварыць. Ды я яму зараз напішу, ён ужо ўдома. Можна нават па тэлефоне дамовіцца з ім, калі будзе ўдома, ці нікуды не выходзіць. Зайсьці з прывітаньнем ад мяне...

Мы з ім знаёмыя ад 1927 г. Ён быў маім сталым, вельмі рупным супрацоўнікам часапісі для дзяцей "Заранка". І цяпер шмат добрага робіць — аформіў альбом "Віленская Беларуская гімназія", альбомы "Беларуская Радашкоўская гімназія",

"Беларуская Нясьвіжска-Клецкая гімназія", а цяпер працуе над альбомам "Наш беларускі сьпявак Міхась Забэйда". Для мяне асабіста аформіў шмат маіх невялікіх працаў. І гэта ўсё бескарысна. А пераЖЫЎ дрэннага вельмі многа...

Пішаце, што цікава было б пабачыць Гродна маімі вачамі? Гэта вельмі проста. Будзе час — прыедзьце да мяне. Як жа я была б Вам удзячная — госьці з Гродна.

Я ня толькі помню Гродна з часу, як мне было 5, 6, 7 гадоў, але і маю некалькі старых паштовак з калекцыі майго бацькі: пантонны мост на Нёмане (іншага не было), агульны выгляд гораду, касьцёл Францішканскі ўночы і іншыя — усе менш-больш з 1904, 1905 гадоў. Прыехалі б з мужам — зрабілі копіі.

Маю паштоўкі выдавецтва — суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца" ды і шмат іншага. Мо Вас бы зацікавіла, як гродзенскую настаўніцу, бо і гродзенскім дзецям паказаць і расказаць варта. А дзе я жыла? Адзін год — амаль процiў муроў Брыгіцкага касьцёла (у 1970 г. гэты дом быў), а пасьля 4 гады на вул. Гараднічанскай, № 4. Цікава, што кватэра, дзе жылі бацькі майго с.п. бацькі, таксама існуе — побач з Фарным касьцёлам.

Бачыце, як я моцна з Гроднам зьвязаная? А кантактаў амаль ня маю.

Ня ведаю, ці Вы знаёмыя з др. М.М. Марцінчыкам[3]. Гэта мой знаёмы яшчэ з 1924 г. Мы ўвесь час ліставаліся. Мала таго, прыяжджаў у Вільню і вельмі шчыра апекаваўся маім здароўем. А цяпер сам цяжка хворы. Ляжыць у шпіталі. Вельмі [illegible] неспакойная, і шкада мне яго.

Другі добры знаёмы — гэта Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч. Але і ад яго вельмі даўна весткі німа. А чаму — ня ведаю.

Цяперашнія назовы вуліц, нават у старым горадзе, нічога мне не гавораць. І чужыя — падвойна, бо, хіба, ніводнай німа з беларускім гучаньнем. А Вы дзе жывеце, у якой часьці гораду? Але хопіць — столькі заняла Вам часу. А запрашаю шчыра і сардэчна.

Усяго Вам найлепшага. *Л. Войцікава.*

Адрас Сяргея Міхайлавіча Новіка-Пеюна: *вул. Купрыянава, д.9, кв. 108; тэлефон: 26–08–48.*

108. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

5 чэрвеня 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Учора атрымала Ваш ліст — дзякую. Сьпяшу адказаць. Лістоў набралася шмат, а маё здароўе моцна падарвала сьмерць др. М.М. Марцінчыка. Ня ведаю, ці асабіста былі з ім знаёмыя, а я аж ад 1924 г., калі ён быў студэнтам Віленскага ўнівэрсытэту, а пасьля вельмі дзейным сябрам беларускіх арганізацыяў. Апошнія пару гадоў лячыў мяне, хоць і жыў у Гродне, а я ў Вільні. Прыяжджаў, а то і здалёк слаў парады, рэцэпты, а часам і лекі. Цяжка траціць старых сяброў, асабліва калі яны амаль равесьнікі.

Дзякую за апісаньне сучаснага Гродна. Я больш-менш арыентуюся, бо была ў Гродне ў 1970 г.— з унукам у Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча. Гасьцявалі дні тры. Я ўнуку паказывала ўсе старажытнасьці Гродна. Касьцёлы ўсе ведаю, бо амаль усе зьвязаныя з жыцьцём або сям'і майго бацькі, або з Гродзенскім гуртком беларускай моладзі. Гэты наш гурток (яго коратка называлі ГГБМ, бо быў нелегальны) нічога супольнага з рэлігійнымі пытаньнямі ня меў, але адным з арганізатараў быў кс. Францішак Грынкевіч,

і мы дзеля канспірацыі нейкі час ладзілі свае сходкі ў яго — як школьнага капэляна.

У лісьце ўсяго не апісаць. Мару, каб дажыць, пабачыць Вас у сябе, падзяліцца ўспамінамі аб Гродне майго часу. Можа, і Вас зацікавяць нейкія факты.

Чаму не абзываецца да мяне А.М. Пяткевіч — не разумею. Пісаў жа даволі часта — і перад тым, як яго пазбавілі катэдры, і пасьля. Ды ўсё зьбіраўся прыехаць. Прыяжджаў раз адзін, а другі раз з жонкай. Але гэта былі кароткія візыты, а хацеў прыехаць на пару дзён — пакапацца ў маіх архівах. А цяпер — ціха. Я нават ня так даўна пісала. Але калі нават ён ужо жыў у новым памяшканьні, то дачка, хіба, ліст яму аддала.

Просіце аб якую легенду ці факт — як тэму да гістарычнага верша? Думаю-думаю, і нічога не прыходзіць у галаву. Мяне заўсёды больш цікавіла прырода, а не гісторыя, і на такія легенды не зьвяртала ўвагу. У дзіцячай часапісі "Зоранка" друкавала легенду "Скуль узяліся асіны і бярозы", а ў часапісі "Беларуская борць" — "Скуль узяліся пчолы". Але маю для Вас такую прапанову, гэта часткова зьвязана з гісторыяй — беларускімі пісьменьнікамі.

Каля Вёскі Мясота Маладзечанскага р-ну праходзіць стары шлях — тракт, які злучыў Менск з Вільняй. З дакумэнтаў вядома, што па гэтым тракце каля Мясоты праяжджала шмат нашых пісьменьнікаў, паэтаў, дзеячоў. Ехалі таксама славутыя літоўцы, латышы, расейцы. І вось па ініцыятыве загадчыка Маладзечанскага музэю Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага[1] пры самой вёсцы злажылі помнік з каменьняў, і на ім — імёны тых, хто ў тыя далёкія часы сюдой ехаў.

У вёсцы ёсьць школа. Дзеці гэтай школы пастанавілі зрабіць у сябе куток пісьменьнікаў. Пачалі зьбіраць адпаведныя матэр'ялы, здымкі, артыкулы, успаміны. Зьвярнуліся яны да мяне, просячы расказаць ім аб Ядвігіне Ш., М. Багдановічу і г.д. Я ім паслала крыху сваіх успамінаў, крыху здымкаў, пазнаёміла іх (лістоўна) з Уладзімірам Содалем з менскага тэлебачаньня. І ён ім, падобна, шмат памагае ў арганізацыі кутка.

Дзеці Мясоцкай школы прыслалі мне сьпісак імёнаў зьмешчаных на помніку, а таксама верш літоўскага паэта — на жаль, па-руску. Я ім абяцала, што папрашу каго з нашых беларускіх паэтаў зрабіць пераклад на беларускую мову. Мо вы гэта зробіце? Была б Вам вельмі ўдзячная. А мо і самі на гэтую тэму напішаце? Было б цікава і карысна. Пасылаю верш і сьпісак.

Выбачайце, што так невыразна і малазразумела пішу. Чуюся дрэнна. Хочацца, каб Вы прыехалі. Можа, наш цудоўны лясны куток зрабіў бы добрае ўражаньне...

Усяго Вам найлепшага! *Л. Войцікава.*

109. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

17 чэрвеня 1980 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

Ужо даўно прачытала Вашую "Стронгу"[1], якая мне вельмі спадабалася. І ня толькі мне — маёй дачцы, Слаўцы таксама. Як шкада, што Вы так мала пішаце! Арыгінальная тэма, добры стыль, добрая мова ўносяць у нашую літаратуру нейкі сьвежы подых. А ён так патрэбны...

Як Вам жывецца? Як гадуецца дачушка? Пісаў мне Сяргей Міхайлавіч

[Новік-Пяюн], быццам Вы яму казалі, што выслалі да мяне ліст? Я нічога ад Вас не атрымлівала ўжо даўно. Сама я чуюся вельмі дрэнна. Асабліва падарвала мне здароўе сьмерць старога сябра, шчырага, чыстай душы беларуса, амаль майго равесьніка, доктара Марцінчыка — гродзенчука. Адыходзяць добрыя людзі, і на гэта німа рады.

Вось ужо мінула 14 чэрвеня 80-годзьдзе нашага сьпевака Міхася Іванавіча [Забэйды] — і нідзе аб гэтым ні гуку. Хоць бы дзе цёплым словам успомнілі, ушанавалі. Казалі, што мастакі ў Менску мелі нешта наладзіць, але ня верыцца мне, каб з гэтага што было. У апошнім нумары "ЛіМа" выцягнулі знекульсь нейкага Шапіру[2] — у яго 75-годзьдзе — а свайго заслужанага беларуса абмінулі. І не рада я, што да такіх часоў дажыла. Цяжка ўсё гэта прыймаецца!

Усяго Вам найлепшага і Вашай сямейцы шчыра зычу. *Л. Войцікава.*

Слаўкі ўдома німа і не будзе аж 3 тыдні. Паехаў вандраваць па гарах Грузіі. Хоць мне без яго сумна, але я рада, што адпачыне, пабачыць сьвет. І так ён зашмат працуе. У сябе па прафэсіі, а пасьля ўдома, у садзе, агародзе і г.д.

Яшчэ слова аб Вашым апавяданьні. У Вас маленькі недагляд: пішаце — *картаплянік*, а пасьля — *бульба*. Ужо або адно, або другое: *картаплянік — картоплі, бульба — бульбоўнік*. Праўда? Яшчэ раз усяго добрага! Бывайце! *Л.В.*

110. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

26 чэрвеня 1980 г. Вільня

Даражэнькая Данута Іванаўна.

Пазаўчора быў у мяне Новік-Пяюн. Прывёз нарэшці скончаны альбом "Наш сьпявак Міхась Забэйда". Працаваў над ім амаль 6 гадоў. Там шмат тэксту: нарыс Янкі Шутовіча "На вышынях мастацтва", напісаны ў 1971 годзе, успаміны самога сьпевака, рэцэнзіі канцэртаў, праграмы і г.д. А таксама шмат здымкаў сьпевака ў розных ролях, у розныя часы. Рэч цікавая і цэнная.

Альбом у мяне, бо куды ж яго даць? Каму? Калі нават аб 80-годзьдзі нідзе ні аднаго слова... Крыўдна за яго, горка, я абураюся бязьмежна. Ад самога юбіляра кароткую картку маю — моцна перажывае сьмерць др. Марцінчыка. Не напісаць аб гэтым сумным факце нельга было, бо вельмі непакоіла б Міхася Іванавіча маўчаньне прыяцеля.

А ці Вы свой верш М. З[абэйду] паслалі? Ці надрукавалі яго дзе-небудзь? У "ЛіМе" німа...

Пры нагодзе гаварыла аб задуманай намі помачы — "бедным і адзінокім". Ня варта было і думаць... Толькі перад Вамі, дарагая, чуюся вінаватай, што без патрэбы турбавала Вас сваімі непатрэбнымі нікому праектамі. Аж сорамна — старая, а такая наіўная...

Аб Хворасьце німа чаго гаварыць — мае сваю Зою і добра. Толькі з ім самім дрэнна — усё яшчэ ў шпіталі, і папраўы не відаць. А вось Новік дзясяткі разоў пісаў — жаліўся: "Я адзін, ніхто мяне не наведывае, хіба, толькі тады, як маюць якую справу. Часта німа каму хлеба купіць"...

А цяпер на нашу прапанову — адказ: "Я сам сабе добра раджу, маю шмат грамадзкіх (?) справаў і нічым іншым займацца ня маю часу". А ну іх...

Мне толькі прыкра, што я Вам забрала час і заняла думкі ідэяй, як аказалася, нікому непатрэбнай. Сама сябе ў душы лаю.

На гэтым трэба скончыць, бо нічога добрага і цікавага не напішацца.

Надвор'е дрэннае — дождж, хмарна. Хоць на наш пяшчаны агарод гэта добра — і паліваць ня трэба, і ўсё добра расьце. Як жа мне хочацца паказаць Вам свой лясны куток! Мора кветак, розныя адценьні зелені ў лесе, прытым бываюць і цікавыя спатканьні. Унук сёлета спаткаў статак сарнаў, а дачка ўчора здалёк пабачыла — лася! Вось як мы жывем.

Усяго Вам і Вашай сям'і найлепшага! Як найбольш здароўя і спакою. Ваша *Л. Войцікава*.

111. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

4 ліпеня 1980 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Учора атрымала Ваш ліст і зараз адказываю, што толькі магу. І так, па чарзе.

Магіла Казіміра Сваяка[1] знаходзіцца недалёка ад магілы Лявона Дубейкаўскага, але ў вельмі недаступным мейсцы. Да таго ж, там ня помнік, а плоская вялікая пліта. Мы з с.п. сынам рабілі здымкі магілаў і помнікаў беларускіх пісьменьнікаў і дзеячаў, як на Росах, так і на г.зв. Былінах — могілках праваслаўных. Але пасьпелі зрабіць толькі 6 з іх. Здымкі маю. Апрача таго, маю спісак беларускіх магілаў, які мы рабілі супольна з Адольфам Клімовічам.

Але вярнуся да К. Сваяка. Увайшоўшы на сходы, якія вядуць да магілы Л. Дубейкаўскага, трэба зьвярнуць адразу налева — там вузенькая сьцяжынка на самым спадзе гары і давядзе да пліты К. Сваяка. Думаю, што там за гэтыя гады ўсё зарасло, ды і літары, хіба, не прачытаюцца. Апрача мяне гэтую магілу ведае і Янка Багдановіч, і яму, хіба, лягчэй, чым мне, туды дабрацца.

Успомніць таксама ня толькі варта, але і трэба — Уладыслава Паўлюкоўскага, пахаванага на Росах. Гэтую магілу таксама мы двое — Янка Багдановіч і я — ведаем. Ня ведаю, ці Вы зьвярнулі ўвагу ў маім рукапісным зборнічку біяграфіяў беларускіх дзеячоў на гэтае прозьвішча — У. Паўлюкоўскі. Ён няшмат пісаў, і творы сярэдняй вартасьці, але адна работа вельмі цікавая — каляндар на круглы год. Кожны месяц мае назовы ў самых розных мовах, гісторыя кожнага месяца, пачынаючы ад назову, да сьвятаў, звычаяў і г.д. пачынаецца ад рымскіх часоў, канчаецца звычаямі, прыказкамі і г.д. беларускага народу.

Друкавалася гэта праца ў "Шляху моладзі", а я маю перапісаную ад рукі. На яго магіле ёсьць маленькі помнік. Надпіс — па-беларуску. Апекаваліся магілай удава і яе сын — пасынак Паўлюкоўскага. Але апошнія гады, як мне казаў Янка Багдановіч, магіла зусім запушчаная.

"Беларуская кнігарня" была на Завальнай, № 7. Гэта рог Завальнай і Малой Пагулянкі, якая цяпер называецца вул. Кастуся Каліноўскага. Цяпер гэты дом зусім перабудаваны, аж пазнаць цяжка. Лявон зрабіў здымкі, і я меншбольш арыентуюся, як было. Уваход у кнігарню быў ад Завальнай, і адна вялікая вітрына. Другая вітрына — ад Малой Пагулянкі, і адтуль з панадворка быў другі праход у памяшканьне кнігарні. За самой кнігарняй быў даволі вялікі пакой, дзе ў годзе 1911–12 жыў Іван Луцкевіч, і там стаяла вялікая скрыня, у якую ён складаў свае скарбы — першыя музэйныя экспанаты. Я іх бачыла ў канцы 1912 г.

Пасьля 1-й сусьветнай вайны кнігарняй загадваў Станіслаў Станкевіч[2] — *Кнігар*. Па пэўным часе (гэтую гісторыю ведае Я. Багдановіч) кнігарню



Зоська Верас. Фота С. Панізьніка. 1978 г.



Маці – Эмілія Сівіцкая. 1912 г.



Бацька – Антон Сівіцкі. 1890 г.



Людвіка з маці ў Альхоўніках. 1900 г.




Дзед – Людвік Садоўскі.
Альхоўнікі, 1900 г.



Людвіка Сівіцкая (у першым шэрагу зьлева) з роднымі. 1890 г.



Гарадзенскі гурток беларускай моладзі. У першым шэрагу: Зыгмунт Абрамовіч, Казімір Калышка, Адам Бычкоўскі; у другім шэрагу: Алена Шэгідзевіч, Людвіка Сівіцкая, ксёндз Францішак Грынкевіч, Ганна Салянка, Станіс Кунда; у трэцім шэр Вінцусь Семяновіч Марыя Салянка, Ста Більмін, Францішак Эйсмант, Эдмунд Кунд Павел Аляксюк, Часлаў Чарноцкі, Станіслаў Раманоўскі. 1910 г.



Ксёндз Францішак Грынкевіч.



Л. Сівіцкая ў ролі Ганкі з п'есы К. Каганца "Модны шляхцюк". 1910 г.




Адам Бычкоўскі.



Адольф Зянюк.




Старая Гародня. Канец XIX стагодзьдзя.



Wielmożna Pani
L. Siwicka
Horodno

Сябры пісалі Л. Сівіцкай на гарадзенскі адрас.



Сябры гарадзенскага гуртка.
У першым шэрагу: Людвіка Сівіцкая і Юзя Грынкевіч; у другім шэрагу: Ян Раманскі, Адольф Зянюк, крайняя справа – Марыся Бобрык. 1913 г.




Надмагільле кс. Ф. Грынкевіча на каталіцкіх могілках у Гародні.



Рамуальд Зямкевіч, Гальяш Леўчык і Людвіка Сівіцкая. Варшава, 1914 г.



Фабіян Шантыр.



ВСЕБѢЛОРУССКІЙ СЪѢЗДЪ
5 декабря 1917 года въ г. Минскѣ.

Билетъ №

выданный

представляющему членовъ, на право участія въ засѣданіяхъ съѣзда съ рѣшающимъ голосомъ.


Что подписью съ приложеніемъ печати удостовѣряется

декабря 1917 г.

Предсѣдатель Мандатной Комиссіи

Секретарь

Пасьведчаньне дэлегаткі Усебеларускага зьезду Л. Сівіцкай.



БІЛЕТ №

Октябра 17 дня 1917 г.

Членъ Організацыйнаго бюро

Пропуск на Вайсковы зьезд.



Дэлегаты Вайсковага зьезду. У першым шэрагу: 1 – Язэп Мамонька, 2 – Ігнат Дварчанін, 3 – Лявон Дубейкаўскі, 5 – Язэп Лёсік, 6 – Язэп Варонка, 7 – Язэп Дыла, 9 – Кіпрыян Кандратовіч, 10 – Сымон Рак-Міхайлоўскі, 11 – Палута Бадунова, 12 – Іван Краскоўскі, 13 – Васіль Муха; у другім шэрагу: 7 – Антон Лявіцкі, 8 – Паўліна Мядзёлка, 16 – Людвіка Сівіцкая, 17 – Аляксандр Чарвякоў; у трэцім шэрагу: 4 – кс. Аляксандр Астрамовіч. Менск, 1917 г.

Аўтограф Зоські Верас. 1917 г.

Запіска М. Багдановіча Зосьцы Верас. Аўтограф, 1916 г.



Л. Сівіцкая
з сынам Антонам
Шантырам. 1919 г.



З мужам Антонам Войцікам. 1926 г.



Вокладка часопіса
“Заранка”. 1927 г.



З дачкой Галінай Войцік.



Эксьлібрыс
Зоські Верас.
Мастак
В. Целеш.



У садзе. Фота Ф. Ігнатовіча. 1978 г.




Зоська Верас. Мастак
Я. Кулік. 1987 г.



Яраслаў і Галіна Войцікі, Зоська Верас,
Янка Саламевіч. 1976 г.



З Фёдарам Ігнатовічам. 1978 г.



З Аленай Руцкай. 1986 г.



З Аляксеем Пяткевічам. 1980 г.

падзялілі — частка асталася як прыватная ўласнасьць Ст. Станкевіча, а другая — ужо як кнігарня Выдавецкага таварыства — перабралася на Вастрабрамскую вул., № 1 — рог Гэтманскай — пад загад Ігната Мятлы[3] (брата П. Мятлы[4], пасла). У якім годзе яе зачынілі — ня помню (ёсьць здымак). Ізноў, напэўна, ведае Я. Багдановіч. Пасылаю Вам яго адрас. Думаю, чаго я не дасказала, ён выясьніць. Можа, ён і аб дошцы ў гонар М. Ластоўскай[5] ведае? Бо ні я, ні зяць аб ёй ня чулі.

Што да музэю і гімназіі — адкажа Вам Лявон, разам з весткамі аб сваім бацьку. Я яму дала брашуру А. Луцкевіча "Prawda o celi Konrada"[6]. Там ёсьць пляны гэтай цэлі і падрабязнае апісаньне. Здымкаў Базыльянскіх муроў у нас шмат з розных бакоў — і ад Вастрабрамскай, і ад Коннай. Усе яны — у альбоме "Віленская Бел[аруская] гімназія" (ёсьць і ўваход у музэй). Ёсьць, хіба, у Лявона і асобныя. Цяпер Лявон зрабіў цікавы альбом "Віленскі Бел[арускі] музэй імя І. Луцкевіча". Сабраны здымкі экспанатаў, розныя артыкулы аб музэі. Да таго ж, маем альбом "Наш сьпявак Міхась Забэйда". Ёсьць што паглядзець, і таму варта прыехаць.

Ледзь не забылася адказаць яшчэ на адно пытаньне. Гродзенскі гурток сваёй сталай кватэры ніколі ня меў. З самага пачатку зьбіраліся ў кіраўніка кс. Фр. Грынкевіча ў яго кватэры пры Бэрнардынскім касьцёле (у даўных кляштарных мурах). Пасьля, як яго назначылі ў Брыгіцкі кляштар, у яго кватэры там. Але гэта коратка.

У 1910 г. мая маці, удава капітана, атрымала ад уладаў дазвол трымаць вучнёўскую кватэру, і мы нанялі кватэру на Гараднічанскай вул., № 4–5 пакояў. І ў нас закватараваліся вучні і вучаніцы (двох з сёстрамі) — адныя беларусы, усе сябры гуртка. Я як бібліятэкар забрала да сябе бібліятэку — вось гэта і была кватэра гуртка. Тут адбываліся рэпэтыцыі хору (было ў нас піяніна), тут малявалі дэкарацыі, вялі рэпэтыцыі спэктакляў, і "нелегальны" гурток зьбіраўся легальна. Кватаранты запрашалі калегаў. Заўсёды на стале — самавар, гарбатка, а то і скокі. Моладзь гуляла...

Такія кватэры часта зьнянацку адведывалі г.зв. пэдэлі. Але ў нас ні разу ніхто ня быў. Усе кватаранты вучыліся добра. Захаваньне — як найлепшае. Ну і апінія "ўдавы капітана" мела значэньне. Так і цягнулася, аж пакуль мы ў 1913 г. выехалі з Гродна. Я — у Варшаву на курсы, маці мая — да свайго бацькі ў Сакольскі павет. Яшчэ ў пачатку 1913 г. пасьпеў гурток выдаць аднаднёўку "Колас беларускае нівы". Гэты "Колас" маю, дзякуючы І.У. Саламевічу.

А што з маёй "Пчалой"? Я бы радзіла Вам заглянуць да І.У. Саламевіча — паглядзець мае ўспаміны. Арыгінал пакуль што ў яго яшчэ — там у разьдзеле "Вільня" ёсьць наклееныя здымак дому на Віленскай, 12, і падпісана, якія дзе былі арганізацыі.

Цяпер, здаецца, усё. Усяго Вам найлепшага! *Л.В.*

Адрас Янкі Багдановіча: *Вільнюс, Жирмуну, 90, кв. 85.*

112. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

15 ліпеня 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна!

Учора атрымала Ваш ліст — дзякую. Хоць 10 ліпеня адведалі мяне менскія мастакі, я толькі з Вашага ліста зразумела, што ў іх быў намер зрабіць копію

альбому. Яшчэ раней, 26 чэрвеня, прыяжджаў Содаль і казаў аб тым, што Новік ня даў зрабіць здымкаў. Я зразумела, што проста некаторыя здымкі М. Забэйды хацелі мець... Не зарэагавала, ды, зрэшты, было ўжо позна — 22 чэрвеня альбом ужо быў у Вільні.

Сяньня я выслала даўгі ліст да Яўгена Сяргеевіча Куліка[1]. Што пісала — мастакі, напэўна, Вам скажуць ці напішуць. Паўтараць ня буду. Дрэнна чуюся, а пішу сяньня ўжо чацьверты ліст.

Справа копіі альбому ня страчаная, мо толькі крыху больш фатыгі будзе каштаваць. Тэксту перафатаграфоўваць німа патрэбы. Новік прывёз мне арыгінал нарысу "На вышынях мастацтва", які ўваходзіць у альбом, і яшчэ 2 копіі гэтага ж нарысу. Я прасіла, каб зрабіў адну копію для Міхася Забэйды. Калі ня мае магчымасьці пабачыць альбом, няхай хоць прачытае, што аб ім напісана. Гэтую копію ўжо М.З. адаслалі.

Але Новік зрабіў 2 копіі — другую для мяне асабіста. Яе я дам, каб перапісалі на машынцы для рэпрадукцыі альбому. А фотакопіі здымкаў зусім добра можна зрабіць тут на мейсцы. Трэба толькі, каб прыехаў фатограф з добрым апаратам. Гэтыя здымкі, што ў альбоме, перафатаграфавалі з пазычаных арыгіналаў самі, насамперад мой с.п. сын, а пасьля зяць. Памылка зробленая адразу — трэба было, робячы фотакопіі, рабіць у двух экзэмплярах, другі быў бы для копіі. Не падумалі...

А С. Новік не таму ня даў, што мы маладым ня верым, нічога падобнага. Ён проста такі пэдант, а мо крыху арыгінал. Дадзена яму што ў рукі — аддасьць толькі таму, хто даў. Ня трэба яго вельмі асуджаць. Вельмі цяжкае было (і ёсьць) яго жыцьцё. Ён праз 5 гадоў быў адданым супрацоўнікам "Заранкі", і ўсё было добра, а цяпер і мне часам цяжка з ім пагадзіцца.

Я з прыемнасьцю спаткаю знаёмага С. Панізьніка і дам сфатаграфаваць усё, што яму будзе трэба. Але ці трапіць ён да мяне? Адрас (дачкі, бо я на яе атрымліваю лісты і г.д.) — гэта мала... Заўсёды ў такіх выпадках даю тэлефон зяця на працы — дамаўляюцца, дзе сустрэцца, і зяць прыводзіць да мяне. А цяпер за тыдзень зяць ідзе ў адпачынак. У сваёй кватэры дачка і зяць летам бываюць рэдка. Усё ў нас — у мяне і ўнука.

А ўнук мае такую працу, што вельмі няпэўная хвіліна, каб мог адарвацца да тэлефоне. Хіба, у Менску хто з маіх бліжэйшых знаёмых — У. Содаль, Арсень Ліс, І.У. Саламевіч ці Адам Язэпавіч Мальдзіс — маглі б вытлумачыць, як да мяне дарогу знайсьці. І як тут зрабіць?

Ці Вы свой верш асабіста Забэйду пасылалі? Ці маеце яго адрас? Я ўчора атрымала ад яго ліст. Просіць падзякаваць усім, хто аб ім помніць. Чуецца дрэнна. Заўтра да яго буду пісаць.

У нас мяса валовае ёсьць кожны дзень, апроч суботы і нядзелі. Гэта таму, што ў вольныя дні прыяжджае маса калгасьнікаў, нават з Беларусі, і ўсё выкупляюць. Цяпер дбаюць, каб сваім мясцовым хапіла. Тварог (добры) ёсьць заўсёды. Але ж гэтыя прадукты летам не перашлеш і не перавязеш — псуюцца. Шкада, хацелася б Вам памагчы... А лекі, якія трэба, маю, а часам памагаю сабе зёлкамі. Вось толькі ад старасьці лекаў німа...

Канчаю і лягу. Мінулую ноч зусім ня спала. Усяго найлепшага! Ня думайце нічога благога аб нас, старэйшых. *Л. Войцікава.*

113. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

31 ліпеня 1980 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую за паведамленьне аб атрыманьні майго ліста. Чытаю Вашую кніжку "Дарогі вялі праз Беларусь"[1] і хачу Вам сказаць, што калі мне было гадоў 6–7, г.зн. у 1898–99 гадах, у Гродне быў яшчэ пантонны мост, а на другім баку Нёмана — процілеглым ад гораду — быў яшчэ г.зв. заезд. Гэта не была карчма, а жыдоўскі драўляны прызваіты дамок, дзе адзін пакойчык, чысты, нядрэнна мэбляваны, служыў для адпачынку падарожнікаў. Можна было памыцца, дастаць шклянку гарбаты і г.д. Затое да дому быў прыбудаваны вялікі будынак з варотамі, куды можна было ўехаць парай коняў з брычкай. Гэта ўжо была вуліца прадмесьця, але ёю пачыналася шаша, якая ішла ад крэпасьці Асавец у Гродна.

Заезд стаяў на горцы, г.зн. вуліца спускалася ўніз даволі стромка. Як жа страшна было зьяжджаць на ня вельмі шырокі, калыхаючыся мост... Трэба было ехаць вельмі памалу і ўвесь час калыхацца разам з мастом. Найчасьцей астаўлялі коні ў заезьдзе і ішлі пехатой, што таксама не было вельмі прыемным... Вось якія ўспаміны абудзіла Вашая кніжка, Адам Язэпавіч (ахвотней пісала б — пане Адаме).

Вы мне не адказалі, што з маёй "Пчалой". Не ідзе мне аб тое, ці яна будзе друкавацца ці не. Але Іван Уладзіміравіч Саламевіч прыслаў мне машынапіс, г.зн. перадрукаваныя на машынцы мае ўспаміны. Рукапіс яшчэ ў яго. А вось "Пчалы" і "Б[еларускай] борці" ня маю. Толькі рукапіс. Але гэта нічога. Зяць мае машынку, аб чым я забылася, бо яна яшчэ не перароблeная на беларускі шрыфт. Пераробіцца — перадрукуе і маю "Пчалу".

Дарэмна я аб гэтым пачала пісаць, але перапісываць ня хочацца. Выбачайце. Дрэнна чуюся і раблю глупства — здаецца, дагэтуль гэтага не было. Гэта, відаць, так на мяне падзеяла сьмерць старога знаёмага, беларускага дзеяча др. Мікалая Марцінчыка, пасьля якой не магу прыйсьці да сябе...

Усяго Вам найлепшага! *Л.В.*

P.S. Што належалася Лявону — аддала.

114. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

2 жніўня 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Дзякую за некалькі слоў ад Вас. Што ёсьць адпаведныя машыны для рэпрадукцыі, я добра ведаю. Аб што ішлося мастакам, я не адразу ўцяміла. Зусім згаджаюся, што зрабіць копію — гэта вялікая і патрэбная справа. Веру, што мастакі маюць магчымасьць карыстацца такой машынай. Але ці на гэта ня трэба спэцыяльнага дазволу? І ці на рэпрадукцыю *такой* рэчы можна той дазвол дастаць?

Калі быў напісаны нарыс аб нашым сьпеваку, аўтар упёрся, што ён будзе надрукаваны, хоць мы тут яго папераджалі, што з гэтага нічога ня будзе. Павёз ён свой нарыс у "Маладосьць". Рэдакцыя прыняла, супрацоўнікі падрыхтавалі да друку, а друкаваць — не пазволілі. Аб гэтым мяне паведаміла Вольга Іпатава[1].

А як робяцца рэпрадукцыі — маю практыку. Некалісь я адаслала ў Менск у акадэмію, у аддзел рукапісаў і рэдкіх друкаў, адозвы, інструкцыі і т.п. папе-

ры Таварыства беларускай школы, але прасіла, калі гэта магчыма, зрабіць мне копіі. Хутка копіі атрымала.

А цяпер больш чым 1½ гады таму два музэі — Гродзенскі (у інстытуце мэдыцыны) і Гудзевіцкі школьны — папрасілі ў мяне мой "Батанічны слоўнік", а я маю толькі адзін экзэмпляр. Тады С. Новік даведаўся ў Менску ў акадэміі, што яны маюць 2 экз. майго слоўніка і могуць зрабіць яго рэпрадукцыю, але не для прыватнай асобы, а для арганізацыяў, і каб прысланць адрасы тых музэяў, якія слоўніка патрабуюць. Быццам не даюць акадэміі нейкага там парашку, патрэбнага для гэтай работы. А каб я дала свой адзіны экзэмпляр? Так і чакала б звароту?

Яшчэ не ўспакоілася пасьля альбомнай справы, як новая прыкрасьць. Прыехала ў Менск і Вільню, каб адведаць магілу свайго дзеда — Ядвігіна Ш.— яго ўнучка Алеся са сваёй дачкой і яе сынкамі — пра-праўнукамі Ядвігіна Ш. Што да мяне не даехала — віна пераблытаных нумароў тэлефона. Добра, што магілу дзеда сама знайшла і пабачыла, што яна дагледжаная. А вось у Менску спаткала іх проста абураючая сустрэча. Вы, хіба, ведаеце, што Я. Колас — блізкі сваяк Я. Лёсіка, а значыцца, і дзеці дачкі Ядвігіна Ванды і яе мужа Язэпа Лёсіка — сваякі сына Коласа Данілы[2]. І вось Алеся, дачка Я. Лёсіка, з цэлым даверам наведала сваяка ў музэі. І што ж? Спаткаў горш, чым чужых. Не запытаўся, як і дзе жывуць і г.д. Усяго коратка не раскажаш. Бедная Алеся напісала мне ліст, поўны болю і скаргі. Ад часу сьмерці маткі Ванды я ім замяніла цётку, як яны пішуць: "Вы адзіная нітачка, якая зьвязывае нас з зямлёй бацькоў і дзядоў".

Выбачайце, што так "пакруціла" старонкі. Знэрвавалася, сама чуюся дрэнна, а тут яшчэ і дачка захварэла. А што з ёй — дактары ня могуць пазнаць. Таму і ліст без вялікага сэнсу.

Я ахвотна дала б мастакам альбом для рэпрадукцыі, але ж гэта не мая ўласнасьць, і трэба было б мець згоду ўсіх, хто матэр'ялы для альбому даваў, зьбіраў і г.д. На вялікі жаль, гэта ўсё людзі, якія ня маюць звычаю адказываць на лісты, на закранутыя ў іх справы. Проста маўчаць і ўсё. Як жа ўсё гэта надакучыла...

Вы дарма ў адным з лістоў напісалі: "Вы, старое пакаленьне, ня верыце нам, маладым...". Што тычыцца мяне асабіста, хоць я самая-самая старая,— веру больш у маладых, чым у г.зв. сярэдняе пакаленьне. Маладыя, калі ў цяперашні час змаглі захаваць чыстую беларускую душу, мову, то ўжо на вагу золата. А сярэднія? Ім гонар, граматы, тытулы даражэйшыя за ўсё, і за іх яны гатовыя на ўсё. Ёсьць і іншыя, на шчасьце.

Цалую шчыра. *Л. Войцікава.*

115. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

15 жніўня 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Якраз пару дзён таму атрымала я паштоўку ад нашага сьпевака. Сумная яна, як і ўсе весткі ад яго з апошняга часу. Быў тры тыдні ў санаторыі, але здароўе не палепшала, а толькі аслабеў. Цяпер ізноў чакае на розныя аналізы, што пры яго слабасьці выконваць цяжка. Да ўсяго яшчэ зачынілі на рамонт блізкую сталоўку, у якую ён хадзіў абедаць. Піша: "Часам, калі змагу, хаджу ў далейшую, а калі не — сяджу ўдома на дыетычных кансэрвах". Ці ж гэта жыцьцё?

Мне так хацелася зрабіць яму прыемнасьць — пасладь той нарыс аб ім, які зьмешчаны ў альбоме. С. Новік зрабіў тры экзэмпляры на машынцы. Адзін у альбом, а два прыслаў мне. Вось адзін з іх быў прызначаны для сьпевака. І што Вы думаеце? Тры разы пасылалі, і кожны раз пошта варочала. Зяць пайшоў на міжнародную пошту даведацца, у чым справа. Аказалася, што ні рукапісаў, ні машынапісаў за мяжу высылаць нельга. І рады на гэта няма.

Сяньня якраз прыйшоў Ваш ліст з Вашым вершам. Я зараз жа да М. Забэйды напісала і выразку (Ваш верш) паслала. Заўсёды лісты да яго пасылаю лётнічай поштай, каб было хутчэй.

Ня ведаю, ці Вы знаёмыя з Алесем Мікалаевічам Белакозам. Але на ўсялякі выпадак пытаюся і Вас: што з ім? Ад мая ня маю ніякай весткі. Ніколі гэтага не было. Пыталася Ларысу Антонаўну [Геніюш]. Нічога на маё пытаньне не адказала, а і ня ўспомніла, ці быў у яе на 70-годзьдзі... Напісала да яго дачкі Марыны — таксама маўчыць.

А Я. Хвораста хуткая дапамога забрала ў рэанімацыю. Адным словам — нідзе нічога добрага. Адна згрызота — з маёй хатай уключна. У дачкі высокі ціск крыві і, мусі, нешта з сэрцам. Гэта дзеіць і на мяне, але апошняе малаважнае. Яшчэ хоць з кійком па грыбы хаджу. Толькі трэба заўважыць, што хаджу недалёка, бо лес пад самай нашай хатай. Толькі што грыбоў добрых німа — адныя лісічкі і сыраежкі, часам — маленькія масьлякі.

Усяго Вам найлепшага! Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

116. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

4 верасьня 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Так доўга Вам не адказывала, што хачу хоць коратка напісаць больш не адкладаючы. Аб тым, каб паслаць М. Забэйду нарыс аб ім часткамі, і [redacted] думала. Але гэта немагчыма. Нарыс вялікі — 67 старонак машынапісу. Ды і трэба было б, каб нехта перапісаў добрым, выразным почыркам, бо ў яго клопат з вачамі. То сколькі лістоў трэба было б выслаць? А гэта ўжо выглядала б падазрона. Яшчэ адну пробу робім — ужо не адсюль. А мо ўдасца...

Ад М. Забэйды даўна німа весткі, а гэта непакоіць. Я ведаю, што ён там шмат сяброў мае, а вось удома — апекі ніякай. Ці мае што есьці, ці можа хадзіць — ніхто, відаць, ня дбае.

У справе М. Забэйды да Вас такая просьба: можа, маеце магчымасьць дастаць той нумар газэты з Вашым вершам[1] — для яго, а калі не, то напішыце, калі ласка, верш ад рукі на паперы без лінеек, з Вашым подпісам. Хочам яго ўклеіць у альбом. Чакаем.

Ад Алеся Белакоза нядаўна мела ліст. Невясёлы — хвароба страўніка яго зьядае. А ён працуе за дзесяцёх. Яго вучаніцы — здольныя дзяўчаткі — прысылаюць мне свае вершы, пішуць лісты. Я ўжо 12 гадоў з імі ў кантакце, г.зн. з Гудзевіцкай школай і яе музэем. А вось бывае перарыў у ліставаньні, і [redacted] непакоюся. Сёлета хацеў падчас адпачынку падлячыцца — паехаць у санаторыю, але не далі пуцёўкі. Цяпер у яго поўна плянаў. У Гудзевічах будуюць новую школу, а старую абяцаюць даць на музэй. Вось і думае загадзя, як што дзе зьмясьціць. Каб хоць яму хапіла сілы на ўсё гэта.

Я даўна пыталася Вас, ці не прабавалі лячыць мужа зёлкамі? Ад усялякіх хваробаў вантробы адзіны добры сродак — сьвятаяньнік (па-польску — *dziurawiec*, расейскі назоў — *зверобой*, лацінскі — *hypericum perforatum*).

Піць — як гарбату, незалежна ад іншых лекаў. Зашкодзіць ні ў якім выпадку ня можа, а магчыма, прынясе палёгку. У мяне шмат добрых кніжак аб лекарскіх зёлках, а і ўласнай практыкі нямала. Чытаючы Вашы вершы, бачу — Вы беларускія назовы расьлін добра ведаеце, што вельмі цешыць, бо ў нашых паэтаў і пісьменьнікаў бывае ўсяляк.

Ніяк не зьбяруся напісаць (адказаць) Ларысе Антонаўне [Геніюш]. Але цяпер гэта, можа, і ня так важна, калі яна шчасьлівая — цешыцца сынам і ўнукам. У мяне лістоў назьбіралася за дзясятак. Адказаць трэба, а з маім здароўем зусім дрэнна. Ці сёлетняе неспрыяючае надвор'е, ці проста — гады...

Сардэчна цалую. *Л.В.*

117. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

14 верасьня 1980 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч[1].

Нарэшці мы сабраліся пераслаць Вам абяцанае. Зяць — фотакопіі паштовак, а я — ліст. Ліст з вялікай падзякай за прысланую "Маладосьць" з Вашым артыкулам. Гэты нумар ёсьць, але не ў мяне ўдома, таму я зусім забылася аб ім. А Ваш артыкул і здымкі паштовак для мяне вельмі дарагія. Асабліва "Брыгіцкі касьцёл", пры ім, зразумела, і кляштар. Ён мне прыпамінае маё раньняе дзяцінства... Мушу выясьніць Вам гэта.

Хоць мы ў Гродне тады не жылі, але амаль кожны год прыяжджалі ў адведзіны да бацькоў майго бацькі — Міхаліны і Міхала Сівіцкіх. А родная цётка маёй бабкі Міхаліны была (па-польску) *prioress* — (па-рас[ейску]) *ігуменьняй* кляштара імяні сьв. Брыгіты — Брыгіцкага. Вось я з мамай або бабкай хадзіла адведываць сваю прабабку.

Маючы гадоў пяць-шэсьць, бегала па калідорах кляштару, сядзела з прабабкай у гародчыку. А пасьля, калі па сьмерці бацькі мы з мамай жылі ў Гродне, дзе [redacted] канчала гімназію, то жылі процiў муроў, якія абгараджывалі кляштар на другім баку вуліцы. Гэты здымак і наагул Ваш артыкул — вялікая для мяне каштоўнасьць.

У мяне знайшлася яшчэ адна паштоўка Гродна: *Гродно. Общий вид. Grodno. Widok ogulny.* На другім баку: *Открытое письмо. Pocztówka. Carte Postale.* Ці Вы такую маеце? Калі не — напішыце. І яшчэ, ці маеце ўспаміны П. Мядзёлкі "Сьцежкамі жыцьця"? Там на стар. 64 зьмешчаная паштоўка: партрэт З. Бядулі. На другім баку рукой Бядулі некалькі слоў да Паўлінкі і дата: *25.5. 1925 г.*

Думаю, што маеце, але на ўсялякі выпадак... Аб паштоўцы з песьняй Паўлінкі — напіша Вам Лявон. А ведаеце, мы бачыліся з Вамі адзін раз, а мне здаецца, што [redacted] Вас даўна ведаю. Гэта, мусіць, таму, што Вы з Гродзеншчыны. А [redacted] ж такая фанатычка ў гэтай справе. Ад 1923 г. я жыву ў Вільні, а зжыцца не магу. Я і так зьбіралася пісаць да Вас у справе паштовак. Але не старых, а цяперашніх, сучасных.

Вось цяпер Вы маеце, што зьбіраць, ёсьць што паказаць. А што знойдуць нашы далёкія нашчадкі з нашага часу? Ці выдаецца цяпер якая вартасная беларускаая паштоўка? Праўда, ёсьць цэлыя сэрыі і альбомы, але пераважна з расейскімі надпісамі. А ўжо калі ўзяць сьвяточныя, віншавальныя паштоўкі,

то, ня кажучы ўжо аб тым, што з беларускімі надпісамі вельмі мала, але якая іх мастацкая вартасьць? Гэта ж агідна ў рукі ўзяць! Абы ясна-красна, як найбольш яскравых колераў, сьцягоў і г.д.

Чаму літоўцы і латышы могуць выпускаць цэлыя сэрыі паштовак мастацкай, далікатнай работы? Асабліва на Новы год, на 1 мая, а ў нас мусяць быць страшныя багамазы? Ад каго гэта залежыць? Але аб гэтым яшчэ пагаворым.

А цяпер: менскія мастакі зьбіраюцца прыехаць на мае 88-я ўгодкі, мо і Вы былі б ласкавы далучыцца да іх? Мой дзень урадзінаў (30 верасьня) выпадае ў аўторак — рабочы дзень. І мы пастанавілі папрасіць гасьцей крыху раней — на суботу (27 верасьня). Вельмі просім.

Перадайце, калі ласка, ад мяне шчырую падзяку гр. С. Панізьніку — за падараваны мне зборнік вершаў і за памяць.

Усяго Вам найлепшага! *Л.В.*

118. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

15 верасьня 1980 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Учора напісала Вам ліст і дала Лявону выслаць разам з паштоўкамі. А сяньня агледзелася, што забылася паслаць Вам адрас Новіка-Пеюна і не напісала, што аб Выдавецтве сувязяў беларускага працоўнага сялянства ніколі нічога ня чула. Магчыма, што Новік будзе што ведаць. Сьпяшаюся паправіць сваю памылку і адрас высылаю.

А яшчэ маю такую просьбу. Можа, будзеце ласкавы запытацца гр[амадзяніна] С. Панізьніка, ці мае каго знаёмага ў Празе, праз каго можна было б даведацца, што там чуваць у нашага сьпевака Міхася Іванавіча Забэйды. Доўга німа ад яго вестак. Не адказывае на лісты ні мне, ні Новіку, а апошні яго ліст быў вельмі сумны і трывожны. У нас (у мяне і Новіка) німа там нікога, каму можна было б даручыць гэтую справу.

Бывайце! *Л.В.*

P.S. "Літаратуру і мастацтва" выпісываем, і чытаю дакладна, асабліва артыкулы знаёмых пісьменьнікаў. Цяпер, здаецца, усё.

Адрас: *БССР, 220036, Мінск-36, вул. Купрыянава, 9–108, Новік-Пяюн Сяргей Міхайлавіч.*

119. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

14 кастрычніка 1980 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

"Успаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі" атрымала, газэты з Вашымі артыкуламі — таксама. Дзякую.

Добра, што хоць Ліда мае беларускую газэту, а Гродна і Ваўкавыск ня могуць гэтага здабыць. Прыкра гэта і сумна. А ведаеце, у 1912–13 гадах у Гродне выходзіла ўрадовая часапісь "Педагогическое дело", і там друкаваліся *беларускія* вершы сябра нашага гуртка Ёзіка Лявіцкага.

Я рада, што Вас зацікавіў наш гурток. Да гэтай пары нідзе не ўдалося аб ім надрукаваць. У 60-я гады Я. Саламевіч даў гэтыя мае ўспаміны ў "ЛіМ".

Патрымалі з паўгода і — вярнулі...

Цяпер кароткая зацемка аб гуртку мае ўвайсьці ў 1-ы том "Гісторыі беларускага тэатру". Добра, што мне прысылалі гэтую зацемку пераглядзець, хоць ёсьць пэўнасьць, што нічога не наблыталі.

Паслала я гэтыя ўспаміны ў Беласток, ужо даўна-даўна. Пасьля іншыя асобы папрасілі прыслаць. Зацікавіліся, бо ж наша дзейнасьць найбольш датычыла Сакольшчыны, Дуброўшчыны, Сухаволі, Сідры і ваколіц. Я паслала. Быццам хацелі надрукаваць у календары на 1981 год.

Ці што з гэтага будзе — ня ведаю, бо ёсьць там людзі, якія ня хочуць, каб успаміналі прозьвішча арганізатара і першага кіраўніка — *ксяндза* Францішка Грынкевіча. А я на ігнараваньне яго асобы не згаджаюся. Лічу гэтакі пагляд глупым і беспадстаўным. Гэта быў чалавек вялікага сэрца. Сотні бедных дзяцей і моладзі без увагі на іх мову і нацыянальнасьць, дзякуючы яго маральнай і матэр'яльнай падтрымцы, маглі вучыцца. Сяньня на яго магіле ў Гродне, як мне казалі, круглы год ляжаць сьвежыя кветкі. І вось ня ведаю, будуць друкаваць ці не...

Калі Вас цікавяць справы Гродзеншчыны, то варта было б Вам пазнаёміцца з аднаднёўкай, якую выдаў гурток у 1913 г., з лістамі сяброў ГГБМ да мяне — гэта лісты ўжо з часоў, калі гуртка не было, а сябры яго былі студэнтамі ў Пецярбургу. Але сьляды працы ў гуртку відаць... А таксама — з біяграфіямі 2 дактароў родам з Гродзеншчыны. Д-ра Станіслава Грынкевіча з мястэчка Новы Двор, які аставіў шмат навуковых працаў, а таксама папулярных — апошнія ў мове беларускай. І д-ра Міколы Міхайлавіча Марцінчыка — родам з вёскі Кубельнікі каля Гродна. Усе гэтыя матэрыялы маю.

Ня ведаю, ці Вы знаёмыя з Аляксеем Міхайлавічам Пяткевічам — выкладчыкам бел[арускай] літаратуры ў Гродзенскім унівэрсытэце. Ён ужо даўна зьбірае матэр'ялы да кніжкі "Культурнае і літаратурнае жыцьцё Гродзеншчыны". Я яму дала шмат матэр'ялаў. Меўся прыехаць, каб пазнаёміцца з лістамі сяброў гуртка, а таксама з біяграфіямі абодвух дактароў — Грынкевіча і Марцінчыка. Пісаў мне ў чэрвені (я з ім даўна знаёмая), што мае адпачынак да 10 ліпня і ў пачатку ліпня прыедзе. Не прыехаў — ня ведаю чаму. Я напісала, пытаючыся, што сталася, але адказу так і не атрымала.

Калі Вас цікавіць усё, аб чым пішу, калі ласка — прыяжджайце, надоўга не адкладаючы. Цяпер паміма дажджоў у нас сапраўды залатая восень. Нідзе ў іншым мейсцы я ня бачыла такога мноства адценкаў васеньніх фарбаў, як тут у нас.

Вы пытаецеся, ці я была ў якіх гарадах Гродзеншчыны апрача Гродна? Толькі ў Лідзе і то коратка — праездам. А ў Сакольшчыне ведаю мястэчкі: Сідру, Сухаволю, Дуброву, Саколку... і шмат вёсак. Усё гэта ў дзяцінстве і раньняй маладосьці... І вось цяпер, чытаючы ў беларускіх аўтараў, як гэта ў бел[арускіх] вёсках трымалі ў хатах курэй і жывёлу (курэй зімой у падпечках — бывала) ды завешвалі вокны заместа шкла радзюжкай, дзіўлюся — дзе гэта і калі было?

А як Вам здаецца? Дзе праўда? Чакаю адказу. Усяго добрага! *Л.В.*

120. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

20 кастрычніка 1980 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую, што адклікнуліся. Ліст дайшоў вельмі хутка, адразу адказываю.

З маімі прозьвішчамі і псэўданімам круцяць, як хочуць, хоць я ўжо ня раз зьвяртала ўвагу. Яшчэ горш тое, што нашы пісьменьнікі, нават такія паважаныя, як А.А. Лойка, ня вельмі дбаюць аб дакладнасьць. Яго (А. Лойкі) "Гісторыю літаратуры" маю, нават 2 экз. Адзін нехта прыслаў, а другі прывёз сам аўтар — на ўрадзіны. Прыяжджаў разам з Янкам Саламевічам. Я толькі пасьля іх ад'езду агледзелася, што не сказала аўтару аб яго памылковых сказах аб ГГБМ. Называе яго Таварыствам аматараў драматургіі, і арганізацыю прыпісывае мне...

Я была сябрам арганізацыйнага сходу, але не ініцыятарам ды арганізатарам. І гэта ў "Гісторыі літаратуры" для студэнтаў! І як тут верыць такім "гісторыям"? Паміж іншым, адзін лішні экзэмпляр гэтай кніжкі высылаю ўнучцы Ядвігіна Ш.

Што памяць А. Уласава трэба адзначыць — гэта справа абавязковая. Але перадусім трэба напісаць да роднай пляменьніцы — Веры Андрэеўны Ніжанкоўскай. Са свайго боку магу напісаць жменьку ўспамінаў, з чаго той, хто будзе апрацоўваць матэр'ял, возьме факты, якія будуць таго варты. Да жонкі А. Уласава пісаць *ня буду* і нікому ня раю з ёю зьвязывацца. Маю ўжо яе элеДэрат — піша глупствы...

Да яе ўжо даўна пісаў Новік-Пяюн. Яна яму адказала (зразумела — парасейску). Копію яе ліста Новік мне прыслаў — маю. Я Уласава ведаю з "Нашай нівы", пасьля тры гады разам працавалі ў Менску, а яшчэ пазьней спатыкаліся ў Вільні, як ён ужо быў сэнатарам. Калі трэба, магу аб ім напісаць не як аб дзеячу, не аб яго паглядах, проста як аб чалавеку ў штодзённым жыцьці.

Ёсьць альбом "Радашкаўская Беларуская гімназія". Аб гімназіі, яе арганізаваньні піша Вера Андрэеўна. Яна цяпер наракае на сваю памяць, так што артыкул у альбоме можа быць прыдатны. Я, праўду кажучы, не зусім упэўненая, але здаецца, што як арганізавалася гімназія, то А. Уласаў яшчэ ня быў жанаты, ці, праўдзівей, яго яшчэ не ажанілі...

Вельмі мне хочацца, каб Вам жаданы прысуд адбыўся як мага хутчэй. Спакайней мне будзе. Бываюць дні, што чуюся вельмі дрэнна, а тады нэрвуюся, што ня ўсё выканана як трэба.

Ці Вы знаёмыя з мастаком Вячаславам Міхайлавічам Целешам? Ён таксама зьбірае матэр'ялы аб "маёй Гродзеншчыне", як кажа сам. Вось дзеля гэтай нашай Гродзеншчыны мы з ім нейк пасябравалі.

А я Вас чакаю яшчэ з аднае прычыны. Др. Ігнатовіч вельмі хацеў здабыць копію майго "Батанічнага слоўніка" для музэю Гродзенскага інстытуту мэдыцыны. Доўга гэта трывала, але нарэшці копію маю. Праз пошту адсылаць не хачу, бо можа папасьць у іншыя рукі. Таму хачу прасіць Вас узяць яе ў мяне і аддаць у Інстытут мэдыцыны.

У Менску ў Акадэміі навук зрабілі 3 копіі. Адну атрымаў У. Караткевіч, другую ўзяў сабе Новік, а трэцюю прыслалі мне для Гродна. Можа, Новіку яна і ня вельмі патрэбная, але пратэставаць не магу, бо каб не яго захады ў Лідзіі Іванаўны Збралевіч, то наагул нічога не зрабілася б.

Апошні час я толькі тое і раблю, што пішу лісты. Пішу, пішу, а колькасьць лістоў да адказу не памяншаецца. Знача, німа ўжо таго спрыту, што раней... Але гэта, хіба, нікога ня зьдзівіць.

Як цяпер маецца пані Марыя? А як гадуецца ўнук? Усім усяго найлепшага!

Л. Войцікава.

121. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

30 кастрычніка 1980 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна!

Пісала Ларыса Антонаўна [Геніюш], што непакоіць Вас маё даўгое маўчаньне. Выбачайце... Некалькі разоў перачытывала Ваш ліст і бралася адказаць, ды ўсё нешта перашкаджала — то дрэннае самадчуваньне, то нейкая сьпешная работа. Восень такіх неадкладных работ падсыпае нямала. Сёлета добрага ўраджаю не было, тым больш трэба шанаваць і не змарнаваць таго, што ёсьць.

Я рада, што яшчэ магу ўдома амаль усё зрабіць. Але дачка, калі толькі можа раней прыйсьці, у суботу і нядзелю абеды варыць сама. Усё ж і для мяне работы хапае — лушчыла фасолю, парадкавала цыбулі глядыёлусаў, абірала яблыкі на джэм, варыла канфітуры з зялёных памідораў і г.д.

Ну а вечары займае пісаньне лістоў. У першую чаргу адказываю тым, каму мой адказ патрэбны да той ці іншай работы. А такіх бывае нямала. Найгорш тое, што доўга не магу сядзець. Мая застарэлая хвароба страўніка моцна пагоршала, і не магу даць рады з болямі. Часам, як лягу, хутка мінае, а часам і ўсю ночку памучыць. Але хопіць аб сабе. Вам удома і сваіх хворых хапае.

Ці ў Вас цёплая кватэра? Мы з унукам у сябе ў лесе маем звычайную кафляную печку і палім яе як хочам і колькі хочам. З гэтага нам шмат хто з жыхароў гораду зайздросьціць. Кажуць: ёсьць да чаго прытуліцца.

Было даволі цёпла, толькі дажджы ўжо надакучылі. Учора яшчэ было +13, а сяньня — толькі +4. На заўтра абяцаюць −5. Унук, як прыйшоў з работы, кінуўся паліць печку ў цяпліцы, бо там у яго яшчэ сьпеюць памідоры і растуць вялікія кусты рознакаляровых хрызантэмаў.

1 лістапада маем дзень памёршых — Задушкі. Паедзем на могілкі — на магілы сваіх родных, і на вялікі могільнік Росы — на магілы беларускіх пісьменьнікаў і дзеячоў.

Учора я атрымала ліст ад Міхася Забэйды. Крыху лепш чуецца, але сам сябе пытаецца: ці надоўга? Найгорш у яго з нагамі — баляць, і штораз горш бачыць. Лекары кажуць, што на гэта німа рады. Ён прасіў падзякаваць Вам за верш і нагул за памяць.

Помніце нашы гутаркі (лістоўныя) аб тым, як пераслаць Міхасю Іванавічу нарыс аб ім? Ужо ўсё ў парадку — атрымаў і чытае. Прыяжджаў да мяне знаёмы з Польшчы, узяў нарыс і, вярнуўшыся да сябе, выслаў. Сьпявак нават пару заўвагаў прыслаў — трэба будзе зрабіць у нарысе папраўкі.

Ваш верш ужо ўклееньі ў альбом. Гэта вельмі цікава, што Вы пішаце аб зёлках, якія прывязьлі з Лодзі. Вельмі шкада, што не памагаюць. Паміж іншым, чаму Вы ўжываеце тэрмін *травы*? Гэта ж чыста па-расейску. Па-беларуску — *зёлкі лекарскія*. А часам старыя бабулі кажуць так ласкава: *памоцнае зельлячко*.

Ці Вы чыталі расейскі зборнік “Бригантина” на 1980 год[1]? Там ёсьць надзвычайна цікавы і добра напісаны артыкул (ці расказ) “Преданья старины глубокой” В. Фалеева. Якраз аб зёлках.

Але хопіць. Ня буду Вам больш забіраць час. Яшчэ адно: ці Вы глядзелі ў тэлевізары менскую перадачу аб граматыцы Б. Тарашкевіча?

Усяго Вам найлепшага! Сардэчна вітаю. *Л. Войцікава.*

122. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

27 лістапада 1980 г. Вільня

Даражэнькая Данута Іванаўна.

Шчыра дзякую, што прынялі пад увагу маю крытыку слова *травы*. Гэта на карысьць нашай мовы. Я да сучаснага слоўніка ніякага даверу ня маю. Гэта быццам бы прапаганда новай сучаснай беларускай мовы, а сапраўды — адно засьмечываньне чужаземнымі словамі. Нават тыя пісьменьнікі, што дагэтуль нядрэнна пісалі сваёй роднай мовай, цяпер, пераходзячы на сучасную, засьмечываюць свае творы такімі словамі, як *завершаны, пастаянны, прамы* і г.д. Аж сэрца баліць, чытаючы.

Німа майго гродзенскага сябра с.п. др. Марцінчыка. Вось ужо ½ года німа. Мы з ім разам бедавалі, разам абураліся. Цікава атрымліваецца: чым далей хто жыве ад Беларусі, тым чысьцей па-беларуску піша. Мо мне так здаецца, бо пішуць мне мае равесьнікі або крыху маладзейшыя, а значыцца, людзі старыя, кансэрватары, да якіх тое новае ня так хутка ліпне.

Прафэсар Ф. Янкоўскі згаджаецца са мной, што мала ведаць граматыку, сынтаксыс і г.д., а трэба адчуваць слыхам, скурай, дзе сваё, дзе чужое. Найгорш мяне абураюць біёлягі. Вам, можа, не прыйшлося спаткацца з такім ляпсусам, а мне не адзін раз. Вось прыклад. Ёсьць такая птушка невялікая — дзятлік, па-расейску — поползень. І вось чытаю: *па-навуковаму — попаўзень, па-народнаму — дзятлік*. То чаму ж для нас назоў чыста расейскі, у расейцаў народны, мае быць навуковым? А што — свой горшы? Ніжэй стаіць паміж мовамі? Паводле мяне, навуковым можа быць толькі назоў *лацінскі*, бо ён зразумелы ў цэлым сьвеце. Тое ж самае прыдумалі і батанікі: расейскі — навуковы, беларускі — народны. Ну, але гэта я села на свайго коніка. Выбачайце.

Пішаце, што мне пашэнціла на добрых мастакоў. Гэта праўда, але ня менш пашанцавала (у нас у Сакольшчыне так кажуць) і на добрых паэтак... Хутка пасьля Вашага ліста атрымала даўгія лісты ад Ларысы Антонаўны [Геніюш] і ад Канстанцыі Антонаўны Буйло. Мы з Канстанцыяй Буйло асабіста незнаёмыя, але мы старыя (яна маладзейшая) і, хіба, апошнія нашаніўкі. Знаёмства з "Нашай нівай", яе супрацоўнікамі нас моцна зьвязывае. К. Буйло апошнім часам паважна хварэла. Цяпер — лепш. Цешыцца, што яе двухтомнік ужо пайшоў у друк.

Я ніколі не шкадую часу на лісты і кожнаму ахвотна адказываю, толькі што часам не пасьпяваю адказаць хутка. Я ўжо даўна — ад 1968 г.— перапісываюся з унучкай Ядвігіна Ш. Матка яе была маёй добрай сяброўкай. Унукі Ядвігіна — дзьве ўнучкі і ўнук — жывуць у Стаўрапальскім краі. Пасьля сьмерці маткі (у 1968 г.), якая з імі заўсёды гаварыла па-беларуску, мовай сваёй ужо гаварыць не асьмеліваюцца, баяцца, што не дадуць рады. Але з вялікай ахвотай чытаюць беларускія кніжкі і просяць пісаць да іх не інакш, як па-беларуску. Нядаўна прыслалі мне фатаграфіі двух праправнукаў Ядвігіна Ш. і просяць, каб ім прыслала ўспаміны (мае) пра іх прабабку. Трэба гэта зрабіць. Апісаць нашу супольную працу ў Менску (1915–1918 г.), розныя, нават дробныя, здарэньні.

Чыталі ўжо "Полымя"? Артыкул А. Мальдзіса пра У. Караткевіча ў сувязі з яго 50-годзьдзем? Учора ў Саюзе пісьменьнікаў меўся быць яго аўтарскі вечар.

Ледзь не забылася, дарагая, мо Вы ведаеце каго ў Гродзенскім інстытуце мэдыцыны? Мне трэба ў іх інстытуцкі музэй перадаць мой "Батанічны слоўнік", яго копію. Аб гэты слоўнік прасіў мяне пару гадоў таму др. Ф. Ігнатовіч — супрацоўнік інстытуту. Яго самога ў Гродне німа — паслалі на працу за мяжу.

Я гэтую копію толькі нядаўна здабыла і ня ведаю, на чые рукі перасляць. Хацела праз А.М. Пяткевіча, але нешта даўна ня піша — ня ведаю, што там у іх робіцца. Мо Вы А.М. спатыкаеце?

Усяго Вам найлепшага — здароўя, сілы і хоць малой паправы здароўя мужа. І яшчэ шмат новых вершаў. Цалую — *Л. Войцікава.*

123. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

3 сьнежня 1980 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Вельмі шкадую, але нічога істотнага на Вашыя пытаньні адказаць не змагу. Так, як і Вы, ведаю аднаго фатографа — Я. Булгака[1]. А хто фатаграфаваў тыя паштоўкі, што выдавала суполка "Загляне сонца...[2]", ня маю паняцьця. Арганізатар суполкі (прынамсі, галоўны) Антон Грыневіч жыў у 20-я гады ў Вільні. Я з ім была добра знаёмая, а вось аб такіх справах, як паштоўкі, ніколі ў нас гутаркі не было.

Апараты фатаграфічныя былі рэчы рэдкія, і займаліся фатаграфаваньнем пераважна спэцыялісты. Паштоўкі старыя, як я Вам казала, з калекцыі майго с.п. бацькі. Ён, калі быў у якім горадзе, то купляў паштоўкі цэлымі сэрыямі. Былі Варшава Вільня, Гродна, Люблін, Камянец-Падольскі і інш. Хоць я вельмі іх сьцерагла, але шмат пагублялася, шмат людзі паразьбіралі — пакралі, шчыра кажучы. А магчыма, што я і сама каму давала. Бацька памёр у 1907 г. Палічыце, сколькі гадоў мінула, і сколькі я з мамай па сьвеце паезьдзіла...

Беларускія паштоўкі — гэта пераважна з пецярбургскай суполкі. Нават не пераважна, а, хіба, усе. Я іх як бібліятэкарка Гродзенскага гуртка выпісывала ў немалым ліку, і нашы сябры іх раскуплялі. Зразумела, і я іх сабе асабіста купляла. Магчыма, і пасылала каму, але ці гэта можна помніць? У мяне карэспандэнцыя заўсёды была вялікая.

А Г. Леўчык, здаецца, адну прыслаў — "Канал Агінскага". А так часам прысылаў самыя звычайныя *почтовые карточки*. Я ўсе лісты яго маю.

Наш беларус Юры Туронак, што жыве стала ў Варшаве, вышле Вам копіі тых паштовак, якія мае, але прасіў "крыху пачакаць", бо вельмі заняты.

Цяпер аб Гульбінскай. Я яе нават мала помню, адзін раз бачыла. Гэта Леўчык хацеў нас "зьвязаць", але нічога з гэтага ня выйшла. Ні яна мне не пісала, ні я ёй. Вось з другой беларускай, аб якой таксама Г. Л[еўчык] успамінае,— Марыяй Галубянкай — у нас была шчырая прыязьнь. Мы з ёю карэспандавалі аж да яе сьмерці (у 40-я гады) у Празе Чэшскай, дзе яна скончыла мэдыцыну і стала жыла. Усе яе лісты маю.

Пытаецеся, ці я была калі ў Рызе? Толькі праездам у 1912 г., калі пару тыдняў пабыла ў сваёй сяброўкі. Ня помню, ці я Вас прасіла падзякаваць ад мяне тым рыжскім беларусам, якія прыслалі мне павіншаваньне. А мо там ёсьць хто з тых часоў, калі ў 20–30-я гады была ў Рызе Беларуская гімназія? Тады я выдавала бел[арускую] часапісь для дзяцей "Заранка". Яе выпісывалі ў Рыгу, у гімназію. Прысылалі мне школьныя здымкі, якія я ў "Заранцы" зьмяшчала. А сталася так таму, што я была асабіста добра знаёмая з К. Езавітавым — яшчэ з Менска, са зьездаў — Усебеларускага і Вайсковага.

І я люблю творы У. Караткевіча і ведаю яго асабіста. Але ня зьмешывайце яго, калі ласка, з Карпюком[3]. Вось гэтага то не люблю! Ён бярэцца пісаць аб

Заходняй Беларусі і піша вельмі аднабакова. Яму ўжо і А.М. Пяткевіч зварочваў увагу, што нельга так фальшаваць падзеяў, але ён, зразумела, "усё лепш ведае". Яшчэ каго не люблю — то Калесьніка!

Калі ўдасца Вам заехаць у Вільню, буду вельмі рада. Хіба, дажыву... Ужо зіма... Мала маю руху, толькі што ў хаце пры гаспадарцы, а гэта для мяне — згуба. Чуюся не надзвычайна, калі не лічыць, што вечна нешта баліць. Але што тут дзіўнага? У мае гады і так добра.

Лістоў, як заўсёды, шмат, а і іншая работа ёсьць. Найгоршае тое, што вельмі шмат часу бываю адна, толькі з катамі...

Усяго Вам найлепшага! Як найлепшых посьпехаў у кожнай працы. Пішыце. Ад маіх –прывітаньне. *Л.В.*

124. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

17 сьнежня 1980 г. Вільня

Дарагая Данусі Іванаўна.

Дзякую за Ваш мілы ліст. З прыемнасьцю вышлю слоўнік для Мэдычнага інстытуту на Вашы рукі, толькі трэба крыху пачакаць, калі зяць будзе мець час гэтым заняцца. Я б рада была, каб слоўнік аднясьлі Вы асабіста або хто з Вашых добрых знаёмых, бо трэба з музэю Мэдычнага інстытуту ўзяць *акт* аб прыняцьці. Гэта не таму, каб я ня верыла, што будзе споўнена, а мне трэба мець у сябе такую даведку для парадку ў маіх, гучна кажучы, архівах.

А што Вы прачытаеце — буду вельмі рада. За тое, што так ахвотна (што рэдка бывае) спатыкаеце маю крытыку, зраблю Вам падарунак — прышлю даўгі сьпісак назоваў птушак па-беларуску (зразумела, і ў іншай мове) — паводле слоўніка Вацлава Ластоўскага[1]. Я гэтага слоўніка ня маю, але калісьці пазычала ад знаёмых і перапісала ўсё, што мяне цікавіла. Не абяцаю, што гэта хутка зраблю, бо яшчэ мушу выпаўніць просьбу ўнучкі Ядвігіна Ш. і паслаць ёй біяграфію яе маткі — маёй некалісь добрай сяброўкі. Біяграфію яе маю гатовую — толькі перапісаць і дадаць пару яе твораў, друкаваных у "Вольнай Беларусі". Гэта займе крыху часу. А цяпер надыходзіць Новы год, і трэба выслаць нямала павіншаваньняў. Хто ведае, можа, апошні раз.

Аб паэтцы Ніне Мацяш[2] пісала мне некалісь Ларыса Антонаўна [Геніюш]. Сэрдэчна мне яе шкада. Яе доля прыпамінае долю ўкраінскай паэткі — забылася прозьвішча... Ага, здаецца — Леся Украінка[3]...

Пытаецеся, каго я знаю з мастакоў? Я. Куліка, В. Маркаўца[4], А. Марачкіна[5], М. Купаву[6], В. Целеша. З В. Целешам у нас завязалася сталае ліставаньне. Зьвязвае Гродзеншчына. І яшчэ нехта прыяжджаў, але не помню ўжо хто. Гэта было на 80-я ўгодкі П. Сергіевіча, якога ведаю, як ён яшчэ быў студэнтам. Мастакі прыехалі віншаваць яго і разам заехалі да мяне. Было іх 4-х (тады М. Купавы я яшчэ ня знала — не было яго) і 5-я — дачка Басалыгі[7].

А першы раз прыяжджалі перад тым, як зьбіраліся ладзіць выстаўку Сергіевіча ў Менску. Тады (я зусім не заўважыла — калі) зрабілі маленькі фільм, якога плёнку пасьля прыслалі майму зяцю, каб паказаў мне. Сьмешна бачыць сябе, так сказаць, звонку, у руху...

Усе мастакі менскія сябруюць з маім старым знаёмым Зянонам Пазьняком і па яго прыкладу называюць мяне *пані Людвіка*. Я з гэтага вельмі рада бо не люблю небеларускага звароту *па-бацьку*. Але што зробіш — хочаш-ня хо-

чаш, а прывыкаць трэба. Яшчэ некаторыя, таксама старыя, прыяцелі называюць мяне *цётка Людвіка*. А можа, і Вы перайшлі б у лістах да мяне на *цётку*? Як казаў калісьці Г. Леўчык: "Было б яксьці больш па-нашаму".

Ой, сколькі ж я Вам часу заняла. І не агледзелася. Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

125. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[1980 г.]

Дарагая Данута Іванаўна.

Я была вельмі рада атрымаць ад Вас ліст. Люблю атрымліваць лісты, і ўдзячная за іх. Лістамі і жыву. Гэта мая сувязь з людзьмі.

Я прывыкла ў маладосьці жыць у грамадзе, сярод людзей, а цяпер у глыбокай старасьці рэдка каго бачу (апрача сваіх). Ды і сувязь з людзьмі, блізкі кантакт нялёгкі, бо вельмі дрэнна чую.

Так што, калі ласка, пішыце, калі Вас гэтакі кантакт цікавіць. І пішыце проста, як да кожнага іншага. Няхай Вас мая старасьць не бянтэжыць. Скажу Вашымі ж словамі: "Я тутэйшая, я звычайная"[1].

Я ўжо ад Я. Хвораста ведала, што Ваша дачка адведала яго, і ён быў рады. Так здарылася, што быў заняты і, на шчасьце, у гэтую пару нядрэнна чуўся. Але хто можа ведаць, што можа быць нават праз гадзіну? Сэрца хворае...

А тою "гаспадыняй" ён пахваліўся. Яго школьная сяброўка прыехала са Смаленшчыны да сваёй сястры ненадоўга і занялася ім. Варыць і г.д. А ён і рады.

Сардэчна вітаю з 1 Мая! Няхай ён прынясе Вам і ўсёй Вашай сям'і шмат сонейка — і на небе, і ў душы, шмат цяпла, зелені, кветак, а Вам асабіста — натхненьня і безьліч новых вершаў.

Усяго Вам найлепшага! Якое шчасьце, што Ваш муж ужо паправіўся. *Л. Войцікава.*

126. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[1980 г.]

Дарагая пані Дануся.

3 дня на дзень буду чакаць вашага прыезду з мастакамі. Прыгатавала сьпісак, што мне будзе патрэбнае з малюнкаў. Непакоюся, што пасьля таго, як паслала чародныя чарнавікі зёлак у Гудзевічы, ня маю адтуль весткі. Мо пасланае не дайшло? А мо Белакозу пагоршала здароўе? Зараз туды пішу.

Набралася да 1 мая шмат лістоў-віншаваньняў. Трэба хоць некалькімі словамі падзякаваць. Паміж іншым, сама нікога не віншавала — палянілася...

Як спраўлюся з лістамі (маю яшчэ 11), вазьмуся за далейшыя зёлкі. Хачу дацягнуць хоць бы да 50-ці. Нэрвуе, што не магу хадзіць — так баляць ногі. А так хочацца яшчэ і да зямлі рукі прылажыць, працуючы. Пакуль сама ў зямлі не апынуся...

1 мая пачалося цяплом, добрай пагодай. Шмат кветак у нас цьвіце. Зацьвітаюць сьліўкі, цьвітуць агрэст, парэчкі. Пчолы (хоць чужыя), чмялі маюць работу. Наагул — вясна прыйшла!

Маю для Вас неспадзянку — магу даць Вам у музэй №№ "Заранкі": дастала ад Новіка дублікаты.

Чакаю. Шчыра цалую. *Л. Войцікава.*

127. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

14 студзеня 1981 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, за павіншаваньні і добрыя пажаданьні! Але чаму Вы мяне называеце "паэтэсай"? Я сваіх вершаў ніколі паважна ня брала, пісала іх (праўда, ад 9-ці гадоў жыцьця) мала, а друкавала толькі дзіцячыя (для дзяцей) — у "Заранцы". То якая ж я паэтка?

Лічу сябе проста некваліфікаваным работнікам да ўсяго. Што трэба было, тое і рабіла, і пісала. Хіба, найбольш на тэмы прыродазнаўчыя: у "Заранцы" — для дзяцей і ў "Беларускай борці" — пчалярскім часапісе.

Калі б Вы хацелі пазнаёміцца з тым, што я пісала, то, будучы ў Менску, зайдзіце калі да Сяргея Міхайлавіча Новіка-Пеюна. Ён як супрацоўнік "Заранкі" мае яе поўны камплект, нават паўнейшы, чым я, бо ў мяне 2 кніжак не хапае. "Беларускую борць", калі захочаце, пабачыце ў мяне. Але гэта часапіс — спэцыялізаваная, пчалярска-гаспадарчая. Рада буду, калі заедзеце.

З Варшавы ад Ю. Туронка Вы, хіба, яшчэ паштовак не атрымалі? Нешта замарудзіў, відаць, не хапае часу. Але калі абяцаў, то павінен зрабіць. Зрэшты, буду яму прыпамінаць.

У мяне, як заўсёды, шмат лістоў да адказу. Быццам нічога асаблівага не раблю, а з адказамі пазьнюся, бо дрэнна чуюся. Баляць вельмі ногі і пухнуць, а ад чаго — ня ведаю. Не магу доўга сядзець. І цяпер трэба канчаць, бо позна. Засядзелася.

Усяго Вам добрага! Да пабачаньня, калі гэта будзе магчыма. Ад маіх — прывітаньне. *Л.В.*

128. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

16 студзеня 1981 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Я вельмі рада, што мой слоўнік мае для Вас канкрэтную вартасьць. Вы не сьпяшайцеся, нічога ня станецца, калі да музэю пазьней дойдзе. Спачуваю, што гэты Ваш "вольны час" зьвязаны з сумнымі падзеямі і трывогамі. І ў мяне нявесела. Вельмі дрэнна чуюся. Ня ведаю, ці ад нырак, ці ад сэрца, але вельмі баляць і пухнуць ногі. А тут на бяду зіма, сьнег — лекар ніякі не паедзе. А прыватных лекараў знаёмых німа. Вось і трэба лячыцца зёлкамі самастойна, а гэта даволі рызыкоўна. Што будзе — ня ведаю.

Ці Вы чытаеце "Голас Радзімы"? Там былі мае ўспаміны аб "Заранцы"'. А ці даходзіць у Гародню беластоцкі "Беларускі каляндар"? У сёлетнім надрукавалі нарэшці мае ўспаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі. Ледзь не забылася самага важнага — для мяне. Вы калісьці пісалі, што маеце ў Польшчы сяброў. Ці не прыяжджае хто ў Гродна? Ці німа якой сувязі паміж Гроднам і Польшчай?

Справа ў тым, што мой добры знаёмы беларус, які даўна жыве ў г. Торунь[2], прыгатаваў для мяне вельмі патрэбныя лекі, якіх тут німа, а мы ніяк ня можам злавіць нейкай аказіі, каб іх перавязьці да нас. Не канечне ў Вільню, абы праз граніцу, а тады з кожнага мейсца — праз пошту. Апрача таго, мая стрыечная сястра ў Варшаве (па-расейску *троюродная*) даўна мае гатовую для нас пачачку з насеньнем лекарскіх зёлак і таксама ня можа пераслаць.

Цяпер я прасіла таго беларуса з Торуня пераслаць лекі ў Варшаву да маёй сястры, а там абедзьве пачкі будуць чакаць шчасьлівага выпадку. Вось я і пытаюся ўсіх добрых знаёмых, а мо што і papадзецца.

Выбачайце, што турбую Вас сваімі справамі. Але чалавек — такая істота, што ўсімі сіламі трымаецца за жыцьцё, хоць, можа, ужо і ня варта.

Мне калісьці ў гэтакай справе памаглі беластоцкія беларусы. Прывязьлі патрэбныя мне ўколы ў Менск, а адтуль выслалі поштай. Але ні летась, ні сёлета ніхто ня ехаў і не паедзе. Вельмі цяжка цяпер з запросінамі — даюць дазвол толькі для самай блізкай сям'і.

Яшчэ аб слоўніку. Аддаючы, скажыце, калі ласка, што яго даю на просьбу доктара Фёдара Іванавіча Ігнатовіча, які ў іх працаваў. Цяпер ён на працы за мяжой, куды яго паслалі на 3 гады. Нядаўна пісаў мне адтуль.

Усяго Вам найлепшага! З сардэчным прывітаньнем — *Л. Войцікава.*

129. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

1 лютага 1981 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Сардэчна дзякую за ліст, за добрыя весткі, а галоўнае — за ахвоту памагчы ў маім клопаце. Я ўжо напісала да сястры. Але буду змушаная яшчэ патурбаваць Вас і прасіць, каб Вы або напісалі або пазванілі Ю. Геніюшу[1] — папярэдзілі яго, што на яго імя будзе высланая пасылачка. Каб гэта не было незразумелай неспадзянкай. Я асабіста Ю. Геніюша ня ведаю, але чытала яго мініятуры ў "Белавежы"[2], і вельмі мне яны спадабаліся.

Мой унук Слаўка (Яраслаў) вельмі ўсьцешыўся, што, магчыма, атрымаем нарэшці пачку ад маёй сястры Казіміры, бо там будзе і крыху насеньня расьлін, якія ён даўна хоча мець. Яшчэ сьнег ляжыць, а яму ўжо сьніцца работа на гародзе і ў цяпліцах. Гэтае hobbi крыху ня вяжацца з прафэсіяй інжынера-фізыка, але, відаць, ягонае замілаваньне — ад мяне. І на гэта німа рады.

У мяне ўдома кіпіць работа. Я сама амаль нічога не раблю (чуюся нядобра), мае зяць і дачка ўзяліся парадкаваць здымкі, альбомы, пісаныя да мяне лісты. Апошніх ёсьць каля 5000. І гэта добра. Будзе мне спакайней, што астанецца ўсё ў парадку. Сама яшчэ маю крыху нясконачанай работы, але маю надзею скончыць.

Пасылаю Вам здымак з выстаўкі абразоў нашага мастака Пётры Сергіевіча, якую наладзілі літоўскія мастакі да яго 80-годзьдзя. Апрача таго, высылаю "Голас Радзімы" (маю запас) і нумар часапісу "Тэатральны Менск", дзе ёсьць мае ўспаміны аб У. Галубку[3]. Гэту часапісь мала хто ведае. Мне прыслалі 3 экзэмпляры. Там шмат цікавага і добрая мова.

Вы казалі, што любіце пісаць у сваіх вершах аб кветках? Пасылаю Вам свой верш, які напісала для свайго с.п. сына, калі яму было 2 гады. Не крытыкуйце вельмі, бо ж я не паэтка, гэта пісалася так сабе — пры нагодзе.

Цалую Вас сардэчна. Ад маіх — шчырае прывітаньне. *Л. Войцікава.*

На імяніны майму сыночку Тоню

Што за зьява? Што за дзіва?
Луг і поле, лес і ніва
Зазьвінелі ціхім тонам –
Ці то песьняй, ці то звонам.

Мілы голас зычна льецца
Ўверх па горах, ўніз па рэчцы.
Чутны топат — ідуць пары...
Што за дзіва? Хіба, чары?

Тут — валошка з шыпшыною,
Там — бяроза з каліною,
Далей, ўзяўшысь за лісточкі,
Йдуць стакроткі, як вяночкі.

А за імі — брат-сястрычка,
І зязюлька невялічка,
Мак чырвоны, драсён белы
І звончыкаў букет цэлы.

Йдуць дарогай і мяжою
Ды сьпяваюць грамадою.
А як пахнуць, як прыбраны —
Як у казцы счараванай!

Аж сонейка ў небе стала:
— І куды ж вы,— запытала,—
На вясельле? На хрысьціны?
— Не, на Тоня імяніны.

Мама
Альхоўнікі (Сакольшчына), 13 чэрвеня 1921 г.

130. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

19 лютага 1981 г. Вільня

Дарагая пані Данpropуся.

Я вельмі рада, што мая маленькая пасылачка зрабіла Вам прыемнасьць. Хацелася адразу Вам напісаць, але апошні час вельмі абвастрылася мая хвароба страўніка (катар, а можа, цяпер і што горшае), цяжка доўга сядзець, пісаць, а лістоў, як заўсёды, прыходзіць шмат, часта такія, што адказаць мушу адразу і нямала раней падумаць. Вось час і праходзіць.

Мела ■ ліст ад Міхася Забэйды — са шпіталя тубэркулёзнага. Зьдзівілася і занепакілася. Ніколі аб тубэркулёзе і гутаркі не было. Пісаў, што лекары маюць патрымаць яго там 2–3 месяцы. Не пасьпела адказаць, як зьявіўся ў Вільні студэнт Менскага ўнівэрсытэту, які езьдзіў у Чэхаславакію з экскурсіяй, быў у Празе і адшукаў М. Забэйду ў шпіталі. Той прасіў студэнта, каб, вяртаючыся

праз Вільню, перадаў мне прывітаньне. На жаль, студэнт меў толькі паўтары гадзіны часу, пасьпеў адшукаць майго зяця, а да мяне ўжо не пасьпеў. Абяцаў прыехаць, каб расказаць мне асабіста, а пакуль што казаў, што М. З[абэй] ду мелі ўжо праз пару дзён выпісываць. Відаць, нічога страшнага німа.

Вы пішаце: шкада, што німа майго зборніка? А ў мяне ёсьць аж 2, але не друкаваныя, а машынапісныя. Адзін з драбніцамі для дзяцей — "Каласкі", другі — з замалёўкамі — "Імпрэсіі". Зроблены яны стараньнямі Сяргея Новіка-Пеюна. Прыгожа аформленыя. Ён іх рабіў у 3-х экзэмплярах. Адзін мне, другі я падпісывала яму, а трэці — у бібліятэку рукапісаў АН БССР.

Каб ня Новік, усё так і асталося б параскіданае па розных часапісах — "Заранцы", "Пралесках", "Студэнцкай думцы" і г.д.

Вось шчасьліва дачакаем канцы зімы, а Вы вольнай хвіліны — прыедзеце і пабачыце. А што з маім слоўнікам батанічным? Ці Вы яго ўжо здалі ў Мэдінстытут?

Ня ведаю, ці Вы, пані Дануся, знаёмыя з Алесем Мікалаевічам Белакозам? Вельмі даўна ня маю ад яго ніякай весткі. А ён жа такі хворы... Непакоюся, ня ведаю, што думаць. А мо проста часу ня мае?

Сяньня больш не пішу, бо дачка выходзіць і падганяе. А калі сяньня ліста ня выслаць, то трэба чакаць аж да панядзелка. У наступным лісьце адкажу на іншыя Вашы пытаньні. А пакуль што — пішыце.

Цалую Вас сардэчна, зычу ўсяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

131. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

1 сакавіка 1981 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Учора я атрымала картку з Варшавы ад сваёй сястры. Піша, што 18 лютага выслала пачку для мяне ў Беласток на імя др. Ю. Геніюша. У гэтай пачцы — таксама лекі, якія прыслаў для мяне на рукі маёй сястры стары знаёмы віленчук, які жыве ў г. Торунь[1]. Паведамляю Вас аб гэтым, бо баюся, каб гэтая пачка не заляжалася ў Беластоку. Найважнейшае для мяне — лекі, такіх тут німа.

Мушу прызнацца, што чуюся штораз горш. Болі галавы мо зьвязаны з пераходам да вясны, але са страўнікам не магу даць рады. Аслабела. Гэта ўсё ня дзіва ў мае гады, але чалавек так ужо, мусіць, створаны, што трымаецца за жыцьцё да апошняга ды баіцца самога факту пераходу да вечнасьці. Вось і хочацца ратавацца, чым можна.

Невялікія маразы трымаюцца ў нас увесь час. Але сонейка моцна грэе, і ў пакоі ўжо вясна. Цудоўна зацьвілі амарылісы — белыя, у чырвоныя жылкі. Кветкі вялікія, як ніколі дагэтуль.

У апошнім лісьце я абяцала, што адкажу на рэшту пытаньняў. Што датычыць здымка з выстаўкі, які я Вам паслала. Побач Я. Багдановіча стаіць Раманюк[2] — мастацтвазнаўца. Той, з павернутай галавой, і ёсьць Купава, а дзяўчынка — яго дачка. Жонкі П. Сергіевіча на тым здымку німа. Што да мяне, то Вы памыліліся — мяне там німа. Прапанавалі прыехаць па мяне машынай, але я адмовілася.

Бачыце, я вельмі дрэнна чую — напалову глухая. Там было шмат знаёмых, маглі вітацца, загаварыць са мною. Якое ж было б маё становішча? Хто да мяне прыходзіць, прыяжджае — пішуць мне, я адказываю. А чытаю лёгка ўсе почыркі без акуляраў. Вось такая мая "гутарка" з людзьмі.

А Слаўка — сын маёй дачкі ад першага мужа. Ён быў (даўно памёр) расеец з выключна расейскім прозьвішчам, якога я ў сям'ю ўводзіць не хацела і запісала Слаўку як Войцікава. Крыху пратэставалі, але ўсё ж я паставіла на сваім. Такія справы.

Слаўка прыносіць мне шмат радасьці — посьпехамі ў працы, працай удома і апякунчымі адносінамі да мяне. Паміма што працуе паміж літоўцамі, расейцамі і палякамі (усе гэтыя мовы добра апанаваў), сваю мову захоўвае чыстай.

А можа, я і дачакаю вясны-лета і пабачу Вас у сябе? Зьбіраюцца прыехаць: унучка Ядвігіна Ш. са сваёй дачкой і ўнукамі (пра-праўнукамі Ядвігіна) — тры пакаленьні. З Менска абяцаюць: Алесь Бачыла[3], У. Содаль і, нават нягледзячы на дрэннае здароўе, праф[эсар] Ф.М. Янкоўскі. Учора ў мяне быў (ужо другі раз) вучань праф. Янкоўскага В. Несьцяровіч — сымпатычны, шчыры беларус. Прывёз 4 кніжкі мовазнаўства, якія выйшлі пад кіраўніцтвам Ф.М. Янкоўскага.

Ня дзіва, што хочацца яшчэ пажыць... Мой зяць піша артыкул аб дзейнасьці свайго дзядзькі Івана Луцкевіча. Гэты артыкул мае ўвайсьці ў "Беластоцкі каляндар" на 1982 год.

Цалую Вас сардэчна. Пішыце. *Л. Войцікава.*

132. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

19 сакавіка 1981 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Дзякую за ліст. Вельмі ж мне ў жыцьці не шанцуе. Каб было інакш, то я ўжо магла б мець свае лекі. Тыдзень таму зяць мой гаварыў па тэлефоне з п. М. Гайдуком, які званіў — з Менску! Езьдзіў з турыстычным цягнікам, маршрут — Мінск-Кіеў. У Вільні ня быў, але мог бы выслаць поштай з Менска, або ў канцы аставіць у каго з нашых супольных знаёмых.

Відаць, др. Геніюш аб гэтай падарожы Міколы Гайдука ня ведаў. А я ўсё цешыля сябе надзеяй, што папрабую новых лекаў, бо тое, што тут маю,— не памагае, і чуюся штораз горш. Праўда, як-небудзь будзе.

Аб тым, што др. Ю. Геніюш быў паранены[1], я ўжо ведала ад Ларысы Антонаўны. Бедная яна — як мусіла непакоіцца і нэрвавацца...

Ад А. Белакоза я ліст нарэшці мела, але вельмі сумны, чуецца ня лепш, а горш. Ня маючы весткі, я пісала да яго дачкі Марыны. Але яна мяне з 8 Сакавіка павіншавала, а на мае пытаньні аб бацьку не адказала. Мо ліст мой да яе не дайшоў? Усё бывае.

Наагул з карэспандэнцыяй цяжка. Выслала я заказным Аляксею Міхайлавічу [Пяткевічу] абяцаную аўтабіяграфію с.п. др. Марцінчыка, а перад гэтым яшчэ напісала ліст. І ня ведаю, ці атрымаў... А мо проста часу ня мае? Праўду кажучы, я і сама не заўсёды ў пару адказываю.

Прыемна ведаць, што выйдзе Ваш новы зборнік вершаў. А як Ларыса Антонаўна, ці ўжо здала ў друк свае вершы? Я забылася яе аб гэта запытацца.

Нешта сёлета вясна не сьпяшаецца да нас. У нашай далінцы ў лесе яшчэ шмат сьнегу, а зямля зусім замерзлая. Дні хмарныя, панурыя. Толькі ўдома цьвітуць прыгожыя амарылісы і ў хатняй цяпліцы ўсходзяць агуркі на расаду.

Усяго Вам добрага! Цалую сардэчна. *Л. Войцікава.*

133. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

29 сакавіка 1981 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Дзякую за вестку. Я рада, што і Вы, і гр. Разанаў са мной згодны. "Пчала" некалісь "лётала" па ўсёй у той час Заходняй Беларусі, няхай жа і ўспамін пра яе ўсюды мае доступ.

З Беластоку атакуюць, каб хутчэй матэр'ял прысылаць, а я чакаю, пакуль зяць перадрукуе (ён мае машынку з бел[арускім] шрыфтам), бо хачу мець машынапіс успамінаў у сябе ў цэласьці. Мушу дадаць, што рукапіс іх да гэтай пары ў І.У. Саламевіча, і ня ведаю, калі я яго дастану. А пара б ужо было. Ведаю, што ў Менску ўсе занятыя па горла, але і мой час ужо агранічаны.

Помніце мой рукапісны зборнічак біяграфій бел[арускіх] дзеячоў? Прыбыло 2 цікавыя — др. Ст. Грынкевіча (з вялікай бібіліяграфіяй) і др. М. Марцінчыка, які памёр 23 траўня 1980 г., амаль год таму. Апошняя не зусім поўная. Гэта аўтабіяграфія, і хіба ня ўся, бо яго жонка, прысылаючы яе, мне пісала, што "часьць перапісала і пасылаю". Значыцца, у яе ёсьць і больш. А ў мяне ёсьць больш чым 100 яго лістоў. Варта, каб хто гэтым заняўся. Не ўяўляю, ці Вы яго (др. Марцінчыка) ведалі, а праф[эсар] Ф. Янкоўскі быў з ім знаёмы.

Маю надзею, што сёлета заглянеце? Усяго найлепшага! Гр. А. Разанаву — прывітаньне. *Л.В.*

134. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

5 красавіка 1981 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Я ўжо лекі атрымала, Ларысе Антонаўне [Генію ш] падзякавала. І Вам шчыра дзякую за параду, як пераслаць, за клопаты. А ці не пісаў Вам др. Геніюш, ці не казаў па тэлефоне, што пераслаў да маткі ня ўсю пачку, атрыманую з Варшавы, а толькі лекі? Бо справа такая: апрача лекаў, якія мой знаёмы Мар'ян Пецюкевіч выслаў у Варшаву да маёй сястры, яна разам запакавала і выслала ў Беласток і сваю пачку для мяне — насеньне лекарскіх зёлак і сякія-такія прыправы, аб якія я яе прасіла, бо ў нас іх і сьледу німа.

Я Ларысе Антонаўне аб гэтым не пісала, не хацела яе нэрваваць, і Вы ёй не кажыце. Да сястры пакуль што не пішу — а мо што выясьніцца. Магчыма, той, хто перавозіў з Беластоку, не хацеў большай пачкі браць? А мо проста "не давёз"? Вельмі непрыемна перад сястрой...

Лекі прыймаю, але чуюся дрэнна. Магчыма, пераход да вясны гэтак дзеіць. Найгорш далягае страўнік. Зусім страціла апэтыт. Але гэта няважна. Найгорш нэрвуе, што ўжо не магу брацца за работу (на гародзе), якая мяне цікавіць і дражніць, калі што ня зроблена, а мае проста не даюць рады — не хапае ні сілы, ні часу.

Вясна позная і халодная — кожную ноч прымаразкі, але ў лесе побач дому поўна пралесак, пачынае цьвісьці мядоўка, а ў кветніку — белыя падсьнежнікі, крокусы.

Унук ужо ўпарадкаваў цяпліцу, думае сеяць. А сам 12-га выяжджае на тыдзень у Тбілісі –на канфэрэнцыю фізыкаў. Вось будзе страху, каб падчас яго адсутнасьці адпаведна цяпліцу дагледзець.

Праз паўтара дня быў у мяне У.І. Содаль — рэдактар "Роднага слова" з менскага тэлебачаньня. Рыхтуюць перадачу аб М. Багдановічу — для школаў. Прывёз мне паказаць сцэнарый. Гаварылі амаль без перарыву, надзіва я чулася амаль добра. Што значыць — нэрвы трымалі.

На 90-годзьдзе нараджэньня М. Багдановіча мае быць фільм на цэлую гадзіну, багата ілюстраваны. Але гэта яшчэ няхутка. Сцэнарый толькі пачынае пісаць Алесь Бачыла.

Але — забіраю Вам час сваімі навінамі. Пасылаю Вам марку, выдадзеную ў Амэрыцы на 450-я ўгодкі друку ў Беларусі. Мо Вас зацікавіць.

Цалую Вас сардэчна. *Л. Войцікава.*

135. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

11 красавіка 1981 г. Вільня

Даражэнькая Ларыса Антонаўна.

Дзякую за ліст. Не адразу адказала — былі розныя перашкоды. У Менску рыхтуюцца да ўрачыстасьці 90-годзьдзя з дня нараджэньня Максіма Багдановіча. Мастакі прыгатаўляюць выстаўку, зьвязаную з жыцьцём і творчасьцю паэта. Знаходзяцца пытаньні і да мяне: якую вышываную белую кашулю меў Максім, як надзяваўся зімой, ці насіў цёплы шалік і г.п. Стараюся прыпамінаць усе дэталі, хоць гэта пасьля 64 гадоў ня так лёгка.

Ужо паставілі помнік М. Б[агданові]чу перад Тэатрам–опэрай. Ужо гатовы помнік на магілу ў Ялце, каб замяніць той недарэчны, што стаіць цяпер — абэліск з зоркай. Адчыняецца Літаратурны музэй М. Багдановіча. У сувязі з апошнім, прыяжджала да мяне захавальніца фондаў музэю, запісала на магнітафон фрагмэнты маіх успамінаў аб паэце. Мы разам з зяцем прыгатаўляем для гэтага музэю фота і рысункі ўсіх дамоў, дзе жыў і бываў М. Багдановіч, прыяжджаючы на Беларусь.

У 1911 г., калі ён прыяжджаў у Вільню, то два месяцы правёў у Ракуцёўшчыне — фальварку, які належаў да дзядзькі (брата маткі) Антона і Івана Луцкевічаў. Лявон езьдзіў туды, парабіў здымкі, стары дом абрысаваў з памяці. А я з памяці адтварыла (штрыхамі) Беларускую хатку ў Менску, дзе была нашая сталоўка і дзе вечарамі ўсе беларусы зьбіраліся. Зрабіла плян усярэдзіне і плян кватэры, дзе Багдановіч жыў. Мая частка працы невялікая, бо толькі словы і "на чорна", а Лявон рысуе і робіць фатаграфіі. А для музэю гэта будуць нядрэнныя экспанаты.

Я з вялікай радасьцю прачытала ў Вашым лісьце аб тым, як Вы адносіцеся да касьцёла, а тым самым — да суайчыньнікаў-каталікоў, як адчуваеце іх крыўду. Гэта рэдкасьць, на вялікі жаль. І ня толькі цяпер. Не магу забыцца слоў Максіма Гарэцкага ў адным з яго апавяданьняў. Ён піша: "Муж быў праваслаўны, а жонка — каталічка... Цікава, чаму яна да гэтай пары астаецца каталічкай?". Значыцца, павінна была сваёй веры адрачыся? А цяпер жа толькі і пішуць аб акаталічываньні, амаль прымусовым.

Ня так даўна А. Мальдзіс праслаў мне выразку з "Голасу Радзімы" (ня ведаў, што я газэту атрымліваю). Там ёсьць артыкул і здымкі аб Велікоднай працэсіі ў Вішневе, аб тамтэйшым пробашчы. Напісана вельмі прыхільна, сымпатычна. Як motto[1] да гэтага далі вынятак з арт. 50 Канстытуцыі БССР: "Выкліканьне варожасьці і нянавісьці ў сувязі з рэлігійнымі вераваньнямі забараняецца...". Разумна і справядліва.

У той жа час “Полымя” друкуе вялікі артыкул Гілевіча[2], у якім аўтар бэйсьціць як найгоршымі словамі і несправядлівымі ацэнкамі Сьв. Айца Рымскага (Папежа). Як гэта разумець? Пасьля таго, як паранілі Папежа[3], у літоўскіх газэтах (і ў тых, што ў расейскай мове) былі паведамленьні аб выпадку, далейшым здароўі і г.д. Пісалі: “Увесь сьвет абураны”. Увесь сьвет, толькі не Беларусь, бо ў нашай прэсе — ні слова...

Ведаеце, я часам чуюся як нейкая выклятая, хоць мне гэтага адчуваць не даюць. Можна было б на гэтую тэму яшчэ шмат сказаць, але не ў лісьце...

Ад пані Дануты [Бічэль] я мела пару слоў. Мо яна ўжо да Вас адклікнулася? Піша, што мужу дрэнна. Ляжыць, а яна сама вельмі занятая ў школе. А пісала таму, што прыслала мне паквітаваньне з музэю Мэдычнага інстытуту ў Гродне на атрыманьне ксэракопіі майго “Батанічнага слоўніка”. Паслала я туды гэту ксэракопію на просьбу др. Ф. Ігнатовіча. Помніце яго? А дала праз п. Дануту, бо яна хацела перапісаць сабе цікавейшыя беларускія назовы.

Ізноў цікавае зьвішча: Мэдычны інстытут у Гродне — на Беларусі, а дырэктар — прафэсар з польскім прозьвішчам і імёнамі. А квіток напісаны па-расейску!

Толькі што была ў мяне доктар. Усё моцна дакучае галава, баляць страшна ногі, усе косьці. Мерала ціск — нармальны, сэрца здаровае, а ў галаве спазмы склератычныя, а рэшта ўсё — болі ад старасьці. Сяньня выслала Зыгмунту Абрамовічу павіншаваньне. Ён 25 красавіка канчае 89 гадоў. Абое з ім моцна перажываем сьмерць сястры др. Ст. Грынкевіча.

Ад маіх — прывітаньне. Учора была бура, вялікі дождж, а ў Вас? Сёлета ўсё вельмі багата цьвіце. Цалую шчыра і сэрдэчна. *Л.В.*

136. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

22 мая 1981 г.

Дарагая пані Дануся.

Страшэнна мне прыкра, што столькі клопату Вам нарабіла. Барані Божа, нікому ў Вільню ў маёй справе не пішыце! Я ж іх усіх сама добра ведаю, асабліва В. Стэха[1]. Ды найпрасьцей зьвярнуцца мне да Лявона... Я яго астаўляла як рэзэрву на выпадак, калі б мая бліжэйшая сваячка змагла прыехаць. Але нешта ад яе вестак даўна ня маю.

А таму майму далёкаму сваяку якраз важна быць на Беларусі — у Белагрудзе пад Лідай. Там магіла яго бацькі, і ён сам там радзіўся. Ён захацеў быць на магіле бацькі ад імені іх вялікай сям'і. Гэта была аграмадная сям'я! У бацькоў было 8 сыноў і 2 дачкі. Цяпер жыве з іх трое братоў і адна сястра, якая ўжо з ложка не ўстае. Вось становішча... Калі б удалося яму прыехаць у Вільню, то адсюль у Ліду не дабярэцца.

Выбачайце, што так дрэнна пішу. Пішу лежачы. Вельмі мне дрэнна, старая хвароба страўніка абазвалася, і то ў цяжкой форме. Цэлую ноч ня спала ні хвілінкі. Чаго ні рабіла, чаго ні прыймала — ніякай рады. Баліць. Вось і ляжу ды нічога ня ем. Калісьці Ларыса Антонаўна [Геніюш] голадам лячылася.

Цікава, каму прадаюць нявестка і ўнукі кніжкі Л.А.? Хоць бы на макулятуру не пайшло ўсё. Бо і так бывае.

Мае быць у Вільні ўрачыстае адкрыцьцё Беларускага клюбу. Будуць запрашаць гасьцей з Гродна, Менска, Маладзечна, Польшчы.

Атрымала даўгі ліст ад Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча]. Але з адказам устрымаюся — можа, устану.

Цалую шчыра. Ад маіх — прывітаньне. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

24 мая

Учора цэлы дзень ляжала. А тут зьявіліся госьці — п. Марыся Маслоўская (былая вучаніца Віленскай Беларускай гімназіі) і дачка Веры Андрэеўны Ніжанкоўскай Іра. Іра прыехала на некалькі дзён, затрымалася ў Маслоўскай, але гэтую ноч начавала ў нас. Яе я помню зусім маленькай — сядзела ў ложачку і гуляла цацкамі. Працуе Іра ў Менску, але пару дзён на тыдзень праводзіць у маці ў Радашкавічах. Расказывала, як апякуецца ўсімі запушчанымі магіламі ў Радашкавічах. Мае пад сваёй апекай 30 магілаў!

А мне сэрца забалела, што я ўжо такая бясьсільная, нават не магу дагледзець "сваіх" магілаў на Панарскіх могілках, дзе пахаваныя мая мама, яе сястра, мой муж Антон Войцік і сын. Калі мая Галя лепш чулася і не займалася цэлай гаспадаркай (агародам, кухняй і г.д.), то раньняй вясной езьдзіла ўпарадкаваць магілы — апалоць, пасадзіць што. А цяпер май канчаецца, і паехаць ня можа. Усе магілы беларусаў на могілках Росы і на праваслаўных упарадкавала. Толькі мае самыя блізкія без дагляду. Чалавек чуецца вінаватым. Але што рабіць, калі ногі ня служаць і сілы німа...

Нашы віленскія беларусы езьдзілі ў Менск да помніка М. Багдановічу, і адтуль Валянцін Стэх проста каля помніка напісаў мне вялікі ліст. З яго даведалася, што 31 мая спэцыяльным вялікім аўтобусам едуць у Ракуцёўшчыну, а ў першую нядзелю чэрвеня ў музэі імя А. Пушкіна[2] будзе сьвята беларускай паэзіі.

Але хопіць. Сама яшчэ ня ведаю, што зраблю з тымі запросінамі. Лявона прасіць ня буду. Падобна, хацеў выслаць запросіны ў Прагу для знаёмых — дазволу не дастаў.

Цалую шчыра і сардэчна. *Л. Войцікава.*

137. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

24 мая 1981 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст — лепш позна, чым ніколі. А што позна — зразумець няцяжка, бо скуль гэты час у Вас будзе. А як жа на дачы — ці шмат шкоды зрабілі зімовыя маразы? У нас — нямала. Прамерзьлі сьліўкі, зусім замерзьлі валоскія гарэхі, дэкаратыўныя кусты дэўцыі прыйшлося сьпілаваць пры зямлі — адрастае.

Адрамантаваная толькі горшая, больш халодная цяпліца — паставілі скрынкі з памідорамі, і флянсы сядзяць, як мур, але не растуць. А цяплейшая, лепшая цяпліца дагэтуль не адрамантаваная, і калі гэта будзе — ня ведаю. Так што цешыцца німа чым.

Толькі кветак шмат — пераважна туліпанаў самых розных колераў. Ужо зялёныя і дрэвы, і трава, але халодныя ветры не ўспакаіваюцца. Сяньня пахадзіла па садзе і ніяк не магу зразумець, ці будзе цьвет на яблынях ці не? Магчыма, пупышкі замерзьлі.

Свайго маладога гаспадара ўжо каля 2 тыдняў ня бачыла. З ім пахадзіць па садзе прыемна і карысна, і дзіўна, мы з ім паміма маёй глухаты добра паразумяваемся.

Што да будынку, дзе была мая гімназія. Ці ён ад 1970 г. зьмяніўся ці не? Бо як у 1970 г. была ў Вас, то ён стаяў бяз зьмены, як у мае часы. Я там вучылася 3 гады. Прыехала ў Гродна ўвосені 1909 г.— паступіла ў 6-ю клясу. Год нармальна вучылася, але аказалася, што каб скончыць гімназію, трэба ў ёй вучыцца 3 гады. Тады ■ адзін год змарнавала. То хадзіла, то прапускала лекцыі — займалася ГГБМ, давала карэспандэнцыі і г.д.

А пасьля зрабіўся скандал. Я вучылася наагул добра, і дырэктарка супольна з кс. Грынкевічам, нічога мне ня кажучы, зьвярнулася ў Кураторыю, каб пазволілі мне канчаць, прабыўшы 2 гады. Кураторыя згадзілася. Але ж я давелалася позна, шмат прапусьціла і таму скончыла толькі ў 1912 годзе. Дырэктарка да мяне з прэтэнзіямі, што я раблю з яе жарты. Я адказала, што віны маёй у гэтым німа. Падаючы просьбу ў Кураторыю, трэба было мяне папярэдзіць.

Я Гродна, усе будынкі, кватэры, дзе жылі мае дзяды, рос бацька, вельмі добра помню. У 1946 г. я была ў Гродне, і кватэра маіх дзядоў Сівіцкіх стаяла бяз зьмены. І на падворку дрэвы старыя расьлі, і брама ад вуліцы (сяньня К. Маркса, а тады Брыгіцкай, яшчэ раней –Паштовай) была на мейсцы. А вось у 1970 г. ужо ні брамы не было, ні дрэваў. Відаць, пасьля гэты панадворак забудавалі, бо М. Таранда[1] дзівіцца — дзе там магла быць кватэра? А яна была направа, у паўсутарэньні, бо такую дзед мой знайшоў сабе пасьля апошняга пажару Гродна. Ашклёныя дзьверы і 2 вакны выходзілі на панадворак, а 3 вакны выходзілі на вузенькі завулак, дзе ледзь адзін звожчык мог праехаць.

М. Таранда меў такі праект — знайсьці выгодную хуткую машыну і забраць мяне ў Гродна. Але скончыў пытаньнем: мусі, гэта нерэальна? Я кажу, што зусім нерэальна. Баляць ногі, хаджу з кіёчкам, часта баліць галава...

А так бы хацелася адшукаць і сфатаграфаваць дамок на вул. Гараднічанскай, калі, вядома, ён яшчэ існуе. Там я жыла з мамай: 1910, 11, 12, 13 гады, і ў нашай кватэры была база Гуртка беларускай моладзі

Цяпер другая важная справа — лісты Смоліча. Тыя копіі, аб якіх я Вам пісала, як лепш іх разгледзела, мала вартыя. На даволі вялікіх аркушах, грубая папера, без панумараваных старонак, вельмі цяжка зразумець. Але я маю грубую пачку лістоў-арыгіналаў, толькі што цяпер даць іх Вам прачытаць не магу.

Зьвярнуўся да мяне нядаўна нейкі, відаць, малады пісьменьнік Зубараў Леанід[2]. Напісаў ён кніжку пра М. Багдановіча. А Алег Лойка зрабіў яму ўвагу, што ён ні словам не ўспамінае найлепшага сябра Багд[ановіча] Аркадзя Смоліча. Што цяпер цэнзура пісаць аб ім пазваляе. Пісьменьнік пайшоў да Н.Б. Ватацы[3]. Тая парадзіла, каб ён зьвярнуўся да мяне.

Я адказала, што маю і біяграфію, і бібліяграфію, і здымкі ды лісты, і магу з усім гэтым пазнаёміць, але не лістоўна. Гэта мне зацяжка. Ён адказаў, што мае ўласную машыну, і сам прыедзе. Вось я яго і чакаю.

А таксама чакаю новага знаёмага з Гродна — Ігара Котава[4], студэнта мэдыцыны. Бо як яны з п. Міколам Т[аран]дам былі ў мяне, я ляжала (штораз часьцей гэта бывае), і было позна, і яны не зрабілі фотакопіі са здымка старога Гродна. Гэты здымак вялікага фармату зроблены добрым фатографам-фахоўцам па заказе майго с.п. бацькі. А можа, і яшчэ што знайшлося б... Ня думаю, каб хто з Гродна хутка прыехаў, бо напэўна паедуць 31 мая ў Ракуцёўшчыну.

Цікава, што я атрымала ліст ад Валянціна Стэха, пісаны ў Менску каля помніка М. Багдановічу. Піша, як зьбіраюцца вялікай групай у Ракуцёўшчыну, што ў першую нядзелю чэрвеня ў Музэі А.С. Пушкіна ў Вільні (лепш — за Вільняй,

бо гэта за горадам) адбудзецца вечар беларускай паэзіі, а пасьля, таксама ў чэрвені, будзе ўрачыстае адкрыцьцё тутэйшага Беларускага клюбу. Ну і якія былі тут паседжаньні, што нават зьявіліся яшчэ новыя беларусы...

Каб ня В. Стэх, яго далікатнасьць, то я зусім нічога ня ведала б, што тут робіцца. Я яму вельмі ўдзячная. Бо тое, што я ня маю ўжо фізычнай сілы ды і зусім глухая, то, хіба, не прычына, каб мяне зусім адапхнуць ад грамадзкай працы. І гэта пасьля 78 гадоў майго ўдзелу ў розных беларускіх арганізацыях...

Што Я. Саламевіч рыхтуе энцыкляпэдыю Багдановіча — ведаю і цешуся ды зычу ёй як найлепшага, хоць гэта не дае Я.С. прыехаць, і мая кніжка, мусі, на плянах і скончыцца. Хіба, выйдзе пасьмертна...

Каб хоць вылечылі сваю небясьпечную хваробу! Пераглядала ўсе зёлкавыя кніжкі — часам дадаткова і адпаведна можна прыймаць, але нічога не знайшла.

Усяго добрага! Прывітаньне п. Марыі. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

138. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

3 чэрвеня 1981 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Цяпер мой чарод перапрашаць за спозьнены адказ. Лістоў да адказу ляжыць шмат, а я нікому не пішу. Нават не магла прыпомніць, хто мяне пытаўся аб кашулі Максіма Б[агдановіча]. Толькі сяньня перагледзела лісты і дайшла да ладу.

Дрэнна чуюся і фізычна і, яшчэ горш, духова. 9 траўня памёрла ў Варшаве мая найлепшая сяброўка — сяброўка дзяцінства і маладосьці. Хоць ■ ведала, што яна цяжка хворая, але ўсё ж вестка аб сьмерці зусім мяне прыбіла. Яна была на 7 гадоў маладзейшая за мяне.

Я сяньня напішу коратка. Як бачыце, рука дрыжыць, і выходзяць каракулі. Пытаецеся, ці помню, якая ў Максіма [Багдановіча] была кашуля? Ён белую кашулю, вельмі скромна вышываную (каўнер адложаны), з паяском, надзяваў толькі адзін раз — як езьдзілі ў Ратамку, дзе беларускія дзеці ладзілі спэктакль. Вось толькі тады я яго ў такой кашулі бачыла, так што дакладна помніць вышыўку немагчыма. Але наагул так, як па Вашым рысунку, будзе добра — вышыўка вузкая, някідкая.

Што да вокладак "Заранкі" і "Борці", то рабіў іх мастак М. Васілеўскі[1]. Мо гэта Вас зьдзівіць, але я яго асабіста амаль ня ведала. Былі ў мяне такія прыхільнікі, што тое-другое падкідалі. Ня помню, якую вокладку Лявон [Луцкевіч] Вам паслаў. Калі для "Заранкі" — група дзяцей пад дрэвам чытае "Заранку" — то гэта было выразана на гуме — лінарыт называецца, калі не мылюся? Зроблена, каб ня трэба было заказываць клішэ, бо гэта вельмі дорага каштавала, а "Заранка" выдавалася амаль бяз грошай. Ледзь канец з канцом вязала.

Былі яшчэ і іншыя вокладкі. Мо ўдасца Вам прыехаць, а я дачакаю, то ўсё пабачыце. Ілюстрацыі да вершаў, казак і г.д. рабіў пераважна Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн, якога Вы тут у нас пазналі.

Цяпер у нас самая прыгожая пара — сьвежая зелень, маса кветак. Вось-вось зацьвітуць белыя акацыі, адно дрэўца — буйнай ружовай. Яблыкаў сёлета амаль ня будзе, крыху сьлівак, а калі нічога не пашкодзіць, будзе шмат суніцаў і трускавак. Толькі мяне гэта ўсё ня цешыць. Найгорш калі чалавек ужо сам, сваімі

рукамі ня можа працаваць. Бо як бяз працы жыць? Я да гэтага не прывыкла.

А якім здымкам Максіма Б[агдановіча] будзеце карыстацца? Ёсьць здымкаў шмат, але ня ўсе добра паказываюць яго выгляд. Паводле мяне самы лепшы, падобны здымак — з кніжкі "Вянок", выданай паўторна ў Вільні ў 1927 г.

Але хопіць. Трэба яшчэ пару лістоў напісаць. Калі час пазволіць — пішыце. А як будзе магчымасьць — прыяжджайце.

Усяго Вам найлепшага! Ад маіх — шчырае прывітаньне. *Л.В.*

139. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

7 чэрвеня 1981 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Нядаўна выслала Вам ліст, сяньня ізноў пішу. Пасылаю здымак Максіма Б[агдановіча], аб якім пісала, што ён, па-маяму, самы лепшы, самы натуральны. Такім я яго і помню.

Забылася Вам адказаць, ці маю "Нёман" з Вашым артыкулам. Не, ня маю і ня бачыла. Калі зможаце прыслаць, буду ўдзячная.

А цяпер такая справа. Учора я атрымала ліст ад таго знаёмага, які прыслаў паштоўку "Ф. Скарына". Ён просіць даведацца, які мастак мог ілюстраваць "Гісторыю беларускай літаратуры" М. Гарэцкага, выданую ў Вільні ў 1920–21 гадах. Там ёсьць і партрэт Ф. Скарыны, які ня раз выкарыстоўваўся ў іншых выданьнях.

Я ў Вільні ня маю абсалютна ніякай магчымасьці што-небудзь даведацца. Думаю, што Вам, наагул беларускім мастакам, гэта зрабіць лягчэй. Калі ласка, падумайце, што можна зрабіць у гэтым напрамку.

Здымак, які пасылаю, перафатаграфаваны з кніжкі, таму выйшаў такі стракаты.

Усяго добрага. *Л.В.*

140. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

21 чэрвеня 1981 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Учора атрымала "Нёман" і ліст. Шчыра дзякую. З цікавасьцю прачытала Ваш артыкул. Гэта для мяне зусім новае. Буду вельмі ўдзячная, калі пастараецеся даведацца ў менскіх сяброў аб афармленьні "Гісторыі беларускай літаратуры" М. Гарэцкага. Я і сама магла б у Менск напісаць, але вельмі пагоршала маё здароўе. Агранічываю пісаніну да самай неабходнай. Мо пагода паправіцца, пацяплее, і сілы вернуцца, але надзея невялікая...

Усяго найлепшага! Вялікага плёну ў працы. *Л.В.*

141. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

21 чэрвеня 1981 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Сардэчна дзякую за кніжку Язэпа Дылы[1]. Пачала чытаць з канца, бо там усё мне знаёма. І прозьвішчы (ды і самыя асобы) шмат якіх артыстаў, і нека-

торыя з падзеяў. Шкада толькі, што аўтар, які сам у той час ня быў у Менску, пакарыстаўся чуткамі ды расказамі і шмат што пераіначыў.

Аб усім напісаць немагчыма, мо пабачымся — раскажу. Адзін толькі факт выясьню: у Бабруйск езьдзілі ня ў маі, а ў красавіку 1917 г. і ставілі "У зімовы вечар". Крыху дэклямацыяў і хор — больш нічога, і больш ня езьдзілі.

А той першы раз запросіны ад Ф. Шантыра перадала Ф. Ждановічу я — ліст у гэтай справе ад Ф. Ш[анты]ра маю. Дэклямаваў Янка Ждановіч (псэўд[онім] Янка Беларус). Ён ня быў сваяком Ф. і А. Ждановічаў, а толькі такога ж прозьвішча.

Ізноў паўтараецца блытаніна з "беларускімі хаткамі" (ня *"хатамі"*). Ніякай на Захараўскім завулку ніколі не было — была на Захараўскай, 18, а калі яе (сталоўку) зьліквідавалі — перанясьлі *без назову* на Маскоўскі завулак, то назвалі Беларускай хаткай паамэрыканскі барак на Камароўцы... І ў прозьвішчах ёсьць памылкі. Але хопіць.

Цікава, што калі ў Вільні ў 1910 г. ставілі "Па рэвізіі", то і Горадзенскі гурток у той самы час тое самае ставіў! А пасьля і з "Модным шляхцюком" тое самае. Толькі што мы не агранічыліся Гроднам, а выяжджалі і на вёскі. Усё нелегальна...

Шкада, што біяграфія Я. Дылы, як і Цішкі Гартнага, прымусова няпоўная. Бо як адзін, так і другі былі дзейнымі сябрамі Б[еларускай] С [ацыялістычнай] Грамады. Першы ў Маскве, другі — у Пецярбургу. Мела пісаць коратка, але так шмат ёсьць сказаць...

Усяго Вам найлепшага! Яшчэ раз дзякую за памяць. *Л. Войцікава.*

142. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

21 чэрвеня 1981 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Не разумею, чаму гэта Ігнатовіч гаварыў з Вамі па-руску? Ён так добра піша па-беларуску, так чыста. А ■ не шкадую, што слоўнік у іх інстытуце. Там жа ёсьць розныя людзі, а вясной вернецца Ігнатовіч, ужо назусім, і будзе карыстацца. Ён, як прыехаў у Вільню, яшчэ перад асабістым знаёмствам са мною, пайшоў у архівы і перагледзеў усе нумары "Беларускай борці", якую я рэдагавала ў 30-я гады. У мяне перагледзеў больш дакладна, вынатаваў сабе ўсе лекарскія зёлкі, якія ўвайшлі ў мой слоўнік.

"Беларуская борць" — гэта быў орган Беларускага каапэратыўнага таварыства "Пчала". Др. Ігнатовіч напісаў артыкул "Таварыства "Пчала" і народная мэдцына". Менскія часапісі друкаваць адмовіліся — "німа мейсца". Тады ён даў гэты артыкул у "Нёман". Там надрукавалі праз паўгода. Скараціўшы да мінімуму і зьмяніўшы загаловак на зусім бессэнсоўны — "Дыягназ "Пчалы".

Паміж іншым, др. Ігнатовіч зьбірае матэр'ялы пра беларускіх лекараў-пісьменьнікаў. Ужо крыху друкаваў у мэдычных часапісах — вядома ж, па-руску, бо такіх спэцыяльных часапісаў па-беларуску не выдаюць. Гэты самы др. Ігнатовіч угаварыў мяне даць свае ўспаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі ў Гродна ў музэй. Я паслухала і паслала на яго адрас, а яго жонка аддала ў Гістарычны музэй. Падобна, закінулі ў фонды, а не ў экспазыцыю, і людзкое вока гэтага ня бачыць. Горка ад усяго гэтага...

Але, мусі, хутка перастану перажываць, бо вельмі дрэнна чуюся. Мо ад гэтых дажджоў ды халадоў улезьлі болі ва ўсе косьці. Баляць шыя, бок правы,

рука, нага. А ў галаве і грудзях — склерозныя спазмы. Надакучыла ўжо цярпець, ды і рабіць нічога не магу. А якое ж жыцьцё без работы? Выбачайце за такі ліст... Інакш не выходзіць.

Цалую шчыра. *Л. Войцікава.*

143. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

19 жніўня 1981 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Сардэчна дзякую за вестку. Хоць ведаю, што ў Вас робіцца. Пісала мне Ларыса Антонаўна [Геніюш], што Вы яе намаўляеце, каб разам з Вамі наведала мяне. Шчыра Вам за гэта дзякую. Гэта цудоўная думка, і мне вельмі-вельмі хочацца, каб яна зьдзейсьнілася. Я была б проста шчасьлівая.

Я 6 дзён ляжала, мусіць, прастудзілася. Яшчэ кашляю, але ўжо хаджу. У нас вельмі прыгожа, безьліч кветак, і лес вокал нас яшчэ па-летняму сьвежы.

Усяго Вам найлепшага! Да пабачаньня. *Л. Войцікава.*

144. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

10 кастрычніка 1981 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Дзякую шчыра за такую добрую вестку: і ў Гродне нешта робіцца! Чым толькі змагу — падзялюся. Але гэтага вельмі мала, бо, напрыклад, Цёткі я ня знала зусім, а Васілька[1] — вельмі мала. А ці ж магу ■ адмовіцца расказаць пра Гродна Максіма Б[агдановіча]?

Я моцна перахварэла і таму аслабела, але сказаць крыху — сілы хопіць. Толькі ня вельмі адкладайце. Чым хутчэй, тым лепш. Пакуль яшчэ залатая восень, пакуль не адцьвілі кветачкі. Вельмі рада буду пабачыць і Вас, і Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча]. Чакаю.

Добра было б, каб папярэдзілі. Можа, па тэлефоне? Пазваніць да майго зяця на працу? Я, здаецца, яго нумар тэлефоне Вам пасылала. На ўсялякі выпадак падаю: *Лявон Антонавіч Луцкевіч, тэл.: 63–24–43, 44–90–01.* Кожны дзень да 16-й апрача суботы і нядзелі.

Цалую Вас. *Л. Войцікава.*

P.S. Шчыра дзякую за добрыя пажаданьні на дзень нараджэньня. Шмат набралася лістоў, не пасьпяваю ў пару адказываць. Сумленьне грызе, што Ларысе Антонаўне ўжо на 2 лісты не адказала. Не магу доўга сядзець. А бываюць лісты, на якія трэба адказаць адразу. *Л. В.*

145. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

14 кастрычніка 1981 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Шчыра дзякую за добрыя пажаданьні на дзень майго нараджэньня. А што спозьненыя? Лепш позна, чым ніколі. Тым больш, трэба прызнацца, ніхто з мастакоў, якія былі летась у мяне, аб гэтай даце ня ўспомніў... Але гэта ня так ужо важна.

Пытаецеся, што ў мяне? Нічога добрага — хварэла на хранічны бранхіт, а цяпер ня ведаю, ад чаго моцна баляць ногі. Проста не магу нармальна хадзіць. Дзіўнага тут нічога няма — гады бяруць сваё, але...

Сардэчна віншую Вас з выстаўкамі, зычу як найбольшых посьпехаў і далейшых плёнаў. Дзякую за стараньне адказаць на маё пытаньне аб аўтары ілюстрацыяў да "Гісторыі беларускай літаратуры". Запытацца А. Ліса — добрая думка. Мо я сама да яго напішу.

Ці спрыяла Вам надвор'е ў санаторыі? У нас лета было нядрэннае і восень прыгожая. Сапраўды — залатая. Але ўжо робіцца штораз халадней. Хіба, трэба спадзявацца прымаразкаў.

Усяго Вам нейлепшага! *Л.В.*

146. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

14 кастрычніка 1981 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Пішучы да Вас ліст, не закранула важную справу. Мелася даганяць другім лістом. Але схапіў мяне бранхіт, страшна кашляю, хрыплю і г.д. Чакала, што палепшае, але гэтага не відаць. Так што паміж атакамі кашлю, з перарывамі — пішу.

Некалькім асобам паслала эксьлібрыс. Усе захопленыя. Пішуць, што яшчэ ніколі падобнай мастацкай работы і такога зьмястоўнага ня бачылі. Ваша работа і для мяне цаны ня мае. Але адбіць 300 экз., напэўна, каштавала нямала. Пазвольце мне вярнуць Вам гэтыя грошы, вельмі прашу. Напішыце толькі — колькі? Грошы маю ўласныя, бо атрымала ганарар за зборнік сваіх даўнейшых твораў, які неўзабаве павінен выйсьці з друку. Чакаю адказу.

Ці не пакрыўдзіце, што я, не пытаючы Вас аб згодзе, дала Ваш адрас самадзейнаму мастаку Анатолю Аляксандравічу Наліваеву[1], які загадывае ў Менску гэтак званай Гасьцёўняй Галубка? Гэта быццам клюб, дзе ладзяць розныя імпрэзы — спатканьні пісьменьнікаў, паэтаў, музыкаў і г.д. А. Наліваеў варты ўсялякай дапамогі. Працуе ганарова і ўмее прыцягнуць людзей. Там памаленьку наладжваецца своеасаблівы музэй — зьбіраюць розныя здымкі, кніжкі, старыя запісы, весткі аб людзях, фактах. Памагаю чым магу.

Канчаю... кашаль вельмі перашкаджае.

Усяго найлепшага! Адкажыце хуценька. *Л. Войцікава (Зоська Верас).*

147. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

31 кастрычніка 1981 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Ліст Ваш атрымала — дзякую. Я рада, што Вы той дзень — гасьціны ў нас — добра ўспамінаеце, але я з сябе незадаволеная. Праектавала даць Вам на дарогу нашых памідораў, не зусім звычайных, і, загаварыўшыся, забылася.

Усё, што Вы просіце напісаць для музэю,— зраблю, напішу. Ужо абдумала, што і як, але прышлю разам з машынапісам маіх успамінаў аб М. Багдановічу "Пяць месяцаў у Менску", як толькі зяць аправіць іх у вокладку. Яны будуць ілюстраваныя адпаведнымі здымкамі: будынкі ў Гродне

і Менску, дзе жыў М. Б[агдановіч],— Беларуская хатка, яе плян усярэдзіне і г.д. Гэта праект зяця. Я хацела даць тыя здымкі асобна, але ён парадзіў, каб уклеіць у тэкст. Мне здаецца, будзе добра. Прыпільную таксама, каб зрабіў для Вас (для музэю) "Максім Багдановіч у Вільні і Ракуцёўшчыне ў 1911 г.". Гэтая праца — Лявона Антонавіча: і тэкст, і здымкі.

А мо добра было б даць у Ваш музэй мае ўспаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі? Я такія ўспаміны паслала ў Гродзенскі музэй, але яны іх, мусі, трымаюць глыбока ў сховішчы і людзкому воку не паказваюць. Калі напішаце, што трэба,— прышлю.

А як выйшлі здымкі, што рабіў гр[амадзянін] А. Наважылаў[1]? Мо і я даста-ла б парачку? Была б добрая памятка таго дня. Была б яму вельмі ўдзячная.

Пішаце, што мае дзеці змарнавалі свой дзень адпачынку дзеля Вас? І ня думайце так. Яны ж у вольныя дні, а нават і ў дні працы, вечарамі заўсёды ў нас. Я наагул чуюся дрэнна, і дачка, колькі можа, стараецца быць са мной. Час супольнага жыцьця, хіба, ужо вельмі абмежаваны...

Страшна запусьціла сваю карэспандэнцыю — да 20 лістоў ляжаць, на якія трэба адказаць. Вельмі ўсьцешыла мяне вестка, што кніжка вершаў Ларысы Антонаўны [Геніюш] ужо ў друку. Сама яна даволі даўна мне не пісала.

Што трэба — пішыце. Усё, што змагу, выканаю. Сардэчна цалую — *Л. Войцікава.*

148. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

10 лістапада 1981 г. Вільня

Дарагая Данусья Іванаўна.

Дзякую за ліст. Вялікая шкада, што Вы мне аб насеньні кветак не сказалі. У мяне ўжо ўсялякае насеньне было спарадкаванае. Маем такія, якія дачка ўжо спрактыкавала ў сябе на бальконе. Але да вясны вельмі далёка — усё зробіцца.

Мае матэр'ялы пра М. Багдановіча "Пяць месяцаў у Менску" ўжо гатовыя. Напішу яшчэ маленькі фрагмэнт ад рукі, каб Вы мелі мой аўтограф. З высылкай трэба пачакаць, пакуль зяць зробіць "Ракуцёўшчыну". Я яго падганяю — бо час ляціць хутка. А свае ўспаміны аб старым Гродне прыгатую пасьля, а разам і "Гродзенскі гурток бел[арускай] моладзі", бо цяпер ня маю часу. Доўга сядзець не магу, а лістоў — безьліч.

Што да Ларысы Антонаўны [Геніюш], то там сапраўднае гора. Да яе з Менска пісьменьнікі прыяжджалі ў справе грамадзянства — сама мне аб гэтым пісала і дадала: "Я ім абяцала, а я свайго слова не мяняю..." А гэта ж было даўна, ды ўсё астаецца па-старому. І я са свайго боку намаўляла, тлумачыла, што яна крыўдзіць ня толькі сябе, але і нашую літаратуру зьбядняе. То ж і на мейсцы інакш бы на яе глядзелі, і менш прыкрасьцяў мела б. Ужо даўна чамусьці ня піша.

Пішаце, што, ведаючы цяпер дарогу, маглі б ізноў прыехаць? Якая ж гэта для мяне была б радасьць. Кожныя адведзіны — гэта падтрымка ня толькі духовая але і фізычная, бо тады мяне нэрвы трымаюць і даюць забыцца аб усялякіх недамаганьнях. А іх хапае.

Цалую Вас сардэчна. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

149. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

25 лістапада 1981 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Ніколі ня думала, што А. Наліваеў наробіць мне такой бяды-прыкрасьцяў. Мо яго намеры (па яго меркаваньні) былі найлепшыя, але вынікі — вялікая для мяне маральная крыўда.

Наліваева да мяне (і да Сергіевіча), падобна, прыслала Міністэрства культуры — намаляваць партрэт. Вельмі не хацелася, але мяне намовілі. Калі прыехаў Н[алівае] ў другі раз — паказаць гатовыя партрэты, пры ад'езьдзінах запытаўся, ці я атрымліваю "добрую пэнсію"? Я яму адказала так, як і ўсім іншым (шмат хто пытаўся), што я ніякай пэнсіі не атрымліваю, бо на гэта німа падставаў.

Я амаль не працавала дзеля заробкаў. Бо трудна залічыць 3 гады ў Менску і 5 гадоў у Вільні ў адміністрацыі. Ды і дакумэнтаў на гэта аніякіх німа. Рэшта ўсё ("Заранка", "Пчала", "Борць" і г.д.) была работа бескарысная. Ніхто мне нічога не плаціў. Выходзіць, што я была дармаедам на нейчых плячах? Не, я працавала, і то працавала фізычна у сваім галоўным фаху.

Маці мая атрымала сваю частку спадчыны па сваім бацьку, які меў маленькі фальварак у Сакольшчыне. Апрача таго, прыехаўшы з Менска, вырабіла сабе нанава пэнсію, як удава капітана. Польскі ўрад ня толькі назначыў пэнсію, але і выплаціў за час, калі мама яе не атрымлівала. Сабралася добрая сума. Купілі дом з садам у г.зв. Калёніі Каляёвай (сёньняшні Павільнюс).

Я залажыла гадоўлю насеньня, кветак і медадаеў. Узялася ўмела, і справа пайшла вельмі добра. Насеньне расходзілася паміж пчалярамі, пчалярскімі арганізацыямі. Запатрабаванымі былі вялікія колькасьці, і мне ў тым агародзе было цесна. Прадалі дом у Калёніі і купілі дзялку, дзе і цяпер жывем. Надыйшла вайна, і ўся мая гадоўля аказалася не на часе.

Але справа ня ў тым. Увесь час я працавала сваімі рукамі — не баялася ні лапаты, ні грабляў, ні сярпа. Пасьля сьмерці мужа, ужо маючы больш чым 60 гадоў, цэлы свой агарод сама абрабляла. Значыцца, дармаедам не была, хоць і ня маю права на ніякую пэнсію. Ды мне яна і непатрэбная, абсалютна непатрэбная. Самі ведаеце маю сям'ю, добрую сям'ю, маю ўласны дом. Хоць ён звонку ня вельмі добра прэзэнтуецца, але цёплы і выгодны.

І так, у мяне да нікога і нічога прэтэнзіі німа. Тым часам Наліваеў без майго ведама пачаў агітаваць. Падобна, праект, каб надрукаваць усе мае публікацыі, выйшаў ад А. Бачылы.

Як я даведалася, што Новік ужо аднёс яму тое з маіх работ, што меў у сябе, я зараз жа напісала. Прасіла: Алесь Мікалаевіч, кіньце Вы гэта і ня думайце аб нейкім друку. Гэта справа безнадзейная і мне, да шчасьця, непатрэбная. Адказу не атрымала ніякага.

Я і ў доме сваім казала, што ўся гэтая задума ня мае сэнсу. На мяне наскочылі, што я няправільна рэагую. Усё ж я трымалася сваёй думкі паміма таго, што даведывалася (усё ад гэтага самазванага адваката Наліваева), быццам і Вы, і Я. Скрыган[1] і іншыя задуму падтрымліваюць. А тут яшчэ Г. Каханоўскі піша Лявону, быццам Н. Гілевіч[2] яму сказаў у гутарцы: "Стыдна, што мы забываемся сваіх пачынальнікаў". І выказаў думку, што трэба мець сьпісы ўсяго, што ў мяне было апублікавана. Я пачала крыху здавацца...

І ўявіце сабе мой жах, калі ўчора атрымала ад Наліваева ліст, у якім ён піша: "Была ў мяне маленькая сустрэча з М. Танкам (хіба М.Т вызваў Наліваева

да сябе?), пытаўся ён аб Вас і сказаў, што Вам дадуць матэр'яльную *дапамогу*!

Як бы мне хто па твары даў! І ня толькі мне, але і ўсім маім. Што гэта? Ці я жабравала? Ці я прашу дапамогі? Нашто яна мне?

У жыцьці ніколі нічога падобнага не перажыла! Танк са сваёй вышыні думае, што можа людзей таптаць, як мурашак. Не, дрэнна кажу, чалавек, калі ён сапраўды чалавек, то і мурашкі не растопча. Калі ласка, спыніце сваім аўтарытэтам усе гутаркі аб маіх публікацыях. Не хачу больш аб нічым ведаць.

Вядома, калі каму (напрыклад, з Энцыкляпэдыі ці Содалю ці каму іншаму) спатрэбяцца якія інфармацыі — даць іх не адмоўлюся. За нятакт і грубасьць на беларускай справе помсты шукаць ня буду.

Выбачайце, што турбую. Лічу, што Вы найхутчэй мяне зразумееце. *Л. Войцікава.*

150. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

30 лістапада 1981 г. Вільня

Дарагая Ларыса Антонаўна.

З болем і жахам чытала Ваш ліст. Я шмат чаго ня ведала. Цяпер разумею Вас і згаджаюся з Вашай пастановай. У маральным балоце нельга жыць, а нават аддаўшы свой спакой і жыцьцё — зьмяніць нічога нельга. Застаецца адно — ратаваць рэшту свайго жыцьця. А чаму ж гэта зносяць старую сядзібу Геніюшаў[1]? Што за прычына? І гэта так, без ніякага звароту вартасьці? Зразумела, што ніякая аплата не заспакоіць крыўды, якую чалавек адчувае, страціўшы страху над галавой ды кусок зямлі, у які ўложана праца і любоў. А бяз дрэў і кветак і я не магла б жыць.

Я ад красавіка 1974 г., калі ў апошні раз была ў с.п. Надзеі Маркаўны [Шнаркевіч] [2], ні аднаго разу нідзе у нікога не была, нават у дачкі. Як воўк, не выходжу са свайго лесу, а ўсё ж не згадзілася б пакінуць свой дом і сад. У найбліжэйшы час перапішу дом на Слаўку, каб пасьля маёй сьмерці не было клопату.

Вярнуся да Вашых справаў. Чаму гэта нельга было рамантаваць царквы? Мо патрэбны быў на гэта дазвол?

У Гродне ў 90-годзьдзе нараджэньня Максіма Багдановіча хочуць паставіць помнік на магіле яго маці і ніяк ня могуць дабіцца дазволу. Калі мы тут, сабраўшы на падпісныя лісты грошы, ставілі помнік на магіле Ядвігіна Ш., то толькі паведамілі кіраўніцтва могільніка, больш нічога. Сяньня так нельга.

Вашае і маё пакаленьне нялёгка згаджаецца з усім "цёмным", ня страціла права абурацца. Маладыя — ужо ня тое. Мо гэта для іх і лепш? Але я ніяк не магу пагадзіцца з крыўдай, са злосьцю людзкой, з няпраўдай. Усё ўва мне кіпіць, хоць сілы асталося менш, чым у ката. Гэтакі ж быў і мой с.п. сын. Мы з ім разам кіпелі пры кожнай такой нагодзе.

Цяпер я адна са сваімі перажываньнямі. І гэта бывае цяжка пераносіць. А сколькі, на жаль, ёсьць прычынаў да абурэньня! І ў прэсе, і ў літаратуры для выгоды дапускаецца яўная мана. Пераіначваньне падзеяў, плююць на тое, што было для чалавека сьвятым...

Спакойнай быць ня ўмею, хоць гэта вельмі дрэнна дзеіць на здароўе. З цяжкасьцю хаджу, не магу спаць, страўнік перастае працаваць. Арганізм зьнішчаны ўшчэнт, і нічога на гэта не парадзіш. Ды і не пара ўжо радзіць.

А хацелася б дажыць да наступнага году, пакуль і Галя і зяць пойдуць на пэнсію — было б каму пільнаваць дому. А страціць яго была б для Слаўкі вялікая крыўда. Ён так любіць працу ў садзе, на гародзе. Ён жа тут выгадаваўся ад першых сваіх дзён. Цяпер хоць я ўжо амаль нічога не раблю, але хаты пільную. Разам з аўчаркай Асам і трыма катамі.

Пішыце, што ў Вас як складаецца, што мяняецца ў той ці іншы бок. Цалую моцна. Нешта Данута Іванаўна [Бічэль]ня піша. Што ў яе чуваць? *Л.В.*

151. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

3 сьнежня 1981 г. Вільня

Дарагая Дануся Іванаўна.

Я рада, што Вы ўсё ў пару атрымалі. Вядома, сумна, што справа музэю дагэтуль няясная, усё цягнецца. Цікава, чаму нельга адразу вынесьці пастановы? Што замінае? Ня вельмі мне падабаецца і мінская праграма. Так усе былі настроеныя на галоўнае сьвяткаваньне 9 сьнежня, аж тут згары загад: 5 сьнежня — адкрыцьцё мастацкай выстаўкі, 7-га — адкрыцьцё помніка і гарадзкі вечар, 9-га — вечар у Маскве. Дзе лёгіка — ня бачу...

Пішаце, што атрымалі ад мяне "запісачку" (пісульку)? Ня ведаю, што маеце на ўвазе. Ці пісульку, уклееную ў мае ўспаміны, атрыманую ад Максіма [Багдановіча] ў 1917 годзе? Ці — яго рукой пісанае "*прошение г-ну губернатору*"? Што да апошняга, нават ня ведаю, ці Вы яго атрымалі? Гэты дакумант — арыгінал — захоўваецца ў мінскіх архівах. Адзін работнік энцыкляпэдыі, Віталь Уладзіміравіч Скалабан[1], заўсёды, як знойдзе ў архівах што датычнае маёй працы ў Мінску (1915–1918 г.), робіць копіі і мне прысылае. Так і з аўтографам Максіма — *прошения*. Зрабіў ксэракопію і праслаў.

Як пачалася гутарка аб Багдановічавым музэі ў Гродне, я напісала Скалабану і папрасіла, каб такую ксэракопію выслаў у Гродна на Ваш адрас. Хутка атрымала кароткі адказ: "Просьбу выпаўніў — выслаў". Ці дайшло? А пісульку да мяне (арыгінал) я аддала ў Мінскі музэй. Сабе аставіла копіі.

Мела я вельмі сумны ліст ад Ларысы Антонаўны [Геніюш]. Цікава, каму і чаму замінае яе хата? Абавязкова трэба яе зьліквідаваць? Ці гэта спосаб пазбыцца непажаданай асобы?

Не пішу больш. Чуюся нядобра, а яшчэ трэба напісаць у Гудзевічы.

Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

152. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

1 студзеня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Толькі што атрымала Ваш ліст і адразу адказываю. І мне цяжка на душы, і тым больш цяжка, што незразумела, чаму такія адносіны да М. Забэйды? Што ён зрабіў такога, што можна яго выгнаць з роднага Краю і з людзкой памяці? Ён жа на ўвесь сьвет панёс нашую песьню...

На 80-я ўгодкі яго нараджэньня ў Менску мастакі цішком, прыватна ўшанавалі яго гэтае сьвята. Толькі ня ведаю, якім цудам у Брэсьце ўдалося ў тэлебачаньні зрабіць перадачу аб М. Забэйдзе. З яго здымкамі, з яго

песьнямі — я ня верыла, што гэта ўдасца, але неяк праскочыла. А цяпер аб яго сьмерці, аб такой нашай вялікай страце — трэба маўчаць...

Мо ў працягу гэтых чатырох месяцаў удасца Вам на які дзень пад'ехаць у Вільню? Прачыталі б лісты М. Забэйды — мо з часам Вам прыгадзілася б. А мо што зьменіцца?

Крыху пацешылі Вы мяне весткамі аб магчымасьці папхнуць справу Музэю М. Багдановіча ў Гродне. Менскі літ[аратурны] музэй М. Б[агданові]ча ўжо, падобна, у сваім памяшканьні, працуюць. Хваляцца колькасьцю экспанатаў, колькасьцю купленых працаў мастакоў... Але я неяк скептычна на гэта гляджу. Шмат што мне не падабаецца. Проста дух ня той, што трэба.

Аб тым, калі Чаржынскі быў літкрытыкам, запытайцеся пры нагодзе Арсеня Ліса. Ён ведае. Ведае таксама аб артыкулах, пісаных Я. Натусэвічам[1]. Я маю толькі адну яго рэч. У "Студэнцкай думцы" ў сьнежні 1924 г. надрукаваны яго пасьмертны ўспамін аб нашым сябры Гэнрыку Матуку[2]. Вельмі добра напісана.

Гэнрык Матук (пасьмертны ўспамін)

Да жалобнае кнігі памёршых беларусаў-інтэлігентаў прыходзіцца з вялікім жалем упісаць яшчэ адно блізкае нам імя нашага сябра с.п. Гэнрыка Матука. Дня 27 жніўня 1924 г. бязьлітасная сьмерць скасіла маладое жыцьцё Г. Матука.

С.п. Г. Матук паміж студэнцтвам вядомы быў ня толькі сваёю безгранічнаю працавітасьцю і дужа высокай этычнасьцю — як у жыцьці прыватным, так і ў адносінах да таварышаў, але ня менш ён быў знаны і асабліва паважаны за тую шчырую сьведамасьць, з якою адносіўся да працэсу разьвіцьця беларускай справы. Яшчэ будучы вучнем старэйшых клясаў Гродзенскай гімназіі, с.п. Г. Матук шчыра аддаўся студыям культурнага багацьця беларускага народу.

Паходзячы з Гродзенскага павету, Г. Матук дасканальна ведаў душу беларускага селяніна.

Вайна кідае с.п. Г. Матука ў Пецярбург. Тутака мы ўжо бачым яго студэнтам. Яшчэ з большаю інтэнсыўнасьцю аддаецца ён грунтоўным студыям беларускага слова. Ня раз у беларускай бурсе прыходзілася чуць, як с.п. Г. Матук ціха, скромна, але лягічна і з вялікім пераконаньнем гаварыў няверуючым аб багацьці духу і магутнасьці дрэмлючых скарбаў беларускага народу.

Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, с.п. Г. Матук працуе як сябра Горадзенскага Беларускага камітэту. Пасьля ўступае ў Галоўную школу сельскага гаспадарства ў Варшаве.

Скончыўшы вясною 1924 г. высокую школу ў званьні ляснога інжынера, с.п. Г. Матук маніўся занясьці ў народ сваю навуковую веду, якую, між іншым, меўся перадаць у беларускай мове. Ужо рыхтаваўся на выезд у Віленшчыну. Перад выездам мне прыйшлося спаткаць с.п. Г. Матука на станцыі ў Горадні.

Колькі харошых думак, колькі сільнага жаданьня было ў с.п. Г. Матука — працаваць для дабра беларускага сялянства! Буйна ліліся яго пляны на будаўніцтва шчасьця беларускага селяніна. Бедны, ня чуў с.п. Г. Матук, што сьцюдзёная сьмерць ужо тачыла сваю касу, каб падцяць пульс яго жыцьця. І ня стала с.п. Г. Матука.

Адыйшоў той, каму ў працягу жыцьця беларуская думка была ясным праменьнем душы і сэрца. Адыйшоў, аднак пакінуў па сабе пекную памятку сярод сялян-суседзяў у змаганьні праўды з крыўдаю, сьвятла з цемраю.

Дык сьпі спакойна, дарагі таварышу. Сьпі, а мы, жывыя, будзем крэпка сьцерагчы твой тастамант барацьбы за самастойнасьць духу беларускага народу.

Натусэвіч

Мае ўвагі. С.п. Г. Матук з Петраграду ў 1917 г. прыехаў у Менск. Разам з другім

студэнтам Уладыславам Чаржынскім (таксама сябрам Гродзенскага гуртка), які пасьля быў даволі вядомым у Менску літаратурным крытыкам (жанатым з сястрой З. Бядулі Чэрняй) жылі ў бел[арускім] інтэрнаце на Маскоўскім завулку, 1 (над беларускай сталоўкай), якім кіраваў Я. Лёсік.

Пасьля ліквідацыі інтэрнату абодва зіму 1917–18 г. жылі ў кватэры Бядулі, у праходным пакойчыку, на падлозе спалі на разложаных сеньніках. Матэр'яльнае іх становішча было вельмі цяжкое. З чаго жылі — сапраўды ня ведаю. Тады абставіны ў Менску наагул былі вельмі дрэнныя. Не было хлеба, крупаў, мукі. Заместа мукі прадавалі змолатыя старыя абаранкі...

Абодва студэнты прыносілі сабе з чайнай вар і рабілі гарбату. Я са сваёй маці жыла таксама ў Бядулі — у суседнім пакоі. Калі не было зусім хлеба, маці мая пякла для нас і для іх бульбяныя дранікі.

Калі Г. Матук выехаў дахаты — ня помню. Асталося ў памяці, як У. Чаржынскі — тып даволі грубы — раніцай будзіў Г. Матука і выпраўляў у чайную па вар. Мы абураліся, што не па чарзе ходзяць. Але Г. Матук лагодна ўсміхаючыся, казаў: "Няхай, пайду, калі яму цяжка"...

Сярод пецярбургскіх студэнтаў, апрача А. Бычкоўскага, А. Зенюка, Я. Лявіцкага, былі яшчэ Пушкарэвіч і Дзядзевіч, але былі яны ня вельмі дзейныя.

Верш "Ня даў мне бацька..." — Я. Лявіцкага. А што напісана *ні* заместа *не*, то ў яго наагул мова была спэцыфічная, мясцовая.

Што да Лойкі — дзе б ён праўду шукаў[3]? Абы больш напісаць, абы больш за гэта ўзяць. Нешта ня пішацца... рука дрыжыць. Чаму — ня ведаю. Больш не пішу, бо і так ледзь зразумееце.

Усяго найлепшага! *Л.В.*

153. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

12 студзеня 1982 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Дзякую за весткі. Сумна, што да гэтай пары не даюць кватэры на музэй. Хто ў Вас там такі заядлы завёўся? Час ляціць хутка, і чым даўжэй чакаць, тым цяжэй будзе здабываць экспанаты.

Аб гарадзкім вечары і габэлене я ўжо ведала ад Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча]. А вось чаму нашы найлепшыя мастакі не прыймалі ўдзелу ў выстаўцы — ня ведаю. Гэта адразу мяне зьдзівіла, калі пабачыла сьпіскі мастакоў, якія свае працы выставілі. Яшчэ горш, калі распаўсюджваюць чуткі, быццам нашы мастакі "ня маюць часу, бо або малююць па заказу, або — што ім асабіста трэба". Зразумела, я ў гэта ня веру, тым больш Аляксей Антонавіч Марачкін прыслаў мне здымак свайго дывана са "Страцімлебедзем", а зяцю — з "Пагоняй". Значыцца, маляваў? Нешта там нядобра пахне...

Аб работах, што былі на выстаўцы, нічога добрага не гавораць. Кожны малюе, як яму ў галаву прыйдзе. На кожным палатне Максім іншы, да сябе не падобны. Адзін мастак намаляваў Максіма разам з Я. Купалам, Я. Коласам, Бядуляй і К. Буйло[1]... І гэта ў Вільні ў рэдакцыі "Нашай нівы". А гэтага быць не магло, бо ў 1911 г., як Максім быў у Вільні, гэтых асоб у Вільні не было. Зрэшты, яшчэ запытаюся ў К. Буйло. Можа, яна помніць. Хоць найчасьцей адмаўляецца даваць інфармацыі, спасылаючыся на дрэнную памяць.

Цяпер у Менску ўжо рыхтуюцца да 100-годзьдзя ня толькі Купалы і Коласа, але і Галубка. Заарганізавалі нешта ў родзе клюбу пад бессэнсоўнай (паводле мяне) назвай "Гасьцінная імя Галубка". Праўда, самі арганізатары паміж сабой называюць яе "Галубковай хаткай".

Менскіх газэтаў з артыкуламі аб юбілею маю цэлае бярэмя, і розныя запрасіны, укладкі і г.д. Маю і "Вянок". Але калі ў Вас ёсьць лішні, то буду ўдзячная, бо маю каму паслаць.

Мела я ліст ад Ларысы Антонаўны. Бедная яна — усім гэтым знэрвавалася і сама з сабой ня можа даць рады. На яе не злаваць трэба, а — зразумець. Сяньня да яе напішу — адкажу на ліст.

Цалую Вас шчыра і сардэчна. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

154. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

19 студзеня 1982 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Сяньня атрымала "Вянок", газэту і Ваш ліст. Дзякую. Адразу Вам пішу, а то каб чакаць Вам чаргі — было б доўга. Ляжыць у мяне 11 лістоў, на якія трэба адказаць, і то някоратка.

А тым часам і я хварэю. Хвароба невялікая — проста катар і галава баліць. Учора, карыстаючы, што дачка была ўдома, я ляжала, каб хутчэй свайго недамаганьня пазбыцца.

Тыдзень таму хварэў мой унук. Лекар баяўся запаленьня лёгкіх, але абыйшлося. Ужо добра. Мусіць, ад яго перахапіла катар. С.п. сын мой баяўся для мяне такіх хваробаў, як грып і г.д. Лекар да нас даехаць ня можа, бо нас зусім занясло сьнегам. Але дачка робіць мне ўколы вітаміну С, і прыймаю асьпірыну. Здаецца, ужо крыху лепш.

Пішаце, што няма каму Вамі апекавацца. А ў каторай клясе Ваш сын? Хіба, ужо не маленькі. Мы свайго Слаўку ад малога прывучалі да ўсялякай хатняй работы. Помню, быў яшчэ ў школе, у 4 ці 5 клясе, як мы з дачкой абедзьве адначасна захварэлі грыпам, і Слаўка тры дні карміў нас — варыў абеды. Дачка сьмяялася: "Трымайся, мама, бо ён цябе пераможа ў кулінарнай штуцы — яго зупы пахнуць на ўсю хату". Але хопіць аб драбязе.

Вельмі балючыя справы Гродна. Аж верыць ня хочацца, што там шмат горш, чым у другіх гарадах. Нават Маладзечна мае сваю беларускую газэту, а тут... І чаму раптам перамяніліся адносіны да справы музэю? Мелі ж ужо даць кватэру. Чаму гродзенскія беларусы ня зьвернуцца ў Менск, да вышэйшых уладаў? Ці гродзенскія царкі недатыкальныя?

Прызнаюся, што не ўяўляю сабе сымболікі суніцаў. У чым тут справа? А што найлепшыя мастакі ня выступілі са сваімі работамі — гэта вельмі нядобра. Насколькі ведаю, то там апынулася адно сьмяцьцё. І яно пойдзе ў музэй?

А з кім там у музэі гаварыць? Дырэктар — малады і, хіба, ад справаў беларускіх далёкі. Захавальніца фондаў? Таксама ня вельмі ва ўсім разьбіраецца. А хто ў камісію ўваходзіць — ня ведаю. Алесь Бачыла лічыць, што "няхай усё робяць маладыя, а мы ў чым-небудзь ім парадзім". Але ж маладыя маладым ня роўныя. Так хочацца, каб усё было на высокім узроўні, без памылак і недацягненьняў.

Ня ведаю, ці што ў справе хаты Ларысы Антонаўны [Геніюш] удасца Вам дабіцца, бо там жа маюць рабіць парк *культуры и отдыха.* Уяўляю тую культу-

ру... Яшчэ адзін спосаб русіфікацыі.

Мушу кідаць пісаць. Дачка стаіць над галавой са шпрыцам, асьпірынай і г.д. Цалую сардэчна. Зычу як найхутчэй моцна стаяць на нагах. *Л. Войцікава.*

155. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

21 студзеня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

З жалем паведамляю, што 21 сьнежня 1981 г. памёр наш Вялікі Сьпявак Міхась Забэйда. Паведамленьне атрымала ўчора. Ці маеце яго поўную біяграфію? Зразумела (гэта вельмі сумна) — публічна ўшанаваць яго памяць ня зможаце...

Калі б захацелі пазнаёміцца з апошнімі гадамі яго жыцьця, то я маю больш за 30 яго лістоў і каля 15-ці копій яго лістоў да Новіка-Пеюна.

Спадзяюся, што ўсё ж калі-небудзь прыедзеце. А цяпер маленькае пытаньне: ці ня ведаеце выпадкам, дзе ў старым Гродне была вуліца Мураўёва[1]? Дастала я такую старую паштоўку. Старыя, вельмі характэрыстычныя камянічкі... А дзе яна была, аніяк не магу прыпомніць.

Чакаю адказу. Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

156. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

24 студзеня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ня ведаю, ці ў Гродне атрымаў хто паведамленьне, што 21 сьнежня 1981 г. памёр наш сьпявак Міхась Забэйда. Я атрымала друкаванае (па-чэшску) паведамленьне. Зяць узяў, каб яго размножыць, я думала яго Вам пераслаць. Але дзеля таго, што ня маю надзеі, каб гэта было хутка зроблена, пішу.

Там сказана: пасьля кароткай хваробы... Трэба разумець, што ляжаў перад сьмерцю коратка, бо хварэў цяжка даўгі час. У апошнім лісьце пісаў: "Чуюся штораз горш, але мо яшчэ папраўлюся".

Вядома, для яго лепш. Скончыліся фізычныя мукі, скончылася доўгае адзіноцтва. Але для тых, хто ў той ці іншы спосаб быў з ім у кантакце,— страта сумная і балючая.

Атрымала я ліст ад Дануты Іванаўны [Бічэль]. Абурае мяне бязьмежны зьдзек гродзенскіх "царкоў" (бо, хіба, цары і іх чарнасоценцы маглі так адносіцца да людзей). Чым жа выкліканая адмова даць памяшканьне музэю? Што за прычыну прыдумалі? Чаму не рэагуе на гэта Менск?

Усяго добрага! *Л. Войцікава.*

157. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

1 лютага 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, за весткі аб Багдановіцкім сьвяце ў Гродне. З Менска маю цэлае бярэмя газэтаў з артыкуламі аб вечарах, канцэртах, выстаўках... Зрабіла на іх спэцыяльную папку. Там і розныя, сапраўды прыгожа выкананыя запросіны, і здымкі, і паштоўкі.

Вось са здымкамі — чыстае гора. Зрабілі нейкі мантаж з розных здымкаў, і Н. Ватацы лічыць, што гэта самы лепшы, найбольш падобны і г.д. А яна ж Багдановіча ня бачыла! А я яго вельмі добра помню, і для мяне Максім самы падобны — на здымку, што выняты з групы, апублікаванай у газ. “Голос” у 1915. Такім ён быў і ў 1916 г. у Менску. Яны — багдановічазнаўцы (з музэю) — прызнаць гэтага ня хочуць. А мастакі? Кожны малюе па-свойму.

Апошняя беластоцкая “Ніва” прыйшла да нас у лістападзе, здаецца, № 29. У якіх нумарах былі артыкулы аб І. Луцкевічу,— ня помню, бо іх пазабіраў Лявон да сябе. Маю надзею, што верне, і камплект за 1981 г. будзе поўны. Хоць і не зусім, бо некаторыя нумары не дайшлі. А што цяпер “Ніва” не выходзіць — гэта так. Наш Слаўка заўсёды слухае радыё — падзеі ў Польшчы. Кажа, што там цяпер выходзяць толькі 2 газэты — “Trybuna ludu” і “Żolnierz wolności”. Нават жаночых — “Przyjacjolka Gospodyni”, “Kobieta i życe” — німа.

Я ўжо даўна вельмі — месяцы два — ня маю вестак з Польшчы ад сваякоў. І вельмі непакоюся. Толькі нейкім цудам праскочыў адзін ліст з Беластоку ад маёй далёкай сваячкі, і то з Калядным аплаткам! Было чым падзяліцца, як гэта ў нас у звычаі.

Цікава, ці ў Беластоку выдалі сёлета “Беларускі каляндар”? А мы так яго чакалі. Там меўся быць вялікі нарыс Лявона аб І. Луцкевічу — да яго 100-годзьдзя, і мае ўспаміны “Беларускае каапэратыўнае т[аварыст]ва “Пчала” і яго орган “Беларуская борць”. Але калі нават і выйшаў каляндар, то мы яго не дастанем. Хіба што перахаваюць да лепшага часу. Калі нічога ня зьменіцца, то і 100-годзьдзе нараджэньня І. Луцкевіча ня зможам адзначыць.

Цяпер пераходжу да галоўнага. Пытаецеся, ці я зьвярнула ўвагу на публікацыю А. Лойкі[1]? Ня толькі зьвярнула, але проста перахварэла, цэлую ноч ня спала. Ведаеце, мне ўжо тры месяцы на 90 год, а я і цяпер не магу абыякава аднясьціся да гэтакіх зьяваў. Ад гэтага агортвае чалавека і злосьць, і боль. А найгорш тое, што зарэагаваць адкрыта, публічна немагчыма, бо ніхто крытыкі “прафэсара” не дапусьціць.

Вельмі крытычна, з абурэньнем аднёсься да публікацыі С.Х. Александровіч. Вядома, у лісьце да мяне. Яшчэ хіба не адзін чалавек абурыцца, але ўсе — у чатыры вокі, а выступіць, скрытыкаваць, не дапусьціць да друку кніжкай — ніхто ня зможа. І пойдзе ў сьвет несусьветная брахня. А пасьля і ўхвальныя рэцэнзіі зьявяцца... Вось што страшна.

А ці Вы помніце выступленьне А. Лойкі з публікацыяй... Не, выбачайце, гэта не яго публікацыя, а інтэрв'ю з А. Лойкам нейкага А. Пісьмянкова[2] — “Уваходзіны ў сьвет Купалы” (“ЛіМ”, люты 1981 г.). Там жа А.Л. расказывае, паміж іншым, як Я. Купала прыяжджаў у Слонім у 1939 г., і А.Л. браў у яго інтэрв'ю... А Лойка радзіўся ў 1931-м — значыцца, меў тады 8 гадоў. І ўжо браў інтэрв'ю? Ён што, вундэркіндам быў?

Там жа А.Л. расказывае, каму ён удзячны за матэр'ялы для яго будучага твору. І паміж іншых падае Зоську Верас... А [redacted] Купалы зусім ня ведала і ніколі ні слова аб ім не пісала і не гаварыла...

Некалісь я моцна знэрвавалася “раманам-хронікай” М. Машары. Сколькі там няпраўды, сколькі бруду выліў на бязьвінных людзей... І ён стасаваў, як і Лойка, перакручываньне прозьвішчаў. Мне тады парадзілі

напісаць пэўнае спраставаньне ў "ЛіМ". Я паслала.

"ЛіМ" пераслаў у "Полымя", сказалі: "Вы надрукавалі, вы і адказывайце". Я дастала ліст ад Л. Арабей. Яна мне напісала: "Гэта *раман*-хроніка, таму аўтар мае права на выдумку, і гэта няважна. Важна каб праўдзіва была прадстаўлена эпоха". Я ёй адказала, што такое лёгікі не разумею. Як можа "праўдзіва быць прадстаўленая эпоха", калі ўсё апіраецца на няпраўдзівых фактах? На тым і скончылася.

Але гэта быў Машара — чалавек вельмі мала разьвіты. Як увайшоў у "вялікую палітыку" — закруцілася галава. І сам пачаў круціць, лгаць бязбожна. Толькі што там справа датычыла ня вельмі вялікіх справаў і нягучных прозьвішчаў. А цяпер у Лойкі ўсё шмат горш, шмат паважней.

Хопіць Вам забіраць час. Сяджу і пішу, а дачцы і зяцю дала работу. Разлажыць па альфабэту ў адпаведныя скрынкі лісты, якіх набралася за год 1981 каля 500. Я кажу сваім: мала таго, што мне столькі напісалі, але я на ўсе лісты адказала! Яшчэ адно. Ці Вы глядзелі 9 сьнежня (а мо пазьней?) менскае тэлебачаньне? Там была перадача "Сустрэча і разьвітаньне: расказывае З. Верас". Цікава, як выйшла? Яшчэ мне ніхто аб гэтым не напісаў.

Усяго Вам і сям'і Вашай найлепшага. *Л. Войцікава.*

158. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

10 лютага 1982 г. Вільня

Даражэнькая Данута Іванаўна.

Так мне Вас шкада! Ляжаць, цярпець ды яшчэ непакоіцца аб блізкім чалавеку — гэта ж падвойны боль, падвойны неспакой. А мо лепш было б згадзіцца на апэрацыю? Ці Вам даюць якія прэпараты да піцьця ці глытаньня? Таблеткі ці адвары?

Пры такой хваробе ўжываюць лекі — прэпараты ці ў форме зёлак-настояў: баркун (рас. *донник*), конскі каштан (кветкі і кара) ды нагаткі.

Дзе ні павернешся, усюды людзі хварэюць, усюды бяда, пачынаючы ад уласнай сям'і. Аб сабе німа чаго гаварыць — такія гады, што хваробы не вылечываюцца, а разьвіваюцца ўсё больш і больш. Але ў дачкі высокі ціск крыві, і галава баліць дні і ночы.

З Менска дрэнныя весткі ад Новіка-Пеюна. На вуліцы страціў прытомнасьць, упаў. Разьбіў галаву, пабіў моцна бок, рукі і ногі. Ляжыць. Але ж ён зусім адзін, даглядаць німа каму. Прыехаў пляменьнік і адвёз яго ў Слонім. Там у Новіка 2 сястры, і абедзьве хворыя.

Да ўсіх магчымых хваробаў немалой прычынай зьяўляецца нетыповая восень. Цёпла, сяньня +5, прычым хмарна, цёмна. Лепш бы ўжо сьнег і марозік.

Ці піша Вам Ларыса Антонаўна [Геніюш]? Ёю, мусі, таксама нялёгка перажываецца такая пагода. Вярнуся да Вашай хваробы. Хіба, не раптоўна ў Вас гэта зрабілася? Пішаце, што ногі балелі з маладосьці. А прафіляктычна Вы нічога не прыймалі?

Пішу без вялікага сэнсу і ня вельмі выразна. Вельмі далягае страўнік. Не магу спаць цэлымі начамі. Час ад часу бяру таблеткі на сон.

Калі зможаце, пару слоў напішыце. Цалую шчыра. *Л. Войцікава.*

159. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

17 лютага 1982 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Дзякую за вестачку. А я ўжо непакоілася, што Вы хварэеце, што, як пісалі ў папярэднім лісьце, не змаглі вылежацца. Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] перад ад'ездам у Менск пісаў, што пасьля візыту да ўладаў гродзенскіх мільганула надзея на лепшае ў справе Багдановічаўскага музэю. Аказалася, што "ўлада" ўлады ня мае і сама моцна залежная.

Ну, а менскім Высокім Асобам ня так ужо сьпешна пашыраць славу Багдановіча. Пабачым, як Вам удасца захаваць хоць якую самастойнасьць. Зразумела, зычу найлепшага.

Помню, што абяцала Вам выслаць фрагмэнт успамінаў аб Максіме — як свой аўтограф. А таксама напісаць аб старым Гродне. Усё не ўдаецца за гэта ўзяцца. Чуюся дрэнна, часта цэлыя ночы ня магу спаць, і пасьля як разьбітая — нічога ня клеіцца. Лістоў шмат, і ёсьць такія, што адказаць трэба абавязкова і хутка. Апрача таго, нэрвы зусім растрэсеныя — не магу ўспакоіцца. Гэта пасьля той часткі "раману" А. Лойкі, апублікаванай у "ЛіМе".

Задалёка зайшла несусьветная брахня гэтага "прафэсара". Страшна падумаць, што цэлая кніжка выйдзе ня толькі ў Менску, але і ў Маскве — у перакладзе. З усіх бакоў сыплюцца лісты, поўныя абурэньня, крытыкі. Але што з таго? Адкрыта, публічна ніхто не запратэстуе. Рады німа. Гэта ўжо так увайшло ў звычай — чым горш, тым лепш. Праўда ня толькі нікога не цікавіць, але нават лічыцца шкоднай. Для каго? Гэта іншая справа.

У наступны ліст улажу крыху насеньня кветак на Ваш балькон, а пасля — яшчэ. Прыйшло мне ў галаву, каб Вы паспрабавалі пасадзіць на бальконе у глыбокай скрынцы або вазоне пару кустоў памідораў — тых дробных, жоўтых (парэчкавых), што Вы ў нас бачылі. Іх можна расшпіліць на сьцяне. Будзе і дэкарацыйна, і смачна. Насеньня прышлю.

Тут у Вільні садзяць памідоры на бальконах, і ня дробныя, а вялікія, як чырвоныя сьліўкі. Яны таксама растуць вельмі высокія і доўгія, і іх можна расшпіляць на сьцяне. А мо ўдасца Вам прыехаць да нас? Тады ўзялі б гатовыя флянсы. Дагаварыцца аб гэта яшчэ маем час. Сеяць памідоры будзем у канцы сакавіка. Думаю, што яшчэ змагу ўнуку крыху памагчы.

Хопіць. Мушу яшчэ сяньня напісаць 3–4 лісты, а ўжо позна. Мая дачка таксама, як і Вы, сёлета ідзе на пэнсію — адпрацавала 33 гады.

Цалую Вас сардэчна, зычу вялікага плёну ў будучай працы. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

160. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

21 лютага 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сяньня атрымала бандэроль і адразу адказываю. Прачытала ўважна — усё добра. Усё ж пару маленькіх заўваг. Там, дзе пералічываеце аўтараў "Коласа беларускай нівы" (ст. 3), у Вас напісана *Лабенецы* — трэба *Лабенцы*. Другое — ці ня варта было б крыху шырэй напісаць аб першым старшыні — Адаме Бычкоўскім?

У беластоцкім календары за 1981 г. у маіх успамінах аб ГГБМ аб ім (асобная нататка) напісана: працаваў у 30-я гады ў Варшаве адвакатам — адзін з заснавальнікаў Асьветнага т[аварыст]ва ў Варшаве. Больш аб ім у календары 1980 г. Гэта як доказ, што з ГГБМ выходзілі і дзейныя беларусы. Не канчалася толькі на Гродна.

Я гэта пішу, а ў думцы: ці не дарэмная Вашая надзея на друк? Каб Вы нас і нашу дзейнасьць крытыкавалі, нас лаялі, ну тады друк быў бы пэўны. А пазытыўная ацэнка? Што ж, прабаваць не зашкодзіць...

Што будзеце пісаць у энцыкляпэдыю — добра. Праўду сказаць, я сама аб гэтым В. Скалабану прыпаміната, каб аб ГГБМ не забыліся.

Яшчэ не ўспакоіліся нэрвы пасьля "раману" А. Лойкі (а злуюць на яго ўсе — і тут, і за мяжой), а тут новы падарунак — у № 2 "Полымя" артыкул Якуба Міско[1]. Ужо здавалася, пасьля яго сьмерці будзе з гэтага боку спакой, аж тут зьявілася спадчына... Агідна, балюча чытаць. Ды і хлусьня несусьветная. Цяпер толькі чакаем, што яшчэ прыдумаюць. У лісьце і не ўдакладнім усяго, у чым справа. Мо яшчэ калі спаткаемся — будзе тэма для гутаркі.

Чакаю весткі, як прымуць Ваш артыкул. Я заўважыла, што найлягчэй трапіць у "Голас Радзімы". Марная гэта газэціна, толькі што далёка ідзе.

Вельмі мяне ўцешыла вестка, што Ларыса Антонаўна [Геніюш] трапіць у энцыкляпэдыю. А вось з с.п. Забэйдай — ня ведаю, што і думаць. Я атрымала ліст ад яго добрых прыяцеляў з Прагі. Яшчэ раней паведамілі мяне і С. Новіка, што с.п. Забэйда прасіў пераслаць усе яго цэнныя рэчы: фартэп'яна, магнітафон, усе стужкі, кружэлкі з песьнямі, архівы — у менскі Дзяржаўны музэй. Учора атрымала ізноў ліст. Паведамляюць, што з Менска ніякага адказу, ні слова...

А там ліквідуецца тое памяшканьне, дзе ён жыў. Ня ведаюць, што рабіць. Мала таго — ня ведаюць, што рабіць з урнай з яго попелам! Ці закупіць мейсца ў Празе, ці суайчыньнікі забяруць, каб пахаваць у роднай зямлі. І што тут адказаць? Калі нават нэкралёгу ў нас нідзе не было... Што Вы на гэта? І за што з ім так абышліся і абходзяцца? А ён, як мне пішуць, гуртаваў каля сябе беларусаў, якіх вайна выкінула з Краю — вучыў мовы, падтрымліваў сьведамасьць.

Мела сяньня ў Прагу пісаць, але ўжо не магу. Апошні час дрэнна чуюся. Сьпяшаюся, каб гэты ліст дайшоў перад Вашым ад'ездам у Менск. Як жа здароўе Вашай жонкі?

Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

161. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

23 лютага 1982 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Перадусім аб звароце да Вас. Думаю, што Вам не падабаецца, што я пішу *пані Дануся*. Гэта бывае, таму зьвяртаюся да Вас па бацьку. Так мяне зьдзівіў Ваш ліст, што я ўсё кінула і пішу.

Першы раз чую, што Лойка ў сваёй "Гісторыі літаратуры" нешта падобнае пісаў. Ці маеце на ўвазе II том гісторыі? Там ён сапраўды рабіў нейкі намёк, але вельмі невыразны, я толькі паціснула плячамі. Лойка ёсьць Лойка, на гэта нічога не парадзіш.

Але цяпер ня ў тым справа. Ня толькі я, але і сотні людзей, у тым ліку паважных дасьледчыкаў, асуджаюць Лойку. За што? За яго артыкул — фрагмэнт

раману аб Я. Купале, які быў надрукаваны ў “Літаратуры і мастацтве”. Хіба, Вы не чыталі?

Там жа ён з балотам зьмяшаў “Нашу ніву”, яе рэдактароў, выдаўцоў, супрацоўнікаў. Часткова выдумаў, часткова даслоўна ўзяў безумоўна хлусьлівыя высказываньні П. Мядзёлкі ў яе кніжцы “Сьцежкі жыцьця”. І тым самым дыскрэдытаваў пачынальнікаў беларускага руху. Вось за што ня толькі тут, але і за мяжой яго сурова асудзілі.

Пару дзён таму я мела госьця з Маладзечна. Той проста сказаў: “А. Лойка аканчальна страціў аўтарытэт як дасьледчык”. Адзін з прафэсароў Менскага ўнівэрсытэту пісаў мне: “А. Лойку — абы кніжка выйшла, а ці ў ёй ёсьць праўда — гэта няважна”.

Друкаваўся толькі фрагмэнт, а цэласьць мае зьявіцца ў “Маладосьці”. Аднарасна пераклад на рускую мову выйдзе ў Маскве! Вось у чым справа. Я той артыкул проста перахварэла. Арганічна цярпець не магу няпраўды. А дзе ў Лойкі няпраўда, [redacted] ведаю найлепш, бо ў рэдакцыі “Нашай нівы” бывала ня раз.

Ларыса Антонаўна той артыкул чытала. І яе пагляд ня розьніцца ад майго і іншых, хто Лойку асуджае. Яшчэ тое трывожыць, што *такі* чалавек працуе з моладзьдзю, уводзіць яе ў жыцьцё, мае свой уплыў.

Выбачайце маю памылку, што да зьмены Вашай працы. Проста я не зразумела і памылілася. Пісаў мне Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч], што ўжо звольнілі тры пакоі ў былым Багдановічавым доме, і што прэса загадзя раструбіла аб Музэі М. Багдановіча. А мо гэта і добра?

Канчаецца люты — зараз пачнеце новую захопліваючую і разам адказную працу. Шчыра зычу як найлепшага плёну. Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

P.S. Ці Вы ведаеце аб сьмерці Міхася Забэйды? Толькі прыватна распаўсюджваецца гэтая вестка, бо нават нэкралёгу нідзе не было. Ведаю, што зьбіраліся пісаць, відаць, не прапусьцілі.

162. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

15 сакавіка [1982 г.] Вільня

Паважаны і дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Спачуваю ў Вашых бедах-хваробах. Гэта сапраўды зашмат ужо для Вашай жонкі — гэтая блудзячая нырка. А яшчэ і Вам трэба было прастудзіцца...

У нас таксама нічога добрага. У маёй дачкі аказалася стэнакардыя. Пры яе працы гэта лячыць цяжка, бо патрэбны спакой, адпачынак. Да ўсяго і я вельмі дрэнна чуюся, і яна стараецца памагчы мне ў хаце, што яшчэ горш яе мучыць. Мо я і мыляюся, але ня вельмі веру ў адданасьць дактароў сваёй справе. Выглядае, што лечаць, каб выканаць плян...

Надыходзіць вясна, а хто зможа засеяць-засадзіць агарод — ня ведаю, бо ўнук мой прыгатаўляецца да экзаменаў у асьпірантуру. Думае паступаць у завочную, каб хоць як заняцца гаспадаркай. Ня ведаю, як гэта яму ўдасца ўсё павязаць. А саду і агароду шкада — столькі працы ўложана.

Вельмі шмат перажываньняў дае справа спадчыны с.п. М. Забэйды. Пісаў мне А. Мальдзіс, што Танк рабіў захады на высокім узроўні, а цяпер справу разглядаюць у Міністэрстве культуры. Але ў Прагу, мусі, ніхто ня піша і аб захадах не паведамляе, бо там сябры-прыяцелі сьпевака непакояцца.

Сяньня С. Новік прыслаў мне копію ліста той асобы, што апекавалася Міхасём Іванавічам. А Янка Хвораст (харэограф) адаслаў мне ліст, што атрымаў з Прагі ў адказ на свой. І адзін (С. Новік), і другі (Я. Хвораст) былі з М. Забэйдам знаёмыя і перапісываліся з ім. Але і адзін, і другі ня маюць нікога блізкага, таму ўсялякія важнейшыя лісты або іх копіі адсылаюць мне. Гэта значыць, хочуць, каб тое, што тычыцца М. Забэйды, было ў адных руках. Забываюцца, што і я толькі адной нагой яшчэ трымаюся тут...

Таксама дагэтуль нічога няведама, што з урнай з попелам нябожчыка. Ці ўжо пастанавілі аставіць у Празе, закупіўшы там мейсца, ці чакаюць, што тут будзе пастаноўлена? А якраз аб гэтым ніхто і не заікаецца. Як гэта нясьцерпна балюча... Не было яму тут мейсца пры жыцьці, німа і па сьмерці. Каб гэта ў Менску быў хто адважны — прыпомніў, падштурхнуў... Тыя, хто перапісываецца з Прагай,— людзі маленькія, і іх голас ня мае вагі. Вось і цягнецца...

Але, ведаеце, не дае мне спакою адно пытаньне. Гэта асоба, што рассылала паведамленьне аб сьмерці (піша, што выслала каля 200!), піша аб даўніх прыяцельскіх адносінах яе сям'і з М. Забэйдам. Піша, як ім апекаваліся, як цяпер сумуюць па ім і г.д.

Дык трэба Вам выясьніць, хто гэта — Надзея Кастэцкая[1]. Паходзіць з Баранавіч. Вучылася ў Вільні ў Рас[ейскай] гімназіі, але належала да хору, які вёў Шыдлоўскі[2], знала Г. Цітовіча[3], 14-гадовай дзяўчынкай у 1936 г. пабачыла сьпевака на канцэрце. Пасьля вайны апынулася ў Празе. Выйшла замуж за чэха — артыста-скрыпача. І вось абодва артысты і яна зблізіліся, пасябравалі і г.д.

Але цікава, чаму М. Забэйда ў лістах ніколі ні словам ня ўспомніў, што мае такіх блізкіх сяброў? І ня толькі я, але і іншыя яго карэспандэнты лічылі яго вельмі адзінокім, без апекі і г.д. А мо проста такая ўжо была натура, што не любіў шмат аб сабе пісаць? Ня ведаю, але неяк прыкра.

Назьбіралася маса лістоў, аніяк не пасьпяваю адказываць, а тут чуюся так, што толькі сіла волі трымае. Апошні час не было тут патрэбных лекаў, і таму пагоршала, але ўжо ёсьць — прыслалі з Ленінграду. Мо яшчэ папраўлюся.

Усяго Вам найлепшага — перадусім папраўы здароўя жонкі. Ад мяне ёй правітаньні і найлепшыя пажаданьні. Бывайце здаровыя. *Л. Войцікава.*

163. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

22 сакавіка 1982 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Цешуся, што насеньне дайшло. Бяда толькі, што вясны як німа — так німа. Ляжыць сьнег, прымаразкі. Нядоўга ўжо будзеце адпачываць, час ляціць хутка, і красавік ужо блізка. А якое ў Вас начальства? Магчымае з пункту гледжаньня беларускасьці? Якія думаеце зьбіраць матэр'ялы? Выключна багдановічаўскія, ці і іншыя?

Менск ужо адсьвяткаваў юбілеі Б. Тарашкевіча і Р. Шырмы, цяпер думае аб 100-годзьдзі Купалы, Коласа і У. Галубка. Юбілей апошняга назначаны на 15 чэрвеня.

Я атрымала сардэчны ліст ад дачок У. Галубка. Дзьве з іх я бачыла ў Менску малымі, 9–10-гадовымі дзяўчынкамі. Адказала пакуль што коратка, але

абяцала напісаць больш, расказаць аб нашай супольнай працы з іх бацькам у Менску ў 1916–17 г. Усё не зьбяруся напісаць. Апошні час дрэнна чуюся: часта і моцна баліць галава.

Непакоюся за Ларысу Антонаўну. У апошнім лісьце пісала, што вельмі дрэнна з сэрцам, што німа патрэбных уколаў... А цяпер німа ніякай весткі. Мо Вы што ведаеце?

Пісалі мне з Менска, што Лойку моцна раскрытыкавалі і за вочы, і ў вочы. І што, магчыма, у кніжцы ён што-небудзь зьменіць. Пабачым. Падобна, пахвалы не атрымаў ад нікога. Гэта пацяшаючы факт...

Ці Вы бачылі ўжо дватомнік Канстанцыі Буйло? Добра выданы. Яна вельмі цешыцца, што дачакала. Будзе хвілінка часу — пішыце. Цалую шчыра — *Л. Войцікава.*

164. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

31 сакавіка 1982 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Я Вам не пісала, але часта думала аб Вас. Аб Вашых справах — музэйных і асабістых. Вы мне пісалі недзе ў канцы мая ці ў пачатку чэрвеня, што чакаеце, каб Ваш муж пайшоў у адпачынак, а тады пачнеце езьдзіць, і паміж іншым — у Вільню. Вось [redacted] і чакала... А пасьля мне Ларыса Антонаўна [Геніюш] напісала, што стан здароўя Вашага мужа пагоршаў... Думала пра Вас, але пісаць не хацела, каб не рабіць Вам лішняга клопату.

Цяпер бачу, што ў Вас ня так ужо дрэнна, калі можаце езьдзіць. А калі ж у Вільню? Вы, як былі, прасілі напісаць сваёй рукой нешта з таго, аб чым [redacted] расказывала, каб быў мой аўтограф. Я ўжо даўна гэта зрабіла. Не адсылала, бо не хачу складаць паперы ў капэрту — няхай будзе аркуш роўны, гладкі. Возьмеце пры аказіі.

Успаміны аб Гродзенскім гуртку ў мяне ёсьць, толькі трэба зрабіць копію (на машынцы), вокладку і здымкі. А з гэтым трэба пачакаць, бо ўдома ў нас рамонт. Зяць ня мае часу.

У Слоніме ў адной са школаў ладзяць школьны музэй — "Слонімшчына літаратурная". Просяць даць туды нешта аб Леўчыку, а і менскі музэй М. Багдановіча штораз нечага патрабуе. А тут, як на бяду, дрэнна чуюся, цяжка што-небудзь рабіць. Стараюся хоць на лісты адказываць. Атрымліваю іх — безьліч. За сем месяцаў больш за 300. Пакуль што на ўсе адказала.

Вельмі была б рада атрымаць ад Ларысы Антонаўны яе зборнік. Я яго адным вокам бачыла. Зяць быў у Менску і ад некага яго дастаў. Паказаў мне, а каб для мяне купіць — не здагадаўся...

Вельмі буду рада Вас пабачыць. Прыяжджайце. А "Жалейку" мецць бы не пашкодзіла. Калі ў Вас лішняя — буду ўдзячная. Вітаюць Вас каты Пірат, Чып і Шэры ды сабака Ас.

Цалую шчыра. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

165. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

4 красавіка 1982 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Ці ня ведаеце, што дзеецца ў Ларысы Антонаўны [Геніюш]? Вельмі непакоюся за яе. Пасьля апошняга (даўна) вельмі трывожнага ліста аб дрэнным стане здароўя — ні слова. Адказу на мае лісты ня маю. Мо не даходзяць? Там усё магчыма.

А што ў Вас? Ужо працуеце? Якія адносіны з непасрэднымі ўладамі? Калі зможаце — кіньце некалькі слоў.

Шчыра Ваша *Л. Войцікава.*

166. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

14 красавіка 1982 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Замарудзіла і я з адказам на Ваш ліст. Такая благая вясна, холад, сьнег, вецер, што мае старыя косьці не вытрымліваюць — чуюся ўвесь час дрэнна. Па чарзе адкажу на Вашыя пытаньні.

1) Хто такі Эдмунд Навіцкі[1]? Ня ведаю. І я заўважыла гэты подпіс на паштоўках, але хто гэта быў — ня ведаю. Хацела запытацца ў Янкі Багдановіча, які меў дачыненьне да выдавецтваў і друкарняў, але ён ляжыць у шпіталі.

2) Максім Багдановіч належаў і працаваў, як і мы ўсе, у Беларускім камітэце т[аварыст]ва помачы ахвярам вайны (вул. Захараўская, 18) — Беларуская хатка. Гэта праца грамадзкая. А дзеля заробку працаваў у Гарадзкой управе, у харчовым аддзеле — гэта ўстанова казённая. А дзе была, на якой вуліцы — зусім ня помню.

3) Аб Земскім музэі абсалютна нічога ня ведаю.

4) Тая паштоўка — юбілейны партрэт Максіма Б[агдановi]ча, абсалютна нічога ня варты. Я маю такіх, хіба, з дзясятак. Адразу напісала ў Менск, у музэй — аб сваім паглядзе. Я і ім казала (былі ў мяне нядаўна з Менска, з музэю), і Вам кажу, што я лічу адзіным добрым і падобным здымак, зроблены ў 1915 г. у газэце "Голос". Вядома, перафатаграфаваны з газэты, мае тэхнічныя недахопы, але падабенства выключнае. Такім я Максіма бачыла і помню. Пасылаю адзін такі Вам.

Работа мастака Пратасені[2] па задуме добрая, вельмі добры фон — стары Менск, але я мала падобная, і Максім павінен быць на галаву вышэйшы за мяне. Каб Пратасеня, будучы ў мяне, сказаў, што мае намер нас рысаваць, я б падсказала розьніцу ва ўзросьце і дала б на ўзор сваю фатаграфію — якраз з 1916 году. Ну і подпіс не зусім удалы... Трэба было напісаць: *Л. Сівіцкая (Зоська Верас).* Апошняе — як аб'ясьненьне, хто такая Л. Сівіцкая — тады я была якраз Л. Сівіцкай, а псэўдоніму яшчэ ня мела[3]. Але ўсё гэта няважна.

Усяго найлепшага! Ад усіх маіх — прывітаньне. Значыцца, летам пабачымся? Абы дачакаць. *Л. Войцікава.*

167. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

14 красавіка 1982 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Адказываю на Вашы два лісты. Перадусім вельмі дзякую за іх, за весткі аб Ларысе Антонаўне [Геніюш] і аб музэі. Ларыса Антонаўна ўжо мне напісала. Пісала, што чытала карэктуру сваёй кніжкі. Задаволеная. Але што хварэе, то хварэе. Усё ж мае надзею, што сілы яшчэ вернуцца, і будзе садзіць кветкі. Зычу ёй усяго найлепшага.

Сумна, што такія малацікавыя і здавальняючыя ў Вас справы з музэем. Проста нейкі зьдзек. Хацелася б памагчы. Але чым і як? Ці хочаце мець мае ўспаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі са здымкамі? Гэта, вядома, ня тычыцца М. Багдановіча, але мае дачыненьне да Гродна. Абяцала Вам напісаць аб старым Гродне, ды ўсё рукі не даходзяць. І чуюся нядобра (надвор'е проста забойчае), і лістамі закідалі. Ляжыць лістоў 5 да адказу. Усё ж аб Гродне напішу і аб Максіме Б[агдановічу] таксама. Маю напісанае, толькі перапісаць.

Дзякую за сьвяточныя павіншаваньні, і Вам таксама мае пажаданьні ўсяго самага лепшага. Каб Вам справа музэю пайшла гладка і плённа!

Цалую Вас шчыра. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

168. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

20 красавіка 1982 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Засмуціў мяне Ваш ліст. Тым больш цяжка, што гэта ў Гродне. Німа людзей — німа беларусаў. Казёншчына, і ўсё. Мне здаецца, каб Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] быў на мейсцы, быў бы Вам дапамогай — памог бы ваяваць. Але ж і яго німа.

Пасылаю Вам адрас В. Скалабана. Зьвярніцеся да яго, спасылаючыся на мяне,— папрасіце, каб прыслаў Вам ксэракопію таго другога дакумэнту. Я да яго таксама напішу — возьмем яго з двух бакоў.

Ці Вы маеце № 12 "Нёману" за 1981 год? Там вельмі добра напісаны артыкул пра М. Багдановіча[1]. Гэта ў музэі мець не пашкодзіць. Калі ня маеце, напішыце мне. Я маю 2 экзэмпляры — магу прыслаць.

Ня помню, ці я дала Вам аўтограф М. Багдановіча (копію) — пісульку Максіма да мяне? Калі не — прышлю. Напішу да Ніны Барысаўны Ватацы — мо яна Вам што парадзіць. Нядаўна яна прыяжджала да мяне разам з захавальніцай фондаў Музэю Багдановіча ў Менску і пляменьніцай Я. Купалы[2]. Шкада, што я тады ня ведала аб Вашых цяжкасьцях, асабіста пагаварыць мо было б больш карысна.

На жаль, ня ведаю нікога прыватнага, хто мог бы Вам памагчы экспанатамі. Ды, праўду кажучы, нікога такога ў Вільні німа. Старыя паўміралі, а маладыя перасталі быць беларусамі. Адзін чалавек такі ёсьць, але хворы, у шпіталі.

Я пісала да Новіка-Пеюна. У яго вялікія зборы кніжак. Цяпер ён усё разьбірае — адсылае ў Нясьвіж, у будучы музэй. Але мо яшчэ што мае? Ці Вам ідзе толькі аб тое, што тычыцца М. Багдановіча?

Сумныя думкі апанавалі, калі даведалася аб усіх Вашых цяжкасьцях.

Але ўсё ж я засьмяялася, прыпомніўшы, што і мае пачаткі працы ў рэдакцыі грамадаўскай прэсы былі аднолькавыя з Вашымі. І я ў рэдакцыі (адзін праціўны цемнаваты пакой і кухня) у першы дзень прынясла з сабой шчоткі, сьціркі, фартух, хустку на галаву і, зачыніўшыся на ключ, мыла вокны, падлогі. Толькі мела яшчэ адну неспадзяванку — кухня была заваленая пустымі бутэлькамі ад гарэлкі і віна... Такія былі мае папярэднікі.

Ад Ларысы Антонаўны мела я ліст. Аб карэктуры яе кніжкі ведаю. Выбачайце, што так насьпех пішу. Апошнія дні вельмі дрэнна чуюся. Моцна завастрылася хвароба страўніка. І есьці не магу, і начамі амаль ня сплю. Ды яшчэ вясна ня хоча ўсталявацца — холад, дажджы, а і сьнег па пару разоў на дзень сыпле.

Цэлыя дні — па 6–8 гадзінаў — сяджу адна. Ды яшчэ ўнук выехаў на некалькі дзён службова ў Маскву. Усё гэта нэрвуе. А як Вашае здароўе? Ці алергія цалкам мінула? Гэта, хіба, ад нейкіх хімікаліяў?

Чакаю ад Вас весткі. Трымайцеся! Сардэчна цалую — *Л. Войцікава*.

169. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

26 красавіка 1982 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Віншую з 1 Мая! Няхай ён прынясе Вам шмат цяпла, сонца, радасьці і забярэ лішнія клопаты. Быў у мяне ўчора Арсень Сяргеевіч Ліс. Я яму сказала аб Вашых клопатах з музэем. Ён кажа, што Вам трэба зьвярнуцца ў сакратарыят Саюзу пісьменьнікаў. Папрабуйце! А мо гэта што дасьць.

Ужо 2 асобы прасілі аб адрас Н.Б. Ватацы, і не магу дачакацца адказу. Ці Вы атрымалі мой папярэдні ліст?

Усяго добрага. *Л. Войцікава*.

170. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

3 мая 1982 г. Вільня

Дарагая пані Дануся!

Пішаце, каб не хваляваца? Навучыце, як гэта робіцца, бо я ня ўмею. Усё жыцьцё нечага хвалююся, трэба ці ня трэба. Пытаецеся аб Ніне Аляксандраўне Ляшковіч — [redacted] аб ёй даўна ведаю, як аб чалавеку рупным, добразычлівым для кожнага, хто патрабуе рады і дапамогі. Яна ўжо не працуе. Яе добра ведае мой зяць Лявон, а я асабіста пазнала яе пару тыдняў таму, калі яна была ў мяне разам з Нінай Барысаўнай Ватацы і з захавальніцай фондаў музэю М. Багдановіча Валянцінай Францаўнай Бляўскай[1].

Толькі што менскія госьці так мяне занялі роспытамі пра Максіма, што з гр. Ляшковіч я і не пагаварыла. Прыяжджайце, знаёмцеся, прабуйце.

За адрас Н. Ватацы дзякую — ужо мела, а што самае сьмешнае — [redacted] маю яго вельмі даўна, але не была пэўная, ці ён актуальны. А цяпер і яе тэлефон маю.

Пацяплела, пачалася маёвая пагода. Нягледзячы на гэта, чуюся вельмі нядобра. І ніякія лекі не памагаюць.

Цалую Вас сардэчна і чакаю. *Л. Войцікава*.

171. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

3 чэрвеня 1982 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Дзякую шчыра за павіншаваньні і добрыя пажаданьні. Спаткаў мяне гэты гонар, але ці не запозна? Я, здаецца, ужо сваё адрабіла і на большае ня здатная. Чуюся дрэнна і тым больш рада буду пабачыць усіх, хто да мяне зьбіраецца.

30 мая была ў мяне Ніна Аляксандраўна Ляшковіч. Нарэшці пазнаёміліся асабіста. Я з ёю гаварыла аб патрэбах гродзенскага Музэю М. Багдановіча. Яна ўжо не працуе, але добра помніць, дзе што ёсьць, дзе чаго шукаць, і гатовая памагчы Вам усімі магчымымі парадамі.

Зразумела, што твор Лойкі абурыў мяне, тым больш, некаторыя былі перакананыя, што часьць крытыкі да яго дайшла, і ён зразумеў, у чым справа, і тое-сёе паправіць. Тым часам нічога ён не зразумеў і нічога папраўляць і ня думаў. Што пішуць абы што — гэта ня дзіва, кар'ерыстаў хапае, але што *друкуюць* такое — гэта горш. Значыцца, даецца зялёная дарога ўсякім брахунам.

Дзіўлюся, што Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч]не атрымаў майго ліста. Я да яго пісала — прасіла, каб ён напісаў у Літаратурную энцыкляпэдыю вестачку аб "Коласе беларускай нівы", выданым у 1913 г. Гродзенскім гуртком беларускай моладзі. Прапанавалі зрабіць гэта мне, але я адмовілася. Немагчыма пісаць — ацэньваць тое, да чаго сама прылажыла руку амаль 70 год таму. Ад Аляксея Міхайлавіча адказу не атрымала. Мо спаткаеце яго, калі ласка, падыміце гэтую тэму.

Усяго добрага. Шчыранька Вас цалую. Ад маіх — прывітаньне. Ваша *Л. Войцікава*.

172. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

6 чэрвеня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую, што непакоіцеся аба мне. Але гэта віна не мая, што трэба непакоіцца, бо я Вам пісала (15 красавіка) на той часовы адрас у Менску, які Вы мне прыслалі. Пісала там і аб сваіх успамінах аб ГГБМ, друкаваных у "Студэнцкай думцы", якой маю шмат нумароў, бо ў іх друкаваліся мае маленькія імпрэсіі. У гэтым жа лісьце я прасіла Вас напісаць маленькі артыкул у "Літаратурную энцыкляпэдыю"[1] аб "Коласе беларускай нівы".

Прапанавалі зрабіць гэта мне, але я адмовілася. Трэба ўмець так ляпідарна пісаць — гэта адно, а другое — глядзець крытычна. Цяжка крытыкаваць тое, што рабілася пад маім наглядам. Я ж тады была самая старэйшая з гурткоўцаў.

Выслаўшы той ліст, я вельмі чакала адказу. А ліст, відаць, загінуў. І гэта ня першы раз мае лісты не даходзяць да менскіх адрасатаў. Відаць, таму што пішу адрасы па-беларуску...

Маю шмат рознай работы, якую трэба абавязкова зрабіць, апрача таго — безьліч лістоў.

А працаваць цяжка. Мінуўшая гарачыня моцна шкодзіла — безупынна балела галава.

Учора мы мелі буру і дождж. Здавалася, пасьля зьмены пагоды павінна галаве быць лягчэй — але не, тое самае ад раніцы. Відаць, падняўся крывяны ціск. Апрача таго, старая хвароба страўніка пагоршылася. Лячуся зёлкамі, мо паможа.

Цяпер у мяне цяжкі час таму, што дачка вельмі запрацаваная. Яна так, як і Вы, запрошаная ва ўнівэрсытэт старшынёй дзяржаўнай экзамінацыйнай камісіі. Апрача таго, прыймае дзяржаўныя экзаміны ў сябе ў пэдінстытуце. Уяўляеце, што гэта значыць. Мушу рабіць усю хатнюю работу, а гэта мне ня так лёгка ўжо даецца. Але ўжо нядоўга такі стан будзе трываць. Далей будзе лягчэй.

Цяпер і ўнук мала можа памагчы, бо 25 чэрвеня здае першы кандыдацкі экзамін. Працуе па начах, а і работы ў садзе ніхто за яго ня зробіць. Толькі ад агароду зусім адмовіўся. Проста не стае на гэта часу. Бо 8 гадзін працы трэба адбыць нармальна.

Толькі зяць ужо на пэнсіі. Ня думае яшчэ зусім пакідаць працы, але цяпер мае 2 месяцы адпачынку, адзін месяц ужо прайшоў, і яшчэ да канца чэрвеня вольны. Так што добра і тое, што я ня так часта адна.

Сардэчна дзякую за павіншаваньне. Ці ня сьмешна крыху ў амаль 90 гадоў уступаць у Саюз пісьменьнікаў? Сапраўды, гэта заслуга, стараньне Генадзя Аляксандравіча Кахаоўскага[2], а яшчэ і А. Мальдзіса. Яны абодва мяне намовілі, пераканалі, што гэта трэба зрабіць. І ўсе клопаты Генадзь Аляксандравіч узяў на сваю галаву. А. Мальдзіс даў вельмі добрую рэкамэндацыю. Другую даў А. Ліс. А хто трэцюю — так і ня ведаю дакладна — ці С.Х. Александровіч, ці Алесь Мікалаевіч Бачыла.

Усё задаволеньне сапсавалі толькі здымкі. І я пратэставала, і ўнук таксама, але зяця не пераканаеш. Зрабіў па-свойму, і цяпер у "ЛіМе" паказалі мяне ў самым горшым выглядзе... А. Ліс казаў мне, што можна было даць здымак і з-перад 10 гадоў, ды і пазьнейшага часу ёсьць нямала лепшых. Але што ж, фатограф упёрся і паказаў мяне карыкатурай... Ня вельмі прыемна. Хіба ж у тэлебачаньні я не такая ўжо страшная? А можа, мыляюся? Але хопіць.

Шалёны сяньня вецер, а гэта таксама выклікае моцны боль галавы. У нас сёлета незвычайна багата ўсё цьвіце. І сад (ужо перацьвілі яблыні), і бэз, цяпер акацыі (у нас іх вельмі шмат), і мора кветак. Даўна не было такога багацьця фарбаў.

А ведаеце, недалёка Гомеля ёсьць мястэчка Сураж. Там памёр і там пахаваны мой бацька. Сьледу магілы, напэўна, німа ўжо даўна. І крыж, і агароджа былі бярозавыя...

Усяго Вам найлепшага! Пішыце. Прывітаньне Вашай жонцы. Шчыра — *Л. Войцікава.*

173. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

29 чэрвеня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ваш ліст з дня 17.06 даўна атрымала. Не сьпяшалася адказваць, бо і так Вы гэтага адказу не прачыталі б, пакуль не прыедзеце ў Гродна.

Да В. Скалабана я зараз жа напісала, але дагэтуль адказу ня маю, ці ён што ў гэтай справе зрабіў. Я сапраўды не магу за такую работу ўзяцца. Маю шмат чаго нясконначанага, а і пару тэмаў трэба распрацаваць для музэяў М. Багдановіча — у Менску і Гродна.

Паміж іншым, Гродзенскаму музэю (ён яшчэ ў пэрспэктыве) не шанцуе. Данута Бічэль зьбіралася прыехаць у Вільню шукаць матэр'ялаў, тым часам

я ад Ларысы Антонаўны даведалася, што яе мужу шмат горш. Так што і справа музэю адкладаецца. Ці ж можа быць інакш, калі ўся надзея на аднагоадзінага чалавека?

Вярнуся да сябе асабіста. Ня чуюся добра, і таму ўсё цягнецца, адкладаецца. Ледзь пасьпяваю адказываць на лісты. Надвор'е зусім ня летняе, дажджы, холад, вялікія ветры. І гэта дрэнна дзеіць на фізычны стан і настрой. А як дзеіць на настрой, на нэрвы А. Лойка –хіба, дагадываецеся самі.

Што я Вам пісала аб "Студэнцкай думцы", аб сваіх успамінах аб ГГБМ — помню. У мяне "Студэнцкая думка" ёсьць — шмат нумароў. Аб ГГБМ ішло ў 2 нумарах 1925 г. У іншых — некалькі маіх імпрэсіяў. У той час адказным рэдактарам "Ст[удэнцкай] думкі" быў былы сябра ГГБМ Адольф Зянюк. Вось ён і запрапанаваў мне мейсца на старонках часапіса.

Як я пасьля сьмялася, не дарма, бо калі ў іх на ўнівэрсытэце была сэсія і ня мелі часу займацца "Ст[удэнцкай] думкай", прыносілі мне матэр'ялы, грошы і выданьне чароднага нумару астаўлялі мне. Я і паперу купляла, і друкарні пільнавала, і карэкту рабіла. Такая была мая сувязь са "Ст[удэнцкай] думкай". А друкавацца тады было няцяжка — абы нічога падазронага не было. Матэр'ялаў (асабліва маіх) ніхто са студэнтаў не скарачываў (як цяпер), не папраўляў — усё ішло, як было напісана.

У 1972 г.— на маё 80-годзьдзе — Зянон Пазьняк хацеў зрабіць добрую справу. Даў мае ўспаміны аб ГГБМ у "Маладосьць". Што з гэтага зрабілі — самі калі-небудзь пераканаецеся. Скарацілі, проста павырэзывалі цэлыя сказы бяз сэнсу. З. Пазняк за галаву схапіўся, як пабачыў. Пасьля перапрашаў мяне, што не даглядзеў.

А яшчэ раней Я. Саламевіч даў гэты ж матэр'ял у "Полымя". Трымалі ½ году. Друкаваць ня думалі (не цікава). Добра, што машынапіс на просьбу Я. Саламевіча вярнулі. Тады С. Новік-Пяюн надрукаваў на машынцы некалькі экзэмпляраў і адпаведна іх аформіў. Так што я магла шмат каму разаслаць, нават за мяжу. Ну а апошні раз пра ГГБМ зьявілася ў беластоцкім "Бел[арускім] календары" ў 1981 годзе.

Дзякую шчыра за стараньне даведацца аб долі магілы майго бацькі. Ня маю надзеі, каб яна захавалася. Столькі вады ўплыло з таго часу. Гэта ж было ў 1907 г., а крыж і агароджа драўляныя, ды і вайна, хіба, нямала зьнішчыла. Можа, і могільніку таго німа. Першыя гады то даглядалі магілу знаёмыя — нават здымак прыслалі. Маю яго.

Ці яшчэ доўга будзеце ў Менску? Пішаце, што Гродна шмат страціла са свайго выгляду за апошні час? Ой, як шмат! Для мяне яно цяпер зусім чужое, апрача тых некалькіх старых вулічак, якія захаваліся бяз зьмены. Я абяцала Данусе Іванаўне напісаць аб старым Гродне, такім, якім я яго помню са сваіх дзіцячых гадоў (як мне было 6–7 г.), і гадоў маладосьці, калі яшчэ быў пантонны мост перад Фарай. Пастараюся гэта зрабіць. Можа, яшчэ ўдасца.

Слаўка ўдзячны Вам за добрыя пажаданьні ў навуцы. Экзаміны ўжо пачаліся. За 1-шы (ангельскі) дастаў 5. Цяпер канчае рэфэрат па філязофіі. Сяньня лёг а 4-й раніцы, устаў — а 6-й. Ня ведаю, як доўга так можна вытрымаць. Паміма таго і сад даглядае — апрысківае і г.д. Гэта ж яго вялікае hobby.

Усяго найлепшага! Прывітаньне Вашым родным. *Л. В.*

174. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

5 жніўня 1982 г. Вільня

Даражэнькая Ларыса Антонаўна.

Шчыра і сардэчна дзякую за кніжку[1]. Чытаю з вялікай прыемнасьцю і асалодай. Нікому не даю, бо зяць мае сваю — нехта яму падараваў у Менску, як быў там на адкрыцьці выстаўкі. А Слаўка чытаць паэзіі ня мае часу, бо чытае Энгельса[2] — да экзаміну. А я па некалькі разоў на дзень адчыню кніжку, прачытаю адзін-два вершы, асьвяжу душу, глытну прыгожае слова-думку. А часам і ажывіць душу трэба, калі яна ўжо вельмі заглохне ад жыцьцёвага націску.

Бываюць вогнішчы, бурай-дажджамі залітыя[3],
Вуголлем чорным, попелам шэрым пакрытыя...
Бываюць душы, як той агонь, спапялеўшыя,
Напоў бы мёртвыя, напоў бы абамлеўшыя...
Калі ж рукою бязбоязнай іх закранём —
Заззяюць полымем ясным, жывым агнём...

Сумны Ваш ліст. Спагадаю з цэлага сэрца. Але як і чым можна памагчы? Зьмяніць атмасфэру? Пераконваюся, што гэта агульная бяда-гора. Менск? Што Менск? Шмат слоў, шмат добрых намераў. А бліжэйшая і далейшая правінцыя — сама па сабе, незалежная!

У Радашкавічах (вестка з ліста — ня выдумка) падчас так горача спраўлянага 100-годзьдзя Я. Купалы выдзерлі з зямлі, адламаўшы прытым галаву, помнік Я. Купалы, а як пабачылі, што помнік сапсаваны, усё цалкам укінулі ў балота. Чаму? Бо пашыралі дарогу, ды яшчэ таму, што той скульптар, які рабіў помнік, выехаў у Ізраіль. Гэта ж хіба не са згоды Менска? Нічога ўжо мая старая галава не разумее. А мо ад гарачыні і сушы мазгі сохнуць? Але гэта — жартам.

Як Вы даяце сабе рады ў гэтую сушу? Вады каля дому ў Вас німа? Чым паліваць? І ў нас німа вады. Адразу, як пачалі будавацца, выкапалі студню. Вада была крынічная. Але як пачалі будаваць навокал фабрыкі, "сьцягнулі" ўсю ваду — у суседняй вёсачцы (цяпер гэта вуліца гораду) ўсе студні высахлі і ў нас таксама. На гэтую вулічку правялі ваду, а да нас — праз горы — немагчыма. Вось і ловім дажджавую. Стаіць 5 бакаў. Зяць зрабіў 2 басэйны. Але яны патрывалі пару гадоў, а цяпер нічога нявартыя — прапускаюць ваду. Вядома, каб рабіў чалавек, які гэту работу ведае, было б што іншае. Але мой зяць лічыць сябе майстрам на ўсё. Вось і робіць на кароткі час — як гульня. А колькі гэта каштуе нэрваў...

Але бываюць і добрыя весткі, добрыя падзеі. Падобна, Лойкава пісаніна "Як агонь, як вада", якую мы чыталі ў часапісным вар'янце, *кніжкай ня выйдзе* ні ў Менску, ні ў перакладзе[4]. Як кажуць: "кніжку зарэзалі". Вось і добра! А вось нашто было друкаваць той часапісны вар'янт? Каму ён быў патрэбны? Каб дагадзіць тым, хто любіць вакол сябе балоты ды ў балоце капацца, ды абрыдзіць жыцьцё тым, хто брахні цярпець ня можа? Гэта ж ня аўтар самавольна друкаваў, а знайшліся такія, што яго ахвотна падтрымалі.

Слаўка заўтра едзе ў літоўскую вёску на вясельле. Жэніцца Галі хрышчоны сын. Яго бацькі — нашы старыя знаёмыя, а матка — мая вучаніца. Жонку бярэ літоўку, ды ён сам па бацьку літовец. Малады скончыў тэхнікум ды цяпер вучыцца на нейкіх вышэйшых тэхнічных курсах, а маладая скончыла Пэдінстытут

у Вільні. Запрашалі Галю, але гэта не на яе здароўе — адмовілася, то хоць аднаго Слаўку запрасілі. Добра, што крыху праветрыцца, а то за працай і навукай сьвету ня бачыць.

Думаю таксама, каб яму наладзіць паездку ў Менск, каб мог пазнаёміцца з менскім Батанічным садам. Там, падобна, шмат цікавага. Гэта ж для Слаўкі замілаваньне. Цяпер гадуе ружы — ёсьць вельмі прыгожыя, добра растуць, добра цьвітуць. Ёсьць і іншыя вельмі дэкарацыйныя кветкі. Нікуды далей, як бывала ў час адпачынку, Слаўка не зьбіраецца, бо экзамін ня так далёка.

Я, насколькі магу, займаюся зрэзываньнем і сушэньнем лекарскіх зёлак. Далёка нікуды хадзіць ня трэба, бо ў нас на дзялцы маем самыя розныя. А рухацца трэба абавязкова.

Ці атрымліваеце лісты з Беластоку? А ад Язэпа [Найдзюка] [5]? А як з пачкамі? Ці можна што пасылаць?

Цалую шчыра і сардэчна. Ваша *Л.В.*

175. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

5 жніўня 1982 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

Аж сорамна мне — смачная вельмі каша з Вашых крупаў, а дагэтуль не падзякавала. Усё таму, што паверыла зяцю, быццам Вы вось-вось прыедзеце. Зьбіралася напісаць да Вашай жонкі з удзячнасьцю і падзякай — то ізноў ня ведала, як яе па бацьку. Перашкоды дробныя, а выйшла зусім няветліва. Хоць так шмат часу прайшло, але вельмі шчыра і сардэчна за падарунак дзякую!

З увагай і цікавасьцю чытала ў "ЛіМе" Ваш артыкул пра творчасьць Я. Брыля[1]. Першае, што мне трапіла ў рукі,— гэта яго "Жменя сонечных промняў". Захапіла зусім. Люблю такія маленькія формы-цуды. Мала слоў, а якія глыбокія абразкі-думкі. Цярпець не магу шматслоўя, думак, якія цягнуцца, быццам гума. Асабіста я Я. Брыля ня ведаю, але прыслаў мне "Золак, убачаны здалёк" і яшчэ нешта з аўтографам. І так ужо павялося, што перасылаем сабе сьвяточныя пажаданьні.

Нічога ня ведаю, дзе Вы цяпер, што ў Вас чуваць, якія пэрспэктывы? Аб сабе нічога цікавага сказаць не магу. Здароўе дрэннае, паправы не відаць і, хіба, ня будзе. Лістоў, як заўсёды, шмат, штораз нешта і нехта новы. Пакуль што — адказываю. Хоць, напэўна, чытаць нялёгка? Почырк псуецца, рука ня слухаецца. Пішыце. Цікавіць мяне вельмі, што ў Вас. Яшчэ раз дзякую за грэчку. Усяго найлепшага Вам і сямейцы.

Л. Войцікава. Ад маіх прывітаньне.

176. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

11 жніўня 1982 г.

Дарагая пані Дануся.

Дзякую за весткі. Гэта вельмі добра, што можаце прыймаць удзел у экспэдыцыях Акадэміі, а Вільня не ўцячэ. У Слоніме робяцца дзіўныя рэчы. За стварэньне музэяў бяруцца адразу дзьве школы — 1-я і 7-я. у адной — "*Пісьменьнікі Слонімшчыны*", у другой — "*Слонімшчына літаратурная*". Што

гэта — спаборніцтва? Мне здаецца, музэй ці, скрамней, музэйны куток, можа і павінна мець кожная школа, але чаму абедзьве аднаго профілю? Ці ўжо так шмат знойдзецца матэр'ялаў, што кожная школа зможа наладзіць музэй па-свояму? А паўтарацца які сэнс?

Наагул, да Слоніма німа ў мяне даверу. Слонімскі гарадзкі музэй раздае свае экспанаты прыватным калекцыянерам, нішчыць партрэты і г.д. а тыя прыватныя калекцыянеры зьбіраюць свае калекцыі не зусім чыстымі спосабамі. Так у аднаго з іх аселі ўспаміны аб Гальяшу Леўчыку, напісаныя да 30-годздзя яго сьмерці Пятром Ластаўкай спэцыяльна для мяне і на маю просьбу, а прывезеныя з Беластоку ў Слонім. Доўга пра гэта можна гаварыць, але ці варта?

Жупранская школа мне ніколі не падабалася. Дзеці адтуль мне пісалі. Я ім, як і іншым, адказывала. У адным з лістоў пішуць: "Як гэта Вам удавалася выдаваць "Заранку" ў такі час поўнага заняволеньня беларусаў?" і г.п. Я ім: "Што Вы пішаце? Ці ж была адна "Заранка"? Былі ж газэты, арганізацыі, гімназія, музэй, выдавецкае тав[арыств] а, кнігарні і інш. Ці ж Вы ня ведаеце?" Яны ў адказ: "Мы ад бацькоў чулі. Але мала верылі, бо нам у школе гэтага ня кажуць". Гэта быў апошні ліст. Відаць, школьныя ўлады пісаць дзецям да мяне забаранілі. А вось Мясоцкая школа і яшчэ школа ў Празароках імя І. Буйніцкага — гэта зусім іншае.

Вельмі хочацца выпаўніць сваю абяцанку: напісаць для Вас "Старое Гродна", ілюстраванае копіямі старых паштовак. Ці ўдасца? Я рада, што ў Гродна хоць адна "Заранка" трапіла. А "Беларускай борці" німа? У Гродзеншчыне "Борць" мела шмат падпісчыкаў.

Выбачайце за хаос і невыразны почырк. Увесь час дрэнна чуюся. Цалую сардэчна! Да пабачэньня! *Л. Войцікава.*

177. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

29 жніўня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Уцешыў мяне Ваш ліст і абяцаньне адведаць мяне, і то разам з жонкай. Буду вельмі рада. Каб толькі неяк датрымацца, бо нешта нядобра (слаба) чуюся. А можа, проста пачатак восені так дзіць? Пабачым.

Што да "Коласа беларускай нівы", хочучы-ня-хочучы, прыйшлося самой напісаць зусім кароткую інфармацыю. Няхай В. Скалабан сам пашырае, калі так упёрся, каб я пісала сама.

Крыху раней я пісала пра сваю дзейнасьць у рамках біялёгіі для энцыкляпэдыі "Прырода Беларусі" — на просьбу рэдактара Дзісько[1]. Ім спадабалася, вось і тут хацелі мяне выкарыстаць. Першы артыкул пісала з ахвотай, і ён удаўся, а другі? Ня ведаю, што з яго зробяць. Але Віталь Уладзіміравіч [Скалабан] упарты — з ім на сваім не паставіш. Сягодня адсылаю ім адказ на анкету.

Пару тыдняў таму былі ў мяне два этнографы, якія пішуць вялікую манаграфію "Беларускае пчалярства". Не ўяўляеце, як я рада, што Таварыства "Пчала", часопіс "Беларуская борць" паслужаць ім як матэр'ялы. Усё ж праца цэлага дзесяцігодзьдзя не загіне без карысьці. І людзі трапіліся надзвычай сымпатычныя.

Перайду да сваіх успамінаў аб ГГБМ. Дзівіць мяне, хто гэта мог быць — М.К.? Вы пішаце — М. Карповіч[2]? А ў які час ён мог быць у гуртку? Адкуль мог ведаць пра падзеі гуртка? У нас у 1909–1913 г. такога не было. Я маю групы

гуртка вялікага фармату, дзе ўсе прозьвішчы падпісаныя рукой Г. Леўчыка, калі я, прыехаўшы ў Варшаву ўвосені 1913 г., папрасіла яго павялічыць групы ў фатографа і запісаць прозьвішчы, пакуль усіх добра помню.

Усё, што я пішу ў сваіх успамінах,— адна чыстая праўда. Ні разу не было ў нас вечарыны на Вялікдзень. Першая была на пачатку 1910 г.— ставілі "Па рэвізіі" ў доме Салянкаў на Паліцэйскай вуліцы. З гэтым самым спэктаклем выяжджалі пару месяцаў пазьней у Сакольскі павет, у былы маёнтак майго прадзеда І. Кулакоўскага[3] — Крыштапарова. Другі спэктакль — "Модны шляхцюк" — ставілі на пачатку зімы 1911 г. І гэты самы "Модны шляхцюк" адыгралі ў Сакольшчыне ў маёнтку Дубніца. У 1912 г. зімой ставілі ў Гродне "Міхалку" Далецкіх[4] і мой пераклад з польскай (маю яго і цяпер) — "Варажба цыганкі".

А 4 кастрычніка 1912 г., у дзень імянінаў нашага кіраўніка кс. Ф. Грынкевіча, малодшая група ў нашым памяшканьні на Гараднічанскай вул. паставіла мой вершаваны пераклад "Пастушка". Былі дэклямацыі і жывыя вобразы. Зьмест "Пастушкі" помню вельмі добра, але слоў ня помню і рукапісу ня маю, бо ставілі гэтую сцэнку ў Ратамцы ў прытулку ў 1916 г. і мне не вярнулі тэксту. Вельмі шкадую.

Але — ніякіх "Страхаў" (ці ня "Страхі жыцьця" — Аляхновіча[5]?) ніколі ня ставілі і ня мелі. Ага, яшчэ на канцы 1912 г. рабілі ёлку для дзяцей у вёсцы Серуцёўцы. Аб чым нават была карэспандэнцыя ў "Нашай ніве". Яе летась знайшоў у газэце У. Содаль, перадрукаваў і прыслаў мне.

Мушу прызнацца, што вершаваны пераклад не даваўся лёгка, ды і ня вельмі быў гладкі. Але гэты добра пастаўлены абразок быў вельмі прыгожы візуальна. Нямала каштавала работа і выдаткі, каб у пакоі зрабіць кусочак лесу-хвайняку, а сярод яго — палянку, пакрытую мохам і чарнічнікам. Прычым, усё натуральнае, жывое. Апісаць — шмат часу зойме. Пабачымся — раскажу.

Учора перарвала ліст, бо прыехаў мастак Целеш. Яшчэ і сяньня пад вечар зойдзе. А я пакуль што стараюся хоць збольшага паадказываць на лісты.

Што да "Старога Гродна"[6] — ня кідаю думкі напісаць. Як выйдзе — гэта іншая справа. Але думак шмат. Многа жывых вобразаў ва ўзрокавай памяці. Каб толькі ўдалося выразіць тое, што "бачу", адпаведнымі словамі. Магчыма, дам крыху і ілюстрацыяў. Маю адпаведныя паштоўкі — трэба зрабіць копіі, а і В. Целеш абяцаў памагчы.

А я помню Гродна, падарожы ў горад з Сакольшчыны (коньмі 18 вёрст...) ад часу, як мне было 6 гадоў. Тады гэта быў для мяне вялікі горад. Жывучы на далёкай Украіне, вельмі тужыла мо ня столькі па Гродна, як па Нёмане і Альхоўніках — фальварку маміных бацькоў...

Усяго Вам найлепшага і ўсёй Вашай сям'і. Да пабачаньня! *Л. Войцікава.*

178. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

22 верасьня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Менш-больш усё ў парадку. Заглянула ў "Студэнцкую думку" — "Страхі" ёсьць. Але я абсалютна нічога ня помню. Гэта быў спэктакль малодшай сэкцыі. Відаць, не было чаго паставіць, і я — раз-два — пералажыла што трапілася ў рукі. Але ні перакладу ня маю, ні зьместу ня помню.

Зьмест "Пастушкі" раскажу, а нават пакажу здымак тых дзяцей, якія там

выступалі. А “Варажбу цыганкі” — маю, прачытаеце. Сьпісак публікацыяў маю, але адзін экзэмпляр. Значыцца, усё прыгатавала. Чакаю Вашага прыезду.

Да пабачаньня. *Л. Войцікава.*

179. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

9 кастрычніка 1982 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Так мы з Вамі да нічога не дагаварыліся. Ня ведаю, чаму Вы ня хочаце, каб мае ўспаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі (машынапіс) зрабіў Новік-Пяюн? Ён робіць вельмі акуратна і добра афармляе ў вокладку. І пасылаць ня трэба яму арыгіналу, бо ён мае ў сябе такі самы экзэмпляр, які рабіў для мяне (і для бібліятэкі рэдкіх друкаў пры Беларускай Акадэміі навук).

Зразумела, ён здымкаў ня мае, і гэта яму трэба паслаць. У Лявона ёсьць яны на плёнцы. Але, магчыма, Ваш муж зрабіў бы лепш. Шкада, што ня скончылі мы нашай гутаркі на гэтую тэму. Нешта перашкодзіла... А як цяпер зрабіць? Пасылаць арыгіналы поштай баюся.

Арыгіналы ў альбоме, а тыя, пабольшаныя, гэта копіі, і то пашкоджаныя. З іх рабіць копіі немагчыма. Забылася я Вам даць даўна прыгатаваны рукапісны кусочак з успамінаў аб Максіме. Не хацела пасылаць поштай, каб не ламаць аркушы. А мо пакуль німа сьнегу, зможаце яшчэ прыехаць? Спакойна, не сьпяшаючыся, абгаворым усе справы.

Усё зьбіраюся пачаць пісаць “Старое Гродна”. Можна было б зрабіць ілюстрацыі копіямі старых паштовак. Некалькі маю сваіх, а яшчэ абяцаў даць мастак В. Целеш. Адну ўжо мне прывёз — якраз самае для мяне цікавае. Відаць на ёй: мая гімназія, старая кнігарня каля муроў Фарнага касьцёла і г.д. Якраз тое, што мне трэба. Каб толькі крыху лепш чуцца...

Усяго найлепшага! Цалую сардэчна. Ваша *Л. Войцікава.*

180. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

24 кастрычніка 1982 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Я ўжо Новіку-Пеюну напісала. Адказу яшчэ ня маю, але дагэтуль ён ніколі не адмаўляўся ад такой работы. Цяпер яшчэ трэба думаць аб здымках да “Гродзенскага гуртка”. “Нёману”[1] напішу — усё складаю ў адну папку. Што да Гродна — мне самой хацелася б пасьпяшыць з гэтай работай, бо мая галава штораз горш працуе. Мо зьдзівіцеся і не паверыце, але ў мяне ніколі німа чарнавікоў — пішу адразу, як бы экспромтам, і таму якраз для сябе мушу рабіць копіі, каб у мяне нейкі сьлед астаўся. Гэтакі я гультай ці што? Я толькі ў малодшых клясах пісала сачыненьне на чорна, а пазьней — ніколі.

“Гродна” я хацела б зрабіць ілюстраванае старымі паштоўкамі, г.зн. іх копіямі. Маю крыху сваіх, а цяпер яшчэ прывёз мне мастак В. Целеш[2]. Для мяне адна асабліва цікавая, бо на ёй ёсьць школа (гімназія), у якой я вучылася, а пры самых мурах Фары — кнігарня, у якой я часта бывала, як мне было

8–9 гадоў. В. Целеш яшчэ пару абяцаў прыслаць.

Ня помню, ці я Вам пісала, як паўстала ў мяне замалёўка "Нёману"? Гэта было ў Менску ў рэдакцыі "Вольнай Беларусі".

Я была б рада, калі б Вы прыехалі, як толькі скончацца Вашыя хатнія клопаты, якіх сапраўды ўжо лішне шмат на Вашую галаву. Вельмі спачуваю. Чаму я хацела б і Вас раней бачыць, і ўсе справы хоць збольшага скончыць? Я вельмі дрэнна чуюся. Можа, гэта ненармальнае надвор'е так дзеіць, але ледзь хаджу, уся збалеўшая — ад галавы да ног. Гэта раз. Па-другое, дарога добрая, пакуль німа сьнегу. Як падае сьнег, па той шырокай дарозе ніхто ня ходзіць, і сьлядоў німа. Ходзіцца вузкай дарогай, і падыходзіць яна да нас з іншага боку. Вось тут і клопат.

Як гэта сталася, што Вас німа на ніводным здымку? Здымкі выйшлі добра, а Вас нідзе німа. Ведаю, што Вы і самі фатаграфавалі, але што з таго? Вас жа таксама там не відаць. Вельмі гэта непрыемна.

2 кастрычніка ізноў былі ў нас госьці, але гэта ўжо мясцовыя, віленчукі. Тыя самыя, што і кожны год. Але, праўда, адзін госьць далёкі, з Рыгі — мастак В. Целеш.

Але гэта ўсё пустая гутарка — трэба яе канчаць, і пара легчы. Можа, памаленьку да гадзіны 3–4 раніцы ўсе болі ўспакояцца, і змагу заснуць. Дачка мая адчувае тыя самыя болі, але старому цяжэй іх цярпець. Былі нейкія 4 дні лягчэйшыя, бо я не была адна. Унук дастаў пару дзён вольных на рабоце, бо ў яго 27 кастрычніка — кандыдацкі экзамін па філязофіі. Цэлымі днямі вучыўся, але ўсё ж быў удома. Ад заўтра пачынаецца старая гісторыя: гадзін 8, а то і болей, я ўдома адна. Толькі з катамі.

Цалую сардэчна. Калі што, пішыце. Усяго найлепшага. *Ваша Л. Войцікава.*

181. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

8 лістапада 1982 г. Вільня

Даражэнькая Ларыса Антонаўна.

Дзякую Вам за ліст, хоць сумны ён, вельмі сумны. Душа баліць, што нельга нічога зрабіць, німа як і чым памагчы. Гэта могуць зрабіць толькі "вялікія дзеячы", але...

Дзеячы вялікія, але сэрцы ў іх малыя і цьвёрдыя. Як я Вас разумею! Мне, праўда, ніхто ня робіць прыкрасьцяў, і апякуюцца і спагадаюць — і чужыя і свае. Але пры ўсім гэтым і я адзінокая, бо глухая. Не аканчальна, нешта яшчэ крыху чую, але як гавораць — ня чую. Мне ўсё трэба пісаць. А каму гэта хочацца? Чужыя госьці да гэтага гатовыя, але ўдома...

У апошнім выпадку, калі трэба, напішуць. Але ж гэта ня гутарка, не абмен думкамі. А калі гавораць паміж сабой, расказываюць сабе што, я нічога не разумею і адчуваю сябе нейкім дурнем.

Тое самае — пры гасьцях. Недарма кажуць: "Што дурны, што глухі — адно". Так і пры гасьцях. З аднаго боку, удзячная за ўвагу, прыемна бачыць сымпатычныя і спрыяючыя асобы, а з другога — чуешся нейкім выкідышам з асяродзьдзя. А ведаеце, калі я найлепш чуюся? Удваіх са Слаўкам! Няшмат гаворым, але ён неяк умее са мной паразумецца. Гаворыць быццам нармальна, не стараецца голасна вельмі, а я, відаць, неяк інтуітыўна яго разумею. Сама дзіўлюся, як гэта можа быць? Слоў ня чую (нармальна), а — разумею. Ён часта, як я лягу

раней яго (бо бывае наадварот), сядзе хоць на хвілінку каля мяне на крэсьле і хоць крышку аб чым-небудзь пагаворыць. Гэтак рабіў заўсёды мой с.п. Тонік.

Апрача таго, што ня чую, мне страшна гудзіць у галаве. Трэск, піск, шум, а часам — быццам над галавой верталёт ляціць. І гэтак — дзень і ноч. А фізычна? Што ж, баліць галава — то менш, то больш, але амаль стала баляць ногі, усе косьці. Мяне таксама трымаюць уколы. Прыняла 30 cocarboxylar'у, а цяпер чакае 30 АТФ. Робіць іх дачка, у апошні час — Слаўка. Ну, але хопіць. Не паможа, а толькі Вас знэрвуе, бо ведаю, што ўмееце спачуваць.

Аб дні юбілею ня буду нічога пісаць, бо п. Дануся [Бічэль], напэўна, усё расказала. А 2 кастрычніка, у суботу, была другая частка — віленскія знаёмыя, тыя, што і кожны год. Праўда, не было Маслоўскай (сваячкі Танка) і Жэні Лобан — яе сяброўкі па Віленскай Бел[арускай] гімназіі. (Яны былі гадзінку раніцай 30 верасьня, бо інакш не маглі.) Не было і старога знаёмага, былога рэдактара часапісі "Шлях моладзі" Янкі Багдановіча. Ён хворы, у шпіталі пасьля апэрацыі горла, апрача таго, амаль асьлеп, апэрацыю вачэй прабавалі рабіць, але не ўдалося. І гэта было прыкра.

А чым прыймалі? Гэта ўжо заслуга зяця. Ён мае знаёмага электрыка на мясакамбінаце і дастаў (як кажуць, па блату) 2 языкі, нешта вэнджанае, добрай сьвініны і добрага валовага мяса. Галя зварыла расол, да гэтага — пірог з салодкай капустай, сьвіныя адбіўныя. Да мяса: памідоры, агуркі маласольныя, салатка са сьвежых агуркоў.

Увечары — рознае мяса, сыр (жоўты, бо аб белым ужо забыліся, які ён), торт (ад гасьцей), яблычны сыр. У суботу — нешта падобнае, добра ня помню, торт купілі самі. Галя намучылася. Мне не давала нічога рабіць, а Слаўка прыйшоў пасьля работы. Другі раз, у суботу, было ёй лягчэй, бо Слаўка быў удома, а ён майстар на ўсе рукі, усё ўмее і ўсё можа.

Ага, у суботу прыяжджаў з Рыгі мастак В. Целеш. Зрабіў мой невялікі партрэт паводле здымка з 1911 г., дзе я — Ганка з камэдыі Каганца "Модны шляхцюк" — у беларускім нацыянальным касьцюме. Прывёз ужо ў рамцы пад шклом. Атрымала шмат павіншаваньняў, тэлеграмаў. Нават ад нейкага зусім незнаёмага беларуса з Віцебска.

Пішаце, што наглядзеліся на мяне маладую ў "Голасе Радзімы"? Гэта Сяргей Панізнік даў зрабіць з адной маленькай групы, дзе я з сябрамі Гродзенскага гуртка перад выездам з Гродна. Зрабіў адну копію даволі вялікага разьмеру і прасіў падпісаць яму. А што дасьць такі здымак у "Голас Радзімы", я і ня ведала.

Маем тут у Вільні мастака-ткача[1], тчэ цудоўныя паяскі з самымі рознымі беларускімі матывамі. Я ўжо мела ад яго пару паясоў — даўгіх, шырокіх, а сёлета атрымала з вытканым надпісам: "Зоська Верас — 90". Гэты пояс завязалі мне праз грудзі, але так нязручна — не відаць на здымку цыфры 90. Пасылаю Вам такі здымак — паглядзіце і на старую. Калі выпрашу ад зяця больш здымкаў групавых з гасьцямі, абавязкова Вам пашлю. Праўда, Лявон зрабіў копіяў нямала і разаслаў усім удзельнікам, але ж я маю і свае патрэбы, і сваіх блізкіх, каму хацела б пасланць.

І я цяпер даўна ня маю вестак з Польшчы. А ўжо было наладзілася добра. А можа б, Вашы ўнукі напісалі на мой адрас, а я пераслала б Вам, улажыўшы ў іншую капэрту, бо мае лісты да Вас даходзяць добра, так як і Вашы да мяне. Як думаеце, можа, папрабаваць?

Мне З. Абрамовіч пасьля свайго 90-годзьдзя прыслаў цэлую газэту (заказным), у якой быў артыкул-інтэрв'ю з ім нейкай польскай журналісткі. Газэта дайшла. Але ён там нагаварыў такога, што ■ яму даволі востра напісала. Сказаў, быццам у Гродне належаў да польска-беларускага гуртка, калі наш гурток быў чыста і выключна беларускі. Не прызнаўся да сваяцтва з Фр. Багушэвічам і яшчэ іншае...

Напісала, што я аб гэтым думаю, і запыталася, ці ён помніць верш Г. Леўчыка "Хто адрокся сваіх"? Відаць, пакрыўдзіўся, бо больш ня піша і мяне на 90-годзьдзе не павіншаваў. Такі канец больш як 70-гадовага знаёмства.

У канцы — такая да Вас справа. У Слоніме, у адной школе (нумару яе ня ведаю) выкладчык беларускай мовы і літаратуры стараецца стварыць школьны музэй "Літаратурная Слонімшчына". Алесь Мікалаевіч [Белакоз] яго падтрымлівае. Той выкладчык пісаў да мяне. Я абяцала даць усё, што ў сябе адпаведнае знайду, зьвязала яго з Нінай Аляксандраўнай Ляшковіч — былой працаўніцай архіваў.

Я падумала, мо Вы захочаце чым памагчы? Ахвяраваць што са сваей бібліятэкі. Гэта для дабра бел[арускай] справы, беларускай моладзі. Я думаю, што яго добрую волю трэба падтрымаць. Як Вы думаеце? Прозьвішча гэтага выкладчыка — Сідаровіч Мікалай Лявонцевіч[2]. А мо Вы яго ведаеце?

Мушу канчаць, бо яшчэ ляжыць 8 лістоў. Хоць бы на адзін яшчэ адказаць. Усяго Вам найлепшага! Каб успакоіліся ўсе мясцовыя злыдні, далі Вам жыць. Цалую сардэчна. Ад маіх — шчырае прывітаньне. Ваша *Л.В.*

182. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

12 лістапада 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. І я падумала аб тым, што нам з Вамі ані пагаварыць не ўдалося, ані перагледзець маіх перакладаў. "Варажба цыганкі" — перапрабленая для сцэны навэля Крашэўскага[1] "Chata za wsią"[2] пад загалоўкам "Цыганка Аза". Не змагла я Вам расказаць і зьместу "Пастушкі". А гэта ўсё трэба зрабіць, і то ня вельмі адкладаючы. Мо ў зімовыя канікулы зможаце прыехаць? Зьмест "Пастушкі" зьбіраюся апісаць дакладна. Тэксту, вядома, ня помню.

Няўжо я Вам не пісала, што гэты сцэнічны абразок вершаваны? А вось што такое "Страхі" — абсалютна ня помню. Ва ўспамінах аб ГГБМ — на старонках "Студэнцкай думкі", год 1925 — аб тым, што малодшая сэкцыя ставіла "Страхі" ў маім перакладзе — ёсьць. А калі я ў 60-я гады пачала якраз з ГГБМ пісаць свае агульныя "Успаміны" — чамусьці на напісанае раней не зьвярнула ўвагі, а пісала з памяці і аб "Страхах" забылася.

Я вельмі ўдзячная С.С. Панізьніку за "Сірату" — я аб гэтым перакладзе таксама ня помніла. А ў "Заранцы" ў 1929 годзе — люты-сакавік — зьмешчаны каталёг кніжак для дзяцей, і ў ім асобна "Сцэнічныя творы": П. Салаўёў — "Цудоўная ноч" (лацінкай), Малады Дзядок[3] — "Елка Дзеда Мароза", Ю. Ігарава — "Сірата", Р. Завадовіч[4] — "Князь Марцыпан". Мая памылка як рэдактара, што не пададзена прозьвішча перакладчыка, і з якой мовы пераклад. "Князь Марцыпан" — з украінскай, таксама мой пераклад, гэта маю.

А "Сірату", паводле С.С. Панізьніка, ставілі ў Дзьвінскай Бел[арускай] гімназіі. Рэжысэраваў дырэктар Рыжскага Беларускага тэатру Язэп Камаржынскі[5]. (Сяр-

гей Сьцяпанавіч [Панізьнік] абяцаў прыслаць дадатковыя весткі.) "Сірата" магла трапіць у яго рукі з Рыжскай пачатковай школы, бо "Заранка" мела з гэтай школай сталую і сардэчную сувязь.

Атрымала я ліст ад Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага. Прыслаў цікавую для мяне вестку: калі ў 1840-х гадах выходзіў у Пецярбургу альманах Яна Баршчэўскага[6] "Незабудка", сярод яго падпісчыкаў быў і мой прадзед Ігнат Кулакоўскі! Цяпер, як кажуць, я ўдома. Разумею, што маё далучэньне да беларускага руху — гэта проста спадчына па прадзеду.

Кніжкі прафэсара Няфёда[7] я ня маю. А весткі пра ГГБМ ён мае проста ад мяне. Бо некалькі разоў пісаў, пытаўся аб гурток і першыя крокі У. Галубка, бо я тады была ў Менску. Артыкул М. Карповіча нехта выкарыстаў для Бел[арускай] сав[ецкай] энцыкляпэдыі — у рэдакцыі культуры і мастацтва. Прыслалі мне на візу. Перадусім зьвярнула ім увагу, што гурток ніколі не называлі драматычным, бо спэктаклі былі толькі адной з галінаў яго дзейнасьці. Прасілі расшыфраваць ініцыялы. Я гэта ўсё зрабіла і дадала да ліку сяброў Язэпа Лявіцкага і Адольфа Зенюка.

Трэба закончыць гутарку, бо яшчэ мушу адказаць на ліст Генадзя Аляксандравіча [Каханоўскага], а дачка зараз выходзіць.

Ага, ці Вы ўжо атрымалі здымкі з таго юбілейнага дня? Зяць іх выслаў (калі — ня ведаю) і меў прасіць перадаць дадатковыя экзэмпляры тым, чыіх адрасоў ня маем. Выбачайце за клопат, але не было іншай рады.

Як здароўе Вашай жонкі? Ці ўжо ўдома? Усяго найлепшага! Шчыра вітаю — *Л. Войцікава.*

183. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

30 лістапада 1982 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Аж у сэрца закалола, як даведалася, што ў Вас такая нядобрая хвароба. Не пачалася яна, хіба, так гвалтоўна адразу, а мусілі быць нейкія сымптомы раней. Ці ляжыце ўдома, ці ў шпіталі? Калі ўдома, то хто Вас даглядае? Мужу, хіба, гэта цяжка рабіць.

Я па-старому доўга бываю адна, што ў гэтую пару — кароткі дзень, хмарна і цёмна — ня вельмі прыемна і адбіваецца на нэрвах.

Цяпер у Вільні Сяргей Сьцяпанавіч Панізьнік. Ізноў знайшоў мае публікацыі, аб якіх я зусім забылася, і нават у маіх сьпісках іх німа. Але рукапісы ў мяне ёсьць, толькі я ня помніла, што гэтыя рэчы (дзіцячыя) друкаваліся. Заўсёды прыемна, калі хто загляне і нешта новае ўнясе ў жыцьцё.

Шчыра дзякую за здымкі — добра выйшлі. Мяне ізноў засыпалі лістамі, не магу з імі даць рады. Тым больш, што пераважна з рознымі пытаньнямі. Але з другога боку гэта добра — ёсьць хоць маленькая карысьць з жыцьця.

Сяньня атрымала ліст ад Арсеня Сяргеевіча Ліса. Піша, што езьдзіў разам з мастакамі на магілу Я. Драздовіча. Паставілі помнік і адчынілі музэй этнаграфічна-мастацкі ў саўгасе, у былой капліцы Плятэраў[1]. Гэта добрая падзея.

Ня буду Вас больш мучыць. Але буду непакоіцца станам Вашага здароўя і прашу ў трох словах паведаміць, як цяпер чуецеся.

Шчыра цалую і зычу палепшаньня. *Л. Войцікава.*

184. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

14 сьнежня 1982 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ужо маю трэцюю вестку ад Дануты Іванаўны [Бічэль] са шпіталя. І я да яе пішу. Але ведаю, што ёй пісаць цяжка, таму не пытаюся, што падчас яе хваробы робіцца з Домам-музэем М. Багдановіча. Ці ёсьць каму даглядаць, калі ўжо не вясьці працу далей?

Калі б пабачылі адпаведныя людзі, што там німа належнай апекі, маглі б забраць памяшканьне. Ці ня думаеце, што гэта магчыма?

Калі ўважаеце за патрэбнае, унясіце ў сьпісак маіх твораў яшчэ 2 пазыцыі: 1) легенда "Ластаўка"; 2) маленькае апавяданьне "Канвалія". Яны друкаваліся ў выданым "Беларускай крыніцай" у Вільні, год ці не 1927, зборнічку для дзяцей "Sadok dla našych dzietak ". Гэтую знаходку маю ізноў дзякуючы Сяргею Сьцяпанавічу Панізьніку.

Я рукапісы гэтых драбніц маю, а што яны друкаваліся — зусім ня помніла. Хоць да Новага году яшчэ кусок часу, але пры аказіі сяньня высылаю павіншаваньне. Вельмі цікава, што ён нам прынясе новага? І што добрага?

Усяго найлепшага! Прывітаньне п. Марыі. *Л. Войцікава.*

185. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

4 студзеня 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ляжыць добры дзясятак лістоў з перад-Новага году, на якія аніяк не зьбяруся адказаць. Абвастрылася старая хвароба страўніка... Болі не даюць сядзець, не даюць нічога рабіць. Баюся, што з маіх задумаў ужо нічога ня будзе.

Вам хачу адказаць хоць на самае галоўнае. "Сірата", "Князь Марцыпан" выйшлі з друку ў 1929 г. Выданьне "Заранкі". На вокладцы "Князя Марцыпана" пастаўлена і прозьвішча (псэўданім) перакладчыка — *З. Верас*. На "Сіраце", здаецца, таксама. Ня маю "Сіраты" ў сябе, бо з "Сіраты" і з "Малюнкаў" Машары меліся зрабіць копіі на "Эры". Зяць узяў, каб зрабіць. Тым часам "Эра" (на рабоце ў зяця) чамусьці не працуе, а зяць паміма таго, што я дамагаюся, каб кніжачкі аднёс мне, бо такая драбяза можа згубіцца, не прыносіць іх.

Пераклад твору В. Біянкі[1] "Лясныя хаткі" выйшаў у 1931 г. Перакладчык не адзначаны. Выдавецтва — "Жаночае т[аварыст]ва імені Цёткі". Тыя драбніцы — верш "Што я люблю", легенда "Ластаўка", абразок "Канвалея" — гэта не пераклады, а мае ўласныя. "Ластаўка" — легенда з запісаў М. Федароўскага ("Lud Białoruski"), мая апрацоўка. Яшчэ 2 легенды з М. Федароўскага — "Скуль узяліся асіны і бярозы" ("Заранка") і "Скуль узяліся пчолы" ("Бел[аруская] борць"). А "Канвалея" была напісана па-расейску *("Ландыш")* яшчэ ў 1906 г. (мне было 14 гадоў) для школьнай часапісі "Подснежник" у Кіеве (тады ■ там вучылася), а пасьля я гэта самае напісала па-беларуску.

Што да ГГБМ — гэта проста непаразуменьне. Мне, калі атрымала артыкул з энцыкляпэдыі на візу, чамусьці не прыйшло ў галаву, што гэта пісаць маглі Вы. А дзеля таго, што больш ніхто аб ГГБМ дэталяў ня ведаў, падумалася, што нехта пакарыстаўся артыкулам Карповіча. Вось уся загадка.

Ад Дануты Бічэль я ўжо весткі мела — і са шпіталя, і ўжо з дому. А вось Ла-

рыса Антонаўна [Геніюш] нешта доўга маўчыць. Ці ня хворая?

Напісала я зьмест “Пастушкі”, і як яе ставілі. Тэксту, зразумела, ня помню. А здымкі тагачасныя маладзенькіх артыстаў маю. Сама сябе абвінавачываю, што пасьля таго, як паставілі “Пастушку” ў Ратамцы, рукапісу адразу не забрала. Так і загінуў.

Цяпер адно, што пасьпела зрабіць,— гэта напісаць жыцьцяпісы Грынкевічаў: кс. Францішка і др. Станіслава. І адаслаць іх пляменьніку ў Варшаву. Аб гэта мяне даўна прасілі іх сваякі: пляменьнік, які жыве ў Варшаве, сын др. Станіслава ў Эльблёнгу і далейшы сваяк Казімір Грынкевіч у Новым Двары. Той, што ў Варшаве, перадрукуе на машынцы і разашле іншым. Аж лягчэй зрабілася, што выканала просьбу. Доктара Станіслава маю біяграфію і багатую бібліяграфію па-беларуску. А для тых, хто ў Польшчы, прыйшлося перакладаць на польскую мову. Толькі той, што ў Новым Двары (яму 78 гадоў), чытае і стала да мяне піша па-беларуску.

Падумала, што жыцьцяпіс і бібліяграфія др. С. Грынкевіча — псыхіятра-нэўроляга — і Вас бы зацікавіла. Але гэта ўжо калі зможаце хоць на адзін дзень прыехаць. Перапісываць — ня дам рады.

Як жа цяпер маецца Ваша жонка? Што так пашкодзіла, што аж 2 месяцы сэрца дакучала?

Усяго Вам найлепшага. *Л. Войцікава.*

186. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

10 студзеня 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Як бачыце, не даю Вам спакою — ізноў пішу. На гэты раз у справе Канстанцыі Буйло. Як мы толькі пачалі з ёю перапісывацца — дзьве апошнія “нашаніўкі” — яна мяне паведаміла, што яе малодшая сястра Станіслава[1] на пачатку 20 гадоў працавала ў Гродне ў дзіцячым прытулку, выйшла замуж быццам за дырэктара Беларускай гімназіі і ў хуткім часе памёрла ад сухотаў. Бедавала, што нават ня ведае, дзе сястра пахаваная.

Пры сустрэчы з с.п. др. Марцінчыкам [redacted] яму аб гэтым расказала, і ён ахвяраваўся шукаць магілу. К. Буйло нават ня ведала прозьвішча таго дырэктара. А дырэктар быў адзін — Тамашчык[2]. Гэтага прозьвішча др. М[арцінчы]к і шукаў. Магілу Тамашчыка знайшоў. Побач пахаваная яго жонка, але зусім не Станіслава, нехта іншы. Так нічога і ня выйшла.

Цяпер супрацоўніца “Голасу Радзімы” Дз. Чаркасава[3] піша кніжку пра жыцьцё К. Буйло. Каб сабраць усе факты яе жыцьця, кантактуецца з ёю стала па тэлефоне. Лістоўна з Буйлянкай, як я яе па-старому называю, паразумецца цяжка. Яна ўсё хварэе — рэўматызм, радыкуліт і г.д.— піша рэдка і коратка. Ізноў паўстала пытаньне аб магіле Станіславы Буйло. Цяпер высьветлілася, што Стася прозьвішча *не мяняла* і, мабыць, пахаваная пад сваім дзявочым.

Я крыху на Буйлянку злуюся. Чаму не было сказаць адразу ясна і прасіць чалавека (яна з др. М[арцінчы]кам сама перапісывалася) шукаць тое, што трэба? Не маладзенькі ж ён, быў і хворы. Цяпер Дз. Чаркасава піша мне, просіць падумаць, што можна зрабіць, як адшукаць тую магілу? А ці наагул яна яшчэ існуе? Зразумела, я асабіста нічога зрабіць не магу.

Падумала, што бывае моладзь, якая ахвотна вядзе пошукі, а ў гэтым вы-

падку, каб зрабіць прыслугу старой паэтцы, можа, хто і знойдзецца? Ці не захацелі б Вы кінуць гэтай думкі паміж студэнтаў? Буду чакаць Вашага адказу.

Учора быў у мяне Уладзімір Скарынкін[4] (паэт) з жонкай і дачкой. Хоць я чулася якраз даволі дрэнна, але рада была б гасьцям, калі б не прывязьлі такую цяжкую, страшную вестку: памёр ад інфаркту Алесь Бачыла. Мяне як абухом па галаве дало. Перад самым Новым годам атрымала ад яго ліст. Як заўсёды, пісаў аб тым, чым займаецца, што піша, якія мае пляны надалей.

І вось — німа чалавека. Не магу ўспакоіцца — шмат гадоў знаёмства, перапіска, шмат кніжак з аўтографамі. Ён быў на 1 год старэйшы ад майго сына. Як прыяжджаў, разам хадзілі па Вільні, адведывалі могілкі. Сын мой паказываў яму магілы беларускіх пісьменьнікаў, дзеячоў. Знаходзілі супольную мову. А я заўсёды любіла вершы А. Бачылы, іх натуральнасьць, спакой і чалавечнасьць. А мо Вы ўжо ведалі без мяне аб гэтай трагічнай страце? Памёр 4.01, хавалі 5-га. Чаму так хутка — ня ведаю.

Апошні час, калі пішу каму, ня маю ніякай пэўнасьці, ці ліст мой дойдзе да адрасата і ці атрымаю адказ. Немагчыма гінуць лісты — і мае, і да мяне. Камусьці мая карэспандэнцыя перашкаджае. А, можа, проста балаган на Віленскай пошце. Тут, напрыклад, ніколі ня ставяць штампаў на атрыманых лістах. Можа ліст валяцца на пошце тыднямі, а раз штампу німа, ніхто праўды ня ведае, калі ліст прыйшоў.

Але канчаю. Займаю стол, а пара вячэраць. Усяго найлепшага! Прывітаньне пані Марыі. *Л.В.*

187. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

23 студзеня 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Пачынаю ад ГГБМ. Вучні гімназіяў і інш. школаў ня мелі права належаць да ніякіх арганізацыяў, гурткоў, клюбаў і г.д. Прадстаўнікі гімназіяў, гэтак званыя пэдэлі, наведваліся нават у прыватныя кватэры, дзе вучні жылі з бацькамі і, зразумела, у кватэры, дзе трымалі большую колькасьць вучняў. На шчасьце для ГГБМ, да нас, дзе жыло па 8 вучняў адначасна, праз 4 гады ніхто ні разу не прыходзіў. Мая мама мела дазвол на вучнёўскую кватэру ад уладаў і, відаць, як удава капітана заслугоўвала на давер.

Карыстаючыся з гэтага, у нас стала зьбіраліся сябры ГГБМ — на рэпэтыцыі, лекцыі, па кніжкі, бо і бібліятэку гуртка я ў сябе трымала. А то і так без усялякай прычыны заўсёды было поўна нашых сяброў. Мама мая толькі малодшых пыталася, ці прыгатавалі лекцыі, і падганяла, каб ня трацілі часу. Калі дапозна чым-небудзь былі занятыя, то і гарбату даставалі ўсе разам са сталымі кватарантамі.

Горш было польскаму гуртку. Было такое (таксама нелегальнае) “Polskie koło samokształcenia”[1], якое паўстала на 3–4 гады раней ГГБМ. Яны ня мелі адпаведнай кватэры на сталыя сустрэчы і кожны раз мусялі шукаць сабе нейкае памяшканьне. Часам і ў нас зьбіраўся хор на рэпэтыцыі, а то раз і вечарыну зрабілі ў нас на Гараднічанскай. Як ведаеце з маіх успамінаў аб ГГБМ, наш старшыня Адам Бычкоўскі і я былі сябрамі “Polskiego koła...”. Карысталіся іх бібліятэкай (трымалі яе ў кватэры аднаго з сяброў на паліцах, замаскаваных шафамі), бывалі ў іх на вечарынках, так як і яны ў нас. Адносіны былі паміж намі шчырыя.

Як я прыехала ў Вільню, то якраз былы старшыня "Polskiego koła..." быў віцэ-ваяводай Вільні. Мы часта спатыкаліся на вуліцы, бо ён жыў на Астрабрамскай, недалёка "Беларускай кнігарні". Заўсёды вітаўся, кажучы: "Dzień dobry, koleżanko". Я нават раз зьвярталася да яго ў справе Тав[арыст]ва "Пчала", і ён памог мне добрай радай...

Маю перад сабой Ваш ліст і адказываю па парадку. Кіеўская школьная часапіс "Подснежник" не была рукапіснай. Артыкулы перапісывалі на машынцы, давалі ілюстрацыі (работы саміх вучаніцаў), а пасьля адбівалі на нейкім апараце ў родзе цяперашняй "Эры". Добра ня ведаю, бо да тэхнічнай групы не належала. Я вельмі хачу пазнаёміць Вас як пэдагога з "Подснежником", гэта была часапіс з году ў год паважнейшая, багата ілюстраваная рысункамі і фатаграфіямі (у школе быў фатаграфічны гурток і лябараторыя).

Я выехала з Кіева, скончыўшы 4 кл., але мне "Подснежник" прысылалі аж пакуль мая кляса ня скончыла школы. І лістоў шмат маю. Пісалі ня толькі каляжанкі, але і наша г.зв. клясная дама (выхавацелька), якая была дачкой дырэктара. Я неяк паказывала "Подснежник" і расказывала аб той школе Саламевічу. Ён быў вельмі зацікаўлены і — зьдзіўлены. "Цяпер,— кажа,— такіх школаў і такіх адносін німа".

Ведаеце што, калі Вам нічога важнага не перашкодзіць, адшкадуйце адзін дзень падчас зімовых (ці веснавых) канікулаў — прыедзьце. Шмат аб чым можна яшчэ пагаварыць, разглядзець. А я, каб няведама як шанавалася, на доўгі час разьлічваць не магу.

Дзякую за пэўную надзею ў справе Станіславы Буйло. Я нядаўна мела ліст ад Канстанцыі Буйло — паважна хварэе. Лекары хочуць палажыць у шпіталь, а яна не згаджаецца.

Учора атрымала вестку ад Ларысы Антонаўны [Геніюш]. Вельмі ёй цяжка без апекі. Піша і аб Дануце Б[ічэль]. Там то ўжо зусім, здаецца, справа безнадзейная. Хвораму то канец мукаў, а для сям'і трагедыя...

А яшчэ гэтыя хваробы у сям'і Загнетавых[2] зусім спынілі працу для гродзенскага музэю Багдановіча. Данута Іванаўна дамовілася з Н.А. Ляшковіч (працаўніца віленскіх архіваў), што прыедзе ў студні і пры дапамозе Ніны Алякс[андраўны] будзе шукаць патрэбных матэр'ялаў. Цяпер усё прапала. А будучыня музэю, відаць, вельмі невыразная. Ваш гродзенскі кампазытар А.К. Шыдлоўскі[3] пісаў у Менск да Я. Хвораста, прасіў памагчы якімі экспанатамі, бо калі іх не зьбярэцца, музэю не адчыняць...

А тут і я дагэтуль нічога не магла зрабіць. Маю пару драбніц прыгатаваных і, як абяцала, думала даць успаміны аб гуртку з фатаграфіямі. Копію гэтых успамінаў меўся зрабіць С. Новік-Пяюн. Я і здымкі паслала. Тым часам з ім няшчасьце. Можа, Вы чулі ўжо — страціў на вуліцы прытомнасьць, упаў, разьбіў галаву, бок, рукі, ногі... Ляжаў удома без апекі. Пляменьнік адвёз яго ў Слонім да сястры. Адзін раз некалькі слоў напісаў, а цяпер ані да мяне, ані ў Менск да прыяцеля ня піша. На яго работу цяпер надзеі німа.

Можа, як удасца папрасіць зяця, каб зрабіў копіі. Мне патрэбныя дзьве, бо адну — у Гродна, а другую — у Слонім, у школьны музэй. Вядома, афармленьне будзе ўжо ня тое, але што рабіць?

Хачу запытацца ў Вас адну рэч. Я маю ў сябе машынапіс сцэнічнага твору "У сваты", напісанага Адамам Бычкоўскім у Гродне ў 1910 г. Ці варта гэта даць у музэй? Разам з успамінамі аб ГГБМ. Для мяне гэта памятка, але пасьля мяне

каго яна зацікавіць? А я гэтую рэч дастала ўжо пасьля сьмерці А. Бычкоўскага — ад Пятра Ластаўкі.

Але хопіць. Зараз яшчэ перапішу жыцьцяпіс кс. Фр. Грынкевіча і мушу адказаць на ліст беларуса-віленчука, які жыве ў Польшчы і прыслаў мне вельмі цікавыя кніжкі, выданыя ў Беластоку. Кніжкі беларускія.

Усяго найлепшага! Прывітаньне пані Марыі. Шчыра прыязная *Л. Войцікава.*

188. ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

25 студзеня 1983 г. Вільня

Дарагая Ларыса Антонаўна.

Дзякую за зьмястоўны ліст. Шмат у ім сумнага, шмат трывожнага, а найгорш тое, што пры найлепшым жаданьні нельга даць ніякай рады. Добра разумею Ваша самотнае існаваньне. У госьці пайсьці ці прыняць у сябе, вясельле — гэта прыемныя падзеі і даюць магчымасьць хоць на некалькі гадзін адарвацца ад рэчаіснасьці. Але але самотныя дні ды ночы, асабліва калі чалавек хворы, вельмі цяжка ператрываць, ня маючы пры сабе блізкай душы.

Пішаце, што я маю пры сабе сваіх? Вядома, гэта шчасьце, але якое яно часам бывае горкае пры маім калецтве (глухаце) ... Ці ім хочацца дастасоўвацца да мяне? У іх свае справы, свае думкі, якімі могуць дзяліцца між сабой. А я — чалавек пабочны, ды і мае справы (весткі, лісты) не заўсёды іх цікавяць. Хоць Галя заўсёды пытаецца, хто што піша, а Лявон з прыемнасьцю перачытываў бы ўсе мае лісты... А я не люблю кантролю і крытыкі.

Слаўка вельмі мала цікавіцца беларускімі справамі, і гэта мне баліць, але я яго разумею. Улюбёная праца ў экспэрымэнтальным інстытуце, канфэрэнцыі ў розных гарадах СССР, дзе пасьля друкуюць яго работы (мае іх у друку 16–17). Цяпер некалькі месяцаў хадзіў на ўнівэрсытэт (не кідаючы работы) — дзеля павышэньня кваліфікацыі, напісаў дыплёмную работу на “выдатна”. А цяпер піша дысэртацыю.

Другі яго конік — сад. Выпісывае, вышуквае ў знаёмых энтузыястаўсадоўнікаў шчэпы новых адменаў яблыкаў, грушак, сьлівак, каб вясной прышчапіць у сябе. Дзе ж тут мейсца і час на беларускія клопаты? Часам што прачытае, перагледзіць часапісі. Але гаворыць чыста, прыгожай мовай. І гэта добра, бо на рабоце і ў таварыстве сваіх калегаў гаворыць па-расейску, а найчасьцей — па-літоўску. І польскую мову ведае. У справах саду і агароду заўсёды са мной радзіцца, хоць цяпер ужо больш за мяне ведае.

Пытаецеся аб здароўе Галі? На жаль, нічога добрага сказаць нельга. Ходзіць да дактароў, прыймае лекі, але чуецца дрэнна. І ціск скача, і сэрца, і яшчэ нейкае жаночае недамаганьне. Найцяжэй тое, што яна вельмі скрытная. Ня любіць аб сваіх недамаганьнях гаварыць, дзяліцца. Бачу, што дрэнна чуецца, а запытаюся — адмахіваецца. У хаце раблю, што магу, хоць Галя стараецца і абед зварыць, і вымыць, што трэба. Але калі магу, то стараюся работу зрабіць без яе. Бо для мяне мець занятак — неабходна. Каб ня думаць, не перажываць, што было — ня вернецца. Але і забыцца ня так лёгка.

Дзякую Вам, што помніце, калі ў мяне самыя цяжкія дні. Спагадлівасьць заўсёды падтрымлівае на духу. Заўсёды ў гэтыя дні я атрымлівала адпаведны ліст ад Веры Андрэеўны, якая любіла і паважала майго с.п. Тоніка. Ня ведаю, ці ў гэтым годзе напіша.

Вельмі трывожыць сытуацыя ў Дануты Б[ічэль]. І яе нага, і стан здароўя яе мужа. Для хворага канец — гэта вызваленьне ад мукаў, але для сям'і — трагедыя.

А яшчэ ёсьць другі бок справы — грамадзкі. Пані Данута — адзіны чалавек, які ўкладаў сваю працу ў арганізацыю ў Гродне Музэю М. Багдановіча. У мяне на юбілеі яна пазнаёмілася з Нінай Александраўнай Ляшковіч — былым працаўніком віленскіх архіваў. Дамовіліся, што п. Данута прыедзе ў студні ў Вільню, каб пры помачы Н.А. шукаць у архівах патрэбных для музэяў матэр'ялаў. Цяпер, зразумела, усё гэта нерэальна. Тым часам гродзенскі кампазытар А.К. Шыдлоўскі пісаў да Я. Хвораста, прасіў дапамагчы экспанатамі, бо калі іх ня будзе дастаткова, музэю адчыніць не пазволяць.

Да ўсяго гэтага яшчэ адно няшчасьце — цяжкая хвароба Сяргея Новіка-Пеюна. Ня помню, ці я Вам пісала аб гэтым. С. Новік яшчэ ўвосені страціў на вуліцы прытомнасьць (сэрца), упаў, разьбіў моцна галаву, бок, пабіў рукі і ногі. Былі ў яго дактары-хірургі, аставілі ляжаць удома, а ў яго нікога німа, каб даглядаў. Пляменьнік адвёз яго ў Слонім да сястры. І вось адзін раз напісаў некалькі слоў, а цяпер ні да мяне, ні да свайго прыяцеля Янкі Хвораста — ні слова. Што з ім — няведама.

С. Новік перад выпадкам абяцаў зрабіць копію маіх успамінаў аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі і прыгожа, як гэта ён умее, аформіць для гродзенскага Музэю Багдановіча. Гэтай копіі (са здымкамі-групамі гуртка) чакала п. Данута. Цяпер усё затрымалася. Копію мог бы зрабіць і Лявон, але ці захоча? Ды і выгляд будзе ня той. Разам з успамінамі мелася даць у музэй яшчэ пару дробных рукапісаў. Данута пісала: не высылайце поштай, каб не ламаць аркушаў у капэрце, прыеду — забяру ўсё разам.

Доля музэю ў Гродне вельмі мяне хвалюе. Гэта ж ідзе ад Максіма Б[агдановіча] — яго дом, яго памяць. І што цяпер рабіць? Што парадзіць — ня ведаю. Гэта мучыць — такая бездапаможнасьць.

Можа, і сьмешна, што я такая страшна старая, ды і здароўя не найлепшага, усё ніяк не магу перастаць думаць, не магу навучыцца бязьдзейнасьці і перажываць страту знаёмых.

Цяпер не магу пагадзіцца з тым, што ўжо німа Алеся Бачылы. Столькі гадоў знаёмства, перапіскі! Цяпер толькі даведалася, што ён узяў на сябе рэдагаваньне майго зборніка, які выходзіць у выдавецтве "Юнацтва". Гэта зборнік маіх публікацыяў, што былі параскіданыя па розных часапісях. Цяпер гэтым заняўся Сяргей Панізьнік, заняўся шчыра і аддана.

Замучыцеся, чытаючы мае грымзолы. Канчаю. Пасылаю адзін здымак з юбілею, дзе ёсьць абое Шышэі. Пабачыце, як выглядаюць. Ад юбілею я іх ня бачыла. Цалую Вас сардэчна. Ад маіх — прывітаньне. Ваша *Л.В.*

189. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

7 лютага 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Выбачайце, што ізноў Вас турбую, але ня маю ў каго запытацца аб тое, што мяне непакоіць. Ізноў справа Станіславы Буйло. Атрымала я ліст ад Чаркасавай у гэтай справе. Піша, што прыяжджала ў Менск старая настаўніца (83 гады) Каліноўская, якая Стан. Б[уйло] ведала асабіста. Падае шмат фактаў, але вельмі блытаных. Падаю па чарзе:

1) у 1920 г. Стася напісала бацькам, што выйшла замуж; 2) Каліноўская

сьцьвярджае, што мужа ў Ст[асі]не было; 3) Апекаваўся Стасяй Сяргей Баранавых (яна піша — Баранаў[1]); 4) лячыў Ст[асю]нейкі доктар Бяляўскі; 5) ксёндз пахаваць Ст[асю] адмовіўся, бо яна была бальшавічка; 6) пахавалі ў цэнтры гораду на могілках, якія ўжо скасаваныя; 7) паставілі крыж з надпісам "Ст. Буйло" — меліся ставіць помнік; 8) Ст. Буйло працавала ў Бел[арускім] прытулку, які знаходзіўся ў Барыса-Глебскім манастыры...

Я ўжо нічога не разумею... Дзе ў цэнтры Гродна быў калі могільнік? І дзе — калі ён наагул быў — Барыса-Глебскі манастыр[2]? Могілкі і кляштар — гэта ж ня шпількі, што іх можна ня ўбачыць...

Мушу крыху сказаць аб сабе... Я, пачынаючы ад 6 месяцаў жыцьця, кожны год летам бывала ў сваіх дзядоў па бацьку (Міхал і Міхаліна Сівіцкія). Так да 1907 г. уключна.

Ад 1909 да 1913 г. уключна жыла ў Гродне стала. Ад 1919 да паловы 1923 г. бывала ў Гродне 1–2 разы ў месяц.

У гэты апошні пэрыяд бывала ў бел[арускай] арганізацыі і кожны раз у Рака-Міхайлоўскага. У арганізацыі спатыкала Паўлінку Мядзёлку, Тамаша Грыба, Дзекуць-Малея[3], Сяргея Баранавых... А таксама сваю сяброўку з Менска Алесю Ігнатаўну Смоліч, якая ў 1920–21 гадах выкладала ў Бел[арускай] гімназіі бел[арускую] мову і літаратуру (Рак-Міхайлоўскі выкладаў матэматыку).

З Алесяй Смоліч мы сьпісаліся ў 1960 г. і аж да яе сьмерці ў 1974-м перапісываліся. Маю ад яе каля 140 лістоў. Помніла, што яна там успаміналa Гродна і тамтэйшыя падзеі. Учора перагледзела ўсе лісты. А. Смоліч успамінае, што застала ў Гродне бел[арускіх] дзяўчат Серафіму Кішко і Мальчэўскую. С. Кішко была загадчыцай Бел[арускага] дзіцячага прытулку, а Мальчэўская працавала ў гімназіі. Яшчэ Алеся Смоліч пісала мне: "Старайся знайсьці Серафіму Кішко — яна можа шмат расказаць аб прытулку, гімназіі і інш. Яшчэ пісала, што прытулак быў на вул. Ерузалемскай — у тым самым панадворку, дзе тытунёвая фабрыка Шарашэўскага.

Цікава надзвычайна, чаму гэта ні адзін чалавек не гаварыў мне нічога аб Стасі Буйло? Што за прычыны? А цяпер проста звар'яцець можна...

Чаркасава піша кніжку аб Канстанцыі Буйло. Аж страшна, каб яна не ўнясла ў сваю аповесьць гэтай усёй блытаніны. Вельмі прашу, адкажыце мне, што Вы з гэтага ўсяго зразумелі? Галоўнае — справа *могілак* і таго *Барыса-Глебскага* манастыра. Няўжо я іх ня бачыла, ня помню? Гэта немагчыма.

Ведаю, што ня маеце часу, а можа, і бяда якая ўдома, але сапраўды вельмі мне патрэбная Ваша помач.

У мяне і свае асабістыя справы — ня вельмі. У выдавецтве "Юнацтва" ідзе ў друк (а мо яшчэ не ідзе) зборнік маіх публікацый. Рэдактарам быў с.п. А. Бачыла, аб чым я нядаўна даведалася. Пасьля яго сьмерці ўзяў гэтую справу на сябе С. Панізьнік. А цяпер ён захварэў... Зборнік на ласцы Вольскага[4]. А я нават ня ведаю, які даюць загаловак, што зьмяшчаюць. Мо ў гэтай справе зьбіраўся ехаць у Вільню А. Бачыла — за тры дні перад сьмерцю... Непрыемная сытуацыя.

Яшчэ раз даруйце, што Вам дуру галаву. Што ў Вас? Ці Вы атрымалі мой папярэдні ліст?

Усяго найлепшага Вам і п. Марыі. Шчыра — *Л. Войцікава.*

190. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

14 лютага 1983 г. Вільня

Паважаны Алесь Мікалаевіч.

Тры дні таму прынясьлі нам дахаты Вашу пасылачку. Слаўкі тады ўдома не было, і пасылка чакала, каб ён сам яе распакаваў. Усё даехала вельмі добра. Слаўка перасылае Вам шчырую і вялікую падзяку. Прышчэпы, як заўсёды, апакаваў плёнкай і закапаў у сьнег. Саджанцы таксама апакаваў і прысыпаў. Так бы хацелася Вам нешта на памяць паслаць, каб расло і нас прыпамінала.

Ну, а цяпер справы менш прыемныя. Помніце, у "ЛіМе", здаецца, 26 лістапада, была заметка, падпісаная нейкім Д. Зінгерам[1]? Хто ён такі? Ня ведаеце часам? Ён там паведамляў, што ў Слоніме пры школе ўжо адкрыты музэй. Прачытаўшы, [redacted] вельмі зьдзівілася: якім цудам у пару месяцаў можна ўтварыць музэй?

Тым часам пару дзён таму атрымала ліст ад Новіка-Пеюна, які цяжка хворы, даўжэйшы час быў у Слоніме ў сястры. Там яго адведываў Сідаровіч і сказаў, што музэю фактычна німа. Толькі каб Новік Зосьцы Верас пра гэта не пісаў, бо музэй напэўна будзе. І быццам сам Сідаровіч аб пасланай у "ЛіМ" заметцы нічога ня ведаў...

Я цяпер ужо і Сідаровічу ня веру. Нашто яны маняць? Каго ашуківаюць? І што з тымі экспанатамі, якія ў добрай веры ім пасылаліся? Я сама нямала паслала...

Шлю яшчэ адну справу, якая каштуе мне шмат нэрваў. Атрымала я ліст ад Дзіяны Цімафееўны Чаркасавай — супрацоўніцы "Голасу Радзімы". Яна піша кніжку аб Канстанцыі Антонаўне Буйло і зьбірае розныя факты з яе жыцьця і яе сям'і. Найбольш ідзе пра сястру К.А.— Станіславу, якая, падобна, у пачатку 20-х гадоў жыла ў Гродне, працавала ў дзіцячым прытулку, захварэла на сухоты, у Гродне памёрла і там пахаваная...

Быццам цяпер Чаркасава сустрэлася са старой настаўніцай Каліноўскай (83 гады), якая Станіславу Буйло ведала. Расказывае, што Станіславу ў прытулак накіравалі Б. Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі. Быццам пахавалі яе на могілках, якія былі ў цэнтры гораду, а цяпер не існуюць. А прытулак быў у Барыса-Глебскім манастыры...

Ці быў такі? Ну добра, аб манастыры я магла забыцца, але могільнік? Я ж ад малых гадоў бывала ў Гродне год у год летам, і якраз у цэнтры гораду, бо мае дзяды (па бацьку) жылі каля самае Фары. Ад 1909 па 1913 г. я жыла ў Гродне стала.

Зьлітуйцеся, Алесь Мікалаевіч, памажыце, бо проста звар'яцець можна. А і ў пачатку 20-х гадоў да паловы 1923 г. я бывала як найменш раз у месяц у Гродне і кожны раз — у Рака-Міхайлоўскага. І ніхто мне нічога не казаў, і могілак я ня бачыла? Нешта незразумелае...

Я прасіла выясьніць справу Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча, але ён нешта не адказывае. Можа, зноў яго жонка хворая? А мо куды выехаў часова? Таму зьвяртаюся да Вас — мо Вы што ведаеце.

Учора атрымала з Прагі ад Н. Кастэцкай[2] праграму канцэрту М. Забэйды ў Празе ў 1958 г. Прыслала 3 экз. Адзін пасылаю Вам — як дадатак да матэр'ялаў аб М. Забэйдзе. Вельмі буду чакаць ад Вас адказу.

Усяго найлепшага — Вам, сям'і, школьнай моладзі. *Л. Войцікава.*

191. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

1 сакавіка 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за зьмястоўны ліст, за стараньні і пошукі. Але, ведаеце, мне здаецца, што трэба кінуць гэтую клапатлівую і беспэрспэктыўную работу. Столькі загадак, столькі блытаніны ды, праўду кажаце, фантазіі...

У апошнім лісьце Чаркасава піша: "Настаўніца Каліноўская кажа, што ў Стасі мужа не было". А крыху далей, што "Стася ў 1920 г. напісала да бацькоў, што выйшла замуж"... Далей — што з іменем Стасі зьвязывалі выкладчыка Тарасевіча, які пасьля выкладаў у Віленскай гімназіі. Якой? Беларускай? У Віленскай Беларускай гімназіі такога выкладчыка наагул не было.

Што да могілак, то я нічагусенькі аб іх ня чула. Можа, гэта былі праваслаўныя? А калі яны былі зьліквідаваныя, у якім годзе?

Я Вам ужо пісала, што аніяк не магу зразумець, чаму, бываючы часта ў Гродне ў пачатку 20-х гадоў, ніколі ня чула ад нікога аб Стасі Буйлянцы. Сер[афіму] Кішко дарэмна шукаць — столькі гадоў прайшло, ды гэта было яе дзявочае прозьвішча, магла не адзін раз выйсьці замуж.

А пасьведчаньне для Алесі Смоліч як выкладчыцы Бел[арускай] гімназіі падпісана: *дырэктар Тамашчык* (без імені).

Я наагул ня ведаю, навошта Чаркасавай да кніжкі аб Канстанцыі Буйло патрэбныя весткі аб яе сястры? Сястра Станіслава ні на жыцьцё, ні на творчасьць Канстанцыі Антонаўны ўплыву ніякага ня мела. Ды і К.А., мусі, ня вельмі аб сястры клапацілася, калі нічога аб яе жыцьці ня ведае. А цяпер, пасьля 60 гадоў, бядуе, што ня ведае, дзе сястра пахаваная. Крыху запозна...

Атрымала Ваш ліст, у якім пішаце аб цяжкім стане мужа Дануты Бічэль, і што яна прыехала ў Гродна. І адначасна — "Літаратуру і мастацтва" з весткай аб сьмерці Загнетава[1]... Для яго — канец цяжкіх мукаў, але для сям'і — гора. Выслалі Дануце тэлеграму. Але як жа гэта выйшла? Памёр без яе? Неспадзявана? Ці пасьпелі яе выклікаць?

Яшчэ, як абухом, вестка аб Ларысе Антонаўне [Геніюш] ... З непакоем чакаю ад Вас весткі, што з ёю і як? Дзіўна — жалілася на сэрца, на высокі ціск, але ні разу — на болі страўніка. А можа, гэта не ў страўніку, а ў вантробе? Пры раку вантробы болі зьяўляюцца ўжо ў самым канцы... Цяжка і сумна аб усім гэтым думаць.

Сяньня атрымала ліст ад С.С. Panізьніка. Справа маёй кніжкі памалу рухаецца, але пытаюцца, каго б я хацела на аўтара прадмовы? Што добра было б каго са старэйшых. А я і ня ведаю нікога.

С. Панізьнік піша, што ад 28 лютага да 4 сакавіка працуе ў Вільні (у архівах, мусіць) рэдактар "Юнацтва" К. Цьвірка[2], і што будзе ў мяне. Значыцца, пагаворым. Зрабіць выбар публікацыяў для кніжкі і ўнясьці карэктуру даручылі Панізьніку. Крыху баюся, што з гэтага выйдзе...

Паміж тым, што друкавалася ў "Заранцы", у "Шляху моладзі", у "Студэнцкай думцы", і тым, што цяпер,— агромністая розьніца. І трэба добра разумець гэтую розьніцу. Што патрэбнае і добрае было тады — для сёньняшняга дня нічога нявартае. Можа, наагул, такі перадрук старога ня мае сэнсу? Як нядобра, калі німа з кім парадзіцца... Каб сын мой жыў — была б іншая справа.

Людзі прыяжджаюць, пішуць, але ўсё гэта людзі новыя, незнаёмыя. Ня ведаеш, якія ў іх пагляды, ці можна быць шчырым?

Для Гродзенскага музэю маю ўжо ня так мала прыгатаванага і ГГБМ. Ёсьць аж 3 экз. (можа, прыдасца) — з фатаграфіямі. Шкада толькі, што вонкавы выгляд не такі добры, як работы С.М. Новіка-Пеюна. Буду чакаць, можа, адзавецца Данута Бічэль, калі міне першы боль.

Калі ласка, перадайце ад мяне прывітаньне і словы спачуваньня Ларысе Антонаўне.

Усяго добрага Вам і сям'і. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

192. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

14 сакавіка 1983 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Абедзьве з дачкой шчыра дзякуем за памяць, за добрыя пажаданьні. І я аб усіх помніла, усім зычыла ў думках усяго самага добрага, сьветлага, а напісаць — нікому не пісала. Цяпер самой сорамна... Але так увесь час нядобра чуюся — усё баліць, дакучае, адбірае энэргію і волю. Можа, як міне гэты пераходны час, будзе лепш? Паглядзім. Тым часам, хоць спозьнена, шлю Вам шчырае прывітаньне, пажаданьне здароўя і сілы духу.

Сардэчна цалую — Ваша *Л. Войцікава.*

Маю тое-сёе для Вашага музэю.

193. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

18 сакавіка 1983 г. Вільня

Паважаны Адам Язэпавіч.

Перадусім дзякую за добрыя сьвяточныя пажаданьні. Сяньня атрымала з Энцыкляпэдыі — аддзел літаратуры і мастацтва — просьбу, каб напісаць для іх артыкул пра Андрэя Зязюлю. Быццам Вы казалі, што я маю ўсе патрэбныя матэр'ялы. На жаль, гэта нейкае непаразуменьне. Я сапраўды Андрэя Зязюлю ведала ў Менску асабіста, але аб ім амаль нічога ня ведаю — ані яго імені (кс [ёндз] Астрамовіч — а імя?), ані скуль паходзіў, ані дзе вучыўся. У Менску ён прыймаў удзел у грамадзкай працы, напрыклад, быў на Зьезьдзе (сакавік 1917 г.), ды аб гэтым успамінаць ня варта...

А вось калі б можна было зьмясьціць у Энцыкляпэдыі пра Уладыслава Паўлюкоўскага[1] (псэўд[онім] У. Ініцкі), то гэта магу зрабіць. Ён быў і мастак, і пісьменьнік. Супрацоўнічаў у гумарыстычных часапісах "Маланка", у "Заранцы" выдаў кніжачку перакладаў Л. Талстога. Але галоўная яго праца — "Гісторыя календароў", пачынаючы ад рымскіх часоў. Апрацавана на кожны месяц, падаюцца назовы месяцаў у розных мовах. А ў канцы кожнага месяца — беларускія прыказкі.

Праца гэтая друкавалася ў часапісе "Шлях моладзі" — год 1934. Сабраныя У. Паўлюкоўскім народныя прыказкі выкарыстаныя ў акадэмічным томе "Прыказкі і прымаўкі". Вось яго маю поўны жыцьцяпіс. Калі трэба — напішу.

Чакаю весткі ад Вас або з Энцыкляпэдыі. Недалёка ўжо да Вялікадня, хоць сьнегу яшчэ поўна.

Усяго найлепшага! Шчыра прыязная — *Л. Войцікава.*

194. ЯЎГЕНУ ПЕТРАШЭВІЧУ

23 сакавіка 1983 г. Вільня

Паважаны Яўген Канстанцінавіч!

Прыняла Вашыя павіншаваньні як голас з мінуўшчыны. Сколькі гадоў, сколькі перажытага...

Хоць па факце віншую Вас з 50-годзьдзем! Што першыя сівыя валасы — гэта нічога, абы сэрца маладое ды творчыя сілы.

Шкада, што да нас не даходзяць з Беларусі ні кіна-, ні (амаль) тэлездымкі. Калі і дадуць зрэдку нейкую тэлеперадачу з Менска, то ў самыя раньнія гадзіны, калі ніхто ня бачыць.

Зьдзівіла мяне, што Вы "бачылі" мяне падчас юбілею. Хіба, Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] у Гродне нешта наладзіў?

Усяго найлепшага! Старая знаёмая *Л. Войцікава*.

195. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[Сакавік 1983 г.]

Дарагая Данута Іванаўна.

Ці ня ведаеце, што з Ларысай Антонаўнай [Геніюш]? Які наканец дыягназ? Пісалі мне і Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч, і Алесь Мікалаевіч [Белакоз], што яе адведываюць, але аканчальнага дыягназу яшчэ не было. Думаю, што і Вы ў курсе. Калі ласка, напішыце хоць пару слоў.

Сама чуюся дрэнна. Цалую сардэчна — Ваша *Л. Войцікава*.

196. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[Сакавік 1983 г.]

Дарагая Дануся Іванаўна.

Толькі што прынясла мне дачка страшную вестку аб стане Ларысы Антонаўны [Геніюш]. А я ўсё ня верыла ў магчымасьць гэтай хваробы... Ні разу, ні аднаго разу Ларыса Антонаўна не ўспамінала аб якіх-небудзь недамаганьнях страўніка. Скуль гэта раптам узялося?

Якая ж страшная доля — канчаць жыцьцё ў муках, а галоўнае — здалёк ад сына і ўнукаў, якіх Л.А. так любіць і так бяз іх тужыць. Пішу да яе некалькі слоў. Калі ўважаеце, што можна даць прачытаць або прачытаць ёй напісанае, калі ласка, зрабіце гэта. А калі не — скажыце, што я цэлым сэрцам, цэлай душой з ёю.

Ня ведаю, як я доўга пратрымаюся. Усё людзкое гора не сплывае па мне без уплыву на маё здароўе, нэрвы. Усё перажываю глыбака і, можа, таму так дрэнна чуюся...

Шчыра цалую. Зычу моцнага духу, вытрываласьці. Ваша *Л. Войцікава*.

197. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

7 красавіка 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Шчыра дзякую за падрабязныя весткі аб Ларысе Антонаўне [Геніюш]. Аб

апэрацыях ■ ведала, бо Данута Б[ічэль] званіла да Лявона [Луцкевіча] і казала аб гэтым. Але гэта было адразу пасьля другой апэрацыі, без дэталяў. Што рана ня гоіцца — гэта вельмі нядобра. Добра, што сын змог прыехаць, як разумею, на вельмі коратка. Але шкада, што не старэйшы ўнук. Яна так яго любіць. Ці ня змог, ці матка не пусьціла. Там адносіны вельмі складаныя.

А хто апякуецца домам, кватэрай у Зэльве? Пішаце, што прыяжджаюць з іншых гарадоў? Напэўна, з Баранавіч др. У. Кароль[1] быў? Добры і чуткі ён чалавек. А вось з Вільні німа каму паехаць, адведаць. Калісьці Вільня была поўная беларусаў, а цяпер? Крыху недабіткаў...

Я сама да Ларысы Антонаўны не пішу — ня ведаю, на якую хвіліну, на які стан, настрой, ліст можа трапіць, але Вас вельмі прашу сказаць ёй, што я ўсёй душой з ёю. Спагадаю, шкадую і рада ўсё зрабіць, каб падтрымаць яе духова. Але чым? Як? Ня ведаю.

Вельмі добра, што парушылі ўсе ўлады і нават М. Танка. Такія адносіны, апека ўжо самі сабой падтрымліваюць яе і пазваляюць забыцца ўсе крыўды, якія перанесла ад зэльвенскай "чорнай сотні".

А ў нас? Прыйшла нарэшці вясна. Дачка (хоць, напэўна, адхварэе высілак) парадкуе кветнікі. Зяць таксама парадкуе — капае, шмат выкідае, бо старое. А мне шкада, бо сама садзіла. Слаўка рвецца на часткі, бо і сад трэба даглядзець, і цяплярні засеяць, і шчапіць яблыні ды сьліўкі (усё новыя гатункі прыносіць), і працаваць нармальна, і начамі пісаць дысэртацыю.

Ужо мае 75 старонак машынапісу, але гэта толькі невялікая частка. Бядуе, што не хапае часу, каб адначасна пісаць патрэбныя да друку артыкулы. Сьпіць 3–4 гадзіны на пару. Толькі як прыйдзе з работы і паабедае, то гадзіны 2 пасьпіць, бо ўжо з ног валіцца. Як доўга так зможа — ня ведаю. Але энэргіі ня траціць.

Нешта Ваш артыкул аб Я. Лявіцкім не паказываецца ў "Полымі". Наагул, Менск гродзенскіх людзей успамінаць ня любіць. Мае ўспаміны аб ГГБМ некалісь ляжалі ў "Полымі" пару гадоў (падаваў Я. Саламевіч), аж нарэшці на маю просьбу забраў назад.

Ці ў Вас ёсьць лішні экзэмпляр машынапісу "З кагорты пачынальнікаў"[2]? Мне прыйшло ў галаву, што вялікую радасьць зрабіў бы гэты артыкул пляменьнікам Я. Лявіцкага. Яны так сардэчна свайго дзядзьку ўспамінаюць і мову сваю захоўваюць, а нічога аб працы дзядзькі ня ведаюць і памятак ня маюць, бо згарэла ў іх хата і ўсе рэчы. Я ім толькі здымак Лявіцкага паслала.

Канчаю. Яшчэ пару лістоў трэба напісаць, а сядзець цяжка. Вось дзе старасьць — ня радасьць. Усяго найлепшага. Пані Марыі — прывітаньне. *Л. Война́кава.*

Кладу некалькі віленскіх пралесак. Калі даедуць сьвежыя, калі ласка, аддайце ці пакажыце (можа, кветак трымаць у палаце нельга) Ларысе Антонаўне [Геніюш] — як прывітаньне з Вільні.

198. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

19 красавіка 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Вы, напэўна, ведаеце, што Алесь Мікалаевіч [Белакоз] у гродзенскім шпіталі. Ён мне напісаў некалькі слоў. Пісаў з перарывамі: пачаў 1 красавіка — скончыў

14-га. Як сам піша, вельмі яму цяжка. Лячэньне — ніякае.

Я прасіла, каб Марына мне пісала, паведамляла, што і як з бацькам, але калі гэты мой ліст да іх дойдзе? Ці яна можа часта ў бацькі бываць? Калі ласка, напішыце мне ўсё, што Вам вядома.

Яшчэ ня сьцішыўся боль пасьля сьмерці Ларысы Антонаўны [Геніюш] ... Я так з ёю зблізілася — хоць толькі лістоўна, маю больш за 300 яе лістоў. А цяпер — ізноў неспакой. Што гэта сёлета робіцца? Столькі хвароб, столькі стратаў... Я ўжо і свае дні пачала лічыць.

Ларыса Антонаўна мела хоць запэўненую апеку, спагадлівасьць шматлікіх людзей, і гэта не памагло. А Алесь Мікалаевіч? У шырэйшых кругах у яго прыхільнікаў мала, а мо і зусім німа. А тады і лекары ставяцца абыякава. Ды ня веру я гродзенскім лекарам. Там жа сваіх людзей німа. Праўду кажучы — як і ў Вільні. На сабе адчуваю.

Усяго добрага. Чакаю весткі. *Л. Войцікава.*

199. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

4 мая 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Хоць каратка хачу адказаць на Ваш ліст з 27.04 г.г. Нешта вельмі пагоршылася маё здароўе. Асабліва даймае хвароба страўніка. Мусі, ад гэтага і слабасьць, а яшчэ вельмі баляць ногі.

Ад Алеся Мікалаевіча [Белакоза] вестак німа. Добра, што Вы хацелі пашукаць адпаведнай пратэкцыі, каб на хворага лекары зьвярнулі больш увагі. А ўсё ж там нешта было, калі Алесь Мік[алаевіч] напісаў мне: “Усяго за гэты месяц наглядзеўся, ня думаў, што ў нашай краіне такое можа адбывацца”. Гэтыя словы шмат гавораць.

Дзякую за падрабязнае апісаньне хаўтураў с.п. Ларысы Антонаўны. Добра, што ўсё так урачыста адбылося. Што да сына яе, то гэта для мяне не навіна... Можа, таму, што я за Ларысу Антонаўну на 17 гадоў старэйшая, яна была са мной вельмі шчырай, дзялілася ўсімі сваімі перажываньнямі, у тым ліку сямейнымі...

Маю ад яе больш за 300 лістоў. У такой колькасьці памясьцілася ўсё, нават самае найгоршае, самае балючае... А сама яна была вельмі спагадлівая, добрая, сардэчная, так што і мне з ёю лёгка было падзяліцца сваімі лепшымі і горшымі перажываньнямі. Цяпер ня маю нікога больш-менш з майго пакаленьня.

Мела я пару лістоў ад людзей, якія ў самыя цяжкія хвіліны свайго жыцьця адчулі на сабе ўплыў сільнай (як пішуць) і спагадлівай душы Ларысы Антонаўны. А вось разьвітаньне ў “ЛіМе” зрабіла прыкрае ўражаньне. Бяз здымка, бяз чорнай рыскі, даволі ляканічна, па-казённаму...

Паміж іншым, ад яе сяброў па няшчасьці (на Варкуце...) дастала я яе верш, там напісаны, які, як кажуць, на шпаргалках пераходзіў з рук у рукі.

Як Ваш артыкул, як і частка маіх успамінаў, што меліся быць у “Спадчыне”, так і мая кніжка — вялікі знак пытаньня. Ужо амаль тры месяцы — ні весткі, ні слова. С.С. Панізьнік, які кніжкай займаўся, часта пісаў, а цяпер ад студня маўчыць. Відаць, ня мае чым падзяліцца. Але гэта ўжо мала мяне цікавіць. Хацела б толькі скончыць пару драбніц, што пачала. Але пісацца штораз цяжэй. Не таму, што ў галаве пусьцее, а таму, што цяжка змагацца з болямі. А мо

дачакаю яшчэ летніх канікулаў, і Вы зможаце прыехаць? Яшчэ тым-сім хацела б падзяліцца ў сувязі з Гродзеншчынай і Сакольшчынай.

Усяго добрага! Для пані Марыі — шчырае прывітаньне. *Л. Войцікава.*

200. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

9 мая 1983 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Так даўна ня маю ад Вас ніякай весткі. Як чуецеся? Сьмерць Ларысы Антонаўны [Геніюш] моцна адбілася на маім здароўі — чуюся вельмі нядобра.

Рада была б, каб Вы змаглі прыехаць, каб я з рук у рукі магла аддаць тое, што прыгатавала для Вас у Музэй М. Багдановіча.

Усяго Вам найлепшага! Здароўя і сілы духу, каб апанаваць усе цяжкасьці жыцьця. Сардэчна цалую — *Л. Войцікава.*

201. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

26 мая 1983 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Дзякую за ліст. Атрымала яго сяньня і адразу адказываю, хоць баюся, што чытаць будзе цяжка — так рука дрыжыць. Гэтая безупынная гарачыня проста мяне забівае...

Я зусім на Вас не злую, а толькі непакоюся. Як доўга німа весткі, розныя думкі лезуць у галаву. Ды і я ня вечная...

Разумею, як на Вас падзеяла захаваньне сына Ларысы Антонаўны [Геніюш]. Мне ўжо аб гэтым пісаў крыху Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч]. Яго захаваньне не было для мяне неспадзяванкай — Ларыса Антонаўна не адзін раз з прыкрасьцю аб такіх фактах пісала. Маю ад яе 307 лістоў і крыху недрукаваных вершаў. Прыедзеце — паглядзіце гэтыя вершы. Можа, што спатрэбіцца, возьмеце.

Я для Вас прыгатавала, што змагла. Пачала пісаць "Старое Гродна", але, мусі, праз гэтую гарачыню далей ня пішацца.

Анатоль Аляксандравіч Наліваеў (мастак) прысылае мне шмат здымкаў: групы, паасобныя пісьменьнікі, і то па 2–3 экзэмпляры. Тое, што Вам спатрэбіцца, возьмеце.

Чаму ў Вас пухнуць ногі? Ці ад сэрца, ці ад нырак? Ці Вы былі ў лекара? Да такіх зьяваў, як пухліна ног, нельга адносіцца абыякава. Гэта паважная справа.

Мяне вельмі мучыць застарэлая хвароба страўніка. Быў лекар. Запісаў лекі, якіх у Вільні німа. Але часьць прыслаў мне Арсень Ліс, а часьць — з Ленінграду. Бываюць дні, што ледзь хаджу — так баляць ногі. Увечары апухлыя, але праз ноч — праходзіць.

Дзівы робяцца сёлета ў прыродзе. Усё сьпяшаецца цьвісьці, і то адначасна. Ніколі гэтага не было — кожная расьліна мела свой сэзон. А цяпер — яшчэ не перацьвіў бэз, а ўжо цьвітуць акацыі, ружы, ірысы.

Цалую Вас сардэчна і чакаю. *Л. Войцікава.*

202. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

10 чэрвеня 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Хачу хоць коратка адказаць, калі ня цяжка будзе Вам прачытаць. Літары скачуць — адно слова выразьней, другое... Мне гэтае лета не шанцуе. Часта мяняецца надвор'е, вялікія ветры і г.д. Усё гэта цяжка пераношу і чуюся дрэнна. Баліць галава, ногі ня хочуць хадзіць, і са страўнікам бяда. Розныя лекі, уколы — нішто не памагае.

Вельмі хочацца дачакацца Вашага прыезду. Яшчэ шмат аб чым трэба было б пагаварыць. Аб долі таго альманаху ведаю даўна. Падобна, як падбяруць матэр'ялы, будуць выдаваць новы. Мае матэр'ялы (успаміны "Менск — з уступам А.С. Ліса) прайшлі праз цэнзуру.

Альманах "Белая вежа" праектуецца даўна. Ужо гадоў ці ня пяць ляжаць у А. Мальдзіса мае ўспаміны "Бел[арускае] каапэрат[ыўнае] т[аварыст]ва "Пчала" і яго орган "Бел[аруская] борць". Ці дачакаюцца друку — ня ведаю...

Вось усё так і цягнецца — гадамі. Цяпер мая кніжка — розныя сабраныя публікацыі за ўсе гады з "Заранкі", "Шляху моладзі", "Студэнцкай думкі", артыкулы мэмарыяльнага характару — усё гэта ў выдавецтве "Юнацтва", а апрацоўку перакідаюць з рук у рукі. Пасьля сьмерці с.п. Алеся Бачылы ўзяўся С.С. Панізьнік, цяпер, як пісаў, заняты сваімі зборнікамі, перадаў М. Лужаніну[1].

Што з гэтага выйдзе — не ўяўляю сабе зусім. І хто напіша прадмову? Неяк Панізьнік пытаўся мяне, каго б я на гэтую ролю хацела. Я адказала, што павінен пісаць той, хто з матэр'яламі добра азнаёміцца, прачытае іх і зразумее. Цяпер то ўжо я нічога не разумею. М. Лужаніна ня ведаю, ну і ён мяне — таксама...

Учора атрымала ад Я. Саламевіча яго "Слоўнік псэўданімаў". Добра, што нарэшці дачакаўся рэзультатаў сваёй больш чым 20-гадовай працы. Ёсьць крыху памылак, прынамсі, што тычыцца мяне асабіста, але на мяне зрабіла цяжкае ўражаньне прадмова — яго нянавісьць да капіталізму і зьвязываньне веры з "апалячываньнем". Вы гэта добра ведаеце, як і я, што адно з другім ня мае нічога супольнага... У Гродзеншчыне, асабліва ў Сакольшчыне, цэлыя вёскі былі каталіцкія, і якраз яны не былі зусім "апалячаныя".

Пляменьнікі гэтага самага Ёзіка Лявіцкага, аб якім Вы пісалі, і сяньня засталіся сьвядомымі беларусамі, хоць беластоцкія дзеячы робяць усё магчымае, каб беларусаў-каталікоў адпіхнуць ад беларускай нацыянальнасьці. Найлепшы прыклад — сёлетні каляндар. Там жа новы стыль, якім карыстаюцца каталікі, ад пачатку да канца ў польскай мове. Усе імёны па-польску...

У Я. Саламевіча гэтакая блытаніна ў паняцьцях ня першы раз. І гэта ў век атэізму... То ўжо абедзьве веры трэба прыймаць аднолькава і больш цьвяроза глядзець вокал сябе — разумець, што ня ўсё так добра з беларускай мовай, сьведамасьцю, як павінна быць. Але хопіць...

Ад Алеся Мікалаевіча [Белакоза] я мела даўгі ліст яшчэ са шпіталя. Усё ж там нешта ня ўсё ясна. Ён у лісьце пару разоў варочаўся да таго, што наагул шкадуе, што лажыўся ў шпіталь. З дому яшчэ не пісаў. Вельмі прыгнечаны тым, што ў Гудзевіцкі музэй нічога не дасталося са спадчыны па Ларысе Антонаўне [Геніюш]. Што яна ўсё адкладвала перадачу сваіх "скарбаў" музэю... А гэта ж там у Гудзевічах яе родная зямля...

Як чуецца Данута Бічэль? Пісала, што хутка прыедзе, а цяпер німа ад яе весткі. Ці ўспомніце на Гродзенскім тэлебачаньні аб 115-х угодках нараджэнь-

ня Ядвігіна Ш.? Гэта 25 чэрвеня. 23-га ў Менску ў Музэі Галубка гэтая дата будзе адзначаная.

Добра, што ўшануюць мэмарыяльнай дошкай памяць І. Дварчаніна. Я яго ведала з часоў Вайсковага зьезду ў Менску, а і тут ня раз спатыкалася, але неяк супольнай мовы не знайшлі, хоць з маім мужам А. Войцікам яны былі блізкімі сябрамі.

Можа, перад выездам на мора яшчэ напішаце? І я шкадую, што Вашай дачцэ не ўдалося заглянуць да мяне.

Усяго найлепшага! Марыі Міхайлаўне — сардэчнае прывітаньне. *Л. Войцікава.*

203. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

28 чэрвеня 1983 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Цэлых 8 дзён прайшло, пакуль я ўзялася Вам адказаць. Ня думайце аб гэтым, што Вы мяне расхвалявалі. У мяне з маладосьці такая натура, што вельмі жыва прыймаю ўсё да сэрца — ня ўмею быць абыякаваю ані да гора, ані да няпраўды ці благіх паступкаў. А ведаць праўду заўсёды трэба.

Ларыса Антонаўна, здаецца, аб усім шчыра пісала, але аб тым, што сын — алькаголік, змаўчала. І з беластоцкіх знаёмых ніхто аб гэтым няшчасьці Геніюшаў не ўспамінаў. Разумею — не хацелі рабіць плётак. Але не заўсёды гэта добра, бо толькі цяпер я зразумела, чаму Ларыса Антонаўна так баялася за ўнукаў. Але чаму Юрка [Геніюш]ня лечыцца? Ён жа — лекар, павінен разумець, чым гэта хвароба (бо гэта ж хвароба) грозіць ня толькі яму, але і сям'і. Я, на шчасьце, ніколі з нічым падобным ня мела дачыненьня ні ў блізкай, ні ў далёкай сям'і, але нічога ў жыцьці так не баялася, як п'яных...

Я маю некалькі вершаў Ларысы Антонаўны, нідзе, хіба, не друкаваных. Два ці тры — калядныя, а адзін пісаны на Варкуце... І жменьку ўспамінаў з тых часоў аднаго з яе таварышаў па няшчасьці. Але думаю, што гэтыя вершы могуць мець вартасьць толькі для Вас асабіста.

Маю ад нябожчыцы 307 лістоў. Але ізноў — яны ў большасьці *вельмі шчырыя*, такіх шырэйшаму грамадзтву не пакажаш.

Мела я ліст ад Алеся Белакоза. Узяўся з усёй магчымай у яго стане энэргіяй за парадкаваньне музэю. Памагаюць яму мастакі. Аб мастаках пісала мне Марына (дачка Белакоза). Але якія гэта мастакі — гродзенскія ці менскія — не напісала. Хоць гэта і няважна, абы нарэшці ўсё фахова давялі да парадку. Менш будзе Белакозу хваляваньня. Можа, гэта і ўтрымае яго здароўе на цяперашнім узроўні — ня будзе пагаршэньня.

25 чэрвеня былі 115-я ўгодкі нараджэньня Ядвігіна Ш. Я своечасова прыпомніла аб гэтым факце мінскай Гасцёўні У. Галубка. Ёю займаецца самадзейны мастак Анатоль Наліваеў. Займаецца шчыра і пасьпяхова. Ужо там было праведзена шмат вечароў пры нагодзе розных юбілеяў. Вядуць вечары пісьменьнікі, паэты.

Вось і на гэты раз Анатоль Аляксандравіч мяне паслухаў — наладзілі вечар у памяць Ядвігіна. Але не 25-га, а раней — 20 чэрвеня, бо вёў яго А. Лойка, і толькі гэты дзень меў вольны. Ужо 23-га я мела поўную справаздачу, як вечар прайшоў, хто выступаў, хто прысутнічаў. Цяпер чакаю здымкаў, якія

А. Наліваеў зрабіў і якія пашле мне і ўнукам Ядвігіна Ш. А тут у Вільні 25 чэрвеня жменька віленскіх беларусаў сабралася каля магілы Ядвігіна, каб ушанаваць яго памяць. Так што ўсё абышлося добра.

Пасьля даўгой сушы сяньня — бура і дождж. Для расьлінаў ён вельмі патрэбны, але нізкі ціск і 100% вільготнасьці паветра дрэнна адбіваюцца на здароўі. Разбалелася галава, патыліца. Прыняла таблетку, але паможа няхутка і не надоўга. Як бы мне хто кляшчамі патыліцу сьціснуў.

Ці Вы ўжо маеце "Слоўнік беларускіх псэўдонімаў", апрацаваны Я. Саламевічам? Добра, што ён нарэшці дачакаўся плёну сваёй работы. Працаваў шчыра і энэргічна больш за 20 гадоў. Ёсьць крыху памылак, але гэта ня так важна, добра, што пачатак зроблены. Мне прыемна пераглядаць — там так шмат знаёмых прозьвішчаў!

Ізноў падае дождж. Галава і далей баліць. Трэба канчаць, бо пачынаю ўжо блытаць літары. А тут яшчэ сьпешна трэба адказаць Канстанцыі Буйло. Пісала, што дрэнна чуецца, не выходзіць з дому, больш часу ляжыць.

Надыходзіць ліпень — абы пагодны. Буду чакаць Вас. А тым часам пішыце. Трымайцеся, не хварэйце. Шчыра цалую. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

204. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

1 ліпеня 1983 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

Рада я, што Вы, нарэшці, адклікнуліся. Час ад часу Сяргей Міхайлавіч [Новік-Пяюн] перадаваў мне ад Вас прывітаньні, але цяпер, як хворы, то і сам мне ня піша. Як добра, што Вы здабылі хоць якую кватэру і маеце надзею забраць сям'ю. Бо якое ж гэта жыцьцё — кожны асобна, вечны неспакой. Што Вы ў "ЛіМе" працуеце, даўно ведаю, і кожнае Вашае выступленьне ў друку цешыць. Рада буду, калі зможаце прыехаць. Здароўем пахваліцца не магу — часьцей блага, чым добра. Прыемна мне было пазнаёміцца з Алесем Пятровічам [Траяноўскім] [1]. Пры пабачаньні, калі ласка, перадайце ад мяне яму прывітаньне.

Пішаце, што я па-даўнейшаму люблю паказаць свой агарод? А ведаеце, у гэтым ёсьць маленькая хітрасьць. Спраўджваю, як, асабліва пісьменьнікі, ведаюць беларускія, сапраўдныя беларускія назовы расьлін. У душы цешуся, калі новы пазнаны чалавек назаве расьліну беларускім імянем. На жаль, гэта так рэдка бывае. Аж вушы вянуць ад калькі і ад чыста чужамоўных назоваў.

Закранулі справу маёй кніжачкі? Вельмі ж я неспакойная, што з гэтага атрымаецца. Штораз то нехта іншы ёю займаецца. Насьцярожвае, што нават у выдавецкім пляне дапусьцілі памылку. Напісана, што "выдавала часапіс для дзяцей "Ранак". Які "Ранак"? Я выдавала "Заранку". Калі тут такая грубая памылка, то чаго можна спадзявацца ў тэксьце? Найбольш праўдападобна, што ■ яе не дачакаю, але прыкра думаць, што выйдзе нейкі зьлепак, нічога ня варты. Была думка, што гэта будзе кніжка шматплянавая — з некалькіх аддзелаў.

А цяпер даведываюся, што даюць загаловак "Каласкі" (так у мяне называецца машынапісны зборнік для дзяцей, зложаны з вершаў (крыху), расказаў, легендаў і г.д., друкаваных у "Заранцы", "Шляху моладзі" і інш. часапісах). А дзе ж тыя абразкі, імпрэсіі, што друкаваліся ў "Студэнцкай думцы", і сабраныя (сабраў і перадрукаваў Сяргей Міхайлавіч [Новік-Пяюн]) пад назвай "Імпрэсіі"?

А дзе артыкулы мэмарыяльнага характару? Наогул, нічога не разумею. Думаю, што лепш бы нічога не рабілі. Было б мне спакойней. Калі мяне намаўлялі (А. Мальдзіс, Г. Каханоўскі), я адмаўлялася, але яны мяне неяк пераканалі. А цяпер шкадую і гэтаму выдавецтву ня веру.

Пішыце, а калі зможаце, прыяжджайце.

Усяго найлепшага. Ад маіх прывітаньне. *Л. Войцікава.*

205. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

31 ліпеня 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Вось апошні дзень ліпня. Думаю, што гэты ліст прывітае Вас удома. Была ў мяне Данута Іванаўна [Бічэль]. Крыху пагаварылі, аддала ёй тое, што прыгатавала для Гродзенскага музэю. Яна чытала тое, што я пачала пісаць аб старым Гродне. Казала, што добра... Ня ведаю. Пастараюся так-сяк скончыць. Вельмі дрэнна чуюся, так што на нешта добрае надзеі мала.

Вы пішаце, што ў маёй біяграфіі — толькі контуры. Але ва ўспамінах, хоць пішу толькі аб працы,— усё маё жыцьцё. А ўспаміны дакладныя, падрабязныя. Толькі што ім німа ходу... Мы некалісь з Янкам Саламевічам чыталі іх разам, бо ён хацеў атрымаць камэнтарыі да таго, што яму здалося няясным. І тады гаварылі аб тым, што хоць некаторыя фрагмэнты трэба даць у друк. Нічога з гэтага ня выйшла і, бадай што, ня выйдзе.

Нават з маёй кніжкай нешта незразумелае. С. Панізьнік прыслаў мне тэматычны плян "Юнацтва". Дадзены загаловак кніжцы — "Каласкі". Гэта загаловак майго машынапіснага зборніка твораў для дзяцей. А кніжка мелася быць шматплянавая, г.зн. меліся быць і мэмуарныя матэр'ялы. Апрача таго, напісана аба мне: "Она была редактором первого детского журнала *"Ранак"*...

Разумееце? Не "Заранка", а нейкі "Ранак". Нават гэтага не зразумелі, то чаго можна спадзявацца? Лепш бы нічога не рабілі. І то заплянавана на III квартал 1984 г.

Я думала, калі мяне намаўлялі на кніжку А. Мальдзіс і Г. Каханоўскі, што сапраўды нехта паважна пастараецца, і дадуць у паважнае выдавецтва, а то ў "Юнацтва"... Значыцца, уся рэшта, усё, што друкавалася ў хрэстаматыі І. Дварчаніна, а раней у "Студэнцкай думцы", "Вольнай Беларусі",— нічога нявартае? І ўсе ўспаміны — таксама?

Я гэта нібы адчувала, бо доўга і ўпарта адмаўлялася ад усялякага друкаваньня. Я напісала Панізьніку, што нічога не разумею, як усё ж мае быць. Адказу не атрымала... Вось такія мае справы.

Пісаў мне нядаўна А. Белакоз. Меў непрыемнасьці з парадкаваньнем музэю, лепш сказаць — з памочнікамі-мастакамі. Закончыў тым, што ізноў зьбіраецца ў шпіталь. Калі напісала аб мастаках, то мушу выясьніць, у чым справа. Менавіта рабілі ўсё вельмі нядбала, абы як. Але Вы нікому з мастакоў аб гэтым не ўспамінайце. Была б непрыемнасьць і мне, і Белакозу.

Цікава мне, як удалася Ваша экскурсія на поўдзень? Ці была адпаведная пагода? Ці добрыя рэзультаты? Была б вельмі рада, каб Вам удалося выбраць час і прыехаць. Пры маім стане здароўя хочацца пасьпяшацца і ўсім падзяліцца, каб ня ўсё зьнікла з таго, што было перажыта.

Вы, выяжджаючы, хіба, ужо ведалі аб сьмерці Янкі Маркавіча Хвораста.

Незразумела, чаму ў прэсе не было ні нэкралёгу, ні ўспаміну, ні разьвітаньня. Поўнае маўчаньне. Чаму?

Усяго найлепшага. Прывітаньне Вашай жонцы. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

206. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

31 ліпеня 1983 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Дзякую за вестачку. Прыкра, што Вашаму сыну не ўдаюцца яго задумы, але добра тое, што ў яго ёсьць мэта, да якой ён імкнецца. Ёсьць замілаваньне. Ці ня варта было б парадзіцца з У.М. Скарынкіным — паэтам, Вы, хіба, яго ведаеце. Ён працаваў у *гражданской* авіяцыі, мае, пэўна, там знаёмствы. Сам быў начальнікам аварыйна-выратавальнай службы Беларускага ўпраўленьня грамадзянскай авіяцыі. А як чалавек — сымпатычны, спрыяльны, можа, ён бы што прыдумаў?

Не магу пахваліцца, што ўспаміны аб Гродне пасоўваюцца наперад. Мела крышачку работы для Гудзевіцкага музэю. А і трывогі за Гудзевічы — таксама. Алесь Мікалаевіч [Белакоз] зноў зьбіраўся ў шпіталь. Дапамога мастакоў у музэі аказалася мала вартая.

Маю скончыць важную перапіску з нашчадкамі сям'і Грынкевічаў з Новага Двара былога Сакольскага павету. А са здароўем адна бяда. Галава — адно, а хвароба страўніка вельмі абвастрылася. І рады не знаходжу.

А і справы агульныя дзіўна няясныя. Я Вам казала аб сьмерці Я. Хвораста. Ён жа быў блізкі з Рыгорам Ширмай у працы, ды і сваяк. І незразумела, чаму пасьля сьмерці — ні нэкралёгу, ні якога-небудзь успаміну. Чаму? Што за прычына? Ад нікога нічога не магу даведацца.

Я са сваім калецтвам — глухатой — чуюся вельмі самотная, як на пустыні. Адно шчасьце — лісты, часта сардэчныя, цёплыя. Гэта ратуе. Усё ж, паміма ўсяго, думаю, што аб Гродне скончу.

Цалую сардэчна. Ад маіх — прывітаньне. Ваша шчыра *Л. Войцікава*.

207. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

14 верасьня 1983 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Зусім страціла кантакт з Гроднам і Гудзевічамі. Што там сталася? Алесь Мікалаевіч [Белакоз] пісаў мне, што ізноў зьбіраецца ў шпіталь і, апрача таго, прасіў прыслаць копію аднае драбнічкі, што я пісала для Гудзевіцкай школы на 90-годзьдзе Максіма Багдановіча, бо арыгінал недзе згубіўся. Я зараз жа выканала просьбу і адначасна напісала да Алеся Мікалаевіча і яго жонкі. Адказу — ні слова.

Яшчэ горш з Аляксеем Міхайлавічам [Пяткевічам]. Атрымала ад яго ліст у канцы чэрвеня. Пісаў, што на ліпень едуць абое з унукам на поўдзень. Вернуцца ў пачатку жніўня, а тады А.М. прыедзе да мяне. Я напісала ліст так, каб у пачатку жніўня атрымаў. Прайшоў жнівень і вось палова верасьня, а ад яго — ні гуку. Ні сам не прыехаў, ні на ліст не адказаў. Мо нічога благога ня сталася, а проста лісты не даходзяць. У кожным выпадку непакоюся.

Тым больш, што нэрвы не ў парадку ад агульнага дрэннага самаадчувань-

ня. Усё цяжэй змагацца з маім хворым страўнікам ды і іншымі недамаганьнямі.

А што ў Вас? Як прайшоў адпачынак? Як здароўе? Буду ўдзячная за некалькі слоў адказу.

Сардэчна вітаю! *Л. Война-Войцікава.*

P.S. Калі ласка, напішыце мне, як па-бацьку жонку А.М. Белакоза? Дагэтуль ня ведаю. Вера — а далей?

208. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

20 верасьня 1983 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

Дзякую за ліст і шчыра вітаю Вас на, хіба, ужо сталым мейсцы. Вельмі цікавіць мяне Вашая праца для Тэатру лялек, г.зн. для дзяцей. Гэта ня "забаўка", як Вы пішаце, а сьвяты абавязак — у даступнай для дзіцяці форме даць яму веды і навучыць цаніць родную зямельку, мову, прыроду. У тэлевізары бачу шмат дзіцячых па назову ансамбляў. Але ж гэта нічога супольнага ня мае з дзіцячымі гадамі, псыхікай, уяўленьнямі дзяцей — сапраўдных дзяцей. Усе гэтыя ансамблі — малпаваньне дарослых. Да роспачы даводзяць какетлівыя міны дзяўчынак, якія ледзь пасьпелі ад зямлі адрасьці. Няхай жа дзеці як найдаўжэй будуць дзецьмі. Нашым беларускім дзецям памажыце ў гэтым.

Пішаце, што чыталі "Моднага шляхцюка", і захапіла Вас, як ён добра, проста напісаны. А як лёгка было іграць на сцэне... Здаецца, нават вучыць ня трэба было — прачытаўшы раз-два, само ігралася. Наш Гродзенскі гурток беларускай моладзі ставіў "Моднага шляхцюка" ў 1911 годзе. Ігралі 2 разы (падрад, бо мала людзей мясьцілася ў памяшканьні), а 3-ці раз на вёсцы для сялян — у Сакольскім павеце. Я іграла ролю Ганкі... Бяз грыму, амаль не прыгатаўляючыся.

Каруся Каганца бачыла ў Мінску у 1916 ці 17 г. адзін раз. Толькі што бачыла, бо, здаецца, нават з ім не гутарыла — быў вельмі каратка. Але аставіў выпадкова на стале картку паперы — нейкі адрывак свайго твору, ці што. Надзвычайна арыгінальны як почырк, так і правапіс. Я гэтую картку схавала і цяпер яе маю.

А вось брата Каруся Каганца — ваеннага лекара Кастравіцкага (імя, здаецца, Амброжы) — я добра ведала. Прыходзіў у Менску на паседжаньні беларускіх арганізацый з 2 сынамі-гімназістамі. Др. Кастравіцкі з твару падобны да К. Каганца — падоўжаны твар, барада, але высокі, стройны. Сыны (ім было, хіба, па год 18–19) у бацьку — высокія, сымпатычныя хлапцы.

З др. Кастравіцкім я даволі часта спатыкалася і ў іншых справах. Ён цікавіўся жыцьцём нашага прытулку для дзяцей. Скамплектаваў аптэчку з усімі найбольш патрэбнымі лекамі, даваў мне часам парады, як памагчы дзецям у выпадках хваробы і г.д. У 70-я гады я чула, што сям'я др. Кастравіцкага апынулася пад Лідай у Белагрудзе. Я спрабавала даведацца, ці гэта праўда, і што з імі сталася праз рэвалюцыю, у лідзкай газэты. Але нічога ня выйшла.

Што Панізьніка ў Менску німа, ведаю, бо загадзя прыслаў мне павіншаваньне на дзень майго нараджэньня з Крыму ды падпісаў тэлеграму псэўданімам... Аж мусіла шукаць у "Слоўніку псэўданімаў", хто гэта такі. А што выйдзе з маёй кніжкай — ня ведаю. Неяк усё вельмі блытана. Ды ўжо

тое, што ў выдавецкім пляне заместа "Заранкі" напісана "Ранак", насьцярожвае... Што там яшчэ папераменіваюць?

Выразку з "Голасу Радзімы" дасылаю. Першы раз здарылася, што надрукавана ўсё без скарочваньняў, бяз зьменаў.

Усяго добрага! Не забывайце. Прывітаньне Вашай сямейцы. Мае Вас вітаюць шчыра. *Л. Войцікава.*

209. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

6 кастрычніка 1983 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сардэчна дзякую за кніжку пра Галубка[1]. У Менску была я на "Апошнім спатканьні"[2], ўпершыню пастаўленым на сцэне, а "Ганку"[3] сама перадрукоўвала на машынцы. Так што ўспамінаюцца менскія часы...

Вельмі непакоюся, чаму німа ніякай весткі ня толькі з Гудзевічаў, але і ад Дануты Б[ічэль]. Мелася прыехаць, а нават ня піша. Што сталася?

Нарэшці маю адказ ад Г. Цітовіча[4]. Тлумачыцца, што артыкул пра Я. Хвораста мела пісаць балетмайстар Ларыса Алексютовіч[5]. Захварэла, езьдзіла лячыцца і г.д. Але гэта не тлумачыць, чаму ў "ЛіМе" не было весткі аб сьмерці як-ніяк заслужанага для беларускай культуры чалавека...

Ці не хацелі б Вы папрабаваць узмоцніць здароўе ўнука аўсом? Калі хочаце — напішыце, прышлю рэцэпт, як гэта робіцца. Загадзя не падаю, бо дрэнна чуюся і маю шмат работы.

Усяго найлепшага! Прывітаньне для пані Марыі. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

210. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

23 кастрычніка 1983 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Хацелася адразу адказаць на Ваш сумны ліст, але ўжо месяц вельмі дрэнна чуюся. Якраз месяц таму, 23 верасьня, быў доктар. Прымаю лекі, але папраўы амаль німа. Цяпер яшчэ пагоршылася надвор'е, дык улез рэўматызм у левую руку, у ногі, ды і ўсе косьці баляць.

Не ляжу, але сядзець і рухацца цяжка. Заляжалася цэлая гара лістоў — адказаў на розныя пытаньні і просьбы. Стараюся, як магу, хоць пакрысе выпаўняць, а тут усё новыя і новыя. Трымаюся сілай волі і раблю (хоць маруднa) усё задуманае. Бо нашто жыць, калі не ўдаецца нічога рабіць?

Вас, Ваш боль я разумею і шчыра спачуваю, бо і сама вось ужо амаль 8 гадоў не магу звыкнуцца з адсутнасьцю на сьвеце сына. Кожны вечар, як лягу, вачамі памяці бачу, як ён ідзе праз пакой і раптоўна падае без жыцьця...

Я кожны вечар паўтараю сабе: "Яму лепш". Ужо ня мучыцца ні фізычна, ні маральна. Бо яго жыцьцё было вельмі цяжкае. І Вы, дарагая, скажыце сабе: "Яму (Вашаму мужу) лепш". Ня церпіць ужо ніякіх боляў, ніякай вісячай над ім аканчальнай небясьпекі. Усё мінула... Ці ёсьць загробнае жыцьцё? Ці поўны нябыт? Хто ведае... Залежыць ад веры ў тое ці іншае. Усё ж ёсьць Спакой. Нічога ўжо не баліць — ні цела, ні душа... Як часам хочацца гэтага Спакою!

А пераступіць парог — страшна...

Цяпер я ня так часта адна, бо і дачка ўжо толькі месяц мае дапрацаваць да пэнсіі, і ўнук менш працуе. Здаваў экзамін у Каўнасе пры Політэхнічным інстытуце (здаў на 5). Праз месяц паступае ў асьпірантуру. Будзе больш удома вучыцца, а ў Каўнас езьдзіць час ад часу.

Так хочацца Вас бачыць. Час ад часу нехта прыяжджае, але рэдка. Пісала я да Аляксея Міхайлавіча. Адказу — ні слова. Пішучы да яго, пыталася аб Вас і аб Алесі Мікалаевічы [Белакозе]. Аб апошнім ня маю ніякіх вестак ужо месяцы тры. І надалей нічога ня ведаю, што сталася. У апошнім лісьце пісаў, што ізноў ідзе ў шпіталь. На тым і скончылася. Пісала і да Веры Ігнатаўны, але таксама не адказала. Як гэта разумець? Ня ведаю.

Трэба на гэтым скончыць. Прыгатавала да высылкі 2 бандэролі і гэты ліст, а яшчэ 9 ляжыць без адказу. Так цягне легчы...

Усяго добрага, што толькі добрага можа быць. Да пабачаньня. Цалую сардэчна. *Л. Войцікава.*

211. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

26 кастрычніка 1983 г.

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Толькі што атрымала Ваш ліст. Сьпяшаюся адказаць, каб Вы хутчэй змаглі прабаваць рабіць для хворай пані Марыі аўсянае малако. Аўса дастаць Вам, хіба, нятрудна. Каб хоць памагло. Зычу з цэлага сэрца. Я цяпер ня п'ю, бо мушу прыймаць шмат лекаў. Чуюся вельмі дрэнна. Сяньня быў лекар — запісаў далей тыя самыя таблеткі, але заўважыў, што ў мяне ў дадатку — хранічны бранхіт. Лёгкі, але лячыць трэба. А што горш — не даюць мне нават носа высунуць на сьвежае паветра, а яшчэ ж — восень.

Ад Дануты [Бічэль] я мела ліст. Ведаю, што была ў Менску на пленуме паэзіі ў Саюзе пісьменьнікаў. А сяньня даведалася з ліста А. Наліваева, што яна была таксама ў Кушлянах — на сьвяце Ф. Багушэвіча. Вельмі непакоіць мяне маўчаньне Алеся Мікалаевіча [Белакоза]. Ніхто нічога ня ведае. Я раз пісала да Веры Ігнатаўны, але адказу не атрымала. Больш не дакучаю.

Што да Рака-Міхайлоўскага... Як бачу, Вы артыкул Бэргмановай з календара 1980 г. ведаеце. Яна перад гэтым пыталася мяне аб гродзенскім часе. Калі Рак[-Міхайлоўскі] жыў у Гродне, я ёй дакладна напісала, бо ў Гродне ў яго сям'і часта бывала. А яна вось і Смолічаў на Лёсікаў перамяніла, на што я пасьля, атрымаўшы каляндар, зьвярнула ёй увагу.

Можа, Рак-Міхайлоўскі з Гродна выяжджаў, але стала жыў з сям'ёй разам, бо і ў гімназіі выкладаў. Я яго, прыяжджаючы, кожны раз бачыла. А з Менска ведала яго вельмі добра. Але Вы, хіба, ня будзеце пісаць у энцыкляпэдыю, што па яго ініцыятыве быў у Менску скліканы Вайсковы зьезд? Ён сам у той час са сваёй вайсковай часьцю стаяў пад Маладзечнам. Таму ўсю тэхнічную работу па скліканьні зьезду даручыў мне. Я аб гэтым падрабязна пішу ў сваіх успамінах.

Пасьля ўжо, у 1923 г., мы з Р[акам-Міхайлоўскім] спаткаліся тут у Вільні. А. Бэргманова ня мае рацыі, пішучы, што рэдагаваньнем грамадаўскіх газэт займаўся Рак[-Міхайлоўскі] — апрацоўваў матэр'ялы і г.д. Ён даваў свае артыкулы, найчасьцей прамовы ў Сойме і г.д., але займаўся толькі фінансавымі справамі. З яго рук я (як адміністратарка) атрымлівала кожны месяц грошы

і яму давала справаздачы. Ну і падтрымлівалі мы (мая маці і я) сяброўскія адносіны з яго сям'ёй. Мы бывалі ў іх, яны ў нас.

Але ці Р[ак] - М[іхайлоўскі] што пісаў ды друкаваў апрача сваіх артыкулаў у пэрыядычным друку — ня ведаю.

Не магу таксама знайсьці вестак, ці належаў да Выдавецкага таварыства або Т[аварыст]ва беларускай школы. Як бачыце, нічога я Вам не памагла. Можа, што знайшла б, але на гэта трэба часу. А я ўжо і сядзець доўга не магу. І ляжаць стала пры бранхіце нельга. Хоць вазьмі ды павесься...

У нас поўная цяплярня цудоўных хрызантэмаў, але пайсці паглядзець не пазваляюць. Дажылася...

Пішыце. Усяго добрага! Пані Марыі зычу хуткай папраўы. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

Авёс (зерне) — на ўзмацненьне арганізму

Адну шклянку аўсу добра перамыць у некалькіх водах (разоў 5–6 зьмяняць ваду), заліць яго 1, 5 бутэлькі малака і парыць на маленькім агеньчыку 2 гадзіны. Тады перацадзіць (зярняты выціснуць праз марлю), і гэтую жыжку — а яе павінна застацца 350 грамаў — піць 3 разы ў дзень перад ядой. Малако гэтае залацістага колеру і прыемнае на смак. Я цэлай колькасьці (350 гр.) за адзін дзень не выпівала, для мяне зашмат пры хворым страўніку. Але хто можа, то і ўсю дозу за дзень можа выпіць.

212. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

30 кастрычніка 1983 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Дзякую за ліст, за тое, што зьбіраецеся прыехаць. Вельмі хачу Вас бачыць. Здароўе не папраўляецца. Хвароба моцна мучыць. Але сілай волі трымаюся. Учора і сяньня пастанавіла адказаць на лісты, якія, як камень, ляжалі на маім сумленьні. Ліст да Вас — сёмы.

Што Вы былі ў Кушлянах, я ведала. Анатоль Наліваеў, які езьдзіць паміж Маладзечнам і Менскам, акуратна паведамляе мяне аб усіх падзеях. Апрача паэта Някляева[1], усіх, хто там быў, ведаю асабіста. М. Ермаловіч даўней, як быў здаровы, часта пісаў і прыязджаў. Цяпер зрэдку піша пару слоў. Ведаю, што жонка Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча] хворая — пісаў.

Дзякую за вестку аб Алесю Мікалаевічу [Белакозу]. Відаць, таму не пісаў, што скрывае, дзе лечыцца. Але што за сакрэт? Я пісала да Веры Ігнатаўны[2], але яна мне не адказала. Белакоз, едучы ў шпіталь, прасіў мяне прыслаць копію аднае драбнічкі, якую я яму паслала на 90-я ўгодкі Максіма Б[агдановіча], і яна ў іх недзе загубілася. Я выслала і прасіла Веру Ігнатаўну, каб паведаміла, ці атрымалі. Можа, мой ліст загінуў, а можа — яе? Добра, што хоць яшчэ жывы. Можа, як прыйдзе да сябе, успакоіцца.

Кожны дзень абяцаю сабе, што засяду за "Старое Гродна". Каб мне так не балела — даўна б скончыла. Столькі напісаўшы, змучылася — таму канчаю.

Цалую сардэчна і чакаю. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

213. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

7 лістапада 1983 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Сьпяшаюся падзяліцца з Вамі добрымі весткамі. Перадусім — атрымала лісты-адказы ад С.Х. Александровіча, У. Казьберука[1], з Мясоцкай школы (пасылала ім насеньне кветак), а галоўнае — ад Алеся Мікалаевіча [Белакоза]. Апошні піша, што напісаў да мяне даўгі, падрабязны ліст, але — ня выслаў, недзе зьнік. Як знойдзе — вышле, а пакуль што піша коратка. Усё ў клопатах аб музэі. Ляжыць у тубэркулёзным шпіталі (гэта ■ ніяк не магу зразумець... чаму?). Калі выйдзе — адтуль напіша.

А яшчэ адна нечакана добрая вестка — з Прагі. Зрушылася з мейсца справа спадчыны М. Забэйды. Забірае яе ў Менск Музэй-архіў. Калі гэта будзе — яшчэ няведама. Але добра і тое, што аб сваёй пастанове Прагу паведамілі.

А вось мне пахваліцца німа чым. Абяцала Вам не хварэць, пакуль ня скончу пісаць аб Гродне, а ўчора цэлы дзень ляжала. Усё хвароба страўніка не дае жыць. Надвор'е гнілое — ад гэтага баліць галава. А як прыймаю што ад болю галавы — шкодзіць на страўнік. Такое блуднае кола. Але — перамагу ўсё і напішу.

Цалую шчыра. *Л. Войцікава*.

214. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

19 лістапада 1983 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Нарэшці высылаю Вам "Старое Гродна". Так, як Вы хацелі,— нічога не перапісывала, шлю, як напісалася, жыўцом. Ды, зрэшты, я ніколі нічога не перапісывала і не папраўляла — ня ўмею. Калі ласка, прачытайце, можа, разам з Аляксеем Міхайлавічам [Пяткевічам], што неабходна — папраўце, калі наагул мая пісаніна нечага вартая. Цяжка пісаць, калі чалавеку ўсё баліць. Ад галавы да ног.

Вось ужо сапраўдная зіма. Марозік маленькі, а сьнегу даволі шмат. Гэта добра, бо прыкрытыя расьліны. Слаўка яшчэ не забясьпечыў на зіму вінаград і ружы, а цяпер усё звалілася адразу. Сяньня Лявон устаўляе дубэльтовыя вокны. Будзе цяплей. Зрэзалі апошнія хрызантэмы — кусты на зіму Слаўка выносіць у склеп. Каб хоць добра перазімавалі.

Прыкра, калі чалавек даходзіць да такога стану, што ўжо ня можа нічога рабіць — толькі ўспамінаецца, што некаліcь усе работы ўдома і ў садзе рабіла сваімі рукамі. І то доўга, бо яшчэ маючы 65 гадоў, цэлы гарод сама капала. Мо таму так доўга жыву?

Ці Вы атрымалі мой апошні ліст, у якім я пісала, што справа спадчыны М. Забэйды зрушылася з мейсца? Што ў Вас чуваць? Як маецеся? Што ў Пяткевічаў? Ніхто ня піша. Алесь Мікалаевіч [Белакоз] ізноў замаўчаў.

Учора атрымала даўгі ліст ад М.П. Пазьнякова[1] — аб справах музэю М. Багдановіча. Нічога пацяшаючага. Дырэктара *яшчэ* німа. І кандыдата, мусі, таксама німа. Мусі, у тыя старыя часы, калі ўсё рабілася прыватна, ніхто нікому не плаціў, на грошы не аглядаліся, і ўсё ішло спарней.

Цалую сардэчна. Пішыце. Ад маіх — прывітаньне.

22 лістапада

У канцы — такая просьба. Калі “Старое Гродна” падыйдзе да друку, то, вядома, будзе перадрукавана на машынцы. Можа, можна будзе друкаваць у 2 экзэмплярах і адзін з іх прыслаць мне? У мяне ж інакш і сьледу не застанецца. Матэр’ял гэты быў ужо гатовы 19 лістапада. Але пралежаў да сяньня. З 19 на 20-е ўночы мне было так дрэнна, што ня мела надзеі падняцца. Неяк прайшло. Заўтра буду прасіць Лявона, каб выслаў. У які дзень ён гэта зробіць? Ня ведаю. Мо ў сераду? У чацьвер? Буду прасіць, каб як найхутчэй выслаў.

Вельмі мне прыкра, што так невыразна напісана — будзе клопат з чытаньнем. Часам пішу лепш, часам горш — залежыць ад болю галавы, а боль залежыць ад надвор’я. Лепш бы ўжо была зіма з марозікам, чым такія гнілыя, цёплыя дні.

Усяго добрага! Буду чакаць адказу. Шчыра — *Л. Войцікава.*

Ніяк ня скончу дапісываць. Вы, мілая пані Дануся, казалі, што часта бачыце Ягоўдзіка. Калі ласка, пры спатканьні вазьміце ў яго для мяне адрас сваякоў М. Забэйды. Хачу ім паслаць здымак магілы сьпявака. Думаю, што праз Вашы рукі хутчэй адрас да мяне дойдзе, чым калі я буду прасіць Валодзю асабіста.

215. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

20 лістапада 1983 г. Вільня

Паважаны пане Адаме.

Сардэчна дзякую за адказ і за цікавыя бібліяграфічныя картачкі. Аб зборнічку “Толькі сон” з маім апавяданьнем я ведала, нават мне яго прыслалі ў лістападзе 1981 г., але я яго так схавала, што цяпер аніяк не магу знайсьці. З часам знойдзецца. Апавяданьне “Толькі сон” напісанае ў Менску, друкавалася ў “Вольнай Беларусі”, а пасьля ў “Хрэстаматыі” І. Дварчаніна. А вось другое — “Прыйдзі да нас, Хрысце” — гэта неспадзяванка. Напісана ў Менску. Друкавалася ў 1922 г. у студэнцкім часопісе “Наш шлях” у Вільні.

Што да “Зборнічка жыцьцяпісаў”[1], то я ўжо і сама пастанавіла дадаць біяграфію М. Забэйды, тым больш, як мне пісалі з Прагі, справа спадчыны сьпевака зрушылася з мейсца, менскі Дзярж[аўны] музэй будзе яе браць. Толькі гэты зборнік ці, дакладней, яго копію перашлю Лідзіі Іванаўне Збралевіч яшчэ ня зараз, бо трэба ўклеіць здымкі і аправіць у вокладку.

Нядаўна праф[эсар] Ф.М. Янкоўскі перадаў туды ў бібліятэку рукапісаў мой рукапіс “Медадайныя расьліны”, які я Фёдару Міхайлавічу некалісь падаравала. Там ужо нямала майго ёсьць. Лідзія Іванаўна [Збралевіч] (ведаю яе асабіста) нядаўна пісала — просіць прыслаць яшчэ... Але ў мяне ўжо ня пішацца. Скончылася.

Як цяпер Вашае здароўе? Думаю, што ў Менску шмат хто хварэе, напрыклад, Арсень Ліс. Паслала яму даўна здабыты для яго патрэбны матэр’ял (аж з Польшчы) і ня ведаю, ці атрымаў. Мо сам хворы, мо жонка або дзеці...

У нашым лясным кутку — белая зіма. Марозік невялікі, ня больш –5, а днём даходзіць і да +2. Цікава, як будзе далей...

Усяго найлепшага! Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

216. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

5 сьнежня 1983 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

Цешуся, што магу Вам даць падрабязныя весткі пра Ф. Аляхновіча і яго творы. У "Хрэстаматыі" І. Дварчаніна ёсьць жыцьцяпіс, бібліяграфія. Надрукаваныя 3 вершы і п'еса ў 4 актах "Няскончаная драма". Апрача таго, ёсьць у мяне 2 кніжачкі — 2 сцэнічныя творы: "Калісь" і "Птушка шчасьця" — п'еса ў 3 актах з песьнямі і нотамі да іх.

Паміма таго, што Ігнат Дварчанін піша, быццам у гісторыях літаратуры Аляхновіча называюць "бацькам беларускай драматургіі", мне асабіста яго творы ня вельмі падабаюцца. Але гэта справа густу. На гэта німа рады...

Я Ф. Аляхновіча і асабіста ведала, але больш спатыкаўся з ім мой муж — Антон Войцік. Я да гэтага знаёмства і не імкнулася, бо Ф. Аляхновіч — піў... і з п'яніцамі сябраваў, а я ўсё жыцьцё ненавідзела п'янства і п'яніцаў. Таму і муж мой спатыкаўся з Аляхновічам рэдка калі... На сцэне твораў Ф. Аляхновіча я ня бачыла. Што ў яго выйшла з працягам "Паўлінкі"[1] — ня ведаю. Неяк і Дварчанін у "Хрэстаматыі" нічога аб гэтым не ўспамінае. Да працы ў драматургіі Аляхновіч быў добра падгатаваны, бо вучыўся ў драматычнай школе ў Кракаве і ў школе Музыкальнага т[аварыст]ва ў Варшаве.

Зразумела, не магу я Вам лістоўна перадаць усяго жыцьцяпісу з "Хрэстаматыі" ды ўсіх твораў, якія маю. Вы езьдзіце ў камандзіроўкі — прыедзьце, усё прачытаеце, што спатрэбіцца, перапішаце ці перадрукуеце на машынцы (яна ў нас ёсьць), калі ўмеце на ёй пісаць. На гэта хіба і вольнага дня — у суботу ці нядзелю — хопіць. Магу дадаць, што Ф. А [ляхновіч] пісаў таксама маленькія апавяданьні прозай пад псэўданімам *Монвід*. Цікава, што Аляхновіча німа ў "Слоўніку псэўданімаў".

Канец яго быў трагічны[2]. Пісаць аб гэтым ня буду. Калі прыедзеце, раскажу.

Дзякую за прывітаньні Вашай жонкі і Юлі. Ім шлю сардэчныя, добрыя пажаданьні. Думаю, што Юля яшчэ няхутка зможа скарыстаць з маёй кніжкі, калі яна і выйдзе. Можа, пару вершыкаў адпаведных знойдзецца, але ▪ наагул пісала ў "Заранцы" для падросткаў, якія ўжо і самі прысылалі свае працы да друку.

Пішу даволі блытана. Дрэнна чуюся — віна такога гнілога надвор'я. Гэта шкодзіць моцна — баліць галава, трымаюся на таблетках. Лістоў безьліч. На самыя розныя тэмы. Стараюся ўсім адказываць. Кажу, што шмат лістоў з пытаньнямі атрымліваю, але я на гэта не наракаю. Без такой работы дажываць сваё жыцьцё было б сумна і пуста. Што трэба — пытайцеся, пішыце.

Усяго найлепшага. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

217. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

6 сьнежня 1983 г. Вільня

Даражэнькая пані Данися.

Цешуся, што "Старое Гродна" дайшло, бо якраз сяньня атрымала вестку з Менска, што мой высланы ліст з патрэбнай інфармацыяй — прапаў. Ніколі нельга быць пэўным, што дзе дзенецца.

Дзівіцеся, скуль браліся ў нас грошы? Проста тыя людзі, што грошы мелі,

былі больш ахвярныя і грамадзка сьвядомыя. Так, напрыклад, Кляўдыюш Душэўскі[1] (Вам, хіба, гэта прозьвішча знаёмае?), працуючы ў Коўне як будаўнік-інжынер (і сяньня там яго дамы стаяць), сам сябе ападаткаваў — кожны месяц пэўны працэнт са сваіх заробкаў адсылаў у Вільню — як дапамогу на ўтрыманьне Беларускага музэю імя Івана Луцкевіча[2].

Пры Беларускім банку ў Вільні быў фонд для незаможных вучняў Віленскай Беларускай гімназіі. Ён складаўся з ахвяраў сяброў гэтага Беларускага каапэратыўнага банку. Нават сяляне, калі праводзілі нейкія грашовыя апэрацыі праз банк, хоць дробную суму ахвяравалі на гэты фонд.

У 1937 годзе, калі мы ставілі помнік на магіле Ядвігіна Ш., у 15-я ўгодкі яго сьмерці, паўстаў ён з ахвяраў.

А як утрымалася часапіс "Студэнцкая думка"? Студэнты зьбіралі грошы на гэтак званыя падпісныя лісты. У 1925 г. пару старонак заняла справаздача з такога збору. Надрукавана: № падпіснога ліста, прозьвішчы ахвярадаўцаў, хто колькі даў, хто зьбіраў. Агульная сума — агульная ўсім падзяка. А давалі хто колькі змог — ад 50 грошай да 25 злотых...

А людзі працавалі бясплатна — тыя, хто меў асобную платную працу, з якой жыў. Зразумела, гэта значыла працаваць на два бакі. Нялёгка... Але калі трэба было — усё было магчыма, на ўсё чалавека хапала.

Я ведаю, разумею, што такое сяньня немагчыма. Іншыя абставіны, іншая арганізацыя працы. Але і сяньня ёсьць людзі, якім хапае на будаваньне дачаў і на машыны. Самі кажаце, што той, хто добра зарабляе, скрывае гэта. Вось гэта і бяда. І які парадокс — той, хто ледзь канец з канцом вяжа, аддае бясплатна свой час, а ня раз і сваю капейку. А той, хто шмат мае матэр'яльных скродкаў, ня дасьць ні часткі іх, ні часу, бо ён яму патрэбны, каб багацьце расло.

Мо і без патрэбы я аб гэтым Вам пішу — нэрвую. Якраз учора я шукала ў "Студэнцкай думцы" патрэбнага мне артыкулу, і кінулася ў вочы тая справаздача са збору грошай на падпісныя лісты. Вось і закруцілася ў памяці, што і як рабілася.

Цяперашняе надвор'е — ні восень, ні зіма, ні вясна — зусім адымае апошнія капелькі сілы, апошнія нэрвы. Галава баліць? Не, не баліць. Мазгі — быццам сьціснуты кляшчамі, аж дранцьвеюць. Цэлы дзень глытаю таблеткі, а рэзультат? Шкодзіць на страўнік. Галі галава баліць дзень і ноч — і настрой адпаведны.

Ці гэта мне здаецца, ці Вы некаліcь казалі, што добра было б мець Вам у музэі мае ўспаміны пра Г. Леўчыка? Напішыце. Якраз А. Наліваеў прывёз мне цэлую кучу розных здымкаў, сярод якіх аж 4 здымкі Леўчыка. Тэкст можна перадрукаваць з майго экзэмпляру. Пакуль што пасылаю Вам здымак: Г. Леўчык і я — у Варшаве ў 1914 г. Я вельмі дрэнна выйшла, але Гальяш — добра.

Калі што трэба — пішыце, што змагу — зраблю. Яшчэ хоць адзін ліст трэба напісаць. Усяго Вам найлепшага! Цалую шчыра — *Л. Войцікава.*

218. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

26 сьнежня 1983 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Машынапіс (у 2 капэртах) атрымала — шчыра дзякую. Хацелася адразу напісаць, падзякаваць, але апанаваў мяне грып. Ужо 2 тыдні кашляю, страшэнны катар, боль галавы. Тры ночы амаль ня спала (2–3 гадзіны ўсяго). Як

заўсёды, у мяне грып без гарачкі. Добра і гэта. Учора больш як паўдня ляжала. Але пасьля ўстала, бо мы са Славай былі адныя. Галя з мужам а 1-й гадзіне пайшлі, бо ў іх год у год на першы дзень Каляд — госьці.

Са Слаўкай нам удваіх добра, але не магу ўсялякай работы зваліць на яго, бо нешта кашляе — гэта раз, а па-другое, мае шмат сваёй навуковай работы як асьпірант, і то на завочным курсе. Да таго ж, не на мейсцы, а ў Каўнасе. Трэба прыгатаўляць работы і езьдзіць да свайго прафэсара, які яго працай кіруе. Сяньня Галя была апошні раз на рабоце. Новы расклад пачнецца пасьля зімовых канікулаў.

Каторы ўжо дзень пішу павіншаваньні і ніяк не магу дайсьці да канца. Шмат каму па некалькі слоў, але прыходзіць нямала лістоў з павіншаваньнямі ды адначасна з нейкімі справамі-пытаньням. Гэтыя забіраюць шмат часу. Не люблю пісаць абы з рук — часта трэба добра пакапацца ў розных крыніцах.

Просіце дараваць, што не змаглі прачытаць прозьвішча? Гэта я Вас мушу перапрасіць, што так напісана. Помню, што ў гэтым прозьвішчы былі робленыя папраўкі. Гэта была блізкая сваячка маёй "гродзенскай" (я так называла) бабулі — *Коляртова.* Яна заўсёды бабулі расказывала, куды і чаго з Э. Ажэшкай хадзілі, што запісывалі. А бабуля, як мне было 8–9 гадоў, усё расказывала мне, каб ведала, "як пісьменьнікі працуюць". Прытым заўсёды я сядзела ў бабулі на каленях. Такая вялікая дзяўчынка. Але была я ў дзядоў тады адзінай унучкай і вельмі пешчанай. Маміныя бацькі былі больш стрыманыя і наагул унукаў ня песьцілі ў такі спосаб.

Што да "Старога Гродна", ці лепш — да машынапісу, маю адну засьцярогу. Я пісала, што "Дамініканскі касьцёл у пэўным часе (у які год — ня помню) быў забраны царскім урадам і перароблены на царкву — *Гарнизонный собор*, а пасьля 1-й сусьветнай вайны ізноў перарабілі на касьцёл" (назоў той самы — Дамініканскі). Калі ласка, паглядзіце рукапіс. Можа, я там не зусім ясна выразілася? Бо так, як у машынапісе, выглядае, быццам Саборны — гэта тэксама *назоў* таго ж самага *касьцёла.*

Удзень чулася неяк лепш. А цяпер ізноў горш, а як кашляю — усё баліць у сярэдзіне. Галя прынясла новыя лекі.

Маю да Вас просьбу. Атрымала павіншаваньне ад мастака Уладзіміра Кіслага[1]. Не магу падзякаваць, бо ня маю адрасу. Калі ласка, пры магчымасьці скажыце яму, што вельмі ўдзячная за памяць, за ўвагу. Выбачайце за клопат.

Усяго добрага! *Л. Войцікава.*

219. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

6 студзеня 1984 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Учора атрымала Ваш ліст. Дзякую за навагоднія зычэньні. А ці Вы мае атрымалі? Пытаюся, бо ў апошні час нешта дзіўнае робіцца з лістамі — гінуць і мае, і да мяне. Гэтак сталася і з маім адказам на Ваш ліст у справе дачкі Рака-Міхайлоўскага. Я Вам адказала даволі хутка і падрабязна.

Пісала аб ёй ці толькі прапанавала (гэтага ня помню) напісаць аб працы Рака-Міхайлоўскага ў Менску (1916–1917 гг.), спатканьнях з ім і яго сям'ёй у Гродне, а пасьля аб сталым кантакце ў Вільні. Сяньня аб гэтым усім не пішу — пачакаю крыху, мо сытуацыя на пошце паправіцца. Апрача таго, маю сьпешных

5 лістоў — заляжаліся, падумаюць людзі, што мяне ўжо німа. А я яшчэ трымаюся, хоць вельмі дрэнна чуюся. Дзьве апошнія ночы зусім ня спала — ні хвілінкі.

А тут яшчэ просьбы: С. Шушкевіч прыслаў сваю новую кніжачку вершаў для дзяцей, просіць напісаць хоць кароткі водгук; удава Бачылы ўжо даўна просіць напісаць аб сустрэчы і карэспандэнцыі са с.п. Алесем Мікалаевічам; У. Мархель ня можа дачакацца майго ўражаньня ад "Лірніка вясковага"[1]. Найгорш з С. Шушкевічам — вершы добрыя і па форме і па зьместу, але бянтэжыць загаловак кніжкі — "Казачны церам". Ці ж гэта па-беларуску?

Вось усё гэта вісіць над галавой. Парадзіцца німа з кім. Каб сын жыў — было б інакш. Хутка (26 студня) ўжо 8 гадоў, як я пазбаўленая добрай помачы і парады.

Ці паказывала Вам Данута Іванаўна [Бічэль] маё "Старое Гродна"? Ці прачыталі? І што на гэта скажаце?

Данута Іванаўна, як і абяцала, передрукавала на машынцы і экзэмпляр мне прыслала ўзамен за рукапіс. Я яе прасіла, калі што трэба паправіць, але з парай папраўак не магу пагадзіцца. Я напісала, што Дамініканскі касьцёл у свой час забралі і перарабілі на царкву, назваўшы *Гарнізонным саборам*. У яе выйшла: "Касьцёл быў то Дамініканскім касьцёлам, то саборам". Ці не выглядае, што гэты касьцёл часам меў *назоў* Сабор? А можа, я цяпер што блытаю? Рада была б, каб Вы прачыталі і мне напісалі.

Толькі не кажыце Дануце, што я пісала — можа пакрыўдзіцца. А другое трэба абавязкова паправіць: у мяне *польная* дарога — у яе *конная* дарога. Ну, але калі б пайшло ў друк, то там рэдактары не адно па-свойму пераробяць, бяз гэтага не абыйдзецца.

Гэтак і з маім зборнікам. Перакідалі з рук у рукі, і ніхто нічога не зрабіў. Узяўся А. Вольскі. Пісаў мне Г.А. Каханоўскі, што рукапіс ці машынапіс *кніжачкі* бачыў ужо ў Я. Саламевіча, які мае пісаць прадмову. Значыцца, зрабілі *кніжачку* (а там было столькі матэр'ялу, ды ня рукапісаў, а ўсё ўжо друкаванае) зусім без майго ведама. Лепш бы яе зусім не было...

Цяпер Г.А. Каханоўскі піша мне, каб я сама запрапанавала свае "Успаміны" выдавецтву "Мастацкая літаратура". Я спачатку ўхапілася за гэтую думку, але пасьля падумала, што баюся. Трэба ж знайсьці рэдактара, абдумаць, выбраць — там жа ня ўсё можа пайсьці ў друк... А хто ж за гэта возьмецца? Ізноў было б тое самае — перакідалі б адзін другому ды рабілі б усё без майго ведама. Няхай ужо ляжыць. Так спакайней.

Ці ня ў тым маім загінулым лісьце быў мой адказ на Вашу просьбу ўзгодніць гады (даты) маіх здымкаў, якія паслаў Вам Лявон? І чаму ён іх не падпісаў адразу? Я і ня вельмі арыентуюся, што ён пасылаў, бо мне не паказаў.

Буду чакаць ад Вас весткі. Мо неяк карэспандэнцыя наладзіцца. Што ў Вас чуваць? Як здароўе пані Марыі? Як — унука? Паміж іншым — ня ведаю, як імя Вашага ўнука, а таксама як па бацьку п. Марыю.

Усяго найлепшага ўсім у Вашым доме. *Л. Войцікава*.

220. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

14 студзеня 1984 г. Вільня

Дарагая Данута Іванаўна.

Дзякую Вам за ліст з 8 студзеня, за ўсе весткі. Дзякую таксама за адрас ма-

стака У. Кіслага. Я з вялікай прыемнасьцю да яго напісала б, але Вы мне не далі яго імя па-бацьку, ня ведаю, як зьвярнуцца. Ужо тое, што ён з Гродзеншчыны, ды яшчэ з Дубна, мае значэньне. З Дубна паходзіў адзін з першых чытачоў "Заранкі" — Сяргей Крывец[1]. Свае першыя вершы, што прысылаў ў "Заранку", падпісываў *Сярожа Пастушок*. Мілы быў і сьціплы ў сваіх лістах хлопчык. Пакуль не заняўся палітыкай, ня трапіў пад уплыў "вялікіх дзеячоў". Ды аб гэтым доўга пісаць. Можа, калі пры сустрэчы раскажу.

Аб мастаку У. К [іслым] зусім ня думаю нічога дрэннага. Я ж разумею ўсю нэрвовасьць, узбуджанасьць высказываньняў Алеся Мікалаевіча [Белакоза]. У першую хвіліну магла паверыць таму, што ён піша, але падумаўшы, вера ў яго словы не магла ўжо быць так непадрыўная. Што ж гэта з А.Б. ізноў сталася? Перапрацаваўся ці што? У сьнежні атрымала ад яго 2 лісты. Такія бадзёрыя, радасныя. У першым прыслаў магчыма падрабязнае апісаньне музэю, экспанатаў. Новы помысл — стварыць (ужо пачаў) аддзел "Лекавыя расьліны", вядома, з беларускімі назовамі, народнымі рэцэптамі. Я, зразумела, прыняла гэты помысл з энтузыязмам, абяцала як найбольшую помач. Адказ атрымала хутка. У тым лісьце пісаў, што "поўны энэргіі, паздаравеў". То што сталася? Цяпер нават ня ведаю, ці мой ліст атрымае — хіба што Вера Ігнатаўна яму завязе. А я пыталася, як, у якой форме экспанаты да гэтага аддзелу рабіць.

Хочацца, пакуль яшчэ магу, зрабіць як найбольш, каб хоць праз музэй пратэставаць процiў розных *іван-чаяў, кіпрэяў, глогаў* ды падобнай бязглузьдзіцы — ранаў на нашай мове. А ці надоўга мяне хопіць? І так сама дзіўлюся, скуль яшчэ бярэцца памяць і крыху сілы. Але штораз цяжэй. Можа, гнілая зіма так дзеіць, а можа, ужо арганізм дайшоў да канца сваіх магчымасьцяў. Ну, німа аб чым гаварыць. Пустая гутарка.

Тым больш, ёсьць іншая тэма: Слаўка жэніцца! Але і тут для мяне ня ўсё проста. З аднаго боку — вельмі радая і спакойная, што ня будзе ў ніякім выпадку адзін-самотны. А з другога — зьнікае ўсялякая надзея, што астаўлю пасьля сябе нашчадка, які прадоўжыць маю даўгалетнюю дарогу. Жэніцца з літоўкай, і то далёкай — аж з былой Жмудзі. Бацька яе — паляк, але відаць, пад пантофлем жонкі (а ліцьвіны — вялікія шавіністы), бо мовы бацькавай дачка ня ведае... так, некалькі слоў. Значыцца, запануе ў нас літоўская мова (я яе ня ведаю зусім), і я буду вылучаная ў сям'і яшчэ больш, чым цяпер.

Пэрспэктывы, як бачыце, нярадасныя. Ну, нічога. Абы Славе добра было. Я ж яго гадавала больш, чым матка, і ён для мяне больш, чым унук. Ды і адносіцца да мяне сардэчна.

Асабліва цяжка мне ў гэтым месяцы. 26 студзеня спаўняецца 8 гадоў ад дня сьмерці сына. Тут удома ніхто аб гэтым ня ўспомніць. Нават Слаўка заражаны эгаізмам і абыякавасьцю. У гэтым выпадку не хапае мне Ларысы Антонаўны Геніюш. Год у год перасылала мне некалькі спачувальных слоў і дадавала: "У гэтыя гадзіны я з Вамі". Другая — гэта Вера Андрэеўна Ніжанкоўская (1-я жонка Б. Тарашкевіча). Ці напіша сёлета?

Як бачыце, атмасфэра нярадасная і неспакойная. Спачуваю Вам і Вашай маме, што страцілі блізкага чалавека. Сколькі б гадоў ні меў — страта балючая. Нейкі цяжкі быў для людзей мінулы год. Пасьля сьмерці с.п. Алеся Бачылы пачала пісаць мне яго жонка.

Прыкра і незразумела, чаму яна праз 40 гадоў супольнага жыцьця не пастаралася навучыцца мужавай мовы, але што зрабіць, цяпер гаварыць аб

гэтым позна. І віна тут ня столькі яе, як Алеся Мікалаевіча [Бачылы]. Ня перагэтым позна. І віна тут ня столькі яе, як Алеся Мікалаевіча [Бачылы]. Ня пер-шая сям'я такая. І вось яна была некалькі месяцаў у Жалезнаводзку. Паехала паставіць помнік на бацькавай магіле. У гэты час сястра — раненая ў аварыі — лягла ў шпіталь. Прыйшлося астацца даглядаць хворую ўжо некалькі гадоў матку. Цяпер, вярнуўшыся ў Менск, піша: "Вярнулася, пахаваўшы матку і цётку, сястра яшчэ не зусім паправілася". Ці ж не трагедыя?

Вось намазала — вочы Вам забаляць. Сардэчна цалую і чакаю весткі. Чым я магу памагчы Вам у музэі? *Л. Войцікава.*

221. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

20 студзеня 1984 г. Вільня

Даражэнькая Данута Іванаўна.

Усё чакала весткі ад Вас — адказу на маё пытаньне. Як па-бацьку мастака Кіслага? Не магу да яго напісаць, і гэта мяне мучыць. Так што чакаю.

Адначасна хачу Вас запытацца, ці Вам у музэі спатрэбіліся б старыя гадавікі "Полымя"? Не цяперашнія, а, як я зразумела з ліста ўласьніка, амаль з першых гадоў існаваньня часапісу. Калі гэты чалавек мне аб "Полымі" пісаў, я Вас не запыталася, а пасьля ён цяжка хварэў — было вельмі дрэнна... Так я і ня думала справу выясьняць. Цяпер, на шчасьце, паправіўся. Можна з ім увайсьці ў кантакт. Запытаюся, можа, яшчэ што мае.

Стараюся нечым заняцца, нешта рабіць хоць крыху карыснае, каб ня думаць аб сваіх недамаганьнях, болях і г.д. Ах, як усё гэта надакучыла...

А тут яшчэ нейкая нядобрая вестка заскочыць. Я, хіба, Вам пісала або гаварыла, што маю старога знаёмага з 20–30-х гадоў, які жыве ў Польшчы. Мы з ім стала і часта карэспандуем. Прысылае мне розныя цікавыя весткі, інфармацыі. І вось тры дні таму атрымала ліст ад яго жонкі. Піша: "Муж у шпіталі, на самыя Каляды яго зваліў інфаркт..." Быццам нягрозны, і хворы папраўляецца. Але ж гэта — пачатак. А што далей? На як доўга гэтага "лепш" хопіць? Вось так і жывецца — ад бяды да бяды.

А што ў Вас? Як здароўе? Як працуецца? Ці ёсьць што новае? Пішыце. Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

222. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

23 студзеня 1984 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Так я затрымалася з адказам, што можаце падумаць нешта нядобрае — або ліст ізноў загінуў, або са мной што сталася. На гэты раз нічога такога — проста не было часу. Былі сьпешныя лісты, выкліканыя нядобрымі весткамі. Ізноў з Польшчы.

Я Вам, можа, пісала або казала, што ў Польшчы ў Інаўроцлаве жыве стары віленскі дзеяч[1] і мой знаёмы з 20–30 гадоў. Стала мы з ім падтрымліваем сувязь. Нямала прысылаў мне каштоўных вестак, нямала перапісываў пасланых яму матэр'ялаў і перасылаў (на маю просьбу) іншым адрасатам.

І вось у мінулым тыдні пасьля даўжэйшага маўчаньня атрымала вестку ад яго жонкі. Піша, што на самыя Каляды мужа зваліў інфаркт. Быццам не цяжкі,

і ўжо хвораму лепш. Але самі ведаеце, першы можа пацягнуць за сабою і далейшыя. Чалавеку ж каля 75 гадоў. То чаго можна спадзявацца? Вельмі моцна мяне гэтая вестка прыбіла.

А пасьля два дні — поўная хата гасьцей. Напэўна, ведаеце, што 17 студня ў Новай Вялейцы ў беларускім аддзеле кнігарні была выстаўка бел[арускай] кнігі і сустрэча беларусаў з Менска і Вільні. З Менска быў А. Мальдзіс, з Вільні чацьвёра беларусаў і адзін ліцьвін — прыхільнік беларусаў, як сам сябе назваў, др. Банайціс[2]. І вось 19-га А. Мальдзіс і др. Банайціс былі ў нас. Лепш сказаць — у мяне, бо ў маіх — дачкі і зяця — былі папярэдняга дня.

А 20-га з Менска неспадзявана зьявіліся аж 4 чалавекі. 2 студэнты журналістыкі (адзін з іх, С. Дубавец[3], быў ужо не адзін раз), супрацоўнік "ЛіМу" і супрацоўнік "Помнікаў архітэктуры і культуры". Ізноў цэлы дзень страчаны, бо ўвечары ўжо не было сілы. Ім жа трэба было ўсё паказаць, расказаць, прыпомніць. А сілы ўжо ня тыя, што калісь. Толькі надзіва памяць усё не адмаўляецца служыць. Ці гэта такі даўгі трэнінг яе трымае?

Пішаце, што ў мяне цікавая манера апавяданьня. Я думаю, што гэта памятка з кіеўскай школы. Я Вам казала, што ў нас былі розныя гурткі, у тым ліку літаратурны. Літаратурны заўсёды зьбіраўся ў нядзелю, і тады ў нас былі гадзіны імправізацыі. Наша выкладчыца літаратуры (вельмі здольная пісьменьніца, аўтарка шматлікіх сцэнічных твораў для моладзі) сядзела ў цэнтры, мы вокал яе. Яна пачынала расказ на якую-небудзь тэму, даводзіла да пэўнага пункту, перарывала і загадывала каторай з нас: расказывай далей. І так адна за другой разьвівалі тэму. Адна карацей, другая даўжэй — у залежнасьці ад здольнасьцяў і фантазіі. Вельмі было цікава. Так у мяне і засталося. Я не пішу — я расказываю...

Я ніколі нічога не пішу на чорна. Можа, гэта і нядобра? Іншы апрацаваў бы, адшліфаваў, а я ня ўмею. Так і засталася прывычка імправізацыі.

Як жыў мой с.п. сын (26 студня ўжо 5 гадоў, як яго німа), то я яшчэ радзілася з ім. Цяпер ня маю з кім. Дачцэ даю прачытаць — часам знойдзе якую памылку, прапушчаную літару ці што. Зяць майго почырку ня можа чытаць — не разьбірае. А як дала машынапіс "Старога Гродна", што мне Данута [Бічэль] прыслала,— прачытаў і бяз слова палажыў. Другі раз ужо нічога чытаць ня дам...

І цяпер вось маю немалы клопат і ня вельмі ведаю, што зраблю. Справа тычыцца Гудзевіцкага музэю. Алесь Мікалаевіч [Белакоз] прыдумаў адну рэч, якая мне вельмі спадабалася, і я разьвіла думку далей. У сувязі з маім "Батанічным слоўнікам" Алесь Мікалаевіч пастанавіў зрабіць спэцыяльную плянту "Лекарскія зёлкі". Вядома, *чыстыя беларускія* назовы расьлін і па магчымасьці народныя спосабы ўжываньня — рэцэпты. Я з радасьцю згадзілася памагчы — даць матэр'ялы і запрапанавала даць каляровыя здымкі расьлін. Больш бы прыцягівала ўвагу.

Гэта быў бы ідэальны спосаб пашырыць ужываньне чыстых беларускіх назоваў заместа гэтых недарэчных *адуванчыкаў, зьверабояў, пустырнікаў* і г.д. І вось цяпер А. М[ікалаеві]ч просіць пасьпяшыць і даць хоць некалькі рысункаў-ілюстрацыяў. А дзе іх узяць? Я маю кніжку, выданую Славацкай акадэміяй,— "Атлас лекарственных растений" — з каляровымі здымкамі з натуры. Здаецца, проста — зрабіць копіі на каляровую плёнку і даць адбіць... А тым часам — бяруць ня вельмі ахвотна, другое — робяць вельмі доўга, трэцяе — колеры немагчымыя, нічога падобнага да арыгіналу.

У зяця шмат каляровых слайдаў, але ўсе адбіваныя за мяжой. А кожная та-

кая пасылка рызыкоўная — дойдзе або не. Вось — сама запрапанавала, а што далей? Падумала, што некалькі штук можна адрысаваць (зрабіць копіі) ад рукі. Каб было далікатней — акварэлямі. Але ізноў — хто гэта зробіць? Да мастакоў з гэтакай прапановай ня зьвернешся. Гэта ж не старыя часы — энтузыястаў німа. Асабліва ў такой дробнай справе.

Нарабіла сабе бяды і ня ведаю, як з яе вылезьці. А так мяне гэтая справа зёлак захапіла. Вядома, можна і без рысункаў рабіць, але гэта ўжо ня тое... У доме — зразуменьня ніякага. Нейкія зёлкі, рысункі... Знайшла "важныя" справы... Ну нічога, неяк будзе. А ня будзе — дзе мая ні прападала.

Што да друку маіх успамінаў — ня так проста. Я. Саламевіч меў іх доўга ў сябе. Зрабіў пару экзэмпляраў машынапісу. Даваў цэласьць прачытаць А. Разанаву. Той, падобна, сказаў: трэба друкаваць усё, апрача таго, што ня можа прайсьці. У тым і справа, што трэба выбраць, што можа, а што ня можа... А хто гэта зробіць?

Зварачацца да Я. Саламевіча ня маю сумленьня. Ён запрацаваны, вымучаны — дыхнуць ня мае часу. Няхай успаміны ляжаць, можа, і на іх прыйдзе пара.

А тым часам я рада, што хоць мой рукапісны зборнік біяграфіяў (21 біяграфія) ужо мае тры машынапісныя копіі. Адна ўжо апраўленая, з клеенымі здымкамі, мае быць для бібліятэкі рукапісаў АН БССР. Поштай адсылаць не хачу. Трэба пачакаць пэўнай аказіі.

Цяпер А. Мальдзіс пераглядзеў — кажа, што гэта добры гістарычны матэр'ял. Праз яго і пераслаць не магла, бо яшчэ трэба было дапоўніць бібліяграфію др. Ст. Грынкевіча. Яшчэ і цяпер знаходзяцца цікавыя весткі пра яго працу навуковую.

Падумаеце — напісала шмат, а таго, што абяцала — аб Раку-Міхайлоўскім — німа. Абяцаю — прыгатую і ў наступным лісьце перашлю. А даты на маіх здымках — ці таксама патрэбныя?

Усяго найлепшага! Прывітаньне Марыі Міхайлаўне. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

223. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

25 студзеня 1984 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Да сьлёз узрушыў мяне Ваш добры, прыхільны ліст. Бачу, адчуваю, што Вы разумееце мяне, а гэта ўжо вялікая палёгка ў горы. Дзякую і за сьвечку ў касьцеле ў памяць майго сына. Я даўна ня маю магчымасьці нідзе быць, нічога зрабіць, як хацелася б, прыкаваная да хаты ўжо шмат гадоў. А цяпер і па хаце хадзіць цяжка — так баляць ногі. Ужо пару гадоў і на магілкі не хадзіла.

Галя вясной і пад восень заўсёды езьдзіць упарадкаваць кветкі, пасадзіць новыя. Добра і гэта. Толькі бяда, што яе здароўе вельмі слабое — нешта сэрцавае (ці не грудная жаба, хоць дактары дагэтуль самі ня ўпэўненыя), а яшчэ нейкія трывалыя зьмены ў пазваночніку. Моцныя болі. Гэта другое мне гора. Я ў яе гады цэлы гарод свой капала і даглядала. А ў 60 і далей, як у нас у студні прапала вада, насіла ваду за 2 кілёмэтры ад дому. Праўда, цяпер гэта вылазіць бокам. Бо страўнік моцна апушчаны, і ад гэтага ўсе яго хваробы.

Але ўдома ёсьць і пацеха. Я сапраўды цешуся, што Слаўка ня будзе адзін. Сягоньня яго паненка прыехала ў Вільню да сястры і прыйшла да нас першы раз. Мілая дзяўчына. Яна сама з сям'і мяшанай. Яе бацька — паляк. Але,

відаць, пад пантофлем жонкі, бо нават не навучыў дачок сваёй мовы. А мо асяродзьдзе таму вінавата — кругом літоўцы, нават жмудзіны. Але думаю, што і беларускай мовы навучыцца. Сяньня ідуць абое маладыя ў тэатр, былі ўжо на нейкай выстаўцы. І гэта вельмі добра, бо дагэтуль Слаўка нікуды не хадзіў. Пасьля работы нічога яго не цікавіла апрача літаратуры і — для адпачынку — тэлевізара. Часу і цяпер у яго вельмі мала, бо завочная асьпірантура вымагае шмат высілку.

Часта цяпер карэспандую з Белакозам. Чуецца фізычна, як піша, дрэнна, але працуе, асабліва ў музэі, з цэлым адданьнем і энэргіяй. Здаецца, я Вам не пісала, што Белакозу прыйшоў у галаву цудоўны помысл — зрабіць у этнаграфічным музэі асобны аддзел (пакуль што плян) — лекарскія зёлкі з народнымі рэцэптамі. Назовы — беларускія, расейскія, польскія, украінскія і лаціна. Я, зразумела, з цэлага сэрца ўзялася памагаць. Цяпер лісты паміж Вільняй і Гудзевічамі лётаюць.

Найгоршая бяда з ілюстрацыямі. Трэба даць рысунак кожнай расьліны — пажадана каляровы. Узораў расьлін у мяне сколькі хочаце — і чорных, і каляровых. Зрабіць фотокопіі чорна-белыя няцяжка, але непрыгожа. Фотокопіі каляровыя тут адбіваюць вельмі дрэнна. Найлепш было б малюнкі акварэлямі. Мастакам-прафэсіяналам і прапаноўваць німа чаго — могуць палічыць для сябе за абразу. А скуль узяць аматара? Гэта трэба, каб хто меў замілаваньне ў гэтым напрамку, а [redacted] такіх ня бачу.

Нядаўна прыяжджалі да мяне студэнты-журналісты. У гутарцы я ім казала: усіх [redacted] ўжо спазнала — і паэтаў, і празаікаў, і гісторыкаў, і мовазнаўцаў, а вось — ні аднаго ўлюбёнага ў сваю работу біёляга, батаніка, заоляга або арнітоляга. Няўжо такіх німа? І вось цяпер на старасьць у самым канцы жыцьця, дзякуючы праекту Белакоза, магу вярнуцца да таго, што самае блізкае,— да зёлак. Вось каб яшчэ разьвязаць справу з малюнкамі.

Пішу, пішу, і здаецца мне, што я Вам ужо гэта пісала. А мо каму іншаму. Лістоў шмат — бывае, і заблытаешся.

З вялікай прыемнасьцю пабачу і Вас, і мастака. Слаўка выходзіць — хачу, каб укінуў ліст. Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

224. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

26 студзеня 1984 г. Вільня

Даражэнькая Данута Іванаўна.

Закідываю Вас лістамі, а ў Вас, мусі, німа ні часу, ні настрою мне адказываць. Але сёньняшнюю вестку сьпяшаюся Вам пераслаць. Учора атрымала ліст ад Янкі Багдановіча. Прапануе, каб хто з Гродна, з Музэю М. Багдановіча прыехаў да яго, перагледзеў яго бібіліятэку. Піша: “Няхай выберуць, што спадабаецца — падарую”. Ці ня варта гэтакую магчымасьць скарыстаць? У яго бібіліятэка была багатая. Я ня ведала, што ён ужо шмат што аддаў у Наваградзкі музэй. Але, можа, яшчэ што вартаснае засталося? Ці ня варта было б пасьпяшацца?

Цяпер Я. Багдановіч чуецца даволі добра. Пасьля апэрацыі аднаго вока ўзмоцніўся духова, бо хоць адным вокам, але бачыць, ходзіць, піша. Усё ж яму 78 гадоў.

Вам самой, хіба, цяпер цяжка прыехаць? Ды і вязьці, калі што выберацца, нялёгка. А ці ня мог бы выбраць вольны дзень мастак У. Кіслы? Заад-

но і да мяне б заглянуў. Пагаварылі б па-людзку, сапраўды пазнаёміліся б. На юбілеі гэта было немагчыма. Вядома, язда вымагае коштаў. Я з радасьцю паслала б грошы на гэтую патрэбу на Вашыя рукі, а яму і гаварыць ня трэба! Было б чалавеку прыкра. Я да У. Кіслага не магу напісаць усё з тае прычыны, што ня ведаю, як яго па бацьку.

З усімі справамі (іх у мяне ня меншае, а наадварот) сьпяшаюся — чуюся зусім блага. Галаву расьпірае (і роздумамі), ногі ня хочуць хадзіць. Іду і хапаюся за сьцены ды дзьверы. А тут яшчэ і лісты гінуць. То я не атрымаю адказ, то мой ліст ня дойдзе да адрасата. Прыходзіцца другі раз пісаць тое самае.

Чакаю Вашага адказу. Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

225. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

6 лютага 1984 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Ня любіце, мусі, гэтакага тытулу, а я так міжволі пішу Вам, бо сама цярпець не магу чужога для нас — па-бацьку. То няхай ужо так на гэты раз будзе.

Ліст Ваш з 29 студзеня атрымала 31-га. А я да Вас пісала 28 студзеня, значыцца, лісты разьмінуліся. Але, хіба, ён да Вас дайшоў? Яшчэ раз падкрэсьліваю, што я Ваш цёплы ліст чытала са сьлязамі ўдзячнасьці. Ад усяго сэрца дзякую за пастаўленую сьвечку. Чытаючы, што гэта ў Францішканскім касьцёле, уявіла сабе калідоры па-францішканскага кляштару. Там у гады існаваньня ГГБМ жыло нямала нашых сяброў-гімназістаў. І мне аднойчы прыйшлося там быць.

Чакала я Вас 4 і 5-га і надалей чакаю. А як маецца Ваша мама? А тут ад Янкі Багдановіча весткі невясёлыя. Такі ўжо быў бадзёры, рады, што хоць адным вокам бачыць, а цяпер піша, што пасьля 7 месяцаў пасьля апэрацыі вока (апэраванае) пачынае балець. Асабліва ўночы. Ці ня прыйдзецца яму зноў легчы ў шпіталь? І за яго неспакойна — усё ж 78 гадоў, і хацелася б, каб з яго бібліятэкі што магчымае ў Ваш музэй трапіла. Паміж іншым, гадавікі "Полымя" — у яго.

Аказалася, што ён у свой час і ў Маладзечанскі музэй нямала аддаў. Аж шкада. У яго так усё было акуратна захавана. Няхай было б у нашым Гродне. Няведама, як там у Маладзечне, хто там гаспадарыць, як ня стала Генадзя Александравіча [Каханоўскага] і с.п. Валянціны Конан[1]. Валя Конан была школьнай сяброўкай майго сына. Працуючы ў музэі, прыяжджала да нас, і я з ёю карэспандавала да яе сьмерці.

Даўна хацела запытаць у Вас пра Біскупцы. Гэта ў былым Ваўкавыскім павеце[2]? І Біскупцы былі гмінай? Ці так? У гэтай гміне была вёска Масюкі. З гэтай вёскі паходзіў Баляслаў Пачопка, які нейкі час быў адміністратарам "Нашай нівы". Маю падпісаны ім рахунак за 100 календароў, якія я выпісала для Гродзенскага гуртка. Ёсьць у мяне яго цікавыя ўспаміны (у польскай мове, друкаваныя ў час. "Przegląd Wileński") з часу, як выдавалася газэта "Беларус".

"Беларуса" пачаў рэдагаваць і выдаваць Антон Бычкоўскі — стрыечны брат старшыні Гродзенскага гуртка беларускай моладзі — Адама Бычкоўскага. Пасьля "Беларусам" заняўся Баляслаў Пачопка. Ён жа злажыў кніжку да малітваў для беларускіх каталікоў "Бог з намі". Прыслалі яе на перагляд кс. Францішку Грынкевічу, які даваў пераглядзець яе мне. Захавалася ў мяне

картка кс. Грынкевіча, які мне пісаў: “Калі ўжо перагледзела, то перашлі мне, бо мушу вярнуць у Вільню”.

Чаму мне ўсё гэта прыйшло на памяць? Пазаўчора атрымала з Варшавы здымак хлопчыка 2-гадовага, які зьяўляецца прадстаўніком 5-га пакаленьня сям’і Грынкевічаў з Новага Двара Сакольскага павету. Усе 5 пакаленьняў мне асабіста знаёмыя (апрача гэтага дзіцяці — яго бачу толькі здымак).

Ня буду больш пісаць — і так замучыла Вас. Неяк рука ня слухаецца — баліць галава, а тады і ўся неяк не ў сабе чуюся.

Як добра, што Гродзенскае тэлебачаньне зацікавілася Гудзевіцкім музэем. Я Вам пісала аб новым помысьле Белакоза? Мяне гэта вельмі зацікавіла. Буду рабіць усё, што змагу. Найгоршае тое, што трэба прасіць аб помачы (перапісаць на машынцы) Лявона, а я гэтага так не люблю, проста баюся. Яго гэта не цікавіць — лічыць “глупствам” і тратай часу. Сама на машынцы пісаць ня ўмею, а Слаўка ня мае часу. Ну і з рысункамі ня ведаю, як будзе. Усё адкладаецца, а мне адкладаць нельга.

Да У. Кіслага яшчэ не пісала. Ці ён у Гродне, ці ў сувязі з войскам куды выехаў? Можа, я Вас пабачу раней, чым гэты ліст дойдзе ў Гродна. Добра было б. Ня ведаю, ці Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] атрымаў мой ліст з матэр’ялам аб С. Раку-Міхайлоўскім.

Цалую сардэчна — *Л. Война.*

226. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

14 лютага 1984 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Надыходзіць назначаны Вамі дзень прыезду ў Вільню, і я вельмі непакоюся, як Вы да нас дойдзеце? Сьнегу вельмі шмат. Хачу папярэдзіць, што той шырокай дарогай, якой езьдзяць нармальна машыны, цяпер ніхто ня ходзіць. Трэба ісьці ад шашы проста, проста, проста — па сьлядах, не паварочваючы на шырокую дарогу. Так ходзяць усе мае. Сьляды давядуць да павароту направа, пад горку, а на самой горцы — сьцежка налева да дому.

Ня ведаю, ці зразумела растлумачыла. А можа, бясьпечней пазваніць Лявону на працу, каб спаткаў Вас і прывёў? Праўда, у суботу і нядзелю ён не працуе. Вось і буду непакоіцца. Але тэлефон на рабоце даю: 63–24–43.

Калі гэта няцяжка, будзьце ласкавы, запытайцеся Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча], ці атрымаў пасланыя яму матэр’ялы пра С. Рак-Міхайлоўскага? Паслала раз — не дайшлі. Паслала другі раз — ніякай весткі. Мо зноў “прапалі”?

Гэтаксама не даходзяць лісты з весткамі, аб якія просяць, у Менск. Дарэмна трачу час. Добра, што хоць з Вамі перапіска ня рвецца, і Вашыя лісты, і мае даходзяць нармальна.

Маразы большыя, чым у студні, а сонейка сьвеціць і грэе праз шыбу па-веснавому.

Вельмі Вас чакаю. Да пабачаньня! *Л. Войцікава.*

227. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

29 лютага 1984 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Некалькі слоў у справе зёлак. Якіх табліцаў 12 зробім са Слаўкам. Замест малюнкаў паклеім каляровыя рысункі, выразаныя з кніжак, паштовак і г.д. Гэта ідэя Слаўкі. Сьпяшаюся таму, што Белакоз просіць хоць крышку перад веснавымі канікуламі. А рэшту — хіба больш 20 табліцаў — буду рабіць так, як мы з Вамі дамовіліся — пры Вашай і Уладзіміра Нікадзімавіча [Кіслага] помачы. У канцы сакавіка буду Вас чакаць. Да той пары, хіба, усё прыгатую.

Стараюся не зварочваць увагі на ўсе свае болі-недамаганьні. Пазволіць сабе хварэць, пакінуць усялякую работу — то гэта ўжо "капут". А трэба скончыць усё пачатае. А тут яшчэ ўсё нешта новае, неспадзяванае наскаківае і забірае час. Увесь час зьбіраюся напісаць да Уладзіміра Нікадзімавіча, ды ніяк не зьбяруся. Калі ласка, перадайце яму ад мяне сардэчнае прывітаньне.

Моцна мяне прыбіла вестка аб сьмерці майго сталага карэспандэнта з Польшчы — даўнейшага віленскага беларускага дзеяча. Другое — неспакой ад іншага чалавека з сям'і Грынкевічаў з Новага Двара Сакольскага павету. Усе — людзі майго пакаленьня, хоць шмат маладзейшыя. Людзі, з якімі зьвязывала і знаёмства, і праца. Так адна за адной абрываюцца нітачкі-сувязі.

Шчыра і сардэчна цалую Вас — *Л. Войцікава.*

228. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[Люты 1984 г.]

Дарагая пані Данута.

Прыяжджайце, калі Вам найвыгадней. Пакуль што яшчэ трымаюся за зямлю, хоць ня вельмі моцна... Маю фатаграфіі: Ванды Л[явіцкай], Смолічаў, Галубка, Гаруна — з некаторых трэба зрабіць копіі. Фота П. Мядзёлкі, Беларускую хатку і плян яе памяшканьня трэба зрабіць абавязкова, бо гэта зьвязана з Максімам Б[агданові]чам. Думаю, што і матэр'ялы аб Віленскай Беларускай гімназіі возьмеце. Гэтага ніхто нідзе ня мае.

Ні Зямельнага банку, ні бібліятэкі — ня ведаю. Я ў свае часы ніякай стычнасьці з гэтым ня мела. Трэба запытацца мастака Вячаслава Міхайлавіча Целеша — мо ён што з гэтага мае на старых паштоўках. Заўтра яму напішу і свае гродзенскія паштоўкі пагляджу. Можа, можна будзе зарыентавацца. Пакуль прыедзеце — будзе вядома.

Здымка Палуяна[1] ня толькі ня маю, але і ніколі яго ня бачыла. Таксама і этнографаў — апрача Карскага. Усё ж тое-сёе набярэцца. Хаваю для Вас мой exlibris[2] — павялічаны.

Сардэчна віншую Вас з такім высокім адзначэньнем. Ня так, як трэба "выразілася", але вельмі баліць галава, гуляюць думкі.

Узяўся мароз. Спытаўся люты, ці добра абуты... Магчыма, і далей так будзе.

Што з гэтым Сяргеем Астраўцом[3]? Мне ён таксама нічога ня піша. Узяўся напісаць пра 75-годзьдзе Гродзенскага гуртка. Прыгатаваўся да гэтага добра. Але як у яго ўсё зьмянілася, відаць, нічога не зрабіў. А можа, і напісаў, а "ЛіМ" друкаваць ня хоча? Нічога ня помню, ці Вы аб Гродзенскім гуртку што маеце ці не?

Пішу і крыва, і коса, знача, трэба кідаць і легчы. Цалую — *Л. Войцікава.*



Зоська Верас.



Данута Бічэль, Аляксей Пяткевіч, Зоська Верас. 1982 г.



З Уладзімірам Ягоўдзікам.




Зоська Верас каля Лясной хаткі. Фота С. Панізьніка. 1978 г.



Лясная хатка. Фота Л. Луцкевіча.



Зоська Верас. 1982 г.



Ліст Нілу Гілевічу. 1980 г.



Янка Багдановіч, Галіна Войцік, Мікола Купава, Зоська Верас, Яраслаў Войцік, Яўген Кулік, Вячка Целеш. 1980 г.



Лявон Луцкевіч, Марыя і Аляксей Пяткевічы, Зоська Верас, Ніна Ляшковіч, Аляксандр Ліпень, Данута Бічэль, Генадзь Каханоўскі, Сяргей Панізьнік. 1982 г.



Зоська Верас і Сяргей Новік-Пяюн. 1977 г.



Антон Шантыр, Галіна Войцік, Станіслава Сергіевіч, Зоська Верас, Кастусь і Леакадзія Шышэі, Янка Багдановіч, Пётра Сергіевіч. 1970-я гг.



Зоська Верас, Аляксей Пяткевіч, Генадзь Каханоўскі. Фота С. Панізьніка. 1982 г.



У чаканьні гасьцей. Фота С. Панізьніка. 1978 г.



Зоська Верас. Фота С. Панізьніка. 1978 г.



З Уладзімірам Содалем. 1981 г.



Вольга Іпатава, Сяргей Панізьнік, Зоська Верас, Ала Чорная, Віталь Скалабан, Уладзімір Содаль. 1987 г.



З зяцем Лявонам Луцкевічам, унукам Яраславам, пляменьніцай Валянцінай і дачкой Галінай. 1980 г.



Сустрэча з моладзьдзю. 1987 г.



Лявон Луцкевіч, Пётра Садоўскі, Сяргей Шупа, Мікола Мурашка, Таццяна Сапач, Зоська Верас.



Аляксей Пяткевіч, Зоська Верас, Сяргей Панізьнік, Марыя Пяткевіч. 1987 г.



З Сяргеем Панізьнікам. 1987 г.



Ніна Ляшковіч, Зоська Верас, Ніна Ватацы, Лявон Луцкевіч.



Сяргей Новік-Пяюн чытачам "Заранкі" быў вядомы як Малады Дзядок.



З Анатолем Наліваевым.




У гасьцях у Зоські Верас слонімскія настаўнікі. 1986 г.



Здымаецца фільм пра Зоську Верас.
У кадры – Галіна Войцік і Лявон Луцкевіч.



Лясная хатка
без гаспадыні...



Адзін з апошніх лістоў
Зоські Верас. 1989 г.



Vita brevis... Панарскія могілкі ў Вільні.

229. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

12 красавіка 1984 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Шчыра дзякую за ліст. Я ўжо непакоілася Вашым маўчаньнем. Так і думалася, што ў Вас з настроем ня ўсё добра. Неяк не дайшло да мяне, што гэта якраз цяпер угодкі сьмерці Ларысы Антонаўны [Геніюш]. Столькі цяпер у мяне такіх угодкаў — адна за другой падходзяць і праходзяць гэтыя сумныя даты.

А колькі цяпер новых стратаў, новых неспакояў аб цэласьці спадчыны! Мар'ян Пецюкевіч, Язэп Александровіч[1]... Аб спадчыне Мар'яна Пецюкевіча памог паклапаціцца Язэп Александровіч, можна сказаць, амаль у канцы свайго ўласнага жыцьця. А што будзе з яго ўласнай спадчынай, думаю, даволі багатай, хоць ён увесь час што больш каштоўнае аддаваў у музэі...

Трэба даведывацца, пытацца, а тут, як на бяду, чуюся вельмі дрэнна. І ногі, і страўнік, і галава — усё адмаўляецца служыць. Учора неяк чулася лепш — шмат хадзіла, увечары рабіла сабе на лякарства віно з альясу. Пакуль зрабіла, была на нагах гадзіны дзьве. А сяньня ледзь-ледзь рухаюся. Галавы ня могуць успакоіць ні таблеткі, ні гарчычнік.

Сардэчна Вам дзякую за добрыя весткі са Слонімскага школьнага музэю. Нарэшці ведама пэўна, што хоць пачаткі музэю, але ўжо існуюць. Што там дзеці гавораць добрай мовай — ведаю, бо пару разоў да мяне пісалі.

Алесь Мікалаевіч [Белакоз] піша часта. Толькі быў пэўны перарыў, калі ён езьдзіў у Менск. Г.А. Каханоўскі спаткаў Алеся Мікалаевіча ў Менску і, як расказываў мне, не пазнаў яго — так дрэнна выглядаў. Паміж іншым, Г. Каханоўскі ўжо цэлы тыдзень у Вільні і ў нядзелю 8-га быў у мяне.

У Гудзевіцкі музэй мы са Слаўкам зрабілі 10 табліцаў зусім закончаных. Выслалі. А пасьля [redacted] паслала 15 чарнавікоў. Атрымалі. Цяпер зраблю яшчэ 5 чарнавікоў і дадам да іх рысункі-выразкі, якія мне дала Галя — з нямецкіх часопісаў. Калі змагу, буду рабіць далей. Матэр'ял маю, але трэба ж яго апрацаваць, напісаць. Першыя рабіць было лёгка і хутка, бо ў мяне былі гатовыя запісы, а цяпер трэба карыстацца кніжкамі і іншымі крыніцамі. Калі галава не дакучае, сьвяжэйшая, то даю сабе рады, а сяньня і прабаваць не бяруся.

Калі Вам сілы і здароўе пазволяць — прыяжджайце. Я заўсёды рада Вас бачыць. Шмат хто зьбіраецца прыехаць. Званіў Новік-Пяюн, што ён і пляменьнік М. Пецюкевіча прыедуць 21 красавіка. Гэты дзень на прыйманьне гасьцей не найлепшы — Вялікая субота перад Вялікаднем. Хоць крыху нешта прыгатаваць трэба, каб падтрымаць старую традыцыю.

Лістоў, як заўсёды, шмат — па 6–7 аднаго дня. Як магу, стараюся ўсім адказаць. Маю новага цікавага карэспандэнта з Глыбокага[2] і новую школу з Лагойска, дзе ладзяць музэйны куток імя Ядвігіна Ш. Апошняе мне "пасватаў" В. Скалабан.

Каб на плячах была нармальная галава, а ня нейкі балючы кацёл, то можна было б жыць. Вартасная мэта была б. Ну, пабачым, што далей будзе. А пакуль што зёлкамі для Гудзевічаў трэба далей заняцца. Падобна, там гэтая работа выклікае вялікае зацікаўленьне.

Цалую сардэчна і чакаю. Ад усіх маіх — шчырае прывітаньне. Ад чатырохлапых — таксама. *Л. Войцікава.*

230. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

23 мая 1984 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Што з Вамі, гродзенцамі, робіцца? Ні ад Вас, ні ад Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча] — ні гуку! Ці езьдзіў хто ад Вас у Гудзевічы — на 15-я ўгодкі музэю? З Менска езьдзіла чалавек 5 ці 6. Зарганізаваць такую дэлегацыю даручыў У. Скарынкіну Ніл Гілевіч. Хто апрача Скарынкіна езьдзіў, яшчэ ня ведаю. Мяне запрашалі і Алесь Мікалаевіч [Белакоз], і дзеці. Але дзе мне ўжо думаць аб такой падарожы.

Страшна баляць ногі — ледзь хаджу. А так хочацца на гарод. Цэлае мора кветак. Усё цьвіце, буяе ўсімі магчымымі колерамі. Выйду, прайду некалькі крокаў — і хоць на зямлю садзіся.

А сёлета ўсё вельмі буйна цьвіце: каштаны, бэз. Маем бэзу 3 гатункі, пах — на цэлае навакольле. А вось ці зацьвіце белая акацыя? Няведама. З 9 на 10 мая ўночы быў прымаразак. Прымерзьлі акацыі, кветкі сьліваў, парэчак і інш.

Я далей займаюся лекавымі зёлкамі для Гудзевічаў. І іншай падобнай работы хапае. Лістоў, як заўсёды, шмат. Зьяўляюцца і новыя карэспандэнты — цікавыя людзі. Чакаю Вас, хачу падараваць крыху "Заранкі", калі яна Вам спатрэбіцца. Новыя кніжкі — "Дарогамі Максіма" А. Бачылы (новае выданьне), "Творы" У. Галубка, хіба, маеце? У мяне знайшлося (прывозяць) па 2 экзэмпляры. Трэба лішняе камусьці аддаць, бо ўжо і класьці німа куды.

Атрымала ліст ад Кожана[1] — выкладчыка ў школе ў Германавічах, Шаркаўшчынскі р-н. Ён вельмі хоча летам спазнаць Гродна, яго гістарычныя помнікі. Пытаецца, ці Вы былі б ласкавы з Гроднам яго пазнаёміць? Ён там нікога ня ведае. Кожан — вельмі цікавы чалавек. Апантаны краязнавец. Мае шмат сабранага матэр'ялу аб сваім раёне, яго гісторыі. Перакапаў, хіба, усе віленскія архівы і бібліятэкі, шукаючы гістарычных вестак. Будзе пісаць працу аб сваім раёне. А пісаць умее, і мова ў яго добрая. Я яму абяцала прасіць Вас прыхільна аднесьціся да яго просьбы і Гродна паказаць. Ці зможаце? Гэта летам, падчас канікулаў. Можна загадзя дамовіцца аб часе.

Чакаю якой-небудзь ад Вас весткі, а найлепш Вас асабіста. Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

231. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

17 чэрвеня 1984 г. Вільня

Дарагі і паважаны Алесь Мікалаевіч.

Вы, магчыма, непакоіцеся, што я так доўга не адказываю на Ваш ліст з дня 11/6. У мяне са здароўем усё па-старому, ня горш, але быў у нас дні тры гродзенскі малады мастак Яўген Шунейка[1]! Маляваў зёлкі. Намаляваў акварэлямі на спэцыяльнай паперы 10 малюнкаў, штук 4 з натуры. Вельмі добра. Пару — горш, але гэта мая віна, бо дала дрэнны ўзор. З тымі, што прыслаў менскі мастак Ракіцкі[2] (зробленыя алоўкам) — 7 штук, маем усяго 17, але да іх (да часткі) трэба яшчэ напісаць тэкст. Вазьмуся за гэта заўтра. Думаю выслаць усё разам.

Хіба няварта высылаць асобна рысункі, асобна тэкст? Буду старацца напісаць як найхутчэй, але за 1–2 дні не пасьпею, бо работа немалая. І так, астануцца яшчэ зёлкі (тэкст), якія хачу выслаць з выразкамі, бо іх маю, і до-

брыя. Думаю, што лепш зрабіць з існуючымі выразкамі, ці чакаць выпадку, што ізноў падвернецца які мастак, і то такі ахвотны да работы.

Яўген Шунейка — надзвычай сымпатычны. Ня толькі як мастак вартасны, але і як актыўны беларус-энтузыяст. Каб больш нам такой моладзі, можна было б мець надзею, што надыйдуць лепшыя для нас часы. Уладзімір Ракіцкі — натура менш энэргічная, спакайнейшая, але таксама вартасны і сымпатычны чалавек.

Сяньня пажагналіся з Я. Шунейкам. На маё пытаньне, як разьлічымся за работу, адказаў: "Ня крыўдзіце мяне такімі пытаньнямі". Прыйшлося перапрасіць за прапанову платы і толькі ад усяго сэрца падзякаваць. Здаецца, тое самае і з Ракіцкім. Бо рысункі прыслаў, а сам цяпер у Магілёўшчыне — пры рэстаўрацыі старога касьцёла, і цяжка з ім паразумецца. Вельмі прыемныя былі гэтыя дні. Я нават аб сваіх болях забывалася.

Дзякую за адрасы старшыні калгасу і старшыні райвыканкаму. З прыемнасьцю напішу ім, але крыху пачакаўшы, як ужо вышлю Вам рысункі і тэксты.

Баюся, ці не спазьнюся з адказам на Вашае пытаньне аб К.А. Кожане. Можа, ён ужо ў Вас быў? Гэта вельмі вартасны чалавек. Надзвычайна энэргічны і працавіты. Хоча ў сябе ў школе заснаваць музэй. Ён — пэдагог, але з замілаваньня краязнавец. Быў у мяне ўжо некалькі разоў, раз — з жонкай. Ужо даўна пачаў прыяжджаць у Вільню ў архівы ды бібліятэкі, дзе шукаў гістарычных вестак аб сваёй ваколіцы — Шаркаўшчынскім р-не і яго беларусах: Я. Драздовічу, П. Ластаўку, агр[аноме] Я. Пачопку.

Матэр'ялаў мае ўжо шмат і цяпер будзе іх апрацоўваць. Піша добра, добрай мовай. Гэта павінна быць цікавая краязнаўчая праца. Калі будзе ў Вас у Гудзевічах і ў Гродне, якое таксама хацеў пазнаць, то, напэўна, падрабязна мне ўсё апіша. Яго лісты — такія жывыя і падрабязныя, чытаючы іх, быццам усё бачыш сваімі вачамі.

Трэба ўжо канчаць. Ужо па 8-й вечара. Сяньня ўжо ня буду нічога пачынаць рабіць. Увесь час дзень у дзень былі дажджы. Сяньня першы дзень быў сонечны. Але ізноў захмарылася, і таму пачала балець галава. Маю напісаць 5 важных лістоў, людзі чакаюць адказу, а я маўчу. Гэта вельмі непрыемна, і мучыць сумленьне.

Усяго добрага! Пішыце. Як цяпер чуецеся? Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

232. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

1 ліпеня 1984 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Ліст Ваш прыйшоў на другі дзень — 27 чэрвеня. Увесь час пра Вас думаю, а напісаць не ўдавалася. Хіба, гэта сучасная хвароба — такія абыякавыя адносіны людзей, адных да другіх, асабліва калі німа патрэбы.

Я ад 1923 г. жыву стала ў Вільні, як цяпер, часта зусім адна па 8–9 гадзін. Старыя знаёмыя паўміралі, асталіся іх нашчадкі, якіх я ведала маленькімі дзяцьмі або падросткамі — і ніхто ніколі не адведае, не пацікавіцца, як жыву... Вось цяпер загадзя бядую, што будзе ў дзень вясельля Слаўкі 9 верасьня.

Вядома, само вясельле будуць спраўляць ня ўдома, а ў якой-небудзь рэстарацыі. Удома і прыгатаваць німа каму, і далёка, і цесна. Можа, зацягнецца дапазна. Як вытрымаць удома адной? А папрасіць каго да таварыства? Абсалютна німа каго...

Спачуваю Вам у клопатах з сынам. Трэба мець надзею, што ўсё перамелецца, абы ня трапіў у дрэннае асяродзьдзе. Ці на канікулы куды выяжджае? Тады Вы зноў ня зможаце пакінуць кватэры і Бонкі... А я так Вас чакаю. Хочацца "цёплай рукой" даць Вам сёе-тое ў музэй, вядома, калі гэта будуць кніжкі, Вам патрэбныя.

Заяжджаў да мяне К.А. Кожан, едучы дамоў, хоць дарога з Вільні ў Германавічы вельмі складаная — з перасядкаю. Быў у Вільні некалькі дзён супрацоўнік Музэю Якуба Коласа Генадзь Тумас[1]. Забег і да мяне. Я вельмі была б рада, каб Ваша дачка змагла прыехаць. Можа, была б такая добрая — намалявала б мне пару зёлак. Усё мне нечага не хапае...

З пісьменьніцай Х. Лялько[2] з прыемнасьцю пазнаёмлюся. Гэта ж таксама — Гродзеншчына, Ліда і яе ваколіцы. У нас цяпер незвычайна прыгожа — мастакоў, паэтаў, пісьменьнікаў павінна гэта зацікавіць. Калі б спаткалі Вы пана Яўгена [Шунейку] — калі ласка, прывітайце яго ад мяне. Усе кантакты з Гроднам, Гродзеншчынай мілейшыя мне, чым з Менскам.

Вельмі хачу, каб Вы прачыталі ліст, які я атрымала ад аднаго з самых малодшых сяброў Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Пабачыце, якія мы, гродзенчукі, моцныя ў сваіх перакананьнях. Хоць бы нас раскінула па ўсіх кутках сьвету. Свае вёскі, свае звычаі астаюцца навечна ў сэрцы і памяці. Так што — чакаю.

Чуюся дрэнна. Ад гэтых дажджоў, вятроў вельмі баляць ногі, часта — галава. Цяжка нахіляцца. А мо гэта ўсё не хваробы, а гады жыцьця, якія цягнуцца, цягнуцца, і канца ім німа...

Мацуйцеся і фізычна, і духова. Цалую сардэчна — *Л. Войцікава.*

233. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

12 ліпеня 1984 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

З цэлага сэрца цешуся з такой удалай ластаўкі[1]. Няхай жа яны вылятаюць шчасьліва як найчасьцей. Дзякую Вам вялікае і за цёплы аўтограф, і за тыя мілыя хвіліны, якія перажывала, чытаючы Вашыя творы. Быццам жывой вады напілася. Пасьвяжэла на душы, пабачыўшы ў друку словы *камель, вогнішча* замест ненавісных *ствол, касьцёр*. Ды яшчэ і наша гродзенская *валошка* заместа *васілька* сэрца пагрэла. Калі б у Вас былі якія сумлівы з назовамі расьлінаў — пытайцеся. З радасьцю параджу, каб не дапусьціць у друк *адуванчыкаў, зьверабояў, глогаў* ды іншых недарэчнасьцяў.

Вы калісьці пыталіся аб творах Франц. Аляхновіча? Я іх сабрала, што ў мяне ёсьць, у адно мейсца і лічыла, што зможаце прыехаць, прачытаць іх. Так і ляжаць — чакаюць. Я цяпер ад даўжэйшага часу пішу для Гудзевіцкага музэю пра лекавыя зёлкі, іх беларускія назовы, значэньне ў народнай мэдыцыне. Сама захапілася гэтым і, калі сілы знойдуцца, далей гэтую работу буду працягіваць.

Што цяпер робіце? Што пішаце? Ці маеце ўжо крыху матэр'ялу для наступнага зборніка? Калі знойдзеце вольную хвіліну, пішыце.

Шчыра прыязная — *З. Верас.*

234. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

14 ліпеня 1984 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Ліст Ваш атрымала, дзякую. Цешуся, што ёсьць надзея Вас пабачыць. Але адначасна хвалююць мяне Вашыя клопаты. Як жа гэта так? Студэнтаў бяруць у армію? Наш Слаўка праходзіў ваенную "падгатоўку" падчас навукі ва ўнівэрсытэце, а пасьля заканчэньня быў месяц ці два ў спэцыяльным вайсковым лягеры. Мае званьне лейтэнанта запасу. З лягеру за месяц напісаў 13 лістоў — усе іх маю. Але бывае і такое, як у Вас.

Мая сяброўка Алеся Смоліч пісала мне, што яе ўнук, пайшоўшы ў армію, ня піша. Зьвярнулася да яго начальства — таксама адказу не атрымала. Чым там скончылася — ня ведаю, бо Алеся захварэла і доўга не пісала. Знача, так з маладымі бывае. Але вядома, як маці гэта перажывае. Чым даўжэй — тым горш. Але ў Вас гэта, хіба, ужо мінулае і весткі аб сыне маеце?

І ў нас з нашымі маладымі ня вельмі спакойна. Прыехала з Венгрыі знаёмая Элімы (нарэчанай Слаўкі) ў Вільню на 4 дні. На гэты час і Эліма ў Вільні. Зразумела, і Слаўка з імі разам. Удома не паказываецца. Калі забяжыць — на хвіліну. Галя ўдома, толькі калі трэба — едзе ў магазын. Лявон таксама часта ўдома.

Цяпер даўжэйшы час ёсьць у Вільні А. Мальдзіс. Быў у мяне амаль цэлы дзень. Ніхто не перашкаджаў, і мы шмат аб чым перагаварылі, чаго ўжо даўна не было. Цяпер прыехаў У. Мархель — аўтар кніжкі "Лірнік вясковы" (аб У. Сыракомлі). Зьбіраецца прыйсьці.

Ну і лістоў, як заўсёды, хапае. А я чамусьці разгультаілася (а мо проста выдахлася) і доўга не адказываю. Аж сарамна перад людзьмі. Сяргей Сьцяпанавіч Панізьнік прыслаў мне фота А. Белакоза, робленае падчас юбілею ў Гудзевічах. Нядрэнна выглядае. Я яго так даўна ня бачыла! Ці ня ў 1975 годзе прыязджаў з Марынай. Неяк апошні час і лістоў ад яго німа.

Перасылаеце прывітаньне нашай зьверыне? А ў нас асталося толькі двое — Ас (сабака) і Чып (кот). Вялікі Пірат атруціўся...

У нас за гарой ёсьць вуліца — некалісь была вёска Рэвянцы. Цяпер ня вёска, а вышэй — вуліца гораду. А дзіч горшая, чым некалісь у беднай падгарадзкой вёсцы. Мой муж вельмі не любіў і не цаніў такіх людзей. І меў рацыю. Вясковыя людзі маюць сваю культуру, сваю асаблівую этыку, а такія "падгарадзкія" зьбіраюць у сабе самае горшае шумавіньне. Вось і цяпер такія тут асталіся.

Уявіце сабе — атруту супраць пацукоў параскладалі на адкрытых мейсцах! Ім то што — самі ня любяць нічога жывога, і калі які чужы кот прыйдзе і атруціцца, то яшчэ і пасьмяюцца. Праз гады, як тут жывем, колькі яны нам катоў забілі — не зьлічыць. Ката не прывяжаш — шукае таварыства. А нам проста ў вочы казалі: "Niech tylko kot pokaże się, prędko koniec jemu zrobimy"[1]. Вось так і прапаў кот Пірат. Тры дні хварэў. У тым самым часе і з Чыпам было няшчасьце, але з іншай прычыны. Паправіўся, жывы. Але ці надоўга? Ён стары, яму ўжо дзясяты год. Вось ляжыць у мяне на каленях, абняўшы за руку...

Атрымала я ліст ад Канстанцыі Буйло. Наракае, што вельмі дрэнна чуецца. Трэба ёй адказаць, падбадзёрыць. Мо які стары здымак адшукаю, чым ёй зрабіць прыемнасьць. "Прырасла" да Масквы, а ўсё ж паміма волі думкі лятуць у свой родны Край...

Цалую Вас шчыра і чакаю. Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

235. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

19 жніўня 1984 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Шкадую, што ў Вас такія непрыемнасьці з сынам, і Ваш прыезд усё адкладываецца. Усё ж маю надзею, што гэтая падзея зьдзейсьніцца.

Вельмі Вам удзячная, што накіравалі да мяне Яўгена Фэліксавіча [Шунейку] — мела пару сапраўды прыемных дзён. І некалькі зёлак намаляваў (цэлых 10 штук!), і само знаёмства з маладым, энэргічным, шчырым чалавекам унясло ў маё жыцьцё сьвежы подых і веру ў маладое пакаленьне.

Замучыла мяне сёлетняе надвор'е. Бясконцыя дажджы, ветры выклікаюць вельмі частыя болі галавы. А ногі, ногі... Так баляць, што хаджу, як калека, аж сорамна.

Сяньня атрымала ліст ад К.А. Кожана. Як заўсёды, вельмі падрабязны. Зьбіраецца ў Гродна, а з Гудзевічамі нешта ня ладзіцца. Алесь Мікалаевіч [Белакоз], відаць, пасьля 20-га ці некуды зьбіраецца ехаць, ці мае нейкую работу, бо прасіў Кожана прыехаць да 20-га, а той ня можа, бо гэты час мае заняты. Праектаваў, варочаючыся з Гудзевіч, прыехаць у Вільню. Але, відаць, нічога з гэтага ня будзе. Шкадую. Ад лютага ня быў. А мне цікава з ім сустракацца.

Не ўяўляеце сабе, як цяпер у нас цудоўна. Перад домам цьвітуць дэкаратыўныя кусты — 2 белыя і 2 ружовыя. Гэта вельмі прыгожыя, рэдкія расьліны. І іншых кветак хапае.

Кніжак, якія праектую даць Вам, не прыгатавала і таму не дала. Прыедзеце, разгледзім і возьмеце.

Цалую сардэчна і чакаю. *Л. Войцікава.*

236. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

23 жніўня 1984 г. Вільня

Паважаны пане Адаме.

Агульнае наша гора, г.зн. сьмерць сьв. пам[яці] У. Караткевіча разбурыла ўсе пляны. Але маладыя мастакі (з Менска, Гродна і Віцебска) намаўляюць, каб работы з лекавымі зёлкамі ня кідаць. Гудзевічам я маю намер гэты аддзел "Нашыя лекавыя зёлкі" папаўняць. У кожным выпадку хачу... А што далей?

Ці варта прасіць Вас аб кантакце з гр. Федаруком[1]?

У нас цяпер, хіба, яшчэ прыгажэй, бо пачынае прасьвечывацца залатая восень. Падобна, у выдавецтве "Полымя" выйшла з друку кніжка аб расьлінах. Што гэта і якога яна напрамку — яшчэ ня ведаю. А можа, у гэтым выпадку аб нечым іншым думаць ня варта? Можа, гэта нешта падобнае? Малады мастак з Менска абяцаў мне яе дастаць, але калі — яшчэ ня ведаю, бо цяпер ён у Мсьціслаўлі пры рэстаўрацыі Кармэліцкага касьцёла.

У нас 6 і 7 верасьня ўнука Слаўкі вясельле. А пасьля я ізноў займуся сваёй работай, калі доля будзе яшчэ мяне трымаць на гэтым сьвеце.

Усяго Вам добрага! Са шчырай зычлівасьцю — *Л. Войцікава.*

237. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

31 жніўня 1984 г. Вільня

Паважаны і дарагі Алесь Мікалаевіч.

Шмат радасьці прынёс мне Ваш ліст. Што зьдзейсьняцца Вашы намеры, і зашумяць у Гудзевічах скрыльлі ветрака — гэта ўжо цудоўна, а другое, што можаце езьдзіць і так інтэнсыўна працаваць, цешыць ня менш. Што можа зрабіць добрая воля і энэргія аднаго чалавека!

А дзе ж той *скансэн* пад Менскам? Ані відаць, ані чуваць. На некалькіх артыкулах у прэсе скончылася, здаецца. Ці яшчэ арганізуецца, перасылаючы паперкі з установы ва ўстанову, зьнізу ўверх і назад? Адным словам — казёншчына, і то, напэўна, добра аплачаная. А літоўцы даўна скансэн вялікі маюць. Слаўка быў, і не адзін фільм ужо быў у тэлебачаньні. Добра было б Вам са школай калі экскурсію туды наладзіць.

Але я пішу-пішу, а на думцы адно — я на Вас сапраўды пакрыўдзілася. Як можна зрабіць такую аграмадную працу над стварэньнем-выданьнем “Праменьчыка” з такімі марнымі пэрспэктывамі? Хіба, не шкада часу, сілы, энэргіі рабіць выданьне на *папяроснай* паперы? Сколькі яно патрывае?

Чаму Вы не напісалі, што Вам папера патрэбная, сколькі і якая? У Вільні ёсьць усялякая, сколькі хочаце. Слаўка купляе рызамі. Ды і грошы Вашы ўласныя ляжаць. Як Вы прыслалі, так і ляжаць. Ды і ў мяне грошы ёсьць даволі: і з пэнсіі, і розныя ганарары, і цяпер за зборнічак, што вось-вось выйдзе, атрымала 60% ганарару, значыцца, яшчэ 40% атрымаю. А нашто яны мне? Часам дам на тое ці другое да хаты, а сама хоць бы што хацела купіць — ня маю магчымасьці, бо ўжо гады нікуды не выходжу. Калі што раблю для Гудзевічаў, то — як для сябе.

Маім надалей гэта ўсё непатрэбнае. Слаўка жэніцца з літвінкай. Пойдзе літоўская сям'я. літоўцы моцныя — ня ўступяць. Для мяне абсалютна чужыя, бо я іх мовы ня ведаю. Так адчуваю, што на мне канчаецца ўсё. Бо я і ў сям'і Садоўскіх — па маці, і ў сям'і Сівіцкіх — па бацьку — апошняя. Ну вось і пажалілася. Але і сапраўды, рэдка бывае такое становішча. Вы, калі ласка, аб гэтай справе не пішыце ў лісьце, калі б папала на вочы каму ўдома — мела б непрыемнасьць.

Затрымалася неяк з работай далейшых зёлак, хоць матэр'ялы маю. Удома рабілі рамонт усіх пакояў — не было варункаў да працы. Думаю, што вось-вось вазьмуся за работу. І дачка купіла мне вельмі цікавую кніжку аб лекавых зёлках — польскую, самую новую. Ведаеце, там назовы расьлін паданыя ў 6-ці мовах: лаціна, польская, расейская, француская, ангельская і нямецкая.

За гэтымі хатнімі справамі ніяк не зьбяруся адаслаць малюнкі мастакоў, а ёсьць сапраўды прыгожыя, па-мастацку зробленыя. Але гэта ж трэба адпаведна запакаваць, здаць на пошту, а цяпер за гэтым рамонтам не было каму.

Праціўная пагода — вецер шалёны, хмарна, зімна. Ці Вам гэтыя падарожы не пашкодзілі? Хутка пачатак школьнага году. Зноў у Вас будзе шмат работы — падвойнай, а то і патройнай.

Усяго найлепшага! Плёну ва ўсіх справах. Школьным дзецям-дзеячам шчасьця ва ўсім! Вашай цудоўнай працавітай сям'і — прывітаньне. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

238. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

21 верасьня 1984 г. Вільня

Дарагі і паважаны Алесь Мікалаевіч.

А ўсё ж я пачну з грашовай справы. Скажыце, што мне з грашамі рабіць? На той сьвет з сабой забраць? Іх у мяне за ўвесь час — з розных дробных ганарараў і той месячнай пэнсіі (50 руб.) пры невялікіх расходах на паперу, капэрты і г.п.— сабралася больш 1000 руб. А і далей зьбіраецца, бо яшчэ ганарару за "Каласкі" дастала толькі 60%. Для сябе асабіста ўсё патрэбнае маю. А каб і хацела штосьці купіць, то не магу. Ужо больш за 10 гадоў не была ў горадзе. А дачка пры сваім благім здароўі і працы проста не заўсёды можа хадзіць па маіх справах.

Пішаце, што ня маю магчымасьці бачыць музэю? Я яго сабе ўяўляю — у мяне фантазія багатая, я ўжо тое, што Вы ў сваіх лістах успамінаеце розныя мясцовасьці, прозьвішчы, знаёмыя мне з дзяцінства,— гэта вялікая прыемнасьць.

Вось Вы ўспомнілі Эйсманты. Адтуль, з Эйсмантаў, паходзіў чалавек, які працаваў аб'ездчыкам у дзяржаўных лясах, жыў у вёсцы Кусьцінцы Сакольскага павету. Разумны быў чалавек, сыноў сваіх пасылаў у навуку. Адзін быў аптэкарам — таго я ня ведала, а два другія скончылі Гродзенскую гімназію. Старэйшы з іх канчаў гімназію, як я яшчэ лялькамі гуляла. Клікала яго "Пятрусь, Пятрусь, хадзі на баль!". І ён, даўганогі, садзіўся пры нізенькім столічку і еў мае пачастункі. А самы малодшы, Франук, быў хрышчоным сынам маёй бабулі (па маме), а пасьля сябрам Гродзенскага бел[арускага] гуртка. Вось адзін назоў мясцовасьці — і сколькі ўспамінаў з самога дзяцінства...

Усё зьбіраюся запытацца, як далёка ад Гудзевічаў Індура і Адэльск? З-пад Адэльска, з фальварку Талочкі, старшыня гуртка Адам Бычкоўскі. А ці ведаеце Кузьніцу? Ад яе простая дарога (10 вёрст) — стары тракт, абсаджаны бярозамі, вядзе ў Новы Двор, каля якога зямля маіх прадзедаў. Каб Вы ведалі, як я тужу па тых кутках! Столькі гадоў (ад 1923 г.) я ў Вільні. А для мяне ўсё тут чужое...

Я Вам ужо пісала, што схапілася за Гудзевіцкі музэй, а цяпер — за справу зёлак і толькі гэтым жыву. Гэта мой ратунак, маё збаўленьне. І Вы мне не пазваляеце дадаць да справы некалькі — зусім для мяне лішніх — грошаў? Ці гэта справядліва?

Цікава, людзі ганяюцца за грашамі, а ад мяне ніхто іх ня хоча. Напрыклад, прашу Славу: "Купі мне паперы". А ён кажа: "Нашто купляць? Ляжаць у мяне цэлыя рызы ў бюрку, бяры, сколькі хочаш".

Мастакі, калі запрапанавала плату за малюнкі, сказалі, што я іх крыўджу такой прапановай. То дзе мне грошы дзець? Я ж ужо канчаю 92 гады. Нашто мне яны? Але хопіць. А то яшчэ з Вамі пасварымся.

Пішучы аб 75-годзьдзі Гродзенскага гуртка, я ня думала аб нейкай публікацыі, а толькі каб Вы па магчымасьці расказалі сваім вучням, як гэта калісь моладзь у Гродне працавала для нацыянальнага ўсьведамленьня. І ня толькі паміж сабой у Гродне, але ставілі спэктаклі для вёскі, раздавалі "Нашу ніву", а календароў выпісывалі кожны год 100 штук і раздавалі іх. Захаваўся ў мяне рахунак на 100 штук календароў, дзе зазначана, якая нам даецца зьніжка. А самі ў Гродне праводзілі лекцыі, вучылі геаграфію Беларусі, яе гісторыю.

Гэта было 75 гадоў таму... А як помніцца — да дэталяў, да дробязяў. Зда-

ецца, усё бачу. А думаць ад такім юбілеі, успамінаць, прыходзіцца адной. Ня ведаю, ці жыве сябра з першых гадоў Зыгмунт Абрамовіч (унук Ф. Багушэвіча). Даўна ня піша. А другі наш сябра з самых малодшых, др. Грабінскі[1], жыве даўна на Флярыдзе. Пісаў цудоўныя лісты ў чыстай беларускай мове, але таксама на апошні ліст ня маю адказу.

Ці ўдасца прапхнуць дзе весткі ад гэтым юбілеі — ня ведаю. Стараецца Арс. Ліс, прыцягнула А.М. Пяткевіча, пісала ў Менскае тэлебачаньне — Ул. Содалю. Але які будзе рэзультат? Хто ведае.

Усяго Вам найлепшага! Прывітаньне для Веры Ігнатаўны. Выбачайце, што так дрэнна пішу. *Л. Войцікава.*

239. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

28 верасьня 1984 г. Вільня

Паважаны і дарагі Алесь Мікалаевіч.

Дзякую шчыра за атрыманы ўчора ліст. Не, я не пакрыўдзілася за адасланыя грошы — шаную людзкія меркаваньні, хоць бы яны з маімі ўласнымі не зусім згаджаліся.

Слаўцы мае грошы непатрэбныя. Ён і сваіх мае даволі. Зарабляе, як і ўсе старшыя інжынеры, няшмат, але не гуляе, не раскідаецца грошамі. А цяпер і жонка яго (фармацэўт) будзе працаваць у Вільні — думаю, што ім хопіць. Дагэтуль сколькі разоў прапанавала Слаўцы грошы на нейкі выдатак, нават для мяне асабіста — ніколі не хацеў браць. Скарыстаю з Вашай парады і штонебудзь карыснае для справы агульнай прыдумаю.

Дубаўца пабачу з прыемнасьцю — даўна яго ня бачыла. Дзіўлюся, што Вы пішаце, быццам німа беларускага календара — ён ёсьць, *перакідны*, змантаваць трэба самім на мэталічную рамку. Прадавалі (мо ўжо німа?) у пачцы запячатанай паасобныя карткі. І месяцы, і дні – па-беларуску, ёсьць і крыху тэксту, але гэта ўсё весткі палітычныя.

Ня тое, што было ў нашых віленскіх адрыўных перадваенных календарах, дзе на другім баку быў і гумар, і часам які верш, і розныя гаспадарчыя парады... Я кожны год запаўняла 100 картак парадамі на розныя тэмы. Паміж іншым, ці я вам даслала "Гісторыю беларускага адрыўнога календара"? Калі не — пастараюся даслаць.

Справы Гродзенскага літаратурнага музэю імя М. Багдановіча я сапраўды не разумею. Данута Б[ічэль] наракае, што не даюць грошай, німа за што купіць экспанатаў, што толькі гродзенскія маладыя мастакі памагаюць, часам падкінуць якую кніжку. Ёсьць прызначаны для гэтага музэю габэлен "Максім Багдановіч" работы Яўгена Шунейкі (маю фота гэтага габэлену — мне падабаецца). Аўтар трымае сваю работу ў сябе ў працоўні, кажа — дам, калі ўжо будзе экспазыцыя. А тым часам Данута ўсё езьдзіць. Была на Брэстчыне на розных спатканьнях, цяпер паехала на Палесьсе. Лісты яе нейкія нэрвовыя. Я яе даўна чакаю, прыгатавала тое-сёе для музэю — а яе німа і німа.

У мяне часта набіраецца якой кніжкі па 2–3 экзэмпляры. Што лішняе — магу аддаць. Ці маеце, напрыклад, "Сьцежкамі Максіма" А. Бачылы? Што яшчэ маю лішняга — напішу пасьля, бо на бяду маю ў доме памочніка (Лявона), які па-свойму гаспадарыць — кладзе кніжкі на самую высокую полку, адкуль я не магу дастаць. І то без майго ведама. Усё нечага шукаю...

Вельмі, вельмі дзякую за апісаньне этнаграфічнага музэю — як бы яго пабачыла. І як гэта ўсё мне знаёма з дзяцінства, з часоў, калі кожнае лета праводзіла ў свайго дзеда ў фальварку Альхоўнікі пад Новым Дваром. І карытa, у якім салілі мяса: кумпякі, паляндвіцы і г.д. Колькі разоў памагала перакладаць і паліваць расолам. І жорны, на якіх рабілі грачаныя крупы — ад буйных да самых дробных. Не абышлося, каб і я іх не круціла.

І шкляныя мухалоўкі, налітыя сыроваткай,— ня раз прыходзілася іх мыць.

А ці апрача церліцы ня маеце іншых ткацкіх прыладаў — кроснаў, калаўроту, верацёнаў? І з гэтым я мела дачыненьне, крыху ўмела прасьці (але толькі грубую пражу — пачосьсе і падобнае, а кужалю так і не навучылася), крыху ткаць. Нават снавала сама. І таму ў Менску ў 1916–17 гг. загадывала ткацкай майстэрняй, а раней раздавала бежанкам лён да пражы, калаўроты і верацёны. Нават маю кніжку запісаў — прозьвішчы жанчын, і скольki фунтаў лёну хто браў прасьці. І праз гады гэта ўсё мне вельмі блізкае.

Мушу на гэтым скончыць. Дачка ідзе ў горад, сьпяшаецца. Дам ліст укінуць у скрынку.

Усяго добрага Вам, Веры Ігнатаўне, вучням. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

240. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

7 лістапада 1984 г. Вільня

Паважаны пане Адаме.

Яшчэ раз дзякую за кніжку[1]. Прачытала адным духам і, думаю, ня раз да яе вярнуся. Столькі новага, і так лёгка, вобразна напісана. Здаецца — бачыш, адчуваеш і перажываеш.

Сумнае ўражаньне робяць адмоўныя рыскі характару Сыракомлі — дагэтуль мне няведамыя. Але што ж, паэт, якога б вялікага таленту ні быў — усё ж чалавек, як і іншыя, з плюсамі і мінусамі.

Але пішу ня толькі таму, каб выразіць удзячнасьць і ўражаньні. Мяне заінтрыгавала прозьвішча Серабракоў. Недалёка маёнтку майго прадзеда Ігната Кулакоўскага[2] Крыштапарова існаваў маёнтак Старпейкі. Належаў ён адстаўному ваеннаму Серабракову, жанатаму з былой артысткай Пецярбургскага тэатру. Цікава, што былая артыстка Серабракова была добрай гаспадыняй ды яшчэ выдатна ведала кройку і шыцьцё.

І вось мая маці, скончыўшы ў Кракаве закрытую кляшторную пэнсію і вярнуўшыся да бацькоў у Сакольшчыну, хоць вельмі маладзенькая, бо мела ўсяго 16 гадоў, пастанавіла пасьля сямейнай нарады падвучыцца кроіць і шыць. У сям'і было 5 жанчын, і з шыцьцём сукенак быў клопат. Пані Серабракова згадзілася прыняць вучаніцу, і мая мама некалькі месяцаў пражыла ў Старпейках.

Сям'ю Серабраковых усе хвалілі як інтэлігентную, разумную, і як добрых дюдзей — у адносінах да суседзяў і сялян. Блізкіх зносінаў паміж суседзямі, хіба, не было — усё ж Серабраковы — расейцы, і гэта дзяліла...

Забылася падаць год, калі мая маці была ў Старпейках — 1886–87. Маю ўражаньне, што Старпейкі — гэта ня быў маёнтак спадчынны, сямейны, а куплены, а мо атрыманы ад ураду пасьля нейкай вывезенай у Сібір сям'і...

На маю бяду, шмат вестак і аб уласных прадзедах-прапрадзедах не хапае. Мая бабуля — дачка І. Кулакоўскага, памёрла, як мне было 13 гадоў. А ці

раней — у 11–12 гадоў — я магла цікавіцца сямейнай гісторыяй? Напэўна, не. Вось і ведала толькі тое, што мне расказывала маці. А яна вялікага значэньня сваім дзядам-прадзедам не прыпісывала. Усё ж я з гісторыі сям'і тое-сёе ведала, і мяне вельмі зацікавілі пошукі Генадзя Аляксандравіча [Каханоўскага]. І я крыху дакумантаў маю. Думаю, што з гэтым усім рабіць, бо аставіць ня маю каму. Так мне здаецца.

Яшчэ вярнуся да Старпеек, дзе жылі Серабраковы. Ужо ў пазьнейшыя гады, калі іх ужо там не было (чые тады яны былі — ня помню), захацелася мне на іх глянуць. Праяжджаючы трактам побач, завярнула ў алею, абсаджаную старымі дрэвамі, і паехала да брамы. Паміж іншым, езьдзіла найчасьцей бяз фурмана. І алея, і сам дом — белы палацык, былі вельмі прыгожыя, хоць у той час ужо даволі запушчаныя. Цяпер, як і ўсе навакольныя маёнткі і вёскі, належыць да вялікай (*неразборл.— М.С.*), якая захавала назоў Крыштапарова, па-польску — Krysztoforów.

Мо Вас што-небудзь з гэтых вестак зацікавіць. Усяго найлепшага. Шчыра зычлівая — *Л. Войцікава.*

241. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

7 сьнежня 1984 г. Вільня

Дарагія вучні Гудзевіцкай школы і паважаны сябра Алесь.

Выбачайце, што не адразу адказала на два Вашы лісты. Крыху прыхварэла, крыху не было часу: то хто прыедзе, то лісты са сьпешнымі пытаньнямі. Бандэролі Вашай яшчэ не атрымала. Магчыма, яна ўжо прыйшла, але мне пару дзён не прыносілі пошты з вул. Архітэкту. Вельмі мне прыкра, што нарабіла Вам клопату з чарнавікамі. І пошукі іх, і праверка забралі Вам шмат часу і нэрваў.

Я добра ведаю, што пішу не па сучасных нормах, але не стараюся сваёй прывычкі зьмяніць, бо ня вельмі мяне сучаснасьць здаволівае. Мае архаізмы, вымаўленьне і г.д.— гэта наша нашаніўская, а пасьля і віленская мова. Цяпер маладыя асьпіранты мовазнаўства спэцыяльна ў віленскіх архівах вывучваюць тую мову, яе гучаньне. Што да маіх чарнавікоў, я лічу, што яе выправяць рэдактары выдавецтва. Мо і больш, чым трэба...

Чакаю Вашай бандэролі, бо не магу зарыентавацца, сколькі чарнавікоў я Вам паслала, і сколькі мне яшчэ трэба зрабіць, каб падагнаць да 60-ці. Столькі абяцала даць у тую будучую кніжку. Пакуль што справа стаіць на мейсцы, бо гэта ж канец году, і этнографы сьпяшаюцца скончыць справаздачы. Ня маюць часу чым іншым заняцца. А як ведаеце, якраз адзін з іх узяў на сябе ўсе клопаты, зьвязаныя з выданьнем "Зёлак". Можа, у мяне выйдзе больш чым 60, але маю такія, якіх ня так важна лекавае значэньне, як магчымасьць даказаць, што яны маюць сваё *беларускае* імя.

Ці была ў Вас ужо тэлевізійная экіпа з Менска? Уладзімір Ільіч Содаль пісаў мне, што зьбіраюцца ехаць 4-га. Але ці змог? Бо ён усё хварэе.

Усё зьбіраюся выслаць Вам вялікую бандэроль: малюнкі, новыя чарнавікі (копіі зраблю сама) і яшчэ пару рукапісаў. А можа, рукапісу "Віленскіх кірмашоў"[1] не прысылаць, бо, магчыма, дам іх у друк у "Голас Радзімы"? І яшчэ адна рэч: знайшла ў польскай часапісі цікавы артыкул аб пялёстках ружаў і здабываньні з іх алею ў Балгарыі. Можа, такі абразок "з чужога панадворка" будзе цікавы для людзей?

Напішыце, то зраблю пераклад і прышлю. Трэба дадаць, што ў тым артыкуле шмат гаворыцца аб досьледах балгарскіх лекараў над лекавымі вартасьцямі ружаў. А некаторыя ружы, як напрыклад, г.зв. цукровыя, і ў нас вельмі добра растуць. Я іх шмат маю. І сама ўжываю іх сушаныя пялёсткі для прамываньня вачэй.

І яшчэ адно. Маю матэр'ялы — тэксты артыкулаў аб Віленскай Беларускай гімназіі. Яны выкарыстаныя да альбому "Віленская Беларуская гімназія імя Івана Луцкевіча". Ляжаць у мяне. Ці прысланць іх Вам, ці аддаць у Гродна — у Музэй М. Багдановіча? Дзе будзе больш карысна?

Пісала мне з Менска М. Эд. Самуйлёнак[2], што была ў Гродне і ў Музэі М. Багдановіча. Хіба там ужо ёсьць экспазыцыя? Была ў мяне Данута Б[ічэ]ль, але так коратка, што я не пасьпела распытацца. Матэр'ялы аб Віленскай Беларускай гімназіі — артыкулы, успаміны (бяз здымкаў) — ляжаць у мяне бескарысна, а хто ведае, што з імі зробяць, калі мяне ня стане. Ды і аб іншыя мае архівы я не зусім спакойная.

Падсыпала крышачку сьнегу. Але тэмпэратура ўсё +4, +6. Дагэтуль німа зімы, хоць ужо блізка Каляды. А пасьля Новага году пачнецца і будзе трываць да мая. Для садоў, агародаў гэта згуба.

Мушу пахваліцца, што ў нас удома сапраўдны поўдзень — маем 2 дрэўцы цытрынаў, абвешаныя фруктамі. Гэта заслуга Слаўкі, яго гадоўля. Маем і мандарынкі. Яны цьвілі, але позна, і фрукты не завязаліся. Ад кветак цытрыны і мандарынак — пах на ўсю хату. І ляўр (ляўравыя лісты — прыправа) маем свой.

Што да капэртаў, то калі выслалі аж 50, то гэта лішняе. Але тут ужо, хіба, не адмовіцеся, калі я за іх заплачу. Гэта ж зусім нармальная рэч. Каб прадавалі ў нас у кіёсках, то мне ж дарма не далі б.

Ці быў які адказ ад А. Марачкіна? Я мела ліст ад С. Дубаўца — сам яшчэ ня быў, хоць абяцае. Цяпер яму ня так лёгка, бо ён працуе ў Гомелі. Захоплены Гудзевіцкімі музэямі, піша: "Ні з чым іх нельга параўнаць, хіба з Музэем імя І. Луцкевіча ў Вільні".

Але хопіць. Яшчэ 3 лісты мушу сьпешна напісаць, каб сяньня выслаць. Усім усяго найлепшага. Больш падтрымкі, менш клопатаў.

Шчыра справе адданая — *Л. Войцікава.*

242. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

25 студзеня 1985 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Вельмі добра было б, каб Вы прыехалі, але пакуль сьнег і холад, хіба, гэта немагчыма. Ці хацелі б Вы ўзяць у музэй матэр'ялы аб Віленскай Беларускай гімназіі? Гэта рукапісы і даволі даўгі артыкул ды пару ўспамінаў былых вучняў гімназіі. Яны выкарыстаныя ў альбоме "Віленская Бел[аруская] гімназія імя Івана Луцкевіча". А ўсе рукапісы я захавала.

Маю таксама вялікую працу аб М.І. Забэйдзе-Суміцкім "На вышыні мастацтва". Гэта машынапіс, якога тэкст таксама выкарыстаны ў альбоме. Аб Забэйдзе, можа, пакуль што ў экспазыцыю даваць нельга (мо не дазволяць), але ў фондах захаваць можна. Што да сямейных здымкаў — выбралі б, што Вам спадабаецца, а ўжо зрабіць адбіткі дагаворыцеся з Лявонам. Што да чаго асабістага — абсалютна не магу прыдумаць. Гэта як мяне ўжо ня будзе... Мае,

напэўна, не адну рэч аддалі б.

У мяне ізноў бранхіт. І то ў даволі цяжкай форме быў, цяпер ужо лепш. Але найгорш баляць ногі. І то, як на злосьць, уночы. Зусім не магу спаць.

Ці ўжо зрабілі экспазыцыю? Ці Яўген Шунейка даў Вам ужо свой габэлен "Максім Багдановіч"? А што там з Сяргеем Астраўцом? Ці мае ўжо кватэру? А жонка яго — адпаведную працу ў Гродне? Ці яшчэ жывуць асобна? Ён меўся напісаць артыкул аб 75-годзьдзі Гродзенскага гуртка бел[арускай] моладзі. Быў у мяне, зрабіў шмат запісаў... Але як звалілася на яго гэтая бяда, то я і не адважылася прыпамінаць.

А маёй кніжачкі і дагэтуль німа[1]. Мелася быць у 1984-м, пасьля сказалі, што па графіку яна выйдзе ў студзені г.г. А цяпер ужо і студзень канчаецца... Калі і выйдзе — цешыцца німа чаго. Шмат адкінулі. Напрыклад, не далі "Нёману"[2]. Цікава, што тут не спадабалася?

На тым і скончу. Маю вельмі шмат лістоў да адказу. Як дрэнна чулася, то і пісаць не хацелася. Каб гэта звычайныя лісты, а то кожны аб нешта пытаецца. Адказаць дакладна — трэба пераглядзець сотні лістоў старых.

Як Вашае здароўе? Што чуваць у Вашых дачкі і сына? Цалую Вас сардэчна. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

243. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

3 лютага 1985 г. Вільня

Паважаны і дарагі Алесь Мікалаевіч.

Сяньня атрымала Ваш ліст з 30/1. Дзякую. Ніяк не магу зразумець, чаму гэта Вашы лісты да мяне *ня ўсе* даходзяць. Ці гэта хто тут іх са скрынкі выцягівае, ці ў Вас на пошце ёсьць нейкі непажаданы кантроль?

Уявіце сабе, што я аб перадачы ў тэлебачаньні аб Гудзевічах даведалася з г. Глыбокага Віцебскай вобласьці — ад майго там карэспандэнта[1]. Ём мне напісаў, што бачыў Гудзевіцкі музэй па тэлевізару і прасіў у мяне дадатковых вестак пра Вашую працу і г.д. А раней ні ад Вас, ні ад У. Содаля ніякіх канкрэтных вестак ня мела. Чакала, зьдзіўленая, бо была ўжо і дата назначаная на запісы і здымкі, а пасьля ўсё заціхла. Пішаце ў гэтым апошнім лісьце, што паведамлялі мне пра тэлебачаньне перад Новым годам? Не атрымала нічога. Каб ня той мой знаёмы (не асабісты) з Глыбокага, то дагэтуль нічога б ня ведала.

Але аб гэтым хопіць. Пабачым, што будзе далей. Я сама ўжо даўна думаю, каб апрача малюнкаў даць засушаныя зёлкі. Добра было б ня толькі ў вязанках-пучках, але і засушаныя — як належыцца да зельнікаў-гербарыяў. Гэты апошні спосаб клапатлівы і патрабуе спэцыяльнай веды. Ня ведаю, ці Ваша выкладчыца біялёгіі — у гэтым выпадку спэцыяльна батанікі — сама ўмее і ці захоча паказаць, як гэта робіцца, вучням. Калі ў мяне вясной будзе ўсё добра, то пастараюся хоць крыху чаго засушыць.

У мяне яшчэ адна прапанова: зёлкі, прыгатаваныя, як ужо *гатовы лек*. Адпаведна нарэзаныя (калі трэба), або засушаныя кветкі, напрыклад, рамонку, братачкаў, пялёсткі валошкі, нагаткоў у маленькіх шкляных слоіках з наклеенымі этыкеткамі: назовы беларускія і лаціна. Я так у сябе прыгатаўляю "зялёную аптэку". Ня трэба шукаць, напрыклад, у торбачках, а стаіць цэлы рад слоікаў з надпісамі, ды і праз шкло відаць, што гэта такое.

Так насыпаныя — ядловец, каляндра, кмен; ягады — маліны, галабень і г.д.,

і кара — дубовая. Гэта вельмі прыгожа выглядае. Што да адпаведнага водару — цудоўная думка! Зёлак духмяных знойдзецца нямала (у ніякім выпадку не парфума — гэта было б штучнае). Перадусім можна лёгка атрымаць водар лясны — сасновы (аб лекавых вартасьцях сасны — хутка прышлю, разам і яшчэ 10 іншых).

Пачала даўна, але ў апошні час мела шмат работы з пошукамі ў старых лістах вестак, патрэбных то для энцыкляпэдыі, то для работ дасьледчыкаў. Цяпер нічога такога на ўвазе німа, і лістоў няшмат.

Што да аўтара артыкулу пра “Бел[арускую] борць”, то ён (і другі) спэцыяльна справамі пчалярства цікавіцца. Магчыма, хутка выйдзе яго манаграфія “Беларускае пчалярства”, і то па-беларуску! У гэтых самых аўтараў выйшла маленькая кніжачка (на жаль, па-расейску) “Беларускае бортніцтва” — аб даўнейшым пчалярстве. Маю 2 экзэмпляры. Прышлю. Аўтар гэтага артыкула, С.Ф. Цярохін[2], узяўся, каб выдаць “Зёлкі” кніжкай, але што будзе — ня ведаю. Даўна ні слова ня піша. Вельмі непакоюся, што з ім, бо ён хворы на сэрца. У апошнім лісьце пісаў: парадзьце, што мне піць, каб узмоцніць сэрца, бо ізноў горш. Я адказала — сардэчнік, але больш весткі ня маю.

Данута Б[ічэль] піша, што прыедзе ў сакавіку. Прыгатую ўсё, што магу і аб што яна просіць. Падобна, ужо цяпер робіць невялічкую экспазыцыю. Пачала пісаць, як атрымаць лясны трывалы водар, і раптам перайшла на другое. Варочаюся да гэтай тэмы. Вясной, як толькі сасна пачне распускацца, пачнуць расьці яе вяршкі — смалістыя, жаўтаватыя сьвечачкі — назьбіраць іх, улажыць у марлевыя мяшэчкі і разьвесіць у кутках пад столльлю — за шафамі ці нешта падобнае. Ня будуць навідавоку, ня будуць псаваць выгляду пакояў. Будуць памаленьку сохнуць і выдзяляць лясны смалісты водар.

Гэтак рабіла заўсёды мая бабуля — маці майго бацькі, якая жыла ў Гродне каля самай Фары. Я з дзяцінства гэта помню. Мусі, гэта па бабулі, што пацягнула мяне да зёлак. У яе заўсёды былі розныя зёлкавыя прэпараты. Рабіла, напрыклад, лек ад хвароб страўніка — *дзевяціранку* — гарэлку на 9 зёлках.

Хіба, на гэты раз хопіць. Каб хоць ня гінулі лісты, бо німа нічога горшага. Усяго Вам добрага! Вам, сям'і, вучням. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

244. ЯНКУ САЛАМЕВІЧУ

9 лютага 1985 г. Вільня

Дарагі Іван Уладзіміравіч.

Учора выслала Вам ліст, сяньня сьпяшаюся дапоўніць. Уночы прыйшло мне ў галаву, што ў маёй кніжцы ўспамінаў нічога не напісана аб Ф. Ш[антыру] ў 1918 годзе. Устала раніцай, перагледзела ўспаміны — сапраўды німа. Чаму так выйшла — і сама ня ведаю. А Вам, можа, будзе цікава і, укладаючы кніжку, карысна.

Звольнены з арышту ў Бабруйску, Ф[абіян] выехаў у Слуцк. Гэта Вам, я думаю, ведама. Але далей: вясной 1918 г. прыехаў са Слуцка ў Менск — роварам. У шынэлі, без усялякіх адзнакаў-пагонаў, у простых салдацкіх ботах. Затрымаўся ў М. Шылы. Як і дзе мы спаткаліся — ня помню, але не адразу, бо я тады працавала на Цне ў садзе. Да сябе я запрасіць не магла, бо мы з мамай жылі (я – толькі ў нядзелю) у тым прытулку (*Распределительный приют*) Усерасейскага земскага саюзу. У малюсенькім пакойчыку — ледзь павярнуцца, ды і мама была слабая пасьля шпіталю.

У кожным выпадку — спатыкаліся. Ф[абіян] хадзіў пару разоў на Цну — са мной. Але ў адно з першых спатканьняў было зімна, і мы зайшлі ў кавярню выпіць гарачага малака. Тады Ф[абіян] кажа: "Калі б мяне цяпер затрымалі, то канец". На маё пытаньне — чаму, у чым справа, ён адказаў: "А таму, што маю пры сабе браўнінг". Вядома, у такі час насіць у кішані браўнінг — глупа і небясьпечна. Я была ў грубай цёплай ясёнцы, шырокай, з вялікімі кішанямі. Ну і запрапанавала аддаць браўнінг мне. Адразу ў кавярні забрала яго ў кішэнь. Так, нязначна, пад столікам пералажылі з кішэні ў кішэнь. Мела крыху клопату, каб перахаваць у сябе — тады ж у Менску былі немцы. Але ўдалося. Забрала з сабой, выяжджаючы ў палове ліпня ў Сакольшчыну. Па дарозе выкінула рэвольвер праз акно вагону. Мы ехалі "пад аховай" немцаў...

З Ф. Ш[антырам] апошні раз бачыліся 13 мая. Ці гэта Вам спатрэбіцца, ці не — але пішу. Вытрасаю апошняе, што помню.

Не падзякавала я Вам за добрую вестку аб "Каласках". Нарэшці. Калісьці Артур Віталевіч Вольскі пісаў: як толькі "Каласкі" зьявяцца, адразу вышлю аўтарскія, або і сам прывязу. На гэта нечага спадзявацца — мароз цісьне і сьнегу шмат.

Усяго добрага. *Л.В.*

Вельмі хацела б расказаць пра Тоніка. Як яму было гадоў тры — столькі ў ім было бацькоўскага...

245. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

14 мая 1985 г. Вільня

Паважаны і дарагі Алесь Мікалаевіч.

Учора атрымала Вашую бандэроль. Просьбу выканаю, "Каласкі" падпішу. Але ці Вам гэта хутка трэба зрабіць? Калі? У мяне такая сытуацыя, што няма каму а ні пакаваць, а ні высылаць. Я ж сама асабіста не магу гэтага рабіць. Таму і апошняя порцыя зёлак і малюнкаў дагэтуль ляжыць.

Але ня трэба было "Каласкоў" прысылаць. Я іх маю добры запас — больш як 50 экз. Праслаў 30 экз. Г.А. Каханоўскі, пасьля 10 — з Глыбокага. Яшчэ той-сёй прывёз. Падпішу, і, як толькі будзе магчымасьць, вышлю.

Хіба Вы ўжо атрымалі мой апошні ліст з запытаньнем, што думаеце, каб прысланць у музэй біяграфію, здымкі Юліі Бібіла і расказ аб пачатку ткацкай традыцыі ў Вашай школе? Пытаюся, бо я не зусім пэўная, ці гэтага раней не зрабіла...

Пытаецеся аб маім здароўі? Пахваліцца няма чым. Вельмі баляць ногі, ледзь магу хадзіць, часта баліць галава і г.д. Месяц таму быў доктар, зьмераў ціск крыві — нармальны, сэрца, як на мае гады, добрае. Кажа, што болі галавы — ад склерозу... А ногі лячыць асьпірынай. Апрача таго, даў уколы — С і В. Усё гэта робіцца, але без ніякіх вынікаў. Вельмі не ў парадку нэрвы...

А тут лісты, справы самыя розныя сыплюцца, як з дзіравага мяшка. Хочацца ўсё зрабіць — не змарнаваць апошняга часу. Нядрэнна было б мець у гэтых справах нейкую помач. А тут яе няма, і надзеі на яе ніякай. Свае занятыя сваёй фаховай працай, а ў дадатку вясна — сад, агарод, кветнікі. А ў гэтых справах я ўжо нічога не магу памагчы, хоць мне рукі самі цягнуцца да ўлюбёнай работы.

Слаўка са скуры вылазіць, як кажуць. Работа па фаху, асьпірантура, сад, агарод, цяплярні, а тут яшчэ, як афіцэра запасу, выклікалі на ваенную катэдру,

на зямлянкі. Шчасьце, што толькі на 5 дзён. Добра, што на агародзе жонка яму памагае, вельмі спрытна капае загоны.

Мне даволі часу займае ліставаньне з Янкам Багдановічам. Нельга яго хоць у такі спосаб падтрымаць. Вельмі яму цяжка пасьля сьмерці жонкі. Пражылі разам 54 гады, а цяпер амаль адзін. У Вільні жыве толькі адна іх дачка, але ў яе праца, дзеці. Думаюць выменяць свае кватэры на адну большую, каб жыць разам. Але гэта ня так лёгка і ня так хутка.

14 чэрвеня будзе дзень нараджэньня М. Забэйды-Суміцкага. У Менску ў гэты дзень ладзяць вечар яго памяці. Ладзіць будуць, падобна, супрацоўнікі Дзяржаўнага архіва-музэю літаратуры і мастацтва.

Але на сяньня хопіць. Буду чакаць на адказ у справе Ю. Бібіла. Усяго найлепшага — усім, усім, усім. Шчыра — *Л. Войцікава.*

246. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

31 мая 1985 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Дзякую, што шчыра аб усім напісалі. Высказацца аб усіх сваіх бедах — гэта ўжо на душы лягчэй будзе. Па-другое, гэта значыць, што маеце да мяне давер. За гэта я Вам вельмі ўдзячная і спагадаю з усяго сэрца.

А можа, усё гэта часовае? Выкліканае цяжкімі ўмовамі жыцьця? А далей усё пераменіцца на лепшае? Мо думаеце, што ў мяне ўсё гладка? Можа, галоўная прычына ў тым, што я глухая, але чуюся — як пятае кола да воза. Ёсьць дзьве пары колаў — пара старая і пара маладая. А я — ні сюды, ні туды. Ня чуюся патрэбная, толькі прыношу клопат сваімі хваробамі, сваім бясьсільлем. Вельмі баляць ногі. Баюся, каб не прыйшлося ляжаць бяз руху. Лепш ужо скончыць, пакуль яшчэ сяк-так рухаюся...

Быў у мяне паэт Алесь Жамойцін[1], аб якім Вы мне пісалі. Цудоўнае ўражаньне зрабіў! І яго мова, і яго сардэчнасьць. Абяцаў не забываць дарогі да мяне. Была б яму вельмі ўдзячная. Бывае ў мяне шмат хто. Нават цэлымі групамі. І гэта мая радасьць. Асабліва калі магу даць патрэбныя весткі. Бо гэта значыць — яшчэ не зусім духовы труп...

Ці зрабіў Лявон копіі здымкаў, аб якія Вы яго прасілі? А мо адаслаў іх Вам? Я нічога ня ведаю... Усё робіцца за маімі плячамі. Прыкра, але што рабіць? Калі маёй старасьці ўжо не давяраецца... Шчасьце, што чужыя, але родныя па духу, думаюць інакш. Як заўсёды, шмат лістоў, шмат пытаньняў і г.д. Гэтым жыву.

Пішыце, як далей ідзе жыцьцё. Ці сыну яшчэ доўга трэба быць у арміі? Маю для Вашага музэю крыху экспанатаў. Ці чакаць Вас? Ці пераслаць праз каго, калі хто з Гродна зьявіцца? Ці атрымалі праз Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча] "Каласкі"?

Буду чакаць весткі. Сардэчна вітаю і цалую. Ваша *Л. Войцікава.*

247. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

19 чэрвеня 1985 г.

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую сардэчна за ліст. І я ня хутка адказала, хоць хацела адразу напісаць. Відаць, у прыродзе нейкія непаразуменьні. Май быў гарачы і сухі, паміма таго, цьвіло вельмі шмат лясных кветак, напрыклад, *мядовак* — прыгожых, сіне-ружовых. Трэба сказаць, што ўсе нашы — і біёлягі, і пісьменьнікі — называюць іх расейскім іменем *медуніца*.

А чэрвень пачаўся халодны і мокры. Лілі дажджы кожны дзень, а два разы былі буры. Толькі сяньня німа дажджу, і на хвіліну паказалася сонца. Паміма такой пагоды цудоўна, як ніколі, цьвілі белыя акацыі і ружовыя, якія цьвітуць паўторна ў жніўні. А што цяпер белыя акацыі разрасьліся так, што аж у лес пайшлі, то мы ў гэтай квецені проста танулі. Ружовыя і цяпер яшчэ не перацьвілі. І бэз белы таксама доўга цьвіў — відаць, так яго кансэрвавалі дажджы і холад. Цяпер цьвітуць язьмін і цукровыя ружы. Наагул, кветак хапае. Толькі я не заўсёды магу на іх наглядзецца, бо трудна хадзіць — вельмі баляць ногі.

Дзякую, што параздавалі ўсім "Каласкі". Выбачайце за клопат. Але толькі адзін Яўген Шунейка адгукнуўся, больш ніхто. А Яўген Петрашэвіч[1] мае звычай пісаць раз у год — перад Новым годам. Як на нашае знаёмства (адзін раз праз дні тры былі разам у Гудзевічах, і то аж у 1969 годзе), то і так добрая ў яго памяць. Але, можа, гэта і ня дзіўна, бо калі я тады (са Слаўкам) ехала ў Гудзевічы, то Яўген Канстанцінавіч [Петрашэвіч] разам з Белакозам спаткалі нас на станцыі і запрасілі ў госьці да маткі Яўгена. Прыймалі так гасьцінна і з такой помпай, што нейк бянтэжыла. Вось з таго часу я так цесна зьвязаная з Гудзевічамі, з іх музэем.

Вельмі добра зробіце, калі разам з жонкай паедзеце аглядзець дакладна музэй. Бо хто ведае, што з ім далей будзе. Ці хопіць Алесю Мікалаевічу сілы вясьці далей барацьбу за дзіравы дах і іншыя самыя істотныя патрэбы. Ідуць і едуць з усіх бакоў, бачаць сабраныя экспанаты, хваляць, але якіх сілаў і энэргіі трэба, каб вымаліць помач на самыя неабходныя патрэбы! А што Алесь Мікалаевіч да Вас не зайшоў — магчыма, справа не ў яго сьціпласьці, а ў хворых нагах.

Аляксей Міхайлавіч, Вы дзівіцеся, што магіла Ф. Грынкевіча так добра дагледжаная, і думаеце, што ёсьць у Гродне яго сваякі? Не, са сваякоў німа нікога. Я з гэтай сям'і ведаю 5 пакаленьняў. Праўда, самыя малодшыя — толькі са здымкаў, але 4 пакаленьні — асабіста, і цяпер патрымліваю сувязь з 3-м і 4 пакаленьнем.

Родная сястра кс[яндза] Ф[ранціш]ка выйшла замуж за паляка (сама пасьля прызнавалася, што гэта была вялікая памылка). Мела 2 дачкі і сына. Дачок ня ведаю, але сына і ўнука (аднаго) ведаю асабіста — прыяжджалі да мяне. Карэспандуем стала. Сын сястры, пляменьнік, вельмі цікавіцца ўсімі беларускімі падзеямі. Чытае кніжкі Аляксандры Бэргман і дадаткова распытываецца ў мяне аб тым, што ў яе прапушчана або не зусім для яго ясна. Ён па прафэсіі інжынер, па замілаваньні — гісторык. Яго сын (4-е пакаленьне) быў у мяне 2 разы і лічыць мяне некім вельмі блізкім. Ён — філёляг, хоць паляніст, але таксама цікавіцца беларускай літаратурай, беларускімі падзеямі. Як бацька аб ім піша, што ў яго найбольш рысак характару Грынкевічаў.

Што да магілы і помніка, то апекуноў трэба шукаць паміж былымі вучнямі школаў гадоў 1910, 11, 12, 13-га. Кс. Францішак быў капэлянам, вучыцелем ня толькі прыватных гімназіяў — жаночай і мужчынскай, але і шматлікіх школаў, г. зв. podstawowych[2]. Толькі пасьля яго сьмерці людзі даведаліся, сколькі ён зрабіў добрага. Плаціў за навуку бедных вучняў, купляў ім адзежу, нават утрымліваў (карміў) сваім коштам. І ўсё гэта сакрэтна...

У 1937 г. прыяжджаў да мяне адзін з былых гімназістаў — спэцыяльна даведацца самыя дробязі з жыцьця любімага і шанаванага пэдагога. Вось дзе сакрэт добрага дагляду магілы. Мне пісалі, што часта і зімой на гэтай магіле знаходзяцца сьвежыя кветкі.

Калі будзеце мець цярплівасьць прачытаць мае каракулі, то, калі ласка, адкажыце. Чуюся дрэнна, слаба. Кожны ліст — гэта ласка і радасьць. Так хочацца хоць раз яшчэ пабачыцца з Вамі...

Шчырае прывітаньне Марыі Міхайлаўне. Яна расказывала сваму ўнуку аб маіх катах Піраце і Чыпе. У красавіку скончыў жыцьцё мой прыяцель Чып. Пірат — раней. Асабліва шкада Чыпа...

Усяго добрага. *Л. Войцікава.*

248. УЛАДЗІМІРУ ЯГОЎДЗІКУ

22 ліпеня 1985 г. Вільня

Дарагі Валодзя.

Атрымала ўжо "Полымя" і Вашую рэцэнзію прачытала[1]. Дзякую. Шкада толькі, што ў бочку мёду трапіла лыжка дзёгцю. Вы зусім не зразумелі "Песьні сіраты". Не падразумявала я ў гэтым вершы ніякай "батрачкі" (па-беларуску — парабчанкі), я мела на ўвазе сябе асабіста. Бацька мой памёр, калі я толькі скончыла 15 гадоў. Не было ў мяне ні сястры, ні брата. Мы асталіся ўдваіх з с.п. мамай. Я моцна адчувала страту бацькі — вельмі добрага, разумнага, інтэлігентнага чалавека. Вось і жаль гэты выліўся ў вершы "Песьня сіраты". Гэты верш быў надрукаваны ў "Нашай ніве".

Думаеце, што некаторыя рэчы, як "У каго прыгажэй", "Добрае сэрца" і г.п. маглі б увайсьці ў дзіцячыя (вядома, не дашкольнага ўзросту) чытанкі? У мяне ёсьць цэлы цыкль падобных драбніц пад агульным загалоўкам "Вацюковыя суботнікі". Туды ўвайшлі: "Пералётныя птушкі", "Ад лучыны да электрычнасьці", "Пералётныя птушкі", "Чаму ўвосень жоўтае лісьце", "Соль", "Цукар", "Газа", "Будаўніцтва ў птушак", "Амяла". З гэтага ўсяго толькі "Амяла" ўвайшла ў зборнічак.

Усё гэта можаце прачытаць у машынапісным зборніку "Каласкі" (ад гэтага, мусі, і зборнік так назвалі). Гэты машынапіс павінен быць (калі выд[авецтва] "Юнацтва" вярнула) ў Сяргея Міхайлавіча [Новіка-Пеюна]. А калі ў яго німа, то ў бібліятэцы Акадэміі навук у аддзеле рукапісаў — у Лідзіі Іванаўны Збралевіч. Машынапіс гэтых "Каласкоў", вокладку і сшываньне рабіў Сяргей Міхайлавіч. Сам мне запрапанаваў, каб усё, што было параскіданае па розных часопісах, сабраць пад адну стрэшку, за што ■ яму вельмі ўдзячная.

На гэтым скончу. Вельмі дрэнна пішацца. Кожны дзень дождж. Сяньня была бура. Усё гэта дзеіць на мяне. Баліць галава, а рука зусім ня хоча слухацца. Два-тры словы лепш, а пасьля ізноў кожная літара скача.

Усяго найлепшага Вам, жонцы Вашай і Юлечцы. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

249. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

26 жніўня 1985 г. Вільня

Паважаны і дарагі Алесь Мікалаевіч.

Дзякую за шчыры ліст. Вельмі Вам спагадаю ва ўсіх цяжкасьцях. Каб хоць гэтыя людзі памагалі, а не перашкаджалі.

Магчыма, я той артыкул у “ЛіМе” ацаніла памылкова. Дзіўным мне здалося, быццам пісьменьнікі часта бываюць у Гудзевічах, і то па некалькі разоў. Я аб гэтым ніколі ад Вас ня чула. А калі бываюць, то чаму маўчаць? Чаму не зацікавяць грамадзянства? Чаму не зарганізуюць нейкай рэальнай помачы?

Пішаце, што маладое пакаленьне захавае мову продкаў чыстай. Мала ў гэта верыцца. Ёсьць у Менску арганізацыя маладых — “Беларуская майстроўня”[1] (крыху незразумелы назоў). Там галоўную ролю іграе малады філёляг (здаецца) Вінцук Вячорка[2]. Ён лічыць, што мова Заходняй Беларусі была добрай, чыстай, вывучае яе, вядзе (пакуль што паміж калегамі) адпаведную прапаганду.

А з другога боку, што робяць выдавецтвы? “Юнацтва” выдае для дзяцей кніжкі ў расейскай мове. “Мастацкая літаратура” зусім ня дбае аб мове сваіх выданьняў. Прыклад? Выданая сёлета кніжка В. Іпатавай[3] *“Перакат”* — гэта мае быць беларускае слова? А можа, толькі я яго ня ведаю? А ў апавяданьнях? Там і *меднаствольныя сосны*, і *іван-чай* (замест скрыпень) і г.д. А ўжо “лепш” за ўсё расейскі зварот *бросить жребий* — па-беларуску *кінуць жэрабя*... Але бываюць і вельмі прыемныя неспадзяванкі.

У мінулым тыдні прыяжджаў А.С. Ліс — прывёз мне маленькую кніжачку вершаў. Гэта цуд — ня вершы! Не магу ад іх адарвацца. Кніжачка маленькая, усяго 44 старонкі. Тытул — “Сурма” (стары інструмэнт музычны), аўтар — Алег Мінкін[4]. Дзіўна, імя ды прозьвішча мала маюць супольнага з беларускай мовай, і радзіўся на Магілёўшчыне, і вучыўся ў Маскве, жыве і працуе ў Брэсьце — інжынер сельскагаспадарчай вытворчасьці... А мова, зьмест вершаў — зачароўваюць. Мо таму, што яны, нібыта просьценькія, але глыбокія па зьместу? Зразумець, лепш адчуць іх лёгка, яны без ніякіх выкрутасаў.

Пішу вельмі невыразна. Душна, хоць хмарна, гэта вельмі дрэнна адбіваецца на здароўі і настроі. Пытаецеся, дзе радзіўся М.І. Забэйда-Суміцкі? Няўжо я не паслала Вам яго жыцьцяпісу? А можа, паслала, а ліст не дайшоў? Напішыце, калі не атрымалі — вышлю ізноў. Пастараюся машынапіс зрабіць. А цяпер шлю толькі вестку, дзе радзіўся.

У мяне да Вас такая просьба. Я зусім ня помню, што я ў Гудзевіцкі музэй пасылала. Пасылала — нічога не запісывала, а цяпер нічога ня ведаю. Ці не магла б якая добрая дзяўчынка запісаць, г.зн. сьпісаць усё, што я пасылала, і прыслаць сьпісак мне? Была б вельмі ўдзячная. Мне гэта вельмі трэба ведаць, бо часам сама сябе пытаюся, дзе тое ці другое дзелася. Пішаце, што матэр'ялаў ад мяне шмат, а я дзіўлюся, бо нічога ня помню.

Што да насеньня памідораў — абавязкова прышлю Вам з дэталёвым апісаньнем гатункаў. Вы, здаецца, маеце цяпліцу? Ці можаце садзіць у ёй? Бо маем гатункі, што толькі ў цяпліцы ўдаюцца. Мы маем 2 цяпліцы — з плёнкі і шкла. У адной гадуем памідоры, у другой — агуркі. Агуркі ў нас на агародзе не растуць зусім. І памідоры, і агуркі даюць вялікі ўраджай.

Усяго найлепшага! Усім, усім прывітаньне. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

250. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

3 верасьня 1985 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст — сяньня яго атрымала. Учора С. Астр[авец] прывёз усе мае матэр'ялы. Я вельмі рада, бо ў гэтыя дні спадзяюся мець у сябе Янку Саламевіча, які прыедзе па новую порцыю матэр'ялаў да маёй кніжкі. А ў гэтай папцы ёсьць тое-сёе, што будзе патрэбнае — хоць бы тыя друкаваныя праграмы.

Цікавая гісторыя — гэтыя праграмы недзе выкапаў Аляксей Каўко[1]. Прыслаў мне і пытаецца: хто іх друкаваў і калі? А я іх першы раз бачу... Мы ў Гродне мелі тыя праграмы рукапісныя, друкаваць ня мелі ніякай магчымасьці. Не было тады ні адпаведных друкарняў, ні грошы... Мы былі бедныя, як мышы касьцельныя. Хто іх друкаваў, калі, дзе? Ня ведаю... Але зьмест праўдзівы, як і было ў нас напісана. І вось — рада, што матэр'ялы маю, і адначасна прыкра, што я так настойліва дабівалася звароту. Выглядала, што я чалавеку ня веру, ня веру ў яго сумленнасьць... А гэта ня так. Мы ж даўна і добра знаёмыя. Такая, відаць, мая доля, што я вечна нешта балюча перажываю.

Аляксей Міхайлавіч, Вы пішаце, што я дарэмна лічу сябе самотнай, шмат людзей мяне помніць, дабра мне зычыць... Гэта так. Атрымліваю шмат мілых, сардэчных лістоў.

А свае ўдома? Вось вазьміце хоць бы справу копіі гэтага здымка, што Вам так спадабаўся. Ці паверыце, што я з Вашага ліста толькі даведалася, што гэты здымак Лявон браў і копію рабіў... Значыцца, сам капаўся ў маіх тэчках, узяў здымак, рабіў копію, выслаў Вам... А мне — ні слова...

То ж: часта нехта звоніць да Л[явона], пытаецца, чаму я доўга не пішу або нешта падобнае. А я аб гэтым нічога ня ведаю, як бы гэта не мяне тычылася... Пасьля толькі з ліста гэтай асобы даведываюся аб званку... Як Вам гэта падабаецца? Ці гэтакія адносіны прыемныя? Я ж ніколі нічога ня ведаю. Ну хопіць... Гэтак ужо будзе да сьмерці.

Л[явон] жа — "навуковец", дзеяч, а я старая як сьвет "баба са склярозай" (ён так мяне называе...).

Восень сапраўды вельмі прыгожая — цёпла, сонца. А яшчэ зелень сьвежая... кветак зацьвіло яшчэ больш. Другі раз цьвіце ружовая акацыя. Даюць ягады маладыя суніцы. А чуюся — дрэнна. Але гэта драбніца — так мусіць быць.

Вярнуся да таго здымка. Гэта на ім са мной *не пляменьніца* Ф. Грынкевіча, а яго *сястра*. Такая яна была, як на вечарынцы (гралі "Моднага шляхцюка") дэклямавала мой верш "Што я люблю". З вершам К. Буйло пад такім жа загалоўкам нічога супольнага ня мае...

Я хацела, каб малая дэклямавала, а не было адпаведнага верша — вось я і напісала. Ня ведаю, чаму ў "Каласках" яго не зьмясьцілі. Падумалі, што гэта насьледаваньне Буйлянцы? А мне тады вершы Буйлянкі не былі яшчэ знаёмыя.

Пішаце, што абышлі магілы беларусаў? Ня ведаю, чаму Л[яво]н прызнае толькі тых, хто пахаваны на Росах, а ня лічыцца з тымі, хто на праваслаўных могілках. На г.зв. Былінах таксама нямала беларусаў. І я некалькі помнікаў (здымкаў) маю.

Мы хадзілі з маім с.п. сынам. Сфатаграфаваў на пачатак 7 магілаў. На Росах:

Ядвігіна Ш., Л. Дубейкаўскага, К. Сваяка. На Былінах: Алены Сакаловай-Лекант[2] (выкладала ў Бел[арускай] гімназіі бел[арускую] мову і літаратуру), дырэктара В[іленскай] Бел[арускай] гімназіі С.К. Паўловіча і яго жонкі, выкладчыка ВБГ С. Караля[3]. Больш не пасьпелі...

Сын пачаў хварэць, і болей не было магчымасьці. А трэба яшчэ дадаць, што на Росах ёсьць магіла-помнік нашай гродзенскай сяброўкі Анны Салянка. Таксама сфатаграфаваны — маю. Але цяпер Л[яво]н аб гэтай магіле ведаць ня хоча. Яна запушчаная...

Так, як і на Панарскіх могілках магілы маіх найбліжэйшых: с.п. мамы, цёткі (маміна сястра), майго мужа Ант. Война і сына — Антона Шантыра. Над сынам то хоць крыж ёсьць, а над рэштай (адна вялікая магіла — усе побач сябе) — *нічога*. Дачка, калі можа, езьдзіць туды, садзіць кветкі. А надпісу на помніку — ніякага... Маю вялікі сьпісак магілаў беларусаў — усяго 39 прозьвішчаў.

Той здымак з Юзяй Грынкевічанкай — з 1912 г.

Сардэчнае прывітаньне п. Марыі. Насеньня якіх кветак пані Марыя хацела б? Хіба, будзе насеньня нямала. Зьбяру, што змагу. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

251. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

16 лістапада 1985 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Зусім Вы аба мне забыліся, а я яшчэ жыву, хоць ужо ледзь-ледзь. Але справа ня ў тым. Чытала Ваш артыкул — з успамінамі Кветкі Вітан[1] і М. Шылы. Пішаце там, што аб Лявоне Дубейкаўскім амаль нічога няведама. Шкада, што не зьвярнуліся да мяне з гэтым пытаньнем.

Я яго ведала — у Варшаве (гады 1914, 1919), у Менску — 3 гады, амаль 2 гады бачыла кожны дзень, а пасьля мы ў Вільні спатыкаліся ня раз — аж да яго сьмерці.

Ва ўспамінах Кветкі Вітан бачу недакладнасьць. Чаму яна ні словам не ўспамінае свайго брата Лявона, які, праўдападобна, вучыўся нейкі час у Віленскай Беларускай гімназіі? Вельмі добра гаварыў па-беларуску — без акцэнту.

А Шыла? Ён і дзясятай часці аб сабе не сказаў. А мо гэта Вы скарацілі, адкінуўшы непатрэбнае? Я М. Шылу ведала добра ў Менску, а пасьля яшчэ лепш тут, у Вільні. Ён памагаў майму мужу рабіць пляны дому, у якім і цяпер жывем.

Маю цікавую групу — Варшаўскі беларускі гурток, дзе шмат маіх добрых знаёмых: Л. Дубейкаўскі, сям'я Сталыгваў, Я. Гапановіч і інш.

Пісаць мне цяжка, ды і ня ўсё напісаць можна. Калі б Вы хацелі даведацца нейкія падрабязнасьці і змаглі ў Вільню прыехаць,— была б рада ўсім падзяліцца. Ня хочацца забіраць з сабою на той сьвет тое, што магло б быць у пэўнай меры карысным.

Усяго добрага! Шчыра зычлівая — *Л. Войцікава*.

252. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

21 лістапада 1985 г.

Шаноўны пане Адаме.

Учора атрымала ліст, адрасаваны Лявону [Луцкевічу]. Занепакоілася... Што з Вамі? Ніхто нічога не пісаў пра Вас. Аварыя якая? Ці прыступ якой хваробы, што аставіла свой сьлед? Калі зможаце, напішыце, калі ласка.

Я пару дзён таму пісала Вам у сувязі з Вашым артыкулам, у якім падаяце ўспаміны Кветкі Вітан і Міколы Шылы. Ці атрымалі?

Сяньня адказываю толькі на Вашае пытаньне аб Палуце Бадуновай[1]. На жаль, ня ведаю яе біяграфіі зусім. Яе, вядома, ведала і здымак маю, але яна шмат старэйшая, займалася толькі палітычнай работай, належала да партыі эсэраў. У працы грамадзкай удзелу не прыймала. Не бывала ні ў Беларускай хатцы, ні на г.зв. суботніках. Да Грамады — як гэта піша М. Сташкевіч[2] у кніжцы "Приговор революции", не належала, ды і я з П. Бадуновай ніколі ў адной групе не працавала, як гэтага Сташкевіч хоча...

Адзін раз мы з Вандай Лявіцкай пайшлі да П. Бадуновай у госьці. Прыняла ветліва, але як дзяўчат, шмат ад сябе маладзейшых, абыякавай гутаркай. На тым і скончылася...

Вельмі крыўдна, што ў Энцыкляпэдыі так шмат вартасных людзей абмінулі ўвагай. Але што зрабіць? Можа, хоць у гэтай анталёгіі, аб якой пішаце, якія прапушчаныя Энцыкляпэдыяй прозьвішчы знойдуцца? Але гэта тутэйшым шырокім масам нічога ня дасьць. Да іх ня дойдзе.

Так хацелася б паказаць Вам варшаўскіх беларусаў, расказаць аб Л. Дубейкаўскім, Сталыгвах і г.д. Думала, што ўдасца пусьціць у друк (асобнай кніжкай) некаторыя разьдзелы з маіх "Успамінаў", у тым ліку і "Дзесяць месяцаў у Варшаве", адкуль пачалося маё знаёмства з Л. Дубейкаўскім, але, здаецца, нічога з гэтага ня будзе...

Відаць, нядоўга ўжо змагу адказываць цікаўным на розныя пытаньні аб старым часе, знаёмых людзях. Тады і застанецца ўсё забытым. Хіба што, нехта пацікавіцца маімі архівамі.

Усяго найлепшага! Зычу набраць сілы, бадзёрасьці, вярнуцца да поўнага здароўя. Ад маіх — прывітаньне і найлепшыя пажаданьні. Шчыра зычлівая — *Л. Войцікава.*

253. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

14 сьнежня 1985 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Зусім нядаўна я Вам пісала, сяньня, маючы крыху часу (не дзівіцеся, што і я ня маю часу), хачу напісаць некалькі слоў аб уражаньні ад твораў У. Арлова[1]. Прачытала "І вярталіся мы" з цікавасьцю і прыемнасьцю. Хачу яшчэ раз да гэтага вярнуцца. А ведаеце, чаму я не прачытала аповесьці раней, калі "Маладосьць" атрымала з пошты? Бо ў гэтым нумары на пачатку зьмешчаныя ўспаміны пра Я. Коласа — С.Х. Александровіча, а там разьдзел "У двары пана Русецкага".

Не магу дараваць Коласу ўсёй гэтай зьдзеклівасьці, проста ненавісьці да Русецкіх... За што гэты "нэпман", за што высьмейваньне? Што да яго зьвярталіся "пан"? Мы ж тады ўсе да аднаго былі "панамі", як у нашаніўскія

часы — інакш адзін да другога не зварочваліся. Гэтае “па-бацьку” — зусім для нас чужое (што і М.М. Улашчык[2], гісторык жа, прызнае), пасьля ўвайшло ў моду. Я і цяпер не люблю гэтага звычаю і, як магу, пазьбягаю яго.

Няўжо ў Русецкіх ад 1918 да 20–21 гг. так усё зьмянілася? Адкуль 3 дамы? Адкуль забудаваны хлеўчукамі панадворак і г.д. Адкуль поўна кватарантаў? Я Русецкіх абоіх вельмі добра ведала. Запрацаваныя ў сваім садзе і пчольніку, з чорнымі ад працы рукамі, вельмі гасьцінныя і сардэчныя. Калі мы наладзілі для бежанцаў курсы садаўніцтва, агародніцтва і пчалярства (гэта былі першыя курсы ў беларускай мове, і то з дазволу Міністэрства земляробства! — год 1916-ы, вясна-лета; маю поўную праграму гэтых курсаў), практычныя заняткі праводзілі ў садзе Русецкіх. Ён сам запрапанаваў, што з работамі ў пчольніку пазнаёміць сам, асабіста. А ў садзе займаліся самі. Сам правёў цэлы цыкль заняткаў, гаварыў па-беларуску. Не за плату ж. Ніхто тады ніякой платы за працу грамадзкую не атрымліваў...

Скончыліся курсы... У хуткім часе пастанавілі арганізаваць “Ткацкую майстроўню”. Камітэт помачы ахвярам вайны дэлегаваў У. Галубка, Р. Зямкевіча і мяне да Русецкіх на Старажоўку — наняць у іх кватэру на ткальню. У Русецкіх было 2 дамы. Адзін, у якім жылі самі,— стары-стары, драўляны, у зямлю лез,— стаяў у садзе. Другі — таксама драўляны, новы, на панадворку ад вуліцы Старажоўскай — быў пусты. У гэтым мы нанялі кватэру.

Пакуль існавала ткальня, некалькі меяцаў я там бывала кожны дзень, бо была кіраўнічкай. Ніколі ніякай непрыемнасьці, ніякіх спрэчкаў. Пасьля ў гэтым доме жыла дачка Ядвігіна Ш. Ванда з мужам Язэпам Лёсікам і, амаль адначасна, сям’я Смолічаў. Апошнія — нядоўга. Мяне ўжо ў Менску не было. Алеся Смоліч, зьмясьціўшы ў “Маладосьці” кароткія ўспаміны аб Коласе, пісала, што Колас напісаў “злосны памфлет на пана Русецкага”. Я адразу напісала ёй, што гэта з яе боку вельмі нядобра — падаваць да друку такія весткі. Пішу ёй, ці ты сама мела якую непрыемнасьць з боку гаспадара? Нейкую крыўду? А з боку Коласа гэта вельмі брыдкі паступак. Ня думала, што ён на такое здольны.

Як Смолічыха была ў мяне тут, у Вільні, я ізноў аб гэтым гаварыла і казала: ведаеш, Алеся, Аркадзь (Смоліч) ніколі б гэтага не пахваліў. А тут раптам аж у 1985 г. С. Хусэйнавіч шырака апісывае гэты факт, з радасьцю падае яго, быццам вялікую заслугу Коласа.

Я так знэрвавалася (цярпець не магу несправядлівасьці — не навучылі мяне бацькі быць несправядлівай), што кінула гэты нумар “Маладосьці” і нічога ў ім не чытала. Каб Вы не нагадалі аб гэтым пісьменьніку, так бы і не прачытала яго твораў. Малады пісьменьнік, а на здымку зусім не малады. І на што яны цяпер абрастаюць бародамі ды вусамі? Праціўная мода... Некалі мой бацька запусьціў бараду. Не памаглі пратэсты ні жонкі, ні бацькоў (мне было 6–7 гадоў). Толькі калі пайшоў да сваёй бабулі, і яна не прыняла, а загадала пайсьці пагаліцца, паслухаў! Гэтак успомнілася з дзяцінства...

Вось забрала Вам шмат часу. Затое адкажаце на 2 лісты адразу, і гэта ўжо карысьць.

Усяго добрага. Шчыра — *Л. Война*

254. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

16 студзеня 1986 г. Вільня

Дарагая пані Данусь.

Учора атрымала Ваш ліст — сьпяшаюся адказаць. Не бядуйце, я са свайго боку зраблю ўсё, што магчыма. Насамперад — здымак пецярбургскі 1910 году. Там апрача Я. Купалы — хлапец, нейкі Адамовіч. Дзяўчат ня ведаю ніводнай. Ванда Лявіцкая ніколі ў Пецярбургу потым не была, а ў 1910 г. ёй было ўсяго 15 гадоў. Калі хочаце, магу прыслаць яе аўтабіяграфію. Толькі трэба яе перадрукаваць на машынцы, бо я цяпер вельмі невыразна пішу, да таго ж, мне цяжка шмат пісаць — дрэнна вельмі чуюся.

З гэтым перадрукам трэба зьвярнуцца да Лявона. Найлепш, каб Вы самі да яго зьвярнуліся з усім, што Вам трэба: фота Ів. Луцкевіча, нашаніўцаў (ёсьць усе: Іван і Антон Луцкевічы, А. Уласаў і В. Ластоўскі). Гэта ў мяне ў альбоме, але Лявон, напэўна, таксама ўсіх мае, калі не гатовыя, то на плёнцы. Што да здымка Ванды Л[явіцкай], то я ўжо прасіла Анатоля Аляксандравіча Наліваева, каб ён Вам здымак выслаў. Ён нядаўна быў у мяне і зрабіў цэлую стужку копіяў, у тым ліку і Ванды. Наліваеў пару гадоў таму намаляваў партрэт Максіма Багдановіча. Выйшаў даволі добра. Нядрэнна было б, каб ён зрабіў — намаляваў — копію для Гродна. Але цяпер ён мае пачатыя 2 партрэты, хоча іх скончыць.

Толькі што гаварыла з Лявонам. Ён кажа, што І. Луцкевіча і рэшту нашаніўцаў можа для Вас зрабіць, але даць іх у экспазыцыю Вам не дазволяць. Былі ўсе гэтыя здымкі ў Менску ў Музэі Якуба Коласа, то загадалі іх зьняць.

Даволі добры партрэт Я. Купалы нарысаваў Мікола Купава. Зьвярніцеся да яго, думаю, што не адмовіцца Вам адбітак прыслаць.

Я для Вас маю невялічкі мой эксьлібрыс і прышлю добры здымак, ня копію, але яшчэ ня маю. Здымкі рабіў віцебскі мастак — ён вельмі добра фатаграфуе,— але яшчэ не прыслаў, ня ведаю чаму. Думаю, што паехаў у Менск паступаць у асьпірантуру. Буду мець здымкі Варшаўскага гуртка — год 1913–14. Ці гэта Вас цікавіць?

Сьпяшаюся скончыць гэтую пісаніну і легчы. Больш як да 7-мі вечара дасядзець не магу. Вельмі завастрылася мая старая хвароба страўніка. Маю лекі, зёлкі, але нічога не памагае. Як лягу, то раней 4–5-ці раніцы болі не сьціхаюць, і не магу спаць. Ляжу і чытаю. Яшчэ добра, што вочы служаць.

Чакаю Вашага адказу, што прыслаць, а што не патрэбна. Трэба сабраць і тое, што [redacted] магу даць, і тое, што Лявон, каб выслаць усё разам.

Не разумею, чаму *ніхто* не цікавіцца Музэем М. Багдановіча. Ёсьць жа ў Гродне і мастакі, і пісьменьнікі... Яшчэ адно: ці Вас цікавіць асоба Гальяша Леўчыка? Я магла б даць і ўспаміны аб ім, і нядаўна напісанае "У гасьцях у Г. Леўчыка".

Цалую сардэчна, зычу плёну ў працы і здароўя. *Л. Войцікава.*

255. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

22 студзеня 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

На ўсялякі выпадак — можа, Вас гэта зацікавіць — паведамляю, што 16–17 лютага споўніцца 75 гадоў ад вечарыны-спэктаклю ў Гродне, калі наш гурток

паставіў камэдыю К. Каганца "Модны шляхцюк". Маю друкаваныя праграмы (вельмі падрабязныя). Гляджу на здымкі тых, хто выступаў на сцэне: у камэдыі, у хоры, з дэклямацыямі. А чаму 2 дні? Бо 16 лютага было шмат гасьцей паважных, паміж імі — Іван Луцкевіч, і для нашых малодшых сяброў не хапіла мейсца. Прыйшлося на другі дзень усю праграму паўтарыць.

Усё аднавілася ў памяці — быццам бачу. Толькі ня ўсіх магу расшыфраваць, бо прозьвішчы замененыя літарамі. Але вось ніяк не магу прыпомніць, на якой вуліцы была тая прыватная кватэра? Як яна называлася? Здаецца, каб сяньня паехала ў Гродна, адразу патрапіла б. Трэба будзе папрабаваць нарысаваць плян. Вось тады на гэтай вечарынцы дэклямавала мой верш "Што я люблю" дзяўчынка — Юзя Грынкевічанка, з якой мы пасьля сфатаграфаліся.

Ці атрымалі ўжо ад Лявона [Луцкевіча] сьпісак магілаў? Меўся Вам выслаць. Ці ўжо ведаеце, якія зьмены ў Гудзевічах? Вельмі трывожна за лёс музэю.

Мела я ліст ад Дануты Б[ічэль]. Жаліцца, што ніхто ёй не памагае, што ня мае вартасных экспанатаў. Я напісала, што магу даць. Прасіла адказаць, што з прапанаванага лічыць для музэю патрэбным. Але адказу яшчэ ня маю.

Нічога нявартая сёлетняя зіма. Ужо так было прыгожа — лес засыпаны сьнегам. Дрэвы белыя і такі марозік. А сяньня ізноў $+3^0$, вялікі вецер скінуў з дрэваў сьнег. Шэра, цёмна. Да лепшага стану здароўя гэта не вядзе. І сну німа, і ногі ня хочуць хадзіць. А што ў Вас чуваць? Як уся Вашая сямейка маецца? Як здароўе, настроі?

Вельмі шмат атрымала я сёлета павіншаваньняў на Новы год. Больш чым 80. У гэтым ліку ад былога падпісчыка "Бел[арускай] борці". Гэта ўжо 2-гі адазваўся. З адным мы ўжо гады 3 перапісываемся, абменіваемся насеньнем, расьлінамі.

Ці атрымліваеце беластоцкую "Ніву"? Я праз Новіка-Пеюна адзін нумар дастала. У ім надрукаваныя мае "Віленскія кірмашы". Адзін з сяброў віленскага Бел[арускага] студэнцкага саюзу, які цяпер жыве ў Польшчы, піша, што выпісаў для нас "Ніву". Цікава, ці будзе даходзіць?

Рада буду, калі атрымаю ад Вас хоць некалькі слоў. Шмат хто зьбіраецца прыехаць у Вільню ў архівы, але пакуль што яшчэ ніхто не прыяжджаў.

Усяго найлепшага ўсёй Вашай сям'і. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

256. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

29 студзеня 1986 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Сяньня высылаем Вам бандэроль. Назьбірала, што ў мяне было,— можа, з гэтага Вам што спатрэбіцца, хоць і не адносіцца да М. Багдановіча. Сваіх здымкаў высылаю 3. Шкадую, што ня маю таго з Менска, з 1916 году. Калі яго дастану, то прышлю.

Лявон Вам выслаў нэгатывы, бо яго лябараторыю завалілі рознай непатрэбшчынай, як рабілі рамонт кватэры, і ён да гэтай пары ня мог там зрабіць парадку. Мне тут трэба адну копію, дык ніяк не магу дачакацца.

Ці Вы маеце, ці захавалі фотакопію дакумэнту (зварот да менскага губэрнатара), пісанага рукой М. Багдановіча? Я некалісь прасіла В.У. Скалабана, каб Вам такую фотакопію выслаў. Гэта было ўжо даўна-даўна.

Ці яшчэ змагу што зрабіць,— ня ведаю, бо чуюся вельмі дрэнна. Часта ляжу,

ногі не трымаюць. Забылася напісаць аб здымку Ванды, што ўлажыла ў бандэроль. Наліваеў заместа Вам прыслаў яго мне. Але гэта і добра, бо бачу, што зрабіў здымак Ванды разам з яе мужам Я. Лёсікам. Таму ён *да экспазыцыі* не надаецца. Напішу, каб зрабіў іншы. Калі гэта будзе — ня ведаю, бо ў Наліваева рыхтуюцца да сьвята народнай песьні, якое адбудзецца ў лютым. Таму ён аб нічым іншым ня думае.

Аўтабіяграфію Ванды [Лявіцкай] варта Вам мець, але я папрашу зяця, каб передрукаваў яе на машынцы (цемнавата — і я зьбілася з лінейкі...). Калі гэта ўдасца, то і фота дамо іншае.

Я ўсё, што тычыцца сям'і Ядвігіна Ш., дала ў Лагойск — у музэй "Літаратурная Лагойшчына". Здымкі, біяграфіі, жменьку ўспамінаў. А Вам прысылаць фатаграфію Ядвігіна Ш., ці ня трэба?

Што да слуцкага поясу — нічога не магу парадзіць. І дзе яго шукаць? Падобна, слуцкія паясы ёсьць у Заслаўі? Няхай бы які мастак паехаў і добры малюнак зрабіў.

Пішыце. Цалую сардэчна, зычу лепшага настрою, спакою, сьветлых думак. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

257. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

29 студзеня 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Здаецца, толькі Вы і засталіся з бліжэйшых знаёмых, што пісалі... Генадзь Аляксандравіч [Каханоўскі] — маўчыць. Падобна, хварэе. А. Белакоз таксама ня піша. Магчыма, у шпіталі. Страчаная сувязь з Гудзевічамі — вялікая для мяне прыкрасьць. Так прывыкла за столькі гадоў жыць жыцьцём музэю. Разам цешыцца, калі ўсё добра, разам бедаваць, калі што не ўдаецца.

Непакоіць мяне асабліва лёс двух аддзелаў — "Лён" і "Зёлкі". Асабліва апошняга. Калі Алесь Мікалаевіч [Белакоз] сам яго не давядзе да парадку, то ўсё прападзе. Ня думайце, што шкадую толькі сваёй работы, не — ідзе аб большым: аб мове, аб беларускіх назвах расьлінаў. Бо хто іх ведае? Можна сьмела сказаць — ніхто. Ня ведае і ведаць ня хоча... Быццам мова складаецца толькі з граматычных формаў, сынтаксысу і г.д.

Вось у Вашым артыкуле аб мове Вы высьветлілі справу гэтага няшчаснага *плацьця* ды і іншых падобных недарэчнасьцяў, а вазьміце Я. Скрыгана — у яго дзясяткі артыкулаў аб мове. Ёсьць, безумоўна, добрыя, разумныя заўвагі, але калі я яго запыталася, а што з тымі назовамі рэчаў, расьлінаў і г.д., аб якіх мы гаворым, бо іх маем каля сябе, даслоўна пад нагамі, а называем чужымі назвамі, ён мне адказаў, што на гэта німа рады, бо *"так жыцьцё вядзе"*. Не жыцьцё, а абыякавасьць, асабліва да прыроды. Прыродай захапляюцца, ахаюць ды охаюць... А як што назваць? Ці ня ўсё роўна... Гэта вынік таго, што ў школах вучыліся толькі мове-літаратуры, а ўсё іншае — у чужой мове.

Вы, вядома, чыталі ў "Маладосьці" фотарэпартаж аб Гудзевіцкім музэі? Здымкі добрыя, прыгожыя, напісана наагул нядрэнна, але калі Алесь Мікалаевіч зьвярнуў увагу на сабраныя матэр'ялы да аддзелу зёлак і прасіў напісаць аб тым, што ўжо зроблена, аўтар фотарэпартажу адмахнуўся і напісаў: "Цяпер пашукаюць зёлак і тутэйшых назваў" і г.д. А колькі там ужо дзеці працы ўлажылі...

25 студзеня была ў мяне дырэктар Архіва-музэю з Менску Ганна Іванаўна

Сурмач[1] — яна, паміж іншым, з Гродзеншчыны. Здаецца, гаворыць і піша па-беларуску добра, а ніводнай беларускай назвы расьлінаў ня ведае — толькі рускія. І чаму гэта так? Чаму такая абыякавасьць якраз да гэтай галіны мовы дзядоў і прадзедаў?

І гэтак ва ўсіх — у радок. Як напіша хто верш — абавязкова ўставіць якую расьлінку, назваўшы яе ў рускай мове. Нічога не магу зразумець.

Ніяк не магу здагадацца, адкуль С.Х. Александровіч узяў усе гэтыя інфармацыі пра Русецкага. Там у гэтым доме адначасна з Коласам жылі Лёсікі (Ванда Лявіцкая з мужам) і Смолічы (Аркадзь з жонкай Алесяй). Вось Алеся ў канцы 60-х гадоў дала ў "Маладосьці" кароткія ўспаміны пра Я. Коласа. У іх напісала, што "Колас напісаў злосны памфлет на пана Русецкага". Я на яе абурылася: "Нашто ты гэта напісала? Каб жыў Аркадзь, ніколі б на гэта не пазволіў, бо быў сумленным чалавекам". Яна адказала, што напісала пра *тое*, што зрабіў Колас, а не сваю думку, бо сама не прыдумала.

Але гэта была гутарка толькі аб памфлеце, а скуль рэшта бессэнсоўных падрабязнасьцяў? Чытала я з вялікай прыкрасьцю, але Александровічу нічога не пісала. Ён тады быў цяжка хворы.

Штораз больш легендаў каля асобы М. Багдановіча. Што напісаў Б. Мікуліч[2] — гэта працяг Бядулінага "Страцім-Лебедзя", дзе німа ні капелькі праўды... У мяне ляжыць выясьненьне да "Страцім-Лебедзя" — з фотаздымкамі таго дому, дзе жыў Бядуля і — Багдановіч. Гэтае выясьненьне я паслала ў Менск у Музэй М. Багдановіча. Схавалі яго глыбока, не паказываюць. Кіраўнікі сабралі шмат чаго пра Бядулю, яго сям'ю, нават "сёстры" размножыліся — аднекуль узялася трэцяя...

Як мне пісалі, цяжка было зразумець, ці гэта Музэй Багдановіча, ці Бядулі... Але памалу ачысьцілі. Пасьля знайшлі нейкага праф. Адамава[3], які "пазнаёміўся ў Менску з Максімам, і разам аглядалі нейкую выстаўку ў залях, дзе былі і слуцкія паясы, і абразы" і г.д. Ізноў казка, бо нічога падобнага не было. А цяпер далей — Музэй хваліцца, што здабыў успаміны дачкі Альбэрта Паўловіча[4], дзе яна кажа, як яны "часта бывалі ў Беларускай хатцы, а Максім у іх" і г.д. А ў сапраўднасьці А. Паўловіч з дачкой Уладыславай і зяцем Я. Фарботкай[5] былі ў Бел[арускай] хатцы *адзін-адзіны* раз — на сьвяткаваньні Новага 1917 году. А маладыя дочкі — ніколі. Ці быў у іх Максім? Можа, калі і быў — ня ведаю.

Творы А. Паўловіча ў Бел[арускай] хатцы чыталі, асабліва калі зьбіралася моладзь. Але сам А. Паўловіч ніякага ўдзелу ў грамадзкім жыцьці беларусаў не прыймаў. Падобна, у яго ўдома адбываліся канцэрты, прыяжджалі з правінцыі і г.д. Але з нас, работнікаў Камітэту помачы ахвярам вайны, *ніхто* ў яго не бываў. Ні Галубок, ні Ядвігін Ш., ні іншыя. Чаму так? Ня ведаю...

Вось бачыце — ужо 4-я легенда. Я ня веру ў той музэй. Прыяжджалі раз да мяне з магнітафонам і сваім супрацоўнікам-фатографам. Апошні ні гаварыць, ні пісаць па-беларуску ня ўмеў... І як ім верыць? Зусім магчыма, што і мне ня вераць. Скарынкін[6] жа сказаў аба мне: "Што яна можа помніць?"...

Добра было б яшчэ хоць раз з Вамі пабачыцца. А цяпер, калі што трэба, пытайцеся. Каб пасьпець падзяліцца ўсім, што ведаю. Бо вельмі дрэнна чуюся. Часта ляжу, ногі дрэнна ходзяць, не магу доўга сядзець.

Сяньня выслала Дануце Б[ічэль] крыху розных здымкаў. Можа, што выберацца для музэю. Добра было б, каб і Вы перагледзелі. Гэта ўсё здымкі, што робіць і прысылае мне Анатоль Наліваеў. Часам па пару экзэмпляраў. Мусі,

на гэтым скончу. Трэба легчы.

З ночы быў невялічкі мароз, а цяпер ізноў пацяплела. Хмарна, сьнегу шмат, лес прыгожы.

Усяго добрага ўсёй Вашай сямейцы. Унук Ваш — малайчына! Як гэта радасна ведаць ня толькі Вам, блізкім, але і мне.

Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

258. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

17 лютага 1986 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Выбачайце, што так доўга маўчу. Ня чуюся добра, часта ляжу, а гэта забірае шмат часу. Як бачу з Вашага ліста, ня вельмі я Вам памагла сваёй бандэроляй. І ўсё ж У. Галубок, чый здымак я Вам паслала, быў штодзённым сябрам Максіма [Багдановіча]. На тым здымку — фотакопіі з календара (здаецца, добра ня помню) — шмат знаёмых і сяброў Максіма: У. Фальскі, У. Галубок, сёстры Бядулі, дзяўчаты з хору — Вера і Люба Тарасік. Яны ўсе сустракаліся з Максімам — калі ня кожны дзень, то вельмі часта.

Пішаце, што ня маеце Ігната Буйніцкага... А я ж Вам паслала яго трупу — ён пасярэдзіне. Я маю асобны здымак Буйніцкага, але німа як копію зрабіць. Я Вам шчыра раджу зьвярнуцца да Анатоля Аляксандравіча Наліваева (*220104, Мінск, вул. П. Глебкі, д.90, кв. 19*). У яго здымкі, фотакопіі вельмі добрыя — мае іх больш за 5000. Ахвотна памагае ўсім музэям. Здымкі часта ўнікальныя — са старых архіўных матэр'ялаў.

Што да Ванды Л[явіцкай] — гэта копія з арыгіналу. Што ж рабіць, яна такая была — ня ўсе могуць быць прыгожымі... Працавітая і вельмі добрая душа. Я і цяпер яе лісты перачытываю з прыемнасьцю.

У гэты ліст кладу здымак Ядвігіна Ш. Гэта вынятак з групы 1917 году. Ён крыху недатрыманы, цьмяны, але на ім Ядвігін Ш.— як жывы. Той, што ў кніжцы "Творы",— нічога няварты. І выгляд, і выраз твару — не Ядвігіна.

Маю здымак сям'і Ф. Багушэвіча — ён сам, яго жонка, 2 дачкі і сын. Калі такога ня маеце — прышлю. А да Наліваева напішыце...

Пані Дануся, пішаце, што я па сьмерці мужа мела каля сябе людзей... Вельмі памыляецеся, я мела каля сябе — лес. Асталася абсалютна адна, бо дачка вучылася ва ўнівэрсытэце, транспарту ніякага не было, хадзіць далёка і небясьпечна, таму яна жыла ў горадзе, прыходзіла толькі на нядзелю. Я нанач брала ў кухню сабаку. Быў у нас такі злы і чуткі Рэкс. Але мне яго атруцілі. Тады я ўжо зусім адна асталася.

Знаёмая жанчына прынясла мне малога шчанюка. Спаў у скрыначцы каля майго ложка. Баяўся, мусі, больш чым я, бо часта будзіўся, прынюхіваўся і лапкай прабаваў, ці я куды ня дзелася.

Пасьля пару месяцаў жыла ў мяне сяброўка Галі — з Віленскай Беларускай гімназіі. Я крыху аджыла і хоць па хлеб магла ў краму пайсьці. Час быў вельмі неспакойны, людзі сапсутыя вайной — кралі, нішчылі... З агароду выбіралі ўсё дачыста, што толькі вырасла: моркву, бручку, мак... Аб яблыках і гаварыць німа чаго — на вачах абіралі. А людзі? Свая беларуская інтэлігенцыя? Пасьля паховінаў ніхто не зайшоў... А пасьля адзіны раз зьявіўся мастак П. Сергіевіч. Пабачыў, што жывая, на тым і скончылася.

А тады ж яшчэ беларусаў было нямала — старэйшых і маладзейшых. А Вы кажаце: людзі... Ой, як цяжка ў нас знайсьці сапраўднага чалавека...

А ў дадатку да ўсяго мой сын у той час быў у ссылцы. Я 12 гадоў ня ведала, ці ён жывы, ці яго німа...

Вось які быў мой лёс. Нават сяньня, калі гэта пішу, дзіўлюся: як я вытрымала? як выжыла? Ну, хопіць...

Пара падзяліцца другім — маю праўнука! Назвалі Алесем. Слава паведаміў, што ўжо забраў сям'ю дахаты. Галя і Лявон зараз ідуць прывітаць новага Чалавека. А я ізноў астаюся, пакуль ня вернуцца, адна. А малога пабачу, калі надыйдзе вясна і будзе цёпла. Вось і пастарэла я на цэлае пакаленьне. І чуюся штораз горш.

Усім-усім шчырае прывітаньне. Цалую сардэчна. Пішыце. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

P.S. Учора былі 75-я ўгодкі беларускай вечарыны-спэктаклю ў Гродне. Ставілі "Модны шляхцюк". Былі дэклямацыі, хор. Маю падрабязную праграму, здымак удзельнікаў.

259. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

5 сакавіка 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Атрымала яго ўчора. Пачну, на маю думку, ад самага важнага. Я ўжо шмат гадоў карэспандую з Уладзімірам Содалем. Шмат думак круціцца вокал тэмы "М. Багдановіч". Яго знаёмства з Вандай Лявіцкай, іх ліставаньне, пазьнейшыя адносіны... Успаміны людзей з в. Карпілаўка аб сям'і Ядвігіна Ш. і г.д. А цяпер я дзялюся з У. Содалем усімі легендамі, якімі абрастае імя Багдановіча. Ён, Содаль, усё захоўвае, а, магчыма, у пэўным сэнсе выкарыстае.

Цяпер — галоўнае. Як мне пісала Н.Б. Ватацы, малады пісьменьнік А. Асташонак[1] задумаў да 100-годзьдзя М. Б[агданові]ча напісаць кніжку аб паэце. Падобна, зьбірае матэр'ял. Але які і дзе? Калі з тых брудных крыніцаў, якімі хваліцца Менскі музэй Багдановіча, то...

Я напісала да Ніны Барысаўны, прапанавала гэтага пісьменьніка накіраваць да мяне, пакуль я яшчэ рухаюся. Але, магчыма, Н.Б., як і супрацоўнікі Менскага музэю, магла ня верыць у маю старую памяць і з тым пісьменьнікам не гаварыла. А, можа, ён сам даверу да мяне ня мае? Калі пачне выкарыстоўваць матэр'ялы Бядулі, Мікуліча, нейкага Адамава, то што атрымаецца? Страх падумаць... Адна пацеха, што я да таго часу не дажыву. І нэрвавацца ня прыйдзецца.

Пытаецеся аб факце прысутнасьці І. Луцкевіча на нашым спэктаклі? Паміж іншым, ня ведаю, хто і калі пачаў старэйшага Луцкевіча называць Іванам, бо ён у лістах падпісываўся *Ян.* Маю пару яго лістоў з такім подпісам.

І вось Я. Л[уцкеві]ча мы на спэктакль запрасілі, і ён не адмовіўся — прыехаў. Пасьля ў "Нашай ніве" (№ 8, 1911 г.) зьмясьціў адпаведную карэспандэнцыю. Я і цяпер шкадую, што пасьля спэктаклю амаль з ім не гаварыла, бо мы разам з нашым старшынёй гуртка А. Бычкоўскім сьпяшаліся на вечарыну ў польскі вучнёўскі гурток: "Koło polskej mlodzieży postępowej"[2]. Яны бывалі ў нас у бел[арускім] гуртку, і нам не выпадала ня быць у іх. Нашага віленскага госьця запрасіў да сябе кс[ёндз] Францішак Грынкевіч.

З Гудзевічаў мне пішуць. Працуюць яны — Алесь Мікалаевіч [Белакоз], новы дырэктар Юрась Новік і малодшы навуковы супрацоўнік Хомка Алена Пятроўна — вельмі інтэнсіўна, падлічаюць-сьпісываюць экспанаты. Аб аддзеле зёлак думаюць. Але як што рабіць, калі новы будынак не рамантаваны? Страха цячэ, сьцены залівае. Зрабілі залю лёну, а цяпер усё выносіць трэба.

А з назвамі расьлінаў — трагедыя. Каб жа гэта маладыя ня ведалі сапраўдных народных назваў... Але ж якраз наадварот — маладыя, асабліва мастакі, ведаюць, шукаюць, а старыя паэты — С. Шушкевіч, М. Лужанін, В. Вітка[3] — падумаць лянуюцца, так і садзяць у свае творы *сон-траву, маці-і-мачыху, доньнік* і інш.

Пытаецеся аб энцыкляпэдыі "Прырода Беларусі". Там тое самае — памылак поўна. На просьбу Генадзя Алякс[андравіча] Каханоўскага я зрабіла сьпіскі памылак, паслала яму. Занёс намесьніку дырэктара энцыкляпэдыі. Той сказаў, што цяпер ужо позна, ня выправіцца, а далей папраўкі будуць узяты пад увагу. Тлумачыцца, што артыкулы пра расьліны пішуць выпадковыя людзі, часта студэнты. Але ж гэта несумленнасьць! Спраўдзіць можа кожны ў слоўніку. Але, праўду сказаць, у энцыкляпэдыі пералічаны "батанічныя сады", "батанічныя запаведнікі", але *"Батанічнага слоўніка"* — німа.

Цяпер то, мусі, і сапраўды, "Бат[анічнага] слоўніка" і з агнём ня знойдзеш. Аб маім то і гаварыць німа што. Былі зробленыя ў свой час 5 ксэракопіяў — 3 ў Менску, у Акадэміі навук (стараньнямі Л.І. Збралевіч) і 2 экз.— тут у Вільні, аб што пастаралася Н.А. Ляшковіч. Слоўніка Кісялеўскага[4], мусі, таксама ўжо даўно німа. Шмат выдаецца рознай дробязі-непатрэбшчыны, і то ня ў нашай мове. Можна было б хоць які слоўнічак зрабіць — перадрукаваць. Але нашто?

Я зьвярнула ўвагу Я. Скрыгану, што ва ўсіх артыкулах аб мове якраз гэты бок мовы нікога не абходзіць. Ён мне адказаў: "На гэта рады німа. Да гэтага вядзе жыцьцё". Як ён гэта разумее? Німа сапраўднай вёскі, німа сапраўднага селяніна, усе жывуць па-гарадзкому, то і расьліны па-гарадзкому (г.зн. па-руску) называць можна, а не па-мужыцку? Гэта тэма балючая, даводзіць мяне да хваробы. Разбалелася галава. Як і кожны дзень, да вечару не дасяджу — трэба легчы.

Аб тым, што Лявон [Луцкевіч] атрымаў ад Вас ліст, матэр'ялы аб асобах памёршых, толькі ад Вас даведалася. А мне нічога гэты "навуковец" ня кажа, нічым ня дзеліцца. А калі я што маю новае, для мяне цікавае — на ўсё махае рукой: няважна.

Але не магу не падзяліцца з Вамі, які падарак я атрымала толькі што ад А. Мальдзіса. Пачну здалёк. У маі 1911 г. наш старшыня гуртка Адам Бычкоўскі скончыў гімназію і меўся выяжджаць з Гродна. ГГБМ наладзіў пажагнальны вечар. Малодшая сэкцыя жагнала яго дэклямацыямі і, здаецца, кветкамі. Ад нас, старэйшых, дастаў на памятку кніжку — том Карскага. Даравальны верш напісала я...

Ня ведаю, якім чынам гэтая кніжка асталася ў Пацярбургу. Там А. Бычкоўскі канчаў юрыдычны факультэт. Чаму, выяжджаючы, аставіў, і дзе — ня ведаю. Але цяпер гэтую кніжку пабачыў у Ленінградзе А. Мальдзіс. Даравальны надпіс зьняў і прыслаў мне. Можаце сабе ўявіць, якая радасьць, які жывы ўспамін...

І адначасна — аблітая халоднай вадой. Ня толькі Лявон, але і дачка не зацікавілася, не глянула. Вось як мне жывецца... Нясоладка, праўда? Што ж рабіць? Неяк цягнуць гэтыя дні трэба.

Усяго Вам добрага! Ці ўжо зусім скончылі хварэць? Ці ўсе здаровыя?

Знойдзеце хвіліну часу — пішыце. Пані Марыі — шчырае прывітаньне. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

260. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

6 сакавіка 1986 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Сардэчна дзякую за памяць і асабліва за падарунак, за ўвагу. Як жа ён усё збудзіў у памяці... Той далёкі час, той "пажагнальны" вечар, калі мы расставаліся з нашым старшым сябрам, з нашым кіраўніком-старшынёй Адамам Бычкоўскім. Цяжкі быў яго жыцьцёвы лёс, і жыў нядоўга. А да апошніх сваіх дзён быў аддданым сынам свайго народу... Маю некалькі яго лістоў, успаміны аб ім — ужо з варшаўскага часу — Пятра Ластаўкі.

Сёлета ў мяне не адзін юбілей, зьвязаны з Гродзенскім гуртком. 16 лютага мінула 75 гадоў ад дня, калі мы ў Гродне ставілі "Моднага шляхцюка" К. Каганца. Якое ж гэта было сьвята! А якая радасьць, калі на гэты спэктакль не адмовіўся прыехаць запрошаны Ян Луцкевіч... Пішу — *Ян*, бо ён так падпісываўся ў лістах. Хто і калі зрабіў яго Іванам — ня ведаю. Успаміналa той дзень, той юбілей адна... І сумна было, што німа з кім падзяліцца...

У кніжцы (рукапіснай) сваіх успамінаў вельмі дакладна нашую працу апісываю. Гэта ж быў 1911 год! Ці дзе адбываліся ўжо такія падзеі-спэктаклі? Ня ведаю.

Ці бываеце ў Вільні? Ня шкодзіла б ізноў нам з Вамі спаткацца, пакуль яшчэ крышку трымаюся за зямлю. Што трымаюся ўжо слаба — не скрываю. Ды і цяперашні почырк аб гэтым гаворыць.

Усяго Вам добрага ў жыцьці і працы! Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

261. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

10 сакавіка 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Такая справа: у Гродне, нават на Вашай вуліцы, жыве дачка нашага агранома Янкі Пачопкі — аўтара кніжак "Пчолы", "Агародніцтва" і інш. У яе (ведаю ад яе сястры, з якой карэспандую) ёсьць запісанае на магнітафонную стужку іх сямейнае сьвята — 50-годзьдзе шлюбу бацькоў і, здаецца, сьвяткаваньне дня нараджэньня самога агранома. Усё гэта, падобна, з песьнямі, прамовамі, а магчыма, і з вершамі самога Янкі Пачопкі.

Ці ня думаеце, што гэта вартасны фальклёрны матэр'ял? Ці ня варта было б яго занатаваць на магнітафон? Меўся гэта зрабіць С. Астраўцоў. Я яму давала адрас. Ці быў там? Ці прабаваў? Ня ведаю...

Шкада было б, каб такія запісы бескарысна прапалі. Калі б тая дачка Янкі П[ачоп] кі (маю яго аўтабіяграфію) не згадзілася, то я магла б напісаць да яе сястры. У іх хатнія, сямейныя абставіны такія — тая, што ў Гродне, адзінокая. Другая мае сына і ўнукаў, але сын нямы... Яго жонка хворая, здаецца, глухая. Хлапцы? Яшчэ, хіба, невялікія, у кожным выпадку не надаюцца на нашчадкаў нашага агранома і зьбіральніка фальклёру. Маю яго здымак і здымкі яго магілы.

Што думаеце ў гэтай справе? Хоць бы Вы праслухалі тыя запісы. Выбачай-

це, што так мажу. Напісала 4 лісты і ўжо не магу. Мушу легчы. Раблю гэта штораз часьцей...

Калі што яшчэ хочаце ведаць — пытайцеся. Пастараюся адказаць. Ці надыходзіць да Вас вясна? Усяго добрага Вам і ўсім Вашым. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

Адрас: *Пачопка Зоя Іванаўна, Гродна, вул. Горкага, д.71, кв.100.*

262. МІХАСЮ ВЕРАЦІЛУ

20 сакавіка 1986 г. Вільня

Паважаны Міхал Уладзіміравіч[1].

Копію "Бат[анічнага] слоўніка", ліст і "Каласкі" атрымала... Падпішу і адашлю... Сяньня пішу толькі некалькі слоў — каб Вы не нэрвавалі, што гэта так доўга трывае, і ня думалі, што Вашая бандэроль недзе прапала...

Я сама асабіста ўжо даўна не бываю ў горадзе і на пошце. Аб усе перасылкі мушу прасіць зяця і таму стараюся сабраць некалькі бандэроляў адразу, каб не рабіць лішняга клопату. Вось і цяпер прыгатую новую порцыю.

Захопленая Вашай працавітасьцю і жаданьнем за ўсялякую цану здабыць як найбольш экспанатаў у Вашай прыватнай бібліятэцы-архіве. Як Вам удалося захаваць выданьні суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца"?

Я, выпісываючы ад 1909 году ўсё выданае суполкай был[ога] Гродзенскага гуртка беларускай моладзі, маю сьпіскі ўсяго, што суполка выдавала, цэны паасобных кніжак-пісулек, партрэтаў, ня маю ніводнага экзэмпляра. Ведаю, сколькі чаго выпісала, што ў бібліятэку, сколькі чаго ўзялі сябры гуртка — толькі для сябе асабіста нічога не захавала... Цяпер шкадую...

Што да майго "Батанічнага слоўніка", я ўсе гэтыя "памылкі" і ўсё "прапушчанае" ў слоўніку адразу ведала і бачыла, але ў абставінах тагачаснага выдавецтва паправіць своечасова не змагла... У 70-я гады — калі яшчэ жыў наш пісьменьнік Уладзімір Караткевіч — з "Бат[анічнага] слоўніка" былі зробленыя ксэракопіі — 3 экз. зрабілі ў Менску ў Акадэміі навук і 2 экз. тут у Вільні. Усе разышліся... Не запісала і цяпер нават ня помню, хто іх у мяне выпрасіў. Ведаю толькі, што самы першы экзэмпляр узяў сабе с.п. У. Караткевіч...

Цяпер у самым-самым канцы жыцьця стараюся перадаць маладым тое, што маю ў памяці з часоў працы ў Гродна, Менску, Вільні... Таму мушу шмат пісаць, шмат адказываць на лісты, расказываць пры сустрэчах. Ці ўдаецца ўсё перадаць? Усё прыпомніць? Ня ведаю... Але стараюся...

У найбліжэйшы час бандэроль прыгатую і вышлю. Зычу Вам далейшых добрых помыслаў дзеля пашырэньня колькасьці Вашых скарбаў. Усяго добрага. Зычлівая *Л. Войцік.*

P.S. А мае подпісы падробленыя па-мастацку. Самой ня верыцца, што гэта ня [redacted] пісала.

263. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

31 сакавіка 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Бачу з Вашага апошняга ліста, што я Вам ня выясьніла мясцовасьці нашай

дзялкі. Забылася. Мы купілі гэтую зямлю ад жыхара вёскі Рэвянцы, што цяпер за гарой, блізка нас. Некалісь сялянам гэтай вёскі давалі такія надзелы сярод лесу. Сяньня гэта ўжо ня вёска, а вуліца Рэвоню, далучаная да гораду. І наш фактычны адрас — *Рэвоню, 81*. А ў купчай (дакуманце аб куплі) дзялка названая Сарадзеры — вось і разьбярыцеся, бо я ўжо сама заблыталася...

Лес наш — фактычна Панарскі (яго і А. Міцкевіч у сваіх творах сярод іншых лясоў успамінае[1]), а мясцовасьцяў Панары ёсьць дзьве — кілёмэтры са тры ад нас Ніжнія Панары, а далей — Верхнія Панары: станцыя, дамы, інстытуцыі і г.д. Цяпер, здаецца, усё. А ўсе, хто бывае і прыяжджае, кажуць — Лясная хатка.

Пры такіх паглядах новага кіраўніка Рэспублікі "ЛіМ", напэўна, не асьмеліцца надрукаваць прысланыя працы аб мове Сяргея Дубаўца. А які ж будзе вынік ліста[2] да Гарбачова[3]? І ў якім становішчы акажуцца падпісаўшыя гэты ліст?

Прыслаў копію гэтага ліста сакратар "Паходні"[4] — праз нашага тутэйшага мастака, які быў у Гродне. Копія ў Лявона, але ён мне даў прачытаць.

Справу таго календара-загадкі вельмі хацелі б парушыць асабіста з Я. Саламевічам. А ён быў, як відаць з далучанага ліста, у поўнай веры, што так і было. Але ці я яго (Саламевіча) дачакаюся? Завалены штораз новай работай... А выясьніць гэтую недарэчнасьць неяк трэба...

Ёсьць і шмат чаго іншага, ня менш важнага, хоць бы ў брашуры Говіна "Друк Заходняй Беларусі". Ня стане мяне — усё так і застанецца... Шмат хто прыяжджае, прыходзяць мясцовыя беларусы, але ўсё гэта дзеля такіх гутарак людзі неадпаведныя. Іх гэта не зацікавіць — усё старое, усё ў мінулым. Цяпер пару асоб прыяжджала, каб парадзіцца пра дзіцячую літаратуру для беларускіх груп у дзіцячых садках.

Аб працы "Паходні", аб іх сустрэчах ведала з падрабязнага ліста Міколы Таранды. Аб узнагароджаньні Алеся Мікалаевіча [Белакоза] газэту з аб'явай прыслаў мне Новік-Пяюн. Сам А.М. пісаў аб тым, што тэлебачаньне праз тры дні працавала над дакумэнтальным фільмам аб Гудзевіцкім музэі. Д-р Кутарга[5] паведаміў мяне аб праектаваньні на май экскурсіі з Вільні ў Гудзевічы, і што ён туды паедзе. Але ці А.М. захоча гаварыць аб сваёй хваробе?

Атрымала пару лістоў ад школьных літаратурных гурткоў. І — якая розьніца паміж імі... Учора атрымала ліст са школы ў Германавічах Шаркаўшчынскага раёну. Пішуць, што арганізавалі хор — часта ідуць па вёсках, танцуюць лявоніху, пяюць беларускія песьні, і ўсё пад назвай "Германавіцкія вячоркі". Усё ладзяць, як на сапраўдных старадаўніх вячорках. Ёсьць у іх гаспадар і гаспадыня, да якіх на вячоркі прыходзіць моладзь. Цяпер шукаюць старых песьняў, сапраўды народных. Думаю, дзе б ім дастаць старыя сьпеўнікі? Напрыклад — А. Грыневіча...

А другая школа — Мясоцкая на Маладзечаншчыне — паведаміла, што правяла юбілейны вечар Ламаносава[6] і *Дни культуры речи*. А ліст канчаецца: "Ах, якая цудоўная наша Вялікая Радзіма!". Да чаго гэта давядзе?

Ужо крыху цяплей, але сьнег і ня думае зьнікнуць. Вельмі яго шмат. Пазаўчора і ўчора напісала 11 лістоў, а сяньня адзін ледзь вымучыла. Мусі, зараз лягу, хоць яшчэ белы дзень. Дрэнна сплю, вельмі баляць ногі, асабліва ўночы. Прыйдзе вясна — буду лячыць крапівой. Вось у Вас горш — хатнія сродкі, хіба, не памогуць. А чым лечыцеся цяпер? Да ліпня яшчэ далёка.

Пішыце, як прайшла сустрэча з былымі студэнтамі? 15 гадоў — гэта вялікі кусок часу.

Усяго добрага! Сардэчнае прывітаньне для п. Марыі. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

264. МІХАСЮ ВЕРАЦІЛУ

15 красавіка 1986 г. Вільня

Паважаны Міхал Уладзіміравіч.

Дзякую за ліст. Вельмі зацікавіў мяне Ваш леташні здабытак — 9 кніжачак. Зусім магчыма, што гэта з нейкай прыватнай бібліятэкі. Але прысланыя ўзоры подпісаў нічога нам не гавораць. Ня толькі мне, але і майму зяцю Лявону Луцкевічу, і этнографу Арсеню Лісу, які пазаўчора быў у мяне.

А.С. Ліс вельмі шмат працуе ў віленскіх архівах і бібліятэках, часам прыязджае на тыдзень, а то і больш. Я думала, што, можа, ён калі на такія кніжачкі і надпісы патрапіў, але ж не — не даводзілася. Пералічыце, калі ласка, якія беларускія творы ў гэтыя кніжачкі ўвайшлі. "Велікодную пісанку"[1] і я ведала.

Што да Вашага "гультайства"... І найбольшая працавітасьць не памагла б здабыць тое, чаго ўжо даўна німа ў продажы, а можа быць толькі захаванае ў архівах і старых вялікіх бібліятэках.

Віленскія архівы вельмі багатыя... Тут і беларускіх выданьняў шмат. І ня толькі друкі, але часта і рукапісы, лісты і г.д. Нашы пісьменьнікі (з Менску), этнографы, краязнаўцы знаходзяць шмат цікавых карысных матэр'ялаў.

Букіністычныя магазіны ў Вільні ёсьць, але беларускага там нічога німа. Што я асабіста са старой літаратуры і публіцыстыкі маю, то і сама добра ня ведаю. Шмат што павыносілі на гарышча, а туды дабрацца — гэта ўжо не мая сіла...

Багатае Вашае жыцьцё пры такой колькасьці прафэсій-захапленьняў... А цікава было б ведаць, дзе Вы працуеце і якая Ваша галоўная прафэсія? Можа, напішаце? Мяне цікавяць усе, хто жыве ў Гродзеншчыне, бо і мае прадзеды, дзяды, бацькі — з Гродзеншчыны. Бацька — з самога Гродна, а продкі маёй маці — з Сакольшчыны, якая цяпер пад Польшчай... Я сама палову жыцьця правяла ў Сакольшчыне і ў Гродне і вельмі тужу па той зямлі.

А з Менска — цікавая вестка. 23 красавіка пачынаецца Зьезд бел[арускіх] пісьменьнікаў, які будзе радзіцца над праблемай: да 100 [-годзьдзя] нараджэньня Максіма Багдановіча перанесьці яго прах з Ялты ў Менск. Гэта ўжо даўна трэба было зрабіць. Добра, што хоць цяпер надумаліся. На гэтым і скончу.

Усяго Вам добрага! Зычу новых здабыткаў — шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

265. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

17 красавіка 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сяньня даведалася ад У.І. Содаля (з менскага тэлебачаньня), што выйшла з друку кніжка "Краю мой — Нёман", і ў Менску ў продажы ўжо німа! А я так яе чакала... Ці ў Гродне яна ўжо разышлася таксама?

Даўна ня маю ад Вас і наагул з Гродна ніякіх вестак. Пара ўжо сеяць кветкі на бальконе. Пасылаю, што маю,— нагаткі і дэкаратыўны мак. Больш нічога летась ня высьпела. Адно і другое сеяць проста ў скрынкі з грунтам. Нагаткі — невысокая расьліна, кусьцістая, мак — высокі, будзе патрабаваць калкоў для прывязываньня.

На мой апошні да Вас ліст у справе фальклёрных запісаў на магнітафонную стужку ў дачкі агранома Янкі Пачопкі адказу не атрымала. Мо той мой ліст або Ваш адказ не дайшлі да мэты? І гэта магчыма. Усё ж добра было б нешта кан-

крэтнае ведаць. Калі гэты мой ліст (з насеньнем) дойдзе — калі ласка, адкажыце.

Усяго найлепшага Вам і сям'і. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

266. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

19 красавіка 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сяньня дзень страшных лістоў. Атрымала іх аж 8... З іх — вельмі сумны — Ваш. Сумны ў сувязі з Вашай хваробай вачэй. Гэта добра, што будуць прабаваць затрымаць разьвіцьцё хваробы. Бо на апэрацыю, відаць, зарана. Катаракта мусіць высьпець, а тады яе можна зьняць. Я такі выпадак бачыла. Пасьля апэрацыі чалавек хоць і насіў акуляры, але бачыў, і хвароба не варочалася. Зычу Вам з цэлага сэрца, каб падлячылі.

Ня хочацца Вас нэрваваць, але Вы пачалі аб Круталевічу[1] і яго брахні. Думаю, што пачатак ідзе ад злой памяці Сташкевіча[2], бо гэта яго нататкі я ўжо некалісь чытала.

Я ніколі нічога супольнага ня мела з Бадуновай. Яна была эсэркай, шмат старэйшай і г.д. Што эсэры пераўтварыліся ў сацыялістаў-рэвалюцыянераў — першы раз чую. З імі я нічога супольнага ня мела. З пералічаных сяброў (як яны пішуць — арганізацыі) Душэўскі быў тады студэнтам у Пецярбургу, Чарапук ніколі ў жыцьці ў Менску ня быў... Мамонька[3]? Шыла? Яны і да Беларускай сацыялістычнай грамады (яе мы проста называлі — Грамада) не належалі. Грамада ў Менску была маленькай жменькай людзей.

Смоліч рэдагаваў газэту "Грамада" — выходзіла коратка. Грамада мела шмат сяброў у аддзелах Масквы, Пецярбурга. А наймацнейшая была ў Бабруйску, створаная Ф. Ш[анты]рам. Можа, гэта цяпер стрымлівае выхад кніжкі і г.д. Сяньня ўсё магчыма...

Грамаду калісьці называлі "буржуазнай арганізацыяй". І як тут што зразумець? Гэта ўжо не на мае сілы, не на маю галаву...

Сяньня ж — ліст ад Дануты [Бічэль]. Што за ліст... Я доўга не магла зразумець, чаго яна хоча. Піша аб нейкіх альбомах, якіх я не хацела даць, а "абяцала альбом (?) Госьцеву[4]". Калі так, то яна ўсё кіне, ад усялякай работы адыйдзе, няхай усё прападае і г.д. Удома падзяліцца ня маю з кім. Усё перажываю адна, перажываю цяжка...

А ўсё праз тое, што я перапісываюся з Госьцевым... Каб Вы прачыталі гэты яе ліст... Паверыць цяжка, што так кідацца на каго магчыма. Старалася, наколькі змагла, растлумачыць ёй. Ці зразумее?

А. Госьцеў, як дасьледчык старога Гродна, мне шмат у чым памог. Я ж там жыла, ведала Гродна ў пачатку стагодзьдзя. Хто з цяперашніх дзеячаў, самых лепшых і адданых патрыётаў, столькі ведае аб тым часе як краязнаўца? Помніце, як я хацела ведаць, што з домам на Гараднічанскай? Мне нават не змаглі гэтай вуліцы адшукаць...

А Госьцеў прывёз старыя пляны, зрабіў адпаведныя здымкі, па якіх выявілі, што дома ўжо німа, але мейсца на пляне адзначылі. Калі гаворым, то аб старой Гродзенскай гімназіі і яе выкладчыках. Гімназіі, дзе [redacted] вучылася. Ён выясьніў, што цяпер у будынку, дзе была Пушкінская школа, а што там, дзе была Рэальная гімназія... Каму гэта шкодзіць і ў чым?

Для мяне гэта — успамін маладосьці, дзяцінства... Я ўсё хачу, каб у Грод-

не былі ўспаміны — машынапісныя, добра аформленыя, са здымкамі аб Гродзенскім гуртку. Тэкст усё абяцае перадрукаваць Новік-Пяюн — ці зробіць гэта? Яму баляць вочы... А скуль узяць здымкі — тут на мейсцы німа каму зрабіць. І я была рада, калі Госьцеў запытаўся, ці можа прыехаць з фотаапаратам? Я, вядома, была рада.

Зрабіў фатограф усё, што мне было трэба, а калі зрабіў яшчэ пару якіх копіяў для сябе — каму гэта перашкаджае? Вось за гэта Данута мне зрабіла неімаверны скандал... Усё гэта на мне моцна адбіваецца. Толькі чакаецца хвіліна, каб адыйсьці навечна...

Матэр'ялы пра Смоліча ўжо ў добрых (я так лічу) руках. Будуць апрацаваныя. Ці пойдзе куды ў друк, ці будзе, як з кнігай Шантыра? Аб Грынкевічу, калі змагу, усё зьбяру, прыгатую і перашлю, хіба, праз каго, хто будзе ехаць. Калі змагу, то і Gaudeamus[5] перапішу і прышлю. Пакуль што чуюся — як зьбітая, скалечаная...

Усяго добрага! Няхай жа Вам дактары памогуць! Шчыра — *Л. Войцікава.*

267. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

25 красавіка 1986 г.

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сяньня я атрымала некалькі слоў ад Алеся Белакоза — вельмі трывожных і зусім незразумелых. Занепакоілася. Хацела напісаць да Марыны, але калі там з бацькам дрэнна, ня будзе яна мець галавы, каб мне пісаць.

Можа, Вы ведаеце, што там у шпіталі робіцца, у чым справа, і будзеце ласкавы напісаць мне? Страты адна за другой, неспакой за добрых людзей зусім зьбілі мяне з ног, і самой пагоршала. Каб хоць адкуль лепшая, сьвятлейшая вестка.

Усяго добрага. *Л. Войцікава.*

268. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

28 красавіка 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сардэчна, шчыра дзякую за *наш* зборнік[1]. Прачытала ад першай да апошняй старонкі адным духам. Ня верыла сваім вачам, што пісьменьнік такой меры, як В. Быкаў[2], назваў маё "Старое Гродна" "цудоўнымі ўспамінамі"... Яны ж так просьценька напісаныя. Рада, што пайшло "Ст[арое] Гродна" без скарачэньняў, без паправак.

А якую прыемнасьць адчула, чытаючы Вашае "З кагорты пачынальнікаў"! Быццам нанава перажывала спатканьні з "бацькам" — нанава чытала яго лісты, прыпамінала свае яму адказы. Я ж таксама называла яго "бацькам" і падпісывалася — "дачка". Адносіны ў нас былі самыя лепшыя. Калі я складала апошнія экзаміны, ён яшчэ быў у 7-й клясе. Мне вельмі трэба было, каб хто памог паўтарыць білеты з геамэтрыі. Я папрасіла Юзіка Лявіцкага. Ён ахвотна згадзіўся, кажучы: "Дык жа гэта зусім натуральна, хто ж паможа, як ня бацька?". Пасьля, ужо з Пецярбурга, неяк доўга не пісаў. І я напісала яму ліст-верш:

То ня вецер енчыць-вые,
то ня дожджык росіць,
то дачка па сваім бацьку
тужыць ды галосіць...

У далёкую старонку,
чужыну ліхую
уцёк бацька ды пакінуў
дачку маладую.

Сам па Неўскім па праспэкце
каменьне зьбівае
і паненкам пецярбургскім
у вочкі заглядае...

Гэта ж бацька, хоць старэнькі,
згорблены ды сівы,
як дурман той, дурыць дзеўкі
і тады — шчасьлівы.

Піша бацька пекным стылем
оды ды паэмы,
а дачцэ як напісаці –
то робіцца немы.

Эй жа, бацька, як няхутка
пісаньне дастану –
пабачыце, пісаць вам
зусім перастану...

Паверыце? — паперка-чарнавік гэтага верша і цяпер у мяне. А "бацька" сапраўды вельмі любіў фліртаваць. Яшчэ ў гімназіі, лічылася, меў нарэчаную — Зосю Клімоўну, таксама сяброўку гуртка. Гэта яе бацькі выбралі сабе Юзіка на зяця. Сьмешная была гісторыя. Аб гэтай сям'і Клімаў шмат можна сказаць, але шкада часу і паперы.

Добра, што не прайшоў артыкул Карпюка[3] ў цэласьці, але і гэты фрагмэнт нейкі малазразумелы і ўносіць дысананс. Яшчэ аднаго чалавека не паважаю, далікатна кажучы,— Іверса[4]. Ён калісьці напісаў успаміны аб Віленскай Беларускай гімназіі. "Гэтак было" назваў, а фактычна было зусім ня гэтак. Мы, хто ведаў гімназію, яе гісторыю, абурыліся і хацелі пісаць спраставаньне, але ў "ЛіМе" прачыталі вельмі "цёплую" рэцэнзію на гэты твор Іверса і далі спакой. Усіх не пераканаеш.

А цяпер Іверс сядзіць жа ў Слоніме, а што робіцца ў г.зв. Музэі літаратурнай Слонімшчыны? Шмат хто паверыў у гэты музэй, я паслала вельмі шмат матэр'ялаў аб Леўчыку, яго недрукаваны верш "Беларускі жаўранак" і інш. А цяпер той Сідаровіч[5], што пачаў ладзіць музэй (прычым нарабіў шмат шкоды — зьнішчыў здымкі і г.д.), нават ад мовы беларускай, мусі, адрокся, бо ўжо тры разы пісаў мне па-расейску. Вядома, я не адказываю і знаць яго не хачу.

Ведаю, што там п'юць на ўсю моц. Можа, і экспанаты прапіваюць...

Сідаровіч здабыў ад пляменьніка К. Лейкі[6] ўсю яго спадчыну — біяграфію паэта, здымкі, вершы з канца мінулага веку. Прасілі яго, каб гэты матэр'ял па-зычыць у Менск, каб адзначыць дастойна юбілей паэта. Ня даў. Праўда, цяпер крыху сам напісаў, але ж гэта ня тое, бо юбілей даўно мінуў.

Як там адбыўся зьезд? Крыху ведаю, але не да канца, і ня вельмі добра аб некаторых выступленьнях адзываюцца. А справы перавозу праху М. Багдановіча з Ялты ў Менск нават не падымалі? Дарэмна мяне намовілі напісаць ліст на гэты зьезд — якраз з намерам перавозу. Здаецца, майго ліста нават не чыталі. Так, як не надрукавалі ў "ЛіМе" адкрытага ліста ў гэтай жа справе. Не сама гэта прыдумала, а па ініцыятыве Генадзя Аляксандравіча Кахаяоўскага, які і сам той мой ліст у "ЛіМ" аддаў.

Ужо ад другой пары турыстаў ведаю, што ў Ялце дапытацца і адшукаць магілу М. Багдановіча не змаглі. Адна пара беларускіх энтузыястаў-дзеячоў з Ваўкавыскага павету паляцела самалётам, павязла вялікі вянок з валошак. Давязьлі сьвежы. Хадзілі цэлы дзень па розных могілках, а магілы Максіма так і не знайшлі. Павяўшы вянок павесілі, як пішуць, на нэўтральны куст...

У Вільні зьявіліся зусім новыя беларусы. Сымпатычныя, з добрай мовай, чыстай, прыгожай. Інжынер-плянавік з жонкай і пара маладых мастакоў. Учора былі ў нас ужо 3-ці раз. Мы вельмі рады. Адно што амаль зусім ня ведаюць беларускай літаратуры. Але хочуць ведаць, знаёмяцца. Я мела крыху кніжак з падвойнымі, а то і патройнымі экзэмплярамі. Лішнія аддала гэтаму інжынеру — на пачатак беларускай бібліятэкі...

Як там у Гродне са зборнікам "Краю мой — Нёман"? Ці ёсьць у прадажы ў кнігарнях, ці можна купіць? Трэба было б абавязкова паслаць у Гудзевічы, а і яшчэ пару экзэмпляраў спатрэбяцца. У Менску, падобна, у прадажы ўжо німа.

Ці ведаеце, што Алесь Мікалаевіч Б[елакоз] з у шпіталі? Якое недамаганьне галоўнае — ня ведаю, але як ён можа паправіцца, калі ўсе думкі, увесь неспакой — Гудзевічы, музэй, што супрацоўнікі змогуць зрабіць і г.д.

Пішаце, што ўсе мае лісты атрымалі. Гэта добра. А насеньне кветак, якое я Вам выслала? У лісьце, у цвёрдай вокладцы, так я шмат каму высылала. Вельмі хочацца Вас абоіх з п. Марыяй пабачыць. Незвычайна цікавіць мяне і адкрыцьцё Дому-музэю і вечар Максіма Багдановіча. Я так шкадую, што ўжо німа магчымасьці і сілы, каб прыняць у гэтым удзел. Але што рабіць? Усё мае свае межы, свой канец... Людзкія магчымасьці — таксама. Крыху рухаюся, крыху пішу, але і шмат ляжу.

Усяго Вам добрага! Здароўя, плёну ва ўсялякай працы. Заўсёды зычлівая *Л. Войцікава*.

269. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

30 красавіка 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Усе матэр'ялы — жыцьцяпіс, бібліяграфію, успаміны аб др. Ст. Гр[ынкевічу] — запакавала і пасылаю. Можа, што з гэтага мне вернеце? Бо я карэспандую з яго пляменьнікам — сынам яго сястры.

Як Вашы вочы? Які рэзультат лячэньня ў шпіталі? Ці зможаце бяз шкоды для зроку працаваць?

У мяне — таксама неспадзявана — бяда з вачамі. Баляць, і вельмі дрэнна бачу. Чытаць дробнага друку не магу. А пры маіх абставінах і агульным стане здароўя не магу мець ані лекара, ані хоць бы акуляраў.

Даволі дзіўна — нядаўна быў у мяне Ваш гродзенскі доктар Ігар Котаў. Як заўсёды, я, глухая, мусіла мець усё напісанае. Ігар пісаў, і я зусім добра чытала. Што сталася — ня ведаю. Перамываю зёлкавай мешанкай, кладу кампрэсы. А можа, будзе лепш... Даўней у выпадку, напрыклад, запаленьня памагала. А цяпер? Магчыма, ад агульнага аслабленьня арганізму? Але хопіць — скаргі не памогуць.

Яшчэ мушу спраставаць адну сваю памылку. Яна тычыцца К. Душэўскага[1]. Ён на зьездзе ў Менску ў красавіку 1917 г. быў — як дэлегат ад пецярбургскіх студэнтаў. Але вельмі коратка, і нідзе не выступаў.

Усяго Вам найлепшага! Папраўы зроку, агульнага самапачуцьця. Прывітаньне п. Марыі. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

270. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[Красавік 1986 г.]

Дарагая пані Дануся.

Дзякую вам за ліст ад 14 красавіка. Ізноў набралася лістоў вельмі шмат, а пісаць цяжкавата. Цяжкавата, але хочацца з усімі сувязь утрымаць.

Даўна ня мела весткі з Гудзевічаў, і толькі цяпер ад Вас даведалася аб такой цэннай знаходцы старой бібліятэкі.

А ведаеце, да чаго дадумаліся ў Менску? Выдаюць Ф. Багушэвіча ў перакладзе на рускую мову... Можа, гэта было б нядрэнна, але які пераклад? Які тэкст — ня ведаю, але загалоўкі? Амаль усё перакруцілі па-свойму, напрыклад, ня "Дудка беларуская", а *"Моя дудка"*. Прадмовы — німа. Заместа яе — аўтэнтычнай прадмовы — напісаная Алегам Лойкам (зноў выступіў). "Скрыпку беларускую" назвалі *"Скрипочкой беларусской"*. А што чакаць у тэксьце?

Вельмі мяне зацікавіў той будынак, што Вам даюць пад клюб. Ці гэта за Фарай па вуліцы даўнейшай Брыгіцкай або Купечаскай (цяпер К. Маркса)? Але прыедзеце — пагаворым, у лістах і заблытацца лёгка. А для мяне гэтае мейсца, гэты куток — памяць ня толькі майго дзяцінства, але і дзяцінства майго бацькі.

Што ў клюбе "Паходня" — ведаю з лістоў М. Таранды. У справе беларускіх групаў у дзіцячых садках у Менску ведаю з лістоў Віялеты Яфіменка[1] і ад тых, хто складае праграму літаратуры для гэтых групаў. Пагаварыць на гэтую тэму прыяжджаў да мяне з Гомеля Алег Чыжоў[2]. Анатоля Сыса[3] ведаю — прыяжджаў. Аб падзеях у Менску падчас сьвята беларускай песьні я ведала адразу, вельмі падрабязна — усе дэталі.

Вельмі Вас чакаю. Ніяк не прыходзіць цёплая вясна. Нядоўга, два дні падаў сьнег. Пакрысе стараюся хадзіць па панадворку. Але — цяжкавата. Ногі вельмі баляць і ледзь трымаюць. Ой, як усё ўжо надакучыла. І боль, і глухата. Ёсьць жа тыпы, для якіх глухі і дурны — сынонімы... І гэта адчуваецца ў штодзённым жыцьці.

Усяго Вам найлепшага! *Л. Войцікава.*

271. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

1 мая 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Нядаўна выслала Вам ліст і сяньня хачу запытацца: ці ня думаеце, што добра было б, каб на Багдановічаўскіх урачыстасьцях у Гродне быў нехта з Вільні — крыніцы беларускага адраджэньня? І Максім Б[агдановіч] быў у Вільні, і ёсьць вершы, якія ён прысьвяціў гэтаму гораду.

Завяліся цяпер тут новыя беларусы — сымпатычныя, сьвядомыя людзі. Гэта Стэх Валянцін Уладзіслававіч (інжынер-плянавік) і яго жонка Тамара. І двое мастакоў — Алег[1] і Хрысьціна[2] Аблажэі. Са старых, што яшчэ добра рухаюцца,— Лявон Луцкевіч.

Я нікому з іх нічога не кажу. І не кажу, што пішу да Вас. Гэта будзе Ваша воля і Вашая ініцыятыва, калі каго з іх запросіце. А мяне ў гэтай справе і ўспамінаць ня трэба. Так для мяне будзе лепш.

272. МІХАСЮ ВЕРАЦІЛУ

12 мая 1986 г. Вільня

Дарагі Міхась Уладзіміравіч.

Даруйце ласкава, што так доўга Вам не адказывала. Вельмі дзякую за лісты, за ўсе весткі аб сабе, сваёй сям'і, Вашай працы. За добрыя, цікавыя вершы. Усё чытала з прыемнасьцю і — часта аб Вас думала... А напісаць — проста не пасьпявала, бо вечныя болі, недамаганьні вельмі аграніčываюць працаздольнасьць. А столькі лістоў (усё сьпешных), наведвальнікаў, падзеяў — і добрых, і благіх, сумных...

Пачну ад благіх: 1 мая памёр наш пісьменьнік, прафэсар, доктар філялягічных навук Сьцяпан Хусэйнавіч Александровіч. Можна сказаць, што нечакана, бо хоць даўна хварэў (хвароба лёгкіх), але заўсёды лічыў на лета на паправу агульнага стану здароўя... Столькі меў задумаў, столькі праектаў далейшай працы! Яму было толькі 65 гадоў... Я заўсёды цяжка перажываю страту знаёмых, шмат маладзейшых за мяне. Сабрала яго лісты. Яшчэ раз прачытала. Пераглядзела кніжкі яго з аўтографамі. Але трэба было яшчэ гэта перажыць-перабалець.

А былі і яшчэ вельмі непрыемныя, цяжкія да зразуменьня падзеі. Хіба, ведаеце з прэсы, што ў Менску 23–24 красавіка праходзіў IX-ты Зьезд пісьменьнікаў Беларусі. Падобна, выступалі па-рознаму, але наагул добра. Але перад Зьездам 20 красавіка здарылася нешта проста агіднае, непраўдападобнае. Весткі не на лістоўную гутарку...

Цяпер пра крыху лепшае — выйшла ў сьвет кніжка "Краю мой — Нёман" — пра літаратурную Гродзеншчыну. Складзеная добра, з цікавых матэр'ялаў. Тыраж невялікі — 5000. У Менску яе, падобна, ужо німа ў прадажы. Але толькі што атрымала я ліст з Гродна — пішуць, што ў іх магазінах кніжка гэта ёсьць. Зараз напішу і папрашу, каб Вам яе выслалі.

Якія ж яшчэ навіны? Магчыма, ведаеце, але на ўсялякі выпадак пішу. 16 траўня (мая) у Гродне ўрачыста адчыняюць Дом-музэй Максіма Багдановіча. Вечарам у салі Унівэрсытэту — ня менш урачысты вечар паэта. А 18 мая — сьвята паэзіі Максіма Багдановіча ў Ракуцёўшчыне Маладзечанскага р-ну. Гэта ўжо традыцыйна — год у год...

Я сама на гербах ня знаюся. Паказала прысланы герб свайму зяцю — Лявону Антонавічу Луцкевічу. Паміж іншым, ён сын Антона Луцкевіча і пляменьнік Івана Луцкевіча — пачынальнікаў "Нашай нівы". Вось зяць кажа, што, магчыма, гэты герб ужываўся як дзяржаўны — Рэчы Паспалітай — пасьля ўзьяднаньня Літвы з Польшчай. Магчыма, пасьля Люблінскай вуніі. Такі герб — Арол — Пагоня — ёсьць у Вільні на касьцёле дамініканаў.

У сувязі з гэтымі ўсімі тэмамі-пытаньнямі маем такую прапанову: у Вас летам, напэўна, будзе нейкі адпачынак. Падчас яго запрашаем Вас у Вільню. Пазнаёміцеся з горадам (калі яшчэ тут не былі), з памятнымі мейсцамі-будынкамі, зьвязанымі з дзейнасьцю беларусаў. У зяця ёсьць запісы — альбомы і г.д. У мяне яшчэ старэйшыя і шмат лістоў — каля 6000. Ёсьць і ўнікальныя здымкі.

Вы, напэўна, і фатаграфуеце? Вось і бярыце фотаапарат — зробіце сабе фотакопіі. А мо і жонка Вашая зможа прыехаць разам? Адно толькі — наш дамок стаіць сярод лесу. Знайсьці самастойна — немагчыма. Дзеля таго трэба ведаць дакладна, калі прыходзіць Ваш цягнік або аўтобус. У гэты час зяць чакаў бы Вас у горадзе на кватэры майго ўнука. Тэлефон: *44–90–01.*

Чакаем адказу. Усяго найлепшага Вам і ўсёй Вашай сям'і. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава з сям'ёй.* Дзякую за Велікоднае віншаваньне, але яно вельмі-вельмі спозьненае, бо ў нас Вялікдзень быў 30 сакавіка. Мы — каталікі з дзеда-прадзеда.

273. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

14 мая 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сяньня атрымала Ваш ліст — дзякую. Як відаць, пэрспэктывы Дому-музэю ня вельмі надзейныя. А пасьля менскіх падзеяў 20 красавіка, магчыма, і трывожныя.

Як шкада, што Беларускае тэлебачаньне — ні гродзенскае, ні менскае — не даходзіць у Вільню! Для нашых новых беларусаў гэта было б сапраўднае сьвята — кожная тэлеперадача. Можа, Ваша гродзенскае нават больш, чым менскае, бо там "Роднае слова" амаль зусім замоўкла. А ведаю, што некаторыя, напрыклад, з Глыбокага, пісалі, прасілі, каб "Роднае слова" гучала ня раз на пару месяцаў, а кожны тыдзень. Вельмі мне падабаўся помысл выступленьняў-гутарак з публікай у кніжных магазынах. Гэтага яшчэ, здаецца, ніколі не было.

Мяне вельмі ўцешыла вестка, што зьявілася ў продажы "Літаратура Гродзеншчыны"[1]. Калі гэта магчыма, я прасіла б пару экзэмпляраў сюды, на мой адрас. Зяць хоча выслаць сваякам за мяжу. А было б цудоўна, каб (калі Вам хто паможа) выслаць на 2 адрасы, каторыя падаю. Прысылаць сюды, а адсюль адрасатам — хіба ня варта? Зразумела, усе кошты Вам неадкладна вярну і буду вельмі ўдзячная.

А і новым беларусам у іх бібліятэку было б добра. Я аднаму з новых — інжынеру — аддаю ўсе кніжкі, якіх маю па 2 экзэмпляры, каб гэта было ў пачатак яго беларускай бібліятэкі. Жыве ён у горадзе, кантактуецца з усімі маладымі, новымі — вось усе і будуць карыстацца.

Назьбіралася ў мяне карэспандэнтаў па цэлым сьвеце. Нават у Петразаводзку. Жыве там чалавек ад даўняга часу — мастак-афарміцель і крыху паэт. Цяпер яму пісаць па-беларуску цяжка. Як піша — трэба было б думаць над

кожным словам. Але ўсім беларускім цікавіцца, а вершы, якія вучыў у школе, і цяпер помніць. І сам пісаў добрыя вершы па-беларуску, як яму было 15–16 гадоў. Як бы ў мяне ні было часу, а пішу яму — шкадую гэтага закінутага жыцьцём на чужыну чалавека. І час ад часу кніжкі пасылаю.

Мой ліст, пасланы на зьезд, падобна, у Н. Гілевіча[2]. Будзе ляжаць, як і той, пасланы ў "ЛіМ" — на тую самую тэму. Гэтага можна было спадзявацца.

Зварот да грамадзянства Н.Б. Ватацы — зьмешчаны. Гэта добра, але цікава, чаму яна піша аб побыце Максіма [Багдановіча] ў Ракуцёўшчыне, але ні словам не ўспамінае аб яго пяці месяцах жыцьця ў Менску ў 1916 г.? Асьцярожнасьць?

Пішаце аб маім вершы да "бацькі"? А я не прыдавала яму ніякага значэньня. Напісаны на паперцы, і цяпер гэтая паперка ляжыць у мяне.

Зараз ужо 8 гадзін вечара. Ужо не магу даўжэй сядзець, мушу легчы. Вось як час трачу. Пагода нядрэнная, толькі суха. Усё зелянее, цьвітуць багата яблыні, сьліўкі. Было б што на гародзе рабіць. Але — не магу ўжо нічога...

Усяго добрага п. Марыі, Вам. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

Калі магчыма — на такія адрасы: *Бабіч Алесь Уладзіміравіч*[3], *БССР, 211800, Віцебская вобл., г. Глыбокае, вул. Савецкая, 26; Верацiла Міхась Уладзіміравіч, 231911, Гродзенская вобл., Ваўкавыскі р-н, г.п. Краснасельскі, вул. Школьная, 38–23.*

274. МІХАСЮ ВЕРАЦІЛУ

18 мая 1986 г. Вільня

Паважаны Міхаіл Уладзіміравіч.

У сувязі з хваробамі і іншымі неспрыяльнымі падзеямі змушаныануляваць свае запросіны Вас у Вільню. Як будзе далей? — па пэўным часе напішу. Сяньня і гэтых пару слоў пісаць цяжка. Выбачайце...

Шчыра — *Л. Войцікава.*

275. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

25 мая 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сардэчна дзякую за прысланыя кніжкі. Як за тыя мне ў Вільню, так і за высланыя па маёй просьбе іншым.

Сяньня атрымала вестку з Глыбокага, куды "Літаратурная Гродзеншчына" ўжо дайшла. Я Вам адразу не падзякавала, не напісала, бо чакала абяцанага расказу аб урачыстасьцях у Гродне. Апрача Вас з Гродна ніхто мне ня піша.

З Менскам сувязь маю. Але адтуль такія жахлівыя весткі, што і сон, і спакой адбіраюць...

А ці былі Вы на сьвяце ў Ракуцёўшчыне? Якое Вашае ўражаньне са зьезду пісьменьнікаў? А што *цяпер* у Доме-музэі? Ці бываюць наведвальнікі?

Яшчэ вярнуся да кніжкі "Краю мой — Нёман". Ведаеце? Дзіўная і незразумелая рэч. Была ў мяне пару дзён таму студэнтка з Пэдінстытуту (ад праф[эсара] Янкоўскага), з Менска. Яна, як, мусі, і іншыя, ня ведала і ня чула, а ня толькі ня бачыла ды не чытала "Краю мой — Нёман". Няўжо ў Менску гэтую кніжку хаваюць ад моладзі? Рэцэнзіі на яе, здаецца, нідзе не было.

Сяньня ў нас, ці ня першы раз у маі, дождж і аграмадны вецер. Круціць

маладыя галіны дрэваў, круціць кветкі. А кветак шмат. І вельмі шмат белага, поўнага бэзу. Хутка зацьвітуць белыя акацыі. У нас іх безьліч — з тых 9-ці, якія я пасадзіла, як мы тут пабудаваліся ў 1938 годзе.

Учора я атрымала ліст ад Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага. Прыпамінае, што ў чэрвені міне *100 гадоў* з дня нараджэньня Язэпа Шнаркевіча — пэдагога, ініцыятара Нясьвіжскай і Клецкай бел[арускіх] гімназіяў. Можа, і Вы хочаце мець матэр'ял аб гэтым чалавеку? Маю яго аўтабіяграфію, здымак. Ды, зрэшты, гэта мой добры знаёмы. Хіба, варта Вам аб ім у Гродзенскім тэлебачаньні ўспомніць.

Толькі бяда, што німа каму зрабіць копіі здымка, а ў мяне ён адзін. Цяпер, як у горадзе на Архітэкту жыве ўнук з сям'ёй, а дачка і Лявон Антонавіч — тут са мной, зяць Лявон копіяў ня робіць — ня мае лябараторыі. Пастараюся нешта зрабіць.

Пішыце, ці Вам такі матэр'ял аб Я. Шнаркевічу патрэбны? Знайшла ў сябе здымачак-арыгінал Я. Шнаркевіча. Рызыкую і пасылаю Вам — можа, зможаце даць добраму фатографу зрабіць некалькі копіяў. Выбачайце за клопат, але баюся, што як буду шукаць магчымасьці зрабіць гэта тут на мейсцы — аніяк не пасьпею. Лявон дрэнна чуецца, і не хачу яму дакучаць.

100-годзьдзе — 10 чэрвеня. Няхай хоць у Вас будзе ў пару. Але як паслаць Вам аўтабіяграфію? Яна ў мяне зьмешчаная ў спэцыяльным сшытку-альбоме. Трэба нешта думаць.

Усяго добрага! Вам, сям'і, знаёмым. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

276. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

11 чэрвеня 1986 г. Вільня

Мілая пані Дануся.

Дзякую за ліст і за весткі. Крыху я ўжо ведала з "ЛіМу" і з ліста Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча]. Аб клубе (па-мояму — клюбе) Аляксей Міхайлавіч піша больш падрабязна. Але ён называе яго клюбам моладзі. А можа, гэта дзьве розныя арганізацыі? Але галоўнае: вядома, прыяжджайце, як Вы пішаце, 21 чэрвеня. Лявон згодны правесьці экскурсію па Вільні. А я рада буду пабачыцца з гродзенцамі. Абы я ў той дзень была ў магчымай форме, бо бывае па-рознаму. Вельмі часта моцна баліць галава.

Чытаю Ваш ліст, і нейкае дзіўнае ў мяне ўражаньне. Цяжка зразумець розныя падзеі. 1) *Дазвол* на запрашэньне таго ці іншага чалавека на такую імпрэзу, як адкрыцьцё Дому Багдановіча. 2) Аплата *камандзіроўкі*. Нешта дзікае, незразумелае. Калі гэта ў мой час людзі бралі грошы падчас грамадзкіх прадпрыемстваў? Калі пыталіся (і каго?) аб дазволы? А жылі і працавалі ў самыя неспрыяльныя часы. Ну што ж? На гэта рады німа.

Пытаецеся, калі пачалі пахаваньні на гродзенскіх могілках? А на якіх? Там жа былі старыя могілкі — недзе амаль за горадам, а і ў горадзе не адныя, бо і праваслаўныя, і каталіцкія. Але я наагул нічога аб гэтым ня ведаю. Была то дзіцём, то падросткам — такія пытаньні не цікавілі.

Як была апошні раз у Гродне, недзе ў 1970 годзе, 3 дні ў гасьцях у Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча], хадзіла на нашыя каталіцкія могілкі і не змагла адшукаць магілаў маіх дзядоў па бацьку. Помніка не было. Крыжы, відаць, спарахнелі, упалі — і сьлед прапаў.

Аб стане здароўя Алеся Мікалаевіча [Белакоза] ведаю. Вельмі непакоюся... Калі згодзіцца на курс абпраменьваньня, хвароба можа затрымацца, але коштам страшных мукаў, боляў і г.д.

Значыцца — да сустрэчы! Усяго найлепшага! Прывітаньне ад маіх. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

277. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[15 чэрвеня 1986 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, за весткі. Аб падзеях у Гродне ведаю і з прэсы, і з ліста Дануты. А 21-га чакаем гродзенскай экскурсіі. Лявон яе правядзе па Вільні.

Аб хваробе Алеся Мікалаевіча [Белакоза] ведаю і аб тым, што яго хочуць лячыць абпраменьваньнем. Гэтае лячэньне ўстрымлівае галоўную хваробу, але выклікае страшныя болі ў арганізме і заняпад раўнавагі. Быў у мяне ў сям'і такі выпадак, такое лячэньне і пасьля — гады мукаў... Не дзіўлюся, што А.М. баіцца.

Цікава, ці ў Гродне такая гарачыня, як у нас? Учора было +30. На мяне гэта вельмі дрэнна дзеіць. Зычу добрых плёнаў на дзялцы. А дзе яна, з якога боку Гродна? Ці далёка ад гораду?

Усяго добрага ўсёй Вашай сям'і і знаёмым. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

P.S. Ня здолела ■ зарганізаваць ушанаваньня памяці Шнаркевіча. Ня маю каля сябе нікога маладога. Да старых гэта не даходзіць.

278. МІКОЛУ ТАРАНДУ

7 ліпеня 1986 г. Вільня

Паважаны пане Мікола.

Па старому нашаніўскаму звычаю і пазьнейшаму — менскаму 1916–18 гадоў — зьвяртаюся без абсалютна чужога для нас — *па-бацьку*. Як Вы гэта прыймеце? Ня ведаю... Атрымаўшы Ваш ліст перад прыездам усёй Вашай грамадкі, увесь час хацелася мне напісаць да Вас, як да сакратара "Паходні"...

Пазнаёміцца асабіста з Вамі падчас прыезду ўсіх Вас не ўдалося... Мне пры маім калецтве — глухаце — падтрымаць гутарку з цэлай грамадой людзей — немагчыма... Іншая справа з адной асобай такая аднабокая гутарка: адзін піша, другі піша і — гаворыць. Вось так хацелася б мне пагаварыць з Вамі.

Я лічу, што сакратар — адданы справе, энэргічны — можа зрабіць больш, чым сам старшыня арганізацыі. У руках сакратара — усё. Вось таму ■ вельмі была б рада, каб Вы змаглі прыехаць да мяне адзін — пакуль што... З прыемнасьцю сустрэну і ўсіх, але хацела б пагаварыць спакойна і адкрыта — з Вамі. Ня думайце, што я прапусьціла без увагі пытаньне аб Менску праз няўвагу, або непаразуменьне. Не, гэта было зроблена зусім сьвядома.

Менск! — праца там вялася на розных франтах. Была і палітычная — зьезды, кангрэс... Была і праца з людзьмі, з бежанцамі, аб чым можна гаварыць адкрыта. Але першае — зьезды — гэта рэч іншая. А Вы самі пісалі, што ў клюб уваходзяць людзі розныя — ня толькі беларусы. А і беларусы ёсьць розныя...

Вашы гродзенскія пісьменьнікі, як А. Карпюк, У. Калесьнік, у сваіх творах рабілі закіды зусім беспадстаўныя, абураючыя... А так хацелася б пазнаёміць

з сапраўднасьцю — тым, што было і добрага, і можа, часам памылковага. Я ж была у самым цэнтры гэтай работы. Маю і свае ўласныя ўспаміны, і здымак групы дзеячаў зьездаў, і друкаваныя Пратаколы зьезду... Вось Вас, пане Мікола, і хачу пазнаёміць з гэтымі матэр'яламі.

Ваш ліст, Вашая гарачая абарона гродзенскага старога вакзалу падказалі мне ў Вас чалавека, якому магу верыць і пазнаёміць з тым, што захавалася ў мяне. Час уцякае, асабліва для мяне — баюся, каб не спазьніцца. А і больш падрабязна пазнаёміць з працай Гродзенскага гуртка беларускай моладзі, з некаторымі жыцьцяпісамі сяброў было б варта. Буду чакаць Вашага адказу — што думаеце аб маёй прапанове.

З прыемнасьцю чытала словы захапленьня пра Гудзевіцкі музэй. Ён мне вельмі блізкі ад самага пачатку яго існаваньня. Ужо хоць бы таму, што гэта — Гродзеншчына...

Усяго добрага Вам і ўсім сябрам клюбу "Паходня". Шчыра зычлівая *Людвіка Войцікава*.

279. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

21 ліпеня 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

З цэлага сэрца спагадаю Вашаму гору. Сколькі гадоў не пражылі б бацькі, у якім узросьце астаюцца дзеці — боль, адчуваньне страты заўсёды аднолькавае. І ня толькі няхутка, але, хіба, ніколі не мінае.

Як добра, што ўдалося наладзіць паховіны са сьвятаром! Разумею Ваш клопат, каб захаваць родную хату. Ёсьць і будзе куды вярнуцца і духам, і целам. Дакрануцца да мінулага, да свайго маленства. Вельмі цяжка ня мець роднага кутка. А ў мяне нідзе яго німа. Нават магілы параскіданыя па сьвеце.

Вернецеся з Грузіі — застанеце гэты мой ліст. Я вельмі буду рада, калі адкажаце мне, калі пачую, што лячэньне пайшло на карысьць. Я ўдома маю нешта падобнае. У дачкі — моцныя адклады соляў у руках. Ходзіць на праграваньне электрычнасьцю. Але ці не пашкодзіць гэта на сэрца? У яе стэнакардыя. А ў нас, на вялікі жаль, лекары ня вельмі асьцярожныя.

Я вельмі рада была пазнаёміцца з клюбам "Паходня". Былі, як ведаеце, усе, а пасьля прыяжджаў сам сакратар. Два дні я знаёміла яго з падзеямі ў Менску ў 1915–18 гадах. Са зьездамі і г.д.

Першы раз, як была ўся група, я справу Менска абмінула, бо ў групе людзі былі розныя. Ня ўсім усё скажаш і пакажаш. Маю здымкі, дакумэнты, якіх і Менск ня мае.

Аб новым выданьні альманаху Данута мне не казала і не пісала. Проста не хапіла часу. Можа, ізноў атрымаецца цікавая кніжка. Але каб зьмясьціць успаміны аб ГГБМ — німа што і думаць. Мне ведама, што калі пасьля аднаго мерапрыемства ў "Паходні" далі матэр'ял у друк, у газэту, то весткі пра ГГБМ і мяне адтуль зьніклі.

Гэта ўжо ня першы раз. У нейкім артыкуле Алеся Мікалаевіча [Белакоза] (аб выхаваньні моладзі ў школе ці нешта падобнае) маё прозьвішча і прозьвішча Юліі Бібіла (ініцыятаркі ткацкага гуртка ў Гудзевіцкай школе) выкінулі. Самі разумееце, што гэта значыць...

Я толькі прыватна магу знаёміць тых, хто да мяне прыяжджае, з успамінамі

аб ГГБМ. А вось у маей будучай кніжцы, якую апрацоўвае Янка Саламевіч, можа, ГГБМ і праскочыць — як самы пачатак маіх успамінаў.

Думаю, што галоўная прычына такіх адносінаў да гуртка і да мяне — гэта той артыкул нейкага невядомага мне *Яна з-пад Ласосны*, надрукаваны ў 1924 г. у час. "Крывіч", дзе гурток паказаны ў зусім фальшывым сьвятле. Адна мана. Гэта ўжо, мусі, каторысь з Вашых гродзенскіх пісьменьнікаў (А. Карпюк або У. Калесьнік) дакапаліся да "Крывіча" і цяпер капаюць ямы пад гуртком.

Мусі, на гэтым скончу. Лістоў — гара, а пішацца ня надта. Папсавалася надвор'е — пахаладнела, дождж. Дождж ня шкодзіць, бо зямля пасьля сушы ніяк ня можа напіцца, але ад вільгаці баляць горш ногі. Да ўсяго, маю другі дзень госьця — маладога пчаляра[1], які скончыў навуку ў Кіеўскай акадэміі (сам з Палесься). Пчаляр-энтузыяст і беларус-патрыёт. Яму, у яго рукі перадаю ўсе весткі пра Беларускае каапэратыўнае таварыства "Пчала" і яго орган "Беларускую борць". Буду спакойная, што памяць аб 10-гадовым існаваньні "Пчалы" ня зьнікне. Але матэр'ялы, дакумэнты застаюцца ў мяне, у маіх архівах.

Калі зможаце, прышліце мне, калі ласка, здымкі Я. Шнаркевіча, хоць арыгінал. Можа, даб'юся, каб тут зрабіць копіі. Ёсьць задума зрабіць альбом "Пчала" і "Борць" — будуць патрэбныя здымкі пчаляроў.

Я паслала аўтабіяграфію Я. Шнаркевіча ў "Настаўніцкую газэту". Паслала праз адну з супрацоўніц Літаратурнага музэю М. Багдановіча з Менска, бо я ў "Настаўніцкай газэце" нікога ня ведаю. Цізьмесьцяць? Ён жа перадусім — пэдагог.

Усяго добрага! Трымайцеся духам. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

280. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

23 ліпеня 1986 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Сардэчна дзякую за верш — мілы, прыгожы і ўжо ня першы. Схавала ў сумысную папку з вершамі для мяне: Л. Геніюш, Р. Барадуліна[1], Ул. Пецюкевіча[2], Ул. Скарынкіна, І. Чыгрына[3], А. Анішчыка[4], С. Панізьніка... Дарагая мне гэтая папка. Дарагая людзкая памяць, добрыя, цёплыя словы.

Не адразу Вам напісала, падзякавала, бо ведала ад сакратара "Паходні", што Вы выяжджалі. Мо яшчэ Вас у Гродне гэтая пісулька і не застане...

Я яшчэ неяк жыву. Горача, баліць галава, баляць моцна ногі. Стараюся ўсё сьцярпець. Лістоў і гасьцей хапае. І гэта падтрымлівае і маральна, і фізычна. Зьбіраю-сушу зёлкі ды яшчэ тое-сёе рыхтую для Гудзевічаў — для салі лекавых зёлак.

Цалую сардэчна. Усім сардэчна-шчырае прываітаньне. *Л. Войцікава.*

281. МІКОЛУ ТАРАНДУ

6 жніўня 1986 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Перачытываю Ваш ліст са здаволеньнем, з прыемнасцю, а куды Вам пісаць — ня ведаю. Адразу адказаць — не змагла... Цяпер пішу на Гродна. Калі буду ведаць, дзе Вы цяпер,— напішу. Бо маю з пару вестак, можа, і важных для Вас і для "Паходні".

Усяго добрага Вам і усім Вашым сябрам. Шчыра зычлівая *Л. Войцік (З. Верас).*

282. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

12 жніўня 1986 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Дзякую за верш і за ліст. Я так рада, проста шчасьлівая, што Вы ў сваім вершы замянілі чужое слова *кастры* на *агні*. Яшчэ што не люблю, гэта словы *патух, патушыць*. Чаму не *згасіць, згасла, пагасла*. Помніце гімн: "Не *пагаснуць* зоркі ў небе...".

Ну, але гэта ўсё ў параўнаньні з такім горам, як хвароба Алеся Мікалаевіча [Белакоза],— драбяза. Ён сам у лісьце да мяне аб апэрацыі ня піша, не прызнаецца, піша толькі аб сэансах абпраменьваньня, хоць і гэтага даволі, каб зразумець, у чым справа. Тут у Вільні ёсьць доктар-анколяг са старых беларусаў з Мсьціслаўя. Ён кажа: "Каб жа хворага да мяне ў Вільню на тутэйшае, больш кваліфікаванае лячэньне. Але ведаю, што прапанаваць гэтага нельга. Ні сілы ў яго на гэта, ні, напэўна, ахвоты ня будзе".

Шчасьце, што Вы, пані Дануся, лепш, мацней чуецеся ў душы. Каб і далей так, каб абміналі Вас розныя прыкрыя неспадзяванкі ў жыцьці. Яны, дробязі, найбольш чалавеку шкодзяць, аслабляюць. Ведаю гэта па сабе.

Так ужо надаела жыць. Сілай волі стараюся трымацца нармальна, але гэта вельмі цяжка даецца. Як заўсёды — шмат лістоў, шмат гасьцей — і здалёк, і тутэйшых новых беларусаў, маладых, шчырых, энэргічных. Мо яны і тут створаць нейкі цэнтр — згуртуюцца ў адно, каб хоць крыху беларускі дух ажыў, не загінула мінуўшчына.

Удома ў мяне нявесела. Унука бачу вельмі рэдка. Запрацаваны. Дачка лечыцца. У яе — адлажэньне соляў у правай руцэ. Моцна баліць. Кожны рух адбіваецца болем. А мне не дае нічога рабіць. Усё сама і сама. Мне застаюцца толькі зёлкі, на іх маю поўнае права. І імі займаюся. Але ж яны займаюць толькі рукі ды ногі, хоць хадзіць даволі цяжка. А думкі вольна снуюцца, а ў іх розныя беды і духовая адзінота. Найгоршыя ночы, калі не магу спаць.

Пішаце, што Вам дарагія гродзенскія касьцёлы? А што казаць пра мяне... З кожным зьвязаны нейкі ўспамін з самага маленства. Асабліва з Брыгіцкім касьцёлам-кляштарам.

Ці вярнуўся ўжо з адпачынку сакратар "Паходні"? Я ад яго атрымала вельмі цікавы ліст з Брэстчыны. Адразу не змагла адказаць (былі госьці — дзень у дзень), а цяпер ня ведаю, куды адрасаваць. Кантакт з Гроднам — гэта для мяне вельмі важна.

Але думкі зноў у Гудзевічах. Лёс Алеся Мікалаевіча [Белакоза] цесна зьвязаны з музэем. Хто ім пакіруе? Хто здолее захаваць, забясьпечыць здабыткі даўгіх гадоў? Там жа ворагаў больш, чым прыхільнікаў, а цяперашнія кіраўнікі вельмі бездапаможныя, і я думаю (мо няслушна) — даволі абыякавыя.

Пісаць яшчэ шмат аб чым можна, але сьпяшаюся, бо дачка выходзіць на працэдуры і ў аптэку. А хачу, каб ліст укінула ў скрынку. Разьлік такі — хутчэй вышлю, хутчэй дастану адказ. Ці так?

Цалую Вас сардэчна і шлю прывітаньні ўсім знаёмым і ўсяму Гродну ды Нёману. Шчыра адданая старая жыхарка Гродна *Л. Войцікава* (па-старому — *Л. Сівіцкая*).

283. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

25 жніўня 1986 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Хоць некалькі слоў Вам у адказ напішу, а то з дня на дзень адкладаю — усё нейкія перашкоды. Маеце рацыю, што найбольш трывала помніцца мова са свайго дзяцінства, са сваёй старонкі. Хоць у дзяцінстве я беларускую мову чула толькі ўлетку, бо ў іншыя поры году была і ўкраінская, і польская, і расейская, і французская. З 17 гадоў ужо прынцыпова аставалася беларуская (апрача моваў у гімназіі). Але беларуская была наша, мяккая, сакольская.

Пасьля, ужо ў Менску, трэба было звыкнуцца з літаратурнай, але і чуць розныя адценкі з самых розных куткоў Беларусі. Усё ж больш і больш на слых выбіралася самае чыстае, без чужаземшчыны. Гэта апошняе да болю рэжа вуха.

Вядома, *гасіць* і *тушыць* — гэта яшчэ нічога, можна прыняць і адно і другое. А ведаеце, я ўжо чула ня толькі *касьцёр дроў*, але і *касьцёр бліноў*! Цікава? Але *касьцёр* замест *вогнішча*? Не прыймаю.

Гэта ўсё дробязі да дыскусіі. Важнейшая справа — Алесь Мікалаевіч [Белакоз], яго здароўе. Ня мела дагэтуль магчымасьці паразумецца з тым доктарам-анколягам. Дастала яго адрас, напішу яму. Можа, удасца яго неяк накіраваць у Гудзевічы. Але гэта чалавек немалады — з такімі цяжэй. Буду прабаваць.

Што да помачы старшыні калгаса, то там было ўсяляк. Ведаю розныя падрабязнасьці. Я ж ужо 20 гадоў маю сувязь з Гудзевічамі — сталую, без перарываў.

Апошні час чуюся вельмі дрэнна. Усялякія беды чапляюцца. Проста надакучыла так доўга жыць і ваяваць з нягодамі старасьці. Хапіла б ужо, і быў бы спакой...

Што да Вашага сакратара — я яму пісала некалькі слоў на яго гродзенскі адрас. Прыедзе, адклікнецца — напішу больш. Было некалькі дзён даждлівых, халодных. Сяньня паказалася сонца. Цікава, якая будзе залатая восень. У нас у лесе яна вельмі шматфарбная. Але пакуль што яшчэ ўсё зялёнае, і кветак шмат — самых розных колераў.

Цалую Вас сардэчна і дзякую за лісты, лістовыя гутаркі. Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] цяжка перажывае сьмерць бацькі, і яму трудна пісаць. Шчыра — *Л. Войцікава.*

284. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

3 верасьня 1986 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ня ведаю, як удасца напісаць, бо першы раз прабую пісаць лежачы. Лепш сказаць — седзячы ў ложку, а не пры стале. Не палохайцеся, нічога паважнага німа, і я стала не ляжу, але, відаць, прастудзілася, маю катар, кашляю і доўга не магу заснуць. Хачу выкарыстаць гэты час на пісаньне лістоў, бо сабралася ўжо, мусіць, больш за 30, на якія трэба адказаць.

А днём, як мае выйдуць на работу і я на гадзін 5–6 астаюся адна, пісаць не магу. Адзінота пры маім слуху (дакладней — без яго) і шуму ў вушах ды галаве так дзеіць на нэрвы, што не магу заняцца ніякай умысловай работай. Стараюся знайсьці работу для рук — гаспадарскую.

У нас вельмі шмат яблыкаў, і стараемся іх не змарнаваць. Робяцца сок, джэмы, сушыцца што горшае на кампот. Вось пры гэтым і я стараюся памагчы. Апрача яблыкаў і грыбоў хапае, дачка вельмі любіць зьбіраць. Праўда, баравікоў німа, але шмат рыжыкаў, а цяпер і падзялёнак да саленьня. Гэта ўжо я парадкую. Рада была б і сама пайсьці пашукаць, але хадзіць далёка не магу, а цяпер з кашлем наагул не выходжу. Але гэта ўсё — драбяза.

Вельмі непакоіць стан Алеся Мікалаевіча [Белакоза]. Падобна, цяпер у яго дрэнны настрой, відаць, горш чуецца. Можа, наш тутэйшы анколяг др. Кутарга пастановіць забраць хворага ў Вільню. Ён шкадуе, што гэта ня зроблена даўна... Тут жа, дзе ён працуе, экспэрымэнтальны анкалягічны інстытут. Вы, хіба, гэтага доктара бачылі, бо ён разам з Лявонам езьдзіў у Гудзевічы, а цяпер ён па тэлефоне кантактуецца з дактарамі гродзенскага шпіталя. Цяпер у мяне ня быў — можа, часу не хапае, а мо і таму, што вельмі дрэнная пагода — дажджы і шалёны вецер. А за Вільлёй на Зьвярынцы быў град — як гарох.

Аляксей Міхайлавіч, прачытайце ў Беларускай энцыкляпэдыі артыкул пра продкаў гэтага д-ра Кутаргі. Яны жылі і працавалі ў Мсьціслаўлі. Доктар вельмі цікавіцца беларускай літаратурай і культурай, але гаворыць і піша пабеларуску вельмі дзіўна, бо яго маці была літоўка. А чалавек ён добры, чуткі і разумны. Так шкадую, што я яго толькі нядаўна пазнала, каб раней і каб зацікавіла яго хваробай Алеся Мікалаевіча, то, можа, да цяперашняга стану не дайшло б...

Уяўляю, як перажывае Алесь Мік[алаевіч] за музэй. Што з ім далей будзе? Данута Іванаўна [Бічэль] неяк дзіўна аптымістычна на гэта глядзіць. Піша, што там усё добра, ёсьць каму працаваць, ёсьць каму захаваць зробленае. А фактычна — зусім німа каму. Не дырэктар жа гэты музэй захавае і не старшыня калхозу... Усё трымалася на працы, на нэрвах, на высілку Алеся Мік[алаевіча]. За 20 гадоў знаёмства і сувязі я больш, чым хто іншы, ведаю і ведала ўсе абставіны працы.

Пішаце аб школьных справах у Менску... І з самога Менска нічога добрага, пацяшаючага не даходзіць. Куды ні глянь, усё ідзе да горшага. Аб школьных справах піша мне былая Вашая вучаніца Валя Войцік[1] — пляменьніца майго мужа. Ды расказываюць тыя, хто прыяжджае.

13 верасьня ў Новай Вялейцы сьвяткавалі 110-я ўгодкі нараджэньня Цёткі. На другі дзень прыехалі да мяне: М. Купава, В. Янушкевіч[2] і музыка М. Стома[3]. Апошні часта ў нас бывае, бо яго маці жыве ў Ляндварове. Нічога пацяшаючага ад іх не пачула. Далей цягнецца справа Траецкага інцыдэнту[4].

А цяпер яшчэ адно. Як, напэўна, ведаеце і помніце, у Менску зьнялі з мейсца дом, у якім у 1916 г. жыў 5 месяцаў М. Багдановіч. Зьнялі перад самай зімой з паламанай страхой і крыху пазабіванымі вокнамі, паставілі на зіму на новым мейсцы. Супрацоўнікі музэю падлажылі жалезныя рэйкі, накрылі. Меліся вясной дом адбудаваць — так абяцала Міністэрства культуры.

Не зрабілі *нічога*, і той дом астаецца ў такім жа выглядзе на другую зіму. Зразумела, адбудоўваць ужо ня будзе чаго... Ці ад гэтага ўсяго няможна расхварэцца? Ці варта было да гэтай пары дажыць?

А што там з "Паходняй"? Маю для іх добры машынапіс ГГБМ — у вокладцы, афармлены, але бяз здымкаў. Некаліс сакратар "Паходні" казаў, што здымкі зробяць самі. Цяпер я пыталася, што будзе, але адказу ня маю. Можа, і ў іх нешта ня ладзіцца?

Віленскія новыя беларусы стараюцца згуртавацца — стварыць нейкі клюб. Пакуль што ўзялі ў нас сьпіскі беларускіх магілаў — бяруць іх пад сваю апеку. Гэта ўжо пачатак іх дзейнасьці. Добры пачатак.

Бядую, ці зможаце прачытаць. Ужо 2-я ночы. Спаць, хіба, ня буду, але і пісаць больш не бяруся...

Усяго добрага. Прывітаньне п. Марыі. Шчыра — *Л. Войцікава*.

285. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[12 верасьня 1986 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Я Ваш той першы ліст атрымала ў пару. Не адказала, бо Вы скончылі тым, што едзеце з сям'ёй на саракавінкі, і я аніяк не магла аблічыць, калі гэта будзе. Пасьля наехала цэлая "калекцыя" менскіх музэяў (яны і ў Гродне былі). Крыху мяне гэта змучыла і адбілася на нэрвах.

Не разумею Лявона [Луцкевіча]. Як ён мог Вам сказаць, што я здаровая? Цэлыя сэрыі розных недамаганьняў! Страўнік (ад даўняга часу, гадоў 30), болі галавы мучаць, болі ног... Мяне словы Лявона зьдзівілі, а маю дачку абурылі. Усё ж неяк стараюся, каб не нэрвавацца занадта, знайсьці сабе нейкую хатнюю работу.

Як толькі знайду адпаведны час (бяз боляў), напішу Вам даўгі ліст. І я маю шмат сумных вестак з Менска аб школьных справах і не зусім добрых — аб "Паходні", іх працы. Яны павінны быць больш стрыманымі, асьцярожнымі... Але ім аб гэтым не кажыце. Пастараюся хутка напісаць даўгі ліст.

Шчыра вітаю Вас і сям'ю. *Л. Войцікава*.

286. МІКОЛУ ТАРАНДУ

7 верасьня 1986 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст, і даруйце, што не адразу адказала, хоць перарыў у нашым ліставаньні даволі вялікі. Што Вы былі ў Менску і ў Сяргея Міхайлавіча [Новіка-Пеюна], я ўжо ведаю ад яго самога. Ён мне прыслаў аж 4 экзэмпляры машынапісаў "Гродзенскага гуртка беларускай моладзі". Адзін — для Вас, для "Паходні", другі — для менскага Дзяржаўнага музэю літаратуры, трэці — для Гасьцёўні Галубка ў Менску, чацьвёрты — на запас. У Дзяржаўны музэй у Менску мне ня вельмі хочацца даваць, бо мне адтуль ужо два разы пісалі — *парасейску!* Але, мусі, прыйдзецца...

Цяпер справа — здымкі. Анатоль Наліваеў з Гасьцёўні Галубка, пісаў, што здымкі Бел[арускага] грод[зенскага] гуртка мае і прышле... Але якія яны, якога фармату і колькі іх — ня ведаю. Ці ня лепш было б, каб копіі здымкаў зрабіў Ваш фатограф, і то тут у мяне? Не з маленькіх здымкаў, а з вялікага фармату, што я маю? Можа, яшчэ што хацелі б перафатаграфаваць. Сьпяшаюся ўсім падзяліцца, бо вось-вось 94 гады стукне, і няведама, што далей будзе...

Як і Вы ўсе з "Паходні", нашы гурткоўскія нашчадкі, так і мы, як стварылі гурток, былі амаль дзеці... Вы ў адным з лістоў пісалі, што Вас пыталіся: што зьвязывае Вас, "Паходню", з 1909 годам — ці так я зразумела? І вось у сувязі

з гэтым я хацела б Вас пазнаёміць з адным артыкулам — сапраўдным *фальшам*, надрукаваным у 1924 г. у часапісі "Крывіч". Я аб гэтым у сваіх успамінах аб ГГБМ пішу, але прачытаць сам артыкул, а не яго крытыку, варта. Каб перадугледзець усе магчымыя непаразуменьні...

Ведаю, што доктар В. Кутарга і мой зяць Лявон Антонавіч [Луцкевіч], будучы у Гродне, спаткаліся з Вамі, Данутай Іванаўнай [Бічэль] ды Аляксеем Міхайлавічам [Пяткевічам]. Так што ўсе Вы ведаеце, што доктар анколяг зацікавіўся хваробай Алеся Мікалаевіча [Белакоза] і будзе старацца сваімі прафэсіянальнымі ведамі яму памагчы. Можа, нават забраць яго сюды ў Вільню. Яшчэ я з ім пасьля павароту з Гудзевіч і Гродна ня бачылася, але абяцае пры першай магчымасьці прыйсьці.

Інжынер Валянцін Стэх кратаецца, як можа. А я вельмі рада, што нехта малады, энэргічны, руплівы пераймае ўсе віленскія беларускія справы ў свае рукі, усім цікавіцца, усім і ўсімі... Адведывае старых і адзінокіх — як Янка Багдановіч, удава мастака Пётры Сергіевіча... Узяў у мяне сьпісак беларускіх магілаў у Вільні (а іх шмат — каля 40) і ўжо ўсе могільнікі абыйшоў — агледзеў. Хоць яшчэ ня ўсе магілы яму паказалі — ня ўсе знайшлі... Вось такія ў нас справы.

А ці Вы ведаеце, што 13 верасьня у Новай Вялейцы каля Вільні будуць сьвяткаваць 110-я ўгодкі нараджэньня нашай паэткі Цёткі — А. Пашкевічанкі? Можа, і з Гродна хто далучыцца? Каб хоць толькі дажджу не было. Лье і лье па некалькі разоў на дзень.

Пішу немагчыма невыразна, але гэта сяньня ўжо 3 ліст, і ужо позна... Усяго Вам найлепшага і ўсім сябрам "Паходні". Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

287. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

7 кастрычніка 1986 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Сардэчна дзякую за ліст, за памяць. Зусім нечакана атрымала шмат павіншаваньняў — лістоў і тэлеграмаў. Маю работу — адказываць, дзякаваць. Учора было некалькі чалавек гасьцей — старых знаёмых, а 27 верасьня, загадзя, віншавалі мяне новыя віленскія беларусы. Мілыя, сьвядомыя людзі з вельмі добрай, чыстай мовай. Знаходзіцца іх штораз больш і больш. Раджу ім згуртавацца, зарганізавацца, каб не пагубіліся і адрадзілі віленскія беларускія традыцыі. Ужо добра тое, што ўзялі ў нас сьпіскі магілаў беларускіх пісьменьнікаў, дзеячаў, пахаваных у Вільні, абыйшлі могілкі і возьмуць магілы пад сваю апеку.

Учора ад сябра па няшчасьці с.п. Ларысы Антонаўны [Геніюш] я дастала 2 вершы паэткі, пісаныя на поўначы, новыя, нязнаныя да гэтай пары. Хачу іх аддаць Вам, але не праз пошту... Маю вялікую пачку лістоў ад Л.А. Думаю, добра было б нам з Вамі іх пераглядзець. Мо Вы частку забралі б, а што і зьнішчыць варта. Пасьля мяне, хіба, шмат лістоў розных возьмуць у Музэй-архіў. Ня варта, каб усе лісты Ларысы Антонаўны туды трапілі. Выходзіць, Вам неабходна да мяне прыехаць. Ведаю, што цягніком цяжка, але ходзіць аўтобус. Гэты транспарт выдатны, пакуль німа марозу і сьнегу.

Я не магу доўга і цярпліва чакаць — у мяне, відаць, бранхіт. Кашляю, хрыплю, ня сплю. І гэта цягнецца ўжо, хіба, трэці тыдзень. Маю дагляд, маю лекі. Але нічога не памагае — відаць, робіцца хранічны. Як у Ніны Барысаўны Ватацы.

Я ад Алеся Мікалаевіча [Белакоза] атрымліваю лісты і пішу яму. Пішуць так-

сама мне гудзевіцкія школьнікі і супрацоўнікі музэю. Вы, хіба, ведаеце, а мо і бачылі нашага віленскага доктара, які езьдзіў у Гудзевічы і ў Гродна, аглядаў нагу Алеся Мікалаевіча. Варочаючыся, у цягніку напісаў мне некалькі слоў і запэўніў, што прыйдзе і "ўсё падрабязна раскажа". Але, на вялікі жаль, дагэтуль у мяне ня быў.

Бачыўся з ім ня раз Лявон Антонавіч [Луцкевіч], але праз трэція рукі весткі няпоўныя і недакладныя. Падобна, гэты доктар напісаў Алесю Мікалаевічу ліст, выклікаючы яго ў Вільню, але адказу не атрымаў. Я не дзіўлюся. Перадусім — як такі хворы пасьля абпраменьваньня можа адзін ехаць у такую дарогу?

Па-другое, А[лесь] М[ікалаевіч Белакоз], на вялікі жаль, больш увагі аддае музэю, сваёй працы, чым стану свайго здароўя. У адным з апошніх лістоў піша: "Хачу зрабіць аканчальна аддзелы лёну і лекавых зёлак, але баюся, што больш як на месяц мяне ня хопіць". Ня думаю, каб гэта значыла "месяц жыцьця", але — "месяц сілы і магчымасьці працаваць". І гэта вельмі непакоіць. Калі гэты доктар нам сяньня-заўтра не пакажацца — напішу яму. Хацела б мець весткі ад яго з першых рук.

У Гродна, напэўна, ёсьць "Беларуская энцыкляпэдыя". Пашукайце на літару *К* прозьвішча *Куторга* — гэта продкі нашага доктара-анколяга. Жылі ў Мсьціслаўлі. Вельмі цікавы іх жыцьцяпіс. Наш доктар вельмі іх памяць шануе. Цікавіцца беларускай культурай і літаратурай, але беларуская мова яго вельмі дзіўная, бо яго матка — літоўка (ці ліцьвінка?), і жонка таксама, і дачка беларускай мовы ня ведаюць. Але як чалавек ён вельмі цікавы і вартасны.

Учора было нядрэннае надвор'е, а сяньня — цёмна, хмарна, дождж. У нас яшчэ на гародзе морква, буракі, капуста-бруксэлька, ды і яблыкі не да канца сабраныя — чакаюць Славы, бо толькі ён зможа ўлезьці на яблыню сарваць рэшту. Яблыкаў у нас сёлета вельмі шмат. Галя робіць вялікія запасы соку, джэму, [redacted] і сырых некалькі скрынак. Як перахаваюцца — ня ведаю.

Былі і грыбы, але не баравікі, якія ў нашым лесе зусім зьвяліся. А некалісь напачатку амаль пад самым домам расьлі. Усё гэтыя гарадзкія грыбнікі. Адзін грыб зрэжуць, а ўсё навокал вытапчуць і перавернуць. Сёлета былі добрыя рыжыкі, падзялёнкі, апенькі ды іншая драбяза. Сушылі і салілі. Галя вельмі любіць зьбіраць грыбы, [redacted] любіла таксама, але цяпер толькі па адной блізкай сьцежцы хадзіла — баляць і слабеюць ногі.

Шмат хто зьбіраўся прыехаць у канцы верасьня, але неяк усе адлажылі на кастрычнік. Вось і чакаю, хто і калі прыедзе. Не спадабалася мне сьвята Цёткі — неяк дзіўна ладзіў яго тутэйшы доктар-ліцьвін. Мову беларускую ведае, нават артыкул аб Цётцы і сьвяце напісаў і меўся паслаць у "ЛіМ" (ня вельмі гэты артыкул мне падабаецца), але чаму не было нікога з беларускіх літаратараў-паэтаў? Былі мастакі, студэнт Менскай кансэрваторыі, маладыя дзеячы з Маладзечна. У Вільню прыслалі запросіны Лявону асабіста. Мо яшчэ каму — ня ведаю. Нават аўтарка кніжак пра Цётку[1] не была. Ці ня дзіўна?

Усяго Вам найлепшага! Пішыце, а калі зможаце — прыяжджайце. Неяк ліст намазала, кашляючы ды трымаючыся за балючую галаву. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

288. МІКОЛУ ТАРАНДУ

14 сьнежня 1986 г. Вільня

Паважаны сябра Мікола.

Дзякую за ліст, за навіны. Сапраўды ёсьць і добрыя, і надзейныя, асабліва Вашыя мясцовыя, гродзенскія. Менск цешыць мала... Магчыма, Вы ня ўсё ведаеце. Там ёсьць дзьве плыні. Ёсьць моладзь, але ёсьць і выдавецтвы і г.д. Ды ня ўсё напішацца...

Лічу, што калі-небудзь зможаце прыехаць — пагаварыць. Цяпер напэўна ўжо ведаеце аб ладжаным у Вільні юбілеі "Н[ашай] нівы". Шкада, што ня ўсё будзе згаджацца з сапраўднасьцю. Вы пісалі, што А. Жамойцін мне раскажа аб нарадзе пісьменьнікаў? А ён нават са мной не прывітаўся... Так, як і іншыя, сабраўшыся на гэты славуты, ладжаны Лявонам, юбілей...

Вы, гродзенцы, людзі культурныя, і зразумееце, да чаго мяне "патрасла" такая захавань сабраўшыхся. Такога, выбачайце за грубае выражэньне, *хамства* я ў жыцьці не спатыкала. А перажыла нямала: зьезды, нарады, канфэрэнцыі, паседжаньні...

Увайшла, і ні адзін чалавек не падняўся, ні адзін не прывітаў — сядзелі, як мур. Нават тыя, што не адзін раз у маім доме бывалі. Чым вытлумачыць? Ня ведаю. Я за сабою ніякай віны не адчуваю. А перажываю такую зьнявагу моцна.

Не дзяліцеся гэтымі весткамі з сябрамі клюбу — ня варта. Я ведаю, што Вашыя сябры — людзі культурныя сапраўды, а не на словах, але і тут могуць быць выняткі. Лепш перайду да іншага. А ці Вы дагэтуль не заўважалі, што і я гавару "дзіўна", як і (на шчасьце) многія з Менска? Я ж ніколі не скажу "клуб", "клас", "філосаф" — толькі мякка. І мяккі знак, дзе трэба, ужываю.

І ведаеце, калі мяне прынялі ў Саюз пісьменьнікаў, прывязьлі сяброўскі білет, я напісала ліст у С [аюз] п[ісьменьні] каў з падзякай і прывітаньнем. Ліст атрымаў Ніл Гілевіч. І мне пасьля пісалі, што ён цэлы дзень насіў гэты ліст і ўсім паказываў: якая *была* і якая павінна быць мяккая беларуская мова. Не сапсаваная цьвёрдым — чужаземным — гучаньнем.

На вялікі жаль, на гэтым скончылася. Але не паміж моладзьдзю. Моладзь хоча мець сваю мову чыстую, мілагучную — якой гаварылі і ў Заходняй Беларусі, і ў Менску ў 1915, 16 гадах. Мы ж тады і звароту *па-бацьку* ня ведалі і не ўжывалі...

Як бы я хацела, каб Вы прачыталі крытыку с.п. М.М. Улашчыка на "твор" А. Лойкі "Як агонь, як вада". Там с.п. Мікола Мікалаевіч і аб ужываньні звароту *па-бацьку*, як аб чужым для беларусаў, гаворыць.

А ведаеце, некаторыя (і то нямала) беларускія студэнты, вывучаючы беларускую мову, робяць запісы-канспэкты лацінскім альфабэтам? Пыталіся мяне, што я аб гэтым думаю? І я з імі згадзілася, бо лацінскі альфабэт мае больш гукаў і дакладней вучыць вымаўленьню. Вось, напрыклад, возьмем літару *Г*. Хто добра беларускай мовы ня ведае, у кожным выпадку будзе гэтую літару вымаўляць *цьвёрда*. Напр[ыклад], *горад* — так і скажа цьвёрда (гэта ня раз можна пачуць у Менску). А ў лацінскім альфабэце ёсьць на гэты гук 2 літары — g і h, і тут памылкі быць ня можа.

Магчыма, я тлумачу няясна — я ж не лінгвіст. Усяго толькі батанік, і то без навуковых тытулаў. Толькі што практыка немалая... Што да батанікі — атрымала цяпер цудоўную батанічную кніжку з Нью-Ёрка. Знаходжу шмат новага, цікавага. Зразумець памагаюць лацінскія тэрміны, а ангельскі тэкст памага-

юць прачытаць дачка і ўнук, бо я ангельскай мовы вучылася ў школе адзін год усяго — мала ў памяці асталося.

Напісала мо больш, чым думала, чым трэба. Але гэта мяне Ґродна так прыцягівае. Ну і яшчэ Сакольшчына. Якія адтуль цудоўныя весткі... Якія мае землякі моцныя ў сваёй беларускасьці... Аб гэтым піша і беластоцкая "Ніва", і прыватныя лісты...

Яшчэ адно пытаньне: як Вы зможаце правясьці юбілей "Н[ашай] нівы", не ўспамінаючы яе рэдактароў-заснавальнікаў? Бо гэтак зрабіў "ЛіМ", а "Голас Радзімы" пайшоў далей — там *толькі* Я. Купала паставіў "Н[ашу] ніву" на належную вышыню. Фальш і фальш, усюды фальш... Як з гэтым ваяваць?

Усяго найлепшага Вам, "Паходні", усім яе сябрам. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

289. СЯБРАМ КЛЮБУ "ПАХОДНЯ"

27 сьнежня 1986 г. Вільня

Дарагіх, мілых сяброў клюбу "Паходня" сардэчна вітаю з Новым годам! З новымі сустрэчамі, дасягненьнямі, добрымі вынікамі ў працы на карысьць Беларусі і яе мовы.

Шчыра адданая роднаму Ґродну — *Л. Войцік*, з гродзенскага часу — *Л. Сівіцкая*. Дзякую за памяць, за павіншаваньне ўсім падпісаўшымся.

290. МІКОЛУ ТАРАНДУ

27 сьнежня 1986 г. Вільня

Паважаны пане Мікола[1].

Толькі цяпер бяруся адказаць на Ваш ліст з 17/XII. Вялікая колькасьць лістоў, і віншавальных, і іншых — не даю рады... На Ваш ліст адказываю па парадку тэмаў. Аб сьмерці сп. М.М. Улашчыка я ведала ўсё дакладна ад Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага, які і на крэмацыі быў. Ён мне пісаў, што пахаваць астанкі памёршага думаюць ня ў Менску, а ў яго роднай вёсцы.

Што Вам пасылаў Лявон да дня юбілею "Н[ашай] нівы", я даведалася толькі ад Вас. Каб ведала, дадала б, што "Н[аша] ніва" выдавала ня толькі календарыкніжкі, але і сельскагаспадарчую часапісь "Саха", рэдактарам якой быў Аляксандр Уласаў. Пасьля А. Уласаў, выяжджаючы ў Менск, забраў "Саху", яе выдавецтва ў Менск, але, здаецца, ня выдаў ніводнага нумару. Толькі ў 1930 г. мы тут у Вільні задумалі аднавіць "Саху", але ўдалося выпусьціць толькі 4 нумары (2 з іх маю). Рэдактарам быў інжынер-аграном Сяргей Бусел.

З супрацоўнікаў "Н[ашай]н[івы] " я добра ведала і супрацоўнічала з Антонам Луцкевічам (20–30 гады ў Вільні), а яшчэ лепш у Менску — 1915–1918 гады, а пасьля ізноў у Вільні — з Аляксандрам Уласавым.

Вы хацелі б ведаць, як закончылася жыцьцё нашаніўцаў? Першым памёр у 1919 г. Іван Луцкевіч (паміж іншым, ня ведаю, хто і калі зрабіў з яго Івана, бо ён у лістах падпісываўся *Ян*). Памёр ад тубэркулёзу у Закапаным (тады Аўстрыя, пазьней і цяпер Польшча), дзе лячыўся. Там пахаваны (ёсьць здымак магілы), але пастаўлены толькі драўляны крыж. Крыж з часам струхнеў, упаў — і магілы цяпер знайсьці не ўдалося. Нашы беларусы, што жылі ў Польшчы (цяпер і іх

ужо німа), езьдзілі, шукалі — не знайшлі.

Антона Луцкевіча вывязьлі, як і ўсю віленскую беларускую інтэлігенцыю ў пачатку 40 гадоў. Куды, і дзе закончыў жыцьцё — ня ведаю. А можа, Лявон што ведае?

Вацлаў Ластоўскі (з якім я шмат карэспандавала) ў 1924 г. і пазьней жыў у Каўнасе, прыймаў удзел у выдавецтве час[апісі] "Крывіч" (пару нумароў маю), напісаў і надта добры слоўнік. У "Крывічы" друкаваў і свае вершы. Дату сьмерці, хіба, Лявон ведае.

Аляксандр Уласаў жыў у пачатку 30 гадоў у сваёй маёмасьці Мігаўка каля Радашковіч. Яго жанілі позна... Дату сьмерці даведаюся ў яго пляменьніцы, з якой і цяпер карэспандую.

У Вільні пахаваны Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) і шмат іншых беларускіх пісьменьнікаў, паэтаў і г.д. Сьпісак лічыць больш як 40 магілаў. Гэты сьпісак перадрукаваў сабе інж[ынер] Стэх, і яны (Стэх і інш. маладыя) возьмуць беларускія магілы пад сваю апеку — заменяць тых, хто дагэтуль аб магілы клапаціўся і кожны год у Дзень памёршых на г.зв. Задушкі складаў на магілах кветкі (з нашага агароду) і паліў сьвечкі.

Ліст Марачкіна і Купавы аб падзеях на Траецкім прадмесьці я чытала — прывозіў мне Купава, але яго копію прыйму з удзячнасьцю. Вось што, М. Купава браў у мяне арыгінал здымка "Старое Гродна". Гэта яшчэ прыдбаў мой бацька. Падобна, копіі, зробленыя добрым фатографам, выйшлі выдатна. Арыгінал мне Купава прывёз. Запытайцеся яго, можа, даў бы "Паходні" копію, бо думаю, што такога здымка ў Вас німа. З пантонным мастом і г.д. Мае лісты, як, падобна, і іншыя, да Купавы не даходзяць... Мне вярнулі назад. *Там* нехта такі сядзіць — лістоў не дапускае.

Пішаце, што ў Вільню зьбіраецца Гродзенскі тэатр? Але ж ён, мусі, не беларускі, а рускі? То і цікавіцца ім німа прычыны. Думаеце, што я ведаю артыста В. Шалкевіча[2]? Не, ня ведаю. Сп. У. Кіслы быў на маім 90-годзьдзі, але да далейшага знаёмства не дайшло. Ведаю толькі ад пані Дануты [Бічэль], што ён надзвычайна добра аформіў надпіс на магіле маці М. Багдановіча.

Пачала пісаць раніцай, а канчаю позна ўвечары. Прарвалася торба з гасьцямі... Была пара мастакоў, лясны інжынер, 2 былыя вучаніцы Віленскай Беларускай гімназіі. Адна з іх — школьная сяброўка майго с.п. сына, каторую я толькі цяпер пазнала. Гэта была хвалюючая падзея...

Цікава мне, у якім будынку адкрыецца Музэй-аптэка? Насупраць Фарнага касьцёла — будынак былы Стэфана Баторыя, там была мая гімназія. А налева ад Фары — рагавы будынак, дзе раней былі фатограф Гельгар[3] і дантыст Фрумін, а пасьля ў 1919–20 гадах — беларускія арганізацыі. А за Фарай, на К. Маркса, якая ў 1905 г. называлася Купечаскай, жылі мае дзяды, гадаваўся мой бацька. Цікава, што гэта будзе за музэй? Не ўяўляю...

Пасылаю не зусім звычайную паштоўку. Гэта работа маёй дачкі. Але хопіць. Пішу штораз горш — ці прачытаеце? (Разбалелася галава.) Пытаюся, ці прачытаеце? Але гэта ўжо такая доля сакратара — мусіць чытаць усялякія каракулі.

Усяго добрага! Шчыра зычлівая *Л. Войцік.*

291. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[27 сьнежня 1986 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сардэчна вітаю Вас і Вашую сямейку з Новым годам! З усяго сэрца зычу ўсяго самага найлепшага — добрага здароўя, радаснага настрою, вялікага плёну ў працы.

Учора атрымала Ваш ліст — дзякую. Вы і не ўяўляеце сабе, якія на мяне валяцца цяжкасьці, непрыемнасьці... Наймацнейшы чалавек можа пад імі зламацца духова. Вельмі мне патрэбныя Вашая — якраз Вашая — помач, парада.

Зараз пачнуцца зімовыя канікулы, можа, сапраўды Вы змаглі б прыехаць? Можа, аўтобусам зручней, чым цягніком? Тым больш, што, магчыма, і самі скарысталі б — маю некалькі лістоў У. Караткевіча[1] да мяне. Вельмі шчырых, у якіх ён піша аб сваіх клопатах з друкам і г.д. Думаю, што ня кожнаму так адкрыта пісаў... Мо гэта сказала б Вам нешта аб пісьменьніку як чалавеку.

Дзякую за добрую вестку аб Алесю Мікалаевічу [Белакозу]. Зрабілася спакайней на душы.

Л. Войцікава.

292. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[Сьнежань 1986 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сярдэчна вітаю Вас і ўсю Вашую сям'ю з надыходзячым Новым годам! Шчыра зычу добрага здароўя, плёну ў працы. Даўна мела ад Вас вестку. Што чуваць? У мяне нічога добрага — маю грып, кашляю, баліць галава і г.д.

Ці чыталі ўжо маё "Старое Гродна"[1]? Што скажаце?

Усяго найлепшага. *Л. Войцікава з сям'ёй.*

Паштоўку гэтую аддайце свайму ўнуку.

293. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[1986 г.]

Даражэнькая пані Данута.

Сяньня атрымала Ваш ліст, зараз адказываю. Ня думайце, што я Белакозу напісала, хто мне паможа з малюнкамі. Я добра ведаю, што ў гэтай прыкрай справе німа віны мастака К[ісла]га, а толькі панясьлі Б[елако] за нэрвы. Мае ён чаго нэрвавацца больш, чым магчыма чалавеку вытрымаць. Я толькі пісала, што Вы паможаце перадрукоўваць. Мае тут паднялі гвалт, што гэта не пэдагагічна — даваць школьнікам усё гатовае. У тым часе Алесь Мікалаевіч паведаміў, што ў іх адрамантаваная машынка, і ён сам (ды і вучні пры яго помачы) перадрукуюць самі, каб ■ толькі прыслала чарнавікі. Што ■ і пачала рабіць.

Частка ілюстрацый робіцца каляровымі выразкамі з кніжак і часапісаў. Але ня ўсё ёсьць, і частку, чаго не хапае, трэба маляваць. Гудзевіцкі музэй — школьны, шмат у чым залежыць ад старшыні калгасу, і той сказаў, што дасьць грошы на малюнкі, і каб рабіў іх А. Ліпень[1]. Алесь Мікалаевіч напісаў да яго. Доўга чакалі адказу. Ліпень меўся напісаць да мяне. Але не пісаў. Цяпер даў Белакозу адказ (гэты адказ у мяне). Ліпень напісаў, што цяпер нічога зрабіць ня можа —

жонка хворая, пасьля апэрацыі і г.д. Што ж, можна толькі паспачуваць. Але калі б узяўся, то яму на гэта трэба шмат часу — больш чым 1 малюнак на дзень зрабіць ня зможа.

Мяне гэта вельмі дзівіць. Малюнкі — малыя расьлінкі акварэляй, што пры іх за работа? Каб гадоў 15–20 таму, то я сама іх зрабіла б. Мне трэба было 15 малюнкаў. Частку іх замяніла выразкамі, але некаторых так і ня маю. Я ўспакоіла Б[елако] за, што нешта прыдумаю. Паперу маю — як трэба. На ўзор, як зробленыя першыя табліцы (10 штук), мы са Слаўкай зрабілі сабе адзін экзэмпляр. Маляваць можна на чыстых аркушах, а тэкст у Гудзевічах выпішуць самі з маіх чарнавікоў і паводле маіх узораў. Уся справа ў малюнках.

Я знайшла яшчэ крыху выразак, але штук 10 трэба намаляваць. А можа, усё ж Вы з У. Кіслым прыехалі б? Расплачуся я сама, бо той старшыня ўжо памагаць музэю адмовіўся. Толькі што Ґудзевіцкі музэй чамусьці сьпяшаецца. Пішуць, што да 1 мая мусяць мець усё гатовае.

А цяпер аб Вашым музэі. Чым толькі змагу — памагу. Я і сама ня ведаю, што маю. Павыносілі на падстрэшак, запакавалі часьць у скрынкі, а я туды дабрацца па вузкіх крутых сходах не магу. Тое, што маю пад рукамі, моцна зьнішчанае. Але ёсьць і ў добрым стане, напрыклад, "Граматыка" Б. Тарашкевіча. Ёсьць такія рэчы, што цяпер нікуды не надаюцца. У кожным выпадку неабходна Вам прыехаць.

А цяпер яшчэ маю лямант са Слоніма — з той 7-й школы, яе музэю. Настаўнік Сідаровіч піша, што ніхто ня хоча памагчы. Напісалі са школы 90 лістоў да розных людзей — адказала палова, і то пераважна, што нічым памагчы ня могуць. Ім там вельмі патрэбны "Чыжык беларускі" Г. Леўчыка[2]. Хоць бы ксэракопію зрабіць — было б добра. Але нідзе "Чыжыка" німа. Я ўжо пыталася ня толькі тут усіх знаёмых, але і ў Польшчы.

А наагул, гэты Сідаровіч — дзіўны чалавек. Ніна Аляксандраўна Ляшковіч колькі разоў яму пісала: прыедзьце ў Вільню, пакажу, навучу, дзе і як шукаць матэр'ялы ў віленскіх архівах — шукайце. Гэтак жа ўсе робяць і шмат цікавага для сябе знаходзяць. Але ж — не! Ён прыехаць ня можа: "Няхай Ніна Аляксандраўна сама шукае". Пасьля — скаргі, што яна ня хоча памагчы... Цяпер піша: "Ідаць, гэты музэй нікому не патрэбны. Ніхто з тых, хто прыяжджаў на адкрыцьцё, не аставіў у кніжцы водгукаў ні слова. І нідзе нічога пра музэй не напісаў". Калі гэта так, то сапраўды дзіўна.

Але хопіць. Чакаю Вашага адказу, а Вас — разам з паважаным мастаком У. Кіслым. Аб Гальяшу Леўчыку пагаворым. Думаю, гродзенчукі — дамовімся. Шчыра Вас цалую. *Л. Войцікава.*

294. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[1986 г.]

Даражэнькая пані Данузя!

Учора Вашую пісульку атрымала — сяньня адказываю. Выбіраю, што насьпяшнейшае, бо лістоў да адказу ляжыць 18 штук. А тут такая слабасьць напала — ледзь ногі цягаю. Але гэта няважна, німа аб чым гаварыць.

Так, успаміны аб Гродзенскім гуртку беларускай моладзі ў "Студэнцкай думцы" — мае. *Л. С.— Ш.* значыць — *Людвіка Сівіцкая-Шантыр* — па першаму мужу. Усё, што падпісана *З.В.*— маё. Вось каб Вам у рукі трапіла "Беларуская борць", там бы Вы ўжо ніяк не зарыентаваліся, бо я падпісывала ці не дзясяткам

крыптонімаў. Не было іншае рады. Супрацоўнікаў было вельмі мала, а тэмаў шмат. Нельга ж было, каб амаль цэлы нумар быў падпісаны адным прозьвішчам або псэўдонімам. Вось і выкручывала свае літары на ўсялякія спосабы.

Што да кніжкі "Мядовыя расьліны"[1], доля яе незайздросная. Часьць матэр'ялаў друкавалася паступова ў "Беларускай борці", а рэшта рукапісу доўга ў мяне ляжала, аж нарэшці я яе аддала Ф.М. Янкоўскаму. Ён мне напісаў, што гэта грэх — трымаць такую рэч у прыватным архіве, і меўся аддаць у нейкі, як ён сказаў, "добры, надзейны музэй".

Што было далей — ня ведаю, бо праф[эсар] Янкоўскі тады захварэў, і перапіска перарвалася. А шкада. Цяпер шкадую, што аддала — дала б Вам. Калі Вы з Фёдарам Міхайлавічам знаёмыя, то мо запытаецеся ў яго? У той часткі рукапісу ўсе мядовыя расьліны падзеленыя на групы: 1) фруктова-мядовыя; 2) дэкаратыўна-мядовыя; 3) гароднінa-мядовыя; 4) лекарска-мядовыя і г.д.

Усе назовы ў 5 мовах: беларускай, украінскай, расейскай, польскай і лацінскай. А можа, праф. Янкоўскі аддасьць гэты матэр'ял этнографам, якія пішуць манаграфію "Беларускае пчалярства"? Яны ўдвох былі ў мяне. Прыедуць яшчэ. Цудоўныя людзі. А мо таму цудоўныя, што нас зьвязывае супольнае замілаваньне?

Хацелася б яшчэ здабыць сілы і шмат каго пабачыць, у тым ліку і Вас, дарагая. Цалую сардэчна! *Л. Войцікава.*

295. МІКОЛУ ТАРАНДУ

25 студзеня 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Сардэчна дзякую за ліст, за весткі з майго Гродна. Так і зьявілася перад вачамі ня толькі маладосьць, навука ў гімназіі ў буд[ынку] Ст[эфана] Баторыя, але і дзяцінства — маё і нават майго бацькі... Той будынак за Фарай займаў архірэй. У яго была дачка майго ўзросту (тады 6–7 гадоў), мы з ёю гулялі, і я ў тым доме бывала. А на самым панадворку насупроць быў дом, дзе жылі мае дзяды (Сівіцкія) з дзяцьмі, г.зн. з маім бацькам і яго 2 братамі.

Ня ведаю, ці цяпер за Фарай ёсьць званіца? Тады была... І мой бацька, малы 4-гадовы Антось, са сваім старэйшым братам улезьлі на тую званіцу, і Антось сеў на вакно (на самым высокім паверсе) і зьвесіў ногі долу. Маці выйшла шукаць дзяцей на панадворку, неяк глянула ўгару і ўбачыла свайго Антося ў сьветлай кашульцы... Якой трэба было моцы духу, каб ня крыкнуць, не абазваць. Сама, як мага цішэй, улезла па сходах, ціхенька адчыніла дзьверы і схапіла малога моцна. Усё моўчкі. Расказывала мне, як мне было ўжо гадоў 7.

Вось як я з гэтым кутком гораду зьвязана моцна... У мяне ёсьць старыя-старыя гродзенскія паштоўкі. Хачу пераглядзець — можа, тая аптэка там ёсьць. Наогул, трэба гэтыя паштоўкі аддаць Вам. Ні мне, а тым больш маім, яны непатрэбныя...

Мастак М. Купава браў у мяне, каб перафатаграфаваць, здымак старога Гродна, яшчэ з пантонным мастом. Здымак мне прывёз, казаў, што копіі ўдаліся, рабіў фатограф-прафэсіянал. Я прасіла аб копіі для Вас. Але ня ведаю, чаму мае лісты да М. Купавы не даходзяць, мне іх вяртаюць... Наагул, пара ўжо зрабіць парадкі ў сваіх архівах і параздаваць — што-куды найбольш карысна.

Пішаце, што маеце запісаныя песьні. Помніце, я Вам казала, што ў дачкі

агранома Янкі Пачопкі ёсьць запісаныя на магнітафонную стужку сямейныя ўрачыстасьці — і дзень нараджэньня Янкі Пачопкі, і 50-годзьдзе шлюбу. Там і прамовы, і гульні, і песьні... Цікавы кусок фальклёру. Я аб гэтым казала Аляксею Міхайлавічу [Пяткевічу], але ён ня меў часу.

Вам не прыпамінала (ага, некалі казала Сяргею Астраўцу), бо я аб гэтых запісах даведалася ад старшай дачкі Янкі П[ачопкі], якая жыве на вёсцы, і яна прапанавала, калі б яе сястра ў Гродне ня мела ахвоты даць уступку перапісаць — самой з ёю скамунікавацца. Пасьля неяк мая перапіска з той Валянцінай Іванаўнай (старшая дачка агранома) спынілася. Аж пазаўчора я ад яе атрымала вельмі сардэчны ліст, і ўсё прыпомнілася... Калі Вас гэта цікавіць, то магу падаць адрас, а калі трэба, то і прыслаць аўтабіяграфію агранома. Яго жыцьцё, праца — кусок гісторыі.

У мяне для "Паходні" яшчэ адна прапанова — ідзе аб людзях таксама з гісторыі грамадзкага беларускага руху. Летась было 100 гадоў ад дня нараджэньня пэдагога Язэпа Шнаркевіча. Паміж іншым, як успамінаў М.М. Улашчык, Я. Шнаркевіч быў першым вучыцелем М.М. Улашчыка ў беларускай мове. З розных прычынаў не ўдалося ні мне, ні іншым гэты юбілей прапхнуць у друк... Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] мае і біяграфію Я.К. Шнаркевіча, і здымак.

А сёлета ў верасьні — 90-годзьдзе яго жонкі Надзеі Маркаўны. Гэта была жанчына цяжкай долі, але надзвычай моцнага духу, вытрываласьці, працавітасьці. Яна хварэла — 20 гадоў ляжала і, лежачы, здолела сабраць матэр'ялы, з якіх паўсталі альбомы: "Віленская Беларуская гімназія", "Радашкаўская Бел[аруская] гімн[азія] " і "Нясьвіжска-Клецкая Бел[аруская] гімн[азія] ".

Уся гэтая яе праца (Надзеі Маркаўны), яе перапіска, зьбіраньне матэр'ялаў адлюстравалася ў лістах да мяне. Я ня так часта магла да яе пайсьці — далёка было, і не заўсёды час быў, вось мы і перапісваліся з ёю аж да яе сьмерці ў маі 1974 г. Знаёмая я была са Шнаркевічамі 50 гадоў. Яе, Н.М., біяграфію маю дакладную. Пакуль была здаровая, працавала у ТБШ — Таварыстве беларускай школы, маю статут гэтага Т[аварыст]ва, блянкі — на просьбу адчыненьня беларускіх школаў, артыкул Надзеі Маркаўны "Школы Заходняй Беларусі" (машынапіс).

Можа, "Паходня" захоча пазнаёміцца з гэтым адрэзкам нашай гісторыі? Нешырока — хоць у сваім складзе... Я хацела да 90-годзьдзя Н.М. даць кароценькую вестку аб ёй у Бел[арускую] энцыкляпэдыю. Адмовілі — "скончыўся ліміт"... Так будзем пакрысе зьнікаць з людзкой памяці...

"Зьвязду" з артыкулам Бірылы[1] маю. Вельмі цікава, што рэдакцыя "Зьвязды" зможа Вам адказаць, што выясьніць. Зьбіралася з Менска група сьпевакоў прыехаць у Вільню з канцэртамі. Што будзе — ня ведаю... Пакуль што такія мяцеліцы, што сьвету не відаць. У нас — сьнегу па калена.

Усяго добрага Вам, цэламу Вашаму клюбу. Няхай жа "Паходня" ня гасьне.

Шчыра зычлівая *Л. Войцік.*

296. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

26 студзеня 1987 г. Вільня

Паважаны пане Адаме.

Мела надзею, што яшчэ зможаце да нас зайсьці, і ўдасца пагаварыць —

скончыць недагаворанае. А цяжкавата было сабраць думкі, калі некалькі асоб аднакасна пыталіся — кожны пра іншае...

Вось цяпер і мушу пісаць гэты ліст, хоць і хвалююся, што чытаць Вам будзе ня вельмі лёгка. За гэткую мазаніну выбачайце — страшное надвор'е. Другі дзень — мяцеліца, густы сьнег. Ні сну, ні раўнавагі.

Аркушы да бібліяграфіі перагледзела. Шмат трэба было выкрасьліць, выкінуць. Прапушчана адно — "Гісторыя беларускага адрыўнога календара" ("Ніва", Беласток). Пакуль што ня ведаю, ня помню ні № газэты, ні году[1]. Мо Лявон знойдзе, а не — прыйдзецца пытаць Ю. Туронка.

Па аркушах бачу, што і артыкулы ў часапісе "Саха" (аддзел Тав[арыст]ва "Пчала") улічаны — значыць, трэба даваць і ўсё, што друкавалася ў "Беларускай борці" пад маім прозьвішчам і шматлікімі ініцыяламі (ужывала самыя розныя варыянты, каб не было відаць, што супрацоўнікаў мала, і адзін чалавек шмат і на розныя тэмы піша).

Напісана — надрукавана. І тут у мяне пытаньне — як хутка гэта трэба зрабіць? Справа ў тым, што цяпер у мяне ўдома "Бел[арускай] борці" німа. Атрымаю яе праз месяц-паўтара. На Палесьсі арганізуюцца пчаляры. Малады пчаляр-энтузыяст, які летась скончыў у Кіеве Сельскагаспадарчую акадэмію і працуе цяпер пчаляром, загадчыкам пасекі — 116 вульляў (з ім мяне пазнаёміў менскі археоляг Генадзь Сагановіч[2] — яны аднавяскоўцы), гуртуе мясцовых пчаляроў. Думаюць стварыць Музэй пчалярства — зьбіраюць экспанаты, бядуюць, што ня маюць адпаведнага памяшканьня. Ёсьць там запушчаны касьцёл — не адрамантуюць у пару — зьнікне. Але як, праз каго дастаць яго пад музэй? Мо парадзіце?

Вось гэтаму пчаляру перадаю, як самаму адпаведнаму нашчадку, усю сваю веду аб працы Тав[арыст]ва "Пчала". Пакуль што толькі дзеля перафатаграфаваньня, перапісаньня ўсяго, што яго і яго сяброў цікавіць. Пазаўчора прыяжджаў са сваім фатографам. Цэлы дзень падбіралі матэр'ялы, фатаграфавалі. Нарэшці я ім запрапанавала, каб узялі, што трэба, з сабой — на мейсцы ў сябе фатограф мае лябараторыю, адпаведныя варункі, і зробіць здымкі больш якасныя. Матэр'ялы даю ня першы раз... Пчаляр (Мікола Папека[3]) робіць падрабязны сьпісак усяго, што бярэ: падпісываецца, з датай і г.д.

Што такое Т[аварыст]ва "Пчала", "Бел[аруская] борць" — Вы пытаеце. Ведаеце, каб ня гэты Мікола-пчаляр, як я яго называю, я і ня ведала б, што з пчалярскімі матэр'яламі рабіць. Даць у музэй які-небудзь, дзе гэта нікога не цікавіць? Кінуць у глыбокія фонды? А калі хто-небудзь прысвоіць, выкарыстае ды яшчэ і чужой мовай падасьць за сваё? Так што я рада, вельмі рада з сувязі з Палесьсем, з яго пчалярамі. Тым больш, што і ва мне па прадзеду Ігн. Кулакоўскім ёсьць капелька палескай крыві. З гэтага боку ўсё добра, але бяда што з выбарам сваіх твораў з "Бел[арускай] борці" мушу пачакаць.

Думала — усё, але прыпомніла, што ў нас пачалася (тады, як Вы былі) гутарка, як выдавалася "Бел[аруская] борць", хто яе фактычна рабіў? Я адказала, што я сама. І цяпер кажу тое самае, толькі шырэй тлумачу. Я сама часапісь складала-укладала, спраўджала рукапісы, вяла паштовую скрынку — перапіску з падпісчыкамі, рабіла карэкту, здавала ў друк, займалася экспэдыцыяй...

Але ж былі і супрацоўнікі. Самы галоўны, самы дзейны Мікалай Манцэвіч — гал[оўны] бугальтар Бел[арускага] каап[эратыўнага] банку. Пісаў добрыя артыкулы, падпісываў: *М.М.*, *М. М-іч*. Другім быў мой муж Антон Войцік[4], які

і ў "Борць" пісаў, і ў "Заранку" рабіў пераклады з украінскай і расейскай моваў. Можа, і А. Войціка даць у бібліяграфічны слоўнік? Я маю яго біяграфію, маю сьпісак яго працаў у "Борці", у "Заранцы". Што Вы на гэта?

З М. Манцэвічам — горш. Яго артыкулы ў "Бел[арускай] борці" сабраць можна, але біяграфіі — ня маю. Нават ня ведаю, скуль родам. Пасьля яго засталася яго выхаванка, я дастала яе тэлефон, хацела даведацца, дзе ён пахаваны, ці ёсьць помнік, што з яго бібліятэкай-спадчынай? Але дазваніцца не змагла. Магчыма, у віл[енскіх] архівах ёсьць якія сьляды. Ён пасьля "Бел[арускай] борці" працаваў кантралёрам у Літве. Але хто будзе ў архівах такіх вестак шукаць? Німа каму, ніхто ў гэтым не зацікаўлены...

Яшчэ адно — чаму Вы казалі: "Ці ж Ганна Іванаўна С [урмач] *яшчэ* працуе?". А чаму? Ці ж з ёю *што* сталася? Мелася не працаваць? Як прыяжджала — зьбірала весткі аб У. Фальскім, гаварылі і на іншыя тэмы. Пасьля прыслала павіншаваньне з Новым годам і яшчэ аб Фальскім пыталася. А вось на мой апошні ліст адказу ня маю. І гэта непакоіць.

Забылася Вам сказаць, што ў Л.І. Збралевіч ёсьць шмат-шмат маіх матэр'ялаў-машынапісаў і нават рукапісаў, таксама і гродзенскае выданьне — "Колас беларускай нівы". Але хопіць, а то яшчэ што прыпомню, пішу штораз горш. Прыкра, што так бязладна напісала, але разбалелася галава... Мушу сьпешна легчы.

Маю надзею, што адкажаце. Каб хоць гэты ліст да Вас дайшоў. Ня ведаю, што думаць, але мае лісты да менскіх адрасатаў не даходзяць.

Усяго найлепшага! Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

297. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

3 лютага 1987 г.

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Як Вам чытаюцца мае ўспаміны[1]? Мо патрэбныя нейкія камэнтарыі і дапаўненьні? Пытайцеся, пакуль яшчэ неяк трымаюся.

Пісала ў "Паходню" — прапанавала зацікавіцца дзейнасьцю сям'і Шнаркевічаў[2], г.зн. дзейнасьцю ў Заходняй Беларусі ня толькі палітычнай. Адказу ня маю.

Нэрвуе, што амаль зусім немагчыма карэспандаваць з Менскам. Лісты мае не даходзяць да адрасатаў. Дзе яны дзяюцца — ня ведаю...

Ці атрымліваеце "Ніву"? Да нас добра даходзіць. З прыемнасьцю гляджу на ілюстрацыі — на здымкі народных хораў. Такія свойскія твары — у хустачках, а не ў какошніках...

Ня буду больш пісаць, а то 2–3 словы — добра, а пасьля — ізноў каракулі. Вельмі дрэнна сплю, і гэта моцна адбіваецца на цэлым арганізме.

Усяго добрага Вам, сям'і, знаёмым. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

298. ЯЎГЕНУ ПЕТРАШЭВІЧУ

6 лютага 1987 г. Вільня

Паважаны Яўген Канстанцінавіч.

І я, і Слаўка ўдзячныя Вам за памяць і навагоднія пажаданьні. Хоць спозьне-

на, але ўзаемна шлем Вам усяго найлепшага ў Новым годзе, у хатнім жыцьці, у працы і ва ўсіх задумах.

Я была б вельмі ўдзячная за вестку аб здароўі Аляксандра Мікалаевіча [Белакоза]. Даўна ня маю ад яго ні слова. Пісаў з Гродна, са шпіталя, але гэта ў самым пачатку. Калі ласка — напішыце. Толькі зьвярніце ўвагу на адрас на капэрце, бо я лісты атрымліваю на адрас дачкі. Ад мяне німа каму хадзіць па іх.

А я Вас з прыемнасьцю бачыла на здымках у беластоцкай "Ніве", дзе Вы сярод групы дзяцей-экскурсантаў у Польшчы.

А мае "Каласкі" ня толькі для дзяцей. Ёсьць у іх і паважнейшая тэма, толькі выдавецтва ня вельмі ўдала матэр'ялы зьмясьціла. Шмат што пераблытана — не туды, дзе трэба, зьмешчана.

Шчыра зычлівыя — *Л. Войцікава* і *Слаўка*.

299. АРСЕНЮ ЛІСУ

8 лютага 1987 г. Вільня

Дарагі Арсень Сяргеевіч.

Дзякую за навагоднія віншаваньні — ад сябе і маіх. Адразу даю адказ на Ваш ліст з 1 студзеня. Напісала і — зьдзівілася: няўжо я так доўга Вам не адказывала, цэлы месяц. Вельмі шмат было віншавальных лістоў — трэба было падзякаваць тым, каго сама першая не павіншавала. Так час сыходзіць, а яшчэ і цяпер ня ўсё напісана, што трэба. А чуюся не найлепш...

Надвор'е нядрэннае, бо суха і ціха, але ж у нас вялікія маразы — па –20, –30. Днём часам падымецца да –15-ці. Баляць ногі, асабліва ўночы круціць, ня сплю і пасьля адсыпаю днём. А часам і зусім не ўстаю.

Нейкі час брала кожны дзень асьпірыну, але ад яе кроў робіцца рэдкай, і пачынаюцца крыватокі з носа. Значыцца, лячуся ад крыватокаў — зёлкамі. Вось так час і праходзіць.

А яшчэ госьці... госьці... Калі 2–3 чалавекі, то яшчэ нічога, але калі 7 і болей, то тады чуюся выціснутая, як цытрына.

Арсень Сяргеевіч, на Ваша запытаньне аб крыптоніме *К.Р.* нічога не магу сказаць, бо я ў пачатку 30-х гадоў не працавала. Апошні год маёй працы — гэта быў 1928, і крыху яшчэ 1929. Так што я ўжо ні гэтай газэты, ні гэтага рэдактара ня ведала.

Пачала ліст з таго, што шмат лістоў, не на ўсе яшчэ адказала. Аж тут новая неспадзяванка. Прыйшоў Лявон, які пасьля працы заходзіць на Архітэкту па пошту, і яшчэ 9 лістоў прынёс...

Паміж гэтымі лістамі ёсьць і з Маладзечна, ад Генадзя Аляксандравіча К[аханоўска]га. Ён мне паміж іншым піша, што намаўляе Вас напісаць артыкул у энцыкл[япэдыю] пра Надзею Маркаўну [Шнаркевіч] як зьбіральніцу фальклёру. А можа, ня маеце яе біяграфіі? Я маю дакладную. Калі трэба — пішыце, прышлю. Яна сёлета ўвосені скончыла б 90 гадоў...

Даўно ўжо зьбіраюся Вас запытацца, што там дзеецца са Ст. Фёд. Цярохіным? Ці выйшла з друку яго манаграфія "Беларускае пчалярства"? Даўгі час пісаў, прыяджаў, а пасьля раптам усё спынілася. Ці ў гэтым я вінаватая? Ці нейкія іншыя прычыны?

Цяпер на Палесьсі, магчыма, у Пружанах будзе арганізоўвацца Музэй пчалярства. Ужо ёсьць сабрана нямала цікавых экспанатаў. Сувязь з такім знаўцам

беларускага пчалярства для маладых арганізатараў музэю была б вельмі карысная. Але ж не магу ім даць адрасу, калі і сама ня ведаю, што думаць.

Бяруся пакрысе сартаваць свае архівы лістоў. Ёсьць такія, якія трэба прапанаваць у Архіў-музэй пад апеку Г. Ів. Сурмач. Але ёсьць і даволі маіх асабістых — ліставаньне з далёкімі сваякамі. Гэтыя пойдуць у печку. Вядома, перачытаць-пераглядзець мне іх раней трэба. Вось і ўзялася — праглянула сотні лістоў маёй сваячкі, што жыла і памёрла ў Беластоку. Яна некалькі гадоў жыла ў Вільні, і тады мы часта бачыліся. Пасьля яна з сям'ёй выехала ў Беласток, а мы перабраліся сюды — у лес, і згубіліся на доўгія гады.

І якое было маё зьдзіўленьне, калі я ў 1969 г. атрымала ад яе вестку. Яна мне пісала: трапіла ў яе рукі беластоцкая "Ніва" з маім артыкулам-успамінам аб "Заранцы", а рэдактар "Нівы" Г. Ваўкавыцкі[1] і мая сваячка жылі ў адным блёку... Вось ад Ваўкавыцкага яна дастала мой адрас і паслала яго ў Варшаву, дзе жыло шмат маіх сваякоў, з якімі сувязь таксама абарвалася. А тыя сваякі (вельмі далёкія, дзясятая вада на кісялі) з беларускімі справамі ня мелі нічога супольнага, апрача аднаго доктара-мэдыка, які, як вучань Гродзенскай гімназіі, у нас жыў і шмат мне памагаў у працы з Беларускім гуртком. То пасланць яго кудынебудзь трэба было, то перапісаць нейкія паперкі, бо ён вельмі прыгожа пісаў. Вось так праз "Ніву" навязаліся парваныя зносіны.

Сяньня ў мяне сумны дзень — дзень нараджэньня с.п. Тоніка. Каб жыў, меў бы 68 гадоў. А ўспомніць няма з кім...

Думала яшчэ шмат што зрабіць і — не магу. Разбалелася галава. Трэба легчы і ставіць гарчычнік на патыліцу.

Усяго добрага Вам і сям'і. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

300. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

9 лютага 1987 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Хачу адказаць Вам на апошні ліст па магчымасьці як найбольш зьмястоўна. Ці змагу? Ня ведаю. Вельмі апошні час баліць галава і наагул дрэнна чуюся. Мо гэта дзеіць пераход да вясны, а можа, проста сілы ўжо не хапае, ды і непрыемнасьцяў у мяне нямала.

Найперш — пра свае ўспаміны. Не, 1927 г.— гэта не канец. У 1928 г. пачынаецца другі этап. Гэта ўжо не рознаякая раскіданая праца, а 10 гадоў існаваньня Беларускага каапэратыўнага пчалярскага т[аварыст]ва "Пчала" і яго органу "Бел[аруская] борць". Якраз аб гэтай арганізацыі дагэтуль ніхто нічога ня ведае і, больш таго, ведаць ня хоча. А "Пчала" існавала і працавала інтэнсіўна даўжэй, чым іншыя заходне-беларускія арганізацыі. Але вялі яе (і арганізавалі) не *вялікія дзеячы*, а людзі сьціплыя, маленькія. І вялі не палітыку, а "нейкае там пчалярства".

Так мне адзін з дзеячоў сказаў: "Каго можа цікавіць нейкае там пчалярства?" А што гэта была работа з вёскай, з сялянствам, гэта не даходзіла да "вялікіх" людзей. У мяне захавалася і "Бел[аруская] борць", і ўсе да дробязяў архівы "Пчалы". І гісторыя арганізацыі напісана падрабязная.

Гадоў 10 таму, калі ня больш, меўся ў Менску выйсьці нейкі альманах. Мне А. Мальдзіс запрапанаваў даць нешта з маіх успамінаў. Я падумала, што найбольш бяскрыўднымі будуць якраз "Пчала" і "Борць". А. М[альдзі]с згадзіўся. Піша: прышліце рукапіс, перадрукую на машынцы, прыеду — пагаворым. Так

і было. Але альманах наагул ня выйшаў.

Пасьля пэўнага часу Беласток просіць прыслаць у каляндар што пра "Бел[арускую] борць". Я адказала: "Борць" без "Пчалы" ня мае сэнсу — адно з другім зьвязанае. Просяць: прышліце цэласьць. Я паслала. Атрымалі. Але ў той год было 100-годзьдзе І. Луцкевіча. Лявон даў свой матэр'ял. Зьмясьцілі. На "Пчалу" ўжо мейсца не было.

На наступны год Лявон даў мат[эр'ял] "Базыльянскія муры". М. Гайдук[1] піша: "Баз[ыльянскія] муры" пойдуць, а пані Людвіка пачакае. Тады я сапраўды заззлавала і напісала, каб "Пчалу" кінуў у печку. "Пчала" мела сяброў, а "Борць" — падпісчыкаў пад Беластокам, і мне цікава было навязаць ізноў праз каляндар з імі сувязь, а чым далей, тым надзей застаць каго менш і менш. Вось такая гісторыя.

А мне так шкада было гэтай 10-гадовай працы, сувязі з пчалярамі, карэспандэнцыі з імі! Я ж праз усе гады была старшынёй і рэдактарам "Борці". Столькі ўлажыла ня толькі сілы, але і душы.

Затое цяпер маю поўнае задаволеньне. Пазнаёмілі мяне з маладым пчаляром-энтузыястам з Палесься. Ён летась скончыў у Кіеве Сельскагаспадарчую акадэмію. Ужо працуе на Палесьсі лясным пчаляром на пасецы ў 116 вульлёў. Гуртуе мясцовых пчаляроў — зьбіраюць экспанаты, каб арганізаваць Музэй пчалярства. Мы ўжо добра знаёмыя. Можна сказаць, лічу яго, Міколу-пчаляра, сваім нашчадкам у гэтай справе. Піша, прыяжджае, прывозіць новых сяброў. І гэта для мяне самыя шчасьлівыя хвіліны. "Пчала" не памрэ.

Кажаце, мала ведама аб Смолічу? Абы хто хацеў — матэр'ялы ёсьць, шмат яго лістоў, шчырых, сардэчных (называў мяне "сястронкай"), ды і біяграфія з пералічэньнем яго геаграфічных твораў і яго здымкі. З менскіх дзеячаў маю біяграфію Усевалада Фальскага. А што я мала пра людзей пісала? Ды жа часу ў мяне не было на гэта. Сябры ў камітэце ды ў іншых арганізацыях былі, але на паседжаньнях-гутарках-вечарынах, а фактычная работа-выкананьне — на мне, бо я больш нідзе не працавала. А ўсе іншыя мелі "пасады".

Калі адказываю Вам на пытаньне, калі мы пажаніліся з Ф. Ш[антырам], то лічу, што Вы найбольш захаваеце весткі для сябе, а не для публікацыі. Людзі не зразумеюць ні ваеннага часу, ні ваенных абставінаў...

Пажаніліся мы ў 1917 г. і дамовіліся з кс. Гадлеўскім[2] аб шлюбе, але ў мяне і ў Ф[абія]на не хапала патрэбных дакумэнтаў — пры розных пераездах з мейсца на мейсца загубілася мая мэтрыка, а як тады было здабыць з Украіны? Калі там і знаёмага ўжо нікога не было? І ці касьцёл захаваў дакумэнты? А нават мой пашпарт разам з маміным знаходзіўся ў Пецярбургу, бо мама мусіла нанава вырабіць сабе пэнсію па мужу і надалей, і атрымаць залеглую за 3 гады. Амаль тое самае ў Ф. Ш[антыра] — ён мусіў дастаць дакумэнты са Слуцка. Так час цягнуўся.

На маё вялікае зьдзіўленьне (бо ж ведала пагляды Ф. Ш[анты]ра), ён прыехаў, мяне не папераджаючы, да маёй мамы — "прасіць маёй рукі". А мама была дзіўным чалавекам. Звычайна, мамы сваіх дачок хваляць аж занадта, а мая мама адказала: "Добра падумайце — яна невясёлая і фанатычка працы, у яе німа часу на асабістае жыцьцё". Але яго гэта не зьнеахвоціла. Больш насьцярожывала неаднолькавае паходжаньне ды іншае выхаваньне — у іншым асяродзьдзі. Але і гэта перамалолася. Жылі па-ваеннаму — асобна, але лісты... лісты... спатканьні. Усё было добра. Хоць і дробных непаразуменьняў хапала.

Але прыйшла да мяне бяда-гора — захварэла мама... цяжка. Чака-

ла апэрацыі. А ў Менску — голад, бяда, ды ў мяне там жывога духу блізкага не было. Адна з горам, як палец. Мама... Вы самі нядаўна страцілі бацьку, ведаеце, што гэта значыць — які неспакой, які боль. А ў мяне ж нікога на сьвеце — ні сястры, ні брата... І тут у мяне адна думка — ехаць, ехаць у Сакольшчыну — да сябе, калі апэрацыя — то ў Гродне, дзе знаёмы хірург. У Сакольшчыне, а гэта ж блізка Гродна,— маміна сястра, свой фальварак (дзед мой ужо памёр), у Гродне — маміна стрыечная сястра, усё ж ня буду адна...

Вось так і пастанавілі. Ф. Ш[антыр] кажа: як толькі змагу — прыеду, калі ня проста, то праз Украіну. Так і рассталіся — назаўсёды. А я паехала на даўгое цярпеньне. На самы Новы 1919 год павязьлі маму ў Гродна на апэрацыю. Ляжала ў шпіталі 3 месяцы, нават 4. Я аб сваім асабістым жыцьці і ня думала. У 1919 г. радзіўся мой сынок, а праз пару месяцаў пасьля даведалася з газэт аб трагічнай сьмерці Ф[абія]на... Вось мая трагедыя. Ці варта яе чапаць?

Сёлета 100 год ад нараджэньня Ф. Ш[антыра], а кніжку яго і аб ім адлажылі на наступны год. Цяпер усё так робіцца. Я да кніжкі дала ўсе лісты. Што з іх прайшло — ня ведаю, але Я. Саламевіч лістоў мне не вярнуў...

Я. Саламевіч узяўся злажыць і маю кніжку. Я, хоць ня вельмі верыла, што з гэтага нешта будзе, матэр'ялы сабрала і дала. Прыслаў мне плян — ужо гатовы, на тым і скончыцца, мусі, бо, здаецца, ніякаму выдавецтву не прапанаваў. Мае шмат іншай паважнейшай і важнейшай работы...

Вось яго новай задумы — энцыкляпэдыі М. Багдановіча — крыху баюся. Ніхто так не аброс легендамі, і то самымі бессэнсоўнымі, як Максім Б. Ці здолее Я. С [аламевіч] адсеяць праўду ад няпраўды?

Аляксей Міхайлавіч! Даруйце за блытаніну з карткамі, за немагчымы почырк ды і, можа, за лішнюю непатрэбную шчырасьць. Я фактычна падзяліцца думкамі ці ўспамінамі ня маю з кім абсалютна...

Сёлета мінула 11 гадоў ад сьмерці сына. З ім то хоць аб яго дзяцінстве ўспомніць было можна. А цяпер каго гэта абходзіць — што я думаю, што я перажываю...

Прачытала яшчэ раз Ваш ліст. Яшчэ на пару пытаньняў адкажу. Верш, ці лепш імпрэсія "Нёману" друкавалася ў "Вольнай Беларусі", а пасьля і ў зборніку літ[аратурным] "Вольнай Беларусі". "Гісторыі беларускага адрыўнога календара" ёсьць у мяне машынапіс, а ў 1976 годзе друкавалася яна ў беластоцкай "Ніве". Адрыўныя календары друкаваліся год у год — ад 1927 г. да 1938. Выдавала Выдавецкае т[аварыст]ва.

Здаецца — усё. Мо будзе які ад Вас адказ? Вось якія мае сілы: пасядзела, напісала і лажуся.

Усяго найлепшага! *Л. Войцікава.*

301. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

12 лютага 1987 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Учора атрымала ад Вас паштоўку. Дзякую. Калі б дачакала лета — буду рада Вас пабачыць. Але ня думаю, каб Вам зрабіла прыемнасьць — маляваць мяне з натуры. Вельмі ўжо я страшная — адныя маршчыны, вочы запаўшыя... Ну, але як хочаце. Вашая справа.

Летась адзін з абсальвэнтаў Віцебскага інстытуту мастацтва надумаў

на дыплёмную работу зрабіць мой партрэт. Як я ні адмаўлялася, пярэчыла — паставіў на сваім. Прыяжджаў, маляваў... Пасьля яго кіраўнік пісаў мне, што выйшла з таго адна з цікавейшых дыплёмных работ. Падобна, і вісіць там у інстытуце. Вельмі хацелася мне пабачыць фотакопію. Але мастака забралі ў войска, і я фотакопіі не дастала.

Пытаецеся аб Зыгмунце Абрамовічы? Я і сама хацела б ведаць, што з ім сталася. Ужо 3 гады ня маю ад яго весткі. Пісала да яго жонкі — не адказала. Калі б памёр, нічога дзіўнага не было б — ён старэйшы на 3 месяцы ад мяне. Але ж ведаць, што памёр, і калі гэта сталася — трэба? Адрас Вам пасылаю, а мо Вы якой праўды даб'ецеся. Мо каго знаёмага ў Польшчы маеце?

Зыгмунт Аб[рамові]ч меў дачку і сына, але я іх адрасу ня ведаю. Мне пісалі, што нехта з Познані быў у яго і запісываў ўспаміны. Але калі гэта было, у якім годзе — так я і не даведалася. А мы з Зыгмунтам пазнаёміліся, маючы па 17 гадоў, і пасьля амаль праз усё жыцьцё (з перарывамі) карэспандавалі.

Як у Вас зіма? У нас ужо маразы мінулі. Сяньня маем +3. Сьнегу вельмі шмат. Успамінаеце аб 95-годзьдзі? А ці я яго дачакаю? Гэта ж яшчэ амаль 8 месяцаў — тое самае, што для маладога 8 гадоў. Ды і чуюся блага, часта ляжу. Гэта ўсё — нармальна. А як Вам жывецца-працуецца? Маеце далейшыя апрацоўкі паштовак? Які горад цяпер на мэце? Знойдзеце час — пішыце.

Усяго найлепшага! Ад мяне і маіх. *Л.В.*

302. МІХАСЮ ВЕРАЦІЛУ

12 лютага 1987 г. Вільня

Дарагі Міхась Уладзіміравіч.

Дзякую за памяць, за прывітаньне з Н[овым] годам. Хоць так спозьнена, але шчыра і я вітаю Вас і зычу ўсяго самага найлепшага, здароўя і плёну ва ўсялякай працы... Цяжка мне ўжо і пішацца, і думаецца. Цяжка даецца гэты 95 год жыцьця...

Усяго Вам добрага. *Л. Войцікава з сям'ёй.*

303. АРСЕНЮ ЛІСУ

14 лютага 1987 г. Вільня

Дарагі Арсень Сяргеевіч.

Учора атрымала Ваш ліст. Дзякую. Нічога не разумею, адкуль узяліся такія цыфры? Пішаце: выйшла *33 нумары* — на *34-м* газ[эта] была зачынена, рэдакцыя арыштавана...

"Сялянскай праўды"[1] выйшла 25 нумароў. 26-ы сканфіскаваны за карэспандэнцыю, і адначасна з газэтай рэдактар забраны на Лукішкі — проста з друкарні...

Аб судзе і г.д. маю ня толькі свае ўспаміны, але і тагачасныя лісты ў справе арышту, суду і г.д., якія я пісала да братоў Антона В [ойціка]. Ён гэтыя лісты ад братоў забраў, перахаваў, а цяпер яны ў мяне. Так што ўсе весткі — ня толькі з пазьнейшых успамінаў, але насьвежа пісаныя — падзея за падзеяй.

Скуль бярэ Ів. Уладз[іміравіч Саламевіч] "адбіткі" газэтаў (№, год і назва газэты)? *Як такія* газэты маглі прайсьці праз цэнзуру? А. Войцік у адным

мейсцы (у хроніцы) назв[аны] рэдактарам “Сялянскай долі”[2], якой ён ніколі не падпісываў, у другім — рэд[актарам] “Сялянскай праўды”. Пабачыла ў той жа хроніцы, што ў астрогу быў пакараны і на працягу *10 тыдняў* пазбаўлены пачак і г.д.

Пакараны быў — праўда, але на 2 тыдні. Маю яго ліст у гэтай справе, піша: кара зьнятая і г.д. Ліст-картка са штэмпэлем пракуратуры. Аным словам — нейкая пародыя, фальшыўка.

Другая адбітка — горшая... Быццам адрыўны каляндар на 1926 г. выдала Навуковае т[аварыст]ва — на добрай паперы, вялікі фармат. Сканфіскаваны за 46 картак — пералічаныя тыя штрафныя карткі. І каляндар быў выданы 2 разы... Гэта як быццам адкрытая крытыка цэнзуры? І гэтакі № газэты праз цэнзуру прайшоў? Я ж тады працавала... і ня ведала б?

Што ж выходзіць, на той самы год было выдана 2 календары адначасна? Бо той, што *сапраўды* быў выданы жменькай нашай сьціплых шэрых людзей, то гісторыю яго маю з карткамі наклеенымі. І “Гісторыя першага беларускага адрыўнога календара” была надрукавана ў беластоцкай “Ніве” ў сьнежні 1976 г. І ў мяне гэты машынапіс ёсьць, і ў Менску — у Новіка-Пеюна і Л.І. Збралевіч. А дзе ж сьлед таго, другога?

І пасьля такой канфіскацыі календара Навуковае т[аварыст]ва спакойна працавала сабе далей і ў 30-я гады? І ніхто ня быў пацягнуты да адказнасьці? Дзіўна... вельмі ўсё гэта дзіўна і неверагодна. Вось гэта мяне і знэрвавала, а на маю хворую і такую старую галаву хіба не найлепшы лек...

Яшчэ адно мушу выясьніць — тыя псэўдонімы, аб якіх пішаце. *А-н, А-на* — зусім ня с.п. Антона В [ойціка]. Ён у той час такіх артыкулаў ня мог пісаць. Не хапіла б на гэта ні разьвіцьця, ні ведаў. Найбольш апрацоўваў карэспандэнцыі... Пасьля, ужо ў 1927 г. і далей, выйшаўшы з астрогу, пачаў рабіць пераклады з украінскай і расейскай моваў для “Заранкі”. А далей пісаў артыкулы па садаўніцтву для “Б[еларускай] борці” і з польскай мовы артыкулы па каапэрацыі — для каапэратыўных курсаў.

З “Бел[арускай] борці” ўсе свае артыкулы выпісала, але трэба пастарацца перапісаць больш чытэльна, калі трапіцца лепшы дзень і рука будзе больш паслушнай. Знайшла яшчэ пару драбніц, якія не ўвайшлі ў аркушы, апрацаваныя супрацоўнікамі А. Мальдзіса. Гэта: тая самая “Гісторыя календара”, пераклад з В. Біянкі “Лясныя хаткі” (друк[аваны] ў “Заранцы”), “Старое Гродна”.

Учора і сяньня ў нас у гасьцях жонка Вінцука Вячоркі — Арына[3]. Ад яе ведаю, што ў праекце — кніжка па гісторыі навукі да 1917 г. Пыталася, ці мог бы хто напісаць нешта з гісторыі пчалярства. У мяне ёсьць (друк[аваны] ў “Бел[арускай] борці”) кароткі нарыс з гісторыі пчалярства (ад часу яшчэ перад нашай эрай). Сяньня прачытала — здаецца, нічога, даволі важна. Магла б даць. Але, можа, ня варта перабіваць дарогі С.Ф. Цярохіну? Можа, ён гэта зробіць? Дзіўныя яго адносіны — ні свайго “Паляваньня” мне не прыслаў, ні на пасланыя “Каласкі” не адгукнуўся... А “Каласкі” яму перадалі проста ў рукі, так што атрымаў напэўна. Відаць, нешта перабегла дарогу.

Усяго найлепшага, і даруйце, што цяжка будзе чытаць. І сяньня ў мяне дрэнны дзень.

Усёй Вашай сямейцы прывітаньне. *Л. Войцікава.*

304. МІКОЛУ ТАРАНДУ

21 лютага1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст. Не адразу адказала, але ўвесь час помню аб магнітафоннай запісі "ўрачыстасьцяў" Янкі Пачопкі. У мяне на нейкі час спынілася перапіска з другой дачкой Я. Пачопкі, якая жыве на вёсцы, а я баялася, што тая гродзенская можа чаму-небудзь адмовіцца. Цяпер атрымала ад Валянціны Іванаўны з вёскі вельмі сардэчны ліст і ўпэўненая, што яна просьбу тае сястры падтрымае. Адрас пасылаю і раджу пасьпяшацца — людзі старэюць і зьнікаюць са сьвету...

Наагул, матэрыялы аб аграному Я. П[ачопку] Вам варта мець. У мяне ёсьць яго аўтабіяграфія, напісаная на маю просьбу. Трэба яе перадрукаваць на машынцы. У яго дачкі Валянціны ёсьць шмат здымкаў бацькі, а ў мяне ёсьць здымак яго магілы і помніка. Варта Вам гэты здымак перафатаграфаваць, а і здымак (арыгінал) старажытнага Гродна — таксама.

Наагул, рада буду, калі прыедзеце. Можа, яшчэ што захочаце сфатаграфаваць ці перадрукаваць. Што будзе з маёй спадчынай? Ня ведаю...

У мяне ёсьць старыя матэр'ялы і нататкі з часоў ГГБМ — Гродзенскага гуртка і іншыя — аж з дзяцінства... Лісты (іх у мяне каля 6 тысяч) збольшага пойдуць у менскі Архіў-музэй, з якім я ўвесь час у кантакце, і з дырэктарам знаёмая.

Ужо час аб усім падумаць і ўсяму знайсьці мейсца. Каб сапраўды тое, што праз усё жыцьцё сабрала і перахавала, не змарнавалася. Што да Шнаркевічаў — ёсьць іх нашчадак, пляменнік самога Язэпа Канстанцінавіча Шнаркевіча. Жыве з сям'ёй яшчэ ў дзядзькавым доме, але ўжо апошняе лета, бо гэты дом зносяць — забіраюць у іх дом і сад, каб на гэтым пляцы нешта будаваць.

Альбом "Віленская Беларуская гімназія" пакуль што ў мяне, а гэтыя ў таго пляменьніка — Янкі Тулейкі[1]. У яго я б Вам радзіла быць і дзеля іншай прычыны, і таксама з фатографам. Янка Тулейка артыстычна тчэ паяскі (кароткія закладкі) з беларускімі ўзорамі. У яго цэлы альбом. Розныя ўзоры, розныя колеры.

Цудоўны матэр'ял, напрыклад, пра паштоўкі — якіх нам так не хапае. Я ўжо гадамі стараюся зацікавіць гэтай справай беларускіх мастакоў, але дарэмна. І такое багацьце астаецца нявыкарыстаным. А як надыйдзе якое сьвята, то нават ня маем віншавальных паштовак з беларускімі матывамі ды надпісамі. Часам зробяць адну-дзьве — "ляпы" мала эстэтычныя, а то бяздушна шлюць расейскія. Як жа інакш у літоўцаў! Пазайздросьціць можна...

Як добра, што Вам удалося давясьці да людзей спатканьні з М.М. Улашчыкам, і што Вы ў кантакце з яго сынам. Цікава мне, ці сын ведае пра бацькавую задуму — апрацаваць Мартыралёгію беларускага народу? Г[эта] значыць — бежанства беларускіх сялянаў у 1-ю сусьветную вайну. У гэтай справе я мелася с.п. Мікалаю Мікалаевічу памагаць зьбіраць матэр'ялы аб былых бежанцах... Асталося ў мяне некалькі лістоў М. Улашчыка і некалькі копіяў перасланых яму ўспамінаў бежанцаў. І прыяжджаў раз да мяне — пазнаёміцца. Але з бежанскай справы нічога не атрымалася. Менская пэрыёдыка не зацікавілася, і збор успамінаў былых бежанцаў мы палічылі непатрэбным... На тым і скончылася. Апошнюю віншавальную паштоўку маю ад М.М. Улашчыка з 1985 году.

Хіба, трэба на гэтым скончыць — бо ўжо ня пішацца. А ўсяго толькі другі ліст сяньня... З сумам успамінаю, што яшчэ ня так даўна магла і 5–6 адзін за другім напісаць. А цяпер часам і ляжаць прыходзіцца.

Усяго Вам найлепшага! Усім сябрам "Паходні" сардэчнае прывітаньне. Шчыра зычлівая і Гродну майму адданая — *Л. Сівіцкая-Войцік.* Аб Гродне — другім разам...

305. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

24 лютага 1987 г. Вільня

Паважаны пане Адаме.

Учора атрымала Ваш ліст — дзякую. Нешта мне здаецца, што ў міжчасе я да Вас пісала. Пыталася, ці студэнт Менскай кансэрваторыі Мікола Стома аддаў Вам той аркуш з запісамі маіх твораў, якія Вы мне далі (2 экз.) — з выкрэсьліваньнямі, памылкова туды ўнесенымі, і адначасна пыталася, што рабіць з тымі аркушамі, што я цяпер запоўніла? Ці, не чакаючы, пераслаць Вам іх праз пошту, ці пачакаць нейкай аказіі? Мо хто прыедзе... Я ўжо ўсё зрабіла (у 2 экз.— адзін для сябе).

Унясла і тое з "Нівы" беластоцкай ("Ніву" тую маю), і што не заўважана ў "Заранцы", ня ўзятае пад увагу "Старое Гродна" — з альманаху "Краю мой — Нёман", і з нікому няведамага "Гаспадарчага дадатку" да грамадаўскіх газэтаў. І, зразумела, з "Беларускай борці".

Здаецца, усё, як трэба. Год, нумар, старонка і г.д.— і самыя розныя крыптонімы, самой у іх можна заблудзіцца. Але ж нельга было паказаць, што адзін чалавек піша на самыя розныя тэмы...

Думаю, што зрабіла ўсё, як трэба. Яшчэ ня ўсе прывычкі доўгага майго рэдактарства забыліся. Вось толькі без патрэбы пачала з "Коласа беларускай нівы", бо Вы ўжо гэта самі зрабілі. Але я недзе Вашую картку разам з лістом так схавала, што не змагла знайсьці, і ня помню яе (карткі) зьместу. Сяньня і ліст, і картку знайшла. Мне трэба было пераслаць адну інфармацыю ў Менск, у Музэй-архіў, а дзеля гэтага прачытаць 55 лістоў свайго варшаўскага карэспандэнта. Чытала і рабіла паметкі лежачы (што мне ў апошні час здараецца), і тады Ваш ліст папаў у тыя... А сяньня ўсё прыпомнілася і стала на свае мейсцы. Так што з "Коласу беларускай нівы" мае дробязі прыйдзецца Вам выкрасьліць.

Яшчэ адно. Я ўнясла зьмешчаны ў "Заранцы" пераклад твору Віталя Біянкі "Лясныя хаткі" і зазначыла, што гэты пераклад быў выданы кніжачкай. Але году выданьня ня помню, а кніжачкі ў сябе ня маю. Праўдападобна, яна разам з іншымі маімі матэр'яламі — у папцы ў Янкі Саламевіча. Ён задумаў зладжыць другую (пасьля "Каласкоў") маю кніжку. Мела складацца з вершаў, імпрэсіяў, перакладаў.

Я дала ў папцы — усё разам. Іван Уладзіміравіч праслаў зроблены ім плян будучай кніжкі. Але, завалены іншымі справамі, не мае часу, каб пайсьці далей пляну. А я папку дала, не пераглядаючы, што там ёсьць, якія рукапісы, і цяпер часта сама ня ведаю-ня помню, дзе чаго шукаць. Магчыма, і кніжка "Лясныя хаткі" ў той папцы. Там на ёй павінен быць год выданьня.

Шкадую і ўзроку, і цярплівасьці ўсіх, каму пішу. Так цяпер цяжка прымусіць сябе пісаць лепш, больш выразна. Рука зусім ня слухаецца...

Удзячная буду за адказ. Усяго найлепшага! Добрага здароўя і плёну ў працы. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

306. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

2 сакавіка 1987 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ліст Ваш з 21.II атрымала ў пару, але каторы ён — дакладна ня ведаю, бо наша віленская пошта леніцца ставіць пячаткі. За ліст, за ўсе весткі — дзякую. Доўга не адказывала, бо шмат часу займала барацьба з самымі markdownрознымі, самымі нечаканымі болямі. Часта, калі дачка ўдома, то і цэлы дзень ляжу. Хоць др. Куторга штораз прыпамінае, што нельга залежвацца, трэба рухацца.

Але перайду да важнейшых справаў. Пачну ад “Пралесак”. Уявіце сабе, што я сама аб іх забылася. Толькі пазычыўшы (яшчэ ў 1970-я г.) ад Я. Багдановіча гадавікі “Шляху моладзі”, каб перапісаць за ўсе часы хроніку (і гэта зрабіла — маю), там у хроніцы знайшла вестку, што выйшаў № 8 “Пралесак”, а ў мяне ніводнага нумару не было... Напісала да Новіка-Пеюна, і ён мне прыслаў камплект у цьвёрдай вокладцы. Тады ўсё і прыпомнілася...

Калі перастала выходзіць “Заранка” (не было сілы болей цягнуць без усялякай дапамогі), прыйшоў да мяне наш тутэйшы ксёндз — Глякоўскі[1]. Нібы бачу яго праз гады... Высокі, з чорнай вялікай шапкай валасоў, заўсёды з непакрытай галавой, у шырокай, даўгой сутане, ідзе вялікі крокамі... Шчыры беларус. Вось ён мне кажа: “Як шкада, што дзеці асталіся без сваёй часапісі. Я маю крыху грошай, калі возьмецеся рэдагаваць, то хоць нешта маленькае зробім”.

Я, вядома, згадзілася. Так і паўсталі “Пралескі” — сапраўды маленькая часапісь. Нядоўга я рэдагавала — усяго 7 нумароў. Перадусім ня мела часу, бо ўжо працавала “Пчала” і выходзіла “Бел[аруская] борць”. Па-другое, пачалі зьяўляцца матэр’ялы (і ілюстрацыі) рэлігійнага зьместу. Я ніколі не была проціў рэлігіі, але ж трэба браць пад увагу, што рэлігіі было дзьве. Як пагадзіць адну з другой? Ну, а калі выдаўцом быў ксёндз, то і напрамак аднабочны. Я з гэтым пагадзіцца не магла, хоць і сама каталічка. І — адмовілася... Выдавец знайшоў сабе новую рэдактарку...

Адрыўны каляндар быў выданы на 1926 г. А ад 1927 г. адрыўныя календары выдавала Бел[арускае] выдавецкае т[аварыст]ва. Але, паводле інфармацыі І.У. Саламевіча, “беларускі адрыўны каляндар на 1929 год (выданьне Станіслава Станкевіча) знаходзіцца ў Менску ў спэцфондзе бібліятэкі АН БССР”.

Я асабіста амаль увесь час рабіла 100 картак і парадаў па агародніцтву, пчалярству, садаўніцтву і жаночай працы. Але да самога выдавецтва дачыненьня ня мела. Аб першым адрыўным календары — тым самым, на 1926 г.— маю напісаныя ўспаміны з прыложанымі аўтэнтычнымі карткамі. Гэтыя ўспаміны друкаваліся ў беластоцкай “Ніве”, гэтую газэту маю.

А цяпер І.У. Саламевіч прыслаў мне адбітку з нейкай газэты, быццам усё, як трэба — і назва, і год выданьня. Усё гэта для мяне вельмі незразумелае і падазронае, бо ў хроніцы апісываецца выданьне адрыўнога календара — таксама на 1926 г., але выдавала быццам Беларускае навуковае т[аварыст]ва “на добрай паперы, вялікага фармату” і г.д.

То што, на адзін і той самы 1926 г. было выдана 2 календары? А калі паверыць, што і сапраўды Навуковае т[аварыст]ва яго выдавала, то хто яго бачыў? Дзе яго сьлед? Я ж тады працавала, газэты праходзілі праз мае рукі, бывала амаль кожны дзень у кнігарнях і другога календара, апрача нашага — сьціплага, маленькага, ня бачыла. Цяпер і папытацца німа ў каго, бо амаль нікога німа...

Цяжка расказаць, як я гэта перажыла, і далей не магу ўспакоіцца.

А падзяліцца німа з кім. Уся гэтая падзея, гэтая газэта пахне фальшам... Некалісь ужо быў артыкул, ня помню чый, што зьяўляюцца газэты, якіх на самой справе ніколі не было...

Папка з маімі ўспамінамі можа ў Вас спакойна ляжаць — я маю рукапіс. Некалісь даўна быў у мяне Кастусь Цьвірка[2]. Ён мяне намаўляў, каб я напісала ці, лепш, апісала сваё дзяцінства. Я і сяньня аб гэтым думаю, бо мае дзіцячыя гады своеасаблівыя вельмі. Я ў бацькоў расла адна. Мой маленькі 10-месячны брат памёр, калі мне было 3 гады, ішоў 4-ты. Бацькі вельмі перажывалі страту сына...

А бацька мяне стараўся наставіць на мейсца брата-хлапца. Не расла разьнежанай дзяўчынкай. Калі бацька быў камандзірам нестраявой, г.зн. гаспадарчай часьці ў палку, то браў мяне з сабой усюды — у лес, дзе прыгатаўлялі дровы, на сенажаць, дзе касілі сена. Маючы 12 гадоў, езьдзіла конна. Лазіла па дрэвах, аглядала казармы (вядома, калі салдаты былі на вучэньнях), таксама салдацкія ёлкі...

Таму калі летам у Сакольшчыне ў фальварку мамінага бацькі я, зусім не як паненка, добра выхаваная, была ў курсе ўсёй гаспадаркі і найбольш мела дачыненьне з коньмі. Ці гэта можна самой апісаць? Ды яшчэ цяпер, калі мне так цяжка кіраваць сваёй рукой? Гэта толькі ў свабоднай гутарцы расказаць можна. А каму? Маіх блізкіх гэта не цікавіць.

Абяцаў прыехаць С.С. Панізьнік — мне з ім лёгка гаворыцца, мы даўна знаёмыя. Але нешта ня едзе. Пісаў, што прастудзіўся, як некуды ў маразы езьдзіў, а цяпер зусім ня піша. Унук запрацаваны да немагчымасьці. А дачка і зяць жывуць сваім жыцьцём, сваімі справамі. Я ня ведаю нічога, што яны робяць, а яны ня хочуць ведаць, што я раблю, чым жыву.

Такія асабістыя ўспаміны з дзяцінства маім блізкім зусім непатрэбныя, тым больш далейшае пакаленьне — праўнук — адпадае як нашчадак, бо гадуецца на літоўца. Бабка малога — мая дачка — вельмі часта ў сваіх дзяцей бывае, але і яны да ўнука, і нявестка — гавораць па-літоўску.

Дзіўны пагляд Лявона [Луцкевіча] (паміж іншым, і ён, калі да дзяцей ходзіць, то гаворыць толькі па-літоўску, апрача, зразумела, са Слаўкам. Лявон кажа, што ўсё залежыць ад Слаўкі: як захоча, то сына па-беларуску гаварыць навучыць. А нашто самі ад першага дня, як Эліма (жонка Славы) ўвайшла ў сям'ю, адразу перайшлі на літоўскую мову? Замест таго, каб вымагаць ад яе, каб яна мужавай мовы вучылася, каб мовы былі роўныя... Я адна да яе гаварыла па-беларуску і тлумачыла, што сям'я можа быць дзьвюхмоўная, але па-роўнаму...

Вось такія ў мяне абставіны — здароўю не спрыяюць. Для бібліяграфічнага слоўніка я выпісала з "Бел[арускай] борці" ўсе свае артыкулы, хоць А. Мальдзіс пісаў, каб не турбавацца, што самі гэта зробяць. Але я ведала, што не дадуць рады, бо я па-рознаму падпісывалася. Не хацела, каб было відаць, што адзін чалавек так шмат і на розныя тэмы піша...

Выбачайце, што так нечытэльна пішу. Напісала і зараз лягу — ужо не магу, а лістоў — гара. Калі што трэба — пішыце, пытайцеся. А што да патрэбных Вам біяграфіяў — можа, самі зьвернецеся да Лявона? Гэтак будзе лепш.

Усяго найлепшага п. Марыі і Вам. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

307. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

8 сакавіка 1987 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Абедзьве з дачкой дзякуем за павіншаваньне з жаночым сьвятам. Матэр'ялы для Бібліяграфічнага слоўніка[1] высылаю. Што непатрэбнае — выкрасьліце.

Ня ведаю, ці тое, што друкавалася ў мала каму вядомым "Гаспадарчым дадатку" да грамадаўскіх газэтаў, мае якую вагу. Напісала на асобным аркушы — лёгка адкінуць.

Ці не магла б яшчэ ў чым памагчы? Маю аўтабіяграфію і поўны сьпісак твораў нашага *першага* агранома Янкі Пачопкі. Ён першы пачаў пісаць кніжкі па пчалярству, агародніцтву, садаўніцтву. Кніжка "Пчолы" (добра апрацаваная) выйшла з друку ў 1923 г. Паміж іншым, я яе маю. Хіба, адзіны экзэмпляр, які ў цэласьці захаваўся, бо ў людзей па руках ходзяць толькі асобныя карткі. Нават родная яго дачка, з якой я карэспандую, яе ня мае. Ён быў сталым супрацоўнікам "Маланкі"[2] і г.д.

Наагул, калі што трэба, пішыце, пытайцеся. Глянула на артыкул у "ЛіМе" — аб энцыкляпэдыі "Прырода Беларусі". Разглядаюць розныя яе недастаткі, але німа ніводнага слова аб памылках (далікатна кажучы) ў назвах расьлінаў Беларусі. Магчыма, і далей пойдуць *адуванчыкі* (або *дзьмухаўцы*, *іван-чаі*, *глогі* і г.д.). Тлумачыцца тым, што артыкулы пра расьліны пішуць выпадковыя людзі, часта студэнты і г.д. Але ж гэта несумленнасьць, бо можна і ў слоўніку Кісялеўскага паглядзець, хоць і там ня ўсё добра.

Але праўда — энцыкляпэдыя "Прырода Беларусі" аб наяўнасьці "Батанічнага слоўніка" маўчыць... Мо гэта і выгодна для выдаўцоў? Ня ведаем і ведаць ня хочам... І *адуванчыкі* і *глогі* ізноў ідуць у сьвет. А цяпер, магчыма, яшчэ горш будзе. Бо ёсьць мясцовасьць, напрыклад, Глыбокае, дзе беларускія назвы ўжо зусім не ўжываюцца. Амаль тое самае і з птушкамі.

А даведкі ёсьць скуль узяць. У "Крывічы" за 1924 г. ёсьць вялікі артыкул "Намэнклятура беларускіх птушак", апрацаваны камісіяй, у склад якой увайшлі праф[эсар] Т. Іваноўскі[3] (вучоны-біёляг), В. Ластоўскі і Кл. Дуж-Душэўскі. Апрацаваны вельмі добра — сапраўды па-навуковаму.

Агледзелася, што гэта не па Вашай часьці праца... І толькі час Вам забіраю, ды яшчэ так дрэнна напісана. Учора пісала зусім па-людзку — напісала 5 лістоў, адзін за другім. Але ўночы дрэнна чулася, і сяньня ўжо рука зусім ня слухаецца. Так што выбачайце.

Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава*.

308. МІКОЛУ ТАРАНДУ

19 сакавіка 1987 г.

Дарагі пане Мікола.

Моцна трымаюся прынцыпаў с.п. М.М. Улашчыка — аб абсалютна чужым для нас звычаі ўжываньня звароту *па-бацьку*. На вялікі жаль, вынікі малыя... Што ж рабіць — прыходзіцца цярпець. Хоць бліжэйшыя мне людзі пішуць мне калі ня *пані* (звычайны зварот у літоўцаў), то *цётка Людвіка* або, па волі прафесара Ф.М. Янкоўскага,— *бабуля*, бо ён мне даў такі ганаровы тытул — *усіхняя бабуля*... Але, здаецца, я паўтараюся. Бо, хіба, ужо аб гэтым пісала.

Аб тым, што Вы былі ў дочкі Я. Пачопкі — Зоі, я ўжо ведала з яе ліста. Бо цяпер і яна мне піша. А Валянціна прыслала мне некалькі здымкаў свайго бацькі. Здымкі патрэбныя ня так мне самой, як для пчаляроў–палешукоў, якія гуртуюцца каля арганізацыі Музэю пчалярства. Як бачыце, у самым канцы жыцьця я вярнулася да сваёй галоўнай прафэсіі –агародніка, садаўніка, пчаляра.

Якраз аб гэтай дзейнасьці — аб існаваньні ў Вільні, пачынаючы ад 1928 г., праз 10 гадоў, Беларускага каапэратыўнага пчалярскага т[аварыст]ва "Пчала" — Вы, цяперашнія гродзенцы, амаль нічога, або і зусім ня ведаеце... "Пчала" мела свой друкаваны орган — "Беларускую борць". Цяпер усю гісторыю "Пчалы", дакумэнты, карэспандэнцыі (а гэтага шмат) перадаю ў будучы Музэй пчалярства. Тыя паляшукі–пчаляры пішуць, прыяжджаюць.

З Менскам галоўны кантакт — з маладымі дзеячамі, якія узялі на сябе немалаважную работу — стварыць *беларускія сэкцыі* ў дзіцячых садах, дзе да гэтай пары панавала толькі расейская мова. Аб усім іншым ведаю толькі тое, што друкуецца ў "ЛіМе". Ну і яшчэ аб працы над выданьнем 6-томнага слоўніка бібліяграфічнага. Бо ў гэтай рабоце крышачку прыймаю удзел.

У нядзелю — 15 сакавіка — сабраліся нашы віленскія беларусы і адначасна з днём нараджэньня майго зяця Лявона адсьвяткавалі невялікі юбілей: 60-годзьдзе з дня выхаду ў сьвет 1-га нумару дзіцячай часапісі "Заранка".

У Вас фэстываль сучаснай музыкі быў больш вясёлы і гучны і большае меў значэньне, чым нашыя юбілеі... І гэта добра, вельмі добра. Жывіце так і далей. Гучна, весела і карысна.

Ці часта бачыце Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча]? Я яму нядаўна пісала, і ня хочацца ізноў яго трывожыць. А справа такая — мне вельмі патрэбны экзэмпляр кніжкі "Краю мой — Нёман". У нас тут у Вільні жыве Ніна Аляксандраўна Ляшковіч. Шматгадовая працаўніца віленскіх архіваў. Вельмі шмат памагала і памагае нашым пісьменьнікам у вышуківаньні патрэбных матэр'ялаў у архівах.

І цяпер яшчэ пасьля цяжкой хваробы (сэрца, ціск высокі і г.д.) памагае пры складаньні слоўніка бібліяграфічнага. Трэба дадаць, што чалавек зусім адзінокі... Вось яна вельмі хацела б мець гэтую кніжку — "Краю мой..." А дзе яе тут узяць у Вільні? Можа, у каго з сяброў "Паходні" ёсьць лішні экзэмпляр? А можа, у Аляксея Міхайлавіча? Будзьце добрыя, сябры "Паходні", памажыце мне ў гэтай справе. Так хочацца хвораму чалавеку дагадзіць. На ўсялякі выпадак пасылаю яе адрас. Найлепш было б адразу ёй пераслаць...

Усіх сяброў "Паходні" сардэчна і шчыра вітаю! Як заўсёды, думкі бягуць да Нёмна, да старога Гродна. Ды яшчэ да старога кляштару брыгітак, па калідорах якога бегала зусім малым дзіцём, бо родная цётка маёй бабулі (бацькавай маці) была *настоятельницей* кляштару. Як сказаць па-беларуску — ня ведаю... Гэта тэрміны, якія цяпер ужо не ўжываюцца... Бачыце, якая я зьвязаная нават з самымі старымі аб'ектамі Гродна.

Напісала 3 лісты і — лажуся. Такое цяпер маё здароўе, такія сілы... Знойдзецца хвіліна часу — пішыце. Усяго найлепшага! Шчыра — *Л. Войцікава*.

309. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

29 сакавіка 1987 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Прабую, як мне сяньня напішацца. Ці можна будзе прачытаць... Бо дзень

да дня не падобны. Усё залежыць, як прайшла ноч. Вельмі кашляю, і не таму, што прастудзілася, бо не было дзе, а таму, што лёгкім не хапае сьвежага паветра. Вельмі шмат сьнегу — нікуды не выходжу з кватэры, "запячатаная" наглуха.

А як Вы чуецеся? Як Вашая прастуда? Дзе Вы яе падхапілі? Ці так зімна ў музэі? Мо стары дом не агледжаны і правявае? А як Стась[1], ці яшчэ хварэе? Колькі яму ўжо? Майму праўнуку 1 год і 2 месяцы. Падобна, бегае па двары, па сьнезе. Пачаў хадзіць, маючы 10 месяцаў. Я яго ад лета ня бачыла. На сваю бяду, і ўнука бачу вельмі рэдка. Такі запрацаваны ў сваім інстытуце, што і жыць, як людзі, ня мае калі.

А мае "згубы" — С. Дубавец і Яўген Шунейка[2] — знайшліся: адклікнуліся. Хоць Дубавец — вельмі скупа... А якраз яго мне вельмі не хапае, яго крытычнага погляду, яго падыходу да розных, часта незразумелых падзеяў. Ці будзе надрукаваны ў "ЛіМе" той матэр'ял, што ён прыслаў? Пабачым.

Цяпер у "ЛіМе" поўна артыкулаў пра дзіцячую літаратуру. Але гэта пераліваньне з пустога ў парожняе. Нічога канкрэтнага не дае. А выдаецца і далей адна фантастыка — і па зьмесьце, і па афармленьні.

Пісаў мне пан Мікола Таранда — цікава, падрабязна, аб усёй гродзенскай працы, аб вечары ў Мэдінстытуце. Я яму вельмі ўдзячная, бо ўсё ж Гродна і далей зьяўляецца для мяне вельмі блізкім і родным — па бацьку, яго бацьках і па гуртку. З якога маю толькі аднаго сябра, і то з самых малодшых. Ён вельмі даўна за мяжой, але карэспандуем часта.

Успамінаем ня толькі Гродна і гурток, але і шмат навакольных вёсак. Праўда, не з-пад Гродна яны, а з Сакольшчыны. Хоць яна цяпер за мяжой, але я з ёю кантакту не перарываю, бо гэта ж Край маіх прадзедаў, дзядоў і мамы. У бяссонныя ночы (а сплю вельмі дрэнна) я ўвесь час там.

Лістоў, як заўсёды, безьліч. І ад знаёмых, і ад зусім незнаёмых. Ды і госьці бываюць даволі часта — і мясцовыя, і з Менска.

Ці ведаеце, што ў Гудзевічах працавала тры дні менскае тэлебачаньне? Мае быць дакумэнтальны фільм пра Гудзевіцкі музэй. Шкадую, што мы тут яго ня ўбачым, бо ў Вільню з Беларусі тэлебачаньне не даходзіць.

Сяньня дачка прынясла з лесу пару кветак падсьнежніка. Гэтыя кветкі ў нас дзіка не растуць, яны родам з Украіны — з-пад Кіева, дзе іх поўныя лясы. Самыя першыя вясной прабіваюцца праз сьнег і на сьнезе расьцьвітаюць. Яны цыбульковыя. Некаліс мы купілі 50 цыбулек. Цяпер яны ў нас разрасьліся ў вялікай колькасьці. А ўнук пасадзіў некалькі цыбулек у лесе з паўднёвага боку — вось яны ўжо і зацьвілі. Белыя званочкі. Маеце цэлую батанічную лекцыю...

А чытаць будзе нялёгка, праўда? Пішаце: "Да сустрэчы". Добра было б... Усё ж штораз бліжэй да 95-годзьдзя, і ўсё можа стацца...

Цалую сардэчна. *Л. Войцікава.*

310. МІКОЛУ ТАРАНДУ

29 сакавіка 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Шчыра дзякую за падрабязны ліст аб "Паходні", яе працы, штораз лепшых радасных падзеях. Шкада, што я ня ведала аб гадавіне "Паходні". Хоць цяпер, на 2-м годзе яе існаваньня, прыйміце ад мяне сардэчныя пажаданьні далейшых посьпехаў у працы. Новых сяброў, новых сустрэчаў, новых узьлётаў духу.

Пішаце аб пастанове паставіць помнік К. Каліноўскаму. Дзе — у самым Гродне? У якім мейсцы? Хіба, ня ў новых мікраараёнах? А як будзеце грашовыя сродкі зьбіраць? Ці на падпісныя лісты, ці будзеце ладзіць і скарбоначныя зборы на вуліцах, у кавярнях і г.д.? У Вільні на помнік Ядвігіну Ш. мы зьбіралі на падпісныя лісты.

У Вас угодкі паўстаньня "Паходні" сьвяткаваліся 12 сакавіка, а мы ў Вільні 18 сакавіка адсьвяткавалі 60-годзьдзе выхаду ў сьвет 1-га нумару дзіцячай часапісі "Заранка". Было што ўспомніць і што расказаць цяперашняму пакаленьню. Нават яшчэ адзін супрацоўнік "Заранкі" — Малады Дзядок — Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн — жыве ў Менску. Вось мы з ім сябе ўзаемна павіншавалі.

Цяпер шмат хто складае праграмы беларускай дзіцячай літаратуры для беларускіх групаў у дзіцячых садах, цікавіцца і старой дзіцячай літаратурай. А як у Вас у Гродне — ці робіцца што ў гэтым напрамку, ці дзіцячыя садкі па-старому рускамоўныя? Вы ўсе маладыя — сваіх дзяцей німа, то і мала, мусіць, цікавіцеся гэтай справай...

Ліст да М.С. Гарбачова[1] А. Аблажэй перадаў майму зяцю Лявону, і ён мне даў прачытаць. Цікава, сьмела напісана... Прыемна, што У.І. Содаль як рэдактар "Роднага слова" падпісаў першы. Ды і шмат іншых, добра знаёмых пісьменьнікаў. Але ёсьць і такія — быццам вельмі дзейныя, а падпісаць пабаяліся... Цікава, які будзе водклік? І ці наагул будзе?

Вясна не сьпяшаецца. Сонца німа, сьнегу — горы... А ўсё ж дачка сяньня прынясла пару першых кветак. Гэта белыя званочкі-падсьнежнікі! Вельмі вобразна называюцца па польску *priebisnieg*, бо сапраўды прабівае сьнег і на сьнягу цьвіце. Гэта ня нашая тутэйшая кветка, паходзіць з больш паўднёвых мясьцін — з Польшчы, Украіны... Але мы ў сябе яе пасадзілі, добра прыжылася і размножылася, нават у лесе, з паўднёвага боку.

Кажаце, што студэнты Сельскагаспадарчага інстытуту добра ведаюць сваю мову? Яны, напэўна, з недалёкіх вёсак, а на Гродзеншчыне мова лепш трымаецца, чым далей на ўсходзе...

Вельмі цікава, што Вам адкажа Міністэрства культуры ў справе Данчыка[2]. Але калі б згадзіліся запрасіць яго у Беларусь — ці зможа прыехаць у Вільню? Бо было і так, што калі хто, напрыклад, прыязджаў з Польшчы у Беларускую Рэспубліку, то ў Літоўскую прыехаць ня меў права.

За 2 дні напісала 10 лістоў, гэты да Вас — 11-ы, і ўжо больш не магу. Хоць яшчэ да адказу цэлая гара ляжыць.

Усяго Вам найлепшага! У жыцьці, у грамадзкай працы. Усім сябрам "Паходні" — шчырае, сардэчнае прывітаньне. Старая гродзенская патрыётка *Л. Сівіцкая-Войцік.*

311. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

30 сакавіка 1987 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Думаю, што Вы ня менш занятыя, чым іншыя, а можа, і больш, а ўсё ж пішу. А можа, памаленьку, не сьпяшаючыся, возьмецеся апрацаваць матэр'ялы пра жыцьцё і ўсебаковую творчасьць доктара Станіслава Грынкевіча? Матэр'ялы, пачынаючы ад біяграфіі, вельмі цікавыя, падрабяз-

ныя ўспаміны калегаў, прафэсараў і г.д.

Гэты доктар, псыхіятр-нэўроляг, вучоны — наш беларус. Цяжка мне падрабязна ўсё напісаць, бо вельмі дрэнна чуюся.

Вы так цудоўна распрацавалі нашага Юзіка Лявіцкага — у артыкуле “3 кагорты пачынальнікаў”. А я аніяк не магу знайсьці пісьменьніка, якому спакойна дала б у рукі ўсе матэр’ялы пра др. Ст. Грынкевіча. Ды і хто за гэта возьмецца? Ані адзін чалавек не зразумее... А я ня маю сумленьня сысьці са сьвету, не зрабіўшы ўсяго магчымага, каб захавалася памяць аб такім чалавеку, як др. Грынкевіч. Ня будзе мяне — усё пойдзе ў печку...

А я і яшчэ аднаго маю — Аркадзя Смоліча, найлепшага сябра Максіма Б[агданові]ча. Цяпер і аб Смолічу пісаць можна, а хто гэта зробіць? Таксама матэр’ялаў хапае — і біяграфія, і поўная бібліяграфія.

Ведаю, што пішу бязладна, малазразумела, але не магу сябе прымусіць думаць больш лягічна. Баліць галава, у вушах коле і г.д. А тут — патоп лістоў на самыя розныя тэмы.

І што Вы зможаце парадзіць на мае праблемы? Тым больш, што сама я амаль — да нічога...

Часта, калі ёсьць магчымасьць, ляжу. Ляжу, а спаць не магу — часта да раніцы.

Калі што з гэтага ліста зразумееце, калі ласка, адкажыце. Буду вельмі ўдзячная.

Прывітаньне пані Марыі. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

312. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

3 красавіка 1987 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Маю да Вас дзьве справы. Напішыце мне, калі ласка, дакладную дату сьмерці с.п. Ларысы Антонаўны Геніюш. Маю тэлеграму, высланую ў той сумны дзень з Зэльвы, але толькі паданы дзень (7-га) — ні месяца, ні году.

Учора перажыла проста шок нэрвовы. Я даўна ў кантакце з Лагойскам (пад Менскам), са школай, у якой наладзілі музэй “Літаратурная Лагойшчына”. Гэта недалёка ад маёмасьці Ядвігіна Ш.— Карпілаўкі. Таму я паслала ўсё, што змагла, аб Карпілаўцы і сям’і Ядвігіна. Атрымлівала лісты, пытаньні, паведамленьні аб новых здабытках, сустрэчах. Усё, здаецца, было ў парадку.

Учора нечакана зьяўляюцца 3 настаўніцы з Лагойска — з апаратам, пытаньнямі ды дзіўнымі просьбамі. Напрыклад, каб ім даць у музэй адзін № “Заранкі” — з адзінага камплекту (!) і г.п. Але гэта яшчэ нічога. Пераглядаючы альбомы, ня ведалі, хто такі Гальяш Леўчык (!) і пыталіся, *дзе цяпер* Ларыса Геніюш! І гэта настаўніцы, яны вядуць беларускую школу! А трэба прызнаць, што мова ў іх нядрэнная. І я ня верыла сваім вачам, чытаючы іх пытаньні. Ня ведалі, што ў Менску ёсьць ужо ў дзіцячых садах беларускія групы. Пад самым горадам працуючы ў беларускай школе... Пад гэтым уражаньнем ня спала да 5 раніцы і цяпер зусім пісаць не магу.

А другое — просьба. Ведаю ад Міколы Таранды, што ў кнігарнях у Гродне ёсьць яшчэ кніжка “Краю мой — Нёман”. Яго я ўжо прасіла прысылаць гэтую кніжку для Ніны Аляксандраўны Ляшковіч (яна цяжка хварэе). Ня хочацца другі раз яго турбаваць. Мо Вы будзеце такая добрая і папросіце каго, каб для

мяне пару экзэмпляраў купілі (грошы вярну). Маю карэспандэнта аж у Ташкенце, а другога — у Петразаводзку. Хацела б ім паслаць. Вельмі ж ужо тужаць па беларускай літаратуры. Выбачайце за клопат.

Цалую і чакаю таго шчасьлівага дня, калі пабачымся, бо чуюся ня вельмі моцна, часта ляжу. *Л.В.*

313. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

11 красавіка 1987 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

Дзякую за шчыры ліст. Не разумею, што сталася з Дубаўцом і Таняй — яго жонкай[1]. Гэта ж такія мілыя былі людзі... Столькі часу я з імі карэспандавала, асабліва з Таняй, калі яна працавала ў Берасьці на тэлебачаньні, а з ім часта спатыкалася — прыяжджаў, яшчэ як быў студэнтам. Ён і яго таварышы падпісываліся — *Вашыя ўнукі*. А як жаніўся і радзілася дачушка, зараз падзяліўся гэтай навіной і напісаў: *гэта Ваша ўнучка*. Я запярэчыла: Вы ж, кажу, даўна лічыце сябе маімі ўнукамі, то Ваша Адэлька — ужо мая праўнучка... Пасьля напісаў: прыедзем утраіх. І гэта быў апошні ліст. Цяпер толькі пару слоў на 8 сакавіка — і ўсё.

Відаць, там у яго нешта нядобра. Яго блізкія сябры з Менска пісалі, што яму ў Гомелі вельмі цяжка... Ведаю, што нядаўна прыслаў у "ЛіМ" крытычны артыкул аб мове — не зьмясьцілі. Таксама Ваш гродзенскі мастак Я. Шунейка вельмі доўга маўчаў. А пасьля толькі некалькі слоў: пры пабачаньні растлумачу, чаму маўчаў... Усё нейкія таямніцы. Можа, памаленьку высьветліцца.

Пішаце аб беларускай групе ў дзіцячым садочку — маеце на ўвазе садок, які вядзе Віялета Яфіменка? Так? Я Віялету ведаю, група гэтая існуе даўна. А цяпер яна не адна — ёсьць па 3–4 групы ў другіх садках. Ёсьць жменя маладых пісьменьнікаў, якія складаюць праграму адпаведнай дзіцячай літаратуры для гэтых групаў. Прыяжджалі, радзіліся, выпісывалі з "Заранкі". Са страхам думаю, каб ня бралі матэр'ялаў для малых дзяцей з бессэнсоўнай фантастыкі — Ст. Шушкевіча і В. Віткі. Вось прыедзеце — пагаворым, разгледзім.

Што да Б. Мікуліча — я ня ў "Нёмане" чытала, а даўна — у яго кніжцы. Пераглядала зьмест, пабачыла "Разьвітаньне" і падкрэсьленыя выдавецтвам словы: *цудоўныя ўспаміны аб М. Багдановічу*. Мяне гэта зацікавіла, я прачытала... Валасы на галаве падняліся! Што за бессэнсоўшчына — ад пачатку да канца?! Напісала да Н.Б. Ватацы. Яна мне адказала, што сам Мікуліч ня мог нічога ведаць, пісаў пад уплывам Бядулі. Вось чаму ў "ЛіМе" — вялікі артыкул аб Мікулічу. І яго словы, што вельмі ўдзячны Бядулі за прыязьнь і падтрымку... Сапраўды, Бядуля прыслужыўся, нічога ня скажаш. Пішучы, трэба ведаць абставіны таго часу, а ня ўносіць яўную блытаніну.

І так — пачатак: Максім *ідзе пехатой* (!), трымаючыся за вазы *бежанцаў*! М. Б[агдановіч] прыехаў цягніком у 1916 г., а ў той год ужо ніякіх бежанцаў на дарогах не было і быць не магло — ужо была граніца.

Далей: Максім *прыйшоў* і адразу пайшоў да Бядулі... *Ведаў*, значыцца, горад і ведаў, дзе Бядуля жыве? Цудоўна!

Далей: Максім цэлыя ночы хадзіў па горадзе, каб пазнаць Менск... У 1916 г. уночы пазнаваць горад? Менск быў *цёмны*, не *асьветлены*, нават вокны магазынаў і дамоў былі заклееныя чорнай паперай, бо з неба ляцелі бом-

бы. І Максім апрача Бядулі нікога ня ведаў, нікога з беларусаў не спатыкаў, ня бачыў...

Гэтае "Разьвітаньне" было надрукаванае ў нейкім малым зборніку. Знайду ліст Ванды Лявіцкай (дачкі Ядвігіна Ш.), у якім яна мяне пыталася: "Ці ты, Люда, чытала гэта? Быццам Максіма Б. ніхто з беларусаў ня ведаў, ніхто ім не цікавіўся, не апекаваўся — адзін Бядуля. Што гэта значыць?" і г.д. Ліст знайду, пакажу Вам. Ёсьць, знача, апрача мяне яшчэ сьведка.

Думка арганізаваць пры музэі групу дзяцей імені М. Багдановіча — гэта цудоўна! Ён так любіў дзяцей, так тужыў, што ня можа мець сям'і — дзяцей уласных... Як назваць, як зрабіць і г.д.— пагаворым.

Сяньня ўжо ні пісаць, ні думаць не магу. Гэта ўжо 6-ы ліст. Як на мае сілы — шмат. Ужо і ў нас вясна. Зямля разьмерзлася, дачка пачала капацца ў зямлі. А я ўжо нічога не магу рабіць, хоць рукі рвуцца да работы. І так цяжка адчуваць сваё бясьсільле...

Пішаце, што ў Вас цьвітуць падсьнежнікі. Скуль у Гродне падсьнежнікі? Хіба, хто садзіць? Бо яны дзіка на Беларусі не растуць. А можа, Вы што іншае пад гэтай назвай разумееце? Ну, пабачымся — высьветлім.

Перагледзела ліст і сама сябе пытаюся: ці зможаце прачытаць і зразумець?

Цалую Вас сардэчна і чакаю. Ваша *Л. Войцікава*.

314. МІКОЛУ ТАРАНДУ

17 красавіка 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за такі зьмястоўны ліст — і цікавы, і радасны. Сколькі разоў я яго перачытала... А адказаць дагэтуль не змагла. Усё чакала, што пачну лепш пісаць, а то рука зусім ня слухалася.

Прыемна ведаць, што Вы і ў сябе ў Гродне працуеце інтэнсіўна, і з Менскам ня траціце кантактаў. Мяне Менск ня цешыць... Безадказнасьцю выдавецтваў — памылкі нават у паважных выданьнях. Дапускаецца проста бессэнсоўшчына, якую прыймаюць за чыстую манету.

Але ёсьць і добрыя весткі: больш беларускіх групаў у дзіцячых садках. Адпаведныя людзі складаюць літаратурную праграму для гэтых беларускіх групаў. Толькі непакоіць, ці патрапяць яны абмінуць тое, што лічыцца "дзіцячай літаратурай",— фантастыку і па зьмесьце, і па ілюстрацыях.

Добрыя весткі з краіны музыкі. 14 красавіка быў у мяне студэнт (даволі даўні знаёмы) Менскай кансэрваторыі — з аддзелу кампазыцыі. Расказаў, што у іх прайшоў фэстываль "Менская вясна". Былі цікавыя творы, можна сказаць, што пакрысе нараджаецца беларуская кампазытарская школа. Што ў кансэрваторыі адбываецца вяртаньне да беларускасьці. Я яму — Міколу Стоме — дала Ваш адрас. Можа, для абодвух бакоў нешта карыснае прыдумаецца.

А ў Вільні ў нядзелю, 12/IV, адбылося першае арганізацыйнае паседжаньне задуманага клюбу аматараў беларускай песьні. Як там што было — яшчэ ня ведаю. Ці быў у Гродне на Вашыя запросіны Алесь Белакоз? Бяда, што яго ганаровае званьне ні ў чым не зьмяніла адносінаў уладаў да яго працы... Кідаюць каменьне пад ногі — замест ў чым памагчы. А са здароўем і далей дрэнна.

Вельмі цікава, якая будзе пастанова ў справе помніка К. Каліноўскаму. Для мяне то і ў Сьвіслачы нядрэнна... Сьвіслацкую гімназію скончыў мой прадзед —

у першай палове прошлага стагодзьдзя. У кожным выпадку майце на увазе, што і я далучуся да складак.

Як шкада, што я ня ведала аб вечары Ларысы Геніюш. А можа, яго яшчэ не было? Я маю вершы паэткі, нідзе недрукаваныя, пісаныя на Варкуце... На сьмерць аднаго са зьняволеных. Трагічныя...

Яшчэ такая справа. У 1981 годзе я пасылала ў Гродна (мяне прасілі) ксэракопію свайго "Батанічнага слоўніка". Атрымала расьпіску, што прынята для *Музея здравоохранения*... Падпісана: *профессор, доктор медицинских наук Бржеский Витольд Чеслававович*[1]. Усё па-руску...

А прасіў мяне паслаць доктар Ігнатовіч Фёдар Іванавіч. Чулі аб такім? Ігнатовіч прыехаў у Вільню ў архівы. Трапіла яму ў вочы "Бел[аруская] борць" — мае артыкулы аб лекавых зёлках. Адкуль узяў адрас? Ня ведаю... Прыйшоў — пазнаёміліся. Нават супольна фатаграфаваліся. Напісаў у "Нёман" у 1982 г. артыкул аб "Пчале" і "Бел[арускай] борці". Нейкі час пісаў з Гродна, пасьля быў у ГДР. І цікава — лісты пісаў па-беларуску, а гаварыў па-руску. Куды і калі зьнік — ня ведаю. Вось такія гродзенскія дзівы...

Сардэчнае прывітаньне ўсім сябрам "Паходні". Вам яшчэ раз дзякую за ліст, і не забывайце. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

315. МІКОЛУ ТАРАНДУ

28 красавіка 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст — цікавы і шмат у чым радасны, асабліва аб маніфэсьце ў справе зьмякчэньня мовы. Аўтары нічога мне не напісалі, відаць, німа там нікога знаёмага. Ня ведаю, чаму зусім ня піша Алесь Мікалаевіч [Белакоз]. Я яго павіншавала з каштоўнымі знаходкамі — бібліятэкай старой літаратуры і падвойнымі дыванамі (бо Вы пішаце — *коўдры*, а я думаю, што ідзе аб дываны, якія ткаліся на спэцыяльных кроснах), але ад Алеся Мікалаевіча — ніякага адказу.

Анатоля Сыса ведаю — прыяжджаў з менскай "Талакой". А на мову сваю беларускую — ад часу Гродзенскага гуртка — Гродна аніяк ня можа здабыцца. Надзея на Вас — "Паходню", на далейшых штораз маладзейшых сяброў.

Дачка мая працавала 5 гадоў у Гродне ў Пэдінстытуце. Я ў 1950 г. была ў яе зімой цэлы месяц. Мейсца сабе не знаходзіла... У інстытуце толькі мы двое — дачка і я — гаварылі па-беларуску, ну і выкладчыца беларускай мовы. На вуліцах усе шыльды, усе аб'явы — па-руску... Было гэтак, калі я ў школе яшчэ была, але ж гэта было ў царскія часы...

Я ў торговыя дні хадзіла на рынак, таўклася там гадзінамі, каб паміж сялянамі пачуць беларускае слова... Ня думаю, каб шмат лепш было ў Менску. Там жа дзеці пісьменьнікаў ня хочуць гаварыць па беларуску... Але — можа, далей будзе лепш. Калі да голасу дойдзе маладое пакаленьне. Самае маладое.

Ёсьць і цяпер добрыя весткі з Гасьцёўні Галубка. Прыедзеце — раскажу, з лістом адпаведным пазнаёмлю. Яшчэ шмат цікавага раскажу аб дзейнасьці літаратурнага гуртка ў школе ў Германавічах Шаркаўшчынскага р-на — на Віцебшчыне.

Вельмі буду рада, калі, ня вельмі адкладаючы, прыедзеце. Ня буду скрываць, што чуюся дрэнна — баляць ногі, цяжка хадзіць. Можа, такі пераходны час — ад зімы да вясны, можа, і шмат нэрвовага, бо нямала пражылося. Гэта ўсё драбяза.

Неяк будзе... У мяне дзень да дня непадобны. Учора шмат лепш пісала, а сяньня зусім рука ня слухаецца.

Вельмі хацела б зьвязаць Вас са студэнтам Менскай кансэрваторыі Міколам Стомам. Здольны кампазытар, выдатны беларус. Пакуль што ня маю яго адрасу. Як быў апошні раз, забылася запытацца аб менскі адрас, а маю толькі адрас яго маці, якая жыве ў Ляндварове пад Вільняй. Ён хоча мяне са сваёй маці пазнаёміць, але да гэтай пары не ўдалося. Калі дачакаю летніх канікулаў — шмат што выясьніцца.

На гэтым сваю мазаніну скончу — самой глядзець праціўна... Сардэчнае прывітаньне ўсёй "Паходні". Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

316. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

10 мая 1987 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Дзякую за ліст і выбачайце, што да гэтай пары не змагла адказаць. Лістоў ляжыць — цэлая гара. Пакуль гэты ліст дойдзе да Вас, Вы ўжо будзеце ведаць, як я прыняла мілых гасьцей з Гродна... Рада была вельмі, але знэрвавалася і разгубілася, бо ляжала ў ложку. Было б гэта яшчэ нічога, бо ня дзіва, калі хто дрэнна чуецца і ляжыць. Але дачка была недзе на гародзе, а Лявону не хапіла культуры, каб мяне папярэдзіць. Хоць бы прычасалася і надзела блюзку, а то ляжала ў начной кашулі... Проста сорамна было. Лявон апраўдываўся, што ня ведаў, калі я лягла.

Я наагул чуюся дрэнна — моцна баляць ногі, часта — галава, а найгорш тое, што разьвіваецца хвароба страўніка. Думаю, што пагоршала, бо далучыўся нэўроз. Прычынаў, каб нэрвавацца,— безьліч. А старому ці шмат трэба? Думаю пачаць абсалютную дыету — перастаць есьці.

А цяпер у мяне такое пытаньне і — просьба. Ведаю, што цяпер можна запрасіць з Польшчы і далёкіх сваякоў, і нават знаёмых. Ведаю падрабязна, як аб гэта старацца. І вось адзін мой далёкі сваяк, які радзіўся пад Лідай — у Белагрудзе (там магіла яго бацькі), просіць, каб я выслала яму запросіны. Клопату з гэтым шмат. Я асабіста зусім бездапаможная.

Рызыкавала б прасіць Лявона. Ці згадзіўся б — ня ведаю... А па другое, магчыма, што захацела б мяне адведаць і мая бліжэйшая сваячка, якая маленькай чатырохгадовай дзяўчынкай жыла з намі — з маёй мамай і са мной — у Менску, у Беларускай хатцы. Тады ўжо мусіла б прасіць Лявона.

Ці не знайшлася б якая добрая душа ў Гродне, якая змагла б выслаць запросіны гэтаму майму сваяку? З вялікай падзякай зьвярнула б усе кошты. Як думаеце — ці гэта магчыма?

Гэты мой сваяк — не беларус, выхаваўся ў Варшаве, але ніякі ня вораг. Яму 78 гадоў — пэнсіянер. Ад маладых гадоў да нядаўна пяяў у Варшаўскай філярмоніі — і на мейсцы, і куды ні езьдзіў — па цэлым сьвеце! Я яму напісала, што зраблю ўсё магчымае, каб цярпліва чакаў. Але ўсё ж час ідзе. Зразумела, што прыехаў бы ён да мяне, наведаўшы сваю Белагруду.

Вельмі буду чакаць адказу. Цалую сардэчна. Ваша *Л. Войцікава.*

На ўсялякі выпадак дадзеныя сваяка далучаю: *Stanisław Mockałło, urodzony 29/4/1916 r. w Białohrudzie k/Lidy — syn Piotra i Maryi ze Stankiewiczew, emeryt.* Яго адрас у Варшаве: *00–159, Warszawa, ul. Nowotki, 24a, m. 70.*

317. МІКОЛУ ТАРАНДУ

10 мая 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Такая ў мяне ўжо завялася мода, што сваіх гасьцей “даганяю” — лістамі... Учора вельмі рада была і Вас бачыць, і пазнаёміцца з новым наведвальнікам. Але абставіны былі такія непрыемныя, што я зусім разгубілася. Заместа пазнаёміць п. Ігара [Котава] з тым, што яму было б цікава як менчуку, паказала здымкі зьездаў...

А ў мяне ёсьць вельмі падрабязныя і дакладна напісаныя “Успаміны” — аб працы-жыцьці ў Менску ад восені 1915 г. да другой паловы ліпня 1918 г. Праца Беларускага таварыства помачы ахвярам вайны, усе прадпрыемствы, усе сустрэчы з мясцовай беларускай інтэлігенцыяй — дзеячамі... І адрысаваная Беларуская хатка.

Заснуць не магла — такая на сябе была злая... Але гэта можна паправіць, праўда? Рада буду, калі п. Ігар [Котаў] захоча прыехаць. Ня буду расказываць, а проста дам прачытаць напісанае... І ў такі спосаб “паходзім” разам па тагачасным Менску.

Учора атрымала ліст ад Алеся Мікалаевіча Белакоза — са сьпіскамі ўсіх новапрыдбаных экспанатаў. А я маю для яго ў аддзел народнай мэдыцыны рэцэпт ад радзікуліту. Рэцэпт сапраўды народны. Такім спосабам вылечылі Я. Шнаркевіча.

Усяго Вам добрага, дарагія гродзенцы, сябры “Паходні”. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава*.

318. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

16 мая 1987 г. Вільня

Дарагі Вячаслаў Міхайлавіч.

Сардэчна дзякую за віншаваньні са сьвятам вясны і за добрыя пажаданьні. Сяньня сапраўды адчуваецца вясна! Сонца, цёпла, усё зялёнае — і трава, і дрэвы. У нас і кветак цьвіце нямала.

А чаму Вы да гэтай пары не прыехалі? Ня толькі я, але і нашыя маладыя мастакі хацелі б з Вамі сустрэцца. Чуюся дрэнна, часам вельмі дрэнна. Тым больш хацелася б яшчэ пабачыцца з добрымі сябрамі.

Выбачайце, што так дрэнна напісана, цяжка будзе прачытаць, зразумець. Цяжка мне даецца гэты 95-ы год — хварэю. Рука ня слухаецца, дрыжыць. А пісаць трэба вельмі шмат. Стараюся ўсё выпаўніць, хоць не адзін чалавек, напэўна, злуе, што так блага напісана.

Усяго Вам найлепшага — у жыцьці і працы. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава*.

Кветкі на здымку — *дзівасіл* (бел.), *inula helenium* (лац.), *девясил* (руск.). Сьцябло — шэраватае, касматае. Лісьцё — цёмна-зялёнае. Кветкі — пялёсткі залаціста-жоўтыя; маладыя — сярэдзінкі выпуклыя, цёмна-жоўтыя, перацьвітаючыя, старыя — чорныя.

319. АДАМУ МАЛЬДЗІС

19 мая 1987 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Учора атрымала Вашую паштоўку. Дзякую. Не зусім разумею — ці міністр зарэагаваў *пазытыўна* ці *нэгатыўна*?

Нешта доўга ня маю весткі ад палешукоў-пчаляроў. Крыху непакоюся, бо пастанавілі саматугам рамантаваць страху на касьцёле — каб не залівала сьцен і сярэдзіны. Пісаў Мікола-пчаляр, што будзе шукаць "сьмелых хлапцоў". Ці ня сталася там якая бяда... Гэта ж такая вышыня, і дах, хіба, ледзь дыхае. Хоць ведаю і тое, што пры пасецы цяпер шмат работы — не адысьці.

А найгоршае — што трэба вясьці безупынную барацьбу з г.зв. кляшчом, які нішчыць пчолы. Прывязьлі некаліс гэтых кляшчоў з Тайляндыі. На Беларусі шмат пчолаў вынішчана ўшчэнт. А цяпер і ў Літве гэтая бяда зьявілася. Пры такой нагодзе мушу выясьніць, што, пішучы аб палескіх пчалярах, я крыху памылілася ў адрасе. Той касьцёл, дзе задумана стварыць музэй (ня толькі пчалярства, але і рыбалоўства, і паляўніцтва) не ў Пружанах, а ў Пружанскім павеце — в. Лінава. Мясцовыя ўлады ім спрыяюць, але як цяпер у іх — ня ведаю.

Меліся ў гэтым месяцы прыехаць па пчалярскую спадчыну с.п. Я. Шнаркевіча, але да гэтай пары німа. А можа, яшчэ дзе вандруюць па Украінскім і Беларускім Палесьсі, шукаючы сьлядоў *шэрай палескай* пчалы, каторую хочуць адрадзіць ва ўсёй чысьціні расы. Ня маючы вестак, усялякае думаецца.

Далі мне пачэснае імя *Маці беларускага пчалярства*. Вось я як *маці*, трывожуся за іх і іх справы. А можа, адзываецца ва мне ў канцы жыцьця тая капелька палескай крыві па маім прадзеду Ігнату Кулакоўскім — палешуку з паходжаньня?

Ой, сколькі забіраю Вам часу... Мусі, таму, што цярпліва чытаеце і адказываеце, бо ўдома мае гэтымі справамі зусім не цікавяцца. Нават не прабую гаварыць.

Усяго добрага! Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

P.S. Вось цікава — учора атрымала 4 лісты, 2 з іх адрасаваныя па-беларуску (і мясцовы адрас, і мой — віленскі), а 2 — па-руску... Калі адрасаваныя па-беларуску добра даходзяць, то нашто адрасаваць у чужой мове? *Л.В.*

320. МІКОЛУ ТАРАНДУ

19 мая 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Не вініце сябе ні ў чым. Ані позна прыехалі, ані мне ні ў чым не перашкодзілі. Спаць я не зьбіралася, бо ніколі раней як а 3–4-й раніцы не засынаю. Калі раней лягу, то таму, што ногі баляць, а часта і галава — ляжу і чытаю.

А непрыемна мне было за мой выгляд. І так стары чалавек, асабліва такі стары, як я, выглядае ня вельмі прыемна. Але, можа, хоць бы пачэсаны ды прызваіта надзеты, хоць і ляжачы. Дачка мяне заўсёды папераджае, нават калі не ляжу. Унук, калі тут са мной, таксама. Ну, а ад зяця — чаго хацець...

Толькі гэта было прычынай майго разнэрваваньня. А бачыць Вас і п. Ігара [Котава] (што я падумала, быццам ён мянчук — была прычына, бо меўся нехта з Менска прыехаць, і то праз Гродна, хто — ужо ня помню) ... Прыяжджайце ці

абодва разам, ці п. Ігар адзін — гэта як Вам будзе выгадней.

А здымак старога Гродна трэба абавязкова перафатаграфаваць. Гэта не аматарскі здымак. Бацька мой, закаханы ў сваё Гродна, узяў добрага фатографа-спэцыяліста, і разам хадзілі, выбіралі мейсца, адкуль найлепш горад выглядае. А я гэты пантонны мост з дзяцінства помню. Не адзін раз па ім ехала і трымалася за маму, як коні палахліва на ваду аглядаліся...

Маю я яшчэ старыя гродзенскія паштоўкі — можа, знойдзецца што для Вас незнаёмае. Яны старэйшыя, чым тое, што я магла бачыць сваімі вачамі. А можа, і яшчэ што Вас зацікавіць.

Вельмі прыкрыя весткі аб рэзультатах сплаву па Дзьвіне... Як гэтая падзея адбілася ў Менску — ня ведаю. Але, варочаючыся з Дзьвіны, у мяне шмат хто з удзельнікаў быў — чалавек 8 ці 9 — пад кіраўніцтвам Анатоля Наліваева. Быў разам нейкі мастак (у адзежы палешука, здаецца). Ён намаляваў нашую Лясную хатку. А Наліваеў расказаў усю імпрэзу вельмі дакладна. І аб песьнях Данчыка — таксама.

Дзіўная атмасфэра у Гродне... Скуль там сабралася такая варожая кампанія? Як пераканалася, у Менску гэтага німа.

Атрымала я ліст ад нейкага зусім незнаёмага пісьменьніка, нават прозьвішча яго зусім не беларускае. Піша мне, што напісаў кніжку пра Максіма Багдановіча (не падумайце, што А. Асташонак — яго я ведаю асабіста), і Алег Лойка зрабіў яму заўвагу, што ён ні словам ня ўспомніў *найлепшага* сябра Максіма — Аркадзя Смоліча... Я аж вачам сваім не паверыла — Смоліча ж і ўспамінаць нельга было!

Той пісьменьнік пайшоў да Ніны Барысаўны Ватацы. Тая таксама аб А. Смолічу нічога ня ведае... Ня ведаю як, мусіць, праз А. Лойку, дайшлі да перакананьня, што А. Смоліча толькі я адна добра ведала, і то аж з 1914 г. Вось той пісьменьнік пытаецца мяне, ці магу яго з асобай А. Смоліча пазнаёміць. Я адказала, што ахвотна але не лістоўна. Ніхто ня здолеў бы ўсяго апісаць. Маю біяграфію, бібліяграфію, здымкі і шмат лістоў. Няхай прыедзе з усім гэтым пазнаёміцца. Так і дамовіліся. Мае сваю машыну і зьбіраецца прыехаць.

Што дзіўна — пішуць цяпер, калі німа цэнзуры, аб А. Смолічу, як і аб А. Гаруну. Як жа гэта так? У Менску — можна, а ў Гродне — не?

Ад Вас толькі даведалася, што В. Стэх мае бранхіт, што 31/V будзе зьезд у Ракуцёўшчыне, і то з такой важнай праграмай... В. Стэх, напэўна, Вам хоць збольшага казаў, як тут у Вільні беларусы арганізуюцца? І я ведаю толькі тое, што Стэх мне напіша... Але ён, як быў здаровы, аб усім паведамляў мяне — аб усіх датах сходаў і г.д.

Яшчэ пару слоў аб А. Гаруну. Чаго ад яго можна хацець? Столькі гадоў у ссылцы... Вярнуўся зусім хворы. А ў Менску ён жа на сходах ніколі не адзываўся ні словам. Сядзеў ціха, толькі слухаў. Чым жа ён быў шкодны? Бацька — рамесьнік, матка — прачка...

Усяго найлепшага ўсёй "Паходні". З Вамі — да пабачаньня, і з п. Ігарам [Котавым]! Мілыя мне гродзенцы... Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

321. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

1 чэрвеня 1987 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Атрымала Вашую паштоўку. Дзякую. Я вельмі рада, што Мікола П[апека] напісаў Вам. Будзе адчуваць сябе больш упэўнена, маючы да каго зьвярнуцца — парадзіцца. І я ад яго ліст атрымала. На гэты раз — вялікі, падрабязны, нават здымак таго касьцёла прыслаў.

Ужо каля двух месяцаў жыве ў лесе каля пасекі. Піша: "Чуюся — як Рабінзон". Цешыцца, што ў лесе вельмі прыгожа, але адначасна бядуе: "Выйду ў лес — поўна кветак, а ня ведаю, як называюцца. Чую мноства птушак, а што за птушкі — ня ведаю". Калі выявілася, як аднабакова вялася навука, браў мой "Батанічны слоўнік" — зрабіць фотакопію не ўдалося. Дам другі раз. Але ж гэта помач невялікая, бо слоўнік не ілюстраваны.

З птушкамі рада знойдзецца. У адным з нумароў "Крывіча" ёсьць вялікі, паважны артыкул праф[эсара] – біялёга Тад. Іваноўскага "Намэнклятура беларускіх птушак". Апрача праф[эсара] падпісаны прозьвішчы В. Ластоўскага і Б. Тарашкевіча. Апошнія спэцыяльнай веды ня мелі, але ў мове маглі памагчы. Дам гэты "Крывіч" — зробяць фотакопію. Хоць фотакопія — гэта ня выхад. Каб гэта была магчымасьць зрабіць ксэракопію! Але такой магчымасьці німа.

Вельмі неспрыяльная пагода для пчолаў. І я бядую разам з Міколам [Папекам]. Бачыце, як я хутка вярнулася да пчалярскіх справаў. Што значыць — прывыкла ад дзяцінства гэтым цікавіцца.

У нас тут гутарка з Лявонам аб 27 чэрвеня, калі мае быць урачыстае адкрыцьцё тутэйшага Беларускага клюбу. Запрашаюць гасьцей з Гродна, Полацка і, вядома ж, з Менска. Думаю, што і Вы, пане Адаме, пацікавіцеся гэтым "нованароджаным" і прыедзеце.

Палажыла перад сабой пару лістоў, а пісаць — не магу. У мяне дзень да дня непадобны. Пару дзён таму добра, выразна пісала...

Усяго добрага! Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

322. МІКОЛУ ТАРАНДУ

3 чэрвеня 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст, за весткі, як прайшоў у Гродне вечар памяці Максіма Багдановіча. Як было ў Менску — я ўжо ведала. Напісалі мне супрацоўнікі Літ[аратурнага] муз[эю] М. Багдановіча, а апрача іх напісаў мне вялікі ліст Вал. Стэх, і то з Менска — седзячы ля помніка. Адчула, быццам і я там была... З музэю прыслалі мне запрасіны ў Ракуцёўшчыну. Вядома, гэта толькі форма. Усе ведаюць, што я ўжо нікуды ня рухаюся.

Пыталася я зяця (Лявона), як там выглядае Максімаў сад (па-мойму — парк). Падобна – жаль глядзець, большасьць дрэваў пасохла. А ён жа (парк) меў быць пад апекай самай блізкай школы. Вось і школа... І такіх на Беларусі больш.

Як я даведалася ад п. Данұты [Бічэль], што прыехала нявестка Ларысы Антонаўны [Геніюш] [1], то адразу сама гатова была плакаць. З лістоў Л. Ант[онаўны], а ў мяне іх шмат, я добра ведала, што гэта за асоба, якія былі

яе адносіны да Л[арысы] Антонаўны. Яна ж, прыяжджаючы, на вачах у Лар[ысы] Антонаўны перабірала ўсе яе рэчы і без пытаньня забірала вельмі каштоўныя дываны. Хлопчыкаў трымала каля сябе — каб часам бабка не "сапсавала" іх сваім уплывам...

Захочаце — прачытайце лісты Л[арысы] Антонаўны. Я іх, мусі, аддам у Гродна, а не ў Музэй-архіў — у Менску. Думаю, што калі б нават с.п. Ларыса Антонаўна напісала тэстамант — гэта не памагло б. Маглі б яго з той ці іншай прычыныануляваць. Спосабы знайшлі б. Дзівіць мяне вельмі, што дом Л[арысы] Антонаўны ня быў зачынены — апячатаны пасьля яе сьмерці. Там жа, хіба, ніхто ня жыў, хоць у Зэльве было нямала сваякоў др. Янкі Геніуша[2] (муж Л.А.) ... І нябожчыца з імі жыла ў прыязьні.

Цяпер што да маскоўскіх падзеяў і зацікаўленьня М. Забэйдам-Суміцкім. Усё залежыць ад Вас. У нас жа ёсьць альбом аб ім — здымкі, добры тэкст. А ў мяне пачка лістоў Міхася Іванавіча, бо мы з ім перапісываліся 7 гадоў — да яго сьмерці. Знайдзіце час (у выходныя, вядома), прыедзьце — зробіце запісы. Маю і яго кароткую біяграфію.

Што да гэтага калекцыянера — пісаць ня буду, але, як прыедзеце, дам эксьлібрыс, а капэртаў, адрасаваных да мяне, можа, і больш выберам — у мяне ж больш як 6000 лістоў, і ёсьць ад цікавых людзей: ад П. Мядзёлкі, Л. Геніюш, М. Забэйды, Ванды Лявіцкай (дачкі Ядвігіна), Гальяша Леўчыка і г.д. Няхай сабе мае... А можа, і *рускім* перастане быць?

У нас тут 27/IV — урачыстае адкрыцьцё Віленскага клюбу. Будуць запрашаць гасьцей з Гродна, з Менска, з Полацка, з Маладзечна. Вы, хіба, ад В. Стэха аб гэтым ведаеце?

І — да пабачаньня! Думала напісаць шмат лістоў. Напісала 2 і больш ужо не магу — ня пішацца... Усяго найлепшага — Вам і ўсім сябрам "Паходні". Сардэчна зычлівая — *Л. Война́кава.*

323. МІКОЛУ ТАРАНДУ

14 чэрвеня 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст. Няхутка на гэты раз адказываю. То нехта прыходзіць, то прыяжджае, то лісты, на якія трэба адразу адказаць. Прыслалі Вы "твор" Сташкевіча[1]... Гэта ўжо ня першы раз ён выпаўняе загад згары... І яго "працамі" верх, напэўна, задаволены. Хіба, яшчэ трэба чакаць нечага новага. Адзін раз ён і мяне зачапіў. Прыпісаў тое, чаго ніколі не было. Мяне добры чалавек успакаіваў: "Чаго Вы нэрвуецеся? Ці такі "гісторык" у нас першы? Ня першы і не апошні".

Вас перасьцерагалі перад віленчукамі. Здаецца, зьявіўся і тут падазроны, нікому няведамы чалавек. Яшчэ ўсяго можна чакаць. Магчыма, пані Данута Вам казала аб маім лісьце — у сувязі са зьмешчаным у "Нёмане" перакладам, зразумела — на рускую мову, успамінаў Барыса Мікуліча — пра М. Багдановіча... Якая агіда! Каму гэта трэба было і нашто — рабіць гэты пераклад і даваць яго ў "Нёман"? Я самой часапісі ня маю, але гэтую старонку перапісала ад рукі Н.Б. Ватацы і прыслала мне, пытаючыся: "Што Вы на гэта?".

Я Б. Мікуліча чытала раней — яго ўрывак "Вяртаньне". Напісана проста глупа, але ўсё ж ня так агідна... Зрэшты, удасца — пагаворым. Гэтаму Вашаму ка-

лекцыянеру нічога пасылаць ня буду. Калі што, то дам праз Вас. Гэта я так Вам напісала пад першым уражаньнем, а пасьля і сама раздумала.

Тут ідзе інтэнсіўная праца — падгатаваўчая. Зразумела, я ў гэтым удзелу не прыймаю, але В. Стэх паведамляе мяне аб кожнай дробязі. Лявон А [антонавіч Луцкевіч] прапануе назву клюбу — "Пралескі". Па-мояму, гэта наіўна, не па-мясцоваму. Апрача таго, ёсьць народны хор "Пралескі", хіба, да якога дзіцячага гуртка надаецца. Я В. Стэху казала, што прапанавалі б — "Крэмень". Гэта сымбалічна: стукнуць — іскры высеча, ды і ваду брудную фільтруе — ачышчае... Але думаю — пабаяцца... Ды ня кожны зразумее.

Нават тутэйшы малады мастак на "твор" Сташкевіча напісаў адказ — артыкул. Добра, разумна, палымяна, але ён не да друку — так, як той адкрыты ліст Белакоза. Ці гэта прыходзіць новая эра — твораў у рукапісах? Можа, удасца нам пабачыцца, пагаварыць — ёсьць яшчэ даволі цікавыя весткі з Менска...

Пішаце аб кіраўнічцы дзіцячага садка? Ці не аб Віялеце Яфіменка? Яна першая асьмелілася стварыць беларускую групу. Цікава, чаму цяпер забаранілі выводзіць дзяцей з дзіцячых садкоў? Калі ня так даўна іх выступленьні ў тэлебачаньні паказывалі? Якраз сьпевы і дэклямацыі? Аб гэтым пісаў мне Ар[сень] Сяр[геевіч] Ліс. Гэта яго дачка выступала, і ён на плёнку сабе запісаў.

Але хопіць займаць Вам час і напружываць сваю волю. Бо трэба прызнацца, што больш у мяне моцнай волі, чым фізычных магчымасьцяў. Усяго найлепшага Вам асабіста, "Паходні" — усім яе сябрам. Зычу далейшых цікавых сустрэчаў. А пакуль што — пішыце, не забывайце. Сакольска-гродзенская душа на выгнаньні — *Л. Сівіцкая-Войцікава.*

324. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

1 ліпеня 1987 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Загадзя хачу выбачыць, што займу Вам крыху часу сваімі асабістымі справамі. Маю ў Варшаве далёкіх сваякоў. Гісторыі гэтай вялікай сям'і апісываць ня буду — шмат часу заняло б. Але самы малодшы з іх, карыстаючы, што цяпер можна запрасіць і далёкіх сваякоў, і знаёмых, просіць мяне (больш нікога тут ня мае), каб выслаць яму запросіны, бо хацеў бы паехаць на магілу свайго бацькі і мейсца свайго нараджэньня — у Белагруду пад Лідай.

Думала, што ўдасца зрабіць гэта праз Гродна — ня выйшла. Тут у Вільні рабіць стараньняў ад майго імені няма каму, а я сама ўжо сапраўдны інвалід. Больш 10 год ня рухалася са свайго лесу. Ды каб запрасіць у Вільню — ці змог бы адсюль паехаць на Беларусь? Як ні абдумываю ў Вільні — пасьля апошніх падзеяў ніхто мне дапамагчы ня зможа і ня схоча. Як думаеце, ці не было б магчымасьці выклікаць яго праз Менск? На жаль, ён не беларус, хоць паходзіць з Беларусі.

Яго дадзеныя: *Станіслаў, сын Пятра, Моцкалло.* Гадоў — 78. Былы сьпявак Варшаўскай філярмоніі. Заслужаны, шмат аб ім пісалі. Іграў на піяніне, маючы 5 год. Цяпер яго сын таксама сьпявае і кампазытар. Дачка вывучыла мовы — швэдзкую, фінскую і г.д.

Пішу яму: "Май цярплівасьць — раблю, што магу". Але што я магу? Калі нікога з маіх гэта абсалютна не абходзіць. Тым больш знаёмых.

Праўду сказаць, надзеі ня маю, але папрабаваць і гэтай дарогі трэба. Пры-

кра, што Вас турбую, але ўжо такая мая доля, што я ў шмат якіх выпадках зусім адзінокая.

Магчыма, гэты ліст і не застане Вас удома. Цяпер жа час адпачынку. Як справы са "Слоўнікам"[1]?

З сардэчнай зычлівасьцю і павагай — *Л. Война́кава.*

325. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

14 ліпеня 1989 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Думала-думала і дайшла да перакананьня, што маеце рацыю — варта было б мець куток у Вашым музэі. Не таму, што лічу сябе вартай музэю, а што была б спакойная за атрыманыя ад людзей лісты, а іх тысячы. Вядома, адкінуўшы тыя — ад маіх бліжэйшых ці далейшых сваякоў (яны засталіся б у сям'і), але ад П. Мядзёлкі, М.І. Забэйды-Суміцкага, Мар'яна Пецюкевіча, Язэпа Найдзюка (Александровіча), Пятра Ластаўкі, Зыгмунта Абрамовіча, Адольфа Клімовіча і г.д. Можа, ня ўсе вартыя былі б перахаваньня, але гэта ўжо не мая справа. А што варта было б Вам прыехаць з фатографам ды зрабіць фотакопіі з розных здымкаў, да якіх я магу даць камэнтарыі,— гэта факт. Вядома, альбомы ды іншае астаюцца ў сям'і да іх далейшай волі. Галоўнае для мяне — лісты.

Ізноў — дажджы. Ані пахадзіць, ані зёлкі пазьбіраць. А чым менш хажу, тым ногі горш дзеюць. І галава баліць. Ды і розныя непрыемныя падзеі, неспакоі — ёсьць чаго нэрвавацца.

Хачу адказаць на ліст п. Міколы Таранды — можа, удасца гэта зрабіць. Але, хіба, адлажу на заўтра. Ужо даволі позна. Вецер абсушыў расьліны — пайду нарэжу сардэчніку, крыху рамонку і лягу. Мо зноў спаць ня буду да раніцы, буду чытаць.

Чакаю — пішыце або прыяжджайце. Сардэчна цалую. Шчырыя прывітаньні ўсім сябрам "Паходні". *Л. Войцікава.*

326. МІКОЛУ ТАРАНДУ

17 ліпеня 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Яшчэ, мусі, ні разу не запозьнілася я так з адказам... Выбачайце. Хіба ад п. Дануты [Бічэль] і п. Ігара [Котава] ведаеце менш-больш, што тут у мяне. Нічым добрым пахваліцца не магу. Рука ня хоча пісаць, ногі ня хочуць хадзіць... Учора цэлы дзень ляжала. Сяньня — крыху лепш. Добрая пагода, можа, і пахаджу больш, пазьбіраю зёлкі.

Найгорш, што тут людзі не такія разумныя, як у Вас. Ад часу, як зьявіліся шматлікія перадрукі "твору" Ст[ашкеві]ча, у нас ніхто не бывае. Ні інжынер, ні мастакі... Мусі, і дарогу забыліся. Раней інжынер калі ня мог прыйсьці, то хоць лістоўна паведамляў мяне, як і што робіцца ў справе клюбу. Бо свае хатнія ня маюць звычаю чым-небудзь дзяліцца...

Вось і сяджу і толькі ад выпадковых гасьцей што-небудзь даведываюся, і — як ні сьмешна — з Менска, ад А. Мальдзіса. Бо ён мне піша — хто аб чым

гаварыў яму па тэлефоне. Сьмешна? Але і горка... Што ж, мне трэба і з гэтым пагадзіцца.

Вам за ліст, за падрабязныя весткі, шмат у чым і добрыя — сардэчна дзякую. Днямі мела надзвычайна сардэчны ліст з Масквы ад Аляксея Каўко. Ці Вы яго ведаеце? Ён быў блізкім прыяцелем с.п. М.М. Улашчыка. Ведаю яго асабіста — прыяжджаў ня раз. Добры, шчыры беларус, чалавек разумны і карысны. Ён дагэтуль нічога ня ведае аб студэнтах-беларусах Маскоўскага ўнівэрсытэту. А мог бы для іх быць вельмі карысным шмат у чым. Сам ён зацікавіўся гэтымі студэнтамі і прасіў аб адрас хоць аднаго з іх.

Ён, Аляксей Канстанцінавіч [Каўко], у пэўнай меры мог бы замяніць і самога М.М. Улашчыка, дапамагчы шмат у чым. Як думаеце? Ці мне прышліце адрас якога студэнта (адзін з іх быў у мяне, але я тады неяк доўга ня мела ад А. Каўко весткі, то і не ўспамінала аб ім). Ці я Вам на ўсялякі выпадак пасылаю адрас маскоўскі А.К. Каўко. Гэта — як самі пастановіце.

З якой цікавасьцю і задавальненьнем чытала аб Вашай працы! Аб Вашых суботніках на Гараднічанцы — такой добрай волі гродзенскай моладзі!.. Здаецца, бачу, уяўляю сабе, як гэта адбываецца... Крапівы німа чаго баяцца — пячэ, але і ад усялякіх рэўматызмаў і артрытызмаў лечыць — абы ня выклікала алергіі. А вось ўсялякія скалечаньні, драпіны трэба дэзынфікаваць і залечываць — гэта можа быць небяспечным.

Быў у мяне учора М. Стома — музыка. Ад яго я даведалася, што справа тутэйшага клюбу ізноў адкладаецца... Ці паведаміў Вас аб гэтым В. Стэх?

На гэтым скончу. Пайду пахаджу, пакуль сонца сьвеціць і грэе. Усяго добрага Вам і ўсім сябрам "Паходні". Сардэчна зычлівая і адданая *Л. Войцік.*

327. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

21 ліпеня 1987 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Ліст Ваш атрымала. Дзякую за весткі аб магчымых зьменах на лепшае. Я аб выступленьні Пячэньнікава[1] не чытала — ня ўсе газэты даходзяць да маіх рук. Цікава, як адбылася сустрэча з рабочымі, якія запрасілі "Паходню"? Пішаце, што ў кнігу водгукаў пісаліся па-руску? Гэта ж нармальна. Цэлыя трактаты пішуць аб мове, выступаюць, радзяцца, а ўдома кожны дзень карыстаюцца чужой мовай. Гэтак нават у сем'ях заслужаных пісьменьнікаў. А ёсьць і такія, што ўважаюць за добрую справу ўводзіць у беларускую мову як найбольш русіцызмаў, бо ад гэтага беларуская мова "багацее".

Што да Вашага прыезду з фатографам — якая можа быць гутарка? Вядома, прыяжджайце — буду рада. Але добра было б папярэдзіць. Гасьцей-ленінградцаў ужо даўна німа — выехалі. Арыгінальная сям'я. Старэйшая жанчына Маня абсалютна не цікавіцца і не цікавілася ніколі беларускай мовай. Яе дачка Маргарыта[2] хоць гаварыць ня ўмее, але цікавіцца літаратурай беларускай — чытае. Калісь прасіла мяне аб што-небудзь М. Багдановіча, а цяпер я ёй дала "Краю мой — Нёман". А родная сястра Мані і яе сям'я жывуць у Амэрыцы, яна адтуль цудоўна піша па-беларуску. З гэтай сям'і паходзіць сьпявак Данчык, яго бацька — украінец. Вось прыедзеце з фатографам — папрашу выняць з групы здымак Данчыка, бо шмат хто хацеў хоць здымак пабачыць.

Зайздрошчу, што вучыце ўнука беларускай мове, а я не магу мець

ніякага ўплыву на тое, каб мой праўнук мог ведаць, як павінна быць, дзьве мовы — бацькі і маткі. Спачатку называлі малога Алесь, цяпер ужо імя зьмененае на літоўскі лад. Перада мною скрываюць і таму аб дзіцяці гавораць проста — малы...

Лекі і парады ад Ігара Котава я атрымала. Лекі ўжо канчаю. А ад п. Ігара мела мілую вестку ўжо з вайсковых збораў. Зараз напішу хоць некалькі слоў. Пану Міколу [Таранду] доўга не адказывала, але ўжо напісала.

Сяджу адна, бо Галя і Лявон зьбіраюць ягады — дзень у дзень. Раніцай Галя ідзе па пазёмкі (я таксама такую назву вынесла з Сакольшчыны), а па абедзе абое ідуць па чарніцы. Мяне забясьпечылі, дзьверы зачынілі на ключ, а акно аставілі адчыненае. Але я ня маю да яго доступу, бо Лявон заставіў пакой сталамі.

Вельмі сяньня горача, +26. Баліць галава, пішу нязграбна, прапускаю літары, не канчаю слоў. Самой непрыемна.

Цалую сардэчна. Сябрам "Паходні" — шчырае прывітаньне. *Л.В.*

328. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

25 жніўня 1987 г. Вільня

Дарагая пані Дануся.

З цэлага сэрца дзякую за кніжку, за дэдыкацыю, якая мяне моцна ўзрушыла. Прыкра мне, што з такім спазьненьнем. Усё таму, што дрэнна чуюся. Не пералічаю недамаганьняў, бо п. Мікола Таранда, напэўна, Вам раскажа. Зусім расклеілася. Ды і розных непрыемнасьцяў хапае. Як на мае гады, то і зашмат іх.

Чытала Ваш ліст і старалася ўявіць сабе, дзе будуць жыць Вашы родныя і дзе — Вы. Толькі што ня ведаю, дзе тая вуліца Каліноўскага? Як яна раней называлася? Можа, ведаеце? У адным з будынкаў недалёка ад Фары на — цяпер Маркса, а даўней Брыгіцкай — жыла мая дзядзіна з сынкамі, а на другім баку — мая цётка, а ў 1909 г., як я прыехала з Кіева ў Гродна, то таксама жыла з мамай на Брыгіцкай процiў муроў, якія аблагараджвалі агароды брыгітак. Як бачыце, Брыгіцкая — гэта мая сямейная вуліца. Ды і кляштар Брыгіцкі — таксама.

Разумею, як Вам непрыемна было пакідаць сваю выдатную кватэру. У кожнай кватэры частка чалавечай душы застаецца. Каб Вы змаглі ўявіць сабе, сколькі я за жыцьцё перамяніла ня толькі кватэраў, але гарадоў, дзе жыла! Хіба, паверыць цяжка.

А вось пералічу: радзілася ў Мяджыбажы, пасьля жыла ў Воліцы каля Старога Канстантынава. Далей — Віньніца, Луцк (гэта на Валыні), Кіеў — з перарывамі, Гродна, Мінск, Вільня — горад пад Вільняй Калёнія Каляёвая (сяньня Павільнюс) — 10 гадоў, потым — у лесе, дзе цяпер. Значыцца, 10 мейсц жыхарства! Ня лічачы, хіба, галоўнай для мяне базы — дзедавага фальварку Альхоўнікі. За ім і сяньня тужу. Адусюль нешта засталося, што з памяці не выветрываецца. Кватэраў — і далічыцца цяжка. А магілы? Па ўсім сьвеце. А я нават на самых блізкіх не магу быць. Толькі па сьмерці.

Ну, але трэба канчаць, каб не дагаварыцца да яшчэ больш сумнага. І так даруйце за такі непрыемны ліст. Вельмі горача, +25°. Галава — як чыгун, цяжкая і баліць. А лістоў, лістоў... На добры лад трэба было б сакратара мець.

Цалую сардэчна і яшчэ раз за кніжку дзякую. Ваша *Л. Войцікава*.

P.S. А мая кніжка мае толькі плян і, мусі, на пляне і скончыцца.

329. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

3 верасьня 1987 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Вашую паштоўку з дня 2 сакавіка атрымала. Дзякую. Усе Вашыя так каштоўныя па зьмесьце-выяве паштоўкі ідуць у мой спэцыяльны этнаграфічны альбом.

Ці былі ў Міколы-пчаляра кінаапэратары? Ня ведаю, бо і сам Мікола маўчыць, як закляты... І па пчалярскую спадчыну не прыяжджае.

Найбольш баюся за такія рэчы, як статут "Пчалы" і ўнікальныя кніжкі — "Пчолы" Я. Пачопкі і "Пчаліна — жывёлка малая, а карысьці дае многа" Г. Бярозкі[1] — з 1911 г. Каб гэта ўжо музэй існаваў — рэч іншая, а так... Я яму дала зрабіць фотакопіі для альбома, які ён меў рыхтаваць. А цяпер нічога ня ведаю. Я ж ня вечная... А пасьля мяне — хто ведае, што з гэтым усім будзе? Бо якраз ні пчалярства нікога не цікавіць, ні Т[аварыст]ва "Пчала". Усё можа спакойна зьнікнуць...

Ці добра адпачылі ў Доме творчасьці? Мяне яшчэ памаленьку ногі носяць. Каб хоць што-небудзь рабіць, зьбіраю лекавыя зёлкі — папаўняю зялёную аптэку. Мо хто калі скарыстае...

Усяго добрага! Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава*.

330. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

3 верасьня 1987 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Школьны год пачаўся, і я ўжо напэўна ведаю, што ўсе на мейсцы. Як жа прайшло Ваша лячэньне? Ці былі добрыя рэзультаты? У якім стане знайшлі пані Марыю? Надвор'е то было вельмі рознае. Ведаю па сабе...

У прошлым тыдні атрымала ліст ад У.І. Содаля з Бел[арускага] тэлебачаньня, у якім ён піша, што, спатыкаўся з Г.В. Кісялёвым і Г.І. Гарэцкім[1], і гаварылі аб Ф. Шантыры і маім с.п. сыне. У адказ я ім прыпомніла, што сёлета 100-годзьдзе нараджэньня Ф. Шантыра. Даты дакладна ня помню.

Я мела надзею, што выдавецтва да 100-годзьдзя выпусьціць з друку кніжку-зборнік, і гэта было б добра. Але ж выдавецтва чамусьці адлажыла выпуск зборніка на 1988 год. Таму я запрапанавала Содалю хоць у "Родным слове" ўспомніць гэты факт. Прасіла, каб парадзіўся з Г. Кісялёвым і Г.І. Гарэцкім. Паміж іншым, Генадзь Васілевіч Кісялёў, як жыў у Вільні, часта ў нас бываў, яны з маім с.п. сынам шчыра сябравалі.

Прыйшло мне ў галаву, што, можа, і Вы захочаце ўспомніць 100-годзьдзе Ф. Ш[антыра]? Ці на Гродзенскім тэлебачаньні, ці хоць бы на спатканьні ў клюбе "Паходня". Тым больш, што Вы і з матэр'яламі зборніка Ф.Ш. знаёмыя. А ў Менску то, мусіць, і аб зборніку — што ён гатовы — ня ведаюць...

Як Янка Саламевіч ўзяўся кніжку рыхтаваць, я дала ня толькі свае ўспаміны, але і ўсе лісты Ф. Ш[антыра] да мяне. Кніжка апрацаваная, а лісты мне не вярнуліся. Дзіўна... І ня вельмі прыемна... Усё ж гэта мая ўласнасьць.

Вы ўжо забыліся, як чытаюцца мае ерогліфы, і на пачатку будзе цяжка. Маю надзею атрымаць адказ.

Сардэчнае прывітаньне Вам і сям'і. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

331. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

12 верасьня 1987 г. Вільня

Шаноўны пане Адаме.

Прыяжджаў у Вільню Мікола-пчаляр. Забраў частку пчалярскай спадчыны Я. Шнаркевіча. Мае прыехаць па рэшту. Я яму аддала ўсе, што ў мяне былі, іншамоўныя пчалярскія часапісы, якія "Бел[аруская] борць" атрымлівала ў абмен. Гэта ўкраінскія, чэшскія і інш. І раней дала яму іх вялікую колькасьць, у тым ліку польскія. І раней яшчэ дала яму такія ўнікальныя кніжкі, як "Пчолы" Янкі Пачопкі, яго ж "Агародніцтва", "Пчаліна — жывёлка малая, а карысьці дае многа" аўтара Г. Бярозкі, выданьня 1911 г. у Пецярбургу.

Аддала з тым, што атрымаю фотакопіі гэтых кніжак, каб хоць які сьлед у мяне быў. Праўда, копію "Пчалы" прывёз. Друк добра выйшаў. Апраўлена ў цьвёрдую вокладку, але ў сярэдзіне неяк неахайна выглядае — поўна пустых белых старонак. Што ж, работа аматараў.

Але баюся, што мы з Міколам пасварымся. І то — за назоў расьліны... Ведаю, што гэта не па Вашай часьці, але, магчыма, і не зусім незразумела. Гэтая расьліна — тое, што, на жаль, пісьменьнікі, паэты і г.д. бяздумна называюць рускім тэрмінам *одуванчик* (адуванчык), або польскім — *дзьмухавец* (dmuchawiec). А я, запісываючы па вёсках Гродзеншчыны назвы да свайго слоўніка, ужыла падказаную мне назву *малачай*. Мікола кажа: малачай — гэта зусім што іншае. А малачаяў ёсьць ні менш-ні больш — 400 адменаў. У нас на Беларусі варыянтаў назваў ёсьць шмат. Гэты самы мой малачай называюць яшчэ *багаткай*. І гэта Міколе-пчаляру падабаецца. А мяне абвінавачывае, што гэта я распаўсюджвала неправідловую назву *малачай*. І сьмешна, і глупа...

Цяпер, плянуючы (калі яшчэ пасьпею) зрабіць батанічны ілюстраваны даведнік для дзяцей, хачу разаслаць анкету, хоць праз школы вясковыя — як гэтыя расьліны (расейскі *одуванчик*, польскі *dmuchawiec*, або яшчэ *mniszek lekarski* — лац. *taraxicum officinek*) у іх называюць. Ці гэта што дасьць? Ня ведаю. Бо ў нас мова (у галіне батанікі) такая ўжо засьмечаная, што ні празаікі, ні паэты, не задумываючыся, ужываюць чужаземныя назвы.

Выбачайце, што такой тэмай Вас турбую. Абсалютна ня маю з кім пагаварыць, з кім парадзіцца. А браць усё на сваю адказнасьць? Скажуць: "Такая старая, што яна там разумее"... А хочацца яшчэ нешта зрабіць карыснае, і — баюся, ня маючы ніякай падтрымкі ці парады. Пасьля "сташкевічаўскай" бомбы ў нас ніхто не бывае — як зачумлёныя. А ў канцы канцоў — пры чым тут я?

Паўстаюць праблемы, з якімі німа з кім падзяліцца. Зможаце адказаць? Буду рада і ўдзячная. А калі не? Ну што ж...

Усяго добрага ў жыцьці і працы. Сардэчна зычлівая — *Л.В.*

332. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

17 верасьня 1987 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст — хутка яго атрымала. Цешуся загадзя, што пабачу Вас і п. Марыю ў сябе. Можа, удасца пагаварыць і на тыя тэмы, што мяне моцна турбуюць. Вельмі хочацца, каб Вы глянулі на мае праблемы вокам крытыка. Удома ня маю з кім падзяліцца.

Гэты, можна сказаць, двухзначны матэр'ял падкінуў мне Янка Саламевіч.

Я вельмі хацела, каб прыехаў, але ведама, якое ў яго сямейнае няшчасьце (сьмерць бацькі) і якая занятасьць паважнай работай. Ня мела сумленьня яму дакучаць.

Перажываю непрыемна той тлум, які робіцца вокал майго юбілею. Для мяне больш значыць мая праца з бежанцамі, а пасьля ў Вільні — пры арганізацыі "Пчалы", пчалярскага таварыства, чым уся г.зв. творчасьць. Бо тут сапраўды хваліцца німа чым. Сабраны матэр'ял для другога — большага — зборніка таксама ня цешыць. Тым больш, што зроблены плян, і тым скончылася. Ды і ў пляне тым — драбяза...

Але хопіць. Нейк рука зусім ня хоча пісаць, нават не магу трымацца лінейкі — вылажу то ўніз, то ўверх. Мусі, і надвор'е шкодзіць — то бура з перунамі, то дажджы і вялікі вецер.

Хіба можна сказаць "да пабачаньня"? А пакуль што — усяго добрага ўсёй Вашай сям'і. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

333. МІКОЛУ ТАРАНДУ

5 кастрычніка 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Вельмі ня маю часу, але хоць некалькі слоў хачу напісаць. Сумна было, што ні Вы, ні п. Данута Бічэль не маглі прыехаць. Але, паміж іншым, прыяжджаў Аляксей Каўко! З якім даўна ня бачыліся. Вельмі добра, цёпла адзываўся аб Вас.

Шкадую, што ня ведала аб Вашай падарожы на Беласточчыну. Папрасіла б заехаць у Новы Двор на былой Сакольшчыне — маёй Сакольшчыне. Там, у Новым Двары (вельмі добрая туды аўтобусная камунікацыя), жывуць яшчэ людзі, якія помняць маю сям'ю і працу Гуртка беларускай моладзі. Усё ў іх памяці жывое, а беларускі патрыятызм вельмі моцны.

Пішаце аб дзейнасьці студэнтаў-беларусаў у Польшчы. А ці Вы чыталі нумар "Нівы", у якім студэнты яўна супольна з царквой лічаць толькі праваслаўных (і гэта ў век атэізму) беларусамі? А каталікі (я ж каталічка, і таму баліць) быць беларусамі ня маюць права? Адкінутыя — як ворагі? Як гэта разумець? Ці Вы ў Гродне ў "Паходні" таксама прытрымліваецеся такога падзелу?

Ёсьць і ў Менску такія этнографы, якія лічаць што ў вёсках з каталіцкім насельніцтвам німа патрэбы шукаць беларускай песьні, бо яны яе ня ведаюць. Абсурд... У Сакольшчыне вёскі былі пераважна каталіцкія і зрэдку мяшаныя. А якая была высокая сьведамасьць, якая пашана да мовы, песьні, звычаяў! А цяпер дачакаліся... Ня маем права быць беларусамі. І гэта дзейнасьць студэнтаў — людзей адукаваных...

Ну хопіць... Выбачайце за "выбух". Удома падзяліцца думкамі німа з кім. Не разумеюць. Сардэчна зычлівая — *Л. Войцікава.*

334. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

10 кастрычніка 1987 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

З цяжкім сэрцам чытала Ваш ліст. Спачуваю Вам і добра разумею. Як можна працаваць у такіх абставінах? У невыгодзе, у неспакоі за дзіця... Для мало-

га гэта самы небясьпечны час, бо ўсё перажытае адбіваецца на яго псыхіцы, на нэрвовай сыстэме. Вельмі цяжка гэта ўсё пазьней залячыць, зьмяніць. А пры кім Вы Стасіка астаўляеце, калі выходзіце? Няўжо аднаго? Ці ня маеце якой знаёмай старушкі, якая змагла б хоць на пару гадзін прыходзіць? Ці надоўга выехала маці малога? А дзе ж яго бацька?

Дзякую за юбілейныя пажаданьні. Я дагэтуль не магу выдыхаць гэтых урачыстасьцяў. Столькі людзей прыходзіла-прыяжджала... А як у такі час адчувала я сваё калецтва — глухату... На вялікі жаль, мала хто гэта разумеў.

Лістоў — безьліч. Мала каму магу падзякаваць асобным лістом. Прасіла "Літаратуру і мастацтва" зьмясьціць маю падзяку на старонках тыднёвіка. Ці зробяць гэта? Ня ведаю. Нікога знаёмага сярод рэдакцыйнага калектыву ня маю. Цяпер даволі часта ляжу. Цяжка даецца далейшае жыцьцё. Так ужо хочацца дачакацца канца...

А навакольле такое прыгожае. Сапраўдная залатая восень. Шкада толькі, што няма сонца. Учора ляжала цэлы дзень. Сяньня хоць на некалькі лістоў адкажу. А што будзе заўтра? Ня ведаю... Баляць галава, ногі, страўнік. Як на мае гады, хіба, хопіць, каб і добры натрой зьнікнуў.

Калі прыйдзе для Вас "добры час", і зможаце прыехаць — буду рада. Я зноў дастала 2 вершы с.п. Ларысы Антонаўны [Геніюш] — з 1950 году. Цікава, ці Вы іх маеце? А што з тым, які Вы ў мяне ўзялі — зрабіць фотакопію? Я, магчыма, зрабіла вялікую памылку і цяпер бядую.

Быў у мяне В. Ягоўдзік (з дачкой). Казаў, што мае намер пісаць працу аб Ларысе Антонаўне. Прасіў пазычыць для прачытаньня яе лісты. Я дала. А цяпер вельмі непакоюся, ці ўдасца атрымаць іх назад...

Якая экіпа з тэлебачаньня ў Вас працавала? З мясцовага ці менскага? Калі з менскага, то я шмат каго ведаю асабіста. Былі ў мяне і цяпер — на юбілеі. Але паміж тэхнічнымі работнікамі ёсьць і расейцы, і то ленінградцы. Сваіх людзей не хапае ці што?

Шкадую Вас, што будуць мучыць мае каракулі. Цалую сардэчна. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

335. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 16 кастрычніка 1987 г.

Дарагі пане Алесь[1].

На самым пачатку просьба — пішыце мне: *пані Людвіка* ці *цётка Людвіка*, а не па чужому звычаю — *па-бацьку*. Мы *па-бацьку* не называліся ані ў Гродне ў Беларускім гуртку моладзі, ані ў Менску ў 1915–1918 гадах. Не тытулаваў нас так і Максім Багдановіч, або мы яго... Ці згаджаецеся?

А цяпер да справы, якая Вас цікавіць. Максім Б[агдановіч]ч ужо сам у сваіх словах "Як я быў маленькі" дае поўны адказ... Што ён мог помніць? Яго бацька (ня помню, у якім мейсцы сваіх твораў) пісаў, што вадзіў сына над Нёман... Але ж пісаў, што падчас апошніх хвілін жыцьця маці і пасьля яе сьмерці Максім сядзеў бяз рухаў на адным мейсцы, як прыкаваны.

Вось гэта, гэтыя падзеі, гэты час засталіся ў яго памяці. У працягу 5 месяцаў у Менску ня помню, каб ён пытаўся ці гаварыў аб Гродне. Гэтая гутарка на вуліцы, калі мы з Максімам праводзілі маю гродзенскую сяброўку (а ў той час сястру міласэрдзя на фронце) на вакзал, была *адзінай.* Хоць, як ведаеце

з маіх успамінаў “Пяць месяцаў у Менску”, мы бачыліся кожны дзень, і то не па адным разе.

Свае “Успаміны” я старалася пісаць дакладна і падрабязна. За прысланую паштоўку сардэчна дзякую. Шкадую, што не змагла пабачыць Вашыя калекцыі.

Гродна мне вельмі дарагое і як родны горад с.п. бацькі, і як у пазьнейшы час мейсца маёй навукі і працы Гродзенскага гуртка беларускай моладзі.

Усяго Вам добрага! Вялікага плёну ў краязнаўчай працы. Сардэчна зычлівая — *Л. Войцікава.*

336. АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ

18 кастрычніка 1987 г. Вільня

Дарагі, паважаны Алесь Мікалаевіч.

Пішаце ў апошнім лісьце, каб Вам не адказываць, бо ня маю часу. Іншыя могуць пачакаць, а Вам ужо на 3 лісты не адказала, аж сумленьне мучыць.

Я ўжо ведала ад Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча], што Вы будзеце ў шпіталі. Ну і вядома, занепакоілася. Як гэта нядобра сталася, што Вы ў свой час не змаглі прыехаць і падлячыцца тут, у Вільні. Усё ж экспэрымэнтальны інстытут, дзе працуюць спэцыялісты,— гэта зусім іншае, чым гродзенскі шпіталь.

Я ўжо крыху адпачыла ад юбілейных урачыстасьцяў. І не спадзявалася, што будзе столькі лістоў, тэлеграмаў, гасьцей. Нават людзей зусім дагэтуль незнаёмых. Затое некалькі чалавек, даўна і добра знаёмых, не адгукнуліся.

Вашых лістоў маю аж тры. З 14 верасьня (з копіямі лістоў да Целеша і ў Віцебск), віншаваньне з 25/9 і цяпер — з 12/10. Сардэчна дзякую за павіншаваньні, за добрыя словы, за пажаданьні. Што да першага, з копіямі. Цікава, ці хто адказаў? Напрыклад, з Віцебска? Мне Целеш толькі пісаў, што зьбіраецца прыехаць у лістападзе.

Апошні Ваш ліст закрануў справу крэменю. Я сваіх і не пыталася, ці *гега* — гэта не літоўскае слова, бо, паглядзеўшы слоўнік В. Ластоўскага, пабачыла, што гэта назва гродзенская. Выпісываю ўсе гэтыя назвы са слоўніка. Лічу, што В. Ластоўскаму можна верыць.

Да гэтай пары цёпла, нават верасьнёвых прымаразкаў не было. Лісьцё ападае, асыпаецца — жоўтае, залацістае, чырвонае. А кветкі яшчэ цьвітуць, і зёлкі зьбіраю — сушу. Ногі баляць, але стараюся хадзіць, каб не застаіваліся. Учора ці пазаўчора быў у мяне сакратар “Паходні” Мікола Таранда. Казаў, што іх сябра — мэдык — мае для мяне нейкія лекі. Ён мне раз ужо памог. Можа, і цяпер нешта добрае парадзіць.

Дачка працуе 2 дні ў тыдні, Лявон — амаль кожны дзень, але па 2–3 гадзіны. Дачка займаецца гаспадаркай, абое — агародам. Але, як заўсёды, яны разам удваіх, я — асобна, адна. Слаўкі ня бачыла ўжо 2 тыдні. Аж крыўдна. Цяпер, магчыма, будзе крыху радасьці. Мая адзіная сваячка, што жыве ў Варшаве, дастала запросіны ад сваякоў свайго бацькі — у Каўнас. Ну, а адтуль і да мяне можа прыехаць. Я яе ўжо 60 гадоў ня бачыла, але карэспандуем стала, без перарываў. Можа, гэта сустрэча і зьдзейсьніцца? А зрэшты, хто ведае?

У мяне яшчэ адна навіна, хіба, добрая. Калі ня будзе ніякіх перашкодаў, мы ўтраіх з тутэйшымі маладымі мастакамі будзем рыхтаваць кніжку

для дзяцей, каляровую — расьліны з беларускімі назвамі (гэта справа мая), а мастакі малююць расьліны і казюлькі, напрыклад, на медадайнай расьліне — пчалу і г.д. Крыху тэксту дам я. Калі гэта ўдасца, буду вельмі рада.

Хіба, на гэтым скончу, бо сяньня ўжо 7-мы ліст. Калі зможаце, пішыце, як чуецеся, як Вас лечаць, чым? Можа, зьвязацца з др. Кутаргай? Напісаць яму? Чакаю весткі. Зычу як найлепшых вынікаў у лячэньні. Ад маіх — прывітаньне. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава*.

337. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

19 кастрычніка 1987 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, за газэту, за Ваш артыкул. Ён аж залішне добры — такі прыхільны, сардэчны. Можа, больш чым я заслужыла. Усё ж ня ўсё ў мяне ладзілася, як трэба.

У тыя часы была даволі адзінокая, без падтрымкі, бяз помачы, сярод ледзь не індыйскіх кастаў. Мала адчуваецца, што нешта скарочана ці выкінута. Разумею (сама перажывала такое), як аўтару крыўдна бачыць сваю працу пакалечанай, але ня думаю, каб хто з чытачоў што заўважыў. А што бяз здымкаў — малая бяда.

Добра, што ў Вашым артыкуле німа памылак, як у іншых аўтараў. Напрыклад, падаюць, што я ў Менску была да 1924 г. У іншым артыкуле: "Як сям'я вярнулася ў Гродна, бацька вадзіў дзяўчынку і паказываў" і г.д. Ды адначасна — аб "навуцы ў Кіеве". Адно непаразуменьне. І як гэтага ня бачаць рэдактары і пускаюць такую бессэнсоўшчыну ў друк?

У Вас (апрача верша ў "Падсьнежніку", аб чым Вы ведаеце) адна памылка, як, зрэшты, і шмат у каго паўтараецца. Быццам я ў грамадаўскай прэсе была "сакратаром". У нас такой функцыі наагул не было.

Я была проста адміністратаркай. У маіх руках былі фінансы (атрымлівала ад Пасольскага клюбу 4,5 тысячы ў месяц). Купляла паперу, расплачывалася з друкарняй, наборшчыкамі, карэктаркай, экспэдытарам, поштай... Кожны месяц давала паслам (дакладней — Раку-Міхайлоўскаму) пісьмовую справаздачу. З рахункамі, расьпіскамі і г.д. Усё — далёкае мінулае...

Адно прыкра, што ў Гродне газэта ня ў нашай мове. У "Гродненской правде" прачытала аб клопаце тых, хто гаспадарыць на дзялках — з угнаеньнямі. А чым Вы ўгнойваеце свой агарод? Калі Вас цікавіць, магла б Вам напісаць, якое значэньне як угнаеньне мае крапіва, і як яе выкарыстаць.

Пішу немагчыма. Чуюся дволі дрэнна, і гэта прычына, што рука ня слухаецца. З прыемнасьцю ўспамінаю нашую з Вамі сустрэчу і шкадую, што была такая кароткая.

Яшчэ раз за ўсё дзякую! Найлепшыя пажаданьні Вам і пані Марыі. *Л. Войцікава*.

338. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

21 кастрычніка 1987 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Ліст Ваш атрымала — дзякую. Цяпер мне ўсё ясна, як Вам жывецца...

Пасылаю першыя радкі вершаў[1]. Калі іх у Вас німа — напішыце, прышлю, а сабе іх перапішу. Копіі лістоў с.п. Ларысы Г[еніюш] мне непатрэбныя, усё роўна іх трэба сабраць у адно мейсца (і ад Ягоўдзіка[2] неяк іх вярнуць). Хіба, лепш лісты захаваць у Вас, чым аддаваць у Менск, у Музэй-архіў.

У мяне лістоў 6000, а можа, і больш. Ужо цяпер трэба ведаць, што з імі рабіць. Хоць, вядома, як мяне ўжо ня будзе (а гэта, хіба, ужо хутка), нехта апрача сваіх маёй спадчынай абавязкова пацікавіцца: што перахавае, а што і выкіне. Прадасьць на макулятуру, а то і спаліць...

Цяжка пачаўся мой 96-ы год... З градзенчукоў быў у мяне толькі Мікола Т[аранда]. Думалі з Ігарам Котавым заехаць, вяртаючыся з Полацка. Мусі, не змаглі...

Неяк да гэтай пары абышлося бяз большых прымаразкаў, шмат што яшчэ цьвіце. Але залатая восень ужо скончылася. Дрэвы — голыя. Лес на гарах вокал нас праглядаецца наскрозь.

Стараюся яшчэ хадзіць па садзе, бо як выпадзе сьнег, надыйдуць маразы — з хаты ня вылезу. Вельмі хочацца Вас пабачыць! Але ня ў Вашых абставінах думаць аб такой падарожы.

Вельмі перажываю пагоршаньне здароўя Алеся Мікалаевіча [Белакоза]. Ізноў шпіталь! Ці паможа? Ён і сам мала ў гэта верыць. Каб год таму адважыўся прыехаць у Вільню, у акадэмічны экспэрымэнтальны інстытут, можа, усё было б інакш...

Вельмі пагоршала мая старая-старая хвароба страўніка. Але думаю, што зьявіўся дадатак — нэўроз страўніка.

1-шы верш: "Ўсё роўна мне — ці сьмерць, ці перашкода, / ці цесны гроб, ці песьня у саду...".

2-гі верш: "Наш шлях — як ноч, як крык балесны...".

Сьпяшаюся... Цалую сардэчна. Ваша *Л. Войцікава.*

339. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

31 кастрычніка 1987 г. Вільня

Дарагі пане Алесь.

Дзякую свайму лёсу (ці долі?), што паставіла Вас на маёй дарозе. Маю з кім успомніць старое Гродна. Але мне хочацца яшчэ большага... Ня ведаю, якое ў Вас становішча, якія магчымасьці, але як я была б рада, каб Вы змаглі да мяне прыехаць.

Маё дзяцінства, а і маладосьць — даволі складаныя... Я ня стала ў Гродне жыла, а толькі адведывала сваіх дзядоў — па бацьку. Шмат што ня ведала, але і шмат ведала, можа, драбніцаў. Але ўсё ж...

А якраз, можа, Вы памаглі б адшукаць той будынак на *Гараднічанскай, 14*, дзе я са сваёй с.п. мамай жыла ў 1910–1913 гг. уключ[на]. Справа ня ў тым, што я там жыла, а ў тым, што ў нас, у нашай кватэры была *база* Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Маю яго гісторыю, здымкі...

Стараюся выясьніць (клюбу “Паходня”, А.М. Пяткевічу), дзе той дом быў, а можа, і ёсьць? І — ня можам паразумецца.

Што да Вашых пытаньняў. Кнігарню Левандоўскага помню вельмі добра, а вось аптэку — ані-ні. Зрэшты, як я ўжо ў 1909 годзе прыехала менш-больш настала ў Гродна, паступіўшы ў 6 клясу гімназіі Кацярыны Баркоўскай, якая займала будынак Батароўку, то аптэкі як такой, хіба, не было?

А што мая бабуля (па бацьку) ў гэтую аптэку хадзіла — гэта напэўна. Ды і мела там сувязі-знаёмства, бо сама цікавілася лекавымі расьлінамі. Стала мела заліты сьпірт на 9-ці зёлках. Як я гэта помню...

А жылі мае дзяды блізенька — зараз за Фарай, за кнігарняй Левандоўскага. Маю паштоўку з 1905 г., адрасаваную майму дзеду Міхалу Сівіцкаму: *Гродно, ул. Купеческая, дом Соборного Духовенства.*

Гэтыя дамы, успадворак помню да самых малых дробязяў. Ведаю, што цяпер там ужо ні сьледу з тых часоў німа. Шкада, што ня ўмею рысаваць. А ў памяці ўсё — як на экране...

А вось кляштар Брыгіцкі маю ў памяці ня толькі звонку, але і з сярэдзіны. Бо родная цётка маёй бабулі М. Сівіцкай была (ня ведаю беларускага тэрміну) па-польску *prioress* — па — руску *настоятельница*. Я там дзіцём часта ў прабабкі бывала, бегала па калідорах і г.д.

І Сенны рынак добра ведала і помню. І званіцу, і дамкі драўляныя зараз за званіцай, бо там жыла цэлы год — 1909.

Пасьля была ў Гродне ў 1954 г. пару дзён, а апошні раз — у 1970-м. Тры дні — у А.М. Пяткевіча. Тады ўжо з унукам, якому паказывала ўсе куткі гораду, і — нэрвавалася яго абрусеньнем. Шыльдамі, аб'явамі і г.д. Вядома, пры царызме было тое самае. Але пазьней ці *павінна* гэтак быць?

І сьледу не было на вуліцах бел[арускай] мовы. А наш Гурток бел[арускай] моладзі быў вывеў мову на вуліцы.

На Вашым пляне ёсьць вуліца Паліцэйская. Там быў дом Салянкаў — 2 дочкі, якія належалі да гуртка. І ў іх доме адбыўся 1-ы спэктакль беларускі. Ставілі “Па рэвізіі”. Гэта не такі стары час, як, напрыклад, аптэкі, бо гурток быў заснаваны ў 1909 годзе, але сколькі можна расказаць аб беларускай працы таго часу...

Цяпер сьляджу з хваляваньнем за працай “Паходні”. А старыя часы Вы, пане Алесь, нагадывайце. Так бы хацелася з Вамі пабачыцца, пагаварыць. Пісаць мне ўсё ж даволі цяжка. 2–3 лісты, і ўжо галава не вытрымлівае — баліць...

Магчыма, са спатканьнем нічога ня будзе, але на ўсялякі выпадак пішу. Як у нашую Лясную хату дабрацца — раскажуць п. Мікола Таранда або п. Ігар Котаў.

Усяго найлепшага. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

340. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 5 лістапада 1987 г.

Дарагі пане Алесь.

На Ваш ліст з 27.X я адказала 31.X. Але ўчора прыпомнілася мне Вашае пытаньне аб фатографе Я. Садоўскім[1]. Ці я яго помню?

Узялася я пераглядаць старыя гродзенскія здымкі сямейныя — і бацькавы, і маміныя. Я дагэтуль не зварочвала ўвагі, у якога фатографа яны рабіліся. Магчыма, калісь даўней і бачыла, але забылася.

Уявіце сабе, што ўсе з канца прошлага стагодзьдзя выйшлі з атэлье

Садоўскага Яна (а не Івана). Але Ян не адзін быў уласьнікам, а разам з Казлоўскім[2]. Мая мама фатаграфавалася ў іх з 1880 г. і далей.

Я ніякім цудам фатографа не магу помніць, бо калі фатаграфаваў мяне першы раз, мне было 6 месяцаў, адругі раз было 4–5 год... Здымкаў ад Я. Садоўскага — вялікая пачка.

А пазьней, ужо за маёй памяці, былі фатографы Карасік[3] і Гельгар[4]. Атэльe Гельгара было блізка Фары — на рагу плошчы, дзе была Ратуша.

У Гельгара фатаграфаваўся наш Гродзенскі гурток беларускай моладзі. Не адзін раз — я. А пасьля і маленькі мой сын. І са мной, і адзін. Вось бы Вам усё гэта паказаць! Так і марыцца...

Ды і Гродзенскі гурток Вам, хіба, незнаёмы? Аб гуртку (ГГБМ, як мы яго канспірацыйна называлі) найбольш ведае А.М. Пяткевіч. Я вельмі хацела, каб "Паходня" мела і гісторыю ГГБМ, і здымкі-групы. Але дагэтуль копіяў зрабіць не ўдаецца. Німа каму. Мелася прыехаць Данута Іванаўна [Бічэль] з фатографам. Але фатограф, падобна, хварэе. А пані Данута і ня піша... Што там сталася? Ня ведаю.

Усяго Вам найпепшага! Вялікага плёну ў пошуках старажытнасьцяў!

Сардэчна зычлівая — *Л.В.*

Яшчэ пытаньне: як мае быць наладжаны Музэй у былой аптэцы[5]? Якія маюць быць экспанаты? Можа, я ў чым магла б памагчы? Напрыклад, лекавымі зёлкамі. У мяне даволі багатая "зялёная аптэка". Яшчэ раз — усяго добрага і Вам, і ўсім сябрам "Паходні".

341. МІКОЛУ ТАРАНДУ

7 лістапада 1987 г.

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст, за падрабязныя весткі. Я аб зьезьдзе ў Полацку ніякіх вестак ня мела. Ведала, што ён быў, і што ад Вас з Гродна паехалі, і гэта ўсё. Цікава вельмі, што і як адбудзецца у Менску? Хоць цяпер і там ужо ёсьць каму вясьці барацьбу — асабліва за мову змагаюцца студэнты Інстытуту лясной гаспадаркі. Аж сэрца расьце, калі чытаю іх лісты.

У нас у Вільні таксама ёсьць крыху руху. Студэнцкі клюб літоўскі (!) 4 лістапада ладзіць вечар, прысьвечаны шматнацыянальнай культуры Вільні. Запрасілі і беларусаў прыняць удзел. Будзе там і выстаўка літаратуры, пэрыёдыкі і г.д. Быў і ў нас адзін са студэнтаў, якому даручылі наладзіць сувязь з беларусамі. Мы далі: "Крывіч", "Заранку", "Бел[арускую] борць", "Студэнцкую думку", фота В. Ластоўскага, мэдальён Я. Драздовіча. Мо Лявон са свайго боку яшчэ што даваў? Ня ведаю.

Але вярнуся да Гродна... Пані Данута [Бічэль] аб школьных справах нічога мне не пісала. Усё зьбіралася прыехаць з фатографам. Але фатограф хварэў, і нічога не атрымалася. Я ёй дала нідзе не друкаваны верш Ларысы Геніюш, пісаны ў 50-я гады на Варкуце. Меліся зрабіць копію, а мне (пакуль што) арыгінал вярнуць. Цяпер я дастала другі верш Л[арысы] Антонаўны з таго часу. Паведаміла п. Дануту аб гэтым. Яна прасіла прыслаць ёй пачатковыя словы, каб спраўдзіць, ці мае іх, ці не. Я гэта зрабіла — напісала, але адказу ніякага... Відаць часу ня мае, ды і хатнія клопаты (ўнук) час забіраюць.

Як гэта сталася, што мы з Вамі ніколі не закранулі асобы Ларысы Антонаўны Геніюш? Я асабіста бачыла яе ўсяго адзін раз — прыяжджала, але карэспандавалі доўга, доўга... Мела я 2 вялікія пачкі лістоў. Маглі б Вы, пане Мікола, хоць з лістоў яе пазнаць. Гэта больш чым найлепшыя артыкулы.

Але вось месяц таму я здала гэтыя лісты (крыху іншых таксама) ў менскі Дзяржаўны архіў-музэй. Прыяжджала дырэктар музэю Г[анна] Іванаўна Сурмач. Я сама яе прасіла, каб прыехала і часць старых лістоў забрала, бо іх у мяне вельмі шмат. Трэба пакрысе парадкаваць свае архівы — ведаць, што з імі пасьля мяне будзе. І так ужо нямала згінула. І то ня дзе ў каго, а ўдома...

Якраз я хацела запытацца Вас або Аляксея Міхайлавіча [Пяткевіча] — што з Алесем Мікалаевічам [Белакозам]? Са шпіталя адзін раз напісаў. Я адказала і больш вестак ня мела. Пісала ў Гудзевічы да супрацоўнікаў музэю, але нічога не адказалі. Нічога, відаць, добрага спадзявацца нельга. Вельмі гэта сумна і балюча. А якая страта для школы, для музэю... Хто гэта здолее ўтрымаць?

Ведаю, што будзеце сьвяткаваць 300-годзьдзе Гродзенскай аптэкі, але што будзе аж усесаюзная канфэрэнцыя? Аб гэтым ня ведала. Пішаце аб аднаўленай плошчы Леніна, аб рэстаўраваных будынках. А як жа яна раней называлася? Я ў цяперашніх назвах не арыентуюся... А як падумаю — Гродна, то ўсё старое стае перад вачамі.

Пасылаю Вам адрас Данчыка. Маю яго здымак, але ў групе. Роблены, як ён прыяжджаў на Беласточчыну. Трэба абавязкова яго з групы "выняць" — перафатаграфаваць, але ўсё няма каму...

Усяго найлепшага Вам і ўсім сябрам "Паходні". Пішыце — не забывайце. Сардэчна зычлівая — *Л. Войцік.*

Што бачылі, што сказалі гродзенскія мэдыкі аб Алесю Мікалаевічу? Няўжо ён зможа прыняць удзел ва ўсіх гродзенскіх урачыстасьцях? А добра было б, каб была зроблена сэрыя здымкаў.

342. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

12 лістапада 1987 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Пасылаю Вам абодва вершы, перапісаныя на машынцы. А што з тым вершам Л.А. [Геніюш] з часоў Варкуты, які я дала Вам, бо Вы хацелі зрабіць копію? Так "гінуць" на пошце лісты, што я ўжо баюся ўсялякіх лістоўных зносінаў... Калі ласка, як атрымаеце вершы — паведамце.

Немагчымае надвор'е. Хмарна, мокра. Лепш ужо марозік з праменьчыкам сонца. А цяпер мае ногі хадзіць ня хочуць, а рука — пісаць па-людзку. А што ў Вас? Як Стась? Ці ў яго было запаленьне лёгкіх? Бедны хлопчык...

Учора ў Вільні студэнты-літоўцы ладзілі вечар шматнацыянальнай Вільні. Выступалі з песьнямі і дэклямацыямі ў розных мовах. Літоўцы як гаспадары — па-літоўску, а далей — беларусы, палякі, расейцы, жыды, караімы.

Чакаю Вашага ліста, а ў ім — вестак аб школьных справах. У Менску сярод моладзі даволі моцны зрух. У мяне сувязь са студэнтамі Інстытуту лясной гаспадаркі. Цікавыя ад іх весткі.

Цалую сардэчна. Ад маіх — прывітаньне Вам, ад мяне — прывітаньне сябрам "Паходні". Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

P.S. Пані Данута, чаму Вы мне лісты адрасуеце па-руску? Мне ўсе нават з Масквы адрасуюць па-беларуску. Мы і за царскіх, і за польскіх часоў па-беларуску адрасавалі.

343. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

14 лістапада 1987 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Аб тым, як пільнуюць "Паходню", я ўжо ведала ад яе сакратара[1]. Ня ў смак іх дзейнасьць і папулярнасьць. Ды яшчэ і за школьныя справы ўзяліся. Гэта ўжо зусім "шкодная" работа. Цікава, як "Паходня" выкруціцца і як забясьпечыцца?

Пішаце, што зьбіраюцца на пленумы, гавораць, а справа — ні з мейсца? А ўсё ж пэўны зрух ёсьць. Але ня там, дзе чакаюць пастановаў, загадаў, а там, дзе моладзь сама бярэцца за справу. Гэта ў Менску.

Учора быў у нас студэнт Менскай кансэрваторыі. Расказываў — у іх шмат што з тэорыі музыкі ўжо выкладаецца ў беларускай мове. Хоць, як ён кажа, выкладчыкам гэта цяжка даецца. А ён сам — гэты студэнт — рэдактар насьценнай газэты, то, як ён кажа, "патрабую адзінага беларускамоўнага рэжыму ў насьценным друку."

Гэта адно, а другое — у Інстытуце лясной гаспадаркі сабралі подпісы студэнтаў, якія жадаюць перайсьці на беларускую мову: пішуць па-беларуску курсавыя і дыплёмныя работы, у сваёй мове здаюць экзаміны. Дамовіліся са сваімі прафэсарамі і самі памагаюць складаць падручнікі, слоўнікі і г.д. Пакуль што ніхто ім не пярэчыць. Што будзе далей? Мо і тут выявіцца нейкі вораг і падставіць свайго Сташкевіча?

Учора позна ўвечары ізноў былі госьці, але я так дрэнна чулася, балела галава, што зачынілася ў сваёй каморцы і не выходзіла. Вельмі цяжка пераношу такое надвор'е, як цяпер. Хмары, мокра і цёпла +5°, +6°. Галава баліць, ногі не трымаюць. А на лісты адказаць мушу. Учора разам з Вашым атрымала 7 лістоў!

Пераходжу да справы. Пытаецеся, ці фармальна належала да БСГ[2]? Тады ў нас ніякіх фармальнасьцяў не было — не прымалі ніякіх легітымацый, нічога. А належалі амаль усе. У Менску ў 1917 г. быў сапраўды зьезд БСГ. Па аднаму чалавеку з Масквы, Пецярбурга, Бабруйска, ну і мы з Менска. Мне, як сакратару, трэба было здаць справаздачу з мясцовай работы. А што рабілася? Адно што А. Смоліч рэдагаваў і выдаваў газэту "Грамада"[3] — і ўсё.

Дзе БСГ была моцная — гэта ў Бабруйску. Там адразу запісалася 100 чалавек з войска і сялянаў блізкіх вёсак. Ладзілі мітынгі вайсковыя і сялянскія, на якіх бывала па некалькі тысячаў чалавек. Я аб усім ведала з лістоў Ф. Шантыра, бо гэта была яго работа, яго заслуга. А цяпер і 100 гадоў ад дня нараджэньня нельга адзначыць, і выхад у сьвет кніжкі затрыманы да наступнага году. А ці выйдзе? Бо цяпер ізноў пошукі: па якой прычыне Ф. Ш[антыр] быў расстраляны? Падазрона...

Я маю 2 білеты: адзін на Беларускі зьезд 5 сьнежня, выданы як дэлегату *Исполнительного Комитета* Вялікай рады. 2-і — на Зьезд беларусаў-ваенных Заходняга фронту 18–21 кастрычніка 1917 г.:

Предъявитель сего член Зьезда беларусаў-ваенных Заходняга фрон-

та, член Выканаўчага Камітэта Цэнтральнай рады беларускіх арганізацыяў Сівіцкая Людвіка.

Ледзь перапісала. Адно слова — па-беларуску, другое — па-руску. Гэта ўсё, што я маю з дакумэнтаў.

Цяпер — другое. Мы з А. Войцікам пажаніліся ў 1926 годзе ў канцы верасьня. Шлюб бралі ў касьцёле св. Пятра і Паўла на Антокалі. Сьведкамі былі паслы на Сойм Павал Каруза[4] і Альбін Стэповіч[5]. Муж мой Антон памёр у 1948 годзе. Маю яго біяграфію, бібліяграфію, лісты з дому (вёска Вярэнькі — паміж Будславам і Парфенавым) ды і з турмы — з Лукішак.

Яшчэ аб білетах: не гаворыцца ясна, што была сакратаркай, але толькі “член *Исполнительного* камітэта”.

Каб напісаць аб сваім дзяцінстве — а яно было не зусім звычайным, трэба мець шмат часу, а яшчэ больш цярплівасьці. Але дадам яшчэ адну вестку — не з дзяцінства, а з маладосьці. Калі я была ў Варшаве на курсах, то ў пачатку 1914 г. ужо пахла вайной. Грамадзянства зарганізавала 6-тыднёвыя ваенныя санітарныя курсы. Там пераважна была гутарка аб ратаваньні раненых, перавязках і г.д. Вялі ваенныя лекары, пераважна хірургі. Вось на такія курсы я запісалася і скончыла. Вымагалі шмат. Будова людзкога цела, касьцей, самыя звычайныя лекі. Галоўнае — бандажаваньне (бінтаваньне) розных частак цела. Цяжка было навучыцца налажыць бандаж на галаву, локаць, калена. Паўтаралася апэрацыя дзясяткі разоў, пакуль не было гладка і надзейна.

А як мне гэта спатрэбілася! Толькі вярнулася да мамы ў дзедаўскія Альхоўнікі — пачалася вайна. На блізкай станцыі Бяляны (адна станцыя ад Гродна) наладзілі прыфрантавы шпіталь. Звозілі раненых. Мы з цёцяй, мамінай сястрой, вазілі раненым малако — я за фурмана. На другі дзень доктар просіць мяне памагчы пры раненых, бо, кажа, мэдсёстры з ног валяцца. Я згадзілася. А доктар зьдзівіўся: дык Вы мэдсястра? Я і кажу, што скончыла курсы. Амаль тыдзень памагала раненым.

А пасьля, у 1921–22 г., як чырвонае войска варочалася з-пад Варшавы, у нас быў штаб фронту. Войска аказалася на панадворку, у садзе. Польскае войска — на ўзгорку, нейкі кілёмэтр ад нас. Стралялі праз сад, праз будынкі. Мы цэлыя дні сядзелі ў склепе пад мураваным сьвіранам. Пад вечар зьбіралі раненых, клалі ў стадолу за мураваныя слупы. Рвалі прасьцірадлы, і я цэлыя вечары і ночы перавязывала.

А пасьля ў Менску наш Камітэт дапамогі бежанцам пры сваім безграшоўі ня меў ні лекара, ні фэльчара. А бежанцы, вядома, як хто захварэе, або хто з дарогі мае пакалечаныя ногі — усе ў камітэт: памажыце. Вось ізноў я мела практыку — ставіла банькі, лячыла раны. А хто памог? Вы, можа, і ня ведалі, што Карусь Каганец меў роднага брата — ваеннага доктара. Мы неяк з ім пазнаёміліся, бо быў пэўны час у Менску. Вось ён мне і памагаў. Зрабіў спэцыяльную аптэчку (шафку), напоўніў самымі рознымі лекамі. Даваў парады, як што ўжываць. Сяньня, калі не магу зусім спаць, часам да белага дня — усё гэта праходзіць перад вачамі.

Здаецца, на гэты раз усё. Мо нават шмат лішняга. Усяго найлепшага! Прывітаньне пані Марыі. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

344. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 15 лістапада 1987 г.

Дарагі пане Алесь.

Рада буду спаткацца з Вамі. Лягчэй дагаворымся, паразумеемся, а мне па старым Гродне хочацца яшчэ "пахадзіць". А цяпер на тых пару пытаньняў пастараюся адказаць.

Драўляны дом № 14 з мансардамі стаяў на процілеглым баку ад Купецкай. Значыцца, там нумары пачыналіся. Магчыма, цяпер там новы будынак, бо рэшта вуліцы была вузкая, цесна забудаваная.

Але Гараднічанская не выходзіла проста на цяперашнюю Э. Ажэшка, а на невялічкі пляц — Паштовы, а той ужо быў на мяжы вуліцы

Што да вуліцы Паліцэйскай, то дом Салянкаў быў недзе ў сярэдняй яе частцы. Зрэшты, я магу і памыліцца ў чым-небудзь. Усё ж я выехала з Гродна ў 1913 годзе, а пасьля толькі час ад часу прыяжджала.

Згубіла я яшчэ адну вуліцу, дзе ў 1911 г. Гродзенскі гурток ладзіў спэктакль — ставілі "Модны шляхцюк" Каганца. Тут я і назвы вуліцы ня помню, і на гэта ўжо німа рады.

Усяго добрага! *Л. Войцікава.*

345. МІКОЛУ ТАРАНДУ

26 лістапада 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Ліст атрымала, дзякую. Учора меліся Вам пазваніць, паведаміць, што адкрыцьцё Клюбу (калі яно наагул адбудзецца) адложана на 25 ліпеня — па незалежных ад арганізатараў прычынах. Доўга, як для мяне, чакаць... А хацелася б з Вамі пабачыцца, аб тым-другім пагаварыць.

Атмасфэра ў хаце цяжкая. Гэта зразумела... Загадзя раджу Вам пакінуць думку аб 95-годзьдзі З. Верас. Не выклікайце воўка з лесу... Гэты *воўк* ужо раз мяне крышачку зачапіў. Прыдумаўшы нейкую арганізацыю з быўшых сяброў БСГ (я да БСГ сапраўды належала і шмат аб яе працы ведаю) супольна з Палутай Бадуновай (а яна ж належала да эсэраў) і яшчэ з людзьмі, якія ў Менску ніколі не былі...

Вам бы варта пазнаёміцца з маімі "Успамінамі" — аб працы ў розных палітычных варунках, але такога, як цяпер, нічога падобнага — ніколі не было. Гэта кажу аб арганізацыях не палітычных, а культурных. А што да Купальля... Вы б пацікавіліся, як гэтае сьвята ладзіцца ў Маладзечне. Там зьбіраюцца тысячы людзей.

Як мне шкада Гараднічанкі... Дрэваў над ёй, лавак у цяньку дрэваў. Што ж рабіць — у сьне толькі Гродна бачу... І ня хочацца думаць, што наяве гэтага німа.

А мы тут перажылі дні трывогі. Пасьля ўсіх паўтораных у прэсе (каб мацней ударыць) агідных артыкулаў тут быў назначаны чародны арганізацыйны сход. І — ніхто не прыйшоў, ні адзін чалавек... Ну, думалі, перапалохаліся і — ўсё. Аж праз пару дзён лістоўна паведамілі, якія раптам былі перашкоды, і што адкрыцьцё пераносіцца на ліпень. Але — ці ня знойдзе дарогі і сюды які-небудзь Сташкевіч? Усё можа быць. У іх рукі доўгія...

Сяньня мая дачка мае гасьцей — усю сваю катэдру з Пэдінстытуту, а можа, нехта і з унівэрсытэту ёсьць, бо сьвяткуе свой дзень нараджэньня, юбілейную дату — 60 гадоў. Хата напоўнена гукамі літоўскай мовы...

Прадбачу, што пры цяперашніх абставінах з Менска шмат хто перастане ня толькі прыяжджаць, але і пісаць. А я сама пакрысе хварэю. Баляць галава, ногі, і то моцна. Зрэшты, і па лісьце гэта відаць. Баюся, што мае карэспандэнты і прачытаць цярпліва ня змогуць.

Буду чакаць — ці весткі, ці прыезду. Усяго найлепшага! Вам і ўсім сябрам “Паходні”. Сардэчна зычлівая — *Л. Войцікава.*

346. МІКОЛУ ТАРАНДУ

29 лістапада1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Ліст Ваш атрымала, дзякую. Вядома, цешыцца німа падстаў. Імкненьні “Паходні” — як найлепшыя, але... Напішу ліст, загляніце на пошту (*неразборл.— М.С.*). Кажаце — мая г.зв. кніжка ляжыць на першым мейсцы. Я мела надзею, што ад гэтага ягамосьця атрымаю хоць пару слоў, бо ж ёсьць супольнае ў прафэсіі (замілаваньні), хоць і стаю шмат ніжэй.

Работы мне даюць шмат — з розных бакоў, а рабіць што, нават думаць — цяжка. Забівае пагода. А выконваць усе просьбы трэба абавязкова. Вельмі цікавіць мяне будучая імпрэза ў Гродне. А ці будзе хто з Вільні, з літоўцаў? Ці запросяць д-ра Кутаргу? Вы, здаецца, яго ведаеце? Ад Алеся Мікалаевіча [Белакоза] маю весткі — лісты. Нічога добрага... Што да Менска, ня думаю, каб там хто зацікавіўся, нават каб Вам адказаў. Ня бачу такіх людзей.

Усяго добрага Вам і усім сябрам “Паходні”. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

А Вашы гродзенцы, аб якіх Вы паведамлялі, не прыехалі. Ні ўчора, ні сяньня. Ці хопіць цярплівасьці прачытаць? Вельмі галава баліць.

347. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

9 сьнежня 1987 г. Вільня

Дарагі пане Алесь.

Ліст Ваш атрымала. Выбачайце, што лістоўна [не] на ўсе Вашыя пытаньні адказываю, але апошні час вельмі дрэнна чуюся. Лягчэй мне расказаць штонебудзь, чым пісаць. Але ці адважыцеся прыехаць? Насыпала шмат сьнегу, засыпала дарогі. Мяцеліца не сьціхае ўжо два дні.

Ды ці змагу што вартае прыпомніць? У канцы XIX ст. я была дзіцём, а ў Гродна настала прыехала ў 1900 г. Вядома, тое-сёе помню, але найбольш — працу моладзі, зусім самастойную.

Што да Максіма Багдановіча — ці ён мог што помніць, у чым арыентавацца, маючы 4 гады? А пасьля — ня чуючы ў сям'і *ніводнага* беларускага слова... Да ўсяго даходзіў сам. А з Гродна помніў адно — сьмерць маці.

Нехта пісаў, што ў сям'і Багдановічаў гаварылі па-беларуску. Нічога падобнага. Не адзін раз была з Максімам аб гэтым гутарка. Ён і свае першыя вершы пісаў па-руску...

У мяне выраблілася ў душы вялікая няпрыязнь і жаль да А. Ягор[авіча Багдановіча] [1] — за апошні пры жыцьці Максіма яго паступак. Быў на гадзіну

дарогі ад Ялты ў час, калі сын паміраў зусім самотны, і не падумаў быць пры ім, бо меў важнейшыя перад сабой пляны. Падумаць страшна...

Атмасфэра Гродна? Што ж, як зможаце дайсьці праз сьнягі — калі ласка. Што змагу — расскажу.

Пішаце, што ў той час былі ў Гродне беларусы? Сьвядомых — ніводнай сям'і. Нават калі іх дзеці — сыны ці дочкі — ужо набіралі сьвядомасьць, бацькі аставаліся збоку абыякавымі.

Але кідаю пісаць. Даволі напісаць 2–3 лісты — і болю галавы нічым нельга ўтаймаваць. Будзем чакаць ці зьмены надвор'я, ці Вашай адвагі.

Усяго добрага. Зычлівая *Л. Войцікава.*

348. МІКОЛУ ТАРАНДУ

14 сьнежня 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за цікавы і даволі аптымістычны ліст. Мой з пошты Вы, хіба, ужо атрымалі? Я яго пісала 5/XII. Пішаце, што баяліся прыехаць, каб не прывязьці мне хваробу? А ■ і бяз Вас яе набралася ад сваёй дачкі. Яна ці не прастудзілася, але гэта, хутчэй, нейкі грып. І я ўжо цэлы тыдзень кашляю, чыхаю, баліць галава... Учора ляжала, але гэта не памагае. Прыймаю розныя лекі — без рэзультату. Сяньня цэлую ноч вачэй не зачыніла. Сяджу, пішу і шкадую сваіх карэспандэнтаў, бо будуць змушаныя чытаць мае грымзолы. Добра, што я хварэю заўсёды без гарачкі, то і ляжаць німа патрэбы, а то і часу німа.

У выдавецтве "Бел[аруская] энцыкл[япэдыя] " працуюць над энцыкляпэдыяй Максіма Багдановіча. Мушу і я напісаць некалькі біяграфій мала знаных людзей, якія зьбіраліся у Беларускай хатцы, як быў у Менску Максім Б[агданові]ч.

Вельмі цікава было б даведацца, хто ў Менску пастараўся зрабіць перадачу аб "Паходні". Да мяне з Менска мала хто піша — усе стогнуць, што ня маюць часу.

Меў у гэтыя дні прыехаць на даўжэйшы час Генадзь Сагановіч у віленскія архівы, але дагэтуль яго німа. Зьбіраўся таксама пісьменьнік Казьбярук па матэрыялы нашаніўскіх дзеячаў, але я сама парадзіла пачакаць, бо цяпер вельмі цяжкая дарога. Сьнегу па калена. 2 дні быў марозік па –2, да –7 градусаў. А сяньня ізноў цёпла. Мокры сьнег цэлымі пластамі валіцца з дрэваў. А так было прыгожа.

Я вельмі радая з адведзінаў А. Госьцева. Прывёз падрабязны плян старога Гродна, г.зн. са старымі назвамі вуліцаў. Знайшлася і мая Гараднічанская — з канца ў канец. На вялікі жаль, майго дому ўжо німа... Але хоць мейсца зазначылі.

Шкада, што часу на гутарку было вельмі мала. Я таксама сяньня цэлую ноч ня спала да белага дня. А пасьля раніцай заснула, дачкі не было, а зяць да 3-й мяне не будзіў, толькі тады збудзіў, як Госьцеў прыйшоў. Пакуль я надзелася, то яшчэ ½ г. прайшло, і часу засталося вельмі мала. Усё ж даведалася яшчэ некалькі дэталяў аб дамах ды вуліцах. Зьбіраецца яшчэ прыехаць з фатографам, каб зрабіць для "Паходні" здымкі групаў Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Але ці хопіць адвагі ім у такі сьнег ісьці...

Усё думаю, як было б добра, каб др. Кутарга быў запрошаны на канфэрэнцыю. Ці гэта Вы прасілі Госьцева, як яны ехалі першы раз? А як Вы др.

Віктару Уладзіміравічу пісалі, то ці ён Вам адказаў? Ці не? Я тут сама магла б яму напісаць, але неяк не адважываюся. Бо я ня ведаю, чаму ён у нас зусім перастаў бываць. Ці гэта праз гэтую нагонку на Лявона, ці якая іншая прычына? Бо з восені 1986 г., калі я запрашала, каб прыйшоў, пакуль німа сьнегу, ён адказаў: "А што мне сьнег? Стану на лыжы і прыйду". А пасьля ад юбілейнага сьвяткаваньня "Нашай нівы" ня быў ні разу...

Я крыху дагадываюся, а ўсё ж непрыемна. Папрабую напісаць да інж[ынера] Стэха, але ж, хіба, нічога ня выйдзе, бо яны, здаецца, незнаёмыя. А можа, яшчэ што прыдумаю.

Пару тыдняў таму былі ў мяне супрацоўнікі Літаратурнага музэю Максіма Багдановіча з Менска. Нават з мастаком, які афармляе пакой, дзе жыў Максім. Усё яму трэба было расказаць: які быў стол, крэслы, ложак... Дзе што стаяла... Узялі ў мяне даволі вялікі здымак старога Гродна — яшчэ з пантонным мастом, каб зрабіць пару копіяў — адна копія для "Паходні". Там у іх вельмі добры фатограф — жанчына. Яе фотакопіі цудоўныя.

Я ўжо памаленьку парадкую свае архівы, асабліва старыя лісты. Ужо некалькі пачак здала у менскі Архіў-музэй. Прыяжджала дырэктар музэю і 2 супрацоўнікі. Думаю, што пара, німа чаго чакаць.

Усяго Вам найлепшага! Прывітаньне ўсім сябрам "Паходні". Сардэчна зычлівая *Л. Войцік.*

349. МІКОЛУ ТАРАНДУ

23 сьнежня 1987 г. Вільня

Дарагі пане Мікола і ўся блізкая майму сэрцу "Паходня".

Вітаю ўсіх сардэчна з Новым годам! Няхай ён прынясе Вам ўсё найлепшае: спакой, цікавыя сустрэчы, плёну багатага ў працы як найбольш. Старая гродзенская патрыётка — *Л. Сівіцкая-Войцік.*

350. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

[1987 г.]

Шаноўны пане Адаме.

Учора атрымала Вашу паштоўку. Дзякую. Сьпяшаюся паведаміць, што я мела ліст ад Міколы-пчаляра. Не пісаў, бо быў вельмі заняты. Вывозіў частку сваіх пчолаў на грэчку. Выбіраў мёд. Здаў дзяржаве 200 кг мёду. Жыве каля пчолаў — у лесе. А адрасаваць цяпер яму трэба: вобласьць і раён — як даўней, і вёска Лінава, але да запатрабаваньня (*до востребования*).

Тэлеперадачы — гэта цудоўны праект! Але хіба і здымкі былі б патрэбныя? Там у іх ёсьць свой добры фатограф. Значыцца, з Міколам [Папекам] трэба было б паразумецца. Але — ці ня сьцягнецца ўвага Сташкевіча і яго "загадчыкаў"? Сташкевіч быў пасланы ў Гродна ў клюб "Паходня". Яны там — людзі разумныя. Ведалі, як яго прыняць, як з ім гаварыць. І з яго выступленьняў нічога сабе ня робяць.

А вось у нас у Вільні ня так. Ад часу публікацыі "твору" Сташкевіча і яго перадрукаў ва ўсіх магчымых газэтах у нас, у нашым доме ніхто з віленскіх беларусаў не бывае — ні нагой. Аб запраектаваным клюбе нічога ня ведаем.

Да мяне асабіста перастаў пісаць нават Стэх. А здаецца, пры чым тут я?

Зразумела, што я публікацыямі абураная і салідарна чуюся пакрыўджаная за зяця ды і за памяць нашаніўцаў, але — захаваньне Стэха і кампаніі... Баяцца за сваю скуру? Ну, няхай сабе. Пражыву і так. Але найгорш тое, што не аддаюць мне пазычаных кніжак і здымкаў. Вось якія ў нас нецікавыя справы.

Рада, што хоць у Міколы-пчаляра ўсё добра. Як толькі знойдзе час, прыедзе машынай па пчалярскую спадчыну Я. Шнаркевіча. А я дам яму рэшту пчалярскіх часапісаў — украінскіх, што атрымала ў абмен за "Бел[арускую] борць". Паміж гэтымі ўкраінскімі часапісамі (ня толькі ўкраінскімі, а і чэшскімі) — цікавы месячнік для дзяцей "Пчолка", які выдаваўся на Падкарпацкай Украіне — у Ужгарадзе.

Пераглядаючы (у бяссонныя ночы) гэты месячнік, зрабіла на вялікую сваю радасьць адкрыцьцё. Даўна, гадоў 20 таму, я пераладжыла на беларускую мову твор "Прыгоды пчалы Маі". За столькі гадоў згубілася першая старонка з прозьвішчам аўтара-немца (я перакладала з перакладу на рускую мову, таму мая дачка ўсю работу забракавала, бо лічыць, што пераклад з перакладу — рэч нічога ня вартая). За гэты час "Пчалу Маю" пераладжылі і на польскую мову, і на літоўскую. Літоўцы нават зрабілі з гэтага тэатральны твор і выставу ў тэатры. Цяпер у "Пчолцы" знайшла кусок такога ж перакладу на ўкраінскую мову і прозьвішча аўтара.

Нешта мой расказ выйшаў даволі блытаны. Гэта, мусіць, віна надвор'я. Вялікі вецер, і ад яго баліць галава. Шкада, што цяпер не бываеце ў Вільні. У нас — мора кветак. Ня ведаем, чым вочы цешыць.

Усяго найлепшага і выбачайце, што заняла столькі часу. Сардэчна зычлівая — *Л.В.*

351. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[1987 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Вы пісалі, што цікавіцеся Аркадзем Смолічам. Я дала ў Літаратурны музэй М. Багдановіча ў Менску некалькі арыгіналаў яго самых цікавых лістоў. Яны мне прыслалі фотакопіі. Можа, Вам іх прыслаць? Лісты вельмі цікавыя, характэрыстычныя — шмат аб ім гавораць. Уложыце іх у тую папку з маімі ўспамінамі, вядома, выкарыстаўшы іх, прачытаўшы. Ці, можа, там у Вас хто іх перадрукуе — для Вас?

Зрабіць копію біяграфіі А. См[олі]ча ня маю магчымасьці. Лявон Антонавіч заўсёды "заняты". А я — бачыце, як пішу? Рука зусім ня слухаецца, зрэшты, як і ўвесь арганізм.

Яшчэ вярнуся да тых лістоў Смоліча — іх копіяў. Разабрацца ў іх ня так проста, бо копіі роблены абы як, не нумараваныя ні лісты, ні іх старонкі. Але ўсё ж сэнс улавіць можна. Ёсьць у мяне арыгіналы яго іншых лістоў. Таксама цікавыя. Усё думаю, што з гэтым усім будзе? Хто маёй спадчынай пацікавіцца?

Здаецца, ужо і цяпер шмат што загінула. Напрыклад, было ў мяне некалькі нумароў "Жаночай справы" — газэты, якую выдавала Жаночае т[аварыст]ва імені Цёткі. Было і пару нумароў укр[аінскай] газэты "Жаночая доля", якую мне прыслала ўкраінка (яна і рэдактар) Кісялеўская, сэнатарка з польскага Сойму. Цяпер гэтых газэтаў — ні сьледу. А статут таго

жаночага Т[аварыст]ва імені Цёткі — маю. Хоць я сама да яго не належала — так выйшла. Усяго не апішаш, што і чаму. А можа, у маіх успамінах аб гэтым ёсьць? Ня помню.

Як Вашая рука? Ці можаце пісаць? Маю вялікі і вельмі цікавы ліст ад М. Таранды. Хачу яму напісаць. Усё чакаю, што будзе шчасьлівы дзень, і буду лепш пісаць, а то проста сорамна. А пісаць прыходзіцца нямала. Маю на Флярыдзе сябра з Гродзенскага гуртка[1] — з самай малодшай сэкцыі. Магчыма часта карэспандуем. Там цікавяцца нашым ГГБМ — прасілі таго сябра напісаць успаміны з таго часу. А ён тады быў невялікім хлапчуком — сам шмат чаго ня ведаў, ня помніць. Прыйшлося мне яму памагчы. Напісала 6 старонак. Ад яго і па 12 старонак лісты атрымліваю.

Усяго добрага Вам і пані Марыі. Шчыра — *Л. Войцікава.*

352. АДАМУ МАЛЬДЗІСУ

[1987 г.]

Шаноўны пане Адаме.

Толькі што атрымала Ваш ліст і ўсю "Бел[арускую] борць" з Палесься. Пішаце, што Вашы супрацоўніцы ўсё расьпішуць. Ня маю на гэта вялікай надзеі, бо я, каб не выглядала, што "Борць" мае мала супрацоўнікаў, падпісвала свае артыкулы самымі рознымі камбінацыямі: *Л.В.* і *В.Л.*, *З.В.* і *В.З.*, *Л.С.* і *С.Л.*, а некаторыя — прозьвішчам поўным.

Так што, можа, мне самой нейкі сьпісак зрабіць? Апрача таго, маю ўжо і тое, што ў беластоцкай "Ніве" дакладна — з годам — друкавана і яшчэ тое з "Заранкі", што прапушчана. З аркуша прыйшлося шмат выкрасьліць, што было памылковае. І аркуш для Вас я ўжо адаслала праз студэнта Менскай кансэрваторыі Міколу Стому. Ён мне часта робіць розныя прыслугі. Яго маці жыве ў Ляндварове, і ён, як прыяжджае да маці, то і да мяне заглядае і шмат у чым памагае.

Так што чакаю Вашай пастановы — можа, сапраўды лепш мне самой выбраць з "Борці" тое, што маё, каб пасьля ня трэба было рабіць папраўак? Тады разам і з "Нівы", і з "Заранкі" — усё ўпішу і разам вышлю. Буду чакаць адказу.

Сардэчна дзякую, што перадалі кніжку Фёдару Міхайлавічу [Янкоўскаму]. Непакоюся, ці ня будзе яму цяжка прачытаць. Вельмі ж ужо блага пішу. Усё гэта — і нэрвы, і болі галавы, што мучаць дзень і ноч.

Картачка з тым, што ў "Коласе",— усё добра. Вось толькі трэба, мусі, ўдакладніць неяк. Я ж у той час не была *З. Верас*, а *Людвіка Сівіцкая*. Псэўдонім *Зоська Верас* зьявіўся толькі ў 1918 г., калі я так падпісала надрукаваны ў "Вольнай Беларусі" экспромтам напісаны (проста ў рэдакцыі) абразок "Нёману". Пасьля так і ў зборніку "В[ольнай] Бел[арусі] " было надрукавана. А цяпер гэта *З. Верас* усюды — дзе трэба і дзе нельга. Як, напрыклад, у час М. Багдановіча.

Усяго Вам найлепшага. *Л.В.*

353. МІКОЛУ ТАРАНДУ

2 студзеня 1988 г.

Дарагі пане Мікола.

Вось і пачынаю карэспандаваць з Вамі ў новым 1988 годзе! Перадусім дзя-

кую за павіншаваньне (і дзе Вы ўзялі такую паштоўку? Я больш ад нікога такой не атрымала) і за добрыя навіны. Бо добра ўжо і тое, што ў "Гродненской правде" знойдзецца хоць час ад часу беларускі твор, беларускае слова. А мо і тэатр што-небудзь пакажа. Хіба, ад часу, як наш Гродзенскі гурток ставіў беларускія спэктаклі, то больш ужо ніколі нічога не было... А можа, я толькі ня ведаю? І гэта магчыма.

Шкада, што Вы мала былі на канфэрэнцыі, бо больш ніхто мне аб гэтай вялікай падзеі ні слова не напісаў. Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] абяцае мне даўгі ліст. Але калі гэта будзе? Ня ведаю... Наагул, ня ведаю, чаго дачакаю, а што — не. Забівае ненармальнае надвор'е. Даволі высокія тэмпэратуры, панурасьць, імглістасьць і цемень. Галава баліць — як ноч, так дзень... А тут, як на бяду, усё нейкую работу падкідаюць. Асабліва ў сувязі з энцыклапэдыяй Максіма Б[агдановіча]ча. Ужо 5 жыцьцяпісаў адаслала, яшчэ трэба напісаць 3, і гэта самыя вялікія. Гэта ўсё жыцьцяпісы людзей, якія жылі ў Менску побач М. Багдановіча. Мелі з ім сувязь. А пішацца цяжка, бо трэба ўвесь час глытаць таблеткі, каб хоць крыху спыніць боль галавы. Але гэта ўсё — дробязь.

Цікава, які будзе сёлета плён у маёй карэспандэнцыі. За мінулы год набралася каля 500 лістоў, ня лічачы юбілейных лістоў і тэлеграмаў. Лісты, карэспандэнцыю трэба разлажыць у спэцыяльную картатэку па альфабэту. А гэта вялікая работа. Пачала (бо ўжо пара) парадкаваць свае архівы. Ужо частку старых лістоў здала ў менскі архіў. Трэба тое самае зрабіць і з рэштай.

Маю вялікую непрыемнасьць і неспакой. Ад палескага пчаляра Міколы Папекі ня маю ніякай весткі вельмі доўга. А я ж яму дала поўнасьцю ўсе архівы Беларускага каапэратыўнага таварыства "Пчала" — для яго будучага музэю. Частку меўся перафатаграфаваць і мне арыгіналы вярнуць, частку — узяць у музэй. Пісаў (хоць ня вельмі часта), прыяжджаў. А цяпер зусім замоўк, зьнік. Гэтак прападуць сьляды маёй 10-гадовае працы ў "Пчале" і "Беларускай борці". Разумееце, як непакоюся... А падзяліцца гэтай бядой ня маю з кім.

Я пыталася Алеся Мікалаевіча Белакоза, што ён з лекавых расьлін даваў на выстаўку, каб зарыентавацца, чые былі малюнкі. Бо мне дапамагалі, рабілі малюнкі 3 мастакі: У. Ракіцкі, Я. Шунейка і П. Анашчанка[1]. Але Алесь Мікалаевіч нічога яшчэ не адказаў. Што да доктара Кутаргі, то ён і мне не адказаў на ліст і перастаў у нас бываць. У чым справа? Ня ведаю...

Напісала сяньня адну рэцэнзію, аб якую мяне прасілі (да энцыклапэдыі Б[агдановіча]), і гэты ліст і — ужо не магу. Так баліць галава. Зараз лягу і — ня буду спаць да белага дня, як звычайна. Вось так жывецца.

Усяго найлепшага Вам! Пішыце. Сардэчнае прывітаньне ўсім сябрам "Паходні". Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

354. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

3 студзеня 1988 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Сяньня атрымала артыкул. Гэта, мусі, для энцыклапэдыі Максіма Б[агдановіча]ча. Дзякую. Ёсьць адна памылка, якую трэба абавязкова паправіць,

тым больш, я цяпер пішу жыцьцяпіс сваёй с.п. мамы для гэтай энцыкляпэдыі.

Справа ў тым, што мама радзілася не ў Альхоўніках, а ў Крыштапарове — маёнтку майго прадзеда Ігната Кулакоўскага — пэдагога і асьветніка. (Крыштапарова — польск. *Krysctoforów* — Сакольскі павет Гродзенскай губэрні.) Маю нават абрысаваны ў памяці гэты дом. Яго ўжо німа, згарэў у 70-я гады, асталася толькі мураваная абора. Але назва існуе да гэтай пары, бо Крыштапарова з мноствам суседніх вёсак і фальваркаў утварыла багаты PGR (Państwowa Gospodarka Rolna[1]) — каля 300 гэктараў.

Калі Крыштапарова прыйшлося прадаць, аставілі сабе на ўласнасьць невялікі кусок — 35 дзесяцін зямлі. Пабудаваліся, і гэта былі Альхоўнікі.

Хоць Крыштапарова было ўжо ў чужых руках, наш Гродзенскі гурток у гэтым доме ў салі, дзе маю маму хрысьцілі, наладзіў сваю першую вечарынку для навакольных вёсак. Ігралі "Па рэвізіі", пяяў хор. Быў прачытаны адпаведны ўсьведамляючы рэфэрат.

Хочацца мне вельмі напісаць "Нашчадкі Ігната Кулакоўскага". Ці змагу — яшчэ ня ведаю. Найгорш — ня вельмі маю для каго. Маіх асабліва зямля гэта не цікавіць. А ўсё ж у нас у Альхоўніках жылі старыя асьветніцкія традыцыі — вучылася шмат сялянскіх дзяцей (нелегальна), вучылася ўся служба, што працавала ў дзеда.

Быў адзін вельмі здольны хлопец. Цікавая яго гісторыя. Маці яго была ня вельмі разумная, называлі яе "дурная Еўка". Ці муж яе кінуў, ці не было ў яе наагул мужа — ня ведаю. Але калі прыходзіла да жніва з дзіцём і клала яго пад сноп і давала ў роцік пакаваны ў ганучку хлеб, мая бабуля забірала дзіцё, купала, паіла малаком.

Як хлопчык падрос, маці прывяла яго і кажа: "Забірайце, хутка пастушком будзе". Так у нас і гадаваўся. Пачаў вучыцца. Быў пастушком, дарос да фурмана. Тады папрасіў майго дзеда, каб на зіму яго звольніў — пойдзе ў сваю вёску вучыць дзяцей. Дзед, зразумела, згадзіўся. Правучыў зіму, вясной вярнуўся да працы. Праз пару гадоў у яго новая думка: "Хачу вучыцца на арганістага". І ў гэтым памаглі. Далі яму асобны пакойчык, паставілі фартэпіяну, пачала мая цёця вучыць яго музыцы, а я — лаціне.

Далей вучыцца паехаў у Гродна — да кс. Грынкевіча. Памог. Зрабіўся Яська арганістым. Дастаў працу недзе за Гроднам. Жаніўся з дачкой лесьніка. Але самаадукацыяй займацца не перастаў. Вучыўся самастойна, а пасьля паступіў у Сьвіслачы ў выйшэшую школу. Скончыў. Стаўся настаўнікам.

Чым ня тэма для аповесьці? Але хто сяньня паверыць, што ўласьнікі фальварку памаглі хлопцу выйсьці ў людзі? Таму і задумываюся, ці варта пісаць гісторыю нашчадкаў Ігната Кулакоўскага. Мусі, не. Шкада высілку...

А пісаць мне цяжка. Ды і чытаць маю пісаніну нялёгка. Таму і сьпяшаюся скончыць. Вельмі дрэнна дзеіць на мяне ненармальная пагода. Баліць галава — як дзень, так ноч.

Напісала для энцыкляпэдыі Максіма Б[агдановіча] 5 жыцьцяпісаў — яшчэ мушу зрабіць 2. Пісаў мне М. Таранда — крышачку аб канфэрэнцыі, але вельмі мала, бо і сам мала там быў.

Усяго найлепшага пані Марыі і Вам у гэтым Новым годзе. Сардэчна зычлівая *Л. Война́кава.*

355. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

4 студзеня 1988 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Учора адаслала Вам ліст, а сяньня яшчэ дапісываю. Папрасіла ў Лявона [Луцкевіча] № 11–12 "Маладосьці" і пазнаёмілася з працай Далідовіча[1]... Хоць яшчэ не зусім дакладна прачытала, зразумела — суцэльная фантазія, усё зьмешана, пераблытана...

Але пабачыўшы, што ён шмат у чым апіраецца на Сташкевіча, зразумела, у чым справа. Ды і апошняе слова, пасьляслоўе — належыць Сташкевічу. Дзе ж тут з "вучоным гісторыкам" спрачацца? Сьмеласьці ня хопіць...

Але жарт жартам. Мае асабістыя ўспаміны хто з "вучоных" возьме пад увагу? Але ж я маю Пратаколы зьезду, і гэта важна. Але ж, як я Вам пісала, яны нявечныя. Хаваю як магу, але ўсё роўна нішчацца-буцьвеюць. Што рабіць, каб пабагацець на *ксэракопію*? Гэта адзіны ратунак.

Ці не маглі б Вы ў Менску пагаварыць з кім адпаведным? Напрыклад, з Віталем Уладзіміравічам Скалабанам? Можа, ён што-небудзь прыдумае? Трэба ж даваць у адпаведныя рукі, каб дакуманту ня страціць.

Добра было б мне з кім адпаведным спаткацца, каб Пратаколы дапоўніць сваімі асабістымі ўспамінамі. Толькі асабіста можна ўсё больш-менш выясьніць. Вядома, гэта мусіць быць чалавек, які *мне* будзе верыць, як і я *яму*.

У Далідовіча і стралялі на Зьезьдзе, і разганялі. І Вайсковы зьезд адбываўся ў тэатры, ды было на ім некалькі сотняў людзей... А было ўсё па-іншаму.

Зразумела, калі лічыце гэта важным, трэба сьпяшацца, пакуль яшчэ хаджу крыху і — думаю. Каб гэта так з В.У. Скалабанам спаткацца! Было б найлепш. Але ці ён знайшоў бы час? Ці гэта тэма яго цікавіць?

Усяго добрага! *Л. Войцікава*.

Забылася пазаўчора, як пісала да Вас, падзякаваць за весткі аб Ігнатовічу. Я ня ведала, дзе ён дзеўся. З яго мовай — бяда. Як пісаў мне, то пару лістоў было па-беларуску, а гаварыў стала па-руску. Добра, што Вы яго публічна пасарамацілі. Але ці дайшло? *Л.В.*

356. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 9 студзеня 1988 г.

Дарагі пане Алесь.

Шчыра дзякую за навагоднія пажаданьні. Узаемна жадаю Вам усяго самага лепшага ў жыцьці, у працы грамадзкай! Крыху спозьнена, але ж год толькі пачаўся.

Дзякую таксама за весткі аб Канфэрэнцыі[1]. Ад Вас першага даведалася падрабязнасьцяў.

Цікава, што большасьць менскіх дзеячоў аб Канфэрэнцыі нічога ня ведалі і, мусіць, ня ведаюць. У прэсе, якую я чытаю, не знайшла ні слова. Цікава — чаму?

Падобна, пакрысе варочаюць старыя назвы вуліцаў. Гэта ў Вільні. А як у Гродне? Далей бачыцца ўся руская літаратура?

Што я хацела Вас запытацца: ці Вы заўважалі на вуліцы Палёвай (ад вакзалу налева, ад вытокаў Брыгіцкай) на рагу цікавы дом крыху як быццам у нямецкім стылі — са шпілямі, бальконамі? Мураваны, тынкаваны, шэрага ко-

леру, з даволі вузкімі высокімі вокнамі, полачкі з чырвонымі пэляргоніямі, якія доўга-доўга цьвілі...

Гэта быў дом доктара Тальгэйма[2] — хірурга, даўгі час дырэктара Гродзенскага шпіталя. Гэта быў мой добры знаёмы — і як доктар, і як гродзенскі дзеяч. Не паміж беларусамі, а паміж польскім грамадзянствам. Здаецца, быў прэзасам (старшынёй) польскага клюбу "Муза", дзе адбываліся канцэрты, вечары і г.д.

Апошні раз я бачыла д-ра Тальгэйма ў 1922 годзе. Завязла да яго на кансультацыю свайго 3-гадовага сыночка. Дзіця на руках у нянькі плакала, рвалася да мяне. А доктар трымаў мяне за руку, не пускаў і так спакойка тлумачыў: "To nic, niech pokryczy[3]".

Вось давёў мяне Ваш ліст да старых успамінаў пра мой горад і яго людзей...

Усяго Вам найлепшага. Зычлівая *Л. Войцікава.*

357. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

11 студзеня 1988 г. Вільня

Даражэнькая пані Дануся.

Дзякую за навагаднюю паштоўку. Даўна [redacted] Вам не пісала — выбачайце. Найчасьцей пішу самае-самае неабходнае. Лістоў — безьліч, а сілы зусім мала. Напішу 2–3 лісты, і галава аж трашчыць. Баліць у вушах, коле. Ды і крыватокі з носа аслабляюць. Час ад часу ляжу. А трэба дадаць, што і сплю вельмі дрэнна. Вазьму (рэдка) кусочак таблеткі на сон — ноч прасплю. А не — дык і да белага дня праляжу. Каб ня думаць — чытаю.

У Менску добрыя людзі складаюць праграму дзіцячых твораў для беларускіх гурткоў у дзіцячых садах. А як у Вас прайшлі Калядкі? Як ведаю, Вы, пані Дануся, найбольш папрацавалі.

У нас Каляднае сьвята прайшло па старым звычаі — куцьця (вячэра), ёлачка. На куцьцю прыйшоў і ўнук Слава. Таму раней, чым заўсёды, селі вячэраць, бо ён сьпяшаўся на другую куцьцю — у сябе, са сваёй сямейкай.

Спатканьне Новага году не было вясёлае. [redacted] лягла рана. Галя з Лявонам а 12-ай прыйшлі павіншаваць, а пасьля да 5-ай сядзелі каля тэлевізара, а я адна ляжала. Крыху чытала, але найбольш успамінала ўсе ёлкі калядна-навагоднія, якія асталіся ў памяці ад раньняга дзяцінства свайго, пасьля маіх дзяцей — Галі, с.п. сына Тоніка і Славы. Цэлую гісторыю можна напісаць...

А колькі цацак зрабіла: ланцугі, цацкі са скарлупак яек, з шышак і г.д. Было што ўспамінаць, чым заняць навагоднюю ноч...

Чакала, што будуць Вашы артыкулы аб с.п. Л. Геніюш, а тут у "ЛіМе" нейчы іншы. Таксама з вершамі таго сумнага ў яе жыцьці часу. Ня ведаю, можа, мне здаецца, але настрой вершаў, тон іх нейкі іншы, чым тых, якія да мяне дайшлі.

А як у Вас асабіста ідзе жыцьцё? Як здароўе? Як трымаецца Стасік? Бяда, калі дзеці хварэюць.

У Менску жыве пляменьніца майго с.п. мужа А. Войціка. Яна скончыла Гродзенскі пэдінстытут (Аляксей Міхайлавіч [Пяткевіч] яе помніць). Мае аднаго сына, хлопчык вельмі здольны, мілы, але стала хворы — больш у шпіталі, чым удома ці школе. У яго хвароба крыві — гемафілія, кроў вельмі рэдкая, абы парэзаўся ці стукнуўся — крыві не спыніць. Ці выжыве? Можна ўявіць, што перажывае маці, да таго ж і сама хворая — нешта з нагамі. А яна выкладчыца

беларускай мовы і літаратуры. Здольная — яе цэняць. Стараюся ёй пісаць, але што гэта паможа. Словы і астаюцца словамі, хоць якія б ні былі спагадлівыя...

Нэрвуюся пры кожным лісьце — ці адрасат будзе мець цярплівасьць прачытаць. Чым больш пішу — тым горш з почыркам. А валіцца на мяне работа (апрача лістоў) адна за другой. То нешта перагледзець, то даць рэцэнзію... Часам знэрвуюся, бо людзі глупства пішуць, бяз сэнсу.

А ўсё ж у 95 гадоў з гакам магчымасьці ўмысловай працы меншыя ды меншыя. Я і сама дзіўлюся, як я яшчэ працую, думаю.

Ну, хопіць. Сябрам "Паходні", усяму Гродну ды Нёману — прывітаньне. Гарачае-гарачае. А таксама — дзеткам з "Вянка". Цалую Вас сардэчна. Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

358. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 17 студзеня 1988 г.

Дарагі пане Алесь.

Дзякую [за] весткі аб Канфэрэнцыіі, за выразку з газэты. У "ЛіМе" пакуль яшчэ нічога не было.

Вуліцаў, аб якія Вы пытаецеся, ні Шмідта, ні Фукса, ня ведаю. Аб др. Тальгейме магла б шмат што расказаць — добра яго ведала.

Вы калісьці пыталіся, якой мовай у Гродне больш гаварылі? А ведаеце, з дзіцячых гадоў, г.зн. з канца XIX ст., як помню, у кожнай краме гаварылі папольску. На вуліцах чуліся розныя мовы, паміж іншых і беларуская. Гэта цяпер Гродна жыве зрусіфікаванае. Ні газэты баларускай, ні школы, ні ўнівэрсытэту... У той час хоць гурток вынес на вуліцу беларускую мову, і спэктаклі, і вечары на сваёй мове гучалі. А цяпер? У мае часы мовы паміж сабой не ваявалі. Мы мелі свой гурток, палякі мелі "Koło polskiej mlodzierzy postępowej"[1] і жылі ў згодзе, адныя другім памагалі. Мы бывалі ў іх, яны — у нас...

Ну хопіць, пішу штораз горш. Усяго найлепшага! *Л. Войцікава*.

P.S. *Заметка* па-беларуску — *зацемка* або *вестка*.

359. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

23 студзеня 1988 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Даўна я Вам не пісала. І даволі даўна ня мела вестак з Гродна. Толькі кароткую справаздачу з канфэрэнцыіі мэдычнай. Цікавая, паважная імпрэза. Але пакуль усе ўражаньні — водгукі аб гэтым у газэтах "Гродненская правда" і "Гродненский университет". Дрыжыкі па плячах бягуць. Уяўляецца: усё беларускае — гэта толькі маленькі, нязначны дадатак, гульня. А можа, я ў сваім лесе так адышла ад сучаснасьці і нічога не разумею? Ну, хопіць аб гэтым.

Як там Ваш "Вянок"[1]? Ці ня варта было б Вам папрасіць аб дапамогу якога маладога рэжысёра-беларуса (калі такі ёсьць) з Гродзенскага тэатру? У гэтым напрамку з дзяцьмі працаваць цяжэй, чым з дарослымі. А сьпеваў (дзіцячага хору) не прабуеце арганізаваць?

Ня ведаю, дзе і што робіць цяпер дваюрадны брат Алеся Белакоза — кампазытар Яўген Канстанцінавіч Петрашэвіч. Ці ведаеце яго? Ён у гэтай справе быў

спэцыялістам. Калі добра помню, выяжджаў нават з дзіцячым хорам у Польшчу. Вельмі даўна перасталі мы з ім перапісывацца. Мо гэта і добра, бо мне, на мае сілы, хапае і новых карэспандэнтаў. А ці не былі б Вам дарэчы дзіцячыя народныя загадкі, пацешкі, калыханкі і г.д.? Гэта з маіх старых фальклёрных збораў з Сакольшчыны. Якраз цяпер, перабіраючы свае старыя архівы, трапілі мне яны на вочы. Напішыце.

Мела крыху работы-пісаніны (можа, ня кожны паверыць, што ў мае гады можна мець такую работу), але ўжо амаль скончыла — будзе больш часу на лісты, на адказы. А гэтага дабра хапае. Не заўсёды магу пісаць, бо час ад часу ляжу. Вельмі баляць ногі, а калі даўжэй пішу хоць бы і лісты — баліць моцна галава. Цяжка яе ўспакоіць. Таблеткі амаль ня дзеюць. Ратуюся гарчычнікамі на патыліцу. Аж скура злазіць.

Маем нарэшці зіму! Крышачку сьнегу, невялічкі, да — 6^0, мароз. І ня так цёмна-панура, як было. Сяньня нават сонейка выглянула на хвілінку. Абы хоць не было так, як раз ужо здаралася. Зіма была цёплая, позьняя, а пасьля ў красавіку маразы — 30^0. Вымерзлі сьліўкі, некаторыя яблыні, шмат дэкаратыўных кустоў. А як у Вас у Гродне?

Хачу яшчэ хоць на 2–3 лісты адказаць (усё ж гара лістоў паменшае), а галава ўжо пачынае балець. Толькі што прынясьлі “ЛіМ” і Вашыя новыя вершы. Будзе што чытаць, як лягу ўночы, бо спаць не магу. Ёсьць і артыкул (ды пару вершаў) аб Ігн. Дварчаніне — старым маім знаёмым з часоў менскіх і віленскіх.

Усяго добрага! Як здароўе Вашае і ўнука? Не забывайце, пішыце. Цалую шчыра. Прывітаньне Вам ад маіх дачкі і зяця. Ваша *Л. Войцікава*.

360. МІКОЛУ ТАРАНДУ

27 студзеня 1988 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст, за цікавыя весткі. Калі Вас можа сабрацца 120–130 чалавек — гэта ўжо вельмі добрыя вынікі. Каб так далей... Аб Вашай цяперашняй занятасьці я ўжо ведала. З цэлага сэрца, загадзя зычу Вам вялікага, даўгога шчасьця. Супольных мэтаў, добрага паразуменьня, бо бяз гэтага німа шчасьця.

Ад “Гродненской правды” и сапраўды *адмаўляюся* — нашто лішні раз псаваць сабе нэрвы... Нават у царскія часы Гродна не было такое зрусіфікаванае... Унівэрсытэт — ці ж ён беларускі? Калі нават свой друкаваны орган мае ў чужой мове... Ці гэта заместа старадаўняй лаціны?

Мяне зацікавіў дзіцячы “Вянок”. Я запрапанавала п. Д[ану] це[Бічэль] крыху дзіцячых загадак, жартоўных песень, калыханак — са сваіх старых фальклёрных запісаў. Але адказу не атрымала.

А ў нас у Вільні сумныя падзеі — новая сьмерць, сьвежая магіла. Памёр стары чалавек. Былы пасол польскага Сойму, па прафэсіі кампазытар, сумленны беларус. У 1926 г. сьведка на маім шлюбе — Павал Каруза. Сьмерць старога чалавека — рэч нармальная, а калі ён доўга і цяжка хварэў — гэта для яго вызваленьне... Але балюча, што паміраў чалавек адзінокі — без сардэчна аддана й у гэтую цяжкую мінуту душы. Пайшлі адведаць — аж ужо запозна... Заўтра паховіны. Паведамілі Менск, можа, хто прыедзе — ня ведаю...

А ў мяне і свой боль — сяньня 12-я ўгодкі сьмерці майго сына. Аб гэтым у нас у доме ніхто ня помніць і помніць ня хоча. У такім настроі і пісаць ня варта.

Адно хачу запытацца, адкажыце мне шчыра і выразна: якія ў Вас у "Паходні" робяцца канкрэтныя закіды А. Госьцеву? Я асабіста даведалася ад яго шмат карыснага, што ня ведала аб старым Гродне. І дзе *мая* вуліца была, і як яна цяпер называецца, і што майго дому німа, але хоць мейсца, дзе стаяў, адзначылі. І шмат іншага... І далей быццам *хаджу* па старых вуліцах са старымі назвамі. А пасьля яго першага ліста ад п. Д[ану] ты[Бічэль] — катэгарычны амаль загад: "Ня трэба было яму адказываць...".

Але я чалавек самастойны і раблю па-свояму. Каб не А. Г[осьце] ў, я і аб канфэрэнцыі нічога ня ведала б, ані дэталяў пра Фарную аптэку... Ну хопіць. Шкада нэрваў. Я пісала А. Г[осьце] ву і буду пісаць — дзяліцца сваімі старымі гродзенскімі ўспамінамі. Бо я ў Гродне не была выпадковым новым чалавекам, а гродзенцам — па глыбокіх сямейных сьлядах, дарагіх мне і на самым-самым канцы жыцьцёвага шляху.

Просіце прыслаць адрас пчаляра? А я ня маю дакладнага яго адрасу. Летам жыў у лесе пры пчолах — тады лісты адрасаваліся на пошту *до востребования* (бо *да запатрабаваньня* на Беларусі маглі б не зразумець). Апошні раз пчаляр напісаў нам у кастрычніку. Паведаміў, што мае добрую кватэру ў в. Лінава, але — ні вуліцы, ні нумару. Ад тае пары маўчыць... А ў яго руках 10-гадовая праца "Пчалы", пчалярскага Т[аварыст]ва, разам і камплект "Беларускай борці". Што гэта для мяне значыць — хіба, разумееце... Ну хопіць.

Усяго, усяго найлепшага! Заўсёды сардэчна зычлівая *Л. Войцік.*

А ці Вы ведаеце, што Алесь Мікалаевіч Белакоз ізноў накіраваны ў гродз[енскі] шпіталь? Гэта была вестка ад яго, даволі даўна. А цяпер? Дзе ён — ня ведаю. *Л.В.*

361. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

29 студзеня 1988 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, асабліва за весткі аб артыкуле Далідовіча. Уявіце сабе, што я гэты нумар "Маладосьці" не чытала і ня бачыла. Калі сама не дапамінаюся, то мне часапісаў, якія выпісывае Лявон, не даюць. Хіба, часам дачка прынясе. А я ж усё, што прачытаю, аддаю, у сябе нічога не астаўляю.

Што да падзеяў менскіх — год 1917, то я маю іх ня толькі ў сваёй памяці і ў сваіх успамінах, а ёсьць у мяне *друкаваныя* Пратаколы зьезду... Ужо колькі часу дабіваюся, каб хто з Менска (вядома, самы надзейны чалавек) узяў гэтыя пратаколы і зрабіў ксэракопіі. Бо ведаю, што больш нідзе такога дакуманту німа. А гэты ж нішчыцца, як яго ні забясьпечываю. Папера тоненькая, нетрывалая...

Але сяньня занятая галава іншым — сумнай, балючай падзеяй. Памёр апошні са старых беларусаў — Павал Каруза. Былы пасол польскага Сойму. Па прафэсіі музыколяг, кампазытар. Учора пахавалі. Прыбыла яшчэ адна беларуская магіла на праваслаўных могілках на Ліпаўцы...

Гэта быў мой стары знаёмы — у 1926 г. быў сьведкам на маім шлюбе з Антонам Войцікам. Цяжкім было яго жыцьцё ўжо даўна. Жонка памёрла, дзяцей не было. Брат у Польшчы (на хаўтуры прыехаў). Даўна хварэў на сэрца. А ў апошні час ляжаў у шпіталі на запаленьне лёгкіх. Аказалася, што яго лячылі ад запаленьня, а фактычна быў рак лёгкіх. Такія ў нас мэдыкі...

Яшчэ сьмерць с.п. П. Карузы сыйшлася якраз з 12-й гадавінай сьмерці май-

го с.п. сына — 27 студня. Можаце ўявіць, як было цяжка...

Зусім прапаў сон. Лягу рана, а засынаю — як ужо белы дзень пачынаецца. Ляжу і чытаю. Каб толькі ня думаць.

Лістоў, як заўсёды, шмат, а пісаць адказы цяжка. Ня так цяжка, але напішу 2–3, і ўжо баліць галава. Пагода нядрэнная. Мароз амаль сталы –10. Сьнегу — як кот наплакаў. Але не выходжу, бо баляць ногі, хадзіць і ў хаце трудна. Раблю масажы, націраю лекамі і г.д. Усё ўжо надакучыла, надаела...

Пра дзеда, яго дом, яго цудоўны сад напісаць хочацца, вельмі хочацца. Але гэта, хіба, для сябе. Маіх гэта не цікавіць, а як прачытаеш некаторыя творы, у якіх прабіваецца неўтаймаваная нянавісьць да шляхты (бо да рускага дваранства — іншы падыход), а яшчэ да каталікоў, то і зусім рукі ападаюць. Нават дзіўлюся, як гэта яшчэ мяне церпяць у сваім асяродзьдзі...

Але вярнуся яшчэ да хаўтураў с.п. П. Карузы. З Менска прыяжджалі: А. Ліс, студэнты Менскай кансэрваторыі, адзін з іх, Мікола Стома — з маткай, былой настаўніцай. З тутэйшых, віленскіх, былі: Марыся Маслоўская (былая вучаніца Віл[енскай] Бел[арускай] гімназіі), Я. Тулейка, А. Анішчык[1], Карабач[2], В. Стэх, Ю. Зімніцкі[3], Л. Кароль[4], Шышэі (апошнія — сябры Ларысы Геніюш па ссылцы). Ну і Лявон Л[уцкеві]ч. Памінкі рабілі ў рэстаране ў горадзе.

Аб канфэрэнцыі мэдыкаў у Гродне ведаю падрабязна ад А. Госьцева. Каб ня ён, нічога ня ведала б. Ад яго ж ведала загадзя аб юбілейным сьвяце К. Каліноўскага. Яшчэ не пасьпела запытацца, ці езьдзілі калі ў Сьвіслач? Ці ёсьць там які знак, што там вучыўся Каліноўскі? Паміж іншым, і мой прадзед І. Кулакоўскі там вучыўся.

Сяньня, як лягу, буду чытаць артыкул Далідовіча. Пагляджу, якая розьніца паміж яго ўяўленьнем і сапраўднымі фактамі.

Нарэшці адаслала Я. Саламевічу (для энцыкляпэдыі) рэшту біяграфій тых, хто жыў побач з М. Багдановічам у Менску ў 1916 г. Усяго — 7 біяграфій і здымак Лявона Гмырака[5] (М. Бабровіча).

Усё, ужо баліць галава. Ці здолею яшчэ хоць 2 лісты напісаць — ня ведаю.

Хацелася б ведаць, якія канкрэтныя закіды ёсьць супраць А. Госьцева? Што Данута Б[ічэль] так энэргічна ледзь не забараняе адказываць яму на лісты і не прыймае яго. А мне ён шмат памог прыпомніць старога Гродна — вуліцы, дамы, усё мне дарагое.

Усяго найлепшага, прывітаньне п. Марыі. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

362. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 29 студзеня 1988 г.

Дарагі пане Алесь.

Дзякую за ліст, за весткі. Дзякуючы Вам і я разам з Вамі і В. Целешам па Гродне “пахадзіла”.

З Пушкінскай школы былі ў нас у гуртку сябры. Адзін з іх — мой добры знаёмы — падчас 1-й сусьветнай вайны быў у войску на фронце. Адтуль пісаў мне у Менск — прасіў аб беларускай літаратуры, каб яе чытаць сярод салдатаў з Беларусі.

У банку бывалі ня раз. У Станіславове — таксама. А ці Вы ведаеце г.зв. Мысьліўскую горку па дарозе да Станіславова, справа, блізка гораду? Гэта было месца сустрэчы моладзі г.зв. маёвак. Было шмат выгодных лавак, столікаў. Ча-

сам іграў аркестр.

У справе Фарнай аптэкі. Ці ў Вас ёсьць весткі, хто гэтай аптэкай кіраваў у пачатку нашага стагоддзя? Хто быў яе гаспадаром? Якраз я гэта даведалася ад свайго адзінага сябра Гродзенскага гуртка. Ён мне піша, што ў 1916 (прыблізна) годзе (яшчэ даведаюся дакладна) гаспадаром быў пан аптэкар Стэпнеўскі (Stepnewski). Мой сябра ў яго жыў (там, на мейсцы), бо быў карэпэтытарам яго сыноў. Вядома, у самой аптэцы прыходзілася бываць.

Аб Яўстафіі Арлоўскім[1] я нічога ня ведала, ня чула. Што сябры нашага Гуртка ў яго вучыліся — гэта напэўна, але, на жаль, з іх ужо, хіба, нікога німа. Той мой сябра, з якім і цяпер я перапісываюся, хіба, яго ня ведаў, бо быў, можа, у 2–3-й клясе. Усё ж я яго запыталася, можа, што напіша. Бяда, што гэта будзе няхутка, бо жыве за мяжой — лісты ідуць вельмі доўга.

Яму я пішу аб усіх падзеях у Вільні і Гродне. Ён скончыў Гродзенскую гімназію, а ў Вільні — мэдыцыну. Усё яму цікава, што тут робіцца. У Гродне ў 1910–11 гг. у Рэальнай гімназіі (на якой вулі[цы] яна была — ня помню, недзе у раёне старых шпіталяў) быў вучыцель геаграфіі (на жаль, прозьвішча ня ведаю) — вельмі цікавы чалавек, прагрэсіўны. Яго мы нават запрашалі на наш вечар-спэктакль у 1911 г, калі ставілі "Модны шляхцюк" К. Каганца. Пасьля я зь ім спаткалася ў сябе ў гімназіі падчас апошніх экзамінаў.

Тут мушу выясьніць, якія ў нас у жаночай прыватнай гімназіі былі ненармальныя экзаміны. Свае вучыцелі ня мелі права экзамінаваць, а Віленская кураторыя назначала экзамінатарамі найчасьцей вучыцялёў Гродзенскай мужчынскай гімназіі. Яны днём былі занятыя ў сябе, а ў нас экзаміны пачыналіся а гадзіне 4–5-й і цягнуліся да 1-й ночы. Вось гэты географ з Рэальнай гімназіі ў нас прыймаў экзаміны.

Пакуль да мяне дайшла чарга, настала ўжо 1-я гадзіна ночы. Была ўжо малапрытомная ад чаканьня, ад хваляваньня. Дайшло да прыроды Амэрыкі... ну там *пампасы, сільвасы*, а я стаю і нічога не магу прыпомніць. А географ пытаецца: "А як на лаціне лес?". Тут я ажыла: "Silva",— кажу. Ну і пайшло: *сільвасы* і г.д. Але скуль ён ведаў, што я ведаю крыху лаціну?

Як жа ў Гродне прайшло сьвяткаваньне юбілею Кастуся Каліноўскага? А можа, у Сьвіслач, дзе Каліноўскі вучыўся, хто-небудзь езьдзіў? Калісьці была гутарка, каб у Сьвіслачы паставіць нейкі помнік, мэмарыяльны знак. Але, мусі, да гэтага не дайшло. Паміж іншым, у Сьвіслачы вучыўся таксама мой прадзед — Ігнат Кулакоўскі, пазьнейшы пэдагог-асьветнік.

Ці Вам няцяжка чытаць мой цяперапшi почырк? Стараюся, як магу, утрымаць нейкую магчымую норму, але рука зусім ня слухаецца.

Маю для "Паходні" выяву старога Гродна. Гэта копія. Арыгінал — работа гродзенскага фатографа (якога — ня ведаю, можа, таго самага Садоўскага?), але па спэцыяльнаму заказу майго с.п. бацькі ў пачатку нашага стагоддзя — Антона Міхайлавіча Сівіцкага.

Пасылаць поштай ня буду. Можа, хто прыедзе, тады дам. І вельмі хачу, каб (пакуль жыву) "Паходня" атрымала здымкі і гісторыю Гродзенскага гуртка бел[арускай] моладзі, каб магла даць пры патрэбе нейкія шырэйшыя інфармацыі.

Усяго Вам добрага! Новых знаходак! Шчыра зычлівая *Л. Войцікава*.

363. МІКОЛУ ТАРАНДУ

9 лютага 1988 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст. Атрымала яго ўчора. Пішу коратка. Чаму? Выясьню іншым разам... А сяньня сьпяшаюся павіншаваць "Паходню" з 2-гадовай плённай працай, пажадаць далейшага вялікага, аграмаднага плёну! Як найменш перашкодаў ды спатканьняў з непажаданымі людзьмі...

Пасылаю Вам здымак старога Гродна — з пантонным мастом, аб язьдзе праз каторы я пісала ў сваіх успамінах "Старое Гродна", зьмешчаных у кніжцы "Краю мой — Нёман". Гэта копія, якую зрабілі ў Менску ў Музэі Максіма Багдановіча. Арыгінал я ахвярую Музэю Максіма. А здымак роблены ў канцы прошлага стагодзьдзя гродзенскім фатографам, але па заказу майго с.п. бацькі Антона Міхайлавіча Сівіцкага. Трэба гэтую копію наклеіць на белы, цьвёрды фон. Знойдзецца ў Вас адпаведны спэцыяліст? А мо А. Г[осьцеў] гэта зробіць?

Атрымала ад яго ліст. Падрабязна расказаў аб юбілеі К. Каліноўскага. Прыслаў весткі, што цяпер (якія ўстановы) ў будынках, якія я ведала як Пушкінскую школу, Рэальную гімназію і г.п. Кожны яго ліст для мяне — падарожа па Гродне, інфармацыя, што было і што ёсьць цяпер. Хто яго (А. Г[осьцева]) лічыць "падазроным" — калі-небудзь пры магчымай асабістай сустрэчы. Калі такая надарыцца — раскажу.

Мікола-пчаляр — знайшоўся! Напісаў. Ён проста жаніўся! І, мусі, забыўся аб усім на сьвеце... Гэта я жартую. Бо праз гэты час шмат куды езьдзіў (у Гудзевічы, у Брэст — у школу пчалярства і г.д.). Я крыху загневалася на яго за такую абыякавасьць. У яго ж усе архівы Т[аварыст]ва "Пчала" — для мяне гэта плён 10-гадовай працы... Ну але, хіба, усё будзе добра — наладзіцца.

Асабліва дрэнна сяньня пішацца. Вельмі баліць галава, німа ратунку. Асабліва баліць, калі напішу 2–3 лісты. А пісаніне німа канца... Але я на лісты не наракаю — наадварот, цешаць мяне і памяць людзкая, і весткі. Бо бяз гэтага — як жа жыць? Калі ўжо так гэтае жыцьцё цягнецца, і канца не відаць. А блізкіх, знаёмых трачу аднаго за другім. Хварэюць... Паміраюць... Перажываю моцна, балюча.

Усяго добрага Вам, сябрам "Паходні". *Л. Войцік.*

364. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 10 лютага 1988 г.

Дарагі пане Алесь.

Дзякую за ліст, за весткі аб Канфэрэнцыі ў гонар Каліноўскага і наагул аб Гродне.

Шкада, што ніхто па-новаму не асьвятліў дзейнасьць рэвалюцыянера. Але што зь Менску быў Г. Кісялёў, то гэта ўжо вельмі добра. Больш сумленнага дасьледчыка я ня ведаю. А знаёмыя мы здаўна.

На гэты раз ı Вам, мусіць, нічога цікавага не скажу. Аб Чурлёнісе[1] Вы ведаеце больш, чым я... Хоць, вядома, бачыла ў літоўскай прэсе яго творы-малюнкі, але літоўскай мовы ня ведаю і не чытаю. Аб Чурлёнісе, хіба, больш маглі б сказаць мае дачка і зяць.

У нас у Вільні настрой прыгнечаны — у канцы студзеня памёр наш так

і не ацэнены пры жыцьці кампазытар Павал Каруза. Да гэтай пары нідзе у беларускай прэсе — ні нэкралёгу, ні разьвітальнага слова... Успаміны аб памёршым павінен напісаць Арсень Сяргеевіч Ліс — этнограф.

У мяне яшчэ сваё асабістае гора. У той самы дзень, як у Вільні памёр П. Каруза, дзіва — ад той жа хваробы — рака лёгкіх, на далёкай Беласточчыне (бліжэй Гродна — усяго 18–20 км) памёр чалавек, такі самы стары, які быў маёй адзінай сувязьзю з былым Сакольскім паветам — зямлёй маіх дзядоў і прадзедаў. Цяпер усе нітачкі парваліся. Ня маю там нікога...

Я ў Вільні жыву ад 1923 г., а прывыкнуць не змагла. Усё для мяне [тут] чужое. Думкі, душа — увесь час там, у Сакольшчыне. Цяпер там ужо і магілы дзядоў німа каму даглядзець...

Пытаецеся, ці помню твар таго настаўніка геаграфіі. Не, ані крышкі... Як здавала экзамін, не да гэтага было, каб прыглядацца да чалавека, а калі быў у нас на спэктаклі, я была на сцэне — іграла ў "Модным шляхцюку" ролю Ганкі. У салю на нікога і не паглядзела. Нашы артысты-хлапцы дрэнна ведалі ролі, зьбіваліся, ну і ня вельмі паважна адносіліся да сваіх роляў. То я ім падказвала і добра муштравала.

У 1986 г. быў якраз 75-гадовы юбілей таго спэктаклю — усё так жыва ўспомнілася, але падзяліцца не было з кім...

Вы, пане Алесь, вывучаеце старое Гродна. Гэта вельмі цікава і карысна для наступных пакаленьняў. А ці зьвяртаеце ўвагу на могільнікі? Хто там пахаваны, калі, як захаваны магілы? Ці хто даглядае тыя магілы, якія ня маюць гаспадароў-нашчадкаў?

У нас у Вільні зроблены сьпіскі магіл беларускіх дзеячоў — пісьменьнікаў, мастакоў. Усяго больш як 54 магілы. Час ад часу робяцца патрэбныя рамонты. На Дзяды (Дзень памерлых) кладуцца кветкі, гараць сьвечкі.

Хіба, хопіць. Зусім не магу пісаць. Вельмі для мяне неадпаведнае надвор'е. Панура, сыпле сьнег, цёпла. Ад гэтага баліць галава. Проста німа рады. Ніякія таблеткі не памагаюць.

Усяго найлепшага! Да наступнага ліста. Сардэчна зычлівая — *Л. Войцікава*.

365. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

18 лютага 1988 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ведаю, што Вас стала ў Гродне німа, але бываеце, то і ліст мой атрымаеце. Вы, хіба, ведаеце аб сьмерці нашага кампазытара с.п. Паўла Карузы, хоць, як здаецца, да гэтай пары ў прэсе не было ні ўспамінаў, ні слова разьвітаньня. А можа, толькі я яшчэ нічога такога ня бачыла і не чытала? І гэта магчыма.

Але справа ня ў тым. Я ўчора перачытала ўсе лісты П. Карузы да мяне. Напаткала я нашу з ім гутарку аб студэнцкім даўнейшым гімне "Gaudeamus igitur"... С.п. П. Каруза прыслаў мне тэкст лацінскі (бо я ня вельмі добра помніла) і пераклады гімна на беларускую і рускую мовы. Прыйшло мне ў галаву, а можа, у Вас студэнты цікавяцца гісторыяй даўнейшага студэнцтва? І тым самым гімнам? Магу яго Вам пераслаць.

У сувязі з тым агідным матэр'ялам у "Маладосьці" (№ 11–12, 1987 г.[1]), на які Вы мне зьвярнулі ўвагу, маю ўжо ксэракопіі Пратаколаў зьезду 1917 г. Хачу адзін экзэмпляр даць клюбу "Паходня", як будзе якая зручная аказія. А ў Менску, хіба, толькі аднаму Генадзю Кісялёву магу даверыць. Хіба, ён то не зьмяніўся...

Але маю толькі стары яго адрас. А можа, жыве на тым самым мейсцы? Ня ведаю. Вельмі даўна яго ня бачыла. Адзіны гісторык, якому веру. Ці патрэбная яму гэтая ксэракопія (арыгіналы друкаваныя ў мяне) — ня ведаю. Але, хіба, ня шкодзіла б, каб меў.

Падае сьнег, але цёпла. Марозу — ні сьледу. Усё ж час ідзе да вясны. У канцы месяца пасею суніцы (пазёмкі). Да вясны хачу Вам пераслаць рэцэпт кампосту з крапівы. Мо спатрэбіцца.

Усяго найлепшага. Прывітаньне пані Марыі. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

366. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

19 лютага 1988 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Учора напісала Вам ліст, а сяньня даганяю, каб паправіць зробленую памылку. Я напісала, што зробленая копія таго дакуманту, які можа высьветліць увесь абсурд "працы" "Пабуджаныя" ў № 11–12 "Маладосьці". Напісала, насколькі помню, і прозьвішча таго, хто рабіў копію. А гэтага ні ў якім выпадку ня трэба было пісаць. Калі ласка, або *замалюйце* чарнілам тое прозьвішча, або *спаліце* цэлы ліст. Будзе мне спакайней. А спакою, так патрэбнага старому чалавеку,— ні хвілінкі...

Выслала бандэрольку заказную Г. Каханоўскаму і — *ні слова*! Другую — У.І. Содалю — тое самае, *ні слова*! Трэцюю — матэр'ялы да энцыкляпэдыі М. Багдановіча і фота Лявона Гмырака Я. Саламевічу і — тое самае, *ні слова*! А квіты маю ўсе... Ці ж гэта ня можа нэрваваць? І што сабе людзі думаюць?

Бядую, што німа ўжо на сьвеце др. гістарычных навук М.М. Улашчыка. З ім так лёгка было разьвязаць розныя гістарычныя загадкі і памылкі.

Цяпер зьвярнулася да Генадзя Кісялёва, але так даўна яго ня бачыла, і адрасу няпэўная. Ды і справу Пратаколаў зьездаў лістоўна не разьвяжаш. Не на маю старую галаву ўжо такія справы. А пазволіць цяперашнім "гісторыкам" усё пераблытываць па-свояму — таксама нельга. І дзе шукаць выхад?

Адна нядрэнная вестка: Алесь Мікалавевіч Белакоз дзень у дзень праймаеводзіць па музэі экскурсіі і нея к трымаецца. Каб так і надалей...

Выбачайце, што не даю спакою. У Вас і сваіх клопатаў хапае. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

367. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

12 сакавіка 1988 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Гэта бяда, што "Пабуджаныя" ўжо ў друку[1]. Далей у людзі пойдзе ўся блытаніна. Пратаколы зьезду ўжо ў Менску. Прашу, падганяю, каб пасьпяшаліся з вырабам копіяў. Але калі яны і будуць, то хто і якім чынам будзе ачышчаць "Пабуджаных"?

Пратаколы зьездаў аўтэнтычныя, друкаваныя, з праўдзівымі прозьвішчамі, праўдзівымі падзеямі. І склікалі на іх нашы бел[арускія] людзі, нашы арганізацыі. Мы ведалі, што хацелі, куды ішлі. Як зьезд дэлегатаў, так і зьезд вайсковы. Былі, вядома, і розныя іншыя: сялянскія (ня нашы), афіцыяльныя —

прадстаўнікоў Часовага ўраду і г.д. Але яны самі па сабе, найбольш варожыя для нашай мовы, школы і г.д. І ў "Пабуджаных" усё пераблытана.

Як Вы ведаеце з маіх машынапісных "Успамінаў", у мяне ўсё падрабязна апісана-расказана. У маю новую кніжку, якая ўжо рыхтуецца, гэтая частка ўспамінаў ня пойдзе. Там будзе толькі "Гродзенскі гурток", "Тав[арыст]ва "Пчала" і "Бел[аруская] борць" і іншая драбяза.

Я магла б Г. Далідовіча пазнаёміць з усім, што помню, што ведаю пра гэты ўвесь пэрыяд, калі Вы яго лічыце сумленным чалавекам. Але баюся сувязі са Сташкевічам. А Г.Д. на Сташкевіча спасылаецца. А гэта тып, які робіць брудную работу. Каб яшчэ Г. Д[алідові]ч мяне не выстаўляў на зьездзе: і столік стаяў побач прэзыдыі, і я там падыходзіла... Вось фантазія. А я на зьездзе сядзела сярод публікі ў лёжы насупроць сцэны і да нічога ня ўмешвалася — глядзела, слухала.

Вайсковы зьезд — гэта была ўжо мая работа. Але не было, як Г. Д[алідові]ч кажа, ніякай Вайсковай Цэнтральнай Рады, а ні войска палякаў. І адбыўся ён не ў тэатры, а ў Губэрнатарскім доме. І здымак (са сьцягам) дэлегатаў зьездаў (абодвух!) маю. Можа, гэта Г. Д[алідові]чу прасьвятліла б увесь той час? Я ж адна з таго часу, і адна магла б гэта зрабіць. Каб не Сташкевіч і ўсё, што за ім стаіць... І як, з якога боку гэта разглядаць? Калі і мы тады, і я цяпер — ледзь ня ворагі БССР...

Нешта ў мяне ня клеіцца. Апошні час дрэнна вельмі чуюся. І галава, і ногі, і страўнік, і кашаль. Разьбіла мяне зусім.

Дарэмна я Вас пыталася, ці ведаеце беларускі пераклад "Gaudeamus igitur". Ёсьць добры пераклад на рускую мову, ■ на беларускую П. Каруза зрабіў толькі падрадкоўнік. Мусіў бы нехта пераклад зрабіць, апрацаваць. То ці прыслаць Вам?

А з А. Госьцевым я ў кантакце. Крыху яму змагла падказаць, дзе што было ў Гродне, і хто быў, і ён мне нямала выясьніў, што цяпер там, дзе была Пушкінская школа, дзе была Рэальная гімназія, дзе дзелася *Мысьліўская горка* і т.п. Выясьнілася, дзе было фатаграфічнае атэлье Я. Садоўскага. Адным словам — узаемная карысьць. А баяцца яго, як гэта раіць п. Д[анута Бічэль],— ня бачу прычыны.

Вельмі непакоіць стан Алеся Мікалаевіча [Белакоза]. Ён сам піша толькі аб сваёй працы, аб колькасьці экскурсіяў. Можа, што дакладней даведаюся ад Ігара Котава — мэдыка, які лічыць сваім абавязкам мець мяне пад сваёй лекарскай апекай. Зьбіраецца прыехаць. Быццам ёсьць сіла, якая можа ўтрымаць такі стары арганізм.

Учора атрымала адразу 20 лістоў — самых нечаканых. Як з імі параджу? Ня ведаю. Быў у мяне палескі пчаляр Мікола [Папека]. Жаніўся. Відаць, шчасьлівы — дагледжаны. Ну і Ваш гродзенскі Мікола — таксама пахваліўся. Значыцца, усё добра, усе рады.

Хацела на гэтым скончыць, але яшчэ адно пытаньне. Не, нават 2 пытаньні. Вы маеце дачыненьне з выдавецтвамі. Можа, мне скажаце, што там з кніжкай Ф. Шантыра, што была гатовая яшчэ ў 1987 г., але да гэтай пары яе німа. Чаму? Цікава...

Другое. Ці Вы бачылі кніжку "Антология педагогической мысли Белорусской ССР", выданую ў Маскве ў 1986 г.? Я атрымала гэтую кніжку ад Г.А. Каханоўскага як падарунак на мой юбілей, бо там ёсьць матэр'ял (са здымкам) майго прадзеда І. Кулакоўскага.

А што рабіць з Г. Далідовічам? Гэта ўжо — як пастановіце. Цяпер, хіба, усё.

Усяго Вам найлепшага — у жыцьці і працы. Сардэчнае прывітаньне п. Марыі. *Л. Война Войцікава.*

368. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

20 сакавіка 1988 г. Вільня

Дарагая пані Данута.

Доўга Вам не пісала, не адзывалася, хоць удзячная за вершы дзяцей, за весткі аб такой багатай, патрэбнай дзейнасьці "Вянка". Не магу пахваліцца сваім здароўем, тым больш — настроем. Неяк трачу былую актыўнасьць, цяжка думаць, цяжка пісаць.

Як нованароджанае дзіця, не лічу гадоў, а лічу месяцы. Як доўга гэта яшчэ працягнецца — ня ведаю. Але ўсё надакучыла. Хочацца адпачыць...

Цалую сардэчна. Зычу сілы, энэргіі і плёну ў кожнай працы. *Л. Войцікава.*

369. МІКОЛУ ТАРАНДУ

27 сакавіка 1988 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за цікавы ліст, за ўсе весткі. А ці ведаеце Вы, што у Менску ствараецца моўная камісія Беларускага фонду культуры? Старшыня — П. Садоўскі[1]. Гэта нешта гаворыць. Дае пэўную надзею. Пішу толькі гэтыя некалькі слоў. Вельмі дрэнна чуюся...

Меўся прыехаць і нешта парадзіць мой доктар Ігар Котаў. Не прыехаў, мусі, ня змог. Маю адчуваньне, што мяне паралізуе... А мо яшчэ абыйдзецца? Пабачым.

Усяго добрага Вам, "Паходні", усім яе сябрам. Як заўсёды, сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

370. УДЗЕЛЬНІКАМ ЛІТАРАТУРНАГА ГУРТКА "ВЯНОК"

28 сакавіка 1988 г.

Дарагія дзеці гуртка "Вянок"[1].

Вітаю Вас з Новым годам! Няхай ён Вам прынясе ўсё самае лепшае: добрае здароўе, добрыя вынікі ў навуцы. У "Вянок" уплятайце новыя сьвежыя кветкі, каб ён у Вас быў заўсёды прыгожы, духмяны, прыносіў шмат радасьці і карысьці Роднай Зямельцы.

Зацьвіце шыпшына — можа, і яна ў Ваш "Вянок" ня будзе лішняя? І кветкі прыгожыя — духмяныя, і ягадкі яе такія карысныя для здароўя. Толькі трэба ведаць, як іх зьбіраць, сушыць, запарываць. Мо хочаце навучыцца? Пішыце — пытайцеся. Выясьню навуку.

Ваша старая бабуля *Зоська Верас.*

371. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

3 красавіка 1988 г. Вільня

Даражэнькая пані Данута.

Шчыра дзякую за весткі. Вельмі цешуся так добра ўдалым сьвятам. Ці будзе яно яшчэ паўтораным? Дзеці з "Вянка", пэўна, вельмі шчасьлівыя і маюць ахвоту да далейшай працы ў гэтым напрамку?

Дзякую за дзіцячыя вершыкі. Ужо самая чысьціня мовы мае вялікае значэньне. А ці ня маюць здольнасьцяў і ў іншых напрамках? Напрыклад, да мастацтва, рысункаў? Варта альманах неяк ілюстраваць. Як думаеце?

Пасылаю "Вянку" пару даволі ўдалых фотаздымкаў з прыродай. Гэта з калекцыі работ майго с.п. сына. У мяне іх вельмі шмат. Пабачымся — пакажу. Ён быў здольным фатографам, хоць толькі аматарам. Баюся, што пасьля мяне гэта ўсё будзе бескарыснае.

Нешта не відаць яшчэ вясны, хоць ужо красавік. У нас перад вокнамі і на агародзе — сьнег. Толькі навакольныя горы бяз сьнегу, але шэрыя, быццам мёртвыя, бяз сьледу жыцьця. А як у Гродне? Можа, цяплей? А як Нёман? Ці вольны ад лёду? Ці наагул гэтай зімой замярзаў?

Ужо 65 гадоў я яго ня бачыла. Хоць, праўда, не зусім гэта так, бо ў 1970 г., калі была ў Гродне з унукам на запросіны Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча, то паказывала Нёман унуку. Расказывала, як наш Гродзенскі гурток вечарамі зьбіраўся на вузенькай сьцежцы над самым Нёманам. І як гэта ўсё яшчэ трымаецца ў памяці? Відаць, тое, што перажываецца ў маладосьці, моцна асядае на дне сэрца.

Але што гэта за сантымэнтальны настрой напаў на мяне? І Вам без патрэбы забіраю дарагі час? Даруйце. Будзе час — пішыце. Пішуць мне з "Паходні" аб усіх падзеях. Цікава. І я ім пішу, але не закранаю глыбака асабістага.

Сардэчнае прывітаньне шлю Вам асабіста і "Вянку. Няхай ён жыве-красуе. Усяго найлепшага! А можа, яшчэ пабачымся з Вамі, дарагая пані Данута, хоць я чуюся вельмі дрэнна і слаба.

Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

372. МІКОЛУ ТАРАНДУ

10 красавіка 1988 г. Вільня

Дарагі пане Мікола.

Дзякую за ліст, за падрабязнасьці. Аб тым, што зьбіраецеся парадкаваць магілы беларусаў, я ўжо ведала ад А. Госьцева. Ці пойдзеце і на каталіцкія [могілкі]? Там, апрача магілы Элізы Ажэшковай, ёсьць яшчэ амаль каля самай капліцы магіла з добрым помнікам ксяндза Францішка Грынкевіча, які арганізаваў Гродзенскі гурток беларускай моладзі. Гэта я пішу так сабе, для цікавасьці, бо магіла, напэўна, добра дагледжаная яго былымі вучнямі.

Толькі пасьля сьмерці Ф. Грынкевіча людзі даведаліся, сколькі ён добрага рабіў для школьнай моладзі, якой бы яна ні была нацыянальнасьці... Навука тады была платная — ня ўсе маглі сваіх дзяцей у школы пасылаць. І вось кс. Грынкевіч за такіх бяднейшых плаціў. І ня толькі, бо часта і апранаў, і падручнікі купляў, і падкармліваў, і то ў вялікім сакрэце. Ніхто і не здагадываўся аб яго філянтрапійнай дзейнасьці. Толькі пасьля сьмерці ўсё адкрылася. І цяпер, па-

добна, шмат хто з гэтых яго падапечных магілу даглядае.

На тых могілках і мае дзяды (па бацьку) пахаваныя. Але былі пастаўленыя толькі крыжы драўляныя — згнілі, пападалі, і сьлед прапаў. Як я была ў Гродне апошні раз у 1970 годзе, хадзіла, шукала — не знайшла, хоць мейсца добра ведала.

Як там у Менску з моўнай камісіяй — ня ведаю. Але быў у мяне Анатоль Аляксандравіч Наліваеў — арганізатар і кіраўнік г.зв. Гасьцёўні Галубка і паведаміў аб сапраўды добрых падзеях. Гасьцёўня праз 6 гадоў існавала ў вельмі неадпаведнай малой кватэры. Усё ж праводзіліся розныя мерапрыемствы, спатканьні з літаратарамі, паэтамі, сьпевакамі і г.п. Былі і нападкі, і чапляліся "адпаведныя людзі". Здалося Наліваеву, што ня вытрымае...

Аж тут — вялікая перамена. Выбралі камісію, у якую ўвайшлі паважныя людзі. Даюць новую добрую кватэру, і ёсьць праект, што Гасьцёўня застанецца гасьцёўняй, але пры ёй будзе адчыняцца Музэй У. Галубка. Гэта вельмі добра, бо ён заслужыў на гэта. Экспанатаў ёсьць ужо нямала, а цяпер вышуківаюцца новыя. Дзеля таго, што я Галубка добра ведала, лічаць, што і я ў нечым памагу. Так што маю новыя клопаты...

Пішаце аб тым, як было 20 сакавіка? Я сапраўды тады дрэнна чулася (як і цяпер) і ня вельмі магла з людзьмі гаварыць. Ды яшчэ з незнаёмымі. Але, шчыра кажучы, шмат лепш было б, каб гэта якраз Вы зайшлі да мяне і зарэкамэндавалі тых новых, у тым ліку і Вашую жонку. А то ня хто іншы, а я апынулася ў глупым становішчы.

Ведаеце, мой стары знаёмы — супрацоўнік "Заранкі" — мае спэцыяльны сшытак ці кніжку, у якую ўсе наведвальнікі — упісываюцца. Я сьмяялася з такога звычаю — быццам у якой высокапастаўленай асобы. Але, можа, гэта і мае свой добры бок. Але хопіць аб гэтым. Гэта — мінула.

Цяпер маю іншыя клопаты. Мне пішуць — прыпамінаюць, што *цяпер* можна, і пара ўспомніць людзей, аб якіх раней трэба было маўчаць. З даўнага часу маю двух такіх людзей — іх біяграфіі, бібліяграфіі, успаміны аб іх і г.д. А напісаць аб іх, распрацаваць німа каму... Гэта не на мае сілы. Зварочвалася не да аднаго пісьменьніка з прапановай апрацоўкі матэр'ялаў, але дарма... Адзін адказаў, што мае тэмаў сваіх на гады 2, а другі (і гэта Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч!) нават не адказаў ні словам. Чаму? Ня ведаю, дагэтуль так не было... Можа, там у яго ня ўсё добра? Можа, хто хварэе? Ня ведаю, што і думаць.

І ня маю больш да каго зьвярнуцца. А шкада, бо тыя два чалавекі, аб якіх матэр'ялы маю, заслужаныя. Адзін — прафэсар, другі — доктар мэдыцыны. Зразумела — абодва Беларусы з вялікай літары.

Неяк яшчэ ваюю са сваімі фізычнымі недамаганьнямі — болямі... Быццам маю неабходныя лекі: таблеткі, парашкі, але прабую памагчы сабе сваімі зёлкамі. Разумеецца, пры помачы адпаведных кніжак. Але гэта ўсё спробы, спробы... А веры мала, бо стары арганізм знасіўся да канца. А чалавек — не машына, новых частак ня ўставіш.

Здавалася, што ўжо пачалася вясна. У нас нават першыя кветкі закрасавалі. Аж тут раніцай глянула ў вакно і бачу — бела-бела. Сьнег... А пасьля днём праз пару гадзін ізноў сьнег падаў — густы-густы. А як у Вас у Гродне? Можа, цяплей і сьнегу не відаць? У нас у дадатак — вялікі вецер.

Калі будзеце мець цярплівасьць і здолееце гэты ліст прачытаць, то Вам,

хіба, мэдаль за гэта прысудзіць трэба. Бываюць дні, што пішу лепш, а сяньня неяк зусім рука ня слухаецца.

Усяго Вам і Вашай жонцы добрага ў жыцьці і працы. Усім сябрам "Паходні" — шчырае прывітаньне і падзяка за памяць. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

373. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

19 красавіка 1988 г. Вільня

Затытулаваць як?

Хацелася б: мілая, дарагая... Хоць Вы мяне ледзь не ідыёткай зрабілі... Але як Вы гэта прыймеце? А справа простая зусім. Чытала Ваш ліст ужо два разы, а зразумець не магу. Які "альбом" я абяцала? Што за "альбом", якога я Вам не дала і г.д. У чым справа?

Я яшчэ ні аднаго са сваіх альбомаў нікому не дала і не даю. Куды іх аддадуць пасьля маёй сьмерці (хоць бы ўжо яна хутчэй прыйшла!) — справа не мая.

Што тычыцца ўспамінаў пра Гродзенскі гурток беларускай моладзі. У мяне ёсьць адзін экзэмпляр (машынапіс) са здымкамі. Я яго з рук не выпускаю. Копіі машынапісныя абяцае зрабіць Новік-Пяюн з таго экзэмпляру, які ён у сябе мае. Дагэтуль не зрабіў, бо мае хворыя вочы. Што будзе — ня ведаю.

Калі б зрабіў, то хто зробіць копіі здымкаў? На мейсцы тут німа каму. Вось я і рада была, калі Госьцеў запытаўся, ці можна прыехаць з фатографам? Я згадзілася, і патрэбныя мне здымкі да гуртка і інш. ужо маю.

А. Госьцеў мне шмат у чым памагае. Памог знайсьці мейсца (на старым пляне Гродна), дзе быў дом, дзе я жыла. Справа ня ў тым, што я там жыла — я не такая заразумелая. А ў тым, што ў нашай кватэры была база гуртка. Далей — паведаміў, што цяпер там, дзе была Пушкінская школа. На якой вуліцы была Рэальная гімназія і што цяпер у тым будынку.

Гаварылі аб Гродзенскай мужчынскай гімназіі, гімназіі Баркоўскай, дзе я вучылася, аб вучыцелях, выкладчыках розных профіляў і г.д.

Раней, сколькі чаго ні прасіла, нават маёй вуліцы Гараднічанскай знайсьці не маглі. Пішаце: лепей бы з Вячкам [Целешам] пагаварылі... А Вячка, сам шукаючы патрэбных матэр'ялаў, з Госьцевым па Гродне хадзіў. Вячка сам мне пісаў. Як Госьцеў гаворыць? Забывае, што я ня чую ні голасу, ні слоў, а піша ня горш за іншых...

Не аб беларускіх выключна справах мы з ім гаварылі, а, напрыклад, аб адным гісторыку — выкладчыку Гродзенскай мужчынскай гімназіі, аб якім я даведывалася яшчэ з дзьвюх крыніцаў. Для мяне гэта маладосьць — школьныя гады. Усё дарага, усё цікава.

Не лічу (і не палічу), што з майго боку гэта нейкі праступак — грэх у дачыненьні да беларускай справы. Гэта мая асабістая справа.

Кажаце, што дачка Госьцева ня любіць беларускай мовы? А ў якой мове гаворыць дачка Саламевіча? Або сын Танка? А ў нашых сем'ях — усё гладка?

Сяньня атрымала 8 лістоў. Апрача Вашага, што моцна "забалеў", яшчэ 2 з балючымі, прыгнятаючымі весткамі. Запэўненыя бяссонныя ночы... Бяссонныя, з болямі, грэлкамі, крыватокамі... Так і трызьніцца — хутчэй бы вечны спакой... Да ўсяго яшчэ і вочы змучыліся — цяжка чытаць, ды і ня ўсе почыркі ўжо добра чытаю. Вядома, на гэта рады німа. Я ўжо 12 гадоў з лесу не выходжу, да доктара-акуліста не пайду.

Выбачайце, што пасьля Вашага ліста пішу аб сабе. Гэта з майго боку проста недаравальна. Яшчэ адзін ліст — ад А.М. Пяткевіча. Там — справа ўжо не аб Госьцеву, а весткі з Менска 1918 г., і я з эсэрамі супрацоўнічаю... Выдумка Круталевіча. А каб яны згарэлі... Цяпер і паміраць спакойна ня буду, а ў нейкай ліхаманцы. Усё роўна, абы хутчэй...

Л. Войцікава.

374. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[1988 г.]

Дарагая пані Данута.

Столькі часу Ваш ліст ляжыць, аж сорамна. То хоць некалькі слоў на паштоўцы... Крыху прыхварэла, дзень пралежала, быццам ужо лепш, але настрой нічога ня варты. Лістоў шмат да адказу, ды і другой неспадзяванай работы — таксама. Ня ведаю, за што хапацца.

Вельмі мне шкада Сяргея Астраўца, яго жонку. З кватэрай і працай яго наладзіцца, а “Гродненская правда” такой і застанецца. Ці ж там працаваць чалавеку з такой здольнасьцю і ідэаламі? Гэта ж зьдзек над чалавекам...

Эх, Гродна, Гродна... Ці ня лепшае было тое маё, старое? Добра, што Вы мелі такіх мілых гасьцей. А што яны ў Гродне робяць? Новік-Пяюн доўга мне ня піша.

Як цяпер маюцца Вашы сын і дачка, што кажуць лекары? Уяўляю, як Вам горка чуць у сябе стала чужую мову. У мяне нешта падобнае. Сяджу ў сваім кутку, а сямейка гаворыць па-літоўску. Я іду толькі абедаць і вячэраць. Нічога людзкага не напісала і не напішу, мусіць, на гэты раз.

Цалую Вас сардэчна! Ад маіх — прывітаньне. *Л. Войцікава.*

375. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

27 красавіка 1988 г. Вільня

Шаноўная пані Данута.

Ліст Ваш атрымала. Я доўга не трымаю ў памяці перажытай крыўды. Ня будзем ужо пра гэта больш гаварыць. Тым больш, прыходзіцца перажываць і большае.

Відаць, ужо шырока пайшло круцельства В. Круталевіча, больш небясьпечнага за Сташкевіча, бо капануў глыбей і круціць, як хоча, бо ў яго і тытулы навуковыя большыя. Я ўжо аб гэтым ведаю, і не ад Госьцева ці “Паходні”. Круталевіч *прыдумаў* нейкія неіснуючыя ў Менску партыі і мяне туды ўсадзіў разам з людзьмі, якія ў Менску і не былі, я іх у вочы ня бачыла ніколі ў жыцьці. А я быццам у той партыі была і адначасна не пакідала Беларускай Вялікай Рады, дзе была сакратаркай. Разумееце? Падвойную ролю іграла.

Аб гэтых выступленьнях Круталевіча я даведалася ад Аляксея Міхайлавіча П[яткеві]ча. А відаць, разышлося ўжо шырака. Я аб Круталевічу і раней ведала, калі ён яшчэ ня быў такой вялікай шышкай, як цяпер. І тады ўжо крытыкаваў працу беларусаў у Менску. У нас была часовая арганізацыя — Цэнтральная рада бел[арускіх] арганізацыяў, куды ўваходзіў і Камітэт помачы ахвярам вайны. Вось гэта Круталевіч крытыкаваў: “Нават бежанцаў улучылі”. А бежанцы

што — перасталі быць дзяцьмі сваёй Бацькаўшчыны? Не павінны мець права голасу? Вось ад яго і пайшла ў Гродне злая слава пра мяне.

А Госьцеў ня ўсё ў сябе трымае. Я маю ад яго нямала здымкаў і нямала вестак пра старое Гродна — Гродна майго дзяцінства і маладосьці, працы ў Беларускім гуртку.

А Вы, я бачу, усё яшчэ пра нейкія альбомы... Я альбомаў маю не адзін. Але ж яны не канешне належаць мне. Я ж маю сям'ю, і сям'я на іх мае права. Я іх з сабой на той сьвет не забяру і нікому не аддам.

А што я дагэтуль не магу дачакацца машынапісаў гісторыі Гродзенскага гуртка беларускай моладзі — не мая віна. Сяньня пішу Новіку-Пеюну. Калі яму хворыя вочы не даюць выканаць абяцанага, то зяць мой Лявон зробіць гэта сам. Я прывыкла, што Новік-Пяюн праз даўгія гады ўсё мне друкаваў на машынцы. Прыгожа афармляў. А цяпер, калі яму вочы баляць, відаць, ня можа, а адмаўляцца яму непрыемна. А што значаць нездаровыя вочы, я сама, на жаль, пераканалася. Без прычыны пачалі балець, а нават не балець, а аслабелі. Зусім не магу чытаць, лісты чытаю з цяжкасьцю, а часам і зусім не магу прачытаць. Мушу прасіць сваіх, каб памагалі.

Перамываю адпаведнымі зёлкамі, кладу кампрэсы — не памагае. Трэба было б акуляры здабыць. А як гэта зрабіць? Трэба да акуліста. А я ўжо 12 гадоў не была ў горадзе. Нават машынай ехаць не магу. Яшчэ на мяне адна бяда — апрача таго, што глухая. Пішу немагчыма, сама гэта бачу — аж сорамна.

Што да спаленых кніжак с.п. Ларысы Антонаўны [Геніюш]. Ад яе нявесткі ўсяго можна спадзявацца. Дзіўлюся толькі, што ўнукі ня мелі адвагі матцы запярэчыць. Ларыса Антонаўна мне шмат пісала аб адносінах нявесткі. Моцна гэта перажывала.

Што да Янкі Саламевіча, я аб яго сыне нічога не кажу, а толькі дачка ня хоча па-беларуску гаварыць. Тлумачыць тым, што ў яе нянька была руская. Ну, Бог з імі.

Ці зможаце прачытаць? Я са сваім цяперашнім зрокам цэлую гадзіну Ваш ліст вывучала. А ліст Арсеня Сярг[еевіча] Ліса зусім не дала рады прачытаць. Ды яшчэ і пагода немагчымая — сьнег ужо чатыры дні сыпле, і тэмпэратура падае, сяньня +1⁰. Што будзе далей, прымаразкі?

Цалую сардэчна. *Л. Войцікава.*

376. АЛЯКСАНДРУ ГОСЬЦЕВУ

Вільня, 28 красавіка 1988 г.

Дарагі пане Алесь.

Ліст Ваш з 14.IV атрымала. Дзякую. Пішу толькі пару слоў — баляць моцна вочы, амаль ня бачу, што пішу. Пры магчымасьці ўспаміны аб Леўчыку прышлю. Вельмі цікава ведаць, што будуць перавыдадзены паштоўкі і матэр[ыялы] з Канфэрэнцыі[1].

Усяго добрага. *Л.В.*

377. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

23 чэрвеня 1988 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Ліст Ваш атрымала. Перапісала яго мая дачка вялікімі літарамі — прачытала. Дзякую. З вачамі вельмі дрэнна — сьлепну. Ні пісаць (толькі вось па такіх

лінейках — напішу, але — не прачытаю), ні друку, ні машынапісу — ня бачу. Але хопіць жаліцца — не паможа.

Дзе была ў Гродне Беларуская гімназія? Ня ведаю. Аб ёй я даведалася ад Алесі Смоліч, якая выкладала там мову і літаратуру. Прыслала мне копію свайго пасьведчаньня. Я яе пыталася аб гісторыі гімназіі — адказала, што нічога ня ведае, ня помніць. Пісала — шукай Серафіму Кішко[1]. Я шукала, як магла, бо яна была сьведкам заснаваньня гімназіі, але не знайшла. А з Рак-Міхайлоўскім бачылася заўсёды коратка, сьпехам — распытываць не магла.

Сьведка, што гімназія была,— пасьведчаньне Алесі Смоліч з подпісам дырэктара. Ужо нехта з сяброў "Паходні" пытаўся мяне пра гімназію. Пісаў: ведаю пра яе, але вельмі мала. А хто гэта быў, той, хто пытаўся, тут у мяне не падпісаўся.

Чуюся вельмі, вельмі дрэнна, але хачу яшчэ напісаць, што няслушна бароніце В. Круталевіча. Ні як вучонага, ні як сумленнага чалавека. Ужо некалькі гадоў таму ён напісаў кароткую зацемку, быццам я — "выхадзец" з Грамады, разам з Бадуновай, К. Душэўскім і Чарапуком увайшла ў нейкую супольную арганізацыю... Я тады толькі махнула рукой — піша і няхай піша. Пасьля, крытыкуючы працу людзей з Менска, зьдзекліва дадаў: "Нават бежанцаў прыцягнулі".

Была Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый, да якой належаў і Камітэт помачы бежанцам. Перадусім — бежанцы ня страцілі права быць людзьмі і грамадзянамі свайго краю. Па-другое, у Камітэце працавалі ня бежанцы, а грамадка людзей, якая бежанцамі і іх дзяцьмі апекавалася. Як — Вы ведаеце.

А цяпер пасьля апошніх абвінавачваньняў Г. Далідовіч, які зьбіраўся прыехаць паслухаць маю крытыку і парадаў надалей, прыехаць ужо і ня думае. Нашто яму парады такой "крывадушнай" асобы, як я? Ну што ж, няхай сабе Далідовічы і Круталевічы вядуць моладзь па крывых дарогах. Гэта ўжо мяне ня тычыцца. Я скончылася дарэшты.

А доля памяці др. Грынкевіча мяне трывожыць. Што ж будзе? Пра А. Смоліча — я веру, хачу верыць — Г. Сагановіч[2] і Л. напішуць па маіх матэр'ялах. Яшчэ пару лістоў трэба напісаць, калі хопіць сілы...

Усяго найлепшага Вам і сям'і. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава*.

378. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[Чэрвень 1988 г.]

Дарагая Данута Іванаўна.

Учора атрымала Ваш ліст з дня 14/VI. На папярэдні Вам адказала. Зрабіў вельмі цяжкае ўражаньне. Проста зразумець цяжка. Алесь Мікалаевіч [Белакоз] таксама лічыць свой музэй вельмі пакрыўджаным. Але і сяньня ў гэтай цяжкой справе ня буду старацца што-небудзь выясьніць. Вельмі баліць галава. Вялікая вільгаць, холад...

Што да "Старога Гродна" — паспрабую пісаць далей, але ня думаю, каб гэта мела якую літаратурную вартасьць. Паглядзім.

Буду чакаць Вас з нецярплівасьцю. Аддам тое, што маю прыгатаванае для Вас. Пачала вельмі моцна адчуваць цяжкасьць сваіх ненармальна даўгіх гадоў. Месяц мне за год хапае, а дзень — за месяц. А тут шмат лістоў, спраў, пытаньняў і гасьцей — таксама ж не бяз мэты выцягнуць з памяці як найбольш. Я на гэта

не наракаю, гэта добра, але часам бываю і змучаная. Усё ж удаецца тое-сёе зрабіць, удакладніць, растлумачыць.

Пытаецеся аб вершах пералічаных аўтараў? Калі што ёсьць, то толькі К. Свака і, можа, А. Зязюлі. Яшчэ не глядзела. Гэта калі ідзе аб асобныя выданьні, бо вершы аднаго і другога ёсьць у "Хрэстаматыі" Ігната Дварчаніна, выданай у Вільні ў 1927 г. Я яе маю. На гэтым і скончу.

Страшна баліць галава. Прыймаю розныя таблеткі, а яны шкодзяць на страўнік. Такое блуднае кола. Усё думаю, як Вы дабярэцеся да нас з хворымі нагамі? А мо ўдасца ў каго машыну дастаць?

Цалую і чакаю. Ваша *Л. Войцікава.*

379. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[30 ліпеня 1988 г.]

Шаноўны Аляксей Міхайлавіч.

Даруйце, што нарабіла Вам клопату, пасылаючы матэр'ялы пра др. Грынкевіча. А цяпер яшчэ адзін клопат — прашу адаслаць гэтыя матэр'ялы Язэпу Янушкевічу[1] (адрас далучаю). Янушкевіч матэр'ялы апрацуе, са справай знаёмы, і зробіць гэта згодна.

Сьпяшаюся, бо чуюся вельмі дрэнна. Хачу ўсё аставіць у парадку. З высылкай матэр'ялаў, можа, хто Вам паможа. Хто з "Паходні" ці са студэнтаў.

Усяго найлепшага — Вам і пані Марыі! *Л. Войцікава.*

380. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[11 жніўня 1988 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст. Прачытаць змагла нават бяз лупы. Янушкевіч так дагэтуль і не прыехаў. А ён апрача Грынкевіча і іншую работу абяцаў зрабіць. Але тую другую можа зрабіць і В.У. Скалабан.

Чуюся вельмі дрэнна і слаба. Магчыма, гэта будзе разьвітальны ліст. Меўся прыехаць па ўласнай волі Ігар Котаў — малады лекар (хіба, яго ведаеце). Мела гэта быць 3 жніўня, але не прыехаў. Магчыма, спалохаўся абвінавачваньняў Круталевіча[1]...

Абвінавачваньні ня маюць лёгікі ні на грош. Бо перадусім я ў такой партыі не была. Па-другое, у Радзе былі людзі самых розных палітычных паглядаў, нават анархіст быў, і гэта нікому ня шкодзіла. Апрача таго, увесь час у Вялікай Радзе быў побач Чарвякоў[2]. А можа, цяпер і Чарвякова ў чым абвінавачваюць?

Ня ведаю, чаго гэты Круталевіч да мяне прычапіўся? І пару гадоў таму пісаў зацемку ў "ЛіМ", што "выхадцы" з Грамады (гэта я) з Бадуновай і іншымі зьбіраліся стварыць нейкую арганізацыю. Цяпер паўтарае тое самае, толькі дадаў новага чалавека — Козіча. А я з Бадуновай, можа, дзесяць слоў наагул гаварыла. Яна была вялікая дзяячка, а я — усяго толькі работніца Камітэту помачы ахвярам вайны. Яна беларускімі справамі культурнымі не цікавілася, ніколі не бывала сярод нас у Беларускай хатцы. Я ад гэтага ўсяго дастала нейкай нэрвовай хваробы...

Каб прыехаў хто з лепшых знаёмых, а Ігар падлячыў, можа б, яшчэ як пра-

цягнула месяцы два, а так зусім німа ўжо сілы цярпець — ні фізычна, ні духова. Чакаю канца як збаўленьня.

Усім гродзенцам, Гродну шчырае, сардэчнае прывітаньне. Ці — разьвітаньне...

Усяго Вам найлепшага! У жыцьці сямейным, у працы. *Л. Войцікава.*

381. ДАНУЦЕ БІЧЭЛЬ

[Лета 1988 г.]

Даражэнькая пані Данута.

Лета, адпачынкі — ня ведаю, дзе каго шукаць. На ўсялякі выпадак пытаньне шлю на Ваш адрас. Можа, ведаеце, што чуваць у Алеся Мікалаевіча [Белакоза]? Апошні раз мне пісалі: “А.М. у шпіталі, Ваш ліст атрымаў”. І ад гэтага часу — ціха. Весткі ніякай ні са шпіталя, ні з Гудзевічаў.

Ведаю, што Вы шмат куды езьдзілі. Ці добра гэты час скарысталі? Ці атрымалі мой ліст і падзяку за верш[1]? Нягледзячы на прысутнасьць амаль кожны дзень мілых гасьцей, настрой благі, цяжкі, радасьці німа. Папаўняю сваю зялёную аптэку — вядома, не для сябе.

Выйшла з друку кніжка А. Гаруна[2]. Там шмат літаратуры для дзяцей, добрыя сцэнічныя творы. Лічу, што шмат лепшыя за сучасныя. Хіба, выкарыстаеце для “Вянка”[3]. Маю шмат лістоў, шмат праектаў, але неяк нічога ня пішацца. Буду ўдзячная за пару слоў адказу.

Усяго добрага Вам! Шчыра зычлівая *Л. Войцікава.*

382. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

[8 верасьня 1988 г.]

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, за розныя навіны. Пішуць мне, дзе што будзе друкавацца, а я горка ўсьміхаюся. Што з гэтых вестак, калі я бачу горш і горш... Ні чытаць, ні бачыць — нічога не магу.

Расчараваў мяне і Ігар [Котаў]. Апошні ліст (з канца ліпеня) быў зычлівы — абяцаў фаховую помач. І раптам — ціха, замоўк. Відаць, спалоханы абвінавачваньнем мяне як быццам у падвойнай ролі...

Трудна. Усё бывае. Я спадзявалася ўсяго-усякага, але сьлепаты? Ніколі. І таму вельмі цяжка яе пераношу.

Падтрымліваюць крыху супрацоўнікі Музэю М. Багдановіча з Менска. Прыязджаюць, пішуць адпаведна. Я ім кажу, што ня толькі экспанаты Музэю Максіма сьцерагуць, але і чуткасьць Максіма перанялі.

А наагул — нічога добрага навакол мяне. Параздавала розныя работы, не апрацавала. Ці хто што зробіць? Ня ведаю. Толькі Віталь Уладзіміравіч Скалабан прыязджаў і абяцаў зрабіць тое, чаго я не пасьпела, каб папярэдзіць далейшыя нападкі В. Круталевіча. Добра хоць гэта.

Усяго добрага Вам і Вашай сям'і. Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

383. АЛЯКСЕЮ АНІШЧЫКУ

12 кастрычніка 1988 г.

Паважаны грамадзянін.

Нам вельмі неабходна ведаць дакладны час існаваньня Наваградзкай Беларускай гімназіі. Думаю, што не адмовіцеся як найхутчэй пераслаць гэтыя весткі на мой адрас.

У пэўных успамінах гаворыцца[1], што Наваградзкая гімназія існавала вельмі *коратка*. Трэба гэты гістарычны факт высьветліць напэўна і поўна. Чакаю ласкавага адказу. Апрача Вас даць такі адказ німа каму.

Як бачыце — яшчэ жыву... Усяго найлепшага. *Л. Войцікава.*

384. МІКОЛУ ТАРАНДУ

27 сьнежня 1988 г.

Паважаны пане Мікола.

Не адказала Вам на ліст. Выбачайце. Зусім сьлепну. Пішу вобмацкам. Вочы рэагуюць толькі на чырвоны колер. На Вашы рукі шлю навагоднія віншаваньні цэламу клюбу "Паходня". Яшчэ раз усяго самага, самага лепшага! Сардэчна зычлівая *Л. Войцікава.*

385. АЛЯКСЕЮ ПЯТКЕВІЧУ

17 ліпеня 1989 г. Вільня

Дарагі Аляксей Міхайлавіч.

Дзякую за ліст, за добрыя прагнозы на будучае. На жаль, гэта, мусі, ня спраўдзіцца. Бачу штораз горш. Ваш ліст збольшага прачытала пры помачы павелічальнага шкла. Ляжыць перада мной аж тры, але я імі карыстацца, мусі, ня ўмею. А пісаць — таксама праз лупу? Ну, глупства. Што будзе — тое будзе, абы хутчэй да канца...

А ўсё сталася раптоўна. Бо яшчэ ўвесну быў у мяне Ігар Котаў. Пісаў мне ў сшытку (як усе, як заўсёды да глухога), і я ўсё чытала лёгка.

Ваш ліст — пятае праз дзясятае — зразумела. Хваліце Круталевіча? Вывучаў *архіўныя дакумэнты*? А якія? Бо і дакумэнты былі і ёсьць розныя. Ворагі заўсёды былі. Ён ужо і даўней у кароткай зацемцы (толькі ня помню, дзе — у "Полымі" ці ў "ЛіМе"?) пісаў: "Выхадкі з Грамады (гэта я — выхадак?) Бадунова, К. Душэўскі, Чарапук[1] (ці яшчэ хто?) стварылі арганізацыю".

А яшчэ раней, гаворачы аб працы беларусаў у Менску, зьдзекліва дадаваў: "Нават бежанцаў прыцягнулі". Была нейкі час Цэнтральная рада беларускіх арганізацыяў, куды ўваходзіў і Камітэт помачы ахвярам вайны. Нам за гэта не плацілі, і ганарараў мы не атрымлівалі. Усё рабілася за скарбоначныя зборы.

Я раз і другі рукой махнула — піша глупства, няхай піша, бо гэтага *не было*. Ніякіх такіх арганізацыяў з Бадуновай і К°. К. Душэўскі прыяжджаў на зьезд у сакавіку — на адзін дзень, нідзе не выступаў, і я яго нават ня бачыла.

А хто такі Чарапук? Ці Вы ведаеце? Я яго — навадворскага хлапца — памагала прыгатаўляць да экзаменаў у гімназію. Тупы, як пень... Усё ж здаў. Спачатку ў Гродне, пасьля пераехаў вучыцца ў Беласток. У хуткім часе выехаў

у Амэрыку. Там пасябраваў з Я. Варонкам[2]. У 1921 г. прыехаў у Новы Двор наведаць сваякоў. Ну і нас — у Альхоўніках, дзе я тады жыла. Зарэкамэндаваўся, як *дыплянатычны кур'ер*. І я яго ў Менску не пазнала б? Ды яго там не было. Пасьля мяне паведамілі, што ён у Амэрыцы памёр як алькаголік...

Як кажу, на ўсе гэтыя выдумкі Круталевіча я мала зьвяртала ўвагі, махала рукой. Ня ведала, што гэта да вялікай работы, да навуковых ступеняў рыхтуе сябе будучы гісторык. Цяпер — дачакалася: легендарных партый і майго там удзелу. Ды яшчэ, як кажуць, сядзячай на дзьвюх крэслах — у партыі і Вялікай Радзе...

Што ж, я не вучоны, я простая баба. У параўнаньні з гэтым, то і лісты Данута [Бічэль] — глупства, можна даравацъ. А А. Госьцеву, як бы ні было, я шмат у чым удзячная. Каб ня ён, я шмат аб якіх падзеях у Гродне ня ведала б.

Што да 20-х гадоў... Я жыла ў Альхоўніках на Сакольшчыне. У Гродна прыяжджала рэдка і бывала толькі ў сям'і Рака-Міхайлоўскага. Чула, што ёсьць беларускі батальён, але аб ім нічога добрага... Цяпер у мяне здымак Рака-Міхайлоўскага, рэабілітаванага пасьля сьмерці. Сьмерці тым больш трагічнай, што ў яго на вачах застрэлілі і яго маладзенькага сына, які не хацеў сьведчыць супраць бацькі. Цікава, *што* аб такіх падзеях скажуць вялікія гісторыкі...

Яшчэ што да Вашага ліста. Не знайшла ніякай весткі, ці Вы атрымалі бандэроль з матэр'яламі аб др. Станіславе Грынкевічы. З усімі, якія ў мяне былі... Ці захочаце ўзяцца за апрацоўку іх? А калі не, то што мне рабіць?

Я апрача вачэй наагул вельмі дрэнна чуюся і стараюся ўсё па магчымасьці зрабіць, чаго сумленьне вымагае.

Вам зычу ўсяго найлепшага. Даруйце за ўсё горшы ліст і за спосаб пісаньня. Губляю лінейку...

Як была, заўсёды зычлівая *Л. Войцікава*.

386. ВЯЧКУ ЦЕЛЕШУ

24 ліпеня 1989 г.

Дарагі пан Вячаслаў.

Дзякую за памяць. Як справы з "Гродна на старых паштоўках"[1]? Не пішу больш — не магу... Мусі, гады зьелі мае вочы — ледзь бачу. Чытаць не магу зусім. Ужо 9 месяцаў ня брала кніжкі ў рукі. Цяжка, вельмі цяжка...

Усяго Вам добрага! Сардэчна зычлівая *Л. Вой[цікава]*.

КАМЭНТАР

Выданьне аднатомавіка прымеркаванае да 120-х угодкаў Зоські Верас (Людвікі Сівіцкай; 1892–1991) – пісьменьніцы, мэмуарысткі, публіцысткі, лексыкографа, перакладчыцы, асьветніцы, грамадзкай працаўніцы, рэдактаркі беларускіх часопісаў. Пражыўшы амаль сто гадоў, яна злучыла разасобленыя часам пакаленьні, зьнітавала розныя эпохі. Ня маючы ў паслужным сьпісе ўнівэрсытэцкіх дыплёмаў, закончыўшы ўсяго толькі гімназію і агародніцка-пчалярскія курсы, Зоська Верас, тым ня менш, ні ў якой справе не выглядала дылетантам і ўсё жыцьцё без утомы рупілася на розных дзялянках – склала "Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік" (выдадзены ў 1924 г.), сабрала ўнікальны каталёг рэцэптаў "Лекавыя зёлкі" (гонар Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музэю, але ня выйшаў друкам да гэтай пары), пісала вершы, апавяданьні і ўспаміны, перакладала п'есы для дзіцячага тэатру, працавала ў шматлікіх асьветніцкіх і грамадзкіх арганізацыях, рэдагавала часопісы "Заранка", "Пралескі" і "Беларуская борць", была нястомнай аўтаркай многіх заходнебеларускіх пэрыёдыкаў, пачынаючы ад легендарнай "Нашай нівы"... Дзясяткі дасьледчыкаў зьвярталіся да яе па падказку – толькі за паваенны час З. Верас па яе ўласным прызнаньні напісала больш за 6 000 лістоў. Яна блізка ведала М. Багдановіча, Б. Тарашкевіча, А. Смоліча, Ст. Грынкевіча, А. Луцкевіча, А. Уласава, С. Рака-Міхайлоўскага і дзясяткі іншых выдатных дзеячаў, пра якіх маўчалі беларускія савецкія энцыкляпэдыі. Адчуваючы адказнасьць перад будучымі пакаленьнямі, З. Верас склала свой уласны рукапісны даведнік, куды ўвайшлі жыцьцяпісы тых, на каго савецкая цэнзура наклала непарушнае табу. На жаль, з усяго багатага творчага даробку пісьменьніцы да гэтай пары пабачыла сьвет толькі кніжачка для дзяцей "Каласкі" (1985). Таму ўкладальнік ахвотна адгукнуўся на прапанову "Гарадзенскай бібліятэкі" скласьці і пракамэнтаваць мэмуарную і эпісталярную спадчыну аўтаркі, чыё жыцьцё непарыўна зьвязанае з Гарадзеншчынай. Чым жа адметны першы збор твораў Зоські Верас? З яе "Успамінаў" раней друкаваліся толькі асобныя разьдзелы ("Старое Гродна", "Горадзенскі гурток беларускай моладзі", "Пяць месяцаў у Менску"), у нашым выданьні яны зьмешчаныя цалкам. Упершыню ў гэтым томе сабраная і ладная частка эпісталярнай спадчыны Зоскі Верас – 386 лістоў (з іх 367 друкуюцца ўпершыню), адрасаваных яе гарадзенскім карэспандэнтам. Такі "геаграфічны" прынцып адбору, вядома, не найлепшы, але ў падобных выпадках заўсёды нечым даводзіцца ахвяраваць. Пры падрыхтоўцы тэкстаў да друку ўкладальнік стараўся захаваць асаблівасьці мовы (*німа, сяньня, падарожа* і г.д.); пакінуты ў першасным выглядзе і дарэформавы правапіс, якога аўтарка больш-менш пасьлядоўна трымалася (часам ужываючы дваякія варыянты: *Менск* і *Мінск*, *горадзенскі* і *гродзенскі*, *адрас* і *адрэса*). Скароты раскрываюцца ў квадратных дужках (напрыклад, Тав*[арыства] "Пчала" і яго орган "Бел[аруская] борць"*). Меркаваны час напісаньня не датаваных тэкстаў падаецца таксама ў квадратных дужках. Усе лісты да пералічаных ніжэй адрасатаў публікуюцца ўпершыню паводле наступных крыніцаў:

лісты Аляксею Анішчыку – архіў грамадзкай арганізацыі “Беларускі музэй імя Івана Луцкевіча” (Вільня);

лісты Алесю Белакозу – архіў А. Белакоза ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музэі;

лісты Дануце Бічэль і ўдзельнікам літгуртка “Вянок” – архіў Д. Бічэль у Дзяржаўнай установе культуры “Музэй Максіма Багдановіча” (Гародня);

лісты Ларысе Геніюш – архіў Л. Геніюш у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук (фонд 31, воп.1, спр. 315–317);

лісты Аляксандру Госьцеву – прыватны архіў А. Госьцева (Гародня);

лісты Фёдару Ігнатовічу – прыватны архіў Ф. Ігнатовіча (Гародня);

лісты Арсеню Лісу – прыватны архіў А. Ліса (Менск);

лісты Адаму Мальдзісу – архіў А. Мальдзіса ў Дзяржаўным музэі гісторыі беларускай літаратуры (фонд не апрацаваны);

лісты Мікалаю Марцінчыку – прыватны архіў Ф. Ігнатовіча (Гародня);

лісты Яўгену Петрашэвічу – архіў З. Верас у Дзяржаўнай установе культуры “Музэй Максіма Багдановіча” (Гародня);

лісты Аляксею Пяткевічу – прыватны архіў А. Пяткевіча (Гародня);

лісты Янку Саламевічу – прыватны архіў Я. Саламевіча (Менск);

лісты Міколу Таранду і сябрам клюбу “Паходня” – прыватны архіў М. Таранды (Гародня);

лісты Вячку Целешу – прыватны архіў В. Целеша (Рыга).

Лісты Міхасю Верацілу друкуюцца паводле публікацыі: Вераціла М. Аўтографы Зоські Верас // “Новы час”, 27 ліпеня 2012 г.;

лісты Уладзіміру Ягоўдзіку – паводле публікацыі: Ягоўдзік У. Ластаўкі з Лясной хаткі // “Літаратура і мастацтва”, 11 траўня 2001 г.; з дапаўненьнямі і ўдакладненьнямі публікатара.

Укладальнік выказвае падзяку за спрыяньне: сп. Ганьне Запартыка – дырэктару Беларускага дзяржаўнага архіва-музэю літаратуры і мастацтва; сп. Аляксандру Стэфановічу – загадчыку аддзелу рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі; сп. Кацярыне Басінскай – дырэктару Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музэю; сп. Лідзіі Макарэвіч – дырэктару Дзяржаўнага музэю гісторыі беларускай літаратуры; сп. Вользе Гулевай – старэйшаму навуковаму супрацоўніку ДМГБЛ; сп. Сьвятлане Рапецкай – дырэктару ДУК “Музэй Максіма Багдановіча” (Гародня); сп. Вераніцы Саламевіч – апякунцы архіва свайго бацькі Янкі Саламевіча; сп. Хведару Нюньку – старшыні Таварыства беларускай культуры (Вільня); сп. Валянціне Войцік і сп. Яраславу Войціку – пляменьніцы і ўнуку пісьменьніцы, якія перадалі для публікацыі рэдкія фотаздымкі; сп. Міхасю Казлоўскаму – рэдактару краязнаўчага часопісу “Куфэрак Віленшчыны”. Асаблівая падзяка – карэспандэнтам Зоські Верас, якія бескарысна дазволілі публікацыю яе лістоў: сп. Дануце Бічэль, сп. Аляксандру Госьцеву, сп. Фёдару Ігнатовічу, сп. Арсеню Лісу, сп. Адаму Мальдзісу, сп. Аляксею Пяткевічу, сп. Міколу Таранду, сп. Вячку Целешу.

Аўтабіяграфія (с. 10). Упершыню – газ. “Голас Радзімы”, 1 кастрычніка 1992 г. [1]*Сівіцкі Антон* (1864–1907) – вайсковец, капітан расейскай арміі; апошняе месца службы – г. Сураж Чарнігаўскай губэрні. [2]*Сівіцкая Эмілія* (дзявоч. *Садоўская*;

1869–1944) – грамадзкая дзяячка; з 1916 г. працавала загадчыцай сталоўкі пры Беларускім камітэце Таварыства дапамогі ахвярам вайны, з 1923 г. жыла ў Вільні. [3]*Міцкевіч Адам* (1798–1855) – польскі паэт беларускага паходжаньня. [4]*Сыракомля Уладзіслаў* (сапр. *Людвік Уладзіслаў Францішак Кандратовіч; 1823 – 1862)* – польскі і беларускі паэт. [5]*"O budownictwie Wilna"* (польск.) – "Пра будаўніцтва Вільні". [6]*"Смык"* – маецца на ўвазе зб. Ф. Багушэвіча "Смык беларускі". [7]*Горадзенскі гурток беларускай моладзі* дзейнічаў у 1909–1913 гг. У яго ўваходзілі вучні мясцовых гімназій і школаў, у тым ліку Л. Сівіцкая, А. Бычкоўскі, А. Зянюк, А. Аляксюк, Я. Натусевіч, К. Колышка, Я. Лявіцкі ды інш. Гурток выдаў літаратурны альманах "Колас беларускай нівы" (1913), меў свой хор, ставіў беларускія спэктаклі. [8]*Саламевіч Янка* (1938–2012) – літаратуразнавец і фальклярыст, аўтар першага ў гісторыі "Слоўніка беларускіх псэўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стст.)". [9]*Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны* заснаванае ў 1915; у яголым Менскім камітэце працавалі Ядвігін Ш., У. Галубок, А. Зязюля, Л. Сівіцкая, В. Лявіцкая, В. Чавусаў і др. [10]*Беларускі нацыянальны камітэт* быў утвораны ў 1917 г. у Менску на зьезьдзе беларускіх нацыянальных арганізацый для выпрацоўкі ў кантакце з Часовым урадам асноваў аўтаноміі Беларусі ў складзе Расейскай фэдэрацыі. [11]*Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый* – каардынацыйны орган беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, створаная ў Менску ў 1917 г. [12]*Вялікая беларуская рада* – каардынацыйны цэнтр беларускага нацыянальна-вызвольнага руху, утвораны ў Менску ў 1917 г. [13]*Беларуская сацыялістычная грамада* – нацыянальная партыя леванародніцкага кірунку, утвораная ў 1902 г. пад назвай Беларуская рэвалюцыйная грамада. [14]*Бароўскі Міхайла* (1891–1989) – украінскі гаспадарнік і грамадзкі дзеяч, рэдактар час. "Украінскі пасечнік", аўтар шматлікіх кніг па пчалаводзтве; яго кніга "Медадайныя расьліны" выйшла ў Львове ў 1931 г. [15]*"Беларуская борць"* – час. Беларускага каапэратыўнага таварыства "Пчала", выходзіў у Вільні з 1934 па 1938 г. пад рэдакцыяй З. Верас. [16]*Тумаш Вітаўт* (1910–1998) – гісторык, публіцыст, грамадзкі дзеяч, адзін з рэдактараў газ. "Раніца". Пасьля Другой сусьветнай вайны жыў у Нямеччыне і ЗША, займаўся пераважна скарыназнаўствам. [17]*Ліс Арсень* (нар. 1934) – пісьменьнік, фальклярыст, доктар філялёгіі. [18]*Дварчанін Ігнат* (1895–1937) – пісьменьнік, актывіст нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі; доктар філязофіі. Быў адным з арганізатараў Першага ўсебеларускага зьезду (1917), у 1933 г. арыштаваны і высланы на Салаўкі, дзе расстраляны. [19]*Горкі Максім* (сапр. *Аляксей Пешкаў*; 1868–1936) – расейскі пісьменьнік і грамадзкі дзеяч. [20]*Крашэўскі Юзаф Ігнацы* (1812–1887) – польскі пісьменьнік беларускага паходжаньня.

Успаміны (с. 13). Цалкам друкуюцца ўпершыню паводле ксэракопіі аўтографа, якая зьберагаецца ў архіве З. Верас у БДАМЛіМ (фонд 318, воп. 1, спр. 3а, 3б). Машынапіс успамінаў захоўваецца ў архіве В. Скалабана (БДАМЛіМ; фонд не апрацаваны).

Старое Гродна (с. 13). Упершыню – альманах "Краю мой – Нёман: Гродзеншчына літаратурная" (Мн., 1986). [1]*Баторы Стэфан* (1533–1586) – вялікі князь ВКЛ, кароль польскі. Меў рэзыдэнцыю ў Гародні, дзе памёр і быў пахаваны ў крыпце Фары Вітаўта (пазьней перапахаваны на Вавэлі). [2]*Ажэшка Эліза* (1841–1910) – польская пісьменьніца беларускага паходжаньня; жыла ў Гародні, ся-

бравала з Ф. Багушэвічам. Многія яе творы (раман "Над Нёманам", аповесьць "Нізіны") заснаваныя на беларускім матэрыяле.

Горадзенскі гурток беларускай моладзі (с. 16). Упершыню – Беларускі каляндар. – Беласток, 1981. [1]*Грынкевіч Францішак* (1884–1933) – рэлігійны і культурны дзеяч. Закончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію, у 1907 рукапакладзены ў ксяндзы. Служыў пробашчам пры Брыгіцкім кляштары ў Гародні, быў кіраўніком Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі. Перакладаў з лацінскай мовы на беларускую багаслужбовую літаратуру. [2]*Бычкоўскі Адам* (1889–1937) – праўнік, драматург, сустаршыня (разам з ксяндзом Ф. Грынкевічам) Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі (1909–1913). [3]*Бычкоўскі Антон* – грамадзкі і рэлігійны дзеяч, публіцыст, рэдактар газ. "Беларус". [4]*Аляксюк Павал* (1892–?) – палітычны і грамадзкі дзеяч. Адзін з ініцыятараў абвяшчэння БНР, уваходзіў у склад Народнага сакратарыяту Беларусі, узначальваў Беларускую вайсковую камісію, супрацоўнічаў з польскімі ўладамі. [5]*Абрамовіч Зыгмунт* (псэўд. *Антон Забель*; 1892–1988) – актор тэатру Ігната Буйніцкага; пазьней жыў у Злотаве (Польшча). [6]"Дудка" – маецца на ўвазе паэтычны зб. "Дудка беларуская" Ф. Багушэвіча. [7]*Федароўскі Міхал* (1853–1923) – беларускі і польскі фальклярыст, этнограф і археоляг. [8]*Палуян Сяргей* (1890–1910) – публіцыст і празаік. [9]*Купала Янка* (сапр. *Луцэвіч*; 1982–1942) – народны паэт Беларусі (1925), клясык беларускай літаратуры. [10]*Каршун* – адзін з псэўд. паэта *Янука Дарашкевіча* (1890–1943). [11]*"Па рэвізіі"* – п'еса ўкраінскага драматурга Маркі Крапіўніцкага (1840–1910). [12]*Polskiego koła samokształczenia* (польск.) – Польскага гуртка самаадукацыі. [13]*Буйніцкі Ігнат* (1861–1917) – актор, рэжысёр, тэатральны дзеяч; пачынальнік беларускага нацыянальнага прафэсійнага тэатру. [14]*Грыневіч Антон* (1877–1937) – зьбіральнік і папулярызатар фальклёру, выдавец, пэдагог, кампазытар. [15]*Карусь Каганец* (сапр. *Кастравіцкі Казімір Рафал*; 1868–1918) – пісьменьнік і грамадзкі дзеяч. [16]*Лявіцкі Язэп* (псэўд. *Юрка Снапко*; 1893–1916) – паэт, удзельнік ГГБМ; загінуў падчас першай сусьветнай вайны. [17]*Ляўковіч Янка* (1891–1976) – актывіст ГГБМ, пазьней – каталіцкі сьвятар. [18]*Зянюк Адольф* (1895–1938) – актывіст і адзін з кіраўнікоў ГГБМ, журналіст. [19]*Луцкевіч Іван* (1881–1919) – палітычны дзеяч, этнограф, публіцыст. [20]*Ластоўскі Вацлаў* (1883–1938) – палітычны і грамадзкі дзеяч, гісторык, этнограф, пісьменьнік, акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1928), прэм'ер-міністр ураду БНР (1919–1923). [21]*Уласаў Аляксандр* (1874–1941) – грамадзка-палітычны і культурны дзеяч, публіцыст. Быў рэдактарам-выдаўцом газэты "Наша ніва", паслом на Сойм Рэчы Паспалітай; загінуў падчас сталінскага тэрору. [22]*Лейка Кандрат* (1860–1921) – паэт і драматург. [23]*Ластаўка Пятро* (1907–1968) – публіцыст і грамадзка-культурны дзеяч Заходняй Беларусі; пазьней жыў у Варшаве. [24]*Дыёгенас* (*Дыяген Сінопскі*; ? – каля 330 г. да н.э.) – старажытнагрэцкі філёзаф-мараліст. [25]*Эпімах-Шыпіла Браніслаў* (1859–1934) – мовазнавец, дасьледчык літаратуры, правадзейны сябра Інбелкульту. [26]*Тарашкевіч Браніслаў* (1892–1938) – грамадзкі і палітычны дзеяч, філёляг, літаратар, акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1928). [27]*Чаржынскі (Дзяржынскі) Уладзіслаў* (1897–1974) – крытык і літаратуразнавец. [28]*Чарапук Янка* (1896–1957) – грамадзкі і палітычны дзеяч, чыноўнік па спэцыяльных даручэньнях пры Міністэрстве замежных спраў БНР, арганізатар Беларускай партыі незалежных рэвалюцыянераў, віцэ-старшыня Беларуска-амэрыканскай нацыянальнай рады. Жыў у ЗША.

Дзесяць месяцаў у Варшаве і пачатак вайны (с. 26). [1]*Леўчык Гальяш* (сапр. *Ляўковіч Ільля*; 1880–1944) – беларускі паэт і бібліяфіл. [2]*Вітан-Дубейкаўскі Лявон* (1869 ці 1869–1940) – архітэктар, пэдагог, паэт; выпускнік Акадэміі архітэктуры ў Парыжы (1909). [3]*Зямкевіч Рамуальд* (1881–1943 або 1944) – грамадзкі і палітычны дзеяч, калекцыянер і бібліяфіл. [4]*Марыя Галубянка* (*Голуб*; па мужу *Бучынская*; ? –1939) – грамадзкая дзяячка, лекар; жыла ў Празе. [5]*Смоліч Аркадзь* (1891–1938) – навуковец, палітычны і грамадзкі дзеяч; загінуў падчас сталінскага тэрору. [6]*Бабровіч Мечыслаў* (псэўд. *Лявон Гмырак*; 1891–1915) – крытык і празаік; загінуў на фронце падчас Першай сусьветнай вайны. [7]*Славацкі Юльюш* (1809–1849) – польскі паэт. [8]*"Сон на кургане"* – драматычная паэма Янкі Купалы. [9]*"Лучынка"* – літаратурна-мастацкі і навукова-папулярны час. краязнаўчага кірунку, выходзіў у Менску ў 1914 г. [10]*"Polacy w Kalabryi"* – кніга польскага пісьменьніка і вандроўніка *Тэадора Трыпліна* (1813–1881) пра ўдзел польскіх вайскоўцаў у напалеонаўскіх войнах у Італіі.

Праца ў Таварыстве помачы ахвярам вайны і дзіцячых прытулках (с. 32). [1]*Ядвігін Ш.* (сапр. *Антон Лявіцкі*; 1869–1922) – празаік і публіцыст; пахаваны ў Вільні на могілках Росы. [2]*Лявіцкая Ванда* (1895–1968) – беларуская пісьменніца, дачка Ядвігіна Ш., жонка Я. Лёсіка. [3]*Галубок Уладзіслаў* (1882–1937) – пісьменьнік, рэжысёр, тэатральны дзеяч, мастак, першы народны артыст БССР. [4]*Фальскі Усевалад* (1886–?) – грамадзка-палітычны і дзяржаўны дзеяч; камісар замежных спраў у Часовым рабоча-сялянскім урадзе Беларусі (1919). [5]*В. Русецкі* – менскі мешчанін, пчаляр, домаўласьнік; у яго доме пэўны час кватараваў Я. Колас. [6]*Астрамовіч Аляксандр* (псэўд. *Андрэй Зязюля*; 1878–1921) – каталіцкі сьвятар і паэт. [7]*Паўловіч Альбэрт* (1875–1951) – паэт і драматург. [8]*Чавусаў Віктар* (1871–1920) – праўнік і журналіст, рэдактар-выдавец газ. "Минский курьер", супрацоўнік Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. [9]*Зьмітрок Бядуля* (сапр. *Самуіл Плаўнік*;1886–1941) – паэт і празаік. [10]*Тацьцянінскі камітэт* – камітэт вялікай княжны Тацьцяны Мікалаеўны для аказаньня часовай дапамогі пацярпелым ад вайны; быў утвораны ў 1914 г. [11]*Шантыр Фабіян* (1887–1920) – паэт, публіцыст, грамадзка-палітычны дзеяч; камісар па нацыянальных справах у Часовым рабоча-сялянскім урадзе Беларусі (1919); быў расстраляны бальшавікамі. [12]*Ждановіч Флярыян* (1884–1937) – тэатральны дзеяч, актор, рэжысёр, адзін з заснавальнікаў беларускага прафэсійнага тэатру; загінуў падчас сталінскага тэрору. [13]*Ядвіга Раткевіч* – мэдык, малодшая сястра дзяячкі беларускай эміграцыі Апалёніі Савёнак; жыла ў Курску.

Пяць месяцаў у Менску (с. 40). Упершыню – альманах "Белавежа" (Беласток, 1971). [1]*Багдановіч Максім* (1891–1917) – паэт і перакладчык, клясык беларускай літаратуры. [2]*Фарботка Язэп* (1893–1960) – паэт, літаратуразнавец. [3]*Гадлеўскі Вінцэнт* (1888–1942) – палітычны і рэлігійны деяч, удзельнік Першага ўсебеларускага зьезду (1917), адзін з заснавальнікаў Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі, уваходзіў у раду Беларускай народнай самапомачы; у 1942 г. расстраляны фашыстамі. [4]*Заяц Леанард* (1890–1935) – палітычны дзеяч, з 1918 г. загадчык канцылярыі, дзяржаўны сакратар ураду БНР. [5]*Мікуліч Барыс* (1912–1954) – пісьменьнік, аўтар аповесьці пра М. Багдановіча.

Падарожа ў Пецярбург і менская батлейка (с. 45). [1]*Родзевіч Леапольд* (1895–пасьля 1938) – паэт, драматург, удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. Быў арыштаваны ў 1934 г., загінуў у Гулагу. [2]*Іваноўскі Вацлаў* (1880–1943) – палітычны і грамадзкі дзеяч, доктар тэхнічных навук, міністр асьветы БНР ва ўрадзе А. Луцкевіча. Падчас Другой сусьветнай вайны быў бургамістрам Менску, загінуў у выніку тэракту.

Менскія зьезды (с. 47). [1]*Варонка Язэп* (1891–1952) – грамадзкі і палітычны дзеяч, адзін з ініцыятараў абвяшчэння незалежнасьці Беларусі, узначальваў Урад БНР. [2]*Скірмунт Раман* (1868–1939) – грамадзкі і палітычны дзеяч. Быў дэпутатам 1-ай Дзяржаўнай Думы Расеі, узначальваў Беларускі нацыянальны камітэт у Менску, займаў пасаду прэм'ер-міністра БНР. [3]*Радзівіл Магдалена* (дзявоч. *Завіша*, у першым замустве *Красінская*; 1861–1945) – мэцэнатка, фінансавала дзейнасць Беларускага выдавецкага таварыства, суполкі "Загляне сонца ў наша ваконца" ды інш. [4]*Пасьля Вайсковага зьезду...*– маецца на ўвазе зьезд Заходняга фронту, скліканы ў Менску 18 кастрычніка 1917 г., які падтрымаў беларускую краёвую ўладу ў асобе Вялікай Беларускай рады. [5]*Круталевіч Вадзім* (1922–2006) – гісторык, праўнік, доктар юрыдычных навук; дасьледаваў гісторыю нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі. [6]*Метлін Іван* – адвакат, быў памочнікам менскага губэрнскага камісара. [7]*Будзька Эдвард* (1882–1958) – палітычны і грамадзкі дзеяч. [8]*Кахановіч Міхал* (1882–1934) – палітычны і грамадзкі дзеяч, гісторык, пэдагог. [9]*Каравайчык Павал* (1896–1937) грамадзкі дзеяч і пісьменьнік (псэўд. *Павал Любецкі*); загінуў падчас сталінскага тэрору. [10]*Адамовіч Аляксандр* (1900–1937) – палітычны дзеяч, з 1926 г. членц ЦК КП(б) Б, з 1928 г. намесьнік наркаму земляроства БССР; загінуў падчас сталінскага тэрору. [11]*Жылуновіч Зьміцер* (псэўд. *Цішка Гартны*; 1887–1937) – пісьменьнік і дзяржаўны дзеяч, старшыня Часовага рабоча-сялянскага ўраду Беларусі (1919). [12]*Краскоўскі Іван* (1880–1955) – грамадзкі дзеяч, пэдагог, дырэктар Дзьвінскай Беларускай гімназіі; пасьля Другой сусьветнай вайны жыў у Славакіі. [13]*Бурбіс Алесь* (1885–1922) – публіцыст, палітычны і грамадзкі дзеяч; быў консулам БНР у Маскве, з 1921 г. намесьнік наркаму замежных спраў БССР. [14]*Станкевіч Янка* (1891–1976) – грамадзка-палітычны дзеяч, доктар славянскай філялёгіі і гісторыі; быў паслом Сойму Рэчы Паспалітай, падчас Другой сусьветнай вайны ўваходзіў у Беларускую самапомач, з 1944 – на эміграцыі. [15]*Мядзёлка Паўліна* (1893–1974) – мэмуарыстка і грамадзкая дзяячка. [16]*Любаўскі Мацей* (1860–1936) – расейскі гісторык, дасьледаваў гісторыю ВКЛ. [17]*Доўнар-Запольскі Мітрафан* (1867–1934) – гісторык і этнограф, прафэсар Маскоўскага, Кіеўскага і Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэтаў. [18]*Карскі Яўхім* (1861–1931) – філёляг-славіст, заснавальнік беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства. Акадэмік Пецярбурскай Акадэміі навук, членц Інстытуту беларускай культуры, Чэшскай Акадэміі навук. [19]*Шахматаў Аляксей* (1864–1920) – расейскі філёляг і гісторык, прафэсар Пецярбургскага ўнівэрсытэту, заснавальнік расейскай мовазнаўчай школы. [20]*Канчар Яўсей* (1882–1979) – гісторык, грамадзка-палітычны дзеяч, адзін з арганізатараў Усебеларускага зьезду (1917). [21]*Касяк Іван* (1879–1966) – пэдагог, выпускнік Маладзечанскай настаўніцкай сэмінарыі; выкладаў у народнай вучэльні ў Ляндварове пад Вільняй. [22]*Грыб Тамаш* (1895–1938) – беларускі палітычны і культурны дзеяч, сябра Рады БНР, народны сакратар земляробства; жыў у Празе. [23]*Рак-Міхайлоўскі Сымон* (1885–1938) – публіцыст і грамадзка-

палітычны дзеяч. Быў паслом на Сойм Рэчы Паспалітай, адным з кіраўнікоў Беларускай сялянска-работніцкай грамады; загінуў падчас сталінскага тэрору. [24]*Шыла Мікола* (1888–1948) – грамадзкі дзеяч і журналіст, рэдактар газ. "Змаганьне" і час. "Шляхам жыцьця", удзельнічаў у Другім усебеларускім кангрэсе (1944). [25]*Кандратовіч Кіпрыян* (1859–1932) – вайсковы дзеяч, генэрал, уваходзіў у Беларускую вайсковую раду. [26]*Русак Васіль* (1896–1946) – грамадзкі дзеяч, выдавец, прадпрымальнік, з 1931 г. кіраўнік Беларускага нацыянальнага камітэту ў Празе. [27]*Чарвякоў Аляксандр* (1892–1937) – дзяржаўны і палітычны дзеяч, адзін са стваральнікаў БССР. [28]*Езавітаў Кастусь* (1893–1946) – беларускі палітычны і грамадзкі дзеяч, сакратар ваенных спраў у першым Урадзе БНР (1918), генэрал-маёр (1920). Узначальваў галоўную ваенную ўправу Беларускай Цэнтральнай Рады (1944). У 1945 г. арыштаваны савецкімі спэцслужбамі ў Нямеччыне, памёр пасьля катаваньняў у менскай турме. [29]*Лёсік Язэп (1883–1940)* – мовазнавец, пісьменьнік, акадэмік Беларускай Акадэміі навук (1928); памёр у зьняволеньні ў турме г. Саратава. [30]*Прушынскі Аляксандр* (псэўд. *Алесь Гарун*; 1887–1920) – пісьменьнік і грамадзкі дзеяч, клясык беларускай літаратуры.

Вір грамадзкага жыцьця (с. 59). [1]*Вернікоўскі Тодар* (1861– пасьля 1935) – палітычны і грамадзкі дзеяч; займаў сакратарскія пасады ў трох урадах БНР. [2]*Саюз гарадоў* (*Земска-гарадзкі саюз*) – агульнарасейскія ваенна-грамадзкія арганізацыі лібэральных памешчыкаў, якія забясьпечвалі фронт Першай сусьветнай вайны зброяй і прадуктамі. [3]*Усебеларускі зьезд* (1917) – першы ў гісторыі агульнанацыянальны форум беларускага народу; быў разагнаны бальшавікамі, пасьля чаго створаны на зьездзе Выканаўчы камітэт перайшоў на нелегальнае становішча. [4]*Ленін Уладзімір* (сапр. *Ульянаў*; 1870–1924) – расейскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў Кастрычніцкай рэвалюцыі (1917), старшыня Савету народных камісараў РСФСР. [5]*Рэзаўскі Людвіг* (1887–1980) – камісар унутраных спраў СНК Заходняй вобласьці і фронту, кіраваў разгонам Усебеларускага зьезду (1917). [6]*Серада Іван* (1879–1943) – палітычны і грамадзкі дзеяч, старшыня Рады БНР (1918). [7]*Крэчаўскі Пятро* (1879–1928) – палітычны дзеяч і гісторык, старшыня Рады БНР (1919–1928); жыў у Празе. [8]*Аўсянік Антон* (1888–1933?) – грамадзкі і палітычны дзеяч, член Народнага сакратарыяту БНР. [9]*Захарка Васіль* (1877–1943) – палітычны дзеяч, з 1928 да 1943 г. намесьнік старшыні, старшыня Рады БНР. [10]*Беларускай Рэспублікі дачакаліся...*– маецца на ўвазе стварэньне савецкай Беларусі, кантраляванай Масквой. [11]*Дыла Язэп* (1880–1973) – пісьменьнік і грамадзкі дзеяч, камісар земляробства ў Часовым урадзе БССР.

Пяць гадоў у Альхоўніках (с. 64). [1]*Грынкевіч Станіслаў* (1902–1945) – лекар-псыханэўроляг, публіцыст, перакладчык, доктар мэдыцыны; у 1944 г. арыштаваны НКВД, загінуў у турме.

Вільня (с. 68). [1]*Станкевіч Станіслаў* (1886–1964) – беларускі выдавец; з 1926 г. меў у Вільні ўласную кнігарню. [2]*Беларускае выдавецкае таварыства* існавала ў Вільні ў 1913–1915, 1919–1930 гг.; заснавальнікі – А. Луцкевіч, Б. Даніловіч і др. [3]*Луцкевіч Антон* (1884–1942) – палітычны і грамадзкі дзеяч, гісторык і літаратурны крытык, прэм'ер-міністр Рады БНР; загінуў падчас сталінскага тэрору. [4]*Манькоўскі Язэп* (псэўд. *Янка Окліч*; 1880-я – 1940-я) – беларускі

і польскі публіцыст, перакладчык, выдавец. [5]*Працаваў тады ў "Вячэрняй газэце"*...– у названым грамадаўскім выданьні А. Луцкевіч працаваў з 1912 па 1914 г. [6]*Беларускі студэнцкі саюз* – арганізацыя студэнтаў Віленскага ўнівэрсытэту (1920–1930). [7]*Пачопка Янка* (псэўд. *Башкір*; 1898–1977) – пісьменьнік, грамадзкі дзеяч, аграном; быў рэдактарам час. "Праваслаўны беларус". [8]*Віленская Беларуская гімназія* – адна з першых беларускіх сярэдніх навучальных установаў у Заходняй Беларусі; дзейнічала ў 1919–1939 гг. [9]*Нагродзкі Зыгмунт* (1866–1937) – пісьменьнік і прадпрымальнік, заснавальнік віленскага "Народнага выдавецтва", якое выпускала і беларускія кнігі. [10]*"Студэнцкая думка"* – грамадзка-палітычны і літаратурны час. Беларускага студэнцкага саюзу ў Вільні. [11]*Войцік Антон* (1998–1948) – публіцыст, рэдактар грамадаўскіх газэтаў; з 1926 г. муж Л. Сівіцкай. [12]*Гаўрылік Язэп* (1893–1937) – грамадзкі і палітычны дзеяч, пасол Сойму Рэчы Паспалітай, адзін з заснавальнікаў Радашкавіцкай беларускай гімназіі; загінуў падчас сталінскага тэрору. [13]*"Сялянская праўда"* выходзіла ў Вільні ў 1924 г. пад рэдакцыяй А. Войціка.

Шлюб з Антонам Войцікам і пераезд у Чыгуначную калёнію (с. 73). [1]*Татарын Серафім* (1903–1988) – удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, сябра КПЗБ. Рэдагаваў газ. "Наша праўда" (Вільня), правёў у польскіх турмах больш за сем гадоў. [2]*Машара Міхась* (1902–1976) – паэт, празаік, актывіст нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. [3]*Сабалеўскі Юры* (1889–1957) – грамадзкі і палітычны дзеяч, пасол Сойму Рэчы Паспалітай, падчас Другой сусьветнай вайны бургамістр Баранавічаў, віцэ-прэзыдэнт БЦР; з 1944 г. на эміграцыі. [4]*Краўцоў Макар* (сапр. *Косьцевіч*; 1890 – пасьля 1939) – пісьменьнік, аўтар тэксту славутай песьні "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" (музыка У. Тэраўскага). Быў дэлегатам І Усебеларускага зьезду, сябрам Рады БНР. Пасьля прыходу саветаў у Вільню арыштаваны НКВД. [5]*Паўловіч Сяргей* (1875–1940) – грамадзкі і культурны дзеяч, пэдагог. [6]*Каруза Павал* (1906–1988) – беларускі музычны і грамадзкі дзеяч, адзін з лідараў Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі ў міжваенны пэрыяд, пасол Сойму Рэчы Паспалітай; быў рэдактарам газ. "Беларуская крыніца". [7]*Стэповіч Альбін* (1894–1934) – кампазытар, выдавец, палітычны дзеяч; пасол Сойму Рэчы Паспалітай. Аўтар вядомай песьні "Беларусь перадусім". [8]*Ярэміч Фабіян* (1891–1958) – грамадзкі і палітычны дзеяч, віцэ-старшыня Беларускага пасольскага клюбу ў Сойме Рэчы Паспалітай. Падчас Другой сусьветнай вайны працаваў бургамістрам Барысава, за што быў асуджаны; пасьля вызваленьня жыў у Вільні. [9]*"Заранка"* – ілюстраваны час. для дзяцей; выходзіў у Вільні ў 1927–1931 гг. пад рэдакцыяй З. Верас. [10]*Таварыства беларускай школы* – культурна-асьветная арганізацыя, дзейнічала ў Заходняй Беларусі ў 1921–1937 гг. [11]*"Саха"* – сельскагаспадарчы час., выходзіў у Вільні і Менску з 1912 па 1931 г. (нерэгулярна). [12]*Шнаркевіч Надзея* (1897–1974) – настаўніца, супрацоўніца галоўнай управы Таварыства беларускай школы, рэдактарка час. "Жаночая справа" і *Шнаркевіч Язэп* (?–1981) – настаўнік, выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі. [13]*Марцінчык Мікалай* (1901–1980) – удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. Рэдагаваў час. "Студэнцкая думка", быў намесьнікам старшыні Галоўнай управы Таварыства беларускай школы. Арыштоўваўся польскімі (1927 і 1930) і савецкімі (1948) уладамі; пасьля вызваленьня жыў у Гародні, працаваў лекарам. [14]*Тулейка Міхась* (1915–1998) – выпускнік Віленскага ўнівэрсытэту, адвакат. Падчас Другой сусьветнай вайны

быў дырэктарам Баранавіцкай настаўніцкай сэмінарыі; з 1944 г. на эміграцыі, жыў у ЗША.

Таварыства "Пчала" і часопіс "Беларуская борць" (с. 76). [1]*Коўш Аляксандр* (1890–1943) – грамадзкі і рэлігійны дзеяч, выкладчык Віленскай Беларускай гімназіі. Падчас Другой сусьветнай вайны быў праваслаўным сьвятаром; у 1943 г. расстраляны фашыстамі. [2]*Хвораст Янка* (1902–1983) – балетмайстар, зьбіральнік харэаграфічнага фальклёру. [3]*Бусел Сяргей* (1901– пасьля 1939) – палітычны і грамадзкі дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстаньня, актывіст студэнцкай арганізацыі "Вольная грамада" (Прага). У 1939 г. арыштаваны ў Вільні НКВД і асуджаны. [4]*Шырма Рыгор* (1892–1978) – беларускі харавы дырыжор, фальклярыст і грамадзкі дзеяч, народны артыст СССР. [5]*Радзевіч Марыя* (1863–1944) – польская пісьменьніца беларускага паходжаньня. [6]*Журба Янка* (сапр. *Івашын*; 1881–1964) – паэт, пэдагог. [7]*Астап Вішня* (сапр. *Павал Губенка*; 1899–1956) – украінскі пісьменьнік. [8]*Талстой Леў* (1828–1910) – расейскі пісьменьнік і грамадзкі дзеяч. [9]*Грэчанінаў Аляксандр* (1864–1956) – расейскі кампазытар. [10]*Равенскі Мікола* (1886–1953) – кампазытар, дырыжор і музычны крытык, аўтар хрысьціянскага гімну "Магутны Божа" (верш Н. Арсеньневай). [11]*Галкоўскі Канстанцін* (1875–1963) – беларускі і літоўскі кампазытар і дырыжор. Народны артыст Літвы (1955). Пісаў музычныя творы на вершы Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка.

Лісты (с. 87)

1. *Ларысе Геніюш* (с. 87). [1]*Геніюш Ларыса* (дзявоч. *Міклашэвіч*; 1910–1983) – беларуская паэтка, мэмуарыстка і грамадзкая дзяячка. Падчас Другой сусьветнай вайны жыла ў Празе, дзе выдала першую кнігу "Ад родных ніў" (1942). У 1948 г. разам з мужам І. Геніюшам была арыштаваная, вывезеная ў СССР і асуджаная да 25 гадоў няволі; пасьля вызваленьня ў 1956 г. жыла ў Зэльве. [2]*Ластаўка Пятро* (1907–1968) – публіцыст і грамадзка-культурны дзеяч Заходняй Беларусі; пазьней жыў у Варшаве. [3]*Клімовіч Адольф* (1900–1970) – грамадзкі дзеяч, журналіст, выдавец; жыў у Вільні. [4]*"Куфар"* – паэма Л. Геніюш.

2. *Ларысе Геніюш* (с. 87). [12]*Бычкоўскі Адам* (1889–1937) – праўнік, драматург, сустаршыня (разам з ксяндзом Ф. Грынкевічам) Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі (1909–1913), сябры якога ладзілі выязныя спэктаклі, чыталі лекцыі, арганізавалі хор і аркестр. Пазьней А. Бычкоўскі вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўнівэрсытэту, удзельнічаў у тамтэйшым беларускім руху. [2]*Бурш Яша* (сапр. *Якаў Анісэровіч*; нар 1929) – беларускі паэт і мастак; жыве ў Варшаве. [3]*Вера Леўчык* (насамрэч: *Ляўчук*) – журналістка беластоцкага тыднёвіка "Ніва", жонка галоўнага рэдактара Г. Валкавыцкага.

3. *Ларысе Геніюш* (с. 88). [1]*Шышэя Кастусь* (1922–2004) – сябра Беларускай незалежніцкай партыі. У 1944 г. быў дэсантаваны на вызваленую саветамі тэрыторыю для арганізацыі беларускай нацыянальнай партызанкі; арыштаваны НКВД, пасьля вызваленьня з жонкай *Леакадзіяй* жылі ў Вільні. [2]*Швэд Віктар* (нар. 1925) – беларускі паэт; жыве ў Беластоку. [3]*Багдановіч Глеб* (1913–?) – палітычны і вайсковы дзеяч, выпускнік Віленскай беларускай гімназіі і мэдыцынскага факультэту Віленскага ўнівэрсытэту. Падчас Другой сусьвет-

най вайны быў сябрам Беларускай незалежніцкай партыі, служыў у Беларускай краёвай абароне, у паваенны час працаваў лекарам на Беласточчыне. У 1949 г. – арыштаваны і дэпартаваны ў СССР, дзе быў асуджаны; пасьля вызваленьня жыў у Рудзенску на Меншчыне. [4]*Багдановіч Вячаслаў* (1878–1941?) – грамадзка-палітычны і царкоўны дзеяч, пасол Сойму Рэчы Паспалітай; у 1939 г. арыштаваны НКВД, прапаў бяз вестак. [5]*Каліноўскі Кастусь* (1838–1864) – лідар нацыянальна-вызвольнага руху, адзін з кіраўнікоў паўстаньня 1863 г. [6]*Кісялёў Генадзь* (1931–2008) – гісторык і літаратуразнавец, доктар філялёгіі. [7]*Семашкевіч Рыгор* (1945–1982) – паэт, празаік, літаратуразнавец, крытык. [8]*Лойка Алег* (1931–2008) – паэт, празаік, літаратуразнавец; член-карэспандэнт НАН Беларусі (1989), доктар філялёгіі (1969). [9]*Шушкевіч Станіслаў* (1908–1991) – паэт, аўтар шматлікіх зборнікаў вершаў для дзяцей.

4. Ларысе Геніюш (с. 89). [1]*Бібіла Юлія* (1897–1974) – бібліёграф; займалася таксама ткацтвам. [2]*Дачка Ядвігіна Ш...– Лявіцкая Ванда* (1895–1968) – беларуская пісьменьніца, жонка Я. Лёсіка. [3]*МОПР (Международная организация помощи революционерам)* – дабрачынная арганізацыя, створаная Камінтэрнам; мела аддзяленьні ў многіх краінах сьвету. [4]*Караткевіч Уладзімір* (1930–1984) – пісьменьнік, клясык беларускай літаратуры. [5]*"Самапомач"* – каапэратыўна-гаспадарчы час.; выходзіў у Вільні ў 1932—1937 гг. пад рэдакцыяй А. Клімовіча. [6]*Пасылаў Шутавічанку...*– маецца на ўвазе жонка А. Клімовіча Вераніка з Шутовічаў. [7]*Муха Васіль* (1889–1965) – вайсковец і палітычны дзеяч, заснавальнік Згуртаваньня маракоў-беларусаў Балтыйскага флёту; дэлегат Усебеларускага зьезду (1917), пазьней служыў у савецкім войску, быў намесьнікам старшыні Бабруйскага аблвыканкаму. [8]*Мой Слаўка...*– унук пісьменьніцы *Яраслаў Войцік*, інжынер-фізык па прафэсіі; жыве ў Вільні.

5. Арсеню Лісу (с. 92). [1]*Ліс Арсень* (нар. 1934) – пісьменьнік, фальклярыст, доктар філялёгіі. [2]*Малады кандыдат філялёгіі...*– відаць, маецца на ўвазе Янка Саламевіч (1938–2012). [3]*Выкладчык беларускай мовы і літаратуры ў гэтай школе...*– гаворка пра Алеся Белакоза (нар. 1928). [4]*Гарэцкі Максім* (1893–1938) пісьменьнік і грамадзкі дзеяч, клясык беларускай літаратуры; загінуў падчас сталінскага тэрору.

6. Яўгену Петрашэвічу (с. 92). [1]*Петрашэвіч Яўген* (нар. 1930) – музычны пэдагог і кампазытар, аўтар зб. "Беларускі вясёлкавы край" (2010); жыве ў Ґародні.

7. Яўгену Петрашэвічу (с. 93). [1]*Барташэвіч Галіна* (нар. 1932) – фальклярыстка, доктар філялёгіі (1994).

8. Яўгену Петрашэвічу (с. 95). [1]*Жучкевіч Вадзім* (1915–1985) – географ, доктар геаграфічных навук (1971), аўтар тапанімічных слоўнікаў. [2]*Улашчык Мікола* (1906–1986) – беларускі гісторык, археоляг, доктар гістарычных навук (1964); жыў у Маскве. [3]*Ці пачыналі пісаць музыку да верша "Рэквіем"...*– відаць, маецца на ўвазе верш А. Вярцінскага "Рэквіем па кожным чацьвёртым".

9. Ларысе Геніюш (с. 96). [1]*Луцкевіч Лявон* (1922–1997) – адзін з кіраўнікоў Беларускай незалежніцкай партыі, афіцэр Беларускай краёвай абароны, дэсантнік

батальёну “Дальвіц”. Падчас Другой сусьветнай вайны быў дырэктарам беларускай школы ў Радашкавічах, настаўнічаў у Баранавічах. Арыштаваны ў 1945 г., асуджаны на 25 гадоў няволі; пасьля вызваленьня жыў у Вільні. Малодшы сын Антона Луцкевіча, зяць З. Верас. [2]*Тонік – Антон Шантыр* (1919–1976), выпускнік Віленскай беларускай гімназіі, сын Зоські Верас і Фабіяна Шантыра. [3]*Новік-Пяюн Сяргей* (1906–1994) – паэт, эспэрантыст, грамадзкі дзеяч, вязень польскіх, нямецкіх і савецкіх турмаў. Падчас Другой сусьветнай вайны працаваў дырэктарам Слонімскага краязнаўчага музэю; пасьля вызваленьня з Гулагу ў 1958 г. жыў у Менску. [4]*Чытаеце “Каласы”...* – гаворка пра раман У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”. [5]*Мальдзіс Адам* (нар. 1932) – літаратуразнавец, празаік, доктар філялёгіі (1987). [6]*Станкевіч Янка* (1891–1976) – мовазнавец, гісторык, пэдагог; аўтар “Беларуска-расейскага (Вялікалітоўска-расейскага) слоўніка” (Нью-Ёрк, 1990). [7]*Панізьнік Сяргей* (нар. 1942) – паэт, краязнавец, перакладчык. [8]*Справа тых студэнтаў...* – маюцца на ўвазе студэнты філфаку БДУ А. Разанаў, В. Ярац і Л. Барташ, якія патрабавалі выкладаньня па-беларуску; былі адлічаныя з унівэрсытэту. [9]*Прашковіч Мікола* (1932–1983) – літаратуразнавец, крытык, перакладчык, кандыдат філялёгіі (1965); быў звольнены з Інстытуту літаратуры Акадэміі навук па абвінавачаньні ў беларускім нацыяналізме.

10. Ларысе Геніюш (с. 97). [1]*Галя – Галіна Войцік* (1927–2007) – пэдагог і мовазнавец, кандыдат філялёгіі, дацэнт Віленскага ўнівэрсытэту, дачка З. Верас і Антона Войціка (1998–1948). [2]*Александровіч Сьцяпан* (1921–1986) – літаратуразнавец, доктар філялёгіі (1972). [3]*Аляхновіч Францішак* (1883–1944) – тэатральны дзеяч, драматург, рэдактар тыднёвіка “Беларускі голас”; забіты невядомымі на ўласнай кватэры ў Вільні. [4]*Луцэвіч Уладзіслава* (дзявоч. *Станкевіч*; 1891–1960) – заслужаная дзяячка культуры Беларусі; жонка Я. Купалы. [5]*Глебка Пятро* (1905–1969) – паэт, мовазнавец, акадэмік АН Беларусі (1957). [6]*Мацкевіч Вацлаў* (псэўд. *Цат*; 1896–1966) – польскі публіцыст, прадстаўнік шавіністычнага крыла польскай журналістыкі; выдаваў у Вільні газ. “Słowo”. [7]*Сергіевіч Пётра* (1900–1984) – мастак; жыў у Вільні.

11. Ларысе Геніюш (с. 99). [1]*Антановіч Антон* (1910–1980) – мовазнавец, доктар філялёгіі (1969). Выкладаў у Віленскім унівэрсытэце (1950–1971), дасьледаваў помнікі татара-мусульманскага пісьменства на беларускай мове. [2]*“Мой Дагестан”* – нарыс аварскага пісьменьніка Р. Гамзатава.

12. Алесю Белакозу (с. 101). [1]*Белакоз Алесь* (нар. 1928) – краязнавец, пэдагог, мэмуарыст; заснавальнік Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музэю (1965). [2]*Багдановіч Янка* (1906–1990) – беларускі журналіст і выдавец; жыў у Вільні. [3]*Забэйда-Суміцкі Міхась* (1900–1981) – сьпявак (лірычны тэнар); працаваў у Харбінскай і Пазнанскай опэрах, з 1940 г. – жыў у Празе, дзе быў салістам Народнага тэатру. [4]*Смоліч Алеся* (дзявоч. *Каткоўская*; ?–1974) – пэдагог, аўтар беларускіх падручнікаў; жонка Аркадзя Смоліча. [5]*Кішко Серафіма* (1898–1958) – грамадзкая дзяячка і пэдагог, жонка рэлігійнага дзеяча Л. Дзекуць-Малея. [6]*Петрашэвіч Вольга* (1909–1978) – работніца гандлю, маці гарадзенскага кампазытара Яўгена Петрашэвіча.

13. Алесю Белакозу (с. 102). [1]*Пецюкевіч Мар’ян* (1904–1983) – этнограф, пэдагог, мэмуарыст, рэдактар час. “Шлях моладзі” (1930–1935), дырэктар Бібліятэкі

імя Урублеўскіх (Вільня). У 1949 г. арыштаваны; пасьля вызваленьня ў 1957-м выехаў у Польшчу. [2]*Пасылаю таксама фота Ганкі...*– ролю Ганкі ў камэдыі К. Каганца “Модны шляхцюк” выканала сама Л. Сівіцкая.

14. Алесю Белакозу (с. 102). [1]*Міхась Явар* (сапр. *Карась*;1903–1933) – паэт, удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. [2]*Унучка Ядвігіна Ш. – Алеся Лёсік* (нар. 1924), якая на той час жыла ў пасёлку Татарка Стаўрапольскага краю.

15. Алесю Белакозу (с. 103). [1]*Пасьля спэктаклю “Модны шляхцюк”...*– размова ідзе пра фота Л. Сівіцкай у нацыянальным строі, дзе яна сфатаграфаваная ў ролі Ганкі з “Моднага шляхцюка” К. Каганца. [2]*Алесь Бачыла* (1918–1983) – паэт, дасьледчык творчасьці М. Багдановіча; ягоныя дасьледаваньні “на тэму тапанімікі” нам невядомыя.

16. Алесю Белакозу (с. 104). [1]*Гэта недзе каля Ружаны...*– маці М. Забэйды-Суміцкага пахаваная на могілках вёскі Шэйпічы Пружанскага р-ну.

17. Алесю Белакозу (с. 104). [1]*К. Буйлянка – Буйло Канстанцыя* (1893–1986), беларуская паэтка; жыла ў Маскве.

18. Адаму Мальдзісу (с. 105). [1]*Мальдзіс Адам* (нар. 1932) – літаратуразнавец, празаік, доктар філялёгіі (1987). [2]*Самойла Уладзімір* (1878–1941) – публіцыст, літаратурны крытык, філёзаф; загінуў падчас сталінскага тэрору. [3]*Шутовіч Янка* (1904–1973) – грамадзка-палітычны дзеяч, рэдактар віленскага час. “Калосьсе”.

19. Адаму Мальдзісу (с. 106). [1]*Майхровіч Сьцяпан* (1908–1981) – літаратуразнавец і крытык; яго артыкул “Мялецій Сматрыцкі” быў надрукаваны ў часопісе “Полымя” (1968, №10).

21. Адаму Мальдзісу (с. 107). [1]*Антон Навіна* – псэўд. *Антона Луцкевіча* (1884–1942) – беларускага палітычнага дзеяча, гісторыка і літаратурнага крытыка. [2]*Нэканда-Трэпка Антон* (1877–1942) – грамадзка-палітычны дзеяч, пэдагог; быў дырэктарам Віленскай Беларускай гімназіі, адным з заснавальнікаў ТБШ.

22. Адаму Мальдзісу (с. 107). [1]*Петрыкевіч Міхась* (1913–1999) – пэдагог і краязнавец, быў дырэктарам Дзятлаўскага раённага музэю; з 1985 г. жыў у Вільні.

27. Аляксею Пяткевічу (с. 110). [1]*Пяткевіч Аляксей* (нар. 1931) – літаратуразнавец і краязнавец, прафэсар Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Я. Купалы. Аўтар кніг “Літаратурная Гродзеншчына: Мясьціны. Людзі. Кнігі” (1996), “Людзі культуры з Гродзеншчыны (2000). ”[2]*Паўлюкоўскі Уладзіслаў* (псэўд. *Улад Ініцкі*; 1895–1955) – пісьменьнік і мастак, удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі; пасьля вайны працаваў дырэктарам Літаратурнага музэю А. Пушкіна ў Вільні. [3]*“Шлях моладзі”* – грамадзка-палітычны і літаратурна-мастацкі час., выходзіў у Вільні з 1929 па 1939 г.

28. Аляксею Пяткевічу (с. 111). [1]*Пазьняк Зянон* (нар. 1944) – палітычны і грамадзкі дзеяч, археоляг, мастацтвазнавец; быў старшынёй сойму Белару-

скага народнага фронту "Адраджэньне", лідарам апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце (1990–1996); з 1996 г. – на эміграцыі, жыве ў Варшаве, выдае час. "Беларускія ведамасьці".

29. Аляксею Пяткевічу (с. 112). [1]*Семашкевіч Рыгор* (1945–1982) – паэт, празаік, літаратуразнавец. [2]Дакладная назва кнігі: "Беларускі літаратурна-грамадзкі рух у Пецярбурзе (канец XIX – пачатак XX ст." (1971). [3]*"Пяць месяцаў у Менску"* – успаміны З. Верас пра М. Багдановіча. [4]*Mała rzecz, a wstyd* (польск.) – малая рэч, а сорамна.

30. Аляксею Пяткевічу (с. 114). [1]*Сабалеўскі Анатоль* (1932–2012) – тэатразнавец і пісьменьнік, доктар мастацтвазнаўства (1974). [2]*Пятровіч Сяргей* (1931–1981) – тэатразнавец, кандыдат мастацтвазнаўства (1962); у 1973–1977 – намесьнік міністра культуры Беларусі.

31. Аляксею Пяткевічу (с. 116). [1]*Грынкевіч Станіслаў* (1902–1945) – беларускі грамадзка-палітычны і культурны дзеяч, літаратар. [2]*Родзька Вацлаў* (1888–1940) – рэлігійны і грамадзкі дзеяч. Закончыў Віленскую духоўную каталіцкую сэмінарыю, служыў у Гародні, у Гальшанах і Старых Васілішках. [3]*Федароўскі Міхал* (1853–1923) – беларускі і польскі фальклярыст, этнограф і археоляг. [4]*Насовіч Іван* (1788–1877) – мовазнавец, фальклярыст і этнограф, аўтар "Слоўніка беларускай мовы" (1870). [5]*Карскі Яўхім* (1861–1931) – філёляг-славіст, заснавальнік беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства. [6]*Пачопка Баляслаў* (1884–1940) – грамадзкі і рэлігійны дзеяч, рэдактар газ. "Беларус", дырэктар Сьвіслацкай настаўніцкай сэмінарыі.

32. Аляксею Пяткевічу (с. 118). [1]*Ермаловіч Мікола* (1921–2000) – гісторык, літаратуразнавец. [2]*Краўцоў Макар* (сапр. *Косьцевіч*; 1890–пасьля 1939) – пісьменьнік; быў дэлегатам І Усебеларускага зьезду, пасьля прыходу саветаў у Вільню арыштаваны НКВД. [3]*Ярэміч Фабіян* (1891–1958) – грамадзка-палітычны дзеяч, публіцыст; з 1922 – сябра Беларускага пасольскага клюбу, падчас нямецкай акупацыі займаў пасаду бургамістра Барысава. Быў арыштаваны органамі НКВД, пасьля вызваленьня ў 1956 г. жыў у Вільні.

34. Аляксею Пяткевічу (с. 121). [1]*Нясьвіжская Беларуская гімназія* – сярэдняя навучальная ўстанова ў Заходняй Беларусі; дзейнічала з 1921 па 1924 г. [2]*Радашкаўская (Радашкавіцкая) Беларуская гімназія імя Ф. Скарыны* дзейнічала з 1922 па 1928 г. [3]*Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры* – культурна-асьветная ўстанова ў Заходняй Беларусі, заснаваная ў 1926 г. з мэтай зьменшыць уплыў КПЗБ; дзейнічала да 1936 г. [4]*Якавенка Васіль* (нар. 1936) – пісьменьнік і публіцыст; гераіня згаданага нарысу сялянка Ульляна Каралінская, якой савецкая ўлада "даверыла ўладу ў раёне", прыгадвае, якімі беднымі і бяспраўнымі былі беларускія сяляне пры панскай Польшчы.

35. Аляксею Пяткевічу (с. 123). [1]Асобу *Уладзіміра Станкевіча* высьветліць не ўдалося. [2]*Рылко Міхась* (1934–2012) – слонімскі журналіст, краязнавец і калекцыянер; быў рэгіянальным карэспандэнтам "Гродненской правды".

36. Адаму Мальдзісу (с. 124). [1]*Беларускі музей імя Івана Луцкевіча* існаваў у Вільні з 1921 па 1945 г. [2]*Драздовіч Язэп* (1988–1954) – мастак, пісьменьнік, пэдагог. [3]*Разанаў Алесь* (нар. 1947) – паэт, перакладчык, эсэіст. [4]*Вярцінскі Анатоль* (нар. 1931) – паэт і грамадзкі дзеяч; быў галоўным рэдактарам тыднёвіка "Літаратура і мастацтва", дэпутатам Вярхоўнага Савету XII скліканьня. Непрыезд паэта ў Гудзевічы быў зьвязаны з выступам П. Машэрава на рэспубліканскай нарадзе, дзе ён пакрытыкаваў творчасьць А. Вярцінскага. [5]*Зямкевіч Рамуальд* (1881–1943 або 1944) – грамадзкі і палітычны дзеяч, калекцыянер і бібліяфіл. [6]*Калдычэва* – маецца на ўвазе польская турма, якая знаходзілася ў вёсцы Калдычэва (цяпер – Баранавіцкі р-н).

37. Адаму Мальдзісу (с. 126). [1]*Збралевіч Лідзія* – бібліёграф, на той час загадчыца аддзелу рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ АН імя Якуба Коласа. [2]*Каб папаліся на вочы розным Шаўцовым...*– відаць, гаворка пра *Пятра Шаўцова*, супрацоўніка выдавецтва "Мастацкая літаратура", аўтара артыкулаў на гістарычныя тэмы. [3]*"Беларускія пісьменьнікі аб буржуазных нацыяналістах"...*– магчыма, маецца на ўвазе артыкул "Ня вам беларусамі звацца", які быў перадрукаваны ў "Хрэстаматыі па гісторыі беларускай публіцыстыкі" (1974) за подпісамі вядомых беларускіх пісьменьнікаў.

39. Янку Саламевічу (с. 128). [1]*Саламевіч Янка* (1938–2012) – літаратуразнавец і фальклярыст, шматгадовы супрацоўнік выдавецтва "Беларуская энцыкляпэдыя", аўтар першага ў гісторыі "Слоўніка беларускіх псэўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стст.)"; выйшаў у 1983 г. [2]*Паўловіч Альбэрт* (1875–1951) – паэт і драматург; яго кніга "Выбранае" выйшла ў 1975 г. [3]*"Снатворны мак"* – п'еса Кандрата Лейкі. [4]*"Беларускі жаўранак"* – нявыдадзеная кніга Гальяша Леўчыка. [5]*Канапніцкая Марыя* (1842–1910) – польская пісьменьніца; З. Верас перакладала яе вершы на беларускую мову. [6]*Веранiка* – дачка Я. Саламевіча. [7]*Ня вельмі арыентуюся ў 2-м "Беларускім савецкім энцыкляпэдычным слоўніку...*– відаць, маецца на ўвазе энцыкляпэдыя "Беларуская ССР" у 5 тамах, якая тады рыхтавалася да друку.

40. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 130). [1]*Ягоўдзік Уладзімір* (нар. 1956) – пісьменьнік, рэдактар і выдавец час. "Лесавік". [2]*У мае ўспаміны аб Г. Леўчыку ўвайшлі ўсе яго лісты...*– успаміны З. Верас былі апублікаваныя ў кнізе Г. Леўчыка "Доля і хлеб" (1980) са значнымі скаротамі, лісты да паэта туды не ўвайшлі.

41. Аляксею Анішчыку (с. 131). [1]*Анішчык Аляксей* (псэўд. *Андрэй Чэмер*; 1912–2007) – мэмуарыст, пэдагог, грамадзкі дзеяч. Падчас Другой сусьветнай вайны выкладаў у Навагрудзкай Беларускай гімназіі (пазьней напісаў яе гісторыю), удзельнічаў у Другім Усебеларускім кангрэсе. У 1948 г. арыштаваны, 12 гадоў правёў у Гулагу, пасьля вызваленьня жыў у Вільні.

42. Адаму Мальдзісу (с. 131). [1]*Рамановіч Яўген* (1905–1979) – дасьледчык гісторыі беларускага тэатру, актор і рэжысёр. [2]*Я не дабівалася, каб Н. Ватацы выкінула Бядулінаю вэрсію...*–гаворка пра "Шлях паэта: зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра Максіма Багдановіча" (1975), складзены бібліёграфам *Нінай Ватацы* (1908–1997).

43. Аляксею Пяткевічу (с. 132). [1]*"Даляглядзь"* – альманах замежнай літаратуры, які выходзіў у Менску з 1975 г. [2]*2 экз. Цёткі...* – маюцца на ўвазе *"Творы"* (1976) пісьменьніцы *Цёткі* (сапр. *Алаіза Пашкевіч*; 1876–1916). [3]*Грышкевіч Францішак* (1904 ці 1906 – 1946) – паэт, пэдагог; падчас Другой сусьветнай вайны быў дырэктарам Віленскай Беларускай гімназіі, у 1944 г. арыштаваны, памёр у менскай турме НКВД. [4]*"Каласкі"* – зборнік дзіцячых твораў З. Верас, выйшаў толькі ў 1985 г. [5]*Марыя Пяткевіч* (дзявоч. *Шумская*; 1930–2012) – настаўніца, жонка літаратуразнаўца А. Пяткевіча.

44. Янку Саламевічу (с. 133). [1]*Аб выданьні "Малюнкаў" пастараюся напісаць...* – гаворка пра зб. М. Машары; тэкст З. Верас зьявіўся ў тыднёвіку "Літаратура і мастацтва" 28 лістапада 1978 г.

47. Ларысе Геніюш (с. 134). [1]*Рада мець нумар са сваім артыкулам...* – 26 сьнежня 1976 г. у тыднёвіку "Ніва" былі надрукаваныя ўспаміны З. Верас "Гісторыя беларускага адрыўнога календара".

48. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 135). [1]*Бэргман Аляксандра* (сапр. *Кучкоўская*; 1906–2005) – гісторык, дасьледчыца нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі; з 1946 г. жыла ў Польшчы. [2]*Пісаныя яго нарачонай ці яе сястрой...* – успаміны пра І. Луцкевіча напісала яго нарачоная *Юльяна Мэнке* (*Вітан-Дубейкаўская;* 1886–1970) – мастацтвазнаўца, грамадзкая дзеячка (гл.: Вітан-Дубейкаўская Ю. Мае ўспаміны. – Вільня, 1994). [3]*Ёсьць А. Луцкевіча "За 25 гадоў"...* – маецца на ўвазе брашура А. Луцкевіча "За дваццаць пяць гадоў (1903–1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый (Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада)". Вільня, 1928. [4]*Ёсьць Антонавава брашура аб цэлі Конрада...* – гаворка пра кнігу А. Луцкевіча "Вязьніца Адама Міцкевіча". Вільня, 1923.

49. Ларысе Геніюш (с. 136). [1]*"Дзяньніца"* – грамадзкая і літаратурная газ., выходзіла ў 1916 г. пад рэдакцыяй З. Жылуновіча ў Петраградзе. [2]*"Świetač"* – грамадзка-палітычны тыднёвік, выходзіў у 1916 г. у Петраградзе пад рэдакцыяй Э. Будзькі. [3]*Сыракомля Уладзіслаў* (сапр. *Людвік Уладзіслаў Францішак Кандратовіч; 1823–1862)* – польскі і беларускі паэт.

52. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 139). [1]*Брыль Янка* (1917–2006) – народны пісьменьнік Беларусі (1981), ляўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982); З. Верас неаднойчы называла яго сваім улюбёным пісьменьнікам. [2]*Ядвігін Ш.* (сапр. *Антон Лявіцкі*; 1869–1922) – пісьменьнік і грамадзкі дзеяч; пахаваны ў Вільні на могілках Росы. [3]*Карусь Каганец* (сапр. *Кастравіцкі Казімір Рафал*; 1868–1918) – пісьменьнік і грамадзкі дзеяч.

53. Адаму Мальдзісу (с. 140). [1]*Мікалай Манцэвіч* – публіцыст, адзін з арганізатараў Беларускага каапэратыўнага таварыства "Пчала"; працаваў старшым бухгальтарам у Беларускім каапэратыўным банку у Вільні.

60. Янку Саламевічу (с. 143). [1]*Kwaso-węglowych* (польск.) – кіслотна-вугляродных.

61. Аляксею Пяткевічу (с. 144). [1]*"Педагогическое дело"* – часопіс Гарадзенскага пэдагагічнага таварыства, выходзіў у Гародні ў 1911–1914 гг. на расейскай мове; на яго старонках З. Верас надрукавала свае першыя творы. [2]*Твору У. Калесьніка ня бачыла...*– магчыма, маецца на ўвазе кніга У. Калесьніка "Ветразі Адысея: Уладзімір Жылка і рамантычная традыцыя ў беларускай паэзіі" (1977).

62. Адаму Мальдзісу (с. 145). [1]*Друкарня Марціна Кухты* (1875–1942?) была заснаваная ў 1906 г. і спачатку месьцілася на вул. Дварцовай, 4 (цяпер – Унівэрсытэцкая), з 1911 г. – на вул. Татарскай, 20. Пасьля Першай сусьветнай вайны друкарня была падзеленая – частка абсталяваньня перавезеная ў Коўна, частка засталася ў Вільні (Татарская, 6). [2]*"Rzecz o B. Taraszkiewiczu"* – манаграфія А. Бэргман. [3]*Ніжанкоўская Вера* (1901–1998) – першая жонка Браніслава Тарашкевіча; жыла ў Радашкавічах.

63. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 145). [1]*Ці Вы чыталі "Маладосьць"...*– гаворка пра артыкул Я. Лецкі "Крыніцы пульсуюць з зямлі" ("Маладосьць", 1978, №3).

64. Адаму Мальдзісу (с. 146). [1]*Арабей Лідзія* (нар. 1925) – пісьменьніца; яе аповесьць "Стану песьняй" выйшла ў 1977 г. [2]*Кіркор Адам Ганоры* (1818–1886) – польскі гісторык літаратуры і выдавец беларускага паходжаньня; закончыў у Вільні Дваранскі інстытут, шмат пісаў пра Віленшчыну. [3]*Роп Эдвард фон* (1851–1939) – біскуп віленскі, арцыбіскуп Магілёўскай рымска-каталіцкай архіепархіі.

65. Адаму Мальдзісу (с. 147). [1]*Усе часткі перакладу "Пана Тадэвуша"...*– гаворка пра пераклад паэмы А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш", зроблены Б. Тарашкевічам; асобным выданьнем выйшаў у 1981 г.

66. Фёдару Ігнатовічу (с. 148). [1]*Ігнатовіч Фёдар* (нар. 1938) – гісторык мэдыцыны, краязнавец, кандыдат мэдыцынскіх навук. Працаваў загадчыкам лябараторыі ў Гарадзенскім абласным цэнтры гігіены і эпідэміялёгіі, выкладчыкам у Гарадзенскім мэдунівэрсытэце. [2]*Марцінчык Мікалай* (1901–1980) – удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. Рэдагаваў час. "Студэнцкая думка", быў намесьнікам старшыні Галоўнай управы ТБШ. Арыштоўваўся польскімі (1927 і 1930) і савецкімі (1948) уладамі; пасьля вызваленьня жыў у Гародні, працаваў лекарам.

69. Аляксею Пяткевічу (с. 150). [1]*Натусевіч Янка* (?–1921 ці 1922) – актывіст беларускага студэнцкага руху, грамадзкі і палітычны дзеяч. [2]*Содаль Уладзімір* (нар. 1937) – літаратуразнавец і краязнавец.

72. Аляксею Пяткевічу (с. 154). [1]*"Беларускае слова"* – газ. Гарадзенскага беларускага нацыянальнага камітэту, выходзіла ў Гародні ў 1921–1922 гг. [2]*Туронак Юры* (нар. 1929) – гісторык, доктар гістарычных навук; жыве ў Варшаве.

73. Мікалаю Марцінчыку (с. 155). [1]*Што да "Б. Тарашкевіча"...*– гаворка пра манаграфію А. Бэргман "Rzecz o B. Taraszkiewiczu". [2]*Hasz bohater* (польск.) – наш волат. [3]*Дварчанін Ігнат* (1895–1937) – пісьменьнік, актывіст нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі; паэма А. Блока "Дванаццаць" у ягоным перакладзе на беларускую мову выйшла ў Вільні ў 1926 г.

74. Мікалаю Марцінчыку (с. 155). [1]*Говін Сьцяпан* – гісторык, выкладчык БДУ; дасьледуе пераважна канфэсійны друк Беларусі. [2]*Аўтар там піша...* – відаць, маецца на ўвазе віленчук *Анішчык Аляксей* (псэўд. *Андрэй Чэмер*; 1912–2007) – аўтар мэмуараў пра Наваградзкую Беларускую гімназію.

77. Янку Саламевічу (с. 158). [1]*Юрка Бусел з-пад Слуцка* – псэўд. *Ю. Булгака* (?–1920) – аўтара тыднёвіка "Наша ніва" і час. "Саха". [2]*Геніюш Янка* (1902–1979) – лекар, выпускнік Карлавага ўнівэрсытэту (Прага), муж паэткі Л. Геніюш. У 1948 г. разам з жонкай быў незаконна пазбаўлены чэшскага грамадзянства, вывезены ў СССР і асуджаны Вярхоўным судом Беларусі на 25 гадоў няволі.

80. Янку Саламевічу (с. 160). [1]*Новік-Пяюн Сяргей* (1906–1994) – паэт, эспэрантыст, вязень польскіх, нямецкіх і савецкіх турмаў. [2]*Ляшковіч Ніна* – супрацоўніца Цэнтральнай бібліятэкі Літвы; дапамагала беларускім дасьледчыкам у іхніх росшуках. [3]*"Kurjer Wileński" ("Виленский вестник")* – палітычная і літаратурная газ. Віленскага генэрал-губэрнатарства; выходзіла ў 1841–1915 гг. у Вільні.

81. Адаму Мальдзісу (с. 161). [1]*Разанаў Алесь* (нар. 1947) – паэт, перакладчык, эсэіст; на той час супрацоўнік выдавецтва "Мастацкая літаратура", дзе ў праектаваным зб. "Спадчына" меркавалася апублікаваць успаміны З. Верас. [2]*Terra incognita* (лац.) – зямля невядомая.

82. Фёдару Ігнатовічу (с. 162). [1]*Грынкевіч Станіслаў* (1913–1966) – выпускнік Віленскага ўнівэрсытэту, уваходзіў у рэдкалегію час. "Калосьсе". Падчас Другой сусьветнай вайны – сакратар Беларускага камітэту самапомачы ў Бэрліне, рэдактар газ. "Раніца". З 1950 г. жыў у ЗША, працаваў лекарам у Кліўлендзе. [2]*"Беларуская крыніца"* – газэта, якую выдавала БХД у 1917–1940 гг. у Петраградзе, Менску і Вільні.

85. Фёдару Ігнатовічу (с. 165). [1]*"Пасланец Прамэтэя"* – аповесьць У. Калесьніка, кніжнае выданьне – 1984 г. [2]*Ваш артыкул аб "Пчале"...* – маецца на ўвазе Беларускае каапэратыўнае таварыства "Пчала", дзейнасьць якога дасьледаваў Ф. Ігнатовіч.

86. Адаму Мальдзісу (с. 166). [1]*Гайдук Мікола* (1933–1998) – пісьменьнік; працаваў намесьнікам галоўнага рэдактара тыднёвіка "Ніва" (Беласток). [2]*Крывец Сяргей* (1904–1945) – паэт, сакратар ТБШ.

89. Адаму Мальдзісу (с. 168). [1]*Кніжка Говіна "Заходнебеларускі друк"...* – дакладная назва манаграфіі С. Говіна – "Друк Заходняй Беларусі (1921–1939)". [2]*Войцік Віктар* (нар. 1947) – кампазытар, на той час намесьнік старшыні праўленьня Саюзу кампазытараў Беларусі. [3]*Глушакоў Уладзімір* (нар. 1952) – пісьменьнік, на той час супрацоўнік час. "Нёман".

90. Мікалаю Марцінчыку (с. 170). [1]*Капсукас Вінцас* (*Міцкявічус-Капсукас Вінцас*; 1880–1935) – адзін з арганізатараў літоўскай камуністычнай партыі, першы кіраўнік савецкай Літвы. [2]*Маслоўская Марыя* – выпускніца Віленскай Беларускай гімназіі.

91. Аляксею Пяткевічу (с. 171). [1]*Аб сьмерці Вашай выкладчыцы Вы мне пісалі...*– маецца на ўвазе літаратуразнавец *Халянкова Аліна* (сапр. *Мацыевіч*; 1940–1979).

92. Мікалаю Марцінчыку (с. 172). [1]*Każdy sobie rzepkę skrobie* (польск.) – кожны сабе рэпку скрабе. [2]*Ліст да Сьнечкуса...*– на той час літоўскага камуністычнага дзеяча *Антанаса Сьнечкуса* (1902–1974) ужо не было сярод жывых; КПЛ кіраваў Пятрас Грышкявічус (1924–1987). [3]*Антон Янкоўскі* – краязнавец, фальклярыст і грамадзкі дзеяч, жыў у вёсцы Адамчукі на Віленшчыне. Мэмарыяльная дошка ў гонар Б. Тарашкевіча на былой вуліцы Віленскай, 12 (цяпер – Людаса Гіры) зьявілася пасьля хадайніцтва А. Янкоўскага перад камуністычнымі ўладамі Літвы.

93. Мікалаю Марцінчыку (с. 174). [1]*Верш М.Т. чытала ў "Ніве"...*– гаворка пра верш Максіма Танка "Я люблю людзей, якія верацъ", апублікаваны ў тыднёвіку "Ніва" 21 кастрычніка 1979 г. [2]*Татарын Серафім* (1903–1988) – удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, сябра КПЗБ. Рэдагаваў газ. "Наша праўда" (Вільня), правёў у польскіх турмах больш за сем гадоў.

95. Адаму Мальдзісу (с. 176). [1]*"Беларуская газэта"* – неафіцыйны орган КПЗБ, які легальна выдаваўся ў Вільні ў 1933–1934 гг. [2]*Гродна ў "Зборы" займе сваё мейсца...*– відаць, маецца на ўвазе "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" ў 7 тамах, выдадзены ў 1984–1988 гг.

96. Мікалаю Марцінчыку (с. 177). [1]*"Роднае слова"* – пазнавальная перадача, якая выходзіла на Беларускім тэлебачаньні пад рэдакцыяй У. Содаля. [2]*Янкоўскі Фёдар* (1918–1989) – беларускі мовазнавец і пісьменьнік, доктар філялёгіі (1970). [3]*Вітаўт Тумаш* (1910–1998) – гісторык, публіцыст, грамадзкі дзеяч; пасьля Другой сусьветнай вайны жыў у Нямеччыне і ЗША, займаўся пераважна скарыназнаўствам. [4]*Грабінскі Баляслаў* (1899–1991) – доктар мэдыцыны, грамадзкі дзеяч. Быў старшынём БХД, падчас Другой сусьветнай вайны узначальваў Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні; з 1944 г. на эміграцыі, жыў у ЗША, уваходзіў у Раду БНР.

97. Аляксею Пяткевічу (с. 178). [1]*У першым лісьце адтуль...*– маецца на ўвазе – з ГДР, дзе Ф. Ігнатовіч часова працаваў. [2]*Жыве ён аж на Флёрыдзе...*– гаворка пра Баляслава Грабінскага.

98. Мікалаю Марцінчыку (с. 179). [1]*Мінкевіч Міхаіл* (1919–1987) – партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, міністр асьветы (1968–1985). [2]*Несьцяровіч Віктар* (нар. 1956) – мовазнавец, загадчык катэдры беларускай мовы, дэкан беларускай філялёгіі Віцебскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. [3]*Лобан Яўгенія* (дзявоч. *Казлоўская*) – выпускніца Віленскай беларускай гімназіі.

101. Аляксею Пяткевічу (с. 183). [1]*Бурсевіч Максім* (1890–1937) – пэдагог, палітычны і грамадзкі дзеяч. У 1925 г. заснаваў у вёсцы Чамяры на Слонімшчыне беларускую прыватную школу. Быў адным з кіраўнікоў Беларускай сялянска-работніцкай грамады, арыштоўваўся польскімі ўладамі, з 1931 г. жыў у Менску,

уваходзіў у ЦВК БССР. Загінуў падчас сталінскага тэрору. [2]*Бурсевіч Ігар* (1911–1985) – выпускнік Віленскай Беларускай гімназіі, па спэцыяльнасьці інжынер-электрык. Жыў і працаваў у Іванаве (Расея), дзе ў 1937 г. быў арыштаваны НКВД, у Гулагу правёў 10 гадоў. Пасьля вызваленьня жыў у Магілёве.

102. Дануце Бічэль (с. 184). [1]*Бічэль Данута* (нар. 1938) – паэтка, мэмуарыстка, ляўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984); стваральніца і першы дырэктар Гарадзенскага музэю М. Багдановіча. [2]*Геніюш Ларыса* (дзявоч. *Міклашэвіч*; 1910–1983) – беларуская паэтка, мэмуарыстка і грамадзкая дзяячка. Падчас Другой сусьветнай вайны жыла ў Празе, дзе выдала першую кнігу "Ад родных ніў" (1942). У 1948 г. разам з мужам І. Геніюшам была арыштаваная, вывезеная ў СССР і асуджаная да 25 гадоў няволі; пасьля вызваленьня ў 1956 г. жыла ў Зэльве.

103. Мікалаю Марцінчыку (с. 184). [1]*Мае выходзіць зборнік "Спадчына"...*– падрыхтаваны ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" альманах "Спадчына", дзе павінны былі друкавацца ўспаміны З. Верас, у сьвет ня выйшаў. [2]*Stwardnienie* (польск.) – зацьвярдзеньне.

104. Ларысе Геніюш (с. 185). [1]*Бічэль Данута* (нар. 1938) – паэтка, перакладчыца і мэмуарыстка, стваральніца і першая дырэктарка Літаратурнага музэю М. Багдановіча ў Гародні.

106. Дануце Бічэль (с. 187). [1]*У роднай вёсцы Лявонавічы пад Слонімам...*– родная вёска С. Новіка–Пеюна Лявонавічы знаходзіцца ў Нясьвіжскім р-не.

107. Дануце Бічэль (с. 188). Друкуецца паводле аўтографа з архіва М. Купавы. [1]*Хвораст Янка* (1902–1983) – балетмайстар, зьбіральнік харэаграфічнага фальклёру. [2]*Новік-Пяюн Сяргей* (1906–1994) – паэт, эспэрантыст, вязень польскіх, нямецкіх і савецкіх турмаў. [3]*Марцінчык Мікалай* (1901–1980) – лекар, рэдактар час. "Студэнцкая думка", намесьнік старшыні Галоўнай управы ТБШ; неаднаразова арыштоўваўся польскімі і савецкімі ўладамі, пасьля вызваленьня жыў у Гародні.

108. Дануце Бічэль (с. 189). [1]*Каханоўскі Генадзь* (1936–1994) – гісторык, археоляг, краязнавец, фальклярыст, літаратуразнавец, доктар філялёгіі (1992); жыў у Маладзечне.

109. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 190). [1]*"Стронга"* – апавяданьне У. Ягоўдзіка, апублікаванае ў тыднёвіку "Літаратура і мастацтва" 30 траўня1980 г. [2]*Шапіра Лазар* (1905–1991) – пісьменьнік і журналіст, загадчык бібліятэкі менскага Дому афіцэраў.

111. Адаму Мальдзісу (с. 192). [1]*Сваяк Казімір* (сапр. *Стэповіч Канстанцін*; 1890–1926) – каталіцкі сьвятар і паэт. [2]*Станкевіч Станіслаў* (1886–1964) – беларускі выдавец; з 1926 г. меў у Вільні ўласную кнігарню. [3]*Мятла Ігнат* – пэдагог і выдавец, актывіст БСГ; быў загадчыкам кнігарні Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні, дырэктарам Язьненскай школы на Дзісеншчыне. [4]*Мятла Пятро* (1890–

1938) – грамадзка-палітычны дзеяч, пасол Сойму Рэчы Паспалітай; у 1933 г. арыштаваны НКВД, загінуў у Гулагу. [5]*М. Ластоўская – Іванаўскайтэ-Ластаўскене Марыя* (1872–1957), літоўская пісьменьніца, жонка В. Ластоўскага (з 1903); публікавалася пад агульным з сястрой Сафіяй Іванаўскайтэ-Пшыбіляўскене (1867–1926) псэўд. *Лазьдзіну Пяледа*. [6]*"Prawda o celi Konrada"* – польскамоўная брашура А. Луцкевіча, выходзіла і па-беларуску пад назвай "Вязьніца Адама Міцкевіча" (Вільня, 1923).

112. Дануце Бічэль (с. 193). [1]*Кулік Яўген* (1937–2002) – мастак і грамадзкі дзеяч.

113. Адаму Мальдзісу (с. 195). [1]*"Дарогі вялі праз Беларусь"* (дакладная назва: *"Шляхі вялі праз Беларусь")* – кніга гістарычных нарысаў Валянціна Грыцкевіча і Адама Мальдзіса, выйшла ў 1980 г.

114. Дануце Бічэль (с. 195). [1]*Іпатава Вольга* (нар. 1945) – пісьменьніца і грамадзкая дзяячка, старшыня Саюзу пісьменьнікаў (1998–2002). [2]*Міцкевіч Даніла* (1914–1996) – старэйшы сын Я. Коласа, першы дырэктар Коласаўскага літаратурнага музэю.

116. Дануце Бічэль (с. 197). [1]*Дастаць той нумар газэты з Вашым вершам...*– маецца на ўвазе верш Д. Бічэль "Сьпявак", апублікаваны ў газ. "Гродненская правда" за 12 ліпеня 1980 г.

117. Вячку Целешу (с. 198). [1]*Целеш Вячка* (нар. 1938) – беларускі мастак і філякартыст, аўтар альбому "Гарады Беларусі на старых паштоўках" (1998); жыве ў Рызе.

121. Дануце Бічэль (с. 202). [1]*Ці Вы чыталі расейскі зборнік "Бригантина" на 1980 год...*– укладальнікам названага навукова-папулярнага зборніка быў беларускі масквіч Аляксей Каўка; пасьляслоўе да нарысу Уладзіміра Фалеева пра лекаваньне зёлкамі напісала доктар мэдыцынскіх навук А. Турава.

123. Вячку Целешу (с. 204). [1]*Булгак Ян* (1876–1950) – польскі і беларускі фотамастак, этнограф і фальклярыст. [2]*"Загляне сонца і ў наша ваконца"* – першая легальная выдавецкая суполка; існавала ў Пецярбурзе ў 1906–1914 гг. [3]*Карпюк Аляксей* (1920–1992) – пісьменьнік і грамадзкі дзеяч; у 1978–1992 гг. узначальваў Гарадзенскае абласное аддзяленьне Саюзу пісьменьнікаў.

124. Дануце Бічэль (с. 205). [1]*Паводле слоўніка Вацлава Ластоўскага...*– маецца на ўвазе *"Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік"* В. Ластоўскага, выдадзены ў Коўне ў 1924 г. [2]*Мацяш Ніна* (1943–2008) – беларуская паэтка і перакладчыца. [3]*Леся Украінка* (сапр. *Ларыса Косач-Квітка*; 1871–1913) – украінская паэтка і перакладчыца. [4]*Маркавец Віктар* (нар. 1947) – мастак. [5]*Марачкін Аляксей* (нар. 1940) – мастак і грамадзкі дзеяч. [6]*Купава Мікола* (нар. 1946) – мастак і грамадзкі дзеяч. [7]*Басалыга Уладзімір* (нар. 1940) – мастак.

125. Дануце Бічэль (с. 206). [1]*Я тутэйшая, я звычайная...*– цытуюцца першыя радкі з верша Д. Бічэль "Тутэйшая".

128. Дануце Бічэль (с. 207). [1]*Там былі мае ўспаміны аб "Заранцы"...*– гл.: "Голас Радзімы" за 27 лістапада 1980 г. [2]*Беларус, які даўна жыве ў г. Торунь...*– маецца на ўвазе *Пецюкевіч Мар'ян* (1904–1983) – этнограф, пэдагог, мэмуарыст.

129. Дануце Бічэль (с. 208). [1]*Геніюш Юрка* (1935–1985) – сын Л. Геніюш, беларускі пісьменьнік, мэдык па адукацыі; жыў у Беластоку. [2]*"Белавежа"* – літаратурны альманах, які выходзіў у Беластоку. [3]*Дзе ёсьць мае ўспаміны аб У. Галубку...*– гл.: Справы дзён даўно мінулых: да 60-годзьдзя трупы У. Галубка / Тэатральны Менск, 1980, №6.

131. Дануце Бічэль (с. 210). [1]*Знаёмы віленчук, які жыве ў г. Торунь...*– гаворка пра Мар'яна Пецюкевіча. [2]*Раманюк Міхась* (1944–1997) – мастацтвазнаўца і этнограф. [3]*Бачыла Алесь* (1918–1983) – паэт, дасьледчык творчасьці М. Багдановіча.

132. Дануце Бічэль (с. 211). [1]*Аб тым, што др. Ю. Геніюш быў паранены...*– лекара-пэдыятра Ю. Геніюша параніў нажом бацька адной з пацыентак, якая памерла пасьля апэрацыі.

135. Ларысе Геніюш (с. 213). [1]*Motto* (італ.) – матыў. [2]*Артыкул Гілевіча...*– маецца на ўвазе *Гіль Мікола* (сапр. *Гілевіч*; нар. 1936) – празаік і публіцыст. [3]*Пасьля таго, як паранілі Папежа...*– маецца на ўвазе замах на *Папу Яна Паўла II* (*Караля Вайтылу*; 1920–2005), зьдзейсьнены 15 траўня 1981 г. турэцкім тэрарыстам Мехметам Алі Агджой.

136. Дануце Бічэль (с. 214). [1]*Стэх Валянцін* (нар. 1950) – інжынер-канструктар, кіраўнік згуртаваньня віленскіх беларусаў "Сябрына". [2]*У музэі імя А. Пушкіна будзе сьвята беларускай паэзіі...*– маецца на ўвазе музэй у Вільні.

137. Аляксею Пяткевічу (с. 215). [1]*Таранда Мікола* (нар. 1957) – біёляг, выкладчык Гарадзенскага дзяржаўнага аграрнага ўнівэрсытэту, адзін з кіраўнікоў гарадзенскага клюбу "Паходня". [2]*Зубараў Леанід* (нар. 1943) – пісьменьнік, аўтар кніг пра М. Багдановіча; з 1990 г. жыве ў ЗША. [3]*Ватацы Ніна* (1908–1997) – бібліёграф, дасьледчыца творчасьці М. Багдановіча. [4]*Котаў Ігар* (нар. 1965) – сябра гарадзенскага клюбу "Паходня", па адукацыі лекар.

138. Вячку Целешу (с. 217). [1]*Васілеўскі Мікалай* (1904–1937?) – мастак-карыкатурыст; арыштаваны НКВД у 1933 г., загінуў у Гулагу.

141. Адаму Мальдзісу (с. 218). [1]*Дзякую за кніжку Язэпа Дылы...*– маюцца на ўвазе выдадзеныя ў 1981 г. "Творы" Я. Дылы (1880–1973).

144. Дануце Бічэль (с. 220). [1]*Васілёк Міхась* (сапр. *Косьцевіч*; 1905–1960) – паэт і журналіст; жыў у Горадні.

146. Вячку Целешу (с. 221). [1]*Наліваеў Анатоль* (нар. 1931) – мастак, калекцыянер, заснавальнік прыватнага музэю "Гасьцёўня Галубка" (Менск).

147. Дануце Бічэль (с. 221). [1]*Наважылаў Алег* (нар. 1936) – гарадзенскі пісьменьнік, піша на расейскай мове.

149. Адаму Мальдзісу (с. 223). [1]*Скрыган Ян* (1905–1992) – празаік і мэмуарыст. [2]*Гілевіч Ніл* (нар. 1931) – паэт, перакладчык, літаратуразнавец, фальклярыст, грамадзкі дзеяч. Народны паэт Беларусі (1991).

150. Ларысе Геніюш (с. 224). [1]*Зносяць старую сядзібу Геніюшаў...*– маюцца на ўвазе спробы зэльвенскага начальства распачаць камунальнае будаўніцтва на зямельным участку Геніюшаў. [2]*Шнаркевіч Надзея* (1897–1974) – пэдагог, рэдактарка час. "Жаночая справа".

151. Дануце Бічэль (с. 225). [1]*Скалабан Віталь* (1947–2011) – гісторык і архівіст.

152. Аляксею Пяткевічу (с. 225). [1]*Натусевіч Янка* (?–1921 ці 1922) – актывіст беларускага студэнцкага руху, грамадзкі і палітычны дзеяч. [2]*Матук Генрык* (?–1924) – грамадзкі дзеяч, актывіст Гарадзенскага Беларускага камітэту. [3]*Што да Лойкі – дзе б ён праўду шукаў...*– маецца на ўвазе раман-эсэ А. Лойкі "Як агонь, як вада", фрагмэнты якога друкаваліся ў "ЛіМе"; гэты твор З. Верас успрыняла вельмі крытычна.

153. Дануце Бічэль (с. 227). [1]*Адзін мастак намаляваў Максіма разам з Я. Купалам, Я. Коласам, Бядуляй і К. Буйло...*– маеца на ўвазе *Міхаіл Савіцкі* (1922–2010), народны мастак БССР (1972) і СССР (1978).

155. Аляксею Пяткевічу (с. 229). [1]*Дзе ў старым Гродне была вуліца Мураўёва...*– вул. Мураўёва (Мураўёўская) знаходзілася ў цэнтры гораду, цяпер – вул. Э. Ажэшкі.

157. Аляксею Пяткевічу (с. 229). [1]*Ці я зьвярнула ўвагу на публікацыю А. Лойкі...*– відаць, маецца на ўвазе ўрывак з раману-эсэ А. Лойкі "Як агонь, як вада", надрукаваны ў "ЛіМе" 9 кастрычніка. [2]*Пісьмянкоў Алесь* (1957–2004) – паэт і крытык; працаваў галоўным рэдактарам тыднёвіка "Літаратура і мастацтва", час. "Вожык".

160. Аляксею Пяткевічу (с. 232). [1]*У №2 "Полымя" артыкул Якуба Міско...*– маюцца на ўвазе дакумэнтальны нарыс публіцыста *Я. Міско* (1911–1981) пад назвай "Таварыш Пётр" – пра дзеяча КПЗБ Мікалая Арэхву. Аўтар нарысу зьняважліва піша пра некаторых дзеячаў нацыянальнаг руху, напрыклад: *"Як чэрві ў непагоду, заварушыліся беларускія нацыянал-здраднікі з-пад знака Р. Астроўскага і А. Луцкевіча"*.

162. Аляксею Пяткевічу (с. 234). [1]*Кастэцкая Надзея* (1929–1991) – сьпявачка, жонка чэшскага музыкі Любаміра Кастэцкага, апякунка М. Забэйды Суміцкага; яе прах пахаваны ў магіле сьпевака на Альшанскіх могілках у Празе. [2]*Шыдлоўскі Аляксандр* (1911–2002) – кампазытар і грамадзкі дзеяч. [3]*Цітовіч Генадзь* (1910–1986) – музыкавед, фальклярыст і харавы дырыгент. Народны артыст СССР (1968).

166. Вячку Целешу (с. 237). [1]*Хто такі Эдмунд Навіцкі...*– магчыма, маецца на ўвазе біскуп Гданьскай дыяцэзіі *Э. Навіцкі* (1900–1971), які меў дачыненьне да выдавецкай справы. [2]*Пратасеня Іван* (нар. 1931) – мастак, аўтар карціны "М. Багдановіч і З. Верас у Менску, 1916". [3]*Псэўдоніму яшчэ ня мела...*– псэўд. *Зоська Верас* Л. Сівіцкая пачала карыстацца з 1917 г.

168. Дануце Бічэль (с. 238). [1]*Добра напісаны артыкул пра М. Багдановіча...*– маецца на ўвазе артыкул В. Скалабана "У гэты суровы і важны час: М. Багдановіч у Менску" / Нёман, 1981, №12. [2]*Пляменьніца Я. Купалы...*– *Ядвіга Раманоўская* (1920–2011), супрацоўніца Літаратурнага музэю Я. Купалы.

170. Дануце Бічэль (с. 239). [1]*Бяляўская Валянціна* (нар. 1949) – музэязнавец, удзельнічала ў стварэньні экспазыцыі Літаратурнага музэю М. Багдановіча і ягоных філій у Менску і Ракуцёўшчыне.

172. Аляксею Пяткевічу (с. 240). [1]*Напісаць маленькі артыкул у "Літаратурную энцыкляпэдыю"...*– маецца на ўвазе "Энцыкляпэдыя літаратуры і мастацтва Беларусі" ў 5 тамах (1984–1987). [2]*Гэта заслуга, стараньне Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага...*– Г. Каханоўскі ня толькі даў З. Верас рэкамэндацыю ў Саюз пісьменьнікаў, але і прапісаў яе ў сваім маладзечанскім доме, паколькі чальцамі СП паводле статуту мелі права быць толькі грамадзяне Беларусі.

174. Ларысе Геніюш (с. 243). [1]*Дзякуй за кніжку...*– маецца на ўвазе зб. Л. Геніюш "На чабары настоена" (1982). [2]*Энгельс Фрыдрых* (1820–1895) – нямецкі філёзаф, адзін з заснавальнікаў марксізму. [3]*Бываюць вогнішчы, бурай-дажджамі залітыя...*– гэты верш належыць самой З. Верас. [4]*Кніжкай ня выйдзе ні ў Менску, ні ў перакладзе...*– раман-эсэ А. Лойкі пра Я. Купалу ў 1982 г. выйшаў у Маскве ў папулярнай сэрыі "ЖЗЛ", а ў 1984 г. у Менску пад назвай "Як агонь, як вада". [5]*Найдзюк Язэп* (1909–1984) – гісторык і грамадзкі дзеяч, адзін з аўтараў кнігі "Беларусь учора і сяньня" (1943); пасьля вайны жыў у Польшчы пад прозьвішчам *Александровіч*.

175. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 244). [1]*Чытала ў "ЛіМе" Ваш артыкул...*– гаворка пра артыкул "Школа майстра: Над старонкамі збору твораў Янкі Брыля" ("Літаратура і мастацтва", 30 ліпеня 1982).

177. Аляксею Пяткевічу (с. 245). [1]*Дзісько Нарцыз* – кандыдат біялягічных навук, супрацоўнік выдавецтва "Беларуская савецкая энцыкляпэдыя імя П. Броўкі". [2]*Карповіч Міхал* – палітычны і грамадзкі дзеяч на Гарадзеншчыне. [3]*Кулакоўскі Ігнат* (1800–1870) – грамадзкі дзеяч, пэдагог; дзед З. Верас. [4]*Браты Далецкія* – псэўд. *Іваноўскага Вацлава* (1880–1943) – палітычнага і грамадзкага дзеяча, міністра асьветы БНР ва ўрадзе А. Луцкевіча. [5]*Аляхновіч Францішак* (1883–1944) – тэатральны дзеяч, драматург, у 1942–1944 гг. рэдагаваў тыднёвік "Беларускі голас" (Вільня); п'еса "Страхі жыцьця" датуецца 1918 г. [6]*Што да "Старога Гродна"...*– маюцца на ўвазе ўспаміны З. Верас, упершыню надрукаваныя ў альманаху "Краю мой – Нёман" (1986).

180. Дануце Бічэль (с. 247). [1]*"Нёману" напішу...*– маецца на ўвазе імпрэсія З. Верас, упершыню надрукаваная ў газэце "Вольная Беларусь" за 7 ліпеня 1917 г. [2]*Целеш Вячка* (нар. 1938) – беларускі мастак і філякартыст, аўтар альбому "Гарады Беларусі на старых паштоўках" (1998); жыве ў Рызе.

181. Ларысе Геніюш (с. 248). [1]*Маем тут у Вільні мастака-ткача...*– гаворка пра *Янку Тулейку* – выкладчыка біялёгіі ў віленскіх школах. [2]*Сідаровіч Мікалай* (1928–2003) – настаўнік і краязнавец, стварыў у Слонімскай СШ №7 літаратурны музей.

182. Аляксею Пяткевічу (с. 250). [1]*Крашэўскі Юзаф Ігнацы* (1812–1887) – польскі пісьменьнік беларускага паходжаньня. [2]*"Chata za wsią"* (польск.) – "Хата за вёскай", навэля Ю. Крашэўскага. [3]*Малады Дзядок* – псэўд. *Новіка-Пеюна Сяргея* (1906–1994) – паэта, эспэрантыста, вязьня польскіх, нямецкіх і савецкіх турмаў. [4]*Завадовіч Раман* (1903–1985) – украінскі пісьменьнік, журналіст і рэдактар; яго п'еса "Князь Марцыпан" у перакладзе З. Верас выйшла ў Вільні ў 1929 г. [5]*Камаржынскі Язэп* (1899–1965) – тэатральны актор і рэжысёр, беларускі грамадзкі і культурны дзеяч у міжваеннай Латвіі. [6]*Баршчэўскі Ян* (1796–1851) – беларуска-польскі пісьменьнік; альманах "Незабудка" пад яго рэдакцыяй выходзіў у Пецярбургу ў 1840–1844 гг. на польскай мове. [7]*Кніжкі прафэсара Няфёда я ня маю...*– відаць, маецца на ўвазе "Гісторыя беларускага тэатру" (1982) доктара мастацтвазнаўства Уладзіміра Няфёда (1916–1999).

183. Дануце Бічэль (с. 251). [1]*Плятэры* – шляхецкі род, з якога паходзіла фальклярыстка і ўдзельніца паўстаньня 1830 г. Эмілія Плятэр. З. Верас, відаць, мае на ўвазе капліцу ў вёсцы Лужкі Шаркаўшчынскага р-ну.

185. Аляксею Пяткевічу (с. 252). [1]*Біянкі Віталі* (1894–1959) – расейскі пісьменьнік; яго дзіцячая прыродазнаўчая кніга "Лясныя хаткі" ў перакладзе З. Верас выйшла ў Вільні асобным выданьнем ў 1931 г.

186. Аляксею Пяткевічу (с. 253). [1]*Буйло Станіслава* (?–1922) – кіраўніца Беларускага дзіцячага прытулку ў Гародні; сястра паэткі К. Буйло. [2]*Тамашчык Павал* – выканаўца абавязкаў дырэктара Гарадзенскай Беларускай гімназіі; з 1921 г. старшыня Гарадзенскай школьна-прытулковай рады. [3]*Чаркасава Дзіяна* – журналістка, адказны сакратар газ. "Голас Радзімы", дасьледчыца творчасьці К. Буйло. [4]*Скарынкін Уладзімір* (нар. 1939) – паэт і перакладчык.

187. Аляксею Пяткевічу (с. 254). [1]*Polskie koło samokształcenia* (польск.) – польскі гурток самадукацыі. [2]*А яшчэ гэтыя хваробы у сям'і Загнетавых...*– маецца на ўвазе хвароба *Эрыка Загнетава* – мужа паэткі Д. Бічэль. [3]*Шыдлоўскі Аляксандр* (1911–2002) – кампазытар, грамадзка-культурны дзеяч у Заходняй Беларусі.

189. Аляксею Пяткевічу (с. 257). [1]*Баран Сяргей* (1892–1937) – грамадзкі і культурны дзеяч; з 1919 г. старшыня Гарадзенскага Беларускага камітэту, адзін з заснавальнікаў Беларускай гімназіі ў Гародні. У 1927 г. перайшоў у БССР, дзе загінуў у Гулагу. [2]*Барыса-Глебскі манастыр* знаходзіўся на вул. Маставой, на месцы цяперашняга Гарадзенскага драматычнага тэатру. [3]*Дзекуць-Малей Лукаш*

(1988–1955) – рэлігійны і грамадзкі дзеяч, прапаведнік баптызму; перакладаў багаслужбовыя тэксты на беларускую мову. [4]*Вольскі Артур* (сапр. *Зэйдэль*; 1924–2002) – паэт, старэйшы рэдактар выдавецтва "Юнацтва" (1981–1984).

190. Алесю Белакозу (с. 259). [1]*Давід Зінгер* – пазаштатны карэспандэнт газ. "Слонімскі весьнік"; працаваў намесьнікам дырэктара Слонімскага навучальна-вытворчага камбінату. [2]*Кастэцкая Надзея* (1929–1991) – апякунка М. Забэйды Суміцкага ў Празе.

191. Аляксею Пяткевічу (с. 260). [1]*Загнетаў Эрык* (1937–1983) – кінаінжынэр, муж паэткі Д. Бічэль. [2]*Цьвірка Кастусь* (нар. 1934) – паэт, празаік, перакладчык, выдавец.

193. Адаму Мальдзісу (с. 261). [1]*Паўлюкоўскі Уладзіслаў* (псэўд. *Улад Ініцкі*; 1895–1955) – пісьменьнік і мастак, удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі; пасьля вайны працаваў дырэктарам Літаратурнага музэю А. Пушкіна ў Вільні.

197. Аляксею Пяткевічу (с. 262). [1]*Кароль Усевалад* (1919–1984) – актывіст Беларускай незалежніцкай партыі, па прафэсіі лекар; у 1946 г. быў арыштаваны, пасьля вяртаньня з Гулагу жыў у Баранавічах. [2]*"З кагорты пачынальнікаў"* – артыкул А. Пяткевіча, надрукаваны ў альманаху "Краю мой – Нёман" (1986).

202. Аляксею Пяткевічу (с. 266). [1]*Лужанін Максім* (сапр. *Аляксандр Каратай*; 1909–2001) – паэт, празаік, перакладчык.

204. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 268). [1]*Траяноўскі Алесь* (1925–2005) – журналіст, паэт і перакладчык.

209. Аляксею Пяткевічу (с. 272). [1]*Дзякую за кніжку пра Галубка...*– відаць, маецца на ўвазе "Драматургія Уладзіслава Галубка" (1982) Л. Карабанавай. [2]*"Апошняе спатканьне"* – п'еса У. Галубка; датуецца 1917. [3]*"Ганка"* – п'еса У. Галубка, у якой Л. Сівіцкая выконвала галоўную ролю. [4]*Цітовіч Генадзь* (1910–1986) – музыкавед, фальклярыст і харавы дырыгент. Народны артыст СССР (1968). [5]*Алексютовіч Ларыса* (1913–2003) – балетмайстар і музычны крытык.

212. Дануце Бічэль (с. 274). [1]*Някляеў Уладзімір* (нар. 1946) – паэт, празаік, грамадзкі і палітычны дзеяч; у 2010 г. вылучаўся на пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. [2]*Я пісала да Веры Ігнатаўны...*– маецца на ўвазе жонка А. Белакоза.

213. Дануце Бічэль (с. 275). [1]*Казьбярук Уладзімір* (нар. 1923) – літаратуразнавец, супрацоўнік Інстытуту літаратуры Акадэміі навук.

214. Дануце Бічэль (с. 275). [1]*Пазьнякоў Міхась* (нар. 1951) – паэт, дырэктар Літаратурнага музэю М. Багдановіча (1981–1984).

215. Адаму Мальдзісу (с. 276). [1]*Што да "Зборнічка жыцьцяпісаў"...*– маецца на ўвазе рукапісны зборнік біяграфій беларускіх дзеячаў, які складала З. Верас.

216. Уладзіміру Ягоўдзіку (с. 277). [1]*Што ў яго выйшла з працягам "Паўлінкі"...*– Ф. Аляхновіч напісаў працяг камэдыі Я. Купалы "Паўлінка"; апублікаваны пад назвай "Заручыны Паўлінкі" (Вільня, 1921). [2]*Канец яго быў трагічны...*– Ф. Аляхновіч быў забіты савецкімі партызанамі (па іншых зьвестках – польскімі акаўцамі) ў Вільні 3 сакавіка 1944 г.

217. Дануце Бічэль (с. 277). [1]*Дуж-Душэўскі Клаўдзій* (1891–1959) – архітэктар, палітычны дзеяч, выдавец, адзін з кіраўнікоў Беларускага цэнтру ў Літве. [2]*Беларускі музей імя Івана Луцкевіча* існаваў у Вільні з 1921 па 1945 г.

218. Дануце Бічэль (с. 278). [1]*Кіслы Уладзімір* (нар. 1957) – мастак-рэстаўратар; жыве ў Гародні.

219. Аляксею Пяткевічу (с. 279). [1]*"Лірнік вясковы: Сыракомля ў беларуска-польскім літаратурным узаемадзеяньні"* – манаграфія У. Мархеля, выйшла ў 1983 г.

220. Дануце Бічэль (с. 280). [1]*Крывец Сяргей* (1904–1945) – паэт, сакратар Таварыства беларускай школы.

222. Аляксею Пяткевічу (с. 282). [1]*У Інаўроцлаве жыве стары віленскі дзеяч...*– маецца на ўвазе *Найдзюк Язэп* (1909–1984) – дзеяч беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, рэдактар час. "Шлях моладзі". У 1943 г. выдаў у акупаваным Мінску падручнік па гісторыі "Беларусь учора і сяньня". З 1944 г. жыў у Польшчы пад прозьвішчам *Александровіч*. [2]*Банайціс Валдас* (нар. 1942) – літоўскі лекар-псыхіятр, бібліяфіл, эспэрантыст і грамадзкі дзеяч, прапагандыст беларускай культуры. [3]*Дубавец Сяргей* (нар. 1959) – журналіст і пісьменьнік; галоўны рэдактар газ. "Наша ніва" (1991–2000) і "Свабода" (2001–2008), радыё "Балтыйскія хвалі" (2000–2001).

225. Дануце Бічэль (с. 286). [1]*Конан Валянціна* (1918?–1981) – выпускніца Віленскай Беларускай гімназіі, галоўная захавальніца фондаў Менскага абласнога музэю (Маладзечна). [2]*Гэта ў былым Ваўкавыскім павеце...*– вёска *Біскупцы*, пра якую ідзе гаворка, знаходзіцца ў Лідзкім р-не.

228. Дануце Бічэль (с. 288). [1]*Палуян Сяргей* (1890–1910) – публіцыст і празаік. [2]*Хаваю для Вас мой exlibris...*– кніжны знак для З. Верас стварыў мастак В. Целеш. [3]*Астраўцоў Сяргей* (нар. 1959) – гарадзенскі журналіст і пісьменьнік.

229. Дануце Бічэль (с. 289). [1]*Язэп Александровіч* – пад гэтым імем жыў у Польшчы Язэп Найдзюк. [2]*Маю новага цікавага карэспандэнта з Глыбокага...*– маецца на ўвазе *Аляксандр Бабіч* (1926–пасьля 1988) – глыбоцкі краязнавец; працаваў бугальтарам.

230. Дануце Бічэль (с. 290). [1]*Кожан Аляксандр* – пэдагог і краязнавец; дасьледаваў Шаркаўшчынскі р-н.

231. Алесю Белакозу (с. 290). [1]*Шунейка Яўген* (нар. 1954) – мастацтвазнавец; працаваў у Гарадзенскім абласным навукова-мэтадычным цэнтры народнай

творчасьці. [2]*Ракіцкі Уладзімір* – мастак-рэстаўратар.

232. *Дануце Бічэль* (с. 291). [1]*Тумас Генадзь* (нар. 1940) – паэт, супрацоўнік Літаратурнага музэю Якуба Коласа (1974–1987). [2]*Лялько Хрысьціна* (нар. 1956) – пісьменьніца, рэдактарка час. "Наша вера".

233. *Уладзіміру Ягоўдзіку* (с. 292). [1]*Цешуся з такой удалай ластаўкі...*– маецца на ўвазе выхад першай кнігі У. Ягоўдзіка "Стронга" (1984).

234. *Дануце Бічэль* (с. 293). [1]*Niech tylko kot pokaźe się, prędko koniec jemu zrobimy* (польск.) – няхай толькі кот пакажацца, хутка канец яму зробім.

236. *Адаму Мальдзісу* (с. 294). [1]*Федарук Анатоль* (нар. 1939) – краязнавец і геабатанік, доктар біялягічных навук.

238. *Алесю Белакозу* (с. 296). [1]*Грабінскі Баляслаў* (1899–1991) – доктар мэдыцыны, грамадзкі дзеяч. Быў старшынём БХД, падчас Другой сусьветнай вайны узначальваў Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні, з 1944 г. на эміграцыі, жыў у ЗША.

240. *Адаму Мальдзісу* (с. 298). [1]*Яшчэ раз дзякую за кніжку...*– відаць, маецца на ўвазе кніга А. Мальдзіса "Восень пасярод вясны: аповесьць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданьняў" (1984). [2]*Кулакоўскі Ігнат* (1800–1870) – пэдагог, краязнавец; прадзед З. Верас. Скончыў Сьвіслацкую гімназію і Варшаўскі ўнівэрсытэт, працаваў куратарам павятовых школаў на Гарадзеншчыне.

241. *Алесю Белакозу* (с. 299). [1]*"Віленскія кірмашы"* – успаміны З. Верас, апублікаваныя ў тыднёвіку "Ніва" 23 чэрвеня 1985 г. [2]*Марыя Самуйлёнак* – дачка пісьменьніка Эдуарда Самуйлёнка (1907–1939).

242. *Дануце Бічэль* (с. 300). [1]*А маёй кніжачкі і дагэтуль німа...*– зб. "Каласкі" выйшаў у 1985 г. [2]*"Нёману"* – празаічная імпрэсія З. Верас.

243. *Алесю Белакозу* (с. 301). [1]*Ад майго там карэспандэнта...*– гаворка пра Аляксандра Бабіча. [2]*Цярохін Станіслаў* (1929–2009) – краязнавец, пісьменьнік, адзін з выдаўцоў газ. "Беларускі калекцыянер".

246. *Дануце Бічэль* (с. 304). [1]*Жамойцін Алесь* (нар. 1955) – паэт, дырэктар Музэю Ф. Багушэвіча ў Кушлянах.

247. *Аляксею Пяткевічу* (с. 305). [1]*Петрашэвіч Яўген* (нар. 1930) – музычны пэдагог і кампазытар, аўтар зб. "Беларускі вясёлкавы край" (2010); жыве ў Гародні. [2]*Podstawowych* (польск.) – пачатковых.

248. *Уладзіміру Ягоўдзіку* (с. 306). [1]*Вашую рэцэнзію прачытала...*– маецца на ўвазе рэцэнзія на зб. З. Верас "Каласкі", надрукаваная ў час. "Полымя" (1985, №7).

249. Алесю Белакозу (с. 307). [1]*“Беларуская майстроўня”* – Беларуская сьпеўна-драматычная майстроўня, нефармальная моладзевая арганізацыя, якая існавала ў Менску ў 1979–1984 гг. [2]*Вячорка Вінцук* (нар. 1961) – мовазнавец, грамадзкі і палітычны дзеяч; кіраўнік Партыі БНФ (1999–2007). [3]*Іпатава Вольга* (нар. 1945) – пісьменьніца і грамадзкая дзеячка, старшыня Саюзу пісьменьнікаў Беларусі (1998–2002). [4]*Мінкін Алег* (нар. 1952) – паэт і перакладчык; жыве ў Вільні.

250. Аляксею Пяткевічу (с. 308). [1]*Каўка Аляксей* (нар. 1937) – літаратуразнавец, архівіст, перакладчык, доктар філялёгіі; жыве ў Маскве. [2]*Сакалова-Лекант Алена* (?–1960) – пэдагог, выкладчыца Віленскай Беларускай гімназіі (1919–1944). [3]*Кароль Сымон* (1888–1945) – пэдагог, сябра Беларускага навуковага таварыства; быў дырэктарам Беларускай гімназіі ў Гарадку Маладзечанскага павету, выкладчыкам Віленскай Беларускай гімназіі.

251. Адаму Мальдзісу (с. 309). [1]*Кветка Вітан* – псэўд. мастацтвазнаўцы і мэмуарысткі Юльяны Вітан-Дубейкаўскай (1886–1970).

252. Адаму Мальдзісу (с. 310). [1]*Бадунова Палута* (1885–1938) – грамадзкая і палітычная дзяячка, уваходзіла ў кіраўніцтва БПСР. [2]*Сташкевіч Мікалай* (1938–2011) – гісторык, шматгадовы супрацоўнік Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ, доктар гістарычных навук.

253. Аляксею Пяткевічу (с. 310). [1]*Арлоў Уладзімір* (нар. 1953) – празаік, паэт і перакладчык. [2]*Улашчык Мікола* (1906–1986) – беларускі гісторык, археоляг, доктар гістарычных навук (1964); жыў у Маскве.

257. Аляксею Пяткевічу (с. 314). [1]*Сурмач Ганна* (нар. 1947) – грамадзкая дзяячка, музэязнавец; была дырэктарам Беларускага дзяржаўнага архіва-музэю літаратуры і мастацтва, узначальвала Згуртаваньне беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”. [2]*Мікуліч Барыс* (1912–1954) – пісьменьнік, аўтар аповесьці пра М. Багдановіча. [3]Асобу *прафэсара Адамава* высьветліць не ўдалося. [4]*Успаміны дачкі Альбэрта Паўловіча...*– маюцца на ўвазе “Успаміны пра бацьку” Тамары Паўловіч-Кліменкі, апублікаваныя ў “Выбраным” А. Паўловіча (Менск, 1975). [5]*Фарботка Язэп* (1893–1960) – паэт, літаратуразнавец. [6]*Скарынкін Уладзімір* (нар. 1939) – паэт і перакладчык.

259. Аляксею Пяткевічу (с. 317). [1]*Асташонак Алесь* (1954–2004) – пісьменьнік і перакладчык. [2]*Koło polskej mlodzieży postępowej* (польск.) – гурток польскай прагрэсіўнай моладзі. [3]*Вітка Васіль* (сапр. *Цімох Крысько*; 1911–1996) – паэт, перакладчык. [4]*Кісялеўскі Анатоль* (1925–1986) – мовазнавец, аўтар “Лацінска-руска-беларускага батанічнага слоўніка” (1967).

262. Міхасю Вераціле (с. 320). [1]*Вераціла Міхась* (нар. 1937) – калекцыянер, краязнавец, паэт і мастак; жыве ў пасёлку Краснасельскі на Ваўкавышчыне. У ягонай калекцыі ёсьць “Батанічны слоўнік” з гэткім надпісам: “*Дарагому жыхару маёй Гродзеншчыны Міхасю Уладзіміравічу Вераціле. Захопленая Вашай працавітасьцю,*

цярплівасьцю і прагай узбагаціць свае калекцыі-архівы. Са шчырымі зычэньнямі новых здабыткаў! Аўтар "Бат. слоўніка" З. Верас. 19-24/ III. 86 г. Вільня".

263. *Аляксею Пяткевічу* (с. 320). [1]*А. Міцкевіч у сваіх творах сярод іншых лясоў успамінае...*– маюцца на ўвазе радкі з паэмы "Пан Тадэвуш": "Калісьці Гедымін, палюючы ў Панарах, / адпачываў на шкуры пры агні на нарах / і гладзіў поўсьць мядзьведжую, закалыханы шумам / вячыстых дрэў" (пераклад Я. Семяжона). [2]*А які ж будзе вынік ліста да Гарбачова...*– гаворка пра "Ліст беларускіх пісьменьнікаў, работнікаў культуры, мастацтва і навуковых устаноў Беларусі Генэральнаму сакратару ЦК КПСС Міхаілу Гарбачову аб лёсе беларускай мовы і культуры" (гл. час. "Исторический архив" (Масква), 2004, №6). Ліст датуецца 15 сьнежня 1986 г.; яго падпісалі 28 чалавек, сярод якіх Р. Барадулін, Я. Брыль, В. Быкаў, П. Панчанка, А. Разанаў, С. Станюта. [3]*Гарбачоў Міхаіл* (нар. 1931) – савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, Генэральны сакратар ЦК КПСС (1985–1991), Прэзыдэнт СССР (1990–1991). [4]*Сакратар "Паходні"...*– маецца на ўвазе *Таранда Мікола* (нар. 1957) – біёляг, адзін з кіраўнікоў клюбу "Паходня", які быў створаны ў Гародні ў 1986 г. [5]*Кутарга Віктар* (1920–?) – лекар-анколяг; жыў і працаваў у Вільні. [6]*Ламаносаў Міхаіл* (1711–1765) – расейскі энцыкляпэдыст, фізык і хімік, паэт і вынаходца.

264. *Міхасю Вераціл*у (с. 322). [1]*"Велікодная пісанка"* – альманах, выдадзены ў 1904 г. у Пецярбургу беларускім таварыствам "Круг беларускай народнай прасьветы і культуры".

266. *Аляксею Пяткевічу* (с. 323). [1]*Круталевіч Вадзім* (1922–2006) – гісторык, праўнік, доктар юрыдычных навук; дасьледаваў гісторыю нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі. [2]*Сташкевіч Мікалай* (1938–2011) – гісторык, доктар гістарычных навук. [3]*Мамонька Язэп* (1889–1937) – палітычны дзеяч і публіцыст, адзін з арганізатараў Першага Усебеларускага кангрэсу (1917), з 1919 г. сябра Прэзыдыюму Рады БНР; у 1928 г. быў арыштаваны НКВД, загінуў у Гулагу. [4]*Госьцеў Аляксандр* (нар. 1948) – гарадзенскі краязнавец, пэдагог, суаўтар кніг па гісторыі Гародні "Кронон" (1993), "Гродназнаўства" (2012) і "Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы" (2012). [5]*Gaudeatmus* (лац.) – узрадуемся; міжнародны студэнцкі гімн, аўтарства прыпісваецца паэту Кіндлебэну і кампазытару Ягану Окенгайму.

268. *Аляксею Пяткевічу* (с. 324). [1]*Дзякую за наш зборнік...*– гаворка пра альманах "Краю мой – Нёман" (1986). [2]*Быкаў Васіль* (1924–2003) – народны пісьменьнік Беларусі (1980); напісаў прадмову да альманаха "Краю мой – Нёман". [3]*Карпюк Аляксей* (1920–1992) – пісьменьнік, у 1978–1992 гг. узначальваў Гарадзенскае абласное аддзяленьне Саюзу пісьменьнікаў. [4]*Іверс Анатоль* (сапр. *Іван Міско*; 1912–1999) – беларускі паэт і ўдзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. [5]*Сідаровіч Мікалай* (1928–2003) – настаўнік і краязнавец, стварыў у Слонімскай СШ №7 літаратурны музей. [6]*Лейка Кандрат* (1860–1921) – паэт і драматург.

269. *Аляксею Пяткевічу* (с. 326). [1]*Дуж-Душэўскі Клаўдзій* (1891–1959) – архітэктар, палітычны дзеяч, выдавец, адзін з кіраўнікоў Беларускага цэнтра ў Літве.

270. Дануце Бічэль (с. 327). [1]*Віялета Яфіменка* – дзіцячы пэдагог, актывістка Беларускай сьпеўна-драматычнай майстроўні. [2]*Алег Чыжоў* – актывіст гомельскага моладзевага згуртаваньня "Талака". [3]*Сыс Анатоль* (1959–2005) – паэт, адзін з лідараў Таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя".

271. Аляксею Пяткевічу (с. 328). [1]*Аблажэй Алег* (нар. 1954) – мастак і пісьменьнік; жыве ў Вільні. [2]*Балаховіч Хрысьціна* (нар. 1959) – мастачка; жонка А. Аблажэя.

273. Аляксею Пяткевічу (с. 329). [1]*"Літаратура Гродзеншчыны"* – маецца на ўвазе кніга А. Пяткевіча "Літаратурная Гарадзеншчына. Мясьціны. Людзі. Кнігі" (1986). [2]*Гілевіч Ніл* (нар. 1931) – паэт, перакладчык, грамадзкі дзеяч, народны паэт Беларусі (1991). [3]*Бабіч Аляксандр* (1926–пасьля 1988) – глыбоцкі краязнавец.

279. Аляксею Пяткевічу (с. 333). [1]*Маю другі дзень госьця – маладога пчаляра...*– гаворка пра пчаляра і паэта *Папеку Міколу* (нар. 1961).

280. Дануце Бічэль (с. 334). [1]*Барадулін Рыгор* (нар. 1935) – паэт, перакладчык, эсэіст; народны паэт Беларусі (1992). [2]*Пецюкевіч Уладзімір* (нар. 1943) – паэт-песеньнік. [3]*Чыгрын Іван* (1931–2006) – літаратуразнавец і паэт. [4]*Анішчык Аляксей* (псэўд. *Андрэй Чэмер*; 1912–2007) – мэмуарыст, пэдагог, грамадзкі дзеяч.

284. Аляксею Пяткевічу (с. 336). [1]*Войцік Валянціна* – пэдагог, заслужаная настаўніца Беларусі; жыве ў Менску. [2]*Янушкевіч Валяр'ян* (нар. 1962) – скульптар; працуе пераважна ў жанры манумэнтальнай скульптуры. [3]*Стома Мікола* (?–2004) – кампазытар; апошнім часам жыў у Варшаве. [4]*Траецкі інцыдэнт* – маецца на ўвазе справакаваны ўладамі напад воінаў-афганцаў на беларускую моладзь у красавіку 1986 г. у менскім Траецкім прадмесьці.

287. Дануце Бічэль (с. 339). [1]*Аўтарка кніжак пра Цётку...*– гаворка пра Лідзію Арабей (нар. 1925).

290. Міколу Таранду (с. 342). [1]*Таранда Мікола* (нар. 1957) – біёляг, выкладчык Гарадзенскага дзяржаўнага аграрнага ўнівэрсытэту, адзін з кіраўнікоў гарадзенскага клюбу "Паходня". [2]*Шалкевіч Віктар* (нар. 1959) – бард, актор Гарадзенскага лялечнага тэатру. [3]*Гельгар Лейба* – гарадзенскі фатограф пачатку XX ст.

291. Аляксею Пяткевічу (с. 344). [1]*Караткевіч Уладзімір* (1930–1984) – паэт, празаік, эсэіст, перакладчык.

292. Аляксею Пяткевічу (с. 344). [1]*"Старое Гродна"* – успаміны З. Верас, апублікаваныя ў альманаху "Краю мой – Нёман" (1986).

293. Дануце Бічэль (с. 344). [1]*Ліпень Аляксандр* (1926–2006) – гарадзенскі мастак і скульптар. [2]*"Чыжык беларускі"* (1912) – паэтычны зб. Г. Леўчыка, надрукаваны беларускай лацінкай.

294. Дануце Бічэль (с. 345). [1]*"Мядовыя расьліны"* – цыкль артыкулаў З. Верас, надрукаваны ў час. "Беларуская борць" у 1930-я гг.

295. Міколу Таранду (с. 346). [1]*Бірыла Мікалай* (1923–1992) – мовазнавец-антрапаніміст; акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1977).

296. Адаму Мальдзісу (с. 347). [1]*Ня помню ні № газэты, ні году...*– "Гісторыя беларускага адрыўнога календара" была апублікаваная ў тыднёвіку "Ніва" 26 сьнежня 1976 г. [2]*Сагановіч Генадзь* (нар. 1961) – гісторык і археоляг; з 1984 г. супрацоўнік Інстытуту гісторыі Акадэміі навук, адкуль быў звольнены ў 2005 г. з палітычных матываў. [3]*Папека Мікола* (нар. 1961) – пчаляр і паэт, заснавальнік літаратурнай Мядовай прэміі. [4]*Войцік Антон* (1998–1948) – публіцыст, рэдактар грамадаўскіх газэтаў; з 1926 г. муж Л. Сівіцкай.

297. Аляксею Пяткевічу (с. 349). [1]*Як Вам чытаюцца мае ўспаміны...*– гаворка пра "Старое Гродна", апублікаванае ў альманаху "Краю мой – Нёман" (1986). [2]*Сям'я Шнаркевічаў...*– *Шнаркевіч Надзея* (1897–1974) – настаўніца, супрацоўніца галоўнай управы ТБШ, рэдактарка час. "Жаночая справа" і *Шнаркевіч Язэп* (?–1981) – настаўнік, выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі.

299. Арсеню Лісу (с. 350). [1]*Валкавыцкі Георгі* (нар. 1928) – беластоцкі пісьменьнік і журналіст, першы рэдактар тыднёвіка "Ніва".

300. Аляксею Пяткевічу (с. 351). [1]*Гайдук Мікола* (1933–1998) – пісьменьнік, журналіст, грамадзкі дзеяч; працаваў намесьнікам галоўнага рэдактара тыднёвіка "Ніва", пісаў падручнікі для беларускіх школаў Беласточчыны. [2]*Гадлеўскі Вінцэнт* (1888–1942) – палітычны і рэлігійны деяч; удзельнік Першага ўсебеларускага кангрэсу (1917), адзін з заснавальнікаў БХД, уваходзіў у раду Беларускай народнай самапомачы. У 1942 г. расстраляны фашыстамі.

303. Арсеню Лісу (с. 354). [1]*"Сялянская праўда"* выходзіла ў Вільні ў 1924 пад рэдакцыяй А. Войціка. [2]*"Сялянская доля"* выходзіла ў Коўне ў 1921–1922 гг.; усяго выйшла 7 нумароў. [3]*Вячорка Арына* (дзявоч. *Ползік*; 1961–2012) – пэдагог, грамадзкая і культурная дзяячка, стваральніца і кіраўніца Беларускага рыцарскага клюбу.

304. Міколу Таранду (с. 356). [1]*Янка Тулейка* – пэдагог, выкладаў біялёгію ў віленскіх школах; пляменьнік Я. Шнаркевіча.

306. Аляксею Пяткевічу (с. 358). [1]*Глякоўскі Станіслаў* (1896–1943) – рэлігійны і грамадзкі дзеяч, доктар тэалёгіі; быў расстраляны фашыстамі. [2]*Цьвірка Кастусь* (нар. 1934) – паэт, празаік, перакладчык, выдавец.

307. Адаму Мальдзісу (с. 360). [1]*Матэр'ялы для Бібліяграфічнага слоўніка высылаю...*– маецца на ўвазе біябібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменьнікі" ў 6 тамах пад рэдакцыяй А. Мальдзіса (1992–1995). [2]*"Маланка"* – ілюстраваны сатырычны час.; выдаваўся ў Вільні ў 1926–1928 гг. [3]*Іваноўскі Тадэвуш* (*Іванаўскас Тадас*; 1882–1970) – літоўскі навуковец-біёляг; брат В. Іваноўскага.

309. Дануце Бічэль (с. 361). [1]*Станіслаў Ільін* – унук Д. Бічэль. [2]*Шунейка Яўген*

(нар. 1954) – мастак і мастацтвазнавец; працаваў у Гарадзенскім абласным навукова-мэтадычным цэнтры народнай творчасьці.

310. Міколу Таранду (с. 362). [1]*Ліст да Гарбачова...*– гаворка пра ліст Генэральнаму сакратару ЦК КПСС Міхаілу Гарбачову 28 дзеячоў беларускай культуры аб катастрафічным становішчы нацыянальнай мовы; датуецца15 сьнежня 1986 г. [2]*Данчык* – сцэнічнае імя *Андрусышына Багдана* (нар. 1958) – беларускага сьпевака і журналіста; жыве ў ЗША.

313. Дануце Бічэль (с. 365). [1]*Сапач Тацьцяна* (1962–2010) – паэтка і журналістка, аўтарка праграмы "Віленскі сшытак" на Літоўскім нацыянальным тэлебачаньні.

314. Міколу Таранду (с. 366). [1]*Бржэскі Вітольд* (1913–1984) – доктар мэдыцынскіх навук; выкладаў у Гарадзенскім мэдінстытуце гісторыю мэдыцыны.

322. Міколу Таранду (с. 372). [1]*Прыехала нявестка Ларысы Антонаўны Геніюш...*– гаворка пра *Валянціну Геніюш* (дзявоч. *Зелянко*), жонку Ю. Геніюша; нар. у вёсцы Бярэжкі на Зэльвеншчыне, жыве ў Беластоку. [2]*Геніюш Янка* (1902–1979) – мэдык па адукацыі, сябра пражскай філіі Беларускай народнай самапомачы; у 1948 г. разам з жонкай быў вывезены ў СССР і асуджаны Вярхоўным Судом Беларусі на 25 гадоў няволі.

323. Міколу Таранду (с. 373). [1]*Прыслалі Вы "твор" Сташкевіча...*– маецца на ўвазе прапагандысцкі артыкул М. Сташкевіча "Людзі з мінулага", у якім аўтар зьнеunion жальна выказваўся пра Антона Луцкевіча і ягоных сыноў – Лявона і Юрку. Цытата з артыкула: *"Яблык ад яблыні недалёка падае, а таму падобным чынам скламіся і лёсы сыноў. Бацька служыў кайзэраўцам, а гэтыя – гітлераўцам"*. Артыкул быў надрукаваны 6 чэрвеня 1987 г. у газ. "Зьвязда" і "Советская Белоруссия", перадрукаваны 17 чэрвеня ў польскамоўнай газ. "Czerwony sztandar" (Вільня), а таксама ўвайшоў у зборнік палітычнай публіцыстыкі "Дары данайцев" (Мн., 1987).

324. Адаму Мальдзісу (с. 374). [1]*Як справы са "Слоўнікам"...*– гаворка пра біябібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменьнікі" ў 6 тамах пад рэдакцыяй А. Мальдзіса (1992–1995).

327. Дануце Бічэль (с. 376). [1]*Пячэньнікаў Валеры* – тагачасны сакратар ЦК КПБ па ідэалёгіі. [2]*Маргарыта Пярова* – пляменьніца зяця З. Верас Лявона Луцкевіча; жыве ў Пецярбургу.

329. Адаму Мальдзісу (с. 378). [1]*Бярозка Генрык* (сапр. *Бэта*) – беларускі сьвятар і папулярызатар пчалярства; быў рэктарам духоўнай сэмінарыі ў Ломжы (Польшча).

330. Аляксею Пяткевічу (с. 378). [1]*Гарэцкі Гаўрыла* (1900–1988) – геоляг і географ, акадэмік Беларускай акадэміі навук (1928), дырэктар Беларускага навукова-дасьледчага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі.

335. Аляксандру Госьцеву (с. 381). [1]*Госьцеў Аляксандр* (нар. 1948) – гарадзенскі кра-

язнавец, пэдагог, суаўтар кніг па гісторыі Гародні "Кронон" (1993), "Гродназнаўства" (2012) і "Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы" (2012).

338. Дануце Бічэль (с. 384). [1]*Пасылаю першыя радкі вершаў...*– маюцца на ўвазе вершы Л. Геніюш. [2]*Ягоўдзік Уладзімір* (нар. 1956) – пісьменнік, рэдактар і выдавец час. "Лесавік".

340. Аляксандру Госьцеву (с. 385). [1]*Садоўскі Ян* – гарадзенскі фатограф другой паловы XIX ст.; прымаў удзел у выданьні "Альбом строяў Расеі". [2]*Казлоўскі Люцыян* (1854–?) – гарадзенскі фатограф, вучань Я. Садоўскага. [3]*Карасік Зельман* – фатограф, ганаровы грамадзянін Гародні (1903). [4]*Гельгар Лейба* – гарадзенскі фатограф, чые працы былі адзначаныя залатым мэдалём на Брусэльскай выставе ў 1905 г. [5]*Музэй у былой аптэцы...*– гаворка пра Аптэку-музэй, адчыненую ў Гародні ў 1996 г. з ініцыятывы Ф. Ігнатовіча.

343. Аляксею Пяткевічу (с. 388). [1]*Ведала ад яе сакратара...*– маецца на ўвазе *Таранда Мікола* (нар. 1957) – біёляг, выкладчык Гарадзенскага дзяржаўнага аграрнага ўнівэрсытэту, адзін з кіраўнікоў клюбу "Паходня". [2]*БСГ* – Беларуская сацыялістычная грамада, нацыянальная партыя леванародніцкага кірунку, створаная ў 1902–1903 гг. [3]*Газэта "Грамада"* – орган Беларускай сацыялістычнай грамады; выходзіла ў 1917 г. у Менску пад рэдакцыяй А. Смоліча. [4]*Каруза Павал* (1906–1988) – музычны і грамадзкі дзеяч, адзін з лідараў БХД у міжваенны пэрыяд, пасол Сому Рэчы Паспалітай. [5]*Стэповіч Альбін* (1894–1934) – кампазытар, выдавец, палітычны дзеяч; пасол Сойму Рэчы Паспалітай.

347. Аляксандру Госьцеву (с. 391). [1]*Багдановіч Адам* (1862–1940) – этнограф, фальклярыст і мэмуарыст; бацька М. Багдановіча.

351. Аляксею Пяткевічу (с. 394). [1]*Маю на Флярыдзе сябра з Гродзенскага гуртка...*– гаворка пра *Грабінскага Баляслава* (1899–1991) – доктара мэдыцыны, грамадзкага дзеяча. Быў старшынём БХД, падчас Другой сусьветнай вайны узначальваў Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні, з 1944 г. на эміграцыі, жыў у ЗША.

353. Міколу Таранду (с. 395). [1]*Пятро Анашчанка* – мастак-дэкаратар; працаваў у Беларускім драматычным тэатры імя Якуба Коласа (Віцебск).

354. Аляксею Пяткевічу (с. 396). [1]*Państwowa Gospodarka Rolna* (польск.) – дзяржаўная аграрная гаспадарка.

355. Аляксею Пяткевічу (с. 398). [1]*Далідовіч Генрых* (нар. 1946) – пісьменьнік, аўтар рамана "Пабуджаныя" (пра падзеі 1917–1918 гг. у Менску).

356. Аляксандру Госьцеву (с. 398). [1]*Дзякую таксама за весткі аб Канфэрэнцыі...*– маецца на ўвазе канфэрэнцыя "150 гадоў Кастусю Каліноўскаму", якая ладзілася Гарадзенскім дзяржаўным унівэрсытэтам імя Я. Купалы. [2]*Тальгэйм Аляксандр* – лекар, старшыня Гарадзенскага музычна-драматычнага таварыства. [3]*To nic, niech pokryczy* (польск.) – то нічога, няхай пакрычыць.

358. Аляксандру Госьцеву (с. 400). [1]*Koło polskiej mlodzierzy postępowej* (польск.) – гурток польскай прагрэсіўнай моладзі.

359. Дануце Бічэль (с. 400). [1]*"Вянок"* – літаратурны гурток, які дзейнічаў пры Гарадзенскім музэі М. Багдановіча.

361. Аляксею Пяткевічу (с. 402). [1]*Анішчык Аляксей* (псэўд. *Андрэй Чэмер*; 1912–2007) – мэмуарыст, пэдагог, грамадзкі дзеяч. [2]*Карабач Сяргей* (нар. 1924) – віленскі лекар, доктар мэдыцынскіх навук, сябра Таварыства беларускай культуры ў Літве. [3]*Зімніцкі Юры* (1921–2002) – актывіст аб'яднаньня беларусаў Вільні "Сябрына". [4]*Кароль Леанід* (1922–1998) – інжынер-хімік, працаваў у віленскім Інстытуце электраграфіі; актывіст Таварыства беларускай культуры ў Літве. [5]*Гмырак Лявон* (сапр. *Бабровіч Мечыслаў*; 1891–1915) – крытык і празаік; загінуў на фронце падчас Першай сусьветнай вайны.

362. Аляксандру Госьцеву (с. 403). [1]*Арлоўскі Яўстах* (1863–1913) – гісторык, краязнавец і пэдагог; аўтар шматлікіх кнігі па гісторыі Гародні.

364. Аляксандру Госьцеву (с. 405). [1]*Чурлёніс Мікалоюс* (1975–1911) – літоўскі мастак і кампазытар.

365. Аляксею Пяткевічу (с. 406). [1]*У сувязі з тым агідным матэр'ялам у "Маладосьці"...*– маецца на ўвазе раман Г. Далідовіча "Пабуджаныя" ("Маладосьць", 1987, №11-12), дзе поруч з выдуманымі пэрсанажамі дзейнічаюць рэальныя. Аўтар падрабязна апісвае хаду Усебеларускага зьезду 1917 г., кіруючыся найперш успамінамі бальшавіка В. Кнорына. Не забытая ў творы і сакратарка зьезду: *"Каля сцэны прайшла і села за столік, што стаяў паблізу трыбуны, спрытная ў шэрым касьцюме з чорным аксамітным каўнерыкам і чорнай шапачцы Людвіка Сівіцкая"*. Пасьляслоўе да раману напісаў М. Сташкевіч, стаўленьне да якога ў З. Верас было рэзка адмоўным.

367. Аляксею Пяткевічу (с. 407). [1]*"Пабуджаныя"* – раман Г. Далідовіча, апублікаваны ў час. "Маладосьць" (1987, №11-12); тут гаворка ідзе пра яго кніжнае выданьне.

369. Міколу Таранду (с. 409). [1]*Садоўскі Пётра* (нар. 1941) – мовазнавец, палітык і дыплямат; быў паўнамоцным амбасадарам Беларусі ў Нямеччыне (1992–1994).

370. Удзельнікам літаратурнага гуртка "Вянок" (с. 409). [1]Літгурток *"Вянок"* пад кіраўніцтвам паэткі Д. Бічэль дзейнічаў пры Гарадзенскім музэі М. Багдановіча ў 1980–1990 гг.

376. Аляксандру Госьцеву (с. 414). [1]*Матэрыялы з Канфэрэнцыі...*– гаворка пра канфэрэнцыю "150 гадоў Кастусю Каліноўскаму", якая адбывалася ў Гарадзенскім дзяржаўным унівэрсытэце імя Я. Купалы з выездам у фальварак Якушоўку.

377. Аляксею Пяткевічу (с. 414) [1]*Кішко Серафіма* (1898–1958) – грамадзкая дзяячка і пэдагог, жонка рэлігійнага дзеяча Л. Дзекуць-Малея. [2]*Сагановіч Генадзь* (нар. 1961) – гісторык і архэоляг, супрацоўнік Інстытуту гісторыі Акадэміі навук.

379. Аляксею Пяткевічу (с. 416). [1]*Янушкевіч Язэп* (нар. 1959) – літаратуразнавец і архівіст; супрацоўнік Інстытуту літаратуры Акадэміі навук, Беларускага навукова-дасьледчага інстытуту дакумэнтазнаўства і архіўнай справы.

380. Аляксею Пяткевічу (с. 416). [1]*Руталевіч Вадзім* (1922–2006) – гісторык, праўнік, доктар юрыдычных навук; у сваіх дасьледаваньнях пра падзеі 1917–1918 гг. у Менску дапускаў недакладнасьці. [2]*Чарвякоў Аляксандр* (1892–1937) – дзяржаўны і палітычны дзеяч, адзін са стваральнікаў БССР.

381. Дануце Бічэль (с. 417). [1]*Ці атрымалі мой ліст і падзяку за верш...*– маецца на ўвазе верш Д. Бічэль "Сяброўства", прысьвечаны З. Верас. [2]*Выйшла з друку кніжка А. Гаруна...*– гаворка пра факсімільнае перавыданьне зб. "Матчын дар" (1988). [3]*"Вянок"* – літгурток пры Гарадзенскім музэі М. Багдановіча.

383. Аляксею Анішчыку (с. 418). [1]*У пэўных успамінах гаворыцца...*– маюцца на ўвазе ўспаміны А. Анішчыка пра Наваградзкую гімназію.

385. Аляксею Пяткевічу (с. 418). [1]*Чарапук Янка* (1896–1957) – грамадзкі і палітычны дзеяч, чыноўнік па спэцыяльных даручэньнях пры Міністэрстве замежных спраў БНР, арганізатар Беларускай партыі незалежных рэвалюцыянераў, віцэ-старшыня Беларуска-амэрыканскай нацыянальнай рады. Жыў у ЗША. [2]*Варонка Язэп* (1891–1952) – грамадзкі і палітычны дзеяч, адзін з ініцыятараў абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, узначальваў Урад БНР (1918).

386. Вячку Целешу (с. 419). [1]*"Гродна на старых паштоўках"* – фотаальбом, над якім працаваў філакартыст В. Целеш; у сьвет ня выйшаў.

ІМЕННЫ ПАКАЗЬНІК

А

Аблажэй А. 328, 363
Абрамовіч З. 17, 18, 48, 112, 115, 172, 186, 250, 297, 354, 375
Адамаў 315, 317
Адамовіч А. 48, 50
Ажэшка Э. 16, 21, 119, 120, 279, 390, 410
Александровіч С. 98, 178, 180, 230, 241, 275, 310, 315, 328
Александровіч Я. 289
Алексютовіч Л. 272
Аляксюк П. 17, 47-51, 53, 54, 63, 112
Аляхновіч Ф. 98, 246, 277, 292
Анашчанка П. 396
Анішчык А. 334, 403
Антановіч А. 100, 179
Арабей Л. 146, 147, 231
Арлоў Ул. 310
Арлоўскі Я. 404
Асташонак А. 317, 371
Астрамовіч А. 33, 58
Астраўцоў С. 288, 301, 308, 319, 347, 413
Аўсянік А. 61, 185

Б

Бабіч А. 330
Бабровіч М. 27, 28
Багдановіч А. 391
Багдановіч В. 89
Багдановіч Г. 89, 100
Багдановіч М. 40-45, 52, 59, 60, 111, 116, 129, 132, 139, 152, 213, 217, 218, 222, 224, 225, 232, 237, 315, 326, 328, 381
Багдановіч Я. 101-103, 110, 192, 193, 210, 237, 249, 250, 285, 286, 304, 358
Багушэвіч Ф. 17, 89, 119, 125, 130, 141, 177, 273, 316, 327
Бадунова П. 310, 323, 390, 415, 416, 418
Банайціс В. 283
Барадулін Р. 334
Баранаў С. 258
Баркоўская К. 10, 15, 385, 412
Бароўскі М. 11, 66, 67, 78, 79
Барташэвіч Г. 95, 126
Баршчэўскі Я. 251
Басалыга Ул. 205
Баторы С. 14, 15, 115, 343
Бачыла А. 103, 104, 152, 211, 213, 223, 228, 241, 254, 257, 281, 290, 297

Белакоз А. 100, 106-108, 124, 134, 143, 145, 155, 197, 206, 209, 211, 262, 267, 269, 285, 293, 314, 350, 369, 402, 407
Бенеш Б. 17
Бібіла Ю. 89, 90, 92, 97, 98, 100, 110, 130, 169, 303, 333
Більмін С. 21, 112
Біндзюк І. 78, 79, 119
Бірыла М. 347
Бічэль Д. 186, 187, 214, 225, 229, 241, 249, 252, 260, 266, 339
Біянкі В. 252, 355, 357
Блок А. 155
Бобрык М. 19, 22, 25, 28, 42, 115, 152, 159
Бржэцкі В. 367
Брыль Я. 139, 140, 244
Будзька Э. 48-50, 52, 54
Буйло К. 105, 164, 165, 174, 203, 227, 236, 253, 293
Буйло С. 253, 255, 257, 258, 260
Буйніцкі І. 18, 36, 50, 112, 115, 316
Булгак Я. 204
Бурбіс А. 50, 54
Бурсевіч І. 183
Бурсевіч М. 183
Бурш Я. 88
Бусел С. 83, 342
Быкаў В. 324
Бычкоўскі Ад. 16, 18-21, 23, 88, 111-114, 123, 127, 128, 132, 227, 232, 255
Бычкоўскі Ан. 16, 25, 132
Бэргман А. 135, 142, 144, 145, 155, 173, 174, 178, 179, 183, 273
Бядуля З. 34, 40, 45, 58-60, 64, 132, 198, 227, 315, 365
Бяляўская В. 239
Бярозка Г. 378, 379

В

Валадкевіч Л. 10
Васілеўскі М. 217
Васілёк М. 220
Варава У. 74
Варонка Я. 47, 61, 185, 419
Ватацы Н. 216, 230, 238, 239, 317, 330, 339, 365, 371, 373
Валкавыцкі Г. 351
Ваяводзкі С. 18
Вераціла М. 330
Вернікоўскі Т. 59
Віславух Ф. 26
Вітка В. 318, 365
Вішня А. 86
Войцік А. 72-75, 215, 256, 267, 277, 309, 348, 354, 389, 402
Войцік В. 169, 337

Войцік Г. 98, 130, 243, 256
Войцік Я. 91, 134, 208, 211, 228, 242, 256, 281, 295
Вольскі А. 258, 280, 303
Вярцінскі А. 124
Вячорка А. 355
Вячорка В. 307

Г

Гадлеўскі В. 44, 49, 54, 352
Гайдук М. 166, 211, 352
Галкоўскі К. 86
Галубок У. 33, 34, 36, 38-41, 43, 44, 50, 57-59, 63, 64, 178, 208, 235, 290, 411
Галубянка (Голуб) М. 26, 39, 46, 91, 155, 204
Гапановіч Я. 26, 309
Гарбатая Б. 14
Гарбачоў М. 321, 363
Гарлуковіч Я. 156
Гартны Ц. 219
Гарун А. 56, 111, 288, 371, 417
Гарэцкі Г. 378
Гарэцкі М. 48, 86, 92, 143, 213, 218
Гаўрылік Я. 72
Гельгар Л. 386
Генію ш Л. 101, 103, 122, 164, 172, 184, 188, 197, 202, 203, 205, 211, 212, 214, 220, 222, 225, 228, 231, 237, 260, 262, 264, 281, 334, 339, 364, 367, 372, 386, 399
Геніюш Ю. 208, 210-212, 267
Геніюш Я. 158, 373
Гілевіч М. 214
Гілевіч Н. 223, 290, 330, 341
Глебка П. 98
Глушакоў У. 169
Глякоўскі С. 358
Гмырак Л. 403, 407
Говін С. 156, 160
Горкі М. 12
Госьцеў А. 323, 392, 402, 403, 405, 408, 410, 412, 414, 419
Грабінскі Б. 177, 297
Грыб Т. 54, 98, 258
Грыневіч А. 18, 70, 204, 321
Грынкевіч В. 176
Грынкевіч К. 115, 118, 151, 154, 159, 252
Грынкевіч Ст. (малодшы) 122, 162, 163
Грынкевіч Ст. (старэйшы) 65, 118, 156, 162, 163, 175, 212, 214, 252
Грынкевіч Ф. 16-18, 22, 23, 65, 114, 117, 122, 132, 164, 189, 199, 216, 286, 305, 410
Грынкевіч Ю. 19, 309, 313
Грэчанінаў А. 86

Д

Далідовіч Г. 398, 403, 408, 409, 415
Данчык 363, 376, 387
Дараховіч С. 81
Дварчанін І. 12, 58, 155, 266, 271, 401
Дзекуць-Малей Л. 258
Дзісько Н. 245
Доўнар-Запольскі М. 52
Драздовіч Я. 124, 291
Дубавец С. 283, 297, 300, 321, 362, 365
Дубейкаўскі Л. 26, 39, 44, 54, 173, 192, 309, 310
Дуж-Душэўскі К. 51, 278, 323, 327, 360, 415, 418
Дыла Я. 62, 176, 218, 219
Дыяген Сінопскі 24

Е

Езавітаў К. 60, 204
Ермаловіч М. 76, 119, 183, 274

Ж

Жамойцін А. 304, 341
Ждановіч А. 56, 62, 219
Ждановіч Ф. 38, 56, 57, 62, 63, 131, 219
Ждановіч Я. 56, 219
Жук Я. 25
Журанкова Б. 79
Журба Я. 86
Жучкевіч В. 96
Жылуновіч З. 48, 50, 51, 54, 62

З

Забэйда А. 106
Забэйда-Суміцкі М. 101, 102, 104, 105, 132, 133, 135, 142, 156, 161, 181, 188, 191, 194, 197, 202, 209, 225, 226, 229, 233, 234, 373
Завадовіч Р. 250
Загнетаў Э. 260
Захарка В. 61, 185
Заяц Л. 44, 47, 48, 50, 54, 61
Збралевіч Л. 126, 128, 148, 276, 306, 349, 354
Зімніцкі Ю. 403
Зінгер Д. 259

Зубараў Л. 216
Зязюля А. 58, 261, 416
Зямкевіч Р. 26, 38, 44, 47, 49, 50, 125, 311
Зянюк А. 19, 22-25, 28, 39, 46, 72, 112, 114, 118, 150, 151, 154, 227

І

Іваноўскі В. 46, 52, 54
Іваноўскі Т. 360, 372
Іверс А. 325
Ігнатовіч Ф. 154, 156, 169, 171, 178, 201, 203, 208, 214, 219, 367, 398
Ігнатоўскі У. 52
Іпатава В. 307

К

Каганец К. 18, 40, 59, 102, 139, 271, 389, 390
Казьбярук У. 275, 392
Калесьнік У. 144, 332, 334
Каліноўскі К. 89, 363, 403-405
Калышка К. 16, 19, 21, 114, 132
Камаржынскі Я. 250
Канапніцкая М. 129
Кандратовіч К. 55
Канчар Я. 54
Карабач С. 403
Каравайчык П. 48
Карасік З. 386
Караткевіч У. 90, 100, 201, 203, 204, 294, 320, 344
Карнацкая В. 26
Кароль Л. 403
Кароль С. 309
Кароль У. 263
Карповіч М. 245, 251, 252
Карпюк А. 204, 325, 332, 334
Карскі Я. 52, 118, 318
Каруза П. 75, 125, 389, 401, 402, 406, 408
Касацкая Ю. 19, 172
Каստравіцкі А. 40, 48, 50, 59, 148, 271
Кастэцкая Н. 235, 259
Касяк І. 54
Каўка А. 308, 376, 380
Кахановіч М. 48, 50-52, 54
Каханоўскі Г. 132, 190, 223, 241, 251, 269, 280, 289, 303, 314, 318, 326, 331, 342, 407, 408
Кветка Вітан 309, 310
Кіркор А. 147

Кіслы У. 279, 281, 282, 285, 287, 288, 343-345
Кісялеўскі А. 318
Кісялёў Г. 89, 96, 98, 102, 144, 378, 405, 406
Кішко С. 101, 111, 258, 415
Клімовіч А. 87, 90, 91, 103, 108-110, 113, 192, 375
Кожан К. 290-292, 294
Колас Я. 86, 111, 129, 196, 227, 292, 310, 315
Конан В. 286
Котаў І. 216, 327, 369, 370, 377, 384, 385, 408, 409, 416, 418
Коўш А. 78
Краскоўскі І. 50, 52, 54
Краўцоў М. 74, 119, 132
Крашэўскі Ю. 12, 250
Круталевіч В. 48, 323, 413, 415-418
Крывец С. 167, 281
Крыўка Я. 36, 39, 44, 72, 76, 77
Крэчаўскі П. 61
Кулакоўскі І. 246, 251, 298, 348, 397, 403, 404, 408
Кулік Я. 194, 205
Кунда С. 114
Кунда Э. 19, 114
Купава М. 205, 210, 312, 337, 343, 346
Купала Я. 50, 61, 89, 111, 116, 129, 178, 180, 227, 230, 243, 312, 342
Кутарга В. 321, 337, 339, 383, 391
Кухта М. 145
Кэпэль М. 68

Л

Ламаносаў М. 321
Ластаўка П. 23, 87-89, 111, 123, 127, 128, 245, 375
Ластоўская М. 193
Ластоўскі В. 20, 26, 27, 68, 76, 78, 118, 144, 205, 312, 343, 360, 372, 382
Лейка К. 21, 326
Ленін У. 61
Леўчык Г. 26-30, 68, 104-106, 123, 127-130, 132, 167, 179, 184, 204, 206, 236, 245, 250, 278, 364.
Лёсік В. 103, 151
Лёсік Я. 56, 59, 63, 64, 196, 227, 311, 314
Ліпень А. 344
Ліс А. 12, 90, 98, 99, 103, 112, 113, 115, 122, 133, 151, 154, 157, 160, 162, 194, 221, 226, 239, 241, 251, 266, 276, 297, 307, 322, 374, 403, 406, 414
Лобан Я. 180, 249
Лойка А. 89, 90, 122, 131, 201, 216, 227, 230, 232-234, 236, 240, 341, 371
Лужанін М. 266, 318
Луцкевіч А. 69, 72, 75, 105, 135, 136, 183, 193, 213, 329, 342, 343
Луцкевіч І. 19, 20, 22, 68, 97, 102, 135, 192, 211, 213, 230, 317, 329, 342
Луцкевіч Л. 96-98, 102, 126, 143, 217, 220, 322, 328, 329

Луцэвіч У. 98
Любаўскі М. 52
Лявіцкая В. 33, 34, 37, 40, 43, 44, 50, 52, 98, 148, 310
Лявіцкі Я. 19, 22, 24, 28, 112, 144, 152, 154, 159, 199, 227, 324
Лялько Х. 292
Ляўковіч Я. 18, 19, 25, 154
Ляўчук В. 88
Ляшковіч Н. 161, 239, 240, 250, 255, 257, 318, 345, 361, 364

М

Майсяюк З. 79
Майхровіч С. 106, 164, 169, 176
Мальдзіс А. 97, 106, 128, 157, 170, 194, 203, 213, 234, 241, 266, 269, 283, 284, 293, 318, 351, 354, 359
Мамонька Я. 323
Манькоўскі Я. 69
Манцэвіч М. 78, 79, 82, 140, 348
Марачкін А. 205, 227, 300, 343
Маркавец В. 205
Марцінчык М. 76, 91, 105-107, 119, 148, 150, 162, 164-166, 168, 171, 175, 181, 186, 189, 195, 203, 211, 212. 253
Мархель У. 280, 293
Маслоўская М. 170, 215, 249, 403
Матрэнчык А. 81
Матук Г. 56, 60, 226, 227
Мацяш Н. 205
Машара М. 74, 90, 105, 107, 133, 147, 230, 231
Мікуліч Б. 44, 315, 317, 365, 373
Мінкевіч М. 179
Мінкін А. 307
Міско Я. 233
Міцкевіч А. 10, 136, 321
Міцкевіч Д. 196
Метлін І. 48-50, 54
Моцкала С. 368, 374
Мураўёў М. 229
Муха В. 55, 91
Мядзёлка П. 50, 62, 98-100, 105, 112, 198, 234, 258, 288, 373
Мятла І. 79, 193
Мятла П. 193

Н

Наважылаў А. 222
Навіна А. 107
Навіцкі Э. 237

Нагродзкі З. 71
Назарук П. 79
Найдзюк Я. 244, 375
Наліваеў А. 221, 223, 265, 257, 274, 278, 312, 313, 316, 338, 371, 411
Насовіч І. 118
Натусевіч Я. 151, 154, 226
Несьцяровіч В. 180, 211
Ніжанкоўская В. 145, 186, 201, 215, 281
Новік-Пяюн С. 96, 102, 104, 106, 110, 120, 125, 126, 130, 132, 140, 142, 144, 153, 156, 160, 174, 181, 184, 186, 189, 194, 207, 209, 217, 223, 229, 231, 235, 255, 257, 313, 358, 412, 414
Новік Ю. 318
Някляеў У. 274
Няфёд У. 251

П

Падгайскі Э. 77
Пазьняк З. 112, 120, 133, 205, 242
Пазьнякоў М. 275
Палуян С. 17, 288
Панізьнік С. 97, 98, 100, 181, 194, 199, 249-252, 257, 260, 264, 269, 293, 334, 359
Папека М. 348, 372, 396, 408
Паўловіч А. 33, 36, 44, 128, 315
Паўловіч С. 74, 76, 309
Паўлюкоўскі У. 110, 133, 192, 261
Пачопка Б. 118, 132, 286
Пачопка Я. 70, 81, 139, 291, 319, 322, 347, 356, 360, 378
Петрашэвіч В. 101
Петрашэвіч Я. 136, 305, 400
Петрыкевіч М. 108, 109
Пецюкевіч М. 102, 103, 135, 212, 289, 375
Пецюкевіч У. 334
Пісьмянкоў А. 230
Плятэры 251
Пратасеня І. 237
Прашковіч М. 97
Пушкін А. 215
Пярова М. 376
Пяткевіч А. 136, 152, 268, 181, 184, 186, 189, 200, 204, 211, 215, 220, 227, 232, 238, 259, 262, 385, 410
Пятровіч С. 116, 178
Пячэньнікаў В. 376

Р

Равенскі М. 86
Радзевіч М. 85

Радзівіл М. 47
Разанаў А. 124, 161, 169, 212, 284
Ракіцкі У. 290, 291, 396
Рак-Міхайлоўскі С. 54, 55, 60, 69, 70-72, 74-76, 111, 119, 178, 179, 183, 258, 273, 279, 411
Рамановіч Я. 131
Раманюк М. 210
Раткевіч Я. 40, 43
Родзевіч Л. 46, 155
Родзька В. 118
Роп Э. 147
Русецкі В. 33, 38, 77, 310, 311
Рыбікаўскас Ё. 182
Рылко М. 123, 124, 127-129
Рэзаўскі Л. 61
Рэпух Ф. 17
Рэшатаў У. 70

С

Сабалеўскі А. 115
Сабалеўскі Ю. 74
Сагановіч Г. 348, 392, 415
Садоўская Э. 10
Садоўскі П. 409
Садоўскі Я. 385, 404, 408
Сакалова-Лекант А. 309
Сакалоўская Г. 60
Салавей Р. 81
Саламевіч Я. 11, 89, 90, 96, 116, 132, 133, 138, 144, 148, 153, 158, 167, 180, 188, 193-195, 199, 201, 212, 217, 242, 255, 266, 280, 308, 321, 333, 353, 354, 357, 358, 378, 379, 407, 414
Салянка Г. 17, 19, 116, 309
Салянка М. 17, 19, 116
Самойла У. 105, 107
Самуйлёнак М. 300
Сапач Т. 365
Сваяк К. 192, 309, 416
Семашкевіч Р. 89, 113
Серада І. 61, 185
Сергіевіч П. 99-103, 106, 108, 109, 156, 181, 205, 208, 210, 223, 316
Сівіцкая М. 13, 14, 198, 258, 385
Сівіцкая Р. 65
Сівіцкая Э. 38, 44
Сівіцкі А. 10, 67, 114, 404, 405
Сівіцкі М. 13, 198, 258, 385
Сідаровіч М. 250, 259, 325, 345
Сіняўскі М. 79
Скалабан В. 225, 233, 238, 241, 245, 289, 313, 398, 416, 417

Скарына Ф. 218
Скарынкін У.254, 270, 290, 315, 334
Скірмунт Р. 47, 48, 50, 51, 54
Скрыган Я. 223, 314, 318
Славацкі Ю. 27
Славінскі Л. 26, 129
Сматрыцкі М. 106
Смоліч Ал. 101, 111, 121, 125, 183, 185, 258, 293, 311
Смоліч Ар. 26-28, 30, 32, 34, 39-41, 44, 45, 47, 49-52, 54, 61, 63, 121, 133, 184, 216, 315, 352, 371, 394
Снапко Ю. 22, 144, 150
Сьнечкус А. 173
Содаль У. 151, 177, 179, 184, 190, 194, 211, 213, 223, 246, 297, 299, 301, 317, 322, 363, 378, 407
Сталыгвы 26, 46, 48, 309
Станкевіч С. 69, 70, 192, 358
Станкевіч У. 123, 127
Станкевіч Я. 50, 52, 57, 97
Сташкевіч М. 310, 323, 373, 375, 388, 390, 393, 398, 408, 413
Стома М. 337, 357, 366, 368, 376, 395, 403
Стэповіч А. 75, 389
Стэх В. 214-217, 328, 339, 343, 371, 372, 374, 376, 394, 403
Сурмач Г. 314, 349, 351, 387
Сыракомля У. 10, 113, 137, 293, 298
Сыс А. 327, 367

Т

Табэрка А. 26, 28
Тальгэйм А. 65, 399, 400
Талстой Л. 43, 86, 261
Тамашчык П. 111, 253
Танк М. 182, 223, 224, 234, 263, 412
Таранда М. 216, 321. 327, 362, 364, 375, 377, 382, 385, 395, 397
Тарасік В. 316
Тарашкевіч Б. 25, 48, 50-52, 54, 107, 116, 148, 155, 156, 171, 173, 202, 235, 345, 372
Татарын С. 74, 174
Траяноўскі А. 268
Трэпка А. 107
Тулейка М. 76, 79, 80, 83
Тулейка Я. 356, 403
Тумас Г. 292
Тумаш В. 11, 65, 82, 177, 184
Туронак Ю. 154, 158, 160, 164, 179, 180, 204, 207, 348

У

Украінка Л. 205

Уласаў А. 20, 32, 33, 38, 39, 44, 55, 60, 68, 201, 312, 342
Улашчык М. 96, 311, 341, 342, 347, 356, 360, 376, 407

Ф

Фалееў В. 202
Фальскі У. 33-36, 38-41, 44, 49, 50, 54, 58, 62, 176, 349, 352
Фарботка Я. 44, 129, 315
Федароўскі М. 17, 28, 89, 118, 252
Федарук А. 294

Х

Хвораст Я. 82, 86, 92, 94, 95, 160, 173, 178, 181, 184, 186-188, 191, 197, 206, 235, 257, 270
Хлявінскі 67
Хомка А. 318

Ц

Цат-Мацкевіч В. 99
Цьвірка К. 260, 359
Целеш В. 201, 205, 246-249, 288, 403
Цётка 129, 132, 146, 148, 337, 339, 340
Цітовіч Г. 235, 272
Цярохін С. 302, 350, 355

Ч

Чавусаў В. 33, 34, 44, 50
Чарапук Я. 25, 29, 323, 415, 418
Чарвякоў А. 60, 62, 416
Чаржынскі У. 25, 60, 226, 227
Чаркасава Дз. 253, 257, 259, 260
Чарэп Л. 68
Чурлёніс М. 405
Чыгрын І. 334
Чыжоў А. 327
Чырскі У. 56

Ш

Шалкевіч В. 343
Шантыр А. 96, 98, 134, 309
Шантыр Ф. 36, 39, 40, 44, 46, 47, 54, 56, 57, 59, 62, 63, 169, 176, 219, 302. 323, 352,

353, 378
Шапіра Л. 191
Шаўцоў П. 126
Шахматаў А. 52
Швэд В. 88
Шнаркевіч Н. 76, 90, 91, 97, 101, 102, 104, 106, 108, 109, 121, 125, 224
Шнаркевіч Я. 76, 78, 121, 125, 331, 332, 334, 347, 356, 369
Шунейка Я. 290-292, 294, 297, 301, 305, 362, 365, 396
Шутовіч М. 91, 106
Шутовіч Я. 105, 110, 124, 156, 161, 164, 191
Шушкевіч С. 89, 280, 318, 365
Шыдлоўская П. 59
Шыдлоўскі А. 235, 257
Шыдлоўскі Я. 19, 35, 255
Шыла М. 55, 70, 302, 309, 310
Шырма Р. 85, 86, 116, 126, 144, 166, 169, 170, 235, 270
Шышэя К. 88, 122, 134
Шышэя Л. 88, 122
Шэгідзевіч А. 17
Шэлека Я. 69

Э

Эйсмант Ф. 17, 115
Энгельс Ф. 243
Эпімах-Шыпіла Б. 24, 46, 52, 89, 113, 129

Я

Явар М. 102
Ягоўдзік У. 276, 381, 384
Ядвігін Ш. 33-40, 43, 55, 56, 58, 63, 64, 77, 90, 102, 105, 111, 129, 131, 132, 139, 148, 149, 151, 173, 196, 203, 205, 211, 224, 314
Якавенка В. 123
Янкоўскі А. 173
Янкоўскі М. 18
Янкоўскі Ф. 177, 179, 180, 184, 203, 211, 212, 276, 330, 346, 360
Янушкевіч В. 337
Янушкевіч Я. 416
Ярэміч Ф. 75, 119
Яфіменка В. 327, 365, 374

ЗЬМЕСТ

Міхась Скобла. А думкі ляцелі ў Гародню 5

Аўтабіяграфія 10

УСПАМІНЫ 13
Старое Гродна 13
Гродзенскі гурток беларускай моладзі 16
Дзесяць месяцаў у Варшаве і пачатак вайны 26
Праца ў Таварыстве помачы ахвярам вайны і дзіцячых прытулках 32
Пяць месяцаў у Менску 40
Падарожа ў Пецярбург і менская батлейка 45
Менскія зьезды 47
Розныя бежанцы і Фабіян Шантыр 57
Вір грамадзкага жыцьця 59
Апошні год у Менску 62
Пяць гадоў у Альхоўніках 64
Вільня 68
Шлюб з Антонам Войцікам і пераезд у Чыгуначную калёнію 73
Таварыства “Пчала” і часопіс “Беларуская борць 76

ЛІСТЫ 87

1. Ларысе Геніюш. 28 мая 1967 г. 87
2. Ларысе Геніюш. 12 чэрвеня 1967 г. 87
3. Ларысе Геніюш. 25 жніўня 1967 г. 88
4. Ларысе Геніюш. 17 верасьня 1967 г. 89
5. Арсеню Лісу. 2 сакавіка 1968 г. 92
6. Яўгену Петрашэвічу. 2 верасьня 1968 г. 92
7. Яўгену Петрашэвічу. 23 кастрычніка 1968 г. 93
8. Яўгену Петрашэвічу. 29 лістапада 1968 г. 95
9. Ларысе Геніюш. 2 лютага 1969 г. 96
10. Ларысе Геніюш. 26 сакавіка 1969 г. 97
11. Ларысе Геніюш. [1969 г.] 99
12. Алесю Белакозу. 26 студзеня 1970 г. 101
13. Алесю Белакозу. 2 лютага 1970 г. 102
14. Алесю Белакозу. 21 сакавіка 1970 г. 102
15. Алесю Белакозу. 6 мая 1970 г. 103
16. Алесю Белакозу. 11 мая 1970 г. 104
17. Алесю Белакозу. 20 чэрвеня 1970 г. 104
18. Адаму Мальдзісу. 29 чэрвеня 1970 г. 105
19. Адаму Мальдзісу. 9 ліпеня 1970 г. 106
20. Алесю Белакозу. 14 ліпеня 1970 г. 106
21. Адаму Мальдзісу. 23 ліпеня 1970 г. 107

22. Адаму Мальдзісу. 19 лістапада 1970 г. 107
23. Ларысе Геніюш. 26 лістапада 1970 г. 108
24. Адаму Мальдзісу. 3 сьнежня 1970 г. 108
25. Ларысе Геніюш. 10 сьнежня 1970 г. 109
26. Яўгену Петрашэвічу. [1970 г.] 110
27. Аляксею Пяткевічу. [1970 г.] 110
28. Аляксею Пяткевічу. 18 лістапада 1971 г. 111
29. Аляксею Пяткевічу. 14 сьнежня 1971 г. 112
30. Аляксею Пяткевічу. 16 студзеня 1972 г. 114
31. Аляксею Пяткевічу. 14 лютага 1972 г. 116
32. Аляксею Пяткевічу. 3 красавіка 1972 г. 118
33. Аляксею Пяткевічу. 30 лістапада 1972 г. 120
34. Аляксею Пяткевічу. 2 лютага 1973 г. 121
35. Аляксею Пяткевічу. 25 лістапада 1973 г. 123
36. Адаму Мальдзісу. 10 студзеня 1975 г. 124
37. Адаму Мальдзісу. 17 студзеня 1975 г. 126
38. Ларысе Геніюш. 8 красавіка 1975 г. 127
39. Янку Саламевічу. 19 кастрычніка 1975 г. 128
40. Уладзіміру Ягоўдзіку. 1 лістапада 1975 г. 130
41. Аляксею Анішчыку. 12 лютага 1976 г. 131
42. Адаму Мальдзісу. 14 лютага 1976 г. 131
43. Аляксею Пяткевічу. 16 лістапада 1976 г. 132
44. Янку Саламевічу. 22 сьнежня 1976 г. 133
45. Янку Саламевічу. 1 студзеня 1977 г. 134
46. Яўгену Петрашэвічу. 27 студзеня 1977 г. 134
47. Ларысе Геніюш. 30 студзеня 1977 г. 134
48. Уладзіміру Ягоўдзіку. 17 лютага 1977 г. 135
49. Ларысе Геніюш. 23 лютага 1977 г. 136
50. Адаму Мальдзісу. 24 красавіка 1977 г. 137
51. Адаму Мальдзісу. 3 чэрвеня 1977 г. 138
52. Уладзіміру Ягоўдзіку. 15 ліпеня 1977 г. 139
53. Адаму Мальдзісу. 22 ліпеня 1977 г. 140
54. Уладзіміру Ягоўдзіку. 12 жніўня 1977 г. 140
55. Адаму Мальдзісу. 26 лістапада 1977 г. 141
56. Уладзіміру Ягоўдзіку. 9 сьнежня 1977 г. 141
57. Адаму Мальдзісу. 12 сьнежня 1977 г. 142
58. Янку Саламевічу. 14 студзеня 1978 г. 142
59. Адаму Мальдзісу. 25 лютага 1978 г. 143
60. Янку Саламевічу. 29 лютага 1978 г. 143
61. Аляксею Пяткевічу. 26 сакавіка 1978 г. 144
62. Адаму Мальдзісу. 28 сакавіка 1978 г. 145
63. Уладзіміру Ягоўдзіку. 29 сакавіка 1978 г. 145
64. Адаму Мальдзісу. 11 мая 1978 г. 146
65. Адаму Мальдзісу. 3 чэрвеня 1978 г. 147
66. Фёдару Ігнатовічу. 17 ліпеня 1978 г. 148
67. Фёдару Ігнатовічу. 30 ліпеня 1978 г. 149
68. Аляксею Пяткевічу. 8 жніўня 1978 г. 150
69. Аляксею Пяткевічу. 15 верасьня 1978 г. 150

70. Фёдару Ігнатовічу. 20 верасьня 1978 г. 151
71. Уладзіміру Ягоўдзіку. 21 кастрычніка 1978 г. 153
72. Аляксею Пяткевічу. 23 кастрычніка 1978 г. 154
73. Мікалаю Марцінчыку. 25 кастрычніка 1978 г. 155
74. Мікалаю Марцінчыку. 30 кастрычніка 1978 г. 155
75. Адаму Мальдзісу. 4 лютага 1979 г. 157
76. Фёдару Ігнатовічу. 21 лютага 1979 г. 157
77. Янку Саламевічу. 28 лютага 1979 г. 158
78. Аляксею Пяткевічу. [Люты 1979 г.] 158
79. Аляксею Пяткевічу. 15 сакавіка 1979 г. 159
80. Янку Саламевічу. [redacted] красавіка 1979 г. 160
81. Адаму Мальдзісу. 12 мая 1979 г. 161
82. Фёдару Ігнатовічу. 14 мая 1979 г. 162
83. Фёдару Ігнатовічу. 26 мая 1979 г. 163
84. Адаму Мальдзісу. 10 чэрвеня 1979 г. 164
85. Фёдару Ігнатовічу. 16 чэрвеня 1979 г. 165
86. Адаму Мальдзісу. 5 ліпеня 1979 г. 166
87. Адаму Мальдзісу. 23 ліпеня 1979 г. 167
88. Фёдару Ігнатовічу. 10 жніўня 1979 г. 168
89. Адаму Мальдзісу. 19 верасьня 1979 г. 168
90. Мікалаю Марцінчыку. 1 кастрычніка 1979 г. 170
91. Аляксею Пяткевічу. 28 кастрычніка 1979 г. 171
92. Мікалаю Марцінчыку. 8 лістапада 1979 г. 172
93. Мікалаю Марцінчыку. 15 лістапада 1979 г. 174
94. Фёдару Ігнатовічу. 11 сьнежня 1979 г. 175
95. Адаму Мальдзісу. 27 сьнежня 1979 г. 176
96. Мікалаю Марцінчыку. 19 студзеня 1980 г. 177
97. Аляксею Пяткевічу. 20 студзеня 1980 г. 178
98. Мікалаю Марцінчыку. 30 студзеня 1980 г. 179
99. Дануце Бічэль. 1 лютага 1980 г. 181
100. Дануце Бічэль. 2 лютага 1980 г. 181
101. Аляксею Пяткевічу. 9 лютага 1980 г. 183
102. Дануце Бічэль. 4 сакавіка 1980 г. 184
103. Мікалаю Марцінчыку. 10 сакавіка 1980 г. 184
104. Ларысе Геніюш. 17 сакавіка 1980 г. 185
105. Ларысе Геніюш. 24 сакавіка 1980 г. 187
106. Дануце Бічэль. 6 мая 1980 г. 187
107. Дануце Бічэль. 11 мая 1980 г. 188
108. Дануце Бічэль. 5 чэрвеня 1980 г. 189
109. Уладзіміру Ягоўдзіку. 17 чэрвеня 1980 г. 190
110. Дануце Бічэль. 26 чэрвеня 1980 г. 191
111. Адаму Мальдзісу. 4 ліпеня 1980 г. 192
112. Дануце Бічэль. 15 ліпеня 1980 г. 193
113. Адаму Мальдзісу. 31 ліпеня 1980 г. 195
114. Дануце Бічэль. 2 жніўня 1980 г. 195
115. Дануце Бічэль. 15 жніўня 1980 г. 196
116. Дануце Бічэль. 4 верасьня 1980 г. 197
117. Вячку Целешу. 14 верасьня 1980 г. 198

118. Вячку Целешу. 15 верасьня 1980 г. 199
119. Вячку Целешу. 14 кастрычніка 1980 г. 199
120. Аляксею Пяткевічу. 20 кастрычніка 1980 г. 200
121. Дануце Бічэль. 30 кастрычніка 1980 г. 202
122. Дануце Бічэль. 27 лістапада 1980 г. 203
123. Вячку Целешу. 3 сьнежня 1980 г. 204
124. Дануце Бічэль. 17 сьнежня 1980 г. 205
125. Дануце Бічэль. [1980 г.] 206
126. Дануце Бічэль. [1980 г.] 206
127. Вячку Целешу. 14 студзеня 1981 г. 207
128. Дануце Бічэль. 16 студзеня 1981 г. 207
129. Дануце Бічэль. 1 лютага 1981 г. 208
130. Дануце Бічэль. 19 лютага 1981 г. 209
131. Дануце Бічэль. 1 сакавіка 1981 г. 210
132. Дануце Бічэль. 19 сакавіка 1981 г. 211
133. Адаму Мальдзісу. 29 сакавіка 1981 г. 212
134. Дануце Бічэль. 5 красавіка 1981 г. 212
135. Ларысе Геніюш. 11 красавіка 1981 г. 213
136. Дануце Бічэль. 22 мая 1981 г. 214
137. Аляксею Пяткевічу. 24 мая 1981 г. 215
138. Вячку Целешу. 3 чэрвеня 1981 г. 217
139. Вячку Целешу. 7 чэрвеня 1981 г. 218
140. Вячку Целешу. 21 чэрвеня 1981 г. 218
141. Адаму Мальдзісу. 21 чэрвеня 1981 г. 218
142. Дануце Бічэль. 21 чэрвеня 1981 г. 219
143. Дануце Бічэль. 19 жніўня 1981 г. 220
144. Дануце Бічэль. 10 кастрычніка 1981 г. 220
145. Вячку Целешу. 14 кастрычніка 1981 г. 220
146. Вячку Целешу. 14 кастрычніка 1981 г. 221
147. Дануце Бічэль. 31 кастрычніка 1981 г. 221
148. Дануце Бічэль. 10 лістапада 1981 г. 222
149. Адаму Мальдзісу. 25 лістапада 1981 г. 223
150. Ларысе Геніюш. 30 лістапада 1981 г. 224
151. Дануце Бічэль. 3 сьнежня 1981 г. 225
152. Аляксею Пяткевічу. 1 студзеня 1982 г. 225
153. Дануце Бічэль. 12 студзеня 1982 г. 227
154. Дануце Бічэль. 19 студзеня 1982 г. 228
155. Аляксею Пяткевічу. 21 студзеня 1982 г. 229
156. Аляксею Пяткевічу. 24 студзеня 1982 г. 229
157. Аляксею Пяткевічу. 1 лютага 1982 г. 229
158. Дануце Бічэль. 10 лютага 1982 г. 231
159. Дануце Бічэль. 17 лютага 1982 г. 232
160. Аляксею Пяткевічу. 21 лютага 1982 г. 232
161. Дануце Бічэль. 23 лютага 1982 г. 233
162. Аляксею Пяткевічу. 15 сакавіка 1982 г. 234
163. Дануце Бічэль. 22 сакавіка 1982 г. 235
164. Дануце Бічэль. 31 сакавіка 1982 г. 236
165. Дануце Бічэль. 4 красавіка 1982 г. 237

166. Вячку Целешу. 14 красавіка 1982 г. 237
167. Дануце Бічэль. 14 красавіка 1982 г. 238
168. Дануце Бічэль. 20 красавіка 1982 г. 238
169. Дануце Бічэль. 26 красавіка 1982 г. 239
170. Дануце Бічэль. 4 мая 1982 г. 239
171. Дануце Бічэль. 3 чэрвеня 1982 г. 240
172. Аляксею Пяткевічу. 6 чэрвеня 1982 г. 240
173. Аляксею Пяткевічу. 29 чэрвеня 1982 г. 241
174. Ларысе Геніюш. 5 жніўня 1982 г. 243
175. Уладзіміру Ягоўдзіку. 5 жніўня 1982 г. 244
176. Дануце Бічэль. 11 жніўня 1982 г. 244
177. Аляксею Пяткевічу. 29 жніўня 1982 г. 245
178. Аляксею Пяткевічу. 22 верасьня 1982 г. 246
179. Дануце Бічэль. 9 кастрычніка 1982 г. 247
180. Дануце Бічэль. 24 кастрычніка 1982 г. 247
181. Ларысе Геніюш. 8 лістапада 1982 г. 248
182. Аляксею Пяткевічу. 12 лістапада 1982 г. 250
183. Дануце Бічэль. 30 лістапада 1982 г. 251
184. Аляксею Пяткевічу. 14 сьнежня 1982 г. 252
185. Аляксею Пяткевічу. 4 студзеня 1983 г. 252
186. Аляксею Пяткевічу. 10 студзеня 1983 г. 253
187. Аляксею Пяткевічу. 23 студзеня 1983 г. 254
188. Ларысе Геніюш. 25 студзеня 1983 г. 256
189. Аляксею Пяткевічу. 7 лютага 1983 г. 257
190. Алесю Белакозу. 14 лютага 1983 г. 259
191. Аляксею Пяткевічу. 1 сакавіка 1983 г. 260
192. Дануце Бічэль. 14 сакавіка 1983 г. 261
193. Адаму Мальдзісу. 18 сакавіка 1983 г. 261
194. Яўгену Петрашэвічу. 23 сакавіка 1983 г. 262
195. Дануце Бічэль. [Сакавік 1983 г.] 262
196. Дануце Бічэль. [Сакавік 1983 г.] 262
197. Аляксею Пяткевічу. 7 красавіка 1983 г. 262
198. Аляксею Пяткевічу. 19 красавіка 1983 г. 263
199. Аляксею Пяткевічу. 4 мая 1983 г. 264
200. Дануце Бічэль. 9 мая 1983 г. 265
201. Дануце Бічэль. 26 мая 1983 г. 265
202. Аляксею Пяткевічу. 10 чэрвеня 1983 г. 266
203. Дануце Бічэль. 28 чэрвеня 1983 г. 267
204. Уладзіміру Ягоўдзіку. 1 ліпеня 1983 г. 268
205. Аляксею Пяткевічу. 31 ліпеня 1983 г. 269
206. Дануце Бічэль. 31 ліпеня 1983 г. 270
207. Дануце Бічэль. 14 верасьня 1983 г. 270
208. Уладзіміру Ягоўдзіку. 20 верасьня 1983 г. 271
209. Аляксею Пяткевічу. 6 кастрычніка 1983 г. 272
210. Дануце Бічэль. 23 кастрычніка 1983 г. 272
211. Аляксею Пяткевічу. 26 кастрычніка 1983 г. 273
212. Дануце Бічэль. 30 кастрычніка 1983 г. 274
213. Дануце Бічэль. 7 лістапада 1983 г. 275

214. Дануце Бічэль. 19 лістапада 1983 г. ... 275
215. Адаму Мальдзісу. 20 лістапада 1983 г. ... 276
216. Уладзіміру Ягоўдзіку. 5 сьнежня 1983 г. ... 277
217. Дануце Бічэль. 6 сьнежня 1983 г. ... 277
218. Дануце Бічэль. 26 сьнежня 1983 г. ... 278
219. Аляксею Пяткевічу. 6 студзеня 1984 г. ... 279
220. Дануце Бічэль. 14 студзеня 1984 г. ... 280
221. Дануце Бічэль. 20 студзеня 1984 г. ... 282
222. Аляксею Пяткевічу. 23 студзеня 1984 г. ... 282
223. Дануце Бічэль. 25 студзеня 1984 г. ... 284
224. Дануце Бічэль. 26 студзеня 1984 г. ... 285
225. Дануце Бічэль. 6 лютага 1984 г. ... 286
226. Дануце Бічэль. 14 лютага 1984 г. ... 287
227. Дануце Бічэль. 29 лютага 1984 г. ... 288
228. Дануце Бічэль. [Люты 1984 г.] ... 288
229. Дануце Бічэль. 12 красавіка 1984 г. ... 289
230. Дануце Бічэль. 23 мая 1984 г. ... 290
231. Алесю Белакозу. 17 чэрвеня 1984 г. ... 290
232. Дануце Бічэль. 1 ліпеня 1984 г. ... 291
233. Уладзіміру Ягоўдзіку. 12 ліпеня 1984 г. ... 292
234. Дануце Бічэль. 14 ліпеня 1984 г. ... 293
235. Дануце Бічэль. 19 жніўня 1984 г. ... 294
236. Адаму Мальдзісу. 23 жніўня 1984 г. ... 294
237. Алесю Белакозу. 31 жніўня 1984 г. ... 295
238. Алесю Белакозу. 21 верасьня 1984 г. ... 296
239. Алесю Белакозу. 28 верасьня 1984 г. ... 297
240. Адаму Мальдзісу. 7 лістапада 1984 г. ... 298
241. Алесю Белакозу. 7 сьнежня 1984 г. ... 299
242. Дануце Бічэль. 25 студзеня 1985 г. ... 300
243. Алесю Белакозу. 3 лютага 1985 г. ... 301
244. Янку Саламевічу. 9 лютага 1985 г. ... 302
245. Алесю Белакозу. 14 мая 1985 г. ... 303
246. Дануце Бічэль. 31 мая 1985 г. ... 304
247. Аляксею Пяткевічу. 19 чэрвеня 1985 г. ... 305
248. Уладзіміру Ягоўдзіку. 22 ліпеня 1984 г. ... 306
249. Алесю Белакозу. 26 жніўня 1985 г. ... 307
250. Аляксею Пяткевічу. 3 верасьня 1985 г. ... 308
251. Адаму Мальдзісу. 16 лістапада 1985 г. ... 309
252. Адаму Мальдзісу. 21 лістапада 1984 г. ... 310
253. Аляксею Пяткевічу. 14 сьнежня 1985 г. ... 310
254. Дануце Бічэль. 16 студзеня 1986 г. ... 312
255. Аляксею Пяткевічу. 22 студзеня 1986 г. ... 312
256. Дануце Бічэль. 29 студзеня 1986 г. ... 313
257. Аляксею Пяткевічу. 29 студзеня 1986 г. ... 314
258. Дануце Бічэль. 17 лютага 1986 г. ... 316
259. Аляксею Пяткевічу. 5 сакавіка 1986 г. ... 317
260. Адаму Мальдзісу. 6 сакавіка 1986 г. ... 319
261. Аляксею Пяткевічу. 10 сакавіка 1986 г. ... 319

262. Міхасю Верацілу. 20 сакавіка 1986 г. 320
263. Аляксею Пяткевічу. 31 сакавіка 1986 г. 320
264. Міхасю Верацілу. 15 красавіка 1986 г. 322
265. Аляксею Пяткевічу. 17 красавіка 1986 г. 322
266. Аляксею Пяткевічу. 19 красавіка 1986 г. 323
267. Аляксею Пяткевічу. 25 красавіка 1986 г. 324
268. Аляксею Пяткевічу. 28 красавіка 1986 г. 324
269. Аляксею Пяткевічу. 30 красавіка 1986 г. 326
270. Дануце Бічэль. [Красавік 1986 г.] 327
271. Аляксею Пяткевічу. 1 мая 1986 г. 328
272. Міхасю Верацілу. 12 мая 1986 г. 328
273. Аляксею Пяткевічу. 14 мая 1986 г. 329
274. Міхасю Верацілу. 18 мая 1986 г. 330
275. Аляксею Пяткевічу. 25 мая 1986 г. 330
276. Дануце Бічэль. 11 чэрвеня 1986 г. 331
277. Аляксею Пяткевічу. 15 чэрвеня 1986 г. 332
278. Міколу Таранду. 7 ліпеня 1986 г. 332
279. Аляксею Пяткевічу. 21 ліпеня 1986 г. 333
280. Дануце Бічэль. 23 ліпеня 1986 г. 334
281. Міколу Таранду. 6 жніўня 1986 г. 334
282. Дануце Бічэль. 12 жніўня 1986 г. 335
283. Дануце Бічэль. 25 жніўня 1986 г. 336
284. Аляксею Пяткевічу. 3 верасьня 1986 г. 336
285. Аляксею Пяткевічу. 12 верасьня 1986 г. 338
286. Міколу Таранду. 7 верасьня 1986 г. 338
287. Дануце Бічэль. 7 кастрычніка 1986 г. 339
288. Міколу Таранду. 14 сьнежня 1986 г. 341
289. Сябрам клюбу “Паходня”. 27 сьнежня 1986 г. 342
290. Міколу Таранду. 27 сьнежня 1986 г. 342
291. Аляксею Пяткевічу. 27 сьнежня 1986 г. 344
292. Аляксею Пяткевічу. [Сьнежань 1986 г.] 344
293. Дануце Бічэль. [1986 г.] 344
294. Дануце Бічэль. [1986 г.] 345
295. Міколу Таранду. 25 студзеня 1987 г. 346
296. Адаму Мальдзісу. 26 студзеня 1987 г. 347
297. Аляксею Пяткевічу. 3 лютага 1987 г. 349
298. Яўгену Петрашэвічу. 6 лютага 1987 г. 349
299. Арсеню Лісу. 8 лютага 1987 г. 350
300. Аляксею Пяткевічу. 9 лютага 1987 г. 351
301. Вячку Целешу. 12 лютага 1987 г. 353
302. Міхасю Верацілу. 12 лютага 1987 г. 354
303. Арсеню Лісу. 14 лютага 1987 г. 354
304. Міколу Таранду. 21 лютага 1987 г. 356
305. Адаму Мальдзісу. 24 лютага 1987 г. 357
306. Аляксею Пяткевічу. 2 сакавіка 1987 г. 358
307. Адаму Мальдзісу. 8 сакавіка 1987 г. 360
308. Міколу Таранду. 19 сакавіка 1987 г. 360
309. Дануце Бічэль. 29 сакавіка 1987 г. 361

310. Міколу Таранду. 29 сакавіка 1987 г. ... 362
311. Аляксею Пяткевічу. 30 сакавіка 1987 г. ... 363
312. Дануце Бічэль. 3 красавіка 1987 г. ... 364
313. Дануце Бічэль. 11 красавіка 1987 г. ... 365
314. Міколу Таранду. 17 красавіка 1987 г. ... 366
315. Міколу Таранду. 28 красавіка 1987 г. ... 367
316. Дануце Бічэль. 10 мая 1987 г. ... 368
317. Міколу Таранду. 10 мая 1987 г. ... 369
318. Вячку Целешу. 16 мая 1987 г. ... 369
319. Адаму Мальдзісу. 19 мая 1987 г. ... 370
320. Міколу Таранду. 19 мая 1987 г. ... 370
321. Адаму Мальдзісу. 1 чэрвеня 1987 г. ... 372
322. Міколу Таранду. 3 чэрвеня 1987 г. ... 372
323. Міколу Таранду. 14 чэрвеня 1987 г. ... 373
324. Адаму Мальдзісу. 1 ліпеня 1987 г. ... 374
325. Дануце Бічэль. 14 ліпеня 1987 г. ... 375
326. Міколу Таранду. 17 ліпеня 1987 г. ... 375
327. Дануце Бічэль. 21 ліпеня 1987 г. ... 376
328. Дануце Бічэль. 25 жніўня 1987 г. ... 377
329. Адаму Мальдзісу. 3 верасьня 1987 г. ... 378
330. Аляксею Пяткевічу. 3 верасьня 1987 г. ... 378
331. Адаму Мальдзісу. 12 верасьня 1987 г. ... 379
332. Аляксею Пяткевічу. 17 верасьня 1987 г. ... 379
333. Міколу Таранду. 5 кастрычніка 1987 г. ... 380
334. Дануце Бічэль. 10 кастрычніка 1987 г. ... 380
335. Аляксандру Госьцеву. 16 кастрычніка 1987 г. ... 381
336. Алесю Белакозу. 18 кастрычніка 1987 г. ... 382
337. Аляксею Пяткевічу. 19 кастрычніка 1987 г. ... 383
338. Дануце Бічэль. 21 кастрычніка 1987 г. ... 384
339. Аляксандру Госьцеву. 31 кастрычніка 1987 г. ... 384
340. Аляксандру Госьцеву. 5 лістапада 1987 г. ... 385
341. Міколу Таранду. 7 лістапада 1987 г. ... 386
342. Дануце Бічэль. 12 лістапада 1987 г. ... 387
343. Аляксею Пяткевічу. 14 лістапада 1987 г. ... 388
344. Аляксандру Госьцеву. 15 лістапада 1987 г. ... 390
345. Міколу Таранду. 26 лістапада 1987 г. ... 390
346. Міколу Таранду. 29 лістапада 1987 г. ... 391
347. Аляксандру Госьцеву. 9 сьнежня 1987 г. ... 391
348. Міколу Таранду. 14 сьнежня 1987 г. ... 392
349. Міколу Таранду. 23 сьнежня 1987 г. ... 393
350. Адаму Мальдзісу. [1987 г.] ... 393
351. Аляксею Пяткевічу. [1987 г.] ... 394
352. Адаму Мальдзісу. [1987 г.] ... 395
353. Міколу Таранду. 2 студзеня 1988 г. ... 395
354. Аляксею Пяткевічу. 3 студзеня 1988 г. ... 396
355. Аляксею Пяткевічу. 4 студзеня 1988 г. ... 398
356. Аляксандру Госьцеву. 9 студзеня 1988 г. ... 398
357. Дануце Бічэль. 11 студзеня 1988 г. ... 399

358. Аляксандру Госьцеву. 17 студзеня 1988 г. 400
359. Дануце Бічэль. 23 студзеня 1988 г. 400
360. Міколу Таранду. 27 студзеня 1988 г. 401
361. Аляксею Пяткевічу. 29 студзеня 1988 г. 402
362. Аляксандру Госьцеву. 29 студзеня 1988 г. 403
363. Міколу Таранду. 9 лютага 1988 г. 405
364. Аляксандру Госьцеву. 10 лютага 1988 г. 405
365. Аляксею Пяткевічу. 18 лютага 1988 г. 406
366. Аляксею Пяткевічу. 19 лютага 1988 г. 407
367. Аляксею Пяткевічу. 12 сакавіка 1988 г. 407
368. Дануце Бічэль. 20 сакавіка 1988 г. 409
369. Міколу Таранду. 27 сакавіка 1988 г. 409
370. Удзельнікам літаратурнага гуртка “Вянок”. 28 сакавіка 1988 г. 409
371. Дануце Бічэль. 3 красавіка 1988 г. 410
372. Міколу Таранду. 10 красавіка 1988 г. 410
373. Дануце Бічэль. 19 красавіка 1988 г. 412
374. Дануце Бічэль. [1988 г.] 413
375. Дануце Бічэль. 27 красавіка 1988 г. 413
376. Аляксандру Госьцеву. 28 красавіка 1988 г. 414
377. Аляксею Пяткевічу. 23 чэрвеня 1988 г. 414
378. Дануце Бічэль. [Чэрвень 1988 г.] 415
379. Аляксею Пяткевічу. 30 ліпеня 1988 г. 416
380. Аляксею Пяткевічу. 11 жніўня 1988 г. 416
381. Дануце Бічэль. [Лета 1988 г.] 417
382. Аляксею Пяткевічу. 8 верасьня 1988 г. 417
383. Аляксею Анішчыку. 12 кастрычніка 1988 г. 418
384. Міколу Таранду. 27 сьнежня 1988 г. 418
385. Аляксею Пяткевічу. 17 ліпеня 1989 г. 418
386. Вячку Целешу. 24 ліпеня 1989 г. 419

КАМЭНТАР 420

ІМЕННЫ ПАКАЗЬНІК 455

Кніжная серыя **"ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА"** заснавана ў 2006 годзе жыхарамі Гродна. Мы вырашылі з дапамогай інтэлектуальнага набытку нашых продкаў і сучаснікаў абараніць наш горад ад бульдозернай "рэканструкцыі". Гістарычныя і культурныя вартасці, створаныя жыхарамі Гродна розных нацыянальнасцяў, ва ўсе часы мелі вялікае значэнне для гісторыі Беларусі і нашага рэгіёна Еўропы, працягвалі найлепшыя еўрапейскія традыцыі і мелі ўплыў на фармаванне дэмакратычнай свядомасці насельніцтва горада.

На гэты час у **"ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ"** пабачылі свет больш за 20 выданняў. Гэта гістарычныя манаграфіі, біяграфіі і мемуары, эпісталярная спадчына, гістарычная і сучасная проза, даведнікі па Гродна. Аўтарамі **"ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ"** з'яўляюцца выбітныя асобы, таленавітыя навукоўцы, руплівыя даследчыкі, адданыя гэтай зямлі людзі.

Кожная чарговая кніга серыі **"ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА"** прысвячаецца той Гародні, якой мы ганарымся.

Выйшлі з друку:

Юры ГАРДЗЕЕЎ "Магдэбургская Гародня"
Данута БІЧЭЛЬ "Хадзі на мой голас"
Пётр СЯЎРУК "Небыцця не існуе. Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху"
Аляксей КАРПЮК "Развітанне з ілюзіямі"
"Зрабаваны народ. Размовы з беларускімі інтэлектуаламі"
Алесь КРАЎЦЭВІЧ "Рыцары і дойліды Гародні"
Сяргей ШАПРАН "Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця" Т. 1-2
Гарадзенскі палімпсест 2008
Гарадзенскі палімпсест 2009
Гарадзенскі палімпсест 2010
Апанас ЦЫХУН "...Улюбёны я ў сваю зямлю"
Віктар ШАЛКЕВІЧ "Рэквіем па непатрэбных рэчах"
Дзмітры ЛЮЦІК "Нёманскі Фронт. 12-25 ліпеня 1944 года. Баі за Гродна ў данясеннях, успамінах, статыстыцы"
Васіль БЫКАЎ. "Гарадзенскі архіў: Невядомыя творы (1957—1972). Незавершанае. Нататнікі"
"Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада"
Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы
Аркадзь ЖУКОЎСКІ "Галс"
Віктар САЗОНАЎ "Маленькія гісторыі з вялікай палітыкі"
Гарадзенскі гадавік-2012
Ларыса ГЕНІЮШ "Лісты з Зэльвы"
Зянон ПАЗЬНЯК "Добрая фатаграфія"
Наталля МАЛІНОЎСКАЯ-ФРАНКЕ "Забыты вернісаж". Творчасць мастакоў Гарадзеншчыны 1860-х – 1930-х гг.


ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА




"Забыты вернісаж". Творчасць мастакоў Гарадзеншчыны 1860-х – 1930-х гг.

Аўтар: Наталля Маліноўская-Франке

ГОД ВЫДАННЯ: 2012
МЕСЦА ВЫДАННЯ: Гродна-Мінск 2012.
ВОКЛАДКА: цвёрдая
ФАРМАТ: 145x200
КОЛЬКАСЦЬ СТАРОНАК: 192, 24 стар. з каляровымі ілюстрацыямі
ISBN 978-9856777-42-7

Гэта першае грунтоўнае даследванне феномена гарадзенскага мастацтва 1860-х-1930-х гадоў. Наталля Маліноўская-Франке вяртае гарадзенцам забытыя скарбы жывапісу, а Гродна вяртае ў шэраг мастацкіх цэнтраў цэнтральнай і ўсходняй Еўропы мяжы XIX-XXстст. Творчая спадчына мастакоў Гарадзеншчыны, а таксама бібліяграфічныя і архіўныя матэрыялы даюць падставы сцвярджаць, што ў 1860-я-1930-я гг. з Гарадзеншчынай былі звязаны жыццём і творчасцю цэлая плеяда мастакоў, якія пакінулі значны след у гісторыі мастацтва жывапісу вялікага цэнтральнаеўрапейскага рэгіёну, які ахоплівае сёння Беларусь, Літву і Польшчу. З аднаго боку, гэта вядомыя мастакі (Казімір Альхімовіч, Фердынанд Рушчыц, Казімір Стаброўскі, Леў Бакст, Генрых Вейсенгоф, Людамір Сляндзінскі, Станіслаў Жукоўскі), чыя творчасць звязана не толькі з Беларуссю, але і з Літвой, Польшчай, Расіяй. З другога боку, у жывапісе Гродзеншчыны гэтага часу працаваў шэраг таленавітых мастакоў (Марыя Гажыч, Марыя Магдалена Бутаўт-Анджэйковіч, Луцыя Балзукевіч, Майсей Лейбоўскі, Зых Буйноўскі, Валянцін Рамановіч ды інш), якія сёння невядомыя або малавядомыя ў гісторыі беларускага мастацтва, але без іх творчых здабыткаў не можа быць поўнага ўяўлення пра жывапіс Гарадзеншчыны і Беларусі.



"Добрая фатаграфія"


Аўтар: Зянон Пазьняк

ГОД ВЫДАННЯ: 2012
МЕСЦА ВЫДАННЯ: Варшава
ВОКЛАДКА: цвёрдая
ФАРМАТ: 184x258
КОЛЬКАСЦЬ СТАРОНАК: 240 з ілюстрацыямі
ISBN 978-83-935476-0-9

"Я напісаў кнігу, якую можна было б назваць асабістай, бо ў ёй я апісаў свае эмоцыі і перажываньні. Я напісаў пра розныя фатаграфіі, якія выклікалі маё захапленьне ці нават уражвалі цягам усяго майго жыцьця. Мне было важна распавесьці пра фатаграфіі, якія, на мой асабісты погляд, выяўляюць жыцьцё чалавечага духу альбо дух рэчы, дух прыроды, жыцьцё чалавечага лёсу. Для мяне яны прывязаная да майго часу, да эпохі, да майго месца на зямлі, выяўляюць яго."
Зянон Пазьняк

"Тым цікавей было паглядзець на свет вачыма чалавека, які ведае, што ён любіць, а што ненавідзіць як бубонную чуму. Такі чалавек не прызнае эрзацаў і кампрамісаў. Чорнае ў яго чорнае, а белае — белае. У гэтым сэнсе тым, чыя натура — кампраміс, хто любіць дзівацтвы, нізавую культуру і не разумее панятку «нармальны чалавек», альбом будзе асабліва цікавы."
Ева Вежнавец

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА




"Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада"

Аўтары: Алесь Госцеў, Аляксандр Дабрыян, Віталь Карнялюк, Святлана Марозава, Андрэй Чарнякевіч, Вячаслаў Швед.
Ілюстрацыі: Эдвард Дмухоўскі, Янка Лялевіч.

ГОД ВЫДАННЯ: 2012
МЕСЦА ВЫДАННЯ: Гродна-Уроцлаў
ВОКЛАДКА: цвёрдая
ФАРМАТ: 190x260
КОЛЬКАСЦЬ СТАРОНАК: 340 з ілюстрацыямі
ISBN 978-83-61617-85-3

"Пра такую кнігу марыць кожны горад. Тысячагадовая гісторыя раскладзеная па палічках параграфаў, падсьветленая, нібы ліхтарыкамі ўпоцемку, каляровымі ілюстрацыямі. Вынесеныя за асноўны тэкст і графічна вылучаныя цытаты з аўтарытэтных крыніцаў, пытаньні, якія скіроўваюць да развагаў, унікальныя архіўныя фотаздымкі... У выніку энцыкляпэдычны па колькасьці фактаў тэкст засвойваецца лёгка, як школьны ўрок. Як на добры розум, сыгнальны асобнік «Гродназнаўства» павінен быў ляжаць у гарадзенскай мэрыі на самым відным месцы, а дзяжурны чыноўнік штодня мусіў бы зьдзьмухваць з каштоўнага выданьня пыл."
Міхась Скобла



“Біяграфія гарадзенскіх вуліц”

Аўтары: Андрэй Вашкевіч, Алесь Госцеў, Віктар Саяпін, Ігар Трусаў, Андрэй Чарнякевіч, Ян Лялевіч, Ігар Лапеха.

ГОД ВЫДАННЯ: 2012

МЕСЦА ВЫДАННЯ: Гродна-Уроцлаў

ВОКЛАДКА: цвёрдая

ФАРМАТ: 198x234

КОЛЬКАСЦЬ СТАРОНАК: 370 з ілюстрацыямі

ISBN 978-83-61617-77-0

Менавіта жаданне больш дступна распавесці як мага большай колькасці гарадзенцаў пра як мага большую колькасць цікавых будынкаў Гродна і нарадзіла ідэю стварэння гэтай кнігі. Тут гісторыя і архітэктурнае мастацтва пераплятаецца з сучаснасцю будынкаў, іх цяперашнім станам і перспектывамі. Гэта своеасаблівы інвентар гістарычнай забудовы Гродна. Гістарычныя звесткі пададзены ў алфавітным парадку згодна з сённяшнімі назвамі вуліц і сучаснай нумарацыяй будынкаў.



ГАРАДЗЕНСКАЯ
БІБЛІЯТЭКА

ISBN: 9788378931041

